Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі.

Кніга выдадзеная пры інфармацыйнай падтрымцы фундацыі “Чалавек у нядолі”.

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаны здымак Уладзімера Базана.

Printed in Lithuania
ISBN: 80-86961-16-8
Друк: Petro Ofsetas, Žalgirio g. 90, LT-09303 Vilnius Lietuva

© Рэдактура. Булгакаў В., 2006

kamunikat.org

**Пра аўтараў**

Сяргей Бабаеў — незалежны аналітык.
Валер Булгакаў — публіцыст, рэдактар часопіса “ARCHE”.
Аляксандар Вашкевіч — правазнаўца, судзьдзя Канстытуцыйнага Суду ў адстаўцы.
Ірына Екадумава — палітоляг, выкладчыца паліталёгіі Акадэміі міліцыі.
Андрэй Екадумаў — філёзаф, выкладчык лёгікі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.
Алесь Зелімханаў — незалежны аналітык. Жыве й працуе ў Заслаўі.
Андрэй Казакевіч — палітоляг, галоўны рэдактар часопісу “Палітычная сфера”.
Андрэй Ляховіч — палітоляг, кіраўнік Цэнтру палітычнай адукацыі.
Пётра Натчык — палітоляг, сябра Цэнтру палітычнай адукацыі.
Вольф Рубінчык — палітоляг, перакладчык гуманістыкі з ангельскай мовы на беларускую.
Міхаіл Пастухоў — правазнаўца, судзьдзя Канстытуцыйнага Суду ў адстаўцы.
Міхась Пліска — правазнаўца, галоўны рэдактар аналітычнага бюлетэню “Адкрытае грамадзтва”.
Алесь Пяткевіч — публіцыст, перакладчык гуманістыкі зь нямецкай мовы на беларускую.
Віталь Сіліцкі — палітэканом, былы дацэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.
Юры Чавусаў — палітоляг, сябра рэдкалегіі часопісу “Палітычная сфера”.

# ЗЬМЕСТ


Уступ ........ 6
Валер Булгакаў

**Разьдзел 1. Палітычная сцэна Беларусі паміж 1990 і 1996**

Уводзіны ........ 7
Андрэй Екадумаў
Роля парлямэнту ........ 8
Віталь Сіліцкі
Выбары Вярхоўнай Рады БССР у 1990 г. ........ 13
Пётра Натчык
Мясцовыя выбары ........ 25
Пётра Натчык
Структура мясцовай улады ў Рэспубліцы Беларусі ........ 40
Пётра Натчык
Разьвіцьцё нацыянальна-дэмакратычнага руху і пазыцыі савецкай эліты ........ 60
Андрэй Екадумаў
Прэзыдэнцкія выбары 1994 году. Пераразьмеркаваньне рэсурсаў улады. Трансфармацыя палітычнай прасторы Беларусі ........ 73
Андрэй Екадумаў
Фармаваньне гібрыднага рэжыму: адаптацыя дэмакратычных інстытутаў да сыстэмы патэстарных адносінаў ........ 77
Андрэй Екадумаў
Перадумовы паразы дэмакратыі ў Беларусі ........ 95
Андрэй Екадумаў

**Разьдзел 2. Палітычная сцэна Беларусі паміж 1996 і 2000**

Увядзеньне пасады прэзыдэнта Беларусі: перадумовы і наступствы ........ 102
Андрэй Ляховіч
Выбары Вярхоўнай Рады Рэспублікі Беларусі і першы Лукашэнкаў рэфэрэндум у 1995 г. ........ 107
Пётра Натчык
Рэфэрэндум і давыбары 1996 г. ........ 126
Пётра Натчык
Працэс раздваеньня органаў улады ў выніку канстытуцыйнага крызысу лістапада 1996 ........ 137
Ірына Екадумава
Канстытуцыйны суд і канстытуцыйны крызыс 1996 г. ........ 147
Аляксандар Вашкевіч, Міхаіл Пастухоў
Структура органаў дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусі і іх трансфармацыя ........ 162
Андрэй Казакевіч
Беларуская намэнклятура і лініі разлому ў яе асяродзьдзі. Кадравая палітыка Лукашэнкі ........ 172
Пётра Натчык
Сыстэма ўлады і сыстэма апазыцыі пасьля канстытуцыйнага крызысу 1996 г. ........ 183
Андрэй Ляховіч

Альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары траўня 1999 году: ініцыятары,
ход правядзеньня, палітычныя наступствы ... 193
Андрэй Ляховіч
Сыстэма ўлады і сыстэма апазыцыі пасьля альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх
выбараў 1999 году ... 203
Андрэй Ляховіч
Выбары ў палату прадстаўнікоў 2000 г. ... 214
Алесь Зелімханаў

**Разьдзел 3. Прэзыдэнцкія выбары 2001 году**
Структура беларускага электарату ... 224
Андрэй Ляховіч
Палітычны рынак СМІ.
Інфармацыйная прастора Беларусі ў 2001 г. ... 227
Андрэй Екадумаў
Палітычны працэс у 2001 годзе ... 245
Андрэй Екадумаў
Суб'екты беларускай палітычнай сцэны ў 2001 годзе ... 257
Ірына Екадумава
Працэс адбору кандыдатаў ... 265
Ірына Екадумава
Працэс пабудовы выбарчай кааліцыі паміж дэмакратычнымі кандыдатамі ... 273
Ірына Екадумава
Выбарчая кампанія Аляксандра Лукашэнкі ... 280
Валер Булгакаў
Дынаміка рэйтынгу А. Лукашэнкі і вынікі прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ... 295
Андрэй Екадумаў
Вонкавапалітычныя фактары прэзыдэнцкіх выбараў ... 304
Ірына Екадумава
Унутранае назіраньне за прэзыдэнцкімі выбарамі ... 312
Міхась Пліска
Парушэньні выбарчага заканадаўства падчас выбарчай кампаніі і прэзыдэнцкіх выбараў ... 317
Міхась Пліска
Урокі прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі 2001 году ... 324
Андрэй Ляховіч

**Разьдзел 4. Палітычная сцэна Беларусі паміж 2001-2003**
Крызыс апазыцыі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ... 328
Віталь Сіліцкі
Унутраная палітыка рэжыму Лукашэнкі:
верасень 2001 — люты 2003 году ... 343
Андрэй Ляховіч
Палітыка ўладаў на інфармацыйным рынку.
Верасень 2001— люты 2003 ... 358
Андрэй Екадумаў
Дынаміка грамадзкай думкі: верасень 2001 — люты 2003 гг. ... 369
Андрэй Екадумаў
Падрыхтоўка ўладаў да мясцовых выбараў 2003 ... 382
Сяргей Бабаеў
Падрыхтоўка апазыцыі да мясцовых выбараў ... 394
Ірына Екадумава
Ход і вынікі мясцовых выбараў 2003 г. ... 402
Ірына Екадумава
Незалежнае назіраньне за мясцовымі выбарамі й яго вынікі ... 411
Ірына Екадумава

Зьмяненьне палітычнага раскладу пасьля мясцовых выбараў 2003 і пэрспэктывы наступных выбарчых кампаній ... 415
Віталь Сіліцкі

## Разьдзел 5. Палітычная сцэна Беларусі ў 2003-2004. Парлямэнцкія выбары 2004 году

Палітычны кантэкст напярэдадні парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму ... 431
Андрэй Ляховіч
Культурны фон беларускай палітыкі ... 446
Андрэй Казакевіч
Стратэгія і тактыка ўладаў у 2003—2004 гг. ... 455
Юры Чавусаў
Палітычнае разьвіцьцё апазыцыі ў 2003—2004 гг. ... 471
Андрэй Казакевіч
Палітычная кампанія ўладаў 2004 г. ... 482
Андрэй Казакевіч
Апазыцыя ў палітычнай кампаніі 2004 г. ... 488
Андрэй Казакевіч
Ход і вынікі парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму 2004 г. ... 498
Юры Чавусаў
Назіраньне за палітычнымі кампаніямі ў 2004 г. ... 517
Юры Чавусаў
Сацыялягічныя дасьледаваньні ў палітычнай кампаніі 2004 г. ... 534
Андрэй Казакевіч
Расклад і тэндэнцыі пасьля выбараў і рэфэрэндуму 2004 г. ... 544
Віталь Сіліцкі

## Разьдзел 6. Беларуска-расейская інтэграцыя

Эканамічная палітыка Лукашэнкі ... 552
Віталь Сіліцкі
Палітычная эканомія беларуска-расійскай інтэграцыі ... 596
Віталь Сіліцкі
Структура расійскіх палітычных элітаў і іх стаўленьне да беларуска-расійскай інтэграцыі ... 636
Юры Ліхтаровіч
Структура кіраўнічых органаў саюзнай дзяржавы Расіі й Беларусі ... 653
Ірына Екадумава
Структура бюджэту саюзнай дзяржавы і яго выкананьне ... 664
Ірына Екадумава

## Разьдзел 7. Партыйная сыстэма Беларусі. Беларускія палітыкі

Разбурэньне манаполіі КПСС і пачатак фармаваньня шматпартыйнай сыстэмы ... 671
Алесь Пяткевіч
Сьпіс беларускіх палітыкаў ... 696
Алесь Пяткевіч, Вольф Рубінчык

Некаторыя скароты ... 732

Паказьнік імёнаў ... 733

# УСТУП

“Палітычная гісторыя незалежнай Беларусі” складаецца з тэкстаў, якія ўжо пабачылі сьвет у выданьнях Менскага аналітычнага грудка — “Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001” (2001), “Беларуска-расійская інтэграцыя” (2002), “Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі” (2003) і нарэшце “Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму” (2005). (Першая ў гэтым шэрагу пазыцыя, “Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001”, нават стала бэстсэлерам і была цалкам прададзена за шэсьць месяцаў.) Ня ўвесь апублікаваны матэрыял вытрымаў выпрабаваньне часам, але ў цэлым ён захоўвае пазнавальную і аналітычную вартасьць. Ёсьць надзея, што яго перакампаноўка дазволіць дасягнуць новай якасьці ў разуменьні працэсаў і падзеяў, якія разам і складаюць найноўшую палітычную гісторыю Беларусі.

Маючы такі багаты і разнашэрсны зыходны тэкст, было бадай немагчыма дабіцца яго публікацыі згодна з прынцыпам храналягічнай лінейнасьці. У колькіх разьдзелах адбываецца зьмяшчэньне часавых пластоў — пазьнейшыя падзеі папярэднічаюць або накладаюцца на ранейшыя.

Гэтая кніга прызначана найперш будзіць палітычнае мысьленьне беларусаў і аб Беларусі. Толькі заключны разьдзел “Сьпіс беларускіх палітыкаў” быў спэцыяльна перапрацаваны для гэтага выданьня і зьмяшчае інфармацыю, актуальную на момант студзеня 2006 г. Усе астатнія тэксты даюцца без спэцыяльнай рэдакцыйнай праўкі. (Дзеля гэтага дзе–нідзе могуць стрэцца анахранізмы або храналягічныя няўвязкі.) Будзе добрым вынікам, калі некаторыя трактоўкі з пазыцыі сёньняшняга дня пададуцца штучнымі і нацягнутымі. Палітычны працэс не вычэрпваецца адной правільнай інтэрпрэтацыяй, і ўсё толькі выйграюць ад яго больш шматмернага разуменьня.

*Валер Булгакаў*

## Разьдзел 1.

# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА БЕЛАРУСІ ПАМІЖ 1990 І 1996

## УВОДЗІНЫ

За Рэспублікай Беларусяй трывала замацаваўся статус дзяржавы, якая найбольш захавала элемэнты камуністычнай сыстэмы часоў СССР. Тым ня менш, пры аналізе дынамікі беларускай палітычнай сыстэмы становіцца відавочнай уласная спэцыфіка постсавецкай мадэлі разьвіцьця беларускага грамадзтва. Новая палітычная сыстэма Беларусі дэманструе ня столькі захаванасьць старых палітычных інстытутаў, колькі пераемнасьць асноўных прынцыпаў ажыцьцяўленьня ўлады ў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы і ў цяперашняй, незалежнай Рэспубліцы Беларусі.

Ацэнка пэрыяду паміж 1990 годам, годам абвяшчэньня незалежнасьці, і 1996, годам інстытуцыйнага, канчатковага афармленьня аўтарытарнай беларускай мадэлі, як пэрыяду страчаных магчымасьцяў, напэўна, не зусім слушная. Беларусь, праз шэраг спэцыфічных гістарычна-культурных чыньнікаў, на момант краху СССР знаходзілася на ніжшым узроўні разьвіцьця як нацыянальнай, так і грамадзянскай самасьвядомасьці.

Дасьледаваньне дынамікі беларускай палітычнай сыстэмы, безумоўна, цесна зьвязана з дасьледаваньнем яе падмуркаў, сфармаваных у савецкі пэрыяд беларускай гісторыі. Аднак дасьледаваньне падмуркаў беларускай мадэлі мяккага аўтарытарызму нельга абмяжоўваць савецкім пэрыядам. Істотныя адрозьненьні цяперашняга беларускага шляху ад астатніх постсавецкіх дзяржаваў эўрапейскай часткі СССР патрабуюць уліку глыбшых гістарычных і культурных чыньнікаў. У значнай ступені гістарычна-культурныя прычыны паспрыялі няўдачы беларускага грамадзтва на шляху дэмакратызацыі пасьля распаду СССР.

Беларускі рэжым, які канчаткова ўсталяваўся ў 1996 годзе, пасьля разгону Вярхоўнага Савету 13 скліканьня і фальсыфікацыі вынікаў рэфэрэндуму, мае даўгую перадгісторыю. Умовы стварэньня беларускага палітычнага гібрыду, закладзеныя ў савецкі, і, больш канк-

рэтна, позьнесавецкі пэрыяд, узаемадзейнічалі з спэцыфічнымі чыньнікамі гістарычна-культурнай дынамікі беларускай нацыі. Мэтай гэтай разьдзелу ёсьць аналіз уплыву гістарычна-культурных чыньнікаў, якія вызначылі часовую перамогу антыдэмакратычных тэндэнцыяў у разьвіцьці беларускай палітычнай сыстэмы.

## РОЛЯ ПАРЛЯМЭНТУ

Кароткая і драматычная гісторыя беларускага парлямэнтарызму шмат у чым адлюстроўвае ўсю найноўшую палітычную гісторыю Беларусі. Парлямэнт — гэта ключавы, хаця і не адзіны, элемэнт палітычнага плюралізму і, пры адпаведным яго разьвіцьці, дэмакратыі. Выбары, дэбаты, барацьба груповак і думак — усё гэта стварае істотныя элемэнты канкурэнтнай палітычнай барацьбы. Сама сабой наяўнасьць гэтых працэсаў аказвае ня меншы ўплыў на палітычнае разьвіцьцё, чым іх вынік, — гэта значыць на тое, хто ў рэшце рэшт атрымлівае кантроль над заканадаўчым працэсам.

На рубяжы эпох, пры пераходзе ад савецкага таталітарызму да таго, што сёньня прынята называць палітычным рэжымам Аляксандра Лукашэнкі, праз кароткі плюралістычны пэрыяд у беларускай палітыцы ў 1990—1996 гг., беларускі парлямэнт (больш дакладней, парлямэнты — Вярхоўныя Рады 12-га і 13-га скліканьня) адыграў выключную ролю ў станаўленьні беларускай дзяржаўнасьці і кволай, пакуль што няўдалай спробе нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, якая, тым ня менш, пакінула ў спадчыну палітычную супольнасьць, вядомую сёньня як Рэспубліка Беларусь. За апошняе дзесяцігодзьдзе шмат было напісана пра прычыны няўдачы нацыянальнага будаўніцтва ў Беларусі, адсутнасьць чыньнікаў для дэмакратызацыі і дасягненьня незалежнасьці і г. д. Пераглядаючы ўсе гэтыя тлумачэньні, міжволі задаешся пытаньнямі: якім чынам Беларусь дасягнула таго, чаго яна дасягнула, чаму ў апошняе дзесяцігодзьдзе дзяржаўнасьць ня толькі выжыла, але і ў пэўнай ступені кансалідавалася, чаму пытаньне аб яе страце, тое, што, здавалася б, было справай часу некалькі гадоў таму, ужо практычна не абмяркоўваецца і не палохае нават большасьць прыхільнікаў незалежнай Беларусі?

Сучасная міталёгія беларускага афіцыёзу зьвяжа адказ на гэтыя пытаньні з асобай прэзыдэнта А. Лукашэнкі. Не абмяркоўваючы яго ролю ў найноўшай беларускай гісторыі, зазначым, аднак, што Лукашэнка як лідэр і як палітычны фэномэн быў бы немагчымы без абвяшчэньня дзяржаўнай незалежнасьці ў 1991 г., без падпісаньня Белавескіх пагадненьняў тагачасным кіраўніком парлямэнту Станіславам Шушкевічам, а гэта значыць, і без таго парлямэнту, які парадзіў незалежнасьць, Шушкевіча, Лукашэнку, гэтаксама і Канстытуцыю 1994 г., безь якой Лукашэнка таксама быў бы немагчымы.

Палітычная рэчаіснасьць часьцяком фармуецца не наўмыснымі, валюнтарысцкімі дзеяньнямі лідэраў і элітаў, а, кажучы кампутарнай мовай, "па змаўчаньні" (by default). Сытуацыя раўнавагі, калі аніводны з актараў ня здольны дамагчыся абсалютнага кантролю над уладай, часам фіксуе палітычную рэчаіснасьць у абсалютна парадаксальным стане: яна існуе, дарма што мала каго задавальняе. Трансфармацыя беларускай палітычнай сыстэмы на пачатку 1990-х гг. і само абвяшчэньне незалежнасьці сталі магчы-

мымі збольшага пад узьдзеяньнем вонкавых чыньнікаў: развалу савецкай дзяржавы і краху камуністычнай сыстэмы — працэсаў, да якіх Беларусь спрычынілася толькі ўскосным чынам. Незалежнасьць і разьвіцьцё палітычнага плюралізму, аднак, не былі імгненна зьвернутыя: яны пэўным чынам "застылі" ў часе на некалькі гадоў, і гэты кароткі адрэзак стаў вызначальным у далейшым лёсе беларускай дзяржавы. Менавіта парлямэнт Беларусі быў тым інстытутам, які забясьпечыў іх існаваньне "па змаўчаньні" ў той гістарычны пэрыяд. З гэтай тэзай у нечым пагадзіўся б і сам Лукашэнка — не дарма ў сваіх шматлікіх прамовах ён зьвязваў часы "ўсеўладзьдзя парлямэнту" з пэрыядам "разгулу нацыяналізму".

З пэрспэктывы часу Вярхоўная Рада 12-га скліканьня сапраўды падаецца як клубок парадоксаў. Асуджаная, здавалася б, на роспуск (узгадаем захады апазыцыі БНФ для скліканьня рэфэрэндуму ў 1992 г.), яна аказалася самым "доўгім" беларускім парлямэнтам, які "зачапіў" тры гістарычныя эпохі: савецкую, першапачаткова постсавецкую (можна сказаць, намэнклятурна-нацдэмаўскую) і, нарэшце, лукашэнкаўскую. Абраная пры фармальна існай аднапартыйнай сыстэме, яна стала самым рэпрэзэнтацыйным беларускім парлямэнтам з найбольш буйной дэмакратычнай і нацыянальнай апазыцыяй за ўсю гісторыю. Вызначаная як "камуністычная", яна прыняла рашэньні аб сувэрэнітэце, потым — незалежнасьці Беларусі, зацьвердзіла нацыянальную сымболіку, а затым першапачаткова адмовілася ад ухваленьня рэфэрэндуму, які вынішчыў кволую гегемонію нацыянальна-дэмакратычнага палітычнага дыскурсу, што існавала ў першыя гады беларускай незалежнасьці. Непрафэсійная і некампэтэнтная, яна дагэтуль зьяўляецца істотным пастаўнікам кадраў як для афіцыйнай эліты, так і контрэліты (зь яе шэрагаў выйшлі многія лідэры апазыцыі — як вэтэраны нацыянальна-адраджэнскага руху, так і былая намэнклятура; у той жа час, Лукашэнка дагэтуль выкарыстоўвае былых дэпутатаў ВР 12-га скліканьня ў якасьці свайго кадравага рэсурсу).

Вярхоўная Рада 12-га скліканьня была створана як дэкаратыўны дадатак да аднапартыйнай камуністычнай сыстэмы і, за рэдкім выключэньнем, існавала ў гэтай ролі аж да жніўня 1991 г. Жнівеньскія падзеі вынесьлі прысуд савецкай імпэрыі, але ня ўладзе былой намэнклятуры. У Беларусі яна захавалася менавіта дзякуючы пракамуністычнай намэнклятурнай большасьці ў Вярхоўнай Радзе. Аднак, дарма што балянс палітычных сілаў збольшага не зьмяніўся, зьнікненьне КПБ-КПСС прывяло да радыкальнага зьмяненьня сыстэмы ўлады. Дэкаратыўны парлямэнт паводле азначэньня ператварыўся ў яе цэнтар. Гэтаксама збольшага дэкаратыўныя атрыбуты палітычнага плюралізму, што зарадзіліся ў Беларусі падчас гарбачоўскай перабудовы, нечакана набылі значнасьць. Нешматлікая парлямэнцкая апазыцыя здолела задаць напрамак палітычнага разьвіцьця здэзарыентаванай і спалоханай намэнклятуры — вынікам стала абвяшчэньне незалежнасьці 25 жніўня 1991 г. і прыняцьце нацыянальнай сымболікі. Ува ўмовах дэфіцыту палітычнага лідэрства, пасаду кіраўніка парлямэнту (і дэкаратыўнага кіраўніка дзяржавы) заняў палітычны аўтсайдэр, унівэрсытэцкі прафэсар Станіслаў Шушкевіч. Як вынік, Беларусь стала спонсарам канчатковага развалу СССР у 1991 г. Перагрупоўка намэнклятуры ў новую "партыю ўлады" пад кіраўніцтвам прэм'ера Вячаслава Кебіча не заняла шмат часу: менавіта яго дамінантная роля ў беларускай палітыцы ў пэрыяд з 1991 па 1994 гг. прымусіла некаторых палітолягаў характарызаваць тагачасную сыстэму ўлады не як парлямэнцкую, а як "прэм'ерскую". Аднак улада прэм'ера залежала ад большасьці ў Вярхоўнай Радзе, здавалася б, пераканаўчай, але ўсё яшчэ здэзарганізаванай і

слаба кіраванай. У выніку Беларусь “затрымалася” ўва ўмовах палітычнага плюралізму яшчэ на некалькі гадоў.

Вярхоўная Рада 12-га скліканьня ўпершыню інстытуцыяналізавала палітычную апазыцыю ў Беларусі. З гістарычных абставінаў гэтую ролю прыняла на сябе фракцыя Беларускага Народнага Фронту, незалежніцкай партыі ў “дэнацыяналізаванай”, паводле азначэньня некаторых палітолягаў, дзяржаве. Здавалася б, менавіта гэтая акалічнасьць і справакавала сытуацыю, калі палітычная параза нацыянальнага руху ў 1994—1995 гг. аўтаматычна справакавала і паразу дэмакратыі. Аб прычынах няўдачы БНФ і яго тагачаснага лідэра Зянона Пазьняка ўжо сказана і напісана шмат. Зазначым, аднак, адну акалічнасьць, на якую многія палітычныя аглядальнікі не зьвяртаюць увагі: менавіта здольнасьць БНФ заняць нішу палітычнай апазыцыі і справакавала першапачатковыя посьпехі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Менавіта прысутнасьць нацыянальнай плыні ў агульнай формуле плюралізму “па змаўчаньні” спрычыніла пашырэньне незалежніцкіх ідэяў на іншыя элітныя колы, перш за ўсё на пэўныя сэгмэнты беларускай намэнклятуры.

Аднак плюралізм пачатку 1990-х гг. (і шмат у чым нацыянальна-адраджэнскі пэрыяд у найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі) быў абмежаваны палітычным жыцьцём Вярхоўнай Рады 12-га скліканьня. Пануючая намэнклятура ня здолела знайсьці больш трывалых формаў самаарганізацыі, што рабіла немагчымым рэпрадукцыю палітычнага статус-кво (здавалася б, такога выгаднага для намэнклятуры). Нягледзячы на тое, што ў выніку наступных парлямэнцкіх выбараў (калі б ім, вядома, не папярэднічалі выбары прэзыдэнцкія) можна было чакаць прыкладна такую ж кампазыцыю новага парлямэнту, як і папярэдняга, лёс асобных прадстаўнікоў “партыі ўлады” быў не гарантаваны. Плюралізм “па змаўчаньні”, такім чынам, захоўваў мэханізм уласнага самавынішчэньня.

Парадаксальна, але дэфіцыт лідэрства не гарантаваў рэпрадукцыі ўладнай эліты і праз прэзыдэнцкія выбары. Беларусь заставалася парлямэнцкай (альбо “прэм’ерскай”) рэспублікай найдаўжэйшы час паміж краінаў былога СССР менавіта таму, што Вячаслаў Кебіч ніколі ня меў шанцу выйграць прэзыдэнцкія выбары. На апошнія партыя ўлады згадзілася толькі тады, калі яе апанавала ілюзія непераможнасьці — ілюзія, якая сама сабой была справакаваная стратай кантролю за палітычнымі і грамадзкімі працэсамі, гэтаксама як і падводнымі рухамі ў шэрагах самой намэнклятуры.

Гэтая ілюзія прывяла да радыкальнага зьмяненьня правілаў гульні праз прыняцьце новай Канстытуцыі 1994 г. і ўсталяваньне прэзыдэнцкай сыстэмы ўлады. Адначасова яна разгарнула сілы, якія стрымліваў парлямэнт 12-га скліканьня, — сілы ўладных амбіцыяў і палітычнага авантурызму новай палітычнай генэрацыі, што прыйшла ў палітыку праз выбары 1990 г., але не знайшла месца ў “партыі ўлады”. Калі б ня гэтая зьмена, А. Лукашэнка так і застаўся б дэпутатам і кіраўніком саўгасу, нягледзячы на імклівы рост яго папулярнасьці. Булахаў, Ганчар, Сініцын, Шэйман, Лябедзька і іншыя былі б вымушаныя задавальняць уласныя амбіцыі выключна шукаючы магчымасьці кааптацыі ў “партыю ўлады”. Па некалькіх галасаваньнях у Вярхоўнай Радзе ў беларускай палітыцы ўсё зьмянілася ўмэнт.

Новаўтвораны інстытут прэзыдэнцкай улады, памножаны на палітычную рэчаіснасьць пачатку 1994 г., азначаў зараджэньне рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Адначасова парлямэнт набыў для сябе прынцыпова новую ролю: з галоўнага элемэнту сыстэмы ўлады ён ператварыўся, кажучы словамі самога Лукашэнкі, у “гняздо апазыцыі”. Рэч была нават не ў палітычных арыентацыях дэпутатаў — пасьля ліпеня 1994 г. яны імкліва страцілі вызначальную

ролю ў паводзінах Вярхоўнай Рады. Палітычная прастора была рэструктурызаваная не па ідэалягічных падзелах (так, як гэта было ў "дапрэзыдэнцкі" пэрыяд), а паводле прынцыпу "за" ці "супраць" самога Лукашэнкі. Памкненьні апошняга набыць абсалютную ўладу спрычынілі пераход у апазыцыю значнай колькасьці тагачасных палітычных гульцоў, уключаючы значную частку лукашэнкаўскіх паплечнікаў. Выключэньне стваралі тыя, хто быў задаволены пэрспэктывай поўнага падпарадкаваньня прэзыдэнцкай волі альбо ня бачыў для сябе ніякай іншай пэрспэктывы. Аднак, намэнклятурная большасьць хутка ўсьвядоміла, што адзінай крыніцай яе ўлады было само знаходжаньне каля ўлады і што апошняе цяпер цалкам залежала ад Лукашэнкі. Як вынік, амаль не было аказана супраціву пабудове прэзыдэнцкай вэртыкалі ў кастрычніку 1994 г. (выключэньне склала толькі апазыцыя БНФ). Спробы атакаваць Лукашэнку яго ж зброяй, абвінавачаньнямі ў карупцыі, былі хутка заблякаваныя. Нарэшце, апошні эпізод супраціву, барацьба супраць першага лукашэнкаўскага рэфэрэндуму 1995 г., скончыўся з прадказальным вынікам. Залежнасьць намэнклятуры ад прэзыдэнцкай улады і волі была цалкам усталяваная падчас змаганьня ў красавіку 1995 г., і, пераасэнсоўваючы падзеі, міжволі можна зьдзівіцца хутчэй таму, што парлямэнт не здаваўся так доўга, а не што ён "зламаўся" так рана.

Рэпрадукцыя апазыцыйнага парлямэнту ў выглядзе Вярхоўнай Рады 13-га скліканьня стала магчымай дзякуючы таму, што новая прэзыдэнцкая ўлада яшчэ не засьведчыла падчас выбараў, што любы парлямэнт, які будзе абраны ў канкурэнтных выбарах і будзе мець пэўныя рэальныя паўнамоцтвы, стане ў апазыцыю да такой асобы, як Лукашэнка. Прэзыдэнт краіны дзесьці інстынктыўна гэта разумеў: няўдалыя спробы зрыву выбараў, нават калі яны прынесьлі відавочную паразу тагачасным галоўным апанэнтам Лукашэнкі, апазыцыі БНФ, яскрава сьведчылі аб яго доўгатэрміновых памкненьнях. Аднак палітычныя плыні, якія выйгралі выбары 1995 г. і ішлі ў Вярхоўную Раду, паводле словаў яе віцэ-сьпікера, камуніста Васіля Новікава, каб "дапамагчы прэзыдэнту", хутка сутыкнуліся з фактам, што адзіная дапамога, якую яны здольныя аказаць Лукашэнку, гэта ліквідацыя (калі не дэ-юрэ, то дэ-факта) самога інстытуту парлямэнтарызму. Канчаткова камуністычна-аграрнай большасьці гэта стала зразумела толькі тады, калі пляны наконт канстытуцыйнага рэфэрэндуму 1996 г. былі ўжо народжаныя і сфармуляваныя ў нетрах прэзыдэнцкай адміністрацыі.

Нягледзячы на шырокую апазыцыю да Лукашэнкі ў Вярхоўнай Радзе 13-га скліканьня, парлямэнт (а разам зь ім і парлямэнтарызм і рэшткі палітычнага плюралізму ў Беларусі) быў загадзя асуджаны. Падчас абвяшчэньня рэфэрэндуму ён, разам з Канстытуцыйным судом, заставаўся адзіным уладным інстытутам, які ня быў цалкам кантраляваны прэзыдэнтам. Сіла закону заставалася адзіным палітычным інструмэнтам антыпрэзыдэнцкай апазыцыі, але яна хутка саступіла закону сілы. Магчыма, беларуская гісторыя павярнулася б у іншы бок, калі б Вярхоўная Рада здолела вынесьці імпічмэнт Лукашэнку ў апошнія дні свайго існаваньня. Але гэтага ня здарылася, бадай, зь дзьвюх прычынаў. Першая: у парлямэнцкай апазыцыі не было сілавой падтрымкі, неабходнай, каб рэальна адхіліць Лукашэнку ад пасады. Яе ня здолела аказаць вуліца, яе цяжка было чакаць ад сілавых структураў. Другая: такі захад патрабаваў прынцыпова іншага складу парлямэнцкай большасьці: амаль уся "намэнклятурная апазыцыя" зрабіла для сябе той самы выбар, што і яе папярэднікі ў Вярхоўнай Радзе 12-га скліканьня: пераход пад поўную залежнасьць ад прэзыдэнцкай вэртыкалі забясьпечваў больш спакойнае існаваньне, чым барацьба зь ёй. Пяцьдзясят дэпутатаў, што засталіся вернымі кан-

стытуцыі 1994 г., — сухі астатак сапраўднай апазыцыйнасьці апошняга паўнавартаснага беларускага парлямэнту.

Пачынаючы зь лістапада 1996 г., парлямэнт, цяпер ужо нацыянальны сход у складзе рады рэспублікі і палаты прадстаўнікоў, набыў кішэнны статус, фактычна зрабіўшы поўны круг, вярнуўшыся ў стан, зь якога пачынаўся беларускі парлямэнтарызм у канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. Кішэннасьць першага складу палаты прадстаўнікоў была літаральнай: ён быў фармальна прызначаны прэзыдэнцкім указам. Да таго ж, як стала вядома з новай вэрсіі Канстытуцыі краіны, новы парлямэнт амаль ня меў заканадаўчых паўнамоцтваў: у большасьці выпадкаў, калі прэзыдэнцкі ўказ ці дэкрэт і закон уступаюць у супярэчнасьць, перавагу мае першы. Першы склад палаты прадстаўнікоў запомніўся хіба што яго адчайнымі спробамі пацьвердзіць сам факт свайго існаваньня, пераважна за мяжой краіны, таму што ўнутры Беларусі ў гэтым не было асаблівай неабходнасьці. Вынікам гэтых высілкаў стала доўгая сага пад назвай “барацьба за легітымізацыю палаты прадстаўнікоў на міжнароднай арэне”. Гэтая барацьба, аднак, сышла на нішто зь цягам таго, як лукашэнкаўская ўлада рабіла выбар на карысьць уласнай самаізаляцыі на міжнароднай арэне перад даволі нязначнымі для яе перавагамі міжнароднага прызнаньня.

Да таго, аднак, як курс на самаізаляцыю быў канчаткова вызначаны, спробы набыцьця міжнароднай легітымнасьці спарадзілі палату прадстаўнікоў 2-га скліканьня, якая была абраная ў кастрычніку 2000 г. Новы парлямэнт быў дэ-факта такім жа кішэнным, як і яго папярэднік, аднак ён быў фармальна абраным. Выбары 2000 г. былі своеасаблівымі: апазыцыя ў асноўным адмовілася ўзяць у іх удзел, спасылаючыся на адсутнасьць базавых падставаў для свабодных і справядлівых выбараў. Тая яе частка, што паспрабавала ўзяць удзел, была збольшага адхіленая ад выбарчага працэсу ўжо на стадыі рэгістрацыі. Посьпеху дамагліся толькі два кандыдаты, што належалі да апазыцыі ў Вярхоўнай Радзе 13-га скліканьня (адна зь іх, Вольга Абрамава, у хуткім часе перайшла ў лягер паплечнікаў Лукашэнкі; другі, Уладзімер Навасяд, быў “адсеяны” на стадыі рэгістрацыі на наступных выбарах 2004 г.). Аднак, каб падтрымаць нейкія надзеі на легітымізацыю выбараў, прэзыдэнцкая вэртыкаль дазволіла своеасаблівы экспэрымэнт з увядзеньнем унутрырэжымнага плюралізму: на выбарах 2000 г. у кожнай акрузе паміжсобку канкуравалі некалькі прадстаўнікоў улады. Безумоўна, канкурэнцыя была толькі ўмоўная, але нават у яе выніку нарадзілася групоўка, якая ў рэшце рэшт ператварылася ў парлямэнцкую апазыцыю. Група “Рэспубліка” пакінула невялікі сьлед у палітычнай гісторыі Беларусі: хутчэй за ўсё, сам факт яе стварэньня запомніцца больш, чым тое, што зьдзейсьнілі яе лідэры, дэпутаты Сяргей Скрабец, Уладзімер Парфяновіч і Валеры Фралоў. (Цікава, што ў той жа час у вышэйшай палаце, радзе рэспублікі, таксама зьявіўся свой апазыцыянэр: ім стаў сам сьпікер палаты, былы прэзыдэнт Акадэміі навук Беларусі Аляксандар Вайтовіч. Яго тэрміновае адкліканьне ў жніўні 2003 г. і такая ж тэрміновая замена на прызначанага ў той жа дзень былога прэм’ера Генадзя Навіцкага, сасланага ў парлямэнт за правалы на гаспадарчай рабоце, толькі ў чарговы раз прадэманстравалі сапраўдны статус беларускага парлямэнту.) Лёс “Рэспублікі” быў вызначаны ня толькі яе статусам ізаляванай апазыцыі ў безуладным парлямэнце, але і адсутнасьцю палітычнай базы, за выключэньнем адміністрацыйнага рэсурсу, з дапамогай якога яны былі абраныя і які быў аўтаматычна страчаны, калі дэпутаты пачалі дазваляць сабе пэўную незалежнасьць. Аднак у гісторыі з палатай прадстаўнікоў 2-га скліканьня зноў пацьвердзілася тэндэнцыя,

якую можна было назіраць і ў папярэдніх беларускіх парлямэнтах: палітычная апазыцыя ў Беларусі ўзьнікае і фармуецца незалежна ад поглядаў ізноў абраных дэпутатаў, кожны раз, калі выбары ня цалкам кантраляваныя.

Таму зразумела, чаму падчас выбараў 2004 г. кантроль за адборам "праўладных" кандыдатаў, падрыхтоўкай і ходам выбараў быў нашмат пільнейшы нават у параўнаньні з папярэднімі выбарамі. Як вынік, трэці парлямэнт па рэфэрэндуме 1996 г. канчаткова набыў рысы, якія пасуюць да яго статусу і паўнамоцтваў, што вызначаныя ў Канстытуцыі. Першыя дні працы новай палаты прадстаўнікоў (перш за ўсё, абраньне сьпікера новай палаты прадстаўнікоў з простай падачы прэзыдэнцкай адміністрацыі і ўстрыманьне ад стварэньня дэпутацкіх групаў паводле простай рэкамэндацыі прэзыдэнта) прадэманстравалі, што для сапраўднага і адзінага цэнтру ўлады адпала неабходнасьць нават у вонкавай дэманстрацыі наяўнасьці рысаў парлямэнтарызму ў сучаснай Беларусі. А значыць, парлямэнт канчаткова пазбавіўся магчымасьцяў аказваць нейкі ўплыў на палітычнае жыцьцё. Калі разьвіцьцё парлямэнтарызму было лякаматывам палітычнага жыцьця ў Беларусі на пачатку 1990-х гг., сёньня яго адраджэньне патрабуе значных палітычных зьменаў, якія, хутчэй за ўсё, ужо не адбудуцца шляхам нармальнай, "сыстэмнай" палітыкі.

## ВЫБАРЫ ВЯРХОЎНАЙ РАДЫ БССР У 1990 Г.

Асаблівасьці электаральных паводзінаў ёсьць важная характарыстыка палітыкі. Іх фармаваньне — доўгатэрміновы працэс, на працягу якога закладаюцца і зьмяняюцца матывы ўдзелу ў палітыцы і асаблівасьці праяўленьня гэтых матываў у электаральных паводзінах. На характар палітычнага ўдзелу ўплываюць палітычны рэжым, выбарчая сыстэма, тып палітычнай культуры, але кожныя наступныя выбары дадаюць яшчэ новыя рысы.

Гістарычныя асаблівасьці разьвіцьця постсавецкіх палітычных сыстэмаў, да якіх адносіцца і беларуская, абумоўліваюць вялікую значнасьць бясспрэчнай палітычнай падтрымкі, якая залежыць не ад выніковасьці ўлады, а ад іншых чыньнікаў (ідэалёгіі, традыцыі і да т. п.). У выніку сэнсам выбарчага працэсу становіцца не абраньне ўлады праз атрыманьне падтрымкі, а дэманстрацыя падтрымкі з боку грамадзянаў.

### Грамадзка-палітычны кантэкст выбараў

Выбары ў Вярхоўную Раду БССР 1990 г. былі першымі рэспубліканскімі парлямэнцкімі выбарамі, якія адбываліся на канкурэнтнай аснове. Але фармальны дазвол удзелу ў выбарах альтэрнатыўных (пазапартыйных) кандыдатаў не прынёс рэальнай роўнасьці ў магчымасьцях прадстаўніцтва і барацьбы за ўладу.

Першыя выбары адбываліся ў супярэчлівым палітычным і сацыяльна-эканамічным асяродзьдзі. Канец 1980-х — пачатак 1990-х гг. быў пэрыядам палітычнага пад'ёму, выкліканага перабудовай, і адначасова эканамічнага крызысу, цяжкасьць якога паглыблялася на фоне дабрабыту застойных часоў.

26 сакавіка 1989 г. адбыліся выбары дэпутатаў на першы Зьезд народных дэпутатаў СССР. Першыя агульнасаюзныя канкурэнтныя выбары праходзілі ўва ўмовах надзвычайнай масавай актыўнасьці. Але ўжо пасьля другога зьезду актыўнасьць пайшла на спад. Выбары праходзілі на альтэрнатыўнай аснове. На 2250 дэпутацкіх месцаў было вылучана 9505 кандыдатаў. Пры гэтым 1/3 дэпутацкіх мандатаў на саюзным узроўні рэзэрвавалася для прадстаўнікоў грамадзкіх аб'яднаньняў, г. зн. зь вялікай імавернасьцю разьмяркоўвалася паміж прадстаўнікамі КПСС. На сходзе былі прадстаўленыя і непартыйныя дэпутаты.

Ні першы, ні другі зьезды ня мелі значных практычных заканадаўчых вынікаў (аднак важным практычным вынікам было расчараваньне ў КПСС і ў Гарбачову). Перад першым зьездам была абраная ВР СССР XI скліканьня. Пасьля другога — прынята 36 нарматыўных актаў, у тым ліку 5 законаў і 26 пастановаў. Але ўсе яны пераважна мелі ці эканамічны, ці дэкларацыйна-ідэалягічны характар.

Вынікам стаў пачатак расчараваньня як у прадстаўнічых установах, так і ў КПСС. Гэта было выклікана супярэчнасьцю паміж чаканьнямі (падчас тэлевізійнай трансьляцыі пасяджэньняў нават пагаршалася працоўная дысцыпліна) і рэальнасьцю (паглыбленьне цяжкага эканамічнага становішча), а таксама асаблівасьцямі масавай палітычнай сьвядомасьці таго часу. Грамадзяне, сацыялізаваныя на працягу сямідзесяці гадоў праз арганізаваную зьверху прымусовую падтрымку, чакалі сыгналаў аб "выніковасьці" абранай улады і вызначэньня далейшых кірункаў шляху да "сьветлай будучыні". Але эканамічны спад працягваўся, а выкрываньне карупцыянэраў, напрыклад па супрацькарупцыйных справах Гдляна і Іванова, ня мела выніку.

Інфармацыйная форма падачы зьездаў нагадвала мадэлі крызыснай камунікацыі. Яны трансьляваліся без скарачэньняў. У выніку людзі аб'ядноўваліся каля тэлеэкранаў і адчувалі патрэбу ў масавай супольнай актыўнасьці (гэта натуральнае наступства крызыснай камунікацыі, дасьледаванае ў ЗША яшчэ пасьля забойства Кенэдзі).

Спрычыненае такім чынам ажыўленьне грамадзтва трэба было толькі накіраваць у патрэбны бок. Але каб гэта зрабіць, неабходная была наяўнасьць сілаў, зацікаўленых ува ўладзе, якія б мелі палітычныя мэты і матывацыю іх дасягненьня, навыкі палітычнай дзейнасьці.

У выніку да зімы 1989/90 гг. у большасьці савецкіх рэспублік пачаўся "парад сувэрэнітэтаў". Лякаматывам выступілі прыбалтыйскія краіны, якія мелі яшчэ жывы досьвед нацыянальнай дзяржаўнасьці. У краінах, дзе меліся этна-нацыянальныя і тэрытарыяльныя супярэчнасьці (напрыклад у Грузіі, Арменіі), рэгіянальныя кіраўнічыя групы пачалі выкарыстоўваць масавую актыўнасьць для пашырэньня сваіх паўнамоцтваў, што выклікала абвастрэньне міжнацыянальных адносінаў.

У большасьці рэспублік СССР накіраваньне масавай актыўнасьці адбывалася праз супрацьстаяньне дзьвюх групаў: дэмакратычнай плятформы і плятформы КПСС — тых, хто выступаў "за" і "супраць" пераменаў. Фармаваньне гэтых ідэалягічных пазыцыяў стала вынікам, з аднаго боку, папярэдняга разьвіцьця незалежніцкіх сілаў, з другога — асаблівасьцяў адносінаў унутры рэспубліканскіх кампартыяў, наяўнасьці ў іх складзе сілаў, зацікаўленых у пераменах.

БССР у гэтым пляне не была выключэньнем. Але расклад сілаў паміж незалежнікамі-дэмакратамі і плятформай КПСС склаўся не на карысьць прыхільнікаў пераменаў. Пры канцы 1980-х гг. у партыйнай эліце БССР склалася мадэль разьмеркаваньня пасадаў, якую

можна ахарактарызаваць як новы кліенталізм[1]. Асноўнымі аўтарамі яе былі партыйныя функцыянэры, якія выйшлі пераважна з парткамаў менскіх прамысловых прадпрыемстваў. Мадэль паказала сваю выніковасьць у савецкай сыстэме пры барацьбе беларускіх функцыянэраў за маскоўскія пасады. Яе ўдзельнікі пасьпелі пабываць у Маскве і вярнуцца ў рэспубліку. Асаблівасьці разьмеркаваньня пасадаў аказалі ўплыў на стаўленьне да пераменаў як з боку рэспубліканскай цэнтральнай, так і мясцовай эліты.

Існаваньне сталых каналаў прасоўваньня ў цэнтар пазбаўляла менскую эліту (асабліва партыйную) матывацыі выкарыстаць перамены, прапанаваныя Гарбачовым, для пашырэньня сваёй улады ў рэспубліцы. Гэта патрабавала пераходу ад кулюарнага да інтэрактыўнага стылю палітычный дзейнасьці, прадугледжвала перадачу ўлады Радам, узмацненьне пазыцыяў кіраўнічай непартыйнай эліты (Вярхоўнай Рады). Гэта быў клопат. Да таго ж мадэль рабіла бессэнсоўнымі прыкладзеныя намаганьні для здабыцьця выгадных пазыцыяў. Кіраўнічай эліце больш зручна было б захаваць уладу ў межах ужо складзенай мадэлі і перачакаць распачатыя перамены.

Рэгіянальная эліта была мала заангажаваная на ўдзел ува ўладзе. Большасьць дасьледнікаў адзначаюць, што прычынай слабасьці рэгіяналаў была гамагеннасьць Беларусі паводле нацыянальных, рэлігійных і іншых парамэтраў, якія маглі стварыць падставы для “крызысу інтэграцыі” і матываваць змагацца за ўладу. Але рэгіянальныя эліты не былі зацікаўленыя ў барацьбе за цэнтральную ўладу і зь іншых прычынаў. Па-першае, прамысловым і кіраўнічым мясцовым элітам не было за што змагацца ў матэрыяльным пляне[2]. Па-другое, асаблівасьці разьмеркаваньня пасадаў у БССР не пакідалі рэгіянальнай партыйнай эліце надзеяў палепшыць свой статус за кошт удзелу ў прадстаўнічых установах. Так, сярод 83 дэпутатаў Зьезду народных дэпутатаў СССР, абраных ад БССР, было толькі 4 прадстаўнікі рэгіянальнай эліты (Анатоль Зелянкоўскі — першы сакратар Берасьцейскага абкаму КПБ, Уладзімер Грыгор’еў — першы сакратар Віцебскага абкаму КПБ, Леанід Кляцкоў — першы сакратар Гарадзенскага абкаму КПБ і Галіна Дылевіч — старшыня выканкаму Залескай сельскай рады). Ад менскай гарадзкой і абласной эліты ішло 3 чалавекі. Прадстаўнікоў жа цэнтральнага дзяржаўнага і партыйнага апарату было 13 чалавек. (На гэта таксама магло мець уплыў і памежнае становішча БССР, што вымушала вельмі пільна кантраляваць кадравую сытуацыю ў ёй.)

Падзел дэлегатаў паводле абласьцей сьведчыў пра наступнае. 1. У кіраўнічых колах статус рэгіянальных партыйных і гаспадарчых элітаў значна саступаў статусу прадстаўнікоў цэнтральнай эліты. 2. Стаўленьне грамадзянаў да мясцовай эліты сьведчыла пра яе невялікі патэнцыял што да здабыцьця ўлады. 3. У рэгіяналаў адсутнічала матывацыя “вылучацца” ў вялікую палітыку.

Такім чынам, цэнтральная эліта не жадала мяняць мадэль уладаваньня, а мясцовая была занадта слабая, каб на нешта прэтэндаваць. З розных прычынаў, але ні першая, ні другая не маглі стаць правадырамі пераменаў.

Напярэдадні выбараў альтэрнатыўныя (нефармальныя) сілы толькі пачалі складвацца. Рэальна на той час можна было казаць пра арганізацыйнае афармленьне толькі БНФ, які ўва-

[1] Больш падрабязна гл.: Urban M. An algebra of soviet power. Elite circulation in Belorusian Republic 1966–1986. — Cambridge University, 1989; Натчык П. Беларуская намэнклятура і лініі разломы ў яе асяродзьдзі // Беларуская палітычная сыстэма і прэзыдэнцкія выбары 2001 г. — Менск: Аналітычная група, 2001.

[2] Больш падрабязна пра вынікі гэтага фактару гл.: Натчык П. Ранейшыя мясцовыя выбары: Ход і вынікі // Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. — Менск : Аналітычны грудок, 2003.

сабляў супрацькамуністычны рух і адначасова выступаў як лякаматыў прасоўваньня нацыянальных ідэяў. За два гады да першых парлямэнцкіх выбараў, 19 кастрычніка 1988 г., быў заснаваны аргкамітэт па стварэньні БНФ. Але першыя зьезды яго заснавальнікаў праводзіліся за межамі БССР.

Касьцяк БНФ складала гуманітарная інтэлігенцыя. Мала хто зь яе прадстаўнікоў меў дагэтуль досьвед палітычнай дзейнасьці. У большай ці меншай ступені гэтыя людзі былі сацыялізаваныя ў традыцыях савецкай дзяржавы. Такая мадэль стварала своеасаблівыя ўяўленьні пра палітыку і сыстэму палітычных паводзінаў. Паверхавы слой гэтых уяўленьняў, які датычыўся ведаў і каштоўнасьцяў (стаўленьне да КПСС, сувэрэнітэту і да т. п.), крытыкаваўся і выклікаў супраціў. Але захавалася асноўная матрыца паводзінаў, закладзеная ў сьвядомасьць савецкай дзяржавай, якая адрозьнівала тых, хто прэзэнтаваў партыйную эліту, і тых, хто ўвасабляў сьвежыя плыні супрацьпартыйных актывістаў. Апошнія разглядалі палітыку не як барацьбу за ўладу, а як барацьбу за справядлівасьць. Асновай уяўленьня пра палітыку быў створаны савецкай эпохай стэрэатып значнасьці масавай падтрымкі. Беларускія дэмакраты не былі мак'явэлістамі, прагматыкамі. Атрымаць іньекцыю мак'явэлізму можна было толькі праз камунікацыю з тымі, хто ўжо меў уладу, напрыклад ад незадаволеных зь ліку кіраўнічай цэнтральнай эліты, ці ад тых, хто жадаў атрымаць уладу, — рэгіянальных элітаў.

Асаблівасьці разьвіцьця БССР абумовілі той факт, што большасьць установаў працы сацыяльнай праслойкі, зь якой паходзілі прадстаўнікі нефармальных груповак (гуманітарнай інтэлігенцыі), знаходзілася ў Менску. Менск быў і месцам панаваньня кіраўнічай эліты, якая бярэ пачатак зь менскіх прамысловых прадпрыемстваў. Але камунікацыя паміж антыкамуністамі-незалежнікамі і незадаволенымі ў пануючай эліце была малаверагодная. Гэтыя групы існавалі ў розных сацыяльных прасторах. Уладная эліта паходзіла пераважна з тэхнічнай інтэлігенцыі. Супярэчнасьці і непаразуменьне паміж беларускімі "гуманітарнікамі" і "тэхнарамі" склаліся яшчэ ў савецкія часы. Малаверагодным было таксама ўсталяваньне нейкіх асабістых сувязяў па-за межамі палітыкі.

Другая крыніца атрыманьня навыкаў прагматычнай палітычнай дзейнасьці — кампраміс з кіраўнічай элітай, якой у выніку масавых пратэстаў пагражала страта ўлады. Зьвяртацца па дапамогу нефармальныя групы маглі толькі да народу, выкарыстоўваючы масавую актыўнасьць. Але ўжо падчас вылучэньня кандыдатаў у Вярхоўную Раду масавая падтрымка гуманітарнай інтэлігенцыі выявіла свае асаблівасьці.

Выбары ў Вярхоўную Раду БССР адбыліся пасьля выбараў Вярхоўнай Рады СССР. Гэта вызначыла як характар палітычнага ўдзелу грамадзянаў, так і пазыцыю асноўнай на той момант палітычнай сілы — КПБ — на выбарах. Першыя агульнасаюзныя выбары адбываліся ўва ўмовах перабудовачнай эўфарыі. Гэта былі больш значныя і больш статусныя выбары. Парлямэнт меў дзьве функцыі: ён быў прадстаўнічай і заканадаўчай установай. У савецкай масавай сьвядомасьці была важная менавіта першая функцыя. Вярхоўная Рада СССР, таксама як і Вярхоўная Рада БССР, успрымалася грамадзянамі не як установа ўлады (гэты статус і рэальна, і сымбалічна захоўваў ЦК КПБ), а як народная трыбуна, установа прадстаўніцтва, на якой прэзэнтуюцца не пазыцыі ці інтарэсы асобнай групы, а асабістае ўяўленьне палітыка пра кірункі разьвіцьця грамадзтва. Магчымасьць удзелу ў рэспубліканскіх выбарах шэрагу рэзанансных партыйных дзеячоў, якія маглі вызначыцца як прыхільнікі рэформаў партыі і прадстаўляць неартадаксальную партыйную пазыцыю, была абмежаваная іх абраньнем у ВР СССР. Да іх ліку можна аднесьці, напрыклад, Мікалая Ігрунова, Георгія Таразевіча, Уладзімера Ганчарыка.

Ход выбараў паказаў, што супрацьпартыйны настрой спалучаўся з матрыцай масавай сьвядомасьці, у якой грамадзяне захоўвалі рытуальны спосаб выражэньня падтрымкі, г. зн. не маглі актыўна і мэтанакіравана дзейнічаць.

Так, паводле дадзеных апытаньняў рэспубліканскай Рады прафэсійных саюзаў, каля 90 % апытаных былі супраць вылучэньня ў якасьці кандыдатаў партыйных, савецкіх, прафсаюзных і камсамольскіх функцыянэраў. Але менавіта яны пераважалі і сярод вылучаных, і сярод абраных дэпутатаў.

## Спэцыфіка палітычнага ўдзелу

Палітычны ўдзел падчас выбараў 1990 г., таксама як і ў савецкія часы, працягваў насіць рытуалізавана мабілізаваны характар. Гэтаму спрыялі і асаблівасьці заканадаўства, і традыцыі палітычнага ўдзелу.

Партыйныя функцыянэры, дзякуючы заканадаўству, атрымалі фору ўжо на этапе вылучэньня кандыдатур. Згодна з заканадаўствам, вылучаць кандыдатаў на рэспубліканскія выбары мелі права працоўныя калектывы, якія налічвалі больш за 300 працоўных. Вылучэньне адбывалася паводле вынікаў перадвыбарных канфэрэнцыяў. Закон не абмяжоўваў колькасьць удзельнікаў канфэрэнцыі, але акруговая і тэрытарыяльная выбарчыя камісіі атрымалі ад Цэнтравыбаркаму брашуру (яна ня мела статусу афіцыйнай інструкцыі, але фактычна выконвалася камісіямі), згодна зь якой дазвалялася рэгістрацыя толькі тых кандыдатаў, на канфэрэнцыях дзеля абраньня якіх прысутнічала ня менш за палову працоўных прадпрыемства. Кандыдаты маглі вылучацца і калектывамі вышэйшых і сярэдніх спэцыяльных навучальных установаў (гэта адрозьнівала выбары народных дэпутатаў БССР ад папярэдніх саюзных выбараў, дзе навучальныя ўстановы ня мелі права вылучэньня кандыдатаў). Калі колькасьць працоўных гэтых установаў была недастатковай, маглі праводзіцца вылучэньні ад аб’яднаных канфэрэнцый калектываў. Акрамя гэтага, права вылучаць кандыдатаў мелі грамадзяне па месцы жыхарства — таксама паводле вынікаў сходаў. Шэраг грамадзкіх аб’яднаньняў (такіх, як таварыства вэтэранаў, аб’яднаньні сьляпых, глухіх, інвалідаў) мелі права асобнага вылучэньня кандыдатаў, іх прадстаўнікі абіраліся раней за астатніх за межамі агульнанацыянальнай выбарчай кампаніі, што давала магчымасьць частцы іх кіраўніцтва амаль гарантавана атрымаць мандаты.

Кандыдаты маглі вылучацца толькі па месцы жыхарства ці працы. Выключэньне складалі тыя грамадзяне, чыя дзейнасьць пашыралася на тэрыторыю, большую за выбарчую акругу, напрыклад на ўсю краіну. Яны мелі права вылучацца ад любой акругі, якая знаходзілася ў тэрытарыяльных межах іх дзейнасьці. Апошняя норма стварала выгадныя ўмовы для партыйных і савецкіх функцыянэраў, значная колькасьць якіх і пайшла на выбары па найбольш “памяркоўных” сельскіх акругах.

Асноўнай формай стала вылучэньне ад перадвыбарных канфэрэнцыяў працоўных калектываў. Гэты спосаб быў найбольш падкантрольны КПСС, якая будавалася на базе ячэек, г. зн. мела вытворча-тэрытарыяльную структуру. Ужо пачатак выбарчай кампаніі паказаў, што магчымасьць арганізаваць масавую актыўнасьць і атрымаць “правільных” кандыдатаў даваў толькі ўдзел працоўных калектываў.

Нягледзячы на наяўнасьць права вылучэньня кандыдатаў ад тэрытарыяльных сходаў, даз-

вол вылучэньня кандыдатаў ад працоўных калектываў (гэты шлях вылучэньня быў найбольш масавым) стаў першым сыстэмным чыньнікам, які схіляў да стварэньня і замацаваньня на канкурэнтных выбарах савецкай мадэлі мабілізаванага ўдзелу. Гэта ставіла патэнцыйных кандыдатаў і ўвесь ход выбарчага працэсу ў залежнасьць ад кіраўніцтва прадпрыемстваў (нягледзячы на лібэралізацыю падбору кіраўнічых кадраў у часы перабудовы, дырэктарскі корпус сваім складам і пазыцыямі ў значнай ступені застаўся традыцыйным) і пазбаўляла нефармальныя сілы матывацыі шукаць арганізаванай падтрымкі ў шырокіх колах насельніцтва. Такі фактар меў вынікам паглыбленьне сувязяў паміж апазыцыйнымі сіламі і прафэсійнымі групамі, зь якіх яны выйшлі, і не заахвочвала іх ствараць доўгатэрміновыя (што працуюць з электаратам ня толькі падчас выбараў) арганізацыйныя структуры на месцах.

Такая мадэль прадстаўніцтва магла быць жыцьцяздольнай толькі пры наяўнасьці кансэнсусу адносна правілаў перадачы ўлады і матэрыяльных рэсурсаў, якімі б маглі карыстацца палітычныя сілы падчас перадвыбарнай барацьбы. Ці пры наяўнасьці іншых, акрамя сацыяльна-прафэсійных і зьвязаных зь сьветапоглядам падставаў для разьмежаваньня. Ніводнага зь пералічаных чыньнікаў у БССР на пачатку 1990-х гг. існаваць не магло.

Грамадзяне ж, асабліва сталічныя жыхары, не сьпяшаліся праявіць выбарчую актыўнасьць. Першыя тыдні працэс вылучэньня кандыдатаў праходзіў вельмі марудна. Асабліва нізкая актыўнасьць выбарнікаў адзначалася ў Менску, дзе на 11 студзеня 1990 г., г. зн. за два тыдні да канца вылучэньня кандыдатаў, на 40 мандатаў прэтэндавала толькі 50 кандыдатаў у дэпутаты. На 13 студзеня ў рэспубліцы па 59 акругах не было вылучана ніводнага кандыдата. На такім узроўні актыўнасьць захоўвалася да канца тэрміну вылучэньня. Асноўная колькасьць кандыдатаў была вылучаная ў апошні тэрмін. Згодна з дадзенымі друку, у апошнія дні рэгістрацыі ў рэспубліцы адбывалася па 100 і больш перадвыбарных канфэрэнцый на дзень. Пры гэтым значная колькасьць кандыдатаў абіралася на альтэрнатыўнай аснове[3].

Ход падрыхтоўкі да выбараў сьведчыць, што, нягледзячы на ілюзію масавай актыўнасьці, грамадзтва было здольнае толькі на арганізаваны зьверху ўдзел у палітыцы. Грамадзяне не былі матываваныя вылучаць кандыдатаў самастойна. Усё адбывалася на падставе двух чыньнікаў: волі кіраўніцтва калектыву ці волі кандыдата.

Арганізаваць перадвыбарную канфэрэнцыю можна было пераважна дзякуючы намаганьням кіраўніцтва. Пры гэтым найбольш палітычна “несумленнай” была менавіта тая група, якая складала патэнцыйны электарат нефармальных кандыдатаў, — інтэлігенцыя. Так, перадвыбарная канфэрэнцыя ад БДУ здолела абраць кандыдата толькі з трэцяй спробы. Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут — з другой. Галоўнай прычынай няпосьпеху была не адсутнасьць супольнага кандыдата, а сыстэматычная адсутнасьць кворуму. Рытуальнасьць удзелу падкрэсьлівалася тым, што ў шэрагу выпадкаў кворуму, які быў на пачатку сходу, ужо не хапала для галасаваньня наконт абраньня кандыдата, г. зн. людзі сыходзілі да канца мерапрыемства[4].

Фактычна гэта магло значыць толькі тое, што сход меў у значнай ступені прымусовы, арганізаваны кіраўніцтвам характар.

Форма рэгістрацыі ўсё ж такі пакідала магчымасьці для вялікай асабістай актыўнасьці, адкрываючы шлях у палітыку мэтанакіраваным кандыдатам. Так, напрыклад, кандыдаты,

[3] Советская Белоруссия. 1990. 27 января.

[4] Советская Белоруссия. 1990. 12 января.

якія не былі абраныя на канфэрэнцыі аднаго працоўнага калектыву, мелі шанец паспрабаваць у межах закону вылучыцца ў іншым. Так, Юры Хадыка, не абраны на аб'яднанай канфэрэнцыі прэзыдыюму Нацыянальнай акадэміі навук і Інстытуту гісторыі, быў вылучаны Інстытутам фізыкі.

Аналіз сацыяльна-прафэсійнага і пэрсанальнага складу вылучаных кандыдатаў паказвае, што барацьба за мандат не разглядалася як барацьба за ўладу. Дамінаваў "прадстаўнічы" матыў удзелу кандыдатаў. Вылучэньне разглядалася не як надзяленьне паўнамоцтвамі, а як ацэнка папярэдніх заслуг. Гэта пацьвярджалася і асаблівасьцямі канкурэнцыі, у якой адсутнічала супольная стратэгія нават з боку прадстаўнікоў партыйных і прамысловых установаў з мэтай перамогі. Аналіз вылучэньня кандыдатаў у Віцебскай вобласьці сьведчыць пра тое, што ў шэрагу акругаў вылучаліся кандыдаты, якія працавалі ў адной установе і нават былі зьвязаныя як кіраўнікі і падначаленыя. Так, па 170-й выбарчай акрузе адначасова балятаваліся першы і другі сакратар гаркаму партыі, па адной з акруг — сакратар райкаму партыі і адзін з загадчыкаў аддзелу таго ж самага райкаму, па 144-й акрузе — два кандыдаты ад райкаму партыі. Таксама шмат прыкладаў, калі ў адной акрузе вылучаліся прадстаўнікі ад аднаго прамысловага прадпрыемства. У шэрагу акругаў выступалі ў якасьці супернікаў партыйныя, камсамольскія і гаспадарчыя функцыянэры. Амаль ува ўсіх разгледжаных выпадках супернікі ад адной установы павінны былі спаборнічаць яшчэ зь некалькімі, у тым ліку альтэрнатыўнымі, кандыдатамі. Фактычна ўсё гэта пацьвярджала, што выбары нават кандыдатамі ўспрымаліся не як барацьба за ўладу, а як рытуал удзелу.

У выніку ў 310 акругах было вылучана 1680 кандыдатаў. Зь іх зарэгістраваны былі 1544. 88,5 % ад агульнай колькасьці кандыдатаў не былі раней дэпутатамі ВР БССР. На адзін мандат у сярэднім прэтэндавалі амаль 5 чалавек. Але ў шэрагу акругаў гэты лік даходзіў да 16. Толькі ў 20 акругах было вылучана па 1 кандыдату.

Паводле справаздачы ЦВК, адносна рэгістрацыі было пададзена 70 скаргаў, 24 зь якіх былі прызнаныя абгрунтаванымі. Большасьць зь іх датычылася адмоваў у рэгістрацыі, галоўнай прычынай якіх было непражываньне ў акрузе, дзе балятаваўся кандыдат (вынік супярэчлівасьці паміж вытворчым прынцыпам удзелу і тэрытарыяльным прынцыпам рэгістрацыі).

Фактычна, несфармаванасьць тэрытарыяльных традыцыяў прадстаўніцтва, замацаваная заканадаўствам і палітычнай практыкай выбараў 1990 г., склала падмурак для таго, каб, незалежна ад выкарыстоўванай рыторыкі (нацыянальнай, рэлігійнай ці інш.), патэнцыяльныя апазыцыйныя сілы пачалі фармавацца паводле сацыяльна-прафэсійнага прынцыпу, а потым зьвяртацца да электарату. Такая мадэль пакідала электарату пасіўную ролю, ролю ня ўдзельніка, а выбарніка-назіральніка. Гэта не спрыяла зьяўленьню масавых партыяў. Вынікам было аслабленьне патэнцыяльнай апазыцыі ўладзе.

Такім чынам, ужо першы этап кампаніі паказаў, што актыўнасьць беларускіх выбарнікаў нават на піку агульнасаюзнага ажыўленьня была пераважна арганізаваная зьверху і мела больш салідарныя, чым канкурэнтныя матывы. Салідарны матыў быў рысай паводзінаў ня толькі выбарнікаў, але і кандыдатаў.

## Асаблівасьці агітацыйнай кампаніі

Рытуальна-мабілізаваны характар удзелу, перавага прафэсійнага прадстаўніцтва над тэрытарыяльным і іх наступствы паглыбіліся падчас агітацыйнай кампаніі. Адной з прыкметаў рытуальнага ўдзелу былі “клюбы выбарнікаў”. Іх утварэньне адбылося яшчэ падчас рэгістрацыі. Мэтай дзейнасьці клюбаў было азнаямленьне грамадзянаў з выбарчым заканадаўствам і арганізацыя сустрэчаў з кандыдатамі. Клюбы існавалі ўва ўсіх раёнах Менску, абласных цэнтрах. Але аналіз апублікаваных у друку справаздачаў аб дзейнасьці клюбаў сьведчыць, што асноўнымі прадстаўленымі ў іх кандыдатамі былі партыйныя функцыянэры.

Стварэньне ўмоваў для вылучэньня ня значыла роўных умоваў для агітацыі. Большасьць з кандыдатаў фактычна ня мелі рэальнай магчымасьці дайсьці да электарату. Партыйная сыстэма знаходзілася ў стадыі фармаваньня. Палітычныя рухі ня мелі сталага прадстаўніцтва ў падкантрольным уладзе друку. Незалежныя мэдыі пакуль не былі створаныя. Закон дазваляў вылучаць кандыдатаў нават ад невялікіх працоўных калектываў, якія, зразумела, не маглі быць рэсурсам пры агітацыі.

Доступ нефармальных сілаў да мэдыяў быў хутчэй сымбалічны, чым сапраўдны. Удзел З. Пазьняка ў перадачы “Крок” і публікацыя яго некалькіх артыкулаў у друку былі выключэньнем, якое падкрэсьлівае правіла. Нэгатыўная рэакцыя на іх у друку паводле памераў этэрнага часу і газэтных палосаў была значна большая за самі выступы. Колькасьць давераных асобаў кандыдатаў абмяжоўвалася лікам у 5 чалавек. Такім чынам, праблема агітацыі станавілася праблемай самога кандыдата і выбарчых камісіяў. У выніку агітацыйная кампанія адбывалася ў традыцыях савецкага гандлю. Закон прадугледжваў правы для ўсіх кандыдатаў. Але фактычныя магчымасьці зьвярнуцца да выбарнікаў залежалі ад статусу і асабістых сувязяў. Няроўнасьць паглыблялася распаўсюджаным у савецкія часы інстытутам кланавасьці і знаёмства, які, дарэчы, таксама меў вытворча-прафэсійны характар.

У залежнасьці ад магчымасьцяў правядзеньня агітацыйнай кампаніі і яе стылю вызначыліся тры групы кандыдатаў: 1) высокія дзяржаўныя функцыянэры; 2) кіраўнікі; 3) простыя грамадзяне.

Першая група мела найбольшыя магчымасьці агітацыі. Фактычна, яе прадстаўнікам агітацыя была непатрэбная. Яе складалі прадстаўнікі ад улады, кандыдаты, што займалі пасады ў цэнтральных і рэгіянальных партыйных і адміністрацыйных установах. Рэгулярная прысутнасьць у друку, магчымасьць, выкарыстоўваючы службовыя пасады, езьдзіць па краіне і арганізоўваць сходы давала ім найбольшыя шанцы. Але гэтая няроўнасьць разглядалася ў якасьці нармальнай. У некаторых абласьцях разгараліся спаборніцтвы паміж калектывамі за вылучэньне функцыянэраў абласнога ўзроўню. Фактычна, прадстаўнікоў гэтай групы можна было лічыць абранымі да выбараў. Толькі найбольш адыёзныя зь іх маглі не прайсьці.

Магчымасьці агітацыі наступнай групы былі не такія вялікія. Да яе адносіліся прадстаўнікі прамысловай і сельскагаспадарчай эліты, кіраўнікі дзяржаўных установаў. Акрамя сродкаў дзяржавы, іх перадвыбарным рэсурсам былі службовыя магчымасьці, інстытут знаёмства. Яны маглі дазволіць сабе “бясплатную” сустрэчу з выбарнікамі вялікага прадпрыем-

ства, якое ўзначальвалі ці з кіраўніцтвам якога мелі сувязі, дарма што іх права так дзейнічаць ня ўсімі разглядалася як законнае. (Існуюць зьвесткі пра абурэньне выкарыстаньнем службовых пасадаў кіраўнікамі (гл.: Звязда. 1990. 21 лютага), але раздражненьне выкарыстаньнем службовага становішча палітычнай элітай калі і існавала, то праходзіла больш незаўважна.)

У найгоршым становішчы паводле магчымасьцяў агітацыі знаходзілася трэцяя група кандыдатаў, у якую ўваходзілі працоўныя, інтэлігенцыя і да т. п. На кампанію яны маглі патраціць толькі сродкі выбаркамаў. Менавіта прадстаўнікі гэтай групы складалі аснову кандыдатаў ад нефармальных рухаў. У кандыдатаў "не ад улады" не было магчымасьці быць пачутымі. Трэба было ці скарыцца з гэтым (гэта адсеяла шэраг кандыдатаў, пераважна слабаматываваных ува ўдзеле ў выбарах), ці шукаць нейкую форму актыўнасьці, якая дазволіла б данесьці заклікі да значнай колькасьці выбарнікаў. Такой формай агітацыі стаў "неканвэнцыянальны" палітычны ўдзел. Менавіта першыя парлямэнцкія выбары заклалі асновы ілюзіі выніковасьці "мітынговай пратэстнай дэмакратыі", што захоўвае сваю моц дагэтуль.

Палітолягі, разглядаючы асаблівасьці разьвіцьця грамадзянскай палітычнай культуры, адзначаюць, што, сярод іншых чыньнікаў, асновай яе існаваньня ёсьць аднолькавасьць сацыялізацыі эліты і масаў, аднастайнае разуменьне таго, як адбываецца перадача ўлады і што бывае зь неэфэктыўнай элітай. Сацыялізацыя савецкіх грамадзянаў і эліты таксама адбывалася ў межах адной мадэлі. Іх аб'ядноўвала ідэя важнасьці палітычнага ўдзелу. Палітычнае дзеяньне для савецкага чалавека — гэта, перш за ўсё, калектыўнае дзеяньне на дэманстрацыі, мітынгу, шэсьці. Для прадстаўнікоў некіраўнічых колаў мітынгі і шэсьці былі амаль адзінай формай палітычнага ўдзелу.

Для ўладнай эліты на працягу савецкіх часоў масавы ўдзел быў адначасова і формай, і сродкам легітымацыі. Закладзеная ў сьвядомасьць значнасьць удзелу падкрэсьлівалася і маскоўскім цэнтрам, які дэкляраваў прынцыпы галоснасьці, усеагульнага прадстаўніцтва, абавязваючы эліту дзейнічаць у гэтым кірунку. Забараніць мітынг на пачатку 1990-х гг. значыла парушыць ня толькі прынцып існаваньня сыстэмы, але і загад цэнтру.

У выніку, выбарчая кампанія праходзіла на фоне агульнасаюзнага масавага неканвэнцыянальнага ўдзелу. Асноўнай формай перадвыбарнай камунікацыі нефармальных кандыдатаў стала праграма "ад дзьвярэй да дзьвярэй" і мітынгі, якія на працягу тэрміну агітацыі адбываліся амаль штотыднёва ў Менску, у абласных і шэрагу раённых цэнтраў (Ліда, Смаргонь, Іўе, Бабруйск, Жабінка, Белаазерск і інш.).

Галоўнымі арганізатарамі масавых (10 і 25 лютага) мерапрыемстваў былі нефармальныя сілы, у першую чаргу БНФ. Амаль усе мітынгі былі масавымі. Так, 25 лютага толькі паводле афіцыйных зьвестак сабралася 12–15 тысяч чалавек, арганізатары называлі лік 100 тысяч. Спэктар пытаньняў быў дастаткова шырокі: ад пратэсту супраць несумленнай дзейнасьці Цэнтравыбаркаму, супраць эканамічнай палітыкі ўраду да барацьбы з наступствамі ЧАЭС, патрабаваньняў ліквідацыі КПСС.

Партыйная эліта, сацыялізаваная ў той самай мадэлі, амаль не супрацьдзейнічала. У мітынгах бралі ўдзел прадстаўнікі цэнтральнай (у Менску) ці рэгіянальнай партыйнай эліты, якія выходзілі "супакойваць народ". І, нягледзячы на нэгатыўную рэакцыю ўдзельнікаў, яны рабілі прамовы.

Шэраг мітынгаў меў палітычныя наступствы, паводле іх вынікаў уладамі былі прынятыя палітычныя рашэньні. Так, напрыклад, Магілёўскі абкам КПБ у адказ на пагрозу мітынгоў-

цаў распачаць палітычны страйк, калі ня будзе скліканая сэсія абласной Рады народных дэпутатаў, вымушаны быў сабраць яе і абмеркаваць узьнятыя мітынгоўцамі праблемы, але на дзень пазьней заяўленага на мітынгу тэрміну.

Дазвол мітынгаў сумяшчаўся зь іх масіраваным нэгатыўным абмеркаваньнем з боку СМІ. Вынікам стала легітымізацыя такога сродку палітычнага ўдзелу, як масавая нэгатыўная падтрымка (г. зн. падтрымка выступленьняў “супраць” чагосьці), ілюзія яе выніковасьці. Улічваючы, што гэта былі фактычна першыя крокі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху (у БССР не існавала моцнага дысыдэнцкага руху), выбар нефармальнымі арганізацыямі пераважна пратэстнага спосабу палітычнай камунікацыі і адсутнасьць захадаў для наладжваньня кантактаў з кіраўнічай элітай былі заканамерныя.

Улада таксама была не зацікаўленая ў сувязях зь нефармаламі. З адзначаных намі вышэй прычын падзеі масавага пратэсту не былі выкарыстаныя прадстаўнікамі мясцовых элітаў, каб паспрабаваць захапіць рэспубліканскія кіраўнічыя пасады (як гэта адбылося, напрыклад, у Расеі і ўва Ўкраіне). Насупраць, на шэрагу мітынгаў (напрыклад у Магілёве) ставіліся пытаньні аб даверы мясцовым парткамам.

Сумяшчэньне халісцкага разуменьня грамадзтва з двудушнай пазыцыяй улады, якая ўдзень сваім удзелам надавала мітынгам праваномерны характар, а ўвечары выступала супраць іх у СМІ, стала прычынай супярэчлівай рэакцыі грамадзтва. Як мы ўжо адзначылі, нацыянальная і рэлігійная гамагеннасьць БССР не стварала ўмоваў для крызысу інтэграцыі. Абыякавасьць большай часткі грамадзтва да нацыянальных каштоўнасьцяў фармавала фон нацыянальна-дэмакратычнага супраціву і мела вынікам падзел грамадзтва на тых, хто мітынгуе, і тых, хто назірае, і пераважна назірае зь непаразуменьнем. (Вынікі прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. паказваюць значнасьць больш зразумелых для электарату матэрыяльных падзелаў (на карумпаваную ўладу і бедны народ).) Вынікам стала складаньне на пачатку зараджэньня незалежнай краіны традыцыяў хутчэй палітычнага назіраньня (пасіўнай падтрымкі), чым палітычнага ўдзелу (актыўнай падтрымкі). Другім вынікам стаў недавер агітацыі з боку афіцыйных СМІ (гэта адлюстравалася, напрыклад, падчас першых прэзыдэнцкіх выбараў у выглядзе фэномэну нэгатыўнай адаптацыі).

## Галасаваньне і вынікі выбараў

У выбарах у ВР БССР, якія адбыліся 4 сакавіка 1990 г., узялі ўдзел 87 % выбарнікаў. Найбольшы ўзровень абсэнтэізму адзначаны ў палітычна актыўным (паводле колькасьці мітынгаў і іх удзельнікаў) Менску, дзе ў выбарах узялі ўдзел 75,3 % выбарнікаў. Найменшы — у Менскай і Берасьцейскай абласьцях, дзе назіралася максымальная яўка, адпаведна 92,6 % і 90,5 %.

Паводле вынікаў першага туру выбараў дэпутатамі былі абраныя 98 чалавек. 45 кандыдатаў былі абраныя ад грамадзкіх аб’яднаньняў да пачатку выбараў. Склад кандыдатаў ад грамадзкіх аб’яднаньняў ня выявіў электаральных прэфэрэнцый большасьці выбарнікаў (хоць і паўплываў на падзеі ў парлямэнце), таму мы спынімся на аналізе складу кандыдатаў, абраных ад тэрытарыяльных выбарчых акругаў. У 194 акругах кандыдаты не былі абраныя. Меліся праводзіцца паўторныя выбары. У 18 акругах, дзе балятаваліся 1-2 кандыдаты, ніводны не набраў неабходнай для перамогі колькасьці галасоў. Гэта значыла, што выбары ў гэтых акругах не адбыліся.

Паводле вынікаў першых двух тураў былі запоўнены 288 з 360 месцаў у парлямэнце, астатнія дэпутаты павінны былі быць даабраныя падчас давыбараў, якія адбываліся 22, 28 красавіка, 5, 11—13 траўня 1990 г. Аднак падмурак для палітычнай інтрыгі, якая разгортвалася ў парлямэнце, быў закладзены менавіта па выніках першых двух тураў, якія вызначылі расстаноўку сілаў.

З 98 дэпутатаў, якія прайшлі ў першым туры, 34 дэпутаты займалі высокія пасады ў партыйных установах. Пераважную большасьць зь іх складалі першыя сакратары раённых ці абласных камітэтаў партыі. Асноўная маса партыйных функцыянэраў ішла ад раённых партыйных арганізацыяў.

Адміністрацыйная эліта значна адставала ад партыйнай, ад яе было абрана 23 дэпутаты. Аднак разам кандыдаты ад старой улады складалі больш за палову дэпутатаў, абраных у першым туры.

Сярод кіраўнічай групы дэпутатаў — старшыняў калгасаў і прадпрыемстваў — назіраецца ўстойлівая перавага старшыняў калгасаў: 11 супраць 3. Амаль усе яны выбіраліся ў акругах, што супадалі зь месцам знаходжаньня прадпрыемства. Тая ж самая тэндэнцыя характэрная і для дэпутатаў, якія ачольвалі ўстановы, ня зьвязаныя з вытворчасьцю.

Фактычна вынікі першага туру былі адбіткам дзейнасьці адзначаных намі мадэляў перадвыбарнай агітацыі, у якой найбольшы посьпех мелі кандыдаты, што выкарыстоўвалі свой палітычны статус і службовае становішча. Найменшую выніковасьць паказаў камунікацыйны стыль агітацыі. Так, у першым туры перамаглі толькі 7 кандыдатаў, якіх можна было адзначыць як прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Толькі 2 зь іх (З. Пазьняк і С. Навумчык) мелі магчымасьці праводзіць узьдзеяньне праз пратэстную мабілізацыю, 4 займалі пасады, што дазвалялі мець вядомасьць задоўга да выбарчай кампаніі (2 дацэнты ВНУ, кіраўнік Штабу грамадзянскай абароны райцэнтру, супрацоўнік газэты).

Нягледзячы на пратэстную рыторыку падчас выбараў, выніковасьць стратэгіяў кандыдатаў-функцыянэраў сьведчыла пра наяўнасьць ува ўлады магчымасьцяў, рэсурсаў і матывацыі для ўзнаўленьня, нават пры зьмене правілаў адбору функцыянэраў. Але выбары ў ВР БССР паказалі наяўнасьць рознай матываванасьці атрымаць прадстаўнічую ўладу ў рэгіянальных групах кіраўнічай эліты. Параўнаньне складу кіраўнікоў, абраных у першым туры, паказвае, што найбольшая каардынацыя стратэгіяў назіралася сярод абласной эліты Магілёўскай вобласьці. Ад яе ў парлямэнт прайшла найбольшая колькасьць (5 чалавек) прадстаўнікоў абласной партыйнай (3) і адміністрацыйнай эліты. У асноўным гэта былі функцыянэры першых пазыцыяў (першы сакратар, сакратары, старшыня аблвыканкаму). Ня менш высокім было прадстаўніцтва і ад раёнаў Магілёўскай вобласьці (4 функцыянэры ад раённай, 1 — ад гарадзкой партыйнай эліты і 1 — ад раённай адміністрацыйнай). У астатніх рэгіёнах выніковасьць абласной эліты не перавышае 2 (Менская вобласьць) — 4 (Гомельская вобласьць) абласных функцыянэраў. Аднак у колькасна параўнальным (паводле колькасьці дэпутатаў-функцыянэраў) з Магілёвам Гомелі значную частку дэпутатаў складалі функцыянэры другога пляну: 2 намесьнікі старшыні аблвыканкаму і сакратар абкаму, загадчык аддзелу. Гомельская вобласьць была таксама найбольш пасьпяховай паводле колькасьці дэпутатаў ад райкамаў і райвыканкамаў, але значная іх частка прадстаўляла раёны, пацярпелыя ад аварыі на ЧАЭС, дзе экалягічныя і эканамічныя праблемы павышалі для насельніцтва значнасьць мясцовай улады. У Берасьцейскай, Віцебскай, Менскай абласьцях выніковай пры змаганьні за мандаты аказа-

лася толькі абласная адміністрацыйная эліта. Найменшую выніковасьць па прасоўваньні партыйнай і адміністрацыйнай эліты прадэманстравалі Менск і Менская вобласьць. У Менску ў першым туры былі абраныя толькі па 2 прадстаўнікі ад абласной адміністрацыйнай і гарадзкой партыйнай эліты, 1 — ад раённай. Гэта найменшы паказьнік у першым туры сярод абласьцей і паводле выніковасьці, і паводле каардынацыі пазыцыяў. З 6 абраных у першым туры функцыянэраў цэнтральных менскіх партыйных і адміністрацыйных установаў улады ніводны не выбіраўся ў Менскім рэгіёне. Наогул, у Менску і Менскай вобласьці паводле вынікаў першага туру адзначалася найменшая колькасьць абраных дэпутатаў.

Такім чынам, пратэстная мабілізацыя ў сталіцы мела вынікам ня столькі абраньне супрацьуладных кандыдатаў, колькі больш скептычнае стаўленьне да астатніх, якія перашкодзілі абраньню функцыянэраў у першым туры. Фактычна, магчымасьць масавай няяўкі выбарнікаў на парлямэнцкія выбары 1995 г. і фактары абсэнтэізму можна было прагназаваць ужо паводле вынікаў 1990 г.

Другі тур сьведчыў пра большую канкурэнтнасьць у параўнаньні зь першым. У другім туры быў абраны 131 дэпутат. Пераважную колькасьць тут складалі тыя, хто не займаў пасадаў у дзяржаўных уладных установах. У другім туры ў парлямэнт прайшло толькі па 17 прадстаўнікоў партыйнай і адміністрацыйнай эліты, у тым ліку толькі 4 функцыянэры абласнога ўзроўню.

“Пасьпяховая” ў першым туры Магілёўская вобласьць дэманструе адваротную тэндэнцыю: у другім туры ад яе прайшлі ў парлямэнт толькі 1 абласны функцыянэр (намесьнік старшыні аблвыканкаму), 1 старшыня гарвыканкаму і ніводнага кандыдата ад раённых партыйных і дзяржаўных установаў. У астатніх абласьцях прайшло ад 3 (Гарадзенская вобласьць) да 5 (Менск) функцыянэраў раённага і гарадзкога ўзроўню. Разам з гэтым у другім (больш канкурэнтным) туры па Магілёўскай вобласьці адзначылася і найменшая колькасьць выбраных іншых кандыдатаў (пераважна кіраўнікоў прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў). У параўнаньні з выніковым першым турам такі расклад у Магілёўскай вобласьці можа сьведчыць толькі пра спалучэньне ляяльнасьці электарату з большай (у параўнаньні зь іншымі абласьцямі) дысцыплінаванасьцю абласной і раённай партыйна-гаспадарчай эліты.

Найбольшае прадстаўніцтва функцыянэраў пасьля другога туру адзначалася ў Менску (5), Гомельскай (5) і Віцебскай (6) абласьцях. Але ў гэтых выпадках цяжка казаць пра скаардынаванасьць іх дзейнасьці. Ува ўсіх адзначаных рэгіёнах былі роўна прысутныя і партыйныя, і адміністрацыйныя эліты, але іх статус не перавышаў раённага ўзроўню. Найбольшую вагу атрымалі прадстаўнікі ад інтэлігенцыі (усяго 43 дэпутаты, у тым ліку 23 — кіраўнікі невытворчых бюджэтных установаў) і працоўныя (17 дэпутатаў). Паводле колькасьці гэтых дэпутатаў не ад улады лідэрам быў Менск, дзе ў другім туры была абрана і найбольшая колькасьць дэпутатаў (27 чалавек). Больш за тое, аналіз наступнай дзейнасьці парлямэнту паказвае, што менавіта дэпутаты-менчукі ад гэтых груповак, абраныя ў другім туры, фігуравалі ў якасьці ўдзельнікаў ініцыятываў супраць цэнтралізацыі ўлады з боку прэзыдэнта ў канцы 1994 — пачатку 1995 г.

Паводле вынікаў другога туру сярод дэпутатаў найменш былі прадстаўленыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя кіраўнікі. Ува ўмовах эканамічнага крызысу краіны зь пераважна перапрацоўчай прамысловасьцю найменш зацікаўленыя ў палітычным удзеле былі

кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў (10 дэпутатаў), якія, як і ў першым туры, істотна адставалі ад сваіх калег, што ўзначальвалі сельскагаспадарчыя ўстановы (18 дэпутатаў). Існуе думка пра ўплыў на разьмеркаваньне мандатаў паміж прамысловым і сельскагаспадарчым кіраўніцтвам пратэстных настрояў, выкліканых наяўнасьцю нефармальных арганізацыяў у невялікіх гарадох, але посьпех партыйных і адміністрацыйных функцыянэраў менавіта ў больш прамысловых усходніх абласьцях (Магілёўскай, Гомельскай) указвае на слабую зацікаўленасьць прамыслоўцаў ува ўладзе, на што паўплывала шмат фактараў, ад эканамічнага становішча краіны і да ранейшага палітычнага лёсу асобных прамысловых кіраўнікоў.

Большасьць з "прамыслоўцаў" ачольвала аб'екты, чыя дзейнасьць мелася забясьпечваць сельскую гаспадарку. Прысутнасьць у парлямэнце кіраўніцтва прадпрыемстваў рэспубліканскага значэньня (напрыклад Дзьмітрыя Сыраквашы, кіраўніка БелАЗу) была хутчэй выключэньнем, чым правілам.

Давыбары, якія адбыліся ў канцы красавіка — пачатку траўня 1990 г., яшчэ больш замацавалі тэндэнцыі, што склаліся на пачатку кампаніі. Пераважная большасьць абраных у гэтую пару дэпутатаў былі прадстаўнікі выканкамаў і сілавых структураў, што замацавала кіраўнічы склад парлямэнту.

***

Такім чынам, асаблівасьці палітычнага ўдзелу грамадзянаў і адсутнасьць палітычнай зацікаўленасьці сярод эканамічна ўплывовых групаў стварыла пераважна функцыянэрскі парлямэнт, у якім таксама, як і ў грамадзтве, фармаваньне фракцыяў магло адбывацца пераважна паводле статуснага прынцыпу, у залежнасьці ад займанай пасады. Альтэрнатыўныя ж сілы, нягледзячы на свае камунікацыйныя магчымасьці прыцягнуць увагу да праблемаў краіны, былі занадта невялікія колькасьцю і лякалізаваныя ў сталіцы. Таму яны не маглі ні ўплываць на ход палітычных працэсаў (зь першай прычыны), ні прыцягнуць на свой бок прадстаўнікоў рэгіянальнай улады (з другой).

## МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ

## 1990 году

Выбары 1990 году як бы знаходзяцца на мяжы часоў: яны адбыліся ў савецкую эпоху, але вызначальна паўплывалі на эпоху сёньняшнюю. Гэта былі апошнія выбары, якія праводзіліся ў БССР, аднак дэпутаты, абраныя на гэтых выбарах, сталі першымі дэпутатамі мясцовых Радаў незалежнай Беларусі. Іх вынікі вызначылі форму мясцовай улады ў краіне. Акурат на легісьлятуру дэпутатаў мясцовых Радаў 1990 году абраньня выпаў найбольш актыўны пэрыяд фармаваньня і разьвіцьця мясцовай улады. Выбары 1990 году можна назваць выбарамі нумар нуль. Гэта яшчэ ня першыя выбары незалежнай Беларусі, але якраз зь іх пачынаецца гісторыя мясцовых выбараў. На іх абралі першыя мясцовыя Рады, пракамуністычныя ў сваім складзе. У выніку мясцовая ўлада сустрэла абвяшчэньне незалежнасьці, калі 67,4% ад агуль-

най колькасьці «мясцовых» дэпутатаў складалі сябры КПСС і УЛКСМ. Найбольш камуністаў і камсамольцаў было ў абласных Радах.

Традыцыі палітычнага прадстаўніцтва пачалі фармавацца з наступных выбараў — 1995 году.

## Мясцовыя выбары 1995 году

Выбары ў мясцовыя Рады, якія адбыліся ў чэрвені 1995 году, вылучаліся трыма характэрнымі рысамі.

Па-першае, гэтыя выбары пабілі ўсе рэкорды палітычнага абсэнтэізму: на выбарчыя ўчасткі прыйшла найменшая колькасьць выбарцаў за ўсю гісторыю правядзеньня выбараў у Беларусі.

Па-другое, гэта былі першыя і апошнія выбары, над якімі не ажыцьцяўлялася мэтанакіраванага, санкцыянаванага згары кантролю з боку выканаўчай улады, як на этапе вылучэньня кандыдатаў, так і на этапе галасаваньня. Дарма што вэртыкаль выканаўчай улады ўжо пачала фармавацца, яна яшчэ не была настолькі моцнай, каб ажыцьцявіць кантроль над Радамі.

Па-трэцяе, гэта былі, так бы мовіць, «партыйныя» мясцовыя выбары. Да 1995 году ў Беларусі склалася партыйная сыстэма, а таксама, да пэўнай ступені, сфармаваліся партыйныя прэфэрэнцыі насельніцтва. Партыі мелі магчымасьць больш-менш свабодна і актыўна змагацца за пазыцыі ў мясцовай уладзе, а грамадзтва — выказваць свае сымпатыі да іх.

Прааналізуем гэтыя чыньнікі і іх уплыў на ход, вынікі выбараў, а таксама стаўленьне грамадзтва да мясцовай улады.

Першая палова 1995 году была вельмі багатай на палітычныя падзеі. Не прайшло і году пасьля першых прэзыдэнцкіх выбараў, як у краіне пачала фармавацца цэнтралізаваная сыстэма выканаўчай улады. Была сфармаваная і прызначаная прэзыдэнцкая вэртыкаль. Праводзіліся першыя апэрацыі па намэнклятурнай прыватызацыі дзяржаўнай маёмасьці (напрыклад, «Гандлёвага дому на Нямізе»). Пачалося супрацьстаяньне прэзыдэнта і парлямэнту. Адбыліся выбары ў Вярхоўную Раду. Прайшла першая інфармацыйная кампанія, якая канвэртавала інфармацыйны ўплыў у функцыянальную цэнтралізаваную ўладу — рэфэрэндум 1995 году.

За адносна кароткі пэрыяд напачатку 1995 году грамадзяне Беларусі прайшлі праз напружаны палітычны марафон, цягам якога ажыцьцяўлялася мэтанакіраваная апрацоўка грамадзкай сьвядомасьці ў шмат якіх, часта супрацьлеглых кірунках. Барацьба вакол усталяваньня выканаўчай «вэртыкалі», парлямэнцкія выбары, рэфэрэндум — кожная з палітычных кампаній інакш расстаўляла дачыненьні паміж палітычнымі актарамі. На ўсе гэтыя падзеі грамадзкая думка павінна была неяк рэагаваць, але для грамадзтва, у якім яшчэ нядаўна існавала толькі адна правільная для ўсіх палітычная пазыцыя, арыентавацца ў такіх умовах было надзвычай складана.

Афіцыйная ўлада выявіла болевыя кропкі грамадзтва яшчэ падчас прэзыдэнцкіх выбараў, асноўным лёзунгам якіх была барацьба «добрага» кандыдата ў прэзыдэнты з «благімі» карупцыянэрамі. Складаны, дынамічна зьменлівы і таму незразумелы расклад палітычных сілаў у пачатку 1995 году таксама можна было прадставіць шляхам простага супрацьпастаўленьня «добрых» грамадзян на чале з прэзыдэнтам і «благіх» палітыкаў, як ува ўладзе, так і па-за

ёй. Такая тэхналёгія дазволіла аб'яднаць грамадзтва і ў значнай ступені маніпуляваць ім, але зрабіла яго апалітычным, нават антыпалітычным*.

За два тыдні да даты мясцовых выбараў адбыўся другі тур парлямэнцкіх, які прадэманстраваў апалітычнасьць насельніцтва: Вярхоўная Рада не была абраная, першы тур выбараў не дазволіў сфармаваць кворуму. Палітычны энтузіязм пачатку 90-х быў нэўтралізаваны чорным піярам 1995-га. Такім чынам, першыя свабодныя выбары адначасова аказаліся і першымі антыпалітычнымі. Наагул, электаральныя кампаніі 1995 году былі ня столькі кампаніямі для адбору прадстаўнікоў ува ўладу на ўсіх узроўнях, колькі кампаніямі асваеньня галоўнага рэсурсу фармаванай аўтарытарнай улады, які яна выкарыстоўвае дагэтуль, — рэсурсу апалітычнасьці насельніцтва, яго дыстанцыянаваньня ня толькі ад улады, але і ад палітыкі. У такіх умовах мясцовыя выбары сталі чымсьці накшталт тэсту на антыпалітычнасьць, прычым тэстам ня толькі для насельніцтва, але і для кандыдатаў на пасады ў Радах.

Мясцовыя выбары былі апошнім крокам палітычнага маратону вясны 1995 году. І таму нядзіўна, што на гэты крок засталося мала сілаў і жаданьня — зрабілі яго найбольш палітычна актыўныя грамадзяне.

СМІ, як цэнтральныя, так і мясцовыя, цягам усёй вясны — пачатку лета 1995 году былі занятыя «глябальнымі» праблемамі — выбарамі ў парлямэнт, рэфэрэндумам — і амаль што пакінулі без увагі выбары мясцовай улады. Адзінай формай рэакцыі на выбары ў СМІ сталі надрукаваныя сьпісы выбарчых камісіяў і зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Радаў.

Да таго ж выбары 1995 году праводзіліся ў нядзелю і ў дачны сэзон — час, які гараджане пераважна праводзяць за горадам, далёка ад выбарчых участкаў. На гэты дзень таксама прыпала каталіцкае сьвята Сьвятой Тройцы. Так, мясцовыя ўлады Віцебскай вобласьці, на захадзе якой жыве многа каталікоў, былі вымушаныя нават зьвяртацца да біскупа Віцебскага і Аршанскага Дзьмітрыя, каб той заклікаў выбарцаў выканаць свае грамадзянскія абавязкі.

За два дні ў цэнтральнай прэсе зьявіліся артыкулы зь перасьцярогай не забыцца на выбары. Але на іх усё роўна забыліся.

Праблемы пачаліся на этапе фармаваньня выбарчых камісіяў. Ува ўмовах палітычнага маратону ў шэрагу рэгіёнаў выбарчых камісіяў проста не сфармавалі. Вылучэньня кандыдатаў у склад выбарчых камісіяў не было, таму іх чальцы даведаліся пра свой удзел толькі з газэтаў.

З актыўнасьцю кандыдатаў у дэпутаты праблемаў не было. На 6698 месцаў у Радах рознага ўзроўню прэтэндавала 35 тысяч дэпутатаў — у сярэднім 5 чалавек на месца. Значная колькасьць ахвочых тлумачыцца ня толькі прывабнасьцю мясцовай улады. Пэўная колькасьць кандыдатаў вылучала свае кандыдатуры ў мясцовыя Рады пасьля паразы на выбарах у ВР,

* Рыторыка, выкарыстаная падчас інфармацыйнай падрыхтоўкі да рэфэрэндуму 1995 году, дазваляе зрабіць выснову, што грамадзтва прагаласавала ня толькі «за» прапановы прэзыдэнта, але наагул «супраць» палітыкаў і палітыкі, якая стала зусім непадобнай да зразумелага чорна-белага палітычнага сьвету савецкіх часоў. Антыпалітычнасьць асноўнай часткі грамадзтва адгэнуль стала атрыбутам беларускай палітыкі і найбольш моцным рэсурсам кіраўнічай эліты. Вынікі апытаньня, праведзенага НІСЭПД улетку 1995 году, паказалі, што палітычныя праблемы стаяць амаль на апошнім месцы сярод пытаньняў, якія цікавяць беларусаў. Калі эканамічныя праблемы, напрыклад нястача прадуктаў харчаваньня, былі значнымі для 64,3% насельніцтва, 53,4% хвалявалася наконт экалёгіі свайго асяродзьдзя, то палітычныя праблемы, напрыклад, усталяваньне дыктатуры, былі значнымі толькі для 25,3%.

якія кагадзе скончыліся. Так, напрыклад, у Віцебскую гарадзкую Раду з 234 кандыдатаў ішло 27 чалавек, што прайгралі на выбарах у ВР. У Гомельскай абласной Радзе такіх было 20 кандыдатаў. Для пэўнай колькасьці кандыдатаў дэпутацкая пасада мела ня столькі прадстаўнічы, функцыянальны, колькі статусны сэнс.

Прагаласаваць у першым туры мясцовых выбараў на выбарчыя ўчасткі краіны прыйшло 48,1% ад агульнай колькасьці выбарцаў. (Па законе лічылася, што выбары адбыліся, калі на іх прыйшло больш за 50% выбарцаў.) Акрамя апалітычнасьці грамадзян, гэты вынік дазваляе меркаваць аб неаднолькавай значнасьці і моцы Радаў розных узроўняў у розных рэгіёнах.

У бальшыні абласьцей агульны ўзровень удзелу ў першым туры выбараў вагаўся між 49,8% (у Гарадзенскай вобласьці) і 57,9% (у Менскай вобласьці — максымальны паказьнік у краіне). У Віцебскай вобласьці на выбары прыйшло 53,3% выбарцаў, Магілёўскай — 53%, Гомельскай — 57,4%, Берасьцейскай — 51,1%. У Менску ж на выбарчыя ўчасткі прыйшло 18,9% грамадзян. Сярод абласьцей назіралася адносна роўнае разьмеркаваньне ўзроўню яўкі на выбары. Але ўсё ж трэба адзначыць, што ў заходніх рэгіёнах, дзе колькасьць прыватных гаспадарак ня толькі ў горадзе, але і ў сельскай мясцовасьці большая, чым на ўсходзе, на выбары прыйшло менш выбарцаў. Найбольшы адсотак назіраўся ў рэгіёнах, дзе пераважае дзяржаўная прамысловая і сельскагаспадарчая маёмасьць — у Гомельскай і Менскай абласьцях, ня лічачы Менску.

Але больш няроўнае разьмеркаваньне ўзроўню актыўнасьці назіралася не паміж рэгіёнамі, а паміж Радамі рознага ўзроўню. У выніку першага туру было абрана 94,7% дэпутатаў сельскіх Радаў, 73,2% пасялковых, 48,5% гарадзкіх у гарадох раённага падпарадкаваньня, 17,5% раённых у гарадох, 29,5% гарадзкіх, 8,5% раённых, 44% абласных Радаў. У Менску выбары не адбыліся ў ніводнай акрузе. Асноўную масу ўчасткаў, дзе выбары адбыліся і былі абраныя дэпутаты, складалі сельскія і пасялковыя Рады.

Спалучэньне высокага ўзроўню абіральнасьці дэпутатаў у пасялковыя і сельскія Рады, сярэдняга ўзроўню — у абласныя і надта нізкага — у гарадзкія паказвае, што прычынай гэтага было ня нейкае благое стаўленьне электарату да Радаў базавага ўзроўню, а іншыя чыньнікі. Гэтая тэндэнцыя, а таксама надзвычай няроўнае разьмеркаваньне яўкі на выбарчых участках (вялікі разрыў паміж гарадамі і вёскай) выразна паказваюць на ўжываньне адміністрацыйнага рэсурсу з боку арганізатараў выбараў. Ініцыятыва яго ўжываньня на выбарах 1995 году выходзіла не ад цэнтру, а з рэгіёнаў. Менавіта мясцовая эканамічная і палітычная эліта была зацікаўленая ў атрыманьні месцаў у Радах.

Тое, што адміністрацыйны рэсурс быў выкарыстаны па ініцыятыве мясцовых уладаў (і што пра сумленнасьць выбарцаў і іх павагу да мясцовай улады ў вёсцы гаварыць не даводзіцца), паказваюць таксама выняткі з правілаў — выбары ў гарадзкіх акругах.

Так, у Віцебску з 45 гарадзкіх акругаў выбары адбыліся толькі ў адной. Асноўная маса насельніцтва гэтай акругі складалася з работнікаў аб’яднаньня «Даламіт», а кандыдатам, абраным на выбарах, стаў начальнік цэху гэтага аб’яднаньня. У Гомелі бальшыня акругаў, дзе адбыліся выбары, знаходзілася ў Савецкім раёне. Акурат у ім былі «заваленыя» выбары ў ВР, што вымусіла мясцовую адміністрацыю выправіць сытуацыю на мясцовых выбарах.

Прычыны прэтэнзіяў мясцовага дырэктарату на месцы ў Радах зразумелыя. На працягу існаваньня рэжыму Лукашэнкі па краіне пракацілася некалькі хваляў «паляваньняў на карупцыянэраў». На канец 1994 — пачатак 1995 году прыпала адна зь іх. Ахвярамі «паляваньняў

ня» ў гэты час былі перадусім бізнэсоўцы. Не сакрэт, што значная колькасьць тадышніх бізнэс-структураў ці была арганізаваная мясцовым дырэктаратам, ці разьмяшчалася на плошчах дзяржаўных установаў, што вельмі часта выкарыстоўваліся «нямэтава». На гэты час артыкулы закону «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні», якія забясьпечвалі дэпутатам недатыкальнасьць, яшчэ не былі скасаваныя. Таму для прадстаўнікоў мясцовага дырэктарату атрыманьне месца ў Радзе любога ўзроўню гарантавала асабістую бясьпеку ў выпадку перасьледу і спакушала іх напоўніцу выкарыстоўваць свае магчымасьці для іх здабыцьця. Асноўным рэсурсам гэтай сацыяльнай групоўкі быў яе ўплыў на сваіх падначаленых, г.зн. адміністрацыйны ўплыў.

Першыя свабодныя выбары прадэманстравалі малы інтарэс грамадзтва да мясцовых прадстаўнічых органаў улады. Але яны выявілі вагар, паслугуючыся якім цэнтральная ўлада магла пераадолець гэтую малую зацікаўленасьць і адначасова кантраляваць актыўнасьць выбарцаў і іх волевыяўленьне. Ім стала прыналежнасьць выбарцаў да вытворча-эканамічных адзінак, г.зн. кампактнае пражываньне працаўнікоў аднаго і таго ж прадпрыемства.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі і выбарчыя акругі складаліся яшчэ за савецкімі часамі на базе аграрных і прамысловых прадпрыемстваў. У гарадох значная колькасьць жыльля распарадкоўвалася ад прадпрыемстваў. Сельскія мясцовыя прадстаўнічыя органы наагул будаваліся на базе калгасаў. Таму нават па-за працай наймальнік, якім пераважна была дзяржава, меў магчымасьць ажыцьцяўляць кантроль над сваімі наёмнымі работнікамі. Падчас выбараў на палітычнае волевыяўленьне ўзьдзеялі не праз палітычны ўплыў, а праз прыналежнасьць людзей да той ці іншай дзяржаўнай установы, прадпрыемства, гаспадаркі.

Бальшыня беларускіх прадпрыемстваў знаходзіцца ў дзяржаўнай маёмасьці. Бальшыня насельніцтва Беларусі занятая акурат на такіх прадпрыемствах. У выніку прафэсійнае карпаратыўнае адзінства ператвараецца ў карпаратыўны кантроль. Так закладаюцца перадумовы для карпаратызму як аб'яднаньня дзяржавы і прафэсійна-гаспадарчых супольнасьцяў дзеля дасягненьня палітычных мэтаў.

У заходніх мадэлях карпаратызму ўплыў на грамадзтва ажыцьцяўляецца праз грамадзкія аб'яднаньні, прафэсійныя саюзы, карпарацыі працоўных і наймальнікаў. У Беларусі перавага дзяржаўнай маёмасьці над прыватнай і залежнае ад палітычнай улады становішча кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў дазваляе ажыцьцяўляць гэты кантроль, мінаючы грамадзкія аб'яднаньні, — наўпрост праз вытворчыя адзінкі. Гэта значна больш эфэктыўна ў параўнаньні з заходнімі мадэлямі. Першыя крокі да такога «простага карпаратызму» былі зробленыя яшчэ падчас выбараў 1995 году. Але сьпярша ініцыятарам гэтых крокаў была не дзяржава, а мясцовая эканамічная (сельскагаспадарчая і прамысловая) і адміністрацыйная эліты, якія паспрабавалі палітычна замацаваць свой статус.

У выніку посьпех цэнтральнай улады на месцах беспасярэдне залежаў ад таго, ці здолее яна зацікавіць мясцовыя эканамічныя адзінкі, а дакладней іх кіраўнікоў, у тым, каб выкарыстаць карпаратыўны рэсурс у мэтах судзеяньня палітыцы Менску. А гэта, у сваю чаргу, залежала ад таго, наколькі дырэктарат заангажаваны ў палітыку, наколькі ён «прывязаны» да афіцыйнага палітычнага курсу. Перадумовы зацікаўленасьці дырэктарату ў супрацоўніцтве з афіцыйнымі палітычнымі ўладамі былі закладзеныя пры канцы 1994-га — у пачатку 1995 году беспасярэдняй залежнасьцю мясцовых органаў улады ад цэнтру, а таксама залежнасьцю мясцовай эканамічнай эліты ад цэнтральнай улады ў Менску (гл. папярэдні разьдзел).

Мы ня будзем падрабязна аналізаваць вынікаў выбараў у органы ўлады на ўсіх узроўнях,

стаўленьне да іх можна вызначыць па памянёным вышэй фэномэне «галасаваньня нагамі». Але падрабязьней разгледзім вынікі выбараў у абласныя Рады.

Пераважнай бальшынёй кандыдатаў у дэпутаты абласных Радаў ува ўсіх рэгіёнах краіны былі кіраўнікі дзяржаўных установаў (маюцца на ўвазе прамысловыя, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, арганізацыі сфэры абслугоўваньня, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай маёмасьці, а таксама бюджэтныя ўстановы — навучальныя і культурныя).

Так, напрыклад, у Гомельскай вобласьці 51,1%* кандыдатаў у дэпутаты абласной Рады складалі кіраўнікі ці намесьнікі кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў. Зь іх толькі 7,4% былі дырэктарамі прамысловых прадпрыемстваў, 11,5% — сельскагаспадарчых. Астатнія кіраўнікі паходзілі зь дзяржаўных бюджэтных установаў.

Такі расклад сілаў склаўся і ў Магілёве і Берасьці, зь невялікай перавагай на карысьць «сельскагаспадарчых» кандыдатаў. Колькасьць кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў сярод кандыдатаў у дэпутаты ў Магілёўскай і Берасьцейскай абласьцях адпаведна складала 52% і 52,3%. У тым ліку 9,4% і 2,9% — кіраўнікі прамысловасьці, 21,3% і 22,5% — старшыні калгасаў, 15,7% і 14,8% — кіраўнікі дзяржаўных непрамысловых арганізацыяў. 51% і 12% ад агульнай колькасьці непрамысловых кіраўнікоў складалі іх намесьнікі.

Найбольшае прадстаўніцтва «прамысловай» эліты, у параўнаньні зь іншымі рэгіёнамі краіны, назіралася ў Менскай вобласьці. Пры агульным прадстаўніцтве кіраўнічай эліты ў 52,7% ад агульнай колькасьці кандыдатаў, 11% было з прамысловых кіраўнікоў. 16,8% прадстаўлялі кіраўніцтва калгасаў і 24,9% былі кіраўнікамі бюджэтных дзяржаўных установаў.

Дачыненьне да прадстаўнічай і выканаўчай улады на абласным, раённым ці сельскім узроўнях у Берасьцейскай вобласьці мелі 9,6% кандыдатаў, 5,1% зь іх займалі пасады ў кіраўніцтве мясцовых Радаў і іх выканкамаў. У Гомельскай вобласьці гэтыя паказьнікі адпаведна складалі 12,6% і 3,4%. У Магілёўскай — 13,4% і 5,5%. У Менскай вобласьці 11,8% кандыдатаў ужо працавалі раней у мясцовай уладзе (гэта значыць, былі абраныя яшчэ ў 1990 годзе).

У параўнаньні з кіраўнічым складам, інтэлігенцыя сярод кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Радаў была прадстаўленая адносна слаба. З усіх абласьцей (за выняткам Менскай) Берасьцейская дала максымальны адсотак прадстаўнікоў інтэлігенцыі сярод кандыдатаў у дэпутаты — 27,1%. Пры гэтым акурат сярод іх найчасьцей у параўнаньні зь іншымі групамі сустракаліся чальцы палітычных партыяў.

Ува ўсіх рэгіёнах сярод кандыдатаў у дэпутаты колькасьць прадстаўнікоў новай бізнэсэліты не перавышала 5%. У Берасьцейскай вобласьці — 2%, у Гомельскай — 3,7%, у Магілёўскай — 2%. Максымальная колькасьць кандыдатаў ад бізнэс-эліты была ў Менскай вобласьці й складала 4,5%.

Як паказваюць лічбы, нягледзячы на пераважна «кіраўнічы» склад корпусу кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Радаў, беспасярэдне эканамічна-зацікаўленыя і эканамічна-ўплывовыя групоўкі (дырэктарат прамысловых прадпрыемстваў) складалі адносна невялікую частку прэтэндэнтаў на мясцовую ўладу. Пераважная бальшыня кандыдатаў складалася з так званага «статуснага» кіраўніцтва — дырэктарату школаў, бальніцаў і іншых бюджэтных устано-

* Тут і далей усе дадзеныя даюцца па сьпісах зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты, надрукаваных у абласных СМІ. Каб стварыць магчымасьці міжабласных і храналягічных параўнаньняў, дадзеныя прыводзяцца не ў абсалютных лічбах, а ў адсотках.

ваў. Гэта былі ўплывовыя ў сваёй мясцовасьці людзі, якія прызначаліся на пасаду адпаведнымі дзяржаўнымі ўстановамі (напрыклад, РАНА прызначаў дырэктарат школаў) і былі так ці інакш ад іх залежныя. Для іх галоўным рэсурсам была кіраўнічая пасада, статус. Палітычная функцыя ў мясцовым прадстаўнічым органе рабілася дадатковым статусным рэсурсам, які практычна губляў сэнс у выпадку пазбаўленьня першага. У адрозьненьне ад кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, у прадстаўнікоў «статуснага» кіраўніцтва не было шанцаў спалучыць эканамічны і палітычны ўплыў і такім чынам узмацніць першы праз другі.

З боку ж прамысловай і сельскагаспадарчай эліты масавага імкненьня набыць палітычныя пазыцыі не назіралася. У бальшыні рэгіёнаў прадстаўніцтва прамысловай і сельскагаспадарчай эліты сярод кандыдатаў не перавышала 10%. Адзіны вынятак складала сельскагаспадарчая эліта Магілёўскай і Берасьцейскай абласьцей. «Палітызацыю» першай можна растлумачыць яе жаданьнем пайсьці ў вялікую палітыку. Акурат яна, сельскагаспадарчая эліта Магілёўскай вобласьці, стала «кузьняй кадраў» для афіцыйнага Менску.

Выбары 1995 году прадэманстравалі, што найбольш зацікаўленай у здабыцьці палітычнай улады ў рэгіёнах стала падпарадкаванае цэнтру «статуснае кіраўніцтва». Яго прадстаўнікі складалі найбольш шматлікую групу кандыдатаў у дэпутаты. Гэта адкрывала для цэнтральнай менскай улады значныя магчымасьці для маніпуляцый і кантролю над мясцовымі прадстаўнічымі органамі.

Адсутнасьць пэўных партыйных прэфэрэнцыяў кандыдатаў у дэпутаты таксама спрыяла памяркоўнасьці фармаванай мясцовай улады.

Колькасьць кандыдатаў, якія адзначылі сваю партыйную прыналежнасьць, не перавышала 50%. Напрыклад, у Магілёўскай вобласьці яна складала 41%, у Берасьцейскай — 39%, у Менскай — 22,6%. Сярод дырэктарату адсотак партыйных кандыдатаў быў амаль найменшы з усіх групаў, якія ішлі на выбары: напрыклад, у Магілёве — каля 35%, у Берасьці — 19,5% ад агульнай колькасьці. У шэрагах прамысловага і калгаснага дырэктарату колькасьць партыйных кандыдатаў наагул не перавышала 10%. Бальшыня кандыдатаў ад мясцовага дырэктарату, якая наважылася пайсьці на выбары, пазыцыянавала сябе як незалежных кандыдатаў. Партыйнымі кандыдатамі ад дырэктарату былі пераважна сябры ляяльнай уладам КПБ. Найбольш партыйных кандыдатаў было сярод мясцовай інтэлігенцыі. У Берасьці такіх было 64,7% ад агульнай колькасьці. Пры гэтым кандыдатаў ад правых партыяў (у першую чаргу БНФ) было амаль у паўтара разу больш, чым ад левых (КПБ, РППС). У Магілёве колькасьць партыйных кандыдатаў сярод інтэлігенцыі складала 72,2%; у адрозьненьне ад Берасьцейшчыны, колькасьць кандыдатаў ад левых партыяў тут перавышала колькасьць правых.

Мясцовы дырэктарат, асабліва яго частка, зьвязаная з эканамічнымі рэсурсамі, нават беручы ўдзел у палітычных падзеях, імкнуўся займаць найменш палітычна заангажаваную пазыцыю. Ува ўмовах падпарадкаваньня выканаўчых камітэтаў і прамысловых прадпрыемстваў афіцыйнаму Менску матывы прыходу ў мясцовую палітыку прадстаўнікоў дырэктарату былі зьвязаныя не з асабістымі палітычнымі амбіцыямі ці мясцовымі палітычнымі інтарэсамі, а зь іншымі фактарамі, напрыклад, імкненьнем узмацніць ці проста не згубіць асабісты статус. А ўлічваючы неабходнасьць аддаваць фінансавыя рэсурсы і час на барацьбу за галасы, можна меркаваць, што галоўнай прычынай іх палітычнай актыўнасьці быў уплыў у Менску. Але ў кожным разе мясцовыя эліты не зьбіраліся аказваць значнага супрацьдзеяньня ўплыву Менску на працэс волевыяўленьня праз мясцовыя прадпрыемствы.

Афіцыйна зрыў мясцовых выбараў 1995 году тлумачыўся «антыпартыйным галасавань·

нем» выбарцаў — маўляў, грамадзяне галасавалі супраць кандыдатаў ад партыяў і такім чынам выказалі свой недавер ім. Сапраўды, з прыкладна 50% партыйных кандыдатаў мала хто перамог у першым туры. У Берасьцейскай вобласьці такіх было 22,5% ад складу дэпутатаў, Гомельскай — 33,3%, Гарадзенскай — 44,8%, Менскай — 32,2%.

Але апрача антыпартыйнасьці, выбары 1995 году мелі і іншую цямкую рысу — надзвычай вялікую долю дырэктарату і кіраўнікоў дзяржаўных арганізацыяў сярод пераможцаў як у першым, так і ў другім туры. Асноўную частку партыйна заангажаваных кандыдатаў складалі прадстаўнікі інтэлігенцыі, і зразумела, што іх параза выклікала і значнае памяншэньне колькасьці партыйных дэпутатаў.

Склад дэпутатаў, якія перамаглі ў першым туры выбараў, карэнным чынам адрозьніваецца ад складу кандыдатаў у дэпутаты.

Так, у Гарадзенскай вобласьці з 28 абраных у першым туры дэпутатаў абласной Рады 14 чалавек былі старшынямі калгасаў. З гэтых 14-ці 7 (50%) вызначылі сваю партыйную прыналежнасьць. 3 чалавекі (10,7%) — дэпутаты ад прамысловага дырэктарату, 5 (17,8%) — ад «статуснага» дырэктарату, 5 (17,8%) — выводзіліся з абласных ці раённых Радаў і іх выканкамаў, у тым ліку 3 займалі там кіраўнічыя пазыцыі (у кожнай з апошніх трох групаў знаходзілася толькі па адным партыйным кандыдату). Сярод абраных дэпутатаў не было ніводнага прадстаўніка ад правых партыяў.

У Гомельскай вобласьці з 42 дэпутатаў абласной Рады, абраных у першым туры, 13 (31%) былі старшынямі калгасаў, зь іх 5 (38%) вызначылі партыйную прыналежнасьць. 2 (4,7%) дэпутаты прадстаўлялі прамысловую эліту, 12 (28,6%) — «статусны» дырэктарат, 11 (26,2%) — належалі да прадстаўнікоў мясцовай улады, у тым ліку 3 зь іх займалі кіраўнічыя пазыцыі. У апошняй групе свае партыйныя пазыцыі вызначылі акурат кіраўнікі Радаў і выканкамаў.

Найбольш паказальная сытуацыя склалася ў Берасьцейскай вобласьці, дзе з 31 абранага ў першым туры дэпутата абласной Рады 14 (45,6%) былі старшынямі калгасаў, у тым ліку 5 (35%) адзначылі сваю партыйную прыналежнасьць; 3 (10%) — прадстаўлялі «статусны» дырэктарат; 10 (30%) чалавек займалі пасады ў мясцовых Радах і іх выканкамах (у тым ліку 7 зь іх кіраўнічыя). У апошніх дзьвюх групах ніводны не адзначыў сваёй партыйнай прыналежнасьці.

У Менскай вобласьці з 31 абранага ў першым туры дэпутата абласной Рады 13 (42%) былі старшынямі калгасаў, у тым ліку 8 (61,5%) адзначылі сваю партыйную прыналежнасьць; 6 (19,4%) належалі да «статуснага» дырэктарату (партыйную прыналежнасьць адзначыў 1); 4 (12,9%) прадстаўлялі прамысловую эліту (зь іх 2 партыйныя); 8 (25,8%) чалавек займалі пасады ў мясцовых Радах і іх выканкамах, зь іх 6 — кіраўнічыя (толькі адзін прадстаўнік гэтай групоўкі адзначыў сваю партыйную прыналежнасьць).

Такім чынам, у параўнаньні з складам кандыдатаў у дэпутаты абласных Радаў, склад дэпутатаў Радаў, абраных у першым туры, можна ахарактарызаваць як выключна «кіраўнічы», але не беспартыйны. Колькасьць дэпутатаў — прадстаўнікоў ад інтэлігенцыі — была непрапарцыйна малой у параўнаньні зь іх колькасьцю сярод кандыдатаў. Прапорцыя дэпутатаў ад кіраўнічага складу, абраных у першым туры, наадварот, была мінімум удвая вышэйшая за іх колькасьць сярод кандыдатаў.

Зьніжэньне партыйнага прадстаўніцтва тлумачыцца значным зьніжэньнем колькасьці інтэлігенцыі і іншых «некіраўнічых» групаў, якія здолелі перамагчы. Акурат гэты фактар растлумачвае паразу правых партыяў. Бальшыня «правых кандыдатаў» (БНФ, АДПБ) былі кандыдатамі ад інтэлігенцыі і бізнэс-эліты.

Найбольш уражвае посьпех старшыняў калгасаў і функцыянэраў мясцовых органаў улады. Але яшчэ больш паказальнай ёсьць тэндэнцыя зьмены ўзроўню партыйнага прадстаўніцтва сярод гэтай групы дэпутатаў у параўнаньні з партыйным прадстаўніцтвам сярод кандыдатаў. Так, сярод найбольш удалай на першым туры групы — старшыняў калгасаў — адсотак дэпутатаў, якія адзначылі сваю партыйную прыналежнасьць, перавышае іх прапорцыю сярод кандыдатаў амаль утрая. Такая сытуацыя назіраецца і сярод прадстаўнікоў мясцовай улады, дзе сярод пераможцаў адсотак партыйных таксама значна большы, чым сярод адпаведнага сэгмэнту кандыдатаў.

Такім чынам, у першым туры выбараў грамадзтва галасавала ня супраць партыяў (простая лёгіка, маўляў, калі абрана мала партыйных дэпутатаў, значыць, грамадзтву не падабаюцца партыі, тут не працуе), а за кіраўнікоў, зь якіх перамаглі тыя, хто быў найбольш зацікаўлены ў перамозе і найбольш палітычна заангажаваны — меў партыйны білет.

Вынікі выбараў залежалі не ад партыйных прыхільнасьцяў грамадзтва, якое было супраць палітыкі і не жадала галасаваць наагул, а ад намаганьняў, якія прыкладаліся з боку кандыдатаў. У найлепшай пазыцыі апынаўся акурат партыйны дырэктарат — кандыдаты, у якіх спалучалася максымальная асабістая матывацыя перамагчы з наяўнасьцю адміністрацыйных сродкаў. Акурат гэты адміністрацыйны рэсурс быў выкарыстаны падчас барацьбы за месцы ў мясцовых органах улады і абумовіў вынік выбараў.

Больш выразна партыйныя стэрэатыпы і прыхільнасьці, якія выявіла грамадзтва на выбарах 1995 году, дэманструе барацьба ў другім туры. Інфармацыйная кампанія ў СМІ напярэдадні другога туру мясцовых выбараў была значна актыўнейшая, але яе праводзілі афіцыйныя ўстановы, а не палітычныя сілы. У бальшыні абласных газэтаў былі надрукаваныя заклікі да насельніцтва ад імя мясцовых Радаў і прафэсійных саюзаў з просьбай прыйсьці на выбары. Гэтая кампанія нязначна падняла яўку: у другім туры галасаваньня ўзялі ўдзел 61,3% выбарцаў. У другім туры з 28 244 акругаў выбары адбыліся ў 24 330, што складае 86% ад агульнай колькасьці; у 873 выбары адбыліся, але кандыдаты не былі абраныя.

На важнасьць партыйнай прыналежнасьці паказвае тое, што ў другім туры барацьба ў значнай ступені разгортвалася паміж беспартыйнымі і партыйнымі кандыдатамі. У бальшыні выпадкаў спаборнічалі беспартыйныя і прадстаўнікі партыяў або беспартыйныя кандыдаты. Міжпартыйнага супрацьстаяньня амаль не назіралася. Але колькасьць партыйных кандыдатаў, якія прайшлі ў другі тур, была таксама значна меншая за іх прадстаўніцтва на пачатку кампаніі. Так, у Гомельскай вобласьці ў другім туры кандыдаты, якія адзначылі партыйную прыналежнасьць, складалі 25%, у Віцебскай — 23,3%, у Магілёўскай — 36,7% ад агульнай колькасьці.

У Гомельскай вобласьці ў 50% акругаў (9 з 18) падчас другога туру выбараў у абласную Раду барацьба разгортвалася паміж беспартыйнымі і кандыдатамі ад партыяў КПБ, Аграрнай партыі, Партыі «Зялёны сьвет», БНФ. Як і ў першым туры, толькі прадстаўнікі ляяльных рэжыму КПБ і Аграрнай партыі здолелі перамагчы беспартыйных. У бальшыні выпадкаў выбару паміж прадстаўнікамі прамысловага ці «статуснага» дырэктарату перавага аддавалася партыйнаму кандыдату (3 з 4 выпадкаў), ці пераможцы не было ўвогуле.

Другое месца па колькасьці сярод тых, хто прайшоў у другі тур, займала партыя «Зялёны сьвет», якая факусавала ўвагу на вельмі актуальных для Гомельшчыны экалягічных праблемах. Але і яе прадстаўнікі (у асноўным інтэлігенцыя), як і ў першым туры, ня здолелі суп-

рацьстаяць «статуснаму» кіраўніцтву (у абодвух выпадках транспартнікам). Па прафэсійнай прыналежнасьці назіралася перавага кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў над астатнімі (найчасьцей ім супрацьстаяла інтэлігенцыя з пасадамі і без).

Але лёс кандыдатаў ад дырэктарату ў другім туры ў Гомельскай вобласьці склаўся інакш. Найбольшыя шанцы абраньня мела мясцовая прамысловая эліта і, як і ў першым туры, старшыні і функцыянэры калгасаў. І ў першай, і ў другой групах паразу пацярпеў толькі адзін кандыдат. Такім чынам, у другім туры яшчэ мацней за першы назіраецца прамысловы, калгасны, наагул карпаратыўны ўхіл.

Такая сытуацыя назіралася і ў іншых абласьцях. Нават у Магілёўскай, для якой былі характэрныя моцныя пазыцыі старшыняў калгасаў як у першым, так і ў другім туры, найбольшыя шанцы перамагчы мела акурат партыйная частка гэтай групы.

Першыя свабодныя мясцовыя выбары выявілі «непалітычную» лёгіку галасаваньня выбарцаў. Наяўнасьць пазапалітычнага статусу аказалася мацнейшым рэсурсам барацьбы за галасы выбарцаў, чым наяўнасьць палітычных рэсурсаў — партыйнай прыналежнасьці, палітычнай пасады, праграмы кандыдата. Палітычныя рэсурсы дзеялі як другасныя ці як крытэры выбару паміж ужо адабранымі па статусным прынцыпе кандыдатамі. Ува ўмовах карпаратыўнага кантролю з боку кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстановаў ды вельмі нізкай яўкі выбарцаў акурат наяўнасьць адміністрацыйнага рэсурсу ў асобных кандыдатаў дазволіла ім перамагчы.

Значная частка мясцовых прадстаўнічых органаў улетку 1995 году так і не была абраная да стану наяўнасьці кворуму. Пры канцы лістапада была ажыцьцёўлена другая спроба абраць мясцовыя Рады, якая таксама была непасьпяховай.

Нягледзячы на паразу мясцовых выбараў 1995 году як сродку фармаваньня легітымных органаў мясцовай прадстаўнічай улады, яны ўсё ж такі далі пэўны палітычны досьвед.

Партыйная і палітычная сыстэмы Беларусі фармаваліся ў неспрыяльных умовах, тыповых для канца XX ст., калі бальшыня палітычных партыяў сьвету губляе свой сталы электарат (у мадэрным грамадзтве цяжка сфармуляваць ідэю ці інтарэс, якія б згуртавалі дастатковую для здабыцьця ўлады колькасьць людзей) і назіраецца «эрозія сацыяльнай падтрымкі». Вынікі выбараў прадэманстравалі няздольнасьць партыяў аб’ядноўваць грамадзян на падставе супольных інтарэсаў і жаданьня змагацца за рэалізацыю гэтых інтарэсаў на палітычным узроўні, але засьведчылі іх карысьць як інстытутаў, праз якія рэалізуецца кантроль над ажыцьцяўленьнем дзяржаўнай улады, прыналежнасьць да якіх стымулюе палітыкаў больш актыўна і эфэктыўна дзейнічаць, змагаючыся за месцы ўва ўладзе. У такім кантэксьце стымуляцыя з боку афіцыйнага Менску апалітычнасьці і апартыйнасьці насельніцтва ёсьць перадумовай пазбаўленьня ўлады грамадзкага кантролю. Падмена палітычных прынцыпаў барацьбы за галасы сродкамі карпаратыўнага кантролю дазваляе ня толькі падпарадкаваць грамадзтва, але і паставіць у залежнасьць як эканамічныя, так і палітычныя мясцовыя эліты.

Рэгіянальныя эліты паспрабавалі ў 1995 годзе падтрымаць свой эканамічны статус набыцьцём палітычнага. Але паколькі першы быў недастаткова моцны, гульня ў палітыку не дазволіла ім дасягнуць пастаўленай мэты і аказалася пасткай, якая зрабіла рэгіянальныя палітычныя і эканамічныя эліты закладнікам цэнтральнай улады.

## Выбары 1999 году

На выбарах 1999 году былі выкарыстаныя тэхналёгіі, апрабаваныя ўладамі ў 1995 годзе. Мясцовыя выбары 1995 году праводзіліся ўва ўмовах фармаваньня цэнтралізаванай сыстэмы выканаўчай улады, калі характэрныя рысы апалітычнага грамадзтва толькі пачалі складацца. 1999 год — гэта час усталяваньня сьпелага рэжыму, калі ў апазыцыі не засталося ілюзіяў наконт таго, што крайняя цэнтралізацыя ўлады — часовая зьява.

Выбары красавіка 1999 году былі першымі мясцовымі выбарамі, якія праводзіліся па правілах, якія ўсталявала цэнтральная ўлада. Вэртыкаль прэзыдэнцкай улады ў рэгіёнах, якую пачалі фармаваць у 1995 годзе, да 1999 году навучылася працаваць як добра наладжаны мэханізм. На працягу 1995—1999 гадоў прайшло некалькі хваляў ратацыяў, якія канчаткова вычысьцілі мясцовую ўладу ад неляяльных элемэнтаў і зрабілі яе падпарадкаванай цэнтру ня толькі як структуры органаў, але і ў пляне пэрсанальнай ляяльнасьці кадраў.

Пры канцы 1998 году былі прынятыя папраўкі да закону «Аб выбарах у мясцовыя Рады». Міжнародная супольнасьць амаль адразу ж адзначыла іх неадпаведнасьць дэмакратычным нормам.

Мясцовыя выбары 1995 году праводзіліся згодна з Законам аб выбарах, які быў прыняты яшчэ ў савецкія часы. Пра значнасьць новага закону аб выбарах для кантролю над волевыяўленьнем сьведчыць тое, што ён уступіў у сілу 28 сьнежня 1998 году — за 4 дні пасьля таго, як указам прэзыдэнта ад 24 сьнежня быў прызначаны тэрмін выбараў. Дарма што закон быў прыняты фактычна пасьля пачатку выбараў і юрыдычна на іх не распаўсюджваўся, выбары праводзіліся акурат па новым законе, што быў прыняты фактычна пасьля пачатку выбарчай кампаніі і зьнік пасьля яе сканчэньня.

Таксама як папярэднія выбары, мясцовыя выбары 1999 году супалі з правядзеньнем нацыянальных палітычных кампаніяў, якія так ці інакш уплывалі як на працэс выбараў, так і на яго вынікі.

Першая кампанія праводзілася ўладамі. 1 лютага 1999 году была распачатая перарэгістрацыя палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Старшынём камісіі па перарэгістрацыі быў прызначаны У. Замяталін. Сам факт перарэгістрацыі, а таксама асоба, якая была пастаўлена на яе чале, сьведчыць, што кампанія мела дэманстратыўна рэпрэсіўны характар.

Перарэгістрацыя праводзілася дзеля зьніжэньня дзеяздольнасьці альтэрнатыўных палітычных сілаў напярэдадні мясцовых выбараў. Але прызначэньне Замяталіна кіраўніком камісіі дазваляе зрабіць і іншыя высновы. Кампанія перарэгістрацыі была больш інфармацыйнай, чым функцыянальнай. Моцныя палітычныя партыі даволі проста праходзілі бар’ер у 1500 чальцоў, патрэбных для перарэгістрацыі. Але, як паказалі выбары 1995 году, партыйная ідэнтыфікацыя была другаснай па значнасьці ў параўнаньні з карпаратыўна-статуснай ідэнтыфікацыяй і дзейнічала толькі ў межах першай. Каб атрымаць патрэбны вынік выбараў, уладзе трэба было дэзарганізаваць, выдаліць з палітычнага поля больш небясьпечныя для карпаратыўнай дзяржавы ўстановы: грамадзкія аб’яднаньні. Але небясьпечнымі для выбараў былі не буйныя аб’яднаньні, накшталт буйных прафэсійных саюзаў.

У пасьлятаталітарным, расчараваным, апалітычным грамадзтве ідэнтыфікацыя зь вялікімі супольнасьцямі губляе сэнс. Пагрозу для ўлады на мясцовым узроўні складаюць акурат невялікія аб’яднаньні, якія ўзьнікаюць у межах працоўных адзінак і грунтуюцца на міжасабо-

вых кантактах. Нават калі зьнікае давер да вялікіх ідэяў і вялікай грамадзкай супольнасьці, застаецца давер да інфармацыі ад сябра ці калегі па працы, да лякальнай супольнасьці, да лідэраў, якім бліжэйшыя і зразумельшыя мясцовыя праблемы і інтарэсы. Акурат альтэрнатыўныя дзяржаўным мікраарганізацыі ў межах прадпрыемстваў маглі б перашкодзіць вылучэньню і абраньню кандыдатаў па статусна-карпаратыўным прынцыпе, які ўлада мела магчымасьць кантраляваць.

Страх перад «лякальнымі» пратэстамі назіраецца і ў рашэньнях, прынятых мясцовымі органамі ўлады, якія абмяжоўвалі актыўнасьць грамадзянаў. Так, у лютым 1999 году Гомельскі аблвыканкам прыняў пастанову, якая абмяжоўвала правядзеньне мітынгаў, сходаў і пікетаў — мерапрыемстваў акурат лякальнага значэньня і ўплыву.

Закон аб выбарах, прыняты пры канцы 1998 году, ня толькі ўскладніў працэс вылучэньня кандыдатаў, але і ня вызначыў грамадзкіх аб'яднаньняў як арганізацыяў, якія маюць правы вылучаць кандыдатаў на мясцовых выбарах. Перарэгістрацыя партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, у выніку якой бар'ер праходзілі толькі буйныя партыі з колькасьцю сяброў больш за 1500 чалавек, пазбаўляла малыя грамадзкія аб'яднаньні магчымасьці набыць палітычны статус і такім чынам ажыцьцявіць уплыў на выбары. Аднак той самы закон надзяліў працоўныя калектывы правам вылучэньня кандыдатаў. Тым самым быў заканадаўча замацаваны мэханізм кантролю над выбарамі.

Згодна з рэзалюцыяй Кангрэсу рэспубліканскіх дэмакратычных сілаў, прынятай 23 сьнежня 1998 году, дэмакратычныя партыі адмовіліся браць удзел у мясцовых выбарах, бо «ў Беларусі адсутнічаюць умовы для правядзеньня свабодных і дэмакратычных выбараў»[1], і вылучаць кандыдатаў. Адмова бальшыні палітычных партыяў ад удзелу ў выбарах мала зьмяняла сытуацыю функцыянальна, але стварала адпаведны інфармацыйны настрой: палітычная кампанія апазыцыі настройвала грамадзтва ня столькі супраць улады, колькі супраць палітыкі як такой. Партыйныя кандыдаты былі вылучаны толькі ад партыяў ЛДП і КПБ, ПНЗ, «Славянскі сабор». Але ЛДП пры канцы сакавіка заявіла аб зьняцьці сваіх кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі.

Другая кампанія праводзілася апазыцыяй. У ліпені 1999 году канчаўся вызначаны Канстытуцыяй 1994 году тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта А. Лукашэнкі. 10 студзеня дэпутаты ВС 13-га скліканьня на сваім сходзе пастанавілі прызначыць выбары прэзыдэнта на 16 траўня 1999 году. Была створана альтэрнатыўная ЦВК на чале з В. Ганчаром.

Сканцэнтраваўшы ўвагу дэмакратычна настроенай часткі грамадзтва на правядзеньні альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў і абвясьціўшы байкот выбарам мясцовым, апазыцыйныя сілы падкрэсьлілі сваё дыстанцыянаваньне ад уладаў і іх палітыкі. Альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары з самага пачатку мелі вельмі мала шанцаў на посьпех. Байкот мясцовых выбараў у СМІ з боку апанэнтаў рэжыму толькі спрыяў посьпеху цэнтралізаванага кантролю ўлады над вынікамі мясцовых выбараў. У традыцыях савецкага часу буйная агульнанацыянальная кампанія для апазыцыі аказалася больш значнай, чым рупатлівая праца з насельніцтвам у рэгіёнах.

Калі для выбараў 1995 году быў характэрны абсэнтэізм выбарцаў, то ў 1999-м адчуваўся дэфіцыт кандыдатаў. У краіне былі вылучаныя 27 362 кандыдаты, амаль у паўтара раза менш, чымся ў 1995-ым. Асноўная частка безальтэрнатыўных акругаў прыпала на сельскія і пасялковыя Рады.

[1] Народная Воля. 1999. 3 лютага.

Аналіз працэсу вылучэньня кандыдатаў паказвае, што ўрокі 1995 году былі добра засвоеныя ўладамі. Дарма што 55% кандыдатаў не займалі раней пасадаў у органах мясцовай улады, на іх чыніў значны палітычны ўплыў цэнтар. Калі на выбарах 1995 году дырэктарат складаў каля 50% ад агульнай колькасьці кандыдатаў у абласныя Рады, то на выбарах 1999-га яго прадстаўнікі склалі пераважную бальшыню кандыдатаў.

Так, у Гомельскай вобласьці 77,5% ад агульнай колькасьці кандыдатаў складалі прадстаўнікі дырэктарскага корпусу, у тым ліку 71,7% — «статусны» дырэктарат, 18% — прамысловы дырэктарат, астатнія — старшыні калгасаў. Працэнт інтэлігенцыі не перавышаў 6%, бізнэсоўцы складалі 3,31% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Нават прадстаўнікоў мясцовай улады было менш за 6%.

У Берасьцейскай вобласьці дырэктарат складаў 68,4% ад агульнай колькасьці кандыдатаў, у тым ліку «статусны» — 73,8%, прамысловы — 15% ад агульнай колькасьці дырэктарату. Інтэлігенцыя і бізнэсоўцы адпаведна — 10,2% і 6% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Колькасьць функцыянэраў мясцовых Радаў і выканкамаў складала 10,3%.

У Магілёўскай вобласьці колькасьць дырэктарату была 66,3% ад усіх кандыдатаў, у тым ліку колькасьць «статуснага» складала 71,4%, прамысловага — 20,6% ад дырэктарату. Прадстаўніцтва інтэлігенцыі не перавышала 9,5%, бізнэсоўцаў — 3,2% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. У Магілёўскай вобласьці было найвышэйшае прадстаўніцтва кандыдатаў ад мясцовай палітычнай эліты — 16,8%.

У ніводным рэгіёне не было шмат прадстаўнікоў партыяў. Як і на мінулых выбарах, найбольш апартыйна сябе паводзіў дырэктарскі корпус. Камуністы павялі на выбары інтэлігенцыю, лібэральныя дэмакраты — бізнэсоўцаў. Але прадстаўніцтва і першых, і другіх было невысокім.

Такім чынам, выбары'1999 па складзе кандыдатаў былі апартыйнымі і збольшага «дырэктарскімі». Пераважная бальшыня кандыдатаў ад дырэктарату — «статусны» дырэктарат — была найбольш уразьлівай, у сэнсе залежнасьці ад уладаў, групай. Улічваючы яе залежнае становішча, можна лічыць, што кантроль над волевыяўленьнем быў распачаты яшчэ на этапе вылучэньня кандыдатаў.

Выбары'1999 былі не праведзеныя ўладамі, а хутчэй інсцэнаваныя імі ўва ўмовах апалітычнасьці насельніцтва і байкоту з боку бальшыні палітычных партыяў. Але нават арганізацыя выбараў згары не патрапіла пераадолець апалітычнасьці грамадзтва. На значнай частцы выбарчых участкаў праводзіліся безальтэрнатыўныя выбары. Так, падчас рэгістрацыі кандыдатаў на 20% участкаў выбараў у абласныя Рады ў кожнай вобласьці быў вылучаны толькі адзін кандыдат. У Магілёўскай вобласьці па адным кандыдату было вылучана больш як у 50% акругаў (32 з 60). З 32 безальтэрнатыўных кандыдатаў толькі адзін не прадстаўляў мясцовага дырэктарскага корпусу: Вадзім Папоў — першы намесьнік міністра сельскай гаспадаркі і харчаваньня. А пасьля таго, як ЛДП пры канцы сакавіка зьняла сваіх кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі, безальтэрнатыўных акругаў стала яшчэ больш.

Удзел у мясцовых выбарах меў ня надта вялікі сэнс з пункту гледжаньня барацьбы за ўладу. Мясцовыя Рады яе фактычна ня мелі. Але мясцовыя выбары 1999 году сталі першым агульнанацыянальным волевыяўленьнем пасьля таго, як у лістападзе 1996 году былі прынятыя зьмены ў Канстытуцыю 1994 году. Абвясьціўшы байкот гэтым выбарам, апазыцыйныя палітычныя партыі фактычна далі ўладам час бескантрольна патрэнавацца ў тэхналёгіях арга-

нізацыі выбараў: арганізацыі вылучэньня кандыдатаў, датэрміновага галасаваньня, апрацоўкі насельніцтва і кантролю над волевыяўленьнем. Так, па прызнаньні Аляксандра Пласкавіцкага, старшыні праўнай управы АП, дзякуючы «тлумачальнай рабоце» на выбары плянавалася прыцягнуць 70—80% выбарцаў. Згодна з інфармацыяй ЦВК, ужо на 1 красавіка датэрмінова прагаласавала 2,05% выбарцаў. У выніку, напрыклад, у Гарадзенскай вобласьці датэрмінова прагаласавалі 23%.

Апазыцыйныя сілы адмовіліся ня толькі ад удзелу ў выбарах, але і ад назіраньня за іх ходам. Назіраньне за ходам выбараў ажыцьцяўлялася пераважна замежнымі назіральнікамі. Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ спачатку не зьбіралася пасылаць назіральнікаў, але 31 сакавіка заявіла аб удзеле ў назіраньні 16 чалавек, а напярэдадні выбараў павялічыла іх колькасьць да 34. Таксама напярэдадні выбараў хадайніцтва аб удзеле ў назіраньні заявілі амбасады Нямеччыны і Чэхіі. ПКБ паабяцала вылучыць 1200 чалавек дзеля паралельнага падліку галасоў, але не зрабіла гэтага.

Узровень яўкі пацьвердзіў прагнозы ўлады: на выбары прыйшло 66,3% выбарцаў. Найвышэйшая яўка назіралася ў Гарадзенскай вобласьці — 75,6%, найменшая — у Менску. Але з тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі, «за» ці «супраць» якога-небудзь кандыдата свае галасы аддалі толькі 67,6%. Фактычна сваю волю выказалі 44,8% ад агульнай колькасьці выбарцаў. Гэта, дарэчы, адпавядае ўзроўню палітычнага ўдзелу на мясцовых выбарах 1995 году. Астатнія выбарцы не акрэсьлілі сваіх пазыцыяў.

Але мясцовыя выбары ня маюць такой вялікай сымбалічнай значнасьці, як, напрыклад, прэзыдэнцкія ці парлямэнцкія. На агульнанацыянальных выбарах галасаваньне супраць усіх кандыдатаў найчасьцей адлюстроўвае пратэст супраць рэжыму. Апазыцыйныя сілы ясна вызначылі стратэгію дзеяньняў на мясцовых выбарах для пратэставага электарату — выбарам быў абвешчаны байкот. Таму паводзіны 32,4% выбарцаў можна растлумачыць ці вельмі вялікім жаданьнем выразіць пратэст супраць палітыкі ўвогуле, ці наяўнасьцю пазапалітычнага адміністрацыйна-карпаратыўнага прымусу ў арганізацыі яўкі на выбарчыя ўчасткі. Першы варыянт малаверагодны з прычыны адносна невялікай сымбалічнай значнасьці мясцовых выбараў. Імавернасьць наяўнасьці карпаратыўнага прымусу павялічвае падкантрольнае становішча «статуснага» кіраўніцтва, удзел якога вызначыў ход і вынікі выбараў.

На карысьць гэтага меркаваньня сьведчыць і надзвычай нізкі ўзровень галасаваньня ў другім туры. «За» ці «супраць» аднаго з кандыдатаў прагаласавалі ў другім туры 45,6% выбарцаў. Такім чынам, больш за 50% выбарцаў прыйшлі толькі затым, каб ува ўмовах абвешчанага апазыцыяй байкоту засьведчыць сваю яўку на выбарчы ўчастак. Як і на мінулых выбарах, найменшы ўдзел у галасаваньні ўзялі жыхары буйных населеных пунктаў, дзе наведаньне выбараў цяжка пракантраляваць. Але розьніца паміж узроўнем палітычнага ўдзелу ў гарадох і па-за іх межамі стала яшчэ цямчэйшай. Так, у Берасьцейскай вобласьці гарадзкая Рада была абрана толькі ў Кобрыне — адносна невялікім горадзе, але былі сфармаваныя ўсе раённыя, пасялковыя і сельскія Рады. Найменшая колькасьць дэпутатаў была абраная ў Берасьці, Пінску і Баранавічах — найбуйнейшых гарадох вобласьці. У Віцебскай вобласьці найменшы палітычны ўдзел назіраўся ў Віцебску і Наваполацку. У Гарадзенскай вобласьці — у Горадні, Лідзе і Слоніме.

Ход выбараў 1999 году абумовіў іх вынікі. У адрозьненьне ад выбараў'1995, у 1999 годзе склад абраных дэпутатаў адпавядаў складу кандыдатаў, якія ішлі на выбары. Але і ў гэтых умовах існавалі больш уплывовыя групоўкі, якія, нягледзячы на адносна невялікае прад-

стаўніцтва сярод кандыдатаў, атрымалі значную колькасьць дэпутацкіх мандатаў. Сярод абраных дэпутатаў абсалютную бальшыню склалі прадстаўнікі «статуснага» дырэктарату. Найбольш моцныя пазыцыі займалі прадстаўнікі выканаўчых органаў і кіраўнікі прадстаўнічых органаў мясцовай улады. У Берасьцейскай вобласьці з 15 кандыдатаў, вылучаных ад гэтай групоўкі ў абласную Раду, прайшлі ўсе. У Гомельскай вобласьці зь дзевяцёх кандыдатаў ад выканкамаў і былых старшыняў Радаў, прайшлі пяцёра. Найменш пераможцаў у параўнаньні з прадстаўніцтвам сярод кандыдатаў у дэпутаты мелі інтэлігенты, чыя колькасьць на выбарах у абласную Раду не перавышала 1-2 чалавек ува ўсіх абласьцях. Дэпутацкія мандаты па астатніх групоўках разьмеркаваліся раўнамерна, адпаведна ўзроўню прадстаўніцтва іх чальцоў сярод кандыдатаў.

Дарма што намінальны ўзровень яўкі выбарцаў у 1999 годзе быў вышэйшы за папярэднія выбары, рэальная колькасьць тых, хто прагаласаваў, не адрозьнівалася ад 1995 году і не перавышала 50% ад агульнай колькасьці выбарцаў. Гэта сьведчыць аб устойлівай апалітычнасьці грамадзтва ды невялікай цікавасьці да прадстаўнічых органаў мясцовай улады. Гэтыя рысы характэрныя для палітычнай культуры постсавецкай Беларусі.

Ужываньне цэнтралізаванага рэсурсу дазволіла ня толькі ўзьняць узровень яўкі на выбарах да 66%, але і сфармаваць мясцовыя органы прадстаўнічай улады. У Беларусі сфармавалася спэцыфічная сыстэма прадстаўніцтва, арганізацыі і правядзеньня выбараў, абумоўленая двума фактарамі. Па-першае, апалітычнасьцю грамадзтва і адсутнасьцю агульнапрызнаных грамадзкіх аб’яднаньняў. Па-другое, палітычнай заангажаванасьцю ня толькі мясцовых палітычных, але і мясцовых эканамічных элітаў.

Дзеля гэтага ў палітыцы на мясцовым узроўні ўтварылася «зачараванае кола». Кантроль над мясцовай эканамічнай і палітычнай элітай дазваляе цэнтральнай уладзе мабілізаваць насельніцтва. Пагаджаючыся на невялікія, на першы погляд, саступкі ў ажыцьцяўленьні функцыяў палітычнай мабілізацыі, мясцовая эліта трапляе ў яшчэ большую залежнасьць ад цэнтральнай улады, таму што здабыты ёю такім чынам палітычны статус не дае гарантыяў асабістай бясьпекі ў стасунках з цэнтрам, бо здабыцьцё гэтага статусу санкцыянавана і арганізавана самім гэтым цэнтрам.

## Высновы

Ход і вынікі мясцовых выбараў паказваюць, што, нягледзячы на апалітычнасьць грамадзтва і адсутнасьць асабістых палітычных інтарэсаў, мясцовыя ўлады і мясцовыя эліты ў Беларусі не знаходзяцца па-за палітыкай. Абраўшы ў палітыцы ролю слабога і пагадзіўшыся на выкананьне другасных функцыяў, яны сталі значным зьвяном у ланцугу падтрыманьня цэнтралізаванай улады. І гэтая роля выконваецца імі насуперак асабістым інтарэсам. Неарганізаванасьць і нявызначанасьць пазыцыяў не дазваляе ім парваць гэты ланцуг.

# СТРУКТУРА МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСІ

Згодна з палітычнай тэорыяй, выбары — гэта працэс адбору кандыдатаў для ажыцьцяўленьня прадстаўніцтва і абароны інтарэсаў грамадзтва — у найлепшым выпадку, ці кіраўніцтва грамадзянамі — у найгоршым.

Ход і вынікі мясцовых выбараў беспасярэдне залежаць ад таго, што зь сябе ўяўляе мясцовая ўлада: зь якіх установаў яна складаецца, у чым яе прызначэньне ў сыстэме як гарызантальнага, так і вэртыкальнага падзелу ўладаў, наколькі шырокая кампэтэнцыя органаў мясцовай улады. І наагул, што значыць мясцовая ўлада для грамадзтва і эліты.

Цяперашні стан інстытутаў мясцовай улады ёсьць вынікам працэсу яе разьвіцьця, на кожным з этапаў якога спалучэньне інтарэсаў (а таксама іх адсутнасьці) розных сацыяльных, эканамічных і палітычных групаў вызначала іх адпаведную гэтаму этапу структуру, функцыі і прызначэньне.

## Структура органаў мясцовага кіраваньня і статус дэпутатаў мясцовых Радаў

Статус дэпутатаў мясцовых Радаў вызначаецца статусам саміх Радаў, іх структурай, функцыямі, а таксама асаблівасьцямі падзелу кампэтэнцыі паміж мясцовымі і цэнтральнымі органамі ўлады, паміж мясцовымі прадстаўнічымі і выканаўчымі органамі. Дзеля гэтага высьвятленьне пазыцыяў мясцовай улады і мясцовага самакіраваньня дазваляе выявіць сэнс, мэты і матывы дзейнасьці тых, хто змагаецца за пазыцыі ў гэтых установах.

Структура і функцыі мясцовай улады вызначаюцца Канстытуцыяй 1996 году, законамі «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні», «Аб статусе дэпутатаў мясцовых Радаў», Выбарчым Кодэксам, а таксама іншымі заканадаўчымі актамі, якія рэгулююць асобныя бакі дзейнасьці мясцовых уладаў.

Фармальна мясцовая ўлада ў краіне складаецца зь дзьвюх частак: органаў мясцовага кіраваньня і мясцовага самакіраваньня. Прадстаўнічымі органамі мясцовага самакіраваньня ёсьць мясцовыя Рады. Функцыі мясцовых выканаўчых органаў належаць выканкамам. Першапачаткова выканкамы ствараліся як выканаўчыя камітэты мясцовых Радаў і падпарадкоўваліся толькі Радам. Але пасьля прыняцьця ў 1994 годзе ініцыяваных прэзыдэнтам Лукашэнкам зьменаў у закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» выканкамы сталі падпарадкоўвацца ня толькі мясцовым прадстаўнічым, але і цэнтральным выканаўчым органам дзяржаўнай улады: атрымалася фармальна падвоенае падпарадкаваньне выканкамаў. У сапраўднасьці абавязкі выканкамаў перад мясцовымі Радамі аказваюцца другаснымі і малазначнымі. Выканкамы дэ-факта сталі ўстановамі, якія прадстаўляюць цэнтральную ўладу ў рэгіёнах. Рады амаль згубілі кантроль над выканкамамі, а ў асобных выпадках самі трапілі ў залежнасьць ад іх.

Адносную значнасьць і памер паўнамоцтваў прадстаўнічых і выканаўчых органаў у рэгіёнах можна ўявіць, зьвярнуўшы ўвагу на парадак пералічэньня гэтых органаў у законе. Сыс-

тэма мясцовага кіраваньня разглядаецца ў ім як значнейшая. Гэта праяўляецца і ў парадку разьмеркаваньня кампэтэнцыі і дзеяздольнасьці гэтых устаноў.

Згодна з законам «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні», сыстэма мясцовага самакіраваньня складаецца зь мясцовых Радаў дэпутатаў і органаў тэрытарыяльнага грамадзкага самакіраваньня (Рады і камітэты мікрараёнаў, жыльлёвых комплексаў і г.д.). Закон прадугледжвае і пэўныя мэханізмы беспасярэдняй дэмакратыі: правядзеньне мясцовых рэфэрэндумаў, сходаў грамадзян. У склад сыстэмы мясцовага самакіраваньня ўваходзяць Рады трох узроўняў: першаснага, базавага і абласнога. Першасны тэрытарыяльны ўзровень — гэта сельскія, пасялковыя, гарадзкія (гарадоў раённага падпарадкаваньня) Рады. Базавы — гарадзкія (гарадоў абласнога падпарадкаваньня) Рады. Абласны — абласныя Рады. Менская гарадзкая Рада мае правы базавай і абласной Рады.

Рады ёсьць прадстаўнічымі органамі і выбіраюцца грамадзянамі, якія жывуць на адпаведнай тэрыторыі, кожныя чатыры гады на падставе ўсеагульнага, свабоднага, тайнага галасаваньня. Выбары ў Рады ўсіх узроўняў праходзяць адначасова, дэпутаты маюць права выстаўляць свае кандыдатуры ў Рады розных узроўняў. Рады ажыцьцяўляюць сваю дзейнасьць шляхам правядзеньня сэсіяў, арганізацыі сталых і часовых камісіяў і іншых органаў.

Канстытуцыя 1996 году вызначае межы паўнамоцтваў мясцовых Радаў такім чынам: яны маюць выключнае права на зацьверджаньне праграмаў эканамічнага разьвіцьця, мясцовых бюджэтаў і справаздачаў аб іх выкананьні; устанаўленьне новых падаткаў у адпаведнасьці з законам і вызначэньне парадку распараджэньня камунальнай маёмасьцю; яны ж прызначаюць мясцовыя рэфэрэндумы. Закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» дазваляе Радам разьмяркоўваць паўнамоцтвы паміж Радамі розных узроўняў пры ўзаемнай згодзе, а таксама перадаваць частку сваіх паўнамоцтваў выканаўчым і распарадчым органам, таксама пры згодзе зь імі.

Такім чынам, фармальна Рады маюць некаторыя паўнамоцтвы, якія ў адпаведнасьці з законам дазваляюць ім прымаць рашэньні наконт кіраваньня пэўнай тэрыторыяй. Але працэс кіраваньня складаецца ня толькі з працэсу прыняцьця рашэньняў, але і з працэсу іх выкананьня, а таксама з кантролю над якасьцю гэтага выкананьня. Таму палітычная роля ўстановы вызначаецца ня толькі яе фармальнымі паўнамоцтвамі, але і тым, ці існуюць сапраўдныя мэханізмы рэалізацыі гэтых паўнамоцтваў. Таму кампэтэнцыю мясцовых Радаў варта аналізаваць, супастаўляючы яе з кампэтэнцыяй выканкамаў і мясцовых адміністрацыяў (у гарадох).

Фармальна выканкамы і мясцовыя адміністрацыі ў гарадох падпарадкуюцца мясцовым Радам. Але насамрэч можна гаварыць пра наяўнасьць вельмі ўскосных і слабых магчымасьцяў мясцовых прадстаўнічых органаў кантраляваць дзейнасьць фармальна падпарадкаваных ім выканкамаў. Выканкамы ёсьць органамі мясцовага кіраваньня, беспасярэдне залежнымі ад органаў цэнтральнай выканаўчай улады і кіраваньня (прэзыдэнта і Рады Міністраў). Яны складаюцца з старшыні, яго намесьнікаў, кіраўніка справамі і чальцоў выканкаму. Функцыянэры на ўсіх гэтых пасадах — палітычныя чыноўнікі, якія беспасярэдне ці ўскосна прызначаюцца прэзыдэнтам. Старшыня абласнога выканкаму прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад яе беспасярэдне прэзыдэнтам ці ў парадку, усталяваным прэзыдэнтам. Пасьля гэтага адпаведная Рада адкрытым галасаваньнем павінна зацьвердзіць старшыню, прызначанага прэзыдэнтам. Пры гэтым закон не забараняе прысутнасьці афіцыйных асобаў, у тым ліку самога прэзыдэнта, на сэсіі Рады, калі праходзіць зацьверджаньне кандыдатуры (акурат так,

у прысутнасьці Лукашэнкі, былі прызначаныя ў 1995 годзе першыя старшыні выканкамаў).

Кіраўнікі ніжэйпаложаных выканкамаў прызначаюцца кіраўнікамі вышэйпаложаных пры наступным узгадненьні з адпаведнай Радай. Старшыня выканкаму прызначае яго чальцоў. Палажэньні «Аб старшыню абласнога, Менскага гарадзкога выканаўчага камітэту» і «Аб старшыню раённага і гарадзкога выканаўчага камітэту» дазваляюць Радзе адхіліць кандыдатуру, прапанаваную прэзыдэнтам ці вышэйпаложаным выканкамам, толькі аднаго разу. У выпадку паўторнага адхіленьня Радай прапанаванай кандыдатуры прэзыдэнт ці старшыня вышэйпаложанага выканкаму маюць права прызначыць старшыню без узгадненьня з Радай. Дзеля гэтага Рада фактычна ня мае магчымасьці ўплываць ні на прызначэньне, ні на звальненьне старшыні выканкаму. Рэальнай функцыяй Рады ёсьць зацьверджаньне, ці легітымізацыя, кандыдатуры, прапанаванай выканаўчай уладай. Пры гэтым прызначэньне старшыні — гэта амаль адзіная сытуацыя, калі Рада як прадстаўнічы мясцовы орган фармальна ўплывае на дзейнасьць выканкаму як выканаўчага органу.

Фармальна тэрмін паўнамоцтваў выканкаму не павінен перавышаць тэрміну паўнамоцтваў адпаведнай Рады (закон абмяжоўвае гэтую норму толькі ў выпадку сельскай і гарадзкой — у гарадох раённага падпарадкаваньня — Радаў). Аднак адсутнасьць абмежаваньняў на пасады для чальцоў выканкаму (закон не вызначае колькасьці тэрмінаў займаньня пасады і крытэраў ацэнкі дзейнасьці старшыні выканкаму) і іх кулюарнае прызначэньне ў выніку прыводзяць да таго, што тэрмін паўнамоцтваў выканкамаў перавышае адпаведны тэрмін Радаў, калі іншае ня вызначана прэзыдэнтам, які мае выключную кампэтэнцыю на звальненьне старшыняў абласных выканкамаў.

Артыкул 9 закону «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» прадугледжвае беспасярэднае падпарадкаваньне і падкантрольнасьць старшыняў выканкамаў усіх узроўняў прэзыдэнту. Апрача гэтага, кіраўнікі абласных выканкамаў падпарадкуюцца Радзе Міністраў у пытаньнях, якія ўваходзяць у кампэтэнцыю ўраду, а кіраўнікі выканкамаў першаснага і базавага ўзроўняў падпарадкуюцца ў гэтых пытаньнях вышэйпаложаным выканаўчым органам. Закон прадугледжвае толькі «адказнасьць» і ў некаторых выпадках «падкантрольнасьць» выканкамаў усіх узроўняў адпаведным Радам у пытаньнях, якія знаходзяцца ў выключнай кампэтэнцыі гэтых Радаў. Што вельмі важна, закон нават у гэтых выпадках не прадугледжвае падпарадкаванасьці выканкамаў адпаведным Радам.

Але мэханізмы адказнасьці выканкамаў таксама нявызначаныя: толькі прэзыдэнт мае выключнае права звальненьня з пасады старшыняў выканкамаў, а таксама валодае яшчэ адной вельмі важнай кантрольнай функцыяй: згодна з артыкулам 50 закону, ён мае права ў выпадку парушэньня службовымі асобамі выканкамаў і мясцовых адміністрацыяў заканадаўства і невыкананьня пастановаў вышэйшых дзяржаўных органаў звальняць шараговых службоўцаў выканкамаў.

Прэзыдэнт мае права скасоўваць пастановы выканкамаў, калі яны супярэчаць заканадаўству. Закон не прадугледжвае магчымасьцяў абскарджаньня дзеяньняў прэзыдэнта што да чальцоў мясцовых выканкамаў ці што да скасаваных прэзыдэнтам пастановаў.

Такім чынам, нягледзячы на падвоенае падпарадкаваньне, мясцовыя выканкамы фактычна падпарадкоўваюцца цэнтральнай уладзе — у першую чаргу прэзыдэнту. Толькі прэзыдэнту — кіраўніку выканаўчай улады — належаць сапраўдныя мэханізмы ўзьдзеяньня на дзейнасьць старшыняў выканкамаў, а ў асобных выпадках — і на дзейнасьць службовых асобаў выканкамаў.

У сапраўднасьці мясцовыя Рады ня могуць самастойна ўплываць на выканкам нават у межах сваёй кампэтэнцыі. Прызначэньне, звальненьне з пасады і іншыя санкцыі што да старшыняў выканкамаў знаходзяцца ў кампэтэнцыі прэзыдэнта ці выканкамаў вышэйшага ўзроўню (як было адзначана, Рада толькі зацьвярджае яго на пасадзе, але ня мае права звольніць ці ўжыць іншыя санкцыі).

Пастановы ў межах сваёй кампэтэнцыі прымаюцца выканкамам і зацьвярджаюцца вышэйпаложаным выканкамам. І толькі адзін раз за год выканкам дакладае аб сваёй дзейнасьці Радзе, але санкцыяў зь ейнага боку ў выпадку неадпаведнай закону дзейнасьці выканкаму таксама не прадугледжваецца. Дысцыплінарныя спагнаньні на старшыняў выканаўчых камітэтаў накладае старшыня вышэйпаложанага выканкаму.

Рада ня мае магчымасьці ўплываць на выканкам і ў арганізацыйных пытаньнях. Такія пытаньні, як вызначэньне структуры, штатаў выканкаму, а таксама фармаваньне бюджэту выканкаму, вырашаюцца самімі выканкамамі пры ўзгадненьні з вышэйпаложанымі выканкамамі і адпаведнымі органамі дзяржаўнага кіраваньня. Мясцовыя Рады ня маюць магчымасьці самастойна фармаваць мясцовыя бюджэты, якія ёсьць часткай агульнадзяржаўнага кансалідаванага бюджэту.

Функцыянальна мясцовыя прадстаўнічыя органы ўлады ў Беларусі маюць дэкаратыўны статус і вельмі абмежаваныя ў магчымасьцях рэальна ажыцьцяўляць кіраваньне мясцовымі справамі. Таму барацьба за мандаты ў мясцовых Радах мае хутчэй інфармацыйна-статусны, чым рэальны функцыянальна-ўладны сэнс.

Але нягледзячы на адсутнасьць функцыянальнай улады, дэпутаты мясцовых Радаў маюць «статусны ўплыў». Бальшыня правоў, якія мае дэпутат згодна з законам «Аб статусе дэпутатаў мясцовых Радаў», рэалізуецца не праз палітычныя інстытуты, а праз мэханізмы публічнага ўплыву. Галоўны рэсурс дэпутата — нават ня ўплыў на працэс прыняцьця рашэньняў у межах Рады, а магчымасьць дзякуючы свайму статусу прыцягваць увагу для разьвязаньня важных для выбарцаў праблемаў і называць вінаватых у тым выпадку, калі гэтыя праблемы не вырашаюцца. Магчымасьці функцыянальнага палітычнага ўплыву праз нарматворчую і нормаўжывальную дзейнасьць абмежаваныя недзеяздольным станам Рады як органу прадстаўнічай улады. Так, артыкул 15 закону замацоўвае за дэпутатамі правы ўносіць прапановы і заўвагі, праекты пастановаў і папраўкі да іх на сэсіі мясцовай Рады, вылучаць кандыдатуры ў склад органаў, якія ўтварае Рада, прапаноўваць заслухаць на сэсіі справаздачу органаў, падсправаздачных Радзе, а таксама вылучаць кандыдатуры ў склад гэтых органаў і г.д. Але бальшыня з гэтых функцыянальных правоў ня мае сэнсу ўва ўмовах адсутнасьці паўнавартаснага кантролю Радаў над дзейнасьцю выканаўчых органаў.

Значнейшымі сродкамі ўзьдзеяньня на палітычны працэс ёсьць кантрольныя і публічныя паўнамоцтвы дэпутата, якія, аднак, не гарантуюцца інстытуцыйна. Дэпутат ёсьць асобай, якая мае замацаваныя законам магчымасьці прыцягнуць грамадзкую ўвагу да той ці іншай праблемы. Але ён ня мае вагароў разьвязаньня гэтых праблемаў. Так, артыкул 14 надзяляе яго правам самастойна ці з групай дэпутатаў скласьці дэпутацкі запыт. Таксама дэпутат мае права патрабаваць ад службовай асобы даць на сэсіі Рады афіцыйнае тлумачэньне ў пытаньнях, якія датычаць найважнейшых грамадзкіх інтарэсаў на тэрыторыі Рады. Дзяржаўны орган, да якога накіраваны запыт, павінен у дзесяцідзённы ці іншы ўсталяваны законам тэрмін даць афіцыйны адказ на запыт. Запыт і адказ павінны быць даведзеныя да ведама грамадзтва праз СМІ.

Рада мае права абавязаць дзяржаўны орган ці службовую асобу даць справаздачу аб выкананьні сваёй пастановы, але сродкі кантролю зь яе боку над якасьцю выкананьня пастановы не вызначаюцца законам, таксама як і канкрэтная адказнасьць службовай асобы за невыкананьне пастановы.

Згодна з артыкулам 17, дэпутат мае права браць удзел у праверках працы дзяржаўных і грамадзкіх органаў, прадпрыемстваў і арганізацыяў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рады, уносіць у Раду прапановы аб правядзеньні праверкі або расьсьледаваньня працы дзяржаўных і грамадзкіх органаў, прадпрыемстваў і арганізацыяў. Такая праверка мае забясьпечыць інфармацыяй Раду для прыняцьця адпаведных рашэньняў. Аднак функцыянальныя мэханізмы ўзьдзеяньня з боку Рады на прадпрыемствы і ўстановы адсутнічаюць, таму што падпарадкаваньне гэтых установаў Радзе ажыцьцяўляецца праз выканкам. Апошні і гаспадарыць на тэрыторыі Рады.

Артыкул 19 надзяляе дэпутата правам на дэпутацкае расьсьледаваньне, якое вядзецца створанай на пастанову Рады дэпутацкай камісіяй. Вынікам расьсьледаваньня ёсьць матываванае заключэньне, па якім Рада прымае рашэньне.

Згодна з артыкулам 19, дэпутат мае права ўдзельнічаць з правам дарадчага голасу ў разглядзе органамі дзяржаўнай улады і кіраваньня, органамі адпаведных грамадзкіх аб'яднаньняў пытаньняў, што закранаюць інтарэсы грамадзян акругі, і патрабаваць рашэньня гэтых пытаньняў, правяраць з прыцягненьнем спэцыялістаў кантрольна-рэвізійных і праваахоўных органаў зьвесткі аб парушэньні законаў, правоў і інтарэсаў грамадзян. Дэпутат мае права праводзіць сходы выбарцаў акругі, выступаць у пытаньнях дэпутацкай дзейнасьці ў СМІ. Але закон не прадугледжвае аніякіх гарантыяў ажыцьцяўленьня гэтых правоў.

Мясцовыя Рады і іх дэпутаты маюць ня столькі палітычную ўладу ў рэгіёнах, колькі ўплыў, які адрозьніваецца ад улады адсутнасьцю рэальных сродкаў для рэалізацыі прынятых імі рашэньняў. Рэалізацыя пастановаў Радаў і дзейнасьць іх дэпутатаў ня ёсьць інстытуцыйна гарантаванай. Таму ўдзел у дзейнасьці Радаў мае форму больш інфармацыйнага, грамадзкага, чым палітычнага ўплыву.

Для ўладаў кантроль над складам Радаў ёсьць не пытаньнем іх поўнага падпарадкаваньня, а пытаньнем прадухіленьня залішняй актыўнасьці дэпутатаў, якая можа дэстабілізаваць грамадзка-палітычную сытуацыю ў рэгіёнах. З гэтага вынікае тое, што ўладам не патрэбныя цалкам падпарадкаваныя мясцовыя Рады. Рэжыму дастаткова, каб гэтыя ўстановы не праяўлялі залішняй актыўнасьці.

## Фармаваньне сыстэмы мясцовага кіраваньня і самакіраваньня. Перадумовы фармаваньня мясцовай улады ў постсавецкі час

Цяперашняя сыстэма мясцовай улады ў Беларусі пачала фармавацца на схіле існаваньня СССР. Адным з галоўных лёзунгаў гарбачоўскай перабудовы была перадача рэальнай улады органам прадстаўнічай улады — рэспубліканскім і мясцовым Радам. У Беларусі першыя выбары ў мясцовыя Рады прайшлі яшчэ ў 1990 годзе. Яны выперадзілі ня толькі прыняцьце рэспубліканскіх законаў, якія рэглямэнтавалі іх дзейнасьць, але і ўтварэньне самой незалеж-

най дзяржавы. У выніку дэпутаты, абраныя за савецкім часам, па савецкіх традыцыях, былі адзінай сілай, якая прадстаўляла лякальныя інтарэсы адразу пасьля здабыцьця незалежнасьці і заканадаўчага афармленьня асноваў мясцовай улады.

На пачатку 90-х гадоў ува ўмовах адсутнасьці досьведу канкурэнтных выбараў грамадзтва ўспрымала палітычны сьвет праз акуляры, надзетыя пры савецкай уладзе. Палітычныя партыі яшчэ ня склаліся як актары палітычнай сыстэмы. Увесну 1990 году на палітычнай сцэне краіны існавалі толькі дзьве ўплывовыя сілы. Па-першае, КПБ, утвораная яшчэ ў савецкія часы беларуская філія КПСС, што згубіла пасьля скасаваньня ў студзені 1990 году 6 артыкулу Канстытуцыі СССР свой палітычна прывілеяваны статус, але захавала ўплыў, а таксама апарат, які складаўся зь вялікай колькасьці функцыянэраў. Пасьля абвяшчэньня ў сакавіку 1991 году пераходу да шматпартыйнай сыстэмы 4 чэрвеня 1991 году КПБ была зарэгістраваная як рэспубліканская партыя.

Па-другое — апазыцыйныя сілы, найбольш вядомай зь якіх быў рух БНФ, які нядаўна зьявіўся на легальным палітычным полі (як партыя быў зарэгістраваны таксама толькі ў 1991 годзе).

Тэрмін правядзеньня мясцовых выбараў супаў з парой фармальнай аднапартыйнасьці, бальшыня кандыдатаў, якія ішлі на выбары не ад КПСС-КПБ, вымушаныя былі рэгістравацца як беспартыйныя.

Першы склад мясцовых Радаў адлюстроўваў стан грамадзтва, якое яшчэ не пазбавілася ад путаў камуністычнай ідэалёгіі, і таму не прадстаўляў інтарэсаў асобных групаў грамадзтва. 67,4% ад агульнай колькасьці абраных кандыдатаў складалі сябры КПСС і УЛКСМ. У выніку кіраўніцтва першых Радаў ня толькі складалася пераважна зь сяброў КПСС, але і сумяшчала савецкія і партыйныя пасады. Так, па словах Уладзімера Леўчыка, старшыні камісіі ВР у пытаньнях мясцовых Радаў і разьвіцьця мясцовага самакіраваньня, у лютым 1991 году 4 абласныя (з 6), тры гарадзкія і абсалютная бальшыня Радаў раённага і гарадзкога ўзроўняў узначальваліся па сумяшчальніцтве сакратарамі адпаведных партыйных камітэтаў.

Мясцовыя Рады ў Беларусі ня сталі падмуркам так званай «муніцыпальнай рэвалюцыі», якой ад іх чакалі. На гэта ў краіне існавалі дзьве прычыны.

Першая прычына — слабасьць групаў, зацікаўленых у пераменах і сьвядомых сваіх інтарэсах. Паколькі перамены былі распачатыя зьверху, яны не былі яшчэ аб’яднаныя і гатовыя для прадстаўніцтва гэтых інтарэсаў. Нават дэмакратычныя кандыдаты не знаходзілі паміжсобку паразуменьня ў Радах. Напрыклад, у тагачаснай Менскай гарадзкой Радзе існавалі чатыры апазыцыйныя дэпутацкія групы, якія часта канфрантавалі паміж сабой.

Палітычныя рэформы ў той час у краіне праводзіліся зьверху, і таму існавала шмат людзей, згодных з тым, што нешта трэба мяняць, але было вельмі мала тых, каму было зразумела, што канкрэтна трэба трансфармаваць на мясцовым узроўні (а менавіта тут палітыка набывае сапраўднае напаўненьне).

Усьвядомленых інтарэсаў ня мела ня толькі грамадзтва, але і палітычная эліта. У адрозьненьне ад іншых рэспублік СССР, прамысловасьць Беларусі складалася пераважна не з сыравіназдабыўчых, а зь пераапрацоўчых прадпрыемстваў. Іх эфэктыўнасьць залежыць ад трываласьці вонкаваэканамічных сувязяў, якія ўва ўмовах постплянавай эканомікі амаль немагчыма стварыць без падтрымкі з боку дзяржавы, што значна зьмяншала памер эканамічнай выгады ад прыватнага кантролю над імі.

У 1991 годзе быў прыняты закон «Аб прадпрыемствах у БССР», які насьледаваў адпавед-

наму закону СССР, згодна зь якім кіраўнікі прадпрыемстваў атрымалі незалежнасьць ад партыйных органаў і цэнтралізаванага плянаваньня, а таксама права самастойна фармаваць цэны на прадукцыю і распараджацца прыбыткам. Але адначасова на кіраўнікоў прадпрыемстваў былі ўскладзеныя абавязкі плянаваньня, пошуку рэсурсаў і шляхоў збыту прадукцыі. Гэта прывяло, з аднаго боку, да некантраляванага ўзросту заработнай платы і разьвіцьця сацыяльнай сфэры пры прадпрыемствах, а зь іншага — да агульнага спаду вытворчасьці.

Эканамічны крызыс, адсутнасьць у краіне вялікіх запасаў натуральных выкапняў (накшталт нафты, газу, мэталаў і г.д.), зь якіх можна было б атрымліваць прыбытак ад іх продажу пасьля першаснай апрацоўкі, зрабіла справу кіраваньня мясцовымі эканомікамі мала прывабнай для рэгіянальных элітаў. Праблемаў ад самастойнага кантролю над імі было значна больш, чым прыбытку. Таму мясцовыя палітычныя і эканамічныя эліты не сьпяшаліся рваць з цэнтрам, пашыраць і замацоўваць сваю кампэтэнцыю, карыстаючыся распачатай зьверху муніцыпалізацыяй, як гэта было, напрыклад, у Расеі.

У краіне склаліся мясцовыя патрон-кліенцкія групоўкі. Але іх галоўнай мэтай была ня ўлада і не кантроль у рэгіёнах. Гэтыя рэсурсы ўва ўмовах адносна беднай на матэрыяльныя вартасьці краіны мала што давалі, апрача адчуваньня асабістай значнасьці. Паляпшэньне матэрыяльнага дабрабыту прадстаўніка мясцовай намэнклятуры наступала праз узмацненьне яго пазыцыяў у сталіцы. Пасада ў мясцовых органах успрымалася перш за ўсё як трамплін для скачка ўгору.

Другая прычына паразы «муніцыпальнай рэвалюцыі» — адсутнасьць у новых дэпутатаў (асабліва дэпутатаў ненамэнклятурнага паходжаньня) навыкаў муніцыпальнай працы і эфэктыўнага лабіраваньня сваіх інтарэсаў. Гэтая рыса была прышчэпленая савецкай сыстэмай, якая, кантралюючы і накіроўваючы яе зьверху, стымулявала такую актыўнасьць масаў, якая арыентавалася не на дасягненьне эфэктыўных вынікаў, а на сам працэс*. Значная колькасьць дэпутатаў не ўсьведамляла сваіх рэальных паўнамоцтваў і функцыяў. Былі выпадкі, калі дэпутаты, выкрыўшы парушэньне закону, не маглі прыцягнуць вінаватых да адказнасьці, бо ня ведалі, як гэта зрабіць. А старшыня Рады чыніў ім перашкоды, бо быў прадстаўніком генэрацыі намэнклятурнай эліты, па-сяброўску і эканамічна павязанай зь мясцовымі гандлёвымі ці іншымі блізкімі да разьмеркаваньня рэсурсаў на мясцовым узроўні групоўкамі. Шараговыя дэпутаты вызваляліся ад асноўнай занятасьці толькі на тэрмін сэсіяў адпаведных Радаў — гэта значыць, што ў астатні час павінны былі ажыцьцяўляць свае працоўныя функцыі. А пры савецкай мадэлі эканомікі працаваць — гэта значыць прысутнічаць на працоўным месцы ў працоўны час. Праца ў Радах разглядалася як дадатковая нагрузка.

Такім чынам, мясцовая палітычная эліта імкнулася захаваць карпаратыўныя сувязі, а не пашыраць абсягі сваёй кампэтэнцыі. У большыні рэспублік былога СССР, напрыклад, у Расеі, значная частка мясцовай савецкай эліты імкнулася парваць з цэнтральнымі органамі кампартыі, каб атрымаць большыя паўнамоцтвы ды ажыцьцявіць прыватызацыю маёмасьці і статусу.

---

* Нават у Вярхоўнай Радзе дэпутатам было важней заявіць пра свае пазыцыі, а не прапанаваць тэхналёгіяў вырашэньня праблемаў. Так, напрыклад, з усіх ідэяў, прапанаваных у ВР, палітычна найбольш рэзанансавай стала праблема барацьбы з карупцыяй. Але «барацьба» зводзілася да нейкага «сакральнага» адкрыцьця імёнаў. У адрозьненьне ад чароўнага сьвету казак, каб перамагчы зло, недастаткова «назваць імёны» злачынцаў, трэба ўсталяваць інстытуцыйныя мэханізмы, якія б прадухілялі паўтарэньне парушэньняў законнасьці. Аднак палітычная дзейнасьць мясцовых Радаў на пачатку 90-х гадоў XX ст. часта зводзілася да «паляваньня на карупцыянэраў».

У Беларусі ня толькі цэнтральнае партыйнае кіраўніцтва не сьпяшалася адыходзіць ад Масквы, браць уладу ў свае рукі, але і кіраўнікі Радаў і іх выканкамаў, а таксама дэпутаты Радаў да апошняга спалучалі пазыцыі ў Радах з партыйнымі пасадамі і не выходзілі з падпарадкаваньня рэспубліканскаму цэнтру. Існуюць зьвесткі, што гэта рабілася пад ціскам з боку ЦК КПБ. Так, 90% дэпутатаў Гомельскай абласной Рады 1990 году абраньня былі камуністамі, а 65% займалі высокія партыйныя і савецкія пасады. З аднаго боку, гэты паказьнік адлюстроўвае ідэалягічнае становішча грамадзтва на той момант. Але гэтыя 90% былі маналітнай групай — у КПБ фактычна не існавала рэфарматарскіх плыняў. Такая маналітнасьць кіруючай эліты ў рэгіёнах блякавала актыўнасьць у Радах новых дэмакратычных дэпутатаў і тым самым запавольвала ратацыю мясцовай палітычнай эліты.

У выніку Рады не сьпяшаліся браць уладу. Выбраныя мясцовыя органы ўлады (асабліва ў сельскай мясцовасьці) часта дэ-факта адмаўляліся ад стварэньня прэзыдыюмаў Радаў, дзеля чаго ўлада на месцах канцэнтравалася ў руках кіраўнікоў Радаў — выхадцаў з партыйнай намэнклятуры, зьвязанай зь менскім партыйным кіраўніцтвам.

Наступныя мясцовыя выбары, у выніку якіх магла б ажыцьцявіцца ратацыя мясцовай эліты, адбыліся толькі ўвесну 1995 году, калі палітычная сыстэма была ўжо заканадаўча афармленая і распачалася яе цэнтралізацыя на карысьць прэзыдэнцкай улады. Дзеля таго што фармаваньне мясцовай улады адбылося да яе заканадаўчага афармленьня, гэтае афармленьне прайшло без удзелу асобаў, зацікаўленых у яе функцыянальнай дзеяздольнасьці.

Падчас заканадаўчага афармленьня мясцовай улады цэнтральнае пытаньне было ня ў тым, каб яна магла эфэктыўна працаваць і выконваць свае функцыі (што прадугледжвае яснае вызначэньне распадзелу кампэтэнцыі і ўсталяваньне гарантыяў недатыкальнасьці гэтай кампэтэнцыі з боку цэнтру), а ў захаваньні элемэнтарных дэмакратычных нормаў, якія б не дазволілі цэнтральнай партыйнай уладзе ажыцьцяўляць амаль неабмежаваны кантроль на месцах.

Сытуацыя аморфнасьці і нявызначанасьці становішча мясцовай улады была выкарыстаная цэнтральнай партыйнай уладай. Падчас распрацоўкі і прыняцьця ў ВР у 1991 годзе закону «Аб мясцовым кіраваньні і мясцовай гаспадарцы ў БССР» не існавала моцных мясцовых лобі, але было магутнае лобі ад Рады Міністраў. Каб захаваць мэханізмы кантролю ў рэгіёнах, Рада Міністраў нават «прасоўвала» ідэю аб скасаваньні прэзыдыюмаў мясцовых Радаў на той падставе, што наяўнасьць такой структуры выклікае падваеньне ўлады паміж прэзыдыюмам мясцовай Рады і выканкамам. У такіх умовах скасаваньне прэзыдыюмаў дазваляла сканцэнтраваць уладу ў рэгіёнах у руках старшыняў Радаў, зрабіць яе амаль неабмежавана падкантрольнай Радзе Міністраў і кіраўніцтву КПБ.

Вынікам барацьбы вакол пытаньня аб прэзыдыюмах стала кампрамісная фармулёўка, якая была зафіксаваная ў законе: «У абласной, Менскай гарадзкой, раённай і раённай у горадзе Радах могуць утварацца прэзыдыюмы». Што трэба разумець: а могуць і не ўтварацца. Кіраўнікі камісіяў Рады, якія згодна з прынятым законам павінны былі складаць прэзыдыюм, мусілі працаваць у ім, сумяшчаючы дзейнасьць з сваёй асноўнай прафэсійнай дзейнасьцю. Так быў зроблены першы крок да памяншэньня дзеяздольнасьці мясцовых прадстаўнічых органаў. Менавіта слабасьць і неакрэсьленасьць пазыцыяў шараговых дэпутатаў мясцовых Радаў прывялі да таго, што яны так і не атрымалі рэальнай улады.

Прызначэньне закону «Аб мясцовым кіраваньні і мясцовай гаспадарцы ў БССР» палягала ў стварэньні мясцовага самакіраваньня і падзелу кампэтэнцыі паміж органамі мясцовага

кіраваньня і мясцовага самакіраваньня. Праз кароткі час пасьля прыняцьця закону ў яго пачалі ўносіцца зьмены. Бальшыня зь іх ня толькі пацьвердзіла функцыянальную слабасьць сфармаванай мясцовай улады, але і яшчэ больш аслабіла яе.

Так, у 1993 годзе, за два гады па ўтварэньні, мясцовыя Рады былі пазбаўленыя значнай часткі сваёй кампэтэнцыі на карысьць цэнтральнай ці мясцовай выканаўчай улады. Згодна зь зьменамі ад 17 чэрвеня 1993 году, паўнамоцтвы па аб'яднаньні Радаў адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак з адзіным цэнтрам перайшлі ад мясцовых Радаў да Рады Міністраў. Рады пазбавіліся права самастойна вызначаць штат выканкамаў (арт. 8, п. 2, пп. 6) і органаў Радаў (арт. 9), падзяліўшы гэтае права з самімі выканкамамі і, што больш істотна, зь міністэрствамі і ведамствамі (арт. 14).

Адначасна за кошт перацягваньня паўнамоцтваў прадстаўнічых органаў пашырыліся паўнамоцтвы выканкамаў Радаў у сфэрах, важных для кантролю над рэалізацыяй прынятых рашэньняў. Напрыклад, згодна з папраўкамі да артыкула 43 закону, яны атрымалі права адхіляць ад пасадаў кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў за невыкананьне пастановаў органаў дзяржаўнай улады да адпаведнага судовага рашэньня.

Такім чынам, з самага  пачатку ўсталяваньня мясцовай улады ў постсавецкай Беларусі назіралася тэндэнцыя да зьмяншэньня сфэры выключнай кампэтэнцыі мясцовай прадстаўнічай улады, пашырэньня кампэтэнцыі мясцовай выканаўчай улады і паступовага ўсталяваньня падпарадкавальных сувязяў паміж цэнтральнымі і мясцовымі органамі выканаўчай улады, мінаючы мясцовыя прадстаўнічыя органы. Гэтыя зьмены не сустракалі хоць якога супрацьдзеяньня з боку прадстаўнічай мясцовай улады. Абыякавае стаўленьне Радаў да кантролю над выканкамамі, установамі, празь якія ажыцьцяўляецца рэалізацыя іх рашэньняў, сьведчыць, што для мясцовых Радаў не была першаснай мэта ажыцьцяўленьня кіраўніцтва адпаведнай тэрыторыяй.

27 сакавіка 1992 году быў прыняты «Закон аб статусе народнага дэпутата мясцовай Рады народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусі», які вызначаў паўнамоцтвы для дэпутатаў мясцовых Радаў. Да 1995 году была прынятая толькі адна папраўка да яго, згодна зь якой усталёўваліся гарантыі для дэпутата пры ажыцьцяўленьні дэпутацкіх паўнамоцтваў. Ува ўсім законе цягам тэрміну яго існаваньня найбольшую ўвагу палітыкаў выклікалі артыкулы 37 «Прыцягненьне дэпутата да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасьці» і 38 «Парадак разгляду пытаньня аб пазбаўленьні дэпутацкіх паўнамоцтваў». Гэтыя артыкулы вызначалі мэханізмы забесьпячэньня недатыкальнасьці дэпутата мясцовай Рады. Падчас існаваньня закону з 1992 па 1997 год яны перажылі тры рэдакцыі: 27 сакавіка 1992 году, 20 сакавіка 1996 году і 4 ліпеня 1997 году, пакуль артыкул 38 ня быў канчаткова скасаваны.

Асаблівасьці фармаваньня і функцыянаваньня мясцовай улады ў Беларусі да 1995 году дазваляюць зрабіць выснову, што з пачатку свайго існаваньня ў краіне Рады функцыянавалі ня столькі як органы прадстаўнічай улады, якія вырашаюць мясцовыя пытаньні па сваіх інтарэсах і пад сваю адказнасьць, колькі як органы прадстаўніцтва асобаў і атрыманьня статусу. Таму яны былі няздольныя і незацікаўленыя ў тым, каб адстойваць і пашыраць свае правы і сфэру сваёй выключнай кампэтэнцыі. У адрозьненьне ад Расеі ці Ўкраіны, у Беларусі не існавала спаважнага рэгіянальнага палітычнага лобі, а таму мясцовая ўлада ня дзеяла як палітычны актар.

## Цэнтралізацыя мясцовай улады

Ува ўмовах неакрэсьленасьці пазыцыяў мясцовай улады яе паступовае падпарадкаваньне цэнтру было заканамерным. Калі ў кастрычніку 1994 году з ініцыятывы прэзыдэнта Лукашэнкі былі прынятыя папраўкі ў закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні», крыніцай пратэсту супраць зьменаў сталі не рэгіёны, ня Рады і выканкамы, чые інтарэсы яны парушалі, а сталічная палітычная эліта.

Галоўным вынікам рэформы 1994—1995 гадоў было канчатковае пазбаўленьне мясцовых элітаў палітычнага кантролю над рэсурсамі і ўладай у рэгіёнах. І мясцовыя эліты на гэта пагадзіліся. Закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» быў прыняты ВР бальшынёй галасоў. А зварот у Канстытуцыйны Суд з патрабаваньнем разгледзець пытаньне аб яго адпаведнасьці Канстытуцыі падпісалі толькі 80 дэпутатаў з 260, што менш за трэцюю частку яго складу, дарма што прадстаўнікі ад рэгіёнаў складалі ня менш за 5/6 ад агульнай колькасьці парлямэнтароў.

Працэсу канцэнтрацыі ўлады папярэднічала «функцыянальная» і інфармацыйная падрыхтоўка рэгіянальных асяродзьдзяў і грамадзкай сьвядомасьці.

З жніўня па лістапад 1994 году былі замененыя амаль усе кіраўнікі абласных сілавых структураў. У Віцебску, Гомелі і Магілёве зьмяніліся кіраўнікі УУС і УКДБ вобласьці. У Берасьці і Менску зьмяніліся кіраўнікі УУС, у Менску наноў прызначаны кіраўнік УКДБ.

2 жніўня 1994 году было прынятае палажэньне аб Камітэце па барацьбе з карупцыяй у органах улады, кіраўніком якога быў прызначаны Юры Малумаў. Але інфармацыйная кампанія ў СМІ прэзэнтацыі грамадзтву гэтай структуры пачалася толькі на пачатку кастрычніка 1995 году — за два месяцы па ўтварэньні камітэту і за некалькі дзён да разгляду зьменаў у закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні». Пры гэтым падкрэсьлівалася, што камітэт сочыць за ўсімі «ад прэзыдэнта да старшыні выканкаму»[1]. А акурат на пачатку разгляду закону, паводле Генадзя Карпенкі, прэзыдэнцкая каманда правяла «кансультацыі з дэпутатамі — мясцовымі кіраўнікамі»[2]. Вядома, гэтыя захады праводзіліся ня толькі дзеля ўціску на мясцовыя эліты, але гэткі ўціск быў ажыцьцёўлены.

Рыторыка Лукашэнкі і яго атачэньня ў зваротах да ВР падчас разгляду рэформы мясцовага самакіраваньня паказвала, што супрацьдзеяньня ад рэгіёнаў амаль не чакалася. Так, напрыклад, Аляксандар Фядута (на той момант начальнік Упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі АП) пагражаў, што, калі закон ня будзе прыняты, «АП утворыць гэтыя структуры на месцах явачным парадкам»[3].

Прапанаваныя зьмены ня толькі пагаршалі стан прадстаўнічых органаў улады, замацоўвалі падпарадкаванае становішча выканкамаў, пазбаўлялі мясцовыя эліты і рэгіянальныя супольнасьці магчымасьці хоць якога ўплыву на фармаваньне і рэалізацыю рашэньняў на мясцовым узроўні, але і канчаткова пазбаўлялі іх кантролю над прамысловасьцю на тэрыторыі сваіх рэгіёнаў. Народ пазбаўляўся права на самакіраваньне, яго прадстаўнікі — на ажыцьцяўленьне ўлады, пахіснуліся і пазыцыі кіраўнікоў мясцовых прамысловых прадпрыемстваў.

[1] Белорусская деловая газета. 1994. 3 октября.

[2] Белорусская деловая газета. 1994. 6 октября.

[3] Белорусская деловая газета. 1994. 6 октября.

У першым варыянце зьменаў у закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні», прапанаваных прэзыдэнтам, прадугледжвалася скасаваньне мясцовых Радаў першаснага ўзроўню і іх выканкамаў і ўтварэньне замест іх мясцовых выканкамаў і мясцовых адміністрацыяў, кіраўнікі якіх беспасярэдне ці ўскосна падпарадкоўваліся прэзыдэнту. Калі згодна з ранейшымі папраўкамі ў законе выканкамы мелі магчымасьць самі прызначаць кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў на тэрыторыі рэгіёну, то цяпер гэтае права замацоўвалася за прэзыдэнтам, які тым самым мог беспасярэдне ўплываць на рэгіянальную эканамічную эліту.

Пасьля абскарджаньня закону ў Канстытуцыйным Судзе быў сфармуляваны «кампрамісны» варыянт, вынікам якога стала падваеньне ўлады на месцах. На ўсіх узроўнях пакідаліся мясцовыя прадстаўнічыя органы ўлады — Рады дэпутатаў, але паралельна ўтвараліся выканаўчыя і распарадчыя органы — выканаўчыя камітэты і мясцовыя адміністрацыі ў гарадох. Кіраўнікоў выканкамаў беспасярэдне ці ўскосна прызначаў прэзыдэнт. У выніку мэта рэформы была дасягнутая: адбылася канцэнтрацыя ня толькі палітычнай, але і эканамічнай улады ў руках цэнтральнай менскай улады.

Хроніка супрацьстаяньня Лукашэнкі і Канстытуцыйнага Суду сьведчыць аб тым, асноўнай мэтай першага было не скасаваньне Радаў, а акурат перападпарадкаваньне выканкамаў. Перад разглядам закону Канстытуцыйным Судом адбылася сустрэча яго чальцоў з прэзыдэнтам. Лукашэнка не настойваў на тым, каб былі пакіненыя ўсе папраўкі ў закон, яго галоўным патрабаваньнем была апэратыўнасьць яго прыняцьця. Магчыма, пункты па Радах наўмысна закладаліся ў праект паправак, каб было чым ахвяраваць. Кіраўнік АП Л. Сініцын[4] абмовіўся, што кандыдатуры для прызначэньня на пасады мясцовых кіраўнікоў А. Лукашэнка вызначыў яшчэ ў часе сваёй перадвыбарнай кампаніі. Гэта азначае, што ён меў досыць часу, каб сплянаваць стратэгію паводзінаў падчас рэформы, вывучыць расстаноўку сілаў у грамадзтве, знайсьці патрэбныя кадры ў сваёй камандзе, а таксама прадугледзець рэакцыю на свае захады.

З тактычных прычынаў, каб захаваць твар у вачах беларускага грамадзтва і міжнароднай супольнасьці ня толькі Канстытуцыйнаму Суду, але і самому сабе, Лукашэнка адмовіўся ад ідэі скасаваньня Радаў першаснага ўзроўню. Дзякуючы невялікай заплянаванай саступцы ён змог супакоіць тых, хто быў супраць рэформы.

Літаральна за два тыдні пасьля вынясеньня пастановы Канстытуцыйнага Суду па законе «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» з прэзыдэнцкай каманды пачалі сыходзіць т.зв. дэмакраты. Гэта была першая хваля кадравых зьменаў, калі Лукашэнку пакінула частка яго перадвыбарнай каманды.

Працэс фармаваньня «выканаўчай вэртыкалі» не сутыкнуўся зь вялікімі цяжкасьцямі. За невялікім выняткам, абласныя, а потым і ніжэйпаложаныя мясцовыя Рады прагаласавалі за новых кіраўнікоў выканаўчай улады. Прызначэньні адбываліся ў дзьве хвалі.

Першымі 28 лістапада 1994 году, за чатыры дні пасьля рашэньня Канстытуцыйнага Суду, былі прызначаныя старшыні Магілёўскага, Гомельскага і Віцебскага абласных выканкамаў, адпаведна Анатоль Кулічкоў, Павал Шыпук і Ўладзімер Андрэйчанка. Два з трох прызначаных — Кулічкоў і Андрэйчанка — выйшлі на гэтыя пазыцыі з пасадаў намесьнікаў старшыняў адпаведных выканкамаў, Шыпук — з гаспадарчай пасады ў Гомельскім рэгіёне. Нягледзь-

[4] Белорусская деловая газета. 1994. 14 ноября.

зячы на закрыты характар прызначэньняў, кандыдатура У. Андрэйчанкі нават магла быць ускосна ўзгоднена з абласной элітай.

За паўтара тыдня другой хваляй 9—12 лютага 1994 году былі прызначаныя старшыні абласных выканкамаў у Берасьці, Горадні і Менску, адпаведна Ўладзімер Заламай, Аляксандар Дубко і Пётра Пётух. У адрозьненьне ад прызначэнцаў першай хвалі, усе яны мелі сувязі з рэгіёнам прызначэньня, але не працавалі апошнім часам у органах мясцовай улады. Акурат у тых абласьцях, куды былі накіраваны прызначэнцы «другой хвалі», былі праблемы ці з самім прызначэньнем старшыняў выканкамаў, ці зь іх кадравай палітыкай.

Так, у Горадні абласная Рада выбірала старшыню выканкаму з трох кандыдатаў: Сямёна Домаша, Аляксандра Дубка і Ўладзімера Сямёнава, і прагаласавала за Дубка толькі другім наваратам. На першым галасаваньні Домаша адмовіўся зацьвердзіць Лукашэнка, а за Сямёнава не пажадала галасаваць Рада. Дубко сваю кандыдатуру зьняў. Калі Рада пад ціскам прэзыдэнта вымушаная была галасаваць зноў, Дубко стаў «кампраміснай асобай», на якую згадзіліся і прэзыдэнт, і Рада. Дзеяньні Дубка пасьля свайго прызначэньня А. Фядута вельмі ўдала назваў «кадравым пагромам». У кіраўніцтва абласной вэртыкалі былі прызначаны адзінаццаць старшыняў калгасаў.

У Берасьці сытуацыя звонку нагадвала гарадзенскую. Берасьцейскі старшыня Рады і выканкаму Віктар Бурскі задавальняў тамтэйшую намэнклятуру. Пры ім разьвівалася эканамічная інфраструктура рэгіёну (была створана свабодная эканамічная зона), які да таго ж атрымліваў дадатковыя прыбыткі ад свайго прымежнага становішча. Прызначэньне У. Заламая было вельмі ўдалым крокам, ён быў прыняты рэгіёнам як свой*.

У такім кантэксьце зразумелае зьдзіўленьне кіраўнікоў рэгіёну ратацыямі, якія раптам пачаў праводзіць такі прывабны «свой» для вобласьці кіраўнік. Магчыма, ад яго іх наагул не чакалі. Аднак і берасьцейцы супрацьдзейнічалі прызначэньням, зробленым новым кіраўніком вобласьці. Напрыклад, падчас прызначэньня старшынём гарвыканкаму дырэктара гарадзкога аўтапарку Васіля Шустава гарадзкая Рада выступіла супраць[5].

Берасьцейская і Гарадзенская вобласьці — прымежныя рэгіёны краіны, якія мелі больш шанцаў, у параўнаньні з усходнімі, сканцэнтраваць нейкі асобны ад цэнтру капітал. Празь Берасьце ішоў як буйны, так і малы транзытны капітал. Тут праходзіць траса Бэрлін — Масква, па якой транспартуецца значная частка грузаў з Захаду ў Расею і ў адваротным кірунку. Гэта асноўнае беларускае «акно ў Эўропу», што не магло не выклікаць матэрыяльнай зацікаўленасьці рэгіянальных элітаў у павелічэньні свайго статусу.

Гарадзеншчына таксама прымежная краіна. Праз гарадзенскі ўчастак мяжы паміж Беларусьсю і Прыбалтыкай, менш паміж Беларусьсю і Польшчай курсуе пераважна дробны прадпрымальніцкі капітал*. Але Горадня мела і другі, ня менш прывабны рэсурс. Транзытны шлях праз Горадню на Захад не такі буйны, як берасьцейскі, таму, можна меркаваць, менш пільна кантралюецца. Вядома, што цягам 90-х гадоў асноўны нелегальны зварот каляровых мэталаў з Расеі на Захад ішоў праз Прыбалтыку. Верагодна, у Гарадзенскай вобласьці адк-

* Магчыма, адной з прычын прыняцьця быў імідж «спакойнага» , «сьціплага» кіраўніка, які склаўся ў Заламая яшчэ тады, калі ён працаваў на Берасьцейшчыне да прызначэньня ў Менск.

[5] Белорусская деловая газета. 1995. 10 января.

* Прыкладам канцэнтрацыі «чаўночнага» транзытнага капіталу ў Горадні было існаваньне там амаль на працягу ўсіх 90-х гадоў найтаньнейшага ў краіне кругласутачнага рэчавага рынку, што абслугоўваў як індывідуальных пакупнікоў, так і аптавікоў.

рываліся магчымасьці кантролю ня толькі над легальнымі, але і над нелегальнымі таварнымі плынямі, якія ішлі з Расеі на Захад праз Прыбалтыку**.

Няцяжка здагадацца, чаму прызначэньне старшыні Менскага аблвыканкаму таксама адбылося падчас «другой хвалі» прызначэньняў. Менск — сталіца краіны. Акурат тут канцэнтруецца эканамічнае жыцьцё, палітычная актыўнасьць і, вядома, нацыянальны капітал. Таму ад менскага грамадзтва зь вялікай верагоднасьцю можна было чакаць супраціву канцэнтрацыі ўлады. Аднак актыўнага супрацьдзеяньня і тут не адбылося. Прычынай гэтага найхутчэй была разьяднанасьць эліты прадстаўнічай і выканаўчай, эканамічнай і палітычнай. У гэтым сэнсе Менскі рэгіён нічым значна не адрозьніваўся ад іншых рэгіёнаў краіны. Такім чынам, нават тыя невялікія падмуркі для эканамічнага аб’яднаньня мясцовых элітаў (якія існавалі ў Берасьці і Горадні), якія паўсталі адносна нядаўна, яшчэ ня сталі базай для ўтварэньня сталых узаемных кантактаў і патрон-кліенцкіх сувязяў. Яны яшчэ не імкнуліся ўтрымаць і выкарыстоўваць уладу на месцах. А прадстаўніцтва альтэрнатыўных палітычных партыяў у мясцовых Радах 1990 году скліканьня было невысокім.

У краіне, дзе яшчэ не сфармавалася сталая грамадзянская супольнасьць, а рэгіянальная ўлада ня мела эканамічнай прывабнасьці для старой эліты, немагчыма правесьці «муніцыпальную рэвалюцыю». З гэтага лягічна вынікала фармаваньне вэртыкалі прэзыдэнцкай улады.

У выніку амаль бязь зьмены ў мэханізмах ажыцьцяўленьня ўлады рэгіёны вярнуліся да амаль ня зьмененай мадэлі пабудовы стасункаў з цэнтрам, падобнай да той, што існавала яшчэ пры Савецкім Саюзе да пачатку гарбачоўскіх рэформаў. Асноўнай рысай гэтай мадэлі быў правінцыяналізм, пры якім рэгіянальная ўлада набывала значнасьць не праз сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё свайго рэгіёну і не праз барацьбу за давер насельніцтва, а праз санкцыю цэнтру (прызначэньне, асабістыя ці патрон-кліенцкія сувязі). Значнасьць і каштоўнасьць рэгіёну вызначаліся блізінёй яго кіраўніка да Менску і шанцамі, якія мела мясцовая эліта для таго, каб перайсьці на пасады ў сталіцы. Пры такім раскладзе рэгіянальнага палітыка чакае або павышэньне ў Менск, або знаходжаньне ў рэгіёне, г.зн. палітычная высылка.

У абодвух выпадках інтарэсы рэгіёну — другасныя.

У СССР, ува ўмовах закрытай краіны, на працягу 70-х гадоў разьвіцьцё прамысловасьці стымулявала ўзмацненьне сувязяў паміж якасьцю палітычнага і эканамічнага мэнэджмэнту ў рэгіёне, з аднаго боку, і кар’ернымі шанцамі яго кіраўніка — з другога. У Беларусі ў сярэдзіне 90-х гадоў XX ст. разрыў ранейшых эканамічных сувязяў, пашырэньне неадпаведнасьці паміж узроўнем мясцовай вытворчасьці і ўзроўнем жыцьця прывялі да ўсталяваньня іншых крытэраў ацэнкі эфэктыўнасьці рэгіянальнага кіраўніцтва, такіх, як асабістая адданасьць, ляяльнасьць цэнтру, супадзеньне палітыкі кіраўніцтва рэгіёну зь непасьлядоўнай і зьменлівай пазыцыяй цэнтру. Акурат такая мадэль падыходзіла як для аўтарытарнага настрою цэнтру, так і для правінцыйнага настрою рэгіёнаў. І зразумела, у такой мадэлі не было месца для дзеяздольных мясцовых прадстаўнічых органаў.

** У сувязі з гэтым паказальна, што адной з вэрсіяў забойства старшыні Гарадзенскай абласной Рады народных дэпутатаў Дзьмітрыя Арцымені была «нікелевая вэрсія». Згодна зь ёй, прычынай забойства было яго ўмяшаньне ў дзейнасьць «нікелевых кантрабандыстаў». Улічваючы стратэгічную значнасьць такога мэталу, як нікель, можна здагадвацца пра ўзровень прыкрыцьця кантрабандыстаў. (Гл.: Народная газета. 1995. 21 лютага).

## Падтрыманьне мэханізму функцыянаваньня цэнтралізаванай мясцовай улады

Існуюць два чыньнікі, якія могуць падцінаць правінцыялісцкія стасункі паміж цэнтрам і рэгіёнамі. Першы — узьнікненьне зацікаўленасьці эліты ў тым, каб застацца ў рэгіёне і выкарыстоўваць рэсурсы рэгіёну на яго карысьць, не арыентуючыся ў сваіх дзеяньнях на цэнтар. У гэтым выпадку мадэль «цэнтар — рэгіёны» мае зьмяніцца знутры сыстэмы.

Другім чыньнікам ёсьць разьвіцьцё грамадзянскай супольнасьці, палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацыяў, якія б змаглі, захапіўшы на выбарах пазыцыі ў мясцовых прадстаўнічых органах, карыстаючыся аўтарытэтам, дадаць мясцовым органам дэмакратычнасьці: справакаваць дэмакратызацыю стасункаў «цэнтар — рэгіёны».

Палітыка афіцыйнага Менску што да рэгіёнаў у другой палове 90-х гадоў уяўляе сабой сыстэму дзеяньняў для недапушчэньня разьвіцьця падзеяў у кірунку актывізацыі першага ці другога чыньніка.

Зацікаўленасьць эліты ў нарошчваньні сваіх пазыцыяў у рэгіёне пры закрытых аўтарытарных сыстэмах звычайна ёсьць вынікам росту эканамічнай прывабнасьці рэгіёнаў. Эканамічнае разьвіцьцё рэгіёну і зьяўленьне ў ім капіталу*, які можна кантраляваць і атрымліваць з гэтага матэрыяльную выгаду, прыводзяць да імкненьня асобных функцыянэраў (ад кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў да кіраўнікоў мясцовых органаў улады) замацавацца на сваіх пасадах і прыватызаваць свой статус. У такім выпадку пасада з часовага рэсурсу, даранага цэнтрам, ператвараецца ў трывалы рэсурс, які здабываецца і кантралюецца на месцы.

1991—1995 гады былі часам імклівага спаду ўзроўню вытворчасьці і, як вынік, істотнага пагаршэньня ўзроўню жыцьця ў Беларусі. У 1996 годзе сытуацыя пачала мяняцца да лепшага: пачаўся паступовы рост УВП, зьявіліся пэрспэктывы эканамічнага палепшаньня і, значыць, павышэньня эканамічнай прывабнасьці рэгіёнаў і іх прадпрыемстваў для элітаў. А эканамічная прывабнасьць рэгіёнаў — гэта першы чыньнік рэгіяналізацыі.

Мэханізм барацьбы з разьвіцьцём «уласьніцкіх» амбіцыяў мясцовых функцыянэраў быў сфармаваны яшчэ ў савецкія часы. Замацаваньню функцыянэраў на сваіх пасадах у СССР супрацьдзеяла сыстэматычная ратацыя кадраў, якая не дазваляла стварыць устойлівых сувязяў паміж функцыянэрамі ў рэгіёне ці на прадпрыемстве, а таксама сыстэма дзяржаўнага кантролю над утварэньнем і дзейнасьцю прадпрыемстваў праз дзяржаўную ўласнасьць на сродкі вытворчасьці, плянавае рэгуляваньне працэсу вытворчасьці й збыту прадукцыі.

Пабудаваная ў выніку рэформы мясцовага самакіраваньня 1994—1995 гадоў сыстэма падпарадкаваньня мясцовых выканкамаў цэнтральнай уладзе дазваляла ажыцьцяўляць як кантроль над утварэньнем, функцыянаваньнем мясцовых прадпрыемстваў, так і над прызначэньнем іх кіраўніцтва. Так, напрыклад, ужо 22 жніўня 1995 году па тэлефанаграме зь Менску райвыканкамы прыпынілі рэгістрацыю прадпрыемстваў. Дэкляраванай мэтай гэтай акцыі было палепшыць сыстэму рэгістрацыі. Так быў прадэманстраваны мэханізм, праз які палітычная

* Пад «капіталам» разумеюцца ня толькі жывыя грошы, але і камунальная маёмасьць, маёмасьць дзяржаўных прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёну, прыватная маёмасьць і магчымасьць ажыцьцяўляць над імі кантроль.

ўлада магла падпарадкоўваць сабе і выкарыстоўваць у сваіх мэтах мясцовую эканамічную эліту.

Канчаткова працэс прызначэньня кадраў быў фармалізаваны па савецкай мадэлі ўказам прэзыдэнта № 464 ад 14 лістапада 1995 году «Аб стварэньні кадравага рэестру кіраўніка дзяржавы». Пералік № 2 гэтага рэестру прадугледжваў рэгістрацыю ў ім у ліку іншых службовых асобаў старшыняў выканкамаў і кіраўнікоў найважнейшых дзяржаўных прадпрыемстваў і ведамстваў, а пералік № 3 улучаў старшыняў абласных і Менскай гарадзкой Радаў народных дэпутатаў. Згодна з указам, адпаведныя органы дзяржаўнай улады і кіраваньня павінны былі сфармаваць рэзэрвы кадраў па вызначаных пасадах і ажыцьцяўляць дзейнасьць па сыстэматычнай апрацоўцы зьвестак аб гэтых кадрах. Меліся на ўвазе збор інфармацыі, арганізацыя павышэньня кваліфікацыі і г.д.

Пункт 4 указу абмяжоўваў свабоду перасоўваньня асобаў, што ўвайшлі ў сьпісы. Так, выехаць у службовую замежную выправу кіраўнікам, улучаным у сьпісы № 1, 2 (у тым ліку старшыням выканкамаў і кіраўнікам прадпрыемстваў), можна было толькі зь пісьмовага дазволу кіраўніка дзяржавы. Асобы, улучаныя ў сьпіс № 3, павінны былі езьдзіць у службовыя выправы зь пісьмовага дазволу сваіх кіраўнікоў.

Нягледзячы на пастанову Канстытуцыйнага Суду, што ўлучэньне ў рэестар службовых асобаў, якія не прызначаюцца прэзыдэнтам, а таксама абмежаваньні ў камандзіраваньні кіраўнікоў дзяржаўных органаў, не падпарадкаваных прэзыдэнту, не адпавядаюць Канстытуцыі, гэтыя палажэньні страцілі моц толькі 8 лістапада 2001 году ў выніку ўступленьня ў сілу ўказу прэзыдэнта № 644.

Утварэньне рэзэрву кадраў закладала базу для абавязковай сыстэматычнай ратацыі кіраўнічых кадраў, якая і была ажыцьцёўлена на працягу наступных гадоў. Нягледзячы на паразу, спроба прэзыдэнта ўсталяваць кантроль за перасоўваньнем асобаў, улучаных у кадравы рэестар, выразна выяўляла ня толькі інфармацыйнае, але і кантрольна-рэпрэсіўнае прызначэньне гэтага нарматыўнага акту. Аднак кадравы рэестар прадэманстраваў і слабы бок фармаванай сыстэмы — кадравы дэфіцыт.

Апрача Віцебскай, у іншых абласьцях цягам 1995—2000 гадоў кіраўніцтва мянялася 2-3 разы. І гэта, натуральна, не было выклікана зьменамі ў прадстаўнічых органах. З такой самай інтэнсіўнасьцю ажыцьцяўлялася і ратацыя кіраўніцтва райвыканкамаў. Аналіз ратацыяў кіраўнікоў аблвыканкамаў паказвае, што перавага аддавалася немясцовым кіраўнікам. Напрыклад, на абласным узроўні бальшыня новых кіраўнікоў прыходзіла з-за межаў рэгіёну прызначэньня: Васіль Даўгалёў у Берасьцейскую вобласьць і Мікалай Дамашкевіч у Менскую прыйшлі пасьля працы ў кантрольных органах, Сяргей Ткачоў у Магілёўскую з пасады намесьніка міністра эканомікі.

Але часам на абласным і асабліва на раённым узроўнях на кіраўнічыя пасады прызначаліся намесьнікі старшыняў выканкамаў або вярталіся старыя кадры, як гэта адбылося, напрыклад, з кіраўніком Гомельскага аблвыканкаму Мікалаем Вайцянковым.

Кантроль над кіраўнікамі мясцовых прадпрыемстваў дасягаўся праз усталяваньне сыстэмы кантрактаў з кіраўніцтвам дзяржаўных арганізацыяў. Кантрактная сыстэма найму кіраўніцтва прадпрыемстваў была ўсталявана пастановай Рады Міністраў № 76 ад 16 верасьня 1994 году, распрацаванай згодна з указам прэзыдэнта № 82 ад 1 верасьня 1994 году. Першапачаткова, згодна з гэтай сыстэмай, наём кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства ажыцьцяўляўся адпаведным міністэрствам ці іншым цэнтральным органам, які мае права кіраваць

дзяржаўнай маёмасьцю; а кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства, якое знаходзіцца ў камунальнай маёмасьці, — адпаведнай мясцовай Радай.

Зьмены, якія былі прынятыя да пастановы Рады Міністраў № 76, прывялі да пагаршэньня становішча кіраўнікоў прадпрыемстваў. Так, згодна з папраўкамі, унесенымі пастановай Рады Міністраў № 1177 ад 24 ліпеня 1998 году, да працэсу прызначэньня кіраўніцтва прадпрыемстваў далучаліся і мясцовыя выканкамы, зь якімі павінна было быць узгоднена прызначэньне, а таксама пашырана кола ўстановаў, якія маюць права разглядаць пытаньне скасаваньня кантракту. Дзеля гэтага прызначэньне і ўстойлівасьць пазыцыяў кіраўнікоў прадпрыемстваў сталі залежаць ня толькі ад цэнтральных профільных органаў дзяржаўнай улады, але, што яшчэ больш істотна ў палітычным пляне, — ад кіраўнікоў адпаведных выканкамаў.

Ступень падпарадкаванасьці выканаўчай вэртыкалі прэзыдэнту прадэманстравала нарада, скліканая пад эгідай ВР напярэдадні рэфэрэндуму, у лістападзе 1996 году. З 160 мясцовых кіраўнікоў, запрошаных ВР, на нарадзе зьявілася толькі 35. Найбольш жорсткая пазыцыя была занятая выканкамамі Магілёўскай і Гомельскай абласьцей, якія забаранілі сваім прадстаўнікам браць удзел у сходзе. Падчас канстытуцыйнага крызысу 1996 году выканкамы ўвогуле адкрыта ігнаравалі пастановы ВР.

Але заставаўся другі патэнцыйны чыньнік рэгіяналізацыі — мясцовыя прадстаўнічыя органы і палітычны ўдзел насельніцтва. Нягледзячы на адсутнасьць рэальнай кіраўнічай улады, мясцовыя Рады маюць магчымасьць ажыцьцяўляць ускосны камунікацыйна-інфармацыйны ўплыў на палітычны працэс. На паседжаньнях мясцовых Радаў выбіраюцца дэпутаты верхняй палаты парлямэнту (Рады Рэспублікі), па восем чалавек ад вобласьці і Менску.

Сам працэс мясцовых выбараў ёсьць моцным рэсурсам, праз які ажыцьцяўляецца легітымацыя ня толькі мясцовай улады, але палітычнага рэжыму ўвогуле. Таму прэзыдэнцкі бок імкнецца ажыцьцяўляць кантроль ня толькі над дзейнасьцю выканаўчых органаў, але і над абраньнем і дзейнасьцю дэпутатаў прадстаўнічых органаў.

Мясцовыя выбары 1995 году прадэманстравалі невялікую палітычную актыўнасьць і нявызначанасьць палітычных поглядаў рэгіянальных супольнасьцяў. Асноўная маса дэпутацкага корпусу, абранага на тых выбарах, была апартыйнай ці пракамуністычнай, а да таго ж, пераважна намэнклятурнай. Некаторыя з Радаў, дзе дэпутаты пасьля дзьвюх спробаў так і не былі абраныя, працягвалі працаваць да выбараў 1999 году, гэта значыць, што сярод іх была значная частка неляяльных да ўлады дэпутатаў. І гэты склад быў небясьпечны для падтрыманьня стабільнасьці ўлады.Так, напрыклад, у сумна вядомым указе прэзыдэнта № 336 ад 28 жніўня 1995 году, прынятым як адказ на страйк прафсаюзу работнікаў Менскага мэтрапалітэну, прадугледжвалася ня толькі прыпыненьне дзейнасьці свабодных прафсаюзаў, але таксама абмежаваньне дэпутацкай недатыкальнасьці, у тым ліку і для дэпутатаў мясцовых Радаў.

Няўдача выбараў у мясцовыя Рады 1995 году дазволіла цэнтральнай уладзе вызначыць іх слабыя месцы і дала фармальныя падставы з гэтага скарыстацца. Найменшая яўка выбарцаў назіралася ў найменш кантраляваных выбарчых участках у гарадох, дзе пасьля назіраліся і найбольшыя праблемы з фармаваньнем кворуму Рады. Тым самым улады атрымалі падставу для нэўтралізацыі непадуладных сабе тэрыторыяў — раённых Радаў дэпутатаў у гарадох і іх органаў, на выбарах у якія дастаткова цяжка ажыцьцяўляць кантроль за волевыяўленьнем. Нэўтралізацыя адбылася або праз скасаваньне гарадзкіх Радаў, або праз далучэньне да іх сельскіх Радаў (дзе залежнасьць насельніцтва ад палітычнай і эканамічнай мясцовай эліты значна большая — таму сельскія Рады прасьцей кантраляваць). Указам прэзыдэнта № 383 ад

19 верасьня 1995 году «Аб правядзеньні рэформы органаў мясцовага кіраваньня і самакіраваньня» гэтыя Рады былі скасаваныя і замененыя мясцовымі адміністрацыямі. Абраныя дэпутаты раённых Радаў у гарадох далучаліся да адпаведных гарадзкіх Радаў дэпутатаў. Дарма што Канстытуцыйны Суд засьведчыў неадпаведнасьць указу Канстытуцыі, ён быў рэалізаваны.

За гэтым надышоў шэраг указаў, якія аб’ядноўвалі няроўныя з пункту гледжаньня магчымасьцяў ажыцьцяўленьня кантролю адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі — тыя, дзе выбары не адбыліся, з тымі, дзе яны прайшлі пасьпяхова. Тым самым павялічыліся ня толькі шанцы абраць Рады, але і зрабіць іх больш ляяльнымі да цэнтральнай улады. Так, у 1996 годзе ў адну тэрытарыяльную адзінку, прадстаўленую, адпаведна, адной Радай, былі аб’яднаныя Смаргонь і Смаргонскі раён. У 1997 годзе з раённымі Радамі былі аб’яднаныя гарадзкія Рады Дзяржынску, Добруша, Лунінца, Крычава, Наваградка.

У тых Радах, якія немагчыма было рэарганізаваць, дадаўшы да іх складу ляяльных дэпутатаў, была абмежаваная колькасьць дэпутатаў. Так, напрыклад, у Менскай гарадзкой Радзе (значная частка дэпутатаў якой была абраная яшчэ ў 1990 годзе) указам прэзыдэнта колькасьць дэпутатаў была скарочаная. Патэнцыял пратэсту з боку мясцовых Радаў быў ня толькі інстытуцыйна, але і пэрсанальна зьменшаны.

Але мясцовыя Рады захоўвалі сваё інфармацыйнае значэньне. Вызначальны інфармацыйны ўплыў на ўзровень папулярнасьці мясцовых органаў улады аказаў канстытуцыйны крызыс і рэфэрэндум 1996 году.

Дасьледаваньні, праведзеныя сацыялягічнай лябараторыяй «НОВАК» у кастрычніку 1996 году (да рэфэрэндуму) і ў сьнежні (пасьля яго), паказалі рэзкае зьніжэньне значнасьці мясцовых органаў улады ў вачах насельніцтва. За два месяцы колькасьць людзей, якія лічылі, што кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады павінны абірацца насельніцтвам, упала з 86,2 да 52,5% ад агульнай колькасьці апытаных. Гл. табліцу 1.

Дынаміка адказаў да і пасьля рэфэрэндуму паказвае, што на погляды грамадзтва істотна паўплываў абвешчаны вынік рэфэрэндуму. Пасьля рэфэрэндуму грамадзтва перастала ўважаць прадстаўнічыя органы ўлады нечым значным. Пры гэтым розьніца ў стаўленьні да мясцовых уладаў сярод тых, хто быў электаратам Лукашэнкі на выбарах 1994 году, і тых, хто не

**Табліца 1.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў улады выбіраліся беспасярэдне жыхарамі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі?», %

| | Так | | Супраць | Ня ведаю |
|---|---|---|---|---|
| 14.09.–7.10.1996 | 86,2 | | 3,3 | 10,5 |
| Адказ на рэфэрэндуме | 28,4 | | 69,92 | Не адказалі |
| 26.12.1996 | 52,5 | | 32,8 | 12,0 |
| 11.09.1997 | Галасаваў у 1994 за А. Лукашэнку | Галасаваў у 1994 супраць А. Лукашэнкі | | |
| | 45,4 | 54,5 | | |

Крыніца: Цэнтравыбаркам РБ, сацыялягічная лябараторыя «НОВАК»[6].

[6] Белорусская деловая газета. 1996. 14 октября; 1996. 26 декабря; 1997. 1 сентября.

галасаваў за яго ў 1994 годзе, была дастаткова невялікая. Стаўленьне электарату да палітыкі прэзыдэнта не паўплывала на страту мясцовымі органамі ўлады свайго аўтарытэту. Прапанаваныя зьмены былі прынятыя як дадзенасьць, што дэманструе ня столькі недавер мясцовым уладам, колькі непапулярнасьць палітычнага пратэсту і палітыкі як такой.

Пры гэтым стаўленьне да мясцовай улады было найменш акрэсьленае ў параўнаньні з стаўленьнем да іншых органаў улады. Паводле вынікаў апытаньня, праведзенага ў 1997 годзе, па колькасьці адказаў «ня ведаю» на пытаньне аб даверы розным палітычным і сацыяльным органам мясцовыя Рады саступалі толькі Саюзу прадпрымальнікаў і незалежным прафсаюзам[7]. Пры такім раскладзе нізкі ўзровень даверу да мясцовай улады быў заканамерным.

У адказах на адно з найбольш значных пытаньняў для сучаснага беларуса аб эканамічным становішчы: «Хто нясе адказнасьць за пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ў краіне?» — адказ «мясцовыя ўлады» наагул не фігуруе[8]. Грамадзтва прызвычаілася думаць, што мясцовыя ўлады нічога не вырашаюць, а значыць, ні за што не адказваюць.

**Табліца 2.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці давяраеце вы мясцовай уладзе?», %

| | Давяраю | Не давяраю | Ня ведаю |
|---|---|---|---|
| Жнівень 1997 году | 29,1 | 54 | 16,9 |
| Кастрычнік 1997 году | 32,6 | 59,2 | 8,8 |
| Снежань 1997 году | 32,1 | 57,1 | 10,8 |

Крыніца: сацыялягічная лябараторыя «НОВАК»[9].

Сфармаваная пасьля 1996 году сыстэма мясцовай улады была незразумелая насельніцтву ні па сваёй структуры, ні па сваіх мэтах і прызначэньні[*]. Мясцовыя прадстаўнічыя і асабліва выканаўчыя мясцовыя органы ўспрымаюцца ня столькі як органы ўлады, колькі як часткі мэханізму, з дапамогай якіх рашэньні цэнтру перадаюцца на месцы, каб там выконвацца, і не абскарджваюцца. Грамадзтва й самі органы мясцовай улады прымаюць амаль любыя зьмены ў іх структуры, мэтах, асаблівасьцях функцыянаваньня. Вынятак складае, бадай, толькі пытаньне іх канчатковага скасаваньня. Прычына такой абыякавасьці дастаткова простая: гэтыя зьмены больш істотна не ўплываюць на рэальны стан рэчаў.

Адзіным палітычным суб'ектам, для якога структура і стан мясцовых органаў улады мае значэньне, ёсьць менскі цэнтар. Па-першае, толькі праз мясцовую палітычную ўладу ён можа надзейна кантраляваць мясцовыя эканамічныя эліты. Па-другое, падчас выбараў кантроль над мясцовымі палітычнымі і эканамічнымі ўладамі дазваляе цэнтру забясьпечваць іх патрэбны вынік і такім чынам легітымізавацьісны рэжым. Абедзьве гэтыя функцыі найбольш выразна выявіліся падчас мясцовых выбараў красавіка 1999 году.

За год да мясцовых выбараў 1999 году, за якімі меліся надыйсьці і парлямэнцкія, улады пачалі падрыхтоўку плацдармаў, каб атрымаць патрэбны вынік «народнага волевыяўленьня». На працягу 1998 году былі распрацаваныя і праведзеныя праз парлямэнт закон «Аб

[7] Белорусская деловая газета. 1997. 11 января.

[8] Белорусская деловая газета. 1997. 30 октября.

[9] Белорусская деловая газета. 1997. 22 декабря; 1997. 8 августа; 1997. 16 августа.

[*] Пераважная частка скаргаў ад насельніцтва скіроўваецца акурат у цэнтральныя органы дзяржаўнай улады, перш за ўсё прэзыдэнту.

выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў», а таксама зьмены ў закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні».

Зьмены ў закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» чарговым разам выявілі ў мясцовай улады нястачу якасных кіраўнічых кадраў і іх падпарадкаваньне цэнтральнай уладзе. Калі падчас прыняцьця папраўак у закон у 1995 годзе былі яшчэ нейкія ілюзіі наконт таго, што можна будзе праводзіць ратацыю кіраўнікоў выканкамаў, то пры канцы 1998-га яны канчаткова зьніклі. Так, напрыклад, у Гомельскай вобласьці з 190 старшыняў сельскіх Радаў 127 ажыцьцяўлялі свае паўнамоцтвы другі тэрмін запар і, згодна з заканадаўствам, не маглі прэтэндаваць на гэтую пасаду трэці раз. Камісія па дзяржаўным будаўніцтве ПП настойвала на неабходнасьці працягнуць іх паўнамоцтвы. У выніку ПП 28 сьнежня 1998 году прыняла зьмены ў закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні». Была скасавана норма, якая абмяжоўвала для старшыняў Радаў і выканкамаў магчымасьці займаць пасаду ня больш за два тэрміны запар.

З аднаго боку, скасаваньне абмежаваньняў стаўленікам прэзыдэнта ажыцьцяўляць свае функцыі магло разглядацца як далейшая цэнтралізацыя ўлады. Але абмежаваньні ратацыі, асабліва для мясцовай прадстаўнічай улады, ня выгадныя палітычнаму цэнтру. Гэта павышае значнасьць пасады мясцовага функцыянэра і яго самастойнасьць, набліжае яго да свайго рэгіёну. Пакідаючы ўладу ў адных руках на месцах на значны тэрмін, цэнтар заахвочвае тых, каму яна належыць, пашыраць свае паўнамоцтвы, і рызыкуе згубіць кантроль над ёй. Гэта адна з найважнейшых пагрозаў для цэнтру з боку рэгіёнаў. Таму найхутчэй гэты захад быў абумоўлены толькі кадравым голадам, які асабліва павялічваецца, калі ўлада прышчапляе грамадзтву палітычную індыфэрэнтнасьць. Але каб перашкаджаць замацаваньню функцыянэраў на сваіх пазыцыях і зьяўленьню ў Радах апазыцыйных дэпутатаў, у закон «Аб выбарах у мясцовыя Рады» былі ўнесеныя папраўкі.

Яны зь цяжкасьцю былі зацьверджаныя звычайна ляяльным Нацыянальным Сходам. Гэтую затрымку дэмакратычныя СМІ тлумачылі крыўдай дэпутатаў на спробу Лукашэнкі правесьці зьмены без уліку сваіх заўвагаў. Але ў парлямэнтароў былі больш важкія прычыны супраціўляцца прыняцьцю закону ў прэзыдэнцкай рэдакцыі.

Падчас разгляду закону ў парлямэнце праблемы ўзьніклі па наступных пытаньнях: аб абмежаваньні ўдзелу ў выбарах грамадзкіх аб'яднаньняў; аб выбарчым праве асобаў, якія былі асуджаныя; аб ніжнім бар'еры яўкі выбарцаў, які неабходны для таго, каб выбары лічыліся сапраўднымі.

Першыя дзьве папраўкі, на якіх настойваў прэзыдэнт, былі прынятыя дастаткова хутка, бо не закраналі асабістых інтарэсаў дэпутатаў. Але прыняць за норму мінімальны ўзровень яўкі ў 50% як у першым, так і ў другім туры пагражала стварыць прэцэдэнт і для выбараў у ПП (дарэчы, прэцэдэнт усё ж такі быў створаны). Пазыцыю прэзыдэнта падтрымала ЦВК, а таксама дэпутаты зь вясковай мясцовасьці. Але значная частка дэпутатаў на падставе смутнага досьведу мясцовых выбараў 1995 году настойвала на неабходнасьці зьніжэньня планкі да 25%.

Спрэчка зацягнулася амаль на тыдзень. У выніку было прынятае «кампраміснае» рашэньне. Прэзыдэнт пагадзіўся з 25% яўкі на мясцовыя выбары ў другім туры, але толькі на мясцовых выбарах. Да таго ж парлямэнт павінен быў пазбавіць пасіўнага выбарчага права асобаў, якія мелі непагашаныя адміністрацыйныя асуджанасьці.

Нягледзячы на несувымерны на першы погляд кампраміс, у ім была свая лёгіка. Высокі

бар'ер яўкі на выбары пры цяперашніх стасунках прэзыдэнта зь мясцовымі элітамі пагражае зрывам выбараў і аслабленьнем пазыцыяў апошніх. Пры апалітычным грамадзтве яўку выбарцаў павінны арганізаваць «дырэктарат» і мясцовыя ўлады. Мясцовы дырэктарат быў адзінай сацыяльнай групай, да якой у выпадку зрыву выбараў улады маглі ўжыць нейкія санкцыі. Калі ў сельскай мясцовасьці арганізаваць яўку не было праблемай, то гарадзкому кіраўніцтву з гэтым было цяжэй. У сваю чаргу, для прэзыдэнта, чыя палітыка скіраваная на стымуляцыю ўласнай падтрымкі з боку насельніцтва праз кантроль над дырэктаратам, высокі бар'ер яўкі — гэта дадатковы чыньнік мабілізацыі ня толькі электарату, але і дырэктарату, а таксама кантролю над апошнім. Зь іншага боку, адхіленьне ад удзелу ў выбарах асобаў, якія маюць адміністрацыйныя асуджанасьці, было накіравана перш за ўсё супраць апазыцыйных палітыкаў.

Такім чынам, новая норма ажыцьцяўляла некалькі функцыяў. Па-першае, у выніку яе прыняцьця зьніжаўся палітычны ўдзел, ад выбараў разам з кандыдатамі, што выступалі супраць прэзыдэнта, адхіляліся і іх выбарцы. Па-другое, гэта вымушала першых (у выпадку наяўнасьці моцнага жаданьня ісьці на выбары) не выяўляць залішняй актыўнасьці. Па-трэцяе, зьніжала ўпэўненасьць у сабе мясцовых кіраўнікоў, якія павінны былі арганізаваць палітычны ўдзел, і яшчэ раз падкрэсьлівала іх палітычную заангажаванасьць, а таму залежнасьць ад Менску. У пляне кантролю над народным волевыяўленьнем стратэгія ўладаў нагадвала грабянец: прыбірала ўсё лішняе (групоўкі, якія пагражаюць сыстэме) і адначасова «прычэсвала» ляяльныя для рэжыму групоўкі, накіраваўшы іх актыўнасьць у патрэбнае рэчышча. Толькі так можна падтрымліваць існаваньне рэжыму ў грамадзтве, дзе палітыка ўсё больш выходзіць за межы сфэры інтарэсаў грамадзянаў і ў якім усё больш прынята рабіць выгляд, быццам палітыкі ўвогуле не існуе. На плечы мясцовага дырэктарату быў ускладзены абавязак імітацыі існаваньня палітыкі.

Важнасьць новых правілаў гульні падкрэсьлівае той факт, што фактычна закон «Аб выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў» прымаўся на два гады — 1999–2000-ы — ці на адны выбары — выбары 1999 году. У 2000 годзе, пасьля прыняцьця Выбарчага Кодэксу, закон страціў сваю сілу.

У 2000 годзе стратэгія ўлады была даведзена да лягічнага канца, што і было адлюстравана ў чарговых зьменах у закон «Аб мясцовым кіраваньні і самакіраваньні» і ў Выбарчым Кодэксе. Гэты дакумэнт быў падрабязна разгледжаны палітычнымі дзеячамі і палітычнымі экспэртамі, як айчыннымі, так і замежнымі*.

Прыняцьце Кодэксу адбывалася падчас няўдалай спробы перамоваў паміж уладай і апазыцыяй і паставіла ў іх кропку. Праведзены вышэй аналіз даводзіць, што ў тагачасных умовах прыняцьце Кодэксу ў такой форме (г.зн. з значнай колькасьцю артыкулаў, якія не адпавядаюць дэмакратычным нормам) была непазьбежнасьцю. Яго недасканаласьць было абумоўленая таксама і асаблівасьцямі мясцовай улады Беларусі, у першую чаргу наяўнасьцю вельмі шырокага кола паўнамоцтваў мясцовых выканаўчых органаў, якія закранані й выбарчы працэс. Наступныя выбары, у тым ліку і мясцовыя выбары 2003 году, якія праводзіліся па гэтым Кодэксе, выявілі ня толькі спэцыфіку выбарчага заканадаўства, але і асаблівасьці фармаваньня і функцыянаваньня мясцовых уладаў.

* Гл.: Белорусская деловая газета. 1999. 30 сентября; 2000. 25 сентября; 2000. 9 февраля.

### Высновы

Нягледзячы на сваё, на першы погляд, другазначнае становішча ў беларускай палітыцы, мясцовая ўлада адыгрывае значную ролю ў палітычным працэсе і ажыцьцяўляе значны ўплыў на структуру і асаблівасьці функцыянаваньня палітычнай сыстэмы. Але гэты ўплыў ёсьць ня вынікам самастойных дзеяньняў мясцовых элітаў (эканамічных або палітычных), а наступствам іх бязьдзейнасьці, іх добраахвотнай залежнасьці ад цэнтральнай менскай улады. Фармаваньне мясцовай улады ў Беларусі было абумоўленае не інтарэсамі мясцовых элітаў, а санкцыяй цэнтру, спачатку маскоўскага, потым менскага. Пабудаваная такім чынам сыстэма мясцовай улады адпавядае патрэбам цэнтру, а не рэгіёнаў. Магчыма, акурат у гэтай неадпаведнасьці функцыяў мясцовай улады яе пазыцыям і ляжыць патэнцыял пераўтварэньня палітычнай сыстэмы краіны ў будучыні.

## РАЗЬВІЦЬЦЁ НАЦЫЯНАЛЬНА-ДЭМАКРАТЫЧНАГА РУХУ І ПАЗЫЦЫІ САВЕЦКАЙ ЭЛІТЫ

### Вонкавыя стымулы дэмакратызацыі ў Беларусі

Разгляд дынамікі беларускай палітычнай сыстэмы скіроўвае нас да вонкавапалітычнага кантэксту: усталяваньня незалежнай беларускай дзяржаўнасьці, палітычнай дынамікі ў Савецкім Саюзе напярэдадні распаду і пасьля, у постсацыялістычным абкружэньні Беларусі.

Набыцьцё незалежнасьці, спроба дэмакратычных і рынкавых пераўтварэньняў, адраджэньне этнанацыянальных падставаў беларускай культуры так ці йначай скіроўваюць нас да працэсаў распаду Савецкага Саюзу.

Дасьледнікі постсавецкай беларускай гісторыі адзначаюць істотны момант, які сур’ёзна адрозьнівае Беларусь ад іншых савецкіх рэспублік эўрапейскай часткі СССР. Яна займала асаблівае становішча. Гэта была рэспубліка, у якой адносны эканамічны дабрабыт у параўнаньні зь іншымі дапаўняўся высокай ступеньню русіфікацыі і дээтнізаванай сьвядомасьцю значнай часткі інтэлектуальнай эліты. У Беларусі панавала свая асаблівая, савецкая міталёгія, заснаваная на савецкай гістарыяграфіі другой сусьветнай вайны. І ў пляне самасьвядомасьці, і ў пляне эканамічнага дабрабыту ў сацыялістычнай Беларусі выходныя ўмовы антыкамуністычных, дэмакратычных пераўтварэньняў былі значна ніжэйшыя за суседнія краіны.

Нацыянальна-культурнае процістаяньне савецкаму рэжыму па лініі супраціўленьня савецкай русіфікацыі таксама было вельмі слабым.

Пачаткова разьвіцьцё працэсаў дэмакратызацыі ў Беларусі было стымуляванае перабудовай пад кіраўніцтвам Міхаіла Гарбачова. Дзеля таго, каб у Беларусі пачалося інтэнсіўнае фармаваньне нацыяналістычных і дэмакратычных рухаў, спатрэбілася спроба рэформаў сацыялістычнай сыстэмы зьверху, з Масквы. Дэмакратычныя рухі ў Беларусі разьвіваюцца ў другой палове 80-х у падтрымку перабудовы, якую праводзіла кампартыя. Ад пачатку нацы-

янальна-дэмакратычныя рухі фармуюцца як нацыянальна-культурныя і экалягічныя, як рэакцыя на Чарнобыльскую катастрофу. Гэта дазваляла зьмякчаць разыходжаньні з самой камуністычнай партыяй, вядучай і накіроўваючай паводле Канстытуцыі СССР.

Аднак, такія несанкцыянаваныя, самастойныя аб'яднаньні грамадзян выклікалі незадаволенасьць беларускага камуністычнага кіраўніцтва. Варункі іх дзейнасьці былі менш спрыяльныя, чым у суседніх прыбалтыйскіх дзяржавах, на Ўкраіне або ў Расіі. У значнай ступені гэта было зьвязана з спэцыфікай найвышэйшай беларускай эліты таго часу, якая на момант гарбачоўскіх рэформаў была практычна дээтнізаваная. Як адзначаюць Марк Нордбэрг і Тарас Кузё, нацыянальныя рухі пэрыяду перабудовы ў СССР абапіраліся на частку камуністаў, што падзялялі нацыянальныя ідэі. Аднак у Беларусі не было такога магутнага корпусу нацыянал-камуністаў[1]. Пра працэсы, якія перашкодзілі ўзнаўленьню нацыяналістычных ідэяў у камуністычным кіраўніцтве БССР — крыху пазьней. Пакуль адзначым, што дэмакратычны рух у Беларусі, як і ў іншых рэспубліках СССР, разьвіваўся ў спалучэньні з нацыяналістычным. Аднак штуршок для ягонага разьвіцьця ў значнай ступені прыйшоў звонку.

Неабходнасьць стрымліваць рэпрэсіі ў барацьбе старой эліты з нацыянальна-дэмакратычным рухам была ў значнай меры абумоўлена падпарадкаваньнем камуністычнай эліты БССР маскоўскаму кіраўніцтву. Беларускае рэспубліканскае кіраўніцтва, якое сумяшчала высокія адміністрацыйныя пасады з пасадамі ў Камуністычнай партыі Беларусі, падпарадкоўвалася кіраўніцтву КПСС у Маскве. Расійскія эліты ў цэнтры савецкай імпэрыі, з аднаго боку, стымулявалі разьвіцьцё дэмакратычных працэсаў на пэрыфэрыі, зь іншага, займаючы больш высокі ўзровень у дзяржаўнай і палітычнай іерархіі Савецкага Саюзу, зьвязвалі рукі рэспубліканскаму кіраўніцтву. Пры гэтым працэсы дэмакратызацыі, дэмантажу савецкай сыстэмы, ініцыяваныя за межамі Беларусі, у яе абкружэньні праходзілі больш інтэнсіўна, выступаючы магутным вонкавым чыньнікам ціску на намэнклятурна-камуністычную эліту Беларусі.

## Разьвіцьцё нацыянальна-дэмакратычнага руху

Яшчэ да гарбачоўскай перабудовы, у 1980 годзе ў Беларусі стварылася «Беларуская сьпеўна-драматычная майстроўня», непалітычная арганізацыя, якая займалася адраджэньнем нацыянальнай мовы і культуры. У 1984 годзе, ужо напярэдадні перабудовы, сябры аб'яднаньня выступілі супраць разбурэньня помнікаў архітэктуры. На працягу 1985–1986 гадоў у абласных цэнтрах Беларусі ствараюцца клюбныя аб'яднаньні, чыя дзейнасьць была зьвязаная з адраджэньнем беларускай мовы і культуры, такія як «Талака», «Паходня», «Тутэйшыя». Адкрыты канфлікт нацыянальнай інтэлігенцыі з кіраўніцтвам Беларусі выклікаў ліст беларускіх пісьменьнікаў і навукоўцаў Міхаілу Гарбачову пра бядотны стан беларускай мовы. Распаўсюджвалася інфармацыя пра сапраўдныя маштабы Чарнобыльскай катастрофы, якую хавалі ад насельніцтва кіраўнікі рэспублікі. Аднак гэта яшчэ не было палітычным супрацьстаяньнем.

У сакавіку 1988 году ў Менску адбыўся мітынг у абарону архітэктурных помнікаў, што

[1] Гл. Нордберг Марк, Кузио Тарас. Построение наций и государств. Историческое наследие и национальные самосознания в Белоруссии и на Украине (Сравнительный анализ) // Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека. 1998. — С. 386.

знаходзіліся пад пагрозай разбурэньня пры будаўніцтве другой лініі мэтрапалітэну. У адказ рэспубліканскае кіраўніцтва прыняло пастановы, якія абмяжоўвалі правядзеньні мітынгаў і маніфэстацый.

У часе правядзеньня XIX усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі менскі клюб «Талака» прыняў зварот з прапановай ліквідаваць лідэрства камуністычнай партыі, замацаванае савецкай канстытуцыяй. Але ўпершыню азначэньне беларускіх нацыянальных інтарэсаў як адрозных ад інтарэсаў СССР было зробленае Беларускім народным фронтам.

Разьвіцьцё нацыянальна-дэмакратычнага руху Беларусі другой паловы 1988 году было цесна павязанае з падзеямі ў Прыбалтыцы. У прыбалтыйскіх рэспубліках СССР ствараюцца Народныя Франты. 19 кастрычніка 1988 году на ўстаноўчай канфэрэнцыі таварыства «Мартыралёг Беларусі» быў створаны арганізацыйны камітэт Беларускага народнага фронту «Адраджэньне» (БНФ). У звароце аргкамітэту БНФ «Да грамадзянаў Беларусі» былі высунутыя заданьні станаўленьня беларускай нацыі на аснове дэмакратычных вартасьцяў і дасягненьня дзяржаўнасьці.

Пры канцы вясны — пачатку лета 1988 году нацыянальна-дэмакратычны рух актывізаваўся дзякуючы выкрыцьцю злачынстваў камуністычнага рэжыму. Пад Менскам, ува ўрочышчы Курапаты, былі знойдзеныя пахаваньні ахвяраў масавых расстрэлаў пэрыяду 30-х–40-х гадоў. 19 ліпеня ў Курапатах адбыўся шматтысячны мітынг, які паспрыяў шырокаму прызнаньню нацыянальна-дэмакратычнага руху.

30 кастрычніка 1988 году ў Менску было забароненае правядзеньне мітынгу-рэквіему «Дзяды», што стала падставай для фізычнай расправы з актывістамі БНФ.

Характэрна, што акурат у беларускай соцыякультурнай і палітычнай сытуацыі нацыянальныя рухі сталі праводзіць свае зьезды ў Летуве. З аднаго боку, гэта было абумоўлена рэжымам максымальнага неспрыяньня з боку беларускіх уладаў. Зь іншага боку, беларуская апазыцыя камуністычнаму рэжыму была менш радыкальная, першапачаткова стваралася як культурніцкі рух і толькі потым — як палітычны. Праявілася адсутнасьць сваёй уласнай дысыдэнцкай традыцыі, праваабарончага руху[2]. Апрача таго, нацыянальна-дэмакратычныя аб’яднаньні Беларусі адпачатна дзейнічалі ў варунках значна меншай падтрымкі іхных ініцыятываў насельніцтвам і прыхільнымі функцыянэрамі ў параўнаньні з краінамі Прыбалтыкі.

У цэлым, на беларускую апазыцыю працавала вонкавая сытуацыя, падзеі ў рэспубліках СССР — узрастаньне нацыяналістычных і антыкамуністычных настрояў. Такія настроі ўнутры Беларусі таксама разьвіваліся, хоць і больш марудна, чымся ў суседніх дзяржавах.

## Дзейнасьць нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі і супраціў беларускіх уладаў

Пачынаючы з 1988 году, культурна-асьветніцкая дзейнасьць БНФ адыходзіць на другі плян у параўнаньні з палітычнай. Савецкае кіраўніцтва Беларусі блякавала спробы дыялёгу, зроб-

[2] Гл. Нордберг Марк, Кузио Тарас. Построение наций и государств. Историческое наследие и национальные самосознания в Белоруссии и на Украине (Сравнительный анализ); Галина Дракохруст, Юрий Дракохруст, Дмитрий Фурман. Трансформация партийной системы Беларуси // Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека. 1998. — С. 386.

леныя нацыянал-дэмакратычным рухам. Але структура Беларускага народнага фронту разьвіваецца, расьце колькасьць яго прыхільнікаў.

15–16 лютага 1989 году ў Вільні адбываецца Другі Вальны сойм беларускага маладзёвага руху. Ствараецца «Канфэдэрацыя маладзёвых суполак» у складзе Народнага Фронту. Тады ж, 15 лютага ў Менску на стадыёне «Дынама» адбыўся агульнагарадзкі мітынг, дзе дэ факта была легалізаваная нацыянальная сымболіка — бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня». Бел-чырвона-белы сьцяг у камуністычнай беларускай прапагандзе быў абвешчаны сьцягам калябарацыяністаў. Аднак актывісты нацыянальнага руху, зьвяртаючыся да нацыянальнай сымболікі, на ўзроўні сымбаляў аддзялілі свой рух ад кампаніі дэмакратызацыі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Была аспрэчаная манаполія камуністаў на дэмакратычную рыторыку. У меру ўзмацненьня структураў нацыянальнага руху дэмакратычная рыторыка перастае асацыявацца з прагрэсіўным крылом камуністычнай партыі.

Супрацьдзеяньне камуністычнага кіраўніцтва ўзмацняецца. Вясна 1989 году багатая на падзеі. 7 сакавіка міліцыя разганяе групу студэнтаў, якія спрабавалі адзначыць угодкі абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. 26 красавіка ў Менску на пляцы Леніна адбываецца акцыя пратэсту, прысьвечаная Чарнобыльскай катастрофе. 29 траўня ў Менску на пляцы Леніна адбываецца мітынг у сувязі з працай І Зьезду народных дэпутатаў СССР.

У чэрвені 1989 году на Ўстаноўчым зьезьдзе была прынятая Праграма БНФ. У разьдзеле «Сувэрэнітэт» абвяшчалася вяршэнства нацыі, вылучалася ідэя вяршэнства народу ў вырашэньні свайго лёсу. Заданьне выхаду Беларусі з складу СССР яшчэ ня ставілася, аднак сам Савецкі Саюз разглядаўся як саюз сувэрэнных дзяржаваў. Паўнамоцтвы СССР разглядаліся як дэлегаваныя саюзнымі рэспублікамі. Праграма БНФ таксама зьмяшчала патрабаваньне права вольнага выхаду кожнай рэспублікі з складу СССР, укладаньня новай Саюзнай дамовы, вяршэнства законаў БССР на яе тэрыторыі, незалежнасьці Беларусі ў міжнародных стасунках, увядзеньня грамадзянства БССР, права рэспублікі на ўласныя вайсковыя фармаваньні. Абвяшчалася неабходнасьць рэфармаваньня сацыяльнай, эканамічнай і палітычнай сыстэмы[3].

26 ліпеня ў Менску адбыўся мітынг, прысьвечаны наступствам Чарнобыльскай катастрофы. 31 верасьня прайшоў марш пратэсту «Чарнобыльскі шлях» і мітынг у Менску. У мітынгу бралі ўдзел жыхары Гомельскай, Магілёўскай і Берасьцейскай абласьцей, якія пацярпелі ад радыеактыўнага забруджаньня.

8 кастрычніка на 2 зьезьдзе Народнага фронту Латвіі лідэр Беларускага народнага фронту Зянон Пазьняк у якасьці праграмнага заданьня БНФ вылучыў ідэю палітычнай незалежнасьці Беларусі. Тым ня менш, каб не адпудзіць электарат, які ўсё яшчэ заставаўся пад уплывам савецкіх мітаў, перадвыбарная плятформа, прынятая Соймам БНФ у сьнежні 1989 году, настойвала на эканамічнай незалежнасьці, замацаваньні ўласнасьці Беларусі на зямлю, прыродныя рэсурсы, вытворчыя фонды на яе тэрыторыі.

25–26 кастрычніка праводзіцца акцыя пратэсту супраць прыняцьця антыдэмакратычнага заканадаўства, 29 кастрычніка — мітынгі-рэквіемы «Дзяды» ў Менску, Горадні, Магілёве, Воршы і Бабруйску. 16 лістапада адбылася ўстаноўчая канфэрэнцыя Беларускага сялянскага саюзу. 25–26 лістапада — Асамблея народаў «Чарнобыльскі шлях». 18 сьнежня ў Менску прайшоў мітынг памяці А. Сахарава.

[3] Гл.: Праграма Беларускага народнага фронту. — Менск, 1989.

26 студзеня 1990 году Вярхоўны Савет БССР прымае закон «Аб мовах у Беларускай ССР». Паводле гэтага закону беларуская мова атрымала статус дзяржаўнай.

25 лютага на пляцы Леніна ў Менску адбываецца шматтысячны (каля 100–120 тысяч) мітынг. Лідэры нацыянальна-дэмакратычнага руху выступаюць па рэспубліканскім тэлебачаньні.

## Суіснаваньне старых і новых элітаў. Балянс сілаў у палітычнай прасторы Беларусі

Да 1990 году нацыяльна-дэмакратычны рух разьвіваецца па-за дзяржаўнымі інстытутамі ўлады. Становішча зьмяняецца ўвесну 1990 году.

У сакавіку 1990 году адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР. Прыхільнікі нацыянальнага адраджэньня і дэмакратызацыі валодалі невялікімі, у параўнаньні з партыйнай намэнклятурай, рэсурсамі для правядзеньня перадвыбарнай агітацыі. Апрача таго, значная частка насельніцтва не ўспрымала лёзунгаў нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі. На выбарах у Вярхоўны Савет БССР прайшлі толькі 37 дэпутатаў ад БНФ, якія склалі апазыцыю камуна-бюракратычнай бальшыні. Чальцамі БНФ у Вярхоўным Савеце быў створаны Дэмакратычны клюб, які налічваў да 100 дэпутатаў. Колькасьць саміх дэпутатаў ад БНФ складала каля 10% складу Вярхоўнага Савету. У той жа час беларуская савецкая намэнклятура была дастаткова млявай і лянівай, ня мела ніякіх асаблівых нацыяналістычных амбіцыяў і сур’ёзных ідэалягічных рэсурсаў, нягледзячы на кантроль над СМІ. Бальшыня Вярхоўнага Савету не магла нэўтралізаваць дэмакратычную меншыню. Аднак і сама гэтая меншыня не была дастаткова радыкальнай, каб пайсьці на абвастрэньне канфлікту са старой элітай.

У выніку такога раскладу сілаў у палітычнай сыстэме Беларусі 1990 году ўсталявалася своеасаблівая раўнавага: больш актыўная меншыня прыхільнікаў рэформаў супраць прадстаўнікоў старой, савецкай партнамэнклятуры. Ніводная з груповак ня мела дастатковых палітычных рэсурсаў, каб цалкам нэўтралізаваць іншую. За савецкай намэнклятурай захоўвалася ўся старая сыстэма сувязяў, стасункаў улады-ўласнасьці, наладжаная бюракратычная гіерархія і падтрымка Камуністычнай партыі Беларусі. Аднак вонкавыя працэсы мадэрнізацыі пазбаўлялі старую беларускую эліту яе эканамічных рэсурсаў. Пахіснулася субардынацыя Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу і залежнасьць мясцовай адміністрацыі ад пастановаў Масквы і яе падпарадкаванасьць імпэрскаму цэнтру. Пры гэтым ідэалягічнае дамінаваньне Цэнтру, перавага агульнасаюзнага тэлебачаньня, палітыка публічнасьці і сам супольны характар інфармацыйнай прасторы Савецкага Саюзу спрыялі росту палітычнай актыўнасьці беларускага насельніцтва. Ініцыятыва ў зьменах ідэалягічнага клімату ў Беларусі на тле інфармацыйнай падтрымкі дэмакратычных працэсаў з Масквы і дзейнасьці дэмакратычных элітаў у суседніх рэспубліках належала нацыянальна-дэмакратычнаму руху.

У 1990 годзе ў Беларусі адбываюцца акцыі ў падтрымку дэмакратычных рэформаў. 25 сакавіка ў Менску легальна адзначаюцца ўгодкі абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. 26 красавіка ў Гомелі бастуюць працоўныя прадпрыемстваў, патрабуючы паскорыць ліквідацыю наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. У траўні 1990 году была створаная Партыя незалежнасьці Беларусі. Тады ж прайшоў шэраг грамадзкіх акцыяў, зьвязаных з працай 1-й сэсіі Вярхоўнага Савету БССР. 2 чэрвеня Рабочы саюз Беларусі арганізаваў мітынг

памяці ахвараў Навачаркаскага расстрэлу рабочых у 1962 годзе. 16 чэрвеня ствараецца арганізацыйны камітэт Беларускай каталіцкай Грамады. 16–17 чэрвеня ў Горадні адбываецца ўстаноўчы зьезд «Саюзу палякаў Беларусі». 23–24 чэрвеня ў Менску праходзіць устаноўчы зьезд Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі.

1990 год быў годам заняпаду савецкай імпэрыі. Вынікам цэнтрабежных сілаў у СССР стаў так званы парад сувэрэнітэтаў. На працягу 1990 году саюзныя рэспублікі прымалі афіцыйныя акты аб сувэрэнітэце. 30 чэрвеня — 1 ліпеня 1990 году на канфэрэнцыі БНФ была прынятая Дэклярацыя аб дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі. Паводле гэтай дэклярацыі, найважнейшым заданьнем руху было дасягненьне поўнага сувэрэнітэту Беларусі. Апазыцыя БНФ у Вярхоўным Савеце настойвала на прыняцьці адпаведных дакумэнтаў, аднак большыня Вярхоўнага Савету, прадстаўленая савецкай партыйнай намэнклятурай, блякавала ініцыятывы апазыцыі, вінавацячы яе ў сэпаратызьме і нацыяналізьме.

Тым ня менш, 27 ліпеня 1990 году Вярхоўны Савет Беларусі, на прапанову старшыні Мікалая Дземянцея, прыняў Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце БССР. Дэклярацыя абвяшчала поўны дзяржаўны сувэрэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасьць і паўніню дзяржаўнай улады Беларусі ў межах яе тэрыторыі, яе незалежнасьць ў замежных стасунках. Было заяўлена пра вяршэнства Канстытуцыі і законаў Беларусі на яе тэрыторыі; зямля, яе нетры абвяшчаліся ўласнасьцю беларускага народу. Ствараліся Нацыянальны банк, уласная падатковая й мытная службы. Артыкул 110 прадугледжваў права Беларусі на ўласныя ўзброеныя сілы, органы бясьпекі. Вайсковыя фармаваньні і базы іншых дзяржаваў маглі быць разьмешчаныя на тэрыторыі рэспублікі толькі пры згодзе Вярхоўнага Савету. Былі абвешчаныя бязьядравы статус і нэўтралітэт Беларускай ССР. Дзень 27 ліпеня быў прагалошаны дзяржаўным сьвятам.

Абвяшчэньне сувэрэнітэту Вярхоўным Саветам БССР не было прадыктаванае лібэральна-капіталістычнымі або нацыяналістычнымі памкненьнямі. Гэтая гістарычная для Беларусі падзея была ў найбольшай ступені абумоўленая вонкавымі чыньнікамі. Дэклярацыя аб сувэрэнітэце была прынятая Вярхоўным Саветам БССР толькі пасьля таго, як Зьезд народных дэпутатаў Расіі і Вярхоўная Рада Ўкраіны прынялі такія дакумэнты. Цяпер ужо беларуская намэнклятура імкнулася выкарыстаць незалежнасьць, каб засьцерагчы сябе ад імпарту рэформаў з Масквы. Прыняцьцё Дэклярацыі зацягвалася беларускім Вярхоўным Саветам наколькі гэта было магчымым. А калі Дэклярацыя была ўсё ж прынятая, яна разглядалася большынёй у Вярхоўным Савеце БССР як магчымасьць для савецкай беларускай эліты захаваць прывілеі. Дэмакратычна настроеныя дэпутаты, тым больш прыхільнікі рынкавай эканомікі і адпаведнай палітычнай сыстэмы, былі ў меншыні.

## Жнівеньскі путч 1991 году.
## Аслабленьне пазыцыяў савецкай эліты.
## Спалучэньне працэсаў дэмакратызацыі і рэакцыі

Тым часам у Беларусі працягвалася фармаваньне новай палітычнай прасторы. 9–10 верасьня ў Менску прайшла ўстаноўчая канфэрэнцыя Аб’яднаньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына». 3–4 лістапада ў Менску праходзіць устаноўчы зьезд Аб’яднанай Дэмакратычнай

партыі Беларусі. Насельніцтва актывізуецца. 7 лістапада на пляцы Леніна ў Менску адбыўся антыкамуністычны мітынг; 26 лістапада — палітычны страйк работнікаў транспарту.

Праціўнікі рэформаў таксама зьдзяйсьняюць захады ў адказ. 1991 год пачаўся з пагромаў. Пагромы адбыліся ўначы 4 студзеня 1991 году ў рэдакцыях газэты «Літаратуры і мастацтва», часопісаў «Полымя», «Нёман», «Беларусь». Тады ж, у студзені, адбываюцца хваляваньні ў Прыбалтыцы. 13 і 20 студзеня ў Менску ў сувязі з падзеямі ў Вільні прайшлі мітынгі пратэсту.

23 лютага 1991 году ў Менску адбыўся ўстаноўчы зьезд Беларускай Сялянскай партыі. 2–3 сакавіка там жа праходзіць ўстаноўчы зьезд Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. 23–24 сакавіка Беларускі народны фронт «Адраджэньне» праводзіць 2-гі зьезд, дзе прымаецца новы статут БНФ.

Магутны штуршок разьвіцьцю палітычнай сытуацыі ўнутры Беларусі надалі падзеі ў Расіі. У жніўні 1991 году Бюро Цэнтральнага камітэту Камуністычнай партыі Беларусі падтрымала путч, узначалены ДКНС (ГКЧП), і выступіла са спэцыяльнай заявай, у якой вітала гэтую падзею. Бюро прыняло «Зварот да камуністаў, усіх працоўных рэспублікі». Путч падтрымаў і Старшыня Вярхоўнага Савету БССР Мікалай Дземянцей, які ацаніў дзеяньні ДКНС як канстытуцыйныя[4].

БНФ ад пачатку безумоўна асудзіў путч. 20 жніўня на пляцы Леніна БНФ правёў мітынг пратэсту. Пасьля паразы путчу ў Маскве Вярхоўны Савет пад ціскам апазыцыі БНФ замест Мікалая Дземянцея абраў старшынём Станіслава Шушкевіча. Вярхоўны Савет Беларусі быў змушаны надаць Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце статус канстытуцыйнага закону. Была прынятая і пастанова пра эканамічную і палітычную незалежнасьць Беларусі. Назвай дзяржавы замест БССР стала Рэспубліка Беларусь. Была прынятая новая сымболіка: бел-чырвона-белы сьцяг і герб «Пагоня». Дзейнасьць КПБ-КПСС была прыпыненая.

Пасьля паразы ДКНС пачаўся хуткі распад СССР. У сьнежні 1991 году ў Белавескай пушчы Станіслаў Шушкевіч і Вячаслаў Кебіч падпісалі дакумэнты пра спыненьне існаваньня СССР і ўтварэньне СНД. Беларуская намэнклятура, якая рэагавала на разьвіцьцё падзеяў у Маскве, пазбылася ініцыятывы. З гэтага моманту Масква, якая для старых беларускіх элітаў усё яшчэ заставалася імпэрскім адміністрацыйным і ідэалягічным цэнтрам, канчаткова абірае шлях палітычных і эканамічных рэформаў. Адбываецца актыўны дэмантаж сацыялістычнай сыстэмы ў Расіі. Перамога нацыяналістычных і дэмакратычных рухаў у Прыбалтыцы і Украіне паставілі старыя беларускія эліты перад неабходнасьцю зьдзяйсьненьня самастойнай палітыкі.

Аднак раўнавага сілаў паміж прыхільнікамі рэформаў і старой савецкай элітай, дасягнутая ў 1990 годзе, у цэлым захоўвалася. Пасьля атрыманьня незалежнасьці старая беларуская эліта памяняла сваю кіруючую структуру. Месца Цэнтральнага камітэту Камуністычнай партыі Беларусі заняў Савет міністраў. Вярхоўны Савет практычна цалкам кантраляваўся ўрадавым лёбі, што аб'ядналася ў фракцыю «Беларусь». Аднак, захаваўшы ўладу, старая намэнклятура ня ведала, як яе далей выкарыстоўваць. Яна стала не гаспадаром становішча, а закладнікам[5]. У адрозьненьне ад старой эліты, апазыцыя на чале з БНФ мела адносна ясную праграму, што прадугледжвала ўмацаваньне незалежнасьці, адыход ад Расіі і збліжэньне з Заха-

---

[4] Гл.: Раздрукоўка фанаграмы гутаркі.

[5] Гл.: Карбалевич Валерий. Политическое развитие и национально-государственные интересы Республики Беларусь (1988–1996) // Адкрытае грамадства. Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь. 1999. № 1(6).

дам, беларусізацыю, рынкавыя рэформы і дэмакратызацыю грамадзтва. Застаючыся ў меншыні, дэпутаты апазыцыі стала выкарыстоўвалі СМІ, апэлявалі да грамадзкай думкі, набывалі ўплыў, які часткова кампэнсаваў іх малалікасьць у Вярхоўным Савеце.

Знаходзячыся пад ціскам апазыцыі, ня маючы ўласнага пляну дзеяньняў, кіруючая савецкая эліта пайшла на кампраміс. Яна па-ранейшаму захоўвала пад сваім кантролем уладу ў цэнтры і на месцах, кантралявала эканоміку — усё яшчэ дзяржаўную, працэс прыватызацыі і вонкавую палітыку. Ідэалягічная і культурная сфэры, дзе ўжо і без таго дамінавалі прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага руху, былі часткова аддадзеныя апазыцыі.

Узімку 1991 і ўвесну 1992 году БНФ выступае з прапановай правесьці агульнанацыянальны рэфэрэндум па пытаньні пра датэрміновыя выбары Вярхоўнага Савету ўвосень 1992 году. Сьпікер Вярхоўнага Савету Станіслаў Шушкевіч ня выкарыстаў сваіх паўнамоцтваў і не падтрымаў БНФ. 1 кастрычніка 1992 году Вярхоўны Савет адхіліў прапанову датэрміновых выбараў, хоць у падтрымку рэфэрэндуму было сабрана 442 000 подпісаў.

## Партыйнае будаўніцтва

30–31 траўня 1993 году БНФ праводзіць 3-і зьезд. На ім афіцыйна абвяшчаецца стварэньне партыі БНФ і прымаецца праграма, якая сьцьвярджае аднолькавую значнасьць вырашэньня праблемаў нацыянальнага самавызначэньня Беларусі і яе дэмакратызацыі, раўназначнасьць правоў нацыі і правоў асобы. Структура і кіраўніцтва Фронту-руху і Фронту-партыі заставаліся тымі самымі.

БНФ абвясьціў сябе партыяй хутчэй выходзячы з прагматычных меркаваньняў. Паводле ідэалёгіі, БНФ ня партыя, а нацыянальна-вызвольны рух, «як бы рух усяго народу, арыентаваны не на суіснаваньне зь іншымі партыямі і ратацыю ўва ўладзе, а на «татальную» перамогу і радыкальныя пераўтварэньні грамадзтва»[6]. Да ўтварэньня новых партыяў БНФ ставіцца насьцярожана. Тым ня менш, у 1990–1992 гадох ідзе актыўны працэс утварэньня новых партыяў.

Яшчэ ў лістападзе 1990 году на базе беларускіх прыхільнікаў «Дэмакратычнай плятформы ў КПСС» узьнікла Аб'яднаная Дэмакратычная партыя. На 2-м зьезьдзе ў 1991 годзе яе ачоліў народны дэпутат СССР Аляксандар Дабравольскі. АДП займае памяркоўную пазыцыю ў адносінах да дзяржаўнасьці беларускай мовы і аб'ядноўвае пераважна расейскамоўную інтэлігенцыю.

У лютым 1991 году ствараецца Беларуская сялянская партыя. У сакавіку 1991 году праходзіць устаноўчы зьезд Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, якая абвясьціла пераемнасьць зь Беларускай Сацыялістычнай Грамадой, партыяй, якая існавала ў пачатку XX стагодзьдзя. У БСДГ сышла памяркоўная і зьвязаная з ранейшым істэблішмэнтам частка БНФ. У яе таксама ўступілі некаторыя прадстаўнікі істэблішмэнту, якія не былі ў БНФ. У ідэалягічным пляне БСДГ нязначна адрозьнівалася ад БНФ. Гэта была хутчэй не сацыял-дэмакратычная, а нацыянальна-дэмакратычная партыя.

---

6 Галина Дракохруст, Юрий Дракохруст, Дмитрий Фурман. Трансформация партийной системы Беларуси / / Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека. 1998. — С. 116.

У чэрвені 1991 году адбываецца ўстаноўчая канфэрэнцыя Беларускай Хрысьціянска-дэмакратычнай злучнасьці. У ліпені ўзьнікае Нацыянальна-дэмакратычная партыя Беларусі (для яе сяброў было пажаданым валоданьне беларускай мовай).

Пры канцы 1991 году група расійскамоўнае інтэлігенцыі далучылася да расійскага Руху за дэмакратычныя рэформы і стварыла арганізацыю РДР «Дэмакратычная Беларусь». РДР была зарэгістраваная ў лютым 1992 году. Пазьней частка яго ўдзельнікаў увайшла ў АГП. Іншая частка створыць у 1996–1997 годзе прарасійскае дэмакратычнае аб'яднаньне «Яблоко».

У 1992 годзе ўзьнікае Партыя народнай згоды (ПНЗ) на чале з мэрам гораду Маладэчна, дэпутатам Вярхоўнага Савету Генадзем Карпенкам. У яе ўвайшлі многія прадстаўнікі кіруючай эліты сярэдняга ўзроўню. Варта адзначыць, што ў 1992 годзе будучы прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка быў адным з двух сустаршыняў ПНЗ. Гэтая партыя была першай у ліку тых, хто падтрымаў маладога і незалежнага Аляксандра Лукашэнку на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году. Партыя ня мела выразнай ідэалёгіі. У далейшым Генадзь Карпенка быў выключаны з партыі, а шэраг лідэраў другога эшалёну стаў супрацоўнічаць з Аляксандрам Лукашэнкам.

АДП і РДР-ДБ, схільныя да лібэральнай ідэалёгіі, у выніку прыйшлі да стварэньня Аб'яднанай Грамадзянскай партыі.

Стасункі паміж БНФ і новымі дэмакратычнымі партыямі разьвіваліся дастаткова складана. Партыі імкнуліся да альянсу з БНФ — найбольш магутнай арганізацыяй, апазыцыйнай старой савецкай эліце. На пачатку 1992 году Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада выйшла з ініцыятывай стварэньня шырокага блёку «Новая Беларусь». Меркавалася аб'яднаць у ім усе дэмакратычныя партыі і прафэсійныя саюзы, улучна з афіцыйнымі. БНФ быў рэзка супраць. Пры канцы 1992 году была створаная для сталай працы Кансультацыйная рада дэмакратычных сілаў, але БНФ пагадзіўся браць удзел у радзе толькі ў якасьці назіральніка. Кансалідацыі ўсіх дэмакратычных сілаў, здольных супрацьстаяць старой сыстэме ўлады, не адбылося.

Паралельна з разьвіцьцём партый на падмурку нацыянальна-дэмакратычнага руху ў Беларусі паступова адбываўся паўзучы камуністычны рэванш. Пасьля правалу путчу ДКНС у жніўні 1991 году дзейнасьць камуністычнай партыі ў Беларусі была часова прыпыненая. Аднак ужо 7 сьнежня 1991 году ў Менску пры ўдзеле 320 дэлегатаў адбыўся ўстаноўчы зьезд Партыі камуністаў Беларусі. Ініцыятарамі выступілі партыйныя функцыянэры сярэдняга і ніжняга зьвёнаў КПБ-КПСС, такія як Віктар Чыкін, Васіль Новікаў, Сяргей Калякін. У 1992 годзе ствараецца фракцыя ПКБ у Вярхоўным Савеце Беларусі, якая налічвала 58 дэпутатаў. Бальшыню фракцыі склалі дэпутаты ад арганізацыяў вэтэранаў і інвалідаў. Толькі 12 чальцоў фракцыі былі беспасярэднімі чальцамі ПКБ.

14 лютага 1993 году, пасьля шматлікіх патрабаваньняў ПКБ, Вярхоўны Савет Беларусі скасаваў пастанову пра часовае спыненьне дзейнасьці КПБ. Легалізацыі Камуністычнай партыі Беларусі дапамагло расьсьледаваньне пракуратуры, якое не пацьвердзіла ўдзелу КПБ у змове ДКНС. Асабліва трывалыя пазыцыі ў параўнаньні з партыямі дэмакратычнай арыентацыі, чыё зьяўленьне і разьвіцьцё зьвязаныя пераважна зь Менскам, камуністы заваявалі ў беларускіх рэгіёнах.

У праграме ПКБ адной з асноўных мэтаў абвяшчалася аднаўленьне СССР. У гэтым імкненьні камуністы былі блізкія да партыяў, што вызнавалі ідэі панславізму і адзінства «славяна-рускага народу». Усе яны так ці йначай адмаўлялі беларускай нацыі ў гістарычнай сама-

стойнасьці. Характэрна, што партыі, аналягічныя расійскім нэафашыстам, якія адсутнічалі ў іншых былых рэспубліках СССР, зьяўляліся ў Беларусі зь яе русіфікаваным, маргіналізаваным у этнакультурных адносінах насельніцтвам.

Няхай і ня так шырока, як у Расіі, у Беларусі ўзьнік фэномэн, аналягічны расійскаму нацыяналізму. Славянскі Сабор «Белая Русь», створаны ў чэрвені 1992 году, найбольш вядомая некамуністычная партыя, якая выступае за дзяржаўнае аб'яднаньне славянаў на чале з Расіяй. Партыя супрацоўнічала з Расійскім нацыянальным саборам. Увесну 1993 году яна выступіла адным з ініцыятараў стварэньня Народнага Руху Беларусі, НРБ, які на нейкі час аб'яднаў камуністаў і панславістаў. У верасьні 1993 году НРБ арганізаваў так званы Кангрэс народу Беларусі, які патрабаваў скасаваць белавескія пагадненьні. У 1993–1994 гадох НРБ сумесна з камуністамі падтрымлівалі прэм'ер-міністра Беларусі Вячаслава Кебіча пры стварэньні адзінай грашовай сыстэмы Беларусі і Расіі.

У 1992 годзе была створаная Аграрная партыя, якая аб'яднала старшыняў калгасаў. У 1993–94 гадох яе кіраўнік Сямён Шарэцкі быў дарадцам прэм'ер-міністра Беларусі Вячаслава Кебіча па сельскай гаспадарцы.

У цэлым, узьніклыя партыі запаўнялі палітычны спэктар Беларусі. Але, як адзначаюць Галіна Дракахруст, Юры Дракахруст і Дзьмітры Фурман, «гэтая нібыта ўсёахопная палітычная сыстэма была вельмі слабой і нетрывалай»[7]. Прыхільнікі партыяў і іх склад былі крайне малалікія, за выключэньнем БНФ. Ніводная з партыяў не знаходзілася ўва ўладзе. Сама ж кіруючая эліта, старая савецкая намэнклятура, пасьля страты канстытуцыйных прывілеяў кампартыі зьдзяйсьняла сваю ўладу па-за ўсялякай партыйнай сыстэмай.

Тыя ж аўтары дакладна характарызуюць спэцыфіку беларускай палітычнай прасторы і кіруючай эліты. У Расіі й ва Ўкраіне ўва ўладзе апынуліся Барыс Ельцын і Леанід Краўчук, былыя камуністычныя дзеячы, цяпер беспартыйныя, якія атаясамілі сябе з пэўнымі ідэямі пабудовы буржуазнай дэмакратыі ці незалежнай дзяржавы. «А ў беларускай «партыі ўлады» ўвогуле не было ніякай дакладнай пазыцыі. Гэта былі проста апартуністы. Спачатку яны вінавацілі ўва ўсіх эканамічных бедах Маскву й імкнуліся засьцерагчы сябе ад расійскай дэмакратыі, пайшоўшы на «сувэрэнізацыю» і «беларусізацыю». Але й абвяшчэньне незалежнасьці, і прызнаньне дзяржаўнасьці беларускай мовы, і забарона КПБ былі хутчэй актамі баязьлівасьці. Ніякага нацыянальнага пачуцьця, усьведамленьня сваёй гістарычнай місіі, якія гэтак перапаўнялі, напрыклад, Краўчука, у іх не было. Беларускі прэм'ер-міністар Вячаслаў Кебіч шукаў хаўрусу з Расіяй і зьбліжаўся з камуністамі і «панславістамі». Ніякіх партыйных структураў гэта «партыя ўлады» праз свае безыдэйнасьць і апартунізм не стварыла і не магла стварыць»[8].

Старая кіруючая эліта ня мела ідэалёгіі й палітычнай праграмы, але яна была аб'яднаная магутнымі карпаратыўнымі інтарэсамі і асабістымі сувязямі. Савецкі рэжым спарадзіў адмысловую прывілеяваную сацыяльную групу, што існавала пад прыкрыцьцём КПСС. Савецкая намэнклятура зьдзяйсьняла сваё панаваньне пры дапамозе фармальных структураў савецкай дзяржавы. Аднак сама сыстэма стасункаў пры ўладзе ў Савецкім Саюзе не была ў строгім сэнсе палітычнай. Гэта былі клянавыя, крэўна-сваяцкія і карпаратыўныя, дапалітычныя, патэстарныя стасункі і сувязі. Фармальныя, вонкавыя структуры савецкай дзяржавы распадаліся ці трансфармаваліся, але падмурак самой сыстэмы ўладных стасункаў захаваўся разам з старой намэнклятурай.

[7] Тамсама. С. 123.

[8] Тамсама.

Вячаслаў Кебіч, які выражаў інтарэсы старой, савецкай эліты, абапіраўся на бальшыню Вярхоўнага Савету, што складалася з усё той жа намэнклятуры. Яго падтрымлівала самая буйная фракцыя «Беларусь», створаная ў 1993 годзе адумысьля дзеля падтрымкі прэм'ер-міністра і якая ўлучала амаль палову дэпутацкага корпусу.

## Беларусіфікацыя і праблемы нацыянальнага адраджэньня

Кампанія беларусіфікацыі праводзілася з ініцыятывы нацыянальна-дэмакратычных сілаў на чале з БНФ. Укараняліся новыя дзяржаўныя сымбалі. У школах і вышэйшых навучальных установах пачалося выкладаньне беларускай гісторыі, пазбаўленае савецкай ідэалёгіі. Кардынальна пераглядаліся ідэі адзінства гістарычных лёсаў расійцаў і беларусаў, іх гістарычнага братэрства. Значная частка цэнтральных і рэгіянальных СМІ прапагандавалі ідэі нацыянальнага адраджэньня. Павялічылася колькасьць выданьняў на беларускай мове. У 1993 годзе ў параўнаньні з 1992 іх было выпушчана на 43% больш па назвах і на 53% — па накладзе[9].

Асноўную ўвагу ў разьвіцьці беларускай культуры апазыцыя надавала ўкараненьню беларускай мовы ў якасьці дзяржаўнай, вызнаючы ідэю пра мову як пра падмурак фармаваньня нацыі. Сыстэма адукацыі пераводзілася на беларускую мову навучаньня: да 1994 году ў школах на беларускай мове навучалася больш за 60% вучняў першых клясаў. Паралельна зьдзяйсьняўся пераход на беларускую мову ў тэхнікумах і вышэйшых навучальных установах, у першую чаргу выкладаньне гуманітарных дысцыплінаў. Значна менш пасьпяхова ішло ўкараненьне беларускай мовы ў сфэры дзяржаўнага справаводзтва.

Але разам з пашырэньнем беларусізацыі ўзрастала незадавальненьне як у асяродку пэдагогаў і чыноўнікаў, так і сярод расійскамоўных інтэлектуалаў, якія складалі значную частку прыхільнікаў беларускай апазыцыі. У СМІ распачалася зацятая дыскусія наконт інтэнсіўнага ўкараненьня беларускае мовы. Перавага была ў прыхільнікаў хуткага й шырокага распаўсюджаньня беларускай мовы, якія мелі ключавыя пазыцыі ў СМІ. Але ў цэлым бальшыня насельніцтва ставілася да беларускай мовы абыякава і не вітала ейнага інтэнсіўнага ўкараненьня. Паводле перапісу насельніцтва, што праводзіўся ў Савецкім Саюзе ў 1989 годзе, 20% этнічных беларусаў лічылі сваёй роднай мовай расійскую. Аднак, паводле перапісу, што праводзіўся ў 1999 годзе, у паўсядзённым жыцьці беларускай мовай карыстаецца менш за 40% насельніцтва.

## Крызысныя тэндэнцыі ў беларускай эканоміцы й намэнклятурная прыватызацыя

Захаваньне савецкай намэнклятурай старых пазыцыяў у эканамічнай і адміністрацыйнай сфэры (у выпадку з цалкам дзяржаўнай эканомікай гэтыя сфэры супадалі) рабіла старую

[9] Гл.: Звязда. 1994. 21 студзеня.

эліту адказнай за пагаршэньне эканамічнай сытуацыі. Дзеля рэабілітацыі ў ваччу насельніцтва старая эліта эксплюатавала міталягізаваныя ўяўленьні савецкіх беларусаў пра функцыянаваньне эканомікі. Крытыка самога прынцыпу цэнтралізаванага кантролю вытворчасьці і разьмеркаваньня пачалася ў Беларусі толькі з распадам СССР. Бальшыня насельніцтва, чые ўяўленьні пра эканоміку абмяжоўваліся школьным курсам грамадазнаўства — вульгарызаванымі трактоўкамі асноваў марксісцкай палітэканоміі — проста ня мела катэгарыяльнага апарату, каб асэнсаваць працэсы, якія адбываліся. (Пасьля, значна больш эфэктыўна, антыкапіталістычную мэнтальнасьць беларускага насельніцтва будзе скарыстоўваць у сваёй папулісцкай рыторыцы Аляксандар Лукашэнка.)

Пераход да рынкавай эканомікі азначаў страту ўлады-ўласнасьці і пераўтварэньне бюракратыі ў звычайнага выканаўцу інтарэсаў уласьнікаў. У 1990–1991 гадох беларуская намэнклятура спрабавала кансэрваваць сацыялістычную сыстэму. Дзеля гэтага трэба было наладзіць цэнтралізаванае забесьпячэньне прадпрыемстваў рэсурсамі і захаваць дзяржаўную ўласнасьць.

5 жніўня 1990 году па ініцыятыве беларускага ўраду адбылася рабочая нарада кіраўнікоў урадаў Беларусі, Летувы, Латвіі, Эстоніі й прадстаўнікаў Расіі й Малдовы. Нарада была прысьвечаная праблемам беспасярэдніх гаспадарчых сувязяў паміж гэтымі рэспублікамі СССР. На ініцыятыву Беларусі быў створаны своеасаблівы рынак — не для вытворцаў і спажыўцоў, а для ўрадаў рэспублік. Дзякуючы гэтаму ўдалося аднавіць нейкае падабенства сыстэмы цэнтралізаванага плянаваньня і блякаваць разьвіцьцё рынкавых стасункаў, хоць такая сыстэма забесьпячэньня функцыянавала зь перабоямі[10]. Старыя адміністрацыйныя мэханізмы ўжо ня дзейнічалі.

Эканамічны крызыс, які ўсё больш нарастаў, кіраўніцтва Беларусі тлумачыла дзеяньнямі Масквы. Старшыня Савету міністраў БССР Вячаслаў Кебіч увесь час падкрэсьліваў, што ў пагаршэньні жыцьця людзей вінаваты саюзны Цэнтар. Характэрна, што лідэр БНФ Зянон Пазьняк таксама вінаваціў у крызысе ня толькі беларускую партыйную намэнклятуру, якая па-ранейшаму заставалася ўва ўладзе, але і Маскву, што імкнулася задушыць беларускую незалежнасьць. Такім чынам, ува ўяўленьнях насельніцтва як прадстаўнікамі старой эліты, так і БНФ (хоць і міжволі) укаранялася думка пра згубныя наступствы распаду СССР. У першым выпадку намэнклятура сьвядома пераносіла адказнасьць на Расію. У другім — ня ўлічваўся магчымы эфэкт антысавецкіх і антырасійскіх выступленьняў у сытуацыі падзеньня ўзроўню жыцьця ў краіне, дзе рэсурс савецкай сыстэмы ня быў вычарпаны гэтак, як ува Ўкраіне, а нацыянальны рух быў значна слабейшым за астатнія рэспублікі СССР.

Акурат дзеяньнямі Масквы тлумачыўся рост бюджэтнага дэфіцыту, разбурэньне спажывецкага рынку, развал фінансавай і грашова-крэдытнай сыстэмаў. Беларускае кіраўніцтва імкнулася засьцерагчы сябе ад дзеяньняў саюзнага кіраўніцтва. Савет міністраў Беларусі прыняў пастанову пра вываз тавараў масавага спажываньня за межы рэспублікі толькі з дазволу ўраду. Аднак спробы захаваць сацыялістычную эканоміку і спыніць эканамічны спад ня мелі посьпеху.

Спробы ізаляцыі не прыносілі жаданых вынікаў. Акрамя таго, функцыянаваньне эканомікі БССР залежала ад паставак сыравіны, энэрганосьбітаў і камплектуючых з Расіі й іншых

[10] Гл.: Леонид Злотников. В петле популизма // Хроника несостоявшегося времени. Десять лет в зеркале «Белорусского рынка». Менск. 2001. 336 с.

рэспублік СССР — якія не купляліся, а разьмяркоўваліся саюзнымі інстытутамі. Пры канцы 1991 году Расія абвясьціла пра пачатак радыкальный рынкавай рэформы і лібэралізацыі цэнаў. Тады ўрад Беларусі таксама быў вымушаны аб'явіць пра лібэралізацыю цэнаў з 1 студзеня 1992 году. Аднак цэны на хлеб, мясамалочныя прадукты, дзіцячыя тавары, жыльлёва-камунальныя паслугі і транспарт заставаліся фіксаванымі.

Ужо пасьля ўтварэньня СНД, улетку 1993 году Беларусь перажыла энэргетычны крызыс. Савет міністраў пачаў прапагандаваць ня проста ідэю эканамічнага хаўрусу з Расіяй, а ідэю палітычнага і дзяржаўнага аб'яднаньня, канфэдэрацыі краінаў СНД.

У верасьні 1993 году Беларусь і Расія падпісалі пагадненьне пра стварэньне адзінай рублёвай зоны. Канкрэтную дамову меркавалася падпісаць у студзені 1994 г. Прадугледжвалася ўвядзеньне ў Беларусі і Расіі супольнай грашовай адзінкі, расійскага рубля. Але, разам з тым, Нацыянальны банк Беларусі захоўваў усе функцыі, улучаючы эмісійную. Урадавая прапаганда Беларусі абяцала павышэньне даходаў грамадзянаў у 2–3 разы. Але ў верасьні-сьнежні 1993 году ў Расіі разьвіваўся збройны канфлікт паміж выканаўчай і заканадаўчай уладамі. Перамога Барыса Ельцына і яго прыхільнікаў паставіла ўрад Вячаслава Кебіча ў складанае становішча. Савецкія кансэрватары з Савету міністраў і беларускага Вярхоўнага Савету былі змушаныя супрацоўнічаць з расійскімі рэфарматарамі. Захаваньне ранейшага высокага статусу старой беларускай эліты патрабавала моцнага ўмяшальніцтва дзяржавы ў эканамічныя працэсы. Аднак Расія, зь перамогай ельцынскай групоўкі, абрала больш лібэральную мадэль эканамічнага разьвіцьця.

У выніку разрыву гаспадарчых сувязяў, што існавалі ў СССР, і пераходу былых савецкіх рэспублік да рынкавай эканомікі, старая беларуская эліта была вымушаная прыстасоўвацца да новай эканамічнай сытуацыі. Паралельна з спробамі паразытаваць на руінах старой адміністрацыйнай эканомікі СССР і расійскіх рэсурсах, беларуская намэнклятура пачала працэс прыватызацыі. Пасьля набыцьця незалежнасьці і роспуску камуністычнай партыі фактычным гаспадаром у Беларусі стала дзяржаўная бюракратыя. Гэта была ўсё тая ж старая савецкая эліта, якая адмовілася ад камуністычнай ідэалёгіі, але якая захавала сваё становішча і доступ да рэсурсаў улады-ўласнасьці. Час яе панаваньня прыпаў на пэрыяд паўнамоцтваў ураду Вячаслава Кебіча, 1991–1994 гады.

Першапачатковаму назапашваньню капіталу дзяржаўнай бюракратыяй спрыялі палітыка стрымліваньня росту цэнаў на тле іх шпаркага росту ў іншых рэспубліках былога СССР і маніпуляваньне валютнымі курсамі. Прыватызацыя фінансаў зрабіла магчымай прыватызацыю дзяржаўнай маёмасьці, але Вярхоўны Савет не стварыў адпаведнага заканадаўчага забесьпячэньня прыватызацыі. І таму прыватызацыя пачалася паводле часовых нормаў, зацьверджаных Саветам міністраў. Спробы вышэйшага кіраўніцтва працягваць разьвіцьцё Беларусі паводле сацыялістычнай мадэлі стварылі спрыяльныя ўмовы для злоўжываньняў і прысабечаньня дзяржаўнай маёмасьці. Ацэньваньне маёмасьці рабілася не паводле яе рынкавага кошту, а паводле рэшткавага кошту бугальтарскага балянсу. Прыватызаваныя аб'екты купляліся за бесцань. У 1992–1994 гадох старая беларуская эліта пераходзіла ад канчаткова збанкрутаванай сацыялістычнай эканамічнай мадэлі да алігархічнага капіталізму[11].

Аднак раўналежна з намэнклятурнай прыватызацыяй расла незадаволенасьць насельніцтва. Эканамічнае становішча пагаршалася. Папулісцкія захады ўраду выклікалі высокую інфля-

[11] Тамсама.

цыю. У 1992–1994 гадох цэны ўзрасьлі ў 432 разы, а аб'ем ВУП зьнізіўся на 20%. Узровень жыцьця за пэрыяд з 1990 да 1994 году ўпаў амаль удвая. Рэзка ўзрасло сацыяльнае расслаеньне. Розьніца ў даходах 10% найбольш багатых і 10% найбольш бедных сем'яў павялічылася ў 13 разоў (у Расіі — у 15 разоў у 1995 годзе з 4,5 разу ў 1991 годзе)[12]. У савецкага істэблішмэнту не было неабходнага рэпрэсіўнага апарату для задушэньня незадаволенасьці і ўзурпацыі ўлады. Не было і неабходнага палітычнага мэханізму легітымацыі старой эліты ў якасьці новай кіруючай клясы. Тым часам набліжаўся канец паўнамоцтваў старога Вярхоўнага Савету зь яго намэнклятурным лёбі. Насельніцтва не рабіла ніякіх сур'ёзных антыўрадавых выступаў, аднак, калі б у той час у Беларусі зьявілася палітычная сіла, здольная яго кансалідаваць і накіраваць яго энэргію супраць старой эліты, урад спыніў бы сваё існаваньне. Становішча старой эліты захоўвалася дзякуючы слабасьці апазыцыі, разгубленасьці і разьяднанасьці насельніцтва Беларусі.

## ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 1994 ГОДУ. ПЕРАРАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ РЭСУРСАЎ УЛАДЫ. ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

### Прэзыдэнцкая рэспубліка як сродак рэпрадукцыі старой эліты

Старая беларуская эліта катэгарычна не жадала дзяліцца эканамічнай і палітычнай уладай беспасярэдне з суб'ектамі гаспадараньня. Дэмакратычныя працэсы ў беларускім грамадзтве, рух за нацыянальнае адраджэньне сустрэлі яе супраціў. Захаваўшы адміністрацыйныя рэсурсы, палітычны й эканамічны ўплыў, яна канчаткова страціла легітымнасьць у ваччу бальшыні беларускага насельніцтва.

Пакуль ня скончыўся тэрмін паўнамоцтваў старога Вярхоўнага Савету, савецкая эліта не рабіла яўных спробаў зьмяніць існуючы лад. Аднак выбары ў новы Вярхоўны Савет маглі сур'ёзна аслабіць яе пазыцыі. Насельніцтва ж, нават тая частка, што ўсё яшчэ падзяляла камуністычныя ідэі, ненавідзела намэнклятурны істэблішмэнт.

Надыход заканчэньня тэрміну паўнамоцтваў Вярхоўнага Савету змусіў савецкую эліту шукаць новыя спосабы захаваньня ўлады. Паколькі моцнай падтрымкі насельніцтва ў яе не было, спатрэбіўся легітымны мэханізм канцэнтрацыі і пераразьмеркаваньня рэсурсаў на яе карысьць. Такім мэханізмам меў стаць інстытут прэзыдэнта. Дзеля ўвядзеньня пасады прэзыдэнта трэба было прыняць новую Канстытуцыю і правесьці выбары.

Перад выбарамі намэнклятура ўзмацніла свае пазыцыі. У верасьні 1993 году прэзыдыюм Вярхоўнага Савету адмовіўся падтрымаць ініцыятыву Станіслава Шушкевіча склікаць паза-

[12] Тамсама.

чарговую сэсію дзеля разгляду сытуацыі ў эканоміцы, прыняцьця Канстытуцыі і прызначэньня датэрміновых выбараў. Сам Станіслаў Шушкевіч быў зьняты з пасады Старшыні Вярхоўнага Савету. Прычынай адстаўкі сталі беспадстаўныя абвінавачаньні ў карупцыі, высунутыя супраць Станіслава Шушкевіча Аляксандрам Лукашэнкам. Істотную ролю ў адхіленьні Станіслава Шушкевіча таксама адыгралі камуністы і прадстаўнікі праімпэрскага Нацыянальнага Руху Беларусі, што сядзелі ў Вярхоўным Савеце. А ў студзені 1994 году на гэтую пасаду быў абраны прадстаўнік парлямэнцкай бальшыні Мечыслаў Грыб.

У сакавіку 1994 году была прынятая новая Канстытуцыя, якая вызначала Беларусь як унітарную дэмакратычную сацыяльную прававую дзяржаву зь вяршэнствам і паўнінёй улады на сваёй тэрыторыі, што самастойна праводзіць унутраную і замежную палітыку. У якасьці асноваў канстытуцыйнага ладу Канстытуцыя замацоўвала палітычны плюралізм, падзел уладаў, прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права, роўнасьць формаў уласнасьці, прынцып неўжываньня сілы альбо пагрозы сілай у стасунках зь іншымі дзяржавамі. Забесьпячэньне правоў і свабодаў грамадзянаў абвяшчалася найвышэйшай мэтай дзяржавы. Але ў сацыяльна-эканамічнай сфэры рэдакцыя адпаведных артыкулаў новай Канстытуцыі захавала пераемнасьць з старой Канстытуцыяй 1978 году.

Галоўнай мэтай прыняцьця новай Канстытуцыі для старой эліты была зьмена формы кіраваньня. Парлямэнцкая рэспубліка станавілася прэзыдэнцкай рэспублікай. Валодаючы дастатковымі адміністрацыйнымі і фінансавымі рэсурсамі, старая эліта разьлічвала паставіць на чале выканаўчай улады свайго чалавека, Вячаслава Кебіча, захаваць сваё лёбі ў той ці іншай форме.

## Параза кандыдатаў ад намэнклятуры і апазыцыі. Абраньне Аляксандра Лукашэнкі

Аналізуючы ход прэзыдэнцкай кампаніі 1994 году, Валер Карбалевіч піша: «Выбары 1994 году ў Рэспубліцы Беларусі былі ўнікальныя. Беларусь заставалася адзінай дзяржавай у Эўропе, дзе ўва ўладзе знаходзілася кіраўніцтва, абранае яшчэ за камуністычным рэжымам. Апошні раз беларускія грамадзяне прыходзілі да выбарчых скрыняў у 1990 г. За гэты час у суседніх краінах (напрыклад, у Польшчы) ужо двойчы пераабіраўся парлямэнт, былі выбары прэзыдэнта. Зьмянілася эпоха, зьмянілася дзяржава, пачаўся пераход да іншай эканамічнай і палітычнай сыстэмы. А тут час быццам застыў. Ува ўладзе быў усё той самы ўрад, сфармаваны яшчэ ЦК КПБ»[13].

Старая эліта валодала значна большымі адміністрацыйнымі і эканамічнымі рэсурсамі дзеля прасоўваньня свайго кандыдата і забесьпячэньня яго выбарчай кампаніі. Апрача таго, рабіўся разьлік на ўзрастаньне ідэалягічнага рэсурсу за кошт уваходжаньня Беларусі ў грашовую сыстэму Расіі. Меркавалася, што імгненны эфэкт ад зьліцьця грашовых сыстэмаў і паразытаваньне на расійскіх рэсурсах падвысяць рэйтынг Вячаслава Кебіча. Таму прысьпешваўся працэс прыняцьця новай Канстытуцыі, якая прадугледжвала пасаду прэзыдэнта. Нацыяналістычная і дэмакратычная апазыцыя імкнулася парушыць пляны ўраду. Стараючы-

[13] Карбалевич Валерий. Путь Лукашенко к власти // Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека. 1998. С. 245.

ся перашкодзіць падпісаньню дамовы аб рублёвай зоне, у студзені 1994 году лідэр БНФ Зянон Пазьняк апублікаваў у «Народнай газэце» артыкул «Аб рускім імпэрыялізьме і яго небясьпецы». Артыкул зьмяшчаў беспрэцэдэнтна рэзкія абвінавачаньні Расіі ў імпэрыялістычнай палітыцы што да Беларусі.

Кандыдатамі ў прэзыдэнты былі зарэгістраваныя шасьцёра прэтэндэнтаў: Старшыня Савету міністраў Беларусі Вячаслаў Кебіч, старшыня Сойму Беларускага народнага фронту Зянон Пазьняк, дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі, дырэктар саўгасу «Гарадзец» Шклоўскага раёну Аляксандар Лукашэнка, былы Старшыня Вярхоўнага Савету Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі Станіслаў Шушкевіч, старшыня калгасу «Прагрэс» Гарадзенскага раёну, старшыня Рады калгасаў Беларусі Аляксандар Дубко, сакратар ЦК Партыі камуністаў Беларусі Васіль Новікаў.

Прыхільнікамі старой савецкай сыстэмы ў тым ці іншым выглядзе, за саюз з Расіяй і супраць рынкавых рэформаў выступілі Вячаслаў Кебіч, Аляксандар Лукашэнка, Васіль Новікаў, Аляксандар Дубко. За рынкавыя рэформы, незалежнасьць ад Расіі і супраць адзінай рублёвай зоны выступалі Зянон Пазьняк і Станіслаў Шушкевіч.

Выбары адбываліся ў два туры. У першым адсеяліся ўсе прэтэндэнты, акрамя Аляксандра Лукашэнкі і Вячаслава Кебіча. Але ўжо ў першым туры за Аляксандрам Лукашэнкам замацавалася яўная перавага (гл. таб.).

| Кандыдат | Выбарцы, якія прагаласавалі «за», % |
|---|---|
| Аляксандар Лукашэнка | 44.8 |
| Вячаслаў Кебіч | 17.3 |
| Зянон Пазьняк | 12.8 |
| Станіслаў Шушкевіч | 9.9 |
| Аляксандар Дубко | 5.9 |
| Васіль Новікаў | 4.3 |

Крыніца: Цэнтравыбаркам Рэспублікі Беларусі.

У другім туры Аляксандар Лукашэнка перамог. За яго прагаласавала 80% ад тых, хто ўзяў удзел у выбарах, або 56% грамадзянаў Беларусі з правам голасу.

## Аляксандар Лукашэнка і электаральная рэвалюцыя

У выбарчай кампаніі дэпутат Вярхоўнага Савету Аляксандар Лукашэнка выкарыстаў ужо адпрацаваны ў час барацьбы за дэпутацкае крэсла імідж чалавека з народу, ужо апрабаваныя раней прыёмы: выкрыцьцё ўлады, прапанова простых рашэньняў складаных праблемаў, абвінавачаньні.

Перад выбарамі Аляксандар Лукашэнка ачольваў антыкарупцыйную камісію Вярхоўнага Савету. Яе стварэньне было зьвязанае з тагачаснай намэнклятурнай прыватызацыяй, якая выклікала незадаволенасьць насельніцтва і давала апазыцыі сур’ёзную перавагу ў змаганьні з камандай Вячаслава Кебіча і прасавецкай бальшынёй у Вярхоўным Савеце. Акурат пад ціскам апазыцыі і грамадзкасьці 4 чэрвеня 1993 году была створаная «Часовая камісія Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі для вывучэньня дзейнасьці камэрцыйных структураў, якія дзейні-

чаюць пры рэспубліканскіх і мясцовых органах улады і кіраваньня». Камісія атрымала даволі вялікія паўнамоцтвы, уключаючы праверку любой дакумэнтацыі ўсіх арганізацыяў, у тым ліку недзяржаўных. На прызначэньні Лукашэнкі настояў Станіслаў Шушкевіч, спадзеючыся, што бескампрамісны дэпутат выкрые незаконныя дзеяньні каманды Вячаслава Кебіча.

Але ні бальшыня Вярхоўнага Савету, ні апазыцыя не ацанілі амбіцыяў Аляксандра Лукашэнкі. Па сутнасьці, уся ягоная дзейнасьць на чале антыкарупцыйнай камісіі была прапагандысцкай кампаніяй, пасьпяховай барацьбой за павелічэньне ўжо атрыманых ідэалягічных і адміністрацыйных рэсурсаў. Дзейнасьць Аляксандра Лукашэнкі ўжо ў той пэрыяд стала пачаткам ягонай прэзыдэнцкай кампаніі.

З пачатку 1994 г. Лукашэнка разьвіваў дасягнуты посьпех, выступаючы ў Вярхоўным Савеце, увесь час ківаў на кампрамат супраць высокіх асобаў, у тым ліку дэпутатаў. Абвастраўся канфлікт паміж Аляксандрам Лукашэнкам і часткай старой намэнклятуры. У прэсе і па радыё ён вінаваціў у незаконных махінацыях віцэ-прэм’ераў Станіслава Брыля і Мікалая Косьцікава, міністра абароны Паўла Казлоўскага, міністра замежных справаў Пятра Краўчанку і міністра вонкаваэканамічных сувязяў Уладзімера Радкевіча, а Вячаслава Кебіча — у спрыяньні парушальнікам закону. Ён езьдзіў па Беларусі, выступаў перад працоўнымі калектывамі і расказваў пра беззаконьне ўва ўладзе. Напярэдадні выбараў, насуперак намаганьням СМІ, якія тады былі падкантрольныя камандзе Вячаслава Кебіча, рэйтынг Лукашэнкі імкліва рос.

Запозьненасьць сацыяльных пераўтварэньняў адыграла важную ролю ў вызначэньні пажаданьняў насельніцтва. Першыя дэмакратычныя выбары першага беларускага прэзыдэнта адбываліся ў пэрыяд больш глыбокага сыстэмнага крызысу, чымся ў суседніх дзяржавах. Аднак і сам мэнталітэт беларускага насельніцтва, у тым ліку і палітычных элітаў, спрыяў захаваньню ранейшай сыстэмы патэстарных дачыненьняў, улады дзяржаўнай бюракратыі і гамаваньню рынкавых рэформаў.

Аляксандар Лукашэнка і Вячаслаў Кебіч істотна адрозьніваліся па сваім статусе. Кебіч быў прадстаўніком найвышэйшага зьвяна кіруючай эліты, Лукашэнка выйшаў зь нізкіх слаёў савецкага дзяржаўнага апарату, пачаў палітычную кар’еру на пасадзе дырэктара саўгасу «Гарадзец» у Магілёўскай вобласьці. Але, ня лічачы асабістых якасьцяў, гэта было іх адзінае сур’ёзнае адрозьненьне. Абодва не абапіраліся на партыі, ня мелі дакладнай праграмы і ідэалёгіі, кіраваліся кан’юнктурай, былі блізкія да камуністаў. Супрацьстаяньне Аляксандра Лукашэнкі і Вячаслава Кебіча было супрацьстаяньнем іміджаў: чалавека з народу і прадстаўніка намэнклятурнай эліты. Хаця яны ў той ці іншай ступені выкарыстоўвалі рынкавую й дэмакратычную рыторыку ў барацьбе за электарат, яны абодва былі прадстаўнікамі савецкай сыстэмы, заснаванай на адзінстве ўлады і ўласнасьці. У другім туры беларусы выбіралі паміж двума савецкімі ўрадоўцамі. Але Аляксандар Лукашэнка, блізкі насельніцтву і паходжаньнем, і манэрамі, не ўспрымаўся як паўнавартасны прадстаўнік намэнклятуры.

Выбары прайшлі па-за межамі ўласна палітычнай прасторы і сталі хутчэй рэфэрэндумам аб даверы састарэлай дзяржаўнай машыне — Аляксандар Лукашэнка сьвядома супрацьпастаўляў народ палітыкам, дыскрэдытаваў дзяржаўныя ўстановы, палітычныя інстытуты і ўладу ўвогуле[14]. Папулісцкая прапаганда накіравала незадаволенасьць насельніцтва на адмаўлень-

[14] Гл.: Карбалевич Валерий. Политическое развитие и национально-государственные интересы Республики Беларусь (1988–1996) // Адкрытае грамадства. Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь. 1999. № 1(6).

не рынкавых рэформаў і дэмакратыі. Стаўленьне масы насельніцтва да рынкавай эканомікі станавілася ўсё больш нэгатыўным[15].

Перамога папуліста Аляксандра Лукашэнкі на першых дэмакратычных выбарах стала адмысловай электаральнай рэвалюцыяй. У Беларусі ўлада надта доўга заставалася ў руках старой намэнклятуры. Адмовіўшыся ад камуністычнай ідэалёгіі, старая эліта выкарыстоўвала мэханізмы рынку і палітычнай дэмакратыі дзеля сваёй рэпрадукцыі. Праводзіліся ня рынкавыя рэформы, а іх імітацыя. За час намэнклятурнай прыватызацыі, раскраданьня дзяржаўнай маёмасьці бюракратыяй, непасьлядоўнасьці рэформаў, накіраваных на фармаваньне алігархічнага капіталізму, ідэя рынкавай эканомікі была дыскрэдытаваная, так і не атрымаўшы свайго рэальнага ўвасабленьня. На тле рэзкага абвастрэньня эканамічных праблемаў і зьбядненьня насельніцтва пачалося зьліцьцё чыноўнікаў з прадпрымальнікамі. І таму назапашаны ў грамадзтве і дасюль не мабілізаваны апазыцыяй пратэстны патэнцыял быў скіраваны аднachасова й супраць намэнклятуры, і супраць прадпрымальніцкага слою, які толькі нараджаўся. У выніку ў Беларусі своеасаблівая электаральная рэвалюцыя аказалася аднachасова й антынамэнклятурнай, і антыбуржуазнай. Перамог кандыдат-папуліст, які найбольш пасьлядоўна выступаў і супраць намэнклятуры, і супраць прыватнага бізнэсу.

## ФАРМАВАНЬНЕ ГІБРЫДНАГА РЭЖЫМУ: АДАПТАЦЫЯ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ІНСТЫТУТАЎ ДА СЫСТЭМЫ ПАТЭСТАРНЫХ* АДНОСІНАЎ

### Разьвіцьцё аўтарытарных тэндэнцыяў. Разбурэньне сыстэмы разьдзяленьня ўладаў

Першапачаткова ў каманду прэзыдэнта ўваходзілі прадстаўнікі розных палітычных плыняў. Разам з Аляксандрам Лукашэнкам да ўлады ўпершыню прыйшлі па-рэфарматарску настроеныя спэцыялісты: Міхаіл Чыгір, Станіслаў Багданкевіч, Анатоль Лябедзька, Дзьмітры Булахаў, Аляксандар Фядута, Уладзімер Нісьцюк і іншыя. Дзякуючы ім дзеля дапамогі Аляксандру Лукашэнку на выбарах быў мабілізаваны расійскі капітал і найбольш уплывовыя беларускія выданьні[16]. Аднак даволі хутка яны самі адмовіліся працаваць у камандзе першага беларускага прэзыдэнта. Першы сышоў галава тэрытарыяльнага дэпартамэнту Віктар Цярэшчанка. Сыходзячы, ён абвінаваціў абкружэньне прэзыдэнта Лукашэнкі ў некампэтэнтнасьці. 8 сьнежня 1994 году праз нязгоду з курсам прэзыдэнта сышоў Віктар Ганчар. У

[15] Гл.: Злотников Леонид. В петле популизма // Хроника несостоявшегося времени. Десять лет в зеркале «Белорусского рынка». Менск, 2001. 336 с.

* Патэстарныя адносіны (ад лацінскага «potestas» — улада) — адносіны ўлады і кіраваньня, якія характарызуюцца наяўнасьцю органаў улады, але адсутнасьцю прадстаўніцтва шырокіх слаёў грамадзтва. Прадугледжваюць дамінаваньне падданіцкай палітычнай культуры. — *Рэд.*

[16] Гл.: Боярунец А., Голобуцкий А., Кулик В. Беларусь перед выбором: демократия или авторитаризм? Киев: УФПР, 1996. С. 12.

1996 годзе, ужо ў пэрыяд супрацьстаяньня прэзыдэнта і Вярхоўнага Савету, падаў у адстаўку прэм’ер-міністар Міхал Чыгір. Спэцыялістаў, якія пайшлі, замянялі кіраўнікі калгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў.

Прыйшоўшы да ўлады, Аляксандар Лукашэнка абвясьціў барацьбу супраць усіх сілаў, якія нібыта перашкаджалі простаму волевыяўленьню народу, — супраць бюракратыі, незалежных судоў, прэсы, прадпрымальнікаў, парлямэнту, палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. На справе гэта была барацьба з сыстэмай стрымак і процівагаў выканаўчай уладзе.

Захопу ўлады прэзыдэнтам і яго абкружэньнем спрыяла слабасьць дэмакратычных сілаў у самім Вярхоўным Савеце. У кастрычніку 1994 году Вярхоўны Савет 12 скліканьня прыняў закон, згодна зь якім кіраўнікі мясцовых адміністрацыяў надалей не абіраліся мясцовымі Саветамі, а прызначаліся асабіста прэзыдэнтам. Парлямэнцкая бальшыня, якая належала старой савецкай эліце, спадзявалася пасьля завяршэньня паўнамоцтваў Вярхоўнага Савету атрымаць пасады на месцах, і скасавала мясцовае самакіраваньне.

У сьнежні 1994 году Аляксандр Лукашэнка забараніў друкаваць у газэтах даклад дэпутата Сяргея Антончыка пра злоўжываньні ў Адміністрацыі прэзыдэнта. Агульнанацыянальныя газэты выйшлі зь белымі палосамі, дзе павінны былі публікавацца выдаленыя цэнзурай матэрыялы з дакладу Сяргея Антончыка. У пачатку 1995 году амаль усе рэдактары агульнанацыянальных газэт былі замененыя. Таксама была ўсталяваная поўная манаполія выканаўчай улады на тэлебачаньне.

Пачынаючы зь вясны 1995 году прэзыдэнцкая ўлада бярэцца за перадзел уласнасьці. Упраўленьне справаў прэзыдэнта на чале зь Іванам Ціцянковым перавяло на свой балянс усе найбольш прэстыжныя будынкі ў Менску, якія раней знаходзіліся на балянсе дзяржаўных установаў. Плата за арэнду ў гэтых будынках пераводзіцца ў прэзыдэнцкую скарбонку.

У траўні 1995 году ў Беларусі адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет. Выканаўчая ўлада стварала максымальна неспрыяльныя ўмовы для правядзеньня выбараў: абмежаваны доступ да СМІ; забаронена праводзіць агітацыю за межамі выбарчых акругаў, па якіх балятаваліся кандыдаты; максымальна дапушчальныя сродкі, выдаткаваныя на выбарчую кампанію аднаго дэпутата, абмяжоўваліся 50 USD. Усім ахвотным работнікам прадпрыемстваў даваўся адпачынак з 1 да 15 траўня. Гэта да мінімуму зьнізіла іх удзел у выбарах, аднак паставіла ў выгадныя ўмовы кандыдатаў, зьвязаных з старой элітай, — дырэктараў саўгасаў і заводаў, дзяржаўных установаў.

Выбары ў Вярхоўны Савет праводзіліся па мажарытарнай сыстэме, якая раней дазваляла старой намэнклятуры кантраляваць працэс выбараў на пэрыфэрыі і стрымліваць уплыў палітычных партыяў. Але цяпер выбары не адбыліся праз нізкую яўку выбарцаў. 8 траўня адбыўся другі тур выбараў. У выніку было абрана толькі 119 дэпутатаў. Гэтай колькасьці не ставала для правядзеньня першага правамоцнага паседжаньня Вярхоўнага Савету. Для пачатку працы новага Вярхоўнага Савету патрабавалася ня менш за 174 дэпутаты, згодна з Канстытуцыяй, — дзьве траціны ад 260, г. зн. ад агульнай колькасьці дэпутатаў. Зь ліку абраных дэпутатаў пераважную бальшыню складалі прадстаўнікі левых палітычных сілаў і супрацоўнікі выканаўчай улады. Стары склад працягнуў працу, іначай Беларусь засталася б без заканадаўчай улады.

Няўдалыя травеньскія выбары дазволілі прэзыдэнцкай групоўцы, спасылаючыся на Канстытуцыю, аспрэчваць правамоцнасьць Вярхоўнага Савету 12 скліканьня. Паводле артыкулу 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, Вярхоўнаму Савету адводзіўся пяцігадовы тэрмін пра-

цы. Аднак, паводле артыкулу 91, завяршэньне тэрміну працы старога Вярхоўнага Савету вызначалася датай першага паседжаньня Вярхоўнага Савету новага скліканьня. Працяг працы старога Вярхоўнага Савету быў абгрунтаваны пацьверджаньнем Цэнтравыбаркаму пра тое, што выбары ў Вярхоўны Савет 13 скліканьня не адбыліся[17]. Аднак заставалася яшчэ адна падстава для зрыву працы парлямэнту — няпэўнасьць кворуму, неабходнага для прыняцьця пастановаў. У 1990 годзе, пры выбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савету 12 скліканьня, колькасьць дэпутатаў склала 254. Для кворуму было дастаткова 237 дэпутатаў, або дзьве трацiны ад колькасьці абраных. Але на верасьнёўскай сэсіі 1995 году зьбіралася максымум 204 дэпутаты. Гэта давала Аляксандру Лукашэнку падставы не падпісваць законы, прынятыя Вярхоўным Саветам, бо на момант прыняцьця законапраекту не было кворуму. Старому дэпутацкаму корпусу перасталі плаціць заробак. Упраўленьне справаў прэзыдэнта захапіла маёмасьць Вярхоўнага Савету: вытворчае аб’яднаньне «Кастрычніцкае» з гатэлем, сталоўкай і аўтабазай[18].

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусі разгледзеў пытаньне пра правамоцнасьць паседжаньняў Вярхоўнага Савету 12 скліканьня. 11 кастрычніка 1995 году ім было вынесенае заключэньне аб праве Вярхоўнага Савета 12 скліканьня зьдзяйсьняць свае паўнамоцтвы ў якасьці вышэйшага прадстаўнічага сталага органа ў поўным аб’ёме да першага паседжаньня Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, калі той будзе абраны ў дастатковым складзе[19].

Але хаця фармальна Вярхоўны Савет ўсё яшчэ захоўваў свой статус вышэйшага заканадаўчага органа, фактычна яго ўлада была падарваная яшчэ ўвесну 1995 году. 11 красавіка прэзыдэнт Лукашэнка выступіў ў Вярхоўным Савеце з ініцыятывай правядзеньня рэфэрэндуму па 4 пытаньнях: аб наданьні расійскай мове статусу дзяржаўнай; аб зьмене дзяржаўнай сымболікі; аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй і аб надзяленьні прэзыдэнта правам распускаць парлямэнт. Дэпутаты адхілілі ўсе пытаньні акрамя пытаньня аб эканамічнай інтэграцыі з Расіяй. Аляксандар Лукашэнка заявіў, што рэфэрэндум будзе праведзены, нягледзячы на пастанову парлямэнту. У адказ на гэта 18 дэпутатаў ад дэмакратычнай апазыцыі абвінавацілі прэзыдэнта ў парушэньні Канстытуцыі і абвясьцілі галадоўку. Уначы з 11 на 12 красавіка яны былі гвалтоўна выдаленыя з будынку Вярхоўнага Савету. У апэрацыі бралі ўдзел вайскоўцы ўнутраных войскаў, атрад міліцыі асаблівага прызначэньня, служачыя галоўнага ўпраўленьня аховы МУС, а таксама падразьдзяленьні, чыя ведамасная прыналежнасьць не была высьветленая старшым сьледчым па асабліва важных справах пры Генэральным пракурору Рэспублікі Беларусі[20]. У дзяржаўных СМІ гэты факт практычна не асьвятляўся. Ніякіх радыкальных дзеяньняў у адказ на разгон дэпутатаў Вярхоўны Савет не зрабіў. На наступны дзень дэпутаты Вярхоўнага Савету прынялі прапанову прэзыдэнта. Да міжнароднай супольнасьці Вярхоўны Савет не зьвярнуўся.

---

[17] Гл.: Грыб М. Шлях да паразумення яшчэ ёсць // Народная газета. 1995. 13 кастрычніка.

[18] Гл.: «Парламент не павінен «кідацца ў атаку», рэагуючы такім чынам на кожнае выступленне прэзідэнта» (Інтэрв’ю карэспандэнта Інтэрфаксу В. Зянковіча). У кн.: Грыб М. На гістарычным скрыжаванні. Мн.: Тэхналогія, 1996. — 158 с. — С. 53–58. — С. 58; «…Неператварыць сэсію ў палітычную гульню». Уступнае слова Старшыні Вярхоўнага Савету М.І. Грыба на адкрыцці чарговай XVIII сесіі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі XII склікання 5 верасня 1995 г. // Звязда. 1995. 6 верасьня.

[19] Гл.: Заключэньне Канстытуцыйнага Суду Рэспублікі Беларусі «Аб адпаведнасьці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі артыкулу 7 Закону «Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусі», артыкулу 10, часткі чацьвёртай артыкулу 63 Часовага рэглямэнту Вярхоўнага Савету РБ» // Народная газета. 1995. 17 кастрычніка.

[20] Гл.: Следствием по делу установлено… // Свабода. №27, 1996. 12 красавіка.

Увесну 1996 году ў Менску праходзілі масавыя выступленьні супраць аб'яднаньня Беларусі і Расіі. Выступленьні жорстка здушаліся, дзясяткі ўдзельнікаў былі схопленыя і атрымалі розныя тэрміны арышту. У турму трапілі лідэры БНФ Юры Хадыка і Вячаслаў Сіўчык, журналісты Ўладзімер Дзюба і Алег Трызна.

У жніўні 1995 году быў здушаны страйк у менскім мэтро. У арганізацыі страйку Лукашэнка абвінаваціў ЗША і польскую «Салідарнасьць». Арганізатары страйку былі звольненыя з працы, некалькі прафсаюзных актывістаў, у тым ліку дэпутат парлямэнту, былі арыштаваныя. Дзейнасьць Свабоднага прафсаюзу Беларусі была прыпыненая прэзыдэнцкім указам.

Увосень 1995 году Аляксандр Лукашэнка агучыў ідэю падпарадкаваньня ўсіх галінаў улады кіраўніку дзяржавы. Пад выглядам простага прэзыдэнцкага кіраваньня ён адкрыта дамагаецца ўвядзеньня рэжыму асабістай улады. Дысбалянс паміж галінамі ўлады ўзмацняўся. У верасьні 1995 году Вярхоўны Савет 12 скліканьня пад ціскам прэзыдэнта спыніў працу. Той жа восеньню прэзыдэнт Лукашэнка адмовіўся выконваць пастановы Канстытуцыйнага Суду. Суд страціў вызначаныя яму Канстытуцыяй функцыі і стаў, па сутнасьці, кансультацыйным органам.

У кастрычніку 1995 году беспасярэднім загадам з адміністрацыі прэзыдэнта дзяржаўныя друкарні Беларусі скасавалі дамовы на друкаваньне ўплывовых апазыцыйных газэт: «Наша Ніва», «Свабода», «Имя», «Белорусская деловая газета». Гэтыя выданьні былі выключаныя з падпісных каталёгаў. Дзяржаўная агенцыя распаўсюджваньня СМІ «Белсаюздрук» адмовілася распаўсюджваць іх у раздроб.

Пры канцы 1995 году прэзыдэнт аднавіў дзеяньне сваіх указаў, скасаваных Канстытуцыйным Судом.

На паўторных выбарах у Вярхоўны Савет 29 лістапада — 10 сьнежня 1995 году былі даабраныя 80 дэпутатаў. Неабходны мінімум быў абраны. У падкантрольных прэзыдэнту СМІ ўжо актыўна праводзілася кампанія па дыскрэдытацыі дэпутатаў і ў цэлым Вярхоўнага Савету як інстытуту дзяржаўнай улады.

У пачатку 1996 году была нацыяналізаваная міжбанкаўская валютная біржа і на паўгоду спыненая рэгістрацыя суб'ектаў гаспадараньня. У 1996 годзе паводле дамовы аб мытным саюзе паміж Беларусяй і Расіяй была ліквідаваная мытная мяжа паміж дзьвюма краінамі, што дазваляла беларускаму боку атрымліваць зыск ад ільготнага ўвозу тавараў на супольную мытную тэрыторыю.

## Рэфэрэндум 1995 году. Крызыс нацыянальна-дэмакратычнага руху

Першы беларускі прэзыдэнт знаходзіўся на пасадзе ўжо блізу год, але яўнага паляпшэньня ўзроўню жыцьця не назіралася. Тым часам нарасталі супярэчнасьці паміж Вярхоўным Саветам і прэзыдэнтам. Патрэбны быў сродак, здольны ўзмацніць пазыцыі Аляксандра Лукашэнкі, умацаваць яго ідэалягічныя рэсурсы ў барацьбе за адміністрацыйныя і эканамічныя. Аляксандар Лукашэнка дзейнічаў паводле апрабаванай папулісцкай схемы. Пасьля выдаленьня пратэстуючых дэпутатаў з будынку Вярхоўнага Савету ў красавіку 1995 году прэзыдэнт дамогся правядзеньня рэфэрэндуму.

14 траўня, у дзень выбараў новага складу Вярхоўнага Савету, адбыўся ініцыяваны прэзыдэнтам рэфэрэндум з пытаньнямі пра статус расійскай мовы, дзяржаўную сымболіку і паўнамоцтвы прэзыдэнта. Галоўнай мэтай рэфэрэндуму было ўзмацненьне ідэалягічнага рэсурсу прэзыдэнцкай групоўкі і асабіста Аляксандра Лукашэнкі, атрыманьне народнага дазволу на парушэньне прынцыпу разьдзяленьня ўладаў.

На рэфэрэндум былі вынесеныя 4 пытаньні. Першае пытаньне, пра мову, улічваючы, што працэс русіфікацыі зайшоў глыбока, было загадзя выйгранкавым. Трэцяе і чацьвертае пытаньні не былі дакладна сфармуляваныя. Гэта былі сафістычныя пытаньні, якія дазвалялі тлумачыць іх у залежнасьці ад кан’юнктуры. А вось у першым пытаньні не канкрэтызавалася, што трэба разумець пад роўнасьцю статусаў расійскай і беларускай моваў. Аднак большыня насельніцтва, не валодаючы дастатковай інтэлектуальнай культурай, не зьвярнула ўвагі на сафістычны характар фармулёвак. На рэфэрэндуме ўсе прапановы Аляксандра Лукашэнкі былі падтрыманыя бальшынёй (гл. таб.).

| Пытаньне | Прагаласавалі «за», % ад колькасьці галасуючых |
|---|---|
| 1. Ці згодныя вы з наданьнем расійскай мове роўнага статусу зь беларускай? | 83,1 |
| 2. Ці падтрымліваеце вы прапанову аб устанаўленьні новых Дзяржаўнага сьцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусі? | 75 |
| 3. Ці падтрымліваеце вы дзеяньні прэзыдэнта, накіраваныя на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Фэдэрацыяй? | 82,4 |
| 4. Ці згодныя вы з неабходнасьцю зьменаў у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, якія прадугледжваюць магчымасьць датэрміновага спыненьня паўнамоцтваў Вярхоўнага Савету Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі ў выпадках сыстэматычнага або грубага парушэньня Канстытуцыі? | 77,6 |

Крыніца: Цэнтравыбаркам Рэспублікі Беларусі.

Рэфэрэндум паклаў канец спробам на працягу 1990–1995 гадоў умацаваць статус беларускай мовы. Гэты ж рэфэрэндум стаў санкцыяй да павелічэньня аўтарытарнай улады прэзыдэнта.

Пры аналізе пытаньняў, вынесеных на рэфэрэндум 1995 году, цікавасьць выклікае пытаньне пра дзяржаўную сымболіку Рэспублікі Беларусі. Замена бел-чырвона-белага сьцяга і герба «Пагоня» на стары, чырвона-зялёны сьцяг БССР без камуністычных сымбаляў, сярпа і молата, а таксама герба, што вельмі нагадваў савецкі, выконвала пэўную функцыю ў барацьбе прэзыдэнта за электарат. Замена герба й сьцяга была папулісцкім захадам. Але каб зразумець сэнс гэтага акту, трэба разгледзець, чаму ж гэтае дзеяньне было сапраўды папулісцкім.

Другое пытаньне, пра герб і сьцяг, было сфармуляванае найбольш карэктна з чатырох. Акурат у другім пытаньні, пазбаўленым лягічных хібаў, была схаваная схема, адпаведна зь якой будаваліся адносіны беларускага прэзыдэнта і яго электарату. І далей кіруючыся гэтай схемай, прэзыдэнт забясьпечыў сабе падтрымку найбольш кансэрватыўнай, агрэсіўна-пасіўнай часткі беларускага грамадзтва.

Прэзыдэнт Лукашэнка выкарыстоўваў савецкія міталягічныя комплексы і спэцыфічныя стэрэатыпы. Да 1995 году значная частка насельніцтва так і ня вызначылася са сваімі палі-

тычнымі прыярытэтамі. Прыхільнікі Аляксандра Лукашэнкі, што забясьпечылі ягоную перамогу на прэзыдэнцкіх выбарах, адчувалі настальгію па часах, калі Беларусь уваходзіла ў склад СССР, сумавалі па гарантаваным спажывецкім мінімуме і стабільнасьці. Шматлікі савецка-беларускі электарат жадаў не ліквідацыі заганнага савецкага ладу, бо проста не ўсьведамляў ягонай заганнасьці, а паляпшэньня матэрыяльнага дабрабыту.

Вярнуць СССР, сацыялістычны лад не маглі ні Вячаслаў Кебіч, ні Аляксандар Лукашэнка. Супярэчнасьць паміж незваротнасьцю гісторыі й апраўданьнем электаральных спадзеваў на вяртаньне ў СССР разьвязвалася, як і цяпер, у адпаведнасьці са схемай, выкарыстанай на рэфэрэндуме 1995 году. Аляксандар Лукашэнка, ад імя народу замяняючы герб і сьцяг на квазісавецкія сымбалі, прапанаваў свайму электарату сублімацыю вяртаньня ў савецкія часы. У сытуацыі прынцыпова немагчымага звароту да ранейшага сацыялістычнага ладу ён даў электарату сымбалічную замену гэтага вяртаньня.

Замест рэальнага разьвязаньня праблемаў грамадзтву паказвалі разьвязаньне гэтых праблемаў па тэлебачаньні, як і ў Савецкім Саюзе. Прэзыдэнцкія прапагандысты вярталі прыкметы сацыялізму. Дзяржаўны сьвяточны каляндар зноў быў перароблены пад афіцыйную гісторыю Савецкай Беларусі. Выкладаньне гісторыі вярнулася да савецкіх схемаў.

## Рэфэрэндум 1996 году. Супрацьстаяньне прэзыдэнта, Вярхоўнага Савету і канстытуцыйнага суду[21]

У студзені 1996 году пачаў сваю працу Вярхоўны Савет 13 склікаaccount, аднак ён ня стаў супрацьвагай выканаўчай уладзе. Савет ня меў доступу да дзяржаўных СМІ, самастойнага інфармацыйнага і матэрыяльнага забесьпячэньня. А дэпутаты, што прыйшлі ў Вярхоўны Савет, ня мелі дастатковай палітычнай волі, каб супрацьстаяць дыктату прэзыдэнта. Тым ня менш, існаваньне нават такога Вярхоўнага Савету і Канстытуцыйнага Суду стварала ў пэрспэктыве пагрозу асабістай уладзе прэзыдэнта Лукашэнкі. Ён імкнуўся юрыдычна замацаваць дасягнутыя аўтарытарныя пазыцыі і дамагчыся, каб бальшыня насельніцтва ўспрымала такую ўзурпацыю як легітымную і мэтазгодную.

Аляксандар Лукашэнка і яго каманда зьвярнуліся да чарговага рэфэрэндуму, на гэта раз у пытаньні новай Канстытуцыі. Новая Канстытуцыя прадугледжвала канцэнтрацыю ўсёй улады ў руках прэзыдэнта і пераўтварэньне Вярхоўнага Савету, Канстытуцыйнага Суду і мясцовых органаў улады ў выключна фармальныя інстытуты, што ня маюць рэальнай улады. Цалкам гэтыя інстытуты нельга было ліквідаваць. Яны павінны былі забясьпечваць працэдуры, якія б імітавалі разьдзяленьне ўладаў. А Лукашэнка і ягоная каманда пасьлядоўна зьдзяйсьнялі ліквідацыю зародкаў дэмакратычнай сыстэмы. Ужо назапашаныя адміністрацыйныя, фінансавыя і ідэалягічныя рэсурсы цалкам гэта дазвалялі.

Сродкі масавай інфармацыі былі сканцэнтраваныя ў руках прэзыдэнцкай групоўкі. Афіцыйныя СМІ прапагандавалі неабходнасьць адзінаасобнай улады. У якасьці ўзору разглядаліся Арабскія эміраты, Саудаўскае каралеўства, дзе «на тле абсалютнай адзінаасобнай улады... прадстаўнічыя органы калі й існуюць, дык толькі ў якасьці дэкарацыі, каб не нэрваваць

[21] Асноўныя дадзеныя ўзятыя з брашуры Беларускага Гельсынскага камітэту: Референдум 1996. Цифры. Суждения. Законность. Брошюра. Белорусский Хельсинкский Комитет. Минск, 1996.

сусьветнай прагрэсіўнай грамадзкасьці»[22]. Публікаваліся лісты прыхільнікаў прэзыдэнта з масы шараговых грамадзянаў, у якіх яны патрабавалі ўвядзеньня простага прэзыдэнцкага кіраваньня.

З 9 да 24 лістапада 1996 году ў Беларусі на ініцыятыву прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі быў праведзены чарговы рэфэрэндум. Прававой падставай для правядзеньня рэфэрэндуму стала пастанова Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі ад 6 верасьня 1996 году «Аб правядзеньні рэспубліканскага рэфэрэндуму ў Рэспубліцы Беларусі і захадах для яго забесьпячэньня». У адпаведнасьці з пунктам 2 гэтай пастановы на рэфэрэндум былі вынесеныя дзьве групы пытаньняў: ініцыяваныя прэзыдэнтам і прапанаваныя групай дэпутатаў Вярхоўнага Савету.

Прэзыдэнт прапанаваў чатыры пытаньні:

1. Перанесьці Дзень незалежнасьці Рэспублікі Беларусі (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — Дзень вызваленьня Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне.

2. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі 1994 году зь зьменамі і дапаўненьнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі), прапанаванымі Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнкам.

3. Ці выступаеце Вы за свабодныя, без абмежаваньняў, куплю і продаж зямлі?

4. Ці падтрымліваеце Вы скасаваньне сьмяротнага пакараньня ў Рэспубліцы Беларусі?

Група дэпутатаў Вярхоўнага Савету ініцыявала тры пытаньні:

1. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі 1994 году зь зьменамі і дапаўненьнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцыяў камуністаў і аграраў.

2. Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады выбіраліся беспасярэдне жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі?

3. Ці згодныя Вы, што фінансаваньне ўсіх галінаў улады павінна зьдзяйсьняцца публічна і толькі зь дзяржаўнага бюджэту?

Згодна з пунктам 3 пастановы, пытаньні пра прыняцьцё Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі 1994 году з прапанаванымі зьменамі і дапаўненьнямі выносіліся на абавязковы рэфэрэндум.

На просьбу Старшыні Вярхоўнага Савету Сямёна Шарэцкага, а таксама на ўласную ініцыятыву, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусі праверыў шэраг палажэньняў гэтай пастановы Вярхоўнага Савету з гледжаньня адпаведнасьці Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусі. У выніку судовага разьбіральніцтва Канстытуцыйны Суд прызнаў, што пункт 3 пастановы, які прадугледжваў вынясеньне пытаньняў зьменаў і дапаўненьняў на абавязковы рэфэрэндум, не адпавядае Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусі.

На падставе гэтага заключэньня Вярхоўны Савет зьмяніў сваю пастанову ад 6 верасьня 1996 году. На абавязковы рэфэрэндум былі вынесеныя толькі пытаньні пра перанос Дня незалежнасьці Рэспублікі Беларусі (Дня Рэспублікі) і выбарнасьць кіраўнікоў мясцовых органаў выканаўчай улады.

Прэзыдэнт Лукашэнка не пагадзіўся з заключэньнем Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада і пастановай Вярхоўнага Савету ад 6 лістапада 1996 году. Ён выдаў два ўказы, што датычылі будучага рэспубліканскага рэфэрэндуму.

Ува ўказе ад 5 лістапада 1996 году № 455, парушаючы Канстытуцыю і Закон «Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме) у Рэспубліцы Беларусі», Аляксандар Лукашэнка вызначыў парадак уступленьня ў сілу рашэньняў рэспубліканскіх рэфэрэндумаў аб зьменах і да-

[22] Гл.: Народная газета. 4 кастрычніка.

паўненьнях Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі. Далей, ува ўказе ад 7 лістапада 1996 году № 459 было пастаноўлена, што заключэньне Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада 1996 ня дзейснае, бо істотна разыходзіцца з Канстытуцыяй і абмяжоўвае канстытуцыйнае права грамадзянаў на ўдзел у рэфэрэндуме. Таксама ўва ўказе была беспасярэдняя пагроза на адрас дзяржаўных органаў, якія перашкаджаюць правядзеньню рэспубліканскага рэфэрэндуму. Паводле пункту 5 гэтага ўказу, дзейнасьць такіх дзяржаўных органаў спынялася, а вінаватыя прыцягваліся да адказнасьці.

9 лістапада 1996 году, або за два тыдні да рэфэрэндуму, пачалося галасаваньне. Прычым праводзілася яно яшчэ да публікаваньня канчатковых тэкстаў зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі. Праект прэзыдэнцкай Канстытуцыі выйшаў чатырохмільённым накладам 12 лістапада. Альтэрнатыўны праект Канстытуцыі, прапанаваны дэпутатамі Вярхоўнага Савету, быў апублікаваны толькі 21 лістапада. Грамадзяне практычна ня мелі магчымасьці зь ім азнаёміцца. Такім чынам, фармальна, абодва праекты былі прапанаваныя для абмеркаваньня, але фактычна насельніцтву накідваўся прэзыдэнцкі праект.

19 лістапада 1996 году на ініцыятыву 73 дэпутатаў Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі ў Канстытуцыйным Судзе пачаўся разгляд справы «Аб парушэньні Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі Лукашэнкам Аляксандрам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі». Разгляд быў прызначаны на 22 лістапада 1996 году. У той жа час з боку прэзыдэнта зьдзяйсьняўся ўціск на дэпутатаў, якія падпісалі прапанову аб праверцы адпаведнасьці ўказаў прэзыдэнта Канстытуцыі. Выкарыстоўваліся кампрамат, пагрозы звальненьня з працы, а ў некаторых выпадках і пагрозы фізычнай расправы.

У ноч з 21 на 22 лістапада паміж прэзыдэнтам Лукашэнкам і Старшынём Вярхоўнага Савету Шарэцкім было падпісанае Пагадненьне аб грамадзка-палітычнай сытуацыі і канстытуцыйнай рэформе ў Беларусі. Цікава, што падпісаньне адбылося пры ўдзеле найвышэйшых службовых асобаў Расійскай Фэдэрацыі, якія адумысьля прыехалі ў Менск і ўзялі на сябе ролю арбітраў у спрэчцы беларускіх галінаў улады.

У склад расійскай дэлегацыі ўваходзілі віцэ-прэм’ер па сувязях з краінамі СНД Валер Сяроў, старшыня Дзяржаўнай думы Расійскай Фэдэрацыі Генадзь Селязьнёў і, пазьней, прэм’ер-міністар Віктар Чарнамырдзін. Пры іх удзеле ў ноч з 21 на 22 лістапада і прайшлі перамовы паміж Сямёнам Шарэцкім, Старшынём Канстытуцыйнага Суду Валерам Ціхінем і Аляксандрам Лукашэнкам.

Паводле Пагадненьня, прэзыдэнт Лукашэнка абавязваўся скасаваць свае ўказы ад 5 лістапада 1996 году № 455 і ад 7 лістапада 1996 году № 459. Гэтым ён прызнаваў рэкамэндацыйны характар рэфэрэндуму па пытаньнях зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі 1994 году. А Вярхоўны Савет у асобе старшыні Сямёна Шарэцкага мусіў адклікаць з Канстытуцыйнага Суду прапанову дэпутатаў аб імпічмэнце прэзыдэнта.

22 лістапада паўнамоцныя прадстаўнікі дэпутатаў Вярхоўнага Савету хадайнічалі аб прыпыненьні справы, а прадстаўнікі прэзыдэнта — аб яе поўным спыненьні. Падставай для абодвух бакоў было падпісаньне пагадненьня паміж сьпікерам Вярхоўнага Савету, Старшынём Канстытуцыйнага Суду і прэзыдэнтам. Разгледзеўшы хадайніцтвы, суд прыпыніў справу.

Аднак пагадненьне не было выкананае. Для таго каб яно атрымала юрыдычную моц, патрабавалася ратыфікацыя Вярхоўнага Савету. Аднак прапрэзыдэнцкая фракцыя дэпутатаў Вярхоўнага Савету «Згода» садзейнічала зрыву ратыфікацыі. Напярэдадні перамовінаў фракцыя «Згода» зьвярнулася да дэпутатаў з заклікам супрацоўнічаць з выканаўчай уладай[23]. Але пры

галасаваньні па ратыфікацыі пагадненьня яе чальцы прагаласавалі супраць ратыфікацыі. Гэта дазволіла прэзыдэнту абвінаваціць Вярхоўны Савет у няздольнасьці ісьці на кампрамісы і адмовіцца ад абавязкаў, узятых на сябе ў сувязі з падпісаньнем пагадненьня. Напярэдадні рэфэрэндуму прэзыдэнт Лукашэнка аднавіў дзеяньне сваіх указаў аб абавязковым характары рэфэрэндуму па пытаньні прыняцьця зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі.

Увесь гэты час працягвалася прапагандысцкая кампанія на карысьць ініцыятываў беларускага прэзыдэнта. У электронных СМІ, практычна цалкам падкантрольных прэзыдэнцкай групоўцы, гледачам дзясяткі разоў на дзень прапаноўвалася падтрымаць пытаньні, ініцыяваныя прэзыдэнтам Лукашэнкам.

Асабліва актыўна ў часе падрыхтоўкі рэфэрэндуму дзейнічалі органы выканаўчай улады. Кіраўнікі прадпрыемстваў, установаў, арганізацыяў, камандаваньне вайсковымі часткамі атрымалі канкрэтныя дырэктывы забясьпечыць перамогу прэзыдэнцкага праекту Канстытуцыі. Штабы па правядзеньні рэфэрэндуму ахапілі сваім уплывам ці ня ўсё насельніцтва краіны. Грамадзян з розных прычын, у тым ліку й пад прымусам, схілялі галасаваць датэрмінова, хаця гэта было парушэньнем Закону аб рэфэрэндуме. Вялася беспрэцэдэнтная агітацыйная праца на карысьць прэзыдэнцкіх пытаньняў. Аляксандар Лукашэнка з мэтай прапаганды наведаў шэраг гарадоў, буйных прадпрыемстваў, выступаў на шматлюдных форумах. Усе рэсурсы выканаўчай улады былі накіраваныя на дасягненьне перамогі на рэфэрэндуме.

Дзеля перамогі ішлі нават на адкрытыя парушэньні закону. 14 лістапада 1996 году адбылося незаконнае адхіленьне ад пасады старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў Віктара Ганчара. Гэты акт быў выкліканы папярэдняй публічнай заявай Ганчара, які папярэдзіў, што адмовіцца падпісваць выніковы пратакол рэфэрэндуму, калі й надалей будуць працягвацца парушэньні заканадаўства.

24 лістапада 1996 году адбывалася афіцыйнае галасаваньне грамадзянаў. У гэты ж дзень праводзіліся паўторныя выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савету і мясцовых Саветаў у акругах, дзе яны раней не адбыліся.

Афіцыйна абвешчаныя вынікі паказалі поўную перамогу прэзыдэнта. У першыя ж дні пасьля рэфэрэндуму ляяльныя Аляксандру Лукашэнку дэпутаты Вярхоўнага Савету перайшлі ў створаную прэзыдэнтам Палату прадстаўнікоў — марыянэткавы орган, пакліканы імітаваць заканадаўчую ўладу. У Палаце атрымалі месцы 70 адсоткаў чальцоў фракцыі «Згода», палова дэпутатаў аграраў і палова камуністаў.

28 лістапада Палата прадстаўнікоў прыняла пастанову адклікаць зварот дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў Канстытуцыйны Суд, пад якім засталося толькі 63 подпісы, недастатковыя для такога звароту.

## Афіцыйныя вынікі рэфэрэндуму 1996 году і дадзеныя сацыялягічных дасьледаваньняў

Паводле афіцыйных зьвестак, апублікаваных Цэнтральнай камісіяй Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў, вынікі плебісцыту 24 лістапада 1996

[23] Гл.: Заявление собрания депутатов Верховного Совета Республики Беларусь // Народная газета. 1996. 22 лістапада.

году па кожным з пытаньняў выглядаюць наступным чынам[24] (гл. табл.).

Крыху іншыя лічбы былі атрыманыя ў Менску. Тут у галасаваньні ўзялі ўдзел 850.627 чалавек, — 68,9 адсотку ад агульнай колькасьці выбарцаў. Зь ліку тых, хто, паводле афіцыйных дадзеных, браў удзел у галасаваньні, 73,1 адсотку менчукоў падтрымалі прапанову аб

Пытаньні, ініцыяваныя Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі:

| Пытаньне | За | | Супраць | | Несапраўдных бюлетэняў |
|---|---|---|---|---|---|
| | чалавек | % | чалавек | % | |
| 1. Перанесьці Дзень незалежнасьці Рэспублікі Беларусі (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — дзень вызваленьня Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне. | 5 450 838 | 88,18 | 646 708 | 10,46 | 83 925 |
| 2. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі 1994 году са зьменамі і дапаўненьнямі (новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі), прапанаванымі Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнкам. | 5 175 664 | 70,45 | 689 642 | 9,9 | 316 157 |
| 3. Ці выступаеце Вы за свабодны, без абмежаваньняў, куплю і продаж зямлі? | 948 756 | 15,35 | 5 123 386 | 82,88 | 109 521 |
| 4. Ці падтрымліваеце Вы адмену сьмяротнага пакараньня ў Рэспубліцы Беларусь? | 1 108 226 | 17,93 | 4 972 535 | 80,44 | 100 702 |

Пытаньні, ініцыяваныя дэпутатамі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі:

| Пытаньне | За | | Супраць | | Несапраўдных бюлетэняў |
|---|---|---|---|---|---|
| | чалавек | % | чалавек | % | |
| 1. Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусі 1994 году са зьменамі і дапаўненьнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцыяў камуністаў і аграраў. | 582 437 | 7,93 | 5 230 763 | 71,2 | 368 263 |
| 2. Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў улады выбіраліся беспасярэдне жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі? | 1 739 187 | 28,14 | 4 321 866 | 69,92 | 120 419 |
| 3. Ці згодныя Вы, што фінансаваньне ўсіх галінаў улады павінна ажыцьцяўляцца публічна і толькі зь дзяржаўнага бюджэту? | 1 989 252 | 32,18 | 4 070 261 | 65,85 | 131 950 |

Крыніца: Цэнтравыбаркам Рэспублікі Беларусі*.

[24] Гл.: Звязда. 1996. 27 лістапада.

* У сьпісы для галасаваньня было ўнесена 7 346 397 чалавек, зь іх у галасаваньні ўдзельнічалі 6 181 463 чалавекі, ці 84,14%. Вынікі галасаваньня што да пытаньняў пра Канстытуцыю даюцца ў суадносінах з агульнай колькасьцю грамадзянаў, унесеных у выбарчыя сьпісы. Вынікі галасаваньня па астатніх пытаньнях разьлічваюцца, сыходзячы з колькасьці тых, хто прыняў удзел у галасаваньні.

пераносе сьвяткаваньня Дня незалежнасьці з 27 на 3 ліпеня — Дзень вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 24,6 адсотку выказаліся супраць.

45,2 адсотку менчукоў ад агульнай колькасьці выбарцаў — жыхароў гораду прагаласавалі за прэзыдэнцкі праект Канстытуцыі, і толькі 14 адсоткаў — за дэпутацкі. Супраць прагаласавалі адпаведна 18,1 і 48,1.

71,6 адсотку грамадзянаў, што ўдзельнічалі ў галасаваньні, выказаліся супраць свабоднай (без абмежаваньняў) куплі і продажу зямлі. «За» прагаласавалі 25,6.

«Супраць» скасаваньня сьмяротнага пакараньня ў Менску прагаласавалі 68,2 адсотку грамадзянаў, што прыйшлі на выбарчыя ўчасткі, «за» — 29,1.

Адрозьніваюцца ад агульнарэспубліканскай карціны ў Менску і вынікі галасаваньня па шостым і сёмым пытаньнях. За прапанову аб абраньні кіраўнікоў мясцовых органаў выканаўчай улады беспасярэдне жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў сталіцы выказаліся 52,6 адсотку галасуючых, «супраць» — 4,1. Наконт прапановы аб публічным фінансаваньні ўсіх галінаў улады і толькі зь дзяржаўнага бюджэту: «за» выказаліся 61,8 адсотку, «супраць» — 34,9 адсотку грамадзян ад колькасьці галасуючых[25].

**Табліца:** Сацыялягічны прагноз і вынікі рэфэрэндуму.

| Пытаньне | за дадзенымі апытаньня за два месяцы да рэферэндуму (%) | за дадзенымі апытаньня напярэдадні рэферэндуму (%) | за вынік рэферэндуму (%) |
|---|---|---|---|
| Як вы ставіцеся да таго, каб перанесьці Дзень незалежнасьці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) на 3 ліпеня — Дзень вызваленьня Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў у Вялікай Айчыннай вайне? | 35,8 | 54,1 | 88,2 |
| Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 году зь зьменамі і дапаўненьнямі, прапанаванымі Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкам. | 40,7 | 62,1 | 70,5 |
| Ці выступаеце Вы за свабодны, без абмежаваньняў, куплю і продаж зямлі? | 28,0 | 19,2 | 15,3 |
| Ці падтрымліваеце Вы скасаваньне сьмяротнага пакараньня ў Рэспубліцы Беларусь? | 20,6 | 17,4 | 17,9 |
| Прыняць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь 1994 году са зьменамі і дапаўненьнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцыяў камуністаў і аграраў. | 9,1 | 8,7 | 7,9 |
| Ці выступаеце Вы за тое, каб кіраўнікі мясцовых органаў выканаўчай улады выбіраліся беспасярэдне жыхарамі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі? | 86,2 | 73,7 | 29,9 |
| Ці згодныя Вы, што фінансаваньне ўсіх галінаў улады павінна ажыцьцяўляцца публічна і толькі зь дзяржаўнага бюджэту? | 79,2 | 72,5 | 32,1 |

[25] Гл.: Советская Белоруссия. 1996. 3 декабря

Афіцыйныя вынікі галасаваньня розьняцца ад дадзеных сацыялягічных дасьледаваньняў. Напрыклад, лябараторыя «Новак», адна з найбольш аўтарытэтных сацыялягічных службаў Беларусі пад кіраўніцтвам прафэсара Андрэя Вардамацкага, за два месяцы да рэфэрэндуму і напярэдадні рэфэрэндуму праводзіла апытаньне розных групаў выбарцаў. Звычайны каэфіцыент хібнасьці пры аналягічных дасьледаваньнях складае 3–4%. Але ў выпадку зь беларускім рэфэрэндумам 24 лістапада 1996 году розьніца па шэрагу пытаньняў дасягала 30%. Гэта змушае засумнявацца ў афіцыйных выніках плебісцыту (гл. таб.).

## Ацэнкі вынікаў рэфэрэндуму

Падазрэньні што да аб'ектыўнасьці вынікаў рэфэрэндуму таксама выклікае параўнаньне зьвестак пра яўку выбарцаў на галасаваньне па рэфэрэндуме і на давыбары дэпутатаў Вярхоўнага Савету. Колькасьць выбарцаў, што бралі ўдзел у давыборах, была значна меншай за колькасьць грамадзян, якія прагаласавалі на тых жа выбарчых участках па пытаньнях рэфэрэндуму. Гэта наводзіць на думку пра фальсыфікацыю вынікаў рэфэрэндуму, асабліва ў пэрыяд з 18.00 да 22.00. Калі а 18.00 было зафіксавана, што ў галасаваньні ўзялі ўдзел толькі 59,5 адсотку выбарцаў, то праз чатыры гадзіны, а 22.00 прагаласавала ўжо 84,2 адсотку.

25 лістапада 1996 году, пасьля падвядзеньня папярэдніх вынікаў галасаваньня, Аляксандар Лукашэнка правёў прэсавую канфэрэнцыю. На ёй было заяўлена, што рэфэрэндум прайшоў беззаганна і апанэнтам прэзыдэнта будзе цяжка настойваць на незаконнасьці і парушэньнях у часе галасаваньня. Тое, што напярэдадні а 18.00 удзел у галасаваньні ўзялі толькі 59,5 адсотку выбарцаў, а да 22.00 — ужо 84,2 адсотку, Аляксандар Лукашэнка растлумачыў тым, што жыхары гарадоў да таго часу ўжо вярнуліся з дачных участкаў. На пытаньні, колькі каштаваў рэфэрэндум і адкуль былі ўзятыя грошы на яго правядзеньне, прэзыдэнт адказаў, што фінансаваньне вялося з дабрачынных унёскаў; каля 13 мільярдаў рублёў паступіла на разьліковы рахунак ад грамадзянаў і прадпрыемстваў. Аляксандар Лукашэнка падкрэсьліў, што перадачы, трансьляваныя ў дзень галасаваньня па беларускім радыё, ён ня лічыць агітацыяй на сваю карысьць, бо людзей проста прасілі прыйсьці на выбарчыя ўчасткі.

26 лістапада Служба інфармацыі і інфармацыйных тэхналёгіяў Савету Эўропы распаўсюдзіла прэс-рэліз з заявай прэзыдэнта Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Лені Фішар, што рэфэрэндум у Беларусі можа мець толькі кансультацыйнае значэньне.

Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі прызнаў вынікі рэфэрэндуму незаконнымі. Была прынятая адпаведная заява ад 26 лістапада 1996 году з асуджэньнем рэфэрэндуму і шматлікіх парушэньняў, дапушчаных пры яго правядзеньні.

Пытаньні аб зьменах і дапаўненьні Канстытуцыі выносіліся адпаведна з заключэньнем Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада і пастановай Вярхоўнага Савету ад 6 лістапада 1996 году на кансультацыйны рэфэрэндум. Аляксандар Лукашэнка сваім указам надаў вынікам галасаваньня па гэтых пытаньнях абавязковы характар. Валер Ціхіня, старшыня Канстытуцыйнага Суду, у лісьце ад 26 лістапада 1996 году на імя Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі і сьпікера Вярхоўнага Савету адзначыў, што ўсе дзяржаўныя органы і службовыя асобы пры ацэнцы вынікаў рэфэрэндуму павінны кіравацца заключэньнем Канстытуцыйнага Суду і пастановай Вярхоўнага Савету.

Рэакцыя расійскага кіраўніцтва на вынікі беларускага рэфэрэндуму была дастаткова стрыманай, аднак Расія прызнала перамогу Аляксандра Лукашэнкі.

Заходнія дзяржавы на вынікі рэфэрэндуму адрэагавалі зусім не зычліва. Яшчэ 21 лістапада прэзыдэнт Рады Эўрапейскага Зьвязу Дзік Спрынг накіраваў Аляксандру Лукашэнку ліст з выказваньнем заклапочанасьці напружаным становішчам у беларускім грамадзтве напярэдадні рэфэрэндуму. Дзік Спрынг падкрэсьліў, што Эўрапейскі Зьвяз падзяляе сумненьні ў канстытуцыйнасьці правядзеньня рэфэрэндуму, выказаныя АБСЭ.

24 лістапада Беларусь наведала дэлегацыя Эўрапарлямэнту на чале з Гербэртам Бэршэм. Адбыліся рабочыя сустрэчы з кіраўніцтвам Вярхоўнага Савету і прадстаўнікамі парлямэнцкіх фракцыяў. Асноўная ўвага надавалася парушэньням, дапушчаным пры падрыхтоўцы і правядзеньні рэфэрэндуму.

Прадстаўнік Дзяржадэпартамэнту ЗША Глін Дэвіс на брыфінгу 25 лістапада заявіў, што афіцыйны Вашынгтон расчараваны правядзеньнем беларускім кіраўніцтвам рэфэрэндуму, які, паводле АБСЭ і іншых міжнародных арганізацыяў, быў незаконны. ЗША таксама далучыліся да іх ацэнак. Прадстаўнік Дзяржадэпартамэнту пералічыў парушэньні, дапушчаныя выканаўчай уладай у часе рэфэрэндуму. Беларускаму ўраду было прапанавана выправіць становішча, абвясьціўшы вынікі рэфэрэндуму неабавязковымі.

Дадзеныя пра вынікі беларускага плебісцыту ня выклікалі даверу ў міжнароднай супольнасьці. Афіцыйныя вынікі паказваюць на яўную перавагу прэзыдэнта ў супрацьстаяньні Вярхоўнаму Савету ў пытаньнях абмежаваньня паўнамоцтваў заканадаўчай улады. Аднак гэтыя вынікі выклікаюць абгрунтаваныя сумненьні. Назіральнікі, прадстаўнікі палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў зафіксавалі шматлікія парушэньні заканадаўства ў пэрыяд датэрміновага галасаваньня і ў дзень рэфэрэндуму.

## Парушэньні, дапушчаныя ў часе рэфэрэндуму

Парадак прызначэньня і правядзеньня рэфэрэндумаў на момант правядзеньня рэфэрэндуму па Канстытуцыі ў Рэспубліцы Беларусі рэгуляваўся нормамі Канстытуцыі і Закону 1991 году «Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме) ў Рэспубліцы Беларусі». Паводле гэтага закону, падрыхтоўка і правядзеньне рэфэрэндуму мусяць зьдзяйсьняцца публічна. Але дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі аднабакова ўзьдзейнічалі на насельніцтва, пра што, у прыватнасьці, гаворыць дасьледаваньне групы міжнародных назіральнікаў ад Эўрапейскага інстытуту па СМІ. Гэтая група вызначыла, што 90 адсоткаў этэрнага часу, прысьвечанага рэфэрэндуму, было разьмеркавана на карысьць прэзыдэнта. «Выбарцы Беларусі былі пазбаўленыя магчымасьці дэмакратычнага выбару, паколькі перадвыбарная кампанія вялася аднабакова»[26].

У адпаведнасьці з Законам (артыкул 9), падрыхтоўка прызначанага рэфэрэндуму і яго правядзеньне павінны ажыцьцяўляцца за кошт бюджэту. Таксама могуць быць выкарыстаныя і добраахвотныя ўнёскі прадпрыемстваў і арганізацыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў і грамадзянаў, якія перадаюцца адпаведным камісіям па рэфэрэндуме. Па словах прэзыдэнта Лукашэнкі, рэфэрэндум нічога не каштаваў для бюджэту, бо яго правядзеньне забясьпечылі

[26] Гл.: Свабода. 1996. 29 лістапада.

дабрачынныя ўнёскі. Аднак пазабюджэтнае фінансаваньне рэфэрэндуму стварыла сур'ёзныя праблемы ў кантраляваньні за разьмеркаваньнем выкарыстаных сродкаў.

Згодна з артыкулам 15 Закону, тэкст праекту рашэньня, што выносіцца на рэфэрэндум, мае быць апублікаваным не пазьней за дзесяць дзён пасьля прыняцьця пастановы аб правядзеньні рэфэрэндуму. Аднак ужо пасьля апублікаваньня праекту зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі ў ім былі зробленыя істотныя папраўкі.

Артыкул 28 Закону прадугледжвае, што ў выпадку, калі менш чым за пятнаццаць дзён да рэфэрэндуму высьветліцца, што ўключаны ў сьпіс галасуючых грамадзянін ня мае магчымасьці прагаласаваць у дзень рэфэрэндуму, ён мае права атрымаць ува ўчастковай камісіі бюлетэнь для галасаваньня. Датэрміновае галасаваньне дапускаецца толькі ў выключных выпадках. У пастанове Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі ад 14 лістапада 1996 году «Аб тлумачэньні асобных артыкулаў Закону Рэспублікі Беларусі «Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме) ў Рэспубліцы Беларусі» вызначана, каго лічыць грамадзянамі, якія ня маюць магчымасьці прыбыць у дзень рэфэрэндуму для галасаваньня. Да іх ліку належаць грамадзяне, якія не раней за пятнаццаць дзён пакідаюць межы Рэспублікі Беларусі, не вяртаюцца назад да дня правядзеньня рэфэрэндуму і здольныя пацьвердзіць гэта дакумэнтальна. Участковая выбарчая камісія абавязана весьці асаблівы ўлік такіх выбарцаў з указаньнем дакумэнтальных зьвестак, што пацьвярджаюць матывы кожнага факту датэрміновага галасаваньня. Але, насуперак Закону і пастанове Вярхоўнага Савету, у Беларусі праводзілася масавае датэрміновае галасаваньне. Выбарцаў адкрыта заклікалі прагаласаваць да афіцыйна прызначанай даты, 24 лістапада.

Спэцыяльная камісія Савету Эўропы, якая знаходзілася ў Менску з 24 да 27 лістапада на запрашэньне Старшыні Вярхоўнага Савету Сямёна Шарэцкага, заклікала прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнку паважаць парлямэнцкую дэмакратыю і законнасьць. Камісія прызнала нелегітымнасьць рэфэрэндуму і яго вынікаў, канстатавала неадпаведнасьць спосабаў правядзеньня канстытуцыйнай рэформы і арганізацыі рэфэрэндуму дэмакратычным стандартам. Паводле закону і ў адпаведнасьці з пастановай Канстытуцыйнага Суду, вынікі рэфэрэндуму, што датычылі канстытуцыйных зьменаў, мелі толькі кансультацыйны характар. Таксама камісія адзначыла адсутнасьць доступу да сродкаў масавай інфармацыі ўсіх палітычных сілаў, што не дазволіла правесьці сапраўдныя публічныя абмеркаваньні праекту Канстытуцыі. Доступ выбарцаў да канчатковых варыянтаў праектаў Канстытуцыі ня быў забясьпечаны загадзя. Больш за тое, праекты былі апублікаваныя пасьля таго, як ужо пачалося датэрміновае галасаваньне. Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Віктар Ганчар быў незаконны адхілены ад пасады.

У цэлым, у часе правядзеньня рэфэрэндуму ў лістападзе 1996 году былі адзначаныя наступныя асноўныя парушэньні:

1. Камісіі па рэфэрэндуме, згодна з Законам, павінны стварацца адпаведнымі Саветамі дэпутатаў не пазьней чым за месяц да рэфэрэндуму. На справе яны ствараліся за 5–7 дзён і не Саветамі дэпутатаў, а органамі выканаўчай улады.

2. У самы адказны пэрыяд падрыхтоўкі рэфэрэндуму ўказам прэзыдэнта быў незаконна адхілены ад пасады старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў В. Ганчар. Адстаўка паралізавала працу органу, правамоцнага зьдзяйсьняць кантроль за законнасьцю галасаваньня і падводзіць вынікі рэфэрэндуму.

3. На момант датэрміновага галасаваньня, 9 лістапада, на ўчастках для галасаваньня ад-

сутнічалі тэксты зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі. Грамадзяне ня ведалі, за што яны галасуюць.

4. Парушэньнем артыкулу 28 Закону быў заклік выбарцаў, а ў многіх выпадках і прымус да датэрміновага галасаваньня. У выніку, да дня рэфэрэндуму прагаласавала амаль чвэрць выбарцаў.

5. Бюлетэні для галасаваньня друкаваліся Ўпраўленьнем справаў прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Яны паступалі на выбарчыя ўчасткі, мінаючы Цэнтравыбаркам і абласныя камісіі. Ніхто ня ўлічваў колькасьці бюлетэняў.

6. Насуперак артыкулу 9 Закону падрыхтоўка рэфэрэндуму і яго правядзеньне фінансавалася не зь бюджэту, а выключна за кошт невядомых дабрачынных унёскаў. Цэнтральная выбарчая камісія была цалкам адхіленая ад дзейнасьці па фінансаваньні рэфэрэндуму.

7. У аднабаковым парадку вялася агітацыя і прапаганда прэзыдэнцкіх пытаньняў. У шэрагу выпадкаў агітацыя вялася проста на ўчастках для галасаваньня.

8. У дзень рэфэрэндуму ствараліся перашкоды назіральнікам, прадстаўнікам палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў пры зьдзяйсьненьні кантролю за працэсам галасаваньня. Іх не пускалі на ўчасткі, не забясьпечвалі патрэбнай інфармацыяй.

9. Тыповымі парушэньнямі заканадаўства на ўчастках для галасаваньня былі наступныя: не было кабінаў для галасаваньня, адсутнічалі праекты зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі, выбарцам дазвалялася галасаваць без дакумэнтаў, што сьведчылі асобу; плёмбы на скрынях для галасаваньня былі пашкоджаныя; былі факты фальшаваньня подпісаў выбарцаў.

Пералік парушэньняў дазваляе сьцьвярджаць, што вынікі рэфэрэндуму нелегітымныя. Аднак значная частка насельніцтва, электарат прэзыдэнта Лукашэнкі, падтрымала вынікі рэфэрэндуму. Таксама вялікая доля беларусаў успрыняла інфармацыю пра незаконны характар рэфэрэндуму індыфэрэнтна. А незадаволеныя не выказвалі адкрытага і арганізаванага непадпарадкаваньня. Сутыкнуўшыся зь безумоўным непрыняцьцём узурпацыі ўлады ў дэмакратычным сьвеце, Аляксандар Лукашэнка і яго атачэньне, пры маўклівай згодзе Расіі й слабасьці легітымнага Вярхоўнага Савету, атрымалі неабходны кантроль над палітычнай сытуацыяй унутры Беларусі.

## Аснова ідэалягічных рэсурсаў Аляксандра Лукашэнкі

Посьпех Аляксандра Лукашэнкі ў значнай ступені забясьпечваўся як нізкай эканамічнай, так і нізкай палітычнай культурай бальшыні беларускага насельніцтва. Да моманту прэзыдэнцкіх выбараў у краіне склалася спэцыфічная соцыякультурная сытуацыя, зьвязаная з далекасяжным працэсам індустрыялізацыі ў другой палове XX стагодзьдзя. «Фэномэн Беларусі ў тым, што розныя слаі насельніцтва жывуць нібы ў розныя гістарычныя эпохі. Узмацняецца разрыў паміж сацыяльна-культурнымі элемэнтамі постіндустрыйнага тыпу часткі гарадзкога насельніцтва і патрыярхальна-індустрыйным тыпам вясковых жыхароў (у асноўным пэнсіянэраў). Людзі з вышэйшай адукацыяй складаюць 12%, а больш за 20% грамадзянаў маюць менш за чатыры клясы адукацыі. А адносная вага нізкакваліфікаваных і паўпэрызаваных слаёў насельніцтва — блізу 25%»[27]. Аднак перажыткі патрыярхальных адносінаў у

[27] Карбалевич Валерий. Путь Лукашенко к власти // Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека, 1998. С. 252.

Беларусі істотна перамяшаныя з найноўшымі міталягічнымі комплексамі пэрыяду савецкага масавага грамадзтва, адносінамі, сфармаванымі ў спэцыфічных савецкіх варунках.

Рыторыка Аляксандра Лукашэнка абапіралася на комплекс савецкіх міталягем, што ўкараняліся савецкай ідэалягічнай машынай і функцыянавалі ў сьвядомасьці прэзыдэнцкага электарату на ўзроўні «здаровага розуму». Ідэя простага народаўладзьдзя, спрошчанае разуменьне дэмакратыі як скасаваньне гіерархіі ў палітычнай сыстэме, недавер да прадстаўнічых органаў санкцыянавалі антыдэмакратычныя дзеяньні Аляксандра Лукашэнкі. У стаўленьні электарату, кансалідаванага вакол постаці прэзыдэнта, да свайго абраньніка праявілася характэрная рыса масавага чалавека Артэгі-і-Гасэта — атаесамленьне сябе зь дзяржавай, успрыняцьцё тэрмінаў «грамадзтва» і «дзяржава» як сынонімаў.

Ідэалягічныя рэсурсы перамогаў Аляксандра Лукашэнкі закладваліся на працягу ўсяго савецкага пэрыяду беларускай гісторыі. Савецкая дзяржава ад пачатку маніфэставала сябе як дзяржаву народу — рабочых і сялянаў. У камуністычнай міталёгіі народ і дзяржава зьліваліся. Калі прыхільнікі дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі ацэньвалі саму савецкую мадэль палітычнага і дзяржаўнага будаўніцтва як непаўнацэнную і заганную, дык бальшыня насельніцтва проста не атрымала ўяўленьняў пра магчымыя альтэрнатывы гэтай мадэлі.

У часы савецкага рэжыму ўлада камуністычнай партыі сьцьвярджала сябе ў якасьці народнай пры дапамозе інстытуту Саветаў народных дэпутатаў. Зь іх дапамогай монапартыйная сыстэма забясьпечвала адбор кандыдатаў, якія папаўнялі савецкія кіраўнічыя і партыйныя кадры, што, у прынцыпе, было адным і тым жа. Але разам з тым Саветы забясьпечвалі бачнасьць народнага волевыяўленьня.

Незадаволенасьць беларускага насельніцтва камуністычным рэжымам была, у першую чаргу, незадаволенасьцю фактычнай сацыяльнай няроўнасьцю, якая існавала ў савецкай сыстэме, але стала адмаўлялася яе ідэалягічнымі інстытутамі. Непразрыстая для шараговых грамадзянаў савецкая ўлада стварала квазістанавыя групы, партыйна-бюракратычную эліту, што мелі высокі сацыяльны статус, распараджаліся рэсурсамі ўлады-ўласнасьці ў сваіх інтарэсах. Аднак само існаваньне такіх групаў супярэчыла базысным савецкім міталягемам роўнасьці, народаўладзьдзя, ураўняльнай сацыяльнай справядлівасьці.

Камуністычная партыя дыскрэдытавала сябе ў ваччу беларускага насельніцтва. Аднак бальшыня, якая ня мела іншых уяўленьняў пра дэмакратыю апрача тых, што ўзьнікалі на падставе камуністычнай міталёгіі, пратэставала якраз супраць савецкага істэблішмэнту, аднак ня супраць саміх прынцыпаў, якія былі абвешчаныя, але не рэалізаваліся ў савецкай дзяржаве.

У Беларусі адсутнічала ў пэрыяд паміж абвяшчэньнем незалежнасьці і прэзыдэнцкімі выбарамі, а потым і ня ўзьнікла, сыстэма прадстаўніцтва інтарэсаў, характэрная для дэмакратычнага грамадзтва. Замест гэтага пасьля прэзыдэнцкіх выбараў разьвілася масавая практыка звароту насельніцтва беспасярэдне да прэзыдэнта з нагоды любых праблемаў, што былі ў кампэтэнцыі мясцовых органаў улады. У Адміністрацыю прэзыдэнта прыходзяць дзясяткі тысячаў зваротаў грамадзянаў, тысячы людзей імкнуцца патрапіць на асабісты прыём. Замест ідэнтыфікаваных апанэнтаў або прыхільнікаў беларускаму рэжыму супрацьстаіць хаатычны канглямэрат дэзарыентаваных, зьняверaных людзей[28].

[28] Гл.: Карбалевич Валерий. Беларусь: расколотое общество // Белорусская газета.1999. 5 апреля.

## Трансфармацыя палітычнай прасторы Беларусі пасьля ўвядзеньня інстытуту прэзыдэнта

У момант выбараў першага прэзыдэнта ў палітычнай прасторы Беларусі можна было вылучыць два супрацьлеглыя лягеры. Старая савецкая эліта, якія ня мела дакладнай палітычнай арганізацыі, але кантралявала ключавыя дзяржаўныя пасады і мела адмысловае палітычнае лёбі ў Вярхоўным Савеце, і нацыянальна-дэмакратычны рух, які афармляўся ў сыстэму палітычных партыяў. Барацьба за пасаду прэзыдэнта вялася абедзьвюма асноўнымі групамі з мэтай павялічыць рэсурсы легітымнага панаваньня, іх экспрапрыяцыі ў праціўніка і пераразьмеркаваньня на сваю карысьць.

Але ў выніку кансэрватыўнай электаральнай рэвалюцыі на выбарах 1994 году і потым, пры ўмацаваньні прэзыдэнцкай улады, гэтая бінарная сыстэма палітычнага супрацьстаяньня «старая эліта — апазыцыя» была трансфармаваная. Ніводзін з палюсоў улады — ні старая намэнклятура, ні нацыянал-дэмакратычны блёк — не атрымаў стратэгічнай перавагі ў выглядзе кантролю над інстытутамі выканаўчай улады. Замест гэтага сфармавалася яшчэ адна сіла, што сканцэнтравала ўладныя рэсурсы, зьвязаная зь першымі дзьвюма, але разам з тым і адносна незалежная. Прэзыдэнт Лукашэнка і яго атачэньне сталі трэцяй сілай, вакол якой сканцэнтраваліся ідэалягічныя і адміністрацыйныя рэсурсы.

Старая беларуская эліта, праводзячы перадвыбарную кампанію Вячаслава Кебіча, імкнулася ў цэлым захаваць ранейшую, бінарную сыстэму супрацьстаяньня намэнклятуры і нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі. Намэнклятура толькі хацела стабілізаваць сваё становішча, пераразьмеркаваўшы з дамапогай выбараў, як мэханізму легітымацыі найвышэйшай выканаўчай улады, ідэалягічныя і дадатковыя адміністрацыйныя рэсурсы на сваю карысьць. Заданьне нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі, наадварот, палягала ў тым, каб з дапамогай выбараў дэлегітымізаваць палітычнае панаваньне старой эліты, пераразьмеркаваўшы адміністрацыйны, а разам з тым, ува ўмовах усё яшчэ дзяржаўнай эканомікі, і эканамічны рэсурсы на сваю карысьць.

Але ў выніку выбараў сфармавалася трэцяя, спачатку нешматлікая група ўлады — прэзыдэнт і атачэньне. Дэмакратычна абраны прэзыдэнт Лукашэнка выступаў на беларускай палітычнай сцэне як самастойны актор, які супрацоўнічаў ці супернічаў з прадстаўнікамі абедзьвюх груповак.

З умацаваньнем прэзыдэнцкай улады ў палітычнай прасторы сфармаваліся тры групоўкі. Старая намэнклятура зь яе савецкімі традыцыямі, прэзыдэнт Лукашэнка і яго атачэньне зь сярэдняга зьвяна беларускай намэнклятуры, нацыянальна-дэмакратычныя групоўкі. У залежнасьці ад сытуацыі кожная з гэтых групаў выступала ці то супраць дзьвюх іншых, ці то сумесна з адной зь іх, абмяжоўваючы рэсурсы трэцяй.

Валодаючы магутным ідэалягічным і, забясьпечаным Канстытуцыяй, адміністрацыйным рэсурсамі, прэзыдэнт зьдзейсьніў пераразьмеркаваньне рэсурсаў улады-ўласнасьці на сваю карысьць. Нацыянальна-дэмакратычныя сілы засталіся ў становішчы апазыцыйных, аднак і частка намэнклятурнага істэблішмэнту, страціўшы ранейшыя пазыцыі, яўна ці няяўна таксама апынулася ў становішчы апазыцыянэраў прэзыдэнцкай групоўцы ўлады.

З фактычнай ліквідацыяй сыстэмы разьдзяленьня ўладаў, якая толькі нараджалася, Бела-

русь вярнулася да выходнай сыстэмы перадпалітычных мэханізмаў зьдзяйсьненьня ўлады, хаця і мадыфікаванай. Пераемнасьць з ранейшай савецкай сыстэмай захавалася ў імітацыі народаўладзьдзя — выбарах у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, цалкам дэкарацыйныя ў палітычных адносінах. Нацыянальны Сход Рэспублікі Беларусі фармальна выступае спадкаемцам Вярхоўнага Савету і найвышэйшым заканадаўчым органам. Але фактычна ён пакліканы агучваць у якасьці законапраектаў ініцыятывы, што выходзяць ад прэзыдэнта. Як і пры савецкай сыстэме, улада застаецца непразрыстай для насельніцтва. Аснову дзяржаўнай улады, як і раней, складаюць не палітычныя інстытуты, а карпаратыўныя і сваяцкія сувязі ўладных асобаў.

Але ў новай беларускай сыстэме ўлады, сфармаванай пры канцы 1996 году, ёсьць істотныя адрозьненьні ад ранейшай, савецкай. Няма якой-колечы выразнай ідэалёгіі, здольнай кампэнсаваць камуністычную ідэалёгію ў БССР. У адрозьненьне ад таталітарнай савецкай сыстэмы, дзе дзяржава і камуністычная партыя выкарыстоўвалі свае ідэалягічныя рэсурсы для мабілізацыі насельніцтва на вырашэньне пастаўленых партыяй заданьняў, беларускі рэжым імкнецца да максымальнай дэмабілізацыі насельніцтва, нэўтралізацыі ягонай палітычнай актыўнасьці. Беларуская прапаганда, у адрозьненьне ад савецкай, не апэлюе да ідэі будаўніцтва лепшай будучыні. Яна ў першую чаргу зьвяртаецца да міталягізаванай савецкай мінуўшчыны. Афіцыйныя дзяржаўныя сьвяты, усталяваныя пасьля 1996 году, так ці гэтак, адрасуюць беларускае насельніцтва да беларуска-савецкага міту пра дзяржаву народнага дабрабыту. У адрозьненьне ад савецкай сыстэмы, мэханізм палітычных рэпрэсіяў значна слабейшы. Нягледзячы на паліцэйскія акцыі, у Беларусі, хаця і абмежаваная дзяржаўнай манаполіяй на СМІ, захавалася свабода слова.

Замест палітбюро манапольнай партыі, неаддзельнай ад дзяржавы, улада апынулася ў руках прэзыдэнта, які ня быў прадстаўніком ніводнай партыі. Выдаліўшы з сваёй каманды прыхільнікаў дэмакратычных рэформаў, Аляксандар Лукашэнка быў змушаны зьвярнуцца па дапамогу да старой бюракратыі. Такім чынам, старая эліта, абмежаваная ў сваіх уладных рэсурсах прэзыдэнцкай групоўкай, тым ня менш захавала доступ да рэсурсаў улады-ўласнасьці, дзякуючы кансэрвацыі адміністрацыйнай эканомікі.

Прэзыдэнт і яго атачэньне блякавалі намэнклятурную прыватызацыю ў тым выглядзе, у якім яна разьвівалася з 1990 па 1994 год. Але ў пляне захаваньня закрытай сыстэмы распараджэньня ўласнасьцю і ўладай інтарэсы прэзыдэнцкай групоўкі і старой эліты ў значнай ступені супалі. Сьветапоглядныя стэрэатыпы новага прэзыдэнта і старой намэнклятуры таксама былі блізкія. «Лукашэнка, правадыр «народнай рэвалюцыі», ідэалягічна вельмі мала адрозьніваўся ад свайго нібыта галоўнага антаганіста, правадыра «партыі ўлады», прэм'ера Кебіча. Асабліва яскрава і гратэскна гэта выявілася потым, калі Лукашэнка спрабаваў зрабіць акурат Кебіча, якога ён раней абяцаў, стаўшы прэзыдэнтам, пасадзіць у турму, сьпікерам Вярхоўнага Савету і, прагнаўшы групу інтэлігентаў, што першапачаткова далучыліся да яго, бо бачылі ў ім альтэрнатыву «застойнасьці», «затхласьці» кебічаўскага часу і разьлічвалі ім «кіраваць», абкружыў сябе нармальнымі прадстаўнікамі кебічаўскай намэнклятуры»[29].

Аляксандар Лукашэнка дамогся магчымасьці караць непажаданых чыноўнікаў, аднак гэта не закранула падмуркаў панаваньня старой эліты — права, гарантаванага пасадай, не валодаць, але распараджацца дзяржаўнай уласнасьцю і адміністрацыйнай уладай.

---

[29] Дракохруст Г., Дракохруст Ю., Фурман В. Трансформация партийной системы Беларуси // Белоруссия и Россия: общества и государства. Москва: Права человека, 1997. С. 127.

# ПЕРАДУМОВЫ ПАРАЗЫ ДЭМАКРАТЫІ Ў БЕЛАРУСІ

## Крызыс вартасьцяў

Леанід Злотнікаў, адзін зь вядучых беларускіх эканамістаў, трактуе ўсталяваньне рэжыму Аляксандра Лукашэнкі як перамогу коснай, інэртнай савецкай бальшыні, рэванш сацыяльных нізоў. «Новыя лідэры... абапіраюцца ў сваёй дзейнасьці на сыстэму традыцыяналісцкіх, дабуржуазных вартасьцяў, якія ў беларускім грамадзтве захаваліся ў большай ступені, чым у суседніх краінах. Адсюль нэгатыўнае стаўленьне прэзыдэнта да пасярэднікаў і фінансістаў, уяўленьні пра «натуральную» гіерархічную сыстэму аднаасобнай улады і арганічнае адзінства грамадзтва»[30].

Аднак трактоўка соцыякультурных асноваў рэжыму Аляксандра Лукашэнкі як традыцыяналісцкіх выклікае пэўныя сумненьні. Традыцыяналізм Аляксандра Лукашэнкі ня йдзе далей пэрыяду панаваньня камуністычнай партыі. Больш слушна будзе казаць пра квазітрадыцыяналізм, спэцыфічны савецкі кансэрватызм прэзыдэнцкага электарату, які мае мала супольнага з заходнім кансэрватызмам. Постсавецкая Беларусь — спадкаемца масавага савецкага грамадзтва часоў БССР зь яго дзяржаўным атэізмам і пасьлядоўнай палітыкай разбурэньня традыцыйных інстытутаў. Апэляцыі прэзыдэнта і прэзыдэнцкай прапаганды да праваслаўя маюць месца толькі ў кантэксьце невыразных ідэяў панслявізму, апраўданьня антызаходняй палітыкі цяперашняга беларускага кіраўніцтва.

Беларускі рэжым абапіраецца не на пэўную сыстэму вартасьцяў, а на адсутнасьць агульнага стандарту вартасьцяў у беларускім грамадзтве. Гэты рэжым усталяваўся на хвалі стыхійнага пратэсту малаадукаванага насельніцтва супраць зьбядненьня і сацыяльнай несправядлівасьці і існуе за кошт адсутнасьці пазытыўных альтэрнатываў, зразумелых беларускаму грамадзтву.

Галоўныя ідэалягемы прэзыдэнцкай прапаганды, пасьля помсты багатым, — сытасьць і спакой. Але сытасьць і стабільнасьць любым коштам ня могуць быць вартаснай базай грамадзтва. Абраньне прэзыдэнта Лукашэнкі ацэньваецца як электаральная рэвалюцыя, у якой вартасьці традыцыйнага грамадзтва ўзялі гару над вартасьцямі лібэральнага грамадзтва[31]. Аднак, з улікам разбурэньня традыцыйных патрыярхальных структураў беларускага, да другой сусьветнай вайны пераважна аграрнага, грамадзтва ў пасьляваенны пэрыяд, больш слушна будзе гаварыць не пра перамогу традыцыйных вартасьцяў, а пра трыюмф антыкапіталістычнай мэнтальнасьці. На працягу ўсяго часу панаваньня камуністычнай партыі ў Беларусі разьвіваўся культываваны савецкай прапагандай комплекс антыкапіталістычных стэрэатыпаў. Усе гэтыя антыкапіталістычныя забабоны і іх наступствы падрабязна прааналізаваныя яшчэ Людвігам фон Мізэсам[32].

---

[30] Злотников Леонид. В петле популизма. // Хроника несостоявшегося времени. Десять лет в зеркале «Белорусского рынка». Минск, 2001. С. 94.

[31] Тамсама.

[32] Гл.: Мизес Людвиг фон. Социализм. Экономический и социологический анализ. — М.: «Catallaxy», 1994. — 416 с.

Валер Карбалевіч, апісваючы сытуацыю ў Беларусі пасьля прыходу Аляксандра Лукашэнкі да ўлады, характарызуе яе як палярызацыю, палітычны раскол паміж інтэлектуальнымі прыхільнікамі незалежнасьці і дэмакратыі й нізкаадукаванымі прыхільнікамі прэзыдэнта[33]. Аднак больш справядлівым тут будзе ўважаць, што якраз недастатковая палярызаванасьць сярод беларускай эліты ў комплексе зь нізкай палітычнай культурай насельніцтва спрыялі перамозе Аляксандра Лукашэнкі і ўсталяваньню беларускага рэжыму.

Духоўныя наступствы савецкага рэжыму выклікаюць істотныя праблемы кансалідацыі прыхільнікаў дэмакратычнага разьвіцьця. Разбурэньне традыцыйнай сыстэмы вартасьцяў патрыярхальнага грамадзтва адбывалася ў працэсе насаджэньня атэістычнай ідэалёгіі камунізму. Аднак сур'ёзнай альтэрнатыўнай сыстэмы вартасьцяў камунізм не стварыў. Сама ўнутраная супярэчлівасьць савецкай ідэалёгіі спараджала канфлікт сыстэмаў вартасьцяў на ўзроўні індывідуальнай сьвядомасьці. Разбурэньню сыстэмы рэлігійных вартасьцяў спрыяла складаная канфэсійная сытуацыя. Беларускія землі ўваходзілі ў рэгіён распаўсюджаньня хрысьціянства, аднак як заходняга, так і ўсходняга. Абедзьве царквы ў розныя пэрыяды гісторыі займалі дамінуючае становішча. У далейшым тут разьвівалася і пратэстанцтва. Насельніцтва беларускіх земляў было поліканфэсійным.

Ніводная з хрысьціянскіх канфэсій не дамінавала на тэрыторыі Беларусі дастаткова доўга. Для Беларусі была характэрная зьмена канфэсійнай прыналежнасьці на працягу некалькіх пакаленьняў. Асабліва інтэнсіўна гэты працэс разьвіваўся ў пэрыяд уваходжаньня беларускіх земляў у склад Расійскай імпэрыі. Пераважна ўніяцкае і каталіцкае беларускае насельніцтва пасьлядоўна, вельмі часта гвалтоўна, схілялася ў праваслаўе. У 1839 годзе ўніяцтва было ліквідаванае, аднак посьпехі ўкараненьня праваслаўя былі дастаткова павярхоўныя[34].

У наш час у Беларусі адсутнічае царква, у якой дамінуе беларуская мова. У праваслаўнай пераважае расійская, у каталіцкай — польская. Спробы аднавіць уніяцтва, зьнішчанае на беларускіх землях з 1839 году, пакуль даюць досыць сьціплы вынік. Мітрапаліт Філарэт, які ўзначальвае Беларускую праваслаўную царкву, застаецца пад юрысдыкцыяй Маскоўскай патрыярхіі. Аднак і само праваслаўе, што насаджалася расійскай імпэрскай адміністрацыяй, ды хутка губляла сваіх вернікаў пасьля адноснай лібэралізацыі расійскай рэлігійнай палітыкі на пачатку XX стагодзьдзя, падарванае затым камуністычнай дыктатурай, ня мае ў Беларусі тых магутных гістарычна-культурных падвалінаў, як ў Расіі.

У выніку складаных гістарычна-культурных працэсаў рэлігійныя асновы вартаснай кансалідацыі беларускага грамадзтва ў XX стагодзьдзі дастаткова слабыя. Па сутнасьці, працэс рэлігійнага адраджэньня толькі пачынаецца.

Дэмакратычныя рухі ў савецкіх рэспубліках разьвіваліся шмат у чым дзякуючы кансалідацыі элітаў і насельніцтва вакол антыімпэрскіх настрояў, ідэяў нацыянальнага адраджэньня і будаўніцтва. Аднак у Беларусі незадаволенасьць насельніцтва камуністычнай бюракратыяй не падмацоўвалася шырокімі антыімпэрскімі настроямі. У далейшым нацыянальна-дэмакратычны рух ня выпрацаваў дакладнага мадэрнізацыйнага праекту — ягоныя нацыяналістычны і дэмакратычны кампанэнты канфліктавалі.

33 Гл.: Карбалевич Валерий. Беларусь: расколотое общество // Белорусская газета.1999. 5 апреля.

34 Гл.: Канфесіі на Беларусі (канец XVIII–XX ст.). Мінск: ВП «Экаперспектыва». 1998. 340 с.

Ідэі дэмакратызацыі бальшыня насельніцтва засвойвала ў інтэрпрэтацыі СМІ, усё яшчэ падкантрольных камуністычнай партыі. І хаця іх падзяляла дастатковая колькасьць грамадзянаў БССР, яны не суадносіліся шчыльна з ідэямі пабудовы незалежнай нацыянальнай дзяржавы, да стварэньня якой імкнуўся БНФ. Для насельніцтва БССР і, пазьней, незалежнай Рэспублікі Беларусі былі характэрныя непасьлядоўнасьць, фрагмэнтарнасьць уяўленьняў пра прымальную палітычную сыстэму, альтэрнатыўную існай бюракратычнай мадэлі. Антыкамунізм, патрабаваньне сацыяльнай справядлівасьці (адпаведна з савецкай традыцыяй), прымітыўныя ўяўленьні пра народаўладзьдзе і жаданьне падкантрольнасьці ўлады спалучаліся з глыбока ўкаранёнымі ў савецкай соцыякультурнай сыстэме патэрналісцкімі звычаямі.

Канцэптуальнае асэнсаваньне працэсаў, што адбываліся ў беларускім грамадзтве, ускладнялася адсутнасьцю ў большыні прадстаўнікоў беларускай эліты неабходнай гуманітарнай адукацыі, катэгарыяльнага апарату і комплексу ўяўленьняў, выпрацаваных заходняй сацыяльнай навукай, але не запатрабаваных савецкай сыстэмай адукацыі. Пры ўсёй адрознасьці ідэалягічных плятформаў і палітычных лёзунгаў як Аляксандар Лукашэнка, так і прыхільнікі апазыцыі аб’ядданыя сваім савецкім мінулым. Раскол на ідэалягічным і палітычным узроўні не адлюстроўваў прынцыповага канфлікту сыстэмаў вартасьцяў. Такіх дакладных вартасных стандартаў, што спрыяюць дакладнай палярызацыі грамадзтва, яго радыкалізацыі ў супрацьстаяньні, у беларускай палітычнай практыцы проста не было. Беларускае грамадзтва, якое ў масе не чакала і не імкнулася да радыкальных палітычных і эканамічных рэформаў, аказалася грамадзтвам без соцыякультурных арыенціраў.

## Разьвіцьцё нацыянальнай эліты

У адрозьненьне ад рэспублік Прыбалтыкі або Ўкраіны, этнакультурная традыцыя Беларусі была найбольш слабой у працэсе супрацьстаяньня русіфікацыі. Дэмакратычныя вартасьці таксама ня сталі падмуркам для кансалідацыі элітаў, апазыцыйных старой камуністычнай намэнклятуры.

Складанасьць кансалідацыі на аснове лібэральных вартасьцяў тлумачыцца ня толькі патрыярхальным мінулым Беларусі. Слабасьць нацыянальнай ідэнтычнасьці абумоўленая спэцыфічнай гісторыяй беларускай нацыі і яе элітаў.

На пачатку ХХ стагодзьдзя фармаваньне беларускай нацыі засталося незавершаным. Тэндэнцыя нацыянальнай кансалідацыі і супрацьлеглая тэндэнцыя русіфікацыі беларусаў пасьля інкарпарацыі беларускіх земляў Расійскай імпэрыяй разьвіваліся адначасова. Аналізуючы працэсы фармаваньня беларускай нацыі ў канфлікце з палітыкай русіфікацыі, Валер Карбалевіч піша пра ўзаемааслабленьне гэтых працэсаў. Няпэўнасьць самаідэнтыфікацыі народу стварала ўмовы для размаітых варыянтаў ягонага разьвіцьця ў залежнасьці ад геапалітычнай сытуацыі[35].

Але аслабленьню этнакультурнай традыцыі, размываньню нацыянальнай ідэнтычнасьці спрыяла ня толькі мэтанакіраваная палітыка русіфікацыі. Працэс разбурэньня ідэнтычнасьці

[35] Гл.: Карбалевич Валерий. Политическое развитие и национально-государственные интересы Республики Беларусь (1988–1996) // Адкрытае грамадства. Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь. 1999. № 1(6).

беларускага этнасу праходзіў у сытуацыі інтэнсіўнага размываньня этнакультурнай ідэнтычнасьці нацыянальнай эліты. Калі ў часы панаваньня польскай Кароны эліта палянізавалася, то пры расійскім панаваньні адбываўся працэс яе русіфікацыі, які суправаджаўся сустрэчным працэсам — фармаваньнем нацыянальнай літаратуры, літаратурнай мовы, станаўленьнем беларускамоўнай нацыянальнай эліты.

Па ўваходжаньні беларускіх земляў у склад СССР абедзьве тэндэнцыі, фармаваньня беларускай нацыі і русіфікацыі беларускага насельніцтва, захаваліся і разьвіваліся ў крыху мадыфікаваным выглядзе. Зьдзяйсьнялася фарсаваная русіфікацыя і «саветызацыя» беларускага грамадзтва. У працэсе урбанізацыі разбуралася самабытная народная культура ў беларускай вёсцы. Але, разам з тым, статус БССР у якасьці саюзнай рэспублікі фіксаваў існаваньне беларускай нацыі на дзяржаўным узроўні, спрыяў нацыянальна-дзяржаўнай самаідэнтыфікацыі беларусаў. Трэба адзначыць, што ідэя нацыянальнай дзяржаўнасьці сфармавалася ў нечым дзякуючы статусу Беларусі ў складзе СССР. З часоў падзелу Рэчы Паспалітай і да стварэньня БССР беларусы ня мелі сваёй дзяржавы. У Расійскай імпэрыі Беларусь называлася Паўночна-Заходнім краем, а беларусы не прызнаваліся асобнай нацыяй. Пасьля таго як была зрынутая дынастыя Раманавых, Беларуская Народная Рэспубліка, якая ўтварылася на месцы паўночна-заходняй правінцыі, была хутка ліквідаваная бальшавікамі. Магчыма, акурат гэтая спроба і змусіла бальшавіцкі ўрад абвясьціць Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку.

У пэрыяд адносна слабога кантролю з боку савецкага цэнтру ў 20-я гады ішоў працэс інтэнсіўнага фармаваньня нацыянальнай ідэнтычнасьці, аднак на чале яго стаяла камуністычная нацыянальная інтэлігенцыя. Яшчэ ў часы панаваньня нацыянал-камуністаў беларуская нацыянальная ідэалёгія была шчыльна зьнітаваная і падпарадкаваная камуністычнай ідэалёгіі. У далейшым рэпрэсіі сталінскага рэжыму супраць нацыянальнай эліты, зьнішчэньне беларусаў і беларускіх элітаў у часы другой сусьветнай вайны кардынальна зьмянілі ня толькі дэмаграфічны склад насельніцтва, але і трансфармавалі тэндэнцыі соцыякультурнага разьвіцьця.

Вайна раскалола нацыянальную эліту, што ацалела ад сталінскіх рэпрэсіяў. Пасьля перамогі Савецкага Саюзу частка яе, што супрацоўнічала з акупацыйным рэжымам, ня ўдзельнічала ў разьвіцьці падзеяў унутры Беларусі. У БССР засталася толькі прасавецкая, камуністычная эліта. Аднаўленьне нацыянальнай эканомікі суправаджалася аднаўленьнем таталітарнай партыйнай машыны. Хаця ўнутры Беларусі і сфармаваўся корпус камуністычных кіраўнікоў з былых партызанаў з моцнымі карпаратыўнымі сувязямі, яны не маглі стаць паўнавартымі праваднікамі нацыянальнай ідэі. У іх сьветапоглядзе нацыянальная ідэя не канкуравала з камуністычнай ідэалёгіяй. Апрача таго, у Беларусі ня склалася традыцыя дысыдэнцтва. У 70-я гады тут не было ніводнай гэльсынскай групы. Адсутнасьць дысыдэнтаў — адзін з чыньнікаў слабасьці Беларускага народнага фронту ў барацьбе з старой савецкай элітай.

Пасьля канчатковага зацьвярджэньня камуністычнага рэжыму і ачысткі ад старых нацыянал-камуністычных кадраў, савецкая сыстэма фармавала ўспрыняцьцё беларускай гісторыі выключна ў кантэксьце савецкай. Клясычныя творы нацыянальнай літаратуры выбіраліся для ўкладаньня падручнікаў у адпаведнасьці з патрабаваньнямі камуністычнае цэнзуры. Ідэалёгія нацыянальна-вызвольнага руху інтэрпрэтавалася з гледзішча сацыялістычнай рэвалюцыі. Увесь корпус афіцыйна дазволенай нацыянальнай літаратуры, ваенная міталёгія савец-

кай Беларусі спрыялі разьвіцьцю ня столькі нацыянальнай, колькі савецкай ідэнтычнасьці[36].

Пераважная бальшыня пасьляваеннай беларускай эліты на пачатак распаду СССР і была носьбітам такой ідэнтычнасьці або мела надзвычай слабую нацыянальную самасьвядомасьць. Насельніцтва Беларусі ў масе не ўспрыняло распад СССР і крах сацыялістычнай сыстэмы як вынік яе глыбокага ўнутранага крызысу.

Лідэры БНФ, якi стаў цэнтрам нацыянальна-дэмакратычнага руху, і ў прыватнасьці Зянон Пазьняк, спрабавалі ўкараніць нацыяналістычную ідэалёгію, ня ўлічваючы соцыякультурнай спэцыфікі постсавецкай Беларусі ў параўнаньні з Украінай або Прыбалтыкай. Ядро БНФ складала гуманітарная і творчая інтэлігенцыя, перш за ўсё цесна зьвязаная з нацыянальнай культурай і мовай. Але ў параўнаньні з астатнім насельніцтвам гэтая група была дастаткова малалікая і недастаткова радыкальная ў сваіх дзеяньнях супраць старой эліты. Адзінства апазыцыі не было дасягнута з прычыны адсутнасьці кансалідацыі новых элітаў на аснове супольных вартасьцяў.

## Масквацэнтрызм старых і новых элітаў

Масквацэнтрысцкая гістарычная канцэпцыя накідалася насельніцтву ўсіх савецкіх рэспублік. Міталягема Масквы — цэнтру Савецкай Радзімы, русіфікацыя, пры аслабленьні ідэалягічнага кантролю, атрымлівалі ў нацыянальных элітаў нэгатыўную інтэрпрэтацыю. Палітыка русіфікацыі стала аргумэнтам нацыянальна-дэмакратычных рухаў у барацьбе за нацыянальную незалежнасьць. Аднак у Беларусі працэс русіфікацыі насельніцтва ішоў значна больш пасьпяхова.

У адрозьненьне ад астатніх рэспублік СССР, якія таксама атрымалі незалежнасьць праз дэмакратызацыю і дэмантаж савецкай сыстэмы, ініцыяваных Масквой, Беларусь найбольш моцна трымалася пазыцыяў масквацэнтрызму.

Кіруючая партыйна-намэнклятурная эліта імкнулася аднавіць сувязі з былым цэнтрам. Пагаршэньне эканамічнага становішча, зьніжэньне ўзроўню жыцьця насельніцтва зьвязваліся з разбурэньнем эканамічных сувязяў з Расіяй. Усе ініцыятывы беларускай партыі ўлады былі накіраваныя на аднаўленьне становішча, у якім была Беларусь да распаду СССР. Гэта значыць, на ўзнаўленьне расійскіх датацыяў і захаваньне нявыгадных для Расіі прывілеяў. Адпаведна, беларуская намэнклятурная эліта імкнулася атрымаць падтрымку антырэфармісцкіх сілаў у Маскве. Аднаўленьне ранейшых стасункаў было магчымае толькі пры рэанімацыі ранейшай савецкай палітычна-эканамічнай сыстэмы.

Насуперак фармальным атрыбутам незалежнасьці савецкай рэспублікі, кіруючая эліта БССР, а затым і Рэспублікі Беларусі, не праяўляла поўнай самастойнасьці, рэагуючы на дзеяньні Масквы.

Паразытаваньне на расійскіх рэсурсах засталося адзінай стратэгіяй беларускай намэнклятурнай эліты, якія ня мела ніякіх вартасных арыенціраў, апрача імкненьня захаваць уладу.

Паколькі ўнутры Беларусі не было дастаткова моцных элітаў, здольных істотна ўплываць на ўнутранае палітычнае становішча, асноўная крыніца пераменаў у беларускай сыстэме

[36] Гл.: Нордберг Марк, Кузио Тарас. Построение наций и государств. Историческое наследие и национальные самосознания в Белоруссии и на Украине (Сравнительный анализ) // Белоруссия и Россия: общества и государства. Выпуск 2. Москва: Права человека, 1998. 432 с.

разьмеркаваньня ўлады-ўласнасьці знаходзілася па-за яе межамі. Нацыяналістычная апазыцыя, якая дасягнула пэўнага ўплыву на беларускім палітычным полі ў значнай ступені дзякуючы пераменам у Расіі, ад пачатку дэкляравала нэгатыўнае стаўленьне да мэтраполіі. Але пры гэтым яна гэтак жа ацэньвала Маскву як сур'ёзны цэнтар палітычнага ўплыву на ўнутрыбеларускія працэсы. Калі старая намэнклятурная эліта лічыла праімпэрскія, пракамуністычная сілы ў Маскве гарантам аднаўленьня савецкай сыстэмы, дык нацыяналістычная апазыцыя канструявала вобраз магутнага ворага, што ўвесь час пагражае беларускай незалежнасьці. Эканамічныя праблемы Беларусі і хібнасьць яе палітычнай сыстэмы тлумачыліся падкопамі Масквы.

Міталягема магутнай Масквы стала важным складнікам ідэалягічнай прасторы постсавецкай Беларусі. Яе глыбокае пранікненьне ў масавую сьвядомасьць савецкіх беларусаў служыла апраўданьнем беларускіх элітаў за свае ўласныя няўдачы на ўнутранай эканамічнай і палітычнай прасторы.

Старая намэнклятурная эліта, апэлююючы да неабходнасьці аднаўленьня Савецкага Саюзу, абапіралася на сыстэму ўяўленьняў савецкага насельніцтва.

Новая, нацыяналістычная і, часткова, дэмакратычная эліта выкарыстоўвала антымаскоўскі міт, хаваючы сваю слабасьць на ўнутрыбеларускім палітычным полі.

Ад пачатку, з часоў гарбачоўскай перабудовы, Масква выступала, хаця часьцяком і міжволі, ініцыятарам пераменаў у Беларусі.

У адрозьненьне ад Прыбалтыкі і Ўкраіны, распаду СССР і працэсу набыцьця незалежнасьці ў Беларусі не папярэднічаў рост нацыянальнай самасьвядомасьці. Старая, савецкая ідэнтычнасьць гняла бальшыню насельніцтва, абмяжоўваючы лік прыхільнікаў нацыянальна-дэмакратычнага руху, блякуючы ініцыятывы нацыяналістычнай апазыцыі, што не наважвалася на радыкальныя дзеяньні ў барацьбе з савецкай намэнклятурай.

## Цывілізацыйнае адставаньне, інтэнсіўная індустрыялізацыя, разбурэньне этнакультурнай прасторы

Такія чыньнікі, як фізычнае зьнішчэньне нацыянальнай эліты, здушэньне нацыянальнай ідэалёгіі ў інтарэсах камуністычнай і пасьлядоўная палітыка русіфікацыі ў пасьляваенны пэрыяд, дапоўніліся новымі магутнымі чыньнікамі, якія блякавалі разьвіцьцё нацыянальнай ідэнтычнасьці беларусаў. Пасьляваеннае аднаўленьне Беларусі было не аднаўленьнем, а, фактычна, стварэньнем беларускай індустрыі.

Да другой сусьветнай вайны цяжкая прамысловасьць знаходзілася ці не на зародкавай стадыі разьвіцьця. У Беларусі пераважала аграрная эканоміка, сельскае насельніцтва па сваёй колькасьці істотна дамінавала над гарадзкім. Аднак у пасьляваенны мірны час Беларусь стала «зборачным цэхам» Савецкага Саюзу. Тут выраблялася 30% электронна-вылічальнай тэхнікі і 23% радыёпрамысловай апаратуры, знаходзіліся галоўныя ў СССР прадпрыемствы сельскагаспадарчага машынабудаваньня і аўтамабілебудаваньня.

У канцы 80-х Беларусь лічылася эканамічна разьвітым рэгіёнам СССР. Тут былі найвышэйшыя тэмпы росту вытворчасьці, найвышэйшы ВУП на душу насельніцтва. Тут жа былі і

найвышэйшыя тэмпы росту прадукцыйнасьці працы. Такі эканамічны рост шмат у чым быў абумоўлены няяўнымі датацыямі з боку Расіі, заснаванымі на сацыялістычнай, савецкай сыстэме цэнаўтаварэньня.

Працэс пасьляваеннай індустрыялізацыі ўклаўся ў пэрыяд жыцьця аднаго пакаленьня. У 1940 годзе на долю гарадзкога насельніцтва прыходзілася ўсяго 21,3%, у той час як у Расіі — 34,4%. Пасьля другой сусьветнай вайны ў Беларусі пачаўся бурны рост індустрыі. Пачынаючы з канца 50-х гадоў у Беларусі адбывалася імклівая урбанізацыя. За час з 1959 да 1987 году гарадзкое насельніцтва вырасла ў 2,62 раза. Значную долю сярод гарадзкога насельніцтва сталі складаць выхадцы зь вёскі ў першым пакаленьні.

Працэс індустрыялізацыі й урбанізацыі праходзіў у варунках татальнага панаваньня камуністычнай ідэалёгіі пасьля разбурэньня спэцыфічнага культурнага асяродзьдзя беларускіх гарадоў, пасьля фактычнага зьнішчэньня гарадзкой культурнай прасторы разам з самімі гарадамі ў часе другой сусьветнай вайны. Разам з будаўніцтвам новых паселішчаў на руінах старых культурных цэнтраў у сьвядомасьць беларускага насельніцтва ўкараняліся асноўныя клішэ беларускай савецкай міталёгіі — пра адзінства лёсаў расійскага і беларускага народаў, пра пралетарскі інтэрнацыяналізм, прыярытэт агульнасаюзных інтарэсаў над інтарэсамі нацыянальных рэспублік.

Сыстэма абмену таварамі, сыравінай, энэрганосьбітамі і грашовай масай у Савецкім Саюзе не была рынкавай. Абмен адбываўся цэнтралізавана, без адэкватнага ўліку ўкладаньняў кожнага рэгіёну ў вытворчасьць тавараў. Цэны на энэрганосьбіты, што пастаўляліся з Расіі, былі прыблізна ў 2,7 раза ніжэйшыя за сусьветныя. А вось цэны на тавары лёгкай прамысловасьці, што ішлі зь Беларусі ў Расію, з улікам якасьці былі ўтрая вышэйшыя за сусьветныя; а цэны на харчовыя тавары — у 2,6 вышэйшыя за сусьветныя[37]. Як найбольш пацярпелая ў Другой сусьветнай вайне, з магутным партызанскім лёбі, Беларусь сілкавалася расійскімі рэсурсамі. На тле нарастаньня крызысу савецкай сыстэмы Беларусь, захоўваючы свой прывілеяваны стан у разьмеркаваньні тавараў і рэсурсаў, мела найлепшы дабрабыт. Тут было значна менш незадаволенасьці савецкім рэжымам, чымся ў іншых рэспубліках СССР.

У пасьляваеннай Беларусі, стымуляваная індустрыялізацыяй і урбанізацыяй, разьвівалася соцыякультурная сытуацыя, яшчэ да другой сусьветнай вайны ахарактарызаваная Хасэ Аргэгам-і-Гасэтам як «паўстаньне масаў». Ішло фармаваньне савецкага масавага грамадзтва, зьвязанае з агульным падвышэньнем узроўню жыцьця, працэсамі разбурэньня ранейшых сацыяльных і культурных сувязяў, пераемнасьці пакаленьняў, ужо дастаткова аслабленых падзеямі нядаўняй беларускай гісторыі. Разьвівалася сыстэма масавай адукацыі і выхаваньня, што накідала савецкую ідэалёгію. Масы насельніцтва перамяшчаліся ў горад. У той жа час само гарадзкое культурнае асяродзьдзе фармавалася наноў. Старыя традыцыі былі ліквідаваныя ў працэсе разьвіцьця індустрыйнай сыстэмы. Размываньне этнакультурнай ідэнтычнасьці беларускага насельніцтва і разьвіцьцё спэцыфічнай савецкай працягвалася шпаркімі тэмпамі.

Працэс мадэрнізацыі «наўздагон», што накіроўваўся з Масквы ў комплексе з спадчынай русіфікацыі ў складзе Расійскай імпэрыі, а затым Савецкага Саюзу, стварыў у Беларусі адмысловую соцыякультурную сытуацыю, якая прывяла да слабасьці дэмакратычных сілаў у постсавецкай Беларусі.

---

[37] Гл.: Dąbrowski M., Antezak R. Economic transition in Russia, the Ukraine and Belarus in comparative perspective. Warsaw, 1995. P. 9.

## Разьдзел 2

# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА БЕЛАРУСІ ПАМІЖ 1996 І 2000

## УВЯДЗЕНЬНЕ ПАСАДЫ ПРЭЗЫДЭНТА БЕЛАРУСІ: ПЕРАДУМОВЫ І НАСТУПСТВЫ

Дастаткова дакладны адказ на пытаньне, што такое насамрэч сучасная Рэспубліка Беларусь і што зь сябе ўяўляе фэномэн прэзыдэнцкай улады ў Беларусі, немагчыма даць на падставе аналізу юрыдычнага статусу, кампэтэнцыі органаў улады. Можна вывучыць заканадаўчыя акты Беларусі: Канстытуцыі 1994 і 1996 гадоў, Закон аб прэзыдэнту 1995 году, іншыя нарматыўныя акты, што рэгулююць прававы статус, вызначаюць кола паўнамоцтваў беларускага прэзыдэнта — і атрымаць вельмі далёкае ад сапраўднасьці ўяўленьне аб тым, хто такі беларускі прэзыдэнт дэ-факта.

Адказаць на гэтае пытаньне можна толькі на падставе вывучэньня дзеяньняў прэзыдэнта, яго асяродзьдзя, яго прыхільнікаў і апанэнтаў у беларускай палітыцы, паступовых зьменаў стану беларускага грамадзтва, зьменаў у грамадзкай думцы. Акурат гэтыя зьмены адлюстроўваліся ў заканадаўстве.

Тэндэнцыі фармаваньня існуючага цяпер палітычнага рэжыму праявіліся да таго часу, як яны былі адлюстраваныя ў заканадаўстве ў выніку правядзеньня ў 1996 годзе рэфэрэндуму і зацьвярджэньня прапанаванай Лукашэнкам новай рэдакцыі Канстытуцыі. Сапраўдны статус, кола паўнамоцтваў прэзыдэнта Лукашэнкі вызначыліся за першыя 14 месяцаў яго знаходжаньня на прэзыдэнцкай пасадзе — да кастрычніка 1995 году.

Прыход Лукашэнкі да ўлады і наступнае фармаваньне рэжыму асабістай улады ў Беларусі зьявы не выпадковыя, а заканамерныя, вызначаныя кірункам і характарам палітычных працэсаў у Беларусі задоўга да прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году.

У 1991—1992 гг. сярод палітычнай эліты Беларусі было даволі распаўсюджаным меркаваньне, што больш адпаведнай патрэбам палітычнага разьвіцьця Беларусі формай кіраваньня ёсьць парлямэнцкая рэспубліка. Дыскусіі аб неабходнасьці зьмены формы кіраваньня пачаліся ў Вярхоўным Савеце ў траўні 1993 году.

Напрыканцы 1993 году ў парлямэнце стала дамінуючым меркаваньне, што акурат прэзыдэнцкая рэспубліка ёсьць формай кіраваньня, якая дазволіць вывесьці Беларусь з глыбокага эканамічнага крызысу, стварыць спрыяльныя ўмовы для забесьпячэньня парадку, арганізаванасьці, дысцыпліны, апэратыўнага прыняцьця неабходных палітычных пастановаў.

Галасы, што прэзыдэнцкая рэспубліка ўва ўмовах Беларусі азначае рэальную магчымасьць усталяваньня дыктатуры, раздаваліся толькі з боку дэмакратычнай апазыцыі ў Вярхоўным Савеце, якую складалі фракцыі БНФ і Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады. Галасы гэтых 50 дэпутатаў (з 345 агульнай колькасьці) не былі пачуты бальшынёй парлямэнтароў.

Але прынцыповая пазыцыя БНФ і БСДГ мела ўплыў на стан грамадзкай думкі. Сацыялягічныя апытаньні, праведзеныя ў сьнежні 1993 году, мелі такія вынікі: 49,5% беларускіх выбарцаў — за ўводзіны пасады прэзыдэнта, і 29,3% — супраць.

Вярхоўны Савет 12 склікаными, выбраны яшчэ ў савецкі час (у 1990 годзе), быў непрафэсійным. Бальшыня дэпутатаў складала лёбі прэм'ер-міністра Вячаслава Кебіча. Акурат яго бальшыня дэпутатаў бачыла прэзыдэнтам Беларусі. Якраз пад Кебіча пісалася Канстытуцыя Беларусі 1994 году, згодна зь якой Беларусь станавілася прэзыдэнцкай рэспублікай.

Вячаслаў Кебіч, зрабіўшы кар'еру ў партыйных органах, быў сваім для партыйнай і савецкай намэнклятуры, якая з савецкага часу захавала свае пасады ў органах улады як на цэнтральным, так і на рэгіянальным, мясцовым узроўні. У той жа час на працягу 1992—1993 гадоў у складзе старой эліты сфармавалася даволі магутная група, якая бачыла, што Кебіч ня тая фігура, якая адпавядае іх палітычным і эканамічным інтарэсам у сьвятле новых патрабаваньняў. Гэта група мела значнае прадстаўніцтва ў цэнтральных органах улады, сярод дырэктараў буйных прадпрыемстваў, мела падтрымку часткі прадстаўнікоў кіраўніцтва Камітэту дзяржаўнай бясьпекі, Міністэрства ўнутраных спраў, Генэральнай пракуратуры, а таксама добрыя кантакты з часткай расейскага істэблішмэнту.

Галоўнымі прычынамі, чаму Кебіч не задавальняў іх, былі:

1) Рост пагрозы іх уладзе з боку дэмакратычнай контраэліты.

Беларуская дэмакратычная контраэліта пачала фармавацца дастаткова нядаўна — напрыканцы 80-х гадоў. На момант развалу Савецкага Саюзу яна была яшчэ ня ў стане ўзяць уладу. Але дэмакратычная контраэліта паступова набірала сілы. Яе сацыяльная база паступова пашыралася зь зьмяненьнямі ў сацыяльна-дэмаграфічным складзе насельніцтва, а таксама дзякуючы таму, што дэмакраты мелі магчымасьць інтэнсіўна працаваць з насельніцтвам (маючы прадстаўніцтва ў парлямэнце, доступ да некаторых буйных дзяржаўных СМІ).

2) Узмацненьне рабочага руху*. Была відавочнай тэндэнцыя ўсё больш моцнага супрацоўніцтва кіраўніцтва незалежных прафэсійных саюзаў і страйкавых камітэтаў з дэмакратычнымі палітычнымі партыямі Беларусі**.

3) Для пабудовы рынкавай эканомікі дзяржава павінна была ўзяць на сабе рэгулюючыя функцыі, забясьпечыць кантроль за функцыянаваньнем і рэфармаваньнем дзяржаўных прадпрыемстваў. Паколькі доля дзяржаўных прадпрыемстваў ува ўнутраным валавым прадукце складала каля 90%, прэзыдэнт павінен быў стаць галоўным арбітрам для дырэктарскага корпусу.

Беларуская эканоміка была ня толькі пабудавана ў савецкі пэрыяд як частка агульнасавецкага гаспадарчага комплексу, яна функцыянавала, па інэрцыі, на падставе тых традыцыяў, якія склаліся ў савецкі час, што ўплывала на якасьць мэнэджмэнту.

У пару існаваньня таталітарнай дзяржавы гаспадарчы абарот рэгуляваўся ня толькі нормамі права, а і пастановамі партыйных органаў. У 1991 годзе гэтая сыстэма развалілася. Рынкавыя мэханізмы ж не былі сфармаваныя. Вынікам таго, што дзяржава фактычна адсаранілася ад рэгуляваньня эканамічных працэсаў, быў «дзікі» рынак.

Беларускім гаспадарчым элітам была патрэбная «моцная асоба», здольная навесьці пара-

* Намэнклятура надоўга запомніла мітынг рабочых Менску ў красавіку 1991 году, калі больш за 100 тысяч рабочых выйшлі на плошчу перад Домам ураду.

** Адзін зь лідэраў БНФ Сяргей Антончык уваходзіў у склад кіраўніцтва рэспубліканскага страйкавага камітэту.

дак, хай шляхам вяртаньня да ранейшых мэтадаў кіраваньня эканомікай, перад якой несьлі б асабістую адказнасьць дырэктары дзяржаўных прадпрыемстваў.

Беларуская эканоміка была арыентаваная пераважна на расейскі рынак. Для таго, каб мець дастатковую гарантыю выкананьня расійскімі партнэрамі сваіх абавязаньняў, патрэбны быў лідэр, здольны падтрымліваць добрыя адносіны, у тым ліку і асабістыя, з прадстаўнікамі расійскай палітычнай эліты*.

Гэта была групоўка прагматыкаў (яе інтарэсы прадстаўлялі, як высьветліцца пазьней, дэпутаты Леанід Сініцын, Віктар Кучынскі, Іван Ціцянкоў, а таксама дзяржаўныя функцыянэры Ўладзімер Гаркун, Міхаіл Мясьніковіч і інш.). Яны ведалі, што ў прэзыдэнта Кебіча ня стане палітычных рэсурсаў, каб быць сапраўдным гарантам іх улады і інтарэсаў. Ім патрэбны быў ня першы сярод роўных, якім быў бы Кебіч, а чалавек, які змог бы быць аўтарытэтным для іх лідэрам, харызматычны палітык, папулярнасьць якога ў грамадзтве была б для іх зарукай стабільнасьці. Яны жадалі стабільнасьці, каб спакойна карыстацца перавагамі свайго статусу, набытага ў ходзе перадзелу дзяржаўнай маёмасьці. Для гэтага ім было недастаткова мець «сваю» бальшыню ў Вярхоўным Савеце і мець пад кантролем пераважную бальшыню СМІ. Сапраўднай стабільнасьці яны маглі дасягчы толькі маючы цалкам «свой» Вярхоўны Савет, толькі «свае» СМІ. Стабільнасьць для іх азначала канцэнтрацыю ўсёй улады ў краіне ў руках «свайго» палітыка і магчымасьць прыняцьця самых жорсткіх захадаў што да тых, хто пагражаў іх статусу і іх інтарэсам.

На гэтую ролю падыходзіў толькі новы чалавек. «Свой» па палітычнай культуры — былы камуніст. Але ня «свой» па статусе — чалавек з генэрацыі партыйцаў, якія на момант развалу Савецкага Саюзу і забароны КПБ у 1991 годзе не пасьпелі заняць высокія пасады. Агрэсіўны, бескампрамісны, харызматычны малады палітык.

Кандыдатура, якая адпавядала ўсім крытэрам, выдзялялася на агульным фоне вельмі яскрава. Гэта быў Аляксандар Лукашэнка, дэпутат Вярхоўнага Савету 12 скліканьня, чалавек з далёкай (па мерках Беларусі) правінцыі — былы дырэктар саўгасу «Гарадзец» Шклоўскага раёну. У 1993 годзе яму была толькі 39 гадоў.

Можна казаць дастаткова дакладна, калі гэтая групоўка вызначылася з кандыдатурай Лукашэнкі. 4 чэрвеня 1993 году ў складзе камісіяў Вярхоўнага Савету зьявілася новая структура — часовая камісія па барацьбе з карупцыяй. Стварэньне такой камісіі, улічваючы падзел парлямэнту на групоўкі і фракцыі, — зьява не ўнутрыпарлямэнцкага жыцьця. На яе стварэньне павінны былі даць згоду «зьверху». Там жа павінна было быць названа дакладнае імя яе кіраўніка. Гэта зрабілі аўтары праекту «прэзыдэнт Лукашэнка».

З траўня 1993 году ў парлямэнце пачынаюць усё больш гаварыць аб неабходнасьці ўводзінаў пасады прэзыдэнта і перавагах прэзыдэнцкай рэспублікі. А 4 чэрвеня 1993 году была створана часовая камісія па барацьбе з карупцыяй пад кіраўніцтвам Аляксандра Лукашэнкі… Яна стала для будучага прэзыдэнта перадвыбарнай трыбунай. Акрамя таго, вакол гэтай нешматлікай** па складзе камісіі пачынае фармавацца групоўка, якая ў будучыні створыць найбліжэйшае атачэньне прэзыдэнта Лукашэнкі.

* Толькі ў гэтай частцы Кебіч, які яшчэ з савецкіх часоў меў добрыя асабістыя адносіны з расійскім прэм'ер-міністрам Віктарам Чарнамырдзіным і яго атачэньнем, апраўдваў надзеі беларускай палітычнай эліты. Новы лідэр павінен быў працягнуць гэтую традыцыю.

** Камісія складалася з 10 чалавек.

Канкурэнтамі ў барацьбе за прэзыдэнцкую пасаду Лукашэнка ўспрымаўся як несур'ёзная і несамастойная фігура, супраць якой не выпадае весьці поўнамаштабную інфармацыйную вайну. Сам жа Лукашэнка ў ходзе перадвыбарнай барацьбы вольна раздаваў моцныя ўдары направа — у бок «нацыянал-радыкалаў» і налева — у бок «карумпаванай намэнклятуры», «партыйна-мафійнай верхавіны».

Адзіны, хто мог стварыць значныя складанасьці для рэалізацыі праекту «прэзыдэнт Лукашэнка», быў Старшыня Савету міністраў Вячаслаў Кебіч. Кандыдат у прэзыдэнты Кебіч меў для барацьбы супраць Лукашэнкі дастаткова палітычных рэсурсаў. Але ў камандзе Кебіча ключавую ролю гралі асобы, якія насамрэч працавалі на карысьць іншага кандыдата — Лукашэнкі. Гэта былі «правая рука» Кебіча Міхаіл Мясьніковіч, а таксама Сяргей Лінг* і зьвязаныя зь імі асобы. Прадстаўнікі старой эліты, яны зрабілі кар'еру яшчэ ў савецкі час**.

Даверанныя асобы Кебіча пераканалі яго ў тым, што перамога на прэзыдэнцкіх выбарах яму забясьпечана. Аплочаныя камандай Кебіча сацыялягічныя апытаньні сьведчылі аб тым, што кандыдатуру прэм'ер-міністра падтрымліваюць каля 27% выбарцаў, бліжэйшага канкурэнта Лукашэнкі — каля 13%.

Фронт інфармацыйнай вайны з боку падкантрольных выканаўчай уладзе СМІ — тэлебачаньня, радыё, буйных нацыянальных газэтаў «Советская Белоруссия», «Звязда» — быў разгорнуты ня супраць найбольш небясьпечнага канкурэнта Лукашэнкі, а дэмакратаў, перш за ўсё супраць дэмакратычных кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта — Зянона Пазьняка, Станіслава Шушкевіча і Генадзя Карпенкі.

Вельмі рэдкія інфармацыйныя выпады супраць А. Лукашэнкі былі выкананыя, у адрозьненьне ад аналягічных акцыяў супраць дэмакратычных кандыдатаў, настолькі непрафэсійна, што гэта кідалася ў вочы. Нэгатыўны PR даў адмоўны эфэкт яго распрацоўшчыкам і рэалізатарам.

Так, напрыклад, 7 чэрвеня 1994 пракебічаўскі публіцыст Іван Антановіч у перадачы Беларускага радыё на падставе таго, што Лукашэнка быццам калісь выступіў на беларускай мове, абвінаваціў яго ў «нацыяналізьме»... Відавочна, што гэтая акцыя была арганізаваная для таго, каб перацягнуць на бок Лукашэнкі частку дэмакратычнага, збольшага беларускамоўнага электарату.

Асноўная энэргія самога Кебіча была накіравана пераважна на барацьбу супраць былога Старшыні Вярхоўнага Савету С. Шушкевіча***.

Да самага апошняга часу прэм'ер-міністар Вячаслаў Кебіч захоўваў ілюзіі сваёй лёгкай перамогі. 1 чэрвеня 1994 году, калі былі падлічаны подпісы, сабраныя ініцыятыўнымі групамі кандыдатаў, назіраўся такі расклад: прэм'ер-міністар Кебіч — 411 тысяч, лідэр БНФ Пазьняк — 217 тысяч, лідэр камуністычнай партыі Новікаў — 184 тысячы. Лукашэнка заставаўся ў цені, займаў у гэтым сьпісе толькі чацьвертае месца — 156 тысяч подпісаў.

* М. Мясьніковіч займаў пасаду першага намесьніка Старшыні Савету міністраў Кебіча, С.Лінг быў яго намесьнікам.

** М. Мясьніковіч — былы сакратар Менскага гаркаму КПБ, член ЦК КПБ, С. Лінг — былы сакратар ЦК КПБ.

*** У ходзе кампаніі супраць С. Шушкевіча Кебіч неаднаразова выкарыстоўваў паслухмяную сабе бальшыню дэпутатаў парлямэнту. Яшчэ задоўга да прэзыдэнцкіх выбараў каманда Кебіча паклапацілася аб стварэньні нэгатыўнага іміджу Шушкевіча. Вакол асобы Шушкевіча быў арганізаваны скандал, які скончыўся 27 студзеня яго адхіленьнем з пасады Старшыні Вярхоўнага Савету. За гэтую пастанову прагаласавала 209 з 345 дэпутатаў парлямэнту.

18 чэрвеня 1994 году ўсе нацыянальныя СМІ паведамілі, што на кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Лукашэнку адбыўся замах. Каля Лёзна, па дарозе зь Віцебску аўтамабіль*, у якім ехаў Лукашэнка, быў абстраляны. Гэта вельмі змабілізавала Лукашэнкаў электарат.

Вынікі першага туру прэзыдэнцкіх выбараў, якія адбыўся 24 чэрвеня, выявілі расклад палітычных сілаў у краіне. Заслона была паднятая: усім стала ясна, хто будзе першым беларускім прэзыдэнтам. Атрыманьне спадзяванага эфэкту ад «лёзьненскай сцэнкі» падштурхнула аўтараў праекту «прэзыдэнт Лукашэнка» на працяг гульні. Раніцай 28 чэрвеня, калі былі ўжо вядомыя вынікі першага туру прэзыдэнцкіх выбараў і кандыдат Лукашэнка ўжо разглядаўся ў іншай якасьці, была праведзена чарговая акцыя. У цэнтры Менску, у будынку Дома ўраду на Лукашэнку і яго давераных асобаў** быў учынены напад з боку супрацоўнікаў міліцыі, якія імкнуліся не дапусьціць Лукашэнку ў яго працоўны кабінэт. Як і павінна было быць па законе жанру, перамога засталася за Лукашэнкам і яго прыхільнікамі: яны «прабіліся» ў сваё службовае памяшканьне.

Гэтая падзея была адпаведным чынам асьветленая ў нацыянальных СМІ. Сам характар зьместу паведамленьняў быў ужо іншым: усе разумелі, што іх галоўны фігурант меней чым за два тыдні будзе выбраны на пасаду прэзыдэнта краіны. Прыцягваюць увагу драбніцы ў асьвятленьні гэтай падзеі: загад не дапусьціць Лукашэнку ў яго кабінэт быццам аддаў міністар унутраных справаў генэрал-маёр Уладзімер Данько; кіраваў дзеяньнямі міліцыянтаў афіцэр у ранзе палкоўніка; кандыдату ў прэзыдэнты Лукашэнку былі нанесены цялесныя пашкоджаньні (на фатаздымках на адзеньні Лукашэнкі былі бачныя крывавыя плямы).

Лукашэнка атрымаў магчымасьць, выкарыстоўваючы вялікую колькасьць СМІ, апавесьці на ўсю краіну пра прычыны здарэньня: карупцыянэры зь ліку кіраўнікоў праваахоўных структураў імкнуцца не дапусьціць яго прыходу да ўлады, таму што ведаюць, што будуць немінуча пакараныя за свае злачынствы перад народам.

Лёзьненскі «замах» і напад міліцыянтаў на Лукашэнку ў Доме ўраду адназначна сьведчаць аб тым, што ў праекце «прэзыдэнт Лукашэнка» прымалі ўдзел прадстаўнікі кіраўніцтва КДБ, МУС і Генэральнай пракуратуры альбо былі цесна зьвязаны з ініцыятарамі гэтага праекту***.

Здарэньне ў Доме ўраду адбылося, калі ўзыходжаньню Лукашэнкі да прэзыдэнцкага крэсла ніхто ўжо не замінаў: Кебіч, ашаломлены гэткай буйной і нечаканай паразай, відавочнай здрадай найбліжэйшага атачэньня, адмовіўся ад барацьбы. 8 ліпеня адбыўся другі тур прэзы-

---

* У адрозьненьне ад Шушкевіча, які ў часе перадвыбарнай кампаніі выкарыстоўваў для паездак старыя «жыгулі», і ад Пазьняка, які ўвогуле ня меў сталага транспартнага сродку, Лукашэнка меў у распараджэньні два новыя «мэрсэдэсы», набытыя старшынём парлямэнцкай камісіі па праблемах ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай катастрофы Іванам Ціцянковым (які неўзабаве атрымае пасаду кіраўніка ўпраўленьня справаў прэзыдэнта) за бюджэтныя грошы.

Выбарчая кампанія Лукашэнкі фінансавалася ня толькі праз Ціцянкова. Значныя сродкі траплялі ў яго выбарчы штаб у выніку фінансавых махінацый зь бюджэтнымі грашыма старшыні парлямэнцкай камісіі па аграрных пытаньнях Уладзімера Гаркуна і зьвязаных зь ім асобаў. У ліпені 1994 году У. Гаркун будзе прызначаны Лукашэнкам віцэ-прэм'ерам па пытаньнях сельскай гаспадаркі.

** Сярод іх былі дэпутаты ВС Леанід Сініцын (праз месяц — кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта), Віктар Кучынскі (уваходзіў у склад часовай камісіі па барацьбе з карупцыяй, у хуткім часе стане апаратчыкам найвышэйшага ўзроўню) і Іван Ціцянкоў.

*** Аб гэтым таксама сьведчыць і характар фінансаваньня выбарчай кампаніі Лукашэнкі. Выкарыстоўваньне бюджэтных сродкаў на гэтыя мэты было магчыма толькі з маўклівай згоды кіраўніцтва праваахоўных органаў.

дэнцкіх выбараў. Нечаканасьцяў не адбылося.12 ліпеня 1994 году ўрад Кебіча склаў зь сябе паўнамоцтвы.

Урад, сфармаваны Лукашэнкам, які існаваў на працягу 1994–1995 гадоў, атрымаў з боку апанэнтаў рэжыму вызначэньне: «урад «маладых ваўкоў». Але гэта вызначэньне ў дастатковай ступені памылковае, бо не бярэцца пад увагу некалькі вельмі паказальных прызначэньняў: віцэ-прэм'ерамі новага ўраду сталі Міхаіл Мясьніковіч і Сяргей Лінг. На працягу другой паловы 1994–1995 гадоў урад моцна зьмяніўся. Адзначым асноўныя, знакавыя кадравыя зьмены. У студзені 1994 году падаў у адстаўку з пасады віцэ-прэм'ера Віктар Ганчар, які неўзабаве стане дэмакратычным палітыкам. А ў красавіку 1995 году на пасаду кіраўніка ўпраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта быў прызначаны адыёзны палітработнік Уладзімер Замяталін.

Прыход Уладзімера Замяталіна адзначыў пачатак наступных зьменаў. Галоўны ідэоляг ураду Кебіча ўва ўрадзе Лукашэнкі атрымаў большую прастору для дзеяньняў. На месца прафэсійных мэнэджэраў ува ўладу хваля за хваляй сталі прыходзіць людзі, зьвязаныя з камуністычнай намэнклятурай.

Першыя прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі былі падобныя да добра пастаўленага спэктаклю. Тут было ўсё: барацьба дабра і зла, галоўны герой, інтрыга і, у рэшце рэшт, шчасьлівы канец — перамога дабра, увасобленага ў галоўным герою.

## ВЫБАРЫ ВЯРХОЎНАЙ РАДЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСІ І ПЕРШЫ ЛУКАШЭНКАЎ РЭФЭРЭНДУМ У 1995 Г.

Другія парлямэнцкія выбары ў Беларусі былі больш стратэгічна прадуманыя і арганізаваныя як уладай, так і яе апанэнтамі, у параўнаньні зь першымі. Зьмянілася структура палітычнай сыстэмы. У 1994 г. была створана пасада прэзыдэнта, адбыліся прэзыдэнцкія выбары, пачала складацца вэртыкаль выканаўчай улады. Афармлялася партыйная сыстэма. Зьявіліся зацікаўленыя ўва ўладзе. І менавіта гэтая зацікаўленасьць стала асноўным чыньнікам выбарчага працэсу.

### Сытуацыя напярэдадні выбараў

Канец 1994 — пачатак 1995 гг. для Беларусі — час працягу эканамічнага спаду, хаця, як лічылі экспэрты, "зьніжэньне ўзроўню жыцьця асноўнай масы насельніцтва ня мела катастрафічнага характару"[1].

Узровень спаду ВНП Беларусі на канец 1994 г. быў крыху меншы, чым у Расеі і Ўкраіны, якія таксама знаходзіліся ў крызысе. Але ў Беларусі крызыс адчуваўся больш востра ў параўнаньні з суседзямі. Гэта тлумачылася лепшым дакрызысным станам рэспублікі, якая ў савецкія часы была эканамічна пасьпяховым рэгіёнам Савецкага Саюзу. Пасьляваеннае аднаўленьне адбывалася праз міграцыю высокакваліфікаваных тэхнічных спэцыялістаў зь

[1] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 46.

іншых рэспублік і працоўных зь вёсак у больш пасьпяховыя ў пляне сацыяльнага разьвіцьця гарады. Вынікам росту сацыяльна-эканамічнага ўзроўню пасьля нягодаў вайны стала асаблівая сыстэма каштоўнасьцяў, у якой матэрыяльны дабрабыт быў больш важны за іншыя. Рэформы, якія не паляпшалі яго, нават калі пашыралі асабістую незалежнасьць, не маглі быць успрынятыя як пазытыўныя.

Нэгатыўнае стаўленьне беларусаў да пераменаў паглыбляліся знаходжаньнем краіны ў зоне расейскага інфармацыйнага ўплыву. 1994 г. — час найвялікшага спаду ў Расеі, які ствараў катастрафічны настрой і прагу вяртаньня да матэрыяльнага камфорту савецкіх часоў. Расейскі інфармацыйны ўплыў паглыбляў насьцярожаны настрой беларусаў чаканьнем далейшага пагаршэньня эканамічнай сытуацыі.

Палітычныя ўстановы краіны знаходзіліся ў стане першапачатковай інстытуцыялізацыі. Працэс фармаваньня ўлады ў незалежнай краіне пачаўся толькі ў 1994 г. (датуль выкарыстоўваліся інстытуты, сфармаваныя пры Савецкім Саюзе) з увядзеньнем пасады прэзыдэнта. Прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі адбыліся позна, у параўнаньні з Расеяй і Украінай, дзе прэзыдэнты былі абраныя адпаведна ў чэрвені і сьнежні 1991 г., падчас трансфармацыйнай эўфарыі. Да крызысу сярэдзіны 1990-х гг. палітычныя інстытуты ў гэтых краінах разьвіваліся, маючы фонам спачатку пасьляперабудоўны, а потым незалежніцкі грамадзкі ўздым. У выніку там склаліся пэўныя традыцыі ўзаемаадносінаў паміж галінамі ўлады. Неабходнасьць існаваньня кожнай зь іх у вачах грамадзянаў ужо не падлягала сумневу.

У Беларусі пара палітычнай інстытуцыялізацыі прыпала на эканамічны крызыс, адчуваньне якога не памякчалася незалежніцкай эўфарыяй. Беларускі парлямэнт не паклапаціўся аб тым, каб зьвярнуцца па падтрымку да грамадзянаў і легітымізаваць да крызысу сваё існаваньне ўва ўмовах незалежнай краіны, хаця ён мог гэта зрабіць ужо ў 1990 г.: гэта не супярэчыла закону, інтарэсам большасьці парлямэнтароў (менавіта функцыянэрскі — не зацікаўлены ў самастойным атрыманьні ўлады — склад парлямэнту, разгледжаны ў папярэднім артыкуле, быў прычынай тармажэньня інстытуцыялізацыі). Як высьветлілася пазьней, гэтая пасіўнасьць парлямэнту значна пашкодзіла інтарэсам беларускага парлямэнтарызму.

У выніку першыя парлямэнцкія выбары адбываліся ўва ўмовах: а) слабаінстытуцыялізаванай палітычнай сыстэмы; б) адсутнасьці сталых традыцый перадачы ўлады; в) эканамічнага крызысу. Для фармаваньня прэтарыянскага аўтарытарнага рэжыму не хапала адной умовы: адсутнічала вялікая сацыяльна-эканамічная палярызацыя.

Пасьля абраньня ў 1994 г. А. Лукашэнкі ў краіне пачаліся працэсы цэнтралізацыі ўлады, у выніку якіх рэгіянальныя ўстановы выканаўчай улады былі падпарадкаваныя прэзыдэнту, мінаючы прадстаўнічыя ўстановы ўсіх узроўняў. Сыстэма, сфармаваная дэ-факта, трымалася на асабістай волі яе стваральнікаў і ўдзельнікаў. Гэта ставіла яе ў залежнасьць ад дзейнасьці рэгіянальных элітаў. Няўстойлівы характар сыстэмы паглыбляўся захадамі Канстытуцыйнага суду, парлямэнту, якія аспрэчвалі яе адпаведнасьць праву. У створанай мадэлі выканаўчая ўлада магла існаваць толькі разам з паслухмяным парлямэнтам. Фармаваньне прадэмакратычнага, нацыянальна арыентаванага парлямэнту ці нават парлямэнту, які б уключаў публічна-рэзанансных дэпутатаў, павышала спакусу вэртыкалі здрадзіць прэзыдэнту. (Мы ня будзем у гэтым артыкуле разглядаць пытаньне аб тым, наколькі сьвядомай была стратэгія цэнтралізацыі ўлады, але прасочым агульную лёгіку дзеяньняў для выключэньня парлямэнту з барацьбы за ўплыў у грамадстве.)

Пераважную большасьць беларускага электарату складаюць працоўныя і сяляне. Менавіта

гэтыя групы ёсьць асноўныя носьбіты матэрыялістычнай сыстэмы каштоўнасьцяў. Згодна з апытаньнем НІСЭПД, да першапачатковых задачаў, якія павінен быў, на думку электарату, вырашыць прэзыдэнт, адносіліся праблемы матэрыяльныя (барацьба з павышэньнем цэнаў, інфляцыяй, беспрацоўем і да т. п.). Палітычныя пытаньні (забесьпячэньне свабоды слова, друку) стаялі ў рэйтынгу толькі на 8-м месцы[2].

Зразумела, што найбольш важныя аргумэнты ў змаганьні за ўплыў мусілі быць не палітычнага, а эканамічнага характару.

Вынікі парлямэнцкіх (1990 г.; гл. папярэдні артыкул) і прэзыдэнцкіх (1994 г.) выбараў паказалі спалучэньне традыцыйнага і пратэстнага матываў электаральных паводзінаў беларусаў. Дасьледнікі адзначалі, што на прэзыдэнцкіх выбарах галасаваньне адбывалася ня столькі за А. Лукашэнку, колькі супраць В. Кебіча.

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў адбылося паступовае паніжэньне рэйтынгу прэзыдэнта. Пік яго спаду прыпаў на канец 1994 г. Так, Андрэй Вардамацкі адзначаў, што за кастрычнік — сьнежань 1994 г. рэйтынг прэзыдэнта імкліва падаў (да 10 % штомесяц)[3].

Падобнае адбывалася і з рэйтынгамі (і без таго невялікімі) большасьці палітычных партыяў, акрамя адной. Згодна з вынікамі дасьледаваньня лябараторыі Давіда Ротмана, зь верасьня 1994 г. адбываўся павольны рост рэйтынгу БНФ з 10,6 % да 13,1 %[4].

У лістападзе 1994 г. лідэр БНФ З. Пазьняк паводле рэйтынгу ішоў пасьля прэзыдэнта і, у адрозьненьне ад першага, рэйтынг З. Пазьняка, таксама як БНФ, паціху рос. Нягледзячы на невялікія абсалютныя лічбы падтрымкі, лякалізацыя пратэстнага настрою ў найбольш неканвэнцыйна палітычна актыўным Менску стварала пагрозу дэстабілізацыі ўлады.

Магчымасьць выкарыстаньня пратэсту ў барацьбе за ўладу была прадэманстраваная яшчэ падчас прэзыдэнцкіх выбараў. Але на парлямэнцкіх сытуацыя была больш складаная.

1. Патэнцыйныя парлямэнтары адрозьніваліся адзін ад аднаго і паводле палітычных пазыцыяў (сярод іх былі і дэмакраты, і "нацыяналісты", і камуністы), і паводле сацыяльна-эканамічнага і палітычнага статусу (ад прадстаўнікоў дзяржаўнай эканамічнай эліты да палітыкаў новай хвалі). Гульня не магла адбывацца адразу супраць усіх.

2. Прэзыдэнцкія выбары паказалі існаваньне ў электаральных паводзінах беларускіх грамадзянаў фэномэну "нэгатыўнай адаптацыі" (павелічэньне ў друку колькасьці артыкулаў "за" ці "супраць" кандыдата выклікала рэакцыю адваротна прапарцыйную: так, павелічэньне колькасьці пазытыўных артыкулаў на карысьць В. Кебіча паніжала яго рэйтынг; гл.: СОЦИС. 1995. № 9). Для агітацыі трэба было выкарыстоўваць ускосныя сродкі, аптымальна стварыць расклад сілаў яшчэ да выбараў.

3. Не існавала партыі, якая б магла з посьпехам прадстаўляць інтарэсы выканаўчай улады.

4. Простая агітацыя супраць парлямэнту ці яго асобных кандыдатаў была неэфэктыўная, гэта шкодзіла іміджу выканаўчай улады.

Боку прэзыдэнта патрэбная была стратэгія, якая б дазволіла панізіць рэйтынг парлямэнту і шанцы абраньня актыўнай часткі кандыдатаў, але не крытыкаваць пэрсаналіі, што магло надаць значнасьць аб'ектам крытыкі.

Асноўным чыньнікам адзначанай вышэй зьмены рэйтынгаў і фактарам пратэстнага на-

[2] Belarus monitor. 1995. № 2. P. 55.

[3] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 27.

[4] Звязда. 1995. 17 траўня.

строю была эканамічная сытуацыя. Зразумела, што менавіта эканамічны пратэст быў сілай, якая магла накіраваць грамадзянаў у палітыку і на парлямэнцкіх выбарах. Кантроль над волевыяўленьнем на выбарах атрымліваў той, хто здолеў бы надаць эканамічнаму пратэсту палітычны сэнс ці кантраляваць і накіроўваць пратэстны рух, захоўваючы дыстанцыю.

Для палітычных партыяў гэтая задача была відавочна не пад сілу. Адсутнасьць скаардынаванай пазыцыі, досьведу барацьбы за ўладу не давалі шанцаў аналітычна разгледзець сытуацыю.

Абсалютныя лікі рэйтынгаў партыяў заставаліся невялікімі, іх зрух ня значыў рэальнага павелічэньня ўплыву, але ён паказваў патэнцыйны кірунак пратэсту. На першым месцы сярод тых, хто мог атрымаць уплыў на накіраваньне пратэстных настрояў, стаяў БНФ. Аднак невялікі рэйтынг казаў, што атрымаць вынік можна толькі праз аб'яднаньне з мацнейшай сілай, якая б карысталася даверам выбарнікаў, але ня мела палітычных амбіцыяў. У прамыслова-аграрнай краіне значны ўплыў на пазыцыі грамадзянаў мелі прафсаюзы. Наяўнасьць сувязяў паміж БНФ і шэрагам прафсаюзаў праявілася яшчэ падчас выступаў 1991 г. Гэта рабіла значна больш небясьпечным для боку прэзыдэнта нават невялікае павышэньне рэйтынгу БНФ.

Каб захаваць уплыў, выканаўчая ўлада вымушаная была першай прыцягнуць увагу да эканомікі, але зрабіць гэта захаваўшы дыстанцыю, каб не зьвярнуць на сябе народны гнеў.

Найбольшыя шанцы на накіраваньне пратэсту з захаваньнем дыстанцыі меў абраны ў 1994 г. прэзыдэнт. Вялікі рэйтынг, нелягічны эмацыйна-папулісцкі стыль паводзінаў дазволілі яму адначасова заставацца ўва ўладзе і крытыкаваць яе — фактычна накіроўваць пратэст, застаючыся ў масавай сьвядомасьці на дыстанцыі ад палітычных сілаў і нават ад падкантрольнага яму ўраду.

Для стварэньня дыстанцыі выкарыстоўваліся папулісцкія лёзунгі "Я ня зь левымі, я ня з правымі — я з народам" (падчас выбарчай кампаніі), дзеяньні, якія павінны былі падкрэсьліць, што прэзыдэнт і ўрад — гэта не адзінае цэлае і першы не адказвае за дзейнасьць другога. Ад'езды зь "вяртаньнем цэнаў" пасьля прыезду, "чысткі" чыноўнікаў, стварэньне кантрольных супрацькарупцыйных установаў і г. д. — усе гэта стварала ў масавай сьвядомасьці разрыў паміж іміджам прэзыдэнта і дзеяньнямі яго ўраду. Гэта адлюстравалася, напрыклад, у палітычных мітах пра дрэнных чыноўнікаў, якія перашкаджаюць добраму прэзыдэнту. Так, на пачатку 1995 г. існаваў вялікі разрыў рэйтынгаў даверу прэзыдэнту і яго ўраду. Сумарны рэйтынг даверу прэзыдэнту складаў 63,4 %, ураду — 39,9 %[5].

Найменшы рэйтынг з усіх палітычных сілаў меў парлямэнт — 23,7 %.

У выніку такога "падзяленьня" адказнасьці за эканамічную неэфэктыўнасьць нават у выпадку далейшага пагаршэньня эканамічнага становішча зьяўлялася магчымасьць выкарыстоўваць эканамічныя праблемы для барацьбы за захаваньне ўлады.

Тыповым прыкладам падзяленьня адказнасьці была заява А. Лукашэнкі на сустрэчы з прафсаюзным актывам ФПБ, дзе ён падкрэсьліў супярэчнасьці з урадам, які ажыцьцяўляе рэформы больш хуткімі тэмпамі, чым прэзыдэнт, які прымае "нярынкавыя рашэньні" накшталт забароны на звальненьні ў сувязі з скарачэньнямі. Прамова рабілася ў прысутнасьці чальцоў ураду (Гаркун, Ганчар, Кокараў, Кузьняцоў)[6].

Мінімальны заробак у гэты пэрыяд складаў 25 % ад спажывецкага мінімуму. Вынікам

[5] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 27.

[6] Звязда. 1994. 24 лістапада.

пагаршэньня эканамічнага становішча сталі шматлікія мітынгі і страйкі. Хваля страйкаў прайшла па беларускіх прадпрыемствах пры канцы 1994 — пачатку 1995 гг., адбыўся шэраг агульнанацыянальных мітынгаў прафсаюзаў. 24 і 27 студзеня 1995 г. адбыліся шматтысячныя мітынгі ў абласных цэнтрах і шэрагу райцэнтраў. Асноўнае патрабаваньне да ўраду — павысіць зарплату. У выпадку невыкананьня патрабаваньняў — пагроза абвясьціць агульнарэспубліканскі страйк. Мэта — прыцягнуць увагу прэзыдэнта.

Першую спробу дамовіцца з прафсаюзамі ўлады зрабілі яшчэ пры канцы 1994 г. 23 лістапада 1994 г. на сустрэчы з кіраўніцтвам ФПБ А. Лукашэнка, з аднаго боку, зрабіў крок насустрач, прапанаваў найбольш "каштоўнае" — далучыцца да барацьбы з карупцыяй праз установы працоўнага кантролю, у ажыцьцяўленьні якога паабяцаў дапамогу абласных УУС і КДБ. Але, з другога боку, за гэтым ішло папярэджаньне, што "любы прафсаюз, які ставіць палітычныя мэты, атрымае адпаведную ацэнку з боку прэзыдэнта". Асабліва эфэктна гэтае папярэджаньне гучала на фоне паведамленьня пра пачатак карупцыйных справаў на "Белшыне", "Бабруйскдрэве", "Гарызонце".

Пачатак 1995 г. адзначыўся перадвыбуховым станам на прадпрыемствах. Але выбуховасьць масаў неяк "не трапляла" на пік палітычных падзеяў. Страйкавыя выбухі адбываліся ці напярэдадні, ці пасьля таго часу, калі б яны маглі мецъ палітычныя наступствы.

Перад парлямэнцкімі выбарамі, з 27 студзеня па 4 сакавіка, адбылося маштабнае павышэньне цэнаў на тавары і паслугі першай неабходнасьці. Ува ўмовах крызысу гэты факт ня быў дзіўным. Больш прыцягвае ўвагу тэрмін і пасьлядоўнасьць інфармацыйнага суправаджэньня гэтых падзеяў. Паведамленьняў у СМІ было амаль столькі ж, колькі і саміх павышэньняў цэнаў (паводле матэрыялаў газэты "Звязда").

Пасьля прафсаюзнага мітынгу 24 студзеня 25 студзеня даражэе мяса. Эканамічную мэтазгоднасьць падаражаньня гэтага прадукту можна паставіць пад сумнеў, таму што закупныя цэны на мяса павінны былі падняцца толькі ў лютым[7].

Рост цэнаў меў палітычны сэнс. Пры канцы сакавіка ў Мазырскім і Калінкавіцкім раёнах на сьметніках знаходзяць 3 т мяса, віну сьпісваюць на бізнэсмэнаў[8].

28 студзеня — паведамленьне пра тое, што плянуецца павышэньне цэнаў на асноўныя прадукты і паслугі. З 1 лютага камунальныя паслугі даражэюць утрая. 2 лютага — паведамленьне, што "цэны яшчэ не паднятыя". З 3 лютага праезд у транспарце расьце ўтрая. 7 лютага хлебабулачныя вырабы даражэюць на 10 %, абвяшчаецца, што стоадсоткавую аплату грамадзянамі камунальных паслуг плянавалася ўвесьці яшчэ 1 студзеня. 22 лютага праезд даражэе ў 1,6 разу. 25 лютага цэны на птушку і яйкі зьніжаюцца на 10 % (паводле сьведчаньняў карэспандэнта — з прычыны перапоўненасьці складоў). 1 сакавіка плянуецца павышэньне цаны на гарэлку на 20 %, 4 сакавіка яна павышаецца. Таксама ў сакавіку ўрад скасоўвае выплату прэміяў да акладаў работнікаў бюджэтнай сфэры[9].

*1 сакавіка пачынаецца рэгістрацыя перадвыбарных блёкаў, 11 сакавіка пачынаецца збор подпісаў за вылучэньне кандыдатаў.*

Улічваючы, што, згодна з дамовай паміж урадам і прафсаюзамі, павышэньне зарплаты ўдвая чакалася толькі 31 сакавіка 1995 г., павышэньне цэнаў стала падзеяй, значна больш

[7] Звязда. 1995. 28 студзеня.

[8] Звязда. 1995. 29 сакавіка.

[9] Звязда. 1995. 4 красавіка.

важнай за выбары. Даходы насельніцтва, зьвязаныя з памерам "мінімалкі", складалі 90,1 % у структуры грашовых даходаў[10]. Доля зарплаты ў гэтым ліку была 45,4 %, але пэнсіі, стыпэндыі, даходы калгасьнікаў таксама былі завязаныя на гэты лік. Сацыяльна-эканамічны крызыс выкарыстоўваўся для выкліку азлабленьня і актывізацыі пратэстнага настрою.

Створаны пратэстны настрой заставалася толькі накіраваць у правільны бок, зразумела, растлумачыўшы прычыны крызысу. Тыповай для выканаўчай улады, неаднаразова публічна агучанай, была лёгіка, прапанаваная намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Аляксандрам Сазонавым: прычына цяжкага эканамічнага становішча Беларусі — падпісаньне белавескіх пагадненьняў. "Менавіта з гэтага пэрыяду трэба весьці адлік стану эканомікі… якi назвалі крызысам". Белавескія пагадненьні былі падпісаныя з згоды ВР і ініцыятывы дэмакратычных сілаў. Таму, чытай, менавіта яны вінаватыя ў крызысе, які пачаўся ў Беларусі, хоць і "значна пазьней", чым у іншых краінах, таму што да гэтага часу "рэспубліка была разьвітай і высокатэхналягічнай". А цяпер сілы, якія выклікалі крызыс, імкнуцца яго паглыбіць і, значыцца, яшчэ больш пагоршыць эканамічныя ўмовы, "перарэзаць пупавіну, якая зьвязвае Беларусь у эканамічным зьвязе з Расеяй"[11].

У гэтай заяве зьвязаныя ў супольны вузел "найлепшыя" ўяўленьні беларусаў пра сябе як нацыю (інтэлігентная тэхналягічная нацыя), зразумелае тлумачэньне цяжкага становішча (разарваныя палітычныя сувязі пашкодзілі сувязям эканамічным, пра цяжкі эканамічны стан у самой Расеі ня ўзгадвалася), пошук вінаватых (ВР і дэмакратычная апазыцыя) і шлях выйсьця (збліжэньне з Расеяй).

Падобныя матэрыялы друкаваліся ў розных газэтах. Напрыклад, у "Советской Белоруссии" А. Сазонаў адзначаў, што апазыцыя, атрымаўшы ўладу на хвалі эканамічных цяжкасьцяў, распачне рэформы. Намесьнік міністра ўнутраных справаў Сяргей Рухлядзеў адзначаў, што "ня выключана" магчымасьць балятаваньня ў парлямэнт прадстаўнікоў шэрагу прадпрымальніцкіх структураў, якія ажыцьцявілі шэраг "каскадных апэрацыяў па абнаяўліваньні грошай"[12]. Такім чынам усталёўвалася сэнсавая сувязь выбары — эканамічны крызыс — крымінал.

У гэтых умовах імкненьне парлямэнту пашырыць паўнамоцтвы і працягнуць тэрмін дзейнасьці, у чым прэзыдэнт абвінавачваў дэпутатаў з шырокай дыскусіяй наконт гэтых пытаньняў у СМІ (як дзяржаўных, так і недзяржаўных), магло выглядаць толькі як пацьвярджэньне вінаватасьці дэмакратаў і прадстаўнічай улады. Гэта накіроўвала грамадзкую сьвядомасьць супраць парлямэнту.

Сумненьне ў мэтазгоднасьці існаваньня парлямэнту выказвалася і ў афіцыйных СМІ, якія цытавалі адпаведныя лісты ад грамадзянаў.

У выніку напярэдадні выбараў парлямэнту 13-га скліканьня ВР стала дзяржаўнай установай, працай якой грамадзяне былі задаволеныя значна менш за астатнія дзяржаўныя ўстановы. Так, паводле вынікаў дасьледаваньня НІСЭПД, у сакавіку як нездавальняючую ці дрэнную працу Вярхоўнай Рады адзначылі 67,6 % апытаных, працу Кабінэту міністраў — 63,9 %, прэзыдэнта — 40 %. Пры гэтым 56 % лічылі, што паўнамоцтвы ВР трэба абмежаваць (падобнай пазыцыі што да ўраду прытрымліваліся 34 %, да прэзыдэнта — 23 %). Такі пункт погляду быў шырока адлюстраваны ў СМІ[13].

[10] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 14.

[11] Звязда. 1995. 28 лютага.

[12] Советская Белоруссия. 1995. 10 марта.

[13] Звязда. 1995. 31 сакавіка; Белорусская деловая газета. 1995. 30 марта і інш.

Гэта сьведчыць пра выніковасьць дзеяньняў для трансфармацыі эканамічнай незадаволенасьці ў незадаволенасьць парлямэнтам. Такім чынам, "нацыяналістычныя" сілы абмяжоўваліся ў магчымасьцях прываблiваньня электарату. Сам факт мэтазгоднасьці іх існаваньня ў палітыцы быў пастаўлены пад сумненьне.

Палітычную афарбоўку эканамічным патрабаваньням маглі надаць прафсаюзы. Іх супольны рэйтынг ня быў вялікі, але іх публічныя акцыі прыцягвалі ўвагу. Аднак прафсаюзныя выступы на чале з ФПБ мелі пераважна эканамічны характар. Працоўныя былі ў ролі просьбітаў да ўраду. А напярэдадні выбараў, у сакавіку — красавіку, актыўнасьць прафсаюзаў, якія ў канцы 1994 — пачатку 1995 гг. правялі шэраг скаардынаваных мітынгаў па ўсёй краіне, згасла. Партыйныя дзеячы камэнтавалі дзеяньні прафсаюзаў на пачатку году як спробу "выпусьціць пару з катла"[14].

І сапраўды, падчас выбараў акцыі прафсаюзаў адбываліся пераважна на пэрыфэрыі (20 красавіка 1995 г. — у Горадні на ПА "Хваля") ці арганізоўваліся асобнымі галіновымі прафсаюзамі (напрыклад прафсаюзам работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня)[15].

Вэрсія выпусканьня пары пацьвярджаецца і тым, што наступная пасьля зімы актывізацыя прафсаюзнай дзейнасьці адбылася толькі ў сярэдзіне лета, акурат паміж першым і другім турам выбараў. Такая позьняя што да першага і раньняя што да другога туру выбараў актывізацыя яшчэ больш дзіўная, калі ўлічваць, што яна адбылася летам, падчас працоўных адпачынкаў, а ў чэрвені высьветлілася, што зарплата на шэрагу прадпрыемстваў не выплачвалася 2–4 месяцы, г. зн. зь лютага — сакавіка (акурат пасьля дэкларацыі яе павышэньня)[16].

Такім чынам, ускосна, не пераходзячы да пэрсаналіяў, агітацыя супраць ідэі парлямэнтарызму і незалежнасьці была праведзеная яшчэ да пачатку кампаніі.

## Заканадаўчая база выбараў

Выбары праводзіліся паводле закону аб выбарах, прынятага ў лістападзе 1994 г. Дасьледнікі адзначаюць генэтычную і сэнсавую сувязь гэтага закону з законам аб выбарах, паводле якога абіраліся дэпутаты ВР БССР у 1990 г.: "гэта той самы закон"[17], хоць і зь некаторымі зьменамі. Але гэтыя зьмены толькі падкрэсьліваюць наяўнасьць сувязі.

Аналіз юрыдычных асаблівасьцяў гэтага нарматыўнага акту быў дастаткова падрабязна разгледжаны раней. Зьвернем увагу на яго палітычныя наступствы.

Згодна з законам, вылучэньне кандыдатаў пачыналася за 65 дзён да выбараў, калі яны павінны былі заявіць у Цэнтравыбаркам пра свой намер удзелу ў выбарах. Падпісныя лісты падаваліся ў выбарчую камісію за 40 дзён да выбараў. Вылучэньне кандыдатаў маглі ажыцьцяўляць як палітычныя партыі, так і працоўныя калектывы і інш.

Параўнальны аналіз выбарчага заканадаўства постсавецкіх краінаў паказвае, што беларускі закон быў самым канкрэтызаваным што да кола суб'ектаў вылучэньня кандыдатаў. Фактычна іх падрабязнае пералічэньне вызначала сацыяльныя арганізацыі (напрыклад, вэтэ-

[14] Белорусская деловая газета. 1995. 30 января.

[15] Звязда. 1995. 22 лютага.

[16] Звязда. 1995. 13 ліпеня.

[17] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 30.

ранскія арганізацыі, арганізацыі інвалідаў і да т. п.), праз якія выканаўчая ўлада, нават у выніку перамогі шэрагу прадстаўнікоў ад партыяў, магла б захоўваць кантроль над парлямэнтам і ўплыў на палітычны працэс. Што да партыяў, то вылучаць кандыдатаў маглі толькі тыя, што мелі першасныя арганізацыі ў акрузе. Мэта гэтага заходу была ў аслабленьні партыйных кандыдатаў. Аднак гэта ўскладняла, але не перакрывала партыям шлях у парлямэнт, вымушаючы ствараць фіктыўныя структуры на месцах.

Працоўныя калектывы мелі прыярытэтнае, у параўнаньні з палітычнымі партыямі, становішча. Для вылучэньня кандыдата ад працоўнага калектыву было дастаткова сабраць сход у 300 чалавек, у той час як кандыдаты, якія вылучаліся шляхам збору подпісаў, павінны былі падаць ня менш за 500 подпісаў. Фактычна гэтыя захады стваралі спакусу выкарыстаць, таксама як і ў 1990 г., статусныя рэсурсы, але ўжо на этапе вылучэньня.

Дазволена было вылучаць кандыдатаў выбарчым блёкам. Тэрмін рэгістрацыі блёкаў пачынаўся раней за тэрмін вылучэньня ад партыяў. Партыйная сыстэма Беларусі знаходзілася ў стане станаўленьня. Партыі былі ня толькі невялікімі паводле памераў, але і вельмі аморфнымі паводле структуры, мелі ў сваім складзе канкурэнтных лідэраў. Магчымасьць блякавацца ня столькі пашырыла пэрспэктывы партыяў што да вылучэньня, колькі стала прычынай разьмежаваньняў у партыях напярэдадні вылучэньня кандыдатаў. Права блякавацца зрабіла партыі не буйнымі, а дробнымі.

Найбольшы рэзананс падчас выбараў атрымалі праўныя нормы, якія рэглямэнтавалі фінансаваньне кандыдатаў. Аналітык Міхаіл Чудакоў разглядае арт. 12 як супрацьдэмакратычую навэлу ў законе аб выбарах. Менавіта гэты артыкул стаў прыступкай да ўказу прэзыдэнта № 124, які фактычна пазбаўляў дэпутатаў магчымасьці легальнай агітацыі. У артыкуле адзначалася, што выдаткі, зьвязаныя з падрыхтоўкай і правядзеньнем выбараў дэпутатаў ВР, фінансуюцца толькі зь дзяржаўных бюджэтных сродкаў. Палітычным партыям, грамадзкім арганізацыям, замежным грамадзянам і арганізацыям забаранялася браць удзел у фінансаваньні і аказаньні іншай матэрыяльнай дапамогі выбарчай кампаніі. Сродкі на выбарчую кампанію павінны былі падзяляцца роўна паміж усімі кандыдатамі ў дэпутаты. Гэтая норма была разьвіта далей указам прэзыдэнта № 124 "Аб забесьпячэньні роўных магчымасьцяў грамадзянаў пры падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў дэпутатаў ВР РБ" ад 30 сакавіка 1995 г.

Указ меў некалькі наступстваў. Закладзеная сума 600 000 беларускіх рублёў адпавядала на той момант $ 50. Вядома, на яе немагчыма было нават надрукаваць дастатковую колькасьць улётак. Кандыдаты вымушаныя былі нелегальна выкарыстоўваць асабістыя сродкі. Так, напрыклад, можна было на вызначаную суму замовіць у друкарні ўлёткі, а дадатковую колькасьць раздрукаваць на ксэраксе, што было марудней і даражэй. (Гэта пацьвярджае факт зьяўленьня ўлётак без выходных зьвестак, які адзначаў у сваім артыкуле А. Касьцень[18].) Пракантраляваць агульную колькасьць улётак было немагчыма. Але скарыстацца з такога шляху маглі толькі кандыдаты, якія мелі адпаведныя матэрыяльныя сродкі ці службовае становішча. Такім чынам, як і падчас выбараў 1990 г., асноўным рэсурсам станавіўся сацыяльны статус. Прадстаўнікі ўладнай эліты зноў атрымлівалі выбарчую фору ў параўнаньні з астатнімі кандыдатамі.

Яшчэ большы разрыў паміж кандыдатамі стварала тая частка ўказу, якая датычыла выкарыстаньня СМІ. Магчымасьці ціску на кіраўніцтва мясцовых СМІ былі значна большыя з боку эліты, а супрацьдзейнічаць распараджэньням мясцовых уладаў было фактычна немагчыма,

[18] Звязда. 1995. 18 траўня.

таму што ад іх залежала фінансаваньне СМІ. Выкананьне гэтай нормы адсочвалася значна больш за фінансавыя.

Абмяжоўваліся магчымасьці сустрэчаў кандыдатаў з працоўнымі калектывамі, іх забаранялася праводзіць у працоўны час. Фактычна гэта разумелася як забарона сустрэчаў. Але магчымасьці камунікацыі захоўваліся за кандыдатамі — прадстаўнікамі кіраўнічай эліты.

Фактычна ўказ ствараў умовы інфармацыйнага вакууму, які дапаўняў захады для фармаваньня нэгатыўнага іміджу парлямэнту.

## Роля выканаўчай улады ў выбарчым працэсе

Кампанія выбараў прэзыдэнта 1994 г. вялася папулісцкімі мэтадамі. Стаўка на пратэстны электарат, імкненьне дыстанцыявацца ад усіх палітычных сілаў стала прычынай "разнамаснасьці" электарату А. Лукашэнкі. Такія выбарнікі маглі прывесьці да ўлады аднаго, але пазбаўлялі магчымасьці сфармаваць партыю ўлады, якая ўзяла б удзел у выбарах, стварыла б парлямэнцкую бальшыню і ў межах закону праводзіла палітыку прэзыдэнта. Гэтую рысу адзначыў нават адзін з паплечнікаў прэзыдэнта С. Посахаў (які, як вядома, быў адным з ініцыятараў спробы стварэньня інстытуцыялізаванай падтрымкі А. Лукашэнку, заснаваўшы ў Горадні грамадзкае аб'яднаньне "Ачышчэньне"): "З прыхільнікаў прэзыдэнта стварыць нейкае падабенства партыі немагчыма"[19].

Ролю партыі ўлады павінна была выканаць прэзыдэнцкая вэртыкаль (маюцца на ўвазе ня толькі рэгіянальныя функцыянэры, але наогул прадстаўнікі гіерархічна падпарадкаванай прэзыдэнту выканаўчай улады), чые прадстаўнікі ня толькі маглі ўзяць удзел у выбарах, але і явачным парадкам кантраляваць сытуацыю на месцах падчас выбарчай кампаніі.

Аляксандар Сазонаў адзначаў, што спачатку прэзыдэнт "вельмі адмоўна ставіўся" і не падтрымліваў вылучэньне ў кандыдаты вэртыкальнікаў, але потым "скарэктаваў свае падыходы… і пачаў ставіцца прыхільна"[20]. Гэта значыць, што першапачаткова вэртыкаль разглядалася толькі як выканаўча-распараджальны мэханізм. Выкарыстаньне дзяржаўных функцыянэраў у якасьці інструмэнту падчас выбараў было вымушаным захадам, выкліканым актывізацыяй супрацьстаяньня парлямэнту, Канстытуцыйнага суду і прэзыдэнта.

На гэта былі і іншыя падставы. Фармаваньне ўраду, стварэньне мясцовых выканаўчых установаў пазбавілі парлямэнт шэрагу актыўных дэпутатаў, патэнцыйных кандыдатаў у ВР наступнага скліканьня. Большасьць з тых, хто атрымаў урадавыя пасады, былі рэгіяналы, г. зн. ратацыя аслабіла магчымасьці і, галоўнае, матывацыю і без таго слабаарганізаваных прадстаўнікоў мясцовых элітаў, што мелі досьвед палітычнай дзейнасьці, на змаганьне за ўладу на наступных парлямэнцкіх выбарах. Большасьць прызначаных кіраўнікоў выканкамаў прадстаўлялі рэгіянальныя гаспадарчыя і адміністрацыйныя колы, што таксама не павышала іх амбіцыі змагацца за свае інтарэсы на выбарах. Так, абласнымі кіраўнікамі былі прызначаныя добра вядомыя ў рэгіёнах Заламай, Дубко, Пётух.

Выкарыстаньне функцыянэраў у якасьці кандыдатаў дазваляла вырашыць адразу некалькі стратэгічных задачаў.

---

[19] Белорусская деловая газета. 1995. 23 января.

[20] Звязда. 1995. 15 красавіка.

1. Далучэньне прадстаўнікоў выканаўчай улады да парлямэнцкай барацьбы паніжала шанцы перамогі дэмакратычных сілаў.

2. Ува ўмовах нэгатывізму што да дэмакратаў і да парлямэнту іх удзел, які мог суправаджацца выкарыстаньнем адміністрацыйнага рэсурсу, дазваляў з большай імавернасьцю абраць парлямэнцкі кворум. Захады накшталт зьніжэньня парогу яўкі да 25 % ці бесьперапыннай дэманстрацыі на працягу дня падчас другога туру выбараў мастацкіх фільмаў у тэлевізіі паніжалі яўку сярод тых, хто жадаў узяць удзел у галасаваньні. У вясковай жа мясцовасьці, пры цяжкім эканамічным становішчы, паразуменьне паміж кандыдатам і мясцовым кіраўніцтвам вымушала выбарнікаў галасаваць "правільна". Большасьць дэпутатаў былі абраныя менавіта ў такіх акругах.

Дагэтуль ніводная краіна СНД не скасавала парлямэнтаў, хоць шмат дзе і надала ім дэкаратыўную ролю. Адсутнасьць парлямэнту не зразумелі б ні на Ўсходзе, ні, тым больш, на Захадзе, сувязі зь якім яшчэ не былі разарваныя. Нягледзячы на шматлікія пагрозы што да ВР, скасаваньне парлямэнту не было выгадна выканаўчай уладзе. Гэта пераклала б адказнасьць за магчымыя эканамічныя няўдачы краіны асабіста на прэзыдэнта, што магло быць небясьпечна пры эканамічным крызысе. Парлямэнт трэба было абраць, каб ён легітымізаваў потым канцэнтрацыю ўлады прэзыдэнтам (але лепш як мага больш слабы і ня зь першай спробы). Іншыя сцэнары выглядалі б на яўную дыктатуру.

Сумненьне А. Лукашэнкі ў сваёй здольнасьці рэалізаваць дыктатарскі варыянт праявілася, напрыклад, у асьцярожнай камунікацыі напярэдадні выбараў зь сілавымі структурамі. 17 лютага прэзыдэнт упершыню пасьля свайго абраньня наведаў вайсковую частку (пухавіцкі спэцназ, які, дарэчы, пазьней стаў граць значную ролю ў сыстэме структураў бясьпекі), дзе раздаваў кампліменты наконт значнасьці арміі[21]. 30 студзеня прэзыдэнт узяў удзел у пашыранай калегіі МУС, дзе таксама выступаў з заахвочвальнымі прапановамі[22] (у МУС яшчэ моцнай была папулярнасьць Ю. Захаранкі). Толькі ў сакавіку зьявілася інфармацыя пра пляны рэарганізацыі сілаў бясьпекі[23]. Такім чынам, прэзыдэнт мог разьлічваць на адданасьць сілавікоў не раней за тэрмін пачатку другога туру выбараў.

3. Функцыянэры вэртыкалі, праведзеныя праз патэнцыйна слабы парлямэнт ці неабраныя ў першым крузе (палітыка да выбараў была накіраваная на стварэньне ўмоваў для пратэстнага галасаваньня, якое, як вядома, ажыцьцяўляецца ня толькі рукамі, але і нагамі), пазбаўляліся асабістых палітычных амбіцыяў, пацьвярджалі сваю вернасьць новаму патрону. А асабістыя амбіцыі вэртыкальнікаў маглі пашкодзіць цэнтралізацыі ўлады ня менш за моцны парлямэнт. Так, цяжка ўявіць, напрыклад, што А. Дубко, які быў у савецкай сыстэме на пазыцыі патрона, будзе бездакорна падпарадкоўвацца свайму былому кліенту А. Лукашэнку. У гэтых умовах вылучэньне функцыянэраў выканаўчай улады было заканамерна і непазьбежна.

## Падрыхтоўка да рэфэрэндуму

Падчас парлямэнцкіх выбараў 1995 г. быў праведзены агульнарэспубліканскі рэфэрэндум, вынікі якога павінны былі замацаваць той расклад палітычных сілаў, які ўжо меў месца.

[21] Белорусская деловая газета. 1995. 20 февраля.

[22] Белорусская деловая газета. 1995. 2 февраля.

[23] Белорусская деловая газета. 1995. 9 марта.

Асаблівасьці пастаноўкі пытаньняў паказваюць, што рэфэрэндум мог ня толькі замацаваць уладу, але і быў сродкам узьдзеяньня на вынікі парлямэнцкіх выбараў.

Упершыню ідэя рэфэрэндуму была выказаная А. Лукашэнкам у размове з Іванам Рыбкіным на пачатку лютага 1995 г.[24] Але размовы пра магчымасьці такога ходу вяліся і дагэтуль. Падставы для яго правядзеньня мелі як унутры-, так і вонкавапалітычны характар.

Нэгатыўнае стаўленьне міжнароднай супольнасьці да канцэнтрацыі ўлады ў краіне вымушала шукаць нейкія сродкі легітымацыі ўжытых захадаў. Пачатак усталяваньня сувязяў з расейскімі рэгіёнамі ствараў хоць і далёкую, але надзею ўзмацненьня становішча, аднак толькі пры наяўнасьці стабільнай улады ў краіне. Праўда, нават “паслухмяны” парлямэнт мог прымаць небясьпечныя нормы: у другім чытаньні прайшоў закон аб прэзыдэнту, які замацоўваў працэдуру выказваньня недаверу прэзыдэнту праз рэфэрэндум і ўключаў сьпікера ў склад Рады бясьпекі. Адбыліся падзеі, якія паказалі небясьпечнасьць існаваньня незалежных дэпутатаў. Пры канцы 1994 г. быў агучаны даклад Сяргея Антончыка, які, нягледзячы на белыя плямы ў газэтах, меў шырокі рэзананс. Сышоў з прэзыдэнцкай каманды В. Ганчар, які заявіў аб наяўнасьці новай інфармацыі пра фінансаваньне прэзыдэнцкай кампаніі[25]. Рэйтынг прэзыдэнта хоць і быў высокім адносна іншых палітычных сілаў, але паступова зьніжаўся пры канцы 1994 г.

Фармаваньне вэртыкалі ўлады было амаль завершана — кантроль на месцах дэ-факта існаваў. Але адпаведнасьць гэтага кантролю закону аспрэчвалася Канстытуцыйным судом. Эфэктыўная сыстэма падпарадкаваньня не адпавядала заканадаўству і трымалася толькі на асабістай волі тых, хто яе стварыў (А. Лукашэнкі і каманды), і тых, хто ў яе ўваходзіў. Апошняе надавала кантролю над вэртыкальлю элемэнт няўстойлівасьці.

*Такім чынам, рэфэрэндум 1995 г. быў патрэбны як сродак легалізацыі сыстэмы ўлады, усталяванай дэ-факта, празь яе легітымацыю.* Але прапанова ўлады электарату ацаніць ужо праведзеныя перамены была б сьмешнай, рызыкоўнай і стратэгічна нявыгаднай. Лепш было легітымізаваць і легалізаваць ня толькі мінулыя, але і наступныя захады ўлады.

18 сакавіка група дэпутатаў зьвярнулася да прэзыдэнта з просьбай правесьці рэфэрэндум. 20 сакавіка ў сваім выступе перад парлямэнтарамі А. Лукашэнка прапанаваў парлямэнту разысьціся, а таксама абвясьціў прапанову правесьці рэфэрэндум. І пасьля шэрагу вядомых скандальных падзеяў з галадоўкай дэпутатаў, выдаленьнем іх з парлямэнту сілай і наступнага пасяджэньня парлямэнту ўва ўцятым складзе, 20 красавіка рэфэрэндум быў абвешчаны. Выніковасьць гэтага захаду гарантавалася асаблівасьцю складу парлямэнту, разгледжанай у папярэднім артыкуле. Нарэшце ВР займела праблемы зь фінансамі. Валютны рахунак ВР быў заблякаваны[26].

Дэпутаты думалі пра сваё “працаўладкаваньне” (50 зь іх зьвярнуліся да кіраўнікоў выканкамаў па дапамогу падчас выбараў).

Рэфэрэндум быў прызначаны на 14 траўня, дзень выбараў ВР.

На прапанову прэзыдэнта на рэфэрэндум выносілася 4 пытаньні: 1. Аб наданьні статусу дзяржаўнай расейскай мове. 2. Аб зьмене дзяржаўных сымбаляў. 3. Аб эканамічнай інтэграцыі з Расеяй. 4. Аб надзяленьні прэзыдэнта правам датэрміновага роспуску парлямэнту.

---

[24] Звязда. 1995. 9 лютага.

[25] Звязда. 1994. 12 сьнежня.

[26] Белорусская деловая газета. 1995. 20 марта.

Пытаньні мелі важнасьць як сродак атрыманьня санкцыі на працяг канцэнтрацыі ўлады і як сродак уплыву на вынікі выбараў. Асноўным зь іх было пытаньне № 4. Менавіта яно легітымізавала вынікі такой дзейнасьці і давала сродкі для наступнага ціску на парлямэнт. Сэнс першых трох быў у стварэньні сувязі паміж эканамічным пратэстам і палітычным выбарам. (Як мы адзначылі, адносіны з Расеяй мелі падмуркам ня столькі інтэрнацыяналістычна-братэрскі настрой, колькі тугу аб савецкім дабрабыце.) Пытаньні наконт дзяржаўных сымбаляў накіроўвалі пратэстны настрой супраць дэмакратаў, і асабліва нацыянал-дэмакратаў.

Фармулёўка пытаньняў рэфэрэндуму не пакідала кандыдатам магчымасьці агітацыі з апірышчам на прагматычныя аргумэнты накшталт эканамічных праграмаў ці праграмаў палітычных рэформаў. Але на той час вызначанай эканамічнай праграмы ня меў і ўрад (эканамічная праграма ўраду пачала абмяркоўвацца толькі ў 1996 г., а, напрыклад, эканамічная праграма БНФ была прыведзеная ў 1994 г. у перадвыбарнай праграме З. Пазьняка).

Перадвыбарная дыскусія была накіраваная ў бок сымбалічных пытаньняў, якія ня мелі практычнага значэньня. Так, вынікі апытаньняў у сакавіку паказалі, што толькі каля 50 % грамадзянаў мелі нейкія меркаваньні наконт сымболікі: 23 % — за Пагоню, 27 % — за стары герб; 24 % — за бел-чырвона-белы, 29 % — за чырвона-зялёны сьцяг[27].

Палова грамадзянаў абыякава ставілася да пытаньняў, вынесеных на народнае абмеркаваньне. Зянон Пазьняк адзначыў: “Калі сумясьціць рэфэрэндум з выбарамі, то выбарнікі будуць цікавіцца не эканамічнымі поглядамі кандыдатаў, а іх адносінамі да сьцяга”[28]. Так і выйшла.

Правядзеньне рэфэрэндуму і парлямэнцкіх выбараў у адзін дзень мела наступныя вынікі: 1. Палітычныя партыі страцілі магчымасьць падчас кампаніі апраўдацца ў пытаньні аб сваім уплыве на эканамічны крызыс. Фактычна быў закансэрваваны створаны перад выбарамі пратэстны настрой супраць дэмакратаў. 2. На другі плян адышла крытыка эканамічных няўдачаў ураду і канцэнтрацыі ўлады. 3. Паглыбіліся супярэчнасьці паміж палітычнымі партыямі, якія, зразумела, мелі розныя пазыцыі ў пытаньнях рэфэрэндуму. 4. Улады атрымалі вагар накіраваньня перадвыбарнага палітычнага дыскурсу праз агітацыю ў пытаньнях рэфэрэндуму. У СМІ інфармацыя ў пытаньнях рэфэрэндуму значна пераважвала інфармацыю наконт выбараў.

## Палітыка што да СМІ падчас падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў

Аналізуючы стан СМІ, журналіст А. Грузьдзіловіч адзначыў, што на пачатку 1995 г. у больш ці менш вызначанай апазыцыі да прэзыдэнта знаходзілася значная колькасьць вядучых СМІ, агульным накладам больш за 1 млн асобнікаў[29].

Аднак лягер СМІ ня быў аднародным з гледзішча палітычных пазыцыяў. Пры гэтым амбіцыі рэдактараў СМІ і рознагалосьсе паміж імі не давалі ім магчымасьці выступіць супольным фронтам. Гэта высьветлілася падчас акцыі зь белымі плямамі і канчаткова пацьвердзілася пасьля пачатку звальненьняў галоўных рэдактараў вядучых СМІ (“Советская Белоруссия”, “Рэспубліка”).

[27] Белорусская деловая газета. 1995. 30 марта.

[28] Белорусская деловая газета. 1995. 27 марта.

[29] Belarus monitor. 1995. № 1. P. 36.

Выбарчай кампаніі папярэднічала “зачыстка” інфармацыйнай прасторы. Першымі яе ахвярамі сталі адносна малаангажаваныя на той час цэнтральныя СМІ. У сьнежні 1994 г. вызвалены ад пасады галоўны рэдактар “Советской Белоруссии”, у студзені 1995 г. Беларускае інфармацыйнае агенцтва перададзенае ў падпарадкаваньне Адміністрацыі прэзыдэнта. 2 студзеня выдавецтву “Дом друку” забаронена друкаваць 12 незалежных газэтаў.

Як і трэба было чакаць, спроба ўзьдзеяньня на СМІ ня выклікала масавага абурэньня. Гэта значыла, што з пачаткам выбараў прэзыдэнту можна пачынаць рашучыя дзеяньні. Стратэгія што да СМІ абапіралася на прынцып “падзяляй і ўладар”.

8 сакавіка 1995 г. А. Лукашэнка сустрэўся з калектывам тэлерадыёкампаніі. Кантроль над тэлебачаньнем застаўся яму ў спадчыну ад савецкай улады. На сустрэчу былі запрошаныя ня толькі журналісты, але амаль усе работнікі тэлерадыёкампаніі, улучна з тэхнічнай абслугаю. Да іх зьвярнуліся з просьбай “не ствараць “дзьмутага” іміджу”. Але шырыня кола запрошаных наводзіла на неагучаную думку: “і паведамляць аб тых, хто гэта робіць”.

Звальненьне з пасады галоўнага рэдактара “Народнай газеты” (органу друку ВР) Язэпа Сярэдзіча ўказам № 113 ад 18 сакавіка 1995 г. было кульмінацыяй кампаніі. Гэты захад меў ужо ня столькі тэхналягічны (падпарадкаваць “НГ”), колькі выхаваўчы характар (паказаць, *што* ўлада можа зрабіць з СМІ). Гэтым указам стваралася і Рада пры прэзыдэнту для нагляду за СМІ.

Камэнтуючы адстаўку, А. Лукашэнка заўважыў: “Я выратаваў Сярэдзіча ад жменькі нацыяналістаў”[30]. Зразумела, што адстаўка павінна была папярэдзіць іншых кіраўнікоў СМІ пра наступствы дапамогі “нацыяналістам”.

Гэтая адстаўка выклікала як грамадзкі, так і кадравы рэзананс. Першы адбіўся ў тым, што за гучным абурэньнем амаль не было чуваць галасоў наконт больш небясьпечнага для грамадзтва пытаньня: стварэньне Рады для нагляду за СМІ фактычна было ўвядзеньнем цэнзуры напярэдадні выбараў.

Кадравым наступствам указу быў сыход А. Фядуты з пасады кіраўніка ўправы грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта і яго замена на Ўладзімера Замяталіна, які быў шырока вядомы сваімі жорсткімі мэтадамі дачыненьняў з мэдыямі і фактычна мог ажыцьцяўляць гэтую цэнзуру. У выніку можна сказаць, што “да канца красавіка прэзыдэнт фактычна цалкам кантраляваў рэспубліканскія дзяржаўныя СМІ”[31].

У выніку СМІ, нават не пастаўленыя пад непасрэдны кантроль улады, як, напрыклад, мясцовыя мэдыі, якія падпарадкоўваліся мясцовым выканкамам, мусілі праводзіць самацэнзуру і ад удзелу ў выбарчай кампаніі фактычна ўхіліліся (матэрыялы аб выбарах працягвала даваць толькі папулярная ў пратэстна актыўным Менску газэта “Добрый вечер”). Камэрцыйныя СМІ — таксама. Але гэта не спыніла ўлады, напрыклад, у закрыцьці палітычна малаангажаванага “8-га каналу”.

Усё вышэй адзначанае паказвае, што няма сэнсу падрабязна аналізаваць стратэгію дзеяньняў СМІ падчас выбараў і іх уплыў на кампанію, які зводзіўся да адсутнасьці ўплыву. Да таго ж зьместавы і колькасны аналіз публікацыяў быў падрабязна праведзены іншымі дасьледнікамі. (Гл.: Belarus monitor. 1995. № 1.)

---

30 Белорусская деловая газета. 1995. 20 марта.

31 Belarus monitor. 1995. № 1. P. 46.

Незалежныя мэдыі ахаплялі ня больш як 20 % чытачоў[32], але ўзьдзейнічалі пераважна на групу насельніцтва, якая галасавала "нагамі", расчараваўшыся ў магчымасьцях узьдзейнічаць на ўладу праз выбары. Астатнія імкнуліся не рызыкаваць, каб не ўскладніць адносінаў з уладай. Нават "Звязда", у якой рэдактар зьменены ня быў і якая раней адважвалася друкаваць матэрыялы ад нацыянальна-дэмакратычных сілаў, з набліжэньнем выбараў усё больш зьвяртала ўвагу толькі на рэфэрэндум.

Фактычна былі створаныя ўмовы для фармаваньня інфармацыйнага вакууму напярэдадні выбараў. Выбарнікі, якія карысталіся інфармацыяй СМІ, ішлі не на выбары, а на рэфэрэндум, таму значная частка зь іх на выбары не дайшла.

СМІ граюць ролю ня толькі перадавальніка, але і фільтра палітычнай інфармацыі, ажыцьцяўляюць яе інтэрпрэтацыю, задаюць шаблён яе ўспрыманьня. Дыстанцыяваньне СМІ ад абмеркаваньня праблемаў выбараў і іх засяроджаньне на рэфэрэндуме азначала, што інфармацыя аб кандыдатах, нават калі яна і трапляла ў кола ўвагі выбарнікаў, успрымалася ў кантэксьце праблемаў, вынесеных на рэфэрэндум, па-за кантэкстам рэальнай палітыкі. Менавіта так і ацэньваліся праграмы кандыдатаў.

## Электаральныя паводзіны

Выбары 1995 г. запомніліся ў палітычнай гісторыі Беларусі найвялікшым узроўнем абсэнтэізму. Парлямэнцкі кворум быў дасягнуты толькі з другой спробы, увосень 1995 г., і было набрана толькі на 16 дэпутатаў звыш патрэбнага мінімуму.

Асаблівасьці палітычнага ўдзелу грамадзянаў сталі наступствам, з аднаго боку, эканамічных праблемаў і расчараваньня ў нацыянальных і дэмакратычных каштоўнасьцях, з другога — вынікам разгледжанай намі передвыбарнай палітыкі ўладаў.

Дасьледнікі адзначалі нетыповую для большасьці краінаў тэндэнцыю. З набліжэньнем выбараў павялічваўся адсотак тых, хто вырашыў ня браць удзелу ў выбарах, і памяншаўся адсотак тых, хто вызначыўся, за якога кандыдата зьбіраецца галасаваць.

Так, Васіль Шайкоў, які на замову гарадзкой Рады праводзіў дасьледаваньне электаральных паводзінаў у Наваполацку зь лютага 1995 г., адзначаў, што з набліжэньнем выбараў да абсэнтэістаў далучаліся нават выбарнікі, якія вызначыліся, за каго галасаваць. У Наваполацку перад пачаткам выбараў у прааналізаваных акругах ня ведалі, за каго прагаласуюць, 56–64 % выбарнікаў[33]. Гэтаму спадарожнічала тэндэнцыя зьніжэньня рэйтынгу большасьці кандыдатаў з набліжэньнем выбараў.

Падобная сытуацыя была вызначана і дасьледаваньнем, праведзеным на замову Менскага гарвыканкаму, згодна зь якім у красавіку 1995 г. намер узяць удзел у выбарах выказалі толькі 52,8 %[34].

За тры тыдні да галасаваньня вынікі гэтых і іншых падобных дасьледаваньняў былі надрукаваныя ў шэрагу СМІ. Фактычна гэта замацавала і паглыбіла намер грамадзянаў не ісьці галасаваць.

---

[32] Тамсама. P. 37.

[33] Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта. 1995. № 5.

[34] Звязда. 1995. 22 красавіка.

У першую чаргу ахвярай кампаніі абсэнтэяваньня меліся стаць выбарнікі, падтрымка якіх мела ўмоўны характар, г. зн. залежала ад вынікаў дзейнасьці ўраду. Яны не жадалі галасаваць ні за неэфэктыўны ўрад, ні — у такіх інфармацыйных умовах — за апазыцыю. Пашырэньне расчараваньня ў палітыцы і палітыках вымусіла іх засяродзіцца на непалітычнай дзейнасьці — на самаўладкаваньні. (Падставы для гэтага таксама меліся. Так, напрыклад, у лютым прэзыдэнтам быў падпісаны ўказ № 64 “Аб забесьпячэньні грамадзянаў Рэспублікі Беларусі зямельнымі надзеламі”, згодна зь якім у тэрміновым парадку — пасьлядоўнасьць захадаў была расьпісаная да 10 мая — урад, абласныя і раённыя выканкамы абавязваліся правесьці шэраг захадаў для надзяленьня грамадзянаў, у тым ліку гарадзкіх жыхароў, зямельнымі ўчасткамі. Зразумелыя захады ў пэрыяд эканамічнага крызысу, але незразумелыя іх тэрміны.) А зрабіць гэта маглі пераважна людзі адпаведнага ўзросту і адукацыі. Паводле вынікаў дасьледаваньняў у Наваполацку, пераважную большасьць сярод тых, хто ня меў надзеі на выхад з крызысу пры дапамозе палітычных інстытутаў, складалі патэнцыйныя прыхільнікі дэмакратычных сілаў. Сярод моладзі такіх было 61 %, сярод людзей пасьля 55 гадоў — толькі 30 %.

Дасьледнікі адзначаюць у якасьці ўплывовых на вынік выбараў чыньнікаў заявы прэзыдэнта аб нежаданьні ўдзельнічаць у галасаваньні, тэлевізійны фільм “Нянавісьць” Ю. Азаронка, паказаны па БТ у апошні вечар перад галасаваньнем. На наш погляд, гэтыя інфармацыйныя захады самі празь сябе не маглі стаць значнай прычынай няяўкі, бо нэгатыўнае стаўленьне да палітыкі, да ВР і нацыянальна-дэмакратычнай апазыцыі было закладзена раней. Яны толькі замацавалі вызначэньне пазыцыяў: мабілізавалі тых, хто быў супраць апазыцыі, і дэмабілізавалі тых, хто сумняваўся ўва ўладзе.

Вынікам абмежаваньня доступу кандыдатаў да прэсы стала вяртаньне да статуснаабумоўленых мадэляў галасаваньня, што мелі месца на выбарах у ВР БССР. Асноўнай крыніцай інфармацыі пра выбары для большасьці выбарнікаў сталі перадвыбарныя ўлёткі. Ува ўмовах абмежаваньня сродкаў надрукаваць іх у дастатковай колькасьці можна было толькі выкарыстоўваючы службовае становішча. Згодна з апытаньнем НІСЭПД, прведзеным у чэрвені 1995 г., пераважная большасьць выбарнікаў (58 %) атрымала інфармацыю аб кандыдатах з улётак. З газэтаў інфармацыю атрымалі амаль удвая менш грамадзянаў — 31,5 %, праз радыё — 10,5 %, праз БТ — 8,7 %, з сустрэчаў з кандыдатамі — толькі 13 % выбарнікаў[35] (для параўнаньня: па іншых праблемах інфармацыю з газэтаў атрымлівалі 60,5 %, праз радыё — 57,7 %, праз тэлебачаньне — 49,1 %[36]. Невялікая колькасьць атрымальнікаў інфармацыі з сустрэчаў з кандыдатамі падкрэсьлівае статусную абумоўленасьць агітацыі. Выбарнікі, якія пазбавіліся за чатыры гады незалежнасьці ад ідэалягічных акуляраў, не маглі гэтага не заўважыць, што таксама матывавала абсэнтэізм.

Напярэдадні другога туру інфармацыйная цішыня ў асьвятленьні выбараў вымусіла шэраг партыяў выступіць з ініцыятывай на асабістыя сродкі стварыць плякаты, якія зьмяшчалі не інфармацыю пра кандыдатаў, а паведамлялі пра дзень выбараў.

Атрыманыя вынікі зьдзівілі саміх выбарнікаў. Так, у другім крузе парлямэнцкі кворум быў набраны. Але адбылася своеасаблівая палітызацыя грамадства. Пратэстны настрой без альтэрнатывы прывёў да нетыповага для Беларусі зруху ў масавай сьвядомасьці што да

[35] Белорусская деловая газета. 1995. 3 августа.

[36] Белорусская деловая газета. 1995. 3 мая.

праблемаў. Пасьля выбараў 47 % апытаных адзначылі сярод падзеяў, якіх яны асьцерагаюцца ў бліжэйшай будучыні, набліжэньне грамадзянскай вайны. Больш за грамадзянскую вайну людзі баяліся толькі экалягічнай катастрофы — 53,4 %. Палітычныя праблемы наблізіліся сваёй значнасьцю да эканамічных: недаступнасьці прадуктаў харчаваньня і тавараў першай неабходнасьці баяліся таксама 47 %[37].

## Ход выбарчай кампаніі

Першай інтэрпрэтацыяй вынікаў выбараў была тэза аб перавазе левых каштоўнасьцяў і стварэньні левага парлямэнту. Але вынікі выбараў больш сьведчылі пра несфармаванасьць стратэгіі правых. Палітычныя партыі і іх электарат адрозьніваліся ня толькі ідэалёгіяй, але і матывамі электаральных паводзінаў, якія адпавядалі тыпалёгіі сацыяльных дзеяньняў, прапанаванай Максам Вэбэрам. Прычынай перамогі левых стала розьніца ў матывах паводзінаў.

У кампаніі было дазволена ўдзельнічаць партыйным блёкам. Іх рэгістрацыя павінна была пачацца раней за рэгістрацыю палітычных партыяў, 10 сакавіка. На першы погляд, карлікавыя памеры партыяў павінны былі вымушаць іх аб’ядноўвацца. Але доўгая падрыхтоўка ня мела вынікам аб’яднаньне.

На пачатку 1995 г. было заяўлена аб складаньні трох патэнцыйных блёкаў: 1) левы, ядро якога складалі ПКБ, АП, сацыялісты; 2) нацыянальна-дэмакратычны — вакол БНФ і БСДГ; 3) дэмакратычны, “Грамадзянская згода” (ГЗ), — вакол ПНЗ, АДПБ, ГП. Розьніца ў палітычных біяграфіях блёкаў стала асновай ня толькі для розьніцы ў палітычных праграмах, але і ў стратэгіях здабыцьця ўлады.

ПКБ і АП прадстаўлялі тых, хто фактычна ўжо меў уладу, але непасрэдна не ўваходзіў у абойму прэзыдэнта. АП была шырока вядомая як партыя старшыняў калгасаў, прадстаўнікі яе натуральна мелі адміністрацыйны рэсурс у мэханістычным разуменьні гэтага слова (“не прагаласуеш — ня дам сена”). ПКБ была створаная пасьля жнівеньскага путчу з маладой хвалі функцыянэраў КПСС. Суполкі ПКБ дзейнічалі амаль ува ўсёй краіне. Большасьць прадстаўнікоў гэтай партыі здолелі выкарыстаць свой статус, атрымаўшы пасады ў кіраўнічых установах. Пасьля стварэньня вэртыкалі свае пасады захавалі амаль усе з 25 камуністаў — кіраўнікоў мясцовых Радаў і выканкамаў.

Левы блёк пачаў рыхтавацца да выкарыстаньня адміністрацыйнага рэсурсу яшчэ 20 лютага, калі 50 дэпутатаў ВР (пераважна аграрнікі) пачалі перамовы з старшынямі выканкамаў аб узаемадзеяньні на выбарах. Галоўнай перавагай гэтага блёку былі адміністрацыйныя рэсурсы і дысцыплінаваны электарат, выхаваны ў савецкіх традыцыях “безумоўнай падтрымкі”. Пераразслы электарат галасаваў пераважна “традыцыйна”, г. зн. у яго не было патрэбы ў дадатковай інфармацыі. Левы блёк ува ўмовах інфармацыйнай цішыні меў найбольш выйгрышныя пазыцыі.

БНФ і БСДГ узьніклі на хвалі пратэстнага незалежніцкага руху і складаліся пераважна з прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Нават тыя сябры партыяў гэтага блёку, якія ў савецкі час займалі нейкія адказныя пазыцыі, падчас удзелу ў незалежніцкім руху набылі імідж, “несумяшчальны” з супрацоўніцтвам з пануючай уладай. Партыі гэтага блёку (асабліва БНФ) атрымаць

[37] Белорусская деловая газета. 1995. 3 августа.

уладу маглі толькі празь перамогу на выбарах. Адміністрацыйны рэсурс, асабліва пасьля стварэньня вэртыкалі, быў ім недаступны. Ілюзію магчымасьці перамогі стварала наяўнасьць сеткі суполак, якія паўсталі яшчэ ў 1993 г., і шырокая вядомасьць лідэраў.

Імідж блёку дазваляў разьлічваць пераважна на пратэстны электарат, аднак значная яго частка не падзяляла гіпэрнацыянальных каштоўнасьцяў, таму магла адысьці да партыяў, якія б прапаноўвалі дэмакратычныя каштоўнасьці без нацыянальнага кантэксту. Выбары 1990 г. паказалі недысцыплінаванасьць "правага" электарату. Матывы яго ўдзелу мелі пераважна каштоўнасна-рацыянальны характар. Пры расчараваньні выбарнікі маглі не прыйсьці на выбары. Менавіта супраць нацыянальна-незалежніцкіх матываў была накіраваная перадвыбарная камунікацыя ўлады.

Партыі "ГЗ" фармаваліся пераважна як кадравыя, з прадстаўнікоў кіраўнічай і бізнэс-эліты. Вынікам стала ідэалягічная аморфнасьць, пэрсанальная канфліктнасьць блёку. Фактычна, партыі гуртаваліся вакол палітыкаў, якія пасьпелі атрымаць і згубіць пасады ў новай краіне: АДПБ — вакол С. Шушкевіча, А. Дабравольскага, ПНЗ — Г. Карпенкі, В. Ганчара, ГП — В. Шлындзікава. Шэраг кандыдатаў гэтага блёку захавалі пасады ў рэгіёнах і ў кіраўніцтве прамысловых прадпрыемстваў. Удзел ува ўладзе ствараў мэтарацыянальных палітыкаў, арыентаваных як на прыцягненьне мэтарацыянальнага (праграмамі), так і афэктыўнага (іміджам сяброў) электарату.

Аналітык Юры Дракахруст ахарактарызаваў фармулёўкі праграмаў цэнтрысцкіх партыяў як "гнуткія", "заспакойлівыя ў ідэалягічным пляне". Гэтыя партыі арганізацыйна былі слаба прадстаўленыя ў рэгіёнах. Іх асноўным рэсурсам быў публічны імідж сяброў. На першы погляд, гэта ўтварала падставы для расколу як паміж партыямі, так і ўнутры іх. Так, напярэдадні выбараў адбыўся раскол АДПБ, вынікам якога стала стварэньне Грамадзянскай партыі В. Шлындзікава. У межах ПНЗ назіралася супрацьстаяньне Карпенка — Ганчар, якое падкрэсьлілася падчас вылучэньня кандыдадатаў[38]. Яно было выклікана кіраўнічым мінулым В. Ганчара, якое дазваляла выбіраць паміж больш функцыянэрскай Партыяй Усебеларускага адзінства і згоды (ПУАЗ) і ПНЗ. У выніку ПУАЗ узначаліў Дз. Булахаў. Гэтае супрацьстаяньне адлюстравалася падчас вылучэньня кандыдатаў ад партыяў, калі В. Ганчар у адказ на адмову вылучыць яго ў Маладэчне (акрузе Карпенкі) вырашыў ісьці на выбары ў Маладэчне не ад партыі, а праз збор подпісаў.

Але, як высьветлілася падчас выбараў, менавіта асабісты імідж кандыдата дазваляў прывабіць афэктыўны электарат і выйсьці за правілы, усталяваныя ўладай, якая абмежавала актыўнасьць СМІ. Шэраг партыяў цэнтрысцкага блёку нават вылучылі кандыдатаў толькі праз збор подпісаў (напрыклад ГП, якая не пасьпела зарэгістравацца).

Левыя партыі, безумоўна, маглі пайсьці на выбары самастойна і нават выкарыстаць падтрымку часткі вэртыкалі ўлады. Правым трэба было аб'ядноўвацца. Стварэньне адзінага блёку дэмакратычных сілаў павышала шанцы БНФ, які прэтэндаваў на прадстаўленьне пратэстнага электарату. Але для цэнтрыстаў далучэньне да нацыянальных каштоўнасьцяў значыла атрыманьне ідэалягічнага балясту. Зразумела, што на аб'яднальную прапанову БНФ Г. Карпенка адказаў адмовай. Для "ГЗ" дастаткова было "джэнтэльмэнскай згоды", якая выключала б узаемную крытыку і такім чынам дазваляла прывабіць пратэстны электарат. Такая згода была дасягнутая 22 лютага.

[38] Белорусская деловая газета. 1995. 23 января.

Як і трэба было чакаць, 10 сакавіка ніводны з блёкаў не зарэгістраваўся.

Перадвыбарная барацьба была барацьбой не праграмаў, а стратэгіяў удзелу выбарнікаў. Найбольшы шанец перамагчы мелі партыі, чый электарат галасаваў дзеля звычкі, не кіраваўся мэтарацыянальнымі ацэнкамі.

У першым крузе прайшлі пераважна незалежныя кандыдаты (зьвязаныя з уладай) і кандыдаты ад левага блёку. Сакрушальная параза левых радыкалаў (з 88 кандыдатаў, вылучаных "Славянскім саборам Белая Русь", не прайшоў ніводны) паказвала, што вырашальную ролю мелі ня левыя каштоўнасьці, а старая звычка галасаваць "за сваіх". Асноўная маса кандыдатаў, абраных у першым туры, была абраная ў рэгіёнах.

Палітолягі адзначалі існаваньне дзьвюх стратэгіяў галасаваньня: у гарадзкіх і ў сельскіх акругах. Апошнія былі найбольш выніковымі, выбары ў вёсках і невялікіх гарадох адбыліся ў 100 з 150 акругаў. Выбарнікі кіраваліся звычкамі, закладзенымі ў савецкія часы. Спаборніцтва адбывалася паміж 5 тыпамі іміджаў кандыдатаў: 1) мясцовы кіраўнік; 2) менскі начальнік; 3) палітык; 4) партыец (камуніст ці фронтавец); 4) фонавы. У другі тур выходзілі кандыдаты "мясцовы кіраўнік" і "менскі начальнік", дзе галасы разьмяркоўваліся на карысьць першых.

У сталічных акругах барацьба адбывалася паміж чатырма групамі іміджаў: 1) фронтавец; 2) камуніст; 3) новы твар; 4) фонавы. Найбольшую перавагу, паводле вынікаў дасьледаваньня, мелі кандыдаты з групы "знаёмы твар", "якія вылучаліся з агульнай масы" асаблівасьцямі біяграфіі (напрыклад, шматдзетны бацька), выглядам ці прыналежнасьцю да жаночага полу. Асноўная колькасьць галасоў разьмяркоўвалася паміж кандыдатамі 1–3 групаў. Рэшту атрымлівалі шматлікія фонавыя. У другі тур, амаль з гарантыяй, выходзіў кандыдат з "знаёмым тварам", дзе ён спаборнічаў з кімсьці з партыйных кандыдатаў. Пры адсутнасьці "знаёмага твару" галасы выбарнікаў пераходзілі на карысьць фонавых. З гэтага вынікае, што ў гарадох галасаваньне адбывалася паводле афэктыўных матываў. Перавага афэктыўных матываў удзелу пашырала магчымасьці кандыдатаў маніпуляваць выбарнікамі. Асабліва карысным такі стыль галасаваньня стаў для наваствoранай партыі ПУАЗ, якая спалучала прадстаўніцтва функцыянэраў з іміджам цэнтрысцкай партыі.

У першым крузе парлямэнт ня быў сфармаваны. У другім крузе 10 сьнежня 1995 г. незацікаўленасьць уладаў ува ўдзеле выбарнікаў павялічылася. Але няўдача вымусіла партыі перайсьці да больш рацыянальнага стылю дзейнасьці, як у межах партыяў, так і паміж імі. Першай прыкметай стала паглыбленьне разьмежаваньня ў цэнтрысцкіх партыях. На пачатку верасьня ПНЗ была ўзначаленая кіраўніком службы кантролю прэзыдэнта Л. Сечкам, а частка сяброў партыі на чале з Г. Карпенкам сышла ў АДПБ, і 1 кастрычніка, у выніку аб'яднаньня АДПБ і ГП, стала часткай новай партыі — АГП. Нягледзячы на дэкляраванае імкненьне да аб'яднаньня (большасьць дэмакратычных партыяў падпісала хартыю "Дыялёг дзеля будучыні"), падзел ПНЗ — АДПБ пацьвярджае раскол дэмакратычнага цэнтру на тых, хто застаўся ўва ўладзе і з прэзыдэнтам, і тых, хто зьбіраўся здабываць уладу самастойна, у апазыцыі прэзыдэнту. Гэты падзел вымушаў бок прэзыдэнта выходзіць на ўзровень публічнай палітыкі і замацоўваць за сабой месца ў палітычнай прасторы, пераважна на яе левым фланзе (гэта пацьвярджаецца і стварэньнем блёку "Саюз дэмакратычных сілаў" з партыяў ПНЗ, АДПБ, ПУАЗ, ЛДП і адбытым ня без удзелу ўладаў расколу ў ПКБ), але на тэрмін другога кругу абмежаваць палітычную актыўнасьць выбарнікаў. У выніку ўстрыманьня ўлады ад арганізацыі выбараў, другі круг стаў інфармацыйна насычаны нават менш за першы.

У гэтых умовах апошняя спроба нацыянал-дэмакратычнага блёку рацыяналізаваць свае паводзіны (24 жніўня абвясьцілі пра кансультацыі паміж БСДГ і ПКБ, а на прэс-канфэрэнцыі ў штаб-кватэры БНФ З. Пазьняк нават заявіў пра магчымасьць дамовы з ПКБ у выпадку наяўнасьці акругаў зь безумоўна непраходнымі кандыдатамі) ужо не магла прынесьці перамогі. Разьмежаваньне цэнтру на "ўладных" і "апазыцыйных" было сыгналам для функцыянэраў мясцовай эліты, адказных за правядзеньне выбараў, прадэманстраваць ляяльнасьць прэзыдэнту, напрыклад, праз выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу.

## Вынікі выбараў і рэфэрэндуму

Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у пытаньнях рэфэрэндуму галасы выбарнікаў разьмеркаваліся наступным чынам: 83,1 % прагаласавалі за наданьне расейскай мове статусу дзяржаўнай, 75 % — за зьмену дзяржаўных сымбаляў, 82,4 % — за інтэграцыю з Расеяй, 77,6 % — за атрыманьне прэзыдэнтам права роспуску парлямэнту. Высокія лікі кампэнсаваліся нізкай яўкай: у рэфэрэндуме ўзялі ўдзел толькі 64,9 % выбарнікаў.

У першым крузе было вылучана 2439 кандыдатаў, зь іх зарэгістравана 2348, у тым ліку 1126 ад партыяў. 70 % вылучаных мелі досьвед кіраўнічай працы, 80 % былі гарадзкія жыхары.

Найбольшую вагу сярод вылучаных склалі дзяржаўныя, прамысловыя функцыянэры ці падпарадкаваныя ім групоўкі. Можна адзначыць павелічэньне, у параўнаньні з выбарамі 1990 г., вагі навукоўцаў і настаўнікаў. Але, нягледзячы на іх высокую колькасьць сярод кандыдатаў, у складзе дэпутатаў іх амаль не было. Ува ўмовах інфармацыйнага вакууму такі вынік быў наступствам статусна абумоўленай агітацыі. Перавага "блізкіх да народу" (тых, чыя службовая дзейнасьць дазваляе стварыць матэрыяльную ці інфармацыйную залежнасьць электарату) групаў кіраўнікоў прадпрыемстваў і старшыняў калгасаў паказвае, што для перамогі патрэбна было ня толькі дайсьці з інфармацыяй да электарату, але мець рэсурсы непасрэднага ўзьдзеяньня на выбарнікаў.

Дэпутаты, абраныя ў першым крузе, як і ў 1990 г., былі пераважна кіраўнікамі. Але ў 1995 г. рэгіянальныя кіраўнікі (15) саступілі кіраўнікам прадпрыемстваў і функцыянэрам зь менскай палітычнай эліты (15). Пераважная большасьць апошніх былі беспартыйныя, ніводны зь іх не балятаваўся ў сталічнай акрузе. Найбольшая колькасьць беспартыйных менскіх функцыянэраў прайшла ад акругаў Магілёўскай вобласьці (4 дэпутаты), у астатніх рэгіёнах праходзіла па 1 (Гарадзенская і Гомельская вобласьці) ці 2 (Менская і Віцебская).

Параўнальны аналіз выніковасьці дзейнасьці партыяў і беспартыйных дзеля вылучэньня кандыдатаў і іх праходу ў парлямэнт дазваляе зрабіць выснову, што найбольшую "праходную моц" мелі партыйныя кандыдаты ад ПКБ і АП. ПКБ у першым крузе атрымала адсотак дэпутатаў, удвая большы за адсотак вылучаных кандыдатаў, АП — у 4 разы. Адсотак беспартыйных сярод вылучаных у першым туры амаль той самы, што і сярод абраных. Такім чынам, вырашальнай у спаборніцтве паміж партыямі была наяўнасьць кандыдатаў-кіраўнікоў. Так, аналіз выніковасьці партыяў (паасобку) і беспартыйных кандыдатаў паказвае вельмі высокую карэляцыю паміж выніковасьцю выбараў для партыі і колькасьцю ў ёй старшыняў выканкамаў ($R$ = 0,909; $p$ = 0,003), функцыянэраў зь Менску ($R$ = 0,806; $p$ = 0,004), старшыняў калгасаў ($R$ = 0,730; $p$ = 0,016). Фактычна гэта пацьвярджае выніковасьць стратэгіі, абранай бокам прэзыдэнта.

У другім крузе партыйныя кандыдаты саступілі беспартыйным. Гэта можна растлумачыць тым, што выканаўчая ўлада пачала актыўна выкарыстоўваць адміністрацыйны рэсурс. Беспартыйныя кандыдаты, якія паменшылі актыўнасьць у вылучэньні (беспартыйнымі былі толькі 30 % ад агульнай колькасьці кандыдатаў), павысілі сваю выбарчую выніковасьць: незалежнымі былі 52 % дэпутатаў, абраных у другім крузе. З партыяў у другім крузе толькі камуністы здолелі правесьці ў парлямэнт больш за 16 дэпутатаў, у астатніх партыяў лік пасьяховых кандыдатаў ішоў на адзінкі.

***

Выбары ў ВР і рэфэрэндум 1995 г. сталі доказам выніковасьці і скаардынаванасьці стратэгіі выканаўчай улады, якая здолела ператварыць незадаволенасьць грамадзянаў эканамічнымі праблемамі не ў супраціў кіраўнічай выканаўчай эліце, а ў палітычную апатыю з боку найбольш арыентаванай на перамены часткі грамадзянаў і ў актывізацыю пратэсту з боку супраціўнікаў пераменаў. У выніку першы этап першапачатковай палітычнай інстытуцыялізацыі быў завершаны легітымацыяй канцэнтрацыі ўлады.

## РЭФЭРЭНДУМ І ДАВЫБАРЫ 1996 Г.

Неабходнасьць правядзеньня рэфэрэндуму 1995 г. дыктавалася пераважна ўнутрысыстэмнымі чыньнікамі. Пры абвяшчэньні і падрыхтоўцы рэфэрэндуму 1996 г. адбылося спалучэньне чыньнікаў унутры- і замежнапалітычных. Першыя вынікалі з асаблівасьцяў палітычнага працэсу 1994—1995 гг. Другія былі зьвязаныя з стаўленьнем да падзеяў у Беларусі полюсаў сусьветнага палітычнага ўплыву. Вонкавыя фактары аказалі ўзьдзеяньне ня толькі на ход падзеяў, але і на наступствы рэфэрэндуму для Беларусі. Аднак іх уплыў быў бы нязначным, калі б яны не супалі з асаблівасьцямі электаральных паводзінаў беларусаў. Таму ў артыкуле аналіз канстытуцыйнага крызысу і чыньнікаў, што ўплывалі на яго разьвіцьцё, ажыцьцяўляецца толькі ў сувязі зь іх уплывам на волевыяўленьне грамадзянаў.

### Сацыяльна-палітычныя ўмовы правядзеньня рэфэрэндуму

На пачатак 1996 г. расклад палітычных сілаў у Беларусі складваўся наступным чынам. Была сфармаваная прэзыдэнцкая вэртыкаль улады. Ужо пры канцы 1995 г. прэзыдэнт меў упэўненасьць у наяўнасьці кантролю на месцах. 29 сьнежня 1995 г. ён выдаў распараджэньне № 259 "Аб выкананьні нормаў і ўказаў прэзыдэнта", згодна зь якім "у мэтах забесьпячэньня палітычнай і эканамічнай стабільнасьці чыноўнікі Кабінэту Міністраў і іншых дзяржаўных установаў, да ўнясеньня зьменаў у адпаведныя заканадаўчыя акты, павінны забясьпечваць безумоўнае выкананьне нормаў і ўказаў прэзыдэнта". Адказнасьць за выкананьне ўскладалася пэрсанальна на кіраўнікоў вэртыкалі. Першыя чуткі пра магчымы рэфэрэндум зьявіліся яшчэ ў лютым 1996 г.[1]

[1] Белорусская деловая газета. 1996. 15 февраля.

Згодна з законам, супрацьвагай уладзе прэзыдэнта павінны былі стаць абраная ў 1995 г. Вярхоўная Рада XIII скліканьня і Канстытуцыйны суд. Нацыянал-дэмакраты, парушальнікі спакою ў Вярхоўнай Радзе XII скліканьня, у парлямэнт не прайшлі. Большасьць з парлямэнтароў былі беспартыйныя, 136 з 198 былі дзяржаўнымі функцыянэрамі і гаспадарчымі кіраўнікамі. Прапрэзыдэнцкая фракцыя “Згода” складала амаль траціну парлямэнту (63 дэпутаты).

Аднак праход у парлямэнт другой хвалі “камунікацыйных палітыкаў”, цэнтрыстаў, якія перайшлі ў 1995 г. у апазыцыю ўладзе, ізноў стаў прычынай няўстойлівасьці ўладных адносінаў. Тэрмін “стабільнасьць” з 1996 г. стаў адным з найбольш папулярных у беларускім палітычным лексыконе, адлюстроўваючы прагу ўлады сфармаваць устойлівую сыстэму падпарадкаваньня. Цэнтрысты-апазыцыянэры ў парлямэнце сталі для Лукашэнкі нават больш небясьпечнымі за нацыянал-дэмакратаў. У адрозьненьне ад тых, першыя мелі досьвед палітычнай дзейнасьці, пабывалі ўва ўладзе і ў савецкі час, і ў час незалежнасьці. Яны ж былі першай генэрацыяй апазыцыйных прагматычных палітыкаў (шэраг зь іх у 1994 г. нават дапамагалі прыйсьці да ўлады А. Лукашэнку). Веды правілаў палітычных адносінаў дазволілі ім хутка прыйсьці да паразуменьня і з аграрнікамі, і з камуністамі, лёгка прыняць пастановы па кадравых пытаньнях, канвэртаваць свой публічны статус у пасады ў парлямэнцкіх структурах[2]. Іх публічны імідж рабіў палітыку больш цікавай. У лютым 1996 г. С. Багданкевіч быў шостым папулярнасьцю сярод найбольш уплывовых палітыкаў. Сярод 8 палітыкаў, магчымых прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта, тры (С. Шушкевіч, Г. Карпенка, С. Багданкевіч) былі прадстаўнікамі дэмакратаў[3].

Першыя намаганьні прэзыдэнта пасьля пачатку працы парлямэнту (супрацьдзеяньне давыбарам і забарона трансьляцыі сэсіяў ВР па БТ) былі накіраваныя менавіта на тое, каб абмежаваць публічнасьць дзейнасьці парлямэнту.

Дзейнасьць для стабілізацыі цэнтралізаванай улады была магчымая толькі пры дапамозе парлямэнту. Правядзеньне прадстаўніка фракцыі ўлады “Згода” Юр’я Малумава, паплечніка А. Лукашэнкі яшчэ з выбараў 1994 г., на пасаду намесьніка сьпікера, які павінен быў займацца юрыдычнымі пытаньнямі, вырашыла гэтую праблему. На пачатку 1996 г. адбывалася “дрэсіроўка” парлямэнту праз дэманстрацыю магчымасьцяў прэзыдэнта кіраваць краінай, мінаючы ВР. У парушэньне Канстытуцыі, без уліку пазыцыі парлямэнту адбылося зацьвярджэньне віцэ-прэм’ера, міністра ўнутраных справаў, міністра абароны, старшыні Нацбанку, генэральнага пракурора, старшыні КДБ. Выступ жа па тэлебачаньні старшыні Канстытуцыйнага суду быў забаронены (Канстытуцыйны суд прапаноўваў унесьці зьмены ўва ўказы прэзыдэнта, прызнаныя неканстытуцыйнымі). Нягледзячы на гарачыя дэбаты, ВР была вымушаная заднім днём зацьвердзіць гэтыя прызначэньні, бо ў выпадку далейшага настойваньня прэзыдэнта (а ён ня меў прычынаў не настойваць) адхіленьне кандыдатураў азначала б канчатковую страту парлямэнтам кантролю над бюджэтнымі грашыма, сілавымі структурамі і да т. п.

Абраны народам, парлямэнт дзейнічаў у межах правілаў, падаючы ў якасьці галоўнага аргумэнту свой праўны статус. Але ён ня меў сілавых і арганізацыйных магчымасьцяў пад-

[2] Прагматызм фракцыі “Грамадзянскае дзеяньне”, напрыклад, добра ілюструецца на прыкладзе абраньня віцэ-сьпікера, калі кандыдатура С. Багданкевіча, што выклікала вялікае абурэньне з боку прэзыдэнта, была прыгожа замененая на Г. Карпенку, які ў тых умовах быў нават больш выгадны “ГД”, таму што палітычнай кар’ерай быў больш падобны да парлямэнцкай большасьці і больш зразумелы ёй.

[3] Белорусская деловая газета. 1996. 19 февраля.

мацаваньня сваіх правоў. Прэзыдэнт мог не асьцерагацца ні масавага супраціву на карысьць парлямэнту (праўныя аргумэнты слаба зразумелыя шараговаму грамадзяніну, і наўрад ці ён здольны пайсьці змагацца за "выкананьне закону"), ні супрацьдзеяньня выканаўчай улады[4].

## Масавая актыўнасьць і грамадзкая думка перад рэфэрэндумам

Вынікі падзеяў 1995 г. разьвязвалі рукі ўладам. Аднак спосаб падрыхтоўкі рэфэрэндуму 1995 г. паставіў пэрспэктывы захаваньня ўлады прэзыдэнтам у залежнасьць ад эканамічнай выніковасьці яго палітыкі. Пасьля рэфэрэндуму 1995 г. у грамадзтве паўстала адчуваньне набліжэньня палітычнага супрацьстаяньня, асабліва ў Менску, дзе амаль палова выбарнікаў выразіла незадаволенасьць "нагамі".

Першыя прафіляктычныя захады ўладаў былі ўжытыя яшчэ на пачатку году. 25 студзеня быў зьняты міністар прамысловасьці Ўладзімер Куранкоў (гэта адначасова аслабляла пазыцыі М. Чыгіра, які сярод папулярных палітыкаў быў другі рэйтынгам пасьля прэзыдэнта). Рыхтаваўся ўказ аб перарэгістрацыі камэрцыйных структураў. 30 сьнежня 1995 г. Мінгармаёмасьць вызначыла пералік з 516 прадпрыемстваў (у тым ліку "Гарызонт", "Віцязь", "Інтэграл"), якія падлягалі разьдзяржаўленьню, што пазбаўляла дзяржаву ад балясту ў выглядзе аб'ектаў сацыяльнай сфэры[5].

Такім чынам улада стварала магчымасьці перакласьці адказнасьць за эканамічную невыніковасьць на кіраўніцтва прадпрыемстваў. У 1995 г. вінаватымі былі абвешчаныя дэмакраты-незалежнікі. У 1996 г. імі павінны былі стаць карумпаваныя кіраўнікі прадпрыемстваў. Разуменьне карупцыі ў масавай сьвядомасьці дагэтуль адрозьніваецца ад яе міжнароднай трактоўкі. Карупцыя, з пункту гледжаньня простага беларуса, — гэта выкарыстаньне службовага становішча ня столькі дзяржаўным функцыянэрам, колькі кіраўніком і нават простым

[4] Электарат партыяў ня быў схільны абараняць інтарэсы сваіх прадстаўнікоў неканвэнцыйным шляхам. Наогул, гэта было цяжка зрабіць. Большасьць дэпутатаў былі абраныя ў рэгіёнах пераважна "вялікаўзроставым" электаратам. На пратэсты беларусаў мог падштурхнуць толькі рэзкі спад дабрабыту. А ў 1996 г. эканамічны крызыс затармазіўся. Невысокая яўка падчас выбараў паказала нізкую палітычную актыўнасьць грамадзянаў, а сувязі дэпутатаў (большасьць зь якіх у мінулым былі кіраўнікамі калгасаў і прамысловых прадпрыемстваў) зь мясцовымі ўладамі і ўстановамі выканаўчай улады былі хутчэй падпарадкавальныя, чым раўнапраўныя. Сродкаў уплыву ў парлямэнтароў не было. Прэзыдэнт меў кантроль над Нацыянальным банкам, сілавымі структурамі. І галоўнае — на яго баку быў мэнталітэт функцыянэраў выканаўчай улады, а яшчэ і страх. Нават тыя, хто ня быў выхаваны ў традыцыях падпарадкаваньня, наўрад ці жадалі рызыкаваць пасадамі дзеля такой зьменлівай рэчы, як вяршэнства права ці падзел уладаў. Павялічыць свой уплыў парлямэнт мог ці абапіраючыся на масы, ці зьмяніўшы стэрэатып функцыянэраў выканаўчай улады (прымусіўшы сумнявацца ўва ўстойлівасьці пазыцыяў прэзыдэнта і, як вынік, саміх функцыянэраў). Але для гэтых зьменаў былі патрэбныя намаганьні большай часткі дэпутатаў. Кіраўнічы склад парлямэнту, прапрэзыдэнцкае лобі (фракцыя "Згода"), якое імкнулася агучваць і прасоўваць прапановы прэзыдэнта на фоне не занадта моцнага супрацьдзеяньня астатніх дэпутатаў, замацоўвалі адчуваньне стабільнасьці прэзыдэнцкай улады. Спробы дэмакратаў прыцягнуць увагу да незаконнасьці дзеяньняў прэзыдэнта, напрыклад прапанова ў лютым 1996 г. стварыць камісію для праверкі дзейнасьці Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта (на чале з В. Ганчаром), блякаваліся парлямэнтам на чале з фракцыяй "Згода". (Белорусская деловая газета. 1996. 15 февраля.)

[5] Белорусская деловая газета. 1996. 5 февраля.

работнікам бюджэтнай сфэры — лекарам, выкладчыкам. Працяг маніпуляцыяў з валютным курсам (нягледзячы на пагрозу эканамічных наступстваў, прэзыдэнт цягнуў з дэвальвацыяй рубля) даў уладам дадатковы сродак нэўтралізацыі незадаволенасьці і задабрэньня электарату. Купля Нацыянальным банкам валюты на біржы павялічыла памер рублёвай грашовай масы на рахунках у 6 разоў[6].

Такая палітыка прынесла плён ужо ў лютым — пачатку сакавіка. Агульнарэспубліканскі страйк, заплянаваны на 28 лютага сходам прафсаюзнага актыву на фоне актывізацыі прафсаюзнага руху, быў перанесены на нявызначаны час. Перанос быў выкліканы тым, што пасьля абяцаньня ўраду выплаціць зарплату да 8 сакавіка шэраг прафсаюзаў прапанавалі перанесьці мітынг[7].

Дарма што згодна з вынікамі апытаньняў на канец лютага 30,9 % грамадзянаў лічылі, што эканамічнае становішча пагоршылася, і 57 % ацэньвалі яго як стабільна дрэннае — толькі 25,4 % былі гатовыя адстойваць свае эканамічныя інтарэсы ў масавых акцыях[8].

У. Ганчарык тлумачыў гэта "эфэктам чаканьня". Гараджане мелі сваякоў у вёсцы, таму нявыплата зарплаты ня выклікала крытычнай сытуацыі.

Актывізацыя пазапарлямэнцкай дзейнасьці БНФ (10 лютага на сойме БНФ было заяўлена аб пераходзе да непарлямэнцкай формы дзейнасьці з мэтай адстаўкі прэзыдэнта) у 1996 г. адбывалася на фоне працяглага эканамічнага крызысу. Аднак дзякуючы "вясковаму тылу" гэты крызыс для значнай часткі грамадзянаў меў псыхалягічны (няма грошай), а не фізіялягічны (няма чаго есьці) характар. У выніку незадаволенасьць эканамічным становішчам выклікала палітычны пратэст, але ня стала стымулам дзейнічаць радыкальна.

Каталізатарам актывізацыі пратэсту стаў зварот уладаў да інтэграцыі з Расеяй. Ува ўнутранай палітыцы інтэграцыйная рыторыка выкарыстоўвалася дзеля павышэньня папулярнасьці прэзыдэнта. Паводле апытаньняў, пасьля сакавіцкіх інтэграцыйных захадаў колькасьць прыхільнікаў А. Лукашэнкі павялічылася на 10,6 % (у параўнаньні зь лютым)[9].

Аднак гэтыя захады актывізавалі і пратэстны электарат, нэўтралізаваны ў 1995 г. Мітынг з нагоды 78-й гадавіны БНР адбыўся 25 сакавіка 1996 г. Якраз да гэтага часу ўсе павінны былі зразумець, што выплата зарплаты (заплянаваная да 8 сакавіка) пры росьце цэнаў ня верне дабрабыту. У мітынгу ўзяло ўдзел больш за 30 000 чалавек, якія прайшлі да тэлецэнтру, патрабуючы магчымасьці выступіць на тэлебачаньні лідэру БНФ З. Пазьняку.

Год таму гэта, магчыма, мела б вынік. Але ў сакавіку 1996 г. было позна: парлямэнцкія выбары ўжо адбыліся. Уплыў на сытуацыю, атрыманы такім чынам, ня мог быць на дадзеным этапе інстытуцыялізаваны ні праз парлямэнт, ні праз рэгіянальныя эліты. Для Фронту радыкальны настрой удзельнікаў акцыі быў нечаканым (З. Пазьняк адзначыў, што "не чакаў такой рэакцыі")[10].

Дзеяньні ўладаў у адносінах да дэманстрантаў падтрымалі 48 % апытаных, асудзілі 34,1 %. Дзеяньні дэманстрантаў падтрымалі 20,7 % і асудзілі 63,3 %. Акрамя як высокім рэйтынгам прэзыдэнта і "некрытычным" эканамічным становішчам, асаблівасьці рэакцыі грамадзтва можна тлумачыць наяўнасьцю інфармацыйнай манаполіі ўладаў на асьвятленьне падзеяў.

[6] Белорусская деловая газета. 1996. 12 февраля.

[7] Белорусская деловая газета. 1996. 27 февраля.

[8] Белорусская деловая газета. 1996. 28 марта.

[9] Белорусская деловая газета. 1996. 28 марта.

[10] Белорусская деловая газета. 1996. 28 марта.

Мітынгі працягваліся на працягу ўсёй "гарачай вясны" 1996 г. Найбольш уражальным быў Чарнобыльскі шлях 26 красавіка.

Падзеі і гвалтоўная рэакцыя ўладаў падзялілі грамадзтва на тых, хто "за" прэзыдэнта, "супраць", і тых, хто ня вызначыўся. Апошніх было больш за ўсіх. Яны нэгатыўна ацэньвалі як дзейнасьць уладаў (40,2 % — нэгатыўна, 33,4 % — пазытыўна), так і дзейнасьць удзельнікаў мітынгаў (45,5 % — нэгатыўна, 27,2 % — пазытыўна)[11]. Пераважна нэгатыўная ацэнка дзеяньняў спалучалася з нэўтральным стаўленьнем да пазыцыяў бакоў. 53,9 % не падтрымлівалі ніводнага з бакоў: 27,5 % адзначылі "цяжка адказаць", 19 % лічылі, што ня маюць рацыі ўсе, 7,4 % — усе маюць рацыю ў роўнай ступені[12].

У адносінах да лёзунгаў мітынгу 26 красавіка думкі падзяліліся на 3 амаль роўныя часткі (39,3 % — "супраць", 31,5 % — "за", 29,2 % адзначылі "цяжка адказаць"). З сакавіка па травень адбывалася павелічэньне як нэгатыўнага, так і пазытыўнага стаўленьня і да ўладаў, і да апазыцыі, але не праз павелічэньне крайніх пазыцыяў ("пазытыўна" — "нэгатыўна"), а праз пераход да асьцярожных "хутчэй, пазытыўна", "хутчэй, нэгатыўна".

Менск, цэнтар супраціву, быў і "цэнтрам" нэгатывізму, дзе ў большай ступені, чым па краіне, адлюстравалася і нэгатыўнае стаўленьне да абодвух бакоў[13]. Адсотак незадаволеных дзеяньнямі дэманстрантаў у Менску быў большы, чым дзеяньнямі ўладаў. (Дамінантнай была пазыцыя "дзеяньне — не мая справа". Гэта быў вынік, па-першае, захаваньня "вясковай" праслойкі ў бюджэтах і, па-другое, створанай у 1995 г. у масавай сьвядомасьці стэрэатыпнай сувязі "інтэграцыя — дабрабыт". На самай справе лёгіка была крыху іншай: "дабрабыт — настальгія — СССР — інтэграцыя". Аднак трэці пункт ланцуга — СССР — ужо не існаваў. Інтэграцыя не азначала дабрабыту.) Гэта значыла, што ў выпадку паглыбленьня супрацьстаяньня большасьць застанецца назіральнікамі, якія нэгатыўна ставяцца да ўсіх, што разьвязвала рукі ўладам на далейшае сілавое здушэньне апазыцыі.

Падзеі вясны 1996 г. сталі каталізатарам для вызначэньня пазыцыяў палітычных сілаў. Парлямэнт дыстанцыяваўся ад вуліцы. Пасьля сустрэчы дэпутатаў з прэзыдэнтам ВР прыняла пастанову "падзяліць з выканаўчай уладай адказнасьць за падзеі, якія адбыліся 26 красавіка"[14].

Прапанова А. Лябедзькі (17 траўня) уключыць у парадак дня пытаньне пра самароспуск парлямэнту і прызначэньне новых выбараў на сьнежань не была падтрыманая парлямэнтам ("за" прагаласавалі толькі 27 дэпутатаў).

Масавы пратэст ня быў выкарыстаны парлямэнтам дзеля збалянсаваньня ўлады. Для пераважнай большасьці дэпутатаў гэты дысбалянс быў звычайнай зьявай.

З ідэалягічных, пэрсанальных і арганізацыйных прычынаў партыі дэмакратычнай апазыцыі таксама не пасьпелі ўвесну 1996 г. аб'яднаць пазыцыі і падтрымаць дзеяньні вуліцы. Так, яшчэ 3 чэрвеня БНФ і АГП абмяняліся выпадамі (В. Вячорка публічна пашкадаваў аб супрацоўніцтве з АГП падчас парлямэнцкіх выбараў 1995 г. АГП адмовілася супрацоўнічаць з БНФ. Гл.: Белорусская деловая газета. 1996. 3 июня). Позна адбылося і далучэньне да апазыцыйнага боку лідэра ўплывовай у парлямэнце аграрнай фракцыі С. Шарэцкага, які пасьля вяртаньня з паездкі ў ЗША 6 чэрвеня выступіў у абарону Канстытуцыі і за арганіза-

---

[11] Белорусская деловая газета. 1996. 20 мая.

[12] Белорусская деловая газета. 1996. 20 апреля.

[13] Белорусская деловая газета. 1996. 6 июня.

[14] Белорусская деловая газета. 1996. 6 мая.

цыю “круглага стала прадстаўнікоў парлямэнту, ураду і прэзыдэнта”, гэта значыць сілаў, якія могуць спыніць у “распаленым палітычным становішчы працяглы эканамічны крызыс”[15].

Запаволеная рэакцыя палітычных структураў на дзеяньні вуліцы прывяла да таго, што прапанова 20 ліпеня сямі партыяў, адрасаваная прэзыдэнту, арганізаваць круглы стол, прагучала толькі як адлюстраваньне непакою ў сувязі з магчымасьцю ўвядзеньня прамога прэзыдэнцкага кіраваньня. Круглы стол адбыўся 26 жніўня, але без прэзыдэнта. З боку ўладаў у ім прымалі ўдзел Сяргей Посахаў і Сяргей Лінг. (З улікам распачатай падрыхтоўкай масавай падтрымкі, склад прэзыдэнцкага боку на круглым стале сьведчыў пра нязначнасьць для яго любых вынікаў.)

Улады выкарысталі круглы стол для расколу левых сілаў. Шэраг гаркамаў ПКБ выступілі супраць дзеяньняў кіраўніцтва, патрабуючы скліка期ньня надзвычайнага зьезду. Вынікам стаў падзел ПКБ на дзьве партыі.

Масавы супраціў, заявы парлямэнцкіх лідэраў і іх інфармацыйныя наступствы актывізавалі і прэзыдэнцкі бок, бо падзеі складалі пагрозу далейшай легалізацыі атрыманых ім паўнамоцтваў і далейшага павелічэньня патэнцыялу апазыцыі. У чэрвені — ліпені быў узмоцнены кантроль за мэдыямі: “Народная газета” была падпарадкавана ўладам праз пераўтварэньне ў ЗАТ, было скасаванае рэгістрацыйнае пасьведчаньне “Белорусской деловой газеты”, праведзеныператрус у рэдакцыі газэты “Беларуская маладзёжная” (7 чэрвеня). Усё гэта можна было кваліфікаваць як пачатак арганізацыі рэфэрэндуму. У парлямэнт былі накіраваныя прапановы для ўдасканаленьня дзейнасьці Канстытуцыйнага суду. 20 чэрвеня на сустрэчы з прадстаўнікамі вэртыкалі А. Лукашэнка абвясьціў пра магчымасьць рэфэрэндуму адносна чатырох пытаньняў: 1) адносіны Беларусі і НАТО; 2) стаўленьне да прыватнай уласнасьці на зямлю; 3) зьмены ў Канстытуцыі; 4) новыя правілы выезду за мяжу.

## Падрыхтоўка ўладаў да рэфэрэндуму

8 жніўня 4 пытаньні рэфэрэндуму былі прапанаваныя прэзыдэнтам парлямэнту, але ў іншай рэдакцыі: 1) перанос Дня Незалежнасьці на 3 ліпеня; 2) прыняцьце Канстытуцыі Беларусі зь зьменамі і дапаўненьнямі, прапанаванымі прэзыдэнтам; 3) свабодныя, без абмежаваньня, купля-продаж зямлі; 4) скасаваньне сьмяротнага пакараньня. Зьмена кола праблемаў значыла імкненьне атрымаць большую падтрымку з боку грамадзтва і, адпаведна, большы рэзананс. Правесьці рэфэрэндум было прапанавана 7 лістапада. На гэта былі тры прычыны: інфармацыйная (“чырвоная” дата павінна была актывізаваць левы электарат), электаральная (каб супрацьдзейнічаць правядзеньню давыбараў у ВР, рэфэрэндум трэба было прызначыць раней за 24 лістапада. Гэта не дазваляла б выкарыстаць выдадзеныя ўрадам на рэфэрэндум грошы на канчатковае фармаваньне парлямэнту), эканамічная (у выпадку ўзьнікненьня праблемаў у адносінах з Расеяй запасаў паліва хапіла б, каб адтэрмінаваць энэргетычны крызыс).

Падрыхтоўка ўладаў да рэфэрэндуму ажыцьцяўлялася ў трох кірунках: 1) мабілізацыя актыўнай масавай падтрымкі; 2) стварэньне ўмоваў для пасіўнай падтрымкі (адсутнасьці супрацьдзеяньня); 3) арганізацыйная падрыхтоўка.

[15] Белорусская деловая газета. 1996. 3 июня.

Для адлюстраваньня актыўнай масавай падтрымкі павінен быў адбыцца Ўсебеларускі народны сход. Паводле плянаў Адміністрацыі прэзыдэнта ў ім меліся ўзяць удзел 6000 чалавек, вылучаных калектывамі прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, саўгасаў, ВНУ, камэрцыйных фірмаў і іншых установаў. Адказнасьць за вылучэньне дэлегатаў ускладалася на адміністрацыі раёнаў. Перавага ў краіне дзяржаўнай формы ўласнасьці над прыватнай гарантавала патрэбную колькасьць удзельнікаў. Папярэдняй датай кангрэсу было прызначана 14 верасьня. Аднак на канец лета — пачатак верасьня прыпала актывізацыя дзейнасьці апазыцыі, таму акцыя прайшла 20 кастрычніка.

Інфармацыйная падрыхтоўка рэфэрэндуму была распачатая яшчэ да яго афіцыйнага абвяшчэньня. 22 чэрвеня па БТ быў паказаны фільм "Прышчэпка супраць нянавісьці", які асацыятыўна адсылаў да падзеяў 1995 г. (да фільму "Нянавісьць"). У пачатку чэрвеня пад кіраўніцтвам Віктара Шэймана і Эдуарда Эйдзіна была пачатая распрацоўка Канцэпцыі вываду эканомікі Беларусі з крызысу. Кіраўнікам сілавых структураў было загадана распрацаваць указ "Аб стабілізацііі грамадзка-палітычнай сытуацыі ў краіне і перадухіленьні супрацьпрэзыдэнцкіх выступаў"[16].

Падрыхтоўка масавай сьвядомасьці да рэфэрэндуму палягала ў выкарыстаньні рэйтынгу А. Лукашэнкі ў якасьці "рычага", з дапамогай якога незадаволенасьць грамадзтва эканамічнай сытуацыяй ператваралася ў сродак узмацненьня ўлады. Прычыны эканамічнага крызысу падаваліся ўладай як вынік невыкананьня пастановаў прэзыдэнта. Каб палепшыць эканамічнае становішча, трэба знайсьці і пакараць вінаватых у невыкананьні — кіраўніцтва прадпрыемстваў і выканкамаў.

У пачатку жніўня пад кіраўніцтвам В. Шэймана была створаная "Камісія па кантролі за выкананьнем прэзыдэнцкіх указаў і пастановаў"[17]. Органы кантролю на розных падставах праводзілі праверкі прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Вынікі парушэньняў шырока асьвятляліся ў афіцыйных СМІ. У выніку ўборка ўраджаю 1996 г., узятая на кантроль прэзыдэнтам, вылілася ў агітацыйную кампанію. Выкарыстаньне кантрольных установаў дазваляла спалучаць уплыў на масавую сьвядомасьць з паглыбленьнем залежнасьці парлямэнтароў, большасьць зь якіх былі з "кіраўнікоў" (у раёнах ці на прадпрыемствах, адкуль яны выйшлі, маглі быць распачатыя праверкі зь цяжкімі вынікамі).

Першая хваля паляваньня на карупцыянэраў прыпала на жнівень 1996 г., калі былі апублікаваныя вынікі праверак па праблемах вытворчасьці малака[18], вясковага гандлю, тэхнічнага абслугоўваньня сельскай гаспадаркі[19]. (Падобныя захады пачалі ўжывацца ўжо з пачатку жніўня. Гл.: Советская Белоруссия. 1996. 9 августа; 15 августа; 16 августа.) 2 верасьня пачалася другая сэсія ВР, на якой мусілі быць канчаткова зацьверджаныя дата і пытаньні, вынесеныя на рэфэрэндум.

Другая хваля паляваньня прыпала на канец верасьня — пачатак кастрычніка[20]. Гэта быў пік супрацьстаяньня прэзыдэнта і парлямэнту наконт прызначэньня даты рэфэрэндуму.

На другой сэсіі ВР 4 верасьня быў абраны старшыня ЦВК Віктар Ганчар (за яго прагаласавала 111 з 150 прысутных дэпутатаў, што сьведчыла пра адсутнасьць адзінства нават у

[16] Белорусская деловая газета. 1996. 15 июля; 1997. 5 августа.

[17] Белорусская деловая газета. 1996. 5 августа.

[18] Советская Белоруссия. 1996. 24 августа.

[19] Советская Белоруссия. 1996. 27 августа.

[20] Советская Белоруссия. 1996. 25 сентября; Белорусская деловая газета. 1996. 10 октября.

прапрэзыдэнцкай фракцыі “Згода”). На тым самым пасяджэньні было забаронена выкарыстаньне выязных выбарчых урнаў, фінансаваньне рэфэрэндуму з пазабюджэтных сродкаў і была зацьверджана неадпаведная інтарэсам прэзыдэнта дата рэфэрэндуму — 24 лістапада 1996 г.[21]. Пытаньні, якія не адпавядалі інтарэсам боку прэзыдэнта, маглі быць зацьверджаныя толькі тайным галасаваньнем.

Сам факт гэтых рашэньняў сьведчыў пра аслабленьне пазыцыяў прэзыдэнта за час парлямэнцкіх канікулаў. На працягу жніўня адбываліся кансультацыі паміж прадстаўнікамі партыяў і расейскімі палітыкамі[22]. На фоне незадавальненьня Масквы дзеяньнямі А. Лукашэнкі (падтрымкі на прэзыдэнцкіх выбарах Г. Зюганава; захадаў для пашырэньня ўплыву ў расейскіх рэгіёнах) у цэнтральнай расейскай газэце “Известия”(15.08.1996) быў апублікаваны артыкул з камэнтарамі да дакумэнтаў наконт арганізацыі замежнапалітычнага забесьпячэньня рэфэрэндуму. На падставе іх аналізу рабіліся высновы аб імкненьні А. Лукашэнкі сфармаваць у замежжы погляд на сваю палітыку як “зрушаную ўправа”, а “левы парлямэнт” падаць “пагрозай дэмакратыі”, зь якой трэба змагацца, зьмяняючы Канстытуцыю на рэфэрэндуме.

12 верасьня пасьля кансультацыі з 85 парлямэнтарамі А. Лукашэнка тэрмінова зьехаў у Маскву. Сэнс паездкі быў у дэманстрацыі парлямэнцкай і “вэртыкальнай” эліце добрых адносінаў з Крамлём як факту захаваньня моцы. Аднак розьніца паміж колам сустрэчаў у Маскве, заяўленым прэс-службай А. Лукашэнкі і пададзеным у незалежных газэтах, паказвае, што адносіны з афіцыйнай Масквой былі дастаткова напружаныя. Першае ўключала Б. Ельцына, А. Завяруху, Я. Прымакова, В. Чарнамырдзіна, І. Радзівонава, А. Лебедзя. У незалежных газэтах жа адзначалася, што дакладна вядома толькі пра сустрэчы з апошнімі двума. З Б. Ельцыным і А. Завярухам сустрэчы былі немагчымыя[23]. 16 верасьня (праз 4 дні пасьля паездкі ў Маскву) адбылася сустрэча А. Лукашэнкі зь беларускімі партыйнымі лідэрамі савецкіх часоў: Аляксеем Камаём, Анатолем Малафеевым, Аляксандрам Аксёнавым і інш.[24] Акрамя партыйнага статусу, які мелі гэтыя асобы, большасьць зь іх былі ў мінулым яшчэ і “патронамі” для значнай часткі дзейнай палітычнай эліты. Празь іх будаваліся як сувязі ў “рэспубліцы”, так і сувязі з Масквой. Іх падтрымка была апошняй надзеяй заклікаць парлямэнтароў да парадку. Слабая выніковасьць гэтага захаду ілюструецца зробленай 16 верасьня заявай Урала Латыпава, у якой ён казаў пра малую імавернасьць сілавой разьвязкі падзеяў з прычыны высокага рэйтынгу прэзыдэнта[25]. Гучала гэта як нагадваньне, што рэйтынг А. Лукашэнкі ў спалучэньні з кантролем над сілавымі структурамі дазваляе правесьці зьмены ў Канстытуцыю нават і без супрацоўніцтва зь нязгоднымі. Але паездкі і А. Лукашэнкі, і парлямэнтароў у Маскву працягваліся ўсю восень.

З 17 верасьня робяцца захады, якія павінны былі дэманстраваць пошук кампрамісу паміж бакамі, — спроба правесьці праз парлямэнт варыянт пагадненьня, але настойваньне фракцыі “Згода” на фармулёўках, выгадных для прэзыдэнта, паралізавала перамовы. М. Мясьніковіч робіць заяву, зь якой вынікае магчымасьць правесьці рэфэрэндум і выбары 24 лістапада.

Аднак на рахунак ЦВК не пералічваюцца грошы. (Фактычна існавалі два рахункі збору сродкаў для правядзеньня рэфэрэндуму: у Белбізнэсбанку, падкантрольным ЦВК, і ў Бела-

[21] Белорусская деловая газета. 1996. 9 сентября.
[22] Белорусская деловая газета. 1996. 2 сентября.
[23] Белорусская деловая газета. 1996. 9 сентября.
[24] Советская Белоруссия. 1996. 17 сентября.
[25] Белорусская деловая газета. 1996. 16 сентября.

русбанку, падкантрольным выканаўчай уладзе, менавіта на апошні афіцыйныя газэты заклікалі прадпрыемствы пераводзіць грошы для фінансаваньня рэфэрэндуму. Гл.: Советская Белоруссия. 1996. 13 сентября.) 20 верасьня М. Мясьніковіч сустрэўся з супрацоўнікамі КДБ з мэтай высьветліць іх стаўленьне да супрацьстаяньня[26]. На сумеснай нарадзе ўраду і "вэртыкалі" 4 кастрычніка прэзыдэнт прапанаваў тым функцыянэрам, хто "адчувае сябе няўпэўнена" на сваёй пасадзе, "прыняць прынцыповае рашэньне", астатнім — узяць удзел у падрыхтоўцы рэфэрэндуму[27]. 5 кастрычніка ў афіцыйных газэтах зьявіліся паведамленьні пра стварэньне пад патранажам прэзыдыўмаў аблвыканкамаў участковых камісіяў для правядзеньня рэфэрэндуму, а таксама "штабоў для правядзеньня плебісцыту"[28]. Фактычна гэтыя штабы павінны былі дзейнічаць паралельна камісіям, сфармаваным ЦВК. Піянэрам гэтага руху была Магілёўская вобласьць. Вынік быў адлюстраваны ў справаздачы працоўнай групы ВР для правядзеньня рэфэрэндуму: "Мясцовыя ўлады, не выступаючы супраць выбараў адкрыта, робяць усё для зрыву выбарчай кампаніі"[29].

На фоне канстытуцыйнага крызысу цягам восені на месцах адбывалася падрыхтоўка да рэфэрэндуму пад патранажам мясцовай улады. Агітацыйная кампанія вялася праз сэгмэнтацыю электарату і заахвочваньне яго асобных сэгмэнтаў да ўдзелу ў рэфэрэндуме праз праўныя і арганізацыйныя захады.

Важнай патэнцыйна-пратэстнай групоўкай была студэнцкая моладзь. Адзначаючы актыўны ўдзел гэтай групы, мы ня згодныя з экспэртамі, якія адзначалі, што яна была асноўнай. Склад тых, хто спачуваў мітынгам (працэнт грамадзян, гатовых прыняць удзел у акцыях пратэсту, сярод грамадзян 24 і 54 гадоў прыкладна аднолькавы: 20—46 %), і асабістыя назіраньні ўдзельнікаў сьведчаць пра большую разнастайнасьць сацыяльна-дэмаграфічнага і прафэсійнага складу ўдзельнікаў.

Пад кіраўніцтвам Аляксандра Пазьняка быў створаны Дзяржкамітэт па справах моладзі. У красавіку ім была распрацаваная праграма "Моладзь Беларусі", зь яго ініцыятывы праводзіўся шэраг круглых сталоў зь лідэрамі моладзевых арганізацыяў з мэтай структураваньня іх сыстэмы.

Да старэйшага пакаленьня больш рабіліся матэрыяльныя захады. У сытуацыі эканамічнага крызысу дзяржава не магла вярнуць адчуваньня дабрабыту савецкіх часоў, але магла прадэкляраваць імкненьне да яго, прапанаваўшы сыстэму сацыяльных ільгот, якая б вымусіла грамадзянаў канкураваць за іх атрыманьне. У выніку "сацыяльная дзяржава" стала ня толькі сродкам агітацыі, але і галоўным брэндам краіны, які захаваўся дагэтуль, добра спалучаючыся з брэндам "паляваньня на карупцыянэраў". У выпадку невыніковасьці першага апраўдвалася неабходнасьць другога.

Першая спроба накіраваць палітыку ў гэтае рэчышча была зробленая яшчэ 20 чэрвеня 1996 г., калі парлямэнту было прапанавана зьмяніць Закон аб прадпрыемствах, надаўшы зарплаце статус першачарговага плацяжа. Прапанова была адхіленая. Паводле словаў Г. Карпенкі, яна пагражала супрацьстаяньнем бюджэтных установаў і прамысловых прадпрыемстваў.

На працягу жніўня — верасьня 1996 г. прэзыдэнтам была прынятая рэкордная колькасьць

[26] Белорусская деловая газета. 1996. 26 сентября.

[27] Советская Белоруссия. 1996. 5 октября.

[28] Тамсама.

[29] Белорусская деловая газета. 1996. 3 октября.

сацыяльна арыентаваных нарматыўных актаў. Першыя зь іх — распараджэньні № 251 "Аб матэрыяльнай дапамозе шматдзетным сем'ям" (да такіх адносіліся тыя, хто меў больш за 3 дзяцей), № 252 "Аб аказаньні адзінокім пэнсіянэрам і інвалідам, што жывуць у нястачы, аднаразовай грашовай дапамогі для набыцьця сельгаспрадукцыі і паліва". Указам прэзыдэнта № 345 адбывалася ўпарадкаваньне цэнаўтварэньня, якое забараняла ўздымаць цэны без павышэньня зарплаты. Сярод тавараў, цэны на якія кантраляваліся Міністэрствам эканомікі, былі, напрыклад, сьпіртныя напоі. Указам № 340 "Аб узмацненьні сацыяльнай падтрымкі працоўных бюджэтнай сфэры" ўводзілася практыка штоквартальнага прэміяваньня ў памеры 5 мінімальных зарплатаў. Мізэрныя памеры зарплатаў не давалі магчымасьці годнага існаваньня, дазвол зьмены памераў прэміяў у залежнасьці ад вынікаў працы пашырыў залежнасьць падначаленых ад кіраўніцтва, якая й была выкарыстаная ў электаральным працэсе.

З жніўня 1996 г. была распачатая сыстэма льготнага крэдытаваньня, якую ўводзіў указ № 358 "Аб захадах для паляпшэньня жыльлёвых умоваў моладзі". Наяўнасьць на рахунках грашовай масы дазваляла выконваць пэўную колькасьць узятых абавязкаў. А ўказам № 344 "Аб своечасовай выплаце зарплатаў, пэнсіяў, стыпэндыяў, дапамогі" адказнасьць за невыкананьне адзначаных у ім захадаў ускладалася на кіраўнікоў прадпрыемстваў[30].

Згодна з камэнтарам кіраўніцтва Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, адказнасьць за нявыплату сацыяльнай дапамогі таксама несьлі кіраўнікі[31]. Ужытыя захады былі шырока разрэкламаваныя ў афіцыйных СМІ — асноўнай крыніцы інфармацыі для большасьці грамадзянаў.

У выніку спалучэньня традыцыяў удзелу і захадаў уладаў, Усебеларускі народны сход прайшоў 19—20 кастрычніка без эксцэсаў, хаця сьцягваньне войскаў і захады перасьцярогі, ужытыя падчас акцыі, указвалі на чаканьньне прэзыдэнцкім бокам супраціву. 16 кастрычніка адбылася сустрэча А. Лукашэнкі з прэзыдэнтам Расеі Б. Ельцыным. У выніку, насуперак прагнозам, на "народным" сходзе А. Лукашэнка ня стаў прапаноўваць зацьвердзіць 7 лістапада (гэтая дата была прычынай канфлікту паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам) як дату рэфэрэндуму (пагатоў што Канстытуцыйны суд папярэдзіў удзельнікаў зьезду пра адсутнасьць у іх права прызначаць рэфэрэндум). Рэфэрэндум павінен быў адбыцца ў дзень, прызначаны парлямэнтам, 24 лістапада, адносна 7 пытаньняў (4 прапанаваныя прэзыдэнтам, 3 — фракцыямі камуністаў і аграрнікаў). Прыезд 28 кастрычніка Рэма Вяхірава і тое, што скарачэньні паставак газу ў Беларусь адбыліся толькі ў сьнежні 1996 г., ужо пасьля рэфэрэндуму, указвае на дасягненьне падчас сустрэчы прэзыдэнтаў дамоўленасьці наконт газавых пытаньняў.

У дзень правядзеньня сходу адбыўся і Кангрэс дэмакратычных сілаў у абарону Канстытуцыі. Дзеяньні боку прэзыдэнта і боку апазыцыі прывялі да таго, што ўдзел грамадзянаў у рэфэрэндуме залежаў не ад пазыцыяў адносна яго пытаньняў, а быў дэманстрацыяй прыхільнасьці прэзыдэнту ці парлямэнту. Згодна з вынікамі апытаньняў, праведзеных у канцы верасьня — пачатку кастрычніка, удзельнічаць у рэфэрэндуме меліся 73,8 % апытаных, аднак толькі 47 % лічылі, што рэфэрэндум неабходны. Вызначаную пазыцыю мелі больш за 2/3 апытаных і толькі ў пытаньнях скасаваньня сьмяротнага пакараньня і фінансаваньня галінаў

[30] Гл. таксама ўказ № 360 ад 13 верасьня 1996 г. "Аб павелічэньні дзяржаўнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей", указ № 384 "Аб павелічэньні даплатаў за навуковыя ступені і званьні" і інш. У жніўні 1996 г. пачалася (і прыкра скончылася) гісторыя наданьня БДУ статусу вядучай ВНУ краіны. Падпісаньне ўказу прэзыдэнта № 342 з нагоды 75-гадовага юбілею БДУ суправаджалася шматлікімі сустрэчамі з выкладчыкамі і студэнтамі ўнівэрсытэту.

[31] Советская Белоруссия. 1996. 4 сентября.

улады. Знаёмства зь зьменамі да Канстытуцыіі адзначылі 35,4 % (з прэзыдэнцкімі) і 19,9 % (з прапанаванымі фракцыямі камуністаў і аграрнікаў) апытаных, 20 % не маглі адказаць, вядомыя ім зьмены ці не. Гэта пры тым, што варыянт, прапанаваны фракцыямі камуністаў і аграрнікаў, быў надрукаваны толькі 11 лістапада, праз тры дні пасьля пачатку датэрміновага галасаваньня і праз два тыдні пасьля правядзеньня апытаньня. Як сьведчаць апытаньні, праведзеныя ў лістападзе 1996 г., значная колькасьць людзей ня вызначылася наконт асноўных пытаньняў рэфэрэндуму (56,8 % — адносна зьменаў, прапанаваных фракцыямі, 39 % — да прэзыдэнцкіх зьменаў). Фактычна вынікі сьведчаць пра тое, што спроба вярнуць грамадзтва да мадэлі рытуалізаванай падтрымкі, што мела месца ў 1990 г., удалася. Гэта адлюстравалася і ў выніках рэфэрэндуму.

## Вынікі рэфэрэндуму 1996

Наяўнасьць кантролю над выканаўчай уладай на месцах давала магчымасьць боку прэзыдэнта захапіць ініцыятыву арганізацыі волевыяўленьня на рэфэрэндуме. 31 кастрычніка было прынята рашэньне фінансаваньня рэфэрэндуму і выбараў зь дзяржбюджэту і добраахвотных ахвяраваньняў прадпрыемстваў. Але гэтыя сродкі былі пералічаны не ЦВК, а непасрэдна тэрытарыяльным фінансавым упраўленьням і не прадугледжваліся дзеля фінансаваньня выбараў. Правал спробы ВР арганізаваць 11 лістапада нараду кіраўнікоў выканкамаў розных узроўняў пацьвердзіў адсутнасьць у прадстаўнічай улады магчымасьці пракантраляваць гэтыя сродкі. 9 лістапада пачалося датэрміновае галасаваньне. 14 лістапада ўказам прэзыдэнта незаконна быў адхілены ад пасады старшыня ЦВК В. Ганчар. Выканаўцай абавязкаў старшыні была прызначаная Л. Ярмошына.

Нягледзячы на пачатак працэдуры імпічмэнту (збор подпісаў за імпічмэнт быў скончаны 18 лістапада), 24 лістапада рэфэрэндум адбыўся.

Паводле афіцыйных дадзеных удзел узялі 84,14 % выбарнікаў. За перанясеньне Дня Незалежнасьці на 3 ліпеня прагаласавалі 88,18 %, "супраць" — 10,46 %, за прыняцьце Канстытуцыі 1994 г. у рэдакцыі, прапанаванай А. Лукашэнкам, — 70,45 %, "супраць" — 9,39 %, за неабмежаваны продаж зямлі — 15,35 %, "супраць" — 82,88 %, за скасаваньне сьмяротнага пакараньня — 17,93 %, "супраць" — 80,44 %. За прыняцьце Канстытуцыі 1994 г. у рэдакцыі, прапанаванай фракцыямі камуністаў і аграрнікаў, прагаласавалі 7,93 %, "супраць" — 71,2 %, за выбраньне кіраўнікоў мясцовых органаў улады — 28,14 %, "супраць" — 69,92 %, за роўнае галоснае фінансаваньне галінаў улады зь дзяржбюджэту — 32,18 %, "супраць" — 65,85 %. Давыбары ў парлямэнт адбыліся ў 60 акругах з 61. Паводле іх вынікаў было абрана 4 дэпутаты з 253 вылучаных кандыдатаў.

Ува ўмовах дысбалянсу паміж уладамі цяжка ацэньваць адпаведнасьць гэтых вынікаў рэчаіснасьці. Аднак фактам ёсьць тое, што яшчэ 19 лістапада 110 з 198 парлямэнтароў, пакінуўшы пасяджэньне ВР, сабраліся на нарадзе ў Адміністрацыі прэзыдэнта. Масавы пратэст супраць вынікаў рэфэрэндуму ня быў гэтулькі моцным, каб пераканаць выканаўчую ўладу вярнуцца ў праўнае поле. 27 лістапада А. Лукашэнка падпісаў указ № 495 "Аб зацьверджаньні сьпісу дэпутатаў Вярхоўнай Рады Рэспублікі Беларусі, уключаных у склад палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі", а таксама закон "Аб прыпыненьні паўнамоцтваў Вярхоўнай Рады Рэспублікі Беларусі XIII скліканьня".

У ПП увайшло 110 дэпутатаў ВР XIII скліканьня. З 59 дэпутатаў, абраных у другім туры ў 1995 г., у ПП засталіся каля 50. Найбольш прадстаўленым у ПП рэгіёнам быў Менск. З 35 менскіх прадстаўнікоў 17 былі функцыянэрамі вышэйшых дзяржаўных установаў (Адміністрацыі прэзыдэнта, Службы кантролю) ці мелі публічную вядомасьць. Ад астатніх абласьцей засталося ад 10 (Гарадзенская) да 17 (Гомельская) дэпутатаў. Найбольш шматлікай прафэсійнай групоўкай былі кіраўнікі прадпрыемстваў.

У 1997 г. была сфармаваная верхняя палата НС РБ — рада рэспублікі. Склад функцыянэраў РР нагадвае вынікі выбараў ВР 1990 г. Найбольшая колькасьць дзяржаўных функцыянэраў сярод васьмі сэнатараў — з Магілёўскай вобласьці, усе функцыянэры прадстаўляюць выканкамы абласнога (3) і раённага (1) узроўню, астатнія вобласьці прадстаўляюць ад 2 (Менская) да 3 (Гомельская, Берасьцейская, Віцебская) дзяржаўных функцыянэраў. Сярод іх функцыянэры абласных выканкамаў і Радаў прадстаўленыя ў прапорцыі 2:1. Як і ў ПП, у РР колькасьць прамысловых кіраўнікоў большая за колькасьць аграрнікаў (11:5).

У дзень правядзеньня рэфэрэндуму адбыліся і давыбары дэпутатаў у ВР XIII скліканьня па 61 акрузе, дзе ў 1995 г. дэпутаты не былі абраныя. Арганізацыя волевыяўленьня не дазваляе казаць, што атрыманы вынік дае поўнае ўяўленьне пра палітычныя прэфэрэнцыі большасьці грамадзян. Вылучэньне кандыдатаў адбывалася ўва ўмовах супрацьдзеяньня цэнтральных і падпарадкаваных ім мясцовых уладаў, што значна абмежавала колькасьць тых, хто жадаў пазмагацца за мандат. Параўнаньне ўзроўню яўкі выбарнікаў у акругах, дзе праводзіўся толькі рэфэрэндум і дзе праводзіліся як давыбары, так і рэфэрэндум, таксама ставіць пад сумнеў ня толькі вынікі выбараў, але наогул наяўнасьць у грамадзян жаданьня ўдзелу ў палітыцы. Вынікі давыбараў не дазваляюць ацаніць адносную значнасьць палітычных партыяў для грамадзтва, але дазваляюць праранжыраваць іх адносную моц, якая б мела месца пры ўмове адсутнасьці нэгатыўных захадаў з боку ўладаў. У першым туры здолелі пераканаўча перамагчы толькі два кандыдаты: Уладзімер Тарасаў (АГП) і Генадзь Грушавы (да 1996 БНФ, з 1996 старшыня Беларускай хрысьціянска-дэмакратычнай партыі). Нават гэты факт пацьвярджае нявызначанасьць палітычных пазыцыяў беларускіх выбарнікаў. Так, Г. Грушавы, старшыня праўленьня фонду “Дзецям Чарнобылю”, прайшоў у мікрараёне Малінаўка, дзе пэўная частка выбарнікаў — перасяленцы з чарнобыльскіх раёнаў. Наяўнасьць у другім туры значнай колькасьці партыйных кандыдатаў (напрыклад, ад АГП у другі тур трапілі 20 кандыдатаў, або 70 % ад агульнай колькасьці вылучаных) таксама заканамерная пры тагачаснай практыцы вылучэньня кандыдатаў. Аднак другі тур давыбараў так і не адбыўся...

Вынікі рэфэрэндуму 1996 г. замацавалі створаную дэ-факта ў 1994—1995 гг. сыстэму падпарадкаваньня. Аднак, нягледзячы на масавы пратэст вясны 1996 г., гэтыя вынікі былі прадвызначаныя, таму што асновы рытуалізаваных электаральных паводзінаў беларускіх грамадзянаў пачалі складвацца з часу паўстаньня незалежнай дзяржавы.

## ПРАЦЭС РАЗДВАЕНЬНЯ ОРГАНАЎ УЛАДЫ Ў ВЫНІКУ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА КРЫЗЫСУ ЛІСТАПАДА 1996

Аўтарытарны стыль кіраваньня прэзыдэнта Лукашэнкі і яго наступства, канстытуцыйны крызыс лістападу 1996 году, прывёў да таго, што з 24 лістапада 1996 г. у Беларусі склалася,

а пасьля 20 ліпеня 1999 г. замацавалася сытуацыя суіснаваньня легітымных безуладных і нелегітымных пануючых органаў улады. Пры гэтым у практыцы іх функцыянаваньня з абодвух бакоў усталявалася перавага нефармальных інстытутаў над фармальнымі*. Рэарганізацыя вышэйшых органаў дзяржаўнае ўлады, умацаваньне выканаўчай вэртыкалі і сілавых структураў, усталяваньне кантролю над СМІ і ўсімі галінамі жыцьця грамадзтва, а таксама выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу на выбарах дазволіла А. Лукашэнку застацца пры ўладзе пасьля сканчэньня тэрміну яго прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў, акрэсьленых у Канстытуцыі 1994 г., па якой ён абіраўся. Апазыцыйныя сілы, ня здолеўшы прадухіліць гэтага працэсу, замацавалі за сабой ролю абароньнікаў канстытуцыйнай законнасьці і аўтарытэтных прадстаўнікоў беларускага грамадзтва.

## Заканадаўчая ўлада

Найвышэйшым прадстаўнічым пастаянна дзеючым і адзіным заканадаўчым органам дзяржаўнай улады ў Беларусі зьяўляецца Вярхоўны Савет. У арт. 83 Канстытуцыі 1994 г. за ім замацаваныя такія паўнамоцтвы, як прызначэньне рэспубліканскіх рэфэрэндумаў, прыняцьцё і ўнясеньне зьменаў у Канстытуцыю, абраньне Канстытуцыйнага суду і кіраўнікоў іншых найвышэйшых органаў судовае ўлады, а таксама зацьвярджэньне рэспубліканскага бюджэту[1].

Працэс раздваеньня заканадаўчае ўлады ў Беларусі ўпершыню акрэсьліўся падчас першага канфлікту паміж прэзыдэнтам і ВС 12 скліканьня ў красавіку 1995 г. Хаця вага апазыцыі ў ВС 13 скліканьня была меншай, чым у папярэднім складзе**, разыходжаньні паміж ім і прэзыдэнтам акрэсьліліся пры выбары старшыні. Насуперак жаданьню А. Лукашэнкі, ім стаў не былы прэм'ер-міністар В. Кебіч, а старшыня Аграрнай партыі С. Шарэцкі, які заявіў, што мае намер дзейнічаць у імя рынкавых рэформаў, захаваньня сувэрэнітэту краіны і недатыкальнасьці Канстытуцыі.

Закладзеная ў Канстытуцыі 1994 г. сыстэма стрымак і супрацьвагаў пачынала працаваць і не дазваляла прэзыдэнту бесканфліктна сканцэнтраваць усю паўнату дзяржаўнай улады ў сваіх руках. Тым ня менш, падтрымка на рэфэрэндуме 1995 г. пытаньня аб праве прэзыдэнта распускаць парлямэнт дала яму грунт для грэбаваньня законам. Зьмены ў Канстытуцыі, ініцыяваныя прэзыдэнтам, былі пакліканыя прыстасаваць заканадаўства да вынікаў усенароднага волевыяўленьня. Дзеля гэтага была выкарыстана адмыслова створаная ў якасьці структуры выканаўчай улады Прававая кансультацыйная рада***. Калі ініцыятыва прэзыдэнта аб пра-

[1] Гл. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Менск: Полымя, 1994. С. 14–15. Гл. Пастухов М. Судебная власть: сегодня и завтра // Згода. 1998. №3(115).

* Маюцца на ўвазе інстытуты не як ўстановы і арганізацыі, а як ўстойлівыя сыстэмы практык, што санкцыянуюцца і падтрымліваюцца з дапамогай сацыяльных нормаў.

** У ВС 13-га скліканьня не патрапілі прадстаўнікі БНФ, але там былі ўтвораны фракцыі камуністаў (44 дэпутаты, ці 22% дэпутацкага корпусу), аграраў (48 чал., ці 24%), лібэралаў (фракцыя «Грамадзянскае дзеяньне» ў складзе 18 чал., ці 10%) і сацыял-дэмакратаў (фракцыя «Саюз працы» з 18 чал.). 92 дэпутаты былі беспартыйнымі. Яны ўтварылі самую шматлікую фракцыю «Згода», у якую ўвайшло 59, або 30% дэпутатаў.

*** Прававая канстытуцыйная рада з 19 юрыстаў на чале з намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта А. Абрамовічам была ўтвораная ўказам ад 14 красавіка 1996 г.

вядзеньні рэфэрэндуму з пытаньнем аб замене Канстытуцыі была абвешчана, дэпутаты ня мелі магчымасьці яе заблякаваць*. Усьведамляючы посьпех прэзыдэнцкіх ініцыятываў на плебісцытах і беспэрспэктыўнасьць тактыкі пазьбяганьня зваротаў да народу, адзінае, што яны маглі супрацьпаставіць спробе зьмены Канстытуцыі, — гэта дадаць уласныя пытаньні, якія ў выпадку падтрымкі выпустошвалі б сэнс пытаньняў, прапанаваных А. Лукашэнкам, і не дазволілі тлумачыць вынікі рэфэрэндуму адназначна на карысьць выканаўчай улады. Апрача гэтага, фракцыямі камуністаў і аграраў быў распрацаваны ўласны праект Канстытуцыі, у якім пасады прэзыдэнта не было ўвогуле.

На ініцыятыву сьпікера С. Шарэцкага, які засумняваўся ў правамоцнасьці вынясеньня новых праектаў Канстытуцыі на рэфэрэндум, пастанова ВС ад 6 верасьня 1996 г. аб прызначэньні рэфэрэндуму была разгледжана ў Канстытуцыйным Судзе. 4 лістапада Канстытуцыйны Суд (далей — КС) прыняў пастанову аб тым, што абодва варыянты праектаў Канстытуцыі прадугледжваюць зьмену дзяржаўнага ладу і таму вынікі такога рэфэрэндуму ня могуць мець абавязковай сілы. Кансультацыйны характар рэфэрэндуму быў пазначаны нават у бюлетэнях для галасаваньня. Тым ня менш, на падставе яго вынікаў уся структура вышэйшых органаў дзяржаўнае ўлады ў краіне была рэарганізавана.

Паводле арт. 91 Канстытуцыі 1996 г., беларускі парлямэнт — Нацыянальны сход — складаецца зь дзьвюх палатаў: Палаты прадстаўнікоў (110 дэпутатаў) і Савету Рэспублікі (64 дэпутаты). Найвышэйшая палата — Савет Рэспублікі — адначасова ёсьць палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Ад кожнай з 6 абласьцей і ад г. Менску ў яе абіраецца па 8 чалавек, а яшчэ 8 прызначаецца прэзыдэнтам.

Першая рэпэтыцыя сэсіі новага парлямэнту абылася яшчэ да рэфэрэндуму, 19 лістапада, калі 80 ляяльных да прэзыдэнта дэпутатаў на запрашэньне дэпутата Івана Пашкевіча накіраваліся на нараду ў будынак Адміністрацыі прэзыдэнта, стварыўшы тым самым праблему кворуму на паседжаньні Вярхоўнага Савету (далей — ВС). Сапраўдная ж рэарганізацыя парлямэнту пачалася да афіцыйнага абвяшчэньня вынікаў рэфэрэндуму, 25 лістапада. Дэпутаты былі ізноў запрошаныя ў Адміністрацыю, дзе кожнаму зь іх было прапанавана падпісаць тыпавую заяву з просьбай аб залічэньні ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У першы дзень гэты дакумэнт падпісалі 62 з 84 прыбылых дэпутатаў. На наступны дзень, калі, па афіцыйных зьвестках, сабралося 117 дэпутатаў, былі сфармаваныя органы кіраваньня ПП НС (далей ПП НС). Сьпікерам, на прапанову А. Лукашэнкі, стаў былы першы сакратар ЦК КПБ Анатоль Малафееў, а віцэ-сьпікерам — Лукашэнкаў даўні сябра, былы дэпутат Вярхоў-

* Аб тым, як Вярхоўны Савет губляў палітычную вагу ўва ўмовах манапалізацыі СМІ беларускім рэжымам, сьведчыць гісторыя адчужэньня «Народнай газеты» — аднаго з найбольш папулярных у Беларусі выданьняў, заснавальнікам якога зьяўляўся ВС. 28 чэрвеня 1996 г. , калі Вярхоўны Савет прагаласаваў за прызначэньне новым рэдактарам «НГ» дэпутата ВС 13 скліканьня Леаніда Юнчыка, ейны дагэтулешні рэдактар Міхаіл Шыманскі ў той жа дзень рэарганізаваў газэту ў адкрытае акцыянэрнае таварыства, якое сам жа і ўзначаліў. Юрыдычнай падставай для гэтых захадаў сталі ўказы А. Лукашэнкі, выдадзеныя на падставе фальшывых дакумэнтаў. Ня маючы гарантаванага доступу да дзяржаўных СМІ, ува ўмовах, калі дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй была разгорнута антыпарлямэнцкая прапаганда, ВС згубіў апошнюю падкантрольную сабе крыніцу інфармацыі (за выключэньнем газэты «Звязда»). [Гл. О реорганизации редакции газеты «Народная газета». Указ Президента Республики Беларусь №233 от 28.06.96. О назначении М.В.Шиманского генеральным директором открытого акционерного общества — главным редактором газеты «Народная газета». Указ Президента Республики Беларусь №235 от 28.06.96].

нага Савету 13 скліканьня Ўладзімер Канаплёў. У ПП НС увайшло 70%, ці 52 дэпутаты фракцыі «Згода», а таксама палова аграраў і камуністаў: 24 дэпутаты ад аграраў і 21 дэпутат ад камуністаў. 28 лістапада ПП НС прыняла пастанову адклікаць зварот дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў КС, чым прадухіліла ўзнаўленьне справы аб імпічмэнце прэзыдэнта. Між тым, 63 дэпутаты ВС, якія паставілі подпісы пад гэтым зваротам і засталіся вернымі Канстытуцыі 1994 г., сваіх подпісаў так і не адклікалі.

Прапанову напісаць заяву з просьбай аб уключэньні ў склад новага парлямэнту праігнаравалі 50 дэпутатаў. Адначасова з стварэньнем новага парлямэнту 70 дэпутатаў працягвалі паседжаньне Вярхоўнага Савету. Ад імя прэзыдыюму ВС яны прынялі заяву аб непрызнаньні вынікаў рэфэрэндуму. Падчас абмеркаваньня сытуацыі дэпутат Андрэй Клімаў прапанаваў выдаць указ аб арышце А. Лукашэнкі. Ягоны апанэнт дэпутат Міхаіл Варановіч заклікаў калег прызнаць паразу і ўзяць удзел у фармаваньні новага парлямэнту. Бальшыня ж дэпутатаў аддала перавагу памяркоўнай пазыцыі — працягваць работу, каб не дапусьціць легітымізацыі дзяржаўных структураў, утвораных на падставе вынікаў рэфэрэндуму. У выніку дэпутаты прызначылі на найбліжэйшы дзень эканамічныя слуханьні з удзелам найбуйнейшых партыяў, а 28 лістапада будынак Вярхоўнага Савету быў зачынены «на рамонт», і сход дэпутатаў ВС канчаткова згубіў прыкметы сэсіі парлямэнту.

Будучы прызнаным міжнароднай супольнасьцю*, ВС згубіў магчымасьць выконваць заканадаўчыя і прадстаўнічыя функцыі, бо ажыцьцяўленьне яго пастановаў нічым не забясьпечвалася. Зь лютага 1997 г. дэпутаты Вярхоўнага Савету, максымальная колькасьць якіх не перавышала 50 чалавек, працягвалі сваю работу ў якасьці палітычных экспэртаў і перасталі называць свае паседжаньні парлямэнцкімі сэсіямі, аддаўшы перавагу больш сьціпламу вызначэньню — «дэпутацкія сходы». У адрозьненьне ад чальцоў ПП НС, яны праяўлялі надзвычайную актыўнасьць у дыскусіях, але наступствы іх работы абмяжоўваліся прыняцьцём палітычных заяваў і стварэньнем новых унутрыпарлямэнцкіх і каляпарлямэнцкіх структураў. Паколькі галоўны плён давала міжнародная дзейнасьць дэпутатаў, то і найбольшы інтарэс выклікалі пытаньні, зьвязаныя з вызначэньнем складаў міжнародных дэлегацыяў.

Сярод першых унутрыпалітычных ініцыятываў распушчанага Вярхоўнага Савету найбольшае значэньне мела дзейнасьць Камісіі па прававой ацэнцы дзеяньняў прэзыдэнта, старшынём якой быў абраны В. Ганчар. 14 кастрычніка 1997 г. дэпутаты ўхвалілі справаздачу камісіі і падпісалі заяву аб немагчымасьці выкананьня А. Лукашэнкам прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў. Пастанова, як і бальшыня рашэньняў ВС, мела важнае сымбалічнае значэньне, але на практыцы яе наступствам сталі перасьледы дэпутатаў акурат за іх парлямэнцкую дзейнасьць**. Між тым, на шляху дэпутатаў да ўлады пастанова камісіі В. Ганчара была толькі паўмерай і мела стаць першым крокам да ўзнаўленьня працэдуры імпічмэнту, дзеля чаго прынцыповае

* 25 лістапада 1996 году афіцыйны Вашынгтон выказаў расчараваньне правядзеньнем беларускага рэфэрэндуму, які быў прызнаны АБСЭ ды іншымі міжнароднымі арганізацыямі незаконным. Эўрапарлямэнт працягваў лічыць сваім партнэрам у Беларусі Вярхоўны Савет. Кіраўніцтва Эўрапейскага Зьвязу і ЗША параілі бізнэсоўцам устрымацца ад укладаньня сваіх капіталаў у беларускую эканоміку.

** Чальцу фракцыі «Грамадзянскае дзеяньне» У. Кудзінаву прысудзілі 7 год па абвінавачаньні ў спробе дачы хабару. Прадстаўнікі ўлады афіцыйна заяўлялі аб адсутнасьці ў Беларусі такой установы, як Вярхоўны Савет, але ў позьве, якую С. Шарэцкаму накіравала пракуратура, да яго зьвярнуліся як да Старшыні ВС. Супраць самаго ж старшыні камісіі В. Ганчара па абвінавачваньні ў «паклёпе на прэзыдэнта» была ўзбуджана крымінальная справа.

значэньне мела наданьне дэпутацкім сходам статусу паўнамоцных паседжаньняў Вярхоўнага Савету. Група дэпутатаў на чале з В. Ганчаром распрацавала пакет матэрыялаў дзеля падрыхтоўкі і правядзеньня паўнамоцных паседжаньняў Вярхоўнага Савету*. Сярод дэпутатаў нават пачаўся другі збор подпісаў за імпічмэнт, але пастанова аб пазбаўленьні дэпутацкіх мандатаў чальцоў Палаты прадстаўнікоў была заблякаваная камуністамі, аграрамі і часткай сацыял-дэмакратаў. У выніку Вярхоўны Савет не прызнаў за сабой права зьбіраць парлямэнцкія сэсіі.

Такім чынам, Вярхоўны Савет захаваў легітымнасьць і здольнасьць прымаць палітычныя заявы, але згубіў мэханізм іх выкананьня і паўнамоцтвы на прыняцьцё пастановаў, якія б закраналі дзейнасьць беларускага дзяржапарату. З створаным А. Лукашэнкам Нацыянальным сходам адбылося адваротнае. Зь яго зьяўленьнем парлямэнцкая работа пераўтварылася з палітычнай у тэхнічную. За першыя месяцы яго працы не было падрыхтавана ніводнага законапраекту. Ранейшыя напрацоўкі Вярхоўнага Савету і прэзыдэнцкія ініцыятывы прымаліся амаль без абмеркаваньня. Спрэчкам замінала нежаданьне дэпутатаў наклікаць на сябе падазрэньні ў неляяльнасьці. Нягледзячы на прысутнасьць у ПП НС групы камуністаў-чыкінцаў, а пасьля выбараў 15 кастрычніка 2000 г. і прадстаўнікоў іншых прапрэзыдэнцкіх партыяў, дэпутаты ў новым парлямэнце дыстанцыююцца ад якой-небудзь выразнай ідэалёгіі. Фактычна, ступень уплыву ў парлямэнце стала вызначацца блізінёй да структураў выканаўчае ўлады і асабіста да віцэ-сьпікера Палаты прадстаўнікоў У. Канаплёва. Першыя дэпутацкія аб'яднаньні аформіліся толькі ў ПП НС 2 склікаьня. Фракцыя «Адзінства» на чале з намесьнікам старшыні камісіі па нацыянальнай бясьпецы Валянцінам Сімірскім, што зьявілася ў траўні 2001 г., створана «дзеля ўмацаваньня аўтарытэту дзяржаўнае ўлады сярод насельніцтва і спрыяньня працэсу інтэграцыі Беларусі з Расіяй». Зьяўленьню беларускага «Адзінства», у якое ўвайшло больш за 40 дэпутатаў, папярэднічалі кантакты ейнага кіраўніцтва з аднайменнай парлямэнцкай расійскай фракцыяй. Другая фракцыя ПП НС, створаная на ўзор «Эўраклюбу» ў Дзярждуме Расіі, атрымала назоў «Эўропа — наш супольны дом». Аб'яднаных у яе 14 дэпутатаў узначаліў намесьнік старшыні камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Анатоль Красуцкі. Галоўнай мэтай гэтай групоўкі стала «паскарэньне працэсу легітымізацыі Нацыянальнага сходу з боку эўрапейскіх міжпарлямэнцкіх арганізацыяў». Партыйных фракцыяў у Нацыянальным сходзе гэтага склікаьня не было.

Адсутнасьць у Беларусі легітымнага парлямэнту пакінула краіну без прадстаўніцтва ў Парлямэнцкай асамблеі (ПА) АБСЭ з 22 лютага 2001 г. Пасьля чарговай сэсіі ПА АБСЭ 6–10 ліпеня пастанова аб прадстаўніцтве Беларусі была перанесена на чарговае паседжаньне ПА АБСЭ. Такім чынам, да другіх выбараў беларускага прэзыдэнта створаная А. Лукашэнкам структура заканадаўчай улады не была прызнаная легітымнай.

## Судовая ўлада

Вызначальным момантам у ломцы сыстэмы судовай улады стала замена судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду. У першым складзе КС на чале з В. Ціхінем праіснаваў два з паловай

* На падставе арт. 92 Канстытуцыі 1994 г., дзе сказана, што дэпутатамі ня могуць быць асобы, «прызначаныя на пасаду прэзыдэнтам альбо па ўзгадненьні зь ім», прапаноўвалася спыніць паўнамоцтвы 109 дэпутатаў, якія перайшлі на працу ў ПП НС і ня ўлічваць іх пры падліку кворуму. Гэта надало б Вярхоўнаму Савету права прымаць законы і мяняць Канстытуцыю.

гады. Да рэфэрэндуму ён рэальна намагаўся выконваць ролю арбітра ў спрэчках паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам.

Хаця супярэчнасьці паміж выканаўчай і судовай уладай былі не такімі заўважнымі, як канфлікты прэзыдэнта з парлямэнтам, тым ня менш Лукашэнка разглядаў частку судзьдзяў КС як «памагатых апазыцыі». Зь цягам часу ў Канстытуцыйнага Суду выразна вызначыліся апанэнты — гэтак званыя «афіцыйныя» юрысты, якія прадстаўлялі Адміністрацыю прэзыдэнта ды іншыя дзяржаўныя ўстановы, прадстаўнікі Прававой кансультацыйнай рады пры прэзыдэнту, правазнаўцы з Нацыянальнай акадэміі навук. На кожную пастанову КС яны адказвалі крытычнымі публікацыямі і камэнтарамі. У той час як Канстытуцыйны Суд кіраваўся ў сваіх пастановах Канстытуцыяй і дзейнымі законамі, «афіцыйныя юрысты» спасылаліся на тэорыю двух тыпаў законаў, вызначаючы прававыя і неправавыя законы. Ускладніліся ўмовы працы і ўнутры КС, дзе прафэсійныя разыходжаньні прынялі асабісты характар. Цяжэй за ўсё захоўваць палітычную нэўтральнасьць было напярэдадні рэфэрэндуму, калі напружанасьць у грамадзтве была надзвычайнай, і некаторыя палітыкі заяўлялі аб небясьпецы дзяржаўнага перавароту. Суд здолеў прыняць пастанову аб кансультацыйным характары вынікаў лістападаўскага рэфэрэндуму. Тым ня менш, судзьдзі не рызыкнулі распачаць працэдуру імпічмэнту, ініцыяваную 73 дэпутатамі Вярхоўнага Савету 19 лістапада 1996 г. 26 лістапада КС прыняў канчатковую пастанову аб спыненьні гэтае справы ў сувязі з адсутнасьцю заяўніка*.

Пасьля рэфэрэндуму 5 судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду на імя прэзыдэнта падалі заявы аб адстаўцы. У новай Канстытуцыі паўнамоцтвы Канстытуцыйнага Суду зьмясьціліся ў адным артыкуле. КС быў пазбаўлены права ўзбуджаць справы на ўласную ініцыятыву, а яго пастановы згубілі абавязковую сілу. Згодна з арт. 116 Канстытуцыі 1996 г., у КС уваходзяць 12 судзьдзяў, зь якіх палова, у тым ліку і старшыня КС, прызначаецца прэзыдэнтам. Другая палова судзьдзяў КС абіраецца верхняй палатай Нацыянальнага сходу (гл. на гэты конт наступны артыкул Міхаіла Пастухова і Аляксандра Вашкевіча).

Судзьдзя КС М. Пастухоў, дэманструючы адданасьць Канстытуцыі 1994 г., накіраваў сваю заяву аб адстаўцы Вярхоўнаму Савету, які прыняў пастанову пакінуць яго на сваёй пасадзе. У выніку М. Пастухоў хадзіў на працу да 24 студзеня 1997 г., пакуль прэзыдэнт не выдаў указ аб вызваленьні яго «ў сувязі з сканчэньнем тэрміну паўнамоцтваў» у парушэньне ўласнае ж Канстытуцыі. Між тым, яшчэ 4 студзеня 1997 г. прэзыдэнт Лукашэнка пацьвердзіў паўнамоцтвы чатырох судзьдзяў, што засталіся ў КС, і прызначыў двух новых, а 24 студзеня

* Падставай для такой пастановы суду сталі звароты дэпутатаў ВС з просьбай адклікаць свае подпісы з-пад прапановы даць заключэньне аб парушэньні прэзыдэнтам Канстытуцыі (па розных зьвестках, ад 10 да 12). У выніку подпісаў пад заявай стала меней за 70 неабходных дзеля ўзбуджэньня справы. Судзьдзя КС Міхаіл Пастухоў у асобным лісьце выказаў меркаваньне, што паводле Закону «Аб Канстытуцыйным судзе Рэспублікі Беларусі» прапанова аб праверцы канстытуцыйнага акту можа быць адклікана ініцыятарам да пачатку разгляду. Але ў заканадаўстве, якое рэгулюе працэдуру адхіленьня прэзыдэнта ад пасады, ня згадваецца пра магчымасьць адкліканьня асобных подпісаў дэпутатаў ВС. Паколькі адзінай прававой падставай дзеля пачатку працэдуры імпічмэнту ёсьць прапанова, падпісаная ня меней за 70 дэпутатамі, то пасьля прыняцьця Канстытуцыйным Судом прапановы да разгляду адкліканьне подпісаў ня цягне за сабой аніякіх юрыдычных наступстваў. Падставай для спыненьня справы аб імпічмэнце, на думку судзьдзі М. Пастухова, магло стаць толькі адкліканьне прапановы ў цэлым, г.зн. бальшынёй галасоў дэпутатаў, што падпісалі заяву. У заключнай частцы гэтага ліста М. Пастухоў напісаў, што Канстытуцыйны Суд спыніў вытворчасьць па справе без законных падставаў і тым самым ухіліўся ад выкананьня свайго канстытуцыйнага абавязку — даць адказ на пытаньне аб парушэньні прэзыдэнтам Канстытуцыі.

вышэйшая палата Нацыянальнага сходу абрала яшчэ 5 судзьдзяў.

4 сакавіка 11 судзьдзяў КС прынесьлі прысягу, а прэзыдэнт Лукашэнка параіў ім трымацца далей ад палітыкі. 15 красавіка 1997 г. на ініцыятыву старшыні Палаты прадстаўнікоў Анатоля Малафеева, старшыні Вярхоўнага суду Валянціна Сукалы, міністра юстыцыі Генадзя Варанцова і намесьніка генпракурора Аляксандра Іваноўскага Канстытуцыйны Суд на чале з Рыгорам Васілевічам перагледзеў і скасаваў пастанову ад 4 лістапада 1996 г. аб кансультацыйным характары рэфэрэндуму. Новы склад КС, па-першае, зьвярнуўся да адваротнага дзеяньня закону і паспрабаваў абгрунтаваць прыняцьцё новай Канстытуцыі ейным жа артыкулам аб праве прэзыдэнта прызначаць рэфэрэндум, па-другое, новы КС ускосна прызнаў, што да 15 красавіка 1997 г. дзейнічала пастанова былога складу КС ад 4.11.96. Таму сэнс гэтай пастановы быў выключна палітычны: КС прадэманстраваў ляяльнасьць прэзыдэнту Лукашэнку і падзяліў зь ім адказнасьць за зьмену канстытуцыйнага ладу ў краіне.

15 ліпеня ў Закон аб Канстытуцыйным Судзе былі ўнесены зьмены. КС быў пазбаўлены права даваць заключэньні аб парушэньні прэзыдэнтам Канстытуцыі, а таксама разглядаць справы на ўласную ініцыятыву. Затое яму нададзена права на прапанову прэзыдэнта даваць заключэньні аб парушэньні Канстытуцыі парлямэнтам. У выніку конча пахіснуўся міжнародны аўтарытэт беларускага Канстытуцыйнага Суду. Калі ў лістападзе 1994 г. В. Ціхіня ад імя беларускага КС даслаў у аўтарытэтную міжнародную арганізацыю «Канфэдэрацыя Канстытуцыйных Судоў Эўропы» заяву аб жаданьні далучыцца, ягоная просьба была падтрыманая КС Польшчы. 9 кастрычніка 1997 г. якраз гэтая арганізацыя адмовілася падтрымаць заяву, якую прывёз у Варшаву новы старшыня КС Р. Васілевіч. Старшыня польскага КС заявіў, што ад Беларусі чакаюцца тлумачэньні адносна адстаўкі ранейшага складу суду і нагадаў, што ўмовай прыняцьця ў Канфэдэрацыю зьяўляецца выкананьне прававых стандартаў дэмакратычнай дзяржавы.

Пасьля рэфэрэндуму суды апынуліся ў поўнай залежнасьці ад выканаўчай улады ў такіх пытаньнях, як службовая кар’ера, фінансавае, жыльлёвае і матэрыяльна-тэхнічнае забесьпячэньне сваіх супрацоўнікаў. Як адзначае М. Пастухоў, у апошнія гады яны сталі зьдзяйсьняць правасудзьдзе не на падставе Канстытуцыі і законаў, а ў адпаведнасьці з дэкрэтамі прэзыдэнта. Напрыклад, дэкрэт «Аб выкананьні судамі г. Менску дэкрэту прэзыдэнта РБ ад 5.03.97», распрацаваны ў дзяржсакратарыяце Рады бясьпекі на падставе матэрыялаў аб парушэньнях дэкрэту №5 ад 5 сакавіка 1997 г. «Аб сходах, мітынгах, вулічных шэсьцях, дэманстрацыях і пікетах», ёсьць бесьпярэчным умяшаньнем выканаўчай улады ў працэс вядзеньня судовых справаў[2].

У такіх умовах частку судовых функцыяў дзяржавы паспрабавала ўзяць на сябе грамадзтва. 10 чэрвеня 1998 г. з ініцыятывай стварэньня грамадзкага суду над службовымі асобамі, якія парушаюць правы і свабоды грамадзянаў, выступіў Нацыянальны выканаўчы камітэт — створаная дэпутатамі Вярхоўнага Савету выканаўчая структура, якая выконвала ролю грамадзкага кааліцыйнага ўраду. Паколькі юрыдычных актаў дзеля паўнавартага дзеяньня такога суду ў Беларусі не існуе, яму вырашана надаць статус грамадзкага. Скаргі, звароты і заявы грамадзянаў павінны былі фіксавацца ў грамадзкім судзе дзеля таго, каб быць разгледжанымі, калі ў Беларусі будзе ўзноўлена законнасьць і імі змогуць заняцца сапраўдныя судовыя органы. Грамадзкі суд быў сфармаваны пры прэзыдыюме Вярхоўнага Савету і меў на мэце займацца справамі ня толькі грамадзянаў, але і грамадзкіх аб’яднаньняў.

---

[2] Гл. Пастухов М. Судебная власть: сегодня и завтра // Згода. 1998. №3 (115).

## Выканаўчая ўлада

Як кіраўнік выканаўчай улады, паводле арт. 84 Канстытуцыі 1996 г. прэзыдэнт набыў права прызначаць рэфэрэндумы і выбары ў Палату прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі, ствараць і рэарганізаваць сваю адміністрацыю ды іншыя органы дзяржаўнага кіраваньня, вызначаць структуру ўраду, прызначаць і звальняць прэм'ер-міністра, міністраў ды іншых чальцоў ураду, са згоды Савету Рэспублікі прызначаць старшыняў Канстытуцыйнага Суду, Вярхоўнага суду, Вышэйшага гаспадарчага суду, старшыняваць на паседжаньнях ураду. Арт. 101 надзяляе прэзыдэнта правам выданьня часовых дэкрэтаў зь сілай закону з далейшым разглядам у трохдзённы тэрмін Палатай прадстаўнікоў, а затым Саветам Рэспублікі[3].

Хаця ў Канстытуцыі за кіраўніком выканаўчае ўлады замацаваныя «царскія», паводле словаў беларускага прэзыдэнта, паўнамоцтвы, на практыцы перавышаюцца і яны. Так 24 сьнежня 1998 г. прэзыдэнт Лукашэнка выдаў указ аб прызначэньні выбараў у мясцовыя Саветы, дзе спасылаўся на закон аб выбарах, які ўступіў у сілу толькі праз 5 дзён. Шмат якія прэзыдэнцкія дэкрэты ўвайшлі ў супярэчнасьць як зь беларускім заканадаўствам, так і зь міжнародна-прававымі актамі, ратыфікаванымі Беларусяй. Між тым правамоцнасьць прэзыдэнта выдаваць такія дэкрэты выклікае сумневы як мінімум па трох прычынах: па-першае, з-за нелегітымнасьці Канстытуцыі 1996 г. дзякуючы шматлікім парушэньням заканадаўства падчас рэфэрэндуму, на падставе вынікаў якога яна ўступіла ў сілу; па-другое, у Канстытуцыі 1996 г. арт. 101 аб паўнамоцтвах прэзыдэнта разыходзіцца з арт. 7, дзе замацаваны прынцып вяршэнства Канстытуцыі; па-трэцяе, прэзыдэнт Лукашэнка зьдзяйсьняе свае заканадаўчыя паўнамоцтвы без прыняцьця адпаведнага закону.

Створаная Лукашэнкам сыстэма кіраваньня дазваляе прысутнічаць ува ўсіх сфэрах дзяржавы і грамадзтва, кантраляваць іх, але не адказваць за канкрэтныя промахі. Кіраваньне эканомікай адбываецца адначасова з трох структураў: Адміністрацыі прэзыдэнта, Савету міністраў і Рады бясьпекі. Няяснасьць заданьняў, якія вымушаны вырашаць урад, нявызначанасьць паўнамоцтваў, дубляваньне выканаўчых функцыяў паміж Саветам міністраў і Адміністрацыяй прэзыдэнта выракаюць выканаўчую ўладу на неэфэктыўнасьць. Адказнасьць за неэфэктыўнасьць кіраваньня эканомікай перакідваецца на ніжэйшыя ўзроўні ўлады.

У арт. 84 Канстытуцыі зафіксавана права кіраўніка выканаўчае ўлады ўтвараць «кансультацыйна-дарадчыя ды іншыя органы пры прэзыдэнту», функцыі і паўнамоцтвы якіх не ўдакладняюцца. Гэтае палажэньне замацавала статус спэцслужбаў, якія не падпарадкоўваюцца нікому, апрача прэзыдэнта. Рэальна такое становішча склалася яшчэ да 1996 г. (нават сьледчы ў асабліва важных справах пры Генэральным пракурору ня змог вызначыць, да якіх органаў належаць работнікі службаў, якія зьбілі дэпутатаў ВС 12 скліканьня ўночы з 11 на 12 красавіка 1995 г., а кіраўнік Галоўнага ўпраўленьня дзяржаховы, якое выкарыстоўвалася дзеля зрыву работы Цэнтральнай выбарчай камісіі 15 лістапада 1996 г., Міхаіл Цесавец, хаця і ўваходзіў у Калегію Міністэрства ўнутраных справаў, зь верасьня 1995 г. міністру ўнутраных справаў не падпарадкоўваўся). Такая структура, як служба аховы прэзыдэнта, створаная па-над органамі дзяржбясьпекі і міліцыі, ёсьць «кішэннай» сілавой службай Лукашэнкі.

Паралельная прэзыдэнцкай вэртыкалі структура выканаўчай улады была ўтворана Вяр-

[3] Гл. Конституция Республики Беларусь (с изменениями и дополнениями) // Народная газета. 1996. 27 лістапада.

хоўным Саветам. У лютым 1997 г. зьявілася Нацыянальная эканамічная рада (НЭР), узначаленая віцэ-сьпікерам Генадзем Карпенкам. Кіруючыя пасады ў ёй занялі дэпутаты фракцыі «Грамадзянскае дзеяньне», якія і выступілі ініцыятарамі яе стварэньня. Як выканаўчы орган легітымнага, хаця і безуладнага, парлямэнту НЭР прэтэндавала на ролю грамадзкага кааліцыйнага ўраду. Дзеля павелічэньня ролі грамадзкасьці ў сваёй рабоце НЭР 14 кастрычніка 1997 г. была ператворана ў Нацыянальны выканаўчы камітэт (НВК) з больш шырокім колам заданьняў. Апрача экономікі ў яго кампэтэнцыю ўвайшлі такія галіны дзяржаўнага кіраваньня, як абарона, бясьпека, мясцовае самакіраваньне, адукацыя і навука, нацыянальныя і рэлігійныя ўзаемадачыненьні. Галоўным прынцыпам фармаваньня НВК былі абвешчаныя прафэсіяналізм і прадстаўнічасьць. Склад НВК быў вызначаны Прэзыдыюмам Вярхоўнага Савету на перамовах з палітычнымі партыямі і грамадзкімі рухамі. Чальцы НВК прызначаліся Прэзыдыюмам ВС пры ўзгадненьні з кіраўніцтвам арганізацыяў, што ўзялі ўдзел у фармаваньні НВК. Кіраўніцтва арганізацыяй зьдзяйсьняў старшыня (Генадзь Карпенка, а з 21 красавіка 1999 г. — Мечыслаў Грыб). НВК быў утвораны як пастаянна дзеючы выканаўчы орган улады. У перапынках паміж штомесячнымі паседжаньнямі НВК працавалі яго камітэты, якіх на 19 лютага 1998 г. налічвалася 15. НВК распрацаваў канцэпцыю і праграму эканамічных рэформаў, падрыхтаваў канцэпцыю нацыянальнага разьвіцьця РБ, у сьнежні 1998 г. НВК выпрацаваў болей за 50 законапраектаў, прыняў шэраг зваротаў да грамадзкасьці, органаў дзяржаўнай улады Беларусі, а таксама да замежных краін і міжнароднай супольнасьці. Між тым, прадстаўнікі НВК так і ня здолелі ня толькі паўплываць на палітыку афіцыйнага ўраду, але і атрымаць магчымасьць выступіць на дзяржаўных тэле- і радыёканалах. Да канца 1999 г. мэты НВК заставаліся ранейшымі — аб'яднаньне вакол сябе апазыцыйных сілаў дзеля прадухіленьня разбуральнай эканамічнай дзейнасьці ўладаў і абарона правоў грамадзянаў. На практыцы дзейнасьць НВК была адным з этапаў каардынацыі дзеяньняў розных дэмакратычных сілаў ува ўмовах умацаваньня аўтарытарызму.

## Высновы

Супярэчнасьці паміж выканаўчай і заканадаўчай галінамі ўлады і тэндэнцыя да празьмернай канцэнтрацыі ўлады ў руках прэзыдэнта часта адзначаюцца палітолягамі ў якасьці характэрнай для пераходных грамадзтваў праблемы. Фармальна з увядзеньнем у дзеяньне новай Канстытуцыі паўпрэзыдэнцкая рэспубліка ператварылася ў прэзыдэнцкую. У працэсуальным жа аспэкце адбыліся больш грунтоўныя зьмены. З рэфэрэндумам у Беларусі распачаліся новыя адносіны паміж дзяржавай і грамадзтвам. Апазыцыйныя сілы не прызналі створаных уладай прадстаўнічых структураў, у выніку чаго выбары сталі адбывацца па-за полем палітычнай барацьбы. Для выбарцаў удзел у галасаваньні стаў гарантавана азначаць удзел у рэпрадукцыі ўлады, якая існуе незалежна ад іх. Скасаваньне прынцыпу падзелу ўладаў, зьнікненьне электаральнай канкурэнцыі надалі адвольным інтэнцыям кіраўніка дзяржавы ролю крыніцы права.

Пры парушэньні законаў беларускі прэзыдэнт перастаў сустракаць сур'ёзны супраціў. Падпарадкаваньне ўсіх галінаў улады амаль зьнішчыла юрыдычна абгрунтаваныя магчымасьці эфэктыўнага ўзьдзеяньня на кіраўніка выканаўчае ўлады. Ключавыя пасады ў органах дзяржаўнага кіраваньня былі пераразьмеркаваныя за прынцыпам лаяльнасьці. Панавань-

не нефармальных інстытутаў улады, замацаваньне ў рабоце дзяржапарату «параканстытуцыйных практык» сьведчыць аб дэградацыі інстытуцыйнай структуры беларускага грамадзтва. Шырыня кампэтэнцыі бюракратычнага апарату і сілавых структураў не забясьпечваюць эфэктыўнасьці дзяржавы. Дырэктыўныя і рэпрэсіўныя мэтады ўзьдзеяньня на эканоміку і грамадзтва сталі для Беларусі асноўным мэтадам рэгуляваньня. Паколькі сфэры кіраваньня, якія былі аб'ектам кампэтэнцыі дзяржаўнага апарату, перайшлі ў сфэру асабістай кампэтэнцыі кіраўніка дзяржавы, у грамадзтве не засталося адносінаў, абароненых ад умяшальніцтва непрадказальнае ўлады.

Для аналізу мэханізмаў зьдзяйсьненьня ўлады ў постаўтарытарных грамадзтвах палітолягі лічаць прыдатнай ідэю Г. О'Донэла, які прапануе ацэньваць постаўтарытарны рэжым на падставе таго, якія ў ім замацоўваюцца інстытуты — фармальныя ці нефармальныя. Фармальныя інстытуты характэрныя для «сталых» дэмакратыяў, дзе зьдзяйсьняецца прынцып вяршэнства права (rule of law). Нефармальныя інстытуты (arbitrary rule) пануюць там, дзе дэмакратычныя працэдуры выкарыстоўваюцца ў якасьці фасаду для кліентэлісцкіх адносінаў і патрыманіяльнага панаваньня[4]. Як правіла, яны запаўняюць сабой тыя сфэры адносінаў, якія не ахопліваюцца прававым рэгуляваньнем. Калі нефармальныя практыкі дзейнічаюць у пазаправавым асяродзьдзі, яны маюць неправавы (unlegal) характар, у выпадку ж парушэньня нормаў, зафіксаваных у нарматыўных актах, маюць месца антыправавыя (illegal) дзеяньні, ці звычайныя злачынствы.

У выпадку скасаваньня незалежнасьці судовай улады незаконныя дзеяньні могуць набываць вонкава легітымны характар сталага панаваньня. У Беларусі гэтаму спрыяла супрацьпастаўленьне праву народнага волевыяўленьня, якое ў масавай сьвядомасьці аказалася вышэйшай інстанцыяй. Папулісцкая рэвалюцыя як спосаб набыцьця ўлады вызначыла і характар далейшае яе зьдзяйсьненьня. Стаўка кіраўніка дзяржавы на прававы нігілізм насельніцтва зрабіла парушэньні закону буднай практыкай, якая набыла вызначальны характар для беларускае палітычнае сыстэмы. Па-першае, яны дазволілі адмяніць рэгуляцыйную функцыю сыстэмы права ў чыста інструмэнтальную, што дапамагло ўсталяваць кантроль над грамадзтвам і прадухіліць яго зваротнае ўзьдзеяньне на ўладу. Па-другое, правапарушэньні на ўсіх узроўнях дзяржаўнага кіраваньня сталі дадатковым фактарам унутранага згуртаваньня эліты. Па-трэцяе, адсутнасьць права як фактару абароны інтарэсаў грамадзянаў стымулюе іх залежнасьць ад улады. Як адзначыў С. Багданкевіч, «абарону ад свавольства ўлады насельніцтва шукае ў той жа ўлады»[5].

Дырэктыўнае кіраваньне зьдзяйсьняецца ўладай без апэляцыі да закону, і якраз у такой сыстэме сацыяльнага рэгуляваньня бальшыня грамадзтва адчувае сябе абароненай. Пры гэтым бальшыня з тых, хто ацэньвае прававую сытуацыю ў Беларусі як ненармальную, зьвязвае гэта з палітыкай А. Лукашэнкі. Акурат яны складаюць патэнцыйную базу апазыцыі яму і ўспрымаюцца прадстаўнікамі ўлады як «дэвіянтная» група.

Скасаваньне агульных правілаў замацоўвае наяўную сыстэму панаваньня, але разбурае дзяржаўны апарат. У меру канцэнтрацыі ўлады ананімны мэханізм зьдзяйсьненьня дзяржаўнае ўлады трапляе ў залежнасьць ад канкрэтных асобаў, што ў рэшце рэшт разбурае аўтаномію дзяржавы. Пры недастатковай аўтаноміі дзяржава губляе магутнасьць: фармалізаваныя

[4] O'Donnell G. Illusions about Consolidation // Journal of Democracy. 1996. Vol. 7, № 2. P. 34–51.

[5] Богданкевич С. Объединим, скоординируем наши усилия // Новости НИСЭПИ. Вып. 4. Декабрь 1999. С. 47.

бюракратычныя працэдуры замяняюцца адвольнымі пастановамі, якія лёгка прымаюцца, але вагары іх выкананьня палягаюць у фармальных інстытутах, на скасаваньні якіх і грунтуецца ўлада. Таму, хаця кампэтэнцыя дзяржавы фармальна пашыраецца, у сапраўднасьці дзяржаўнае кіраваньне зьдзяйсьняецца выбіральна. Інстытуцыйная дэградацыя беларускага грамадзтва разбурае таксама адзінае сэнсавае поле ўзаемадзеяньня ня толькі асобных элемэнтаў дзяржавы, але і дзяржавы і грамадзкасьці. Нездарма асяродкі незалежнага беларускага грамадзтва дэманструюць большую зацікаўленасьць у захаваньні прававых нормаў, чымся дзяржава*.

## КАНСТЫТУЦЫЙНЫ СУД І КАНСТЫТУЦЫЙНЫ КРЫЗЫС 1996 Г.

### Перадгісторыя

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая 15 сакавіка 1994 году, упершыню ў гісторыі беларускага канстытуцыяналізму прадугледзела ўсталяваньне ў краіне адмысловага органу канстытуцыйнага кантролю — Канстытуцыйнага Суду. У Канстытуцыю ўвайшоў разьдзел з васьмёх артыкулаў, які рэгуляваў кампэтэнцыю, парадак фармаваньня Канстытуцыйнага Суду і прававы статус судзьдзяў. Гэты разьдзел уваходзіў у частку VI Асноўнага Закону пад назовам «Дзяржаўны кантроль і нагляд». Такім чынам быў падкрэсьлены асаблівы статус Канстытуцыйнага Суду ў сыстэме дзяржаўных органаў.

30 сакавіка 1994 году, праз 15 дзён пасьля прыняцьця Канстытуцыі, быў прыняты Закон «Аб Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь». Ён складаўся з 57 артыкулаў у чатырох разьдзелах[1]. Сымбалічна, што гэта адбылося ў дзень уступленьня ў дзеяньне новага Асноўнага Закону.

На адзінаццаць пасадаў судзьдзяў прэтэндавала каля 40 кандыдатаў[2]. Зь іх дэпутаты ўхвалілі толькі васьмярых. Яшчэ адна кандыдатура была прапанаваная беспасярэдне ў часе сэсіі. Такім чынам, 28 красавіка 1994 году на пазачарговай сэсіі Вярхоўнага Савету быў абраны паўнамоцны склад Канстытуцыйнага Суду (паводле артыкула 12 Закону аб Канстытуцыйным Судзе, ён меў права пачаць працаваць і прымаць пастановы, калі ў ягоны склад абраныя ня менш за 7 судзьдзяў)[3]. Яшчэ двух судзьдзяў даабралі 25 траўня 1996 г.[4].

Шмат хто з судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду да абраньня на гэтую пасаду займаў высокія пасады ў органах выканаўчай улады: намесьнік міністра юстыцыі, намесьнік міністра ўнутраных справаў, начальнік юрыдычнага ўпраўленьня ўраду, намесьнік начальніка навукова-дасьледчага аддзелу Вышэйшых курсаў КДБ, намесьнік старшыні Вышэйшай атэстацыйнай

* У 1998 г. грамадзкія арганізацыі Беларусі выступілі супраць ліцэнзаваньня распаўсюджаньня прававой інфармацыі.

1 Закон Республики Беларусь о Конституционном суде Республики Беларусь // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 15. С. 220.

2 Мехов С. Громко молчащий орган // Фемида. 1994. 25 апреля.

3 Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 15. С. 220.

4 Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1996. № 18. С. 338.

камісіі. У склад Канстытуцыйнага Суду абралі двух судзьдзяў Вярхоўнага і Менскага гарадзкога судоў. Чальцамі суду сталі таксама загадчык юрыдычнага аддзелу Сакратарыяту Вярхоўнага Савету, начальнік катэдры Акадэміі міліцыі і два дацэнты катэдры канстытуцыйнага права Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. Агулам у першым складзе суду былі тры дактары і тры кандыдаты юрыдычных навук, адзін з дактароў (Валер Ціхіня) меў годнасьць члена-карэспандэнта Акадэміі навук Беларусі.

Ужо ў першыя гады дзейнасьці Канстытуцыйны Суд вызначыў сваё месца ў палітычнай сыстэме грамадзтва. Ён разгледзеў больш за 40 справаў, датычных канстытуцыйнасьці законаў парлямэнту, указаў прэзыдэнта, пастановаў ураду. Бальшыня зь іх мела на мэце абарону канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзянаў.

Трэба адзначыць, што цягам 1995—1996 гадоў асноўным парушальнікам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі быў прэзыдэнт А. Лукашэнка. Ягоныя ўказы часта падмянялі дзейныя законы і парушалі канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзянаў. Пад лістапад 1996 году Канстытуцыйны Суд прызнаў неканстытуцыйнымі (цалкам або ў пэўных частках) 17 указаў і 1 распараджэньне Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі.

Канстытуцыйны Суд апынуўся ў эпіцэнтры «лістападаўскіх падзеяў» 1996 году, калі прэзыдэнт А. Лукашэнка выступіў з ініцыятывай правядзеньня нацыянальнага рэфэрэндуму. На прапанову Старшыні Вярхоўнага Савету С. Шарэцкага Канстытуцыйны Суд зрабіў заключэньне пра рэкамэндацыйны характар рэфэрэндуму па пытаньні зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі, пра што быў зроблены адпаведны запіс у бюлетэні. А напярэдадні рэфэрэндуму, 19 лістапада, у Канстытуцыйны Суд паступіла прапанова 73 дэпутатаў Вярхоўнага Савету пачаць працэдуру адхіленьня А. Лукашэнкі ад пасады прэзыдэнта. Праз шэраг прычынаў, пра якія будзе сказана ніжэй, суд ня здолеў завяршыць разгляду гэтай справы.

Спасылаючыся на вынікі лістападаўскага 1996 году рэфэрэндуму, А. Лукашэнка ўвёў у дзеяньне новую рэдакцыю Канстытуцыі, якая іначай разьмеркавала паўнамоцтвы паміж асноўнымі органамі дзяржаўнай улады. Судзьдзям Канстытуцыйнага Суду, якія не прызналі «новай» Канстытуцыі, прапанавалі напісаць заявы на імя прэзыдэнта. Шасьцёра судзьдзяў, улучаючы старшыню, гэтак і зрабілі. Іх адстаўка была прынятая. Судзьдзя М. Пастухоў, які не схацеў зьвярнуцца з просьбай пра адстаўку, быў вызвалены з пасады «ў сувязі з заканчэньнем тэрміну паўнамоцтваў судзьдзі». У студзені 1997 году быў сфармаваны новы склад Канстытуцыйнага Суду. Старшыню суду (Р. Васілевіча) і пяцёра судзьдзяў прызначыў сваім указам А. Лукашэнка, астатніх шасьцёра судзьдзяў «абрала» верхняя палата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі.

Такім чынам, цяпер у Беларусі дзейнічае Канстытуцыйны Суд, прызначаны прэзыдэнтам А. Лукашэнкам і яму падсправаздачны. Цікава, што за гады працы ён не разгледзеў ніводнага ўказу й дэкрэту прэзыдэнта наконт адпаведнасьці Канстытуцыі.

## Парадак фармаваньня Канстытуцыйнага Суду і прававы статус судзьдзяў

Як вядома, у эўрапейскіх краінах існуюць розныя падыходы да адбору кандыдатаў на пасады судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду. У шмат якіх эўрапейскіх краінах права прызна-

чаць судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду маюць некалькі органаў або службовых асобаў, што належаць розным галінам улады[6]. Прапановы замацаваць такі парадак выказваліся і ў часе распрацоўкі праекту Закону аб Канстытуцыйным Судзе[7]. Аднак заканадаўцы пайшлі іншым шляхам, устанавіўшы ў артыкуле 126 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, што Канстытуцыйны Суд абіраецца Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусі з кваліфікаваных спэцыялістаў у галіне права ў колькасьці 11 судзьдзяў. Разьвіваючы канстытуцыйную норму, Закон аб Канстытуцыйным Судзе прадугледзеў, што судзьдзём можа быць абраны грамадзянін Рэспублікі Беларусі, які мае вышэйшую юрыдычную адукацыю, высокую кваліфікацыю ў галіне права і высокія маральныя якасьці[8].

Працэдура абраньня чальцоў суду была падрабязна ўрэгуляваная разьдзелам V Часовага рэглямэнту Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі[9]. Паводле артыкулу 71 гэтага акту, кандыдатуры на пасады судзьдзяў прапаноўваліся дэпутатамі Вярхоўнага Савету. Абмеркаваньне і галасаваньне адбывалася з улікам заключэньняў па кандыдатурах дзьвюх сталых камісіяў парлямэнту — з заканадаўства і зь дзяржаўнага будаўніцтва, а таксама Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету — органу, у які апрача сьпікера і віцэ-сьпікераў уваходзілі *ex officio* старшыні ўсіх сталых камісіяў парлямэнту. Адпаведна з прынятай працэдурай, кандыдат на пасаду судзьдзі павінен быў выступіць перад парлямэнтам з кароткай прамовай і адказаць на пытаньні дэпутатаў. У выпадку, калі колькасьць прэтэндэнтаў была большай за колькасьць вакансіяў, прадугледжвалася папярэдняе галасаваньне аб уключэньні кандыдатураў у сьпіс для тайнага галасаваньня. Рэглямэнт не дапускаў паўторнага вылучэньня на працягу адной сэсіі кандыдатуры, якая ў выніку галасаваньня не атрымала больш за палову галасоў ад агульнай колькасьці дэпутатаў парлямэнту, як і не дапускалася вылучэньне аднаго й таго кандыдата болей за два разы.

У артыкулах 36 і 126 Канстытуцыі Беларусі былі замацаваныя пэўныя абмежаваньні на дзейнасьць судзьдзі Канстытуцыйнага Суду. Так, асобы, абраныя ў склад суду, не маглі займацца прадпрымальніцкай дзейнасьцю, выконваць іншую аплатную працу, акрамя выкладчыцкай і навукова-дасьледчай, якая не суправаджалася заняцьцём штатным пасадаў. Яны (як і судзьдзі агульных судоў) не маглі быць дэпутатамі, а таксама чальцамі палітычных партыяў і іншых грамадзкіх аб’яднаньняў, якія перасьледавалі палітычныя мэты.

Цяжка растлумачыць, чым кіраваліся дэпутаты парлямэнту, усталяваўшы для судзьдзяў КС гранічны ўзрост знаходжаньня на пасадзе ў 60 год. У праектах Закону і Канстытуцыі, якія неаднаразова перараблялiся, фігуравалі лічбы 65 і 70 год. Тым ня менш, якраз 60-гадовы ўзрост быў замацаваны ў канчатковым варыянце.

Паводле пункту 5 артыкула 100 Асноўнага Закону, кандыдатуру для абраньня на пасаду старшыні суду павінен быў прапаноўваць прэзыдэнт, у той час як паводле артыкула 13 Закону аб Канстытуцыйным Судзе намесьнік старшыні абіраўся самімі судзьдзямі з свайго скла-

---

[5] См. например: Zwierzchowski E. Sądownictwo konstytucyjne w Europie Zachodniej.

[6] Вашкевич А. Конституционный Суд Республики Беларусь: место и роль в системе государственных органов // Судебно-правовая реформа: концепция и пути ее реализации в Республике Беларусь. Мн., 1992. С. 181.

[7] Статья 14 Закона о Конституционном Суде Республики Беларусь // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 15. С. 220.

[8] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1994. № 17. С. 285.

[9] Федута А. Валерий Тихиня как зеркало белорусской эволюции // Белорусская деловая газета. 1996 года. 17 октября

ду. Больш за год пасада старшыні была вакантная, бо кандыдатура Дзьмітрыя Булахава, старшыні парлямэнцкай камісіі з заканадаўства, прапанаваная прэзыдэнтам, не набрала неабходнай колькасьці галасоў[10].

Артыкул 13 Закону аб Канстытуцыйным Судзе прадугледжваў, што ў выпадку адсутнасьці старшыні і яго намесьніка або немагчымасьці выкананьня гэтымі асобамі сваіх абавязкаў, паўнамоцтвамі старшыні карыстаецца найстарэйшы векам судзьдзя, якім быў В. Ціхіня. Ён жа і быў абраны на пасаду старшыні суду з прапановы прэзыдэнта А. Лукашэнкі 23 сакавіка 1995 году[11]. На пасаду намесьніка старшыні адкрытым галасаваньнем судзьдзяў быў абраны Валер Фадзееў[12].

Артыкул 126 Канстытуцыі прадугледжваў, што судзьдзі абіраюцца на 11 год. Такая пастанова была прынятая дзеля таго, каб тэрмін паўнамоцтваў судзьдзяў не супадаў з тэрмінам паўнамоцтваў парлямэнту. У арт. 15 Закону аб Канстытуцыйным Судзе ўтрымлівалася норма, паводле якой судзьдзі маглі быць пераабраныя на новы тэрмін.

Старшыня Канстытуцыйнага Суду абіраўся на 5 год, пасьля чаго таксама мог быць пераабраны, але ўжо «на астатні тэрмін сваіх паўнамоцтваў у якасьці судзьдзі»[13]. Выходзіла, што пры пераабраньні тэрмін яго паўнамоцтваў мог бы складаць ужо ня 5, а 6 год. Цікава, што ў Законе ўвогуле ня згадвалася, на які тэрмін абіраецца намесьнік старшыні, з чаго вынікала, што ён абіраўся на ўвесь тэрмін сваіх паўнамоцтваў, г. зн. на 11 год.

Артыкул 18 Закону аб Канстытуцыйным Судзе рэгуляваў пытаньне пра датэрміновае спыненьне паўнамоцтваў судзьдзяў па пастанове Вярхоўнага Савету і пры наяўнасьці адной з наступных акалічнасьцяў:

а) просьба судзьдзі пра адстаўку;

б) стан здароўя, які перашкаджае выкананьню абавязкаў;

в) сьмерць судзьдзі;

г) дасягненьне 60-гадовага ўзросту;

д) страта грамадзянства Рэспублікі Беларусі;

е) зьдзяйсьненьне ўчынкаў, якія дыскрэдытуюць Канстытуцыйны Суд;

ж) уступленьне ў дзеяньне датычнага судзьдзі абвінаваўчага выроку суду.

Зьвяртае на сябе ўвагу пункт «е» сваёй досыць расплывістай фармулёўкай, якая пры пэўных абставінах дазваляе выкарыстоўваць яе супраць судзьдзі, нежаданага з палітычных меркаваньняў. Больш за тое, ані Закон аб Канстытуцыйным Судзе, ані Часовы рэглямэнт Вярхоўнага Савету не рэгулявалі працэдуру спыненьня паўнамоцтваў судзьдзі.

У Канстытуцыі і Законе былі замацаваныя гарантыі незалежнасьці судзьдзяў. Згодна з часткай 4 арт. 126 Канстытуцыі, простае ці ўскоснае ўзьдзеяньне на Канстытуцыйны Суд альбо яго чальцоў, зьвязанае зь дзейнасьцю для ажыцьцяўленьні канстытуцыйнага кантролю, недапушчальнае і цягне адказнасьць, прадугледжаную законам.

Судзьдзі Канстытуцыйнага Суду не маглі быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасьці, арыштаваныя, іншым чынам пазбаўленыя асабістай свабоды бяз згоды Вярхоўнага Савету, апрача выпадкаў затрыманьня на месцы зьдзяйсьненьня злачынства. Крымінальная справа ў

---

[10] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1995. № 18. С. 208.

[11] Текущий архив Конституционного Суда Республики Беларусь за 1995 год.

[12] Ст. 15 Закона о КС // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь . 1994. № 15. С. 220.

[13] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь.1995. № 20. С. 237.

дачыненьні да судзьдзі Канстытуцыйнага Суду магла быць пачатая толькі Генэральным пракурорам, дый толькі пры згодзе парлямэнту (цікава, што Канстытуцыя замацоўвала ў дачыненьні да чальцоў КС больш высокі ўзровень абароны, чымся нават дэпутатаў парлямэнту, у адносінах да якіх у час паміж сэсіямі крымінальная справа магла быць распачатая пры згодзе Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету). Згодна з часткай 2 арт. 23 Закону аб Канстытуцыйным Судзе, недатыкальнасьць судзьдзі распаўсюджвалася на яго жытло і іншую законную ўласнасьць, службовае памяшканьне, транспарт, сродкі сувязі, карэспандэнцыю, рэчы й дакумэнты.

У сакавіку 1995 году ў Закон аб Канстытуцыйным Судзе былі ўнесеныя дапаўненьні, якія ўзмацнілі матэрыяльныя гарантыі дзейнасьці судзьдзяў[14]. Гэтак, было прадугледжана, што судзьдзя, які выйшаў у адстаўку, пры наяўнасьці пэўнага працоўнага стажу атрымліваў права на штомесячную пажыцьцёвую дапамогу. Службовыя аклады судзьдзяў былі на ўзроўні акладу віцэ-сьпікера парлямэнту, а Старшыні Канстытуцыйнага Суду — на ўзроўні сьпікера. У Законе была ўсталяваная норма, згодна зь якой зьніжэньне існуючага ўзроўню матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня дзейнасьці Канстытуцыйнага Суду магло адбывацца толькі са згоды Вярхоўнага Савету.

Аднак у варунках, калі матэрыяльна-тэхнічнае абслугоўваньне суду зьдзяйсьнялася «ў парадку, вызначаным прэзыдэнтам», было цяжка дамагчыся рэалізацыі гэтых палажэньняў Закону. Напрыклад, паводле пастановы Савету міністраў, прынятай у чэрвені 1994 году, за кожным судзьдзём быў замацаваны пэрсанальны аўтамабіль, кіроўца якога быў адначасова целаахоўнікам судзьдзі. Пасьля першай жа пастановы суду аб прызнаньні неканстытуцыйнасьці ўказу прэзыдэнта пэрсанальныя аўтамабілі і целаахоўнікаў «адмацавалі». Колькасьць аўтамабіляў, замацаваных за судом, зьмяншалася ў прапарцыйнай залежнасьці ад павелічэньня актаў прэзыдэнта, прызнаных судом неканстытуцыйнымі. Пад лістапад 1996 году аўтамабілем мог карыстацца толькі старшыня суду.

## Кампэтэнцыя Канстытуцыйнага Суду

Артыкул 132 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь абвяшчаў: «Кампэтэнцыя, арганізацыя і парадак дзейнасьці Канстытуцыйнага Суду вызначаюцца законам». Такім чынам, пералік паўнамоцтваў суду, замацаваны ў Канстытуцыі, ня быў вычарпальным. Некаторыя зь іх былі зафіксаваныя ў Законе аб Канстытуцыйным Судзе. Агулам характарызуючы кампэтэнцыю беларускага суду, можна сказаць, што яна была значна больш вузкаю ў параўнаньні з судамі бальшыні эўрапейскіх краінаў. Суд ня быў правамоцны ацэньваць канстытуцыйнасьці палітычных партыяў, тлумачыць Канстытуцыю, разглядаць канстытуцыйныя скаргі грамадзянаў.

Асноўным заданьнем Канстытуцыйнага Суду, у адпаведнасьці з арт. 125 Канстытуцыі, было зьдзяйсьненьне кантролю за канстытуцыйнасьцю нарматыўных актаў у дзяржаве. Паводле арт. 127 Асноўнага Закону, Канстытуцыйны Суд ажыцьцяўляў кантроль за канстытуцыйнасьцю: а) законаў; б) міжнародных дамоваў і іншых абавязкаў Рэспублікі Беларусі; в) прававых актаў міждзяржаўных утварэньняў, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь (перш за ўсё меліся наўвеце акты, прынятыя ў рамках Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў); г) указаў

[14] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1995. № 11. С. 120.

прэзыдэнта; д) пастановаў кабінэту міністраў; е) актаў Вярхоўнага і Вышэйшага гаспадарчага судоў і Генэральнага пракурора, што маюць нарматыўны характар.

Акты, пералічаныя ў пунктах «а)» і «б)», маглі правярацца ня толькі на адпаведнасьць Канстытуцыі, але і міжнародным прававым актам, ратыфікаваным Беларусяй, а пералічаныя ў пунктах «в», «г», «д» — таксама й на адпаведнасьць законам.

Канстытуцыя замацоўвала пералік суб'ектаў, якія мелі права ініцыяваць разгляд справы ў Канстытуцыйным Судзе. Гэта: 1) прэзыдэнт; 2) Старшыня Вярхоўнага Савету; 3) сталыя камісіі Вярхоўнага Савету; 4) група дэпутатаў Вярхоўнага Савету, лікам ня меншая за 70 чалавек (пры агульнай колькасьці дэпутатаў парлямэнту ў 260 чалавек); 5) Вярхоўны Суд; 6) Вышэйшы гаспадарчы суд; 7) Генэральны пракурор. Іншыя дзяржаўныя органы, грамадзкія аб'яднаньні, а таксама грамадзяне маглі зьвяртацца з прапановамі ініцыяваць праверку канстытуцыйнасьці пэўнага акту толькі да вышэйпералічаных суб'ектаў.

У Канстытуцыі мелася адмысловая норма (арт. 112), якая надавала права любому суду зьвяртацца ў Канстытуцыйны Суд, калі пры разглядзе пэўнай справы суд прыходзіў да высновы, што нарматыўны акт не адпавядае Канстытуцыі. У такім выпадку суд павінен быў прыняць пастанову ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй і паставіць «ува ўстаноўленым парадку пытаньне аб прызнаньні дадзенага нарматыўнага акту неканстытуцыйным». Падрабязна «прыняты парадак» рэгуляваўся Законам аб судовым ладзе і статусе судзьдзяў Рэспублікі Беларусі. Згодна з гэтым Законам, старшыні раённых, гарадзкіх, абласных, а таксама міжгарнізонных вайсковых судоў і Старшыня Беларускага вайсковага суду маюць права хадайнічаць перад Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусі аб унясеньні прапановаў у Канстытуцыйны Суд аб праверцы канстытуцыйнысьці нарматыўных актаў[15]. Дасюль у практыцы яшчэ не было выпадкаў такіх хадайніцтваў.

За першыя два з паловай гады дзейнасьці Канстытуцыйнага Суду найбольш часта да яго зьвярталіся Старшыня Вярхоўнага Савету, сталыя камісіі парлямэнту і групы дэпутатаў парлямэнту лікам ня менш за 70 чалавек. Агулам за пэрыяд з 1994 году да лістапада 1996 году ў пытаньні канстытуцыйнасьці былі разгледжаныя 46 нарматыўных актаў, зь якіх не адпаведнымі Канстытуцыі цалкам альбо часткова былі прызнаныя 13 законаў, 4 пастановы Вярхоўнага Савету, 17 указаў прэзыдэнта, 3 пастановы ўраду, адна пастанова Пленуму Вярхоўнага суду, адна пастанова выканаўчага камітэту Менскага гарадзкога Савету.

Асаблівасьцю прававога статусу Канстытуцыйнага Суду, у адрозьненьне ад судоў іншых эўрапейскіх краінаў, было права суду на сваю ініцыятыву разглядаць пытаньне аб адпаведнасьці нарматыўных актаў любога дзяржаўнага органа, грамадзкага аб'яднаньня Канстытуцыі, законам, міжнародна-прававым актам, ратыфікаваным Рэспублікай Беларусяй. Варта адзначыць, што Канстытуцыйны Суд, асабліва на пачатку сваёй дзейнасьці, досыць часта карыстаўся правам пачынаць справы з уласнай ініцыятывы, што сталася нагодай упікаць суд у «юрыдычным актывізьме» і, безумоўна, было адной з прычынаў, што падштурхнула А. Лукашэнку ініцыяваць канстытуцыйную рэформу ўвосень 1996 году.

Замежныя адмыслоўцы, якія рэцэнзавалі праект Закону аб Канстытуцыйным Судзе, выказвалі заклапочанасьць у сувязі з тым, што існаваньне такога права дае падставу сумненьням у нэўтральнасьці і палітычнай бесстароннасьці суду. А. Блянкенагель, прыкладам, паказваў, што наяўнасьць уласнай ініцыятывы правакуе суд на судова-прававую актыўнасьць і

[15] Вестник Конституционного Суда Республики Беларусь. 1996. № 1. С. 13.

пазбаўляе яго магчымасьці выконваць свае першапачатковыя функцыі і не дае баком ставіцца да гэтай інстанцыі як да суду.

Тым ня менш, заканадаўца не прыслухаўся да гэтых заўвагаў і надаў суду на канстытуцыйным узроўні права распачынаць справы з уласнае ініцыятывы. На гэтае рашэньне паўплывалі як мінімум тры акалічнасьці. Па-першае, быў улічаны досьвед працы Камітэту Канстытуцыйнага нагляду СССР, які меў такое права. Па-другое, меркавалася, што суд будзе асьцярожна выкарыстоўваць гэтае права, разглядаючы толькі акты, якія абмяжоўвалі канстытуцыйныя правы й свабоды грамадзянаў. Па-трэцяе, орган канстытуцыйнага кантролю быў новаю зьявай у палітычнай і прававой сыстэмах дзяржавы. Некаторыя дэпутаты лічылі, што наданьне суду такога права заахвоціць да актыўнасьці іншых суб’ектаў, што могуць ініцыяваць звароты і «заняць» суд дастатковай колькасьцю працы. Меркавалася, што Канстытуцыйны Суд будзе распачынаць справы з свае ініцыятывы адно на першым этапе сваёй дзейнасьці.

Іншым паўнамоцтвам суду, пра якое ня згадвалася ў Канстытуцыі, але якое прадугледжвалася артыкуламі 36 і 44 Закону аб Канстытуцыйным Судзе, было складаньне прэзыдэнту і Вярхоўнаму Савету штогадовага пасланьня пра стан канстытуцыйнай законнасьці ў краіне. Праект гэтага дакумэнту рыхтаваўся Сакратарыятам Канстытуцыйнага Суду, затым накіроўваўся судзьдзям і чальцам Навукова-Кансультацыйнай Рады для вывучэньня. Дапрацаваны тэкст пасланьня з улікам заўвагаў і прапановаў абмяркоўваўся на паседжаньні суду, зацьвярджаўся ягонай пастановай і падпісваўся Старшынём Канстытуцыйнага Суду.

Першы такі дакумэнт быў прыняты 27 студзеня 1995 году. У ім ацэньвалася захаванасьць канстытуцыйных нормаў у дзейнасьці дзяржаўных органаў на прыкладзе пастановаў Канстытуцыйнага Суду, а таксама выказваліся прапановы для ўдасканаленьня дзейнага заканадаўства. Фактычна, у першым пасланьні быў закладзены стандарт наступных дакумэнтаў такога тыпу.

Асабліва шырокі грамадзкі і палітычны рэзананс набыло Пасланьне Канстытуцыйнага Суду прэзыдэнту й Вярхоўнаму Савету ад 9 лютага 1996 г. У ім стан канстытуцыйнай законнасьці ў краіне быў прызнаны нездавальняючым. Суд прызнаў, што ў выніку неправамернага ўзмацненьня выканаўчай улады прыніжаюцца роля і значэньне іншых галінаў улады, што ў шэрагу выпадкаў законы падмяняюцца падзаконнымі актамі, што супярэчаць законам[16]. Пасланьне абмяркоўвалася ў парлямэнце, і ў выніку была прынятая адмысловая пастанова Вярхоўнага Савету[17].

Канстытуцыя і Закон аб Канстытуцыйным Судзе не надалі суду права заканадаўчай ініцыятывы, то бок права ўносіць у парлямэнт праекты законаў. Разам з тым, артыкул 130 Асноўнага Закону даў суду права падаваць прапановы ў Вярхоўны Савет аб неабходнасьці зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі, а таксама аб прыняцьці і зьменах законаў. Такія прапановы належала абавязкова разглядаць. Гэта права суд выкарыстаў пры падрыхтоўцы штогадовых пасланьняў аб стане канстытуцыйнай законнасьці. Напрыклад, у Пасланьні Канстытуцыйнага Суду ад 9 лютага 1996 году было прапанавана стварыць у Рэспубліцы Беларусі пасаду ўпаўнаважанага ў правах чалавека, унесьці зьмены ў Канстытуцыю, надаўшы суду права афіцыйна тлумачыць Канстытуцыю, усталяваць адказнасьць за невыкананьне пастановаў Кан-

[16] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1996. № 7. С. 94.

[17] Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. 1996. № 16. С. 224.

стытуцыйнага Суду (апошняя прапанова была рэалізаваная парлямэнтам у чэрвені 1996 г.)[18].

Канстытуцыйны Суд быў складнікам мэханізму вырашэньня пытаньня аб адказнасьці Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Згодна з артыкулам 104 Канстытуцыі, прэзыдэнт мог быць адхілены ад пасады ў выпадку парушэньня Канстытуцыі або пры зьдзяйсьненьні злачынства. Пытаньне аб адхіленьні прэзыдэнта магло быць пастаўленае на прапанову ня менш як 70 дэпутатаў парлямэнту. Заключэньне аб парушэньні прэзыдэнтам Канстытуцыі мусіў даваць Канстытуцыйны Суд. З моманту вынясеньня такога заключэньня прэзыдэнт ня мог выконваць сваіх абавязкаў да прыняцьця Вярхоўным Саветам адпаведнай пастановы.

## Аналіз некаторых пастановаў Канстытуцыйнага Суду першага складу

Канстытуцыйны Суд разгледзеў шэраг справаў па абароне правоў і свабодаў грамадзянаў, замацаваных Канстытуцыяй і законамі Рэспублікі Беларусі. У першую чаргу суд зьвяртаў увагу на прававую абарону грамадзянаў у галіне працоўных, грамадзянскіх, адміністрацыйных стасункаў.

Гэтак, насуперак патрабаваньню артыкулу 5 Закону «Аб парадку ўступленьня ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі», што прадугледжвала дзеяньне законаў і іншых нарматыўных актаў (да таго, як яны будуць прыведзеныя ў адпаведнасьць з Канстытуцыяй) толькі ў той частцы, у якой яны не пярэчаць Канстытуцыі, на практыцы прымяняліся нормы працоўнага заканадаўства, што не адпавядалі Канстытуцыі.

У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд сваім заключэньнем ад 23 верасьня 1994 году прызнаў неканстытуцыйнымі і ня маючымі сілы яўна дыскрымінацыйныя нормы, апісаныя ў артыкуле $18^1$ і пункце $1^1$ артыкула 33 Кодэксу законаў аб працы, што прадугледжвалі права наймальніка звальняць работнікаў пры дасягненьні імі пэнсійнага ўзросту.

Канстытуцыйны Суд распачаў разгляд канстытуцыйнасьці нормаў працоўнага заканадаўства з прычыны неабгрунтаванага абмежаваньня пэўнымі тэрмінамі аплаты вымушанага прагулу, а таксама задавальненьня іншых грашовых патрабаваньняў. Вярхоўны Савет, разгледзеўшы гэтае пытаньне, палічыў неабходным скасаваць у Кодэксе законаў аб працы нормы, што абмяжоўвалі тэрмін аплаты вымушанага прагулу, а таксама выплаты работніку належных сумаў пры задавальненьні іншых грашовых патрабаваньняў.

Вывучыўшы пытаньне аб рэалізацыі права грамадзянаў на прафэсійна-тэхнічную адукацыю, Канстытуцыйны Суд выявіў, што выканаўчы камітэт Менскага гарадзкога Савету дэпутатаў, прыняўшы 19 траўня 1994 году пастанову «Аб парадку прыёму ў прафэсійна-тэхнічныя вучэльні выпускнікоў агульнаадукацыйных школаў г. Менску і найбліжэйшых населеных пунктаў», абмежаваў магчымасьць атрыманьня прафэсійна-тэхнічнай адукацыі ў Менску выпускнікоў школаў іншых рэгіёнаў краіны. Суд зрабіў выснову, што гэтая пастанова не адпавядае артыкулу 49 Канстытуцыі, артыкулу 19 Закону «Аб правах дзіцяці», якія гарантуюць грамадзянам права на даступнасьць прафэсійна-тэхнічнай адукацыі і выбар навучальнай установы. Пастанова было прызнаная неканстытуцыйнай і ня маючай юрыдычнае сілы ў ча-

[18] Больш падрабязна пра гэтую і іншыя справы, датычныя свабоды перамяшчэньня, гл.: Вашкевич А. Конституционный Суд...

стцы абмежаваньня правоў грамадзянаў на атрыманьне прафэсійна-тэхнічнай адукацыі ў навучальных установах Менску[19].

У справе «Аб адпаведнасьці Канстытуцыі артыкулу 88 Закону Рэспублікі Беларусі «Аб пэнсійным забесьпячэньні» і артыкула 56 Закону Рэспублікі Беларусі «Аб пэнсійным забесьпячэньні вайскоўцаў, асобаў камандуючага і шараговага складу органаў унутраных справаў» суд, прызнаўшы гэтыя артыкулы неканстытуцыйнымі ў частцы прыпыненьня выплаты працоўнай пэнсіі на тэрмін пазбаўленьня пэнсіянэра волі, адначасова прапанаваў Вярхоўнаму Савету і органам выканаўчай улады прывесьці законы і іншыя нарматыўныя акты ў адпаведнасьць з Заключэньнем Канстытуцыйнага Суду ад 28 траўня 1996 г.

Артыкул 22 Канстытуцыі гарантаваў роўнасьць усіх перад законам і права без усялякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў. Захаваньне гэтай канстытуцыйнай нормы не магло быць забясьпечана ў варунках, калі адміністрацыйную адказнасьць, а таксама падвышаныя (у параўнаньні з ужо прынятым Кодэксам аб адміністрацыйных правапарушэньнях) памеры караў (штрафаў) на свой водум прымалі абласныя, Менскі гарадзкі саветы дэпутатаў. 24 кастрычніка 1994 г. Канстытуцыйны Суд прызнаў артыкул 5 Кодэксу аб адміністрацыйных правапарушэньнях у частцы надаваньня права мясцовым саветам прымаць пастановы аб узмацненьні і ўсталяваньні адміністрацыйнай адказнасьці неадпаведным Канстытуцыі.

Разглядаючы справу аб адпаведнасьці Канстытуцыі пастановаў Савету міністраў Рэспублікі Беларусі ад 6 красавіка 1992 г. № 186 «Аб дзяржаўных каштоўных паперах былога Саюзу ССР» і ад 5 сакавіка 1993 г. № 125 «Аб выкупе аблігацыяў мэтавай беспрацэнтнай пазыкі 1990 году на набыцьцё тавараў працяглага карыстаньня», суд прызнаў, што дзяржава беспадстаўна адмовілася выконваць узятыя на сябе абавязкі што да грамадзянаў-уласьнікаў аблігацыяў азначанай пазыкі, не згадзіўшыся на прапанаваныя ўмовы іх пагашэньня. Тым самым былі парушаныя ня толькі патрабаваньні асноўных нормаў грамадзянскага заканадаўства, але й канстытуцыйны прынцып узаемнай адказнасьці дзяржавы й грамадзяніна.

Канстытуцыйны Суд выказаўся ў абарону грамадзянскіх і палітычных правоў і свабодаў грамадзянаў у справе канстытуцыйнасьці Ўказу Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 21 жніўня 1995 г. № 336 «Аб некаторых захадах для забесьпячэньня стабільнасьці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусі».

Гэтым указам была прыпыненая дзейнасьць Свабоднага прафсаюзу і пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Менскага мэтрапалітэну прафсаюзу чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў Рэспублікі Беларусі; пракуратуры было загадана ўнесьці ў суды пастановы для забароны дзейнасьці гэтых прафсаюзных арганізацыяў; прадугледжвалася, што ўдзел палітычных партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў і прафсаюзаў у страйках на прадпрыемствах, улучаных у Пералік, зацьверджаны пастановаю кабінэту міністраў ад 28 сакавіка 1995 г. № 158, цягне за сабой спыненьне іх дзейнасьці. Апрача таго, указ прыпыняў дзеяньне нормаў законаў у пляне недатыкальнасьці дэпутатаў Вярхоўнага Савету і мясцовых саветаў дэпутатаў.

Суд прызнаў, што гэтыя дзеяньні Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі супярэчаць Канстытуцыі, законам Рэспублікі Беларусі, Міжнароднаму пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох, Канвэнцыі Міжнароднай арганізацыі працы «Аб свабодзе асацыяцыяў і абароне права на арганізацыю», ратыфікаваным Рэспублікай Беларусяй.

---

19 Вестник Конституционного Суда Республики Беларусь. 1996. № 4. С. 32–37.

На ініцыятыву дэпутатаў Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі, што паставілі пытаньне аб недапушчальнасьці манапалізацыі сродкаў масавай інфармацыі, суд праверыў тры ўказы прэзыдэнта (ад 4 жніўня 1994 г. № 19, ад 5 жніўня 1994 г. № 27, ад 28 верасьня 1994 г. № 128), датычных дзейнасьці выдавецтва «Беларускі дом друку», якое займала дамінуючае становішча на рынку газэтнай прадукцыі. Злоўжываньне гэтым становішчам з боку асобных службовых асобаў дзяржаўных органаў кіраваньня прывяло да таго, што ў сьнежні 1994 г. некаторыя газэты выйшлі зь белымі плямамі. Гэтым было парушанае канстытуцыйнае права грамадзянаў на атрыманьне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі. Нэгатыўныя наступствы такога становішча мелі месца і ў 1995 г., калі ў сувязі з парушэньнем устаноўленага парадку выдавецтвам «Беларускі дом друку» былі скасаваныя дамовы з шэрагам недзяржаўных выданьняў, што змусіла іх шукаць паліграфічную базу вонках краіны.

Суд таксама прыйшоў да высновы, што Нацыянальная тэлерадыёкампанія была ня толькі сродкам масавай інфармацыі, займаючы дамінуючае становішча ў сфэры тэлерадыёвяшчаньня, але й мела функцыі цэнтральнага органа дзяржаўнага кіраваньня. Гэта прывяло фактычна да ўстанаўленьня яе манаполіі ў сфэры электронных сродкаў масавай інфармацыі.

На гэтай падставе суд прызнаў, што асобныя нормы Палажэньня аб Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, зацьверджанага Ўказам прэзыдэнта ад 28 верасьня 1994 г. № 128, пярэчаць Канстытуцыі, якая забараняе манапалізацыю сродкаў масавай інфармацыі дзяржавай, грамадзкімі аб’яднаньнямі або асобнымі грамадзянамі.

У шэрагу сваіх пастановаў Канстытуцыйны Суд зьвярнуў увагу на неабходнасьць захаваньня канстытуцыйнага прынцыпу разьдзяленьня ўладаў, згодна зь якім заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады самастойныя ў межах сваіх паўнамоцтваў, узаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адна адну.

Гэтак, разьмежаваньне паўнамоцтваў Вярхоўнага Савету й прэзыдэнта, а таксама вызначэньне іх месца ў сыстэме органаў дзяржаўнай улады былі разгледжаныя судом пры праверцы канстытуцыйнасьці Законаў аб Вярхоўным Савеце і Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі. Суд прызнаў, што шэраг палажэньняў Законаў як аб Вярхоўным Савеце, так і аб прэзыдэнту не адпавядаюць Канстытуцыі, у той жа час была падкрэсьленая важнасьць дэталізацыі сфэры дзейнасьці найвышэйшых органаў дзяржаўнай улады і забесьпячэньня іх эфэктыўнага ўзаемадзеяньня, як гэтага патрабуе Канстытуцыя.

Суд канстатаваў, што прынцып разьдзяленьня ўладаў яшчэ не атрымаў належнага ўвасабленьня на практыцы. У выніку мелі месца факты неабгрунтаванага ўзмацненьня выканаўчай улады, прыніжэньня ролі і значэньня іншых галінаў улады.

У справе адпаведнасьці Канстытуцыі Закону ад 6 кастрычніка 1994 г. «Аб унясеньні зьменаў і дапаўненьняў у Закон Рэспублікі Беларусі «Аб мясцовым самакіраваньні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусі» суд сваім заключэньнем прызнаў неканстытуцыйнымі нормы гэтага Закону, датычныя скасаваньня мясцовых саветаў першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Разгледзеўшы справу аб адпаведнасьці Канстытуцыі артыкула 7 Закону «Аб Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусі», асобных артыкулаў Рэглямэнту Вярхоўнага Савету, суд прыйшоў да высновы, што Канстытуцыя не дапускае, як гэта трактавалася выканаўчай уладай, адсутнасьці найвышэйшага прадстаўнічага і адзінага заканадаўчага органа ўлады, якім ёсьць Вярхоўны Савет. На падставе Канстытуцыі і Закону «Аб парадку ўступленьня ў сілу Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі» суд прызнаў, што Вярхоўны Савет 12 скліка765ньня мае права ажыць-

цяўляць свае паўнамоцтвы аж да першага паседжаньня Вярхоўнага Савету трынаццатага скліканьня, абранага ў паўнамоцным складзе.

Указам прэзыдэнта ад 19 верасьня 1995 г. № 383 «Аб правядзеньні рэформы органаў мясцовага кіраваньня і самакіраваньня» былі зьліквідаваныя ў гарадох раённыя саветы дэпутатаў і іх органы. На тэрыторыі гэтых раёнаў былі ўтвораныя мясцовыя адміністрацыі, абвешчаныя правапераемцамі выканаўчых камітэтаў раённых саветаў дэпутатаў. Гэтым жа ўказам у гарадох было прыпыненае правядзеньне выбараў у раённыя саветы народных дэпутатаў. Наступныя ўказы прэзыдэнта ад 27 лістапада 1995 г. № 481 і ад 30 лістапада 1995 г. № 485 зацьвярджалі прыкладную структуру мясцовай адміністрацыі і ўносілі зьмены і дапаўненьні ў Часовае палажэньне аб мясцовай адміністрацыі.

Разгледзеўшы гэтыя ўказы, суд пастанавіў, што ліквідацыя ў гарадох раённых саветаў дэпутатаў і іх органаў і стварэньне на тэрыторыі раёнаў у гарадох мясцовых адміністрацыяў, пярэчаць Канстытуцыі і Закону «Аб мясцовым кіраваньні й самакіраваньні», а прыпыненьне правядзеньня выбараў у раённыя саветы дэпутатаў пярэчаць Канстытуцыі і Закону аб выбарах дэпутатаў мясцовых саветаў.

Можна безь перабольшаньня сказаць, што на пачатковым этапе дзейнасьці (красавік 1994 г. — лістапад 1996 г.) Канстытуцыйны Суд зрабіў значны ўнёсак у рэалізацыю канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзянаў і забесьпячэньне прынцыпаў вяршэнства закону і разьдзяленьня ўладаў. Упершыню ў айчыннай практыцы канстытуцыяналізму было прадэманстраванае імкненьне органа ўлады служыць Канстытуцыі і абараняць правы чалавека і грамадзяніна.

## Справа аб імпічмэнце прэзыдэнта А. Лукашэнкі

Напярэдадні канстытуцыйнага рэфэрэндуму 24 лістапада 1996 г. 73 дэпутаты Вярхоўнага Савету зьвярнуліся ў Канстытуцыйны суд з ініцыятывай аб адхіленьні ад пасады прэзыдэнта А. Лукашэнкі. Фармальнай падставай ініцыятывы дэпутатаў сталі шматлікія факты выданьня А. Лукашэнкам указаў, што пярэчылі Канстытуцыі і парушалі асноўныя правы й свабоды грамадзянаў. Такіх актаў, прызнаных устаноўленым парадкам неканстытуцыйнымі, налічвалася 18.

Рэальнай жа прычынай для пачатку працэдуры імпічмэнту стаў заняты канфлікт паміж А. Лукашэнкам і парлямэнтам. Вытокі гэтага канфлікту, на наш погляд, трэба шукаць у нястрымным імкненьні А. Лукашэнкі сканцэнтраваць у сваіх руках усю дзяржаўную ўладу і пазбавіць іншыя органы ўлады права кантраляваць ягоную дзейнасьць. Улетку 1996 году А. Лукашэнка абвесьціў намер правесьці нацыянальны рэфэрэндум і ўнесьці істотныя зьмены й дапаўненьні ў Канстытуцыю 1994 году. Народу Беларусі прапаноўвалася, па сутнасьці, новая канстытуцыя. Асноўныя праўкі датычылі пераразьмеркаваньня паўнамоцтваў асноўных органаў улады. Прычым большая частка паўнамоцтваў даставалася прэзыдэнту. У той жа час Вярхоўны Савет як найвышэйшы прадстаўнічы орган улады мусіў быць датэрмінова распушчаны, а замест яго меў зьявіцца дзьвюхпалатны парлямэнт накшталт Нацыянальнага сходу Францыі. Канстытуцыйны суд таксама належала рэфармаваць, зьмяніўшы парадак яго фармаваньня і звузіўшы кампэтэнцыю. У выніку і парлямэнт, і Канстытуцыйны Суд лучалі ў поўную залежнасьць ад прэзыдэнта, чые паўнамоцтвы, у сувязі з прыняцьцём новай канстытуцыі, працягваліся на два гады.

Пад выглядам правядзеньня рэфэрэндуму А. Лукашэнка й ягоная каманда рыхтавалі дзяр-

жаўны пераварот з мэтай умацаваньня асабістай улады прэзыдэнта. Дэмакратычна настроеныя дэпутаты Вярхоўнага Савету ўсяляк чынілі перашкоды гэтым памкненьням А. Лукашэнкі. На прапанову Старшыні Вярхоўнага Савету С. Шарэцкага й з уласнай ініцыятывы Канстытуцыйны Суд разгледзеў з пункту погляду адпаведнасьці Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусі пастанову Вярхоўнага Савету ад 6 верасьня 1996 году «Аб правядзеньні рэспубліканскага рэфэрэндуму ў Рэспубліцы Беларусі і захадах для яго забесьпячэньня» і пастанавіў, што пытаньне аб зьменах і дапаўненьнях Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі ня можа выносіцца на абавязковы рэфэрэндум. Паводле пастановы суду, вынікі галасаваньня ў гэтым пытаньні маглі мець адно рэкамэндацыйны (кансультацыйны) характар[20].

На падставе рашэньня Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада 1996 году Вярхоўны Савет унёс зьмены ў сваю пастанову ад 6 верасьня 1996 году і прызнаў, што на абавязковы рэфэрэндум выносяцца толькі пытаньні пра перанос Дня незалежнасьці Рэспублікі Беларусі (Дня Рэспублікі) і пра выбарнасьць кіраўнікоў мясцовых органаў выканаўчай улады.

А. Лукашэнка, ня згодны з заключэньнем Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада 1996 г. і пастановаю Вярхоўнага Савету ад 6 лістапада 1996, выдаў два ўказы, датычныя будучага рэфэрэндуму. Указ ад 5 лістапада 1996 г. № 455, парушаючы Канстытуцыю і Закон «Аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме) ў Рэспубліцы Беларусі», вызначаў парадак уступленьня ў сілу рашэньняў рэспубліканскіх рэфэрэндумаў аб зьменах і дапаўненьнях Канстытуцыі[21]. Указ ад 7 лістапада 1996 г. № 459 сьцьвярджаў, што заключэньне Канстытуцыйнага Суду ад 4 лістапада 1996 г. ня дзейснае, бо істотна разыходзіцца з Канстытуцыяй і абмяжоўвае канстытуцыйнае права грамадзянаў на ўдзел у рэфэрэндуме (народным галасаваньні)[22]. Больш за тое, указ зьмяшчаў пагрозу на адрас тых дзяржаўных органаў, якія будуць замінаць правядзеньню рэспубліканскага рэфэрэндуму. Дзейнасьць такіх дзяржаўных органаў, паводле ўказу прэзыдэнта, мусіла быць спыненая, а вінаватыя асобы прыцягваліся да адказнасьці. У істоце гэта было ўвядзеньне простага прэзыдэнцкага кіраваньня з усімі наступнымі вынікамі.

За два тыдні да рэфэрэндуму, з 9 лістапада 1996 году, пачалося датэрміновае галасаваньне, хаця тэксты зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі не былі яшчэ апублікаваныя. Толькі 12 лістапада чатырохмільённым накладам выйшаў з друку прэзыдэнцкі праект Канстытуцыі. А вось альтэрнатыўны праект, вынесены на рэфэрэндум дэпутатамі Вярхоўнага Савету, невялічкім накладам быў апублікаваны толькі 21 лістапада, і грамадзяне практычна ня мелі магчымасьці зь ім азнаёміцца.

Увесь гэты час грамадзтва апрацоўвалася дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі. Грамадзянам дзясяткі разоў на дзень па радыё й тэлебачаньні прапаноўвалася падтрымаць пытаньні, вынесеныя прэзыдэнтам. Надзвычайную актыўнасьць падчас падрыхтоўкі да рэфэрэндуму разгарнулі падпарадкаваныя прэзыдэнту органы выканаўчай улады. Кіраўнікі прадпрыемстваў, установаў, арганізацыяў, калгасаў, саўгасаў, камандзіры вайсковых частак атрымалі канкрэтныя ўказаньні забясьпечыць перамогу прэзыдэнцкага праекту Канстытуцыі. Ува ўсіх рэгіёнах былі створаныя штабы для правядзеньня рэфэрэндуму, якія ахапілі сваім уплывам і кантролем амаль усё дарослае насельніцтва краіны.

Пад рознымі падставамі грамадзянаў схілялі да датэрміновага галасаваньня (хаця гэта й

20 Собрание указов Президента и постановлений Правительства Республики Беларусь. 1996. № 31. С. 808.

21 Гэты ўказ ня быў апублікаваны ў афіцыйным выданьні. Ягоны тэкст гл.: Рэспубліка. 1996. 9 лістапада.

22 Пастухов М. Импичмент не состоялся. А могло ли быть иначе? // Народная воля. 1997. 4 сакавіка.

было парушэньнем Закону аб рэфэрэндуме). Праводзілася нечуваная дагэтуль агітацыйная праца на карысьць пытаньняў, прапанаваных прэзыдэнтам. Сам А. Лукашэнка з прапагандысцкімі мэтамі наведаў шэраг гарадоў, буйных прадпрыемстваў, выступаў на шматлюдных грамадзкіх форумах.

У такіх варунках 19 лістапада 1996 году Канстытуцыйны Суд распачаў справу «Аб парушэньні Прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусі А. Лукашэнкам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі». Аднак справа не разглядалася па сутнасьці. На судзьдзяў рабіўся беспрэцэдэнтны ўціск з боку Адміністрацыі прэзыдэнта. Старшыню суду В. Ціхіню двойчы выклікалі на канфідэнцыйныя гутаркі з А. Лукашэнкам. Пасьля гэтых сустрэчаў В. Ціхіня неаднойчы схіляў судзьдзяў спыніць справу.

Усёахопны ўціск рабіўся таксама на дэпутатаў, якія падпісалі зварот у Канстытуцыйны Суд. У выніку незаконных дзеяньняў уладаў (запалохваньні, шантаж, пагрозы і да т.п.) да дня разгляду справы 12 дэпутатаў адклікалі свае подпісы пад зваротам.

Яшчэ адна цікавая дэталь. Напярэдадні разгляду справы аб адхіленьні прэзыдэнта А. Лукашэнкі ад пасады ў Менск прыбыла група расійскіх высокіх асобаў (Віктар Чарнамырдзін, Генадзь Селязьнёў, Ягор Строеў). Пад іхным патранажам уночы з 21 на 22 лістапада было падпісанае «траістае» «Пагадненьне аб грамадзка-палітычнай сытуацыі і канстытуцыйнай рэформе ў Рэспубліцы Беларусі»*. Яго падпісалі прэзыдэнт А. Лукашэнка, які абавязаўся скасаваць свае ўказы аб абавязковым рэфэрэндуме ў пытаньнях зьменаў і дапаўненьняў Канстытуцыі; Старшыня Вярхоўнага Савету С. Шарэцкі, які меўся забясьпечыць адкліканьне з Канстытуцыйнага Суду дэпутацкага звароту; Старшыня Канстытуцыйнага Суду В. Ціхіня, які мусіў спыніць справу аб парушэньні прэзыдэнтам А. Лукашэнкам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі.

Падпісаньне гэтага Пагадненьня не дазволіла Канстытуцыйнаму Суду пачаць 22 лістапада 1996 году разгляд справы, нягледзячы на тое, што сабраліся ўсе ўдзельнікі судовага паседжаньня. Старшыня суду В. Ціхіня ня даў пачаць працэсу і адклаў разгляд да атрыманьня ліста С. Шарэцкага аб адкліканьні подпісаў дэпутатаў Вярхоўнага Савету. Аднак бальшыня дэпутатаў адмовілася адклікаць свае подпісы.

Выніковае паседжаньне суду было прызначанае на 26 лістапада 1996 г. Але ранкам гэтага дня Цэнтальная камісія па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў абвясьціла «пераможныя» вынікі рэфэрэндуму і ўступленьне ў сілу новай рэдакцыі Канстытуцыі. Вярхоўны Савет 13 скліканьня на ініцыятыву Адміністрацыі прэзыдэнта быў распушчаны. У такіх умовах Канстытуцыйны Суд спыніў справу аб парушэньні прэзыдэнтам А. Лукашэнкам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі. Фармальнай падставай для гэтага паслужыла тое, што дэпутаты Вярхоўнага Савету адклікалі свае подпісы пад зваротам у Канстытуцыйны Суд[23].

## Зьмены прававога статусу Канстытуцыйнага Суду паводле новай рэдакцыі Канстытуцыі

Новая рэдакцыя Асноўнага Закону, а таксама прынятая на яе аснове новая вэрсія Закону аб Канстытуцыйным Судзе кардынальна зьмяніла статус суду і яго чальцоў.

* Яно не было апублікаванае ў сродках масавай інфармацыі і засталося грамадзтву невядомым.

23 Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. 1999. № 91. № 1/795.

З Канстытуцыі зьнік асобны разьдзел, прысьвечаны прававому статусу Канстытуцыйнага Суду. Замест ранейшых васьмёх артыкулаў у новую рэдакцыю Асноўнага Закону ўвайшоў толькі адзін артыкул, зьмешчаны ў самым канцы разьдзелу «Суд».

Калі дагэтуль увесь склад суду абіраўся парлямэнтам, дык цяперака, згодна з часткай 3 артыкулу 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, шэсьць судзьдзяў прызначаюцца прэзыдэнтам, а шэсьць — абіраюцца вярхняй палатай парлямэнту — Саветам Рэспублікі.

Цікава, што, нягледзячы на ўказаньне Канстытуцыі выбіраць шэсьць судзьдзяў, насамрэч ніякіх выбараў не праводзілася, альтэрнатыўныя кандыдатуры парлямэнту не прапаноўваліся і на паседжаньні, на якім зацьвярджалі судзьдзяў, не абмяркоўваліся. І яшчэ: у Рэглямэнце Савету Рэспублікі, які афіцыйна не публікаваўся, ёсьць палажэньне, згодна зь якім усе кандыдатуры на пасаду судзьдзяў Канстытуцыйнага Суду могуць уносіцца на разгляд верхняй палаты толькі на прапанову Старшыні Канстытуцыйнага Суду. Іначай кажучы, магчымасьць прызначэньня непажаданых з той ці іншай прычыны для прэзыдэнта судзьдзяў цалкам выключаная.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі і — адпаведна — у новай рэдакцыі Закону аб Канстытуцыйным Судзе зьмяніліся патрабаваньні да прэтэндэнтаў на пасаду судзьдзі. Гранічны ўзрост чальцоў суду павышаны да 70 год. Цяпер прэтэндэнты павінны, «як правіла», мець навуковую ступень у галіне юрыспрудэнцыі. Што праўда, у Канстытуцыі нічога не гаворыцца пра тое, хто вырашае, магчыма ці не магчыма вылучаць на пасаду судзьдзі асобу, якая ня мае такой ступені.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі і Закону аб Канстытуцыйным Судзе зьніжаныя гарантыі незалежнасьці судзьдзяў. Цяпер паўнамоцтвы судзьдзі могуць прыпыняцца, ён можа быць арыштаваны або прыцягнуты да адказнасьці «са згоды прэзыдэнта». Акрамя таго, прэзыдэнт можа ў любы час адхіліць старшыню суду і любога судзьдзю (у тым ліку і прызначанага ня ім на пасаду) у выпадках, прадугледжаных арт. 18 Закону аб Канстытуцыйным Судзе.

Зьніжаныя і матэрыяльныя гарантыі незалежнасьці судзьдзяў. Цяпер яны ў матэрыяльным забесьпячэньні прыраўноўваюцца да судзьдзяў агульных судоў.

29 студзеня 1997 году парлямэнт прыняў дапаўненьне да Закону аб Канстытуцыйным Судзе, згодна зь якім «судзьдзя ў часе зьдзяйсьненьня сваіх паўнамоцтваў у Канстытуцыйным Судзе прыводзіцца да прысягі аднаго разу». Аднак, нягледзячы на гэта, 4 сакавіка 1997 г. новы склад судзьдзяў, у тым ліку й чацьвёра судзьдзяў першага складу, былі прыведзеныя да прысягі на вернасьць новай рэдакцыі Канстытуцыі асабіста А. Лукашэнкам.

Істотныя зьмены адбыліся ў пераліку суб’ектаў, надзеленых правам ініцыяваць судовыя справы ў Канстытуцыйным Судзе. Зь іх былі выключаныя тыя суб’екты, якія раней праявілі найбольшую актыўнасьць у падачы заяваў. Згодна з новымі варункамі, Канстытуцыйны Суд ня можа распачынаць справы з уласнай ініцыятывы. Цяпер права зьвяртацца ў суд маюць прэзыдэнт, абедзьве палаты парлямэнту, Вярхоўны і Вышэйшы гаспадарчыя суды (прызначаныя прэзыдэнтам) і Савет міністраў Рэспублікі Беларусі (прэм’ер-міністар прызначаецца на пасаду прэзыдэнтам з наступным зацьверджаньнем верхняй палатай парлямэнту, астатнія чальцы ўраду прызначаюцца прэзыдэнтам).

З новай рэдакцыі Канстытуцыі зьнікла права Канстытуцыйнага Суду даваць заключэньне пра парушэньне Канстытуцыі прэзыдэнтам. Замест гэтага зьявілася норма аб неабходнасьці на прапанову прэзыдэнта даваць заключэньне пра наяўнасьць фактаў сыстэматычнага або грубага парушэньня Канстытуцыі палатамі парлямэнту.

З Асноўнага Закону зьнікла згадка пра тое, што пастановы Канстытуцыйнага Суду канчатковыя і не падлягаюць абскарджаньню і апратэставаньню, а таксама норма аб тым, што

простае або ўскоснае ўзьдзеяньне на Канстытуцыйны Суд ці яго чальцоў, зьвязанае зь дзейнасьцю для ажыцьцяўленьня канстытуцыйнага кантролю, недапушчальнае і цягне за сабой адказнасьць згодна з законам.

Такім чынам, зьмены, унесеныя ў заканадаўства і датычныя інстытуту канстытуцыйнага кантролю пасьля правядзеньня рэфэрэндуму 1996 г., ня маюць прагрэсіўнага характару, звужаюць гарантыі незалежнасьці судзьдзяў, ставяць Канстытуцыйны Суд і яго чальцоў у жорсткую залежнасьць ад волі аднога чалавека.

У выніку Канстытуцыйны Суд з актыўнага і самастойнага органа канстытуцыйнага кантролю ператварыўся ў залежную ад прэзыдэнта і яго структураў (Адміністрацыі, упраўленьня справаў, службы бясьпекі) юрыдычную ўстанову, пазбаўленую ўсялякае ініцыятывы і ўласнае пазыцыі. Гэтае перараджэньне добра відаць на прыкладзе справаў, якія разгледзеў новы склад суду да 2001 г.

За гэты тэрмін дзейнасьці Канстытуцыйнага Суду ў новым складзе ім былі разгледжаныя ў 1997 годзе — 13 справаў, у 1998 — 11, у 1999 — 17, у 2000 — 28. Аднак ніводзін акт прэзыдэнта ня быў прызнаны супярэчным Канстытуцыі, нягледзячы на тое, што шмат якія дэкрэты і ўказы прэзыдэнта, на думку выбітных беларускіх навукоўцаў, маюць яўна антыканстытуцыйны характар і пярэчаць ужо новай рэдакцыі Асноўнага Закону. Прыкладам, згодна з сумнавядомым дэкрэтам прэзыдэнта № 40, ён мае права прымаць пастанову аб канфіскацыі маёмасьці, што належыць на правах уласнасьці як юрыдычным, так і фізычным асобам, нягледзячы на канстытуцыйную норму, што прымусовае адчужэньне маёмасьці ажыцьцяўляецца толькі паводле пастановы суду (Гэтае права было пасьлей скасаванае. — **Рэд.**).

Пра «незалежнасьць» судзьдзяў яскрава сьведчыць Указ прэзыдэнта № 32 ад 18.01.1999 г., адпаведна зь якім прэзыдэнт... прыцягвае да дысцыплінарнай адказнасьці Старшыню Канстытуцыйнага Суду і яго намесьніка, калі яны «нясвоечасова прайшлі штогадовы мэдычны агляд у лячэльных установах упраўленьня справаў прэзыдэнта»[24].

Парушэньнем Канстытуцыі і Закону аб Канстытуцыйным Судзе, якія не прадугледжваюць інстытуту папярэдняга кантролю, зьяўляецца тое, што судзьдзі Канстытуцыйнага Суду, паводле словаў самога А. Лукашэнкі, ажыцьцяўляюць папярэднюю экспэртызу законапраектаў, а таксама бяруць удзел у іх распрацоўцы.

Не дазваляюць казаць пра значэннасьць Канстытуцыйнага Суду ў справе абароны правоў грамадзянаў і ягоныя пасланьні пра стан канстытуцыйнай законнасьці ў Рэспубліцы Беларусь. Яны больш нагадваюць справаздачы аб зробленай працы зь яўным імкненьнем прыхарашыць стан справаў у сфэры захаваньня канстытуцыйных нормаў. У пасланьнях апісваюцца ўсе разгледжаныя справы, аналізуецца зьмест лістоў, што паступілі на адрас Канстытуцыйнага Суду, пералічаюцца канфэрэнцыі, у якіх удзельнічалі судзьдзі Канстытуцыйнага Суду. Але разам з тым у іх няма галоўнага — прынцыповасьці ў ацэнцы стану з захаваньнем законнасьці і правоў чалавека.

## Высновы

У выніку палітычнай і прававой трансфармацыі статус Канстытуцыйнага Суду ў сыстэме

[24] Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. 1999. № 7. № 1/41.

органаў дзяржаўнай улады рэзка зьнізіўся. Ён хутчэй выконвае ролю дэкарацыі, чымся рэальна дзейснага органа канстытуцыйнага кантролю. Ягонай «доляй» сталі справы, зьвязаныя з праверкай канстытуцыйнасьці асобных палажэньняў законаў, пастановаў ураду і ведамасных нарматыўных актаў. Заключэньні суду ў гэтых справах практычна не ўплываюць на сытуацыю з законнасьцю і правамі чалавека ў краіне.

Паказальна, што нягледзячы на яўныя парушэньні ўжо новай Канстытуцыі, якія ўтрымліваюцца ў актах прэзыдэнта, ніводзін зь іх ня быў скасаваны за час працы новага складу Канстытуцыйнага Суду. Больш за тое, яны нават не былі прадметам разгляду ў судзе.

Улічваючы цяперашні статус суду, а таксама тую акалічнасьць, што ўсе найвышэйшыя органы дзяржавы сфармаваныя самім А. Лукашэнкам або пры ягоным беспасярэднім удзеле, можна сьцьвярджаць: Канстытуцыйны Суд фактычна стаў дэкарацыйным органам, які камуфлюе адсутнасьць рэальнага разьдзяленьня і балянсу ўладаў у дзяржаўным мэханізьме Рэспублікі Беларусі.

## СТРУКТУРА ОРГАНАЎ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСІ І ІХ ТРАНСФАРМАЦЫЯ

Эвалюцыя палітычнае сыстэмы ў напрамку аўтарытарнае мадэлі кіраваньня трэба шукаць ня толькі ў мэнталітэце і асаблівасьцях палітычнае культуры, але і ў арганізацыйна-структурных кампанэнтах палітычнай улады, а таксама што, ня менш істотна, у працэсах рэалізацыі адміністрацыйна-гаспадарчых функцыяў дзяржавы.

У сувязі з гэтым асобнага аналізу заслугоўваюць наступныя праблемы дзяржаўнага кіраваньня: 1) аналіз структуры органаў дзяржкіраваньня; 2) вывучэньне ролі бюракратыі як самастойнага актора ў палітычнай сыстэме; 3) узровень і формы карупцыі.

Сыстэма дзяржаўнага кіраваньня Рэспублікі Беларусі разьвівалася ў некалькі этапаў. Першы прыпадае на 1991—1994 гады і быў зьвязаны з інэрцыйным і шмат у чым спантанным паўстаньнем парлямэнцкай сыстэмы. У гэты час адбываецца разбурэньне савецкай сыстэмы ўлады, стварэньне незалежнае дзяржавы і ўсталяваньне “няўстойлівае дэмакратыі”, якая суправаджалася дэзарыентацыяй кіруючай эліты і афармленьнем фрагмэнтаванай шматпартыйнасьці.

Штаты органы кіраваньня незалежнай Беларусі фармаваліся на аснове прафэсійных работнікаў партыйнага й дзяржаўнага апарату, г. зн. былое намэнклятуры, якая ў савецкія часы мела шмат прывілеяў, і галоўную зь іх – манаполію на ўладу. Урад Вячаслава Кебіча, прызначаны ў траўні 1990 году, складаўся ў асноўным з былое камуністычнае эліты (далей посткамуністычная эліта), якая атрымала магчымасьць прыватызацыі значнай часткі нацыянальнае ўласнасьці. Старшыня Вярхоўнага Савету, С. Шушкевіч, які стаў Старшынёй Вярхоўнага Савету ў верасьні 1991 году і пазыцыянаваўся як “дэмакратычныя лідэр”, шмат у чым служыў «прыкрыцьцём» для намэнклятурнай бюракратыі. На пачатку 1994 году ён быў адхілены ад улады. З шэрагу прычынаў як пэрсанальнага, так і інстытуцыйнага характару (нязьдольнасьць выканаўчай улады выконваць функцыі эфэктыўнага палітычнага кіраваньня) было прынятае рашэньне ўвесьці парлямэнцка-прэзыдэнцкую сыстэму, што і адлюстравалася ў Канстытуцыі 1994 г.

Прэзыдэнцкія выбары і перамога А. Лукашэнкі адкрылі шлях на вышэйшыя пасады іншым групам выхадцаў з намэнклятуры, менш рэспэктабэльным паводле свайго сацыяльнага паходжаньня, але ня менш амбітным. Гэта была генэрацыя так званых «старых камсамольцаў і маладых камуністаў», але прадстаўнікі старое эліты таксама захавалі свае пазыцыі на кіруючых дзяржаўных пасадах.

З абраньнем новага прэзыдэнта пачынаецца новыя этап палітычнага разьвіцьця Беларусі – пэрыяд канстытуцыйнага крызысу, які адбываўся 1994—1996 і меў пэрманэнтны характар. Пэрыяд характарызуецца ўзьнікненьнем жорсткага супрацьстаяньня паміж прэзыдэнтам і парлямэнтам, якое завяршылася рэфэрэндумам у лістападзе 1996 і паўстаньнем супэрпрэзыдэнцкай сыстэмы кіраваньня.

Асноўным «дасягненьнем» і вынікам гэтага пэрыяду зьяўляецца стварэньне “выканаўчае вэртыкалі” і значная цэнтралізацыя ўлады. Рэгіянальная бюракратыя да першых прэзыдэнцкіх выбараў была адданая В. Кебічу. Лукашэнка лёгка пераадолеў слабыя сумненьні і былыя сымпатыі мясцовых уладаў, выкарыстоўваючы заканадаўчыя мэханізмы. Была праведзеная рэформа сыстэмы органаў мясцовай улады (ухваленая парлямэнтам у кастрычніку 1994 году).

Зьмены Закону аб мясцовым самакіраваньні моцна абмежавалі ўладу сыстэмы Саветаў як органаў мясцовага самакіраваньня, замяніўшы яе скразной структураю дзяржаўнага кіраваньня. Уся ўлада на мясцовым узроўні была аддадзеная структурам, падпарадкаваным непасрэдна прэзыдэнту. Пасьля перамогі Лукашэнкі значна ўзрасла роля прадстаўнікоў Магілёўскае вобласьці, шмат хто зь іх быў абавязаны сваім кар’ерным ростам асабіста прэзыдэнту.

Такім чынам, Рэспубліка Беларусь, як і шэраг іншых рэспублік былога СССР, мела спробу стварэньня парлямэнцка-прэзыдэнцкай сыстэмы кіраваньня, але яна аказалася нетрывалай. Супярэчнасьці і адкрытае супрацьстаяньне паміж выканаўчай і заканадаўчай уладай прывяло да пэрманэнтнага палітычнага крызысу і паўстаньня аўтарытарнае мадэлі кіраваньня.

Пры фармальным захаваньні парлямэнцка-прэзыдэнцкай сыстэмы адбываўся няўхільны рост паўнамоцтваў прэзыдэнта, што было адлюстравана ў заканадаўстве. Гэта прывяло да пераўтварэньня выканаўчай улады ў дамінуючую палітычную сілу пад прыкрыцьцём рыторыкі пра фармаваньне цэнтру эфэктыўнага дзяржаўнага кіраваньня. На практыцы адсутнасьць трывалых грамадзянскіх і палітычных структураў дазваляе гэтай галіне ўлады ўсё больш і больш выходзіць з-пад кантролю. Больш за тое, гэта вядзе да зьнішчэньня ня толькі самой сыстэмы разьдзяленьня ўладаў, але й любога падабенства сыстэмы стрымак і супрацьвагаў. У канцы 1995 году пачынаецца фармаваньне адміністрацыйнага апарату адзінаўладзьдзя, то бок выканаўчай “вэртыкалі”.

Больш падрабязна спынімся на працэсах структураваньня органаў дзяржаўнага кіраваньня ў гэты пэрыяд. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў пасаду прэм’ер-міністра заняў Міхаіл Чыгір. Яго намесьнікамі (віцэ-прэм’ерамі) сталі Міхаіл Мясьніковіч, Сяргей Лінг, Уладзімер Гаркун і Віктар Ганчар. На пачатку сваёй прэм’ерскай дзейнасьці Чыгір выступае з праграмнай прамовай пра скарачэньне апарату кіраваньня, пра адыход ад галіновай структуры міністэрстваў, скарачэньне колькасьці міністэрстваў ад 36 (як гэта было за В. Кебічам) да 24. Аднак гэтыя ідэі, зрэшты, як і сама ідэя стварэньня ўладнай вэртыкалі, не былі чымсьці новым. Уважліва аналізуючы адну з праграмных прамоваў Кебіча – «Мы стаім на гістарычным скрыжаваньні» (сакавік 1994 г.), – знаходзім наступнае: «...узбуйніць блёкі дзяржкіраваньня, пашырыць кампэтэнцыю міністэрстваў, скараціць 13 зь іх, на 12% скараціць колькасьць работнікаў»; і яшчэ: «...разьмежаваць функцыі мясцовых органаў улады і кіраваньня і прадстаўн-

ічай улады на месцах (Саветаў), рашуча скараціць колькасьць мясцовых прадстаўнічых органаў; старшыняў абласных Саветаў павінен зацьвярджаць кіраўнік выканаўчай улады дзяржавы». Гэты прыклад вельмі добра ілюструе становішча, ролю адміністрацыйна-бюракратычнага апарату ў палітычнай сыстэме. Бюракратыя – гэта вельмі стабільны і кансэрватыўны кампанэнт цэнтру прыняцьця палітычных рашэньняў.

Яшчэ адна захаваная дасюль тэндэнцыя, якая таксама выразна праявілася ў разгляданы намі пэрыяд усталяваньня прэзыдэнцтва – гэта ўзрастаньне ролі Адміністрацыі прэзыдэнта ў дзяржаўным кіраваньні Беларусі. У 1994 годзе яе кіраўніком стаў Леанід Сініцын. Пачаткова гэтая структура занялася кантролем над кадравай палітыкай у пабудове органаў дзяржкіраваньня. Прыкладам, ужо ў жніўні 1994 г. у адным з інтэрвію кіраўнік Адміністрацыі заявіў, што структура ўраду вызначаная і ўлучае 25 міністэрстваў і Камітэт дзяржаўнае бясьпекі.

Кадры Адміністрацыі прэзыдэнта ў 1994 г.: намесьнікі кіраўніка Адміністрацыі Міхаіл Сазонаў, Васіль Даўгалёў (начальнік службы кантролю); Віктар Кучынскі (памочнік прэзыдэнта ў асаблівых даручэньнях); Віктар Шэйман (дзяржаўны сакратар Рады бясьпекі); Аляксандар Фядута (кіраўнік Упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі). Назавём некаторыя імёны кіраўнікоў ураду таго пэрыяду: Павал Казлоўскі – міністар абароны; Юры Захаранка – міністар унутраных справаў; Уладзімер Ягораў – старшыня КДБ; Барыс Батура – міністар эканомікі; Міхаіл Марыніч – міністар вонкаваэканамічных сувязяў; Вольга Даргель – міністар сацыяльнай абароны; Васіль Стражаў – міністар адукацыі й навукі; Інэса Драбышэўская – міністар аховы здароўя.

У сьпісе кіраўнікоў «першай хвалі» шмат імёнаў публічных палітыкаў, якія потым перайшлі ў адкрытую апазыцыю цяперашнім уладам. Адным зь іх спатрэбіліся гады, іншым – лічаныя месяцы дзеля перагляду сваіх пазыцыяў. Паказальны прыклад начальніка Ўпраўленьня ў справах тэрыторыяў Адміністрацыі, даверанай асобы Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г. Віктара Цярэшчанкі, які ўжо ў верасьні 1994 г. пайшоў у адстаўку ў сувязі зь нязгодай з кадравай палітыкай Лукашэнкі.

Адной зь першых ластавак у супрацьстаяньні прэзыдэнта й парлямэнту сталі спрэчкі аб стварэньні Ўпраўленьня справамі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ў 1994 г. Старшыня Вярхоўнага Савету Мечыслаў Грыб рэзка раскрытыкаваў Указ прэзыдэнта № 9 аб утварэньні вышэйзгаданага ўпраўленьня і запатрабаваў скасаваць пункты, датычныя фінансавага, матэрыяльна-тэхнічнага й сацыяльна-бытавога забесьпячэньня Парлямэнту з боку ўпраўленьня.

Зь верасьня 1995 г. у якасьці самастойнага органа ствараецца ГУДА (Галоўнае ўпраўленьне дзяржаўнай аховы) пры прэзыдэнту, беспасярэдне падпарадкаванае прэзыдэнту і дзяржсакратару Рады бясьпекі і прызначанае для аховы аб'ектаў дзяржаўнага значэньня. Яго начальнікам быў прызначаны дэпутат ВС 13 скліканьня, палкоўнік Міхаіл Цесавец. Сілавыя органы да гэтага часу маюць вялікае значэньне ў структурах улады і ўтвараюць па пэўным прыкметах дастаткова ўплывовыя і разгалінаваныя кланы, моцна зьвязаныя з "крышаваным" бізнэсам і выкарыстаньнем дзяржаўнае ўласнасьці.

## Узроўні прыняцьця рашэньняў

Аналізуючы сыстэму дзяржаўнай улады, мы павінны зыходзіць з разьдзяленьня бюракратыі на два ўзроўні – палітычны й прафэсійны. Да палітычнага ўзроўню належыць вузкі слой

вышэйшай і часткова сярэдняй бюракратыі, што займае такія дзяржаўныя пасады, якія дазваляюць ім у рамках Канстытуцыі праводзіць у жыццё пэўны палітычны курс. Асноўная маса дзяржслужбоўцаў належыць да другога ўзроўню.

Гэтае разьдзяленьне павінна суадносіцца з асноватворнымі канстытуцыйнымі актамі дзяржавы, калі ў дэмакратычных краінах да ўзроўню прафэсійных публічных палітыкаў належаць, як правіла, выбарныя афіцыйныя асобы. Адпаведна, яны наўпрост адказныя перад сваімі выбарцамі і, што ня менш важна, маюць шырокія паўнамоцтвы для прыняцьця ўладных пастановаў і іх рэалізацыі.

У Беларусі найбольшымі паўнамоцтвамі ўва ўладнае гіерархіі валодаюць службовыя асобы, чый статус не адлюстраваны ў Асноўным Законе краіны. Рэальная сыстэма прыняцьця рашэньняў у Беларусі не супадае з канстытуцыйна вызначанымі органамі дзяржаўнага кіраваньня. Разгледзім асноўныя ўзроўні прыняцьця рашэньняў.

Першы ўзровень – Адміністрацыя прэзыдэнта (больш дакладна, яе вышэйшыя эшалёны): каля сотні чалавек, якія ў сваім распараджэньні маюць да 90 адсоткаў дзяржаўнай уласнасьці.

Другі ўзровень – сярэдняе зьвяно Адміністрацыі прэзыдэнта і некаторыя спэцыяльныя службы: Камітэт дзяржкантролю, КДБ і г.д.

Савет міністраў, міністэрствы і дзяржаўныя камітэты можна аднесьці толькі да трэцяга ўзроўню, а мясцовыя выканаўчыя і адміністрацыйныя органы – да чацьвертага.

Дзяржслужбоўцы цалкам залежаць ад вышэйшых узроўняў уладнае гіерархіі як з адміністрацыйнага, так і зь фінансавага боку. Апрача гэтага, кіраўнікі структурных падразьдзяленьняў розных узроўняў могуць стаць ахвярай каньюнктурных прэзыдэнцкіх рашэньняў. Асобна можна вылучыць групу, якую прадстаўляюць дырэктары буйных дзяржаўных прадпрыемстваў, якія утвараюць некалькі прамысловых лабісцкіх групаў, а таксама кіраўнікоў калгасаў (сельскагаспадарчае лобі).

Цэнтралізацыя сыстэмы прыняцьця рашэньняў у Беларусі сёньня вышэйшая, чымся гэта было ў былым СССР. Значэнным фактам зьяўляецца тое, што манаполія выканаўчай улады дасягаецца сродкамі заканадаўчага рэгуляваньня, што было характэрным і для савецкай дзяржаўна-адміністрацыйнай практыкі, у намаганьні захаваць дамінуючую ролю дзяржаўных структураў у разьмеркаваньні фінансавых і палітычных рэсурсаў.

Структурным адрозьненьнем беларускай палітычнай сыстэмы застаецца дамінаваньне адміністрацыйна-разьмеркавальных стасункаў. Фэномэн «улады-ўласнасьці», калі ўлада першасная, а ўласнасьць выступае яе функцыяй, дае неаспрэчнае права адміністрацыйна-бюракратычнаму апарату на цэнтралізаванае пераразьмеркаваньне ўсіх каштоўнасьцяў і дабротаў. Дамінаваньне пераразьмеркавальнага тыпу публічнай палітыкі спалучанае зь вядучай роляй бюракратыі і высокай ступеньню імавернасьці ўжыцьця гвалту. Гэта вядзе да таго, што ўлада выступае ня столькі як інструмэнтальны сродак, колькі як найвышэйшая каштоўнасць сама па сабе.

## Бюракратыя як самастойны актор

Сучасная ўрадавая ўстанова – шматузроўневая арганізацыя, што акумулюе вялізныя веды й досьвед у сваёй спэцыфічнай сфэры. Ведамствы вылучаюць свае інтарэсы і прыярытэты.

Яны маюць шырокую сетку сувязяў (традыцыяў, пагадненьняў, пэрсанальных стасункаў у сваіх сфэрах) як зь іншымі ведамствамі, гэтак і з групамі інтарэсу. Бюракратыя імкнецца адыгрываць самастойную палітычную ролю. Кантроль над ажыцьцяўленьнем прынятых рашэньняў – крыніца бюракратычнай улады. Прыкладам, распад СССР стаў абвальным акурат тады, калі намэнклятура пайшла на зьмены ў сыстэме кіраваньня.

Крыніцы бюракратычнай улады: разьмеркаваньне бюджэтных рэсурсаў, крэдытаў, наданьне ільготаў; імкненьне да павелічэньня штатаў, бюджэту, паўнамоцтваў; уплыў на СМІ з мэтай фільтрацыі непажаданай інфармацыі або распаўсюджаньне ілжывай інфармацыі.

У Беларусі мы маем прыклад прыватызацыі чыноўнікамі іх кіраўнічых функцыяў. Паўнамоцтвы, сфэра дзейнасьці і нават службовыя абавязкі становяцца палітычнымі і эканамічнымі рэсурсамі чыноўніка. Гэта пацьвярджае ўскладненая працэдур дзейнасьці прыватнага бізнэсу, пэрманэнтныя кампаніі па перарэгістрацыі юрыдычных асобаў, ліцэнзаваньне відаў дзейнасьці, манапалізацыі цэлых эканамічных сфэраў "крышаванымі" структурамі. Сярэдні і буйны бізнэс магчымы толькі ў тым выпадку, калі падмацаваны прамой сувязьзю з адмысловымі асобамі ў бюракратычных структурах і "палітычнай" падтрымкаю. Чыноўнікі рознага рангу сваім апякунствам ствараюць «страху» для бізнэсу, атрымліваючы за гэта абавязковыя адлічэньні і, такім чынам, актыўна ўдзельнічаюць у пераразьмеркаваньні яго даходаў. Кантроль над рынкамі – найважнейшы рэсурс для бюракратыі. Можна ўпэўнена сьцьвярджаць, што сэктар "бізнэсу" будзе зьберагацца пры любым магчымым узмацненьні дзяржаўнай улады.

У Беларусі склаўся звышцэнтралізаваны рынак з абмежаванай канкурэнцыяй, адбылася эканамізацыя бюракратычных структураў. Такія карпаратыўныя рынкавыя стасункі стрымліваюць як эканамічнае разьвіцьцё, так і станаўленьне прафэсійнага і сучаснага мэнэджмэнту.

У канкурэнтнай сацыяльнай сыстэме дзяржаўныя ўстановы закліканыя аказваць разнастайныя паслугі насельніцтву побач зь недзяржаўнымі й прыватнымі арганізацыямі. Больш за тое, з мэтаю павышэньня эфэктыўнасьці працы дзяржапарату і эканоміі бюджэтных рэсурсаў некаторыя кіраўнічыя функцыі аддаюцца ў сфэру прыватнага сэктару. Безумоўна, гэта магчыма пры разьвітай сыстэме афармленьня інтарэсаў і гарантыях правоў уласнасьці. Недзяржаўныя аб'яднаньні і асацыяцыі грамадзянаў у разьвітых краінах складаюць канкурэнцыю і кантралююць працу дзяржаўных агенцыяў.

Роля адміністрацыйна-бюракратычнага апарату ў Беларусі можа ацэньвацца дваіста: з аднаго боку, адносна трывалае сацыяльнае і фінансавае становішча; зь іншага – надзвычай хісткія пазыцыі.

Першае – чаму пазыцыі бюракратыі трывалыя. Колькасьць дзяржчыноўнікаў у Беларусі каля 100 тысячаў. Дзеля параўнаньня – у 80-я гады ў БССР было каля 73 тысячаў чыноўнікаў.

Існуе шмат магчымасьцяў даць чыноўніку зарабіць, нават не выкарыстоўваючы «пазабюджэтных фондаў»: "крышаваньне" бізнэсу, стварэньне ўласных гаспадарчых структураў, "шэрыя" схемы ўзаемазалікаў паміж суб'ектамі гаспадараньня, валютныя спэкуляцыі, апекаваньне газавым і нафтавым бізнэсам, доступ да разьмеркаваньня бюджэтных сродкаў і дзяржаўных прывілеяў. Для чыноўнікаў існуе мноства магчымасьцяў іншага роду: спэцыяльнае мэдычнае абслугоўваньне, бясплатная прэстыжная адукацыя, ільготныя пуцёўкі ў найлепшыя дамы адпачынку, узнагароды й званьні, адчуваньне свайго высокага сацыяльнага статусу і наяўнасьці ўлады. Значна вышэй, чымся магчымасьць «прыватызацыі» кіраўнічых функцыяў, цэніцца магчымасьць «далучыцца да цывілізаванага сьвету» ў выглядзе за-

межных камандзіровак і выплаты сутачных у цьвёрдай валюце. Вяршыня чыноўніцкага лёту – атрыманьне дыпляматычнай пасады за мяжой ці сыход у прыбытковыя бізнэс-сфэры.

Другое – чаму пазыцыі чыноўнікаў хісткія. Многія прадстаўнікі цяперашніх уладных структураў зьвязаныя з рэжымам і матэрыяльнымі, і палітычнымі, і асабістымі абавязкамі. Няўстойлівасьць вызначаецца асабістай «васальнай» залежнасьцю ад патрона, магчымасьцю стаць ахвярай клопату за "народныя інтарэсы" ў выглядзе кампаніі па барацьбе з карупцыяй.

З боку Лукашэнкі і афіцыйных СМІ неаднойчы чуліся як запалохвальныя, так і пагардлівыя выказваньні на адрас адміністрацыйна-бюракратычнага апарату: «агрэсіўна-баязьлівае чынавенскае атачэньне» ("Знамя юности", 16.06.1998); «чыноўнікі загразьлі ў інтрыгах і звадах», корань сацыяльных праблемаў у «бескантрольным і карумпаваным чынавенстве – той рэальнай уладзе, якая ўзьнялася над намі» ("7 дней", 21.07.1998). У апошні час павялічылася роля сымбалічнае барацьбы зь "бюракратызмам", "злоўжываньнямі асобных бюракратаў", "валакітаю" і г.д. Але такія акцыі маюць пераважна інфармацыйнае значэньне і зарыентаваныя на грамадзкасьць у значна большай ступені, чым на рэальныя зьмены ў сыстэме кіраваньня.

Раскручваньне праблемы карупцыі – зручная магчымасьць для набыцьця дадатковага палітычнага капіталу. Згадайма «торбы кампрамату», сьпісы карупцыянэраў, складзеныя А. Лукашэнкам падчас ягонага дэпутацтва ў Вярхоўным Савеце. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў адной з буйных справаў стала адстаўка міністра лясной гаспадаркі Георгія Маркоўскага і абвінавачаньне яго ў злоўжываньнях і безадказнасьці. У верасьні 1994 г. адбылася яшчэ адна адстаўка: міністар абароны Павал Казлоўскі паніжаны ў званьні да генэрал-лейтэнанта за «злоўжываньні службовым становішчам» (затым пасаду міністра абароны займалі Анатоль Касьценка, Леанід Мальцаў, Аляксандар Чумакоў, ізноў Леанід Мальцаў).

Уздым барацьбы з карупцыяй адбываецца ў 1997 г.: арышты старшыні Нацыянальнага банку Тамары Віньнікавай (і паралельнае ўзмацненьне пазыцыяў Пятра Пракаповіча) і міністра сельскай гаспадаркі Васіля Лявонава (неўзабаве пасьля забойства ў кастрычніку 1997 г. Яўгена Мікалуцкага – прадстаўніка Камітэту дзяржкантролю па Магілёўскай вобласьці). Карупцыйныя скандалы пэрыядычна ўзьнікалі ў атачэньні прэзыдэнта і пазьней. Найбольш гучная справа Г. Жураўковай, якая да арышту ў 2003 г. ўзначальвала Ўпраўленьне справамі прэзыдэнта, можна ўзгадаць таксама крымінальную справу ў адносінах да Я. Рыбакова, былога старшыні Белтэлерадыёкампаніі.

Тут можна прасачыць заканамернасьць: з аднаго боку запалохваньне і адкрыты шантаж нескароных кіраўнікоў, зь іншага – тэхналёгія барацьбы за рэсурсы праз ліквідацыю канкурэнтаў.

Прыкладамі рэальнай карупцыі зьяўляецца дзейнасьць фундацыі Махмуда Эсамбаева і фірмы «Торгэкспо» (створаныя ў 1995 г.). У 1996 г. гэтыя структуры вызваляюцца ад уплаты мытных плацяжоў, акцызаў, ПДВ, займаюцца транспартаваньнем тавараў у Расію. Шкода бюджэту Беларусі за 1995 г. – люты 1996 г. склала 320 млн. $, г. зн. 11% гадавога дзяржбюджэту. Яшчэ прыклад – указам № 291 18 ад 01.08.95 было створанае прадпрыемства «Белспецвнешторг» дзеля «эфэктыўнага выкарыстаньня й рэалізацыі вызваленага ўзбраеньня, вайсковай тэхнікі, тавараў ВПК». Адна з буйных справаў – продаж партыі Міг 29 у Пэру. Пасьля 1996 году карупцыйныя схемы набылі сыстэмны інстытуцыялізаваны характар і адначасова сталі практычна непразрыстымі для грамадзкасьці.

Кампаніі па пакараньні нядбайных кіраўнікоў, па ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны, па

барацьбе з карупцыяй заўсёды маюць на ўвазе дзьве мэты. З аднаго боку, вонкавая мэта – узьдзеяньне на грамадзкую думку дзеля павышэньня аўтарытэту ўлады. Зь іншага боку, унутраныя мэты – кантроль за найбліжшым абкружэньнем з мэтай папярэджаньня змоваў і інтрыгаў.

Прэзыдэнцкая вэртыкаль улады ў Беларусі – ня столькі апора, колькі закладнік дзяржаўнай палітыкі. Стыль «сэлектарных нарадаў», адкрытыя абразы і пагардлівае стаўленьне да чыноўнікаў рознага, нават самага высокага ўзроўню ўмацаваліся як звычайная практыка ў стасунках «кіраўнік-падначалены». Паводле апытаньняў НІСЭПД (ліпень 2001 г.), да 80% «вэртыкалі» незадаволеныя існуючым парадкам рэчаў.

Некаторыя з функцыянэраў беларускага рэжыму наважваюцца на адкрыты пратэст супраць сыстэмы ўлады, напрыклад, былыя кіраўнік Упраўленьня справаў прэзыдэнта Іван Ціцянкоў і Генэральны пракурор Алег Бажэлка. У траўні 2001 г. самахоць пайшоў у адстаўку Ўладзімер Сьцяпанаў, намесьнік старшыні Берасьцейскага аблвыканкаму. У чэрвені 2001 з просьбай пра адстаўку зьвярнуўся старшыня НДТРК Віктар Чыкін. Найбольш вернымі пэрсонамі ў бліжэйшым атачэньні прэзыдэнта застаюцца Віктар Шэйман, Леанід Козік, Пётра Ракаповіч, Васіль Даўгалёў, Мікалай Дамашкевіч некаторыя іншыя.

У сучасным грамадстве дзеля выхаду з крызысу і фармаваньня рынкавых стасункаў трэба скарачаць дырэктыўны пачатак у дзяржаўным кіраваньні. У выніку расьце патрэба ў прафэсійных адміністратарах. Сёньня ж у Беларусі выпадае гаварыць ня столькі пра прынцыпы эфэктыўнасьці адміністрацыйнага апарату, колькі пра ягоную палітызацыю, што зьяўляецца адметнай рысай недэмакратычных рэжымаў. Калі дзяржаўнае кіраваньне заснаванае на кіруючай ролі і дамінаваньні аднае палітычнае групы, а функцыі адміністрацыі зводзяцца да формулы «загад-выкананьне», пра дальнабачную дзяржаўную палітыку казаць цяжка.

**Структура органаў дзяржаўнага кіраваньня**



## Структура Раду міністраў (на стан 1 лютага 2006):

**Прэм'ер-міністар** Сідорскі Сяргей (са сьнежня 2003)

**Першы намесьнік** Сямашка Уладзімер

**Намесьнікі:**
Бамбіза Іван
Гапееў Васіль
Даўгалёў Васіль
Кабякоў Андрэй
Касінец Аляксандар

## Структура Прэзыдыюму Рады міністраў

Прэм'ер

першы намесьнік

намесьнікі

Кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта

Старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю – Тозік Анатоль

Старшыня Праўленьня НБ – Пракаповіч Пётар

Міністар эканомікі

Міністар фінансаў

Міністар замежных справаў

# Органы, падпарадкаваныя Радзе міністраў (па стане на канец 2005)

## Міністэрствы:

1. Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва – міністар Курачкін Генадзь
2. Міністэрства ўнутраных спраў – міністар Навумаў Уладзімер
3. Міністэрства жыльлёва-камунальнае гаспадаркі – міністар Белахвостаў Уладзімер
4. Міністэрства аховы здароўя – міністар Рудэнка Віктар
5. Міністэрства замежных спраў – міністар Мартынаў Сяргей
6. Міністэрства інфармацыі – міністар Русакевіч Уладзімер
7. Міністэрства культуры – міністар Матвяйчук Уладзімер
8. Міністэрства лясное гаспадаркі – міністар Сямашка Пётар
9. Міністэрства абароны – міністар Мальцаў Леанід
10. Міністэрства адукацыі – міністар Радзькоў Аляксандар
11. Міністэрства па падатках і зборах – міністар Дзейка Ганна
12. Міністэрства па надзвычайных сытуацыях – міністар Барыеў Энвер
13. Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя – міністар Харужык Лявонцій
14. Міністэрства прамысловасці – міністар Русецкі Анатоль
15. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі – міністар Ганчарэнка Ўладзімер
16. Міністэрства сельскае гаспадаркі і харчаваньня – міністар Русак Леанід
17. Міністэрства спорту і турызму – міністар Грыгараў Аляксандар
18. Міністэрства статыстыкі і аналізу – міністар Зіноўскі Ўладзімер
19. Міністэрства гандлю – міністар Іванкоў Аляксандар
20. Міністэрства транспарту і камунікацый – міністар Сасноўскі Ўладзімер
21. Міністэрства працы і сацыяльнае абароны – міністар Морава Антаніна
22. Міністэрства фінансаў – міністар Корбут Мікалай
23. Міністэрства эканомікі – міністар Зайчанка Мікалай
24. Міністэрства энэргетыкі – міністар Агееў Аляксандар
25. Міністэрства юстыцыі – міністар Галаванаў Віктар

## Дзяржаўныя камітэты:

Камітэт дзяржаўнае бясьпекі – старшыня Сухарэнка Сьцяпан
Дзяржаўны ваенна-прамысловы камітэт – старшыня Азаматаў Мікалай
Дзяржаўны камітэт па авіяцыі – старшыня Мельнік Вадзім
Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналёгіях – старшыня Мацюшкоў Уладзімер
Дзяржаўны камітэт памежных войскаў – старшыня Паўлоўскі Аляксандар
Дзяржаўны мытны камітэт – Шпілеўскі Аляксандар

## Камітэты пры Радзе Міністраў

1. Камітэт па архівах і справаводзтве — старшыня Адамушка Ўладзімер
2. Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасьцяў – старшыня Гуляка Леанід
3. Камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі – старшыня Кузьняцоў Рыгор
4. Камітэт па матэрыяльных рэзэрвах – Жабка Пётар
5. Камітэт па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС – старшыня Цалка Ўладзімер
6. Камітэт па стандартызацыі, мэтралёгіі і сэртыфікацыі – старшыня Карашкоў Валерый
7. Камітэт па каштоўных паперах — старшыня Давыдаў Аляксандар
8. Камітэт па энэргаэфэктыўнасці – старшыня Дубовік Леў

## Дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Радзе міністраў

• Беларускі дзяржаўны канцэрн нафты і хіміі (канцэрн «Белнафтахім»).

• Беларускі дзяржаўны канцэрн харчовай прамысловасьці (канцэрн «Белдзяржхарчпрам»).

• Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасьці і рэалізацыі тавараў народнага спажываньня (канцэрн «Белмясцпрам»).

Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасьці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасьці (канцэрн «Беллегпрам»).

• Беларускі дзяржаўны канцэрн па вытворчасьці і рэалізацыі фармацэўтычнай
і мікрабіялягічнай прадукцыі (канцэрн «Белбіяфарм»).

• Беларускі вытворча-гандлёвы канцэрн лясной, дрэваапрацоўчай і цэлюлёзна-папяровай прамысловасьці (канцэрн «Беллеспаперпрам»).

• Беларуская чыгунка.

• Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх таварыстваў (Белкаапсаюз).

### Адміністрацыя прэзыдэнта

Кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта
Намесьнікі кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта
Памочнікі прэзыдэнта
Прэсавы сакратар прэзыдэнта

### Структура адміністрацыі прэзідэнта

Галоўнае ўпраўленьне кадравае палітыкі
Галоўнае ідэалягічнае ўпраўленьне
Галоўнае дзяржаўна-прававое ўпраўленьне
Галоўнае арганізацыйнае ўпраўленьне
Галоўнае ўпраўленьне па ўзаемадзеяньні з органамі заканадаўчае і судовае ўлады
Галоўнае эканамічнае ўпраўленьне

Упраўленьне вонкавае палітыкі
Упраўленьне па працы са зваротамі грамадзян

Канцылярыя прэзыдэнта
Прыёмная прэзыдэнта
Прэсавая служба прэзыдэнта
Сакратарыят прэзыдэнта
Аддзел падрыхтоўкі выступаў
Аддзел па пытаньнях грамадзянства і памілаваньня

## БЕЛАРУСКАЯ НАМЭНКЛЯТУРА І ЛІНІІ РАЗЛОМУ Ў ЯЕ АСЯРОДЗЬДЗІ. КАДРАВАЯ ПАЛІТЫКА ЛУКАШЭНКІ

У самых агульных рысах працэс пераўтварэньняў у недэмакратычных краінах можна ахарактарызаваць як змаганьне дзьвюх сілаў. З аднаго боку — прагрэсіўнай часткі грамадзтва, прадстаўленай інстытутамі грамадзянскай супольнасьці. Пад уплывам розных фактараў — эканамічных, культурных і палітычных — гэтыя інстытуты прачынаюцца ад «замарожанага» стану і ствараюць пазытыўную контраэліту. З другога — кансэрватыўнай кіруючай эліты, якая імкнецца як мага затрымаць гэты «замарожаны» стан, каб захаваць сваю ўладу. Першыя ўвасабляюць сабой дынамічны вэктар пераменаў у грамадзкім і палітычным жыцьці. Другія — кансэрватыўны вэктар захаваньня старога парадку.

Сусьветны досьвед палітычнай трансфармацыі сьведчыць пра тое, што ні старая намэнклятурная эліта, ні новая контраэліта, узьніклая на глебе актывізацыі грамадзкіх інтарэсаў, ня ёсьць маналітнымі супольнасьцямі. Яны заўсёды складаюцца з шэрагу сілаў, якія адрозьніваюцца міжсобку, апрача сваіх ідэалягічных праграмаў, рознай ступеньню гатоўнасьці да правядзеньня ці прыняцьця пераменаў, дасягненьня кампрамісу ці жорсткасьцю абранай пазыцыі. Акурат барацьба паміж гэтымі сіламі складае сутнасьць палітычнага працэсу.

Контраэліта зьяўляецца больш маналітнай за старыя сілы. Перад ёй стаіць пэўная мэта: перамены. Мэта старой эліты ня вызначана так выразна. Яе чальцы ня толькі аб’яднаныя ўдзелам ува ўладзе, але і падзеленыя гэтай уладай. Ім у рознай ступені ёсьць што губляць, і яны ў рознай ступені гатовыя да прыняцьця інавацый.

Здольнасьць старой эліты ці яе часткі пайсьці на кампраміс стварае ўмовы для больш ці менш мірнай дэмакратычнай рэвалюцыі. Жорсткасьць пазыцый эліты такіх умоваў не стварае. Адпаведна ступень арганізаванасьці контраэліты таксама ўплывае на хуткасьць і незваротнасьць пераменаў. Асаблівасьці стаўленьня да пераменаў і рашучасьці абараняць гэтыя перамены акурат і ўтвараюць падмурак для падзелу розных плыняў у эліце. Але гэтыя плыні, у сваю чаргу, зьяўляюцца вынікам папярэдняга разьвіцьця эліты.

Эліта Беларусі напрыканцы савецкага і ў постсавецкі час не была выключэньнем: яна таксама ёсьць вынікам барацьбы шэрагу ўнутрыэлітных плыняў.

Беларусь напрыканцы 80-х — пачатку 90-х гадоў XX ст. была прамыслова-аграрнай рэспублікай заходняй часткі СССР, на мяжы з Эўропай. Гэта стварала наступныя фактары, якія абумоўлівалі характар адносінаў паміж групамі намэнклятурнай эліты:

1. Прамысловы фактар, які спараджаў прамысловае лёбі. Тут маецца на ўвазе існаваньне групы кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў і адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, на якіх знаходзіліся гэтыя прадпрыемствы, для якіх пэрспэктывы кар’еры абумоўліваліся пасьпяховай працай прадпрыемства. Ува ўмовах арыентаванай на саюзны цэнтар рэспублікі гэтая група імкнулася палепшыць свае пазыцыі ў адносінах да гэтага цэнтру. Яе заданьнем-максымум было паступовае апанаваньне саюзных структураў сваімі прадстаўнікамі.

2. Аграрны фактар. У краіне з буйным аграрным сэктарам эканомікі рэкрутаваньне эліты адбываецца або шляхам прызначэньня з імпэрскага цэнтру, або шляхам высоўваньня з кола кіраўнікоў сельскай гаспадаркі. Улічваючы меншую, у параўнаньні з прамыслоўцамі, інтэнсіўнасьць кантактаў з саюзным цэнтрам, гэтая група ня столькі была арыентавана на цэнтральную ўладу, колькі на захаваньне свайго ўплыву на месцах.

3. Улічваючы памежнае з Эўропай становішча Беларусі, значным фактарам у фармаваньні эліты ня мог ня быць уплыў групаў функцыянэраў з органаў дзяржаўнай бясьпекі і памежнай службы.

Больш ці менш выразныя групы намэнклятурнай эліты на тэрыторыі БССР пачалі фармавацца толькі пасьля другой сусьветнай вайны. Дагэтуль цэнтралізаваная таталітарная ўлада асаблівай кадравай палітыкай, рэпрэсіямі перашкаджала прызначэньню ў рэспубліканскія органы функцыянэраў з рэгіянальнага партыйнага апарату. Перавага прызначэнцаў з саюзнага цэнтру не дазваляла сфармавацца ўстойлівым сувязям унутры рэспубліканскага апарату.

Але ў пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе асабістыя, нефармальныя стасункі, якія склаліся ў часе апошняй вайны паміж кіраўнікамі партызанскіх аддзелаў і падпольных арганізацыяў, простымі партызанамі і падпольшчыкамі, стварылі падмурак для пабудовы ў 50–60-х гг. новай сыстэмы ўнутрыэлітных адносін на Беларусі.

Гэтую першую хвалю ўнутрана структураванай намэнклятурнай эліты ў БССР прынята называць «партызанскай элітай». Бальшыня яе чальцоў была зьвязана памяцяй пра сумесную дзейнасьць у партызанскім руху, падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацыях.

Да 1956 году першыя сакратары ЦК КПБ прызначаліся з Масквы (Панцеляймон Панамарэнка, Мікалай Гусараў, Мікалай Патолічаў).

У 1956 годзе першым сакратаром ЦК КПБ стаў Кірыла Мазураў, прадстаўнік нацыянальнай эліты. Яго прыход паклаў пачатак хвалі прызначэнцаў з самой Беларусі. Ужо ў сярэдзіне 60-х гадоў з 16 функцыянэраў, якія былі прызначаныя на значныя партыйныя пасады ў Менскай вобласьці, 8 (гэта значыць 50%) мелі за сабой «партызанскую маладосьць». Апошнім кіраўніком рэспублікі, г. зн. першым сакратаром ЦК КПСС, зь ліку «партызанаў» быў Пётра Машэраў.

Адносіны паміж прадстаўнікамі партызанскай эліты будаваліся на прынцыпе клясычнага клііентэлізму. Галоўнымі рэгіёнамі іх рэкрутаваньня сталіся Віцебская і Берасьцейская вобласьці. Галоўнай заслугай гэтай генэрацыі беларускай эліты сталася тое, што дзякуючы ім упершыню склалася акурат унутрыбеларуская лесьвіца заняцьця элітных пасад на падставе асабістых адносінаў.

У 60-70 гг. у БССР будуецца і разьвіваецца шмат буйных прамысловых прадпрыемстваў. Прыкладна тады ж у нетрах беларускага партыйнага і гаспадарчага апарату пачынае фармавацца наступная генэрацыя эліты — прамысловая эліта. Першы вузел адносін паміж элітамі, які будзе значна ўплываць на сыстэму перадзелу ўлады ў краіне нават у пасьлясавецкі час, завязаўся акурат з узмацненьнем прамысловай эліты ў 70-80 гг. Новая прамысловая эліта фармавалася на базе партыйных камітэтаў буйных прадпрыемстваў. Галоўным месцам яе ўзьнікненьня быў Менск, найбольш значнымі прадстаўнікамі — былы першы сакратар ЦК КПБ Мікалай Сьлюнькоў і яго група.

Партызанская эліта трымалася на прынцыпу субардынацыі. Прамысловая ж эліта стварала клястэры з роўных па статусе функцыянэраў, якія дапамагалі адзін аднаму ісьці наверх. Калі «партызаны» часам мелі ня вельмі добрыя адносіны з Масквой (напрыклад, пра адносіны Мазурава і Брэжнева ўспамінаюць і цяпер), то галоўнай мэтай прамысловай эліты стала ў першую чаргу стварэньне свайго лёбі ў саюзным цэнтры — у Маскве.

Зь беларусаў, якія ў гэты час займалі пасады ў саюзным цэнтры, бальшыню складалі прадстаўнікі прамысловай эліты партыйнага паходжаньня. На гэта былі свае прычыны. Якраз буйныя прамысловыя прадпрыемствы былі прадпрыемствамі «агульнасаюзнага зна-

чэньня», іх прадстаўнікам было прасьцей прайсьці наверх. У той жа час гэта адпавядала агульнасаюзнай партыйнай лініі, якая стымулявала праходжаньне рэгіянальных элітаў праз цэнтар.

Найбольшая колькасьць функцыянэраў, якія пайшлі на павышэньне ў Маскву або прайшлі праз маскоўскія структуры і вярнуліся на кіраўнічыя пасады ў Беларусь, была акурат зь Менску.

Але пры гэтым ступень ратацыяў зь Менску на кіраўнічыя пасады ў іншыя рэгіёны Беларусі не адрозьнівалася ад звычайнай, дарэчы, вельмі слабой ратацыі паміж абласьцямі. Такім чынам, рэгіянальныя эліты папаўняліся пераважна функцыянэрамі з тых самых рэгіёнаў або прызначэнцамі з саюзнага цэнтру. Гэта значыць, яны ўзнаўлялі мадэль адносін партызанскай эліты: мадэль вэртыкальных сувязяў, якія сягаюць ад высокапастаўленага патрона ў вобласьці да яго пратэжэ на раёне ці ў горадзе.

У выніку ў БССР на пачатку 80-х гадоў склаліся дзьве супрацьлеглыя мадэлі адносінаў у эліце: прамысловая мадэль цэнтральнай рэспубліканскай эліты і аграрная мадэль эліты абласьцей.

Першая выявіла сваю эфэктыўнасьць у прасоўваньні функцыянэраў наверх, але мела малы эфэкт як сыстэма арганізацыі ўлады ў рэгіёнах. Другая мадэль стварала менш шанцаў выйсьці на агульнасаюзны ўзровень, але дазваляла захоўваць кантроль на рэгіянальным узроўні.

Цэнтральная рэспубліканская эліта складалася пераважна з выхадцаў з парткамаў буйных прамысловых прадпрыемстваў*.

Рэгіянальныя ж эліты заставаліся пераважна аграрнымі, мелі слабы выхад на рэспубліканскі цэнтар і адначасна адчувалі слабы кадравы ўплыў з гэтага цэнтру.

Пры канцы існаваньня СССР у Беларусі не сфармавалася традыцыі разьмеркаваньня пасадаў, якая б шчыльна зьвязвала рэгіянальныя эліты і эліту рэспубліканскага цэнтру. Яны існавалі адносна ізалявана. Мадэлі іх рэкрутаваньня і разьмеркаваньня пасадаў былі рознымі. Рознымі былі й іх мэты. Каналы рэспубліканскі цэнтар — саюзны цэнтар, саюзны цэнтар — рэспубліканскі цэнтар, саюзны цэнтар — рэгіён рэспублікі былі больш значныя за каналы рэспубліканскі рэгіён — рэспубліканскі цэнтар і рэспубліканскі цэнтар — рэгіён рэспублікі.

Супярэчнасьць інтарэсаў цэнтральнай (прамысловай) і рэгіянальнай (аграрнай) эліты ў адносінах рэспубліканскі цэнтар — рэгіёны рэспублікі выклікала канфлікты паміж «прамыслоўцамі» і «аграрнікамі» на рэгіянальным узроўні**.

Такім чынам, з запачаткаваньнем «перастройкі» рэгіянальныя і рэспубліканская эліты мелі розныя мэты і розныя матывы паводзінаў. Калі першыя маглі хутка прыстасоўвацца да зьменлівай сытуацыі, каб захаваць свае пазыцыі, то другія былі зацікаўленыя ў захаваньні бязь зьменаў усталяванай сыстэмы адносін улады. Былая гаспадарчая, а цяпер нацыянальная эліта, якая паходзіла з буйных высокатэхналягічных прадпрыемстваў, была больш зарыентавана (і прызвычаена) да галіновых сувязяў з Масквой, зь якой у савецкі час прыходзіла сыравіна і дырэктывы.

* З 12 членаў Бюро ЦК КПБ, абранага на 29-м зьезьдзе, 6 (50%) можна вызначыць як «прамыслоўцаў», толькі адзін меў адносіны да аграрнага сэктару, на 30-м зьезьдзе з 16-цёх чальцоў Бюро — адпаведна 8 (50%) і 2 (1,2%).

** Так, напрыклад, у Горадні прызначэньне «прамыслоўца» Сямёна Домаша на партыйную пасаду адбылося толькі пасьля вычарпаньня магчымасьцяў рэгіянальнай эліты правесьці прадстаўнікоў аграрнага кляну, пры пагрозе прызначэньня партыйнага «рэфарматара» Ўладзімера Сямёнава.

З развалам СССР ні ў цэнтральнай партыйна-гаспадарчай, ні і ў прамысловай, ні ў рэгіянальнай эліце БССР не было групаў, якія былі б зацікаўлены ў правядзеньні грунтоўных і незваротных рэформаў.

Сувэрэнізацыя Беларусі была перашкодай для адладжанай сыстэмы ўзыходжаньня да саюзнага цэнтру. Адсутнасьць значных сыравінных рэсурсаў у Беларусі* таксама рабіла праблематычнай гэтую сувэрэнізацыю.

Аграрна-прамысловыя рэгіянальныя эліты ня мелі ні каналаў, ні рэсурсаў, а галоўнае — навыкаў і значных стымулаў для ўзьдзеяньня на эліты рэспубліканскія. Пры гэтым як першыя, так і другія проста падпарадкоўваліся ініцыятывам з імпэрскага цэнтру. Толькі выбары ў ВС БССР 12 скліканьня, якому было накавана абвясьціць незалежнасьць Беларусі і стаць рэальным цэнтрам палітычнага жыцьця краіны, паклалі пачатак новага этапу разьвіцьця эліты. Яны адкрылі шлях у цэнтар вялікай колькасьці прадстаўнікоў рэгіянальнай намэнклятурнай эліты. У ВС 12 скліканьня агульная колькасьць рэгіянальных функцыянэраў ад старшыняў калгасаў да кіраўнікоў абласьцей была большай за 51%. Зь іх больш за 14% былі старшыні калгасаў, 21,5% — прадстаўнікі рэгіянальнай адміністрацыйнай эліты, 29,5% — партыйнай. Пры гэтым колькасьць функцыянэраў з цэнтральнай партыйнай і дзяржаўнай эліты ў парлямэнце была ня большая за 10%. У сьценах парлямэнту адбыўся дэбют шмат якіх рэгіяналаў як агульнанацыянальных палітыкаў.

Што да цэнтральнай партыйнай намэнклятуры, то яна была не гатовая да новых адносінаў улады, якія ўзьніклі пасьля здабыцьця Беларусяй незалежнасьці. Разам з прыпыненьнем дзейнасьці КПБ вышэйшыя партыйныя функцыянэры пазбыліся ўсякай улады і амаль бясьсьледна зьніклі з палітычнай сцэны. (На гэтым фоне пазытыўна вылучалася рэфармісцка настроеная група дэпутатаў ВС 12 скліканьня «Камуністы Беларусі за дэмакратыю», найбольш шумным прадстаўніком якой быў А. Лукашэнка. У групу ўваходзіла каля 50 чалавек, але сярод іх не было ніводнага дзеяча, вышэйшага рангаю за кіраўніка прамысловага ці аграрнага прадпрыемства.)

На першыя пазыцыі выйшла намэнклятура цэнтральных органаў дзяржавы, менш уплывовая, менш здольная кантраляваць рэгіёны. Прэм'ер-міністар В. Кебіч, адчуваючы аслабленьне гэтага кантролю, адводзіць свайму намесьніку М. Мясьніковічу функцыю каардынатара па сувязях з рэгіёнамі.

Адзінай групай, якая захавала арганізацыйны патэнцыял, была эліта праваахоўных органаў (КДБ, МУС і г.д.). Яе ўплывовасьць падкрэсьліваецца тым фактам, што кебічаўскі ўрад неаднаразова імкнуўся зьменшыць яе ўплыў. Так, адным з найбольш значных адміністрацыйна-кадравых пераўтварэньняў, заплянаваным яшчэ на 1992 год, была правядзеньне рэформы органаў дзяржаўнага кіраваньня, згодна зь якой КДБ падлягаў частковаму расфармаваньню, скасоўвалася служба вонкавай выведкі. Пытаньне пра расфармаваньне КДБ і перападпарадкаваньне яго службаў МУС і Міністэрству абароны разглядалася ў сьнежні 1993 году ў парлямэнце. У памежных войсках арганізоўвалася служба АСАМ** як процiва-

* Беларускія прадпрыемствы былі пераважна не рэсурсаздабывальнымі, а рэсурсаперапрацоўчымі.

** АСАМ (Аддзел спэцыяльных актыўных мерапрыемстваў) — элітнае падразьдзяленьне памежных войскаў. Падчас канфлікту паміж тагачасным дзяржсакратаром па барацьбе з злачыннасьцю і нацыянальнай бясьпецы Генадзем Данілавым старшыня КДБ Эдуард Шыркоўскі і міністар унутраных справаў Уладзімер Ягораў абвінавачвалі першага ў залішняй апецы, дыктаце ў кадравых пытаньнях і стварэньні паралельнай (неканстытуцыйнай, на іх погляд) спэцслужбы — АСАМу памежных войскаў. — *Рэд.*

га адпаведнай структуры ў КДБ. Невыпадкова кіраўнікі МУС і КДБ Уладзімер Ягораў і Эдуард Шыркоўскі выразілі рашучы пратэст гэтым плянам.

На пачатку 90-х гадоў аўтарытэт у грамадзтве старой намэнклятурнай эліты катастрафічна зьніжаецца. Адначасова павышаецца ўплыў нацыянальна-дэмакратычных сілаў. Здабыцьцё Беларусяй незалежнасьці, мітынгі і страйкі 1991 году выявілі неабыякі патэнцыял беларускіх дэмакратычных сілаў, здольнасьць уплываць на грамадзтва, арганізоўваць акцыі масавага пратэсту. Яны стаюцца пагрозай для палітычных пазыцыяў намэнклятуры. У гэтых умовах намэнклятура пастанаўляе ўвесьці пасаду прэзыдэнта. Пасьля першых прэзыдэнцкіх выбараў і да 2001 г. эліты ў сваім станаўленьні прайшлі празь некалькі этапаў.

Першы этап можна вызначыць як парлямэнцкі, або псэўдадэмакратычны. Як было сказана раней, да сярэдзіны 90-х гадоў у Беларусі не сфармавалася акрэсьленых плыняў у намэнклятурнай эліце. Пасьля свайго абраньня Лукашэнка запачаткаваў кадравую палітыку, заснаваную на прызначэньнях вышэйшых службоўцаў дзяржапарату, выходзячы з асабістых кантактаў і рэгіянальных сувязяў. На адказныя пасады прызначаліся функцыянэры, якія былі яму вядомыя па Магілёўскай вобласьці, або тыя, з кім ён працаваў у парлямэнце.

За першыя два месяцы прэзыдэнтуры Лукашэнка зрабіў 57 найважнейшых прызначэньняў. З новапрызначаных на пасады 19 (33%) функцыянэраў былі былымі дэпутатамі парлямэнту, прычым бальшыня зь іх заняла першарадныя пасады. Ужо на гэтым этапе пачала дзейнічаць рэгіянальная мадэль прызначэньняў. Сярод 19 прызначэнцаў з парлямэнту сямёра функцыянэраў працавалі з Лукашэнкам падчас перадвыбарнай кампаніі, а як найменей пяць паходзяць з аднаго з Лукашэнкам рэгіёну — Магілёўскай вобласьці. Сярод астатніх значную частку складалі тыя, хто займаў пасаду на прыступку ніжэй у той самай сфэры дзяржаўнага кіраваньня.

Пры гэтым першарадныя пасады Лукашэнка аддаў былым прадстаўнікам найбуйнейшай намэнклятуры. М. Мясьніковіч захаваў пасаду першага намесьніка прэм’ер-міністра, пасада намесьніка па эканамічных пытаньнях засталася за С. Лінгам з захаваньнем адпаведнай сфэры дзейнасьці. Прызначаныя намесьнікі прэм’ер- міністра У. Гаркун і В. Ганчар (былыя дэпутаты парлямэнту) атрымалі параўнальна нязначнае кола паўнамоцтваў у сельскагаспадарчай і культурна-асьветніцкай галінах.

Аморфнасьць цэнтральнай і ізаляванасьць рэгіянальнай эліты дазволіла Лукашэнку правесьці рэформу органаў мясцовага кіраваньня без супрацьдзеяньня з боку рэгіёнаў. Пасьля гэтай рэформы кіраўнікі рэгіёнаў пачалі прызначацца Менскам у адпаведнасьці з асабістымі сымпатыямі прэзыдэнта.

Кадравай базай рэгіянальных лідэраў ізноў стаў парлямэнт. З 6 кіраўнікоў абласных адміністрацыяў 3 прайшлі праз ВС 12 скліканьня, 5 займалі пасады абласнога ўзроўню раней. Аднак рэформа адлюстравала і рэгіянальныя тэндэнцыі ў фармаваньні эліты: бальшыня кіраўнікоў рэгіянальных адміністрацыяў (перадусім раённага ўзроўню) была рэкрутавана з рэгіёнаў, хоць і ў адпаведнасьці з сымпатыямі прэзыдэнта.

Акурат гэтая рэформа справакавала першы выразны канфлікт інтарэсаў паміж плынямі ў прэзыдэнцкім атачэньні. Пачынаючы з 1994 году іх было тры: старая эліта, сілавікі, парлямэнтары (ці камунікацыйныя палітыкі). Можна таксама гаварыць пра існаваньне асобнай групы «магілёўцаў», хоць яна ў шмат якіх адносінах ёсьць намінальнай. Яе прадстаўнікі прысутнічалі ўва ўсіх згаданых плынях, але не складалі арганізаванага адзінства.

Старая эліта была прадстаўленая ў першую чаргу М. Мясьніковічам*. Ён працаваў ува ўрадзе Беларусі з 1986 году, прайшоў шлях ад міністра жыльлёва-камунальнай гаспадаркі да намесьніка прэм'ера. Ува ўрадзе Кебіча ён курыраваў прамыслова-эканамічную сфэру, валодаў калясальнымі сувязямі як з рэгіянальнымі элітамі, так і за мяжой краіны. Асноўнае функцыянальнае прызначэньне гэтай групы эліты — эканамічнае забесьпячэньне дзейздольнасьці пабудаванай А. Лукашэнкам дзяржаўнай сыстэмы. Акурат праз Мясьніковіча А. Лукашэнка падтрымліваў кантакты з Масквой, прадстаўнікамі нацыянальнай прамысловай і банкаўскай эліты. Бальшыня міністраў, якія мелі дачыненьне да прамыслова-гаспадарчай дзейнасьці (ужо згадваныя Сяргей Лінг, Барыс Батура, а таксама міністар гандлю Валянцін Байдак і міністар прамысловасьці Ўладзімер Куранкоў), захавала свае пасады падчас першай хвалі ратацый дзяржапарату пасьля абраньня Лукашэнкі. Захаваў свае пазыцыі і міністар сельскай гаспадаркі В. Лявонаў, які належаў да магілёўскага кляну, быў былым патронам Лукашэнкі і забясьпечваў сувязі з аграрнымі элітамі.

У выніку першых прызначэньняў прадстаўнікі старой намэнклятуры захавалі асноўныя пазыцыі ў фінансава-эканамічным сэктары, забясьпечваючы нязьменнасьць старога курсу і сыстэмы падзелу ўлады**.

Найбольш глыбокія ратацыі ў першыя месяцы пасьля абраньня Лукашэнкі адбыліся ў праваахоўных органах: КДБ, МУС і Камітэце памежных войскаў. Зьмена кіраўнікоў і іх намесьнікаў тут адбываецца аднначасова (у іншых ведамствах паміж ратацыямі першых і другіх праходзіць нейкі час). На пасаду кіраўніка КДБ вяртаецца Ягораў, які ў 1994 годзе выступіў супраць групоўкі Данілава і за гэта паплаціўся пасадай. Пасаду яго намесьніка атрымаў Валер Кез, які таксама ў свой час быў зьняты з пасады за супрацоўніцтва з антыкарупцыйнай камісіяй Лукашэнкі.

Дарэчы, і Ягораў, і Кез працавалі некаторы час у праваахоўных структурах Берасьцейскай вобласьці, выхадцам зь якой быў В. Шэйман, адзін з найбольш актыўных дзеячаў перадвыбарнай каманды Лукашэнкі і найбольш уплывовых асобаў у яго атачэньні. В. Шэйман быў прызначаны кіраўніком вядучай сілавой установы краіны — Рады бясьпекі.

Кіраўніком МУС стаецца былы дэпутат генэрал Захаранка. Адбываецца зьмена ўсіх намесьнікаў міністра ў гэтым міністэрстве. Сярод новых прызначэнцаў таксама прысутнічаюць берасьцейцы (Мікалай Крэчка). Цалкам быў зьменены кіраўнічы склад і ў памежных войсках — там, дзе ў часе Кебіча быў створаны АСАМ як супрацьвага адпаведнай службе ў КДБ.

У іншых міністэрствах у першыя месяцы адбываюцца толькі прызначэньні новых міністраў. Намесьнікі зьмяняюцца праз некаторы тэрмін і не ўва ўсіх міністэрствах.

Як парлямэнцкую*** (ці камунікацыйную) эліту можна вызначыць тых новых функцыянэраў, якія прыйшлі ўва ўрад і адміністрацыю Лукашэнкі з парлямэнту. Гэта найбольш разнастайная, шматлікая, але найменш устойлівая група. Так, з парлямэнту ў выканаўчую ўладу

* Падчас выбараў 1994 г. Лукашэнка ня змог заручыцца падтрымкай прамыслова-гаспадарчай эліты. Таму стаўку на Мясьніковіча як старога «гаспадарніка» можна растлумачыць тым, што новаму рэжыму былі патрэбныя стабільныя каналы камунікацыі з кіраўнікамі прадпрыемстваў.

** У сувязі з гэтым адзначым: «парлямэнтары» атрымалі гучныя, але, за выключэньнем Захаранкі, Ягорава і Чыгіра, неўплывовыя пасады.

***Да гэтай групы мы адносім тых, хто ня толькі прыйшоў з парлямэнту, але і стварыў сабе імя, якое было на слыху, дапамагала ўтварыць уражаньне дэмакратычнай арыентацыі. Напрыклад, Чыгір ня быў у парлямэнце, але яго імя давала дадатковы палітычны капітал.

прыйшлі такія палітычныя антаганісты, як В. Ганчар і В. Шэйман, Ю. Захаранка і І. Ціцянкоў, У. Ягораў і І. Драбышэўская. Яны былі вельмі разьяднаныя. Іх аб’ядноўвала адна якасьць — усе яны падчас выбараў 1994 г. так ці інакш падтрымлівалі А. Лукашэнку. Акурат прадстаўнікі гэтай групы першымі пачалі сыходзіць з прэзыдэнцкай каманды. Гэты сыход быў абумоўлены эвалюцыяй палітычнага курсу рэжыму і падзелам сфэраў уплыву паміж рознымі плынямі ў эліце. Пачатак сыходу «парлямэнтароў» паклаў В. Ганчар. Яго сыход у сьнежні 1994 году супаў з разгарам кампаніі стварэньня прэзыдэнцкай вэртыкалі ўлады і прызначэньнем, згодна з новым заканадаўствам, асабіста прэзыдэнтам кіраўнікоў выканкамаў. Прычынай адстаўкі Ганчара была, паводле яго словаў, нязгода з новай сыстэмай улады, пры якой губляецца значэньне кабінэту міністраў і ўплыў канцэнтруецца ў Адміністрацыі прэзыдэнта. На яго думку, яго сыход адпавядаў «калектыўнай пазыцыі кабінэту міністраў». Дарэчы, іншыя парлямэнтары пры сваім сыходзе (Л. Сініцын, Міхаіл Чыгір) таксама спасылаліся на «калектыўнае» імкненьне, хаця сыходзілі ў адстаўку паасобку.

Пасады былых парлямэнтароў паступова займаліся больш зарганізаванымі і непераборлівымі прадстаўнікамі дзьвюх іншых груповак: старой намэнклятуры і сілавікоў. У далейшым акурат барацьба гэтых дзьвюх груповак, Мясьніковіча і Шэймана, будзе складаць асноўную інтрыгу пры падзеле сфэраў уплыву. Адыход Ганчара вызваліў месца на пасадзе віцэ-прэм’ера для прадстаўніка Берасьцейшчыны Ўладзімера Русакевіча. Рэгіён яго паходжаньня дазваляе думаць пра сувязі Русакевіча з Шэйманам і адпаведнай групай, указвае на ўзмацненьне гэтай групы. І сапраўды, на працягу наступных трох месяцаў адбылося аслабленьне «старых намэнклятурнікаў». Была замененая бальшыня міністраў эканамічна-прамысловага профілю, якія не былі зьменены дагэтуль: міністры гандлю, прамысловасьці, фінансаў і часткова іх намесьнікі. Такім чынам, першая хваля сыходу парлямэнтароў адчыніла шлях для перападзелу сфэраў уплыву, павысіла значэньне сілавой групоўкі, адпаведна зьнізіўшы ўплыў «старой намэнклятуры».

Гэтыя падзеі адбываліся на фоне паступовай зьмены кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў. Маніпуляцыі з курсам валюты, крызыс неплацяжоў паставілі прамысловасьць перад праблемай выжываньня і канчаткова аслабілі нізавую прамыслова-гаспадарчую эліту (кіраўнікоў дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў, банкаў, іншых суб’ектаў гаспадараньня). У дадатак, у верасьні 1994 году ўрадам была прынятая пастанова аб пераразаключэньні кантрактаў з кіраўнікамі прамысловых прадпрыемстваў. Іх пазыцыі сталі больш няўстойлівымі, чымся ў савецкія часы.

З канца 1994 і да 1996 году толькі паводле адкрытай інфармацыі было зьменена больш за 10 кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў. Нэўтралізацыя фінансава-гаспадарчай эліты адбывалася адначасна з паніжэньнем уплыву Мясьніковіча і групоўкі «старых намэнклятурнікаў». Іх рэсурсы ўнутры краіны, падстава іх існаваньня ўва ўладзе, таялі разам зь зьмяншэньнем колькасьці зьвязаных зь імі кіраўнікоў прадпрыемстваў. Старая эліта адчула патрэбу ў дадатковых рэсурсах для ажыцьцяўленьня ўплыву.

Наступныя ратацыі парлямэнтароў таксама суправаджаліся перадзелам сфэраў уплыву паміж «сілавікамі» і «гаспадарнікамі». З сыходам А. Фядуты з пасады кіраўніка Ўпраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта яго месца ў чэрвені 1995 году пераходзіць да адной з найбольш адыёзных фігураў кебічаўскай адміністрацыі — У. Замяталіна*. З

* Замяталін быў прызначаны з падачы Шэймана пасьля правальнай працы ў кантрольных органах.

сыходам з МУС Захаранкі, адбытым у кастрычніку 1995 году, адбыліся вялікія ратацыі ў МУС*, а праз два месяцы ў КДБ і ў Адміністрацыі прэзыдэнта. У выніку гэтых ратацыяў «парлямэнтар» Сініцын, які яшчэ год таму курыраваў прызначэньні ў склад лукашэнкаўскай адміністрацыі, будучы яе кіраўніком, згубіў рэальны ўплыў і ў кастрычніку 1995 году захаваў толькі пасаду віцэ-прэм'ера. М. Мясьнковіч, патрон «старых намэклятурнікаў», атрымаў больш значную прыісных стасунках улады пазыцыю кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, зьмяніўшы Л. Сініцына. Пры гэтых абставінах прызначэньне В. Шэймана выканаўцам абавязкаў міністра ўнутраных справаў, хоць і з захаваньнем пасады Дзяржсакратара Рады бясьпекі, таксама можна разглядаць як аслабленьне яго ўплыву**.

Кадрамі з КДБ было «ўмацаванае» МУС. Намесьнік міністра ўнутраных справаў Сяргей Рухлядзеў быў заменены на выхадца з КДБ Івана Юркіна, які ў часе супрацьстаяньня Ягорава і Шыркоўскага Кебічу займаў дастаткова асьцярожную пазыцыю. Як і Рухлядзеў, Юркін да гэтага некаторы час працаваў у праваахоўных органах Расіі. У сьнежні 1995 г. на пасаду намесьніка міністра ўнутраных справаў быў прызначаны былы кадэбэшнік — кіраўнік контравыведкі Фарыд Канцараў. А яшчэ раней міністрам унутраных справаў прызначаны Валянцін Агалец, які напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. быў звольнены Кебічам з пасады намесьніка камандуючага ўнутранымі войскамі.

Праз два месяцы пасьля сыходу Захаранкі, у сьнежні 1995 году, адбылася вялікая ратацыя і ў КДБ. Быў адпраўлены ў адстаўку кіраўнік КДБ Ягораў***. Замест яго быў прызначаны Уладзімер Мацкевіч, былы шэф КДБ у Берасьцейскай вобласьці, які за год да гэтага быў пераведзены зь Берасьця ў Менск. Замест берасьцейца Кеза першым намесьнікам кіраўніка КДБ прызначаецца Леанід Ерын, які да гэтага працаваў на пасадзе кіраўніка ФСБ Расіі па Маскве і Маскоўскай вобласьці. Кез стаецца намесьнікам кіраўніка Рады бясьпекі, а праз два месяцы звальняецца ў запас. На яго месца прыходзіць Юркін, пра якога мы казалі раней. Гэтыя прызначэньні адлюстроўваюць зьніжэньне ўплыву шэйманаўскіх сілавікоў: сыходзяць берасьцейцы, у МУС прыходзіць Канцараў з контравыведкі****.

Значная колькасьць новых прызначэнцаў мае супольную ўласьцівасьць — сувязь з Расіяй. Ерын, Юркін, Агалец працавалі большы ці меншы час у расійскіх праваахоўных органах. А Канцараву напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. прыйшла прапанова зьехаць у Расію на пасаду кіраўніка контравыведкі Сібірскай вайсковай акругі. У спалучэньні зь пераарыентацыяй вонкавай палітыкі Беларусі (акурат у гэты час Лукашэнка нарошчвае свой уплыў у Расіі) гэта гаворыць пра ўзмацненьне новага фактару ў падзеле сфэраў уплыву ў беларускім кіраўніцтве — расійскага.

«Прарыў на Ўсход» ажыцьцяўляецца пры дапамозе «старой намэнклятуры», дакладней, «старых сілавікоў». Улічваючы яго часовы посьпех у 1995–1997 гг. у «чырвоным поясе» Расіі, можна дапусьціць, што такі эфэкт маглі даць толькі сувязі, якія меў Мясьніковіч у фінансава-эканамічных колах старой расійскай эліты, а празь яе — з расійскімі рэгіянальнымі (перадусім сілавымі) элітамі. Каб захаваць уплыў, які губляўся групай Мясьніковіча ў меру таго, як прамыслова-эканамічная эліта была скароная Лукашэнкам, «старыя намэнк-

* Спачатку былі заменены людзі дэмакратычна арыентаванага Захаранкі, а потым зьняты і ён сам.

** Пра гэта таксама гаворыць публікаваная ў СМІ інфармацыя пра цяжкасьці, якія ўзьніклі ў Шэймана зь вяртаньнем назад на пасаду Дзяржсакратара Рады бясьпекі.

*** У 1994 годзе Ягораў таксама падтрымліваў на прэзыдэнцкіх выбарах дэмакратычнага кандыдата С. Шушкевіча.

**** Шэйман як берасьцеец меў кантакты перадусім з памежнікамі і вонкавай выведкай.

лятурнікі» выкарысталі новы рэсурс: актывізавалі свае сувязі з Расіяй. Яны зарыентавалі Лукашэнку на супэрмэты — на дасягненьне палітычных дывідэндаў па-за межамі Беларусі.

Аднак нягледзячы на захаваньне ўплыву Мясьніковіча, перабудова і падпарадкаваньне Лукашэнкам прамыслова-гаспадарчай эліты працягвалася. Яе канчатковая нэўтралізацыя надышла разам з ратацыяй, якая адбылася ў прамежку паміж сыходам Сініцына і Чыгіра. Разам зь Сініцыным сышоў міністар эканомікі Георгі Бадзей. Яшчэ ў студзені 1996 году былы міністар прамысловасьці, вылучэнец ад цяжкой прамысловасьці У. Куранкоў быў заменены на вылучэнца ад электроннай прамысловасьці, дагэтулешняга дырэктара напаўжывога заводу вылічальнай тэхнікі Анатоля Харлапа. Таксама адбываецца замена «старога» міністра фінансаў. Такім чынам разам з сыходам «парлямэнцкай» эліты аслабляецца і нэўтралізуецца і старая прамыслова-эканамічная эліта. Пры гэтым яна не ствараецца наноў, а замяняецца менш уплывовымі і менш самастойнымі функцыянэрамі.

У Расіі і ўва Ўкраіне магутныя прамысловыя эліты мелі дастатковыя рэсурсы і стымулы, каб абараніць сваіх стаўленікаў і свае інтарэсы, ствараючы сыстэму карпарацыйных алігархій. Гэтыя алігархіі змагаліся за ўплыў у палітыцы. Беларуская прамысловая эліта ня вытрымала канкурэнцыі з супэралігархам, які мэтанакіравана змагаўся супраць яе, — дзяржавай, дакладней тым, хто атрымаў найвышэйшую ўладу ў гэтай дзяржаве. Прамыслова-эканамічнае лёбі было дэмаралізаванае.

Яшчэ адной значнай падзеяй, якая адбылася адначасна з гэтым новым пераразьмеркаваньнем пасадаў, стала хваля прызначэньняў на пасаду дарадніка прэзыдэнта. У студзені 1997 году адбыліся адразу чатыры прызначэньні: Івана Антановіча, Сяргея Посахава, Уладзімера Каралёва, Пятра Капітулы. Такі шэраг прызначэньняў паказвае ўзмацненьне расійскага фактару ў беларускай палітыцы. Прызначэньні Антановіча, які на пачатку 90-х гадоў займаў пасаду сакратара Камуністычнай партыі Расіі, міністрам замежных справаў, Каралёва, былога кіраўніка службы дзяржаўнага пратаколу, Посахава, выхадца з Расіі, які дагэтуль спэцыялізаваўся на арганізацыі масавай падтрымкі Лукашэнку, дараднікамі прэзыдэнта гавораць пра тое, што Лукашэнку спатрэбілася прапагандысцкае забесьпячэньне яго ўсходняй палітыкі.

На гэтым фоне працягвае павышацца ўплыў асобаў, якія валодалі моцнымі сувязямі з Расіяй. На пасаду намесьніка дзяржсакратара Рады бясьпекі і аднаго з кіраўнікоў галоўнага ўпраўленьня спэцпадразьдзяленьняў КДБ прызначаны Сяргей Канцавенка. Раней ён працаваў у Радзе бясьпекі, пасьля адстаўкі Кеза зьехаў у Маскву*, вярнуўся адтуль за паўгоду да гэтага прызначэньня. Праглядаюцца сувязі з Расіяй і ў прызначанага выканаўцам абавязкаў міністра абароны Аляксандра Чумакова**.

Такім чынам, да пачатку 1997 году адбылося пераразьмеркаваньне каналаў уплыву на прэзыдэнта. Прадстаўнікі парлямэнцкай групы або пайшлі ў апазыцыю рэжыму, як В. Ганчар, або на нейкі час выпалі з палітыкі, як М. Чыгір і Л. Сініцын. Прамыслова-эканамічная эліта на рэгіянальным і галіновым узроўні згубіла сваю самастойнасьць. Вялікія зьмены перажыў яе пэрсанальны склад. У эліту нацыянальнага ўзроўню прыйшлі старыя артадоксы, якія займалі высокія пасады яшчэ за часоў Кебіча. Толькі цяпер яны былі цалкам залежныя ад Лукашэнкі. Адзінай групай, якая захавала статус-кво, засталіся сілавікі. Але і ў іх ася-

* Канцавенка меў сувязі з уплывовым расійскім палітыкам А. Вольскім пасьля сумеснай працы ў Карабаху.

** Чумакоў нейкі час служыў разам зь вядомым расійскім генэралам А. Лебедзем у Прыднястроўі.

родзьдзі праявіліся ўзаеманезамірэнчыя групоўкі.

Існая на пачатку 90-х гадоў рэгіянальная, прамысловая і рэспубліканская эліта аказалася няздольнай сфармаваць устойлівыя групы націску з выразнымі палітычнымі мэтамі. Таму здабыцьцё ўсёй паўніні ўлады адным з былых аўтсайдараў рэгіянальнай, атамізаванай аграрнай эліты мела вынікам не адстойваньне рознымі элітнымі групамі свайго складу і пазыцыяў, а пашырэньне ўплыву найбольш зарганізаванай групоўкі, якая не была зьвязана ні з воднай з астатніх, — сілавікоў.

Як было сказана раней, гэтая група вызначаецца разнароднасьцю. Яна пачала распадацца на плыні яшчэ ў 1994–1996 гг. Спачатку барацьба вялася паміж старымі артадоксамі і асьцярожнымі прыхільнікамі пераменаў. Сыход Захаранкі і Ягорава зрабіў неактуальным падзелы па ідэалягічным крытэры. Галоўным яднальным момантам сталася паходжаньне з аднаго рэгіёну або сумесная праца.

Пры гэтым Лукашэнка дабіўся своеасаблівага балянсу элітаў: «старыя намэнклятурнікі» дзякуючы сваім сувязям з Расіяй забясьпечвалі эканамічную дзеяздольнасьць рэжыму. Шэйманаўцы, якія атрымалі кантроль над праваахоўнымі органамі, — яго ўнутраную стабільнасьць. Узмацненьне любой з гэтых групаў пагражала падарваць гэты балянс.

Яшчэ ў 1995 годзе пасьля кароткай сутычкі за вызначэньне сфэраў уплыву ў МУС «намэнклятурнікі» і «праваахоўнікі» пайшлі на кампраміс. Валянцін Агалец, Фарыд Канцараў і Юры Сівакоў падыходзілі і «старым», і Шэйману і пры гэтым мелі дастаткова моцныя сувязі з Расіяй. Агалец быў да 1994 года быў першым намесьнікам камандуючага ўнутранымі войскамі. Сівакоў ішоў з Рады бясьпекі, г. зн. ад Шэймана, але да 1994 году працаваў у Савеце міністраў і, адпаведна, меў сувязі са «старымі». Канцараў раней узначальваў контравыведку КДБ.

Пры гэтых акалічнасьцях Лукашэнка зрабіў усё, каб кожная з гэтых групаў заставалася ўва ўладзе, але не перамагла канчаткова. Пачынаючы з 1997 году зьмяняюцца адносіны паміж плынямі ў складзе эліты сілавікоў, праводзіцца кадравая палітыка, накіраваная на падтрыманьне балянсу сілаў. Міністар унутраных справаў Агалец, ключавая кансэнсусная фігура, заставаўся на сваёй пасадзе да 1999 году, нягледзячы на чуткі пра яго звальненьне з прычыны пагаршэньня крымінагеннай сытуацыі ў краіне. На пасады міністраў Лукашэнка пачаў часта прызначаць выканаўцаў абавязкаў, выканаўцаў абавязкаў з выпрабавальным тэрмінам.

Найлепей сыстэма «стрымак і проціваг» у кадравай палітыцы Лукашэнкі праглядалася на рэгіянальным узроўні. Амаль што ўсе кар’ерныя ўзьлёты тут адбываюцца дзякуючы міжрэгіянальным ці міжведамасным прызначэньням. Так, пры канцы 1996 году кіраўнік гомельскага Ўпраўленьня ўнутраных справаў (УУС) Віталь Апанасевіч пераводзіцца ў магілёўскае УУС, а праз тры гады — у Менск. Замест яго, на год, прызначаецца берасьцеец Міхаіл Удавікоў, чыя пасьлейшая хуткая кар’ера дазваляе гаварыць пра наяўнасьць у яго моцнай пратэкцыі наверсе. Пры канцы 1997 году кіраўнік віцебскага УУС Валер Гарадзенка пераводзіцца зь Менску, а Валянцін Нікіцін пераходзіць у Раду бясьпекі, толькі пару гадоў папрацаваўшы ў гомельскім КДБ. У складзе «праваахоўнай» эліты падтрымліваецца балянс і паміж прадстаўнікамі рэгіёнаў. На пасадах намесьніка КДБ пабывалі прадстаўнікі амаль што ўсіх абласьцей, апрача Віцебскай.

Больш-менш трывалыя сувязі сярод функцыянэраў праваахоўных органаў пачалі аднаўляцца толькі пачынаючы з 1999 году, з прызначэньнем на пасаду міністра ўнутраных справаў

Сівакова. За ім на месца камандуючага ўнутранымі войскамі быў прызначаны Юры Жадобін, які скончыў тую ж самую ваенную акадэмію бранетанкавых войскаў імя Маліноўскага, што і сам Сівакоў, перайшоў усьлед за ім на пасаду камандуючага ўнутранымі войскамі і сышоў разам зь Сіваковым*. Аднак пасьля гэтага адбываецца міжведамасная ратацыя, в.а. міністра ўнутраных справаў на некалькі месяцаў прызначаецца Ўдавікоў, які потым пераходзіць у Раду бясьпекі.

З новым прызначэньнем Сівакова на пасаду намесьніка прэм'ер-міністра (лістапад 2000 г.) адбываецца новая ратацыя. Кіраўніком МУС стаецца Ўладзімер Навумаў са службы бясьпекі прэзыдэнта. Адначасова адбываюцца ратацыі і ў КДБ: яго ачольвае Леанід Ерын.

Чаму адбываецца такая незвычайная перастаноўка кадраў? Сівакоў у свой час быў адной з кансэнсусных фігураў, якія прыйшлі ў МУС на прапанову Шэймана, але і са згоды Мясьніковіча. Гэтае ж яго павышэньне суправаджаецца паніжэньнем уплыву Шэймана**. Пасьлявыбарная адстаўка Мясьніковіча была выкліканая перадусім тым, што яго пазыцыі засталіся нязьменнымі, і павелічэньня яго ўплыву цяжка было ўнікнуць. Прызначэньне ж татарына Латыпава на пасаду кіраўніка Адміністрацыі выглядае заканамернасьцю ў тым ліку дзякуючы прамоцыі з боку казанскіх танкістаў.

У 1999 годзе адбыліся вялікія перамены і ўва ўнутранай, і ў вонкавай палітыцы Беларусі. З абраньнем расійскага прэзыдэнта Пуціна*** Лукашэнку давялося зьмяніць свае прыярытэты ўва ўсходняй палітыцы. Апрача гэтага, набліжаліся беларускія прэзыдэнцкія выбары 2001 году. Працягваць стратэгію раўнавагі кадраў азначала ўзмацняць неэфэктыўнасьць рэжыму. У гэтых абставінах стаўка Лукашэнкі на высокапрафэсійнага контравыведніка, былога загадчыка катэдры спэцыяльных дысцыплінаў Інстытуту нацыянальнай бясьпекі (калішнія Вышэйшыя курсы КДБ СССР) У. Латыпава выглядае ня як чарговая праява новага падзелу ўплыву, а як ажыцьцяўленьне захадаў, патрэбных для мабілізацыі сыстэмы ў крытычных абставінах. Актывізацыя апазыцыйнага руху, ціхае незадавальненьне ўладай з боку насельніцтва, пагроза пратэстнага галасаваньня — усё гэта запатрабавала неадкладных захадаў з боку рэжыму.

Кадравая палітыка не перажыла радыкальнай ломкі, па-ранейшаму прызначалі асобаў, а ня групы ці кляны. Але ўжо цяпер можна гаварыць пра тое, што пачынаючы з 1994 г. і дагэтуль беларуская палітычная сыстэма штучна затрымлівалася ў «замарожаным» стане.

Аморфнасьць і залежнасьць эліты БССР стала прычынай таго, што на пачатку 90-х гадоў што на Беларусі не існавала рэфарматарскіх плыняў у эліце. Дэмакратычная апазыцыя ж была яшчэ недастаткова моцнай, каб выкарыстаць гэта і прыйсьці да ўлады. У выніку, тая сіла, якая здабыла ўладу, была зацікаўленая перадусім у далейшым зьмяншэньні вагі як апазыцыі, так і старой эліты. У сярэдзіне 90-х быў перапынены працэс далейшай самаарганізацыі прамыслова-эканамічных элітаў. Быў сфармаваны новы дырэктарскі корпус. Прэзы-

* Жадобін таксама скончыў Казанскую бранетанкавую вучэльню. Трэба зьвярнуць увагу на нечаканы пераход Міхаіла Лазарава з маскоўскай Акадэміі бранетанкавых войскаў на пасаду кіраўніка Ваеннай акадэміі Беларусі.

** Пра гэта кажа ня толькі прызначэньне Шэймана на пасаду Генэральнага пракурора, але і іншыя факты. Напрыклад, перавод яшчэ шэйманаўскага «фаварыта» Ўдавікова ў Раду бясьпекі, узмацненьне Ерына і інш.

*** Пуцін, як і Лукашэнка, адразу пачаў уціскаць і падпарадкоўваць сабе расійскую прамыслова-эканамічную эліту, зь якой яшчэ нядаўна навязваў нефармальныя кантакты Лукашэнка.

дэнцкая вэртыкаль павялічыла залежнасьць рэгіянальных і галіновых элітаў ад цэнтру. Функцыянэры найвышэйшага ўзроўню лучылі ў поўную залежнасьць ад таго, хто іх прызначыў.

Але адначасова з гэтым такая палітыка *divede et impera* стварыла вялікую колькасьць незадаволеных рэжымам ня толькі сярод насельніцтва, але і сярод пакрыўджаных і зьняважаных прадстаўнікоў эліты. Таму пытаньне далейшага выжываньня рэжыму — гэта ў першую чаргу пытаньне аб тым, ці пажадаюць і ці здолеюць пакрыўджаныя аб'яднацца для ўдару ў адказ. І наколькі сілы дэмакратычнай апазыцыі здолеюць выкарыстаць яго, каб павялічыць свой уплыў.

## СЫСТЭМА ЎЛАДЫ І СЫСТЭМА АПАЗЫЦЫІ ПАСЬЛЯ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА КРЫЗЫСУ 1996 Г.

На фоне грамадзкага расколу і дэградацыі сацыяльных інстытутаў у Беларусі склаўся даволі спэцыфічны балянс сілаў, пры якім не перамагла ні ўлада, ні апазыцыя. Улада А. Лукашэнкі замацавалася дзякуючы моцнаму адміністрацыйнаму рэсурсу, стымуляваньню ў насельніцтва арыентацыі на сацыяльнае ўтрыманства і блякаваньню працэсаў самаарганізацыі беларускага грамадзтва. Фактычнаму панаваньню А. Лукашэнкі апазыцыя паспрабавала супрацьпаставіць сымбалічны капітал: аўтарытэт закону і ідэал Беларусі як цывілізаванай эўрапейскай дзяржавы. Між тым, недастатковы мабілізацыйны патэнцыял не дазволіў ні А. Лукашэнку зь яго камандай, ні апазыцыі ўсталяваць уласныя правілы палітычнай гульні. Хаця адразу пасьля рэфэрэндуму раўнавага паміж уладай і апазыцыяй выглядала хісткай, улетку 1999 г. яна замацавалася больш стала.

### Сыстэма ўлады

**Унутраная арганізацыя**

Прыцягнуўшы да ўлады старую савецкую намэнклятуру, А. Лукашэнка паставіў на ключавыя пасады самых розных людзей. Тыя зь іх, хто арыентаваўся на рынкавыя рэформы, пакінулі яго каманду яшчэ да рэфэрэндуму 1996 г. Пасьля 1996 г. у камандзе А. Лукашэнкі пераважалі прадстаўнікі партыйна-гаспадарчай намэнклятуры. Атачэньне А. Лукашэнкі склалі людзі, галоўнай якасьцю якіх стала асабістая адданасьць прэзыдэнту Лукашэнку (У. Канаплёў, С. Посахаў), прадстаўнікі старой намэнклятуры (А. Малафееў, М. Мясьнікові і яго каманда), спэцыялісты-прагматыкі, гатовыя працаваць з уладай незалежна ад палітычнага курсу краіны (адзін з кіраўнікоў Нацыянальнага банку Беларусі Генадзь Алейнікаў, міністар фінансаў Мікалай Корбут), а таксама палітыкі, якія выканалі асабліва важныя даручэньні Лукашэнкі*. Своеасаблівае месца займаў тагачасны сакратар Рады бясьпекі В. Шэйман, за плячыма якога стаялі беларускія спэцслужбы. Найбольш далікатныя распараджэньні прэзыдэнта

* Былы дэпутат Вярхоўнага Савету Іван Пашкевіч, які ў першыя дні пасьля рэфэрэндуму правёў работу па пераводзе дэпутатаў Вярхоўнага Савету ў Палату прадстаўнікоў, атрымаў пасаду намесьніка кіраўніка Адміністрацыі, а адзін зь лідэраў беларускіх камуністаў Віктар Чыкін за стварэньне прапрэзыдэнцкай партыі камуністаў атрымаў пасаду намесьніка старшыні Менгарвыканкаму, а пасьля старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі.

выконвалі такія асобы, як старшыня Ўпраўленьня справаў прэзыдэнта І. Ціцянкоў, дараднік прэзыдэнта ў асаблівых даручэньнях В. Кучынскі і брат былога міністра прадпрымальніцтва і інвэстыцыяў Аляксандра Сазонава Міхаіл Сазонаў.

Структуры ўлады былі пабудаваны на патранажна-клiентэлісцкіх узаемінах*. Надаўшы сабе пераважна кантрольныя функцыі, Лукашэнка знаходзіцца па-над асобамі зь іх інтарэсамі і выступае ў ролі судзьдзі ў магчымых канфліктах паміж набліжанымі. Групоўкі ўнутры пануючай эліты ўтвараліся вакол асобных яе прадстаўнікоў (такіх як М. Мясьніковіч, В. Шэйман, У. Канаплёў і І. Ціцянкоў). Між тым, спэцыфіка адносінаў паміж групоўкамі ўнутры ўлады вызначаецца выключна пераразьмеркаваньнем кампэтэнцыі ў асобных галінах кіраваньня. З прычыны адсутнасьці ў Беларусі адасобленых ад прэзыдэнта фінансава-прамысловых групаў супярэчнасьці ўнутры беларускай пануючай эліты як узьнікаюць, так і вырашаюцца без звароту да інтарэсаў шырокіх колаў грамадзтва.

Згортваньне ў Беларусі інстытуцыйна адрэгуляванай сфэры публічнай палітычнай барацьбы зьмяніла і функцыі органаў прадстаўнічай улады. У ПП НС, нягледзячы на прысутнасьць групы камуністаў-чыкінцаў (Міхаіл Анікееў, Валер Захарчанка, Сяргей Касьцян, Ігар Катляроў), так і ня склалася партыйнага прадстаўніцтва. Фактычна, склад фігур уплыву вызначаецца дачыненьнем да структураў выканаўчае ўлады ці блізінёй да віцэ-сьпікера палаты У. Канаплёва.

## Сувязь з грамадзтвам

У пабудаванай Лукашэнкам сыстэме ўлады пераважнай формай артыкуляцыі інтарэсаў грамадзтва зьяўляецца галасаваньне. Усе пасярэдніцкія структуры паміж дзяржавай і грамадзтвам як бы выступаюць у ролі сілаў, якія супрацьстаяць беспасярэдняму народнаму волевыяўленьню. Атрымаўшы пасаду прэзыдэнта дзякуючы агрэсіўнай рыторыцы, пабудаванай на супрацьстаўленьні «сваіх» і «чужых», А. Лукашэнка стаў прытрымлівацца гэтае тактыкі і надалей. Пры гэтым сярод тых, каму была навязана роля антынародных сілаў, апынуліся палітычныя партыі і грамадзкія арганізацыі. Падпарадкаваўшы сабе ўсе галіны ўлады, прэзыдэнт Лукашэнка, тым ня менш, не забясьпечыў сабе стоадсоткавых гарантыяў непахіснага панаваньня. Будучы абавязаным сваёй уладай усенароднаму волевыяўленьню, ён ня можа скасаваць інстытуту выбараў. Таму, улічваючы незадаволенасьць беларускага насельніцтва ўзроўнем жыцьця, прэзыдэнту па-ранейшаму даводзіцца разьлічваць на пратэстнае галасаваньне і падтрымліваць сябе ў стане канфрантацыі з тымі ці іншымі сіламі. За стыль дзейнасьці А. Лукашэнку называюць «паталягічным рэвалюцыянэрам», які пераўтварыў палітычную барацьбу ў краіне ў «халодную грамадзянскую вайну»[1]. Наяўнасьць у краіне палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў дапамагае прэзыдэнту падтрымліваць міт аб тым, што яму «перашкаджаюць», і ўхіліцца ад часткі ўзятых на сябе абавязкаў, зьвязаных зь дзяржаўным забесьпячэньнем такіх сацыяльных сфэраў, як адукацыя ці культура. Тым ня

* Палітычны кліентэлізм выступае як своеасаблівая форма вэртыкальнай салідарнасьці, у якой асымэтрычная ўлада ці няроўнасьць спалучаецца з салідарнасьцю, а патэнцыйны ці рэальны ўціск — з падкрэсьліваньнем добраахвотнасьці сувязяў. Гл.: Roniger L. Democracy, Clientelism and Civil Society. Ed. by L. Roniger and Aysegьneє-Ayata. Boulder, London. Lynne Rienner publishers, 1994. 223 p.

[1] Гл. Карбалевич В. Беларусь: расколотое общество // Белорусская газета. 1999. 5 красавіка.

менш, рост уплыву апазыцыйных сілаў, які стварае небясьпеку яго адхіленьня ад улады, прадухіляецца ўсімі магчымымі спосабамі: ад іх дыскрэдытацыі ў СМІ да ліквідацыі дзяржаўнымі органамі. Акурат пасьля апошняга рэфэрэндуму ў Беларусі пачалі зьнікаць дзеячы апазыцыі і зьявіліся палітычныя вязьні.

Імідж носьбіта ўсенароднага мандату на непадзельнае панаваньне вымушае А. Лукашэнку змагацца ня толькі з апазыцыяй, але і з уласнымі падначаленымі. Судовыя працэсы ператварыліся ў сродак палітычнай барацьбы як улады з апазыцыяй, так і ўнутры самой улады. У канцы 1996 г. была арыштаваная загадчыца аддзелу кіраваньня дзяржаўнай уласнасьцю й прыватызацыяй Салігорскага гарвыканкаму Людміла Шульга. Ёй інкрымінавалася атрыманьне хабару ад прадпрымальнікаў за паслугі па паскарэньні працэсу перарэгістрацыі фірмаў. Да судовай адказнасьці прыцягнулі таксама намесьніка загадчыка аддзелу эканомікі і рынкавых адносінаў Салігорскага гарвыканкаму. 28 лютага 1997 г. быў арыштаваны мэр Салігорску Мікалай Юрчык, супраць якога была ўзбуджана крымінальная справа за «крадзеж у асабліва буйных памерах». 5 красавіка прэзыдэнцкім указам за «расьпіцьцё алькагольных напояў на працоўным месцы» былі звольнены 12 работнікаў гарадзкой адміністрацыі г. Барысава, у тым ліку старшыня Барысаўскага гарвыканкаму Віктар Капульцэвіч, некалькі ягоных намесьнікаў, начальнік інспэкцыі Дзяржаўнага падатковага камітэту ў Барысаве Тацяна Пятровіч, ейны намесьнік, начальнікі мясцовага ГУУС і ДАІ Іван Шышла й Зьміцер Сашэнка, а таксама дырэктар Барысаўскага мясакамбінату Леанід Стэфанскі. Дакумэнт, на падставе якога яны былі звольненыя, зьмяшчаў дырэктыву «забясьпечыць прыцягненьне да адказнасьці ўсіх вінаватых службовых асобаў па факце расьпіцьця сьпіртных напояў 2 красавіка 1997 г. у будынку падатковай інспэкцыі г. Барысава». Паводле словаў арганізатаркі мерапрыемства Т. Пятровіч, 2 красавіка 1997 г. адбылася ня п’янка, а сьвята з нагоды завяршэньня будаўніцтва дзіцячага садка. Будаўніцтва пачыналася за бюджэтныя грошы, але не было завершана, таму мясцовая барысаўская адміністрацыя дабудавала яго ўласнымі намаганьнямі. Сьвяткаваньне фінансавалася ягонымі ўдзельнікамі добраахвотна, з уласных кішэняў, але ў прэсе падавалася як сьведчаньне карумпаванасьці мясцовых уладаў. Дасьведчаныя асобы тлумачылі звальненьне барысаўскіх «вэртыкальшчыкаў» тым, што раённае начальства дапамагло былому прэм’еру В. Кебічу перамагчы на выбарах у Вярхоўны Савет 13 скліканьня. Іншай прычынай варожасьці А. Лукашэнкі да барысаўскага кіраўніцтва магла стаць палітычная пазыцыя тамтэйшага мэра В. Капульцэвіча, які быў членам фракцыі камуністаў у Вярхоўным Савеце.

У траўні 1997 г. быў арыштаваны Сяргей Барысаў, якога абвінавацілі ў тым, што ў верасьні 1995 г., будучы дырэктарам гомельскага радыёзаводу, ён арганізаваў крадзеж маёмасьці ў асабліва буйных памерах. Пасьля ў такіх злачынствах, як раскраданьне дзяржаўнай уласнасьці, карупцыя ці перавышэньне службовых паўнамоцтваў, абвінавацілі былога міністра абароны Анатоля Касьценку, старшыню Нацбанку Тамару Віньнікаву, міністра сельскай гаспадаркі Васіля Лявонава, старшыню калгасу «Расьсьвет» Васіля Старавойтава, старшыню былога Ашчаднага банку Ўладзімера Хілько.

## Кантроль над грамадзкімі арганізацыямі

Пасьля рэфэрэндуму і рэарганізацыі органаў дзяржаўнага кіраваньня былі адкарэктаваныя прававыя ўмовы дзейнасьці палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў. У сакавіку

1997 г. Рада бясьпекі стварыла камісію па праверцы фінансавай дзейнасьці найбуйнейшых грамадзкіх аб'яднаньняў. Штрафныя санкцыі, накладзеныя камісіяй, прывялі да згортваньня дзейнасьці такіх арганізацыяў, як Беларускі фонд Сораса, цэнтар стратэгічных ініцыятываў «Усход — Захад», дабрачынны фонд «Дзецям Чарнобыля». Калі раней гэтыя меры распаўсюджваліся толькі на тыя арганізацыі, кіраўніцтва якіх знаходзілася ў сталіцы, то з 1998 г. перасьледы грамадзкіх арганізацыяў ахапілі ўсю краіну. Асноўнымі сродкамі барацьбы з трэцім сэктарам сталі адмовы ці затрымкі ў рэгістрацыі, уціск на актывістаў, адмовы ў выдзяленьні памяшканьняў для правядзеньня мерапрыемстваў, штрафы, дыскрэдытацыя ў СМІ. Адной з такіх мераў стала перарэгістрацыя да 1 ліпеня (падоўжаная пасьля да 1 жніўня) усіх партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, падчас якой кожная арганізацыя мела напісаць заяву, што яна дзейнічае на падставе Канстытуцыі 1996 г. Дэкрэт прэзыдэнта №2 ад 26.01.99 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаваньні дзейнасьці палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў ды іншых грамадзкіх аб'яднаньняў», на падставе якога праводзілася перарэгістрацыя, забараніў дзейнасьць незарэгістраваных аб'яднаньняў.

## Прадзяржаўныя арганізацыі

Улада беларускага прэзыдэнта акрамя сілы і адміністрацыйнага прымусу абапіраецца на сытуацыйныя настроі насельніцтва. Таму Лукашэнка зацікаўлены ў падтрымцы ня толькі з боку дзяржаўных структураў, але і некаторых сэгмэнтаў грамадзтва. У першыя гады прэзыдэнтуры Лукашэнку падтрымлівала панславісцкая партыя «Славянскі Сабор «Белая Русь» (ССБР), некаторыя функцыянэры якой былі працаўладкаваныя ў Адміністрацыі прэзыдэнта і Міністэрстве замежных справаў.

Каб кампэнсаваць недастатковую падтрымку з боку грамадзтва, Лукашэнка пайшоў на стварэньне прадзяржаўных арганізацыяў, якія б маглі кантраляваць найбольш важныя для ўлады сацыяльныя групы. Асабліва пільная патрэба ў такіх арганізацыях паўстала напярэдадні рэфэрэндуму 1996 г. Намаганьнямі ляяльных прэзыдэнту асобаў была расколата партыя камуністаў, якая ўлетку 1996 г. на чарговым пленуме афіцыйна прыняла пастанову перайсьці ў апазыцыю да А. Лукашэнкі і ўзяць удзел у працы «Круглага стала» дэмакратычных сілаў. Пасьля гэтага камуніст В. Чыкін, які, у адрозьненьне ад С. Калякіна і В. Новікава, не патрапіў у Вярхоўны Савет 13 скліканьня, адкрыта перайшоў на бок А. Лукашэнкі. Скарыстаўшыся дапамогай партыйнага кіраўніцтва савецкіх часоў, доступам да СМІ, а таксама адміністрацыйным рэсурсам прэзыдэнцкай вэртыкалі, ён перацягнуў на бок А. Лукашэнкі значную частку партыі, якая была зарэгістравана як Камуністычная партыя Беларусі (КПБ).

Пасьля вясны 1996 г. упершыню за час незалежнасьці Беларусі аб'ектам асаблівай увагі ўлады стала моладзь. На адмыслова сабранай нарадзе 17 чэрвеня 1996 г. прэзыдэнт Лукашэнка заклікаў лідэраў маладзёвых арганізацыяў і супрацоўнікаў дзяржструктураў па рабоце з моладзьдзю стварыць адзіную ляяльную дзяржаве маладзёвую арганізацыю накшталт савецкага камсамолу. Гэты ж заклік з абяцаньнем матэрыяльнае падтрымкі быў агучаны ім на маладзёвым форуме 20–21 верасьня 1996 г. У выніку, за некалькі месяцаў да рэфэрэндуму зьявілася нешматлікая маладзёвая арганізацыя «Прамое дзеяньне», якая правяла некалькі акцый у падтрымку прэзыдэнта, пасьля чаго стала галоўным атрымальнікам сродкаў, прыз-

начаных на стварэньне ляяльнага «ўплывовага маладзёвага руху»*. Пасьля рэфэрэндуму на базе гэтай арганізацыі з дапамогай мясцовай «вэртыкалі», міністэрстваў, ведамстваў і навучальных установаў быў утвораны Беларускі патрыятычны саюз моладзі (БПСМ), якому меркавалася перадаручыць каардынацыю дзейнасьці ўсіх маладзёвых арганізацыяў у краіне. Але калі стала відавочна, што БПСМ з гэтым ня дасьць рады**, яго значэньне для ўлады было абмежавана роляй «кузьні кадраў».

## Сыстэма апазыцыі

**Партыі**

Пасьля рэфэрэндуму 1996 году апазыцыя набыла новыя арганізацыйныя формы і пачала асвойваць новыя мэтады дзейнасьці. Але першыя месяцы пасьля рэфэрэндуму для бальшыні дэмакратычных сілаў азначыліся чаканьнем грунтоўных пераменаў. Яны меркавалі, што новы рэжым сам сябе разбурыць: па-першае, у выніку непрызнаньня з боку міжнароднай супольнасьці, па-другое, дзеля сваёй эканамічнай нежыцьцяздольнасьці.

Прыпыненьне часовага гандлёвага пагадненьня з Эўразьвязам, пазбаўленьне ранейшага статусу ў АБСЭ, пераход ЗША да палітыкі «выбарачнага дыялёгу» і замарожаныя адносіны з Паўночнаатлянтычнай асамблеяй не паўплывалі на палітыку беларускіх уладаў. Вагары дыпляматычнага і эканамічнага ўзьдзеяньня, якія ўжыла да Беларусі міжнародная супольнасьць, аказаліся неэфэктыўнымі. Галоўным гандлёвым партнэрам Беларусі была Расія, а тамтэйшае кіраўніцтва, маючы аналягічны досьвед разгону парлямэнту, прызнала вынікі рэфэрэндуму***. Што да рэакцыі насельніцтва, то паступовае пагаршэньне яго эканамічнага стану не ўзмацніла ў ім прагу да зьмены кіраўніцтва, а наадварот, адцягнула ад палітыкі. Маса людзей пераключыла ўвагу на прысядзібную гаспадарку, прыработкі і г. д. Увесну 1997 г. стала відавочна, што спадзяваньні значнае часткі апазыцыйных сілаў на хуткія зьмены становішча ў краіне ня спраўджваюцца. (Хаця ў сталіцы адбыліся масавыя дэманстрацыі, падчас якіх былі сутыкненьні зь міліцыяй, сёлетняя актыўнасьць была слабейшай за леташнюю.)

Увесну 1997 г. партыі перагледзелі тактыку сваёй дзейнасьці. БНФ, які і да рэфэрэндуму ня меў уласнага прадстаўніцтва ў Вярхоўным Савеце, адносна лёгка перанёс зьнікненьне ў Беларусі легітымнага парлямэнту. На чарговым сойме 12 красавіка 1997 г. БНФ канстатаваў, што ўладу А. Лукашэнкі не прызнае і ў далейшай дзейнасьці будзе аддаваць перавагу

* Указам прэзыдэнта ад 9 ліпеня 1997 г. было вызначана фінансаваньне гэтае структуры зь дзяржаўнага фонду садзейнічаньня занятасьці, Беларускага фонду падтрымкі прадпрымальніцтва, Рэспубліканскага фонду аховы прыроды і навакольнага асяродзьдзя і Рэспубліканскага фонду дапамогі асобам, пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС.

** З 26 жніўня 1993 г. у Беларусі існавала Ўсебеларуская рада маладзёвых і дзіцячых аб'яднаньняў. За месяц да ўстаноўчага зьезду БПСМ ейнае кіраўніцтва правяло Ўстаноўчы кангрэс Нацыянальнай рады маладзёвых і дзіцячых арганізацыяў. У новую парасонную структуру ўвайшлі 18 рэспубліканскіх маладзёвых аб'яднаньняў і 1 рэгіянальнае. Гэтае мерапрыемства скасавала манаполію БПСМ на пасярэдніцтва паміж усёй беларускай моладзьдзю і дзяржавай. Арганізатары ўстаноўчага сходу БПСМ адрэагавалі на гэта выключэньнем са статуту БПСМ пункту пра сяброўства арганізацыяў, прычым кіраўнікі арганізацыяў, што пагадзіліся ўвайсьці ў БПСМ, даведаліся аб гэтым толькі на ўстаноўчым зьезьдзе.

*** Апрача таго, што Расія забясьпечвала Беларусь нафтай і газам, на яе прыпадала 52% вонкавагандлёвага абарачэньня Беларусі.

акцыям пратэсту. Лібэралы з АГП скіравалі свае намаганьні ў квазіпарлямэнцкае рэчышча: на забесьпячэньне работы сваёй фракцыі ў Вярхоўным Савеце, а таксама ўтворанага ёй кааліцыйнага ўраду. Частка АГП радыкалізавалася і стала надаваць больш увагі ўдзелу ў вулічных акцыях. Першай выказала гатоўнасьць да перамоваў з уладай Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя («Народная Грамада»). На зьезьдзе, адбытым у красавіку 1997 г., яна прапанавала ідэю стварэньня Канстытуцыйнага сходу, які б забясьпечыў магчымасьць правядзеньня легітымных парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў. Меркавалася, што юрыдычную аснову для яго павінны стварыць легітымны Вярхоўны Савет. У склад Канстытуцыйнага сходу меркавалася ўключыць дэпутатаў ад парлямэнту, 70 прадстаўнікоў ад прэзыдэнта і партыяў, якія ўдзельнічалі ў рабоце «Круглага стала», а таксама кандыдатаў, якія набралі падчас апошніх выбараў найбольшую колькасьць галасоў. Партыя камуністаў на чале з С. Калякіным з сыходам чыкінцаў згубіла амаль палову свайго складу, але стала ў яшчэ большую апазыцыю Лукашэнку. Ідэалягічна яна зрушылася ўправа, у кірунку сацыял-дэмакратыі.

## Прафсаюзы

Структуры спадкаемцы савецкай прафсаюзнай арганізацыі — Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) — аказаліся апошнім каналам уплыву на ўладу, які ня быў перакрыты ў выніку канстытуцыйнага перавароту 1996 г. Традыцыйна яны супрацоўнічалі з уладай толькі ў эканамічных пытаньнях, такіх як памеры заработнай платы, рост цэнаў, невыкананьне калектыўных дамоваў на прадпрыемствах. Матэрыяльныя рэсурсы прафсаюзаў спрыялі ня столькі мабілізацыі клясы наёмных работнікаў, колькі заспакаеньню працоўных калектываў. Самі прафсаюзы вылучыліся няздольнасьцю аказваць уціск на дзяржаву і працадаўцаў*. Доўгі час кіраўніцтва ФПБ захоўвала палітычную нэйтральнасьць, ішло на кампрамісы, аддаючы перавагу ня страйкам, а перамовінам**. Некаторы час пасьля стыхійных страйкаў, што адбыліся ў красавіку 1992 г., гэтая тактыка была пасьпяховай. Між тым, спробы перайсьці да палітыкі сацыяльнага партнэрства паспрыялі палітызацыі ФПБ. У 1995 г. кіраўніцтва ФПБ пачало адкрыта выказваць незадаволенасьць сацыяльнай і эканамічнай палітыкай ураду. Улетку 1996 г. ФПБ правяла некалькі страйкаў у знак пратэсту супраць затрымкі выплаты заработнай платы, а таксама падтрымала акцыі прадпрымальнікаў на менскіх рынках, выкліканыя новым парадкам падаткаабкладаньня. Падчас канфлікту паміж прэзыдэнтам і Вярхоўным Саветам 13 скліканьня лідэр ФПБ У. Ганчарык заняў бок парлямэнту. Пасьля рэфэрэндуму 1996 году ФПБ стала нават часьцей выступаць з палітычнымі заявамі. Такія традыцыйныя для прафсаюзаў формы дзейнасьці, як страйкі, былі абмежаваныя прэзыдэнцкім дэкрэтам «Аб сходах, вулічных шэсьцях і дэманстрацыях», на які ў красавіку 1997 г. чарговы пленум ФПБ адрэагаваў заявай. Канчаткова ж радыкалізацыі ФПБ паспрыялі намеры прэзыдэнта перадаць функцыю прафсаюзаў па арганізацыі адпачынку працоўных дзяржаве. Для кіраўн-

* ФПБ аб'ядноўвае 4,5 млн. чал. Гэта бальшыня наёмных работнікаў у Беларусі. Уступленьне работнікаў у прафсаюз адбываецца аўтаматычна пры прыёме на працу.

** Структура ФПБ замінала дакладнаму вызначэньню ейных інтарэсаў. Прафсаюзы, якія ўваходзілі ў ФПБ, але былі нязгодныя з агульнай палітыкай фэдэрацыі, стрымлівала ад выхаду палажэньне статуту ФПБ аб падзельнасьці прафсаюзнай уласнасьці.

іцтва ФПБ гэта азначала страту ўплыву на чальцоў прафсаюзу. Колькасьць жа сьвядомых чальцоў ФПБ, гатовых пры неабходнасьці пацьвердзіць сваё сяброўства, па ацэнках старшыні ФПБ У. Ганчарыка, складала 500–600 тысяч чалавек.

Сярод незалежных прафсаюзаў найбольшую вядомасьць атрымаў Беларускі кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП), які аб’ядноўваў пяць прафсаюзаў: Беларускі незалежны прафсаюз, Свабодны прафсаюз Беларусі, прафсаюз пэдагогаў «Прызваньне», Дэмакратычны прафсаюз транспартнікаў і Свабодны прафсаюз мэталістаў. Паўстаўшы пад уплывам замежных прафсаюзных арганізацыяў, такіх як «Салідарнасьць» і Міжнародная канфэдэрацыя свабодных прафсаюзаў, Кангрэс з самага пачатку адстойваў эканамічныя рэформы і дэмакратычныя вартасьці. Дзякуючы сваёй палітычнай заангажаванасьці БКДП не заўжды ўдавалася ўдзельнічаць у падпісаньні Тарыфнага пагадненьня. Пасьля страйку на менскім мэтрапалітэне дзейнасьць заснавальніка БКДП Свабоднага прафсаюзу Беларусі была прыпыненая прэзыдэнцкім указам*. На 1997 г. колькасьць БКДП складала каля 30 тысячаў чалавек.

## Грамадзкія арганізацыі

Пры ўсёй сваёй непадкантрольнасьці прэзыдэнт залежыць ад электаральных паводзінаў беларускага грамадзтва, і тым самым — ад суб’ектаў уплыву на грамадзкую думку. Захаваньне ўлады вымагае па магчымасьці поўнага кантролю над СМІ і перасьледу любых значных грамадзкіх ініцыятываў. У сваю чаргу, уціск на недзяржаўныя грамадзкія арганізацыі прывёў да паляпшэньня каардынацыі іх дзейнасьці. 22 лютага 1997 г. была ўтворана Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў, да якой адразу ж далучыліся больш за 250 грамадзкіх аб’яднаньняў. Найважнейшымі з мэтаў дзейнасьці Асамблеі сталі калектыўная самаабарона арганізацыяў, інфармацыйны абмен у межах краіны, а таксама з замежнымі няўрадавымі арганізацыямі, рэсурсная падтрымка. Структурызацыя Асамблеі была скіраваная на ўсталяваньне сувязяў з шырокімі слаямі беларускага грамадзтва і нарошчваньня мабілізацыйнага патэнцыялу беларускага дэмакратычнага руху «дзеля пераходу ад палітыкі выжываньня да палітыкі экспансіі грамадзянскае супольнасьці ў Беларусі»[2]. 14 лістапада 1998 г., падчас правядзеньня другой Асамблеі, было абвешчана, што ў Беларусі налічваецца 2,5 тыс. няўрадавых арганізацыяў, зь іх 520 грамадзкіх аб’яднаньняў, 2/3 зь якіх дзейнічае ў рэгіёнах, далучыліся да Асамблеі.

## Каардынацыя дзеяньняў апазыцыі

Апазыцыйныя сілы спрабавалі аб’ядноўваць свае намаганьні яшчэ ўвесну 1996 г., калі колькасьць людзей, якія выходзілі на зарганізаваныя апазыцыйнымі партыямі мітынгі, зьдзіўляла саміх арганізатараў. Пасьля аднаго зь першых такіх мітынгаў, прысьвечанага двухгодзьдзю

* Акрамя Свабоднага прафсаюзу Беларусі была прыпынена дзейнасьць пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі менскага мэтрапалітэну, а таксама прафсаюзу чыгуначнікаў і транспартных будаўнікоў.

2 Роўда У. Нацыянальная ідэя і фарміраванне грамадзянскай супольнасці ў Беларусі // Грамадзянская альтэрнатыва. 1999. № 2. С. 8.

прыняцьця Канстытуцыі, 14 палітычных партыяў і 5 грамадзкіх аб'яднаньняў утварылі «Рух у падтрымку Канстытуцыі», мэтай якога было аб'яднаньне намаганьняў грамадзкасьці дзеля забесьпячэньня ў краіне вяршэнства права і выкананьня пастановаў Канстытуцыйнага Суду. Працягам гэтае ініцыятывы стаў «Круглы стол». 25 ліпеня 1996 да «Круглага стала» далучылася 12 партыяў, рухаў і прафсаюзаў, 28 жніўня — 14, а ў другую дэкаду кастрычніка — 21[3]. Прадстаўнікі «Круглага стала» намагаліся выступіць арбітрамі ў канфлікце паміж выканаўчай і заканадаўчай галінамі ўлады. Імі была выказана ініцыятыва імпічмэнту прэзыдэнта і падрыхтаваны Нацыянальны кангрэс «У абарону Канстытуцыі, супраць дыктатуры», што адбыўся 18-19 кастрычніка 1996 году і атрымаў назоў I Кангрэсу дэмакратычных сілаў.

У хуткім часе пасьля рэфэрэндуму была ўтворана Кансультацыйная рада дэмакратычных сілаў Беларусі. Другім цэнтрам каардынацыі апазыцыйных сілаў стала Нацыянальная эканамічная рада, утвораная Вярхоўным Саветам 13 скліканьня і рэарганізаваная ў кастрычніку 1997 г. у Нацыянальны выканаўчы камітэт. Увесну 1998 г. беларуская апазыцыя фактычна мела два каардынацыйныя цэнтры. У НВК дамінавала АГП, а ў Кансультацыйнай радзе — БНФ.

Новай зьявай для беларускай палітыкі стаў рух Хартыя'97, задуманы паводле аналёгіі з чэскай Хартыяй'77, які аб'яднаў грамадзянаў самых розных палітычных паглядаў у іх супрацьстаяньні з аўтарытарнай сыстэмай. Хартыя'97 падтрымлівала Вярхоўны Савет, выступала з патрабаваннем адстаўкі прэзыдэнта, фармаваньня кааліцыйнага ўраду, правядзеньня дэмакратычных выбараў. Адной з формаў дзейнасьці Хартыі'97 сталі масавыя акцыі. Але хаця Хартыя прэтэндавала на маніфэстацыю і мабілізацыю дэмакратычна настроенага грамадзтва ў Беларусі, рэальна ёй удалося заручыцца падтрымкай толькі расійскамоўных беларусаў. Пры гэтым нельга адмаўляць ролю гэтай арганізацыі ў правядзеньні II Кангрэсу дэмакратычных сілаў, на якім была прынятая пастанова аб стварэньні Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў Беларусі.

На II Кангрэсе дэмакратычных сілаў, што адбыўся 29–30 студзеня 1999 г., меркавалася прыняць дакумэнт аб кансалідацыі дэмсілаў і выпрацаваць адзіную пазыцыю ў дачыненьні выбараў, якія, паводле Канстытуцыі 1994 г., былі прызначаны ВС на 16 траўня 1999 г. Хаця, паводле словаў аднаго зь лідэраў БНФ Лявона Баршчэўскага, апазыцыя і пераходзіла «ў стан нацыянальна-вызваленчага руху», узгодненай пазыцыі па падрыхтоўцы да выбараў выпрацавана не было. Былі прынятыя рэзалюцыі аб пагрозе дзяржаўнасьці, няўдзеле ў выбарах у мясцовыя саветы, аб асуджэньні палітыкі прэзыдэнта, аб дыскрымінацыі беларускае мовы. Пры гэтым рэзалюцыя аб кансалідацыі дэмакратычных сілаў Беларусі прынята не была. Дзеля выкананьня пастановаў II Кангрэсу дэмакратычных сілаў меркавалася ўтварыць стала дзейны орган — Каардынацыйна-кансультацыйную раду (ККР). На ініцыятыву БНФ каардынацыйныя функцыі было вырашана пакінуць за створанай яшчэ ў 1997 г. Кансультацыйнай радай, чальцамі якой былі БНФ, АГП, БСДП (НГ), Беларуская партыя працы, Аграрная партыя і Партыя камуністаў беларуская. Тым ня менш, пытаньне аб ККР не было разьвязанае цалкам. Дзеля ўтварэньня гэтае структуры ўдзельнікі Кангрэсу пастанавілі правесьці дадатковыя перамовы.

На II Кангрэсе дэмакратычных сілаў быў агучаны намер апазыцыі ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах, што, паводле Канстытуцыі 1994 г., мелі адбыцца ў 1999 г. Насуперак ча-

[3] Гл. Парламенцкі веснік. Жнівень 1996 г., № 14 (126); Парламенцкі веснік. Кастрычнік 1996 г., № 17 (129).

каньням апазыцыі выбары не пацягнулі за сабой дадатных зрухаў. Паколькі А. Лукашэнка адмовіўся ад іх правядзеньня, апазыцыі давялося рыхтаваць іх самастойна. Рэагуючы на перадвыбарныя прыгатаваньні, якія распачаў Вярхоўны Савет, Міністэрства юстыцыі заявіла, што пастанова ВС ад 10 студзеня 1999 г. аб правядзеньні выбараў і стварэньні Цэнтравыбаркаму незаконная. Супраць старшыні камісіі В. Ганчара была ўзбуджана крымінальная справа па артыкуле «Самавольнае прысваеньне званьня ці ўлады службовай асобы». Кандыдат у прэзыдэнты М. Чыгір быў арыштаваны*. Празь немагчымасьць арганізаваць выбары належным чынам галасаваньне праводзілася мэтадам абыходу кватэраў выбарцаў. Пры гэтым, па дадзеных ЦВК і праваабарончага цэнтру «Вясна-96», за дзесяць дзён выбарчай кампаніі звыш 350 чалавек былі затрыманыя, дзесяць актывістаў асуджаны на тэрмін ад 3 да 10 сутак арышту, пяцёра атрымалі папярэджаньні, два аштрафаваныя. Напярэдадні галасаваньня адзін з кандыдатаў, лідэр БНФ З. Пазьняк, адмовіўся ад удзелу ў выбарах і заклікаў сябраў БНФ спыніць работу ў выбарчых камісіях. Пасьля гэтага ЦВК на чале з Ганчаром сфальсыфікаваў вынікі выбараў. 19 траўня на прэс-канфэрэнцыі старшыня ЦВК В. Ганчар сьпярша абвясьціў, што ў выбарах удзельнічалі 53,2% выбарцаў, але пасьля прызнаў іх несапраўднымі з-за парушэньняў, дапушчаных падчас галасаваньня. Зьвесткі аб тым, колькі галасоў набраў кожны з кандыдатаў, абвешчаны не былі.

20 ліпеня, калі паводле Канстытуцыі 1994 г. скончыўся тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта Лукашэнкі, апазыцыйныя сілы таксама ня здолелі ўзяць сытуацыю пад кантроль. Яшчэ на ІІ Кангрэсе дэмакратычных сілаў у прысутнасьці дыпляматаў судзьдзя КС першага складу М. - Пастухоў выступіў з спавешчаньнем, у якім было сказана, што пасьля 20 ліпеня 1999 г. паўнамоцтвы кіраўніка выканаўчай улады пераходзяць да Старшыні Вярхоўнага Савету С. Шарэцкага. Тым ня менш, 21 ліпеня С. Шарэцкі замест таго, каб выдаць адпаведны ўказ, прапанаваў прыняць гэтую пастанову дэпутатам, якія, у сваю чаргу, стварылі мандатную камісію і, захапіўшыся пытаньнем кворуму, ніякай пастановы не прынялі. Акцыя масавай падтрымкі дэпутатаў ВС была таксама правалена: дзеля нядбайнасьці арганізатараў замест запляնаваных 100 тысячаў да месца паседжаньня ВС прыйшло ўсяго 3 тысячы чалавек.

Такім чынам, апазыцыя ня здолела пераняць ініцыятыву ці справакаваць уладу на такія дзеяньні, якія змаглі б выклікаць масавую незадаволенасьць, а ейны ўплыў на грамадзтва аказаўся абмежаваным**.

## Узаемадзеяньне паміж уладай і апазыцыяй

Першыя захады што да вызначэньня магчымых шляхоў для ўзаемапаразуменьня паміж уладай і апазыцыяй былі зробленыя ўвесну 1997 г. Не адмаўляючыся ад перамовінаў, улада ўсяляк зацягвала падрыхтоўку і ўсяляк дэманстравала сваю незацікаўленасьць у іх. Прадстаўнікі прэзыдэнцкага боку адмовіліся весьці перамовы з дэлегацыяй апазыцыі ў складзе дэпутатаў ВС Г. Карпенкі, М. Грыба і П. Краўчанкі. Сесьці за стол перамовінаў з дэлегацы-

* Паводле словаў былога міністра ўнутраных справаў Ю. Захаранкі, загад аб арышце экс-прэм'ера даў асабіста прэзыдэнт Лукашэнка.

** У чэрвені 1999 г., пасьля арганізаваных апазыцыяй прэзыдэнцкіх выбараў, 32,2% апытаных НІСЭПД нічога ня ведалі пра прычыну зьняволеньня кандытата на пасаду прэзыдэнта М. Чыгіра.

яй, складзенай толькі з чальцоў прэзыдыюму распушчанага парлямэнту, азначала прызнаць яго законнасьць. Прэзыдэнт Лукашэнка заявіў, што будзе весьці размову толькі з усімі партыямі адразу, у тым ліку і тымі, што яго падтрымліваюць. БНФ, АГП і БСДП (НГ) прапанавалі ўсім астатнім партыям падпісаць заяву аб дэлегаваньні правоў на вядзеньне перамоваў дэпутатам ВС. У рэшце рэшт выйсьце знайшла дэлегацыя Эўразьвязу: на ейную прапанову было вырашана далучыць да перамовінаў прадстаўнікоў усіх фракцыяў ВС. Пры гэтым дэпутаты адмовіліся падпісваць якія-колечы дакумэнты, у якіх не пазначаны іх дэпутацкі статус. Праграмнай базай для апазыцыі на перамовах была Канстытуцыя 1994 г. і зафіксаваныя ў ёй разьмежаваньні паўнамоцтваў галінаў улады. Канкрэтным патрабаваньнем быў роспуск Палаты прадстаўнікоў і правядзеньне новых выбараў. Прэзыдэнт Лукашэнка, з свайго боку, прадстаўляў перамовы як шараговую кансультацыю з групай грамадзянаў, якая не ўскладае на ўладу ніякіх абавязкаў. Аб прызнаньні правамоцтваў ВС сур'ёзных размоваў не вялося, таму ні па прызначэньні новых выбараў, ні, тым больш, па зьмене Канстытуцыі ніякіх дамоўленасьцяў дасягнута не было*. Кампраміс аказаўся непатрэбным абодвум бакам перамовінаў: апазыцыя спадзявалася на выгадныя для сябе зьмены становішча ўнутры краіны, а прэзыдэнт Лукашэнка — на зьмену стаўленьня да Беларусі за мяжой. У выніку большую карысьць ад перамовінаў атрымаў А. Лукашэнка, які быў зацікаўлены ў тым, каб улагодзіць удзельнікаў паседжаньня ПА АБСЭ 3–5 ліпеня 1997 г. калі ня вынікамі, то хаця б самім фактам перамовінаў з апазыцыяй.

Паступова перамовы ўлады і апазыцыі пры пасярэдніцтве міжнародных структураў ператварыліся ў перамовы ўлады і міжнароднай супольнасьці пры пасярэдніцтве апазыцыі. З мэтай падрыхтоўкі да паўнавартых выбараў новага складу парлямэнту і новага прэзыдэнта НВК прапанаваў 24 лістапада 1998 г. пачаць перамовіны паміж прэзыдэнтам і ВС 13 скліканьня пры пасярэдніцтве эўрапейскіх структураў. У заяве былі пералічаныя наступныя ўмовы правядзеньня свабодных дэмакратычных выбараў: фармаваньне дэмакратычным шляхам Цэнтральнай выбарчай камісіі; забесьпячэньне прадстаўнікам усіх рухаў, партыяў ды іншых арганізацыяў доступу да дзяржаўных СМІ; спыненьне перасьледаў грамадзянаў па палітычных матывах і вызваленьне ўсіх палітычных вязьняў. Патрабаваньні гэтыя не былі задаволеныя ні пры выбарах у мясцовыя Саветы 1999 г., ні пры выбарах у ПП НС 2000 г., што стала прычынай байкатаваньня апазыцыяй гэтых выбараў.

## Высновы

Пасьля рэфэрэндуму магчымасьці выкарыстаньня палітычных мэтадаў узьдзеяньня на беларускага прэзыдэнта былі страчаныя. Перамовіны з удзелам міжнародных арганізацыяў не паспрыялі роспуску Палаты прадстаўнікоў, правядзеньню дэмакратычных выбараў у прадстаўнічыя органы ўлады ці скліканьню Канстытуцыйнага сходу. Гэта замацавала раскол у грамадзтве, але апазыцыя пазьбегла іміджу памагатага лукашэнкаўскага рэжыму. У выніку ў краіне замацаваліся дзьве паралельныя сыстэмы ўлады.

З каляпсам партыйнай сыстэмы ў беларускім грамадзтве склаўся новы прынцып палітыч-

* Прэзыдэнцкі бок меў інструкцыю аб тым, што перамовіны могуць весьціся толькі з прадстаўнікамі пэўных палітычных сілаў, былымі дэпутатамі Вярхоўнага Савету.

най палярызацыі. Ідэнтыфікацыя палітычных сілаў стала вызначацца ня столькі па восі «правыя — левыя», колькі па прынцыпе ляяльнасьці да ўлады А. Лукашэнкі: «за ці супраць». На фоне супрацьстаяньня ўлады і апазыцыі ідэалягічныя адрозьненьні паміж асобнымі партыямі аказаліся неістотнымі ў параўнаньні з пытаньнем аб падтрымцы рэжыму. Паводле некаторых ацэнак, беларуская партыйная сыстэма набыла выгляд двухпартыйнай[4]. У апазыцыі апынуліся прадстаўнікі ўсіх ідэалягічных кірункаў ад кансэрватараў-нацыяналістаў да камуністаў, а партыя ўлады пасьлядоўна ўнікала якой-небудзь выразнай ідэалёгіі. Посьпехі апазыцыі ў барацьбе з уладай А. Лукашэнкі зьвяліся да падтрымкі з боку міжнароднай супольнасьці, якая ня мае эфэктыўных вагароў уплыву на сытуацыю ўнутры краіны.

Адмова апазыцыйных сілаў інтэгравацца ў створаную нелегітымным прэзыдэнтам структуру ўлады пакінула магчымасьць для вяртаньня Беларусі ў стан канстытуцыйнай законнасьці. Улада і апазыцыя, знаходзячыся ў стане канфрантацыі, сталі апраўданьнем адна адной.

## АЛЬТЭРНАТЫЎНЫЯ ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ ТРАЎНЯ 1999 ГОДУ: ІНІЦЫЯТАРЫ, ХОД ПРАВЯДЗЕНЬНЯ, ПАЛІТЫЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ

У жніўні 1998 году стала вядома, што пры падрыхтоўцы праекту дзяржаўнага бюджэту Беларусі на 1999 год ня будуць прадугледжаныя выдаткі на правядзеньне ў 1999 годзе прэзыдэнцкіх выбараў. Былі страчаныя апошнія надзеі на перагляд уладай сваёй пазыцыі што да вынікаў апошняга рэфэрэндуму, згодна зь якімі прэзыдэнцкія паўнамоцтвы Аляксандра Лукашэнкі былі працягнуты да 2001 году. Дэмакратычнымі ж сіламі правядзеньне прэзыдэнцкіх выбараў разглядалася як падзея выключнага палітычнага значэньня. Таму пры канцы 1998 году ВС 13 скліканьня стварыў рабочую групу для падрыхтоўкі пастановы што да правядзеньня ў 1999 годзе прэзыдэнцкіх выбараў. У яе ўвайшлі старшыня ВС Сямён Шарэцкі, кіраўнікі апазыцыйных палітычных партыяў, якія мелі сваіх прадстаўнікоў у парлямэнце, а таксама былы старшыня ЦВК Віктар Ганчар.

На гэтую ініцыятыву ўлада адрэагавала ўжо 7 студзеня 1999 году: Генэральны пракурор Беларусі Алег Бажэлка заявіў пра магчымасьць узбуджэньня крымінальнай справы супраць удзельнікаў рабочай групы. Гэты момант задаў непажаданы для дэмакратычнай апазыцыі кантэкст выбараў: улада ня лічыць легітымным ВС і не прызнае яго права на прызначэньне прэзыдэнцкіх выбараў, але адначасна ініцыятары правядзеньня выбараў, апазыцыйны ВС і створаныя ім органы, згодна з сваёй наперад вызначанай лініяй, зьвяртаюцца да афіцыйных органаў улады, быццам прызнаючы іх легітымны статус.

Нягледзячы на папярэджаньне ад генпракурора, 10 студзеня 1999 г. адбылося паседжаньне ВС, на якім прысутнічалі 44 дэпутаты. 42 зь іх ухвалілі распрацаваную працоўнай групай пастанову. Было вырашана, што першы тур прэзыдэнцкіх выбараў адбудзецца 16 траўня 1999 году, а з 1 сакавіка пачнецца рэгістрацыя ініцыятыўных групаў кандыдатаў. У складзе 19 чалавек была зацьверджаная Цэнтральная выбарчая камісія па выбарах прэзыдэнта пад

[4] Гл. Плиско М. Партогенез в современной Беларуси // Адкрытае грамадства. 2000. № 2 (8). С. 20.

кіраўніцтвам В. Ганчара. У яе склад увайшлі прадстаўнікі БНФ, АГП, Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, Беларускай асацыяцыі журналістаў, а таксама прафэсійных саюзаў.

13 студзеня адбылася падзея, якая, магчыма, таксама паўплывала на правядзеньне альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. У гэты дзень суд адмовіў у вызваленьні пад падпіску аб нявыезьдзе* 75-гадоваму старшыню калгасу «Расьсвет» Васілю Старавойтаву. Гэтая крымінальная справа была беспасярэдне «замоўленая» Лукашэнкам для таго, каб запалохаць дырэктарскі корпус — прадстаўнікоў прамыслова-эканамічнай эліты. Гэтай пастановай суду ўлады далі зразумець: зьмены палітычнага курсу ў краіне ня будзе, як ня будзе і недатыкальных, нягледзячы на ўзрост, стан здароўя, нацыянальную або інтэрнацыянальную вядомасьць.

15 студзеня Цэнтравыбаркам паінфармаваў СМІ, мясцовыя органы ўлады, міністэрствы аб часе і месцы свайго першага паседжаньня. Афіцыйныя структуры і іх прадстаўнікі на гэтае паведамленьне не адгукнуліся. Яны і ў далейшым не рызыкавалі мець стасункі з Ганчаровым Цэнтравыбаркамам, таму што гэта азначала як мінімум звальненьне з працы, а як максымум — прыцягненьне да адміністрацыйнай ці нават крымінальнай адказнасьці.

Цэнтравыбаркам быў вымушаны працаваць у паўпадпольлі, што само сабой стварала значныя перашкоды для эфэктыўнага правядзеньня такой вялікай палітычнай акцыі, як прэзыдэнцкія выбары. Ня здолеў ён здабыць і сталага памяшканьня: Міжнародны адукацыйны цэнтар, у якім было прызначанае першае паседжаньне Цэнтравыбаркаму, на наступны дзень пасьля ўкладаньня дамовы скасаваў яе.

16 студзеня на першым паседжаньні Цэнтрвыбаркаму быў зацьверджаны плян захадаў для правядзеньня прэзыдэнцкіх выбараў. Было пастаноўлена, што за 70 дзён да даты выбараў пачнецца збор подпісаў за вылучэньне кандыдатаў у прэзыдэнты. На працягу аднаго месяца ініцыяўныя групы кожнага прэтэндэнта на пасаду прэзыдэнта павінны сабраць ня менш за 100 тысяч подпісаў. Потым сабраныя подпісы неабходна перадаць у Цэнтравыбаркам, які пачне рэгістрацыю кандыдатаў. А з 6 красавіка павінна распачацца агітацыйная кампанія. Была таксама прынятая пастанова на працягу месяца сфармаваць рэгіянальныя выбарчыя камісіі, а з 1 красавіка пачаць фармаваньне ўчастковых камісіяў.

У ходзе першага паседжаньня Цэнтравыбаркаму была дасягнутая згода па адным з найважнейшых пытаньняў — пытаньні аб фінансаваньні выбарчай кампаніі. Дарма што Канстытуцыяй 1994 году прадугледжвалася толькі бюджэтнае фінансаваньне, у сувязі зь немагчымасьцю выкарыстоўваць бюджэтныя сродкі было вырашана праводзіць выбары за кошт добраахвотных ахвяраваньняў і з гэтай мэтай стварыць спэцыяльны фонд.

Падзеі, зьвязаныя з ініцыятывай дэмакратычных сілаў правесьці прэзыдэнцкія выбары, не засталіся незаўважанымі па-за межамі краіны. 17 студзеня, пасьля больш як паўгадовай адсутнасьці** ў Менск вярнуліся паслы заходніх дзяржаваў. А 18 студзеня ў Менск прыбыла спэцыяльная кансультацыйна-наглядальная група АБСЭ пад кіраўніцтвам Адрыяна Севярына. Група правяла сустрэчы як з прадстаўнікамі апазыцыі — кіраўнікамі ВС 13 скліканьня, так і з прадстаўніком беларускіх уладаў — намесьнікам міністра замежных справаў Сяр-

* Падставай для хадатайніцтва адвакатаў Старавойтава была заключэньне мэдычнай камісіі, што Старавойтаў па стане здароўя (тубэркулёз лімфавузлоў, атэрасклероз галаўнога мозгу, ішэмічная хвароба сэрца, перанесены інсульт) ня можа адэкватна ўспрымаць разбор справы.

** Канфлікт быў выкліканы парушэньнямі беларускімі ўладамі ў 1998 годзе ўмоваў Венскай Канвэнцыі аб дыпляматычнай дзейнасьці.

геем Мартынавым. У апошні дзень візыту, 19 студзеня, група сустрэлася зь сьпікерам ВС 13 скліканьня Сямёнам Шарэцкім, экс-прэм’ер-міністрам Міхаілам Чыгіром і старшынём Цэнтравыбаркаму Віктарам Ганчаром. Факт сустрэчы афіцыйных прадстаўнікоў АБСЭ з прадстаўнікамі Вярхоўнага Савету, апазыцыйнага Цэнтравыбаркаму і асабіста Міхаілам Чыгіром, які яшчэ пры канцы 1998 году абвясьціў аб сваім жаданьні змагацца за прэзыдэнцкую пасаду на выбарах 1999 году, быў зынтэрпрэтаваны як знак падтрымкі ініцыятывы правядзеньня альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі з боку міжнароднай супольнасьці, пацьвердзіў нязьменнасьць пазыцыі Захаду што да прызнаньня дзейным Асноўным Законам Беларусі Канстытуцыю 1994 году і адзіным легітымным заканадаўчым органам — Вярхоўны Савет.

Гэтыя сустрэчы выклікалі нэгатыўную рэакцыю з боку ўладаў. Прычым на гэты раз Лукашэнка выказаў сваю незадаволенасьць пазыцыяй Захаду ня толькі праз хвалю прапаганды з боку сваіх СМІ. 20 студзеня Югаславіі быў прадастаўлены статус наглядальніка пры Парлямэнцкай Асамблеі Саюзу Расіі і Беларусі. Гэты крок, улічваючы верагодную эскаляцыю балканскага крызысу, быў пакліканы прадэманстраваць Захаду волю беларускіх уладаў аказаць рэжыму Мілошавіча ня толькі дыпляматычную падтрымку.

Характар палітыкі Лукашэнкі (як і якога-любя іншага кіраўніка дзяржавы), яго разуменьне пэрспэктываў разьвіцьця ўнутры- і вонкавапалітычнай сытуацыі заўсёды яскрава адлюстроўваюцца ў адпаведнай кадравай палітыцы. 20 студзеня 1999 году шэфам службы бясьпекі прэзыдэнта быў прызначаны палкоўнік міліцыі Ўладзімер Навумаў. Да свайго прызначэньня У. Навумаў камандаваў аддзелам спэцыяльнага прызначэньня Міністэрства ўнутраных справаў «Алмаз». Ніколі яшчэ чалавек з МУС не надзяляўся такой пасадай. Да прызначэньня У. Навумава службай бясьпекі прэзыдэнта кіраваў палкоўнік КДБ, камандзір аддзелу спэцыяльнага прызначэньня КДБ «Альфа» Юры Бародзіч. Акурат яго падначаленыя былі галоўнай ударнай сілай пры правядзеньні ў красавіку 1995 году акцыі супраць галадуючых дэпутатаў ВС. Прызначэньне У. Навумава і пасьлейшая ратацыя ў службу бясьпекі прэзыдэнта супрацоўнікаў «Алмазу» сьведчыла аб тым, што Лукашэнку спатрэбілася іншая служба бясьпекі. Ён рыхтаваўся да падзеяў, зьвязаных з сканчэньнем тэрміну яго паўнамоцтваў у ліпені 1999 году. Яму была патрэбна адпаведная каманда, здольныя выканаць любую, самую брудную і, пры неабходнасьці, крывавую працу. Лукашэнку былі патрэбныя такія кадры, якія пойдуць зь ім да канца.

Тым часам Захад пасьлядоўна праводзіў сваю палітыку: 25 студзеня КНГ АБСЭ распаўсюдзіла заяву аб сваем стаўленьні да прызначаных Лукашэнкам на сакавік 1999 году выбараў у мясцовыя Саветы: «Палажэньні Закону аб выбарах дэпутатаў у мясцовыя Саветы ня могуць забясьпечыць правядзеньня свабодных і справядлівых выбараў».

30 студзеня адбыты ў Менску Кангрэс дэмакратычных сілаў прыняў рэзалюцыю пра поўную падтрымку прэзыдэнцкіх выбараў 16 траўня 1999 году. Гэта падзея мела ключавое значэньне для кансалідацыі дэмакратычнага лягеру (партыяў, прафсаюзаў, грамадзкіх ініцыятываў) напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў. Рэакцыя ўладаў ня змусіла доўга чакаць: 1 лютага была абвешчана перарэгістрацыя палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. На пасаду кіраўніка камісіі па перарэгістрацыі быў прызначаны стары русафіл Уладзімер Замяталін. Тым самым улада дала зразумець, што зарукай пасьпяховай перарэгістрацыі для палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў будзе няўдзел у альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбарах.

Неўзабаве кампанія рэжыму супраць арганізацыі прэзыдэнцкіх выбараў перайшла ў іншае

поле. 3 лютага В.Ганчар заявіў, што з рэгіёнаў прыходзіць шмат зьвестак аб тым, што мясцовыя аддзяленьні банкаў адмаўляюцца пераводзіць грошы на рахунак Цэнтравыбаркаму, які быў разьмешчаны ў камэрцыйным банку «Прыёрбанк». На запыт Цэнтравыбаркаму ў юрыдычны аддзел НББ быў дадзены адказ, што «блякаваньне рахунку парушае заканадаўства».

8 лютага Лукашэнка ажыцьцявіў яшчэ адну кадравую зьмену: на пасаду міністра ўнутраных справаў быў прызначаны былы камандуючы ўнутранымі войскамі Юры Сівакоў. Ён зьмяніў на гэтай пасадзе генэрал-лейтэнанта Валянціна Агальца, які займаў яе ажно тры з палавінай гады. Гэта была ня менш знакавая кадравая перастаноўка, чым прызначэньне на пасаду шэфа службы бясьпекі У. Навумава. На месца адданага рэжыму Агальца быў прызначаны генэрал, здольны ня проста выконваць волю прэзыдэнта, але і праяўляць падчас гэтага «творчую ініцыятыву»*. Сваёй новай пасадай Сівакоў быў збольшага абавязаны падтрымцы асобы з найбліжэйшага атачэньня Лукашэнкі — Віктара Шэймана, пад кіраўніцтвам якога Ю. Сівакоў працаваў у Радзе бясьпекі да таго, як узначаліў унутраныя войскі. Шэйман добра ведаў Сівакова яшчэ з канца 80-х гадоў (тады маёр Шэйман, як і Сівакоў, служыў у Берасьці). Сівакоў яшчэ ў 1995 годзе заслужыў давер Лукашэнкі: акурат ён узначаліў у верасьні 1995 году дзяржаўную камісію па расьсьледаваньні інцыдэнту зь зьбітым паветраным шарам і пагібельлю амэрыканскіх аэранаўтаў і, натуральна, вінаватых не знайшоў. Навумаў і Сівакоў не былі адзінымі прадстаўнікамі новай хвалі прызначэнцаў Лукашэнкі на кіраўнічыя пасады ў праваахоўных органах. Адбыліся кадравыя зьмены і ў кіраўніцтве КДБ: яшчэ 20 студзеня на пасаду намесьніка старшыні КДБ быў прызначаны былы старшыня Гарадзенскага ўпраўленьня КДБ Уладзімер Мацюшка.

З прызначэньнем Сівакова канчаткова акрэсьлілася пазыцыя Лукашэнкі і яго атачэньня што да альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. Пры існай унутрыпалітычнай сытуацыі нельга было сьцьвярджаць, што «раскрутка» альтэрнатыўнай выбарчай кампаніі зможа прывесьці да зьмены ўлады ў Беларусі: у Лукашэнкі на той час было значна больш рэсурсаў для ўтрыманьня ўлады, чымся ў яго апанэнтаў для яе здабыцьця. Але, тым ня менш, ні сам Лукашэнка, ні яго дараднікі не маглі сабе дакладна ўявіць, наколькі неабходна будзе змабілізаваць даступныя ім рэсурсы для захаваньня ўлады. Уплыў шэрагу фактараў рабіў магчымым разьвіцьцё ўнутрыпалітычнай сытуацыі ў Беларусі ў неспрыяльным для аўтарытарнай улады кірунку:

— была відавочнай кансалідацыя апазыцыйных сілаў вакол ідэі правядзеньня альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў;

— ўсё больш было сымптомаў блізкога пагаршэньня эканамічнай сытуацыі ў Беларусі: стан эканомікі краіны ў значнай ступені залежаў ад эканамічнай сытуацыі ў Расіі, якая была асноўным гандлёвым партнэрам Беларусі. Расійскі дэфолт жніўня 1998 г. моцна ўдарыў па беларускай эканоміцы;

— сканчэньне тэрміну прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі пры рэзкім пагаршэньні эканамічнай сытуацыі ў краіне давала дэмакратычным сілам актыўную падтрымку з боку прафсаюзаў. Пры нявыгадным для рэжыму разьвіцьці сытуацыі на вуліцы разам з апазыцыяй маглі б выйсьці рабочыя буйных прадпрыемстваў — тады для ўлады ўтрымаць сытуацыю пад кантролем было б дастаткова складана**.

* Падчас працы ў Радзе бясьпекі Сівакоў выступаў з прапановай стварэньня нацыянальнай гвардыі. Калі б яго праект быў зрэалізаваны, яе можна было б хутчэй назваць «прэзыдэнцкай гвардыяй».

** Акурат тады пачалося збліжэньне паміж дэмакратычнай апазыцыяй і прафсаюзамі: адным з кіраўнікоў рэспубліканскага прафсаюзу прадпрымальнікаў быў сябра БНФ Арнольд Пячэрскі.

Такім чынам, недзе на пачатку лютага ўладай быў выбраны курс на жорсткае здушэньне альтэрнатыўнай выбарчай кампаніі. 9 лютага адбылося паседжаньне Рады бясьпекі, на якім былі вызначаныя адказныя асобы за рэалізацыю захадаў супраць альтэрнатыўнай выбарчай кампаніі і зацьверджаныя паўнамоцтвы каардынатара правядзеньня контразахадаў — дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі Шэймана. Напярэдадні гэтага паседжаньня быў прызначаны міністрам ўнутраных справаў Сівакоў — яму адводзілася роля аднаго з асноўных выканаўцаў гэтых захадаў.

На наступны дзень, 10 лютага, «засьвяціліся» некаторыя зь іншых удзельнікаў паседжаньня. У гэты дзень у этэры Беларускага тэлебачаньня старшыня Дзяржаўнага камітэту ў справах друку Міхаіл Падгайны зрабіў прыкладна наступную заяву: «СМІ, якія заклікацьмуць да ўдзелу ў прэзыдэнцкіх выбарах 16 траўня, будзе выносіцца папярэджаньне Дзяржаўнага камітэту ў справах друку. Другое папярэджаньне будзе азначаць закрыцьцё СМІ». Падгайны падкрэсьліў, што «СМІ ў Беларусі павінны прытрымлівацца палажэньняў Канстытуцыі 1996 году». Другая заява была зроблена Генэральным пракурорам Алегам Бажэлкам падчас інтэрвію журналістам беларускіх СМІ. Ён заявіў, што «дзейнасьць парушальнікаў Канстытуцыі (дэпутатаў Вярхоўнага Савету — арганізатараў прэзыдэнцкіх выбараў. — *Рэд.*) будзе апэратыўна вывучацца, і калі будуць высьветленыя факты парушэньня дзейнага заканадаўства, будуць узбуджацца адміністрацыйныя і крымінальныя справы».

Такім чынам, зрыў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў ператварыўся ў адну з мэтаў дзяржаўнай палітыкі. На паседжаньні Рады бясьпекі 9 лютага былі вызначаныя сфэры кампэтэнцыі, абмеркаваныя мэханізмы супрацоўніцтва і каардынацыі дзейнасьці адказных асобаў і ўзначальваных імі ведамстваў. Можна гаварыць аб такім раскладзе:

Сівакоў (МУС) — беспасярэдняе правядзеньне комплексу захадаў, накіраваных як супраць арганізатараў, так і актывістаў кампаніі апазыцыі па правядзеньні прэзыдэнцкіх выбараў.

Мацкевіч (КДБ) — збор інфармацыі аб плянах арганізатараў прэзыдэнцкіх выбараў, разьмеркаваньні функцыяў паміж дэмакратычнымі арганізацыямі Беларусі й іх структурамі пры правядзеньні захадаў гэтай кампаніі, сувязях ініцыятараў прэзыдэнцкіх выбараў з прадстаўнікамі міжнародных арганізацый і палітычнымі коламі краінаў Захаду. Маніторынг разьвіцьця ўнутры- і вонкавапалітычнай сытуацыі ў кантэксьце альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў і сканчэньня тэрміну прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі паводле Канстытуцыі 1994 году.

Бажэлка (Генэральная пракуратура) — узбуджэньне крымінальных справаў у дачыненьні да арганізатараў прэзыдэнцкіх выбараў, забесьпячэньне «правільнасьці» разгляду гэтых справаў у судовых органах.

Падгайны (Дзяржаўны камітэт у справах друку) — забесьпячэньне інфармацыйнай падтрымкі захадаў, скіраваных на зрыў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў.

Замяталін (намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, адказны за працу Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, іншых дзяржаўных СМІ) — плянаваньне і правядзеньне інфармацыйнай вайны супраць ініцыятараў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. Як кіраўнік дзяржаўнай камісіі па перарэгістрацыі палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, Замяталін быў адказны таксама за стварэньне «адпаведных» умоваў перарэгістрацыі, адказваў за працу Міністэрства юстыцыі ў гэтым кірунку.

Падзеі, якія адбыліся адразу пасьля гэтага, адназначна ўказваюць на скаардынаваную працу дзяржаўных органаў для зрыву альтэрнатыўнай прэзыдэнцкай кампаніі.

11 лютага ў Гомелі пасьля сходу актывістаў дэмакратычных палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў, на якім абмяркоўваліся пытаньні правядзеньня выбараў, супрацоўнікамі міліцыі быў праведзены шэраг затрыманьняў. Затрыманыя абвінавачваліся ў правядзеньні несанкцыянаванага сходу. 12 лютага ў Гомелі супрацоўнікі міліцыі і КДБ на падставе «інфармацыі» аб замінаваньні будынку правялі ператрусы ў памяшканьні гомельскай філіі праваабарончай арганізацыі «Беларускі Гельсынскі камітэт». Выбухоўкі не знайшлі, затое канфіскавалі больш за 14 тысяч улётак з інфармацыяй пра выбары прэзыдэнта 16 траўня.

Крыху пазьней хваля рэпрэсіяў абрынулася на дэмакратычныя арганізацыі Гарадзеншчыны: былі праведзены ператрусы ў памяшканьні грамадзкага аб'яднаньня «Ратуша», гарадзенскага прафэсійнага саюзу прадпрымальнікаў, рэдакцыі газэты «Пагоня». Тут супрацоўнікі міліцыі і КДБ не абмежаваліся канфіскацыяй улётак, але і забралі кампутарнае абсталяваньне гэтых арганізацыяў.

Тым ня менш, 24 лютага старшыня ЦВК В. Ганчар паведаміў аб стварэньні тэрытарыяльных — абласных і раённых — выбарчых камісіяў. Наступным этапам працы Цэнтравыбаркаму было абвешчана ўтварэньне ўчастковых выбарчых камісіяў. Гэты этап быў самым складаным для рэалізацыі. Перад ЦВК стаяла заданьне ўва ўмовах усё больш жорсткіх рэпрэсіяў арганізаваць працу некалькіх тысячаў такіх участкаў і прыцягнуць каля 10 тысячаў актывістаў.

У адказ на гэта раніцай 25 лютага Цэнтравыбаркам у поўным складзе быў затрыманы сіламі міліцыі па абвінавачаньні ў правядзеньні несанкцыянаванага сходу. Гэтая акцыя ўлады выклікала неадкладную рэакцыю міжнароднай супольнасьці. У той самы дзень прадстаўнік Дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША зрабіў жорсткую заяву: «Злучаныя Штаты зь вялікай занепакоенасьцю ўспрынялі вестку аб сёньняшнім арышце праваахоўнымі органамі старшыні Цэнтравыбаркаму В. Ганчара, а таксама іншых сяброў камісіі». У заяве было адзначана, што «канстытуцыйныя рознагалосьсі — гэта беспасярэдні вынік незаконнага рэфэрэндуму 1996 году» і што «беларускі Канстытуцыйны Суд прызнаў рэфэрэндум 1996 году неканстытуцыйным, а Злучаныя Штаты, Эўрапейскі Зьвяз, тройка АБСЭ і Парлямэнцкая асамблея, а таксама большая частка міжнароднай супольнасьці не прызналі яго вынікаў. Нягледзячы на гэта, прэзыдэнт Лукашэнка выкарыстаў рэфэрэндум для пашырэньня сваіх паўнамоцтваў і працягу на два гады тэрміну свайго знаходжаньня на пасадзе».

Вэрбальны двубой міжнароднай супольнасьці і беларускага рэжыму працягваўся. У той жа дзень, 25 лютага, старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў у міжнародных справах Аляксандар Козыр заявіў аб намеры беларускага боку пастаўляць узбраеньні ў «братнюю» Югаславію. Паводле яго словаў, 3 сакавіка ў Менск прыбудзе з афіцыйным візытам міністар замежных справаў Югаславіі, падчас перамовінаў зь якім плянуецца ўкласьці пагадненьне аб пастаўках узбраеньняў. Беларускія ўлады пачынаюць выкарыстоўваць балканскі крызыс для аказаньня *ўплыву на пазыцыю Захаду ў «беларускім пытаньні»*.

Затрыманьне сябраў Цэнтравыбаркаму раніцай 25 лютага было перадусім акцыяй застрашэньня. Акурат таму на іх затрыманьне былі кінутыя непрапарцыйна вялікія для такой акцыі сілы міліцыі. Лукашэнка (які быў у той час у Маскве) назваў затрыманьне «памылкай». Вечарам 25 лютага В. Ганчара і яго калегаў адпусьцілі.

У сувязі з рэпрэсіямі Цэнтравыбаркам быў вымушаны паскорыць правядзеньне кампаніі. 1 сакавіка Цэнтравыбаркам зарэгістраваў ініцыятыўныя групы экс-прэм'ера Міхаіла Чыгіра і лідэра БНФ Зянона Пазьняка па вылучэньні кандыдатаў у прэзыдэнты. Ініцыятыўная група кожнага кандыдата складала каля 3 тысячаў чалавек. З моманту рэгістрацыі ініцыятыўным

групам была дадзена права зьбіраць подпісы ў падтрымку сваіх кандыдатаў. Адразу пасьля гэтага супрацоўнікі міліцыі затрымалі і гэтым разам моцна зьбілі Ганчара.

3 сакавіка, як і плянавалася, адбыўся афіцыйны візыт у Беларусь міністра замежных спраў Югаславіі Жывадзіна Ёванавіча. Ён быў дэманстрацыйна прыняты на найвышэйшым узроўні — прэзыдэнтам Лукашэнкам, дзяржаўным сакратаром Рады бясьпекі Шэйманам і міністрам замежных справаў Уралам Латыпавым. Замежныя і беларускія СМІ асабліва падкрэсьлілі, што адбылася сустрэча Ёванавіча зь міністрам абароны Беларусі генэралам Чумаковым. У выніку перамовінаў быў падрыхтаваны праект дамовы аб аказаньні рэжыму Мілошавіча ваенна-тэхнічнай дапамогі. Згодна зь ім, беларускі бок абавязаўся прадставіць вытворчыя магутнасьці і спэцыялістаў Барысаўскага танкарамонтнага заводу для мадэрнізацыі югаслаўскай танкавай тэхнікі і ажыцьцявіць падрыхтоўку югаслаўскіх вайскоўцаў у галіне супрацьпаветранай абароны на базе Ваеннай акадэміі Беларусі.

Тым часам Ганчар у зьняволеньні трымаў сухую галадоўку. На сёмы дзень нейкія людзі ў масках (верагодна, супрацоўнікі службы бясьпекі прэзыдэнта) прымусова ўлілі В. Ганчару ў рот 400 грамаў глюкозы. У апошні дзень зьняволеньня, 10 сакавіка 1999 г., старшыня Цэнтравыбаркаму на 3 гадзіны быў зьмешчаны ў карцэр — халодную камэру ў лёхах турмы.

Пакуль Ганчар сядзеў у турме, пасольства Злучаных Штатаў распаўсюдзіла спавешчаньне аб стане правоў чалавека ў Беларусі за 1998 год. У ім зноў была пацьверджана нязьменнасьць пазыцыі ЗША што да рэфэрэндуму 1996 году, а таксама было адзначана, што прадстаўнікі сілаў бясьпекі маюць беспасярэдняе дачыненьне да шматлікіх парушэньняў правоў чалавека. У адной з сваіх наступных заяваў па Беларусі дзярждэп ЗША прызнаў дэпутатаў ВС 13 скліканьня Ўладзімера Кудзінава і Андрэя Клімава, а таксама старшыню калгасу «Расьсьвет» Васіля Старавойтава, якія былі асуджаныя па чыста крымінальных артыкулах, вязьнямі сумленьня. Прынцыповая пазыцыя міжнароднай супольнасьці прымусіла ўладу адмовіцца ад правядзеньня хвалі шырокамаштабных рэпрэсіяў супраць апазыцыі.

У хуткім часе дэмакратычныя сілы Беларусі атрымалі падтрымку і з боку эўрапейскай супольнасьці. 11 сакавіка Эўрапейскі Парлямэнт аднагалосна прыняў жорсткую рэзалюцыю пра сытуацыю ў Беларусі. У ёй было выказана патрабаваньне правесьці свабодныя і справядлівыя выбары да таго моманту, калі скончыцца тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта Лукашэнкі. Эўрапарлямэнт заклікаў забясьпечыць пры правядзеньні прэзыдэнцкіх выбараў усе стандарты АБСЭ, спыніць крымінальны перасьлед і запалохваньне апазыцыйных сілаў, «якія займаюцца падрыхтоўкай законнай кампаніі выбараў прэзыдэнта».

У абарону кіраўніка ЦВК В. Ганчара выступілі Дзяржаўны дэпартамэнт ЗША, а таксама старшыня АБСЭ міністар замежных справаў Нарвэгіі Кнут Волебэк. *Amnisty International* абвясьціла Ганчара вязьнем сумленьня.

Збор подпісаў за вылучэньне кандыдатаў у прэзыдэнты сутыкнуўся з актыўным супрацьдзеяньнем уладаў. У этэры Беларускага тэлебачаньня прайшоў шэраг прапагандысцкіх перадачаў, у якіх на зборшчыкаў подпісаў «палявалі» супрацоўнікі міліцыі.

Наступны ўдар быў нанесены найбуйнейшым дэмакратычным палітычным партыям і недзяржаўным грамадзкім арганізацыям Беларусі, дзякуючы рэсурсам і ўдзелу якіх праводзілася гэтая кампанія. 15 сакавіка Міністэрства юстыцыі вынесла афіцыйныя папярэджаньні БНФ, АГП, Беларускаму Гельсынскаму камітэту. Цяпер, у адпаведнасьці з заканадаўствам, зьявілася юрыдычная падстава для адмовы гэтым арганізацыям у перарэгістрацыі. Зачэпкай для папярэджаньняў сталася «незаконная» дзейнасьць гэтых арганізацыяў што да правяд-

зеньня альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. На стан 15 сакавіка Дзяржаўны камітэт у справах друку вынес папярэджаньні за інфармацыйную падтрымку выбараў больш як 10 незалежным беларускім СМІ.

Адзначаючы абвастрэньне ўнутрыпалітычнай сытуацыі, 15 сакавіка кіраўнік місіі АБСЭ ў Менску Ганс-Георг Вік выступіў з прапановай пераадоленьня канстытуцыйнага крызысу шляхам правядзеньня перамовінаў паміж уладай і дэмакратычнай апазыцыяй паводле формулы «чатыры плюс адзін». Згодна зь ёй, з аднаго боку, у перамовінах мае ўдзельнічаць Аляксандар Лукашэнка, з другога — старшыня ВС 13 скліканьня Сямён Шарэцкі, старшыня ЦВК Віктар Ганчар, а таксама кандыдаты ў прэзыдэнты — Зянон Пазьняк і Міхаіл Чыгір.

У адказ Міністэрства замежных справаў пацьвердзіла «неаднаразова заяўленую гатоўнасьць ураду Беларусі да дыялёгу з апазыцыяй і зацікаўленымі міжнароднымі арганізацыямі». Аднак бакі — місія АБСЭ, якая дзейнічала зь ведама старшыні АБСЭ Кнута Волебэка, і прадстаўнікі беларускага ўраду — у чарговы раз разышліся ў поглядах на юрыдычныя падставы перамовінаў. Ганс-Георг Вік нагадаў, што рэфэрэндум 1996 году, як гэта і было пазначана ў бюлетэнях для галасаваньня, меў не абавязковы, а кансультацыйны характар, і тым самым паставіў пад сумнеў вынікі рэфэрэндуму. У той жа час прадстаўнікі беларускага ўраду ў чарговы раз нагадалі пра гатоўнасьць улады весьці перамовы толькі на падставе «адназначных» вынікаў рэфэрэндуму 1996 году.

На гэтым фоне абвастраецца балканскі крызыс. У сярэдзіне сакавіка безвынікова скончыліся перамовіны ў Рамбуе паміж югаслаўскай дэлегацыяй і прадстаўнікамі міжнароднай супольнасьці. Гэтая падзея аб'ектыўна пайшла на карысьць Лукашэнку, значна пашырыла прастору для яго гульні ў Беларусі і за яе межамі*. Беларускаму кіраўніцтва стала ясна, што:

1) Улічваючы сымпатыі насельніцтва Беларусі да сэрбаў**, кампанію Захаду супраць рэжыму Мілошавіча можна будзе прадставіць акурат як агрэсію супраць сэрбскага народу, стварыць імідж ЗША, НАТО і іншых вонкавапалітычных апанэнтаў рэжыму як агрэсараў, якія «імкнуцца да сусьветнай гегемоніі і таму ненавідзяць незалежную, свабодалюбівую палітыку прэзыдэнта Лукашэнкі».

2) Значна павялічваюцца магчымасьці для вядзеньня інфармацыйнай вайны супраць дэмакратычных сілаў Беларусі праз прэзэнтацыю іх як «пятай калёны» «натаўскіх агрэсараў».

3) Падзеі ў Югаславіі выклікаюць выбух зацікаўленьня з боку насельніцтва Беларусі (чаму ўсяляк спрыяцьме ўлада), што дазволіць канчаткова інфармацыйна задушыць кампанію апазыцыі па выбарах прэзыдэнта.

4) Расія будзе імкнуцца выкарыстаць канфлікт вакол Косава для рэваншу за кампанію

* Аб уплыве міжнароднай сытуацыі на палітычны працэс у Беларусі сьведчыць і месца, якое ў тагачаснай структуры ўлады займаў міністар замежных справаў Урал Латыпаў, былы палкоўнік КДБ, чалавек з найбліжэйшага Лукашэнкавага атачэньня. Адначасова Латыпаў займаў пасаду дарадніка прэзыдэнта і адзін з усіх міністраў меў статус віцэ-прэм'ера. Гэтага чалавека можна назваць «шэрым кардыналам» беларускай палітыкі: яго ўплыў на Лукашэнку, на працэс прыняцьця палітычных рашэньняў у Беларусі быў вельмі значны.

** Беларусь знаходзіцца ў зоне інфармацыйнага ўплыву Расіі. Расійскія СМІ, перш за ўсё электронныя, маюць значны ўплыў на фармаваньне грамадзкай думкі ў Беларусі. Дзяржаўныя беларускія СМІ ў асьвятленьні падзеяў міжнароднага жыцьця зазвычай ідуць у рэчышчы пазыцыі «братняй Расіі». Таму не выпадкова, што, напрыклад, першая расійска-чачэнская вайна, у ходзе якой было забіта, толькі паводле расійскіх зьвестак, каля 25 тысячаў мірных жыхароў, ня выклікала такой нэгатыўнай рэакцыі ў беларускага грамадзтва, як кампанія НАТО супраць рэжыму Мілошавіча, у ходзе якой страты сярод мірнага насельніцтва склалі некалькі соцень чалавек.

Захаду супраць парушэньня правоў чалавека ў часе расійска-чачэнскай вайны 1994-1995 гадоў, паспрабуе ізноў заявіць сьвету аб сабе як [былой] супэрдзяржаве, з пазыцыяй якой трэба лічыцца. Гэта азначае, што вартасьць адзінага расійскага саюзьніка — Лукашэнкі — для Расіі рэзка падвысіцца. Расія ў агляднай пэрспэктыве ні пры якіх умовах ня «здасьць» Лукашэнку.

Улада зразумела, што балканскі крызыс поўніцай разьвязвае ёй рукі ў адносінах з дэмакратычнай апазыцыяй. 16 сакавіка, на наступны дзень пасьля заявы кіраўніка місіі АБСЭ, у кватэру старшыні ЦВК ўварваліся блізка дзесяцёх супрацоўнікаў міліцыі і КДБ. Падчасператрусу былі канфіскаваныя матэрыялы, зьвязаныя зь дзейнасьцю ЦВК. «Дасягненьні» праваахоўных органаў у зрыве альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў былі адзначаныя Лукашэнкам. 23 сакавіка яго ўказам была нададзеная годнасьць генэрала першаму намесьніку міністра ўнутраных справаў Міхаілу Ўдавікову і начальніку Ўпраўленьня ўнутраных справаў Гомельскага аблвыканкаму Віталю Апанасевічу. Незалежныя СМІ адзначылі цікавы факт: калі М. Удавікоў атрымаў годнасьць генэрал-маёра адпаведна пасадзе, то В. Апанасевіч стаў адзіным зь міліцэйскіх начальнікаў абласной рангі, хто быў уганараваны ёй. Прычына гэтага навідавоку: аналіз падзеяў, зьвязаных з правядзеньнем альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў, не пакідае сумневу, што акурат у Гомельскай вобласьці перасьлед апазыцыянэраў набываў найбольш радыкальныя формы.

Тым ня менш, у прызначаны ЦВК тэрмін, 31 сакавіка, ініцыятыўныя групы кандыдатаў у прэзыдэнты — лідэра БНФ Зянона Пазьняка і экс-прэм'ера Міхаіла Чыгіра прадставілі неабходную для рэгістрацыі колькасьць подпісаў. Кожны прэтэндэнт атрымаў падтрымку каля 130 тысяч грамадзянаў краіны. У той жа дзень ЦВК прыняў пастанову аб рэгістрацыі кандыдатаў. У адпаведнасьці зь ёй, з 1 красавіка распачыналася перадвыбарная кампанія. Тым часам Зянон Пазьняк вымушана знаходзіўся за мяжой, а дзяржаўныя СМІ неаднаразова нагадвалі пра намер улады арыштаваць лідэра найбуйнейшай апазыцыйнай партыі адразу пры яго перасячэньні дзяржаўнай мяжы Беларусі. Каб стварыць кандыдатам «роўныя магчымасьці», улады 1 красавіка пайшлі на арышт Міхаіла Чыгіра. Экс-прэм'ер быў абвінавачаны па чыста крымінальных артыкулах у «эканамічных злачынствах», учыненых, нібыта, у 1993–1994 гг., калі Чыгір узначальваў камэрцыйны «Белаграпрамбанк» (артыкул 91 Крымінальнага кодэксу «крадзеж у асабліва буйных памерах» і 166 «злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі»).

Арышт кандыдата ў прэзыдэнты выклікаў нэгатыўную рэакцыю міжнароднай супольнасьці. Першы сакратар пасольства ЗША ў Беларусі Даяна Максэй выступіла з афіцыйнай заявай, у якой яшчэ раз нагадала, што «дэмакратычны мандат» Лукашэнкі выгасае 20 ліпеня 1999 году, і заклікала беларускага прэзыдэнта зьдзейсьніць пазытыўныя крокі для разьвязаньня гэтай праблемы шляхам дыялёгу з апазыцыяй.

Беларускі рэжым адрэагаваў на гэта гучнай вонкавапалітычнай акцыяй. 8 красавіка Слабадан Мілошавіч зьвярнуўся да кіраўнікоў Саюзу Расіі і Беларусі з просьбай прыняць у яго склад Югаславію і адразу атрымаў запэўніваньні, што яго просьба будзе разгледжана падчас найбліжэйшай сустрэчы Ельцына і Лукашэнкі. 14 красавіка, падчас бамбардаваньня НАТО Югаславіі, Лукашэнка дэманстрацыйна ляціць у Бялград да «славянскага брата» Слабадана.

Адносіны Беларусі з Захадам працягвалі пагаршацца. 20 красавіка намесьнік дзяржаўнага сакратара ЗША Строўб Тэлбат сустрэўся зь міжнародным каардынатарам грамадзкай ініцыятывы «Хартыя'97» Андрэем Саньнікавым. 27–28 красавіка Менск наведалі кіраўнікі

дэпартамэнтаў МЗС Нямеччыны (Кляўс Нойбэрт), Аўстрыі (Ёзэф Мітшаўэр) і Фінляндыі (Рэнэ Нібэрг). У першы дзень візыту яны сустрэліся зь міністрам замежных справаў Уралам Латыпавым і кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта Міхаілам Мясьніковічам. У другі — з прадстаўнікамі апазыцыі: старшынём ВС Сямёнам Шарэцкім, выканаўцам абавязкаў старшыні БНФ Лявонам Баршчэўскім і старшынём АГП Станіславам Багданкевічам.

Эўрапейскія дыпляматы далі зразумець прадстаўнікам Лукашэнкі, што ратыфікацыя дамовы паміж Эўрапейскім Зьвязам і Беларусяй аб партнэрстве і супрацоўніцтве, а таксама ўкладаньне часовага гандлёвага пагадненьня будуць магчымымі толькі пры ўмове адмовы беларускіх уладаў ад рэпрэсіяў у дачыненьні да ініцыятараў і актывістаў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў, а таксама ад зацягваньня перарэгістрацыі палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Прадстаўнікі міжнароднай супольнасьці настойвалі на вызваленьні палітычных вязьняў (сярод якіх быў названы і Міхаіл Чыгір) і на правядзеньні дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй без аніякіх папярэдніх умоваў.

Сам Лукашэнка ў гэты час знаходзіўся ў Маскве. 28 красавіка адбылася яго сустрэча зь Ельцынам. Расійскі прэзыдэнт адмовіўся разглядаць просьбу Мілошавіча. Апрача гэтага, Масква, не вагаючыся, адкінула беларускі плян стварэньня саюзнай дзяржавы з пасадай саюзнага прэзыдэнта і навязала Лукашэнку свой — з абраньнем саюзнага парлямэнту зь мінімальнымі паўнамоцтвамі.

Тым часам у Беларусі арганізатары альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў здолелі стварыць сетку выбарчых участкаў. У сувязі зь немагчымасьцю арганізаваць стацыянарныя выбарчыя ўчасткі Цэнтравыбаркам пастанавіў правесьці галасаваньне з 6 па 16 траўня шляхам абыходу выбарцаў. Стала ясна, гэтыя выбары не адпавядаюць стандартам АБСЭ і запрасіць на іх міжнародных назіральнікаў ня ўдасца. Разьлічваць на міжнароднае прызнаньне кандыдата, які атрымае найбольшую колькасьць галасоў, прэзыдэнтам Беларусі таксама не выпадала. Міжнароднай супольнасьцю была прызнана легітымнай адно сама кампанія дэмакратычных сілаў па правядзеньні прэзыдэнцкіх выбараў.

Улада прыклала максымум намаганьняў, каб умовы правядзеньня выбараў з 6 па 16 траўня паставілі пад сумнеў вышэйазначаную пазыцыю міжнароднай супольнасьці. Галасаваньне праводзілася ў самых экстрэмальных умовах. Лідэр БНФ Зянон Пазьняк адмовіўся ад удзелу ў выбарах ужо пасьля пачатку галасаваньня. Да таго ж, увечары 7 траўня бясьсьледна зьнік адзін зь лідэраў дэмакратычнай апазыцыі — былы міністар унутраных справаў Юры Захаранка.

19 траўня былі падведзеныя вынікі прэзыдэнцкіх выбараў. Паводле зьвестак старшыні ЦВК Віктара Ганчара, выбары адбыліся — у іх узялі ўдзел каля 53% беларускіх выбарцаў. Але назваць пераможцу Ганчар ня змог.

Выбарчая кампанія 1999 г., па сутнасьці, ператварылася ў палітычную акцыю, дзякуючы якой дэмсілы яшчэ раз нагадалі беларускім грамадзянам аб неабходнасьці глыбокіх дэмакратычных ператварэньняў усяго грамадзтва на падставе Канстытуцыі 1994 году. Нягледзячы на рэпрэсіі з боку ўлады*, разьвязаную ёй інфармацыйную вайну супраць апазыцыі, правядзеньне альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў істотна актывізавала беларускае грамадзтва.

Вынікам прэзыдэнцкіх выбараў 1999 году таксама сталіся *якасныя зьмены* ў лягеры дэ-

* За дзейнасьць, зьвязаную з правядзеньнем альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў, да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасьці ў краіне было прыцягнута каля 2000 чалавек.

макратычнай апазыцыі. Іншымі словамі, адбыўся раскол сярод беларускіх дэмакратычных сілаў, а таксама зьмяненьне палітычнага статусу некаторых буйных беларускіх палітыкаў.

17 траўня лідэр БНФ Зянон Пазьняк выступіў з рэзкай крытыкай дзейнасьці старшыні Цэнтравыбаркаму Віктара Ганчара і самога ЦВК. Іншыя лідэры БНФ — Вінцук Вячорка, Лявон Баршчэўскі, Юры Хадыка — фактычна дыстанцыяваліся ад выказваньняў свайго паплечніка па БНФ. Узьніклы крызыс у БНФ скончыцца ўвосень расколам гэтай партыі на дзьве структуры — Кансэрватыўна-Хрысьціянскую партыю БНФ пад кіраўніцтвам Пазьняка і партыю БНФ пад кіраўніцтвам Вячоркі. Дзейнасьць жа самога Вярхоўнага Савету будзе дэзарганізавана ад'ездам старшыні ВС 13 скліканьня Шарэцкага ў Літву. Выконваць абавязкі старшыні ВС узяўся В. Ганчар. Яго зьнікненьне 16 верасьня 1999 г. фактычна паклала канец гэтай структуры.

## СЫСТЭМА ЎЛАДЫ І СЫСТЭМА АПАЗЫЦЫІ ПАСЬЛЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНЫХ ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 1999 ГОДУ

Палітычную сытуацыю, якая склалася ў Беларусі пры канцы траўня 1999 году пасьля заканчэньня кампаніі альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў, можна ацаніць як патавую. З аднаго боку, палітычныя апанэнты Лукашэнкі выкарысталі фактычна ўсе даступныя на той час магчымасьці аказаньня ціску на ўладу і тым ня менш не змаглі пахіснуць палітычных пазыцыяў дыктатара. З другога боку, беларускі прэзыдэнт выкарыстаў увесь арсэнал сродкаў барацьбы з апазыцыяй і тым ня менш не дасягнуў вырашальнага посьпеху ў барацьбе з дэмакратычнымі сіламі. Разам з тым, альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары акрэсьлілі асноўных удзельнікаў палітычнай гульні ў Беларусі. Дзеля яе геапалітычнага становішча яны не абмяжоўваюцца ўнутранымі палітычнымі актарамі. Удзельнікаў палітычнай гульні тут ня два, а чатыры: улада, апазыцыя, Захад і Расія.

Падтрымка беларускіх дэмакратычных сілаў з боку Захаду ў значнай ступені абумовіў арсэнал сродкаў, якія выкарыстоўвае беларускі рэжым у барацьбе са сваімі палітычнымі апанэнтамі. Але пры ўсёй моцы сваіх геапалітычных уплываў Захад не стварыў эфэктыўных вагароў узьдзеяньня на беларускі рэжым.

Маштаб расійскай падтрымкі рэжыму Лукашэнкі таксама ня ёсьць сталай велічынёй і залежыць ад бягучых палітычных канстэляцый. Напрыклад, пры канцы траўня 1999 г. расійскі істэблішмэнт, сур'ёзна заклапочаны інтэграцыйнымі ініцыятывамі Лукашэнкі, пайшоў на беспрэцэдэнтны акт націску на беларускі рэжым: энэргетычны расійскі манапаліст, РАО «ЕЭС Расіі», паведаміў аб скарачэньні паставак электраэнэргіі ў Беларусь; газавы расійскі манапаліст, кампанія «Газпром», пастанавіла скараціць пастаўкі газу. Лукашэнку далі зразумець, што пастаўляць электраэнэргію і энэрганосьбіты ў Беларусь па ўнутраных расійскіх цэнах ніхто ня будзе.

Гэтая пазыцыя зусім не азначала, што Крэмль жадае паспрыяць зьмене ўлады ў Беларусі: Лукашэнка задавальняў Расію. Яе пазыцыя тлумачылася і тым, што ў 1999 годзе ў Расіі пасьлядоўна зьмяніліся тры ўрады: Прымакова, Сьцяпашына і, у рэшце рэшт, Пуціна. Падрыхтоўка расійскім кіраўніцтвам другой чачэнскай кампаніі толькі павялічвала зацікаўле-

насьць Расіі ў Лукашэнку. Ува ўмовах ціску з боку Захаду (ад заяваў пра парушэньні правоў чалавека да пагрозаў прыняцьця эканамічных санкцыяў) Расіі былі б вельмі выгадныя катэгарычныя заявы беларускага прэзыдэнта аб падвоеных стандартах заходняй палітыкі або аб пастаноўцы на баявое дзяжурства пад Віцебскам палка расійскіх міжкантынэнтальных балістычных ракет «Тополь-М» у адказ на пашырэньне НАТО на ўсход…

На прасторы СНД інтарэсы Расіі, як правіла, уваходзілі ў супярэчнасьць з інтарэсамі ЗША, а ў меншай ступені — з інтарэсамі іншых дзяржаваў Захаду. Падтрымкай Лукашэнкі, паўнамоцтвы якога з 21 ліпеня 1999 году станавіліся для Захаду нелегітымнымі, Расія на прасторы СНД стварала важны для сваёй вонкавай палітыкі прэцэдэнт. *Прэзыдэнт краіны, якая ўваходзіць у СНД, непрызнаны зь якіхсьці прычынаў Захадам, можа атрымаць падтрымку Расіі пры ўмове правядзеньня прарасійскай палітыкі, выкарыстаць гэты рэсурс для таго, каб захаваць уладу*.

У сытуацыі заканчэньня тэрміну сваіх легітымных паўнамоцтваў прэзыдэнт Лукашэнка чакаў ад Расіі падтрымкі, якая для атаесамлялася зь пераходам на новы віток інтэграцыі ў межах беларуска-расійскага саюзу (і, тым самым, катэгарычным прызнаньнем прэзыдэнтуры Лукашэнкі Расіяй) і аднаўленьнем у ранейшым аб'ёме паставак энэрганосьбітаў у Беларусь (заданьнем-максымум тут было зьніжэньне на іх цэнаў*).

Стратэгічнай мэтай Лукашэнкі было захаваньне ўлады, нягледзячы на пэрспэктыву непрызнаньня легітымнасьці ўлады з боку ўнутрыпалітычнага апанэнта — апазыцыі — і вонкавапалітычнага апанэнта — прыхільнага да дэмакратычнай апазыцыі Захаду. Дасягненьне гэтай мэты прадугледжвала актыўныя, прадуманыя дзеяньні на ўсіх трох франтох — што да Расіі, дэмакратычнай апазыцыі і Захаду. У выпадку іх посьпеху рэжым мог ня толькі абараніць свае пазыцыі, але і аслабіць у краіне пазыцыі сваіх апанэнтаў.

Сканчэньне прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі паводле Канстытуцыі 1994 году, устрыманьне Крамля ад актыўнай падтрымкі беларускага рэжыму, магчымая актывізацыя дэмакратычнай апазыцыі, пасьлядоўная пазыцыя Захаду, пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ўвесну-ўлетку 1999 году і, як вынік, рост сацыяльнай напружанасьці — усё гэта падштурхоўвала Лукашэнку да перамовінаў. Пры гэтым Лукашэнка разумеў пад перамовінамі не дасягненьне пагадненьня паміж бакамі пры іх гатоўнасьці ісьці на ўзаемныя саступкі, а працэс абмену думкамі, каб выйграць час, узмацніць свае пазыцыі. Звыш таго, Лукашэнку ўдалося навязаць выгадны яму фармат перамовінаў не апошнюю чаргу дзякуючы фактару бягучага палітычнага моманту, бо дэмакратычная апазыцыя выйшла аслабленай з альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. Яна ня мела дастаткова моцных пазыцыяў, каб быць паўнапраўным суб'ектам перамовінаў і каб прымусіць рэжым выканаць дасягнутыя пагадненьні.

Пасьля правядзеньня альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў найбуйнейшыя палітычныя партыі БНФ і АГП апанаваў крызыс. Яго прычынай стала ацэнка вынікаў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў, дзейнасьці Цэнтравыбаркаму і яго старшыні. Пасьля расколу ў БНФ 25 траўня адбыўся раскол у АГП. Сябра кіруючага органу АГП — Палітсавету — В. Ганчар быў паддадзены вострай крытыцы. Старыя лідэры партыяў, Зянон Пазьняк і Станіслаў Баг-

* Энэргетычныя выдаткі ўваходзяць у склад сабекошту кожнага прадукту вытворчасьці. Беларуская эканоміка, арыентаваная на выпуск канцавога прадукту, мае энэрга- і матэрыялаёмісты характар. Зьнізіць энэргетычныя выдаткі — значыць, зьменшыць сабекошт прадукцыі, павысіць яе канкурэнтаздольнасьць. Для Лукашэнкі гэта значыла атрымаць неабходныя рэсурсы для таго, каб стабілізаваць альбо палепшыць эканамічную сытуацыю, зьменшыць незадаволенасьць насельніцтва як сваім эканамічным становішчам, так і палітычным курсам.

данкевіч, гублялі падтрымку значнай колькасьці сяброў сваіх партыяў. Пазыцыя З. Пазьняка што да выбараў 1999 году стала каталізатарам унутранага крызысу ўзначаленай ім партыі.

Ідучы на перамовіны з апазыцыяй, Лукашэнка і яго атачэньне *implicite* перасьледавалі наступныя заданьні:

1) Падштурхнуць апазыцыю да далейшага расколу. Апазыцыя раскалолася ў пытаньні ацэнкі правядзеньня альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. Падтрымка ўладай ідэі перамоваў і разрэклямаваная гатоўнасьць улады ісьці на дыялёг з апазыцыяй можа выклікаць чарговы раскол у стане дэмакратычных сілаў — на гэты раз у пытаньні стаўленьня да перамовінаў.

2) Ажыцьцявіць апэратыўны маніторынг бягучага стану апазыцыйных сілаў. Высьветліць пазыцыю апазыцыйных сілаў што да парлямэнцкіх выбараў 2000 году. Вызначыць групу гатовых да супрацоўніцтва з уладай апазыцыйных палітыкаў і прэзэнтаваць іх грамадзтву спачатку як «канструктыўную апазыцыю», каб пасьля падмяніць апазыцыю яе «канструктыўнай» часткай. Шляхам інфармацыйнай кампаніі выціснуць радыкальных праціўнікаў рэжыму на пэрыфэрыю палітычнай сцэны.

3) Напярэдадні тэрміну заканчэньня прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі пазбавіць апазыцыю фармальнай падставы для таго, каб вывесьці людзей на вуліцы; дэзарганізаваць частку грамадзтва, схільную да рашучых дзеяньняў на баку апазыцыі.

Апрача гэтага, перамовіны давалі ўладзе магчымасьць зьнізіць рэзананс у беларускім грамадзтве факту непрызнаньня Захадам законнасьці паўнамоцтваў Лукашэнкі пасьля 20 ліпеня. Для бальшыні беларускіх грамадзянаў перамовіны ўлады і апазыцыі пры пасярэдніцтве Захаду азначалі прызнаньне існага ў Беларусі рэжыму.

З моманту свайго заснаваньня ў 1997 годзе Кансультацыйна-наглядальная група АБСЭ ў Менску не спыняла спробаў пасадзіць бакі беларускага ўнутрыпалітычнага канфлікту за стол перамовінаў. На працягу першага кварталу 1999 году КНГ АБСЭ пад кіраўніцтвам Г.Г. Віка разам зь Дзярждэпартамэнтам ЗША і спэцыяльнай місіяй АБСЭ пад кіраўніцтвам А. Севярына неаднаразова заклікалі ўладу пайсьці на перамовіны з апазыцыяй. На гэта афіцыйныя беларускія прадстаўнікі адказвалі, што перамовіны магчымыя толькі пры ўмове прызнаньня ўдзельнікамі перамоўнага працэсу Канстытуцыі 1996 году, што рабіла іх бессэнсоўнымі. Аднак зь цягам часу пазыцыя беларускіх уладаў пачала мяняцца. Стваралася ўражаньне, што беларускі прэзыдэнт і яго атачэньне шукаюць асобаў для такога далікатнага даручэньня, якім ёсьць перамовіны з апазыцыяй.

Яшчэ ў сьнежні 1998 году ў складзе вышэйшага эшалёну ўлады адбыліся два паказальныя прызначэньні. На пасаду міністра замежных справаў быў прызначаны У. Латыпаў, а дараднікам прэзыдэнта ў пытаньнях Расіі і СНД быў прызначаны Міхаіл Сазонаў*. Апошні меў рэпутацыю майстра палітычнай інтрыгі.

З прызначэньнем кадравага контравыведніка Латыпава тактыка ўлады што да апазыцыі і КНГ АБСЭ набыла новыя рысы. Некаторымі расійскамоўнымі недзяржаўнымі СМІ праводзіцца кампанія прамоцыі Латыпава: яго прызначэньне падаецца як прыкмета магчымых зьме-

* У 1995–1996 гг. М. Сазонаў займаў пасаду першага намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Паводле пэўных зьвестак, ён каардынаваў арганізацыйную працу што да забесьпячэньня «патрэбных» вынікаў рэфэрэндумаў траўня 1995 і лістапада 1996 гг. і меў беспасярэдняе дачыненьне да зрыву імпічмэнту Лукашэнку восеньню 1996 году. У пачатку 1997 г. М. Сазонаў сышоў зь вялікай палітыкі і заняўся нафтабізнэсам.

наў у вонкавай палітыцы рэжыму, надзвычай пазытыўна ацэньваецца сама асоба Латыпава. Сам Латыпаў робіць вельмі выверанымя крокі, каб узмацніць гэтае ўражаньне. У часе акцыі НАТО ў Югаславіі стрыманыя ацэнкі гэтай падзеі Латыпава выяўна кантрастуюць з эмацыйнымі інвэктывамі Лукашэнкі. На нейкі час ствараецца ўражаньне, што Лукашэнка ня толькі сам вызначае вонкавапалітычны курс Беларусі, але і сам яго рэалізуе насуперак волі свайго найбліжшага атачэньня. Латыпаў жа застаецца ў ценю.

Пры канцы красавіка, пасьля сустрэчы Латыпава і Мясьніковіча з эўрапейскімі дыплcom матамі, міжнароднай супольнасьці быў дадзены сыгнал: Латыпаў паспрыяў лібэралізацыі рэжыму перарэгістрацыі палітычных партый і грамадзкіх арганізацый. У адказ на заяву эўрапейскіх структураў аб неабходнасьці дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй без аніякіх папярэдніх умоваў з боку міністра замежных справаў Латыпава ніякіх катэгарычных адмоваў не прагучала. Заходняй дыпляматыі ўмела навязваўся пазытыўны імідж Латыпава.

Сытуацыя, якая склалася ў адносінах паміж прадстаўнікамі дэмсілаў і КНГ АБСЭ, стварала пагрозу расколу паміж імі. Настойлівасьць КНГ АБСЭ, якая ня бачыла альтэрнатывы перамовінам, магла пазбавіць беларускую апазыцыю спачуваньня і падтрымкі з боку Захаду. Дыстанцыя паміж апазыцыяй і Захадам, у сваю чаргу, была б на карысьць Лукашэнку. Урэшце, пасьля кансультацый прадстаўнікі КНГ АБСЭ і дэмсілаў сышліся ў тым, што нават пры правале перамовінаў гэта дазволіць яшчэ раз выявіць беларускаму грамадзтву сутнасьць існага рэжыму.

У чэрвені АБСЭ зрабіла першую спробу даць старт перамовам. На слуханьнях у «беларускім пытаньні», праводжаных Парлямэнцкай Асамблеяй АБСЭ з 11 па 13 чэрвеня ў Бухарэсьце, былі запрошаныя прадстаўнікі, з аднаго боку, апазыцыйных палітычных партыяў, ВС 13 скліканьня, трэцяга сэктару, з другога боку — улады*. Аднак прынялі запрашэньне толькі прадстаўнікі «дэмакратычнага» боку. Рэжым яшчэ ня быў гатовы да перамовінаў, ня меў прадуманага пляну дзеяньняў. Гэтым крокам беларускае кіраўніцтва таксама дало зразумець ініцыятарам перамовінаў, што яны будуць магчымыя толькі на падкантрольнай рэжыму тэрыторыі.

Гульня лукашэнкаўцаў пачалася толькі на пачатку ліпеня. 2 ліпеня ў Менску на сэсіі Парлямэнцкага Сходу Саюзу Беларусі і Расіі Лукашэнка выступіў зь беспрэцэдэнтна рэзкай крытыкай Расіі, абвінаваціў кіраўніцтва гэтай дзяржавы ў грубым парушэньні саюзных дамоваў. 3 ліпеня Лукашэнка пацьвердзіў курс на паляпшэньне адносінаў з Захадам. 5 ліпеня міністар замежных справаў Латыпаў правёў брыфінг, на якім растлумачыў сутнасьць зьменаў у вонкавай палітыцы Беларусі: краіна ня можа заставацца па-за інтэграцыйнымі працэсамі ў Эўропе, таму будуць зробленыя крокі для нармалізацыі адносінаў з Захадам. У сувязі з гэтым найбліжэйшым заданьнем МЗС Беларусі будзе ўкладаньне пагадненьня з Эўрапейскім Зьвязам аб партнэрстве, а таксама часовага пагадненьня аб гандлёвым супрацоўніцтве. Пры гэтым Латыпаў адзначыў, што Расія застаецца стратэгічным партнэрам Беларусі. Такім чынам, ужо на пачатку гульні сталі бачнымі ролі, разьмеркаваныя сярод лукашэнкаўцаў. Асноўным актарам стаў дыплямат з кадэбісцкім мінулым Латыпаў, які рабіў заявы аб магчымых зьменах «у прававой сыстэме Беларусі» і аб гатоўнасьці «прэзыдэнта да адкрытай, сумленнай перадвыбарнай барацьбы».

* Плянавалася, што тэмамі дыскусіяў паміж прадстаўнікамі апазыцыі, трэцяга сэктару і ўлады стануць праблемы заканадаўчай улады, СМІ і выбараў.

7–8 ліпеня сэсія ПА АБСЭ, адбытая ў Пецярбурзе, прыняла рэзалюцыю, у якой выказала чарговы заклік да ўлады і апазыцыі ў Беларусі сесьці за стол перамовінаў. 15 ліпеня Лукашэнка даў згоду на сустрэчу з кіраўніком спэцыяльнай рабочай групы АБСЭ А. Севярынам і кіраўніком місіі АБСЭ ў Менску Г.Г. Вікам. Лукашэнка пагадзіўся пачаць перамоўны працэс з апазыцыяй наконт (1) распрацоўкі заканадаўства для правядзеньня свабодных, справядлівых выбараў, якія будуць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю, (2) доступу апазыцыі да СМІ, (3) вызначэньня паўнамоцтваў будучага парлямэнту. 21 ліпеня міжнародныя арганізацыі, у тым ліку АБСЭ, заявілі, што тэрмін легітымных прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі выгас.

Палітычны спэктакль працягваўся. 21 і 27 ліпеня апазыцыя чарговага разу прадэманстравала сваю слабасьць, вывеўшы ў Менску на дэманстрацыі супраць улады Лукашэнкі толькі 10–15 тысячаў чалавек. 6 жніўня Лукашэнка прызначыў М. Сазонава кіраўніком групы па падрыхтоўцы дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй. У першым жа сваім інтэрвію Сазонаў адзначыў, што Канстытуцыя 1996 году ня можа быць прадметам перамовінаў, ня можа быць і гаворкі аб прэзыдэнцкіх выбарах раней за 2001 год: гэта катэгарычная пазыцыя прэзыдэнта Лукашэнкі. Тэмай перамовінаў могуць быць толькі пытаньне доступу апазыцыі да дзяржаўных СМІ, а таксама абмеркаваньне ўжо падрыхтаванага ўладамі праекту Выбарчага кодэксу.

Такім чынам, яшчэ да фармаваньня дэлегацыяў, *якія павінны былі прадстаўляць на перамовінах бок улады і бок апазыцыі*, стала ясна іх поўная беспэрспэктыўнасьць (хаця сам зь сябе перамоўны працэс выклікаў вялікі розгалас у беларускім грамадстве*).

18 жніўня апазыцыя вызначылася з кандыдатурамі, якія павінны былі прадстаўляць яе на перамовінах з уладай. Імі сталі палітыкі другога пляну — намесьнікі старшыняў, сябры кіруючых органаў дэмакратычных арганізацыяў: Юры Беленькі (ад БНФ), Аляксей Кароль (ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада»), Алег Трусаў (ад Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады), Леанід Лемяшонак (ад Партыі працы і справядлівасьці), Алена Скрыган (ад Партыі камуністаў беларускай). Узначаліць дэлегацыю было даверана намесьніку старшыні АГП Анатолю Лябедзьку.

Сама колькасьць прадстаўнікоў кожнага боку — 6 чалавек — была абумоўлена пагадненьнем паміж Г.Г. Вікам і М. Сазонавым. Катэгарычнасьць, зь якой М. Сазонаў настойваў на лічбе 6, тлумачыцца вельмі проста: улада не губляла ніводнага шанцу, каб рукамі самой апазыцыі разваліць створаную ёй для вядзеньня перамовінаў кааліцыю. У Беларусі налічвалася мінімум 7 палітычных партыяў, якія прэтэндавалі на ролю «буйных». Акрамя адзначаных партыяў, у «сямёрку» ўваходзіла і Лібэральна-дэмакратычная партыя Сяргея Гайдукевіча. Прарасійскі палітык, шчыльна зьвязаны зь беларускімі спэцслужбамі, Гайдукевіч выконваў ролю «дадатковага» рупару ў інфармацыйнай кампаніі ўлады, накіраванай на дыскрэдытацыю апазыцыі як боку перамовінаў (гэтую ж самую функцыю ён выканаў і падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі 2001 году, калі на яе завяршальным этапе рэжым выкарыстоўваў Гайдукевіча як скандальнага правакатара супраць Уладзімера Ганчарыка).

Заявы Гайдукевіча, што сфармаваная дэлегацыя не адлюстроўвае ўсяго спэктру палітыч-

* Сама ідэя перамоваў была вельмі папулярнай сярод беларускага грамадзтва. Беларускія грамадзяне жадалі пацяпленьня палітычнага клімату. Згодна з вынікамі агульнанацыянальнага сацыялягічнага апытаньня, праведзенага НІСЭПД, 38,3% рэспандэнтаў выказаліся ў падтрымку перамовінаў паміж апазыцыяй і ўладай. 16,9% апытаных сьцьвердзілі, што весьці перамовы з Лукашэнкам бессэнсоўна.

ных партыяў, што «за бортам» апрача ЛДП апынуліся прафсаюзы, прымусілі Віка аказаць ціск на беларускіх дэмакратаў з мэтай тэрміновай карэкцыі складу дэлегацыі: адно месца з боку апазыцыі за сталом перамовінаў мусіла падлягаць ратацыі — яго па чарзе павінны займаць прадстаўнікі «сямёркі» палітычных партыяў.

«Прарыў» ЛДП у склад дэлегацыі значна зьменшыў эфэкт ад яе працы. Кожнае пасед-жаньне суправаджалася абвінавачаньнямі з боку Сяргея Гайдукевіча альбо яго паплечніка па партыі Аляксандра Рабатая ў адрас астатніх сяброў дэлегацыі ў «неканструктыўнасьці» іх пазыцыі. Заявы лідэраў ЛДП рэгулярна агучваліся дзяржаўнымі СМІ.

Дыялёг паміж уладай (якую прастаўляла група Сазонава*) і дэлегацыяй апазыцыі скончыўся дамоўленасьцяй стварыць у пачатку верасьня рабочую групу пад кіраўніцтвам прафэсара Міхаіла Пастухова для ажыцьцяўленьня доступу апазыцыі да дзяржаўных СМІ. Самой дэлегацыі апазыцыі было прапанавана падрыхтаваць свае заўвагі да праекту Выбарчага кодэксу, згодна зь якім увосень 2000 г. павінны былі адбыцца выбары ў парлямэнт.

Для працягу перамовінаў з рабочай групай М. Пастухова ўлады стварылі экспэртную групу пад кіраўніцтвам аднаго з галоўных ідэолягаў рэжыму — галоўным рэдактарам «Советской Белоруссии» Паўлам Якубовічам. З доўгімі і частымі перапынкамі дыялёг** аб умовах доступу апазыцыі да дзяржаўных СМІ вёўся да лютага 2000 году і, натуральна, ня меў ніякіх вынікаў. У лютым лукашэнкаўскі парлямэнт прыняў Выбарчы кодэкс. Яго прыняцьцё і пэрспэктыва правядзеньня парлямэнцкіх выбараў згодна з гэтым дакумэнтам азначала, што ў прызнаньні Захадам вынікаў парлямэнцкіх выбараў і тым самым у прызнаньні легітымнасьці парлямэнту новага складу рэжым не зацікаўлены. Пры гэтым Латыпаў і Сазонаў прыклалі максымум намаганьняў у гульні з дэмакратычнымі сіламі, каб апазыцыя ня выйшла раней часу зь «перамовінаў». Да канца сакавіка 2000 г. вялася млявая дыскусія наконт магчымасьці перапрацоўкі Выбарчага кодэксу на дэмакратычны лад.

Рэальная пазыцыя ўлады падштурхнула лідэраў дэмакратычных партыяў спыніць удзел у «перамовінах». БНФ і АГП, а таксама дэмакратычныя грамадзкія арганізацыі заявілі аб намеры арганізаваць байкот парлямэнцкіх выбараў.

Прынцыповая пазыцыя дэмсілаў была патрактаваная дзяржаўнымі СМІ як праява «незамірэнчасьці» апазыцыі, дзеля якой яна павінна пакінуць надзею вярнуцца ў «сыстэмную палітыку». У якасьці партыяў, якія прэзэнтаваліся грамадзтву як «канструктыўная апазыцыя», усё часьцей фігуравалі ЛДП, і рух «Яблык» пад кіраўніцтвам Вольгі Абрамавай, і, часткова, ПКБ. Акурат прадстаўнікі гэтых партыяў сядзелі за сталом «перамовінаў» да апошняга — да ліпеня 2000 г.

Прэзыдэнт Лукашэнка высака ацаніў дзейнасьць сваіх прадстаўнікоў на перамовінах. Пры канцы лістапада 2000 году «сілавіка» Шэймана на адной з ключавых у Беларусі службовых пасадаў — пасадзе Дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі — зьмяніў «дыплямат» Латыпаў. Пасьля выбараў 2001 г. ён пойдзе яшчэ далей і будзе прызначаны кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта.

* Апрача Сазонава ў групу ўваходзілі першы намесьнік дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі Віктар Новельскі, дырэктар Нацыянальнага цэнтру законапраектнай дзейнасьці Ігар Андрэеў, міністар юстыцыі Генадзь Варанцоў, намесьнік міністра замежных справаў Уладзімер Герасімовіч, дэпутат ПП НС Юры Кулакоўскі і будучы кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэньні Лукашэнкі ў кандыдаты ў прэзыдэнты Мікалай Чаргінец.

** Напрыканцы верасьня перамовіны былі пастаўленыя пад пытаньне пастановай суду ў справе палітычнага вязьня Андрэя Клімава, які быў прыгавораны да 6 гадоў пазбаўленьня волі.

Няўдача перамовінаў абумовіла і характар найбуйнейшай падзеі палітычнага жыцьця краіны ў 2000 годзе — кастрычніцкіх парлямэнцкіх выбараў. Дзякуючы сваёй недэмакратычнасьці яны не былі прызнаныя міжнароднай супольнасьцю.

Але стратэгічная мэта ўлады — пазбавіць дэмакратычную апазыцыю магчымасьці аказваць уплыў на палітычнае жыцьцё краіны, замяніць іх у вачах грамадзкасьці «канструктыўнай», гэта значыць падкантрольнай «апазыцыяй», — не была дасягнута.

Вынікі парлямэнцкіх выбараў пацьвердзілі правал гэтых плянаў. Кампанію дэмакратычных сілаў Беларусі, накіраваную на байкатаваньне недэмакратычных выбараў, можна назваць пасьпяховай. У буйных гарадох рэспублікі на выбары прыйшла толькі палова выбарцаў. На вялікай колькасьці выбарчых участкаў выбары не адбыліся. 54% тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі, выказалі ў ходзе сацыялягічных апытаньняў меркаваньне, што ўлада павінна выканаць патрабаваньне аб правядзеньні свабодных і справядлівых выбараў. Каля 22% удзельнікаў галасаваньня адзначылі сябе як перакананых праціўнікаў аўтарытарнага рэжыму.

Стварыць нават бачнасьць свабодных дэмакратычных выбараў, надзець дэмакратычнае адзеньне ўладзе не ўдалося.

Аўтарытарная ўлада не змагла задушыць дэмакратычны рух. Няздольная перамагчы ў адкрытай барацьбе, яна была вымушана наносіць удары цішком, плесьці павучыньне інтрыг.

## Мясцовыя выбары 1999 году

На выбарах 1999 году былі выкарыстаныя тэхналёгіі, апрабаваныя ўладамі ў 1995 годзе. Мясцовыя выбары 1995 году праводзіліся ўва ўмовах фармаваньня цэнтралізаванай сыстэмы выканаўчай улады, калі характэрныя рысы апалітычнага грамадзтва толькі пачалі складацца. 1999 год — гэта час усталяваньня сьпелага рэжыму, калі ў апазыцыі не засталося ілюзіяў наконт таго, што крайняя цэнтралізацыя ўлады — часовая зьява.

Выбары красавіка 1999 году былі першымі мясцовымі выбарамі, якія праводзіліся па правілах, якія ўсталявала цэнтральная ўлада. Вэртыкаль прэзыдэнцкай улады ў рэгіёнах, якую пачалі фармаваць у 1995 годзе, да 1999 году навучылася працаваць як добра наладжаны мэханізм. На працягу 1995—1999 гадоў прайшло некалькі хваляў ратацыяў, якія канчаткова вычысьцілі мясцовую ўладу ад нелаяльных элемэнтаў і зрабілі яе падпарадкаванай цэнтру ня толькі як структуры органаў, але і ў пляне пэрсанальнай лаяльнасьці кадраў.

Пры канцы 1998 году былі прынятыя папраўкі да закону «Аб выбарах у мясцовыя Рады». Міжнародная супольнасьць амаль адразу ж адзначыла іх неадпаведнасьць дэмакратычным нормам.

Мясцовыя выбары 1995 году праводзіліся згодна з Законам аб выбарах, які быў прыняты яшчэ ў савецкія часы. Пра значнасьць новага закону аб выбарах для кантролю над волевыяўленьнем сьведчыць тое, што ён уступіў у сілу 28 сьнежня 1998 году — за 4 дні пасьля таго, як указам прэзыдэнта ад 24 сьнежня быў прызначаны тэрмін выбараў. Дарма што закон быў прыняты фактычна пасьля пачатку выбараў і юрыдычна на іх не распаўсюджваўся,

выбары праводзіліся акурат па новым законе, што быў прыняты фактычна пасьля пачатку выбарчай кампаніі і зьнік пасьля яе сканчэньня.

Таксама як папярэднія выбары, мясцовыя выбары 1999 году супалі з правядзеньнем нацыянальных палітычных кампаніяў, якія так ці інакш уплывалі як на працэс выбараў, так і на яго вынікі.

Першая кампанія праводзілася ўладамі. 1 лютага 1999 году была распачатая перарэгістрацыя палітычных партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Старшынём камісіі па перарэгістрацыі быў прызначаны У. Замяталін. Сам факт перарэгістрацыі, а таксама асоба, якая была пастаўлена на яе чале, сьведчыць, што кампанія мела дэманстратыўна рэпрэсіўны характар.

Перарэгістрацыя праводзілася дзеля зьніжэньня дзеяздольнасьці альтэрнатыўных палітычных сілаў напярэдадні мясцовых выбараў. Але прызначэньне Замяталіна кіраўніком камісіі дазваляе зрабіць і іншыя высновы. Кампанія перарэгістрацыі была больш інфармацыйнай, чым функцыянальнай. Моцныя палітычныя партыі даволі проста праходзілі бар’ер у 1500 чальцоў, патрэбных для перарэгістрацыі. Але, як паказалі выбары 1995 году, партыйная ідэнтыфікацыя была другаснай па значнасьці ў параўнаньні з карпаратыўна-статуснай ідэнтыфікацыяй і дзейнічала толькі ў межах першай. Каб атрымаць патрэбны вынік выбараў, уладзе трэба было дэзарганізаваць, выдаліць з палітычнага поля больш небясьпечныя для карпаратыўнай дзяржавы ўстановы: грамадзкія аб’яднаньні. Але небясьпечнымі для выбараў былі не буйныя аб’яднаньні, накшталт буйных прафэсійных саюзаў.

У пасьлятаталітарным, расчараваным, апалітычным грамадзтве ідэнтыфікацыя зь вялікімі супольнасьцямі губляе сэнс. Пагрозу для ўлады на мясцовым узроўні складаюць акурат невялікія аб’яднаньні, якія ўзьнікаюць у межах працоўных адзінак і грунтуюцца на міжасабовых кантактах. Нават калі зьнікае давер да вялікіх ідэяў і вялікай грамадзкай супольнасьці, застаецца давер да інфармацыі ад сябра ці калегі па працы, да лякальнай супольнасьці, да лідэраў, якім бліжэйшыя і зразумельшыя мясцовыя праблемы і інтарэсы. Акурат альтэрнатыўныя дзяржаўным мікраарганізацыі ў межах прадпрыемстваў маглі б перашкодзіць вылучэньню і абраньню кандыдатаў па статусна-карпаратыўным прынцыпе, які ўлада мела магчымасьць кантраляваць.

Страх перад «лякальнымі» пратэстаміназіраецца і ў рашэньнях, прынятых мясцовымі органамі ўлады, якія абмяжоўвалі актыўнасьць грамадзянаў. Так, у лютым 1999 году Гомельскі аблвыканкам прыняў пастанову, якая абмяжоўвала правядзеньне мітынгаў, сходаў і пікетаў — мерапрыемстваў акурат лякальнага значэньня і ўплыву.

Закон аб выбарах, прыняты пры канцы 1998 году, ня толькі ўскладніў працэс вылучэньня кандыдатаў, але і ня вызначыў грамадзкіх аб’яднаньняў як арганізацыяў, якія маюць правы вылучаць кандыдатаў на мясцовых выбарах. Перарэгістрацыя партыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў, у выніку якой бар’ер праходзілі толькі буйныя партыі з колькасьцю сяброў больш за 1500 чалавек, пазбаўляла малыя грамадзкія аб’яднаньні магчымасьці набыць палітычны статус і такім чынам ажыцьцявіць уплыў на выбары. Аднак той самы закон надзяліў працоўныя калектывы правам вылучэньня кандыдатаў. Тым самым быў заканадаўча замацаваны мэханізм кантролю над выбарамі.

Згодна з рэзалюцыяй Кангрэсу рэспубліканскіх дэмакратычных сілаў, прынятай 23 сьнежня 1998 году, дэмакратычныя партыі адмовіліся браць удзел у мясцовых выбарах, бо «ў Беларусі адсутнічаюць умовы для правядзеньня свабодных і дэмакратычных выбараў»[1], і вылу-

[1] Народная Воля. 1999. 3 лютага.

чаць кандыдатаў. Адмова бальшыні палітычных партыяў ад удзелу ў выбарах мала зьмяняла сытуацыю функцыянальна, але стварала адпаведны інфармацыйны настрой: палітычная кампанія апазыцыі настройвала грамадзтва ня столькі супраць улады, колькі супраць палітыкі як такой. Партыйныя кандыдаты былі вылучаны толькі ад партыяў ЛДП і КПБ, ПНЗ, «Славянскі сабор». Але ЛДП пры канцы сакавіка заявіла аб зьняцьці сваіх кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі.

Другая кампанія праводзілася апазыцыяй. У ліпені 1999 году канчаўся вызначаны Канстытуцыяй 1994 году тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта А. Лукашэнкі. 10 студзеня дэпутаты ВС 13-га скліканьня на сваім сходзе пастанавілі прызначыць выбары прэзыдэнта на 16 траўня 1999 году. Была створана альтэрнатыўная ЦВК на чале з В. Ганчаром.

Сканцэнтраваўшы ўвагу дэмакратычна настроенай часткі грамадзтва на правядзеньні альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў і абвясьціўшы байкот выбарам мясцовым, апазыцыйныя сілы падкрэсьлілі сваё дыстанцыянаваньне ад уладаў і іх палітыкі. Альтэрнатыўныя прэзыдэнцкія выбары з самага пачатку мелі вельмі мала шанцаў на посьпех. Байкот мясцовых выбараў у СМІ з боку апанэнтаў рэжыму толькі спрыяў посьпеху цэнтралізаванага кантролю ўлады над вынікамі мясцовых выбараў. У традыцыях савецкага часу буйная агульнанацыянальная кампанія для апазыцыі аказалася больш значнай, чым рупатлівая праца з насельніцтвам у рэгіёнах.

Калі для выбараў 1995 году быў характэрны абсэнтэізм выбарцаў, то ў 1999-м адчуваўся дэфіцыт кандыдатаў. У краіне былі вылучаныя 27 362 кандыдаты, амаль у паўтара раза менш, чымся ў 1995-ым. Асноўная частка безальтэрнатыўных акругаў прыпала на сельскія і пасялковыя Рады.

Аналіз працэсу вылучэньня кандыдатаў паказвае, што ўрокі 1995 году былі добра засвоеныя ўладамі. Дарма што 55% кандыдатаў не займалі раней пасадаў у органах мясцовай улады, на іх чыніў значны палітычны ўплыў цэнтар. Калі на выбарах 1995 году дырэктарат складаў каля 50% ад агульнай колькасьці кандыдатаў у абласныя Рады, то на выбарах 1999-га яго прадстаўнікі склалі пераважную бальшыню кандыдатаў.

Так, у Гомельскай вобласьці 77,5% ад агульнай колькасьці кандыдатаў складалі прадстаўнікі дырэктарскага корпусу, у тым ліку 71,7% — «статусны» дырэктарат, 18% — прамысловы дырэктарат, астатнія — старшыні калгасаў. Працэнт інтэлігенцыі не перавышаў 6%, бізнэсоўцы складалі 3,31% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Нават прадстаўнікоў мясцовай улады было менш за 6%.

У Берасьцейскай вобласьці дырэктарат складаў 68,4% ад агульнай колькасьці кандыдатаў, у тым ліку «статусны» — 73,8%, прамысловы — 15% ад агульнай колькасьці дырэктарату. Інтэлігенцыя і бізнэсоўцы адпаведна — 10,2% і 6% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Колькасьць функцыянэраў мясцовых Радаў і выканкамаў складала 10,3%.

У Магілёўскай вобласьці колькасьць дырэктарату была 66,3% ад усіх кандыдатаў, у тым ліку колькасьць «статуснага» складала 71,4%, прамысловага — 20,6% ад дырэктарату. Прадстаўніцтва інтэлігенцыі не перавышала 9,5%, бізнэсоўцаў — 3,2% ад агульнай колькасьці кандыдатаў. У Магілёўскай вобласьці было найвышэйшае прадстаўніцтва кандыдатаў ад мясцовай палітычнай эліты — 16,8%.

У ніводным рэгіёне не было шмат прадстаўнікоў партыяў. Як і на мінулых выбарах, найбольш апартыйна сябе паводзіў дырэктарскі корпус. Камуністы павялі на выбары інтэлігенцыю, лібэральныя дэмакраты — бізнэсоўцаў. Але прадстаўніцтва і першых, і другіх было невысокім.

Такім чынам, выбары 1999 па складзе кандыдатаў былі апартыйнымі і збольшага «дырэктарскімі». Пераважная бальшыня кандыдатаў ад дырэктарату — «статусны» дырэктарат — была найбольш уразьлівай, у сэнсе залежнасьці ад уладаў, групай. Улічваючы яе залежнае становішча, можна лічыць, што кантроль над волевыяўленьнем быў распачаты яшчэ на этапе вылучэньня кандыдатаў.

Выбары'1999 былі не праведзеныя ўладамі, а хутчэй інсцэнаваныя імі ўва ўмовах апалітычнасьці насельніцтва і байкоту з боку бальшыні палітычных партыяў. Але нават арганізацыя выбараў згары не патрапіла пераадолець апалітычнасьці грамадзтва. На значнай частцы выбарчых участкаў праводзіліся безальтэрнатыўныя выбары. Так, падчас рэгістрацыі кандыдатаў на 20% участкаў выбараў у абласныя Рады ў кожнай вобласьці быў вылучаны толькі адзін кандыдат. У Магілёўскай вобласьці па адным кандыдату было вылучана больш як у 50% акругаў (32 з 60). З 32 безальтэрнатыўных кандыдатаў толькі адзін не прадстаўляў мясцовага дырэктарскага корпусу: Вадзім Папоў — першы намесьнік міністра сельскай гаспадаркі і харчаваньня. А пасьля таго, як ЛДП пры канцы сакавіка зьняла сваіх кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі, безальтэрнатыўных акругаў стала яшчэ больш.

Удзел у мясцовых выбарах меў ня надта вялікі сэнс з пункту гледжаньня барацьбы за ўладу. Мясцовыя Рады яе фактычна ня мелі. Але мясцовыя выбары 1999 году сталі першым агульнанацыянальным волевыяўленьнем пасьля таго, як у лістападзе 1996 году былі прынятыя зьмены ў Канстытуцыю 1994 году. Абвясьціўшы байкот гэтым выбарам, апазыцыйныя палітычныя партыі фактычна далі ўладам час бескантрольна патрэнавацца ў тэхналёгіях арганізацыі выбараў: арганізацыі вылучэньня кандыдатаў, датэрміновага галасаваньня, апрацоўкі насельніцтва і кантролю над волевыяўленьнем. Так, па прызнаньні Аляксандра Пласкавіцкага, старшыні праўнай управы АП, дзякуючы «тлумачальнай рабоце» на выбары плянавалася прыцягнуць 70—80% выбарцаў. Згодна з інфармацыяй ЦВК, ужо на 1 красавіка датэрмінова прагаласавала 2,05% выбарцаў. У выніку, напрыклад, у Гарадзенскай вобласьці датэрмінова прагаласавалі 23%.

Апазыцыйныя сілы адмовіліся ня толькі ад удзелу ў выбарах, але і ад назіраньня за іх ходам. Назіраньне за ходам выбараў ажыцьцяўлялася пераважна замежнымі назіральнікамі. Кансультацыйна-назіральная група АБСЭ спачатку не зьбіралася пасылаць назіральнікаў, але 31 сакавіка заявіла аб удзеле ў назіраньні 16 чалавек, а напярэдадні выбараў павялічыла іх колькасьць да 34. Таксама напярэдадні выбараў хадайніцтва аб удзеле ў назіраньні заявілі амбасады Нямеччыны і Чэхіі. ПКБ паабяцала вылучыць 1200 чалавек дзеля паралельнага падліку галасоў, але не зрабіла гэтага.

Узровень яўкі пацьвердзіў прагнозы ўлады: на выбары прыйшло 66,3% выбарцаў. Найвышэйшая яўка назіралася ў Гарадзенскай вобласьці — 75,6%, найменшая — у Менску. Але з тых, хто прыйшоў на выбарчыя ўчасткі, «за» ці «супраць» якога-небудзь кандыдата свае галасы аддалі толькі 67,6%. Фактычна сваю волю выказалі 44,8% ад агульнай колькасьці выбарцаў. Гэта, дарэчы, адпавядае ўзроўню палітычнага ўдзелу на мясцовых выбарах 1995 году. Астатнія выбарцы не акрэсьлілі сваіх пазыцыяў.

Але мясцовыя выбары ня маюць такой вялікай сымбалічнай значнасьці, як, напрыклад, прэзыдэнцкія ці парлямэнцкія. На агульнанацыянальных выбарах галасаваньне супраць усіх кандыдатаў найчасьцей адлюстроўвае пратэст супраць рэжыму. Апазыцыйныя сілы ясна вызначылі стратэгію дзеяньняў на мясцовых выбарах для пратэставага электарату — выбарам быў абвешчаны байкот. Таму паводзіны 32,4% выбарцаў можна растлумачыць ці вельмі

вялікім жаданьнем выразіць пратэст супраць палітыкі ўвогуле, ці наяўнасьцю пазапалітычнага адміністрацыйна-карпаратыўнага прымусу ў арганізацыі яўкі на выбарчыя ўчасткі. Першы варыянт малаверагодны з прычыны адносна невялікай сымбалічнай значнасьці мясцовых выбараў. Імавернасьць наяўнасьці карпаратыўнага прымусу павялічвае падкантрольнае становішча «статуснага» кіраўніцтва, удзел якога вызначыў ход і вынікі выбараў.

На карысьць гэтага меркаваньня сьведчыць і надзвычай нізкі ўзровень галасаваньня ў другім туры. «За» ці «супраць» аднаго з кандыдатаў прагаласавалі ў другім туры 45,6% выбарцаў. Такім чынам, больш за 50% выбарцаў прыйшлі толькі затым, каб ува ўмовах абвешчанага апазыцыяй байкоту засьведчыць сваю яўку на выбарчы ўчастак. Як і на мінулых выбарах, найменшы ўдзел у галасаваньні ўзялі жыхары буйных населеных пунктаў, дзе наведаньне выбараў цяжка пракантраляваць. Але розьніца паміж узроўнем палітычнага ўдзелу ў гарадох і па-за іх межамі стала яшчэ цямчэйшай. Так, у Берасьцейскай вобласьці гарадзкая Рада была абрана толькі ў Кобрыне — адносна невялікім горадзе, але былі сфармаваныя ўсе раённыя, пасялковыя і сельскія Рады. Найменшая колькасьць дэпутатаў была абраная ў Берасьці, Пінску і Баранавічах — найбуйнейшых гарадох вобласьці. У Віцебскай вобласьці найменшы палітычны ўдзел назіраўся ў Віцебску і Наваполацку. У Гарадзенскай вобласьці — у Горадні, Лідзе і Слоніме.

Ход выбараў 1999 году абумовіў іх вынікі. У адрозьненьне ад выбараў 1995, у 1999 годзе склад абраных дэпутатаў адпавядаў складу кандыдатаў, якія ішлі на выбары. Але і ў гэтых умовах існавалі больш уплывовыя групоўкі, якія, нягледзячы на адносна невялікае прадстаўніцтва сярод кандыдатаў, атрымалі значную колькасьць дэпутацкіх мандатаў. Сярод абраных дэпутатаў абсалютную бальшыню склалі прадстаўнікі «статуснага» дырэктарату. Найбольш моцныя пазыцыі займалі прадстаўнікі выканаўчых органаў і кіраўнікі прадстаўнічых органаў мясцовай улады. У Берасьцейскай вобласьці з 15 кандыдатаў, вылучаных ад гэтай групоўкі ў абласную Раду, прайшлі ўсе. У Гомельскай вобласьці зь дзевяцёх кандыдатаў ад выканкамаў і былых старшыняў Радаў, прайшлі пяцёра. Найменш пераможцаў у параўнаньні з прадстаўніцтвам сярод кандыдатаў у дэпутаты мелі інтэлігенты, чыя колькасьць на выбарах у абласную Раду не перавышала 1-2 чалавек ува ўсіх абласьцях. Дэпутацкія мандаты па астатніх групоўках разьмеркаваліся раўнамерна, адпаведна ўзроўню прадстаўніцтва іх чальцоў сярод кандыдатаў.

Дарма што намінальны ўзровень яўкі выбарцаў у 1999 годзе быў вышэйшы за папярэднія выбары, рэальная колькасьць тых, хто прагаласаваў, не адрозьнівалася ад 1995 году і не перавышала 50% ад агульнай колькасьці выбарцаў. Гэта сьведчыць аб устойлівай апалітычнасьці грамадзтва ды невялікай цікавасьці да прадстаўнічых органаў мясцовай улады. Гэтыя рысы характэрныя для палітычнай культуры постсавецкай Беларусі.

Ужываньне цэнтралізаванага рэсурсу дазволіла ня толькі ўзьняць узровень яўкі на выбарах да 66%, але і сфармаваць мясцовыя органы прадстаўнічай улады. У Беларусі сфармавалася спэцыфічная сыстэма прадстаўніцтва, арганізацыі і правядзеньня выбараў, абумоўленая двума фактарамі. Па-першае, апалітычнасьцю грамадзтва і адсутнасьцю агульнапрызнаных грамадзкіх аб'яднаньняў. Па-другое, палітычнай заангажаванасьцю ня толькі мясцовых палітычных, але і мясцовых эканамічных элітаў.

Дзеля гэтага ў палітыцы на мясцовым узроўні ўтварылася «зачараванае кола». Кантроль над мясцовай эканамічнай і палітычнай элітай дазваляе цэнтральнай уладзе мабілізаваць насельніцтва. Пагаджаючыся на невялікія, на першы погляд, саступкі ў ажыцьцяўленьні функ-

цыяў палітычнай мабілізацыі, мясцовая эліта трапляе ў яшчэ большую залежнасьць ад цэнтральнай улады, таму што здабыты ёю такім чынам палітычны статус не дае гарантыяў асабістай бясьпекі ў стасунках з цэнтрам, бо здабыцьцё гэтага статусу санкцыянавана і арганізавана самім гэтым цэнтрам.

## Высновы

Ход і вынікі мясцовых выбараў паказваюць, што, нягледзячы на апалітычнасьць грамадзтва і адсутнасьць асабістых палітычных інтарэсаў, мясцовыя ўлады і мясцовыя эліты ў Беларусі не знаходзяцца па-за палітыкай. Абраўшы ў палітыцы ролю слабога і пагадзіўшыся на выкананьне другасных функцыяў, яны сталі значным зьвяном у ланцугу падтрыманьня цэнтралізаванай улады. І гэтая роля выконваецца імі насуперак асабістым інтарэсам. Неарганізаванасьць і нявызначанасьць пазыцыяў не дазваляе ім парваць гэты ланцуг.

# ВЫБАРЫ Ў ПАЛАТУ ПРАДСТАЎНІКОЎ 2000 Г.

## Апошняя Вярхоўная Рада

Калі вяртаешся да падзеяў 1995–1996 гг., пачынаеш верыць у тое, што лік 13 на самай справе нешчасьлівы. Менавіта на гэтым ліку спынілася дзейнасьць беларускай Вярхоўнай Рады. Тыя падзеі амаль дзесяцігадовай даўніны сталі асновай для падзеяў сёньняшніх. Беларусь перад правядзеньнем выбараў дэпутатаў апошняй Вярхоўнай Рады амаль год пражыла пад кіраўніцтвам першага прэзыдэнта.

Кожнаму вядомая значнасьць кампаніі, калі фармуецца адзін з цэнтральных органаў улады. Плян кіраўніцтва выканаўчай улады не прадугледжваў абраньня моцнага прадстаўнічага органу, у якім дэпутатамі былі б прадстаўнікі розных палітычных сілаў, чые погляды не адпавядалі поглядам кіраўніка дзяржавы. Таму выканаўчая ўлада зрабіла ўсё, што змагла, каб сарваць тыя выбары. Гэта паказалі вынікі: на 260 дэпутацкіх месцаў у траўні 1995 г. было абрана толькі 120 дэпутатаў. Вынікі рэфэрэндуму, які праходзіў адначасова з выбарамі, паказваюць, што актыўнасьць выбарнікаў была ня вельмі дрэнная — амаль 65 %. І гэта пры тым, што пытаньні рэфэрэндуму не былі вырашальнымі для Беларусі і яе жыхароў. Несумненна, што пры адпаведнай інфармацыйнай падтрымцы неабходная колькасьць дэпутатаў была б выбраная. Зьяўленьне Вярхоўнай Рады можна лічыць хутчэй недарэчнасьцю, чым заканамернасьцю: яна была выбраная насуперак дзеяньням выканаўчай улады. Чаго вартая заява кіраўніка дзяржавы аб тым, што ён ня пойдзе на выбары, таму што яны (дэпутаты) усё роўна падмануць!

Адсутнасьць неабходнай колькасьці дэпутатаў для скліканьня першага пасяджэньня Вярхоўнай Рады выклікала неабходнасьць працягу паўнамоцтваў Вярхоўнай Рады 12-га скліканьня. Пакуль новы склад Вярхоўнай Рады ня быў сфармаваны, краіна не магла існаваць без прадстаўнічага органу ўлады. Такім жа чынам не пакідаюць сваіх крэслаў міністры пасьля рос-

пуску кабінэту, пакуль ня будзе сфармаваны новы склад ураду. Тым ня менш, былі зробленыя захады для прызнаньня нелегітымнасьці дванаццатай Вярхоўнай Рады. Але Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусі 11 кастрычніка 1995 г. пастанавіў, што паўнамоцтвы парлямэнту захоўваюцца да абраньня правамоцнага складу новай Вярхоўнай Рады. Аднак дзейнасьць Вярхоўнай Рады 12-га скліканьня была настолькі паралізаваная, што яшчэ ў верасьні на пасяджэньне не сабралося і 100 дэпутатаў.

Тым ня менш, 10 сьнежня 1995 г. былі прызначаныя паўторныя выбары ў тых акругах, дзе дэпутаты не былі абраныя ў траўні. Зь вялікай цяжкасьцю ўдалося сфармаваць парлямэнт у правамоцным складзе — 198 дэпутатаў. 9 студзеня 1996 г. адбылася першая сэсія Вярхоўнай Рады 13-га скліканьня. Але працягласьць яе дзейнасьці была невялікай. Дарэчы, гэта быў апошні дзяржаўны орган, сфармаваны шляхам выбараў і прызнаны эўрапейскімі міжнароднымі арганізацыямі і дзяржавамі.

Рэфэрэндум 24 лістапада 1996 г., на якім была прынятая новая рэдакцыя Канстытуцыі Беларусі, скончыў дзейнасьць Вярхоўнай Рады. Згодна з новай рэдакцыяй Канстытуцыі прадстаўнічым органам стаў нацыянальны сход Рэспублікі Беларусі, які складаецца зь дзьвюх палатаў — палаты прадстаўнікоў і рады рэспублікі.

## "Удасканаленьне" выбарчага заканадаўства і яго наступствы

Новая рэдакцыя Канстытуцыі зрабіла прэзыдэнцкую ўладу ў параўнаньні з прадстаўнічай абсалютнай.

Першая палата прадстаўнікоў была сфармаваная дзіўным спосабам. На яе першае пасяджэньне сабраліся 103 дэпутаты ліквідаванага парлямэнту і абвясьцілі сябе першай палатай прадстаўнікоў, што пацьвердзіў і прэзыдэнт. Ня дзіўна, што новы парлямэнт не атрымаў міжнароднага прызнаньня. Калі нават лічыць правамоцнасьць вынікаў праведзенага рэфэрэндуму, відавочна, што новы прадстаўнічы орган павінен быў фармавацца шляхам усенародных выбараў, а не пасяджэньнем часткі парлямэнтароў, выбраных у зусім іншы парлямэнт.

Але наперадзе былі новыя выбары (новая рэдакцыя Канстытуцыі фармальна ня зьнішчыла самога інстытуту парлямэнтарызму разам з выбарчай сыстэмай). Іншая справа, якое заканадаўства будзе рэгуляваць правядзеньне выбараў і рэфэрэндумаў. Прыняцьце амаль новай Канстытуцыі выклікала зьмяненьні і выбарчага заканадаўства, абумоўленыя ня толькі яго прывядзеньнем да адпаведнасьці ёй. Па-першае, як паказаў час, зьмяненьне заканадаўства ішло па шляху кадыфікацыі, у выніку чаго ў студзені 2000 г. зьявіўся Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусі. Па-другое, аналіз Выбарчага кодэксу паказвае, што ўлада імкнулася стварарыць такія заканадаўчыя ўмовы, каб не дапусьціць магчымасьці апазыцыйным арганізацыям і палітыкам уплываць на ход выбараў ці рэфэрэндуму, а значыць — на іх вынікі.

Да прыняцьця Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусі выбары ў Рады розных узроўняў, у тым ліку і Вярхоўную, выбары прэзыдэнта, рэфэрэндумы адбываліся паводле адпаведных асобных законаў. Калі ўлічыць, што некаторыя кампаніі, напрыклад выбары і рэфэрэндум, праводзіліся адначасова, то маглі ўзьнікаць і, відаць, узьнікалі пытаньні з часам пачатку галасаваньня, з фармаваньнем камісіяў і іх паўнамоцтвамі і г. д. Так, для розных кампаніяў

існуюць аднолькавыя нормы, якія лягічна абазначыць адзіным разьдзелам заканадаўства. Але пры адначасовым правядзеньні выбараў і рэфэрэндуму апошні становіцца асноўным мерапрыемствам для выбарніка. Выбары ж адыходзяць на другі плян. Напрыклад, у Расеі адначасовае правядзеньне розных выбарчых кампаніяў, а таксама сумяшчэньне выбарчых кампаніяў з рэфэрэндумам забаронена. У гэтым выпадку не існуе адзначаных праблемаў.

Да таго ж Выбарчы кодэкс ня толькі ня ўносіць яснасьці ў разуменьне закону, а, наадварот, ускладняе работу з заканадаўствам. Зразумела, прафэсійныя юрысты так ці іначай з часам здолеюць разабрацца ў гэтым блытаным дакумэнце. Простаму ж чалавеку, які ня мае адпаведнай адукацыі, няма сэнсу нават разгортваць яго старонкі. Мяркуецца, што кандыдат на месца дэпутата павінен быць чалавекам адукаваным ці мець магчымасьць прыцягнуць да працы спэцыяліста. Так, гэта праблема ўдзельніка выбарчай кампаніі. Але акрамя кандыдатаў у дэпутаты або прэзыдэнты ёсьць яшчэ шматлікая катэгорыя ўдзельнікаў выбараў — сябры камісіяў розных узроўняў.

Такім чынам, перавага Кодэксу ўва ўніфікацыі выбарчага заканадаўства зьнішчаецца яго складанасьцю. Значна важней, аднак, наколькі новае заканадаўства стварыла спрыяльныя ўмовы для ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу. Выбарчы кодэкс, як і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі, пацьвердзіў мажарытарную выбарчую сыстэму, нібыта толькі такі спосаб выбараў дае магчымасьць выбарніку ўплываць на працу дэпутата. Аднак на практыцы атрымліваецца з дакладнасьцю наадварот. Толькі той выбарнік, які аддае голас партыі, аддае яго за той ці іншы шлях разьвіцьця сваёй дзяржавы. Інакш адбываецца вяртаньне да перабудовачнага часу, калі існавала аднапартыйная сыстэма. Толькі ў часы Савецкага Саюзу партыя існавала фізычна, а ў Беларусі яе ролю сёньня грае прэзыдэнцкая вэртыкаль. Мажарытарная выбарчая сыстэма ў Беларусі прыніжае ролю наяўных партыяў у грамадзкім жыцьці, уводзіць людзям у галовы думку, што партыйныя лідэры і актывісты — людзі своекарысьлівыя, якіх цікавіць толькі ўласны дабрабыт.

Вынікі выбараў не залежаць цалкам ад заканадаўства. Нават пры такім ці падобным заканадаўстве можна правесьці адносна дэмакратычныя выбары, як гэта і здарылася на мяжы 1980-х — 1990-х гг. Калі ж улада ставіць за мэту не дапусьціць іншадумцаў да кіраваньня дзяржавай, вось тут закон, які гэтая ж улада і стварыла, становіцца яе галоўным інструмэнтам, што дае ўпэўненасьць у перамозе, прычым дзеля яе няма патрэбы значна парушаць закон. Гэта паказала практыка правядзеньня ўсіх кампаніяў, якія прайшлі пасьля прыняцьця Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусі.

## Кампанія 2000 г.

Найперш зьвернем увагу на некаторыя палажэньні Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусі, якія даюць падставы думаць, што ўлада не зацікаўленая праводзіць выбары ў адпаведнасьці з эўрапейскімі стандартамі.

Любая выбарчая кампанія пачынаецца для яе ўдзельнікаў з магчымасьці ўвайсьці зацікаўленым асобам у склад выбарчых камісіяў. Гэтая магчымасьць прадугледжваецца Кодэксам. Наколькі значны ўплыў аказваюць гэтыя асобы на ход выбарчай кампаніі, паказваюць статыстычныя дадзеныя аб складзе камісіяў. Напрыклад, у часе правядзеньня выбараў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу 2-га склікання ў склад акруговых выбарчых

камісіяў з агульнага ліку 1430 чалавек увайшло 135 прадстаўнікоў палітычных партыяў, альбо 9,4 %. Калі ўлічыць, што асноўнымі ўдзельнікамі выбарчай кампаніі павінны быць якраз палітычныя партыі, то згаданы адсотак не выглядаў значным. Хутчэй можна сказаць, што партыі не аказалі ўплыву на вынікі кампаніі ў частцы дзейнасьці акруговых камісіяў.

**Табліца 1.** Склад акруговых выбарчых камісіяў па выбарах дэпутатаў палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу 2-га склікання (паводле Цэнтравыбаркаму)

| | |
|---|---|
| Усяго створана акруговых выбарчых камісіяў | 110 |
| У склад акруговых выбарчых камісіяў увайшло (чал.) | 1430 |
| У склад камісіяў увайшлі прадстаўнікі: | |
| а) палітычных партыяў (усяго) | 135 (9,4 %) |
| у тым ліку: | |
| ПКБ | 59 |
| КПБ | 38 |
| ЛДП | 29 |
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці | 4 |
| Беларуская патрыятычная партыя | 3 |
| Сацыяльна-спартыўная партыя | 2 |
| б) іншых грамадзкіх аб'яднаньняў (усяго) | 224 (15,7 %) |
| у тым ліку: | |
| БПСМ | 74 |
| Беларускае аб'яднаньне ветэранаў | 62 |
| Жаночая лібэральная асацыяцыя | 24 |
| Рэспубліканскі клуб выбаршчыкаў | 6 |
| Беларускі саюз жанчын | 17 |
| Лібэральна-дэмакратычны саюз моладзі | 15 |
| Саюз ветэранаў вайны ў Аўганістане | 7 |
| Рух "За сацыяльны прагрэс і справядлівасьць" | 4 |
| Аб'яднаньне "Чарнобыльскія дзеці" | 3 |
| Міжнародны жаночы саюз адзінства | 3 |
| Беларускі саюз спартоўцаў | 2 |
| Асацыяцыя шматдзетных бацькоў | 2 |
| Беларускі саюз мастакоў | 2 |
| Беларускі саюз міру | 2 |
| Фонд "Дзецям Чарнобыля" | 1 |
| Аб'яднаньне "Грамадзяне за нацыянальную бясьпеку" | 1 |
| в) працоўных калектываў | 620 (43,3 %) |
| г) грамадзянаў шляхам падачы заявы | 311 (21,7 %) |
| д) прэзыдыюмаў абласных радаў дэпутатаў | 58 (4 %) |
| е) абласных выканаўчых камітэтаў | 82 (5,7 %) |

Яшчэ меншы адсотак сяброў партыяў увайшоў у склад участковых выбарчых камісіяў — 1 %, альбо 713 чалавек з агульнай колькасьці 70 859 сяброў камісіяў.

Трэба яшчэ ўлічыць, сябры якіх партыяў (іх на час той выбарчай кампаніі было зарэгістравана дзевятнаццаць) увайшлі ў склад участковых камісіяў (табл. 1). У сувязі з гэтым цікавай уяўляецца наступная інфармацыя. Толькі адна палітычная партыя, якую можна лічыць больш-менш апазыцыйнай да ўлады, мела сваіх прадстаўнікоў у складзе акруговых выбарчых камісіяў. Гэта ПКБ, ад якой у акруговых камісіях прысутнічала 59 сяброў, што складае 4,13 % ад агульнай колькасьці сяброў акруговых камісіяў. Ня варта гаварыць аб уплыве гэтай партыі на выбарчы працэс, калі яе сяброў не хапіла нават па адным на кожную выбарчую камісію.

Найбольшае прадстаўніцтва традыцыйна мелі працоўныя калектывы (работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, а таксама настаўнікі і мэдыкі, на якіх улада мае просты ўплыў). На 110 акруговых камісіяў было 140 прадстаўнікоў улады, уключаючы прадстаўнікоў і абласных Радаў, і выканкамаў.

Яшчэ горшае палажэньне было з прадстаўніцтвам партыяў ува ўчастковых камісіях (табл. 2). У 2000 г. па 6694 участках для галасаваньня ў склад участковых выбарчых камісіяў увайшло толькі 713 сяброў партыяў. Гэта значыць, што па адным партыйным сябры камісіі было толькі ў 10,7 % камісіяў. А ад агульнай колькасьці сяброў участковых камісіяў сябры партыяў склалі зусім трошкі больш за 1 %.

Амаль усе партыі і грамадзкія аб'яднаньні, якія мелі прадстаўніцтва ўва ўчастковых выбарчых камісіях, былі ляяльныя да ўлады. Амаль палова сяброў камісіяў была дэлегаваная працоўнымі калектывамі, што яшчэ больш ставіць пад сумнеў незалежнасьць камісіяў.

Пры аналізе фармаваньня выбарчых камісіяў, а таксама і іншых этапаў выбарчых кампаніяў, якія будуць разглядацца далей у гэтым артыкуле, паўстае пытаньне: а ці магло быць

**Табліца 2.** Склад участковых выбарчых камісіяў па выбарах дэпутатаў палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу 2-га скліканьня

| | | |
|---|---|---|
| Усяго ўчасткаў для галасаваньня | 6694 | |
| Колькасьць сяброў участковых камісіяў | 70859 | |
| Прадстаўнікі ад: | | |
| а) палітычных партыяў (усяго) | 713 | 1 % |
| у тым ліку: | | |
| КПБ | 91 | |
| ПКБ | 164 | |
| ЛДП | 385 | |
| Сацыял-дэмакратычнай партыі народнай згоды | 28 | |
| Аграрнай партыі | 41 | |
| Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасьці | 4 | |
| б) іншых грамадзкіх аб'яднаньняў (усяго) | 2320 | 3,3 % |
| в) працоўных калектываў | 31673 | 44,7 % |
| г) грамадзянаў шляхам падачы заявы | 33157 | 46,8 % |
| д) выканаўчых камітэтаў і раённых адміністрацыяў | 2991 | 4,2 % |

інакш? Магчыма, зацікаўленыя асобы не знайшлі спосабаў палітычнай барацьбы за месца ўва ўладзе? Адказаць на гэтыя пытаньні дапаможа аналіз заканадаўства аб выбарах.

Артыкулам 35 Выбарчага кодэксу прадугледжана, што вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў могуць партыі, іншыя грамадзкія аб'яднаньні, працоўныя калектывы, а таксама грамадзяне шляхам падачы заявы. Як бачым, усе слаі грамадзтва могуць узяць удзел у выбарчай кампаніі, уключаючы і ўдзел у працы выбарчых камісіяў. Але зьвернем увагу на артыкул 34 Кодэксу. Аказваецца, акруговыя камісіі для выбараў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў ствараюцца на пасяджэньнях прэзыдыюмаў абласных, Менскай гарадзкой рады дэпутатаў і абласных, Менскага гарадзкога выканаўчых камітэтаў, а ўчастковыя камісіі — наогул рашэньнямі раённых, гарадзкіх выканаўчых камітэтаў, а ў гарадох з раённым дзяленьнем — раённымі адміністрацыямі. Па сутнасьці, ніякага рэглямэнту правядзеньня гэтых пасяджэньняў няма. Таму ўдзельнікі такіх пасяджэньняў не абмежаваныя ў сваіх рашэньнях. Да таго ж у арганізатараў сумесных пасяджэньняў Радаў і выканкамаў няма абавязку запрашаць зацікаўленых асобаў, больш за тое, калі хто захоча трапіць на пасяджэньне, можа ня быць дапушчаны, таму што заканадаўства не прадугледжвае гэтага. Няма сэнсу гаварыць, якое рашэньне прымае выканкам сумесна з Радай, якая, па сутнасьці, ёсьць прадстаўнічы прыдатак выканаўчай улады.

Асаблівую ўвагу варта зьвярнуць на працэс фармаваньня ўчастковых выбарчых камісіяў. Ува ўмовах, калі ў дзяржаве існуе выканаўчая вэртыкаль, а ніжэйшыя выканаўчыя органы (раённыя, гарадзкія выканаўчыя камітэты, раённыя адміністрацыі ў гарадох) абсалютна падначаленыя вышэйшым выканаўчым органам, гэтыя органы прымаюць рашэньне, якое поўнасьцю адпавядае палітыцы дзейнай улады. А менавіта яны фармуюць сямідзесяцітысячны склад участковых камісіяў, які выконвае правядзеньне галасаваньня і падлік галасоў.

## Дылема для апазыцыі: ад перамоваў да Байкоту-2000

Перад выбарамі ў палату прадстаўнікоў 2000 г. апазыцыя апынулася ў патавай сытуацыі. З аднаго боку, Лукашэнка сам пасьлядоўна выціскаў яе зь "першага" ў "трэці" сэктар. Зь іншага боку, і сама апазыцыя зрабіла стаўку на адыход ад удзелу ў фармальных палітычных працэсах, спансараваных уладамі. Існаваньне па-за межамі сыстэмнай палітыкі прывяло яе да стварэньня сваіх паралельных інстытутаў (Вярхоўная Рада 13-га скліканьня, "паралельны ўрад" у форме Нацыянальнага выканаўчага камітэту і "паралельная" цэнтральная выбарчая камісія на чале зь Віктарам Ганчаром), палітычных працэсаў ("альтэрнатыўныя" прэзыдэнцкія выбары 1999 г.), мэдыяў, нават сваіх сьвятаў, мастацтва, музыкі і культуры.

Але няўдача паралельных прэзыдэнцкіх выбараў 1999 г. і немінучы надыход выбараў у лукашэнкаўскі парлямэнт ставілі перад апазыцыяй пытаньне: што далей? Далейшае існаваньне ў палітычным андэграўндзе было ўсё меней эфэктыўным. Спроба абраць паралельнага прэзыдэнта скончылася хіба што чарговым скандалам унутры апазыцыі. Стаўка на Вярхоўную Раду 13-га скліканьня як носьбіта легітымных прэтэнзіяў апазыцыі на ўладу (і сродак дэлегітымізацыі Лукашэнкі) не апраўдвала сябе. Напаўлегітымны падпольны парлямэнт ня меў рычагоў уплыву на палітычную сытуацыю ўнутры Беларусі, што паступова зьмяншала яго ўплыў і на міжнароднай арэне.

Здавалася б, выхад з сытуацыі прапанавалі міжнародныя актары (перш за ўсё АБСЭ і

Злучаныя Штаты), якія актыўна лабіявалі пачатак перамоваў паміж уладай і апазыцыяй аб зьмене выбарчага заканадаўства і лібэралізацыі палітычнага клімату. Спроба арганізацыі перамоваў цягнулася часам 1999 — пачатку 2000 гг. На некаторых адрэзках здавалася, што працэс меў пэўную пэрспэктыву. Так, у верасьні 1999 г. улады і апазыцыя дамовіліся аб стварэньні дзьвюх рабочых групаў па падрыхтоўцы прапановаў да зьмены выбарчага заканадаўства і доступу апазыцыі да СМІ. Але хуткім часам высьветлілася, што на сапраўднае паляпшэньне палітычнага клімату разьлічваць не даводзіцца. Выбарчы кодэкс быў прыняты ў лютым 2000 г. без заўваг апазыцыі. Яна вылучыла ў адказ чатыры ўмовы свайго ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах (доступ да СМІ, прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях, спыненьне палітычных рэпрэсіяў і пашырэньне паўнамоцтваў парлямэнту) і апынулася ў замкнёным коле: каб дамагчыся вольных выбараў, ёй трэба было набрацца сілы, але набрацца сілы без удзелу ў сыстэмнай палітыцы не было як. Было таксама няясна, што мелася падштурхнуць Лукашэнку да прыняцьця ўмоваў апазыцыі.

Такая пазыцыя дэмсілаў была праінтэрпрэтаваная ўладамі і падкантрольнымі СМІ як доказ іх нягнуткасьці і экстрэмізму. Замест “радыкальнай” апазыцыі ўлады інсьпіравалі ўзьнікненьне “канструктыўнай” апазыцыі, што сабралася ў ліпені 2000 г. у прэзыдэнцкіх пакоях на “дыялёг грамадзкіх палітычных сілаў”. Дыялёг выліўся ў маналёг аднаго вядомага актора і не запомніўся нічым істотным, акрамя шальмаваньня яго палітычных апанэнтаў.

Пытаньне “што рабіць далей?” паўстала зноў. Ці ўдзельнічаць у выбарах, вынік якіх быў прадказальны, ці адмовіцца, забясьпечыўшы ўладзе “чыстую” перамогу? Так пытаньне стаяла далёка не для ўсіх. Большая частка апазыцыі, на чале з Каардынацыйнай радай дэмакратычных сілаў (парасонная арганізацыя, што ўтварылася ў 1999 г. для каардынацыі дзеяньняў апазыцыі), партыямі БНФ і АГП, абвясьціла байкот. Не падпарадкаваліся байкоту Партыя камуністаў беларуская Сяргея Калякіна, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (“Народная грамада”) Міколы Статкевіча, моладзевая арганізацыя “Грамадзянскі форум”, якая тым самым пазбавілася статусу моладзевага крыла АГП, а таксама шэраг вядомых палітыкаў — Міхаіл Чыгір, Генадзь Грушавы, Гары Паганяйла і інш.

Як вынік, выбары 2000 г. падзяліліся на два розныя працэсы. Адзін, фармальны, — самі выбары, чый вынік паступова страціў сэнс (прынцыповай розьніцы паміж тым, ці будзе прадстаўляць Лукашэнку ў палаце былы старшыня калгасу ці вэртыкальнік, сапраўды не існавала). Другі — значна больш калярытны, але наўрад ці больш сэнсоўны, — няспынныя на працягу ўсёй кампаніі ўзаемныя атакі і абвінавачаньні з боку “байкатыстаў” і “псэўдадэмакратаў”. Першыя абвінавачвалі другіх у здрадзе ці, як мінімум, палітычнай нізкавокасьці, другія — у палітычнай баязьлівасьці і нежаданьні вылезьці з “рэзэрвацыі”. Рацыю часткова мелі і тыя і другія.

**Табліца 3.** Удзел у парлямэнцкіх выбарах-2000 (паводле стаўленьня да прэзыдэнта Лукашэнкі)

| | Удзельнічалі ў выбарах (58,8 %) | Не ўдзельнічалі ў выбарах (41,2 %) |
|---|---|---|
| Перакананыя прыхільнікі Лукашэнкі | 31,4 | 6,8 |
| Тыя, хто вагаецца | 56,9 | 46,9 |
| Перакананыя праціўнікі Лукашэнкі | 12,7 | 49,3 |

Паводле: Новости НИСЭПИ. Вып. 1. 2001. Март. С. 8.

З аднаго боку, удзел “незалежных” дэмакратаў і прадстаўнікоў партыяў Статкевіча і Калякіна пацярпеў няўдачу ўжо на стадыі рэгістрацыі, на якой былі адсеяныя амаль усе патэнцыйна моцныя альтэрнатыўныя кандыдаты (Алег Воўчак, Генадзь Грушавы, Гары Паганяйла і г. д.). Усяго дакумэнты на рэгістрацыю падалі 769 вылучэнцаў. Адмову атрымалі 218. Зь іх 146 абскардзілі адмовы. ЦВК прызнаў рацыю толькі 23 кандыдатаў. Уладзе насамрэч былі не патрэбныя ані легітымныя выбары, ані кішэнныя дэмакраты. Самі партыйныя лідэры, аднак, былі зарэгістраваныя: для іх на выбарах быў загатаваны паказальны разгром.

Зь іншага боку, байкот як кампанія дэлегітымізацыі ўлады таксама пацярпеў няўдачу. Папершае, легітымнасьць выбараў адзначаецца іх адпаведнасьцю дэмакратычным стандартам, а ня складам удзельнікаў (а значыць, паколькі рэжым прадэманстраваў выключную няздольнасьць да захаваньня нават нейкай уявы празрыстасьці і справядлівасьці выбарчага працэсу, удзел апазыцыі зусім не пагражаў наданьнем выбарам вонкавай легітымнасьці). Па-другое, байкот практычна дэмабілізаваў дэмакратычны электарат і пакінуў тых, што ня вызначыліся, без альтэрнатывы існай уладзе. Гэта відаць з табл. 3: сярод тых, хто не пайшоў на выбары ў палату, пераважалі праціўнікі Лукашэнкі, а сярод удзельнікаў выбараў — яго прыхільнікі. Байкот спрацаваў на карысьць дыктатара такім жа чынам, як і ў Сэрбіі. Сама колькасьць удзельнікаў выбараў, згодна зь незалежнымі апытаньнямі, значна перавысіла 50 %, так што лік 45 %, які быццам бы сьведчыў аб байкоце, быў выведзены з вынікаў галасаваньня ў Менску (пра гэта гавораць і вынікі незалежнага назіраньня ў іншых гарадох, якія адрозьніваюцца ад афіцыйных толькі на пару, а не на сямнаццаць адсоткаў). Хоць нават афіцыйныя зьвесткі (колькасьць выбарнікаў магла быць падкарочаная падчас галасаваньня) сьведчылі, што выбары не адбыліся ў 39 акругах, пра посьпех байкоту цяжка меркаваць. Гэта былі гарадзкія акругі, дзе пераважалі апанэнты Лукашэнкі.

## Вынікі выбараў у палату прадстаўнікоў 2000 г.

Галоўны вынік быў вядомы задоўга да самой кампаніі. Афіцыйныя дадзеныя выклікалі цікавасьць хіба што аматараў статыстыкі. Выбары адбыліся (можна спрачацца колькі заўгодна, у якой колькасьці акругаў, — але відавочна, што байкот не спрацаваў). Улада атрымала перамогу “паводле азначэньня” (зь ёй мала хто і спрачаўся). Удзел лаяльных палітычных партыяў стварыў пэўную ілюзію палітычнага плюралізму (табл. 4). Абраньне двух колішніх апазыцыянэраў Вольгі Абрамавай і Ўладзімера Навасяда (“псэўдадэмакратаў”, паводле азначэньня прыхільнікаў байкоту) дадало працэдуры нейкай вонкавай прыстойнасьці. Запрошаныя ўладамі міжнародныя назіральнікі абвясьцілі выбары “прыкладам дэмакратыі і высокай палітычнай культуры”. Міжнародныя арганізацыі не прызналі выбары свабоднымі і справядлівымі.

Аднак з пэрспэктывы часу (асабліва параўноўваючы з выбарамі 2004 г.) можна заўважыць і пэўныя адметнасьці вынікаў 2000 г. Па-першае, выбары прайшлі ў два зьместоўныя туры (у першым быў абраны толькі 41 дэпутат з 110). Па-другое, у багатай колькасьці акругаў прысутнічала канкурэнцыя кандыдатаў ад улады. На гульні ў дэмакратыю з боку лаялістаў прэзыдэнцкая вэртыкаль глядзела збольшага лагодна (былі і выняткі: калі ў бабруйскай акрузе лукашэнкаўскі паплечнік Аляксандар Шпілеўскі, будучы старшыня Мытнага камітэту, катастрафічна прайграваў, яго канкурэнту прапанавалі сысьці з дыстанцыі ў абмен на

месца ў радзе рэспублікі, куды ён быў празь некалькі тыдняў абраны). Гэта спрыяла “ўнутрырэжымнаму плюралізму”. Пэўныя кампаніі, як, напрыклад, сутыкненьне двух бізнэсмэнаў (Аляксея Ваганава і Юр’я Данькова) у Паўднёва-Заходняй акрузе Менску, калі і ня мелі ніякага палітычнага зьместу, былі проста забаўнымі. Нарэшце, паводле кампазыцыі палата № 2 выразна адрозьнівалася і ад прызначанай папярэдніцы, і ад абранай у іншым кантэксьце наступніцы. У парлямэнт прайшло дванаццаць прадпрымальнікаў. Самае галоўнае, у ім цягам часу сфармавалася апазыцыйная фракцыя — група “Рэспубліка”. Заўважым, усе яе прадстаўнікі, уключаючы самых дэмакратычна настроеных — бізнэсмэна Сяргея Скрабца, бізнэсмэна, колішняга спартоўца Ўладзімера Парфяновіча і генэрала Валер’я Фралова, — ішлі ў парлямэнт як прадстаўнікі ўлады. Такім чынам, нават мінімальная імітацыя дэмакратыі з боку ўлады, што абмежавалася ўнутрырэжымным плюралізмам, прывяла да ўзьнікненьня ў парлямэнце апазыцыі. У гэтым палата № 2 у нечым працягнула традыцыі Вярхоўных Радаў 12-га і 13-га скліканьня, а ня першай палаты.

Безумоўна, гэтая акалічнасьць не мяняла статусу палаты прадстаўнікоў як кішэннага парлямэнту. Фармальна да кастрычніка 2004 г. у Беларусі была сыстэмная апазыцыя, але яе ўплыў на прыняцьце рашэньняў быў такім жа нулявым, як і ў апазыцыі пазасыстэмнай. І ўсё ж — маючы на ўвазе гэтае нечаканае ўзьнікненьне парлямэнцкай апазыцыі — ці былі выбары 2000 г. сапраўды безнадзейнымі? Ці сапраўды яны не давалі апазыцыі ніякіх магчымасьцяў? Ці быў гэта толькі і выключна фарс? Відаць, усё было трошкі інакш. Магчыма, і выбары, і палата № 2 усё ж давалі нейкія, хутчэй агітацыйныя, прапагандысцкія магчымасьці для апазыцыі. Можа, прыняўшы на ўзбраеньне тактыку апазыцыі БНФ 1989 г. пры выбарах народных дэпутатаў СССР (калі прадстаўнікоў БНФ не зарэгістравалі, БНФ пайшоў на падтрымку больш прымальных нэўтральных кандыдатаў), апазыцыя і магла б пашырыць прысутнасьць патэнцыйна апазыцыйных кандыдатаў, якія ў 2004 г. маглі б утварыць колькасна і якасна іншую сілу. Але такія крокі патрабуюць іншага падыходу да апазыцыйнай дзейнасьці — нестандартнага мысьленьня, здольнасьці да асымэтрычных захадаў, наяўнасьці доўгатэрміновай стратэгіі альбо хаця б спробаў мець яе і шмат чаго іншага.

**Табліца 4.** Удзел палітычных партыяў у выбарах 2000 г. (паводле ЦВК)

| Назва партыі | Зарэгістравана кандыдатаў | Абрана кандыдатаў |
|---|---|---|
| Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці | 15 | 2 |
| Партыя камуністаў беларуская | 46 | - |
| Камуністычная партыя Беларусі | 71 | 6 |
| Ліберальна-дэмакратычная партыя | 98 | - |
| Аграрная партыя | 19 | 5 |
| Беларуская сацыяльна-спартовая партыя | 1 | 1 |
| Рэспубліканская партыя | 14 | - |
| Беларуская патрыятычная партыя | 10 | - |
| Партыя народнай згоды | 2 | 1 |
| Усяго | 276 | 15 |

## Высновы

Прайшло дванаццаць гадоў з моманту выбараў першага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, першых выбараў незалежнай Беларусі. За гэты пэрыяд Беларусь перажыла тры з паловай выбарчыя кампаніі па выбарах дэпутатаў парлямэнту — галоўнага органу прадстаўнічай улады. Здавалася б, павінны ўжо складвацца нейкія традыцыі, павінны складвацца і разьвівацца ўмовы для разьвіцьця дэмакратычных інстытутаў, у тым ліку і інстытуту выбараў. Улічваючы больш раньнія пэрыяды сацыяльна-палітычнага разьвіцьця дзяржавы — галоснасьць, перабудову, выбары першага парлямэнту з пачатку перабудовы, набыцьцё незалежнасьці, — гэта значны тэрмін для таго, каб стварыліся ўмовы для разьвіцьця выбарчага працэсу ў бок дэмакратызацыі, у тым ліку ў справе разьвіцьця заканадаўчай базы.

На сёньняшні дзень мы маем выбарчае заканадаўства, якое было створана без уліку ўсіх дэмакратычных нормаў. Замест дэмакратызацыі адбываецца адваротны працэс: выбарчы працэс усё больш набывае формы даперабудовачнага пэрыяду. У выніку ад палітычнай барацьбы ўсё больш адсякаюцца тыя палітычныя арганізацыі, сутнасьць якіх, у прыватнасьці, і палягае ў тым, каб змагацца за месца ўва ўладзе, — партыі. Парлямэнт усё больш набывае непалітычны характар і ператвараецца ў прыдатак улады выканаўчай, што робіць прадстаўнічую ўладу непатрэбнай у палітычнай структуры дзяржавы. Рашэньні парлямэнту практычна стоадсоткава ўзгадняюцца з прэзыдэнцкай уладай і, у выпадку згоды апошняй, прымаюцца амаль аднагалосна. І рэч ня толькі ў складзе парлямэнту, але і ў яго паўнамоцтвах. Тым ня менш, як паказвае практыка і беларускага палітычнага жыцьця, і практыка іншых краінаў, нават той парлямэнт, які мае абмежаваныя функцыі і паўнамоцтвы, але які складаецца з апазыцыйных дэпутатаў, здольны значна ўплываць на рэформы ў краіне.

Мы паспрабавалі прааналізаваць, наколькі можна выкарыстаць заканадаўчыя рамкі для барацьбы за ўладу, супраць цэнтралізацыі ўлады адным дзяржаўным інстытутам, а то і ў адных руках. Як паказалі дзьве апошнія выбарчыя кампаніі, закон не дае дзейсных інструмэнтаў у гэтай барацьбе. Прычыны могуць быць ня толькі ў заканадаўстве, але і ў здольнасьці апазыцыі знаходзіць слабыя месцы ў пабудаванай выбарчай сыстэме і абыходзіць тыя пасткі, якія расстаўленыя на шляху да дэпутацкага месца. Але трэба прызнаць якасьць заканадаўства аб выбарах, якое амаль не пакідае “неляяльным да ўлады” палітыкам шанцаў прайсьці празь іх.

Калі такія шанцы могуць узьнікнуць у сучаснай Беларусі? Гэта асобная тэма. Вынікі апошніх выбараў паказваюць: такіх шанцаў няма. А пры цяперашняй цэнтралізацыі дзяржаўнай улады, пры вострым нежаданьні дзяліцца ўладай з апанэнтамі і магчымасьці не дзяліцца ўладай на такія нечаканасьці, як аслабленьне рэжыму адсеву нежаданых кандыдатаў, у бліжэйшы час спадзявацца не выпадае.

## Разьдзел 3

# ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2001 ГОДУ

## СТРУКТУРА БЕЛАРУСКАГА ЭЛЕКТАРАТУ

Прычыны трываласьці існуючага ў Беларусі аўтарытарнага рэжыму трэба шукаць ня толькі ў асаблівасьцях беларускай палітычнай сыстэмы, у асобе прэзыдэнта Лукашэнкі, але і ў спэцыфіцы беларускага электарату.

Зьяўленьне Лукашэнкі на палітычнай сцэне, тое, што ён нягледзячы на неспрыяльныя для яго зьмены ў палітычнай сытуацыі ўчэпіста захоўвае ўладу, тлумачыцца яго здольнасьцю дастаткова дакладна ўлоўліваць спадзевы, настроі, уяўленьні беларускага грамадзтва, факусаваць гэта ў сваёй камунікацыі з выбарцамі і адлюстроўваць у сваёй палітыцы. Значны пэрыяд сваёй кар’еры ў савецкі час Лукашэнка займаўся чыста прапагандысцкай працай*. Ідэалёгія позьняга СССР абумовіла кірунак яго палітычнай сацыялізацыі.

Колькасьць людзей пэнсійнага веку (ад 55 гадоў і болей) у 2001 г. складалі 23,3% ад агульнай колькасьці насельніцтва Беларусі**. 77,9% беларускіх пэнсіянэраў — прыхільнікі Лукашэнкі.

Прычым з узростам колькасьць прыхільнікаў рэжыму падвышаецца. Ува ўзроставай катэгорыі ад 60 гадоў і болей (18,6% ад агульнай колькасьці насельніцтва) прыхільнікамі Лукашэнкі былі 81,7% выбарцаў.

Такім чынам, частку цьвёрдага электарату Лукашэнкі складаюць людзі пэнсійнага ўзросту (сам гэты «цьвёрды» электарат у залежнасьці ад палітычнага кантэксту вагаецца ад 35 да 50% беларускіх выбарцаў).

Паміж двума палітычнымі полюсамі — левым «пралукашэнкаўскім» і правым «незалежніцкім» — знаходзіцца вялікі сэгмэнт электарату, які ня вызначыўся, не ідэнтыфікуе сябе зь нейкай ідэалёгіяй. У залежнасьці ад абставінаў ён складае 30–45% беларускіх выбарцаў.

Палітычныя паводзіны гэтай бальшыні часта ня маюць рацыянальнага характару: яна знаходзіцца ўва ўладзе стэрэатыпаў, сфармаваных за часоў існаваньня СССР. На ўзроўні масавай сьвядомасьці ў гэтых людзей гарманійна спалучаюцца ўзаемасупярэчлівыя ўяўленьні: яны выступаюць за «рынкавую эканоміку», але пры «жорсткім дзяржаўным рэгуляваньні», за «незалежную беларускую дзяржаву», але ў складзе «саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі» і г.д.

* З 1975 году, з моманту сканчэньня Магілёўскага пэдагагічнага інстытуту, і па 1982 год, а таксама ў 1985–1987 гг. Лукашэнка быў палітработнікам.

** У гэтым артыкуле выкарыстоўваюцца дадзеныя ўсеагульнага перапісу насельніцтва Беларусі (1999 г.), матэрыялы Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі, вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў, праведзеных Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД), а таксама незалежнай сацыялягічнай лябараторыяй «Новак».

Успрыманьне гэтай бальшынёй прэзыдэнта Лукашэнкі адбываецца не ў структурна-функцыянальных катэгорыях, як найвышэйшай службовай асобы, абранай на пэўны тэрмін і «зьвязанай» пэўнымі сфэрамі кампэтэнцыі, а хутчэй у індывідуальна-ацэначных, як «моцнай» асобы.

Апрацоўваючы гэтую «электаральна хісткую» бальшыню, беларускі рэжым пры дапамозе дзяржаўных СМІ навязвае грамадзтву ўяўленьне, што да ўсяго пазытыўнага ў грамадзтве асабіста спрычыніўся прэзыдэнт Лукашэнка, а ўсё нэгатыўнае адбываецца па віне бюракратаў, дырэктараў прадпрыемстваў, міністраў, іншымі словамі, унутраных і вонкавых ворагаў.

Падчас выбарчай кампаніі 2001 году рэжымам шырока ўжываўся трук супрацьстаўленьня «сумленнага і справялівага» прэзыдэнта Лукашэнкі і «карумпаванай намэнклятуры». Пэрыядычныя публічныя чысткі, якія праводзяцца сярод прадстаўнікоў вышэйшай бюракратыі, прадстаўнікоў дырэктарскага корпусу, апрача ўсяго іншага, спрыяюць мабілізацыі лукашэнкаўскага і «нявызначанага» электарату.

Факт, што рэжыму сапраўды ўдалося дасягнуць адносных эканамічных посьпехаў, выкарыстоўваецца афіцыйнай прапагандай для навязваньня Лукашэнку іміджу гаранта эканамічнай стабільнасьці і эканамічнага разьвіцьця Беларусі.

Дынаміка ўнутранага валавога прадукту (1991–1998 гг.)

| | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Індэкс унутранага валавога прадукту папярэдні год = 100% | 99 | 90 | 92 | 87 | 90 | 103 | 111 | 108 |
| Індэкс канчатковага спажываньня папярэдні год = 100% | 93 | 90 | 98 | 88 | 91 | 102 | 110 | 108 |

Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусі.

1991–1995 гг. былі часам рэзкага падзеньня ўзроўню вытворчасьці, выбуху інфляцыі (яе месячны ўзровень складаў 35–40%) і, як вынік, рэзкага падзеньня ўзроўню жыцьця ў Беларусі. У 1996 г. сытуацыя пачала зьмяняцца да лепшага. На працягу 1999–2001 гадоў тэндэнцыя эканамічнага росту была захаваная. На прэзыдэнцкія выбары 2001 году беларускае грамадзтва выйшла, маючы ўзровень дабрабыту, блізкі да савецкага. Апытаньне, праведзенае ў траўні 2001 г., дало такую карціну спажывецкіх настрояў беларусаў:

| Як бы Вы ацанілі якасьць Вашага жыцьця? | |
|---|---|
| **Варыянт адказу** | **Усе апытаныя (%)** |
| Вельмі добрае | 0,7 |
| Даволі добрае | 41,5 |
| Даволі дрэннае | 42,9 |
| Вельмі дрэннае | 14,9 |

Крыніца: Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў.

Беларускае грамадзтва ў абліччы бальшыні сваіх грамадзян аддае перавагу гарантаванаму, відавочнаму спажывецкаму мінімуму перад зьменамі, у пазытыўным выніку якіх яно ня ўпэўненае. Калі палітычная пазыцыя «пралукашэнкаўскага» і «незалежніцкага» электарату мае ідэалягічную дэтэрмінанту («кансэрватыўна-савецкую» і «нацыяналістычную»), то для

бальшыні «нявызначаных» беларускіх выбарцаў першараднымі выступаюць сацыяльна-эканамічныя пытаньні*.

Стабілізацыя эканомікі дазваляе беларускаму рэжыму прапагандаваць «уласнае» разуменьне дэмакратыі. Месца «правоў чалавека» замяніла ідэалягема «жорсткага парадку». Пры гэтым інстытуцыйнае і заканадаўчае афармленьне аўтарытарнага рэжыму адбывалася ад «імя народу». Кожнай буйной палітычнай акцыі з боку ўлады папярэднічае адпаведная «народная» ініцыятыва, будзь гэта «Ўсебеларускі народны сход»** альбо недзяржаўныя *de jure* арганізацыі, якія аб’ядноўваюць лукашэнкаўскіх прыхільнікаў***.

У гэтым сэнсе паказальна, што адным зь першых крокаў Лукашэнкі на пасадзе прэзыдэнта было стварэньне ў структуры сваёй адміністрацыі ўпраўленьня «па працы з зваротамі грамадзян».

Што датычыць сталага «лукашэнкаўскага» электарату, то яго сацыяльны партрэт у першай палове 2001 г. быў такі:

| У залежнасьці ад узросту | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 18–19 г. | 20–24 г. | 25–29 г. | 30–39 г. | 40–49 г. | 50–55 г. | Больш за 55 г. |
| 25,8% | 31,3% | 16,7% | 27,9% | 39,2% | 43,7% | 77,9% |

| У залежнасьці ад адукацыі | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Пачатковая | Няпоўная сярэдняя | Сярэдняя | Сярэдняя спэцыяльная | Вышэйшая (у тым ліку няскончаная) |
| 78,5% | 47,0% | 31,4% | 35,0% | 29,2% |

| Рэгіён | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Менск | Менская вобл. | Берасьце і вобл. | Гародня і вобл. | Віцебск і вобл. | Магілёў і вобл. | Гомель і вобл. |
| 28,5% | 45,9% | 34,6% | 34,4% | 40,4% | 46,4% | 47,7% |

| У залежнасьці ад населенага пункту | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Сталіца | Абласныя цэнтры | Вялікія гарады | Малыя гарады | Сяло |
| 28,5% | 39,4% | 28,8% | 39,9% | 51,5% |

Крыніца: НІСЭПД.

За Лукашэнку масава галасуюць людзі сталага веку зь невялікім узроўнем адукацыі, жыхары Ўсходняй Беларусі, жыхары вёсак і мястэчак. На момант апытаньня Лукашэнка меў падтрымку 32,6% работнікаў дзяржсэктару (менш яго падтрымлівалі работнікі нешмат-

* Сацыялягічныя апытаньні паказваюць, што ад 65 да 70% беларускіх выбарцаў, адказваючы на пытаньне: «Якія праблемы Вас больш за ўсё хвалююць?», — называюць у першую чаргу эканамічныя праблемы.

** Удзел у «выбарах» дэлегатаў «Усебеларускага народнага сходу» бяруць меней за 5% беларускіх выбарцаў. Пры гэтым традыцыйна «Ўсебеларускі народны сход», дэлегаты якога пераважна прадстаўнікі «прэзыдэнцкай вэртыкалі», выступаюць з ініцыятывамі ад імя ўсяго беларускага народу.

*** Напрыклад, пытаньні, якія былі вынесеныя на рэфэрэндум траўня 1995 г., зь верасьня 1994 г. лябіявалі «недзяржаўныя» грамадзкія арганізацыі накшталт «Славянскага Сабору «Белая Русь».

лікага недзяржаўнага сэктару (21,6%), якія маюць, як правіла, большы заробак у параўнаньні зь першымі).

Да сталага «незалежніцкага», дэмакратычнага электарату можна аднесьці прыблізна 20% беларускіх выбарцаў*. Яго ядро складае моладзь з высокім узроўнем адукацыі, прадстаўнікі інтэлігенцыі, кваліфікаваныя работнікі, сярэдняя кляса. Пераважна гэта жыхары Менску і паўночна-заходняй Беларусі.

## ПАЛІТЫЧНЫ РЫНАК СМІ.
## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ПРАСТОРА БЕЛАРУСІ Ў 2001 Г.

Асноўныя стаўкі ў перадвыбарнай барацьбе 2001 году рабіліся не на праграмы кандыдатаў, а на выкрыцьцё рэальных ці ўяўных злачынстваў апанэнтаў, абвінавачаньні ў зьніжэньні ўзроўню жыцьця і дэстабілізацыі палітычнай абстаноўкі.

Апазыцыйны электарат аб'ядноўвае не супольная шкала вартасьцяў, а незадаволенасьць рэжымам А. Лукашэнкі. Сама апазыцыя — гэта сукупнасьць розных груповак з адметнымі ідэалёгіямі, ад камуністаў да нацыяналістаў, аб'яднаных, у першую чаргу, сваім супрацьстаяньнем рэжыму А. Лукашэнкі.

### Падтрымка перадвыбарнай кампаніі А.Лукашэнкі

З 1995 году электронныя і друкаваныя дзяржаўныя СМІ цалкам кантралююцца прэзыдэнцкай выканаўчай вэртыкальлю. Асьвятленьне перадвыбарнай кампаніі А. Лукашэнкі ў падкантрольных прэзыдэнту СМІ не адрозьнівалася ад асьвятленьня дзейнасьці прэзыдэнта ў папярэдні пэрыяд, пачынаючы з 1995 году. Паназіраўшы за перадачамі Беларускага дзяржаўнага тэлебачаньня ў апошнія дзесяць гадоў, можна сьцьвярджаць, што рэклямная кампанія на карысьць А. Лукашэнкі ў дзяржаўных СМІ вядзецца на працягу ўсяго гэтага часу. Прэзыдэнт Лукашэнка фактычна манапалізаваў тэлевізійны этэр і стала фігуруе ў перадачах дзяржаўнага тэлебачаньня з моманту падрыхтоўкі да рэфэрэндуму 1996 году.

Празьмерная прысутнасьць прэзыдэнта ў беларускіх тэлеперадачах нязьменна суправаджаецца пазытыўнымі камэнтарамі ягоных дзеяньняў, паведамленьнямі пра посьпехі ў палітыцы й эканоміцы. Пры гэтым усімі сродкамі падтрымліваецца вобраз, які прывёў А. Лукашэнку да ўлады — чалавека з простага люду, які дагэтуль ня страціў зь ім лучнасьці. Беларускі прэзыдэнт не дапускае правядзеньня тэлевізійных дэбатаў з прадстаўнікамі апазыцыі.

За ўвесь час свайго кіраваньня А. Лукашэнка стала наведваў беларускія рэгіёны, праводзіў сустрэчы, адкрываў сьвяты, ладзіў працяглыя выступы, дэманструючы адзінства з абралым яго грамадзтвам, выяўляў актыўную дзейнасьць у вырашэньні сацыяльных і эканамічных праблемаў.

Былы дырэктар саўгасу, А. Лукашэнка штогод ладзіць тэлевізійнае шоў — сэлектарныя

* Каля 20% беларускіх выбарцаў нэгатыўна ставяцца да наданьня расейскай мове роўнага статусу зь беларускай і да зьмены дзяржаўнай сымболікі, ажыцьцёўленай у траўні 1995 г. Гэта пытаньні вельмі паказальныя ў сэнсе палітычных перавагаў «незалежніцкага» электарату.

нарады з кіраўнікамі калгасаў, дзяржаўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, якія дэманструюць электарату ягоныя намаганьні ў паляпшэньні жыцьця ў краіне. 7 жніўня 2001 году беларускі прэзыдэнт чарговы раз зладзіў ужо традыцыйную сэлектарную нараду з удзелам высокапастаўленых чыноўнікаў, прысьвечаную жніву і ўмалоту. Паводле заявы кіраўнікоў Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчаваньня, збор ураджаю ішоў пасьпяхова.

Такое асьвятленьне ўборачнай кампаніі — штогадовая акцыя, накіраваная на падтрымку рэйтынгу прэзыдэнта.

Першыя вынікі гэтае кампаніі пракамэнтаваў лідэр прафсаюзу работнікаў сельскай гаспадаркі Аляксандар Ярашук: «Што да заяваў пра ўдалы ўраджай, дык у іх няма нічога дзіўнага, бо сельская гаспадарка ў нас даўно ўжо стала не эканамічнай, а ідэалягічнай галіной. Бяда ў тым, што ніхто не ўзгадае, пра што йшлося на сэлектарнай нарадзе, калі надыдзе час падводзіць вынікі і параўноўваць іх з прагнозамі»[1].

Адначасова з рэклямай А. Лукашэнкі ў беларускіх дзяржаўных СМІ праводзіцца дыскрэдытацыя любой рэальнай апазыцыі прэзыдэнту. Кампанія афіцыйных СМІ супраць апазыцыі пачалася з выхадам у беларускі тэлевізійны этэр фільму тэлежурналіста Юр'я Азаронка «Дзеці хлусьні» ў 1995 годзе. Акцыі беларускай апазыцыі ў выпусках беларускіх навінаў заўсёды паказваюцца ў нэгатыўным сьвятле. Адмысловая штотыднёвая праграма «Рэзананс» складаецца зь сюжэтаў і камэнтароў, накіраваных на зьніжэньне даверу да апазыцыі.

Задоўга да пачатку выбарчай кампаніі на Беларускім тэлебачаньні зьявілася праграма Ю. Азаронка «Таемныя спружыны палітыкі» — адкрытая прапаганда супраць апазыцыі і яе лідэраў, пабудаваная на прымітыўных мэтадах ачмурэньня, стварэньня вобразу ворага, выкарыстаньні мантажу і прадузятых камэнтароў, маніпуляваньня вобразамі й цытатамі, што беспасярэдне не датычаць заяўленых праблемаў. У перадачы выкарыстоўваюцца перакручваньні фактаў, аднабаковае асьвятленьне падзеяў, абвінавачаньні апазыцыі ў падрыхтоўцы тэрарыстычных актаў і супрацоўніцтве з замежнымі спэцслужбамі, якія імкнуцца падарваць уладу «народнага» прэзыдэнта.

Перадачы Беларускага дзяржаўнага тэлебачаньня таксама закліканыя апраўдаць беларускія ўлады ў сытуацыі з правамі чалавека для міжнароднай супольнасьці. Яны пераймаюць стылістыку савецкіх палітычных аглядаў, што выкрывалі жахі буржуазнай дэмакратыі.

Выступы самога беларускага прэзыдэнта ў падкантрольных СМІ таксама, як правіла, зьмяшчаюць выпады супраць апазыцыі. Асаблівы рэзананс у незалежнай прэсе выклікала нарада А. Лукашэнкі з вышэйшымі ўрадоўцамі, якая трансьлявалася 31 ліпеня 2001 г. Беларускім дзяржаўным тэлебачаньнем.

Гарант беларускай Канстытуцыі правёў у этэры нараду з кіраўнікамі выканаўчай вэртыкалі, прысьвечаную будучым выбарам, заклікаючы іх не паддавацца на правакацыі апазыцыі. Паводле словаў прэзыдэнта, супраць яго рыхтавалася змова, на чале якой стаіць галава місіі АБСЭ Ганс-Георг Вік, які ўзначальвае штаб беларускай апазыцыі. «Гэты штаб падрыхтаваў сцэнар адхіленьня Лукашэнкі ад улады. І ён просты: у дзень выбараў 15 тысяч назіральнікаў павінны абвясьціць пераможцам праціўніка дзейнага прэзыдэнта. Пасьля гэтага, 10 верасьня, некалькі тысяч праціўнікаў Лукашэнкі возьмуць штурмам ягоную рэзыдэнцыю».

Публічная нарада была закліканая стымуляваць ляяльнасьць урадоўцаў у часе выбараў. А.

[1] Мария Яровенко. Комментарии // Белорусская деловая газета. 2001. 9 августа.

Лукашэнка пэрсанальна папярэдзіў тагачаснага галаву адміністрацыі Міхаіла Мясьніковіча, прэм'ер-міністра Ўладзімера Ярмошына і мэра Менску Міхаіла Паўлава, што прэзыдэнту, нібыта, раілі публічна арыштаваць Міхаіла Мясьніковіча і Ўладзімера Ярмошына, каб запалохаць чынавенства. Зь іншай крыніцы Лукашэнку стала вядома пра кантакты менскага мэра, галавы адміністрацыі і прэм'ер-міністра з арганізацыяй «За новую Беларусь», якую ўзначальвае былы міністар сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў, што адбыў турэмнае зьняволеньне і цяпер знаходзіцца ў апазыцыі да прэзыдэнта. Таксама А. Лукашэнку былі, нібыта, перададзеныя дакумэнты, якія сьведчылі аб тым, што вылучэньне кандыдата Міхаіла Марыніча было інсьпіраванае Міхаілам Мясьніковічам. Але прэзыдэнт тут жа пасьпяшаўся заявіць, што не дае веры гэтым паведамленьням і ніхто ня будзе арыштаваны. Паводле словаў Лукашэнкі, дэзінфармацыя зыходзіць ад апазыцыі, якая імкнецца ў вырашальны момант «зьнегаловіць» уладу.

Пры канцы жніўня кандыдаты на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі С. Домаш, У. Ганчарык і С. Гайдукевіч выступілі па Беларускім тэлебачаньні, кожны з трыццаціхвілінным зваротам да выбарцаў. А. Лукашэнка адмовіўся ад перадвыбарнага тэлевізійнага выступу перад выбарцамі, тым самым падкрэсьліваючы свой асаблівы статус што да іншых кандыдатаў.

Прэзыдэнт Лукашэнка абвясьціў па БТ праграму канкрэтных справаў. Ён наведваў рэгіёны Беларусі, сустракаўся з насельніцтвам, ягоны вяжж падрабязна асьвятляўся СМІ. А. Лукашэнка ўвесь час даваў інтэрвію Беларускаму тэлебачаньню, што шматкроць перавысіла час выступленьня ягоных апанэнтаў у беларускім тэлеэтэры. Беларускае тэлебачаньне паказвала, як прэзыдэнт, у адрозьненьне ад сваіх апанэнтаў, не гаворыць, а займаецца канкрэтнымі справамі для паляпшэньня жыцьця людзей.

Наведваньне рэгіёнаў з падрабязным асьвятленьнем у беларускіх навінах адначасова рабіла А. Лукашэнку рэкляму на ўсю краіну, дзякуючы манапалізаванаму тэлебачаньню, і беспасярэдне забясьпечвала рэкляму ў рэгіёнах. Яшчэ з часоў візытаў кіраўнікоў СССР у савецкія рэгіёны мясцовае начальства на час візыту задзейнічае ўсе рэсурсы, намагаючыся палепшыць сытуацыю ў населеных пунктах па шляху візытантаў. Гэтая традыцыя дэманстрацыйнага дабрабыту захавалася й цяпер. Такім чынам, зь зьяўленьнем найвышэйшага кіраўніка ўмовы жыцьця ў населеным пункце, як правіла, паляпшаюцца. У варунках беларускай правінцыі, пры нізкім узроўні палітычнай і інтэлектуальнай культуры, гэты папулісцкі прыём цалкам апраўданы. Акрамя таго, падобнае турнэ па беларускіх рэгіёнах спрыяла кантролю за ляяльнасьцю чынавенства на месцах, прынамсі на нейкі час, дзякуючы асабістаму візыту прэзыдэнта ў рэгіён. Такім чынам, візыты прэзыдэнта Лукашэнкі ў рэгіёны спалучалі папулісцкую кампанію з інспэкцыямі вэртыкалі.

Пачынаючы з 30 жніўня, у Беларусі адбываліся вайсковыя манэўры «Нёман-2001», на якіх прэзыдэнт Лукашэнка прысутнічаў асабіста як Вярхоўны Галоўнакамандуючы. Вучэньні падрабязна асьвятляліся ў спэцыяльных рэпартажах Беларускага тэлебачаньня. Падчас вучэньняў, што трансьляваліся на ўсю краіну, адпрацоўваліся дзеяньні супраць тэрарыстычных фармаваньняў на тэрыторыі Беларусі; дзеяньні войскаў супраць праціўніка, які ўварваўся з тэрыторыі суседніх дзяржаваў, хаця канкрэтна не ўдакладнялася, што гэта за дзяржавы; адбіцьцё авіяцыйных налётаў. Гледачам беларускага каналу дэманстравалася маленькая пераможная абарончая вайна, хаця і ўмоўная.

Тым часам асьвятленьне дзейнасьці астатніх кандыдатаў на Беларускім тэлебачаньні на фоне чынаў прэзыдэнта рабілася ў іранічна-нэгатыўным рэчышчы.

Дзяржаўнымі СМІ для дыскрэдытацыі апазыцыі актыўна выкарыстоўваюцца крымінальныя справы супраць палітыкаў, што сталі ў апазыцыю да А. Лукашэнкі, а таксама супраць іхных сваякоў. У 2001 годзе інфармацыйная кампанія супраць М. Чыгіра разьвівалася дзяржаўнымі СМІ на падставе рэпартажаў і камэнтароў пра арышт ягонага сына, Аляксандра Чыгіра, нібыта за крадзяжы і гандаль запчасткамі аўтамабіляў. Абвінавачаньні й камэнтары, якія пераконвалі аўдыторыю ў вінаватасьці затрыманых, трансьляваліся Беларускім тэлебачаньнем адразу пасьля затрыманьня, пры адсутнасьці пастановы суду. Аналягічная тактыка раней ужывалася ў дачыненьні да самога М. Чыгіра.

Завядзеньне крымінальных справаў супраць прадстаўнікоў апазыцыі суправаджалася інфармацыйнай кампаніяй у дзяржаўных СМІ, якая апраўдвала такія захады і адначасова фармавала ў сваёй аўдыторыі нэгатыўнае стаўленьне да апазыцыі.

З набліжэньнем выбараў сталі больш складанымі варункі працы апазыцыйных выданьняў. У канцы жніўня ў Горадні былі арыштаваныя 64 тысячы асобнікаў не зарэгістраванай у Дзяржкамдруку расійскай газэты «Президент», якія накіроўваліся ў Калінінград.

Арыштаваны нумар газэты быў цалкам прысьвечаны палітычнай сытуацыі ў Беларусі напярэдадні выбараў. Адны толькі загалоўкі гэтага нумару газэты ўжо могуць сьведчыць шмат пра што: «Трэцяга ня дадзена: Аляксандар Лукашэнка ня мае права балятавацца ў прэзыдэнты», «Дзікае паляваньне караля Стаха: рэдакцыя газэты «Президент» атрымала пакет дакумэнтаў і відэаматэрыялаў, што паступілі ў Адміністрацыю прэзыдэнта Расійскай Фэдэрацыі. Усе дакумэнты аб’яднаныя адной тэмай — дачыненьне высокіх беларускіх урадоўцаў да дзейнасьці «эскадрону сьмерці» — спэцпадразьдзяленьня, што фізычна зьнішчала палітычных апанэнтаў А. Лукашэнкі» і да т.п. Некалькі матэрыялаў у арыштаваным выпуску газэты былі прысьвечаныя адзінаму кандыдату ў прэзыдэнты ад апазыцыі Ўладзімеру Ганчарыку.

17 жніўня ў Менску ў друкарні прыватнага выдавецтва «Мэджык» быў арыштаваны 400-тысячны наклад беларускай апазыцыйнай газэты «Наша свабода». Апэрацыю зьдзяйсьнялі супрацоўнікі АБЭЗ Першамайскага раёну сталіцы сумесна з прадстаўнікамі Дзяржкамітэту фінансавых расьсьледаваньняў. Арыштаваны спэцвыпуск прысьвячаўся передвыбарнай сытуацыі ў Беларусі, а таксама кандыдату Ўладзімеру Ганчарыку. Паводле сьведкаў — супрацоўнікаў «Мэджыка», прадстаўнікі праваахоўных органаў яшчэ ў ноч на пятніцу, калі друкаваўся наклад «Нашай свабоды», перакрылі ўсе выхады з памяшканьня друкарні. І ўсё ж такі частку накладу — 100 тысячаў асобнікаў — супрацоўнікі рэдакцыі змаглі вывезьці. Паводле афіцыйнай вэрсіі, тое, што адбылося ў друкарні «Мэджык», тлумачыцца тым, што адпаведныя дакумэнты на друк нумару газэты «не адпавядалі дзейнаму заканадаўству». Іначай кажучы, кіраўніцтва «Мэджыка» не паказала неабходных дакумэнтаў на патрабаваньне «органаў», паколькі яны знаходзіліся ў рэдакцыі «Нашай свабоды». Апрача таго, яны сапраўды ўтрымлівалі пэўныя недакладнасьці. Аднак усе гэтыя парушэньні не давалі права арыштоўваць накладу газэты. Карныя санкцыі ці да друкарні, ці да рэдакцыі — вось звыклыя меры пакараньня ў такіх выпадках. Такім чынам, відавочна, што ў ход пайшла не бугальтэрыя, а палітыка.

У Воршы ў рэдакцыю незалежнай мясцовай газэты «Куцейна» ўварваліся чацьвёра ў цывільным і, не паказаўшы ніякіх дакумэнтаў, пачалі ператрус. Супрацоўнікі рэдакцыі выклікалі нарад міліцыі, які прыбыў і паехаў. За гэты час адзін зь невядомых назваўся супрацоўнікам камітэту фінансавых расьсьледаваньняў, а іншы — супрацоўнікам КДБ. За тры гадзіны зьявілася абвінавачаньне ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці і выданьні газэты безь ліцэнзіі. Галоўны рэдактар заявіў пра беспадстаўнасьць абвінавачаньняў. Але чатыры

кампутары і надрукаваныя асобнікі газэты былі канфіскаваныя.

31 жніўня два спэцвыпускі незалежнай «Предпринимательской газеты» выйшлі зь белымі плямамі. Як паведаміла «Радыё Рацыя», зьнятыя з друку матэрыялы аспрэчвалі законнасьць балятаваньня Аляксандра Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта. У іх даводзілася, што Аляксандар Лукашэнка зьбіраецца заняць прэзыдэнцкую пасаду ўжо ў трэці раз, хаця паводле Канстытуцыі прэзыдэнт можа знаходзіцца ўва ўладзе толькі два тэрміны.

Напярэдадні выбараў дзяржаўныя СМІ распаўсюджвалі паведамленьні пра падрыўную дзейнасьць апазыцыі ў хаўрусе з замежнымі спэцслужбамі. Спасылаючыся на нейкі маскоўскі цэнтар «Незалежная палітычная экспэртыза», які перадаў аналітычныя нататкі ў Дзяржаўны сакратарыят Рады бясьпекі Беларусі, дзяржаўныя СМІ распаўсюджвалі інфармацыю пра тое, што на тэрыторыі Беларусі праводзіцца апэрацыя «Белы бусел», накіраваная на зрынаньне прэзыдэнта Лукашэнкі паводле югаслаўскага сцэнару. Задарма распаўсюджваўся спэцвыпуск дзяржаўнай газэты «Советская Белоруссия» ад 5 верасьня, выдадзены дадатковым накладам. Газэту разносілі выбарцам, якія не падпісваліся на «Советскую Белоруссию». У спэцвыпуску ўтрымліваліся заклікі да людзей галасаваць за Аляксандра Лукашэнку, а таксама праграма прэзыдэнта «За моцную і квітнеючую Беларусь».

9 верасьня былі заблякаваныя інтэрнэт-сайты апазыцыйных арганізацыяў і СМІ, якія плянавалі асьвятляць працэс выбараў у рэжыме *on line*. У іх ліку былі заблякаваныя інтэрнэт-рэсурсы «Хартыі’97», «БДГ-online», «Радыё Свабода», «Радыё Рацыя», «Нашай Нівы», праваабарончага цэнтру «Вясна», «Маладога фронту» і іншых, уключаючы сайт менскага прадстаўніцтва IREX. Гэта было дастаткова проста зрабіць, паколькі асноўныя рэсурсы Інтэрнэту ў Беларусі кантралюе дзяржаўная арганізацыя «Белтэлекам».

Была таксама ўжытая тэлефонная блякада. У замежных карэспандэнтаў узьнікалі праблемы пры перадачы паведамленьняў у свае агенцыі і рэдакцыі. У сярэдзіне дня беларускія спэцслужбы прыпынілі працу перасоўнага тэлевізійнага комплексу Эўрапейскага вяшчальнага саюзу, рэпартажы зь Беларусі ішлі з затрымкай.

## Эфэктыўнасьць прапаганды ў дзяржаўных СМІ

Узмацненьне рэпрэсіяў, здольных стымуляваць радыкалізацыю іншадумцаў і, у тым ліку, цяперашняй палітычнай апазыцыі, нявыгаднае беларускаму прэзыдэнту. Аляксандру Лукашэнку патрэбная слабая, разрозьненая, кантраляваная апазыцыя, якая хаця й пратэстуе супраць беларускага рэжыму, але пазьбягае рашучых дзеяньняў. Такая апазыцыя забясьпечыць бачнасьць дэмакратыі і неабходны вобраз ворага для прэзыдэнцкага электарату.

Супраць апазыцыйных выданьняў выкарыстоўваюць у першую чаргу не паліцэйскія сілы, а падпарадкаваны прэзыдэнту бюракратычны апарат. Асноўныя перашкоды ў дзейнасьці апазыцыйных СМІ ствараюцца з дапамогаю адміністрацыйных захадаў: кампаніяў перарэгістрацыі незалежных ад дзяржавы выданьняў і падатковага кантролю. Выпуск апазыцыйных выданьняў можа быць прыпынены ў дзяржаўных друкарнях, магчымае зьняцьцё з друку некаторых матэрыялаў, у выніку чаго нумары апазыцыйных газэт могуць выйсьці зь белымі палосамі.

Такім чынам 6 ліпеня быў сарваны выпуск нумару газэты «День», у якім было зьмешчанае інтэрвію з былым кіраўніком справаў прэзыдэнта Іванам Ціцянковым. Гэты нумар павінен быў выйсьці накладам 55 600 асобнікаў пры звычайным накладзе ў 8000 асобнікаў. Але

ў дзяржаўнай друкарні нумар быў надрукаваны накладам толькі ў 5600 асобнікаў. Аднак раніцой гэты суботні выпуск так і не зьявіўся ў шапіках Менску, абласных і раённых цэнтраў. Але інтэрвію з былым кіраўніком справаў прэзыдэнта ўсё адно было апублікаванае ў апазыцыйнай прэсе.

У цэлым улады пазьбягалі адкрытага гвалту што да да апазыцыйных СМІ, па магчымасьці імкнуліся ствараць бачнасьць законнасьці, аддаючы перавагу эканамічнаму і адміністрацыйнаму ціску. Прапагандысцкая кампанія на карысьць А. Лукашэнкі ішла ў сытуацыі, калі апазыцыя ня мела доступу да этэру і дзяржаўнага друку, манапалізаваных прэзыдэнцкай вэртыкальлю. Аднак у Беларусі ўсё ж існуе пэўная свабода слова, хаця інфармацыйныя рэсурсы апазыцыі, і, у цэлым, іншадумцаў, для выказваньня свайго пункту погляду значна сьціплейшыя.

Дзяржаўныя СМІ, якія абслугоўваюць рэжым, знаходзяцца ў нашмат выгаднейшых умовах у параўнаньні з апазыцыйнымі. Яны забясьпечаныя паліграфічнымі магутнасьцямі, памяшканьнямі і фінансавымі рэсурсамі. Іхны наклад значна вышэйшы за наклад апазыцыйных газэт.

Напрыклад, наклад найбольш папулярных апазыцыйных і незалежных СМІ на момант выбараў 2001 г. быў наступны. Газэта «Белорусский рынок» — 13 000 асобнікаў; «Белорусская газета» — 15 000 асобнікаў; «Белорусская деловая газета» — 18 600, «Народная воля» — 41 780, «Наша Ніва» — 5600, «Наша свабода» — ад 9 000 да 10 000 асобнікаў; газэта «Товарищ», заснаваная Цэнтральным камітэтам Партыі камуністаў беларускай, — 8 000; выданьне Фэдэрацыі прафсаюзаў «Беларускі час» — 42 000 асобнікаў. У той жа час наклад адной толькі прапрэзыдэнцкай газэты «Советская Белоруссия» складаў 380 493 асобнікі, суботніх выпускаў — 438 333 асобнікі. Ляяльная да Лукашэнкі «Народная газета» выдавалася накладам 89189 асобнікаў.

Аднак пры фактычнай манаполіі прэзыдэнта на дзяржаўныя СМІ, папулярнасьць беларускіх інфармацыйна-прапагандысцкіх тэлеперадач у гледачоў дастаткова нізкая. Прафэсійны ўзровень гэтых перадач вельмі невысокі і адпавядае ўзроўню савецкай прапаганды на Беларускім тэлебачаньні ў пэрыяд позьняга СССР. Зацягнутыя сюжэты, паўтараныя шматкроць ідэалягічныя штампы, суседзтва з больш прафэсійнымі і цікавымі расійскімі каналамі, якія іначай асьвятляюць становішча ў Беларусі, звужаюць аўдыторыю беларускіх інфармацыйных праграмаў. Таму эфэктыўнасьць уласна электронных беларускіх СМІ невысокая. Пра гэта сьведчаць дадзеныя сацыялягічнага апытаньня, праведзенага ў чэрвені 2001 г. Гэтак, насуперак прапагандысцкай кампаніі супраць дзейнасьці АБСЭ ў Беларусі, распачатай Беларускім тэлебачаньнем, пра тое, хто такі Ганс-Георг Вік, у чэрвені ведала менш за палову рэспандэнтаў (гл. табліцу).

Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Беларускія ўлады заявілі пра магчымасьць высылкі з краіны кіраўніка КНГ АБСЭ пасла Г.-Г. Віка, паколькі, на іх думку, ён парушае беларускія законы. Што Вы пра гэта думаеце?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Я падтрымліваю намеры беларускіх уладаў, паколькі дзейнасьць пасла Г.-Г. Віка парушае беларускія законы | 12.8 |
| Я не падтрымліваю намераў беларускіх уладаў, паколькі дзейнасьць пасла Г.-Г. Віка не парушае беларускіх законаў | 18.6 |
| Нічога не чуў пра дзейнасьць пасла Г.-Г. Віка | 55.0 |
| Цяжка адказаць/Ня могуць адказаць (далей адпаведна ЦА і НА) | 13.5 |

Крыніца: НІСЭПД.

Хаця беларусы глядзяць праграмы дзяржаўнага тэлебачаньня, інфармацыйныя перадачы 2001 г. не карыстаюцца ў іх высокай папулярнасьцю. Больш за траціну апытаных НІСЭПД у чэрвені іх проста не глядзелі. Сур'ёзнага пагаршэньня адносінаў да апазыцыі мэтанакіраваная тэлевізійная прапаганда таксама не дасягае (гл. табліцу).

Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Апошнім часам на Беларускім тэлебачаньні выходзяць перадачы, у якіх рэзка крытыкуецца дзейнасьць апазыцыі. Як гэтыя перадачы паўплывалі на Вашае меркаваньне пра апазыцыю?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Яно пагоршылася | 9.6 |
| Яно палепшылася | 4.5 |
| Яно не зьмянілася | 36.9 |
| Я не глядзеў такіх перадачаў | 41.7 |
| ЦА/НА | 7.3 |

Крыніца: НІСЭПД.

Дзяржаўнае Беларускае тэлебачаньне ня мае істотнага ўплыву як на меркаваньне беларускіх элітаў, так і на думку шараговых грамадзянаў. Ніжэй прыводзяцца дадзеныя апытаньня беларускіх элітаў, праведзенага НІСЭПД у ліпені 2001 году.

Апошнім часам на Беларускім тэлебачаньні выходзяць перадачы, у якіх рэзка крытыкуецца дзейнасьць апазыцыі. Ці зьмянілася пасьля прагляду гэтых перадач Вашае меркаваньне пра апазыцыю?

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Тыя, хто працуе ў дзяржсектары | Тыя, хто не працуе ў дзяржсектары |
|---|---|---|---|
| Яно пагоршылася | 18.5 | 17.9 | 18.9 |
| Яно палепшылася | 66.2 | 64.3 | 67.6 |
| Яно не зьмянілася | 1.5 | — | 2.7 |
| Я не глядзеў такіх перадачаў | 13.8 | 17.8 | 10,8 |

Крыніца: НІСЭПД.

Якраз эліта найбольш уважліва сочыць за выступамі Аляксандра Лукашэнкі на Беларускім тэлебачаньні. І, у значнай ступені, акурат на беларускіх урадоўцаў быў разьлічаны выступ прэзыдэнта 31 ліпеня 2001 г. Хаця ўрадоўцы могуць не згаджацца зь дзеяньнямі прэзыдэнта, яны ўсё яшчэ дастаткова залежныя і недастаткова арганізаваныя. Іх стаўленьне да кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі і рэальныя дзеяньні ў працэсе падрыхтоўкі да выбараў цалкам могуць не супадаць.

## Расійскі чыньнік у беларускай інфармацыйнай прасторы

У інфармацыйнай прасторы Беларусі, занятай электроннымі СМІ, у 2001 г. дамінавала Расія. На момант прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ў Беларусі налічвалася тры асноўныя тэлевізійныя каналы: Беларускае тэлебачаньне, канал ОРТ і РТР. Апошнія два каналы — расійскія. У Менску зь сямёх бясплатных тэлевізійных каналаў беларускім быў адно дзяр-

жаўны канал БТ. Расійскія: ОРТ, РТР, Культура, НТВ, TV-6. Сталічны канал СТВ+RenTV, створаны на базе сталічнага Восьмага каналу, насамрэч ёсьць філіяй расійскага каналу RenTV.

Ступень даверу беларускага грамадзтва да расійскіх электронных СМІ была значна вышэйшая, чымся да беларускіх. Акурат яны, больш за беларускія незалежныя СМІ, здольныя былі паўплываць на тую частку беларускага электарату, якая вагаецца.

Зь лютага 2001 году, пачынаючы зь візыту А. Лукашэнкі ў Маскву ў часе Дзён беларускай культуры, расійскія каналы трансьлявалі рэпартажы пра побыт беларускага прэзыдэнта ў Маскве. Улетку 2001 году якраз расійскае тэлебачаньне ўпершыню за апошнія гады трансьлявала выступы некаторых беларускіх палітыкаў, якія прэтэндавалі на імідж «апазыцыйных».

7 чэрвеня, у дзень, калі Нацыянальны сход Беларусі абвясьціў дату прэзыдэнцкіх выбараў, а 15 гадзіне па расійскім канале НТВ было паказанае інтэрвію з Л. Сініцыным. У ім Сініцын у абсурднай манэры заявіў, што А. Лукашэнка можа аб’явіць сябе прэзыдэнтам, які набраў 130% галасоў, і ніхто ня зможа яго спыніць. Тады ж 7 чэрвеня, у вечаровым тэлеэтэры папулярнага ў Беларусі каналу ОРТ з інтэрвію тэлевядучаму Аляксандру Любімаву выступіў галава Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Беларусі Ганс-Георг Вік.

8 траўня а 21 гадзіне паводле беларускага часу ў Беларусі была раптоўна перапыненая трансьляцыя расійскіх тэлеканалаў ОРТ, РТР, НТВ. Беларускае тэлебачаньне трансьлявала свае перадачы па ўсіх каналах да канца гэтага дня. 9 траўня працягвалася дэманстрацыя праграмаў Беларускага тэлебачаньня па ўсіх расійскіх каналах, што вяшчаюць на Беларусь. Глядзець расійскія перадачы маглі толькі ўладальнікі спадарожнікавых антэнаў, а іх у Беларусі вельмі мала.

Адказнасьць за адключэньне расійскага тэлевяшчаньня ўзяў на сябе першы намесьнік галавы Адміністрацыі прэзыдэнта Ўладзімер Замяталін, растлумачыўшы гэта як часовую рэалізацыю сувэрэнітэту краіны. Напярэдадні чакалася прыбыцьцё ў Маскву на запрашэньне Фонду абароны галоснасьці пяцёх апазыцыйных прэтэндэнтаў на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. Тым ня менш, вяшчаньне расійскіх каналаў было адноўленае.

У нядзелю 10 чэрвеня па канале ОРТ у папулярнай праграме расійскага журналіста Ўладзімера Познэра «Времена» выступілі Сямён Домаш, Павал Казлоўскі, Сяргей Калякін, Міхаіл Чыгір і лідэр АГП Анатоль Лябедзька. Праграма трансьлявалася ў тым ліку і на Беларусь. У час перадачы былі выказаныя заўвагі пра тое, што насуперак інтэграцыйным расійска-беларускім пагадненьням і стварэньню саюзных структураў Беларусі й Расіі, інтэграцыя немагчымая праз прынцыпова адрозную арганізацыю эканомік: камандна-адміністрацыйную ў Беларусі і рынкавую ў Расіі.

На баку беларускага прэзыдэнта ў тэлеперадачы Ўладзімера Познэра выступіў дэпутат Дзяржаўнай думы Расіі камуніст Георгі Ціханаў. Аднак і ён, у выніку, вымушаны быў канстатаваць, што інтэграцыя Расіі й Беларусі на цяперашнім этапе немагчымая праз адрозьненьні ў дзяржаўных сыстэмах. Сам Аляксандр Лукашэнка ў праграме ня ўдзельнічаў. Характэрна, што беларускі прэзыдэнт пазьбягае адкрытай палемікі з апанэнтамі. Ягоныя выступы ў электронных СМІ праходзяць у рэжыме маналёгу. Як паведаміў вядучы перадачы Ўладзімер Познэр, ён накіроўваў пэрсанальнае запрашэньне Аляксандру Лукашэнку, але адказу не атрымаў. Пазьней Аляксандар Лукашэнка абвінаваціў апазыцыянэраў у тым, што яны шчодра заплацілі за свой удзел у праграме для рэклямы на ОРТ. Уладзімер Познэр спраставаў заяву беларускага прэзыдэнта, паведаміўшы, што ўдзельнікі перадачы ня плацяць за свой удзел і выступы.

У красавіку 2001 году НІСЭПД вывучаў стаўленьне грамадзтва да беларускіх і расійскіх радыёстанцыяў і прэсы.

У радыёэтэры асноўнымі канкурэнтамі беларускаму дзяржаўнаму радыё ёсьць не Беларуская служба Радыё «Свабода», а расійскія або расійскамоўныя беларускія радыёстанцыі (гл. табліцу).

Якія радыёстанцыі вы слухаеце, %

| Варыянт адказу | Слухаю | Не слухаю | НА |
|---|---|---|---|
| Беларускае дзяржаўнае радыё | 52.6 | 43.0 | 4.4 |
| FM-станцыі (Бі-Эй, Радыё-Рокс, Альфа-Радыё, Радыё-Століца і інш.) | 44.1 | 49.4 | 6.5 |
| Мясцовае радыё | 45.5 | 49.1 | 5.4 |
| Расійскія радыёстанцыі | 40.8 | 53.3 | 5.9 |
| Беларуская служба Радыё «Свабода» | 14.0 | 78.7 | 7.3 |
| Расійская служба Радыё «Свабода» | 10.4 | 82.0 | 7.6 |
| Іншыя заходнія радыёстанцыі | 11.4 | 80.0 | 8.6 |
| Радыё «Балтыйскія хвалі» | 2.4 | 88.9 | 8.7 |
| Радыё «Рацыя» | 2.3 | 88.7 | 9.0 |
| Іншая радыёстанцыя | 5.5 | 63.9 | 30.6 |

Крыніца: НІСЭПД.

Згаданыя ў апытаньні FM-станцыі вядуць вяшчаньне на расійскай мове і займаюць згодніцкую палітычную пазыцыю, абмяжоўваючыся кароткімі навінамі пра палітычныя падзеі, зьвязаныя зь Беларусяй. Беларускае дзяржаўнае радыё знаходзіцца пад поўным кантролем прэзыдэнцкае вэртыкалі. Дэмакратычныя вартасьці ў Беларусі прапагандавалі толькі тры радыёстанцыі — Радыё Свабода, Радыё Рацыя і радыё «Балтыйскія хвалі».

У рэйтынгу даверу друкаваным выданьням у красавіку 2001 году першае месца занялі расійскія выданьні, якія мелі беларускія выпускі. Гэта, у першую чаргу, папулярныя яшчэ з часоў перабудовы газэты «Аргументы и факты» і «Комсомольская правда» (гл. табліцу).

Якім газэтам вы давяраеце, %

| Варыянт адказу | Давяраю | Не давяраю | ЦА/НА |
|---|---|---|---|
| «Аргументы и факты» в Белоруссии» | 42.4 | 10.8 | 46.8 |
| «Комсомольская правда в Белоруссии» | 34.1 | 13.6 | 52.3 |
| «Советская Белоруссия» | 34.7 | 20.7 | 44.6 |
| «Белорусская деловая газета» | 18.7 | 13.9 | 67.4 |
| «Труд» в Белоруссии | 20.9 | 15.3 | 63.8 |
| Мясцовая недзяржаўная газета («Брестский курьер» і да т. п.) | 15.9 | 15.7 | 68.4 |
| «Известия» в Белоруссии» | 15.5 | 15.8 | 68.7 |
| Мясцовая дзяржаўная газета («Гомельская праўда», «Магілёўская праўда» і да т. п.) | 17.0 | 18.7 | 64.3 |
| «Свободные новости» | 14.7 | 17.5 | 67.8 |
| «Народная воля» | 16.1 | 20.1 | 63.8 |
| «Белорусский рынок» | 10.5 | 15.7 | 73.8 |
| «Белорусская газета» | 9.8 | 16.7 | 73.5 |
| «Наша свабода» | 8.9 | 18.3 | 72.8 |

Крыніца: НІСЭПД.

Досыць вялікая аўдыторыя чытачоў давярала прапрэзыдэнцкай «Советской Белоруссии» — каля траціны апытаных, што прыблізна адпавядае колькасьці прыхільнікаў А. Лукашэнкі ў беларускім грамадзтве. Сама газэта захавала сваю назву з часоў СССР.

## Дзяржаўныя СМІ як выразьнік установак беларускага рэжыму

У лютым-сакавіку 2001 году НІСЭПД правёў дасьледаваньне сацыяльна-палітычных пазыцыяў СМІ, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі. Праводзіўся параўнальны аналіз іхных сталых аўдыторыяў (гл. табліцу).

Аўдыторыя беларускага недзяржаўнага і заходняга радыё, карыстальнікі Інтэрнэту падзяляюць дэмакратычныя вартасьці, падтрымліваюць незалежнасьць Беларусі, паважаюць міжнародныя структуры. Аўдыторыя беларускага дзяржаўнага радыё і тэлебачаньня настроеная антыдэмакратычна, не давярае міжнародным структурам, ня цэніць незалежнасьці. Гледачы расійскіх тэлеканалаў складаюць асноўную масу тых, хто ня вызначыўся з прыярытэтамі.

Беларускае і расійскае тэлебачаньне ёсьць найбольш даступным для бальшыні беларускага насельніцтва, масавым. Спадарожнікавае тэлебачаньне і Інтэрнэт былі даступныя людзям з высокім, па беларускіх мерках, дабрабытам. Аднак, улічваючы дадзеныя сацыялягічных апытаньняў, датычных беларускіх СМІ, у чэрвені 2001 году, правамерна меркаваць, што пазытыўнае стаўленьне электарату Аляксандра Лукашэнкі да прэзыдэнта вызначалася ня столькі дзейнасьцю беларускіх СМІ, колькі самі палітычныя прыхільнасьці прыхільнікаў Аляксандра Лукашэнкі вызначалі перавагі ў сфэры СМІ. Паводле дадзеных чэрвеньскіх дасьледаваньняў НІСЭПД, больш за 70% беларускага насельніцтва не паддавалася ўплыву беларускай тэлевізійнай прапаганды.

Беларускія СМІ ня столькі прадукуюць уяўленьні сваёй сталай аўдыторыі, колькі ўзнаўляюць тыя яе ўяўленьні, якія ўжо ўкарэніліся на ўзроўні здаровага глузду, засвоіліся ў савецкі час і нязначна трансфармаваліся ў постсавецкі пэрыяд.

Паводзіны гледачоў Беларускага тэлебачаньня, і, у цэлым, спажыўцоў інфармацыі дзяржаўных СМІ Беларусі, укладаюцца ў мадэль кагнітыўнага дысанансу Леона Фэстынгера[2]. Прыхільнікі прэзыдэнта аддаюць перавагу тым крыніцам інфармацыі, якія даюць ім паведамленьні, што адпавядаюць іхным уяўленьням пра ролю палітычнага лідэра, зьдзяйсьненьне дзяржаўнае ўлады і сацыяльнае справядлівасьці, нават калі гэтыя ўяўленьні і не адпавядаюць рэчаіснасьці.

## Інфармацыйная палітыка беларускай апазыцыі

У перадвыбарнай тактыцы беларускай апазыцыі прасочвалася тая ж стаўка на пратэставае галасаваньне, што і ў каманды А. Лукашэнкі ў 1994 годзе. Калі асноўным рэсурсам прэзыдэнта быў адміністрацыйны, дык апазыцыя імкнулася выкарыстаць супраць А. Лукашэнкі

[2] Гл. Фестингер Леон. Теория когнитивного диссонанса: пер. с англ. СПб.: «Ювента», 1999. 318 с.

Табліца. Параўнальны сацыяльна-палітычны партрэт сталых аўдыторыяў розных мас-мэдыяў, %

| Сацыяльна-палітычныя характарыстыкі | [illegible] | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Радыё | | | ТВ | | | Інтэрнэтам (0.5) |
| | БР* (47.0) | FM* (12.9) | ЗР* (1.1) | БТ* (52.7) | РТ* (85.1) | ЗТ* (1.2) | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| Задаволеныя тым, як А. Лукашэнка кіраваў краінай цягам апошніх гадоў: | | | | | | | |
| · Хутчэй так | 28.7 | 14.9 | 6.8 | 38.2 | 27.7 | 5.6 | 0 |
| · Часткова так, часткова не | 42.9 | 38.8 | 31.6 | 42.2 | 42.2 | 50.8 | 60.3 |
| · Хутчэй не | 17.3 | 44.5 | 56.8 | 18.1 | 29.2 | 43.7 | 39.7 |
| Жадаюць, каб А. Лукашэнка быў прэзыдэнтам нашай краіны яшчэ адзін тэрмін: | | | | | | | |
| · Так | 55.6 | 21.2 | 27.6 | 54.0 | 39.6 | 16.0 | 0 |
| · Не | 18.3 | 50.7 | 56.1 | 18.8 | 33.5 | 45.7 | 65.7 |
| Лічаць, што калі А. Лукашэнка будзе абраны на новы тэрмін, яго палітыка: | | | | | | | |
| · Можа стаць больш прагрэсіўнай | 21.0 | 10.7 | 19.9 | 33.4 | 23.6 | 5.2 | 0 |
| · Можа стаць больш рэакцыйнай | 9.1 | 20.3 | 20.1 | 3.3 | 14.7 | 10.1 | 10.2 |
| · Застанецца ранейшай | 43.1 | 58.2 | 53.7 | 43.0 | 47.4 | 69.5 | 58.6 |
| Зьбіраюцца ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах: | | | | | | | |
| · Так | 87.2 | 70.1 | 83.4 | 87.0 | 77.6 | 47.6 | 74.0 |
| · Прымуць рашэньне ў залежнасьці ад палітычнай абстаноўкі | 7.5 | 12.8 | 16.6 | 7.1 | 10.1 | 33.3 | 16.0 |
| · Не | 3.7 | 10.4 | 0 | 4.9 | 6.7 | 13.3 | 0 |
| Палажэньні праграм кандыдатаў у прэзыдэнты, якія будуць найбольш важнымі пры галасаваньні: | | | | | | | |
| · Працяг цяперашняй палітыкі А. Лукашэнкі | 53.6 | 21.5 | 20.6 | 52.5 | 39.2 | 11.3 | 16.2 |
| · Карэнная зьмена цяперашняй палітыкі А. Лукашэнкі | 29.7 | 12.1 | 74.7 | 42.3 | 56.1 | 71.0 | 74.8 |
| · Умацаваньне незалежнасьці Беларусі | 31.1 | 58.9 | 63.7 | 33.1 | 39.0 | 80.0 | 100 |
| · Далейшая інтэграцыя Беларусі з Расіяй | 66.3 | 39.2 | 36.3 | 65.4 | 59.2 | 20.0 | 0 |

разнастайныя скандалы, зьвязаныя з парушэньнем правоў чалавека і законаў Беларусі. Прычым чуткі й паведамленьні, праўдзівасьць якіх пэўна не даведзеная, не абавязкова зыходзяць беспасярэдне ад прадстаўнікоў беларускай палітычнай апазыцыі.

* БР — Беларускае дзяржаўнае радыё, FM — прыватныя беларускія радыёстанцыі, ЗР — замежныя радыёстанцыі (апрача расійскіх!), БТ — Беларускае дзяржаўнае тэлебачаньне, РТ — расійскія тэлеканалы, ЗТ — замежныя тэлеканалы.

Працяг табліцы.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Працягваньне рынкавых рэформаў | 50.4 | 82.1 | 93.0 | 51.2 | 63.8 | 94.5 | 100 |
| Працяг папярэдняга эканамічнага курсу | 42.3 | 12.7 | 7.0 | 42.8 | 31.2 | 5.5 | 0 |
| Умацаваньне парадку й законнасьці праз удасканаленьне заканадаўства, кантроль грамадзтва над сілавымі структурамі | 76.5 | 85.4 | 87.5 | 77.6 | 79.9 | 78.0 | 100 |
| Умацаваньне парадку й законнасьці праз пашырэньне сілавых структураў і іх функцыяў | 19.7 | 11.1 | 12.5 | 19.6 | 17.5 | 22.0 | 0 |
| Павялічэньне ролі дзяржавы ў палітыцы й эканоміцы | 38.2 | 21.1 | 22.6 | 39.8 | 32.0 | 30.1 | 16.2 |
| Павялічэньне ролі самых грамадзян у палітыцы й эканоміцы | 53.5 | 71.7 | 73.9 | 53.6 | 62.7 | 69.9 | 74.8 |
| Калі б заўтра адбыліся прэзыдэнцкія выбары, за каго галасавалі б вы (адкрытае пытаньне): | | | | | | | |
| А. Лукашэнку | 57.6 | 23.1 | 29.3 | 58.2 | 43.0 | 16.9 | 0 |
| Альтэрнатыўнага кандыдата* | 1.7 | 10.8 | 8.5 | 5.5 | 9.0 | 11.2 | 20.1 |
| Выбары прэзыдэнта Беларусі ў 2001 годзе будуць свабоднымі й справядлівымі: | | | | | | | |
| Так | 52.2 | 22.1 | 16.2 | 51.3 | 38.8 | 23.2 | 18.1 |
| Не | 17.1 | 44.2 | 57.8 | 18.6 | 28.2 | 45.8 | 41.0 |
| ЦА | 30.8 | 33.6 | 26.0 | 30.2 | 33.0 | 31.0 | 40.9 |
| Гатоўнасьць людзей у Беларусі выражаць свае палітычныя погляды: | | | | | | | |
| Ніхто не баіцца | 23.5 | 13.3 | 17.6 | 35.4 | 20.2 | 10.5 | 0 |
| Некаторыя людзі баяцца | 33.5 | 35.7 | 28.5 | 34.1 | 34.0 | 33.2 | 24.7 |
| Многія людзі баяцца | 26.5 | 39.1 | 50.1 | 24.3 | 30.5 | 47.2 | 75.3 |
| Усе баяцца | 5.1 | 7.4 | 3.8 | 5.8 | 6.7 | 7.8 | 0 |
| ЦА | 11.4 | 4.5 | 0 | 10.4 | 8.6 | 5.3 | 0 |
| Стаўленьне да мітынгу прафсаюзаў 14 лютага 2001 г.: | | | | | | | |
| Дадатнае | 51.3 | 62.5 | 83.6 | 50.7 | 55.8 | 85.1 | 15.1 |
| Абыякавае | 7.4 | 14.4 | 11.3 | 7.9 | 8.3 | 5.6 | 50.7 |
| Адмоўнае | 11.5 | 5.4 | 0 | 11.6 | 8.3 | 3.0 | 9.1 |
| Нічога не ведаюць пра гэта | 20.4 | 16.4 | 0 | 20.4 | 20.2 | 5.2 | 25.2 |

З пачатку 2001 году ў расійскіх і беларускіх незалежных СМІ сталі зьяўляцца публікацыі, у якіх А. Лукашэнку прыпісваўся дыягназ «мазаічная псыхапатыя». Дыягназ быў пастаўле-

* Пад альтэрнатыўнымі кандыдатамі разумеліся палітыкі, якія заявілі пра свой намер балятавацца на пост прэзыдэнта Беларусі: Сяргей Гайдукевіч, Уладзімер Ганчарык, Сямён Домаш, Сяргей Калякін, Павал Казлоўскі, Зянон Пазьняк, Міхаіл Чыгір.

Заканчэньне табліцы.

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Найлепшым варыянтам узаемаадносінаў Беларусі й Расіі лічаць: | | | | | | | |
| · Добрасуседзкія стасункі дзьвюх незалежных дзяржаваў | 21.0 | 42.2 | 54.3 | 22.2 | 28.4 | 44.1 | 68.8 |
| · Саюз незалежных дзяржаваў | 28.4 | 32.3 | 31.3 | 29.3 | 30.4 | 30.0 | 16.2 |
| · Аб'яднаньне ў адну дзяржаву | 48.5 | 22.1 | 14.4 | 46.5 | 38.7 | 14.5 | 0 |
| Да падрыхтоўкі КНГ АБСЭ 14 тысячаў незалежных назіральнікаў для кантролю за ходам галасаваньня на выбарах прэзыдэнта ставяцца: | | | | | | | |
| · Дадатна | 41.9 | 67.3 | 52.2 | 42.4 | 51.0 | 63.7 | 83.8 |
| · Адмоўна | 20.7 | 4.1 | 4.5 | 19.9 | 14.1 | 3.9 | 0 |
| · Нічога не чулі пра гэта | 20.0 | 18.8 | 18.7 | 20.5 | 20.1 | 26.4 | 16.2 |
| Лічаць, што КНГ АБСЭ парушае беларускія законы: | | | | | | | |
| · Так, парушае | 20.3 | 7.1 | 30.3 | 20.1 | 15.3 | 23.8 | 0 |
| · Не, не парушае | 24.5 | 46.6 | 45.5 | 24.3 | 32.6 | 46.7 | 83.8 |
| · Нічога не чулі пра КНГ | 20.1 | 17.3 | 6.8 | 19.5 | 19.5 | 20.3 | 16.2 |
| Ці можна давяраць лічбам і аналізу незалежных дасьледчых цэнтраў: | | | | | | | |
| · Так, паколькі яны даюць грамадзянам аб'ектыўную інфармацыю | 32.2 | 13.9 | 36.9 | 33.9 | 38.1 | 55.6 | 50.5 |
| · Не, паколькі яны сьвядома даюць грамадзянам перакручаную інфармацыю ў інтарэсах тых, хто ім плаціць | 15.3 | 12.9 | 31.6 | 15.3 | 15.1 | 22.7 | 0 |
| · Нічога не чулі пра такія цэнтры | 19.9 | 10.9 | 0 | 17.7 | 15.4 | 10.5 | 0 |
| · ЦА | 32.6 | 32.3 | 31.5 | 33.2 | 31.2 | 11.1 | 49.5 |

Крыніца: НІСЭПД.

ны беларускім лекарам-псыхіятрам, выпускніком Гарадзенскага мэдычнага інстытуту Зьмітром Шчыгельскім у заключэньні «Гісторыя хваробы Аляксандра Лукашэнкі», апублікаваным пасьля таго, як сам Зьміцер Шчыгельскі выехаў у ЗША. Паводле матэрыялаў, разьмешчаных у электронным выданьні «Газета.Ру», «у Лукашэнкі кансыліюмам дактароў (Шчыгельскі ўзгадніў свае высновы зь яшчэ як мінімум трыма лекарамі-псыхіятрамі) дыягнаставанае наступнае захворваньне: «мерна выражаная мазаічная псыхапатыя зь пераважаньнем рысаў паранаідальнага і дысацыяльнага разладаў асобы». Гэтая выснова зроблена на падставе працяглага завочнага назіраньня за Лукашэнкам А., у тым ліку на аснове шматкроць трансьляваных па Беларускім тэлебачаньні сэлектарных нарадаў прэзыдэнта, ягоных выступаў перад дэпутатамі парлямэнту, успамінаў пра яго ягоных нядаўніх паплечнікаў, а таксама жонкі... Галоўная небясьпека палягае ў тым, што ягоная псыхапатыя, з гледзішча псыхіятраў, мае паранаідальныя рысы, характэрныя таксама для дысацыяльнага разладу асобы пры наяў-

насьці стрыжневай звышкаштоўнай ідэі ўласнае значнасьці. Канчатковы ж дыягназ, як, зрэшты, няцяжка было здагадацца, — «мазаічная псыхапатыя». Гэты ж дыягназ быў пастаўлены ў такіх вядомых асобаў, як Гітлер і Сталін. Пакутаваў ад яе й Мусаліні... З такім дыягназам Лукашэнка не павінен займаць пасаду галоўнакамандуючага беларускага войска. Патрабаваньні да здароўя вайскоўцаў беларускага войска цалкам дакладна апісаныя ў загадзе міністра абароны № 461 ад 4 жніўня 1998 году. «Мерна выражаная мазаічная псыхапатыя» трапляе пад абмежваньне артыкулу 76 гэтага загаду і прадугледжвае нядатнасьць да вайсковае службы ня толькі ў ваенны, але і ў мірны час. Таму Шчыгельскі ў сваім звароце да дэпутатаў парлямэнту заклікае іх тэрмінова арганізаваць адмысловую камісію для дадатковага агляду Лукашэнкі А. з мэтай вырашэньня пытаньня аб вызваленьні яго ад пасады прэзыдэнта».

У часе перадвыбарнай барацьбы апазыцыя актыўна выкарыстоўвала супраць А. Лукашэнкі і яго абкружэньня абвінавачаньні ў зьнікненьні беларускіх апазыцыйных дзеячоў: экс-міністра ўнутраных справаў Юр'я Захаранкі, зьніклага 7 траўня 1999 году, экс-старшыні Цэнтравыбаркаму Віктара Ганчара, бізнэсоўца Анатоля Красоўскага, журналіста расійскага тэлебачаньня Зьмітра Завадзкага, зьніклага 7 ліпеня 2000 году. У пачатку лета ў Беларусі ў спэцвыпусках газэты «Наша свабода», якія распаўсюджвалі ў беларускіх гарадох актывісты апазыцыйнага руху «Зубр», і ў спэцвыпусках прафсаюзнай газэты «Рабочы» была апублікаваная інфармацыя пра дзейнасьць створанага рэжымам беларускага эскадрону сьмерці, які зьнішчаў дзеячоў апазыцыі. Затым у апазыцыйных выданьнях пачалі публікаваць матэрыялы, прысьвечаныя зьнікненьням і сьледзтвам у справах зьніклых бязь вестак, а таксама ўскосным сьведчаньням дачыненьня Аляксандра Лукашэнкі й ягонага абкружэньня да зьнікненьняў.

6 ліпеня ў Маскве жонкі зьніклых палітыкаў сустракаліся з прадстаўнікамі расійскіх СМІ. Сьвятлана Завадзкая, Ірына Красоўская, Тацяна Клімава і Людміла Карпенка заявілі пра беспасярэдняе дачыненьне беларускай улады і асабіста Аляксандра Лукашэнкі да зьнікненьня/гібелі/зьняволеньня сваіх мужоў. 8 ліпеня Сьвятлана Завадзкая, Ірына Красоўская, Тацяна Клімава і Людміла Карпенка накіраваліся ў Парыж, дзе з 6 да 10 ліпеня адбывалася летняя сэсія Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ.

7 ліпеня, у гадавіну зьнікненьня Зьмітра Завадзкага, Беларуская асацыяцыя журналістаў зладзіла акцыю: блізу 40 журналістаў перадалі ў Генэральную пракуратуру і Міністэрства ўнутраных справаў зварот з патрабаваньнем адказаць: дзе Зьміцер Завадзкі? Кіраўніцтву сілавых структураў быў перададзены ліст, падпісаны 275 беларускімі й замежнымі журналістамі.

Ранкам 13 ліпеня кандыдат на пасаду Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі У. Ганчарык у экстраным парадку сабраў у штаб-кватэры Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай журналістаў і заявіў, што мае дакумэнты, якія пацьвярджаюць дачыненьне некаторых дзяржаўных чыноўнікаў да зьнікненьня дзеячоў апазыцыі. Журналістам былі раздадзеныя ксэракопіі дакумэнтаў, што датычылі зьнікненьняў. Сярод іх былі тлумачэньні асобаў, зьвязаных са справамі аб зьнікненьнях, матэрыялы допытаў, вынікі крыміналістычных экспэртызаў, у тым ліку фотаздымак пісталета, якім, нібыта, былі зьдзейсьнены забойствы. Паводле Ўладзімера Ганчарыка, дакумэнты датычылі зьнікненьня ў 1999 годзе былога міністра ўнутраных справаў Юр'я Захаранкі, намесьніка Старшыні Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара і бізнэсоўца Анатоля Красоўскага. Апэратар ОРТ Зьміцер Завадзкі, які зьнік на тэрыторыі Беларусі, ня быў згаданы.

Журналістам была прадэманстраваная ксэракопія рукапіснага тэксту, нібыта рапарту начальніка галоўнага ўпраўленьня крымінальнай міліцыі МУС генэрал-маёра Мікалая Лапаці-

ка міністру ўнутраных справаў Уладзімеру Навумаву. Генэрал-маёр Лапацік, у ліку іншых службовых асобаў, займаўся расьследаваньнем справаў пра зьнікненьні. У сваім рапарце за лістапад 2000 году Мікалай Лапацік паведамляў, што, паводле ягоных зьвестак, канкрэтныя асобы атрымлівалі даручэньні па фізычным зьнішчэньні былога міністра ўнутраных справаў Юр'я Захаранкі. За некалькі месяцаў гэтак сама захапілі і зьнішчылі В. Ганчара і бізнэсоўца А. Красоўскага. Былі названыя прозьвішчы асобаў, што давалі даручэньні, і беспасярэдніх выканаўцаў. Рапарт неўзабаве быў вернуты Мікалаю Лапаціку з рэзалюцыяй «Для выкананьня».

Матэрыялы, зь якімі Ўладзімер Ганчарык пазнаёміў журналістаў, былі атрыманыя ад невядомае асобы. Уладзімер Ганчарык ня стаў іх публікаваць цалкам, а даслаў разам са зваротам у Адміністрацыю прэзыдэнта дзеля таго, як паведаміў ягоны прэс-сакратар Зьміцер Верашчагін, каб прасачыць за рэакцыяй Аляксандра Лукашэнкі.

На прэсавай канфэрэнцыі, якая адбылася пазьней у той жа дзень, 13 ліпеня, міністар унутраных справаў У. Навумаў адмаўляў факт атрыманьня ад генэрал-маёра Мікалая Лапаціка рапарту, копію якога паказваў журналістам У. Ганчарык. Уладзімер Навумаў паведаміў, што пры канцы 2000 году генэрал-маёр Лапацік цяжка захварэў. У справе Зьмітра Завадзкага Ўладзімер Навумаў выказаў упэўненасьць, што ў гэтай справе будуць асуджаныя вінаватыя са злачыннай групы былога афіцэра спэцпадразьдзяленьня «Алмаз» Валера Ігнатовіча, заявіўшы, што матывам злачынства была помста Ігнатовіча за чачэнскі рэпартаж пра яго (аўтарства Зьмітра Завадзкага).

19 ліпеня ў Вашынгтоне жонкі зьніклых Анатоля Красоўскага і Зьмітра Завадзкага, удава Генадзя Карпенкі і жонка Андрэя Клімава, які ўжо тры з паловай гады сядзеў у турме, узялі ўдзел у прэсавай канфэрэнцыі, арганізаванай пры тэхнічнай дапамозе амбасады ЗША ў Менску. Яны выказалі ўпэўненасьць у замяшанасьці ў зьнікненьнях «эскадрону сьмерці», арганізаванага беларускімі ўладамі.

Намесьнік дзяржсакратара дзярждэпартамэнту ЗША Філіп Рыкер у заяве для прэсы паведаміў, што Злучаныя Штаты Амэрыкі занепакоеныя палітычна матываванымі зьнікненьнямі ў Беларусі, атмасфэрай палітычных рэпрэсіяў і сур'ёзна ўспрымаюць абвінавачаньні на адрас высокіх чыноўнікаў рэжыму Лукашэнкі. ЗША заклікалі беларускія ўлады правесьці поўнае й празрыстае расьследаваньне зьнікненьня Юр'я Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Зьмітра Завадзкага, паведаміць пра месца іх знаходжаньня. Жонкі зьніклых палітыкаў зьвярнуліся да міжнароднай супольнасьці з просьбай стварыць камісію, якая б назірала за расьследаваньнем.

8 жніўня адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі дзяржаўных і недзяржаўных СМІ. Адкрываючы сустрэчу, прэзыдэнт паведаміў, што апошнім часам на ягоны адрас паступалі шматлікія просьбы правесьці прэс-канфэрэнцыю з прадстаўнікамі вядучых СМІ. Прэзыдэнт заявіў, што на Захадзе ўсё больш актыўна вядуцца размовы пра неабходнасьць супрацоўніцтва зь Беларусяй, але Беларусь на Захадзе будзе адстойваць свае інтарэсы. Калі прадстаўнікі СМІ выказалі нездаўменьне з нагоды адсутнасьці рэакцыі прэзыдэнта на выкрываньні, агучаныя Ўладзімерам Ганчарыкам, Аляксандар Лукашэнка сказаў, што ён не абавязаны рэагаваць на кожны стрэл апазыцыі, а пададзеныя Ганчарыкам дакумэнты не вытрымліваюць аніякае крытыкі.

Скандалы, кампрамэтуючыя беларускі рэжым, былі закліка765ныя ўзмацніць пазыцыі канкурэнта Аляксандра Лукашэнкі на выбарах за кошт пратэставага галасаваньня. У красавіку й

чэрвені НІСЭПД праводзіў апытаньне з мэтай высьветліць стаўленьне грамадзтва да інфармацыі пра зьнікненьні людзей у Беларусі. Блізу паловы апытаных былі не задаволеныя ходам сьледзтва. Больш за чвэрць рэспандэнтаў была ўпэўненая, што ў зьнікненьні апэратара ОРТ Зьмітра Завадзкага замяшаныя беларускія спэцслужбы. Варта адзначыць, што гэтыя дадзеныя атрыманыя яшчэ да публікаваньня інтэрвію былых сьледчых пракуратуры Зьмітра Петрушкевіча і Алега Случака пра эскадроны сьмерці ў Беларусі (гл. табліцу).

| Варыянт адказу | 04.01(%) | 08.01(%) |
|---|---|---|
| Хутчэй не задаволены | 37.0 | 32.8 |
| Часткова не задаволены | 10.4 | 13.5 |
| Часткова задаволены | 12.6 | 16.0 |
| Хутчэй задаволены | 8.3 | 8.8 |
| ЦА/НА | 31.7 | 28. |

Крыніца: НІСЭПД.

Расьсьледаваньнем была не задаволена больш за траціну рэспандэнтаў, аднак асаблівага рэзанансу ў грамадзтве, тым больш масавых акцыяў пратэсту, публікаваньне матэрыялаў пра зьнікненьне людзей ня выклікала. Чуткі пра дачыненьне беларускага рэжыму да зьнікненьняў пачалі распаўсюджвацца ў Беларусі ўжо неўзабаве пасьля зьнікненьняў. Матэрыялы пра магчымую зьвязанасьць зь імі вышэйшых асобаў дзяржавы друкаваліся ў апазыцыйнай прэсе і раней. У адказ беларускія дзяржаўныя СМІ распрацоўвалі вэрсію пра наўмыснае зьнікненьне беларускіх апазыцыянэраў з мэтаю зьняславіць прэзыдэнта. У якасьці прыкладу прыводзілася зьнікненьне з-пад варты, а затым зьяўленьне ў Лёндане былой кіраўніцы Нацыянальнага банку Тамары Віньнікавай.

Бальшыня насельніцтва ня выпрацавала дакладнага стаўленьня да зьнікненьняў, у прыватнасьці да зьнікненьня Зьмітра Завадзкага. Дачыненьне прэзыдэнта й прэзыдэнцкіх спэцслужбаў да зьнікненьня людзей для бальшыні заставалася адкрытым пытаньнем (гл. табліцу).

Пасьля публікацый пра эскадроны сьмерці ў незалежных СМІ, інтэрвію ўцёклых зь Беларусі сьледчых, прэс-канфэрэнцыі Ўладзімера Ганчарыка беларускае грамадзтва, за выняткам нешматлікіх актыўных прыхільнікаў апазыцыі, ніяк ня выказала свайго стаўленьня да скандалаў.

Пры ацэнцы пасіўнага стаўленьня насельніцтва да інфармацыі пра зьнікненьні належыць улічваць, акрамя нізкага ўзроўню палітычнае культуры, адсутнасьці салідарнасьці і няразьвітай правасьвядомасьці, празьмерна часты зварот да палітычных сэнсацыяў беларускіх дзяр-

Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Як Вы мяркуеце, ці выкраданьне апэратара ОРТ Зьм. Завадзкага зьдзейсьнена злачынцамі з асабістых матываў, як сьцьвярджае пракуратура, альбо беларускімі спэцслужбамі з палітычных меркаваньняў, як лічыць апазыцыя?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Зьм. Завадзкага выкралі злачынцы з асабістых матываў | 20.7 |
| Зьм. Завадзкага выкралі беларускія спэцслужбы з палітычных меркаваньняў | 26.4 |
| ЦА/НА | 52.9 |

Крыніца: НІСЭПД.

жаўных і незалежных СМІ ў працэсе супрацьстаяньня сыстэмы апазыцыі й сыстэмы ўлады. З моманту свайго гістарычнага спавешчаньня пра барацьбу з карупцыяй у 1994 годзе А. Лукашэнка ўвесь час выкарыстоўвае публічныя выкрыцьці ў барацьбе з апанэнтамі. Пры гэтым апазыцыя, выкрываючы дзеяньні прэзыдэнта, таксама правакуе палітычныя скандалы. Пэрыядычныя гучныя заявы, далёка не заўсёды заснаваныя на неаспрэчных фактах і бездакорных доказах, сталі звыклай зьявай у беларускай інфармацыйнай прасторы.

Скандал са зьнікненьнямі атрымаў разьвіцьцё пры канцы жніўня.

27 жніўня, у панядзелак, з інфармацыяй пра зьнікненьне беларускіх палітыкаў выступілі экс-міністар сельскай гаспадаркі Васіль Лявонаў і былы намесьнік сакратара Рады бясьпекі Валер Кез. Васіль Лявонаў пераказаў зьмест сваіх гутарак з былым Генэральным пракурорам Беларусі Алегам Бажэлкам, а Валер Кез — з былым старшынём КДБ Уладзімерам Мацкевічам. Васіль Лявонаў паведаміў, што рашэньне пра арышт Зьмітра Паўлічэнкі Алег Бажэлка прымаў разам з былым кіраўніком КДБ Уладзімерам Мацкевічам. Пасьля арышту яны паведамілі пра гэта А. Лукашэнку і прапаноўвалі арыштаваць Віктара Шэймана і міністра ўнутраных справаў Юр’я Сівакова. Валер Кез апавёў, што аналягічную інфармацыю ён атрымаў ад Уладзімера Мацкевіча.

Зьміцер Паўлічэнка быў арыштаваны 23 лістапада. «Таго ж дня супрацоўнікі КДБ правялі ператрус у кватэры Паўлічэнкі і ягоным службовым кабінэце. Як сьцьвярджае Валер Кез, у часе ператрусу была знойдзена буйная сума грошай, зброя і пісьмовыя сьведчаньні датычнасьці Паўлічэнкі да зьнікненьняў палітыкаў. А, нібыта, наступнага дня група байцоў «Алмазу» была накіраваная да СІЗА КДБ дзеля вызваленьня Паўлічэнкі. На яе шляху паўстала спэцпадразьдзяленьне Камітэту дзяржбясьпекі «Альфа». Як казаў Валер Кез, «збройнай сутычкі ўдалося пазьбегчы толькі цудам». Аднак 27 лістапада Паўлічэнку вызвалілі — на загад Лукашэнкі. Таго ж дня былі адпраўленыя ў адстаўку Алег Бажэлка і Ўладзімер Мацкевіч. Прычым Мацкевічу нават не дазволілі ўвайсьці ў ягоны ўласны кабінэт.

Як падкрэсьліў Васіль Лявонаў, ягоны выступ быў прадыктаваны жаданьнем «ўратаваць жыцьцё Алега Бажэлкі». Чалавек, які валодае такой інфармацыяй, павінен баяцца за сваё жыцьцё. Праўда, мяркуючы з інфармацыі пра знаходжаньне Алега Бажэлкі ў Менску, ён адчуваў сябе тут цалкам камфортна. Прынамсі, паводле неафіцыйнай інфармацыі, на мінулым тыдні Бажэлка прысутнічаў на народзінах аднаго з кіраўнікоў пракуратуры. Прычым там жа нібыта знаходзіўся і дзейны Генэральны пракурор Віктар Шэйман[3].

Таго ж дня, 27 жніўня, шэраг беларускіх і расійскіх СМІ атрымалі відэакасэту з новымі выкрыцьцямі, датычнымі зьнікненьняў дзеячоў апазыцыі. За тыдзень да таго ў СМІ ўжо зьявілася відэакасэта, дзе невядомы, назваўшыся былым супрацоўнікам ЗАХР, паведамляў падрабязнасьці пра зьнікненьні.

Два чалавекі, інтэрвію зь якімі запісаныя на гэтай касэце, фактычна пацьвярджаюць інфармацыю, якую аналягічным чынам на мінулым тыдні распаўсюдзіў іншы ананімны сьведка. Аднак, у адрозненьне ад першых відэавыкрыцьцяў, на гэты раз людзі на касэце не хаваюць твараў, называюць свае прозьвішчы й пасады. Праўда, запіс усё ж ня вельмі якасны — прозьвішча чалавека, які назваўся супрацоўнікам аддзела па абароне канстытуцыйнага ладу і барацьбе з тэрарызмам Камітэту дзяржбясьпекі, прыблізна можна ідэнтыфікаваць як Угляніцу. Другі, Андрэй Жарнасек, таксама можа быць супрацоўнікам КДБ. Абодвух апазнаў

3 Андрей Маховский. Явление новых свидетелей // Белорусская деловая газета. 2001. 29 жніўня.

сябра штабу Ганчарыка Яўген Скочка.

Гэтую ж інфармацыю пацьвердзілі і ў КДБ. Як сказаў прэс-сакратар КДБ Фёдар Котаў, у гэтым ведамстве сапраўды працуе нейкі Генадзь Угляніца. Пры гэтым Котаў адзначыў, што асабіста ён пазнаць гэтага супрацоўніка на відэакасэце ня змог. Атрымаць тлумачэньні ў самога Генадзя Ўгляніцы не ўдалося. У панядзелак яго не было на працоўным месцы, і ў КДБ не змаглі паведаміць, дзе ён знаходзіцца.

Зьмест відэакасэты мала адрозьніваецца ад сьведчаньняў, агучаных тыдзень таму ананімным інфарматарам. Сьцьвярджалася, што ў часе правядзеньня незалежнага расьсьледаваньня знойдзены сьведка выкраданьня Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Мяркуючы па ўсім, сьведку клічуць Віталь Мяцельскі. Гэты чалавек быў нібыта салдатам тэрміновай службы ў групе ЗАХРу і браў удзел у хаваньні аўтамабіля Анатоля Красоўскага. Доўгі час ён жыў у Барысаве, але цяпер хаваецца, баючыся за сваё жыцьцё[4].

Апрача інтэрвію на відэакасэце былі кадры паласы перашкод. Як сьцьвярджалі аўтары інтэрвію, здымкі рабіліся каля базы спэцназу ў Бярэзінскім запаведніку. Нібыта акурат там быў схаваны аўтамабіль Анатоля Красоўскага. 28 жніўня, у аўторак, у згаданае месца выехалі прадстаўнікі пракуратуры і СМІ, а таксама міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў. Ні доказаў, ні сьведчаньняў іх зьнішчэньня на месцы, згаданым у інтэрвію на відэакасэце, знойдзена не было. Рэпартаж пра пошукі і іх вынікі быў паказаны па тэлебачаньні.

Аднак пытаньне, ці быў відэазапіс з чарговымі выкрыцьцямі правакацыяй, застаецца адкрытым. Як і ў папярэдніх скандальных паведамленьнях пра зьнікненьні, для канчатковых высноваў інфармацыя або супярэчлівая, або яе недастаткова. Зьяўленьне касэты можна было інтэрпрэтаваць і як правакацыю з боку беларускіх спэцслужбаў супраць апазыцыі, і як правакацыю апазыцыі супраць прэзыдэнта напярэдадні выбараў.

Новы ўсплёск чутак наконт лідэраў апазыцыі выклікала раптоўнае пагаршэньне стану здароўя Сямёна Домаша. 30–31 жніўня Сямён Домаш, які зьняў сваю кандыдатуру на карысьць Уладзімера Ганчарыка, быў шпіталізаваны з дыягназам гіпэртанічны крыз. У апазыцыйнай прэсе сталі зьяўляцца артыкулы зь меркаваньнямі пра атручаньне Сямёна Домаша. Ягоны стан паступова пагаршаўся пасьля выступу на Беларускім тэлебачаньні 21 жніўня. Дагэтуль Сямён Домаш быў вядомы сваім моцным здароўем.

Новым этапам інфармацыйнага супрацьстаяньня апазыцыі прэзыдэнту стала выкарыстаньне дагэтуль не ўжываных сродкаў вулічнай агітацыі. Ня маючы доступу да манапалізаваных Аляксандрам Лукашэнкам дзяржаўных СМІ, валодаючы меншымі інфармацыйнымі рэсурсамі, прыхільнікі апазыцыі, у першую чаргу сярод моладзі, скарыстоўваюць тактыку югаслаўскага «Отпору».

На вуліцах гарадоў расклейваюцца мініплякаты-налепкі, якія агітуюць насельніцтва супраць рэжыму Лукашэнкі, за дэмакратычную Беларусь. Ладзяцца вулічныя акцыі, палітычныя гэпінінгі. Як камэнтуе гэтую тактыку расійскі штотыднёвік «Коммерсант-Власть», «імкненьне беларускай апазыцыі ўзяць на ўзбраеньне досьвед сэрбскай аксамітнай рэвалюцыі прасочваецца даволі яскрава. Некаторыя беларускія плякаты — копія сэрбскіх, нават што да шрыфта. Напярэдадні мінулагодніх югаслаўскіх выбараў увесь Бялград быў заклеены налепкамі з адным словам «Готов!» У Менску — гэткія ж налепкі са словам «Надоел!»[5]. Падобную агітацыю, выкарыстоўваючы досьвед югаслаўскага маладзёвага руху «Отпор»,

---

4 Андрей Маховский. Явление новых свидетелей // Белорусская деловая газета. 2001. 29 жніўня.

5 Гл. Геннадий Сысоев. Батька сделал свое дело // Коммерсант-Власть. 2001. 17 ліпеня.

што змагаўся такім чынам супраць рэжыму Слабадана Мілошавіча, у беларускіх умовах супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі вёў маладзёжны рух «Зубр».

# ПАЛІТЫЧНЫ ПРАЦЭС У 2001 ГОДЗЕ

Галоўная адметнасьць палітычнага працэсу ў 2001 годзе палягала ў адсутнасьці палітычнага дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй. Прэзыдэнцкія структуры і апазыцыя суіснавалі і існуюць паралельна, зьдзяйсьняючы свае акцыі, імкнучыся ўзьдзеяць на электарат. Палітычныя падзеі ў Беларусі 2001 году адбываліся ў значнай ступені за межамі ўласна палітычных інстытуцыяў, паколькі самі інстытуцыі ў беларускай сыстэме так і ня сталі легітымнымі каналамі палітычных пераўтварэньняў.

## Стаўка А.Лукашэнкі на Маскву як заруку стабільнасьці беларускага рэжыму

У выніку ўласнае палітыкі А. Лукашэнка фактычна апынуўся ў становішчы расійскага сатэліта. Адмова міжнароднае супольнасьці прызнаць ягоны рэжым легітымным пакуль не стварала сур’ёзных праблемаў для беларускага прэзыдэнта ўнутры краіны. Аднак ува ўмовах міжнароднае ізаляцыі і вычарпаньня ўласных, у першую чаргу эканамічных, рэсурсаў палітычнага панаваньня А. Лукашэнка вымушаны шукаць падтрымкі расійскіх элітаў. Узімку, на пачатку 2001 году беларускі прэзыдэнт нанёс візыт у Маскву з мэтай заручыцца падтрымкай расійскіх кіроўных колаў. Афіцыйна візыт быў прымеркаваны да Дзён беларускае культуры ў Маскве.

Дні культуры Рэспублікі Беларусь у Расіі пачаліся з хакейнага матчу паміж камандай беларускага прэзыдэнта і зборнай вэтэранаў расійскага хакею і прадстаўнікоў Фэдэральнага сходу Расіі. Наступным днём А. Лукашэнка сустрэўся з Уладзімерам Пуціным, Віктарам Герашчанкам, Міхаілам Касьянавым, Паўлам Барадзіным. Увечары ў Вялікім тэатры ён уручыў ордэны і мэдалі Францішка Скарыны мэру Масквы Юр’ю Лужкову, Генадзю Селязьнёву, акторцы Тацяне Даронінай, рэктару МДУ Віктару Садоўнічаму, міністру культуры Міхаілу Швыдкому, галаве нафтагазавай кампаніі «Ітэра» Ігару Макараву.

Увесну, 2 красавіка, у Маскве адбылося паседжаньне Вышэйшай дзяржаўнай рады Саюзнай дзяржавы Беларусі й Расіі, прысьвечанае вынікам першага пяцігадовага юбілею саюзу. На паседжаньні быў зацьверджаны саюзны бюджэт на 2001 год, плян працы саюзнага ўраду і пасланьне Парлямэнцкаму сходу, падпісанае пагадненьне аб стварэньні міжнароднай фінансава-прамысловай групы (МФПГ) «Аэракасьмічнае абсталяваньне». З боку Беларусі ў яе склад увайшлі два прадпрыемствы, з расійскага — адзінаццаць.

А. Лукашэнка імкнуўся заручыцца прадтрымкай Уладзімера Пуціна ў пытаньні атрыманьня Беларусяй раней абяцаных расійскіх крэдытаў. Але расійскае Міністэрства фінансаў не паведаміла дакладнай даты вылучэньня першага траншу крэдыту ў 100 мільёнаў даляраў

ЗША. У тай жа час галава Цэнтрабанку Віктар Герашчанка паведаміў, што крэдыт будзе выдадзены адразу пасьля таго, як Беларусь ратыфікуе пагадненьні аб адзінай валюце. Адзіны эмісійны цэнтар пры гэтым мусіць знаходзіцца ў Маскве, і друкаваць грошы для Беларусі павінен расійскі Цэнтрабанк.

Увечары 2 красавіка расійскі тэлеканал НТВ паведаміў, што Аляксандар Лукашэнка быў вымушаны пакінуць Маскву датэрмінова. Згодна з паведамленьнем амбасады Беларусі ў Маскве, праграма візыту была цалкам выкананая. Аднак на ўрачыстым канцэрце ў гонар юбілею расійска-беларускага пагадненьня Аляксандар Лукашэнка не прысутнічаў. Уладзімера Пуціна на ім таксама не было. Першы юбілей беларуска-расійскага саюзу прайшоў дастаткова сьціпла, ня так, як хацелася б беларускаму прэзыдэнту. Барыс Ельцын не зьявіўся на імпрэзы, зьвязаныя зь пяцігодзьдзем беларуска-расійскага саюзу. Расійцы ўзнагародзілі Аляксандра Лукашэнку ордэнам «За заслуги перед Отечеством» II ступені.

У пэрыяд супрацьстаяньня ў Расіі Барыса Ельцына і камуністычных рэваншыстаў Аляксандар Лукашэнка спрытна выкарыстоўваў унутрырасійскія супярэчнасьці, дамагаючыся ад Крамля неабходных саступак у эканоміцы і ў сфэры міжнародных стасункаў. Зь перамогай каманды Ўладзімера Пуціна Масква заняла значна больш жорсткую пазыцыю ў дачыненьні да беларускага прэзыдэнта, фактычна, паставіўшы яго ў становішча цалкам кантраляванага васала. Падтрымка расійскіх кіруючых колаў стала неабходным варункам захаваньня ягонае ўлады ўнутры Беларусі.

5 красавіка ў рамках камандна-штабнога трэнаваньня (КШТ) дзяжурных сілаў і сродкаў Аб'яднанай сыстэмы СПА СНД расійскія стратэгічныя бамбавікі Ту-22 і Ту-95 зьдзяйсьнялі пасадку на беларускіх вайсковых аэрадромах: Мачулішчах, пад Менскам, і ў Баранавічах. Паводле задумы КШТ, яны імітавалі парушэньне паветранай прасторы дзяржаваў-удзельніцаў СНД. Аднак выкарыстаньне дзеля такіх мэтаў стратэгічных бамбавікоў надта дарагое. (Для запраўкі кожнага самалёта патрабуецца ад 50 да 100 тонаў газы.) Перш чым сесьці ў Беларусі, гэтыя ж самалёты ўдзельнічалі ў найбуйнейшых за апошнія сем гадоў вучэньнях дальняй авіяцыі Расіі. У паветра былі паднятыя да паўтара дзясятка стратэгічных бамбавікоў, якія ў часе выкананьня вучэльнага баявога заданьня праводзілі запуск крылатых ракетаў і рэальнае бамбаваньне.

Яшчэ з часоў СССР на тэрыторыі Беларусі захаваліся 6 аэрадромаў, здольных прымаць цяжкія бамбавікі. Аэравузел Мачулішчы пад Менскам быў базай дальняй авіяцыі СССР. І цяпер, прымаючы расійскія стратэгічныя бамбавікі на тэрыторыі Беларусі, Аляксандар Лукашэнка прадэманстраваў сваю вартасьць для расійскіх вайскоўцаў — у якасьці прадказальнага і падаўкога партнэра.

З 31 траўня да 1 чэрвеня ў Менску прайшоў саміт краін-удзельніц СНД. 30 траўня, напярэдадні саміту, у 23:37 на тэрыторыі расійскай амбасады ў Менску адбыліся два выбухі. Як паведаміла Ўпраўленьне інфармацыі і грамадзкіх сувязяў МУС, «на месцы здарэньня былі знойдзеныя аскепкі і дужкі гранатаў РГД-5, якія сьведчылі пра тое, што былі кінутыя дзьве гранаты».

На наступны дзень у Менск на саміт прыбылі вышэйшыя службовыя асобы Расіі. Выбух ля расійскай амбасады ня выклікаў асаблівай рэакцыі зь іхнага боку. У часе саміту міністры замежных справаў Расіі й Беларусі абмяняліся ратыфікацыйнымі граматамі па пагадненьнях «Аб увядзеньні адзінай грашовай адзінкі і фармаваньні адзінай эканамічнай прасторы, аб урэгуляваньні пытаньня эмісійнага цэнтру Саюзнай дзяржавы» і «Аб урэгуляваньні пытань-

няў, зьвязаных са спыненьнем дзейнасьці органаў Саюзу Беларусі й Расіі», падпісаных у Менску паўгоду таму.

З 1 ліпеня Расія ўвяла ў дзеяньне другую частку Падатковага кодэксу і перайшла на прынцып спагнаньня падаткаў па краіне прызначэньня з усімі краінамі СНД, акрамя Беларусі. Расійскі бок пагадзіўся перайсьці на прынцып спагнаньня ПДВ па краіне прызначэньня толькі пры ўмове аднаўленьня мяжы зь Беларусяй. На тэрыторыі адзінай дзяржавы, на думку расійскага міністэрства фінансаў, ускосныя падаткі павінны спаганяцца па прынцыпе краіны паходжаньня.

Улетку, 20–21 чэрвеня, А. Лукашэнка нанёс двухдзённы візыт у Маскву, дзе пры ягоным удзеле Ўладзімер Пуцін і Міхаіл Касьянаў абмяркоўвалі пытаньні тарыфнага і нетарыфнага рэгуляваньня, спагнаньня ўскосных падаткаў і павелічэньня паставак газу ў Беларусь.

Пры захаваньні поўнамаштабнай палітычнай падтрымкі беларускага рэжыму Расія імкнулася навязаць Лукашэнку ўласныя правілы эканамічнай інтэграцыі. Беларускі бок быў выключаны з удзелу ў вызначэньні мытных ставак і падаткаў у рамках Саюзу Беларусі і Расіі, а таксама падатку на прыбытак. Дзяржаўная Дума Расіі зацьвердзіла 24-адсоткавы падатак, не палічыўшы патрэбным паведаміць пра гэта беларускім саюзьнікам.

Расія таксама адммовілася ад працягу рэалізацыі бартэрных схемаў у гандлі Расіі й Беларусі. У выніку скасаваньня расійскага дзяржзаказу на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю адбылося скарачэньне расійскага імпарту зь Беларусі. Акрамя таго, Аляксандар Лукашэнка страціў свабоду перамяшчэньняў па расійскіх рэгіёнах, якой карыстаўся ў пэрыяд ельцынскай адміністрацыі. Пашырэньне кантактаў з расійскімі рэгіёнамі ў абыход Крамля спыненае. Пашырэньня паўнамоцтваў саюзных органаў таксама не адбылося.

27 ліпеня Павал Барадзін, дзяржсакратар Саюзу Расіі й Беларусі, наведаў Менск і перадаў Аляксандру Лукашэнку 100 тысяч даляраў для хворых беларускіх дзяцей. У найбліжэйшым часе 70–80 дзяцём было зробленыя апэрацыі ў Маскоўскім кардыялягічным цэнтры, паведаміў Павал Барадзін на брыфінгу, які праходзіў у рэзыдэнцыі прэзыдэнта ў Менску. Імёны расійскіх бізнэсоўцаў, якія за месяц да выбараў беларускага прэзыдэнта заняліся дабрачыннасьцю, засталіся невядомыя. Павал Барадзін прывёз грошы з саюзнага бюджэту на адпачынак 700 дзяцей з Гомельскай вобласьці ў аздараўленчых установах Расіі й Беларусі. Перад візытам Беларусь атрымала 50 млн. амэрыканскіх даляраў расійскага крэдыту, выдадзенага Цэнтрабанкам.

## Заходняя палітыка Лукашэнкі

Паралельна стараньнямі беларускіх уладаў пагаршаліся варункі працы Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Беларусі. Увесну 2001 году галава камісіі Ганс-Георг Вік прапанаваў, каб расійскія назіральнікі на беларускіх выбарах дзейнічалі ў рамках назіраньня, арганізаванага АБСЭ. У выпадку падпісаньня адзінага пратаколу зь іншымі прадстаўнікамі АБСЭ расійскі бок пры наяўнасьці парушэньняў у часе выбараў прэзыдэнта ня меў бы падставаў прызнаваць вынікі выбараў. А. Лукашэнка абвінаваціў галаву Кансультацыйна-назіральнай групы Ганса-Георга Віка ў фінансаваньні беларускае апазыцыі і прыгразіў дэпартацыяй за

самастойны ўдзел у беларускім палітычным працэсе.

З 25 да 29 чэрвеня ў Страсбургу адбывалася апошняе перад прэзыдэнцкімі выбарамі ў Беларусі паседжаньне Парлямэнцкай асамблеі Савету Эўропы. Статус Беларусі ў ПАСЭ, закансэрваваны яшчэ на пачатку 1997 году, застаўся нязьменным. На паседжаньні Парлямэнцкай асамблеі Савету Эўропы ў Страсбургу бралі ўдзел беларускія праваабаронцы, адмыслова запрошаныя ПАСЭ на паседжаньне Камітэту ў юрыдычных пытаньнях і правох чалавека. Сэсія ПАСЭ папярэднічала паседжаньням Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ ў Парыжы 6–10 ліпеня. 30 чэрвеня — 2 ліпеня Менск наведалі прадстаўнікі Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ Ута Цапф і Урбан Алін дзеля вывучэньня сытуацыі перад парыскай сэсіяй. Беларускае пытаньне абмяркоўвалася на 10-й сэсіі Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ. 6 ліпеня на парадку дня Сталага камітэту АБСЭ стаяла пытаньне пра прадстаўніцтва Беларусі ў ПА АБСЭ. Палата прадстаўнікоў, сфармаваная пасьля рэфэрэндуму 1996 году замест Вярхоўнага Савету, не была прызнаная легітымнай.

## Унутраная палітыка Лукашэнкі

У часе сваёй мабілізацыйнай кампаніі Аляксандар Лукашэнка, як і ў пэрыяд свайго кіраваньня, які папярэднічаў падрыхтоўцы да выбараў, ладзіў папулісцкія акцыі, прымеркаваныя да знакавых датаў. У першую чаргу — зьвязаныя з часам, калі Беларусь была ў складзе Савецкага Саюзу. Прэзыдэнт стараўся ўзмацніць свае ідэалягічныя рэсурсы за кошт свайго ранейшага электарату і перахапіць частку ідэалягічных рэсурсаў апазыцыі.

Так, 15 сакавіка 2001 году ўпершыню за чатыры гады на афіцыйным узроўні адзначаўся Дзень беларускай Канстытуцыі, прынятай у 1994 годзе. У конадзень гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС прэзыдэнт Лукашэнка наведаў найбольш пацярпелыя ад радыяцыі раёны Беларусі. Гэты візыт шырока асьвятляўся ў дзяржаўных СМІ. Тады ж пацярпелыя раёны наведалі і прадстаўнікі апазыцыі, але іхная прысутнасьць асьвятлялася больш сьціпла.

9 траўня, у Дзень Перамогі над фашысцкай Нямеччынай, А. Лукашэнка браў удзел ува ўрачыстым паседжаньні і шэсьці, прысьвечаных Дню Перамогі. Гэтае традыцыйна савецкае сьвята — абавязковы эпізод у культываваньні настальгіі па СССР. Аднак на гэты раз вайсковы парад у гонар Дня Перамогі ў Менску не адбыўся, а быў перанесены на 3 ліпеня, лукашэнкаўскі Дзень Незалежнасьці Рэспублікі Беларусі.

18 траўня ў Палацы Рэспублікі ў Менску адбыўся II Усебеларускі сход — зьезд лукашэнкаўскіх вылучэнцаў з усяе краіны. Паводле афіцыйных дадзеных, у мерапрыемстве ўзялі ўдзел блізу 3 тыс. чалавек. А. Лукашэнка выступіў з дакладам «За моцную і квітнеючую Беларусь», у якім абяцаў не дапусьціць прыватызацыі прадпрыемства «Беларуськалі», Мазырскага солездабыўчага заводу і нафтахімічнага комплексу Беларусі. Таксама ён казаў пра тое, што да 2005 году мяркуецца падняць заробкі на ўзровень ня менш як 250 даляраў у месяц. II Усебеларускі сход прыняў рэзалюцыю, у якой ухваліў сацыяльна-эканамічнае разьвіцьцё краіны ў 1996–2000 гадох. Тым часам прадстаўнікі апазыцыі ладзілі пікет на Кастрычніцкай плошчы, спрабавалі разгарнуць плякаты, і былі тут жа схопленыя.

Пры канцы чэрвеня, завяршаючы візыт на Гомельшчыну, Аляксандар Лукашэнка выкарыстаў у рэклямных мэтах паездку галавы Расійскай Праваслаўнай Царквы Аляксія II па Беларусі. У апошнія дні візыту, які праходзіў у паўднёвых раёнах Беларусі ў кірунку з заха-

ду на ўсход, патрыярх наведаў некалькі гарадоў, найбольш затрымаўшыся ў Мазыры, дзе разьмяшчаецца Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод, які часткова знаходзіцца ўва ўласнасьці сумеснага расійска-беларускага прадпрыемства «Слаўнафта».

З Мазыру Аляксій II накіраваўся да месца сустрэчы з прэзыдэнтам Беларусі. 27 чэрвеня візыт праваслаўнага патрыярха завяршыўся сустрэчай з Аляксандрам Лукашэнкам, якая адбывалася ля помніка Дружбы народаў на сутыку межаў Расіі, Беларусі і Ўкраіны. Ад імя беларускага народу Аляксандар Лукашэнка зрабіў Праваслаўнай Царкве каштоўны падарунак, перадаўшы на аздабленьне маскоўскага храма Хрыста Збаўцы сьвяточныя харугвы коштам 118 млн. беларускіх рублёў (каля 100 тыс. даляраў). Затым разам з Аляксандрам Лукашэнкам Аляксій II накіраваўся ў вёску Карма, дзе яны наведалі мясцовы Сьвята-Пакроўскі храм. На гэтым візыт Аляксія II у Беларусь і паездка Аляксандра Лукашэнкі па Гомельшчыне завяршыліся. У часе гэтага візыту Аляксандар Лукашэнка, за два зь нечым месяцы да выбараў, цягам менш за тыдзень двойчы атрымаў блаславеньне ад найвышэйшага гіерарха Расійскай Праваслаўнай Царквы.

Самай маштабнай рэклямнай акцыяй у падтрымку А. Лукашэнкі і ягонага курсу быў юбілейны, дзясяты, музычны фэстываль «Славянскі базар» у Віцебску, які ладзіўся ў апошнія дні ліпеня. Фэстываль адбываецца штогод, зьбірае выканаўцаў з рэспублік былога СССР і адтварае атмасфэру музычных фэстываляў, што ладзіліся ў савецкі час на тэрыторыі СССР і ў краінах Варшаўскай дамовы. На гэты раз яго наведалі прэзыдэнты Расіі і Ўкраіны.

Пры канцы жніўня ў Беларусі праводзіліся вайсковыя вучэньні «Нёман-2001», на якіх адпрацоўвалася аднаўленьне чыгуначных шляхоў пасьля бамбаваньняў, аналягічных бамбаваньням НАТО ў Югаславіі.

4 верасьня ў Палацы Рэспублікі ў Менску адбылася сустрэча А. Лукашэнкі з выбарцамі. Каля дзьвюх з паловай тысячаў чалавек былі адумысьля дастаўленыя ў Менск з розных рэгіёнаў Беларусі на сустрэчу з прэзыдэнтам.

На ёй А. Лукашэнка сказаў, што за гады ягонага кіраваньня ўдалося спыніць эканамічны спад і забясьпечыць сацыяльна-эканамічную стабільнасьць. Лукашэнка заявіў, што пад ягоным кіраўніцтвам за апошнія 5 гадоў унутраны валавы прадукт узрос на 36 адсоткаў, прамысловая вытворчасьць — на 65 адсоткаў; даходы насельніцтва вырасьлі і складаюць цяпер 106 адсоткаў да ўзроўню 1990 году. Паказьнікаў дзевяностага году не ўдалося дасягчы толькі ў сельскай гаспадарцы. Беларускі прэзыдэнт абнародаваў таксама сваю перадвыбарную праграму. У яе аснову было пакладзена жыльлёвае будаўніцтва, разьвіцьцё экспартнай вытворчасьці, аграпрамысловага комплексу, падтрымка навукі і ўмацаваньне сыстэмы аховы здароўя.

На гэтай сустрэчы Аляксандар Лукашэнка паабяцаў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў выгнаць зь Беларусі кіраўніка Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Беларусі Ганса-Георга Віка. Таксама Аляксандар Лукашэнка зрабіў заяву наконт дзейнасьці ў Беларусі пасла ЗША Майкла Козака, пра тое, што акурат Майкл Козак — аўтар нашумелай заявы дзяржсакратара ЗША Коліна Паўэла па Беларусі. Лукашэнка абвінаваціў амбасаду ЗША ў фінансаваньні беларускай апазыцыі і апублікаваў сьпіс асобаў, якіх нібыта фінансавалі праз амэрыканскую амбасаду. У іх ліку былі названыя лідэр АГП Анатоль Лябедзька, лідэр партыі БНФ Вінцук Вячорка, кіраўнік «Вясны-96» Алесь Бяляцкі, намесьнік старшыні КХП БНФ Сяргей Папкоў, рэдактар «Народнай Волі» Язэп Сярэдзіч, прафсаюзны дзеяч Віктар Івашкевіч, кіраўнік НІСЭПД Алег Манаеў.

## Выкарыстаньне адміністрацыйных рэсурсаў супраць беларускай апазыцыі

Пры передвыбарнай гонцы А. Лукашэнка задзейнічаў магутныя адміністрацыйныя рэсурсы з мэтай аслабленьня апазыцыі. Напярэдадні выбараў прэзыдэнт прыняў шэраг указаў, сярод якіх былі і ўказы, беспасярэдне накіраваныя на ўмацаваньне ягоных пазыцыяў.

Трэба асабліва адзначыць дэкрэты Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі: № 8 ад 12 сакавіка 2001 году, № 11 ад 7 траўня 2001 году і № 20 ад 26 чэрвеня 2001 году.

Дэкрэт № 8 ад 12 сакавіка 2001 году «Аб некаторых захадах што да ўдасканаленьня парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі» прадугледжвае рэгістрацыю замежнай бязвыплатнай дапамогі і выдачу адпаведных пасьведчаньняў Дэпартамэнтам па гуманітарнай дзейнасьці пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі. Пры гэтым выкарыстаньне замежнай бязвыплатнай дапамогі да атрыманьня пасьведчаньня забараняецца дэкрэтам, а сам парадак рэгістрацыі замежнай дапамогі вызначаецца Дэпартамэнтам па гуманітарнай дзейнасьці пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі. У дэкрэце, падпісаным акурат перад выбарамі прэзыдэнта, адумысьля абумоўлена, што «замежная бязвыплатная дапамога ў любым выглядзе ня можа быць выкарыстана для падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў, рэфэрэндуму, адкліканьня дэпутата, чальца Савету Рэспублікі, для правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў, пікетаваньняў, страйкаў, вырабу і распаўсюджваньня агітацыйных матэрыялаў, а таксама правядзеньня сэмінараў і іншых формаў агітацыйна-масавай працы сярод насельніцтва»[1]. Дзяржаўны кантроль за мэтавым выкарыстаньнем замежнай бязвыплатнай дапамогі яе атрымальнікамі акрамя Дэпартамэнту па гуманітарнай дзейнасьці пры Прэзыдэнту Рэспублікі Беларусі быў даручаны Камітэту дзяржаўнага кантролю, Міністэрству ўнутраных справаў, Дзяржаўнаму падатковаму камітэту, Дзяржаўнаму мытнаму камітэту, Дзяржаўнаму камітэту фінансавых расьследаваньняў і іх тэрытарыяльным органам і іншым дзяржаўным органам. За парушэньне патрабаваньняў дэкрэту зь юрыдычных асобаў спаганяецца штраф у памеры да 100 адсоткаў кошту атрыманай дапамогі або юрыдычныя асобы караюцца канфіскацыяй атрыманых тавараў (маёмасьці), якія залічваюцца ў даход бюджэту. Таксама дапускаецца ліквідацыя прафсаюзаў, грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў нават за аднаразовае парушэньне палажэньняў дэкрэту, дэпартацыя замежных грамадзянаў і асобаў без грамадзянства, спыненьне дзейнасьці прадстаўніцтваў замежных арганізацыяў.

Дэкрэт № 11 ад 7 траўня 2001 году быў накіраваны на абмежаваньне свабоды сходаў і іншых масавых мерапрыемстваў напярэдадні выбараў. Як і папярэднія дэкрэты, што датычылі сфэры палітычнае актыўнасьці, ён накіраваны ня толькі на абмежаваньне волевыяўленьня грамадзянаў, але й на ўскладненьне бюракратычнае працэдуры, якая дазваляе легальна праводзіць акцыі апазыцыі.

Дэкрэт прадугледжвае магчымасьць ліквідацыі палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў і іншых арганізацыяў за аднаразовае парушэньне заканадаўства аб сходах. Гэта магчыма, калі «адказныя асобы не забясьпечылі парадку арганізацыі ці правядзеньня акцыі, што вык-

[1] Дакумэнт даступны па адрасе: http://www.ncpi.gov.by/. (Дзейны на 09.09.2001 г.)

лікала нанясеньне шкоды ў буйным памеры або істотную шкоду правам і законным інтарэсам грамадзянаў, арганізацыяў або дзяржаўным ці грамадзкім інтарэсам». Пры гэтым да нанясеньня істотнай шкоды аднесена парушэньне руху транспарту[2].

Дэкрэт № 20 ад 26 чэрвеня, улічваючы фактычную непадсправаздачнасьць самога прэзыдэнта беларускаму грамадзтву, інстытутам заканадаўчай і судовай улады, быў накіраваны супраць канкурэнтаў А. Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах. Гэты дэкрэт прадугледжваў абавязковае дэкляраваньне даходаў і маёмасьці кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі, ягоных блізкіх сваякоў, мужа (жонкі) і яго (яе) бацькоў. Фактычнае падпарадкаваньне судовай улады цяперашняму прэзыдэнту забясьпечвае яму магчымасьці для адсейваньня кандыдатаў у працэсе перадвыбарнай кампаніі ў адпаведнасьці з уласным дэкрэтам. У дэкрэце прадугледжваецца, што выкарыстаньне кандыдатам грашовых сродкаў ці іншай матэрыяльнай дапамогі ў парушэньне частак дзявятае і дзясятае артыкулу 48 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусі выклікае адмову ў рэгістрацыі кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі або скасаваньне пастановы аб яго рэгістрацыі[3].

Для дасягненьня перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах беларускі прэзыдэнт ня грэбаваў і фінансавымі рэсурсамі замежных суб’ектаў гаспадараньня, якія ажыцьцяўляюць эканамічную дзейнасьць у Беларусі. 18 чэрвеня 2001 году А. Лукашэнка падпісаў дэкрэт № 19 «Аб некаторых пытаньнях падаткаабкладаньня замежных юрыдычных асобаў у 2001 годзе». Паводле гэтага дэкрэту, «з 1 ліпеня да 31 сьнежня 2001 г. замежныя юрыдычныя асобы, якія ажыцьцяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасьць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі, павінны рабіць адлічэньні ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчаваньня і аграрнай навукі, адлічэньні сродкаў карыстальнікамі аўтамабільных дарог у дарожныя фонды, а таксама мэтавыя зборы на фармаваньне мясцовых мэтавых бюджэтных фондаў стабілізацыі эканомікі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі і харчаваньня, жыльлёва-інвэстыцыйных фондаў і мэтавы збор на фінансаваньне выдаткаў, зьвязаных з утрыманьнем і рамонтам жыльлёвага фонду, у парадку і на ўмовах, вызначаных артыкуламі 11 і 23 Закону Рэспублікі Беларусі «Аб бюджэце Рэспублікі Беларусі на 2001 год» (Нацыянальны рэестар прававых актаў Рэспублікі Беларусі, 2000).

Апрача выдадзеных дэкрэтаў, у прадстаўнікоў апазыцыі ўзьніклі праблемы, зьвязаныя з крымінальным перасьледам іхных сваякоў. Прычым беспасярэднюю датычнасьць беларускага прэзыдэнта і ягонага найбліжэйшага абкружэньня да падобных крымінальных справаў у варунках Беларусі нельга давесьці наўпрост.

10 лютага 2001 году на аўтарынку ў менскім раёне Малінаўка з двума таварышамі, Васілём Быкавым і Сяргеем Калядом, быў затрыманы сын беларускага экс-прэм’ер-міністра Міхаіла Чыгіра Аляксандар Чыгір. Паводле вэрсіі сьледзтва, іх затрымалі, таму што ў часе плянавай праверкі былі, нібыта, знойдзены запчасткі ад скрадзеных аўтамабіляў, апазнаныя пацярпелымі. Пры затрыманьні сын экс-прэм’ера быў зьбіты. Пасьля скаргі на імя пракуро-

[2] Гл. Дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 7 траўня 2001 г. № 11 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленьні парадку правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацый, іншых масавых мерапрыемстваў і пікетаваньня ў Рэспубліцы Беларусі». Дакумэнт даступны па адрасе: http://www.ncpi.gov.by/.

[3] Гл. Дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 26 чэрвеня 2001 г. № 20 «Аб абавязковым дэкляраваньні даходаў і маёмасьці кандыдата ў прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі, яго блізкіх сваякоў, супругі (супруга) і яе (яго) бацькоў і некаторых іншых мерах, накіраваных на правядзеньне адкрытых, свабодных і сумленных выбараў». Дакумэнт даступны па адрасе: http://www.ncpi.gov.by/.

ра з патрабаваньнем правесьці мэдычны агляд наконт наяўнасьці цялесных пашкоджаньняў Аляксандар Чыгір быў абсьледаваны толькі на трэція суткі.

Чыгір-малодшы быў зьмешчаны ў сьледчы ізалятар на вул. Валадарскага ў Менску. На дзясяты дзень яму было прад'яўлена абвінавачаньне ў выкраданьні шасьцёх аўтамашынаў зь іх наступнай разукамплектацыяй і рэалізацыяй запасных частак. На пачатку красавіка Аляксандру Чыгіру чарговы раз працягнулі тэрмін утрыманьня пад вартай — да 20 чэрвеня. 6 красавіка невядомымі асобамі быў зьбіты ягоны адвакат Аляксандар Пыльчанка. Ён быў шпіталізаваны, а ягоны падабаронны на доўгі час застаўся безь юрыдычнае дапамогі.

Да 13 чэрвеня Аляксандру Чыгіру не дазвалялі бачыцца зь сям'ёй. Матцы Аляксандра Чыгіра адмовілі ў праве абараняць інтарэсы сына. 13 ліпеня яму дазволілі спаткацца з жонкай, 14 — з маткай. Адваката таксама дапусьцілі не адразу.

Пазьней Аляксандру Чыгіру прад'явілі абвінавачаньне ў стварэньні і кіраўніцтве злачыннай групай, якая займалася выкраданьнем мікрааўтобусаў. Мера магчымага пакараньня ў гэтым выпадку адпавядае 8–15 гадом зьняволеньня. Аляксандар Чыгір не прызнаў сябе вінаватым. Яго новы адвакат Зьміцер Іванішка лічыў, што справа ягонага падабароннага сфабрыкаваная з мэтай зьняславіць яго бацьку, экс-прэм'ера Беларусі Міхаіла Чыгіра.

Пры канцы сакавіка па падазрэньні ў продажы наркотыкаў быў затрыманы Сяргей Віньнікаў, сын экс-старшыні Нацыянальнага банку Беларусі Тамары Віньнікавай, якая доўгі час утрымлівалася пад хатнім арыштам, затым загадкавым чынам уцякла з-пад варты і цяпер жыве ў Лёндане. Пасьля выбараў ён быў выпушчаны з турмы.

## Акцыі беларускай апазыцыі

Беларуская апазыцыя ў часе перадвыбарнай кампаніі праводзіла традыцыйныя штогадовыя шэсьці й мітынгі. Хаця ў гэтым годзе 15 сакавіка апазыцыя вырашыла ўстрымацца ад традыцыйнай масавай акцыі, прысьвечанай Дню Канстытуцыі, каб не выдаткоўваць сілы напярэдадні 25 сакавіка, Дня Волі, які адзначаецца з 1990 году. Шэсьце прайшло з арыштамі актывістаў; рэпартажы пра яго трансьляваліся ў расійскім тэлебачаньні. Але ў цэлым мерапрыемства мела дзяжурны характар і ня выклікала асаблівага грамадзкага рэзанансу.

Упершыню на вулічнай акцыі апазыцыі прысутнічалі ў якасьці выпадковых назіральнікаў тагачасны галава Адміністрацыі прэзыдэнта Міхаіл Мясьнікович, міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў і яго намесьнік Леанід Глухоўскі.

Да 15-х угодкаў Чарнобыльскае катастрофы ў гарадох Беларусі адбыліся акцыі апазыцыі. 26 красавіка ў Менску праводзілася шэсьце «Чарнобыльскі шлях». Міліцэйскія сілы на гэты раз ня ўмешваліся, і, у цэлым, іх было незвычайна мала. «Чарнобыльскі шлях» праводзіцца з 1989 году, калі беларускае грамадзтва толькі даведалася пра рэальныя маштабы катастрофы. У 1996 годзе, калі шэсьце ператварылася ў выступ супраць прэзыдэнта, праваахоўныя органы дзейнічалі асабліва жорстка, а дэманстранты паводзілі сябе значна больш рашуча. Паводле дадзеных апазыцыі, усяго было затрымана каля 70 удзельнікаў акцыі, 20 чалавек зьвярнуліся па неадкладную мэдычную дапамогу, 100 — атрымалі траўмы рознае ступені цяжкасьці.

На гэты раз усё адбылося звонку спакойна, безь міліцэйскіх кардонаў. Упершыню за доўгі час прыхільнікі апазыцыі прайшлі па галоўнай вуліцы Менску — праспэкце Скарыны.

Шэсьце пачалося зь мітынгу, адкрытага намесьнікам старшыні БНФ Вячаславам Сіўчыкам, потым быў праведзены жалобны малебен, прысьвечаны Чарнобыльскай трагедыі. Шэсьце закончылася а 20 гадзіне мітынгам, на якім прысутнічала каля 7000–8000 чалавек. Пачынаўся рух калёны з 5000 чалавек.

Вулічныя выступы ў Дзень Волі і ўгодкі Чарнобыльскай аварыі паказалі, што мабілізацыйныя магчымасьці беларускай апазыцыі за пэрыяд супрацьстаяньня А. Лукашэнку не павялічыліся.

Апрача акцый палітычнай апазыцыі, у краіне адбываліся наўпрост зь ёй не зьвязаныя стыхійныя выступы. Узімку, з 1 да 5 студзеня 2001 году, па ўсёй краіне праходзіў страйк дробных беларускіх прадпрымальнікаў. Яго асноўнай прычынай стала павелічэньне мытных збораў на тавары з трэціх краін, што ўвозіліся з Расіі. Гэта змушала дробных гандляроў павышаць кошт тавару на 40%.

27 красавіка ранкам ткальлі менскага камвольнага камбінату перакрылі вуліцу, патрабуючы выплаціць затрыманыя сакавіцкія заробкі. Для разьвязаньня канфлікту на сустрэчу зь дзьвюма сотнямі ткальляў была адпраўленая дэлегацыя ўрадоўцаў рознага рангу.

5–6 ліпеня ў Менску, у Доме літаратара, прайшоў III Зьезд беларусаў сьвету. З 334 запрошаных дэлегатаў прыбылі 228 беларусаў з 20 краінаў сьвету, уключаючы ЗША, Вялікабрытанію, Нямеччыну, Бэльгію, Украіну, Польшчу. Зьезд, без усялякае дзяржаўнае падтрымкі, арганізавала Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына».

Напярэдадні зьезду беларускія амбасады за мяжой рэкамэндавалі прадстаўнікам беларускіх дыяспараў не наведваць Менску. На зьезьдзе прысутнічалі Сямён Домаш, намесьнік міністра культуры Валер Гедройц, пасол ЗША Майкл Козак. Зьезд адкрыўся вітаньнямі Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонкі Сурвілы з Канады і Васіля Быкава.

У выніковай рэзалюцыі зьезду гаварылася, што аб’яднаньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» пацьвердзіла сваю прыхільнасьць ранейшаму намеру працягваць і пашыраць сваю дзейнасьць, накіраваную на адраджэньне Беларусі як сувэрэннае дзяржавы, кансалідацыю беларусаў як нацыі і фізычнае захаваньне беларускага народу. У дэклярацыі «Беларуская дыяспара і сьвет» быў прыняты зварот да ўрадаў іншых краін, міжурадавых арганізацыяў, дабрачынных фондаў, «трэцяга сэктару» і незалежных СМІ дапамагчы беларускай нацыі вярнуць Беларусь на шлях законнасьці і паскорыць фармаваньне грамадзянскай супольнасьці.

27 ліпеня ў Менску прайшлі акцыі, прысьвечаныя Дню Незалежнасьці. (Пасьля апублікаваньня афіцыйных вынікаў рэфэрэндуму 1996 году гэтае сьвята было перанесенае на 3 ліпеня, дзень вызваленьня Менску ў другой сусьветнай вайне.) Большую частку ўдзельнікаў акцыяў складала моладзь.

Блізу паўтары тысячы чальцоў незарэгістраванага маладзёвага аб’яднаньня «Зубр» сабралося на пляцы Перамогі ў Менску. Яны прынесьлі да помніка Перамогі вялікі кош з кветкамі, затым каля 50 дзяўчат адна за адной падыходзілі да Вечнага агню і пакідалі каля яго па гвазьдзіку. Затым адбылося публічнае прыняцьцё 15 новых чальцоў — з прысягай на расійскай мове на Біблії пад бел-чырвона-белым сьцягам. Пасьля гэтага маладыя людзі з партрэтамі зьніклых беларускіх палітыкаў рушылі ў кірунку Кастрычніцкай плошчы. Аднак каля моста праз Сьвіслач іх чакалі некалькі міліцыянтаў і паўтара дзясятка чалавек у цывільным. Побач знаходзілася некалькі міліцэйскіх машынаў. Частка моладзі села на асфальт, астатнія рушылі да вуліцы Камуністычнай. У выніку было затрымана 26 чалавек, зь якіх палову

складалі непаўналетнія. Некаторых падлеткаў адпусьцілі, іншагародніх затрымалі да прыезду бацькоў. Арыштаваныя паўналетнія ўдзельнікі акцыі ўтрымліваліся ў спэцпрыёмнікуразьмеркавальніку да панядзелка, пасьля чаго над імі пачаліся суды.

Увечары ў парку Дружбы народаў каля плошчы Бангалор адбыўся канцэрт, прысьвечаны Дню Незалежнасьці, арганізаваны «БМА Group». У ім бралі ўдзел беларускія гурты «N.R.M.», «Крама», «Зьніч», «Уліс», «Zet». Пад канец канцэрту на ім прысутнічала каля 2000 чалавек.

29 ліпеня ў Менску, у Палацы культуры ААТ «Сукно», адбыўся 1 Кангрэс беларускай дэмакратычнай моладзі. У ягонай працы ўзялі ўдзел 523 дэлегаты і больш за 40 гасьцей. З маладзёвых арганізацыяў был прадстаўленыя «Малады фронт», «Маладая грамада», «Маладыя сацыял-дэмакраты», «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў», Беларуская партыя свабоды, рух экалягічнага супраціву «Зубр», Асацыяцыя маладых прадпрымальнікаў і некалькі больш дробных арганізацыяў. На кангрэсе прысутнічалі Ўладзімер Ганчарык, Сямён Домаш, старшыня «Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Анатоль Грыцкевіч і старшыня «Таварыства беларускай мовы» імя Францішка Скарыны Алег Трусаў. Таксама кангрэс наведалі прадстаўнікі палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў, праваабарончых арганізацыяў, АБСЭ і амбасады ЗША.

У 12.20 перад дэлегатамі і гасьцямі выступіў Уладзімер Ганчарык з рэзкімі выказваньнямі пра стан Беларусі, на адрас Аляксандра Лукашэнкі. Пасьля выступу супрацоўнікі міліцыі абвясьцілі пра атрыманае паведамленьне, што заля Палаца культуры замінаваная. На 15 хвілінаў заля была аддадзеная ў распараджэньне супрацоўнікаў міліцыі. Бомбу не знайшлі.

Пасьля перапынку выступілі Сямён Домаш, Вінцук Вячорка, Юры Хашчавацкі і прадстаўнікі рэгіёнаў. Пры канцы кангрэсу была прынятая рэзалюцыя, у якой было падтрыманае вылучэньне адзінага кандыдата ад шырокае грамадзянскае кааліцыі.

1 жніўня ў Менску блізкія сваякі беларускіх палітыкаў, бізнэсоўцаў і журналістаў, якія зьніклі бязь вестак або былі рэпрэсаваныя, правялі несанкцыянаваны пікет каля будынку Адміністрацыі прэзыдэнта, трымаючы ў руках партрэты сваіх родных, пацярпелых ад рэжыму. Наступным днём такі ж пікет правяла Аб'яднаная грамадзянская партыя.

6 жніўня кіраўнікі незарэгістраванае Міністэрствам юстыцыі маладзёвае арганізацыі «Малады фронт» правялі прэсавую канфэрэнцыю, на якой заявілі, што апошнім часам чальцоў іхнае арганізацыі масава выклікаюць на допыты ў КДБ. Да некаторых сябраў сьледчыя прыходзілі пагутарыць нават дамоў. Больш за тое, за актывістамі «Маладога фронту», паводле словаў лідэраў, было наладжанае сачэньне; КДБ падазраваў «Малады фронт» у датычнасьці да выбухаў на тэрыторыі расійскае амбасады ў ноч на 31 траўня.

22 жніўня ўвечары прыхільнікі беларускай апазыцыі правялі акцыю «Кола неабыякавых людзей». Некалькі сотняў грамадзянаў сталі вакол рэзыдэнцыі прэзыдэнта ў Менску. Удзельнікі трымалі партрэты зьніклых дзеячоў апазыцыі. На акцыі прысутнічаў экс-кандыдат у прэзыдэнты Сямён Домаш. Правакацыяў і спробаў разагнаць пікет не было. Гарадзкія ўлады былі загадзя папярэджаныя і не рызыкнулі разганяць пікет напярэдадні выбараў. Акцыя доўжылася каля гадзіны, затым удзельнікі разышліся. Аналягічныя акцыі адбыліся па ўсёй Беларусі.

На працягу ўсяе вясны і лета маладзёвы рух «Зубр» ладзіў палітычныя гэпінінгі, якія не патрабавалі вялікае колькасьці ўдзельнікаў. Такая форма палітычнае барацьбы ў Беларусі ўпершыню пачала выкарыстоўвацца ў шырокіх маштабах. Раней традыцыйнымі формамі пратэсту заставаліся мітынгі, дэманстрацыі й пікеты.

Напярэдадні выбараў у часе адборачнага матчу чэмпіянату сьвету-2002 Беларусь-Украіна юныя заўзятары, прадстаўнікі руху «Зубр», колерамі сваіх футболак стварылі на трыбунах выяву бел-чырвона-белага сьцягу. У выніку больш за 100 актывістаў незарэгістраванага маладзёвага руху «Зубр» былі сілком выдаленыя за межы стадыёну. Гэта суправаджалася зьбіцьцём. Абвінавачаньні ў парушэньні грамадзкага парадку на стадыёне не выстаўляліся.

Падобная сутычка адбылася раней, 16 жніўня, у часе правядзеньня маладымі прыхільнікамі АГП футбольнага турніру на стадыёне «Вымпел» у парку Чалюскінцаў у Менску. Тады трое вайскоўцаў унутраных войскаў забралі ў дзьвюх актывістак арганізацыі «Зубр» бел-чырвона-белы сьцяг. Некалькі дзясяткаў заўзятараў з «Зубра» накіраваліся ўсьлед за патрульнымі да будынка РАУС Цэнтральнага раёну і заблякавалі рух транспарту на скрыжаваньні вуліцаў Арлоўская і Старавіленская, у тым ліку і аўтобусу з АМАПам. Пасьля гэтага міліцыя аддала сьцяг пікетчыкамі. Але затым больш за дзесяць удзельнікаў былі затрыманыя, хаця пазьней іх адпусьцілі на волю.

Мабілізацыйная кампанія апазыцыі не прыцягнула да ўдзелу ў адкрытых акцыях пратэсту значнай колькасьці незадаволеных. Асноўная маса найбольш актыўных прыхільнікаў апазыцыі ўжо была задзейнічана. Выяўленьня незадаволенасьці насельніцтва, што ня ўдзельнічала ў мерапрыемствах апазыцыі, варта было чакаць на выбарах у верасьні.

У чэрвені 2001 году ў рамках праекту «Беларусь: пэрспэктывы ў XXI стагодзьдзі» НІСЭПД правёў нацыянальнае апытаньне. Было апытана 1499 рэспандэнтаў ува ўзросьце ад 18 гадоў і старэйшых, памылка рэпрэзэнтацыйнасьці не перасягнула 0,03%. Вынікі апытаньня паказалі, што пераважная бальшыня насельніцтва выбірае ўдзел у галасаваньні на прэзыдэнцкіх выбарах (гл. табліцу.)

Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці плянуеце Вы ўдзельнічаць у галасаваньні ў часе прэзыдэнцкіх выбараў у гэтым годзе?» (Пазыцыі «Цяжка адказаць» і «Няма адказу» выключаныя)

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Так | 86.8 |
| Не | 7.1 |

Крыніца: НІСЭПД.

Паводле дадзеных таго ж апытаньня, у чэрвені бальшыня насельніцтва не была задаволеная вынікамі кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі ці задаволеная часткова (гл. табліцу.)

Беларускай апазыцыі была неабходная максымальная мабілізацыя насельніцтва дзеля перамогі. Але мабілізацыя электарату ў падтрымку свайго кандыдата, супраць Аляксандра

Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці задаволеныя Вы тым, як А. Лукашэнка кіраваў краінай?»

| Варыянт адказу | [illegible], % |
|---|---|
| Хутчэй задаволены | 16.8 |
| Часткова задаволены | 31.1 |
| Часткова не задаволены | 18.0 |
| Хутчэй не задаволены | 29.7 |

Крыніца: НІСЭПД.

Лукашэнкі, можа быць эфэктыўнай толькі пры жорсткім незалежным кантролі за правядзеньнем выбараў. Аляксандру Лукашэнку, які сканцэнтраваў у сваіх руках адміністрацыйныя рэсурсы, дастатковыя для кантраляваньня дзейнасьці выбарчай камісіі, у першую чаргу неабходная ляяльнасьць бюракратыі і нэўтралізацыя староньніх назіральнікаў. І апазыцыя, і прэзыдэнт прытрымліваліся ўжо сфармаванай тактыкі ўзьдзеяньня на электарат — галоўным чынам праз СМІ і публічныя акцыі.

## Палітычныя акцыі пасьля выбараў

9 верасьня ў Беларусі праходзілі прэзыдэнцкія выбары. А 14 гадзіне, паводле афіцыйных дадзеных, яўка выбарцаў па краіне склала 57,93%. Гэта азначала, што выбары адбыліся.

Ранкам 10 верасьня Цэнтравыбаркам назваў канчатковыя афіцыйныя дадзеныя па выніках выбараў. Паводле гэтай інфармацыі, за Аляксандра Лукашэнку аддалі свае галасы 75,62% выбарцаў, за Ўладзімера Ганчарыка — 15,39%, Сяргея Гайдукевіча — 2,48%. Цэнтравыбаркам заявіў, што выбары ў Беларусі праводзіліся ў адпаведнасьці з законамі. У цэлым у выбарах узялі ўдзел 83,8% грамадзянаў Беларусі.

Тым жа ранкам у панядзелак, 10 верасьня, Уладзімер Ганчарык зладзіў прэс-канфэрэнцыю. На сустрэчы з журналістамі таксама прысутнічалі Міхаіл Чыгір і Сяргей Калякін.

Уладзімер Ганчарык заявіў, што накіроўвае скаргу ў ЦВК з патрабаваньнем прызнаць вынікі выбараў несапраўднымі. Скарга падрыхтаваная на падставе зьвестак, атрыманых ад Беларускага Гельсынскага Камітэту, грамадзкай ініцыятывы «Незалежнае назіраньне» і назіральнікаў зь ягонага штабу.

Уладзімер Ганчарык адзначыў, што фармаваньне тэрытарыяльных участковых выбарчых камісіяў адбывалася з парушэньнем прынцыпу прадстаўнічасьці. Ува ўсіх дзяржаўных СМІ вялася адкрытая прапаганда ў падтрымку Аляксандра Лукашэнкі. Бюлетэні вымаліся са скрынак і замяняліся на іншыя. «Калі Цэнтравыбаркам не задаволіць маю скаргу, тады я буду абскарджваць пастанову ЦВК у Вярхоўным судзе, а затым і ў міжнародных судовых інстанцыях. Мы будзем дамагацца непрызнаньня выбараў. Заяўляю, што вынікі галасаваньня сфальсыфікаваныя. Гэта ня вытанчаная перамога, як пасьпела ўжо паведаміць БТ, а вытанчаная падробка. Насамрэч, паводле нашых дадзеных, за мяне прагаласавалі 40% выбарцаў, а за Лукашэнку — 46%. Падобна, што мне давялося падзяліцца сваімі галасамі. Сёньня мы пойдзем у працоўныя калектывы з тым, каб у 17.00 арганізаваць на Кастрычніцкай плошчы мітынг пратэсту»[4].

Сяргей Гайдукевіч, кіраўнік ЛДП, пасьпяшаўся павіншаваць А. Лукашэнку зь перамогай.

9 верасьня на Кастрычніцкай плошчы ў Менску, насупраць рэзыдэнцыі прэзыдэнта, пад дажджом адбыўся несанкцыянаваны мітынг, які сабраў блізу 5000 прыхільнікаў беларускае апазыцыі. Мітынг быў прызначаны загадзя, на 20.00 9 верасьня. Ён прайшоў досыць спакойна, без сутычак зь міліцыяй і правакацыяў. На мітынгу выступіў адзіны кандыдат ад апазыцыі У. Ганчарык, прысутнічалі М. Чыгір, М. Марыніч, С. Антончык. Пад ранак удзельнікі разышліся.

20 верасьня адбылася цырымонія ўступленьня на пасаду прэзыдэнта. Характэрна, што А.

[4] Белорусская деловая газета. 2001. 9 верасьня.

Лукашэнка даваў прысягу не ў будынку парлямэнту, а ў Палацы Рэспублікі. А. Лукашэнка прысягаў не перад парлямэнтам, а перад сабранымі ў Палацы Рэспублікі ляяльнымі прадстаўнікамі беларускага грамадзтва. Асноўную масу запрошаных складалі прадстаўнікі праўрадавых грамадзкіх аб'яднаньняў.

А. Лукашэнка прысягнуў на Канстытуцыі 1996 году, галава Цэнтравыбаркаму Л. Ярмошына ўручыла прэзыдэнту службовае пасьведчаньне на пяцігадовы тэрмін. Аднак, апрача гэтых працэдураў, далейшая цырымонія ня мела адпаведнае рэглямэнтацыі ў беларускім заканадаўстве.

Пасьля прысягі прэзыдэнта на Кастрычніцкай плошчы адбыўся парад, хаця падобная цырымонія Канстытуцыяй не прадугледжвалася. На Кастрычніцкай плошчы перад Палацам Рэспублікі Аляксандар Лукашэнка выступіў перад прадстаўнікамі ўзброеных сілаў, Дзяржаўнага камітэту памежных войскаў, КДБ, Міністэрства па надзвычайных сытуацыях, курсантамі Вайсковае акадэміі і Сувораўскае вучэльні. Імправізаваны вайсковы парад афіцыйна праходзіў як прывядзеньне да прысягі. Пры гэтым давалася прысяга народу й прэзыдэнту. Салдаты і афіцэры маршам прайшлі па пляцы, прагрымеў салют з гарматаў, разьмешчаных непадалёк ад Кастрычніцкай плошчы, на стадыёне «Дынама», дзе звычайна знаходзіцца рэчавы рынак.

У гэты дзень цягнікі мэтро не спыняліся на станцыі «Кастрычніцкая», у цэнтар горада былі сьцягнутыя дадатковыя сілы міліцыі.

У цэлым, ніякіх сур'ёзных выступаў, акцыяў пратэсту, якія можна было б супаставіць з акцыямі апазыцыі ўвесну 2001 году, пасьля апублікаваньня афіцыйных вынікаў выбараў не адбылося. Уступленьне Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта прайшло спакойна.

## СУБ'ЕКТЫ БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ СЦЭНЫ Ў 2001 ГОДЗЕ

Акторамі беларускай палітыкі напярэдадні выбараў засталіся беспасярэднія прэтэндэнты на новы прэзыдэнцкі мандат — нелегітымнае кіраўніцтва дзяржавы, прадстаўленае прэзыдэнтам Лукашэнкам і ягонымі падначаленымі, а таксама недастаткова папулярная ў грамадзтве апазыцыя ў выглядзе палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў і грамадзянскіх ініцыятываў. Калі лукашэнкаўскі рэжым захаваў адносную згуртаванасьць, то ў шэрагах апазыцыі супярэчнасьці акрэсьліліся вакол поглядаў на тактыку зьмены рэжыму: шляхам радыкальнага адмаўленьня створаных нелегітымным прэзыдэнтам органаў дзяржаўнай улады (апазыцыя супраць дзяржавы) ці шляхам правядзеньня дэмакратычных зьменаў любымі рэальнымі сродкамі, у тым ліку — праз пошук кампрамісу з пралукашэнкаўскімі сіламі (апазыцыя супраць улады).

Перадвыбарныя зьмены ў камандзе А. Лукашэнкі былі прадыктаваныя імкненьнем дамагчыся поўнай мабілізацыі адміністрацыйных рэсурсаў. Збольшага яны прынялі форму кадравых перастановак. Заданьнем найбуйнейшых апазыцыйных сілаў напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў стала кансалідацыя шырокай грамадзянскай кааліцыі дзеля вылучэньня і супольнай падтрымкі альтэрнатыўнага Лукашэнку кандыдата. Дзеля гэтага апазыцыя пайшла на супрацоўніцтва з прадстаўнікамі намэнклятуры.

## Палітычныя партыі

У 2001 г. палітычныя партыі як чыньнікі беларускае палітыкі страцілі той уплыў, які яны мелі, напрыклад, у 1996 г. Заняпад партыяў праявіўся ня толькі ў спадзе ўплывовасьці ды ўнутранай згуртаванасьці, але і ў іхнай колькасьці. Пасьля праведзенай Міністэрствам юстыцыі Беларусі перарэгістрацыі партыяў у краіне стала ўдвая меней: калі на пачатку 1997 г. у Беларусі было зарэгістравана 35 палітычных партыяў, то ў 2001 г. іх засталося 18. Без ажыцьцяўленьня парлямэнцкай дзейнасьці, пры неспрыяльным прававым рэжыме работы з грамадзтвам непадкантрольныя ўладзе партыі скіравалі свае рэсурсы не на дасягненьне праграмных мэтаў, а на адстойваньне канстытуцыйнай законнасьці, абарону правоў чалавека і грамадзянскіх свабод у краіне. На працягу апошніх чатырох год жыцьцяздольнасьць беларускіх партыяў вызначалася не папулярнасьцю іхных праграмных палажэньняў ці ўплывам на структуры дзяржаўнае ўлады, а актыўнасьцю ў рабоце з грамадзтвам, кантактамі партыйных лідэраў з замежнымі партнэрамі ды міжнароднымі структурамі.

## Правыя

Традыцыйна правы флянг беларускай палітычнай сцэны займае БНФ «Адраджэньне». Дзейнасьць БНФ поруч зь іншымі партыямі ў Каардынацыйнай радзе дэмакратычных сілаў (КРДС) стала сьведчаньнем таго, што БНФ пачаў пазбаўляцца прэтэнзіяў на ролю арганізацыі, якая гуртуе ўсе незалежніцкія сілы. На пачатку падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў кіраўніцтва БНФ абмяркоўвала магчымасьць вылучэньня ўласнага кандыдата на пасаду прэзыдэнта. Але БНФ давялося адмовіцца ад гэтага пляну з прычыны нястачы мабілізацыйнага патэнцыялу і ўнутраных супярэчнасьцяў.

На пачатку выбарчай кампаніі БНФ ня меў і арганізацыйнага адзінства. 30 кастрычніка 1999 г. на другой сэсіі 6 зьезду БНФ «Адраджэньне» зьмяніўся лідэр: Зянона Пазьняка замяніў Вінцук Вячорка. З гэтым не пагадзілася прыхільнікі З. Пазьняка, у выніку чаго БНФ «Адраджэньне» раскалоўся на «Кансэрватыўна-хрысьціянскую партыю «Беларускі народны фронт»» (КХП БНФ) на чале з З. Пазьняком і «Грамадзкае аб'яднаньне «Беларускі народны фронт «Адраджэньне» (БНФ «Адраджэньне»), які ўзначаліў В. Вячорка. 13 верасьня 1999 г. Міністэрства юстыцыі зарэгістравала партыю КХП БНФ, а 18 лютага 2000 г. — грамадзкае аб'яднаньне БНФ «Адраджэньне». Падчас выбараў КХП БНФ вылучыла ўласнага кандыдата ў прэзыдэнты — З. Пазьняка, які не набраў дастатковай колькасьці подпісаў для рэгістрацыі й заклікаў сваіх прыхільнікаў нікога не падтрымліваць. БНФ «Адраджэньне» аддаў перавагу супольным дзеяньням з дэмакратычнымі сіламі.

Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП) да 1999 г. выконвала ролю цэнтрысцкае партыі, скіраванай перадусім на парлямэнцкую дзейнасьць. Нават пасьля рэфэрэндуму 1996 г. галоўным кірункам ейнай дзейнасьці было інтэлектуальнае забесьпячэньне дзейнасьці фракцыі лібэралаў «Грамадзянскае дзеяньне» ў Вярхоўным Савеце. У 1999 г., пасьля сьмерці намесьніка старшыні АГП Г. Карпенкі ды няўдалых акцыяў апазыцыі 16 траўня і 21 ліпеня 1999 г., АГП радыкалізавалася і ідэалягічна наблізілася да БНФ. Так, у партыйным дакумэнце «Шлях Беларусі да дэмакратыі», прынятым у сьнежні 1999 г., яна абвясьціла сябе «народ-

най партыяй», што не тыпова для лібэральнай. АГП стала больш актыўна ўдзельнічаць у вулічных акцыях. Пасьля зьмены кіраўніцтва ў красавіку 2000 г. і сыходу зь яе шэрагаў Юр'я Марозава, Уладзімера Навасяда, Васіля Шлындзікава і Леаніда Злотнікава АГП выступіла з ініцыятывай байкатаваньня выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Поруч з БНФ АГП адыгрывала ключавую ролю ў дзейнасьці Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў на першых стадыях вылучэньня адзінай кандыдатуры на пасаду прэзыдэнта ад аб'яднанай апазыцыі.

## Цэнтар

Адмова беларускіх правых партыяў кантактаваць зь нелегітымнымі органамі ўлады прывяла да таго, што электарат цэнтрысцкіх сілаў, прадстаўлены сярэдняй клясай, інтэлігенцыяй, часткова намэнклятурай і работнікамі дзяржапарату, аказаўся слаба ахопленым уплывам дэмакратычных сілаў. АГП, ператварыўшыся зь лібэральнай у лібэральна-кансэрватыўную партыю, вызваліла нішу дзейнасьці цэнтрысцкіх сілаў для пралукашэнкаўскай Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі С. Гайдукевіча (створанай у 1995 г. з удзелам і на ўзор Лібэральна-дэмакратычнае партыі Расіі Ўладзімера Жырыноўскага), а таксама такіх новых палітычных актораў, як сацыяльна-лібэральнае грамадзкае аб'яднаньне «Яблык» Вольгі Абрамавай (таксама створанае пры падтрымцы аднайменнае расійскае партыі) ці Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада С. Шушкевіча.

## Левыя

Папулісцкая палітыка А. Лукашэнкі стварыла для левых у Беларусі праблему з ідэалягічным самавызначэньнем. Ува ўмовах неразьвітасьці прыватнага бізнэсу ў Беларусі аб'ектам прыкладаньня палітычнай энэргіі і сацыял-дэмакратаў, і прафсаюзаў стаў галоўны наймальнік — дзяржава. Таму левацэнтрысцкія сілы ў Беларусі прыцягваюць да сябе найменш радыкальную частку левага электарату, а таксама частку цэнтрысцкага. Між тым, наёмныя работнікі складаюць у Беларусі шматлікую сацыяльную базу, якая па-ранейшаму недастаткова задзеяная ў палітыцы. Па-першае, гэтаму замінае шматлікасьць беларускіх сацыял-дэмакратычных партыяў і лідэраў. Па-другое, значная частка працоўных не давярае новым партыям і аддае перавагу больш традыцыйным формам удзелу ў палітыцы, ініцыяваным начальствам альбо прафсаюзамі.

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) (БСДП (НГ) стала першай дэмакратычнай партыяй, якая адкалолася ад апазыцыі, згуртаванай у КРДС. Пэўныя разыходжаньні паміж БСДП (НГ) ды іншымі прадстаўнікамі апазыцыі акрэсьліліся яшчэ ўвесну 1999 г., калі плянаваліся выбары ў мясцовыя Саветы. АГП і БНФ пастанавілі ў іх ня ўдзельнічаць, а БСДП (НГ) дазволіла сваім чальцом вылучацца кандыдатамі, хаця і не ад партыі, а ў якасьці прыватных асобаў. Пры падрыхтоўцы акцыі «Байкот-2000», арганізаванай КРДС, пастанова аб'яднанай апазыцыі аб няўдзеле ў выбарах у Палату прадстаўнікоў была катэгарычнай і абавязковай для ўсіх чальцоў гэтай арганізацыі. Насуперак гэтай пастанове кіраўніцтва БСДП (НГ) адмовілася ад байкоту, прычым Цэнтральны камітэт БСДП (НГ) двойчы

ўхваліў пастанову лідэра партыі Мікалая Статкевіча ўдзельнічаць у выбарах у ПП НС. М. Статкевіч у парлямэнт не патрапіў, а БСДП (НГ) ня толькі падарвала адзінства апазыцыі, але і сама апынулася на мяжы расколу. За ўдзел у выбарах сябры КРДС прагаласавалі за выключэньне БСДП (НГ) з сваіх шэрагаў, пакінуўшы прадстаўніцтва з правам дарадчага голасу для фракцыі БСДП (НГ) «За адзінства», якая байкот падтрымлівала. 20 лістапада 2000 г. пастановай паседжаньня гаркаму БСДП (НГ) лідэр гэтай фракцыі Аляксей Кароль за невыкананьне патрабаваньняў статуту быў выключаны з партыі, але ўжо праз 2 тыдні яго сяброўства ў партыі было ўзноўлена. Пасьля фармальнае адзінства партыі захавалася, але разыходжаньні паміж прыхільнікамі А. Караля і М. Статкевіча ня зьніклі.

Іншыя сацыял-дэмакратычныя партыі, за выняткам БСДГ С. Шушкевіча, калі не ўзначальваюцца прафсаюзнымі лідэрамі, то арганізацыйна зьвязаныя з прафсаюзамі. Сярод іх найбольш вядомыя Беларуская партыя працы (БПП) і Беларуская партыя жанчын «Надзея». 8 жніўня 2001 году, Беларуская партыя працы (БПП) на V зьезьдзе асудзіла прэзыдэнта Лукашэнку за падмену рашучых захадаў для выпраўленьня эканамічнага стану краіны папулісцкімі абяцанкамі. У заяве «Аб сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў Рэспубліцы Беларусі напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў» БПП выказалася за сыход А. Лукашэнкі і яго каманды з палітычнай арэны.

Найбольшую эвалюцыю ў Беларусі перажылі камуністы. Тая частка камуністаў, якая перайшла на бок улады, пераўтварылася ў яшчэ адну пралукашэнкаўскую арганізацыю і не скарыстала нават магчымасьці стварыць фракцыю ў парлямэнце. Апазыцыйная прэзыдэнту Партыя камуністаў беларуская на чале зь Сяргеем Калякіным, наадварот, адчула ўціск улады: ад адмоваў у прадстаўленьні памяшканьняў для партыйных мерапрыемстваў да паклёпаў і абвінавачаньняў у агентурнай дзейнасьці праз дзяржаўныя СМІ. Цяпер антылукашэнкаўскія камуністы адстойваюць прынцып разьдзяленьня ўладаў, шматпартыйнасьць, грамадзянскія правы і свабоды, а ў эканоміцы прапануюць раўнапраўнасьць розных формаў уласнасьці. Паводле ўласнага прызнаньня, лідэр беларускіх камуністаў С. - Калякін лічыць сябе перадусім прафэсійным палітыкам, і толькі пасьля — камуністам. На прэзыдэнцкія выбары ён выйшаў у ролі дэмакратычнага кандыдата зь непартыйнай плятформай.

Што+разу пры неабходнасьці мабілізацыі сваіх прыхільнікаў беларускія партыі сутыкаюцца з патрэбай у стварэньні кааліцыі прадстаўнікоў усяго палітычнага спэктру — ад левых (камуністаў) да правых (нацыянальна скіраваных кансэрватараў). Тым ня менш, спробы ейнага стварэньня дагэтуль не прынесьлі ім спадзяванага выніку.

## Прафсаюзы

Хаця наёмныя работнікі складаюць сацыяльную базу сацыял-дэмакратычных партыяў, іх падтрымкай імкнуцца заручыцца і прафсаюзы. За апошнія 5 год адбылася заўважная палітызацыя прафсаюзаў, а са студзеня 1999 г. супрацоўніцтва апазыцыі з прафсаюзамі пачало замацоўвацца нават дакумэнтальна*.

* Другі Кангрэс дэмакратычных сілаў абавязаўся падтрымаць прафсаюзы ў правядзеньні агульнанацыянальнай акцыі пратэсту.

У 2001 г. у Беларусі было зарэгістравана 38 рэспубліканскіх прафсаюзаў і 16 прафсаюзаў прадпрыемстваў (установаў і арганізацыяў). Найбольш буйной паводле колькасьці заставалася Фэдэрацыя прафсаюзаў беларуская, якая аб'ядноўваў частку беларускіх прафсаюзаў і ўлучала 4,5 млн. чалавек. Аднак для бальшыні зь іх сяброўства ў прафсаюзе застаецца данінай савецкай традыцыі, калі работнікі дзяржпрадпрыемстваў уступалі ў прафсаюзы аўтаматычна пры прыёме на працу, незалежна ад уласнага жаданьня. Пры гэтым тэрытарыяльныя прафсаюзныя структуры традыцыйна маюць блізкія сувязі зь мясцовымі ўладамі. Калі ў 2000 г. А. Лукашэнка паспрабаваў зьмяніць кіраўніцтва некаторых галіновых прафсаюзаў, то сутыкнулся зь нечаканым супрацівам сваёй жа «вэртыкалі» на месцах, бо акурат «вэртыкальнікам» падпарадкоўваліся кіраўнікі прафсаюзных арганізацыяў на прадпрыемствах.

У тым жа годзе праводзілася праверка дзейнасьці ФПБ, падчас якой былі замарожаныя рахункі арганізацыі. Атака на кіраўніцтва ФПБ выклікала рэзкія заявы Міжнароднай арганізацыі працы.

Да эскаляцыі канфлікту паміж уладай і прафсаюзамі моцна спрычынілася пастанова прэзыдыюму ФПБ аб падтрымцы У. Ганчарыка, які вылучыўся кандыдатам на прэзыдэнцкіх выбарах. Пасьля яе ўзьдзеяньне рэжыму на ФПБ стала жарстчэйшым: ад дыскрэдытацыі ў СМІ да праверак фінансавай дзейнасьці ды запужваньняў пры дапамозе Канстытуцыйнага Суду*. 12 студзеня 2001 г. Міністэрства юстыцыі распаўсюдзіла заяву з пагрозай пазбавіць ФПБ рэгістрацыі ў выпадку вылучэньня У. Ганчарыка кандыдатам у прэзыдэнты. Адным зь першых адказаў на зьяўленьне кандыдата ад прафсаюзаў стала спроба ўраду замарозіць сацыяльнае партнэрства: праз месяц пасьля ўзгадненьня пазыцыяў па пяцёх спрэчных пытаньнях Генэральнага пагадненьня на 2001–2003 гг. Савет міністраў перагледзеў сваю пазыцыю і прапанаваў прафсаюзам новы праект пагадненьня з рэзка скарочанай колькасьцю сацыяльных гарантыяў і нявыгаднымі для прафсаюзаў умовамі. У праекце былі таксама скарочаныя паўнамоцтвы прафсаюзаў для кантролю выкананьня заканадаўства аб працы.

Пасьля выбараў прэзыдыюм ФПБ накіраваў А. Лукашэнку не віншаваньні, але пажаданьні выконваць свае перадвыбарныя абяцаньні. Пры гэтым лідэры прафсаюзаў работнікаў дзяржаўных установаў, аховы здароўя выступілі з ініцыятывай скліканьня нечарговага пленуму ФПБ для адхіленьня У. Ганчарыка ад пасады старшыні ФПБ «з прычыны ўцягваньня прафсаюзу ў палітыку».

## КРДС пасьля IV Кангрэсу дэмакратычных сілаў

Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў (КРДС) была ўтворана 6 партыямі й арганізацыямі як сталая кааліцыйная арганізацыя беларускай апазыцыі. КРДС заснавалі АГП, БНФ, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная грамада), Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў**, Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў і грамадзянская ініцыятыва «Хартыя'97». Кангрэс дэмакратычных сілаў адыгрываў ролю форуму, на зацьверджаньне

* У Канстытуцыйным Судзе разглядалася скарга аднаго з чальцоў ФПБ аб парадку ўплаты сяброўскіх складак.

** Пасьля афіцыйнай рэгістрацыі гэтая арганізацыя стала называцца «Асацыяцыя грамадзкіх аб'яднаньняў «Асамблея», далей па тэксьце «Асамблея».

якога выносяцца прынцыповыя для аб'яднанай беларускай апазыцыі пастановы. На першым кангрэсе дэмакратычных сілаў, які адбыўся 18–19 кастрычніка 1996 г., напярэдадні другога рэфэрэндуму, беларускае грамадзтва выказвалася ў абарону Канстытуцыі 1994 г. і супраць прэзыдэнцкай дыктатуры. На V Кангрэсе 18 жніўня 2001 г. шырокая грамадзянская кааліцыя канчаткова ўхваліла супольную стратэгію дзеяньняў на прэзыдэнцкіх выбарах. Для раскладу антылукашэнкаўскіх сілаў напярэдадні выбараў прынцыповае значэньне меў IV Кангрэс дэмакратычных сілаў, які прайшоў 2 ліпеня 2000 г. На IV Кангрэсе да КРДС далучыліся прадстаўнікі Кансультацыйнае рады апазыцыйных палітычных партыяў — Беларускай партыі працы, Беларускай партыі жанчын «Надзея», Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады С. Шушкевіча, члены Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, а таксама абласных і менскай гарадзкой КРДС. IV Кангрэс дэмакратычных сілаў прыняў рэзалюцыю «Аб кансалідацыі дэмакратычных сілаў», у якой «для эфэктыўнай рэалізацыі сумесных палітычных пастановаў Кангрэсу дэмакратычных сілаў» заклікаў мясцовыя структуры арганізацыяў — удзельніцаў Кангрэсу прыступіць да стварэньня рэгіянальных каардынацыйных радаў дэмакратычных сілаў у абласьцях, гарадах і раёнах, дзе яны яшчэ не створаныя.

Каб не дапусьціць легітымізацыі ўлады А. Лукашэнкі сваім удзелам у рабоце незаконна створаных дзяржаўных структур, на IV Кангрэсе дэмакратычных сілаў беларуская апазыцыя пастанавіла байкатаваць выбары ў Палату прадстаўнікоў. У якасьці прычыны гэтай пастановы была названая адмова ўладаў выканаць умовы правядзеньня законных, свабодных і справядлівых выбараў: наданьне парлямэнту рэальных паўнамоцтваў адзінага заканадаўчага органа; прывядзеньне выбарчага заканадаўства ў адпаведнасьць з эўрапейскімі стандартамі; забесьпячэньне апазыцыі доступу да дзяржаўных СМІ; спыненьне палітычных рэпрэсіяў, забесьпячэньне свабоды сходаў, мітынгаў і шэсьцяў, а таксама свабоды слова.

Насуперак чаканьням ініцыятараў стварэньня КРДС, гэтая структура ня стала адзіным каардынацыйным цэнтрам дзеяньняў усіх антылукашэнкаўскіх сілаў. Не аб'яднала беларускую апазыцыю і акцыя «Байкот-2000»: новы склад ПП НС быў пасьпяхова абраны, прычым у ім апынуліся асобныя дэмакратычныя кандыдаты, якім гэты посьпех каштаваў прыналежнасьці іх рухаў да аб'яднанай апазыцыі (В. Абрамава) ці нават членства ў партыі (У. Навасяд). Разыходжаньні ў стаўленьні да гэтай акцыі выклікалі канфлікты ўнутры самой КРДС. За адмову лідэра БСДП (НГ) М. Статкевіча падпісваць заяву аб асуджэньні выбараў КРДС выключыла ягоную партыю са свайго складу. У знак салідарнасьці з БСДП (НГ) паседжаньні КРДС ігнаравала Беларуская партыя працы. Дэзарганізоўвала Раду і пастанова IV Кангрэсу дэмакратычных сілаў аб наданьні права голасу грамадзкім аб'яднаньням, у тым ліку рэгіянальным і афіцыйна не зарэгістраваным. Прадстаўнікі БСДГ і Беларускай партыі жанчын «Надзея» неаднаразова прапускалі паседжаньні КРДС, бо іх адштурхоўваў роўны статус іхных партыяў зь непартыйнымі і незарэгістраванымі арганізацыямі. 29 траўня 2001 г. з-за непаразуменьняў у дыскусіі аб парадку вызначэньня пазыцыі адзінага кандыдата ў дачыненьнях з Расіяй выхадам з КРДС прыгразіла БСДГ С. Шушкевіча*. Прадстаўнікі БСДГ і раней дэманстравалі незадаволенасьць адсутнасьцю кворуму, але якраз сыход гэтай партыі азначаў бы для КРДС канчатковую страту мандату на вылучэньне адзінага кандыдата ад апазыцыі. Між тым, на гэтым працэс распаду КРДС не спыніўся. 27 чэрвеня яе пакінула

* Прадстаўнік БСДГ Алег Багуцкі заявіў, што яго партыя можа выйсьці з КРДС дзеля беспрынцыповай пазыцыі гэтай структуры ў пытаньні інтэграцыі з Расіяй.

Беларуская партыя жанчын «Надзея». Паводле словаў лідэра партыі В. Палевіковай, гэта было выклікана парушэньнямі дамоўленасьцяў аб складзе «пяцёркі», у прыватнасьці тым, што некаторыя высокапастаўленыя функцыянэры АГП агітавалі далучыцца да «пяцёркі» новых кандыдатаў (А. Ярашука, Н. Машэраву).

## Незалежнае беларускае грамадзтва

Новай зьявай, не характэрнай для прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г., стаў актыўны ўдзел у палітыцы (у тым ліку, у перадвыбарнай кампаніі) грамадзкіх аб’яднаньняў. Паводле дадзеных Міністэрства юстыцыі, у Беларусі ў 2001 г. было зарэгістравана 1900 грамадзкіх арганізацыяў. Фармальна, палітыка ня ёсьць сфэрай іх дзейнасьці, але фактычна шмат якія арганізацыі трэцяга сэктару і нефармальныя дэмакратычныя рухі перажылі палітызацыю. Па-першае, дзяржаўная палітыка, скіраваная супраць інстытуцый «трэцяга сэктару», вымусіла шмат якія арганізацыі актыўней гуртавацца паміжсобку, каб супольнымі намаганьнямі адстойваць свае правы і знаходзіць рэсурсы на дзейнасьць. Па-другое, шмат якія НДА былі ўтвораныя пасьля канстытуцыйнага перавароту 1996 г. прадстаўнікамі апазыцыйных сілаў і насамрэч перасьледавалі палітычныя мэты, будучы рэакцыяй гэтых сілаў на ўскладненьне варункаў легальнай палітычнай дзейнасьці.

Першымі палітычнымі *de facto* і грамадзкімі *de jure* арганізацыямі сталі моладзевыя аддзяленьні палітычных партыяў: «Маладая Грамада» — атожылак БСДП (НГ), «Малады Фронт» — БНФ, «Грамадзянскі Форум» — АГП. Многія прадэмакратычныя НДА паўсталі самастойна, без удзелу партыяў, але прытрымліваліся выразнай палітычнай пазыцыі. Такія аб’яднаньні, як «Хартыя’97», Асамблея і «Рэгіянальная Беларусь», занялі правы флянг палітычнага поля — паміж БНФ «Адраджэньне» і АГП.

Паколькі прававыя ўмовы дзейнасьці арганізацыяў трэцяга сэктару ў Беларусі не спрыяюць грамадзянскай актыўнасьці, а атрыманьне сродкаў на дзейнасьць дробнымі і рэгіянальнымі арганізацыямі дагэтуль застаецца праблематычным, то неабходнай умовай іх дзейнасьці стала ўменьне наладжваць кантакты паміжсобку і з замежнымі партнэрамі. Пасьля закрыцьця ў Беларусі фонду Сораса ягоную сфэру занялі такія рэсурсныя цэнтры, як «Аб’яднаны шлях», Асамблея, Інстытут дэмакратыі ўва Ўсходняй Эўропе, Цэнтар «Супольнасьць» ды інш. Каардынацыя рэгіянальных арганізацыяў ды нефармальных ініцыятываў прывяла да зьяўленьня такіх структур, як «Ратуша» ў Горадні, «Контур» у Віцебску, «Вежа» ў Берасьці, «Кола сяброў» у Магілёве і г.д.

Павелічэньне колькасьці і ролі недзяржаўных арганізацыяў дэмакратычнай арыентацыі (2–3 сьнежня 1999 г., калі адбыўся III Кангрэс Асамблеі, у ейным складзе было 430 арганізацыяў) адлюстравалася ў пастанове Асамблеі аб рэгістрацыі і ўдзеле ў прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. Новы старшыня Асамблеі Алесь Бяляцкі заявіў, што трэці сэктар павінен узяць на сябе звычайную для грамадзкіх арганізацыяў на выбарах ролю — назіраньне за выбарамі, удзел у рабоце выбарчых камісіяў і прыцягненьне да выбараў моладзі.

Паказальнай зьявай для сучаснай беларускай палітыкі стала грамадзянская ініцыятыва «Хартыя’97», якая дагэтуль ня мае ні юрыдычнага статусу, ні выразнай структуры. У лістападзе 1997 г. яна паўстала ў выглядзе ініцыятывы для аказаньня юрыдычнай дапамогі грамадзянам, правядзеньня масавых мерапрыемстваў, апэратыўнага інфармаваньня і рэагаваньня

грамадзтва на незаконныя дзеяньні беларускіх уладаў. Ня будучы партыяй, «Хартыя'97» стварыла ідэйную глебу для каардынацыі дзейнасьці незадаволенай рэжымам расійскамоўнай часткі грамадзтва і пачала прэтэндаваць на ролю адной з найбольш уплывовых сілаў у КРДС.

Напярэдадні выбараў беларускія НДА займаліся ўсімі відамі передвыбарнай дзейнасьці: ад мабілізацыі й назіраньня да збору подпісаў і агітацыі. Акрамя гэтага, яны ўдзельнічалі ў вызначэньні выбарчай стратэгіі дэмакратычных сілаў. 13 жніўня паміж двума дэмакратычнымі кандыдатамі ў прэзыдэнты й шырокай грамадзянскай кааліцыяй было падпісана пагадненьне «Аб узаемных забавязаньнях адзінага кандыдата і шырокай грамадзкай кааліцыі ў пэрыяд і пасьля выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі». Пры гэтым розьніцы паміж палітычнымі і грамадзкімі суб'ектамі «шырокай грамадзкай кааліцыі» не праводзілася. Адзінства беларускай апазыцыі і стала галоўнай ейнай перамогай на прэзыдэнцкіх выбарах.

## Афіцыйныя ўлады

Прэзыдэнт Лукашэнка, рыхтуючыся да выбараў, ажыцьцявіў кадравыя перастаноўкі ў Міністэрстве ўнутраных справаў і Радзе бясьпекі. Таксама ён стараўся прадухіліць удзел у кампаніі прамыслова-эканамічнай эліты. Грунтоўныя зьмены ў Лукашэнкавым атачэньні пачаліся задоўга да выбараў. 27 лістапада 2000 г. былі звольнены старшыня КДБ У. Мацкевіч і генпракурор А. Бажэлка. В. Шэйман быў выведзены з Рады бясьпекі і прызначаны генпракурорам. На пасаду міністра абароны быў ізноў прызначаны Л. Мальцаў. Былы начальнік службы бясьпекі прэзыдэнта У. Навумаў, які некалі ўзначальваў спэцпадразьдзяленьне Міністэрства ўнутраных справаў «Алмаз», атрымаў пасаду міністра ўнутраных справаў. КДБ узначаліў былы начальнік службы бясьпекі прэзыдэнта Л. Ерын.

Прызначэньне былога першага намесьніка міністра ўнутраных справаў М. Удавікова на пасаду намесьніка дзяржсакратара Рады бясьпекі сьведчыла пра часовае зьніжэньне ўплыву аднаго з найбліжэйшых паплечнікаў А. Лукашэнкі В. Шэймана, якога замяніў на пасадзе дзяржсакратара Рады бясьпекі У. Латыпаў. Пазыцыі былога міністра ўнутраных справаў Ю. Сівакова, падчас працы якога на гэтай пасадзе адбыліся гучныя скандалы, выкліканыя зьнікненьнем вядомых у Беларусі людзей, істотна не пахіснуліся: 13 лістапада 2000 г. ён быў прызначаны намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта.

Ня ўсе перадвыбарныя перастаноўкі гарантавана ўзмацнялі становішча Лукашэнкі напярэдадні выбараў. Ад яго аддаліліся яго былыя паплечнікі, добра знаёмыя зь «непублічнымі» сфэрамі дзейнасьці беларускага прэзыдэнта (Іван Ціцянкоў, Алег Бажэлка, Віктар Лагвінец).

Адразу пасьля выбараў А. Лукашэнка зрабіў шэраг адставак і прызначэньняў. 12 верасьня ўказам прэзыдэнта ў адстаўку адпраўлены кіраўнік прэзыдэнцкай Адміністрацыі Міхаіл Мясьнікoвіч. На месца М. Мясьніковіча прызначаны кіраўнік Рады Бясьпекі, нядаўні міністар замежных справаў Урал Латыпаў, сам Мясьніковіч быў пераведзены на пасаду памочніка прэзыдэнта ў асаблівых даручэньнях. Новым кіраўніком Рады Бясьпекі стаў былы кіраўнік службы бясьпекі прэзыдэнта Генадзь Нявыглас. Першы намесьнік кіраўніка Адміністрацыі, ваяўнічы русафіл Уладзімер Замяталін быў таксама адпраўлены ў адстаўку. Першым намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта прызначаны былы першы намесьнік дзяржаўнага сакратара Рады Бясьпекі, кадравы работнік спэцслужбаў Станіслаў Князеў. Яшчэ адным намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі стаў Леанід Козік, які да гэтага працаваў намесьнікам прэм'ер-міністра.

У першай дэкадзе кастрычніка быў прызначаны новы прэм'ер-міністар Генадзь Навіцкі — міністар архітэктуры і будаўніцтва ўва ўрадзе У. Ярмошына. У адрозьненьне ад У. Ярмошына, Г. Навіцкі, зямляк А. Лукашэнкі, які прыйшоў ўва ўладу разам зь яго абраньнем у 1994 г., ніяк не праявіў сябе ў якасьці публічнага палітыка і вызначаўся адсутнасьцю асабістых сувязяў з расійскім кіраўніцтвам (сфэра будаўніцтва, у якой зрабіў кар'еру Навіцкі, за часоў існаваньня СССР адміністрацыйна падпарадкоўвалася Менску, а не Маскве).

На прэс-канфэрэнцыі з нагоды пераабраньня А. Лукашэнка заявіў, што прынцыповых зьменаў у палітычным курсе краіны не плянуецца. У эканоміцы ім была паабяцаная лібэралізацыя пры дзяржаўнай падтрымцы дробнага й сярэдняга бізнэсу ды захаваньні ранейшага аб'ёму сацыяльных гарантыяў. У палітыцы — працяг барацьбы з карупцыяй, павышэньне ролі ўраду, умацаваньне партыйнай сыстэмы і дзяржаўная падтрымка СМІ. У вонкавай палітыцы — захаваньне курсу на інтэграцыю з Расіяй.

## Высновы

Пры заўважных перагрупаваньнях у стане беларускай апазыцыі захоўваўся ранейшы баланс сілаў. Сыстэма ўлады заставалася па-ранейшаму самадастатковай і ня мела патрэбы ў выразнай ідэалёгіі. Сыстэму апазыцыі аб'ядноўвала перадусім непрыняцьцё сфармаванай сыстэмы дзяржаўнай улады.

Няздольнасьць партыяў нацыянальна-кансэрватыўнай, камуністычнай і сацыял-дэмакратычнай арыентацыі здабыць уладу паасобку вымусіла іх стварыць супольную кааліцыю. Пры гэтым ідэалягічнае самавызначэньне беларускіх партыяў становіцца ўсё больш умоўным, бо яно адбываецца ўва ўмовах дыфузіі партыйнай сыстэмы з трэцім сэктарам. На пачатак выбарчай кампаніі 2001 г. грамадзкія аб'яднаньні й нават незарэгістраваныя грамадзянскія ініцыятывы набылі ў КРДС роўны статус з палітычнымі партыямі. Мяжа паміж палітычнымі і непалітычнымі арганізацыямі стала яшчэ больш плыннай, бо сфэра дзейнасьці партыяў стала асвойвацца непартыйнымі грамадзка-палітычнымі ўтварэньнямі, што працавалі на выбарах пад кіраўніцтвам штабоў апазыцыйных кандыдатаў. Праз уласныя структуры яны стваралі арганізацыйную аснову прэзыдэнцкай кампаніі, забясьпечвалі (ці, прынамсі, мусілі забясьпечваць) мабілізацыю розных групаў насельніцтва, працавалі з выбарчымі камісіямі — рабілі тое, што партыі робяць для ўласных вылучэнцаў. Упершыню з апазыцыйнымі сіламі сталі гуртавацца прадстаўнікі намэнклятуры, хаця гэты хаўрус ня стаў дастаткова дзейсным, а сама стаўка была прадыктаваная ня строгім палітычным разьлікам, а асабістым візіянэрствам некаторых дэмакратычных лідэраў.

# ПРАЦЭС АДБОРУ КАНДЫДАТАЎ

Выбары 2001 г. давалі апанэнтам А. Лукашэнкі большы шанец прыйсьці да ўлады, чымся працэдура імпічмэнту прэзыдэнта ў 1996 г. ці альтэрнатыўная прэзыдэнцкая кампанія 1999 г. Тым ня менш, дэмакратычныя сілы сутыкнуліся з праблемамі, якія яны ня здолелі пераадолець цягам выбарчага марафону.

Першай і галоўнай праблемай для дэмакратычных сілаў стаў пошук уласнага лідэра, здольнага перамагчы А. Лукашэнку на выбарах. З палітыкаў, якія прэтэндавалі на пасаду прэзыдэнта на выбарах 2001 г., усяго два — Зянон Пазьняк і Віктар Цярэшчанка, калі не лічыць Лукашэнку — вылучаліся кандыдатамі ў прэзыдэнты ў 1994 г. Але і першы, і другі не маглі разьлічваць на падтрымку з боку аб'яднанай апазыцыі і шырокай кааліцыі дэмакратычных сілаў. Выбар гэтых сілаў быў зроблены на карысьць двух былых намэнклятурнікаў — лідэра Фэдэрацыі прафсаюзаў У. Ганчарыка і былога кіраўніка Гарадзенскай вобласьці С. Домаша, вылучанага грамадзкім аб'яднаньнем «Рэгіянальная Беларусь».

## Вылучэньне канкурэнтаў А. Лукашэнкі на выбарах

Як улада, так і апазыцыя пачалі перадвыбарную кампанію задоўга да рэгістрацыі кандыдатаў. Яшчэ 22 сьнежня 2000 г. Сяргей Гайдукевіч і Міхаіл Чыгір былі запрошаны ў студыю расійскага тэлеканала ОРТ на запіс праграмы «Здесь и сейчас» А. Любімава як патэнцыйныя кандыдаты на пасаду прэзыдэнта Беларусі на выбарах 2001 г.

Праблема вызначэньня адзінага кандыдата ад аб'яднанай апазыцыі была ўзьнята адначасова з пытаньнем аб падрыхтоўцы да выбараў — адразу пасьля восеньскіх выбараў у ПП НС. 15 сьнежня 2000 г. Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў абмеркавала кандыдатуры трох прэтэндэнтаў на ўдзел у прэзыдэнцкіх выбарах: экс-прэм'ера М. Чыгіра, лідэра грамадзкага аб'яднаньня «Рэгіянальная Беларусь» С. Домаша і вылучанага Фэдэрацыяй прафсаюзаў беларускай і партыяй працы старшыні ФПБ У. Ганчарыка. Выбар паміж імі быў праблематычным, бо кожны з трох кандыдатаў паасобку меў слабыя бакі. С. Домашу дзяржаўныя СМІ навязвалі вобраз радыкальнага апазыцыянэра, зьвязанага з БНФ, што магло адштурхнуць «нявызначаных» выбарцаў. Вылучэньню адзіным М. Чыгіра заміналі крымінальныя справы, распачатыя ўладамі ў 1999 г. супраць яго, а зь лютага 2001 г. — і супраць ягонага сына. Не на карысьць М. Чыгіру быў таксама ўдзел у выбарах у Палату прадстаўнікоў падчас акцыі «Байкот-2000», а таксама пражываньне ў Маскве, якое магло зашкодзіць яго рэгістрацыі ў якасьці кандыдата (згодна з арт. 80 Канстытуцыі, кандыдат у прэзыдэнты павінен няспынна жыць на тэрыторыі Беларусі на працягу 10 апошніх год перад вылучэньнем). КРДС мелася вызначацца з адзіным кандыдатам да моманту рэгістрацыі, прычым гэтае вызначэньне мусіў зацьвердзіць чарговы V Кангрэс дэмакратычных сілаў. Акрамя прадстаўнікоў ад КРДС, пра свой намер выставіць свае кандыдатуры на будучых прэзыдэнцкіх выбарах на 15 сьнежня 2000 г. заявілі С. Гайдукевіч і С. Калякін.

Паралельна з КРДС пытаньне аб адзіным кандыдату абмяркоўвалася ў партыях. Сваё бачаньне гэтага пытаньня выказаў былы лідэр АГП С. Багданкевіч. Яшчэ ў студзені 2001 г. ён прапанаваў, каб узгадненьне кандыдатуры прайшло на падставе бягучага рэйтынгу і выбарчых пэрспэктываў, прычым да рэгістрацыі кандыдатаў. Паводле сцэнару С. Багданкевіча, усе астатнія апазыцыйныя палітыкі павінны былі ўвайсьці ў кааліцыйную каманду «ўзгодненага» кандыдата. Зацьвердзіць вылучэньне адзінага кандыдата мусіў Кангрэс дэмакратычных сілаў, але пры ўмове, што Кангрэс будзе арганізаваны не КРДС, якая прадстаўляе правацэнтрысцкія сілы, а пад эгідай шырэйшай грамадзянскай кааліцыі.

Вылучэньне кандыдата абмяркоўвалася ня толькі кааліцыйнымі структурамі, але й партыямі. БНФ «Адраджэньне» на чарговым сойме 13 студзеня 2001 г. пастанавіў, што кандыдат

ад дэмакратычнай кааліцыі павінен быць вызначаны праз пагадненьне як мага шырэйшага кола дэмакратычных сілаў. Ключавым момантам у вызначэньні меў стаць Кангрэс дэмакратычных сілаў. КХП БНФ таксама заяўляла аб падтрымцы адзінага кандыдата ад апазыцыі, але 18 лютага Соймавая канфэрэнцыя КХП БНФ вылучыла кандыдатам у прэзыдэнты З. Пазьняка.

У красавіку зьявіліся чуткі, нібыта БНФ зьбіраецца байкатаваць прэзыдэнцкія выбары. Між тым, БНФ настойваў на хутчэйшым вызначэньні адзінага кандыдата, бо лічыў недапушчальным збор подпісаў за некалькіх прэтэндэнтаў паасобку. 9–10 чэрвеня падчас чарговага Сойму Грамадзкага аб'яднаньня БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ было адзначана, што Кангрэс дэмакратычных сілаў Беларусі павінен прайсьці як мага хутчэй, але ні ў якім разе не пасьля рэгістрацыі ў Цэнтравыбаркаме кандыдатаў у прэзыдэнты.

4 лютага 2001 г., калі стала відавочна, што працэс вылучэньня адзінага кандыдата ад апазыцыі зацягнуўся, АГП прыняла новую канцэпцыю вызначэньня, дзе прызнала існаваньне двух цэнтраў апазыцыі: Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў і Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай. Адначасова замест вылучэньня адзінага кандыдата было вырашана выпрацаваць адзіны плян дзеяньняў.

Пытаньне аб падтрымцы адзінага кандыдата паглыбіла ўнутраныя супярэчнасьці ў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная грамада). А. Кароль, лідэр унутрыпартыйнай фракцыі «За адзінства», заклікаў аднапартыйцаў галасаваць за С. Домаша, у той час як старшыня партыі М. Статкевіч прапанаваў ім вызначацца самастойна. Хаця цэнтральнае кіраўніцтва партыі падтрымала лідэра БСДП (НГ) М. Статкевіча, на 5 пазачарговым партыйным зьезьдзе на баку А. Караля выступілі партыйныя структуры Магілёўскай і Гарадзенскай вобласьці.

Бюро ЦК Партыі камуністаў беларускай пасьлядоўна падтрымлівала У. Ганчарыка. 22 ліпеня ЦК ПКБ афіцыйна зацьвердзіў пастанову лідэра партыі С. Калякіна аб яго падтрымцы.

У ліпені апазыцыйныя сілы ізноў заявілі пра сваё імкненьне завершыць працэс вызначэньня адзінага кандыдата. 4 ліпеня Палітсавет АГП прыгразіў адклікаць сваіх чальцоў з камандаў кандыдатаў «пяцёркі» ў тым выпадку, калі працэдура вылучэньня адзінага кандыдата ня будзе вызначана імі да 15 ліпеня. Калі кандыдаты ня здолеюць самастойна вылучыць з свайго складу «найгаднейшага», АГП прапанавала сфармаваць калегію выбарцаў з сотні аўтарытэтных партыйных ды грамадзкіх дзеячаў і абраць адзінага мэтадам галасаваньня. У выпадку нязгоды дэмакратычных кандыдатаў прыняць такія ўмовы вылучэньня «адзінага» АГП абяцала адмовіць у падтрымцы ўсёй пяцёрцы і падтрымаць іншага кандыдата.

Ня менш жорсткую пазыцыю заняў аргкамітэт Кангрэсу дэмакратычных сілаў. 10 ліпеня ён пастанавіў, што калі кандыдаты ня вызначацца з «адзіным» да 15 ліпеня, то ён зробіць гэта самастойна.

## Перадвыбарная кааліцыя дэмакратычных кандыдатаў

Пры канцы 2000 г. да тройкі «С. Домаш, М. Чыгір і У. Ганчарык» далучыўся П. Казлоўскі. 25 красавіка аформілася «пяцёрка»: пра дамоўленасьць аб каардынацыі дзеяньняў дзеля перамогі на выбарах заявілі У. Ганчарык, С. Домаш, М. Чыгір, П. Казлоўскі і С. Калякін. Пры гэтым разглядалася магчымасьць далучэньня да «пяцёркі» Людмілы Карпенкі — удавы бы-

лога старшыні Нацыянальнага выканаўчага камітэта Г. Карпенкі, а Палітсавет АГП таксама абмяркоўваў вылучэньне кандыдатуры аднаго з сваіх кіраўнікоў — Аляксандра Дабравольскага. Жаданьне далучыцца да яе выказвалі В. Цярэшчанка і А. Ярашук.

На першай сумеснай прэсавай канфэрэнцыі 3 траўня кандыдаты «пяцёркі» абвясьцілі, што будуць узаемадзейнічаць пры падрыхтоўцы й правядзеньні выбараў. Да абраньня адзінага кандыдаты «пяцёркі» працавалі адзіным фронтам. 12 чэрвеня яны зьвярнуліся з адкрытым лістом да старшыняў абласных, гарадзкіх і раённых выканкамаў, кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацыяў, у якім заклікалі іх забясьпечыць строгае выкананьне заканадаўства пры фармаваньні выбарчых камісіяў і ў працэсе галасаваньня і падліку галасоў.

Канчатковая пастанова пра выбар адзінага канкурэнта А. Лукашэнку неаднаразова пераносілася. 27 чэрвеня на закрытым паседжаньні «пяцёрка» пастанавіла вызначыцца з «адзіным» самастойна да 15 ліпеня. Аднак і 15 ліпеня рашэньне не было прынята.

Жадаючы вызначыцца з «адзіным» самастойна і пры гэтым захаваць адзінства, кандыдаты зьвярнуліся да канфідэнцыйнага мэмарандуму, падрыхтаванага 8 ліпеня *International Republican Institute*. У мэмарандуме былі прадстаўлены рэйтынгі кожнага кандыдата сярод ягонага электарату, а таксама выбарцаў, схільных галасаваць за іншых кандыдатаў.

| Электарат | Розніца дадатнага і адмоўнага рэйтынгаў кандыдата (%) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | Калякін | Казлоўскі | Ганчарык | Чыгір | Домаш |
| Лукашэнкі | -19 | -16 | -18 | -38 | -20 |
| Чыгіра | -15 | -8 | 14 | — | 17 |
| Домаша | -9 | 11 | 22 | 25 | |
| Ганчарыка | -7 | 7 | | 32 | 29 |
| Казлоўскага | -43 | | -21 | -6 | -22 |
| Калякіна | — | 0 | 8 | -38 | -32 |
| Іншых | -15 | -14 | -6 | -12 | -3 |
| Нявызначаных | -5 | -4 | 3 | -13 | 1 |
| Усіх кандыдатаў | -113 | -28 | 2 | -49 | -30 |
| «Пяцёркі» | -74 | 6 | 23 | 13 | 8 |

Крыніца: International Republican Institute.

З табліцы відаць, што беларускія выбарцы аказаліся даволі пасьлядоўнымі ў сваіх сымпатыях: тыя, хто аддаваў перавагу А. Лукашэнку, цьвёрда адмаўлялі ў падтрымцы «пяцёрцы». Прыхільнікі кандыдатаў правай часткі палітычнага спэктру (С. Домаш, М. Чыгір) не сымпатызавалі левым (П. Казлоўскі і С. Калякін), і наадварот. Пры гэтым найменшы адмоўны рэйтынг меў У. Ганчарык. Ягоная фігура аказалася здольнай перацягнуць галасы прыхільнікаў іншых кандыдатаў і галасы тых, хто ня вызначыўся. Гэта і абумовіла выбар Ганчарыка на сходзе «пяцёркі» 21 ліпеня. Між тым, мэмарандум абыйшоў увагай такія пазыцыі, як мабілізацыйны патэнцыял штабоў розных кандыдатаў і гатоўнасьць чальцоў штабоў розных камандаў працаваць на іншых кандыдатаў «пяцёркі». Іншымі словамі, пастанова пра выбар Ганчарыка была прынятая без уліку мабілізацыйнага патэнцыялу яго каманды.

25 ліпеня чальцы «пяцёркі» пацьвердзілі гатоўнасьць працаваць на перамогу У. Ганчарыка. С. Калякін і П. Казлоўскі заявілі, што ня будуць дамагацца перагляду пастановы, прыня-

тай імі 21 ліпеня. Пры гэтым П. Казлоўскі заклікаў кандыдатаў М. Марыніча і Л. Сініцына падтрымаць на выбарах У. Ганчарыка.

13 жніўня было падпісана пагадненьне паміж прэтэндэнтамі С. Домашам, У. Ганчарыкам і шырокай грамадзянскай кааліцыяй аб прынцыпах пабудовы будучай дэмакратычнай беларускай дзяржавы. У пагадненьні «Аб узаемных забавязаньнях адзінага кандыдата і шырокай грамадзянскай кааліцыі ў пэрыяд і пасьля выбараў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі» было абумоўлена аднаўленьне дэмакратычнай сыстэмы ўлады: пераразьмеркаваньне паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады на карысьць заканадаўчай і судовай уладаў, забесьпячэньне незалежнасьці СМІ, правядзеньне парлямэнцкіх выбараў, а таксама выбараў у мясцовыя Саветы па зьмешанай прапарцыянальна-мажарытарнай сыстэме; ажыцьцяўленьне шматвэктарнай вонкавай палітыкі; наданьне значнай ўвагі разьвіцьцю культуры, мовы і вяртаньне нацыянальна-гістарычнай сымболікі. Палітычныя партыі ды грамадзкія арганізацыі, якія падпісалі пагадненьне, узялі на сябе абавязак прыкласьці ўсе намаганьні для абраньня прэзыдэнтам адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў, а пасьля, у выпадку яго перамогі, спрыяць у правядзеньні рэформаў у краіне. Дамову падпісалі У. Ганчарык, С. Домаш, П. Казлоўскі, С. Калякін, М. Марыніч, М. Чыгір, А. Ярашук, а таксама буйныя палітычныя і грамадзкія дзеячы: С. Шушкевіч (Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада), В. Вячорка (БНФ), А. Бухвостаў (Беларуская партыя працы), А. Лябедзька (АГП), В. Лявонаў («За новую Беларусь»), А. Мілінкевіч («Рэгіянальная Беларусь») ды інш.

М. Чыгір, П. Казлоўскі, С. Калякін, М. Марыніч, А. Ярашук і У. Ганчарык запатрабавалі ад С. Домаша, каб той адмовіўся ад падпісаньня пагадненьня і зьняў сваю кандыдатуру на карысьць адзінага кандыдата У. Ганчарыка без усялякіх умоваў. Аднак у выніку перамоваў палітыкі былі вымушаныя пагадзіцца з патрабаваньнямі С. Домаша і лідэраў шэрагу апазыцыйных партыяў і падпісаць праект пагадненьня, узгоднены 11 жніўня. 17 жніўня Міністэрства юстыцыі, спасылаючыся на артыкулы Канстытуцыі 1996 г., дзе акрэсьліваюцца выключныя паўнамоцтвы прэзыдэнта, зрабіла заяву аб юрыдычнай нікчэмнасьці пагадненьня паміж кандыдатамі, бо, маўляў, яно ўздымае пытаньне аб зьмене канстытуцыйнага ладу і заклікае да парушэньня Асноўнага Закону краіны. КДБ Беларусі распаўсюдзіў іншую заяву, у якой адзначыў, што фармальна пагадненьне не супярэчыць заканадаўству, але азначае «пачатак прапагандысцкага забесьпячэньня прызнаньня несапраўднымі вынікаў выбараў у выпадку перамогі на іх А. Лукашэнкі».

## Рэгістрацыя ў цэнтравыбаркаме

Да 15 чэрвеня Цэнтравыбаркам прымаў сьпісы ўдзельнікаў ініцыятыўных групаў, якія займаліся зборам подпісаў у падтрымку кандыдатаў; да 21 ліпеня ў ЦВК падаваліся подпісы за кандыдатаў; 14 жніўня адбылася рэгістрацыя кандыдатаў.

Дзеля рэгістрацыі прэтэндэнты павінны былі за 3 тыдні набраць і перадаць у Цэнтравыбаркам ня менш за 100 тыс. подпісаў. Эфэктыўнасьць збору подпісаў залежала ад складу ініцыятыўных групаў, бо толькі чальцы ініцыятыўных групаў маглі ім займацца. На стан на 18 гадзін 15 чэрвеня, калі завершыўся тэрмін падачы ў Цэнтральную камісію па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў сьпісаў ініцыятыўных групаў па вылучэньні кандыдатаў у прэзыдэнты, акрэсьліліся 25 кандыдатаў у прэзыдэнты:

*Сяргей Антончык*, лідэр незарэгістраванай арганізацыі «Рабочая самадапамога»;

*Сямён Домаш*, лідэр незарэгістраванага аб’яднаньня «Рэгіянальная Беларусь»;

*Юры Данькоў*, дэпутат Мінскага гарадзкога савета, прадпрымальнік;

*Сяргей Гайдукевіч*, лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі і блёку «Новая Беларусь — Адзінства»;

*Уладзімер Ганчарык*, лідэр Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай;

*Павал Казлоўскі*, былы міністар абароны, старшыня грамадзкай арганізацыі «Міжнародны фонд рэабілітацыі здароўя былых вайскоўцаў»;

*Леанід Калугін*, генэральны дырэктар ЗАТ «Атлянт»;

*Сяргей Калякін*, лідэр Партыі камуністаў беларускай;

*Канстанцін Кананові*ч, інжынэр электроннай тэхнікі, юрыст, часова беспрацоўны;

*Яўген Крыжаноўскі*, галоўны рэжысэр тэатру сатыры й гумару «Хрыстафор»;

*Ніна Лабанава*, бібліятэкар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўнівэрсытэту;

*Уладзімер Лапцэвіч*, пэнсіянэр;

*Валер Леванеўскі*, прадпрымальнік;

*Аляксандар Лукашэнка*, дзейны прэзыдэнт;

*Аляксей Ляшко*, дырэктар таварыства з абмежаванай адказнасьцю «Ліпень»;

*Міхаіл Марыніч*, надзвычайны і паўнамоцны пасол Беларусі ў Латвіі, Эстоніі ды Фінляндыі па сумяшчальніцтве (кіраўніком выбарчага штабу выявіўся Л.Сечка);

*Наталя Машэрава*, дэпутат Палаты прадстаўнікоў;

*Мікалай Мякека*, віцэ-прэзыдэнт міжнароднай асацыяцыі «Абарона правоў чалавека»;

*Зянон Пазьняк*, лідэр КХП БНФ;

*Леанід Сініцын*, былы кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта, былы віцэ-прэм’ер, віцэ-прэзыдэнт грамадзкага аб’яднаньня «Сацыяльныя тэхналёгіі» (прэзыдэнтам гэтага аб’яднаньня аказаўся Аляксандар Фядута);

*Сяргей Скрабец*, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, кіраўнік ЗАТ «Гандлёвы Дом БелБабаеўскае»;

*Валянцін Сямак*, прадпрымальнік, афіцэр запасу КДБ;

*Віктар Цярэшчанка*, дэпутат Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, генэральны дырэктар сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства «Міжнародны інстытут мэнэджмэнту» (МІМ-Беларусь);

*Міхаіл Чыгір*, былы прэм’ер-міністар;

*Аляксандар Ярашук*, старшыня рэспубліканскага камітэту Беларускага прафсаюзу работнікаў аграпрамысловага комплексу.

21 ліпеня завяршыўся прыём тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі подпісаў у падтрымку прэтэндэнтаў на пост прэзыдэнта. Частка прэтэндэнтаў на ўдзел у выбарах у якасьці кандыдатаў выйшла з барацьбы яшчэ раней. 19 чэрвеня ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі ініцыятыўным групам грамадзян па вылучэньні кандыдатамі ў прэзыдэнты А. Ляшка і У. Лапцэвіча. Для А. Ляшка перашкодай стала тое, што ён нарадзіўся ў Расіі (Рэспубліка Комі), а паводле арт. 80 Канстытуцыі, прэзыдэнтам Беларусі можа быць толькі грамадзянін Беларусі па нараджэньні (цікава, што Цэнтравыбаркам без праблемаў зарэгістраваў Яўгена Крыжаноўскага, які нарадзіўся на Ўкраіне ў горадзе Мікалаеў). У выпадку У. Лапцэвіча сьпіс чальцоў ініцыятыўнай групы аказаўся яго асабістай выдумкай. Роўна праз месяц С. Антончык, абвясьціўшы, што сабраў 116 тыс. подпісаў, зьняў сваю кандыдатуру і ўвайшоў у выбарчы

штаб М. Марыніча. Сваё рашэньне С. Антончык патлумачыў імкненьнем паказаць супернікам прыклад добрасумленнага пошуку супольнага кандыдата. 21 ліпеня ў якасьці кандыдата, за якога было здадзена болей за 100 тыс. подпісаў, старшыня ЦВК Л. Ярмошына магла назваць толькі А. Лукашэнку. Усяго ЦВК зарэгістравала 22 ініцыятыўныя групы кандыдатаў у прэзыдэнты. 11 з 17 прэтэндэнтаў заявілі, што набралі 100 тыс. подпісаў. Пры гэтым подпісы ў ЦВК прадставілі 16 кандыдатаў.

Аспрэчыць падлік подпісаў зьбіраліся М. Чыгір, В. Цярэшчанка, З. Пазьняк (чальцы ініцыятыўнай групы З. Пазьняка згубілі частку подпісаў з-за таго, што рэгістравалі подпісы ў раёнах, дзе яны былі сабраныя, а не па месцы жыхарства іх уладальнікаў).

| Кандыдат | Колькасьць чальцоў ініцыятыўных групаў | Папярэдняя колькасьць, тыс. подпісаў (апоўдні 21.06.2001) | Здадзена паводле звестак штабоў, тыс. подпісаў | Афіцыйная колькасьць подпісаў* | Колькасьць подпісаў, прызнаная сапраўднымі |
|---|---|---|---|---|---|
| Ю. Данькоў | 244 | 1,5 | 130 | 80 940 | 62 039 |
| Л. Калугін | 120 | 77 | няма звестак | 95 699 | 91 545 |
| С. Калякін | 2 076 | 31 | 100,46–101 | 96 957 | 93 562 |
| П. Казлоўскі | 1 609 | 42 | 108 | 80 683 | 79 351 |
| К. Капановіч | 142 | 0,345 | няма звестак | 786 | 741 |
| М. Марыніч | 808 | 33 | 120 | 96 295 | 91 021 |
| З. Пазьняк | 1 429 | каля 30 | 104,6 | 75 818 | 70 915 |
| Л. Сініцын | 1 973 | 59 | 110 | 86 034 | 80 540 |
| С. Скрабец | 170 | 0,22 | няма звестак | 13 618 | 12 324 |
| В. Цярэшчанка | 6 069 | 16,5 | не менш за 100 | 68 307 | 68 879 |
| М. Чыгір | 1 485 | 19 | 100–150 | 87 308 | 85 523 |
| А. Ярашук | 1 209 | 20 | менш за 100 | 76 312 | 68 159 |

Крыніца: Беларуская інфармацыйная агенцыя «Белапан».

Зарэгістраваныя кандыдаты ў прэзыдэнты

| Кандыдат | Колькасьць чальцоў ініцыятыўных групаў | Папярэдняя колькасьць, тыс. подпісаў (апоўдні 21.06.2001) | Афіцыйная колькасьць подпісаў* | Колькасьць подпісаў, прызнаная сапраўднымі |
|---|---|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 3 830 | 220 | няма звестак | 296 375 |
| С. Домаш | 3 753 | 85 | 165,45 | 161 471 |
| У. Ганчарык | 4 054 | 66 | 123 124 | 123 380 |
| С. Гайдукевіч | 2 136 | 96 | 175 832 | 136 259 |

Крыніца: Беларуская інфармацыйная агенцыя «Белапан».

* Гл. Сообщение Центральной комиссии Республики Беларусь по выборам и проведению республиканских референдумов [Электронная вэрсія]. Дакумэнт дасяжны па адрасе http://www.rec.gov.by/index.php?doc_id=52.

8 жніўня Цэнтравыбаркам разгледзеў скаргі М. Марыніча і Л. Сініцына і адмовіў ім у прэтэнзіі на ўдзел у працягу выбарчай кампаніі. 25 ліпеня Сініцын падаў у ЦВК яшчэ 25 000 подпісаў, якія папрасіў далучыць да ўжо здадзеных. ЦВК адмовілася прыняць подпісы, па-дадзеныя пасьля ўстаноўленага тэрміну 20 ліпеня. 7 жніўня Л. Сініцын накіраваў у ЦВК другую заяву з копіямі расьпісак, завераных намесьнікамі старшыняў мясцовых выканкамаў аб прыёме падпісных лістоў па вылучэньні Л. Сініцына, якія, нібыта, не былі ўлічаныя ў выніковых пратаколах па Магілёўскай вобласьці. ЦВК устанавіла, што згаданыя ў заяве асобы не працуюць у пазначаных выканкамах і накіравала прынятыя дакумэнты ў пракуратуру. М. Марыніч падаў заяву з просьбай далучыць да раней сабраных у яго падтрымку падпісных лістоў яшчэ 4,5 тысяч подпісаў, сабраных у Менску і ня ўлічаных у выніковых пратаколах выбарчых камісіяў. Праверка ўстанавіла, што ў ягоным выпадку мела месца «тэхнічная памылка», калі за адну партыю здадзеных падпісных аркушоў выдаваліся дзьве расьпіскі. Сам М. Марыніч назваў расьсьледаваньне, праведзенае пракуратурай, неаб'ектыўным.

## Дзеяньні А. Лукашэнкі

Разам з адміністрацыйным рэсурсам Лукашэнкам актыўна выкарыстоўвалася і прапаганда. У дзяржаўных СМІ быў шырока разрэклямаваны факт, што ў ліпені стараньнямі Лукашэнкі былі атрыманыя $5 млн. ад нафтавай кампаніі «Слаўнафта» на ўборачную кампанію, а таксама быў арганізаваны за кошт бюджэту «Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі» адпачынак 700 дзяцей з радыяцыйна забруджаных тэрыторыяў у найлепшых лячэльнях Беларусі ды Расіі.

Ня грэбаваў А. Лукашэнка і асабістай дыскрэдытацыяй канкурэнтаў. 6 красавіка 2001 г., падчас сустрэчы з прадстаўнікамі «вэртыкалі» А. Лукашэнка заявіў, што дэпутат Дзяржаўнае Думы Расіі Яўген Прымакоў перадаў яму інфармацыю аб тым, што беларуская апазыцыя атрымала з Захаду на перадвыбарную кампанію фантастычную суму — 500 млн. даляраў.

## «Трэцяя сіла» на прэзыдэнцкіх выбарах

Акрамя А. Лукашэнкі і прадстаўнікоў шырокай грамадзянскай кааліцыі ў выбарах удзельнічалі прэтэндэнты на прэзыдэнцкую пасаду зь менш вызначанай палітычнай пазыцыяй, гэтак званая «трэцяя сіла». Найчасьцей за ёй прынята бачыць уплыў Расіі ці расійскіх фінансава-прамысловых ці фінансава-палітычных групаў. Кандыдатамі ад «трэцяй сілы» ў беларускіх СМІ зазвычай называлі Леаніда Сініцына, Наталю Машэраву і Сяргея Гайдукевіча.

Асабліва цікавая роля лідэра ЛДП С. Гайдукевіча, які надзвычай лёгка прайшоў рэгістрацыю ў Цэнтравыбаркаме, у выбарчай кампаніі. Зь яе пачаткам С. Гайдукевіч пачаў супрацьстаўляць сябе як уладзе, так і аб'яднанай апазыцыі. 24 лістапада 2000 г. ЛДП С. Гайдукевіча абвясьціла пра стварэньне левацэнтрысцкага передвыбарнага блёку «Новая Беларусь — Адзінства» (НБА), які меўся распачаць падрыхтоўку Кангрэсу народаў Беларусі. Два ранейшыя кангрэсы ладзіліся Народным рухам Беларусі — марыянэткавай праўрадавай ініцыятывай, інсьпіраванай урадам В. Кебіча, якую таксама ўзначальваў С. Гайдукевіч.

На беларускай палітычнай сцэне ЛДП выконвала ролю партыі, якая не бяз посьпеху ад-

цягвала да сябе дэмакратычна настроеных выбарцаў. Улетку 2000 г. ЛДП, не пагадзіўшыся з тактыкай байкоту выбараў у ПП НС, са скандалам выйшла з Кансультацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў. Пасьля парлямэнцкіх выбараў ЛДП ізноў выказала жаданьне ўдзельнічаць у працы Кансультацыйнай рады. Такая пастанова была прынята 26 кастрычніка 2000 г. на пашыраным паседжаньні Вышэйшай рады ЛДП з удзелам прадстаўнікоў ЦК і кіраўнікоў рэгіянальных арганізацыяў партыі. 3 лістапада ЛДП заявіла аб гатоўнасьці ўвайсьці ў КРДС. Далейшае разгортваньне падзеяў паказала, што партыя С. Гайдукевіча была гатовая ўвайсьці ў КРДС толькі затым, каб паралізаваць дзейнасьць гэтай структуры. У заяве, распаўсюджанай 1 чэрвеня 2001 г., кіраўніцтва блёку НБА пацьвердзіла, што для яго ні аб якіх палітычных дамовах зь «пяцёркай» і прадстаўнікамі дэмакратычнай апазыцыі ня можа быць і размовы.

Любы альтэрнатыўны кандыдат, які не ўзгадняе пазыцыі з шырокай грамадзянскай кааліцыяй, размывае пратэстны электарат і такім чынам працуе на ўладу. Апрача гэтага, удзел такога кандыдата ў выбарах можа згладзіць у вачах выбарцаў канфлікт паміж апазыцыяй і прэзыдэнтам і такім чынам заблякаваць уздым палітычнай актыўнасьці патэнцыйных прыхільнікаў дэмсілаў. Вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у ЦВК дакладна вызначылі, што такой роляй рэжым надзяліў С. Гайдукевіча. Пікам яго выбарчай кампаніі сталі брутальныя заявы ў дзяржаўных СМІ, накіраваныя на дыскрэдытацыю дэмакратычнага кандыдата У. Ганчарыка.

### Высновы

Выбарчы маратон 2001 г. паказаў, што найбуйнейшыя беларускія палітыкі, за выняткам апартуніста С. Гайдукевіча і камуніста С. Калякіна, ня маюць партыйнай прыналежнасьці. Галоўнай сілай, якая кінула выклік рэжыму А. Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах, аказалася шырокая грамадзянская кааліцыя. Пры гэтым яе праграмны саюз з часткай намэнклятуры не прынёс пазытыўных палітычных вынікаў.

Вялікім пралікам шырокай грамадзянскай кааліцыі стала тое, што цэнтар яе увагі ад прамоцыі свайго кандыдата ў рэальным беларускім грамадзтве перамясьціўся ў сфэру ягоных дзеяньняў у выпадку прыходу да ўлады.

## ПРАЦЭС ПАБУДОВЫ ВЫБАРЧАЙ КААЛІЦЫІ ПАМІЖ ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ КАНДЫДАТАМІ

Перадвыбарная кааліцыя дэмакратычнай апазыцыі была створана грамадзка-палітычнымі сіламі самых розных арганізацыйных формаў. Зь пяцёркі апазыцыйных кандыдатаў, што пагадзіліся ўзгадняць свае дзеяньні ў выбарчай кампаніі (У. Ганчарык, С. Домаш, С. Калякін, П. Казлоўскі і М. Чыгір), толькі С. Калякін быў партыйцам, але й ён выйшаў на прэзыдэнцкія выбары хутчэй не як камуніст, а як прадстаўнік дэмакратычнай апазыцыі. Хаця партыі актыўна ўдзельнічалі ў перадвыбарнай кампаніі, ініцыятыву па вылучэньні й прамоцыі кандыдата ад шырокай грамадзянскай кааліцыі ў іх перахапілі грамадзка-палітычныя рухі.

## Апазыцыйныя перадвыбарныя згуртаваньні

Першай аб намеры стварыць перадвыбарную кааліцыю заявіла Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў (КРДС). На IV Кангрэсе дэмакратычных сілаў 2 ліпеня 2000 г. КРДС абвясьціла сябе адзіным цэнтрам падрыхтоўкі дэмсілаў да выбараў. Між тым, Рада не змагла згуртаваць усіх некантраляваных рэжымам палітычных сілаў. Па-за КРДС апынуліся Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) М. Статкевіча, Партыя камуністаў беларуская С. Калякіна і рух «Яблык» В. Абрамавай. Зь імі пры пасярэдніцтве Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ аб’яднаная апазыцыя стала каардынаваць свае дзеяньні ў рамках Кансультацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў (КРАПП).

У кастрычніку 2000 г. на прапанову дэпутата ВС 13 скліканьня Генадзя Ўсюкевіча 11 вядомых палітычных дзеячоў утварылі аргкамітэт па стварэньні Грамадзкага камітэту «Выбар-2001» для вылучэньня адзінага кандыдата на пасаду прэзыдэнта ад дэмсілаў. Апроч Г. Усюкевіча ў аргкамітэт увайшлі дэпутаты ВС В. Шлындзікаў, В. Шчукін, У. Нісьцюк, а таксама аўтарытэтныя дзеячы беларускай апазыцыі Гары Паганяйла, Тацяна Ваніна, Генадзь Грушавы, Язэп Сярэдзіч ды інш. Акрамя вылучэньня кандыдата ў прэзыдэнты, камітэт паставіў сабе мэту згладзіць супярэчнасьці паміж апазыцыйнымі партыямі. «Выбар-2001» праіснаваў паралельна з КРДС да 13 ліпеня, калі ўвайшоў у рух В. Лявонава «За новую Беларусь».

21 траўня 2001 г., аўтаномна ад КРДС, «Выбару-2001» і КРАПП, на базе руху «Зямля і воля» і пры ўдзеле былога старшыні Сялянскай партыі Яўгена Лугіна быў утвораны яшчэ адзін грамадзка-палітычны рух для вылучэньня адзінага кандыдата ад дэмсілаў на пасаду прэзыдэнта. У хуткім часе пасьля стварэньня ён атрымаў назву «За новую Беларусь». На ўстаноўчым сходзе руху прысутнічалі пяць кандыдатаў у прэзыдэнты: У. Ганчарык, С. Домаш, С. Калякін, П. Казлоўскі і М. Чыгір. Лідэрам руху стаў былы міністар сельскай гаспадаркі В. Лявонаў — фігура для беларускай апазыцыі паказальная. Маючы імідж намэнклятурніка савецкага ўзору, які ў сярэдзіне 90-х быў прыхільнікам аднаўленьня СССР і выступаў у абарону калгасаў, В. Лявонаў апынуўся ў шэрагу найзаўзятшых апанэнтаў Лукашэнкі. 21 ліпеня аргкамітэт для стварэньня кааліцыйнага руху «За новую Беларусь» ініцыяваў сустрэчу «пяцёркі» ў офісе Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай (ФПБ), дзе адзіным кандыдатам ад шырокай грамадзянскай кааліцыі быў абвешчаны старшыня ФПБ У. Ганчарык. Праз тыдзень пасьля вызначэньня адзінага кандыдата В. Лявонаў узначаліў выбарчую кампанію У. Ганчарыка.

Акрамя дэбюту ў якасьці публічных палітыкаў некалькіх прадстаўнікоў старой намэнклятуры новай зьявай для беларускай палітычнай сцэны 2000–2001 гг. стала кааліцыя рэгіянальных рухаў, ачоленая аб’яднаньнем «Рэгіянальная Беларусь». Аб’яднаньне было ўтворана дзеля кансалідацыі й каардынацыі дзейнасьці грамадзкіх арганізацый, палітычных партыяў і прафсаюзаў і бярэ пачатак з сакавіка 1997 г., калі 25 дэмакратычных арганізацыяў Гарадзенскай вобласьці заклалі каардынацыйны камітэт «Гарадзенская ініцыятыва»*. Наступным крокам

* У 2001 г. каардынацыйны камітэт «Гарадзенская ініцыятыва» лучыў 34 грамадзкія аб’яднаньні, прафсаюзы і рухі, у тым ліку тамтэйшую філію БНФ «Адраджэньне», гарадзкую філію БСДП (НГ), абласныя аддзяленьні Беларускага Гельсынскага камітэту і моладзевай арганізацыі АГП «Грамадзянскі форум».

стала стварэньне аналягічных каардынацыйных структур у іншых абласьцях і буйных гарадох Беларусі (у Магілёве, Гомелі, Віцебску, Берасьці, Маладэчне, Барысаве, Лідзе, Салігорску й Слуцку). 18 траўня 2000 г. яны аб'ядналіся ў «Рэгіянальную Беларусь», ад якой 26 траўня 2001 г. быў вылучаны кандыдат у прэзыдэнты С. Домаш.

Іншую ролю ў падрыхтоўцы да выбараў узяла на сябе Асацыяцыя грамадзкіх аб'яднаньняў «Асамблея». Яна ня вылучыла свайго кандыдата ў прэзыдэнты, але ў рэзалюцыі «Аб правядзеньні грамадзкай мабілізацыйнай кампаніі ў ходзе прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г.», прынятай 2–3 сьнежня 2000 г., заявіла пра намер правесьці мабілізацыйную кампанію і ўлічыць пры яе падрыхтоўцы аналягічны досьвед Славаччыны, Сэрбіі ды Ўкраіны. Пасьля прызначэньня даты выбараў мабілізацыйная кампанія пад заклікам «Выбірай!» стартавала. Удзел у ёй ўзялі каля 200 арганізацыяў. У штаб кампаніі ўвайшлі кааліцыя жаночых арганізацыяў, моладзевая кааліцыя «Пераменаў!», Цэнтар «Супольнасьць», Беларуская асацыяцыя рэсурсавых цэнтраў.

Некаторыя дэпутаты Вярхоўнага Савету 13 скліканьня таксама прэтэндавалі на статус грамадзкай сілы і падчас IV Кангрэсу дэмакратычных сілаў, адбытага 2 ліпеня 2000 г., далучыліся да КРДС. Дзейнасьць дэпутатаў ВС была адрасавана перадусім міжнароднай супольнасьці. Так, 28 ліпеня 2001 г. яны прынялі ўласную заяву «Аб міжнародным назіраньні за прэзыдэнцкімі выбарамі ў Беларусі», у якой адзначылі, што ўлады вядуць мэтанакіраваную працу па падрыхтоўцы масавай фальсыфікацыі вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. Дэпутаты ВС запрасілі АБСЭ, Савет Эўропы, Эўразьвяз, міжпарлямэнцкія міжнародныя арганізацыі ўзяць удзел у назіраньні за прэзыдэнцкімі выбарамі. Між тым, прадстаўнікі парлямэнцкай тройкі (АБСЭ, ПАСЭ і Эўразьвязу) зьбіраліся назіраць за выбарамі ў Беларусі толькі супольна, і іх дзеяньні залежалі ад афіцыйнага запрашэньня беларускіх уладаў.

## Роля КРДС у вылучэньні адзінага кандыдата дэмсілаў

Галоўным клопатам пры вылучэньні адзінага дэмакратычнага кандыдата на пасаду прэзыдэнта Беларусі было тое, ці здолее ён заваяваць сымпатыі ўсяго грамадзтва, а ня толькі нацыяналістычна настроенай інтэлігенцыі.

2 лістапада 2000 г., падвёўшы вынікі выбараў у Палату прадстаўнікоў, КРДС, у складзе якой на той момант знаходзілася 14 партыяў, арганізацыяў і прафсаюзаў, узяла на сябе абавязак вылучыць кандыдата на найбліжэйшыя прэзыдэнцкія выбары ад аб'яднанай апазыцыі й забясьпечыць яму ўсямерную падтрымку. На паседжаньні КРДС 15 сьнежня 2000 г. былі названыя тры прэтэндэнты на ролю адзінага альтэрнатыўнага А. Лукашэнку кандыдата — У. Ганчарык, С. Домаш і М. Чыгір. Пры канцы сьнежня 2000 г. КРДС таксама далучыла да гэтай тройкі кандыдатуру П. Казлоўскага. Далейшае вызначэньне адзінага кандыдата зацягнулася. На паседжаньні КРДС 13 сакавіка 2001 г. яно было перанесена на красавік. 14 траўня на чарговым паседжаньні КРДС пагадзілася з тым, каб кожны з патэнцыйных кандыдатаў зьбіраў подпісы для рэгістрацыі ў Цэнтравыбаркаме самастойна. Апоўначы 21 ліпеня, калі скончыўся тэрмін падачы подпісаў за кандыдатаў, аказалася, што толькі два кандыдаты зь «пяцёркі» маюць шанец быць зарэгістраванымі кандыдатамі на пасаду беларускага прэзыдэнта.

Пасьля вызначэньня адзінага кандыдата ад дэмсілаў КРДС пераарыентавалася на назіраньне за працай выбарчых камісіяў, мабілізацыйную кампанію ды яе інфармацыйную падтрымку.

У піку КРДС 9 ліпеня 2001 г. было абвешчана пра стварэньне левацэнтрысцкай Канфэдэрацыі «За сацыяльныя перамены» (КЗСП), якая аб'яднала прыхільнікаў старшыні БСДП (НГ) М. Статкевіча, лідэра Беларускай партыі працы А. Бухвостава, а таксама некаторых прафэсійных, экалягічных, жаночых ды моладзевых арганізацыяў. КЗСП прэтэндавала на ролю левацэнтрысцкай супрацьвагі КРДС, за якой КЗСП небеспадстаўна прызнавала ролю кааліцыйнага аб'яднаньня правацэнтрысцкіх сілаў. Заснавальнікі КЗСП выказалі надзею на далучэньне да іх іншых левых сілаў — Партыі народнай згоды Сяргея Ермака, БСДГ Станіслава Шушкевіча, а таксама Партыі камуністаў беларускай Сяргея Калякіна. Ролю пасярэдніка паміж сабой і КРДС (як і ўвогуле каардынацыю намаганьняў правацэнтрысцкіх і левацэнтрысцкіх арганізацыяў), а таксама місію па вылучэньні адзінага кандыдата КЗСП прапанавала даручыць Лявонаўскаму руху «За новую Беларусь».

Як і трэба было чакаць, ініцыятыва КЗСП не знайшла падтрымкі з боку КРДС, якая пасьля вылучэньня адзінага кандыдата ад апазыцыі засталася форумам дэмакратычных партыяў, пасярэднікам паміж партыямі і грамадзтвам, аўтарытэтным суб'ектам грамадзкай думкі і каардынацыйным цэнтрам для падрыхтоўкі да выбараў сілаў усяго палітычнага спэктру.

## «Пяцёрка» кандыдатаў як перадвыбарнае згуртаваньне

У. Ганчарык, С. Домаш, М. Чыгір, П. Казлоўскі разам з камуністам С. Калякіным 25 красавіка 2001 г. падпісалі дамову аб каардынацыі дзеяньняў і тым самым утварылі «пяцёрку» прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта. 21 ліпеня, на наступны дзень пасьля завяршэньня збору подпісаў, кандыдаты ад апазыцыі абралі «адзіным» У. Ганчарыка. Выбар У. Ганчарыка шмат у чым быў прадыктаваны ілюзіяй перакупіць намэнклятуру і работнікаў дзяржаўнага апарату, за што меўся ўзяцца каардынатар Ганчарыкавай выбарчай кампаніі В. Лявонаў.

27 ліпеня чатыры ўдзельнікі дэмакратычнае «пяцёркі» заявілі пра стварэньне Прэзыдэнцкай Рады (у якую ўвайшлі М. Чыгір, П. Казлоўскі, С. Калякін і С. Домаш). Запрашэньне да ўдзелу ў Прэзыдэнцкай Радзе атрымалі М. Марыніч і А. Ярашук, якія, як і ўсе сябры «пяцёркі», пагадзіліся аб'яднаць свае штабы ў адзіны «аб'яднаны» штаб У. Ганчарыка. Адначасова пры штабе «адзінага» кандыдата была ўтворана Грамадзкая Рада палітычных партыяў, закліканая выпрацаваць базыснае пагадненьне партыяў з адзіным кандыдатам, якое будзе акрэсьліваць абавязкі, што бярэ на сябе апошні ў выпадку перамогі. Намесьнік старшыні АГП А. Дабравольскі ўзначаліў інфармацыйна-аналітычную службу «аб'яднанага» штабу і стаў намесьнікам В. Лявонава. У штаб таксама ўвайшлі старшыня Беларускай партыі жанчын «Надзея» В. Палевікова, лідэр «Хартыі'97» А. Саньнікаў і былы прэтэндэнт у кандыдаты М. Марыніч. Кіраўніцтва выбарчым штабам было даручана старшыні Беларускай партыі «Надзея» Валянціне Палевіковай, а ўсю выбарчую кампанію «адзінага» ўзначаліў лідэр руху «За новую Беларусь» Васіль Лявонаў.

Абраньне адзінага кандыдата ад шырокай грамадзянскай кааліцыі не ўмацавала адзінства беларускай апазыцыі. Адразу пасьля пастановы аб вылучэньні адзіным кандыдатам У. Ганчарыка выказалі сваё расчараваньне рэгіянальныя штабы С. Домаша. 27 ліпеня чальцы ініцыятыўнай групы С. Домаша па Берасьцейскай вобласьці прынялі заяву, у якой заклікалі яго не здымаць сваю кандыдатуру на карысьць У. Ганчарыка і весьці сваю выбарчую кампанію да канца. Незадаволенасьць рашэньнем «пяцёркі» выказала кіраўніцтва Гарадзенскага га-

радзкога грамадзкага аб'яднаньня вэтэранаў вайны, працы і ўзброеных сілаў. 2 жніўня на паседжаньні Віцебскай каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў зьявіліся цяжкасьці са стварэньнем штабу адзінага кандыдата ў прэзыдэнты: уліцца ў аб'яднаны штаб У. Ганчарыка пагадзіліся тамтэйшыя прыхільнікі С. Калякіна, М. Чыгіра і П. Казлоўскага, але ініцыятыўная група С. Домаша пастанавіла чакаць дырэктываў самога С. Домаша. Прадстаўнікі Магілёўскага абласнога штабу па вылучэньні кандыдатам у прэзыдэнты С. Домаша выставілі ў якасьці ўмовы сумеснай працы на адзінага кандыдата падпісаньне паміж С. Домашам і У. Ганчарыкам спэцыяльнага пагадненьня.

У выніку, У. Ганчарык і С. Домаш былі неаднаразова вымушаныя прымаць адмысловыя заявы аб адзінстве сваёй стратэгіі на выбарах і адсутнасьці паміж імі прынцыповых разыходжаньняў. У сумеснай заяве 3 жніўня яны ў чарговы раз пацьвердзілі непахіснасьць дамоўленасьцяў «пяцёркі» аб вылучэньні адзінага кандыдата.

У адказ на пастанову «пяцёркі» аб вылучэньні адзінага кандыдата як КРДС, так і асобныя палітычныя партыі ды грамадзкія арганізацыі пачалі прымаць заявы аб падтрымцы адзінага кандыдата і сваіх перадвыбарных наказах яму. 26 ліпеня заяву аб падтрымцы У. Ганчарыка як адзінага кандыдата ад шырокай грамадзянскай кааліцыі прыняла КРДС. 27 ліпеня АГП прапанавала прыняць «Пагадненьне аб узаемных забавязаньнях адзінага кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі і шырокай грамадзянскай кааліцыі ў пэрыяд і пасьля выбарчай прэзыдэнцкай кампаніі», у якім У. Ганчарык быў бы прызнаны адзіным кандыдатам, якому было прапанавана ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі супольна з С. Домашам па формуле «будучы прэзыдэнт — будучы прэм'ер-міністар». БНФ «Адраджэньне» таксама вітаў адзінага кандыдата, а ў якасьці ўмоваў свайго ўдзелу ў передвыбарнай кааліцыі дэмакратычных сілаў прапанаваў яму сфармуляваць выразнае стаўленьне да незалежнасьці Беларусі, дэмакратызацыі і рэформаў, пераразьмеркаваньня паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады, а таксама гарантыяў што да беларускай мовы і культуры. БНФ таксама прапанаваў распусьціць Нацыянальны сход, увесьці новы выбарчы кодэкс, прызначыць новы склад Канстытуцыйнага й Вярхоўнага судоў, замацаваць у якасьці дзяржаўнай скасаваную ў 1995 г. сымболіку, а таксама забясьпечыць спрыяльныя ўмовы для дзейнасьці дэмакратычных палітычных партыяў. 28 ліпеня нечарговы Сойм БНФ пацьвердзіў прапанаваную АГП схему, паводле якой прапаноўвалася працаваць С. Домашу і У. Ганчарыку: у выпадку пасьпяховай рэгістрацыі абодва кандыдаты маюць укласьці паміжсобку пагадненьне паводле прынцыпу «будучы прэзыдэнт — будучы прэм'ер-міністар». Акурат пры гэтай умове БНФ «Адраджэньне» пагадзіўся падтрымаць У. Ганчарыка на Кангрэсе дэмсілаў 18 жніўня.

13 жніўня была падпісаная дамова паміж шырокай грамадзянскай кааліцыяй і адзіным кандыдатам у прэзыдэнты ад дэмсілаў У. Ганчарыкам, паводле якой пасьля рэгістрацыі У. Ганчарыка кандыдатам у прэзыдэнты С. Домаш здымае сваю кандыдатуру на яго карысьць і становіцца кіраўніком Палітычнай Рады штабу адзінага кандыдата. У сваю чаргу, У. Ганчарык у выпадку абраньня прэзыдэнтам сфармуе ўрад на чале з С. Домашам. Тандэм «Ганчарык — Домаш» здолеў скансалідаваць вакол сябе значную частку апазыцыйных Лукашэнку сілаў, але супраць яго выказалася БСДП (НГ), кіраўніцтва якой аддавала перавагу У. Ганчарыку, і КХП БНФ. У першыя выходныя жніўня на выязным паседжаньні Сойму ў Варшаве КХП БНФ пастанавіла заклікаць сваіх сяброў ды прыхільнікаў прагаласаваць на прэзыдэнцкіх выбарах супраць усіх кандыдатаў.

## Кангрэс дэмакратычных сілаў

13 ліпеня КРДС пастанавіла правесьці чарговы V Кангрэс дэмакратычных сілаў 4 жніўня 2001 г. Аднак ужо на стадыі падрыхтоўкі роля Кангрэсу як форуму, на якім мае быць зацьверджаны адзіны кандыдат ад апазыцыі, зьвялася да акцыі, пакліканай ухваліць ужо зацьверджаную кандыдатуру. Калі АГП настойвала на правядзеньні Кангрэсу як PR-акцыі для «раскручваньня» ўжо вызначанага кандыдата, але выступала супраць выкарыстаньня Кангрэсу дзеля яго вылучэньня, то «Рэгіянальная Беларусь», наадварот, была зацікаўленая ў выкарыстаньні Кангрэсу дзеля вылучэньня адзінага кандыдата, бо на Кангрэсе яна была прадстаўлена лепш, чымся ў КРДС. Як і іншыя калектыўныя ўдзельнікі грамадзянскай кааліцыі, аргкамітэт па падрыхтоўцы V Кангрэсу дэмакратычных сілаў сфармуляваў уласныя ўмовы падтрымкі адзінага кандыдата: абарона незалежнасьці і сувэрэнітэту Беларусі пры захаваньні «добрых і раўнапраўных адносінаў з усімі блізкімі і далёкімі суседзямі як на Ўсходзе, так і на Захадзе»; правядзеньне канстытуцыйнай рэформы, якая «будзе садзейнічаць стварэньню ў краіне прававога рэжыму, абароне правоў чалавека і выкананьню Беларусяй ейных міжнародных забавязаньняў»; правядзеньне эфэктыўных сацыяльна-эканамічных рэформаў; добрасумленнае расьсьледаваньне «крымінальных злачынстваў супраць вядомых дзеячаў палітычнай апазыцыі: Г. Карпенкі, Ю. Захаранкі, В. Ганчара ды іншых» і інш.

У дзень стварэньня Прэзыдэнцкай Рады Кангрэс дэмакратычных сілаў быў перанесены на 18 жніўня — дату, калі кандыдаты павінны прайсьці рэгістрацыю. Да рэгістрацыі аргкамітэт вырашыў устрымацца ад падтрымкі У. Ганчарыка альбо С. Домаша. Хаця колькасьць подпісаў, пададзеных за дэмакратычных кандыдатаў, была прызнана Цэнтравыбаркамам дастатковай для рэгістрацыі абодвух, аргкамітэт вырашыў застрахавацца на выпадак, калі адзін зь іх ня пройдзе рэгістрацыі. Паколькі пастанова кандыдатаў аб абраньні «адзіным» У. Ганчарыка расчаравала правую апазыцыю, БСДП (НГ) убачыла ў Кангрэсе небясьпеку перагляду выбару кандыдатаў, зробленага 21 ліпеня. 27 ліпеня Выканаўчае бюро БСДП (НГ) заклікала КРДС адмовіцца ад правядзеньня Кангрэсу дэмакратычных сілаў, а замест яго прапанавала правесьці пасьля рэгістрацыі кандыдатаў у прэзыдэнты форум шырокай грамадзянскай кааліцыі ў падтрымку адзінага кандыдата, падрыхтоўку якога даручыць кіраўніцтву руху «За новую Беларусь».

## Моладзевыя арганізацыі

У выбарах 2001 г. шырокую дэмакратычную кааліцыю падтрымлівалі шматлікія моладзевыя арганізацыі. Увосень 2000 г. была ўтворана моладзевая кааліцыя «Пераменаў!», у якую ўвайшлі «Малады фронт», «Маладая грамада», «Моладзь АГП», «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў», «Моладзевы хрысьціянска-сацыяльны саюз», «Моладзевая салідарнасьць», «Беларуская асацыяцыя маладых палітыкаў», «Асацыяцыя маладых прадпрымальнікаў».

18 чэрвеня стартавала мабілізацыйная кампанія пад заклікам «Выбірай!», скіраваная на прыцягненьне насельніцтва да ўдзелу ў выбарах. Штаб мабілізацыйнай кампаніі быў створаны пад эгідай «Асамблеі». У яго ўвайшлі кааліцыя жаночых арганізацыяў, моладзевая кааліцыя «Пераменаў!», Цэнтар «Супольнасьць», Беларуская асацыяцыя рэсурсавых цэнтраў.

Удзел у мабілізацыйнай кампаніі прынялі каля 200 арганізацыяў. Акцыі мабілізацыйнай кампаніі праводзіліся ўва ўсіх рэгіёнах Беларусі ў форме непалітычных мерапрыемстваў (канцэртаў, распаўсюджаньня інфармацыйных матэрыялаў, выпуску бюлетэняў, размоваў зь людзьмі, спартовых мерапрыемстваў, графіці-акцыяў). Агітацыя за канкрэтных кандыдатаў пры гэтым не праводзілася.

На ініцыятыву «Маладога фронту», «Задзіночаньня беларускіх студэнтаў», «Маладой грамады» ды іншых моладзевых аганізацыяў 29 ліпеня адбыўся Кангрэс беларускай моладзі, пакліканы паспрыяць каардынацыі дзейнасьці палітычна актыўнай моладзі напярэдадні выбараў. У Кангрэсе ўдзельнічалі старшыня «Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Анатоль Грыцкевіч і старшыня «Таварыства беларускай мовы» імя Ф. Скарыны А. Трусаў, прысутнічалі прадстаўнікі палітычных партыяў, грамадзкіх арганізацыяў, АБСЭ і амбасады ЗША. Сярод выступоўцаў былі У. Ганчарык, С. Домаш, В. Вячорка, С. Высоцкі, Ю. Хашчавацкі. На Кангрэсе былі прынятыя дзьве рэзалюцыі: «Моладзь супраць рэжыму», дзе было адзначана, што за адзін толькі ліпень 2001 г. рэпрэсіі абрынуліся на 200 чальцоў моладзевых арганізацыяў, і «Моладзь патрабуе пераменаў», прысьвечаная падтрымцы альтэрнатыўнага А. Лукашэнку кандыдата ў прэзыдэнты.

6 жніўня дэмакратычныя моладзевыя арганізацыі Беларусі выступілі з сумеснай заявай супраць рэпрэсіўных дзеяньняў уладаў перад выбарамі. Заяву падпісалі 17 арганізацыяў, у тым ліку «Малады фронт», «Моладзь Аб'яднанай грамадзянскай партыі», «Зубр», «Маладая грамада» «Маладыя сацыял-дэмакраты», «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў» і іншыя. У заяве адзначалася, што ў меру набліжэньня даты прэзыдэнцкіх выбараў рэпрэсіі супраць моладзевых арганізацыяў узмацняюцца.

8 жніўня прадстаўнікі «Маладога фронту», «Маладой грамады», «Моладзі АГП», руху «Зубр» ды іншых арганізацыяў падчас сустрэчы з У. Ганчарыкам перадалі яму зварот «Моладзь за Беларусь», падпісаны 67 моладзевымі арганізацыямі ды іх аддзяленьнямі ў розных рэгіёнах Беларусі. У звароце выказвалася падтрымка У. Ганчарыка як кандыдата ад шырокай грамадзянскай кааліцыі, ад якога чакаюць рэалізацыі наступных патрабаваньняў моладзі:

— гарантаваньня незалежнасьці Беларусі, вяртаньня ёй нацыянальнай сымболікі (герб «Пагоня» і бел-чырвона-белы сьцяг) і прызнаньня беларускай мовы адзінай дзяржаўнай;

— пераразьмеркаваньня паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады на карысьць заканадаўчай і судовай, а таксама паміж прэзыдэнтам і ўрадам на карысьць прэм'ер-міністра;

— неадкладных парлямэнцкіх выбараў па зьмяшанай, прапарцыйна-мажарытарнай сыстэме;

— вырашэньня асноўных праблем моладзі: рэформы сыстэмы адукацыі, скасаваньня прымусовага разьмеркаваньня і абавязковай вайсковай службы, паляпшэньня сацыяльных умоваў і стварэньня магчымасьцяў самарэалізацыі;

— гарантаваньня С. Домашу пасады прэм'ер-міністра.

## Пралукашэнкаўскія грамадзкія і палітычныя арганізацыі ў выбарчай кампаніі

Напярэдадні выбараў у Партыі народнай згоды (ПНЗ) пад кіраўніцтвам С. Ермака акрэсьліўся раскол з-за пытаньня аб падтрымцы кандыдата на пасаду прэзыдэнта. З самага пачатку

свайго існаваньня ў якасьці пралукашэнкаўскай партыі (калі на ініцыятыву Леаніда Сечкі ад БСДП (НГ)* адкалолася частка партыі і ўтварыла ПНЗ), адноўленая ПНЗ аб'ядноўвала работнікаў дзяржаўнага апарату і дырэктараў дзяржпрадпрыемстваў, якія дагэтуль адкрыта не выказваліся супраць палітыкі беларускага прэзыдэнта. Але незадоўга да выбараў частка сяброў ПНЗ выказалася за адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў У. Ганчарыка.

У студзені 2001 г. была ўтворана «Рэспубліканская каардынацыйная рада кіраўнікоў палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў», якая аб'яднала 32 прапрэзыдэнцкія грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі (Камуністычная партыя Беларусі, Беларуская патрыятычная партыя, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці і інш). Мэтамі гэтай кааліцыі былі названыя пабудова грамадзянскай супольнасьці, усталяваньне кантактаў паміж уладай і грамадзтвам, удасканаленьне беларускага заканадаўства. Гэтае ўтварэньне адыгрывала ў беларускай палітыцы ролю кішэннай прапрэзыдэнцкай палітычнай сілы, патрэбнай рэжыму перадусім для яго легітымізацыі ў вачох міжнароднай супольнасьці. 12 чэрвеня 2001 г. Рэспубліканская каардынацыйная рада ўключыла ў сябе яшчэ 4 арганізацыі і з гэтай прычыны пастанавіла стварыць рух у падтрымку А. Лукашэнкі.

### Высновы

Кааліцыя ў падтрымку альтэрнатыўнага А. Лукашэнку кандыдата была ўтвораная ня столькі для прадстаўніцтва тых ці іншых сацыяльных групаў, колькі для правядзеньня канкурэнтнай барацьбы ў сфэры публічнай палітыкі.

## ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ

Выбарчая праграма А. Лукашэнкі зьмяшчала ў сабе ня толькі набор палітычных лёзунгаў, але і комплекс эканамічных акцый. Найважнейшай зь іх было давядзеньне сярэдняй зарплаты беларуса да 100$ у месяц. Апанэнты беларускага рэжыму паставіліся да гэтага абяцаньня скептычна. Выказвалася думка, што шматлікія крызысныя зьявы і тэндэнцыі (гл. Табліцу 1) у беларускай камандна-адміністрацыйнай эканоміцы не дадуць спраўдзіць гэтае абяцаньне.

І сапраўды, у беларускай эканоміцы на пачатку 2001 году назіраліся такія небясьпечныя сымптомы, як зьмяншэньне капітальных укладаньняў, істотнае запаволеньне жытловага будаўніцтва, павелічэньне колькасьці беспрацоўных, якое сьведчыла аб спадзе дзелавой актыўнасьці, усплёск інфляцыі і беспрэцэдэнтнае падзеньне беларускага імпарту.

Апрача гэтага, у першым квартале 2001 году па афіцыйных зьвестках прырост унутранага валавога прадукту (УВП) склаў 1%, а па ацэнках шэрагу незалежных экспэртаў — зьнізіўся на 3%. За студзень-люты УВП павялічыўся на 0,6% (летась за той самы пэрыяд — на 7%; пры гэтым, паводле афіцыйных рэляцый, у 2000 г. адбыўся прырост аб'ёму УВП на 6% і рост УВП на 3%), рост прамысловай вытворчасьці склаў усяго 1,8%. Вытворчасьць спажывецкіх тавараў зьменшылася на 2,5%, у тым ліку прадуктаў харчаваньня — на 5,3%.

* БСДП (НГ) была ўтворана на аб'яднаўчым зьезьдзе ПНЗ і БСДГ у чэрвені 1996 г.

Табліца 1. Некаторыя сацыяльна-эканамічныя паказьнікі Рэспублікі Беларусі за студзень-травень 2001 году

| | Студзень-травень 2001 г. | У % да студзеня-траўня 2000 г. | Травень 2001 г. у % да | |
|---|---|---|---|---|
| | | | траўня 2000 г. | красавіка 2001 г. |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал, млрд.руб. | 804,1 | 97,7 | 110,2 | 114,3 |
| Увод у дзеяньне жылых дамоў, тыс.кв.м агульнай плошчы | 910 | 79,4 | 79,2 | 152,6 |
| у тым ліку ў сельскай мясцовасьці | 300 | 74,0 | 78,6 | 153,3 |
| Грузаабарачэньне прадпрыемстваў транспарту агульнага карыстаньня*, млн. ткм | 13 868,0 | 98,9 | 99,4 | 102,5 |
| Колькасьць беспрацоўных, афіцыйна зарэгістраваных у органах дзяржаўнай службы занятасьці (на канец справаздачнага пэрыяду), тыс. чалавек | 100,7 | 107,4 | 107,4 | 98,1 |
| у % да эканамічна актыўнага насельніцтва | 2,3 | | | |
| Індэкс спажывецкіх цэнаў | | 119,9** | 171,6 | 102,6 |
| Індэкс цэнаў вытворцаў прамысловай прадукцыі | | 115,5** | 135,2 | 100,8 |

* Без унутранага воднага транспарту.

** Канец пэрыяду да сьнежня 2000 г.

| | Студзень-красавік 2001 г. | У % да студзеня-красавіка 2000 г. | Красавік 2001 г. у % да | |
|---|---|---|---|---|
| | | | красавіка 2000 г. | сакавіка 2001 г. |
| Зьнешнегандлёвы абарот*, млн. дал. ЗША | 4666,7 | 93,2 | 86,7 | 92,5 |
| экспарт тавараў | 2375,1 | 103,7 | 96,2 | 95,7 |
| імпарт тавараў | 2291,6 | 84,4 | 78,4 | 89,4 |
| сальда | 83,5 | | | |
| Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва | | 123 | 123 | 101 |
| Рэальная налічаная сярэднямесячная заработная плата аднаго работніка | | 122,7 | 123,9 | 100,5 |

Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусі.

* Без уліку паслугаў.

Адпаведна, у пэрыяд са студзеня да красавіка 2001 году рост цэнаў у Беларусі склаў 16,8%. Адбылося зьмяншэньне памеру статутных фондаў банкаў на 6,4%. Унутраная дзяржаўная пазыка толькі за першы квартал павялічылася на 17,2% (прыкладна на 365 млн.

даляраў), без уліку крэдытаў пад гарантыі ўраду.

Нягледзячы на ўсе афіцыйныя дэклярацыі, што Беларусі ўдалося выйсьці на ўзровень «дакрызыснага» 1990 году, у 2001 годзе вытворчасьць прамысловых тавараў склала адно 88% ад узроўню 1990 г., а ў 2000 г. беларуская прамысловасьць упершыню ня выканала пляну па выпуску спажывецкіх тавараў. Толькі за 2000 год імпарт тавараў лёгкай прамысловасьці вырас на 16,7%, аб'ём экспартаваных у краіну прадуктаў харчаваньня ўзрос на 34%, больш за 70% харчаваньня і сыравіны на беларускім рынку былі імпартныя.

Лявінападобна расла колькасьць стратных прадпрыемстваў. У лёгкай прамысловасьці доля стратных прадпрыемстваў дасягала 33% (усе дадзеныя за 2000 г.), у харчовай — 15%, у цэлым па прамысловасьці — 21%. Больш за палавіну з 2543 беларускіх калгасаў і саўгасаў былі стратныя, штомесяц на датацыі для аграпрамысловага комплексу выдаткоўвалася каля 20 млрд.BLR.

На фоне падзеньня асноўных эканамічных паказьнікаў дэфіцыт у гандлі з Расіяй дасяг рэкорднай адзнакі — 1 млрд. 700 млн. даляраў ЗША.

Лукашэнка даў абяцаньне давесьці сярэднюю заработную плату да 100$ яшчэ пры канцы 2000 году. І ўжо тады гучалі галасы экпэртаў, што для гэтага давядзецца штомесяц дадаткова прыцягваць у бюджэт 200 млн. даляраў ЗША. Цікава, што і сам Лукашэнка, і афіцыйная прапаганда падавала давядзеньне сярэдняй заработнай платы да 100$ як беспрэцэдэнтную для незалежнай Беларусі акцыю. Але, як паказвае графік, гэта было ня што іншае, як вяртаньне да стану 1997 году.

У цэлым беларускім уладам удалося выканаць гэтае асноўнае эканамічнае перадвыбарнае абяцаньне*. У жніўні 2001 году, паводле афіцыйнай статыстыкі, сярэдняя заработная плата ў Менску склала 120$, а ў цэлым па краіне каля 95$. На фоне іншых ўсходнеэўрапейскіх грамадзтваў з высокай доляй праваслаўнага насельніцтва гэты вынік выглядае досыць няблага. Сярэдні румын атрымліваў у месяц 75$, сярэдні ўкраінец — 60$. У Расіі заробак настаўніка з вышэйшай адукацыяй і стажам працы 20 гадоў і больш увесну 2001 году складаў 875 расійскіх рублёў (прыкладна 30$), а заробак настаўніка-пачаткоўца — 500 расійскіх рублёў (каля 15$). І гэта пры тым, што сярэдняя зарплата прамысловага работніка сягала 3800 расійскіх рублёў (блізка 130$).

Але ня столькі эканамічныя дасягненьні забясьпечылі Лукашэнку пераабраньне на другі тэрмін, колькі прадуманая да дробязяў стратэгіі выбарчай барацьбы. Пры гэтым асноўную ролю ў распрацоўцы лукашэнкаўскай выбарчай кампаніі адыгрывала Рада бясьпекі і яе кіраўніцтва.

Тактычна лукашэнкаўцы зрабілі ўсё, каб дэзарыентаваць апазыцыйныя ім сілы ў рэальных палітычных канстэляцыях, ня даць ім перахапіць палітычную ініцыятыву і тым самым дасягчы сваёй стратэгічнай мэты — перамогі Лукашэнкі зь ня меншым узроўнем народнай падтрымкі, чымся падчас агульнанацыянальных рэфэрэндумаў 1995 і 1996 гг.

---

* Ува ўмовах «закрытага грамадзтва» цяжка адзназначна вызначыць, адкуль беларускі рэжым сіляў эканамічныя рэсурсы для выкананьня гэтага заданьня. Але відавочна, што давядзеньне сярэдняй зарплаты да ўзроўню ў 100$ ператварылася ў адну з мэтаў дзяржаўнай палітыкі, на якую працаваў увесь дзяржаўны апарат. Магчыма, для гэтага былі выкарыстаныя замежныя крэдыты (расійскага і арабскага паходжаньня), пазабюджэтныя фонды, іншыя крыніцы фінансаваньня. Тое, што арабскі сьвет ускосна быў уцягнуты ў беларускую прэзыдэнцкую выбарчую кампанію 2001 г., пацьвярджаецца тым фактам, што на канец жніўня быў заплянаваны, але так і не адбыўся, візыт у Беларусь лібійскага лідэра Муамара Кадафі (для Кадафі гэта было б першае наведаньне Эўропы пасьля 1978 г.).

Дынаміка заработнай платы працоўных і службоўцаў у Рэспубліцы Беларусі ў 1997–2001 гг. (у USD).




Крыніца: IntelConsult Group.

Пералічым асноўныя стратэгіі вядзеньня перадвыбарнай барацьбы лукашэнкаўцамі:

1. Атамізацыя і перакупліваньне незалежніцкага/пратэстнага электарату. Стварэньне псэўдаапазыцыйных сілаў з мэтай надзейна кантраляваць незалежніцкі/пратэстны электарат. Раскол і маргіналізацыя дэмакратычных сілаў, іх дыскрэдытацыя ў вачах грамадзтва пры дапамозе псэўдаапазыцыйных утварэньняў накшталт ЛДП*.

* За 10 дзён да выбараў усе менскія дзяржаўныя СМІ апублікавалі на першых палосах «Заяву кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі Сяргея Гайдукевіча». Гэты тэкст дае ўяўленьне пра тыповыя прыёмы лукашэнкаўскага PR падчас выбараў, таму ёсьць сэнс працытаваць яго цалкам: «29 жніўня 2001 году грамадзяне Беларусі мелі магчымасьць назіраць па сваіх тэлевізійных экранах так званага адзінага кандыдата ад апазыцыі, а па сутнасьці стаўленіка партнамэнклятуры Ўладзімера Ганчарыка. Тое, што заявіў у сваім выступленьні «асноўны апазыцыянэр», можна расцэньваць як паказчык поўнага правалу перадвыбарнай кампаніі У. Ганчарыка.

Як і трэба было чакаць, асноўны акцэнт у сваім звароце камуніст Ганчарык зрабіў на сувязі з Расіяй. І нават зьвярнуўся па падтрымку да Прэзыдэнта Расійскай Фэдэрацыі У. Пуціна. Паважаны Ўладзімер Іванавіч, а ці ня лічыце Вы, што прапануеце Расійскай Фэдэрацыі ўмяшацца ўва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусі? Спадар Ганчарык, але ж зусім нядаўна Вашы адданыя прыхільнікі палілі на плошчы расійскі сьцяг.

Вы, Уладзімер Іванавіч, зьвярнуліся да прадстаўнікоў уладнай «вэртыкалі», створанай Аляксандрам Лукашэнкам, з прапановай перайсьці на Ваш бок. Але ж усе памятаюць Вашы абяцаньні паддаць лукашэнкаўскіх чыноўнікаў люстрацыі. Што з Вамі здарылася? Растлумачу: гэта ня што іншае, як палітычная прастытуцыя.

У сваім выступленьні, Уладзімер Іванавіч, Вы ўспомнілі ўсіх: і прадстаўнікоў сілавых ведамстваў, і чыноўнікаў, і нават Аляксандра Лукашэнку. У парыве адчаю Вы зьвярнуліся па дапамогу да ўсіх, але толькі не да простых грамадзян Беларусі. Яны Вам не патрэбныя!

Ваша выступленьне мы ацэньваем як поўнае бясьсільле весьці далейшую барацьбу за ўладу. Вы — банкрут! Вы не прадстаўляеце ніякай адзінай апазыцыі. Няма ніякага адзінага кандыдата. Ёсьць партнамэнклятурнік Уладзімер Ганчарык. Вось з гэтым мы Вас і віншуем!

Калі ў Вас, Уладзімер Іванавіч, ёсьць сумленьне, Вы павінны папрасіць прабачэньня перад беларускім народам за ўсю хлусьню, якую Вы на працягу апошняга часу выказвалі. Вы павінны прапрасіць прабачэньня ў С. Домаша і ўсіх, хто Вам паверыў і падтрымліваў, якіх Вы так нахабна і цынічна ашукалі і самае ганебнае — працягваеце ашукваць» (Звязда, 31.09.2001).

2. Дасягненьне нэўтральнасьці або пасіўнай падтрымкі старых і новых эканамічных элітаў, якія валодаюць вялікімі матэрыяльнымі рэсурсамі.

3. Інфармацыйнае завышэньне самадэструкцыйнага патэнцыялу беларускага рэжыму, навязваньне найвышэйшаму беларускаму кіраўніцтву заніжанага інтэлектуальнага іміджу ў недзяржаўных СМІ, з аднаго боку, і адначасна шырокамаштабная прапаганда эканамічных, сацыяльных, вайсковых і інш. дасягненьняў у дзяржаўных СМІ, з другога боку. Навязваньне Лукашэнку іміджу «лідэра, які кансалідуе ўсю нацыю», у расійскіх электронных СМІ.

Кампанія лукашэнкаўцаў па перацягваньні на свой бок «нявызначанага электарату» пачалася з заявы аб удзеле ў выбарчай кампаніі Наталі Машэравай, кандыдаткі-фантому, цалкам ляяльнай Лукашэнку. Дзякуючы незабыўнаму для масавай сьвядомасьці вобразу свайго бацькі (былога першага сакратара ЦК КПБ, які слынуў як «добры гаспадарнік») Машэрава была здольная выклікаць моцную эмацыйную прыхільнасьць беларусаў. Падчас парлямэнцкіх выбараў 2000 году ў ніжнюю палату беларускага парлямэнту Машэрава давяла сваю поўную ляяльнасьць і падкантрольнасьць сваім патронам. Яна балятавалася ў той самай выбарчай акрузе, дзе за дэпутацкі мандат змагаліся экс-прэм’ер Міхаіл Чыгір і экс-начальнік упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта Аляксандар Фядута. У першым туры Машэрава набрала амаль 49% галасоў выбарцаў, фактычна забясьпечыўшы сабе перамогу (Чыгір тады ўзяў 23%, Фядута — менш за 10% ), у другім, пасьля таго, як Чыгір зьняў сваю кандыдатуру, — 85%. Ня выключана, што ўжо тады лукашэнкаўскія паліттэхнолягі апрабоўвалі сцэнары для прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, вывучаючы «запас трываласьці» кандыдатаў ад партыі ўлады. Пры гэтым акруга, дзе балятавалася Машэрава, была настроена досыць дэмакратычна — у 1990 г. ад яе (праўда, тады акругі былі меншыя памерам) прайшоў у ВС 12 скліканьня прадстаўнік БНФ Пётра Садоўскі, а ў менскі гарсавет — сябар сойму БНФ Міраслаў Кобаса (праз 5 гадоў у тым самым раёне на выбарах у ВС 13 скліканьня ён выйшаў у другі тур са старшынёй Беларускай партыі жанчын «Надзея» Валянцінай Палевіковай, але выбары былі прызнаныя «неадбытымі»). У 1989 г. народным дэпутатам СССР ад яе быў абраны Станіслаў Шушкевіч.

Да «раскручваньня» Наталі Машэравай пасьля яе заявы пра прэзыдэнцкія амбіцыі адразу падключыўся былы віцэ-прэм’ер беларускага ўраду і экс-кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Леанід Сініцын, які правакацыйна заяўляў, што, «калі на сёлетніх прэзыдэнцкіх выбарах сваю кандыдатуру вылучыць Н. Машэрава, шанцаў нават у Лукашэнкі будзе мала». Але асабліва энэргічна на прамоцыю Машэравай працавалі расійскія СМІ. Тэлеканал *НТВ*, газэта *«Известия»* (вельмі характэрны падкрэсьлена агрэсіўны падзагаловак тагачаснага інтэрвію *«Известиям»* — *«Наталя Машэрава: мой натуральны стан — стан барацьбы»*) разгарнулі рэкляму яе постаці яшчэ падчас парлямэнцкіх выбараў 2000 году. Важна, што разьлік тады рабіўся і на мабілізацыю ірацыянальных пластоў масавай сьвядомасьці беларускіх грамядзянаў — напрыклад, умела падаграваўся інтарэс да гісторыі з аўтакатастрофай, у якой загінуў Пётра Машэраў, да ягоных кар’ерных пэрспэктываў у імпэрскім цэнтры і г.д. У выніку выходзіў сюжэт з рысамі дэтэктыву і мыльнай опэры — значыцца, акурат тое, што традыцыйна карыстаецца попытам у беларускім грамадзтве. Гэта пацьвярджае алягічны, пазбаўлены ўсякага сэнсу перадвыбарны лёзунг Машэравай, прыдуманы, магчыма, яе патронам Замяталіным: *«Жанчына ніколі не ўступае ў барацьбу, калі не перакананая, што пераможа»*, а таксама навязьлівае супрацьстаўленьне Машэравай (цікава, што сама Машэрава прытрымліваецца крайне русафільскіх і беларусафобскіх поглядаў. Напрыклад, на пачат-

ку сакавіка 2001 году яна ўвайшла ў аргкамітэт «Славянскага зьезду Расійскай Фэдэрацыі, Беларусі і Ўкраіны» разам з такімі афіцыёзнымі дзеячамі, як кажуць у Расіі, «народна-патрыятычнай» арыентацыі, як расійскі скульптар Вячаслаў Клыкаў і былы лідэр шавіністычнай групоўкі *«Память»* Ігар Шафарэвіч. Яшчэ раней яна была абраная «старшынёй Цэнтральнай Рады Саюзнай грамадзкай палаты» — напаўкамуністычнай грамадзкай арганізацыі пры парлямэнцкім сходзе Расіі і Беларусі) і Лукашэнкі, культываванае расійскімі мэдыямі. Адразу пасьля заявы Машэравай пра яе «прэзыдэнцкія» амбіцыі расійскія мэдыі проста «прарвала». Пачалася сапраўдная, прафэсійна сплянаваная кампанія інфармацыйнай падтрымкі кандыдатуры Машэравай. Возьмем досыць вузкі сэгмэнт расійскай інфармацыйнай прасторы — расійскія Інтэрнэт-выданьні. Адной зь першых прамоцыю Машэравай пачала расійская праўрадавая *gazetasng.ru*. Яе аналітык Арнольд Ступін заявіў: *«У А. Лукашэнкі на выбарах зьявіцца супернік. У дзень выступу Лукашэнкі ў Горадні, дзе ён казаў, што «мы прошляпили свою страну», маючы на ўвазе СССР, раптам выявілася, што Лукашэнка можа і сам «прошляпить» Беларусь: Наталя Машэрава са словамі «Жанчына ніколі не ўступае ў барацьбу, калі не перакананая, што пераможа», — заявіла аб сваім цьвёрдым намеры балятавацца ў прэзыдэнты Беларусі. Неабходна адзначыць, што Наталя Машэрава можа за кароткі час стаць досыць харызматычнай постацьцю ў Беларусі».* Але яшчэ за дзень да заявы Машэравай пра вылучэньне расійскі аналітычны сэрвэр *polit.ru* зьмясьціў аб'ёмістую публікацыю пад назвай *«Наталя Машэрава пацьвердзіла свой намер супернічаць з Лукашэнкам на прэзыдэнцкіх выбарах. Лукашэнка пачынае нэрвавацца»* прыкладна з такім самым наборам думак. У той жа дзень рэспэктабэльны маскоўскі *kommersant.ru* публікуе аналіз *«Аляксандар Лукашэнка «прошлепал страну». У Беларусі можа зьявіцца новы прэзыдэнт»*, які сваёй стылістыкай моцна нагадвае папярэднія тэксты, хаця і зьмяшчае некалькі арыгінальных заўвагаў: *«Сваю выбарную кампанію Наталя Машэрава зноў наважылася весьці як кандыдат ад партыі ўлады. Цяпер яе галоўнае апірышча — намесьнік кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Беларусі Ўладзімер Замяталін, шэры кардынал, які захоўвае сваю пасаду на працягу ўсяго кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі».* Завяршала «інфармацыйную карціну» публікацыя Сьвятланы Несьцеравай на старонках найбуйнейшага расійскага Інтэрнэт-выданьня *gazeta.ru* пад назвай *«Прызначаная дата адхіленьня Лукашэнкі ад улады»*, дзе пяяўся той самы хваласьпеў спн. Машэравай: *«Машэрава карыстаецца падтрымкай шэрагу буйных функцыянэраў са структураў расійска-беларускага саюзу. Відавочна, што рашэньне Машэравай ламае ўвесь перадвыбарны расклад».*

Гульня з Машэравай працягвалася. 15 чэрвеня Радыё Свабода агучыла інфармацыю «даверанай асобы» Наталі Машэравай, былога члена АГП Юр'я Марозава пра тое, што найвышэйшае кіраўніцтва Беларусі (акурат гэтак, неканкрэтызавана) нечакана прапанавала Наталі Машэравай пасаду віцэ-прэм'ера, куратара сацыяльных праблемаў — пры ўмове, што яна ня будзе ўдзельнічаць у выбарчай гонцы. Але Машэрава, маўляў, адмовілася ад гэткай прапановы.

Увогуле, бальшыня расійскіх мэдыяў падчас выбарчай гонкі займалася напусканьнем «ружовага туману», імітацыяй апазыцыйнасьці да Лукашэнкі, стварэньнем ілюзіі таго, што Масква не задаволена сваім беларускім саюзьнікам. У сытуацыі, калі амаль усе рэсурсы ўлады знаходзіліся ў распараджэньні Лукашэнкі, гэта спрыяла нэўтралізацыі беларускай апазыцыі і тых палітыкаў, зь якімі яна зьвязвала свае надзеі на перамогу ў прэзыдэнцкіх выбарах, а самому Лукашэнку стварала максымальна камфортныя ўмовы для ягонага па

магчымасьці легітымнага пераабраньня на другі прэзыдэнцкі тэрмін.

Яшчэ пару штрышкоў з палітычнай біяграфіі Наталі Машэравай. 24 траўня 2001 году яна разам зь яшчэ адным вылучэнцам на прэзыдэнта Сяргеем Скрабцом увайшла ў створаную дэпутацкую групу «Адзінства», узначаленую былым намесьнікам генэральнага дырэктара сумеснага беларуска-нямецкага прадпрыемства «Белфарм» Юр’ем Марозавым. У сярэдзіне 90-х яна стварыла «Беларускі саюз імя П. Машэрава «Зьніч», каб паглыбляць беларуска-расійскую інтэграцыю на нефармальным узроўні.

Машэрава, як і Міхаіл Марыніч, ня мела ні перадвыбарнай праграмы, ні яснай праграмы дзеяньняў (у інтэрвію маскоўскай газэце «Коммерсант» 22 чэрвеня Машэрава не змагла нават адказаць на пытаньне пра сваю палітычную канцэпцыю: карэспандэнт пытаецца: «Але ўсё-такі вы будзеце прапаноўваць канцэпцыю, якая адрозьніваецца ад канцэпцыі А. Лукашэнкі?», Машэрава адказвае: «А пра гэтае з вамі пагаворым, калі я буду зарэгістраваная»).

Ад Лукашэнкі яе адрозьнівала перадусім тое, што перадвыбарная кампанія першага была накіравана на шырокія слаі грамадзтва, тым часам як Машэрава ўсяляк спрабавала ўнікнуць прывязкі да канкрэтнай сацыяльнай групы грамадзтва — абы, барані Божа, не перацягнуць на свой бок каго-небудзь з лукашэнкаўскага электарату. Інакш кажучы, Машэрава сьвядома цуралася сацыяльных адрасатаў сваёй актыўнасьці, робячы стаўку на эмацыйную прывабнасьць свайго іміджу «адзінай дачкі загадкава памерлага ўсенароднага кіраўніка» і фактычна разьлічваючы на галасы толькі той меншай паловы беларускага грамадзтва, якая ня вызначылася, за каго галасаваць (каб зрабіць выбар гэтай часткі грамадзтва лягчэйшым, Машэрава нейкі час выкарыстоўвала нават лібэральна-дэмакратычную рыторыку ў духу Сініцына і Марыніча). За Машэравай не стаяла ні палітычная праграма, ні самастойная (г.зн. непралукашэнкаўская) палітычная сіла. Яна была і засталася папулярным таварным знакам на беларускім палітычным рынку, і толькі.

Яшчэ адным кандыдатам, за якім стаяла адно вялікае палітычнае «нішто», кандыдатам-фантомам, вылучэньне якога, паводле пэўных крыніцаў, было інсьпіраванае беларускім рэжымам, быў Міхаіл Марыніч (паказальна, што кіраўніком яго выбарчага штабу паставілі «тэрмінатара» калішняй БСДП (НГ) Леаніду Сечку, які раскалоў партыю і ўтварыў прапрэзыдэнцкую ПНЗ). Як і Машэрава, Марыніч прэзэнтаваў не арыгінальную палітычную праграму, а хутчэй сьветапоглядную опцыю — гэткі празаходне настроены гаспадарнік-лібэрал, неляяльны Лукашэнку, заклапочаны станам з правамі чалавека ў Беларусі. Імідж Марыніча-заходніка ўмацоўваўся дзяржаўнымі і недзяржаўнымі СМІ яшчэ ў першай палове гэтага году. У інтэрвію «Советской Белоруссии» (1 сакавіка 2001 г.) Марыніч палка заклікаў «выпрацаваць адзіную пазыцыю па прасоўваньні палітыкі нашай дзяржавы ў структуры эўрапейскага рэгіёну і міжнароднай супольнасьці». 28 лютага ў «БДГ» Марыніч выявіўся прынцыповым прыхільнікам уступленьня Беларусі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю (СГА): «Тое, што 2000 г. аказаўся практычна згубленым для навязваньня сувязяў з СГА, агромністы мінус. І чым раней мы вырашым гэтую праблему, тым выгадней будзе для агульнага аднаўленьня тавараабарачэньня». Марыніч рэпрэзэнтаваў сябе як вялікага эканамічнага патрыёта Беларусі. Невыпадкова на пачатку 2000 г. ён прапаноўваў Лукашэнку набыць у беларускую ўласнасьць пару латвійскіх партоў.

Каб зразумець ролю Марыніча ў перадвыбарным раскладзе сілаў, важна ўлічваць і тую акалічнасьць, што яго люта ненавідзяць тутэйшыя «праваслаўныя русафілы». У нашумелай антысэміцкай кнізе «Вайна па законах подласьці», выдадзенай у Менску коламі, блізкімі да

Ўладзімера Замяталіна, Марыніч разам з Паўлам Шараметам, Ігарам Кузьняцовым, Аляксандрам Патупам названы ворагам беларускага народу.

Пры гэтым імідж Марыніча надзіва супадаў з іміджам аднаго з цэнтральных кандыдатаў ад дэмакратычнай «пяцёркі» Сямёна Домаша. І ў першым, і ў другім выпадку перад намі выдатныя гаспадарнікі, палітыкі, у цэнтры ўвагі якіх перадусім эканамічны росквіт Беларусі. І Домаш, і Марыніч згаджаюцца з тым, што рэжым Лукашэнкі прыводзіць Беларусь да эканамічнага краху. Абодва яны выступаюць за палітычную і эканамічную лібэралізацыю Беларусі, за прававую дзяржаву, абодва носяць акуляры.

Вылучэньне чужога інтарэсам Масквы Марыніча сьведчыла пра тое, што стратэгічныя аспэкты пляну выбарчай кампаніі Лукашэнкі былі распрацаваныя ў Менску, а не ў Маскве. Масква толькі чуйна адгукалася на ідэі лукашэнкаўскай адміністрацыі і аказвала ім інфармацыйную падтрымку. Калі гэтая тэза слушная, то ў беларускай выбарчай кампаніі Крамлю належала другасная роля, ён не валодаў палітычнай ініцыятывай.

Пры дапамозе сваіх «падстаўных» кандыдатаў (Машэравай, Сініцына і драбнейшых), вылучаных і зацьверджаных, паводле пэўнай інфармацыі, Радай бясьпекі, лукашэнкаўцы «асвойвалі» «нявызначаны», патэнцыйна антылукашэнкаўскі электарат (у красавіку 2001 г., паводле зьвестак НІСЭПД, амаль 37% беларускіх выбарцаў сьцьвердзілі, што ня будуць галасаваць за Лукашэнку). Лукашэнкаўскія паліттэхнолягі рабілі ўсё для таго, каб усе гэтыя людзі не прагаласавалі за рэальна апазыцыйнага палітыка. З гэтай мэтай яны стваралі муляж апазыцыйнасьці накшталт Машэравай, выдатна пры гэтым разумеючы: *тых, хто вагаецца,* можна і трэба перакупіць пры дапамозе яркіх, але цалкам марыянэткавых постацяў.

Пэрсона Леаніда Сініцына вымагае асобнага абмеркаваньня. Лукашэнкаўскія паліттэхнолягі, відавочна, рэзэрвавалі яму месца неўраўнаважанага лібэрала, дадаткова адказнага за сувязі зь бізнэсам. Акцыі гэтага дзеяча былі прадуманыя і адрасныя. Чаго вартая сініцынская заява, што на працягу трох тыдняў яго групе ўдалося сабраць больш за 160 тысяч подпісаў за ініцыятыву «пяць з плюсам» (сэнс якой палягаў у наданьні легітымнасьці ў ваччу міжнароднай супольнасьці марыянэткавым органам дзяржаўнага кіраваньня Беларусі). Або скандальны сініцынскі ліст пра распродаж дзяржаўнай уласнасьці напярэдадні выбараў (хаця адрасная група — эканамічная эліта — выдатна зразумела сэнс гэтага пасланьня). Самым «смажаным» фактам з гэтага ліста было тое, што афіцыйны Менск за падтрымку падчас рэфэрэндуму 1996 г. расплаціўся з «арлоўскай групай», узначаленай сьпікерам Рады Фэдэрацыі РФ Ягорам Строевым, кантролем над Беларускім мэталюргічным заводам.

Сініцын ніколі асабліва не хаваў таго, што зьбіраецца працаваць на Лукашэнку. У 2000 г., калі 27 верасьня пастановай Вярхоўнага суду Сініцын быў зарэгістраваны кандыдатам пасьля зьняцьця выбарчай камісіяй Рагачоўскай акругі, ён правёў прэс-канфэрэнцыю, на якой заявіў пра тое, што мае намер вярнуцца ўва ўладу, кансультаваць Лукашэнку на выбарах і што ён падтрымлівае стасункі з Лукашэнкам празь яго памочнікаў. Паказальна, што Сініцын тады быў вылучаны кандыдатам ад двух працоўных калектываў дзяржаўных арганізацый — дарожна-будаўнічай управы і прадпрыемства па вытворчасьці жалезабэтонных канструкцый.

Дарэчы, аналітыкі сыходзяцца на думцы, што «гонар» вынаходзтва славутай прэзыдэнцкай вэртыкалі таксама належыцца Сініцыну. І яшчэ пару штрышкоў зь яго біяграфіі. Зь імем Сініцына, які ў свой час займаў пасаду кіраўніка Рады па каштоўных паперах пры Савеце міністраў, зьвязаны скандал, якія выбух пасьля няўдалага выпуску ў 1995 г. першых бела-

рускіх залатых манэтаў. Задума скончылася судовымі працэсамі. Аўтарам эскізу першай беларускай манэты быў ня хто іншы, як Леанід Сініцын... Празь нейкі час Лукашэнка ў тэлепраграме «Совершенно секретно» абвінаваціў Сініцына ў махінацыях (продажы за бесцань расійскім камэрцыйным структурам матэрыяльных рэзэрваў Беларусі), у адказ на што апошні пагражаў судзіцца, але намер свой так і ня зьдзейсьніў.

Як і Наталя Машэрава, Сініцын актыўна «раскручваўся» расійскімі СМІ. Тэлеканалу ОРТ Сініцын сэнсацыйна прызнаўся, што беларускія ўлады падрыхтавалі сьпіс людзей, якіх ня будуць пускаць на БТ, і што ён, натуральна, у гэтым сьпісе першы.

Група «вылучэнцаў», якія так ці інакш былі зьвязаныя з Лукашэнкам, апрача Машэравай і Сініцына (у якасьці кіраўніка ягонай ініцыятыўнай групы ўсплыў Уладзімер Сьцяпанаў — былы намесьнік старшыні Берасьцейскага аблвыканкаму, раптоўная добраахвотная адстаўка якога напярэдадні выбарчай кампаніі нарабіла шмат шуму ў мас-мэдыях; Сьцяпанаў — блізкі сябар старшыні камісіі па працы, сацыяльных пытаньнях, ахове здароўя, фізычнай культуры і спорце ПП НС Станіслава Гаварушкіна; такая была зроблена камбінацыя), налічвала Віктара Цярэшчанку (характэрна, што лукашэнкаўскі афіцыёз *«Советская Белоруссия»* ў сваіх публікацыях прадстаўляў гэтага дырэктара Міжнароднага інстытуту мэнэджмэнту з завочнай вышэйшай адукацыяй як «дырэктара беларуска-нямецкага СП»), Юр'я Данькова, дэпутата менскага гарадзкога Савету. Падчас апошніх выбараў у менскі гарадзкі Савет Юры Данькоў (ён жа кіраўнік Рэспубліканскай сацыяльна-гуманітарнай дабрачыннай арганізацыі, старшыня Таварыства аховы жывёлаў і па сумяшчальніцтве дырэктар аднаго з найбуйнейшых менскіх начных клюбаў «Данькоў-клюб», заснаванага ім сумесна зь Беларускім таварыствам глухіх (!)), усяго на чатыры галасы выперадзіў галоўнага лекара раённай паліклінікі. *«Советская Белоруссия»* ў 2000 прысьвяціла Міхаілу Марынічу некалькі такіх хвалебных нарысаў, якія з пазыцыі сёньняшняга дня робяць уражаньне, што гэты чалавек распачаў сваю перадвыбарную кампанію ня сёньня і ня ўчора («дарог пройдзена шмат... Але якія б пасады ні займаў гэты надзіва сьціплы і зычлівы чалавек, ён заўсёды застаецца эталёнам сапраўднай прыстойнасьці. Учора прэзыдэнт абвясьціў М. Марынічу падзяку» (№ 9, 14.01.2000); «споўнілася 60 гадоў М. Марынічу. Міхаіл Апанасавіч зрабіў у сваім жыцьці шмат — будаваў гарады, дарогі і масты. Зь яго імем зьвязаныя стварэньне менскага мэтро, добраўпарадкаваньне нашай сталіцы — М. Марыніч быў мэрам Менску. Таленавіты чалавек таленавіты ўва ўсім! Міхаіл Апанасавіч — буйны палітык» (№ 162, 05.07.2000). Яшчэ адзін вылучэнец, Леанід Калугін, як вынікае з публікацый у СМІ аднаго з найбуйнейшых лукашэнкаўскіх ідэолягаў Юр'я Дудзінова, «глыбока веруючы праваслаўны чалавек». Пасьля рэгістрацыі сваёй ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў «праваслаўны чалавек» яшчэ нічога ня мог адказаць на пытаньне беларускай службы Радыё Свабода аб прычынах свайго вылучэньня (Калугін: «Я ж вам сказаў — рана яшчэ пра гэта гаварыць. Ня трэба пра гэта. Ну навошта?» Карэспандэнт: «Але чаму Вы вырашылі вылучацца?» Калугін: «Ну як чаму? Таму што я грамадзянін Рэспублікі Беларусі»). А як паведаміў сакратар Цэнтравыбаркаму Мікалай Лазавік, кіраўнік ЗАТ «Гандлёвы Дом БелБабаеўскае» Сяргей Скрабец падчас падачы заявы быў у «хваравітым стане» (магчыма, намякаючы на стан алькагольнага ці наркатычнага ап'яненьня). Мікалай Лазавік заявіў літаральна наступнае: «Адчуваецца няцьвёрдая рука чалавека, які зь цяжкасьцю трымаў пяро», а пасьля дадаў, што Цэнтравыбаркам потым спрабаваў знайсьці спадара Скрабца, але дома яго не было і мабільны тэлефон не адказваў.

Усіх гэтых людзей аб'ядноўвала прафэсія — перад намі розная рукі «гаспадарнікі» і

бізнэсоўцы (этап рэгістрацыі ініцыятыўных групаў скончыўся шматзначным штрышком, які таксама апынуўся ў цэнтры ўвагі беларускіх СМІ, як электронных, так і друкаваных, — дасылкай па пошце дакумэнтаў для рэгістрацыі малавядомым бізнэсоўцам Аляксандрам Батурам).

Вылучэньне такога роду кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта ўжо з пачатку гэтага году было адным з асноўных элемэнтаў мабілізацыйнай кампаніі Лукашэнкі. (Дарэчы, яна дэманстравала структурнае падабенства да фармаваньня кааліцыі дэмакратычных кандыдатаў. Стварэньне пяцёркі прыцягнула да яе ўвагу розных слаёў беларускага грамадзтва — людзі сталага веку цешыліся, што пабачылі ў ёй камуніста Калякіна, вайскоўцаў і міліцыянэраў не пакінуў абыякавым Павал Казлоўскі, сябры Фэдэрацыі прафсаюзаў з энтузіязмам даведаліся пра ўваходжаньне ў пяцёрку У. Ганчарыка і г.д. Фактычна тое самае рукамі сваіх паліттэхнолягаў зрабіў Лукашэнка, толькі цікавіла яго перадусім беларуская фінансава-прамысловая эліта.) Праз сваіх псэўдаапазыцыйных кандыдатаў Лукашэнка даваў расчараваным у дзяржаўнай эканамічнай палітыцы прамыслова-фінансавым элітам знак, што паразуменьне ўсётакі магчымае, што ў выпадку яго пераабраньня на другі тэрмін ляяльныя рэжыму прадпрымальнікі зноў атрымаюць пэўныя палёгкі і прэфэрэнцыі. Найбуйнейшы афіцыйны ідэоляг Аляксандар Зімоўскі ў сваёй тэлевізійнай праграме «Рэзананс» ад 10 чэрвеня 2001 г. таксама выказаў непакой пра намэнклятуру: «Відавочна адзінае: Беларусі чарговы раз спрабуюць навязаць далёка ня самы лепшы варыянт. Безумоўна, адлучаная ад кармушкі намэнклятура падтрымлівае Домаша з асабістых інтарэсаў». Адзначым стылёвую неахайнасьць Зімоўскага: зь яго словаў вынікае, што *далучаная да кармушкі* намэнклятура беззасьцярожна падтрымае Лукашэнку.

У разгар выбарчай кампаніі, 13 чэрвеня 2001 г. Лукашэнка падпісаў шэраг указаў, якія лібэралізавалі некаторыя сфэры беларускай эканомікі. Указ №313 прадугледжваў вылучэньне падатковага крэдыту прадпрыемствам радыёэлектроннай ды іншых галін прамысловасьці. Указ №314 устанаўляў гранічныя нарматывы на разьлікі за энэргарэсурсы ў неграшовай форме. Указ №315 пакліканы быў стымуляваць прамысловую вытворчасьць дзякуючы таму, што вызначанаму наверсе сьпісу прадпрыемстваў будзе дадзена магчымасьць атрымаць незаплянаваныя прыбыткі. Указ №316 «Аб удасканаленьні парадку правядзеньня і кантролю вонкавагандлёвых апэрацый» паляпшаў умовы вонкавагандлёвай дзейнасьці і, у прыватнасьці, лібэралізаваў рэжым рэгістрацыі мытняй пашпарту вонкавагандлёвае апэрацыі: згодна зь ім, апэрацыі на суму да 1.500 даляраў не падлягалі рэгістрацыі (раней — да 200$). Указ №319 вызваляў прадпрыемствы каапэрацыі ад выплаты ў бюджэт падаткаў на даходы, на прыбытак і на даданую вартасьць пры бязвыплатнай перадачы ім ува ўласнасьць маёмасьці з рэспубліканскай ці камунальнай уласнасьці.

Другая, ня менш важная прычына такой павышанай увагі да беларускай фінансава-прамысловай эліты з боку Лукашэнкі і яго паліттэхнолягаў тлумачылася тым, што рэжым імкнуўся зьвесьці на нішто магчымасьць любой падтрымкі беларускімі бізнэс-структурамі кандыдатаў рэальнай беларускай апазыцыі. Стаўка рабілася на тое, што тая частка беларускай эканамічнай эліты, якая ня купіцца на перадвыбарныя абяцанкі самога Лукашэнкі, найхутчэй прафінансуе выбарную кампанію «палітычна добранадзейных» — г.зн. Сініцына, але не Ганчарыка або Калякіна. Для беларускай жа апазыцыі абмежаваньне рэальнай рэсурснай базы непазьбежна азначала памяншэньне базы падтрымкі на выбарах.

Звышзадача, якая ставілася Лукашэнкам перад гэткага роду «мабілізацыйнай кампаніяй»,

фактычна палягала ў кансалідацыі «ў часіну вырашальнай бітвы» тых беларускіх элітаў (і лібэральна, і па-рэваншысцку настроеных), якія дагэтуль успрымаюць незалежнае беларускае грамадзтва і культываваныя ім вартасьці як пагрозу сваім жыцьцёва важным інтарэсам. Трук з разьдзіманьнем пагрозы «правага рэваншу» зь яго катастрафічнымі наступствамі для краіны быў упершыню з посьпехам апрабаваны Лукашэнкам яшчэ падчас выбарчай кампаніі 1994 г., калі яму без асаблівага клопату ўдалося перацягнуць на свой бок такіх цьвяроза думаючых палітыкаў, як В. Ганчар або М. Чыгір, а таксама наконадні абодвух рэфэрэндумаў, якім папярэднічала адносная эканамічная лібэралізацыя.

Інфармацыйнае забесьпячэньне лукашэнкаўскай выбарчай кампаніі зьдзяйсьнялася вельмі прафэсійна. У траўні 2001 г. зь нічога ніякага пачынае раздаваць апазыцыйным СМІ інтэрвію былы начальнік упраўленьня справаў Адміністрацыі прэзыдэнта Іван Ціцянкоў, у якім ён навязвае шырокай грамадзкасьці думку, што Лукашэнка вядзе вельмі замкнёнае жыцьцё і што ў гэтым жыцьці ён прыслухоўваецца да галасоў трох найбліжэйшых яму людзей, у тым ліку Ўладзімера Канаплёва «зь яго жонкай Алай». Такія публікацыі прытуплялі ўвагу і пільнасьць апанэнтаў сучаснага беларускага рэжыму, ляпілі Лукашэнку імідж прастакаватага палітыка зь недалёкім сялянскім розумам, схільнага да неабдуманых імпульсіўных рашэньняў. Гэты імідж мусіў узмацніць наступны бліскучы крок Лукашэнкі — прызначэньне кіраўніком сваёй ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў пісьменьніка, адстаўнога генэрала МУС і цяперашняга «старшыню камісіі па нацыянальнай бясьпецы Савету Рэспублікі НС» Мікалая Чаргінца. Апошні адразу засьвяціўся ў СМІ — у інтэрвію «Советской Белорусии» ён паўстаў чалавекам старой загартоўкі, хваліў Лукашэнку і пры канцы заявіў пра сваё рэзка адмоўнае стаўленьне да паліттэхнолягаў і сучасных паліттэхналёгій, як, відаць, ад яго патрабавался, засьведчыўшы поўнае дылетанцтва ў гэтым пытаньні: «Брудныя» палітычныя тэхналёгіі прыйшлі сьпярша ў Расію, а цяпер іх спрабуюць прышчапіць і ў нас, часта дзякуючы тым жа расійскім тэлеканалам. Трэба быць рэальна гатовымі да рознага роду правакацый, фальшаваньняў і кампрамату. Чорны *PR* немінуча будзе выкарыстоўвацца высокааплатнымі паліттэхнолягамі — дамарослымі і прыежджымі — супраць Аляксандра Лукашэнкі як найбольш рэальнага кандыдата на пасаду кіраўніка дзяржавы. Мы гатовыя да гэтага, але адкажам самай дзейснай зброяй — адкрытасьцю, праўдай, рэальнай карцінай справаў».

Вельмі ўдала ў інфармацыйным пляне лукашэнкаўцы разыгралі «расійскую карту». Цягам усёй выбарчай кампаніі апазыцыйныя СМІ трубілі пра «нявызначанасьць», «нэўтральнасьць» Расіі, тым часам як Масква была і засталася зацікаўленая ў экспарце ўнутранай лукашэнкаўскай палітыкі ў іншыя краны СНД, перадусім у частцы яе культурнага, інфармацыйнага і, калі так можна сказаць, ідэалягічнага складнікаў. Не падтрымаць найбольш прарасійскага на прасьцягу СНД прэзыдэнта Расія проста не магла. Найперш таму, што гэта зрабіла б цяжкое ўражаньне на прэзыдэнтаў іншых постсавецкіх краінаў, зь якімі Расія вяла перамовы аб уступленьні ў саюз, — Малдовы ды Арменіі. Правал Лукашэнкі на выбарах сур’ёзна запаволіў бы інтэграцыйныя працэсы на прасьцягу былога СССР, ініцыяваныя Масквой, і паставіў бы пад сумнеў далейшае існаваньне СНД.

Пры гэтым, як і ў 1994 г., Лукашэнка зарабляў палітычныя дывідэнды на антыкарупцыйных скандалах і абяцаньнях «запусьціць заводы». 22 чэрвеня апазыцыйная «Белорусская деловая газета» на першай паласе зьмясьціла матэрыял пра затрыманьне па падазрэньні ў атрыманьні хабару намесьніка начальніка РУУС Маскоўскага раёну Менску падпалкоўніка міліцыі Андрэя Мухтарава. А роўна на тыдзень раней, 15 чэрвеня, у «Советской Белорус-

сии» зьявіўся артыкул «Заводы павінны і будуць працаваць» з падрабязным апісаньнем таго, як Лукашэнка наведваў Менскі мэханічны завод імя Вавілава, што ён там гаварыў і што бачыў. Апрача гэтага, Лукашэнку старанна ляпілі імідж кіраўніка, які амаль вырашыў «жытловае» пытаньне (усё тая ж «Советская Белоруссия» сваю публікацыю «Дах на галавой — права кожнага» (№164; 14.06.2001) пачынае з сакрамэнтальнага: «Прэзыдэнт патрабуе зрабіць больш танным жытловае будаўніцтва. Сёлета жытловае будаўніцтва зробіцца таньнейшым на 10%»).

Важную ролю рэжым адводзіў і прапагандзе і контрапрапагандзе посьпехаў беларускай прамысловасьці. Напрыклад, пасьля паведамленьняў у незалежнай прэсе, што на віцебскім тэлевізійным заводзе «Віцязь» рыхтуюцца скарачэньні работнікаў, а ў пэрспэктыве таксама заплянаваны пераход на няпоўны рабочы тыдзень, у «Советской Белоруссии» апэратыўна было апублікаванае інтэрвію з генэральным дырэктарам гэтага прадпрыемства Валер’ем Нікіфаравым, у якім ён катэгарычна зьняпраўдзіў гэтыя зьвесткі (вельмі паказальны палітызаваны фрагмэнт інтэрвію з нападкамі на незалежныя СМІ: «Цяпер скарачэньняў работнікаў прадпрыемства не вядзецца. Магчыма, глебу для такіх плётак стварае несумленная прэса. Чаму гэта адбываецца? Актывізавалася перадвыбарная кампанія. І пэўным сілам вельмі хочацца паказаць, як у нас усё кепска... Дзякуючы пастановам ураду краіны і асабістаму ўдзелу прэзыдэнта А. Лукашэнкі забясьпечаныя варункі для захаваньня радыёэлектроннай галіны»). Увогуле, Лукашэнку падабалася нацягваць на сябе маску эканаміста (так ён сам сябе ахарактарызаваў у заяве, пададзенай у Цэнтравыбаркам). 22 чэрвеня ён сустрэўся ў Менску з удзельнікамі 8 паседжаньня Эканамічнай рады СНД і сказаў літаральна наступнае: «Я заклікаю тут, на беларускай зямлі, прыняць дзейсныя эканамічныя пастановы, якія будуць своеасаблівай данінай памяці аб тых, хто ваяваў у гэтай вайне». А днём раней, 21 чэрвеня, у «Советской Белоруссии» зьявіўся артыкул «Дзяржава і бізнэс: нам ня жыць адзін без аднаго». Лукашэнка разглядаў эканамічныя эліты як патэнцыйную небясьпеку створанаму ім рэжыму і таму што ёсьць сілы імкнуўся прадстаць гарантам іх будучага працьвітаньня. У артыкуле цытуюцца словы Лукашэнкі, нібыта прамоўленыя ім на сустрэчы зь пераможцамі конкурсу «Найлепшы прадпрымальнік 2000 году»: «Прадпрымальнікі — гэта людзі, якія ствараюць асноўныя вартасьці ў нашым грамадзтве, у нашай дзяржаве». Шэраг гэтых «стваральнікаў» Лукашэнка ўзнагародзіў зоркай «Герой Беларусі» (узнагарода адбылася ўпершыню з 1996 г.) — прамыслоўца Паўла Марыева, аграрнікаў Міхаіла Карчміта, Віталя Крамка і пасьмяротна гаспадарніка Аляксандра Дубка.

Ня грэбавалі лукашэнкаўцы і інфармацыйна-прапагандысцкімі акцыямі старога савецкага кшталту. 19 чэрвеня газэта «Рэспубліка» публікуе артыкул «Падтрымаем у рэспубліцы грамадзянскі мір і сацыяльную стабільнасьць», у якім інфармуе пра зварот групы ляяльных Лукашэнку кіраўнікоў палітычных партый і грамадзкіх арганізацый у сувязі з прэзыдэнцкімі выбарамі, падпісаны, між іншым, старшынём Беларускага саюзу кампазытараў Ігарам Лучанком і прэзыдэнтам Міжнароднага грамадзкага аб’яднаньня «Паслы славянства», беларускай пісьменьніцай Таісай Бондар. Незадоўга да гэтага «Советская Белоруссия» публікуе заклік «маладога пакаленьня Беларусі» прагаласаваць за Лукашэнку, падпісаны лідэрамі праўрадавых маладзёвых арганізацый. 28 чэрвеня лідэры кішаньковых лукашэнкаўскіх палітычных партый і грамадзкіх арганізацый (старшыня Беларускай патрыятычнай партыі Зьміцер Улаховіч, сакратар Аграрнай партыі Эдуард Калінін, сакратар ЦК КПБ Валер Захарчанка, першы сакратар ЦК БПСМ Юры Салаўёў і інш.) правялі прэс-канфэрэнцыю, на якой усяляк

ухвалялі дэкрэт № 20 Лукашэнкі «Аб абавязковым дэкляраваньні даходаў і маёмасьці кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусі, яго блізкіх сваякоў, жонкі (мужа) і яе (яго) бацькоў і некаторых іншых захадах, скіраваных на правядзеньне адкрытых, свабодных і сумленных выбараў».

Заслугоўвае ўвагі і ўсходняя палітыка Лукашэнкі. Яго візыт у Маскву, адбыты 20–21 чэрвеня, быў абумоўлены ня толькі эканамічнымі (павелічэньне паставак газу ў Беларусь, пытаньні тарыфнага і нетарыфнага рэгуляваньня, спагнаньня ўскосных падаткаў) або палітычнымі, але й, калі так можна выразіцца, перадвыбарнымі меркаваньня. Сам візыт бурна камэнтараваўся ў расійскіх і беларускіх мэдыях. У пятніцу, 22. 06. 2001, у «Советской Белоруссии» зьявіўся артыкул «Візыт прэзыдэнта ў Маскву быў плённым», падсумаваны такой высновай: «На перамовінах не было закрытых тэмаў, сустрэчы праходзілі ў атмасфэры шчырасьці і даверу».

Падчас маскоўскай выправы Лукашэнку ўдавалася ўсё задуманае — абмеркаваць з прэзыдэнтам нафтагазавай кампаніі «Слаўнафта» Міхаілам Гуцэрыевым пытаньне аб распрацоўцы нафтавага радовішча ў Ненецкай акрузе РФ (апрача гэтага, як паведамляе інфармацыйны сэрвіс расійскай энэргетыкі www.rusenergy.com, значная ўвага была нададзеная тэме інтэграваньня «Слаўнафты» ў нафтахімічны комплекс Беларусі. Міхаіл Гуцэрыеў паінфармаваў Лукашэнку і пра стварэньне «Слаўнафтаю» ўласнай сеткі збыту нафтапрадуктаў на тэрыторыі Беларусі, а таксама пра ўдзел кампаніі ў забесьпячэньні паліўных патрэбаў беларускіх гаспадарак падчас збору ўраджаю), з кіраўніком групы кампаній «Ітэра» Ігарам Макаравым — праблему стварэньня сумеснага прадпрыемства для здабычы газу; з расійскім прэм'ерміністрам Міхаілам Касьянавым Лукашэнка дасягнуў дамоўленасьці наконт будаўніцтва газаправоду па тэрыторыі Беларусі (некаторыя прысутныя на сустрэчы Лукашэнкі з расійскім кіраўніцтвам у Крамлі журналісты параўналі гэтае афіцыйнае мерапрыемства з касьцюмаваным шоў — Пуцін і Касьянаў беспасярэдне з сваіх кабінэтаў давалі дырэктывы для выкананьня дасягнутых з Лукашэнкам дамоваў). Зь вялікай помпай была пададзена сустрэча Лукашэнкі і першага і апошняга прэзыдэнта СССР Міхаіла Гарбачова, дзе Лукашэнка паказаў сябе лібэралам, а Гарбачоў — лукашэнкафілам. Цікава, што пасьля сустрэчы з Гарбачовым Лукашэнка ізноў трапіў цэнтар увагі расійскіх журналістаў. «Што б і хто б ні гаварыў, але тыя, хто вызначае палітыку Расіі, ніколі не гаварылі пра ўваходжаньне Беларусі ў склад Расіі і паглынаньне Беларусі», — сказаў беларускі прэзыдэнт. І дадаў: у гэтым выпадку саюз «быў бы нядоўгім і разваліўся б, як картачны дамок».

Падчас свайго апошняга ваяжу ў Маскву Лукашэнка працаваў і як актор палітычнага тэатру. Агенцыя электроннай інфармацыі http://news.km.ru 22 чэрвеня распаўсюдзіла паведамленьне «Лукашэнка плянуе выйграць выбары бяз Пуціна»: «Лукашэнка ўпэўнены, што публічныя заявы расійскага прэзыдэнта пра яго падтрымку на прэзыдэнцкіх выбарах не паўплываюць на ход падзеяў. Лукашэнка адзначыў, што асабіста папрасіў Уладзімера Пуціна публічна не выказвацца пра падтрымку цяперашняга прэзыдэнта Беларусі». Падчас свайго візыту Лукашэнка таксама актыўна спэкуляваў на беларуска-расійскай інтэграцыі. 22 чэрвеня расійскія інфармацыйныя агенцыі распаўсюдзілі інфармацыю «Канстытуцыю саюзнай дзяржавы пачнуць пісаць на наступным тыдні»: «Працоўная група па складаньні тэксту Канстытуцыі саюзнай беларуска-расійскай дзяржавы прыступіць да працы на наступным тыдні. З словаў [Лукашэнкі] вынікала, што адпаведная дамоўленасьць была дасягнутая на апошняй сустрэчы ў Маскве з прэзыдэнтам Расіі Ўладзімерам Пуціным».

Аднак пік расійскай падтрымкі Лукашэнкі зьвязаны зь візытам кіраўніка РПЦ Аляксія II на Беларусь (23–27.06), адбыты пасьля шасьцёх гадоў паўзы, і яго сустрэчы з Лукашэнкам. Беларускія ўлады змаглі выкарыстаць яго з максымальнай выгадай. Напрыклад, асьвячэньне берасьцейскай праваслаўнай царквы Ўваскрасеньня Хрыстовага з удзелам Лукашэнкі і Аляксія II (які ў Берасьці ў звычнай для расійцаў шавіністычнай манеры выказаўся, што «вялікая і братняя Ўкраіна павінна прыйсьці да ўсьведамленьня таго неабходнага дабра, якое нясе адзінства») трансьлявалася беларускім тэлебачаньнем і радыё.

Асобную ўвагу трэба зьвярнуць на камэнтар гэтай акцыі Аляксандрам Зімоўскім у праграме «Рэзананс» (этэр 24.06). Зімоўскі пачынаў свае развагі так, як можа пачынаць расійскі інтэлігент, выхаваны ў імпэрскай традыцыі эканамічнай аўтаркіі і палітычнай самаізаляцыі: «Беларусь стала першай і, здаецца, адзінай краінай, дзе кіраўнік дзяржавы публічна і неаднаразова заяўляў, што аснова нашай ідэалёгіі — хрысьціянская сыстэма вартасьцяў. І тут А. Лукашэнка лёгка знайшоў узаемаразуменьне з царквой». Але пад канец зрываецца на набалелае, на канстатацыю палітычнай нядобранадзейнасьці пэўнай часткі беларускай эканамічнай эліты: «Не сакрэт, што іншыя дзеячы, ня толькі палітыкі і дэпутаты, але і *дырэктары* (вылучана намі. — *В.Б.*), у сваім паказным запале выходзяць далёка за рамкі сумленных узаемаадносін з царквой».

Канец візыту Аляксія II выйшаў ня менш сымбалічны — на сумежжы Беларусі, Расіі і Ўкраіны расійскі патрыярх, прыехаўшы ў гэтае месца на лукашэнкаўскім аўтамабілі, ізноў сустрэўся з Лукашэнкам і ўзяў удзел у перадачы «дару беларускага народу — дзьвюх адтвораных харугваў для маскоўскага храму Хрыста Збаўцы». А перад адлётам гэтага расійскага праваслаўнага дзеяча на радзіму адбылася яго сустрэча з Лукашэнкам у Сьвятапакроўскай царкве сяла Карма Добрускага раёну Гомельскай вобласьці.

Зрэшты, расійская падтрымка Лукашэнкі не абмяжоўваецца толькі прыездам Аляксія II. 25 ліпеня адбылася сустрэча прэзыдэнтаў Беларусі, Украіны і Расіі ў Віцебску, а 1–3 жніўня ў Сочы — нефармальная сустрэча кіраўнікоў дзяржаваў СНД.

Перадвыбарная кампанія Лукашэнкі была накіравана на шырокія слаі беларускага грамадзтва і апэлявала да розных узроўняў сьвядомасьці нашых грамадзян. Лукашэнка імкнуўся здабыць прызнаньне ў тых, хто зацікаўлены ў паляпшэньні сваіх жытловых варункаў. Ён узбуджаў замілаваньне ў прыхільнікаў беларуска-расійскай інтэграцыі і жорсткай барацьбы з карупцыяй. Не пакідаў ён абыякавымі і работнікаў буйных прадпрыемстваў і адначасна быў надзвычайна ўважлівым да беларускіх бізнэсоўцаў. Ну і, канечне, выбух захапленьня Лукашэнка выклікаў у тутэйшых носьбітаў «праваслаўнай духоўнасьці».

Тым часам лукашэнкаўцы ня толькі перакуплялі фінансава-прамысловыя эліты, але і рэалізоўвалі плян драбненьня рэальнай апазыцыі.

24 чэрвеня 2001 г. кандыдат у прэзыдэнты Лукашэнка, праяўляючы неабыякія тэатральныя здольнасьці, абвінаваціў усіх астатніх кандыдатаў у прадажнасьці і змове. Падобныя выпады Лукашэнкі перасьледавалі дзьве мэты. Па-першае, Лукашэнка ўмела навязваў апазыцыйны статус сваім стаўленікам (Сініцыну, Машэравай і г.д.), па-другое, ён падтрымліваў у стане «боегатоўнасьці» свой электарат. Гэта рабілася шляхам выбудовы свайго роду ланцуговай рэакцыі: беларускі прэзыдэнт эмацыйна дакараў у нечым Машэраву, пасьля ў зводках інфармацыйных агенцыяў зьяўляўся Сініцын і ўпікаў Лукашэнку за зробленыя грашкі.

Камбінацыя з удзелам Машэравай, Сініцына і інш. сьведчыла пра тое, што ў лягеры праў-

радавых кандыдатаў адбываўся свайго роду падзел працы. Лукашэнку значна выгадней было рэклямаваць сваіх «пацешных» кандыдатаў, чымся рэальных супернікаў. Але апроч дасягненьня тактычнае выгады, лукашэнкаўцы былі зацікаўленыя і ў кардынальным перадзеле беларускага палітычнага поля згодна з пасьпяхова апрабаваным у Расіі сцэнаром «кіраванай дэмакратыі», выцясьніўшы з гэтага поля несыстэмную ўваччу афіцыйных уладаў апазыцыю. Усьлед за псэўдапарлямэнтам і псэўдаканстытуцыйным судом, псэўдадэмакратыяй і псэўдазаконнасьцю прыходзіла чарга псэўдаапазыцыі, бо толькі псэўдаапазыцыя магла зрабіць уладу Лукашэнкі неабмежаванай, а створаную ім палітычную сыстэму — закончанай і па-свойму дасканалай. (У апазыцыянэры лез нават блізкі сябар Лукашэнкі і па сумяшчальніцтве намесьнік старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзімер Канаплёў — у сярэдзіне чэрвеня ў Страсбургу ён заявіў аб сваім намеры стварыць і ўзначаліць у «палатцы» апазыцыйны рух, пра што хутчэй-хутчэй паведаміла пад рубрыкай «Сэнсацыя» «Народная Воля».)

Пасьля падліку подпісаў, сабраных ініцытыяўнымі групамі, асноўныя «пралукашэнкаўскія» вылучэнцы спынілі свой удзел у выбарчай кампаніі. Крыху раней «па ўласным жаданьні» гэта зрабіла і Наталя Машэрава. Зьвяртае ўвагу «парнаграфічная» колькасьць подпісаў, здабытых ініцыятыўнымі групамі М. Марыніча (91 021), Л. Сініцына (80 540) і Л. Калугіна (91 345) — маўляў, усё, што маглі, зрабілі, але троху не хапіла да 100 000. Марыніч і Сініцын некаторы час яшчэ скандалілі, грazіліся судзіцца, але неўзабаве сьцішыліся. Марыніч удзельнічаў у апазыцыйных акцыях, але нічым сябе асабліва не праявіў. Сініцын заявіў пра свой намер балятавацца ў дэпутаты пакуль яшчэ няіснага парлямэнту «Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі». Калугін адразу сышоў у палітычны цень.

Сыход Сініцына, Марыніча і Калугіна зусім не азначаў адмову лукашэнкаўцаў ад стварэньня «кіраванай апазыцыі». У сярэдзіне жніўня дэпутат ПП НС Генадзь Дылеўскі апублікаваў у «БДГ» «Адкрыты ліст будучаму прэзыдэнту», які паказваў, што інсьпіраваная Лукашэнкам з свайго атачэньня так званая «лібэральная партыя» жыве і красуе, забясьпечваючы

**Табліца 2**

| | Прагаласуюць за яго абавязкова | Магчыма, прагаласуюць за яго | Ні пры якіх абставінах не прагаласуюць за яго | Цяжка адказаць |
|---|---|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 26 | 13 | 40 | 22 |
| М. Чыгір | 7 | 18 | 39 | 36 |
| С. Домаш | 5 | 13 | 34 | 49 |
| Н. Машэрава | 4 | 18 | 34 | 43 |
| С. Антончык | 2 | 7 | 40 | 51 |
| Я. Крыжаноўскі | 2 | 8 | 43 | 48 |
| З. Пазьняк | 2 | 7 | 51 | 36 |
| С. Гайдукевіч | 1 | 9 | 41 | 48 |
| У. Ганчарык | 1 | 14 | 38 | 46 |
| С. Калякін | 1 | 6 | 43 | 50 |
| П. Казлоўскі | 1 | 7 | 38 | 54 |
| Н. Лемяшэўскі | 1 | 7 | 37 | 55 |
| В. Цярэшчанка | 1 | 7 | 38 | 54 |

Крыніца: Сацыялягічная служба «Люстра» інфармацыйнай агенцыі БелаПАН

свайму прэзыдэнту надзейную апору. Ліст Дылеўскага — гэта свайго роду маніфэст «новых апазыцыянэраў», які вызначаўся неабыякой інтэлектуальнай культурай і ўтрымліваў шэраг досыць радыкальных палажэньняў. У ім зьмяшчаліся заклікі да эканамічнай мадэрнізацыі Беларусі (разьвіцьцё малога і сярэдняга бізнэсу, фіскальная рэформа, мінімізацыя ўдзелу дзяржавы ў гаспадарчай дзейнасьці, увядзеньне свабоднай куплі-продажу зямлі, лібэралізацыя банкаўскай сфэры), дэмакратызацыі сыстэмы палітычнай улады (павелічэньне вагі заканадаўчай і судовай улады, укараненьне мясцовага самакіраваньня), канстытуцыйнага ўладкаваньня краіны ў адпаведнасьці з эўрапейскімі стандартамі, вырашэньня дэмаграфічных праблемаў, адкрытасьці да Захаду.

Паралельна лукашэнкаўцамі ажыцьцяўлялася тактыка перакупліваньня «незалежніцка» настроеных беларусаў. Для гэтага доўгі час пераносілася сэсія парлямэнцкага сходу Саюзу Расіі і Беларусі, часова спыняліся трансьляцыі ў Беларусі расійскіх тэлеканалаў.

Прафэсійна сплянаваная выбарчая кампанія прынесла Лукашэнку плён. Травеньскае апытаньне (гл. Табліцу 2) жыхароў Менску зафіксавала наступны рэйтынг Лукашэнкі і яго асноўных супернікаў.

З кожным наступным месяцам Лукашэнкаў рэйтынг будзе стабілізавацца.

## ДЫНАМІКА РЭЙТЫНГУ А. ЛУКАШЭНКІ І ВЫНІКІ ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 2001 ГОДУ

У жніўні, напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў, НІСЭПД даў сацыялягічныя прагнозы што да магчымага галасаваньня тых беларускіх выбарцаў, якія яшчэ ня вызначыліся.

Было апытана 1.518 рэспандэнтаў. Гранічная памылка рэпрэзэнтацыйнасьці не перавышала 0.03 %.

Галасы за трох кандыдатаў на прэзыдэнцкіх выбарах разьмеркаваліся наступных чынам. (гл. Таб. 1).

На падставе атрыманых дадзеных быў разьлічаны аптымістычны для апазыцыі сцэнар галасаваньня. З разьлікаў НІСЭПД, А. Лукашэнка мог атрымаць, звыш паказаных у табліцы, яшчэ каля 4% галасоў. Пры найлепшым зьбегу абставінаў 13–14% дадавалася адзінаму апазыцыйнаму кандыдату.

**Табліца 1.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «За каго Вы прагаласуеце, калі кандыдатамі ў прэзыдэнты будуць наступныя палітыкі?» (закрытае пытаньне)

| Варыянт адказу | Выбралі адказ, % |
|---|---|
| А. Лукашэнка | 47.4 |
| С. Домаш | 12.1 |
| У. Ганчарык | 11.4 |
| С. Гайдукевіч | 4.1 |
| Не галасаваў | 10.6 |
| ЦА/НА | 14.4 |

Аднак нават пры спрыяльнай для апазыцыі сытуацыі А. Лукашэнка забіраў палову ўсяго беларускага электарату. Адзіны апазыцыйны кандыдат мог атрымаць каля траціны ўсіх галасоў. Гэтая лічба выходзіла пры мэханічным складаньні адсоткаў У. Ганчарыка і С. Домаша. Нават пры ўзгодненым галасаваньні апазыцыі беларускі прэзыдэнт захоўваў істотны адрыў. Такім чынам, апазыцыя ішла на выбары, ужо завочна прайграючы А. Лукашэнку.

На нізкі, у параўнаньні з А. Лукашэнкам, рэйтынг У. Ганчарыка ў значнай ступені паўплываў чыньнік часу. Паводле дадзеных таго ж апытаньня НІСЭПД, чвэрць выбарцаў, якія ня вызначыліся, зусім ня ведала пра кандыдата У. Ганчарыка (гл. Таб. 2).

**Табліца 2.** Стаўленьне выбарцаў, якія ня вызначыліся, да У. Ганчарыка і А. Лукашэнкі*, %

| Стаўленьне да кандыдата | Стаўленьне да У. Ганчарыка | Стаўленьне да А. Лукашэнкі |
|---|---|---|
| Вельмі дадатна | 1.6 | 2.9 |
| Хутчэй дадатна | 15.6 | 14.6 |
| Хутчэй адмоўна | 14.3 | 37.3 |
| Вельмі адмоўна | 4.8 | 17.5 |
| Нічога не чуў | 25.7 | 0.5 |
| Цяжка адказаць | 37.9 | 27.5 |

У той жа час, А. Лукашэнка быў цэнтральнай постацьцю беларускай палітычнай сцэны з 1994 году і на момант выбараў заставаўся самай вядомай асобай у Беларусі.

Паводле вынікаў выбараў падазрэньні выклікае не сама перамога А. Лукашэнкі, а высокі адсотак ягоных прыхільнікаў — паводле афіцыйных дадзеных, дзьве траціны выбарцаў. Тады як паводле вынікаў жнівеньскіх дасьледаваньняў НІСЭПД, напярэдадні выбараў прэзыдэнт Лукашэнка мог упэўнена разьлічваць на галасы прыблізна паловы ўсіх выбарцаў.

Афіцыйныя дадзеныя Цэнтравыбаркаму, у параўнаньні з вынікамі галасаваньня на прэзыдэнцкіх выбарах у 1994 годзе, дазвалялі афіцыйнаму Менску сьцьвярджаць пра стабільную

**Табліца 3.** Вынікі галасаваньня на выбарах прэзыдэнта 9 верасьня 2001 году

| | Узялі ўдзел у галасаваньні | За С. Гайдукевіча | За У. Ганчарыка | За А. Лукашэнку |
|---|---|---|---|---|
| Разам | 83.86% | 2.48 | 15.65 | 75.65 |
| Берасьцейская вобласьць | 85.84% | 2.44 | 15.73 | 76.17 |
| Віцебская вобласьць | 84.67% | 2.41 | 12.76 | 77.45 |
| Гомельская вобласьць | 85.74% | 1.76 | 8.34 | 85 |
| Гарадзенская вобласьць | 85.67% | 2.87 | 15.08 | 76.96 |
| Менская вобласьць | 84.12% | 2.32 | 14.84 | 76.56 |
| Магілёўская вобласьць | 85.26% | 2.17 | 9.84 | 83.03 |
| г. Менск | 77.59% | 3.37 | 30.5 | 57.57 |

Крыніца: Цэнтравыбаркам Рэспублікі Беларусі.

* Выбарцы, якія ня вызначыліся, гэта тыя, хто, адказваючы на закрытае пытаньне: «За каго Вы будзеце галасаваць на прэзыдэнцкіх выбарах, калі кандыдатамі будуць наступныя палітыкі?», выбралі варыянты адказу «ні за кога» або «цяжка адказаць».

падтрымку палітыкі А. Лукашэнкі бальшынёй беларускага насельніцтва цягам сямёх гадоў (гл. Таб. 3 і 4).

Пры яўцы выбарцаў у цэлым блізу 84% у 2001 годзе, паводле дадзеных Цэнтравыбаркаму, за А. Лукашэнку прагаласавала каля дзьвюх трацінаў удзельнікаў галасаваньня. У 1994 годзе ў другім туры выбараў, пры яўцы блізу 70 % выбарцаў, за А. Лукашэнку прагаласавала блізу 80% удзельнікаў галасаваньня. Пры супастаўленьні гэтых дадзеных з вынікамі выбараў 2001 году відаць, што папулярнасьць А. Лукашэнкі цягам сямёх гадоў заставалася на ўзроўні, супастаўным з выбарамі 1994 году, ці нават крыху павялічылася. Але, у той жа час, у першым туры выбараў 1994 году адсотак прыхільнікаў А. Лукашэнкі склаў блізу 45%. Гэта значыць, што адсотак галасоў прыхільнікаў кандыдатаў, што не прайшлі ў другі тур, праціўнікаў В. Кебіча, адышоў да А. Лукашэнкі.

Аднак у 2001 годзе адсотак відавочных прыхільнікаў прэзыдэнта Лукашэнкі, паводле дадзеных Цэнтравыбаркаму, на выбарах заставаўся супастаўны з адсоткам ягоных прыхільнікаў у 1994 годзе ў другім туры галасаваньня. Але ў пэрыяд, які папярэднічаў выбарам 2001 году, і ў першым туры ў 1994-м, колькасьць прыхільнікаў А. Лукашэнкі вагалася ў межах 50 адсоткаў.

Сумненьні ў выніках выбараў паводле інфармацыі Цэнтравыбаркаму выклікае якраз высокі адсотак тых, хто прагаласаваў за А. Лукашэнку ў верасьні 2001 году. Гэтыя сумненьні

**Табліца 4.** Прэзыдэнцкія выбары 1994 году. Колькасьць тых, хто галасаваў, %

| Тур | | Вобласьці Беларусі | | | | | | Менск | Беларусь у цэлым |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Гарадзенская | Берасьцейская | Менская | Віцебская | Гомельская | Магілёўская | | |
| I | Разам удзельнічалі ў галасаваньні | 80.3 | 83,4 | 82.8 | 79,2 | 73.8 | 79,4 | 70.2 | 79 |
| | Галасавалі за: | | | | | | | | |
| | А. Дубко | 9.01 | 5.3 | 7,02 | 6,72 | 5,15 | 4,38 | 3,5 | 5,98 |
| | В. Кебіча | 14.59, | 13,86 | 14,93 | 19,72 | 23,08 | 16,97 | 18,24 | 17,33 |
| | А. Лукашэнку | 36,31 | 53,47 | 44,46 | 15,96 | 45.57 | 63,01 | 26.48 | 44,82 |
| | В. Новікава | 3,27 | 3.17 | 4.29 | 3.59 | 4,99 | 3.53 | 4,53 | 4.29 |
| | З. Пазьняка | 21.21 | 11.72 | 15.34 | 9.41 | 6,33 | 4.68 | 20.98 | 12,82 |
| | С. Шушкевіча | 10,38 | 8,7 | 8,65 | 7.12 | 8,59 | 3,83 | 21,21 | 9.91 |
| II | Разам удзельнічалі ў галасаваньні | 72.1 | 77,7 | 76.7 | 73,7 | 72.5 | 73,5 | 51.9 | 70,6 |
| | Галасавалі за: | | | | | | | | |
| | В. Кебіча | 12.6 | 10,3 | 12.3 | 15,2 | 18.1 | 11,6 | 19.8 | 14,2 |
| | А. Лукашэнку | 81 | 84,9 | 82,4 | 80 | 77,4 | 85.3 | 70 | 80.4 |
| Несапраўдныя бюлетэні | | 6.1 | 4,8 | 5.3 | 4,8 | 4.5 | 3,1 | 10.2 | 5,4 |

Крыніца: Цэнтравыбаркам Рэспублікі Беларусі.

**Табліца 5.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці зьбіраецеся Вы браць удзел у будучых прэзыдэнцкіх выбарах?», %

| Варыянт адказу* | 02.01** |
|---|---|
| Так, я буду ўдзельнічаць у гэтых выбарах | 76.1 |
| Я прыму рашэньне пра ўдзел ці няўдзел у залежнасьці ад палітычных абставінаў у часе перадвыбарнае кампаніі | 10.8 |
| Не, я не буду ўдзельнічаць у гэтых выбарах | 6.5 |

**Табліца 6.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці задаволеныя Вы тым, як А. Лукашэнка кіраваў краінай цягам шасьцёх гадоў?», %

| Варыянт адказу | 06.00** | 08.00 | 09.00** | 10.00 | 11.00 | 02.01** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Хутчэй задаволены(ная) | 22.5 | 17.6 | 23.7 | 22.1 | 20.3 | 26.8 |
| Часткова задаволены(ная), часткова не | 44.5 | 40.5 | 42.6 | 41.1 | 42.9 | 41.4 |
| Хутчэй не задаволены(ная) | 33.0 | 41.6 | 32.7 | 35.8 | 36.3 | 28.8 |

**Табліца 7.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці хочаце Вы, каб А. Лукашэнка быў прэзыдэнтам нашае краіны яшчэ адзін тэрмін?», %

| Варыянт адказу | 11.00 | 02.01 |
|---|---|---|
| Так | 36.1 | 41.6 |
| Не | 41.5 | 32.3 |
| ЦА/НА | 22.4 | 26.1 |

цалкам абгрунтаваныя, калі супаставіць вынікі сацыялягічных дасьледаваньняў НІСЭПД, якія праводзіліся ў Беларусі ў сувязі з выбарамі.

НІСЭПД у лютым-сакавіку 2001 году правёў нацыянальнае апытаньне, у час якога было апытана 1489 рэспандэнтаў, гранічная памылка рэпрэзэнтацыйнасьці не перавышала 0.03%.

Паводле дадзеных сацыялягічных апытаньняў пачатку году, калі ўсе эканамічныя і адміністрацыйныя рэсурсы рэжыму яшчэ не былі задзейнічаныя дзеля прыцягненьня электарату, А. Лукашэнка ўжо меў дастаткова надзейную электаральную базу. Пры гэтым бальшыня грамадзянаў ужо тады зьбіралася ўдзельнічаць у выбарах (гл. Таб. 5–8).

Адсотак тых, хто ня вызначыўся, і незадаволеных А. Лукашэнкам перавышаў адсотак ягоных прыхільнікаў. Аднак яшчэ ў лютым-сакавіку незадаволеныя і тыя, хто ня вызначыўся, уяўлялі сабой разрозьненую масу, якая ня бачыла свайго кандыдата. Толькі ў ліпені быў вылучаны адзіны кандыдат, а пагадненьне паміж найбольш пэрспэктыўнымі кандыдатамі ад апазыцыі У. Ганчарыкам і С. Домашам было падпісанае 13 жніўня, за месяц да выбараў. У той жа час, прыхільнікі А. Лукашэнкі былі ад пачатку згуртаваныя вакол свайго аднаго і адзінага кандыдата. Мабілізацыя ўсіх адміністрацыйных і эканамічных рэсурсаў беларускага рэжыму дзеля перамогі А. Лукашэнкі, актыўная мабілізацыйная кампанія ў дзяржаўнай прэсе прыцягнула дадатковыя галасы зь ліку тых, хто вагаўся.

У красавіку 2001 году НІСЭПД зноў праводзіў нацыянальнае апытаньне, у час якога дась-

* Пазыцыі «Цяжка адказаць» і «Няма адказу» тут і ў шэрагу выпадкаў далей выключаныя.

** Апытаньне праводзілася сумесна з Цэнтрам сацыяльных і экалягічных дасьледаваньняў.

ледавалася дынаміка стаўленьня насельніцтва да А. Лукашэнкі. Быў апытаны 1.461 рэспандэнт ува ўзросьце ад 18 гадоў і больш. Была складзеная табліца, якая адлюстроўвала дынаміку рэйтынгу А. Лукашэнкі. Супастаўленьне дадзеных, пачынаючы з 1997 году, сьведчыла пра паступовае зьніжэньне рэйтынгу беларускага прэзыдэнта (гл. Таб. 9).

Але, нягледзячы на зьніжэньне рэйтынгу, А. Лукашэнка ўсё адно заставаўся самым папулярным лідэрам у параўнаньні зь любым магчымым кандыдатам ад апазыцыі (гл. Таб. 10).

Бальшыня апытаных па-ранейшаму зьбіралася галасаваць на выбарах, а колькасьць незадаволеных вынікамі кіраваньня А. Лукашэнкі значна пераўзыходзіла колькасьць задаволеных. Адсотак тых, хто не жадаў, каб А. Лукашэнка заставаўся на наступны тэрмін, пераўзыходзіў адсотак ягоных прыхільнікаў (гл. Таб. 11–13).

У чэрвені, калі прапагандысцкая кампанія ў дзяржаўнай прэсе і СМІ ўзмацнілася, НІСЭПД апытаў 1.499 рэспандэнтаў ува ўзросьце ад 18 гадоў і старэйшых (памылка рэпрэзэнтацыйнасьці не перавышала 0.03%). Колькасьць гатовых прагаласаваць за А. Лукашэнку істотна не зьмянілася. Каля траціны рэспандэнтаў — велічыня, супастаўная з колькасьцю прыхільнікаў прэзыдэнта, — выбралі адказ «ЦА». Кандыдатура адзінага кандыдата ў апытаньні набірала ўдвая менш адсоткаў за А. Лукашэнку (гл. Таб. 14–18).

На працягу ўсяга пэрыяду падрыхтоўкі да выбараў апазыцыйныя СМІ папярэджвалі пра высокую імавернасьць фальсыфікацый вынікаў галасаваньня. Аднак яшчэ ў чэрвені пера-

**Табліца 8.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Калі б заўтра адбыліся выбары прэзыдэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі?», % (адкрытае пытаньне)

| Варыянт адказу * | 02.01 |
|---|---|
| А. Лукашэнка | 41.4 |
| М. Чыгір | 3.3 |
| У. Ганчарык | 1.5 |
| З. Пазьняк | 1.4 |
| С. Домаш | 1.2 |
| С. Гайдукевіч | 0.6 |
| С. Шушкевіч | 0.5 |
| У. Ярмошын | 0.4 |
| В. Палевікова | 0.4 |
| Г. Карпенка | 0.4 |
| У. Мацкевіч | 0.3 |
| А. Лябедзька | 0.2 |
| А. Ярашук | 0.2 |
| Н. Машэрава | 0.2 |
| П. Казлоўскі | 0.2 |
| С. Калякін | 0.2 |
| В. Кебіч | 0.1 |
| С. Калянкевіч | 0.1 |

* Улучаныя прозьвішчы тых, хто згаданы ў апошнім апытаньні.

**Табліца 9.** Дынаміка стаўленьня насельніцтва да А. Лукашэнкі, %

| Паказьнікі стаўленьня да прэзыдэнта | Адзначылі Лукашэнку (варыянт А) | | | | | | | Не адзначылі Лукашэнку (варыянт В) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 11'97 | 09'98 | 06'99 | 11'99 | 04'00 | 10'00 | 04'01 | 11'97 | 09'98 | 06'99 | 11'99 | 04'00 | 10'00 | 04'01 |
| Прагаласавалі б за Лукашэнку на новых прэзыдэнцкіх выбарах* | 44.3 | 53.2 | 46.0 | 43.3 | 38.4 | 33.2 | 37.2 | 55.7 | 47.8 | 54.0 | 56.2 | 61.6 | 66.3 | 66.8 |
| Прагаласавалі б за Лукашэнку на выбарах прэзыдэнта Беларусі і Расіі | 35.3 | 44.7 | 32.8 | 31.6 | 22.3 | 25.2 | 34.4 | 64.8 | 55.3 | 67.2 | 68.4 | 77.7 | 74.8 | 75.6 |
| Давяраюць прэзыдэнту | 45.0 | 48.0 | 41.0 | 39.8 | 39.2 | 33.9 | 33.8 | 32.5** | 22.1** | 28.8** | 33.5** | 32.9** | 35.6** | 37.2** |
| Лічаць Лукашэнку ідэальным палітыкам | 50.4 | 51.5 | 45.7 | 44.9 | 37.0 | 34.3 | 34.3 | 49.6 | 48.5 | 54.3 | 55.1 | 65.0 | 65.7 | 65.7 |

* Адказ на адкрытае пытаньне (г.зн. рэспандэнты самі ўпісвалі імя палітыка)

** Не давяраюць прэзыдэнту

**Табліца 10.** Стаўленьне электарату да кандыдатаў у прэзыдэнты, %

| Кандыдаты у прэзыдэнты | Рады бачыць | Не рады бачыць | Ня ведаю такога | Давяраю | Буду галасаваць | Не буду галасаваць |
|---|---|---|---|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 39.8 | 34.4 | 1.5 | 39.4 | 39.5 | 36.4 |
| М. Чыгір | 21.2 | 29.7 | 11.9 | 19.8 | 17.9 | 15.1 |
| У. Ганчарык | 12.1 | 22.9 | 23.3 | 9.7 | 10.1 | 45.2 |
| С. Домаш | 9.8 | 17.2 | 38.9 | 7.5 | 8.1 | 46.2 |
| З. Пазьняк | 7.6 | 52.2 | 10.0 | 5.8 | 6.3 | 59.7 |
| П. Казлоўскі | 7.0 | 16.4 | 39.0 | 3.9 | 4.8 | 48.8 |
| С. Калякін | 3.6 | 20.1 | 41.1 | 2.6 | 2.8 | 51.7 |

**Табліца 11.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці зьбіраецеся Вы ўдзельнічаць у будучых прэзыдэнцкіх выбарах?», %

| Варыянты адказу* | 04'01 |
|---|---|
| Так | 70.5 |
| Прыму рашэньне ў залежнасьці ад палітычнай сытуацыі | 14.9 |
| Не | 7.2 |

**Табліца 12.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці задаволены Вы тым, як А. Лукашэнка кіраваў краінай?», %

| Варыянты адказу | 11'00 | 04'01 |
|---|---|---|
| Хутчэй задаволены | 20.3 | 18.3 |
| Часткова задаволены, часткова не | 42.9 | 46.9 |
| Хутчэй не задаволены | 36.3 | 33.8 |

**Табліца 13.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці хочаце Вы, каб А. Лукашэнка быў прэзыдэнтам нашай краіны яшчэ адзін тэрмін?», %

| Варыянты адказу | 02'01 | 04'01 |
|---|---|---|
| Так | 41.6 | 34.0 |
| Не | 32.2 | 40.7 |

**Табліца 14.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці хочаце Вы, каб А. Лукашэнка быў прэзыдэнтам нашай краіны яшчэ адзін тэрмін?», %

| Варыянты адказу | 02'01 | 04'01 | 06'01 |
|---|---|---|---|
| Так | 41.6 | 34.0 | 38.6 |
| Не | 32.3 | 40.7 | 33.3 |

важная бальшыня апытаных ня мела намеру аспрэчваць вынік выбараў у выпадку іх фальсыфікацыі. Больш за палову гэтае пасіўнае бальшыні ўвогуле ня верыла ў магчымасьць паўплываць на сытуацыю. Такім чынам, радыкальных, здольных дэстабілізаваць палітыч-

* Пазыцыі «Цяжка адказаць» і «Няма адказу» тут і далей збольшага выключаны.

**Табліца 15.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Калі б заўтра адбыліся выбары прэзыдэнта Беларусі, за каго б Вы прагаласавалі?», % (адкрытае пытаньне)

| Варыянт адказу* | 04'01 | 06'01 |
|---|---|---|
| А. Лукашэнка | 37.2 | 36.3 |
| М. Чыгір | 6.6 | 3.5 |
| С. Домаш | 2.7 | 3.1 |
| Н. Машэрава | | 2.1 |
| З. Пазьняк | 2.4 | 0.9 |
| С. Шушкевіч | 1.4 | 0.5 |
| У. Ганчарык | 1.3 | 1.0 |
| С. Гайдукевіч | 0.7 | 0.5 |

**Табліца 16.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Каго б Вы хацелі бачыць на пасадзе прэзыдэнта Беларусі?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| А. Лукашэнка | 36.7 |
| Аднаго з кааліцыі пяцёх дэмакратычных кандыдатаў (У. Ганчарык, С. Домаш, С. Калякін, П. Казлоўскі, М. Чыгір) | 17.6 |
| Кандыдата, вылучанага Каардынацыйнай радай дэмакратычных сілаў (КРДС) | 3.9 |
| Іншага кандыдата | 7.3 |
| ЦА/НА | 34.5 |

ную абстаноўку і мабілізаваць насельніцтва, дзеяньняў ад апазыцыі у выпадку парушэньняў на выбарах, гэтая бальшыня не чакала (гл. Таб. 18).

Такім чынам, становішча А. Лукашэнкі і ў пэрыяд падрыхтоўкі, і ў часе выбараў заставалася цалкам надзейным. Паводле вынікаў незалежных сацыялягічных апытаньняў, на працягу ўсяго пэрыяду падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў рэйтынг А. Лукашэнкі вагаўся ў межах траціны-паловы ад агульнае колькасьці выбарцаў. У сярэдзіне лета рэйтынг патэнцыйна адзінага апазыцыйнага кандыдата заставаўся ў межах аднае пятае ад агульнай колькасьці выбарцаў.

Аднак рэйтынг А. Лукашэнкі, які вагаўся ў папярэдні выбарам пэрыяд, усё ж такі істотна адрозьніваўся ад афіцыйных вынікаў галасаваньня, пададзеных Цэнтравыбаркамам, — тры чвэрці выбарцаў, што прыйшлі на ўчасткі. Улічваючы, што ў 1994 годзе ў першым туры прэзыдэнцкіх выбараў А. Лукашэнка атрымаў галасы 45% выбарцаў пры яўцы 79%, а ў 2001 годзе ў першым жа туры за яго прагаласавала ўжо 75,65% пры яўцы амаль у 84%, выходзіць, што рэйтынг беларускага прэзыдэнта за 7 гадоў кіраваньня ня зьнізіўся, а, наадварот, вырас. Але дадзеныя сацыялягічных апытаньняў сьведчылі адваротнае.

Такі высокі адсотак выбарцаў, якія прагаласавалі за А. Лукашэнку, быў неабходны беларускаму прэзыдэнту дзеля легітымізацыі, апраўданьня свайго знаходжаньня ўва ўладзе. Спасылкі на Канстытуцыю ставяцца пад пытаньне празь непрызнаньне міжнароднай суполь-

* Улучаныя тыя, хто атрымаў больш за 0.5% галасоў і згаданы ў апошнім апытаньні.

**Табліца 17.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне пра тое, за каго зь вядомых палітыкаў рэспандэнты гатовыя прагаласаваць на прэзыдэнцкіх выбарах, а за каго ня будуць галасаваць ні пры якіх абставінах, % (закрытае пытаньне)

| Варыянт адказу | Буду галасаваць | | Ня буду галасаваць | | Ня вызначыліся | | Прагноз | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 01'01 | 06'01 | 01'01 | 06'01 | 01'01 | 06'01 | 01'01 | 06'01 |
| А. Лукашэнка | 39.8 | 43.8 | 36.4 | 24.0 | 23.8 | 22.2 | 52.2 | 56.3 |
| Н. Машэрава | —* | 17.0 | —* | 39.9 | —* | 43.1 | —* | 29.9 |
| М. Чыгір | 17.9 | 17.1 | 45.1 | 45.0 | 37.0 | 37.9 | 28.4 | 27.5 |
| С. Домаш | 8.1 | 12.0 | 46.2 | 44.6 | 45.7 | 43.4 | 14.6 | 21.2 |
| У. Ганчарык | 10.1 | 10.3 | 45.2 | 18.0 | 14.7 | 11.7 | 18.3 | 17.7 |
| П. Казлоўскі | 4.8 | 6.1 | 48.8 | 47.4 | 46.4 | 46.5 | 9.0 | 11.4 |
| С. Калякін | 2.8 | 4.2 | 51.7 | 49.2 | 45.5 | 46.5 | 5.1 | 8.0 |
| Я. Крыжаноўскі | 4.3 | 4.1 | 47.7 | 50.0 | 48.0 | 45.9 | 8.3 | 7.6 |
| С. Гайдукевіч | 4.0 | 4.2 | 50.6 | 52.1 | 45.4 | 43.7 | 7.3 | 7.5 |
| З. Пазьняк | 6.3 | 5.0 | 59.7 | 62.7 | 34.0 | 32.3 | 9.5 | 7.1 |
| А. Ярашук | 2.6 | 2.3 | 49.2 | 49.2 | 48.2 | 48.5 | 5.0 | 4.5 |
| Л. Сініцын | 2.0 | 1.9 | 50.3 | 49.9 | 47.7 | 48.2 | 3.8 | 3.7 |

**Табліца 18.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі Вы палічыце, што вынікі прэзыдэнцкіх выбараў сфальсыфікаваныя, дык як хутчэй за ўсё Вы будзеце сябе паводзіць?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Пагаджуся зь імі, таму што іх ужо нельга будзе зьмяніць | 13.5 |
| Не паверу гэтым вынікам і буду вельмі засмучаны, але ў масавых акцыях пратэсту ўдзельнічаць не буду | 25.1 |
| Вазьму ўдзел у масавых акцыях пратэсту, каб паспрабаваць зьмяніць гэтыя вынікі | 10.2 |
| ЦА/НА | 51.2 |

насьцю Канстытуцыі 1996 году. Застаецца эксплюатаваць старую выпрабаваную ідэалягічную схему: прэзыдэнт, які абапіраецца беспасярэдне на народ. Дзеля гэтага была патрэбная ня проста перамога на выбарах, а перамога зь велізарнаю перавагай.

А. Лукашэнка, які заняў пасаду прэзыдэнта ў 1994 годзе на хвалі пратэставага галасаваньня і ня меў надзейнае апоры сярод прамыслова-фінансавай эліты, змушаны ўвесь час падтрымліваць свой імідж народнага кіраўніка, «усенароднага абранага» прэзыдэнта. Нават гарантаваная перамога, якая некалькімі адсоткамі перавышала 50-адсоткавы бар'ер, была недастатковаю дзеля падтрыманьня гэтага вобразу.

* У гэтым апытаньні дадзенае прозьвішча не прапаноўвалася.

# ВОНКАВАПАЛІТЫЧНЫЯ ФАКТАРЫ ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ

Міжнародная супольнасьць выступала на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. арбітрам, ад якога залежала прызнаньне альбо непрызнаньне іх вынікаў. Галоўнымі ўдзельнікамі выбараў ад замежнай грамадзкасьці для Беларусі былі наглядальнікі ад заходніх міжнародных арганізацыяў (АБСЭ, Эўразьвяз і ПАСЭ) ды краінаў СНД. Усяго на выбарах прысутнічала больш за 700, а па зьвестках Міністэрства замежных справаў Беларусі — каля 800 замежных наглядальнікаў і прыкладна столькі ж журналістаў. Палова наглядальнікаў працавала пад эгідай Бюро дэмакратычных інстытутаў і правоў чалавека АБСЭ і Асацыяцыі арганізатараў выбараў краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Другую палову склалі наглядальнікі ад СНД ды іншых краін, якіх запрасілі беларускія ўлады.

Пасьля выбараў меркаваньні назіральнікаў падзяліліся. Наглядальнікі ад СНД прызналі беларускія выбары дэмакратычнымі, іх калегі з Захаду — не.

## Захад і выбары прэзыдэнта ў Беларусі

Пагаршэньне адносінаў Беларусі з краінамі Захаду, запачаткаванае пасьля 1996 г., доўжылася да самых выбараў 2001 г. Ні на рэфэрэндум 1996 г., ні на парлямэнцкія выбары 2000 г. міжнародныя групы наглядальнікаў не дасылаліся. За выняткам прэзыдэнта Віетнаму і лідэраў краін СНД падчас кіраваньня прэзыдэнта Лукашэнкі Беларусь не наведаў з афіцыйным візытам ніводзін кіраўнік дзяржавы.

Заходнія місіі ў Беларусі прадстаўлены амбасадамі, прадстаўніцтвам праграмы TACIS, Кансультацыйна-назіральнай групай АБСЭ ды інш. Беларускі рэжым традыцыйна ўспрымае іх як фактар нестабільнасьці ўнутры краіны. У сакавіку 2001 г. была прынятая пастанова Савету міністраў № 325, якая ўскладніла парадак адкрыцьця і дзейнасьці ў Беларусі прадстаўніцтваў замежных фірмаў і арганізацыяў. Прадстаўнікі краінаў Захаду пэрыядычна абвінавачваліся ўва ўмяшаньні ўва ўнутраныя справы Беларусі. Так, напрыклад, 31 ліпеня на нарадзе выканаўчай улады А. Лукашэнка заявіў, што ўсю дзейнасьць апазыцыйных прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта каардынуе глава КНГ АБСЭ ў Беларусі Г.-Г. Вік, які да таго ж «начальнік штабу ўсёй беларускай апазыцыі».

Толькі пасьля перамогі на выбарах А. Лукашэнкі беларускі рэжым стаў намагацца нармалізаваць стасункі з Захадам. Адсутнасьць віншаваньняў у адрас А. Лукашэнкі з боку кіраўнікоў заходніх дзяржаваў міністар замежных справаў М. Хвастоў патлумачыў тым, што дзеля асэнсаваньня Захадам вынікаў выбараў і прыняцьця рашэньняў аб далейшым супрацоўніцтве зь Беларусяй патрэбны час. Сам А. Лукашэнка на прэс-канфэрэнцыі з нагоды пераабраньня паабяцаў за год-паўтара зьдзейсьніць прарыў у дачыненьнях з Захадам.

## Паўночнаатлянтычная асамблея

10 сакавіка 1992 г. Беларусь уступіла ў Раду Паўночнаатлянтычнага супрацоўніцтва НАТО

— кансультацыйны форум, створаны альянсам дзеля пашырэньня дыялёгу і супрацоўніцтва з былымі праціўнікамі НАТО — краінамі Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. У студзені 1995 г. Беларусь далучылася да Праграмы НАТО «Партнэрства дзеля міру». У сакавіку 1997 г. НАТО замарозіла адносіны зь Беларусяй з прычыны канстытуцыйнага перавароту лістапада 1996 году. Беларусь удзельнічала ў сустрэчах Рады эўраатлянтычнага партнэрства, але варожае стаўленьне беларускага прэзыдэнта да гэтае арганізацыі і ягоная арыентацыя на цесны вайсковы хаўрус з Расіяй замінала ўзаемнаму даверу.

## Арганізацыя па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе

30 студзеня 1992 г. Беларусь стала паўнапраўным чальцом Нарады па бяспецы й супрацоўніцтве ў Эўропе (НБСЭ, цяпер Арганізацыі па бясьпецы й супрацоўніцтве ў Эўропе, ці АБСЭ). Сяброўства ў АБСЭ вымагае выкананьня пэўных стандартаў, датычных унутранай палітыкі, у тым ліку правядзеньня ўсеагульных, роўных, справядлівых, тайных, свабодных, адкрытых ды адказных выбараў, як гэта абмоўлена пастановай Другой Капэнгагенскай нарады Канфэрэнцыі па чалавечым вымеры АБСЭ, праведзенай у 1990 г. Пасьля канстытуцыйнага перавароту 1996 г. кантакты Беларусі з гэтай арганізацыяй не спыніліся, але дзейнасьць у Менску КНГ АБСЭ і шэраг выпрацаваных ёй дакумэнтаў аб унутрыпалітычным становішчы ў Беларусі сталі прычынай непаразуменьня паміж АБСЭ і афіцыйным беларускім кіраўніцтвам. 22 лютага 2001 г., калі скончыўся тэрмін паўнамоцтваў Вярхоўнага Савету 13 скліканьня, Беларусь страціла прадстаўніцтва ў Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ. На сэсіі ПА АБСЭ 6–10 ліпеня прысутнічалі дзьве дэлегацыі — ад Нацыянальнага сходу і ад ВС 13 скліканьня. Абедзьве дэлегацыі прэтэндавалі на прадстаўніцтва Беларусі ў ПА АБСЭ. Нягледзячы на хадайніцтва дэпутатаў Дзяржаўнай Думы Расіі аб прызнаньні паўнамоцтваў дэпутатаў Нацыянальнага сходу, мандатная камісія Пастаяннага камітэту ПА АБСЭ не задаволіла заяўкі ніводнай зь беларускіх дэлегацыяў.

Беларусь стала першай краінай-чальцом АБСЭ, якая не накіравала запрашэньне наглядальнікам ад Бюро па дэмакратыі і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЭ. Пачатак работы БДІПЧ АБСЭ ў Беларусі быў заплянаваны на 1 жніўня, аб чым неаднаразова заяўлялася з 9 ліпеня. Тым ня менш, затрымкі з запрашэньнем і адмова ў выдачы візаў двум прадстаўнікам групы наглядальнікаў сарвалі доўгатэрміновае назіраньне БДІПЧ АБСЭ. У выніку зрыву доўгатэрміновага назіраньня БДІПЧ АБСЭ прадстаўнікі гэтае арганізацыі працавалі на беларускіх выбарах у складзе «Міжнароднай місіі па абмежаваным назіраньні за выбарамі» (ММАНВ), у якую ўвайшлі прадстаўнікі БДІПЧ АБСЭ й парлямэнцкай «тройкі», сфармаванай Парлямэнцкай Асамблеяй АБСЭ, Парлямэнцкай Асамблеяй Савету Эўропы ды Эўрапейскага парлямэнту. БДІПЧ АБСЭ было прадстаўлена 29 асобамі — прадстаўнікамі 20 дзяржаваў, зь якіх 16 прадстаўлялі СНД, Сярэднюю Эўропу ды балканскія краіны. Ацэньваючы вынікі галасаваньня, прадстаўнікі АБСЭ адзначылі, што назіраньне за выбарамі ў Беларусі мела вымушана абмежаваны характар і суправаджалася шматлікімі парушэньнямі з боку ўлады — ад нагляду за прэсай да ўціску на наглядальнікаў. Як адзначыў Гэрхард Штудман, БДІПЧ прыйшло да высновы, што працэс выбараў «не адпавядаў умовам АБСЭ што да дэмакратычнасьці выбараў». Апазыцыю ў шэрагах наглядальнікаў ад АБСЭ склалі ўкраінскія парлямэнтары, на думку якіх выбары прайшлі дэмакратычна і ў адпаведнасьці з заканадаўствам.

Афіцыйныя ж высновы АБСЭ, паводле словаў старшыні Прагрэсіўнай сацыялістычнай партыі Ўкраіны Н. Вітрэнкі, зьмяшчаюць не прававую, а палітычную ацэнку. Тым ня менш, 10 верасьня кіраўнік групы наглядальнікаў місіі АБСЭ Хрэер Бэйліян заявіў, што выбары прэзыдэнта Беларусі не былі ні дэмакратычнымі, ні свабоднымі, ні сумленнымі. Усе парушэньні, па ягоных словах, былі дапушчаныя ў перадвыбарны пэрыяд. Бэйліян заявіў, што самі выбары прайшлі «добра».

А. Лукашэнка, са свайго боку, імкнуўся зьвязаць праблему прызнаньня выбараў з боку АБСЭ з «падрыўной» дзейнасьцю старшыні КНГ АБСЭ Г.-Г. Віка. 4 верасьня на сустрэчы з выбарцамі А. Лукашэнка паабяцаў да сканчэньня выбараў «выправіць» Г.-Г. Віка зь Беларусі. Гэты намер ён пацьвердзіў у дзень выбараў у размове з кіраўніком місіі ПА АБСЭ Кімам Кільюнэнам. Але на прэс-канфэрэнцыі, прысьвечанай свайму пераабраньню на другі тэрмін, А. Лукашэнка заявіў, што, хаця ён і лічыць, што «кансультацыйна-назіральнай місіі АБСЭ ў Менску больш няма чаго рабіць», высылаць з краіны Г.-Г. Віка ён не зьбіраецца. Сьведчаньнем жаданьня афіцыйнага Менску палепшыць адносіны з АБСЭ стала заява міністра М. Хвастова аб тым, што беларускія ўлады расцэньваюць папярэднія высновы АБСЭ аб выбарах прэзыдэнта як «канструктыўны дакумэнт», які адкрывае магчымасьці для дыялёгу паміж Беларусяй і АБСЭ. На паседжаньні Пастаяннага камітэту Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ ў Лісабоне 9 кастрычніка Беларусь была прадстаўлена дэлегацыяй Нацыянальнага сходу пад кіраўніцтвам Мікалая Чаргінца, а таксама дэлегацыяй Вярхоўнага Савету на чале з Анатолем Лябедзькам. Пастанова аб наданьні Парлямэнцкай асамблеі беларускаму Нацыянальнаму сходу статусу «адмыслова запрошанага» прынятая не была.

## Злучаныя Штаты Амэрыкі

ЗША ёсьць краінай-удзельніцай АБСЭ. Найлепшым часам у адносінах паміж Беларусяй і ЗША быў люты 1993 г., калі Беларусь ратыфікавала дамову аб нераспаўсюджаньні ядравай зброі. Пасьля канстытуцыйнага перавароту 1996 г. ЗША абралі ў дачыненьні да Беларусі тактыку «выбіральнага» дыялёгу. Афіцыйныя прадстаўнікі ЗША падкрэсьлена ішлі на кантакт зь беларускімі дэмакратычнымі лідэрамі, незалежнымі СМІ і няўрадавымі арганізацыямі.

Напярэдадні выбараў беларускі рэжым пайшоў на разьдзьмуваньне скандалу, зачэпкай для якога сталі некаторыя выказваньні амэрыканскіх афіцыйных асобаў. 25 жніўня ў звароце да беларускага народу з нагоды дзесяцігодзьдзя незалежнасьці Беларусі дзяржаўны сакратар ЗША Колін Паўэл заявіў пра неабходнасьць выконваць стандарты, якія Беларусь узяла на сябе як членц АБСЭ й ААН. Паўэл сказаў, што беларускія ўлады ведаюць, якія канкрэтныя крокі яны павінны зрабіць, каб адпавядаць пагадненьням у рамках АБСЭ і каб вынікі будучых прэзыдэнцкіх выбараў былі прызнаныя сапраўднымі. М. Хвастоў пракамэнтаваў зварот дзяржсакратара ЗША як «грубае й простае ўмяшаньне ўва ўнутраныя справы Беларусі» і «асабісты падыход пасла Козака»[1]. Другі скандал быў зьвязаны з публікацыяй у брытанскіх газэтах «Times» і «Guardian» выказваньня М. Козака, які параўнаў палітыку ЗША ў Беларусі

[1] Гл. Стенограмма пресс-конференции заместителя премьер-министра — министра иностранных дел Республики Беларусь М.М. Хвостова для представителей белорусских и иностранных СМИ 6 сентября 2001 года [Электронная вэрсія]. Дакумэнт дасяжны па адрасе: http://www.mfa.gov.by/cgi-bin/mfa8.pl?year=2001&month=09&file=07_09_2001_(1).

па падтрымцы дэмакратычных ініцыятываў з падтрымкай «контрас» у Нікарагуа[2]. Гэта выклікала бурную рэакцыю ў беларускіх дзяржаўных СМІ.

Пазыцыя ЗША наконт вынікаў выбараў цалкам супала з высновамі БДІПЧ АСБЭ аб тым, што выбарчы працэс быў недэмакратычным. Аб гэтым заявіў прэс-сакратар Дзярждэпартамэнту ЗША Рычард Баўчар, а таксама намесьнік прэс-сакратара Дзярждэпартамэнту ЗША Філіп Рыкер. Паводле словаў Ф. Рыкера, выбары, якія не былі ні свабоднымі, ні дэмакратычнымі, ня могуць быць прызнаныя міжнароднай супольнасьцю.

## Парлямэнцкая асамблея савету эўропы

У 1992 г. Беларусь атрымала статус «адмыслова запрошанай» у Парлямэнцкай Асамблеі Савету Эўропы. З прычыны канстытуцыйнага перавароту ў студзені 1997 г. гэты статус быў страчаны. Тым ня менш, ПАСЭ працягвала накіроўваць у Беларусь свае дэлегацыі й прымаць дэлегацыі з Беларусі: як ад афіцыйных уладаў, так і ад апазыцыі.

У выніку візыту ў Беларусь, адбытага з 31 ліпеня па 3 жніўня 2001 г., старшыня палітычнага камітэту Парлямэнцкай Асамблеі Савету Эўропы Тэры Дэвіс заявіў, што ПАСЭ будзе назіраць за выбарамі толькі ў тым выпадку, калі БДІПЧ АБСЭ зможа своечасова і рэгулярна зьдзяйсьняць як кароткатэрміновае, так і доўгатэрміновае назіраньне. У адваротным выпадку ПАСЭ ня зможа скарыстацца запрашэньнямі на выбары, атрыманымі ад беларускіх афіцыйных асобаў. Прадстаўнік ПАСЭ атрымаў запрашэньне ад М. Хвастова 31 ліпеня разам з абяцаньнем даслаць запрашэньне для БДІПЧ у найбліжэйшы час, але дата не была ўдакладнена. Беларускія ўлады адаслалі афіцыйнае запрашэньне ў БДІПЧ, але толькі 17 жніўня, калі пачынаць праводзіць паўнавартае назіраньне было позна.

Наконт вынікаў выбараў ПАСЭ прытрымліваецца той пазыцыі, якая была сфармулявана Міжнароднай місіяй па абмежаваным назіраньні за выбарамі (ММАНВ), г.зн. не прызнае беларускія выбары дэмакратычнымі. На чарговай сэсіі, што адбывалася ў Страсбургу 24–28 верасьня, пытаньне пра аднаўленьне статусу Беларусі ў ПАСЭ было вырашана пазытыўна, але на аснове стратэгіі «крок за крокам». Як Камітэт міністраў, так і Парлямэнцкая асамблея Савету Эўропы выказалі жаданьне перагледзець палітыку ў дачыненьні Беларусі, калі для гэтага будуць належныя падставы. На сэсіі ў Страсбургу ПАСЭ зрабіла крок насустрач беларускім уладам, пановаму сфармуляваўшы ўмовы зьмяненьня сваёй палітыкі ў дачыненьні Беларусі. 21 верасьня Камітэт міністраў Савету Эўропы прыняў дакумэнт «Рэкамэндацыі 1441. Сытуацыя ў Беларусі», у якім былі згаданыя 5 пунктаў, выкананьне якіх прывядзе да нармалізацыі адносінаў:

— свабода слова;
— роўныя магчымасьці для правядзеньня выбарчых кампаніяў усімі кандыдатамі;
— перагляд функцыяў і паўнамоцтваў парлямэнту;
— вызваленьне палітвязьняў;
— маратор на сьмяротную кару.

Гэтыя патрабаваньні ёсьць памякчанымі ўмовамі «размарожваньня» статусу «адмыслова запрошанага», сфармуляванымі ПАСЭ для Беларусі 26 студзеня 2000 г.

2 Гл. Langado A. US adopts «Contras policy» in communist Belarus // The Times. September 03 2001. (http://www.thetimes.co.uk/article/0,,3-2001303768,00.html).

## Эўразьвяз

Па выбарах дэпутатка Эўрапарлямэнту Элізабэт Шродтэр у інтэрвію беларускай службе Радыё «Свабода» заявіла, што, на ейны погляд, выбары прайшлі спакойна, бязь яўных парушэньняў, пры высокай актыўнасьці выбарцаў. Між тым, паводле словаў кіраўніка вонкавапалітычнай камісіі ЭЗ Хаўера Саляны, пераабраньне А. Лукашэнкі прэзыдэнтам Беларусі «выклікае некаторыя пытаньні».

## Расія як фактар уплыву на прэзыдэнцкія выбары ў Беларусі

Падчас выбарчай кампаніі дэмакратычныя кандыдаты не атрымалі ніякай падтрымкі з боку Расіі. С. Домаш падчас візыту ў Маскву сустракаўся з Аркадзем Вольскім і Анатолем Чубайсам, але заручыцца іх падтрымкай ня змог. Ніводны з дэмакратычных кандыдатаў ня здолеў спаткацца з расійскім прэзыдэнтам, тым часам як, паводле зьвестак агенцыі «Франс Прэс», на працягу першых 9 месяцаў 2001 году А. Лукашэнка сустракаўся зь ім сем разоў. Апісаныя ў прэсе візыты ў Беларусь расійскіх палітыкаў і прамыслоўцаў, прадстаўнікоў тамтэйшых фінансава-прамысловых груповак засьведчылі, што ўсе яны мелі інтарэс толькі да існага рэжыму. Што да расійскага грамадзтва, то, паводле вынікаў апытаньня, праведзенага расійскім Фондам «Грамадзкая думка» ў пачатку верасьня 2001 г., толькі 30% жыхароў Расіі цікавіла, хто пераможа на прэзыдэнцкіх выбарах у Беларусі. Пры гэтым бальшыня расійскага грамадзтва аддае перавагу А. Лукашэнку. На думку 44% апытаных, для Расіі было б лепш, каб прэзыдэнтам Беларусі зноў абралі Лукашэнку, 36% не змаглі адказаць на пытаньне, а 20% меркавалі, што было б лепш, каб перамог іншы кандыдат. Увогуле, расіяне не праяўлялі асаблівага інтарэсу да прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. Паводле зьвестак Фонду «Грамадзкая думка» ды Ўсерасійскага цэнтру вывучэньня грамадзкай думкі, атрыманых у пачатку верасьня 2001 г., значная частка расіян (35–40%) была слаба дасьведчаная ў тым, як адбываецца выбарчая каманія ў Беларусі, і, адпаведна, не магла сказаць нічога пэўнага пра свае сымпатыі.

У. Пуцін павіншаваў А. Лукашэнку зь перамогай на выбарах за гадзіну да таго, як АБСЭ зрабіла свае высновы наконт прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі. У сваёй тэлеграме расійскі прэзыдэнт пацьвердзіў жаданьне Расіі прытрымлівацца ранейшага курсу на расійска-беларускую інтэграцыю.

Каб падсаладзіць пілюлю, некаторыя расійскія палітычныя сілы, у тым ліку інсьпіраваныя Крамлём, дэманстратыўна выказвалі сваю падтрымку апазыцыйнаму кандыдату. Напярэдадні выбараў У. Ганчарык атрымаў урадавую тэлеграму ад старшыні палітычнага савету партыі «Саюз правых сілаў» Барыса Нямцова. У асобе У. Ганчарыка Б. Нямцоў павітаў «намаганьні беларускай апазыцыі, скіраваныя на большую дэмакратызацыю беларускага грамадзтва». Пасьля выбараў Б. Нямцоў заявіў, што перамога Аляксандра Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах «не прынясе нічога добрага Беларусі». З асуджэньнем пазыцыі Расіі ў дачыненьні А. Лукашэнкі выступіў першы намесьнік фракцыі «Яблык» у Дзярждуме Расіі Сяргей Іваненка. На яго думку, беларускі прэзыдэнт ставіць барацьбу за ўладу вышэй за

інтарэсы расійска-беларускага саюзу і маўклівая падтрымка Масквой Лукашэнкі «стратэгічна няправільная».

## Палітычныя інтарэсы Расіі ў Беларусі

Беларусь важная для Расіі перадусім як адзіны геапалітычны хаўрусьнік. На тэрыторыі Беларусі разьмешчаны расійскія вайсковыя аб’екты. Яшчэ ў 1995 г. Расія падпісала зь Беларусяй пагадненьне аб парадку завяршэньня будаўніцтва, выкарыстаньня і ўтрыманьня сыстэмы папярэджаньня аб ракетным нападзе ў Баранавічах, а таксама аб утрыманьні й выкарыстаньні цэнтру сувязі ВМФ «Вялейка», які ўваходзіць у сыстэму сачэньня за падлодкамі. Тэрмін дзеяньня пагадненьня — 25 год.

Напярэдадні выбараў аб падтрымцы Масквой беларускага рэжыму ўлады ўскосна сьведчыла пастанова ўраду М. Касьянава даць Беларусі крэдыт у памеры 4,5 млрд. RUR для стабілізацыі беларускага рубля. Фармальна крэдыт быў выдадзены пры ўмове ўвядзеньня да 2005 г. расійскага рубля ў якасьці адзінай валюты для Расіі ды Беларусі з адзіным эмісійным цэнтрам у Маскве. 23 ліпеня першы транш у памеры 1,5 млрд. расійскіх рублёў быў пераведзены на рахунак Нацыянальнага банку Беларусі. Другая частка пазыкі (3 млрд. RUR) мае паступіць у распараджэньне Нацыянальнага банку Беларусі да канца 2001 г., калі будзе распрацавана праграма захадаў для ўвядзеньня супольнай грашовай адзінкі.

Пры поўнай палітычнай падтрымцы беларускага рэжыму Крэмль выяўляў прынцыповасьць у пытаньнях эканамічных адносінаў зь Беларусяй. Напярэдадні візыту беларускага прэзыдэнта ў Расію, што праходзіў 20–21 чэрвеня, Дума самастойна зацьвердзіла 24-адсоткавы падатак на прыбытак, праігнараваўшы жаданьне А. Лукашэнкі ўдзельнічаць у прыняцьці гэтага рашэньня. Ня мелі посьпеху перамовы аб бартэры і пастаўках Расіі сельскагаспадарчай тэхнікі, не атрымалася ў беларускага прэзыдэнта таксама пашырыць паўнамоцтвы «Саюзнай дзяржавы». Беларусь мае патрэбу ў павелічэньні паставак прыроднага газу ў наступным годзе, але падчас візыту ў Маскву была дасягнута толькі дамоўленасьць правесьці перамовы на ўзроўні «Газпрам» — «Белтрансгаз» увосені[3].

3 жніўня У. Пуцін заявіў, што Расія ня будзе ўмешвацца ўва ўнутраныя справы Беларусі ў сувязі з прэзыдэнцкімі выбарамі. Гэтае абяцаньне расійскага лідэра было *de facto* дэзавуяванае заявамі ў падтрымку А. Лукашэнкі такіх расійскіх палітыкаў, якія ў тым ліку маюць паўнамоцтвы выступаць ад імя расійскай дзяржавы, як Павал Барадзін, Генадзь Селязьнёў, Ягор Строеў, Юры Лужкоў, Аман Тулееў, Уладзімер Жырыноўскі, Генадзь Зюганаў і інш.

## Эканамічныя інтарэсы Расіі ў Беларусі

У агульным аб’ёме беларускага імпарту краіны СНД складаюць 71,3%, а Расія — 66,7%[4]. З студзеня 1995 г. паміж Беларусяй і Расіяй існуе мытны саюз, які дазваляе Беларусі ат-

3 Гриб Н. А. Лукашенко: «Что я имел, то и введу» // Белорусская газета. 25.06.2001, № (291). — С. 8.

4 Гл. Внешнеторговый оборот Беларусі в январе-июле с.г. [Электронная вэрсія]. Дакумэнт дасяжны па адрасе: http://www.mfa.gov.by/cgi-bin/mfa8.pl?year=2001&month=09&file=10_09_2001_(1).

рымліваць энэрганосьбіты фактычна па ўнутраных расійскіх цэнах. У лютым 1995 г. паміж краінамі падпісана дамова аб дружбе, добрасуседзтве і супрацоўніцтве, а таксама пагадненьне аб адзіным кіраваньні мытнымі службамі і сумеснай ахове межаў. Сёньня беларуска-расійская эканамічная інтэграцыя знаходзіцца ў стане паміж мытным саюзам і супольным рынкам.

Найбольшы інтарэс для расійскага капіталу ўяўляе беларускі нафтахімічны комплекс. Кантроль над ім дазваляе ўскосна кантраляваць усю прамысловасьць краіны. Пашырыць сфэру сваёй дзейнасьці ў Беларусі зьбіраецца нафтавая кампанія «Слаўнафта», якая ўдзельнічала ў фінансаваньні і мадэрнізацыі Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу, дзе перапрацоўваецца ейная вуглевадародная сыравіна. Пры ўдзеле «Слаўнафты» рэалізуецца праект здабычы нафты ў Ханты-Мансійскай аўтаномнай акрузе. Для гэтага было вырашана стварыць сумеснае расійска-беларускае прадпрыемства «Славянская нафтавая кампанія» (СНК), у якім 26% акцыяў належаць «Белнафтахіму», 24% — «Беларуснафце», а 50% — Ненецкай нафтавай кампаніі. СНК атрымала ліцэнзію на геалягічнае вывучэньне нетраў Лігінскага ўчастку на тэрыторыі Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі, і ў красавіку 2002 г. мяркуе разьведаць 450 км$^2$ яго тэрыторыі.

Кампанію «Ітэра», якая канкуруе з «Газпрамам» на беларускім рынку прыроднага газу, цікавяць Менскі аўтамабільны завод (МАЗ), Беларускі мэталюргічны завод (БМЗ) і Бярозаўская гідраэлектрастанцыя. На Другім Усебеларускім сходзе кіраўнік групы кампаній «Ітэра» І. Макараў заявіў, што «Ітэра» мае найбліжэйшым часам інвэставаць у беларускую эканоміку 200 млн. USD. Для дэманстрацыі сур’ёзнасьці сваіх намераў І. Макараў наведваў завод «Керамін» і канцэрн «Белэнэрга». На прадпрыемстве «Керамін» «Ітэра» зьбіраецца правесьці мадэрнізацыю, а пры дапамозе «Белэнэрга» мяркуе правесьці рэканструкцыю Бярозаўскай ГРЭС.

Па-ранейшаму трывалыя пазыцыі ў Беларусі захоўвае «Газпрам», які распачаў будаўніцтва новага газаправоду «Расія — Кобрынь — Вельке Капушаны (Славаччына)». На працягу трох апошніх год інвэстыцыі «Газпраму» ў газаправод «Ямал — Заходняя Эўропа», які праходзіць праз Беларусь, складалі каля 60% усяго аб’ёму простых інвэстыцыяў у беларускую эканоміку. «Газпрам» зацікаўлены ў акцыянаваньні «Белтрансгазу», які разьлічвае інтэграваць у сваю адзіную трубаправодную сыстэму.

Напярэдадні выбараў Беларусь наведвалі таксама прадстаўнікі расійскай кампаніі «Лукойл». У 1996 г. «Лукойл» й «Юкас» стварылі ў Беларусі сумесныя прадпрыемствы «Любел-Ойл» і «Росбелнафта». Напярэдадні выбараў кіраўнік «Лукойла» Вагіт Алекпераў сустрэўся з А. Лукашэнкам і тагачасным прэм’ер-міністрам У. Ярмошыным і прапанаваў свой інвэстыцыйны праект для беларускага нафтахімічнага комплексу. У прыватнасьці, Аляксераў выказаў жаданьне інвэставаць 100 млн. USD у Наваполацкае ВА «Палімір».

У галіне машынабудаўніцтва плянуецца зрэалізаваць праект стварэньня фінансава-прамысловай групы з удзелам беларускіх МАЗу і БелАЗу ды расійскага капіталу. Пасьля здабыцьця пакету акцыяў «Слаўнафты» ўзамен за перадачу Крамлю кантролю над тэлеканалам ОРТ зацікаўленасьць у рабоце Мазырскага нафтаперапрацоўчага заводу зьявілася ў расійскага алігарха Рамана Абрамовіча.

На прэс-канфэрэнцыі 27 жніўня кіраўнік выбарчай кампаніі У. Ганчарыка В. Лявонаў абнародаваў стэнаграму гутаркі, якая адбылася 19 сакавіка паміж кіраўніком «Сібірскага алюмінію» Алегам Дзерыпаскам, дырэктарам МАЗу Валянцінам Гурыновічам, губэрнатарам

Яраслаўскай вобласьці Анатолем Лісіцыным і беларускім віцэ-прэм'ерам Леанідам Козікам, на якой абмяркоўвалася передача «Сібалу» А. Дзерыпаскі кантролю над МАЗам. «Сібал» вядзе перамовы аб уключэньні МАЗу ў аўтапрамысловы холдынг разам з «УралАЗам» і Яраслаўскім маторным заводам. 12 верасьня ў Мінску з А. Лукашэнкам сустракаўся яраслаўскі губэрнатар Анатоль Лісіцын. Разам з прадстаўнічай дэлегацыяй Яраслаўскай вобласьці ў Беларусь прыбыў і кіраўнік «Сібірскага алюмінію» А. Дзерыпаска. Размова ішла пра ўваход Менскага аўтазавода ў склад холдынгу «РусПрамАўта», у тым ліку пра магчымасьць набыцьця «Сібалам» пакету акцыяў Менскага аўтазаводу.

## Садружнасьць незалежных дзяржаваў

Як палітычнае ўтварэньне СНД ня грае значнай ролі ў беларускай унутранай палітыцы. Гэта збольшага зьвязана са спэцыфікай сувязяў паміж краінамі Садружнасьці, дзе шматбаковыя пагадненьні маюць толькі рамкавы характар, а рэальнае супрацоўніцтва адбываецца на аснове двухбаковых дамоўленасьцяў. На прэзыдэнцкія выбары А. Лукашэнка запрасіў да назіраньня прадстаўнікоў усіх краін СНД. Місія назіральнікаў ад СНД у Беларусі налічвала 20 чалавек. Усе яны прызналі вынікі выбараў.

## Роля міжнароднай супольнасьці ў назіраньні за выбарамі

Міжнароднае назіраньне за выбарамі зьдзяйсьнялі Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЭ й Асацыяцыя арганізатараў выбараў краінаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы (ААВКЦУЭ). Місія БДІПЧ АБСЭ складалася з 10 чалавек ад місіі Эўрапарлямэнту, 57 чалавек ад місіі Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ і 12 чалавек уласна ад БДІПЧ. На двухбаковай аснове было запрошана 259 наглядальнікаў з 34 краін і 6 міжнародных арганізацыяў, у тым ліку 114 парлямэнтароў, якія прадстаўлялі больш за 20 краін і 5 міжнародных арганізацыяў. Калі БДІПЧ АБСЭ не прызнала прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі адпаведнымі сваім патрабаваньням, то папярэднія высновы ААВКЦУЭ былі менш катэгарычнымі.

18 ліпеня ААВКЦУЭ пачала ўласнае назіраньне, якое ўключала назіраньне за вылучэньнем ініцыятыўных групаў, зборам подпісаў у падтрымку кандыдатаў у прэзыдэнты, рэгістрацыяй, передвыбарнай агітацыяй у СМІ, галасаваньнем і падвядзеньнем вынікаў. На апошнім этапе ў склад ААВКЦУЭ ўвайшлі 64 асобы з 10 краінаў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропы, а таксама ЗША. У папярэдняй справаздачы, падрыхтаванай 10 верасьня, місія ААВКЦУЭ адзначыла «дэфіцыт плюралізму й празрыстасьці» прэзыдэнцкіх выбараў, а таксама тое, што «ў шэрагу выпадкаў не былі рэалізаваныя дэмакратычныя ўмовы арганізацыі выбарчага працэсу». Пры гэтым яна прыняла папярэднія вынікі выбараў, абвешчаныя беларускім Цэнтравыбаркамам. Памяркоўнасьць ААВКЦУЭ ў ацэнцы беларускіх выбараў можна патлумачыць мяккасьцю патрабаваньняў гэтай арганізацыі ў дачыненьні дэмакратычнасьці выбараў у параўнаньні з АБСЭ, а таксама тым, што ключавую ролю ў ейнай дзейнасьці гралі выбарчыя камісіі Расіі ды Ўкраіны.

# УНУТРАНАЕ НАЗІРАНЬНЕ ЗА ПРЭЗЫДЭНЦКІМІ ВЫБАРАМІ

## Арганізацыйная структура незалежнага грамадзкага назіраньня

Падмурак сыстэмы незалежнага грамадзкага назіраньня складалі дзьве структуры: 1) Цэнтральная каардынацыйная рада па назіраньні за выбарамі (далей — ЦКР) і 2) ГА «Праваабарончы цэнтар «Вясна». У сваю чаргу ў ЦКР уваходзілі некалькі грамадзкіх аб'яднаньняў: 1) ГА «Беларускі рэспубліканскі клюб выбарцаў», 2) РГА «Беларускі Гельсынскі камітэт», 3) «Свабодны прафсаюз беларускі», 4) РГА «Фонд імя Лява Сапегі», 5) ГА «Беларускі жаночы інфармацыйна-каардынацыйны цэнтар», 6) ГА «Цэнтар «Беларуская ініцыятыва» і 7) аргкамітэт «Руху за дэмакратычныя і свабодныя выбары». ЦКР была створана ўвосень 1999 году і мела досьвед назіраньня за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў. Нягледзячы на тое, што ў ЦКР на правах чальца ўваходзіла РГА «БГК», гэта арганізацыя трымалася асобна і разам з агульнай рэалізоўвала таксама й сваю ўласную праграму назіраньня.

На пачатку 2001 году публічна заявіла пра сваё жаданьне наладзіць самастойнае назіраньне за прэзыдэнцкімі выбарамі «Асацыяцыя грамадзкіх аб'яднаньняў «Асамблея» (кіраўнік А. Бяляцкі). Блізу двухсот арганізацыяў, што ўваходзяць у Асамблею, падтрымалі ўдзел у назіраньні, у тым ліку Грамадзкае аб'яднаньне «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», Рэспубліканскае маладзёвае аб'яднаньне «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў», Грамадзкае аб'яднаньне «Праваабарончы цэнтар «Вясна», Грамадзкае аб'яднаньне «Прававая дапамога насельніцтву», Грамадзкае аб'яднаньне «Цэнтар па правах чалавека».

Імкнучыся не дапусьціць стварэньня паралельных структураў у сыстэме грамадзкага назіраньня, ЦКР ініцыявала перамовы з Асамблеяй, якія завяршыліся ўвесну 2001 году падпісаньнем пагадненьня аб стварэньні адзінае сыстэмы незалежнага грамадзкага назіраньня. Свой унёсак у дасягненьне гэтае дамоўленасьці зрабіў кіраўнік КНГ АБСЭ ў Менску пасол Ганс-Георг Вік.

Адзіная сыстэма грамадзкага незалежнага назіраньня атрымала назву Грамадзянская ініцыятыва «Незалежнае назіраньне» (далей — ГІ «НН»). Арганізатары ГІ «НН» не палічылі неабходным падаваць дакумэнты на рэгістрацыю ў Міністэрства юстыцыі. Кіраўнікамі ГІ «НН» былі два сустаршыні: М. Грыб — фактычны кіраўнік ЦКР і А. Бяляцкі — кіраўнік Асамблеі і ГА «Праваабарончага цэнтру «Вясна».

Сваімі галоўнымі заданьнямі ГІ «НН» абвясьціла: 1) стварэньне моцнай дзеяздольнай сеткі незалежнага непартыйнага назіраньня за выбарамі на тэрыторыі ўсяе краіны, 2) забесьпячэньне дэмакратычнасьці, адкрытасьці, публічнасьці і празрыстасьці выбарчага працэсу і 3) інфармаваньне беларускай грамадзкасьці і міжнароднай супольнасьці пра сапраўдныя вынікі галасаваньня.

Пра сваю зацікаўленасьць ува ўдзеле ў працы ГІ «НН» заявіла Фэдэрацыя прафсаюзаў беларуская. Гэта было зьвязана з тым, што У. Ганчарык, старшыня гэтага найбуйнейшага ў краіне прафаб'яднаньня, зьбіраўся вылучаць сябе ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты. Аднак

ФПБ ня стала паўнапраўным сябрам ГІ «НН», а абмежавалася статусам назіральніка. Пра сваю падтрымку ГІ «НН» заявілі і іншыя меркаваныя дэмакратычныя кандыдаты ў прэзыдэнты, але рэальнага ўдзелу ў працы па стварэньні сыстэмы назіраньня ніхто зь іх ня браў.

Па аналёгіі з цэнтрам ува ўсіх абласьцях і г. Менску, а таксама практычна ўва ўсіх раёнах і найбуйнейшых гарадох былі створаныя рэгіянальныя структуры ГІ «НН», якія ачольвалі два каардынатары (фармальна адзін зь іх быў кіраўніком, другі — ягоным намесьнікам). Пры ГІ «НН» была створана прэс-служба (кіраўнік Тацяна Равяка), сайт у Інтэрнэце і юрыдычная служба (кіраўнік Валянцін Стэфановіч).

Удзельнікі ГІ «НН» дамовіліся пра ўніфікацыю ўсіх дакумэнтаў, якія выкарыстоўвалі ў сваёй працы назіральнікі, арганізавалі выпуск уласнае сымболікі і двух даведнікаў для назіральнікаў. Адзін з даведнікаў прызначаўся для доўгатэрміновых унутраных назіральнікаў (пад рэдакцыяй Міхася Плiскі), другі — для назіральнікаў, якія пачыналі сваю працу зь першага дня датэрміновага галасаваньня (пад рэдакцыяй Мечыслава Грыба, Уладзімера Гудзеева і Міхася Пліскі).

Падрыхтоўка назіральнікаў вялася на сэмінарах, якія праводзіліся спэцыялістамі з практычным досьведам назіраньня за выбарамі. Усім удзельнікам сэмінараў раздавалі пакет мэтадычных і навучальных матэрыялаў.

Да ключавых постацяў у сыстэме грамадзкага назіраньня за выбарамі, якія рабілі вызначальны ўплыў на прыняцьцё рашэньняў, а таксама вялі беспасярэднюю арганізацыйную працу, трэба аднесьці двух сустаршыняў ГІ «НН» — Мечыслава Грыба і Алеся Бяляцкага, а таксама старшыняў ГА «Беларускі рэспубліканскі клюб выбарцаў» У. Гудзеева і РГА «БГК» Тацяну Процьку.

## Канцэпцыя незалежнага назіраньня

У дзеяньнях ЦКР і Асамблеі можна было прасачыць барацьбу дзьвюх, хаця і падобных, але ўсё ж розных канцэпцый грамадзкага назіраньня.

Адна з гэтых канцэпцый — яна ў большай ступені характэрная для дзейнасьці ЦКР — была заснаваная на палажэньні, што назіральнік ня ёсьць беспасярэднім удзельнікам выбарчага працэсу, а значыць, і ня мае права ўмешвацца ў ход выбараў. Таму заданьне назіральніка зводзіцца адно да фіксаваньня парушэньняў, якія робяць у сваёй дзейнасьці ўсе суб'екты выбарчага працэсу. Прыхільнікі гэтага падыходу ўвесь час падкрэсьлівалі сваю роўнааддаленасьць як ад уладаў, гэтак і ад структураў палітычнае апазыцыі. У прэсе М. Грыб заяўляў, што сыстэма назіраньня ЦКР ёсьць незалежнай сыстэмай назіраньня, што яна не перакрыжоўваецца з партыйнымі сыстэмамі назіраньня і сыстэмамі назіраньня кандыдатаў у прэзыдэнты. На практыцы гэтае цьверджаньне не адпавядала рэчаіснасьці. Касьцяк сыстэмы грамадзкага назіраньня якраз і складаўся з назіральнікаў, якія былі чальцамі апазыцыйных палітычных партыяў. Практычна ўсе абласныя, раённыя і гарадзкія каардынатары сыстэмы грамадзкага назіраньня былі адначасова й лідэрамі структуры якой-небудзь апазыцыйнай палітычнай партыі.

Гэты падыход да грамадзкага назіраньня канцэптуальна супадаў з падыходам да назіраньня, які быў характэрны для міжнародных назіральнікаў АБСЭ. Для назіральнікаў АБСЭ ён і ня мог быць іншым — у адваротным выпадку іх маглі б абвінаваціць ува ўмяшальніцтве ўва

ўнутраныя справы той ці іншай краіны і пазбавіць акрэдытацыі. Таму іх дзейнасьць у краіне знаходжаньня, як правіла, абмяжоўваецца выключна фіксацыяй парушэньняў у часе выбараў, і затым на падставе гэтай ацэнкі робяцца высновы пра ступень дэмакратычнасьці выбараў. Да прыхільнікаў такога падыходу можна залічыць і кіраўніка КНГ АБСЭ ў Менску пасла Г.-Г. Віка.

Другі падыход да сутнасьці грамадзкага назіраньня быў заснаваны на больш актыўным удзеле назіральніка ў выбарчым працэсе. Яго прыхільнікі лічылі, што назіральнік павінен ня толькі фіксаваць парушэньні выбарчага заканадаўства, але й намагацца прадухіляць парушэньні. Калі прыхільнікі першага падыходу, кажучы пра дзейнасьць назіральнікаў, стараліся пазьбягаць слова «кантроль», дык прыхільнікі актыўнага супрацьдзеяньня парушальнікам закону разьмясьцілі яго на сымболіцы ГІ «НН», што стала прычынай заўзятае дыскусіі на адным з сумесных паседжаньняў ЦКР і Асамблеі. Прыхільнікі гэтага падыходу разумелі, што ў часе гэтых выбараў улада не зьбіраецца выконваць дэмакратычныя стандарты. Таму яны не баяліся афішаваць свае сувязі з апазыцыйнымі палітычнымі партыямі (напрыклад, правесьці сваё паседжаньне ў штаб-кватэры БНФ) і разумелі, што немагчыма стварыць разгалінаваную сыстэму грамадзкага назіраньня бязь іх дапамогі і ўдзелу ў ёй чальцоў беларускіх партыяў.

Безумоўна, ня варта перабольшваць значэньне гэтых канцэптуальных разыходжаньняў. Бальшыня назіральнікаў не заглыблялася ў тэарэтычныя пабудовы, тым больш, што сваімі рашучымі дзеяньнямі, накіраванымі супраць самой ідэі незалежнага назіраньня, улада нівэлявала адрозьненьні ў падыходах і не давала ім вырасьці ў сур’ёзныя арганізацыйныя разыходжаньні паміж ЦКР і Асамблеяй.

## Барацьба ўлады зь незалежным грамадзкім назіраньнем

Галоўная стратэгія ўлады палягала ў тым, каб, распаўсюджваючы з дня ў дзень праз электронныя й друкаваныя СМІ розныя байкі пра назіраньне, запалохаць шараговых грамадзянаў і пазбавіць іх усялякага жаданьня стаць назіральнікамі. У чым толькі ні абвінавачвалі арганізатараў назіраньня і назіральнікаў. Найчасьцейшым абвінавачаньнем было называньне дзейнасьці па арганізацыі назіраньня «антыдзяржаўнай» і «антынароднай». Асабліва вядомым стала выказваньне А. Лукашэнкі, у якім ён параўнаў назіральнікаў з баевікамі. У адной зь перадачаў БТ (27 жніўня) лукашэнкаўскі прапагандыст Яўген Новікаў заклікаў кампэтэнтныя органы неадкладна арыштаваць усіх кіраўнікоў сыстэмы грамадзкага назіраньня. Трэба аддаць належнае ўладам: хаця й былі іх дзеяньні просталінейнымі, ім удалося прадухіліць масавае ўступленьне грамадзянаў у шэрагі назіральнікаў. У такіх умовах аб’явы, што рэгулярна публікаваліся ў незалежных СМІ, з заклікамі ўзяць удзел у назіраньні, не прынесьлі вялікага плёну. Агульная колькасьць назіральнікаў, што ўваходзілі ў сыстэму ГІ «НН», была не нашмат большай, чым на выбарах у Палату прадстаўнікоў, і ў выніку склала блізу 8 тысяч чалавек, г.зн. заплянаванае колькасьці ў 14 тысяч дасягнуць не ўдалося. Агулам, паводле словаў Лідзіі Ярмошынай, на 6700 выбарчых участках было акрэдытавана 21 887 назіральнікаў.

Адмысловае месца ў прапагандысцкай кампаніі ўладаў заняло змаганьне супраць спробаў ГІ «НН» арганізаваць паралельны падлік дадзеных пра вынікі галасаваньня. Арганізата-

ры сыстэмы назіраньня, а разам і ўся апазыцыя, былі абвінавачаныя ў прысваеньні функцыяў выбарчых камісіяў: маўляў, яны хочуць гэта зрабіць дзеля таго, каб сфальсыфікаваць вынікі выбараў і захапіць уладу. 3 верасьня пад эгідай праўрадавай Рэспубліканскай каардынацыйнай рады кіраўнікоў палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў адбылося паседжаньне круглага стала з дужа сымбалічным парадкам дня «Сацыяльныя й прававыя наступствы паралельнага падліку галасоў». На ім выступілі высокапастаўленыя прадстаўнікі пракуратуры, МУС, Міністэрства юстыцыі, Цэнтральнай выбарчай камісіі, якія ў адзін голас гаварылі пра незаконнасьць і недапушчальнасьць правядзеньня паралельнага падліку галасоў. Рэпартаж з гэтага круглага стала ў адпаведнай танальнасьці быў паказаны па тэлебачаньні. Раней, 16 жніўня, Міністэрства юстыцыі выступіла нават з адмысловай заявай, у якой папярэдзіла кіраўнікоў ГІ «НН» пра недапушчальнасьць дзейнасьці ад імя незарэгістраванае арганізацыі і правядзеньня паралельнага падліку галасоў.

Насамрэч ніхто з арганізатараў назіраньня й ня думаў прысвойваць функцыі ўчастковых камісіяў. Гаворка йшла не пра наладжаньне сыстэмы паралельнага падліку галасоў, а адно пра вызначэньне агульных вынікаў выбараў на падставе сумаваньня дадзеных, якія ўтрымліваліся ў зыходных (першасных) пратаколах участковых камісіяў. Арганізатары сыстэмы назіраньня мелі ўсе падставы меркаваць (пра гэта сьведчыў досьвед назіраньня за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў), што на этапе перадачы выніковых пратаколаў з участковых у тэрытарыяльныя камісіі адбываецца іхная фальсыфікацыя, то бок замена адных вынікаў іншымі, выгаднымі для існуючага рэжыму. Разумеючы, што ў сьціслыя тэрміны атрымаць неабходныя дадзеныя з усіх выбарчых участкаў практычна немагчыма, кіраўніцтва ГІ «НН» вырашыла спрасьціць заданьне й абмежавацца зборам дадзеных толькі зь некаторых зь іх, якія можна было б потым экстрапаляваць на ўсю краіну. З гэтай мэтай па рэпрэзэнтацыйнай выбарцы былі абраныя 500 участкаў, якія прапарцыйна прадстаўлялі гарадзкія, сельскія й закрытыя ўчасткі ўва ўсіх рэгіёнах краіны. Гэтая мэтодыка дазваляла вызначыць вынікі выбараў з хібнасьцю, якая не перавышала 2%. У тым выпадку, калі б зьвесткі з гэтых участкаў істотна адрозьніваліся ад афіцыйных, гэта магло служыць доказам магчымых фальсыфікацыяў. Такая мэтодыка падліку галасоў ужывалася ў шмат якіх краінах — Украіне, Грузіі, Казахстане, Баўгарыі, Пэру, Філіпінах — і цалкам апраўдала сябе.

Побач з выключна прапагандысцкімі прыёмамі ўлады выкарыстоўвалі і іншыя спосабы барацьбы зь незалежнымі назіральнікамі. Напярэдадні датэрміновага галасаваньня сярод чальцоў выбарчых камісіяў сталі распаўсюджваць адмысловыя мэтадычныя дапаможнікі, у якіх знаходзіліся рэкамэндацыі па супрацьдзеяньні працы грамадзкіх назіральнікаў. Натуральна, што гэтая літаратура выдавалася ананімна й ня мела ніякіх выходных зьвестак.

Адна з такім мэтадычных рэкамэндацыяў называлася «Пра тактыку нэўтралізацыі дзейнасьці «незалежных» назіральнікаў». У прыватнасьці, яна прапаноўвала старшыням камісіяў вызначаць такія месцы для назіральнікаў, якія б «не дазволілі весьці паўнавартаснага назіраньня», старшыні камісіяў павінны былі супрацьдзеяць ня ўсім назіральнікам, а, у першую чаргу, найбольш актыўным зь іх. У іншай, такога ж тыпу, брашуры зьмяшчаліся ня толькі «каштоўныя» парады па нэўтралізацыі назіральнікаў, але й адкрыта перакручваўся зьмест некаторых артыкулаў Выбарчага кодэксу, датычных назіраньня (прадстаўнікі СМІ ня маюць права назіраць за ўчастковымі камісіямі, а назіральнікі — права прысутнічаць пры падліку галасоў) і працэдуры галасаваньня (падставай для датэрміновага галасаваньня ёсьць адпачынак).

На выбарах у Палату прадстаўнікоў улада ўпершыню арганізавала прысутнасьць на выбарчых участках назіральнікаў, ляяльных існуючаму рэжыму. На прэзыдэнцкіх выбарах гэты досьвед атрымаў паўсюднае разьвіцьцё. У якасьці арганізацыяў, якія маглі накіроўваць «правільных» назіральнікаў, былі вызначаныя БПСМ (у розгар выбарчай кампаніі гэта арганізацыя ў прапагандысцкіх мэтах заявіла, што накіруе для назіраньня 26 000 чалавек), праўрадавыя палітычныя партыі і вэтэранскія арганізацыі.

У барацьбе зь незалежным назіраньнем улады ня грэбавалі і выключна адміністрацыйнымі захадамі. Напярэдадні датэрміновага галасаваньня па Беларусі прайшла хваля пагромаў сядзібаў грамадзкіх аб’яднаньняў, якія былі ўдзельнікамі сыстэмы незалежнага назіраньня — ГА «Беларускі рэспубліканскі клюб выбарцаў», РГА «Фонд імя Лява Сапегі», РГА «Беларускі Гельсынскі камітэт» і інш. Праверка інфармацыі пра «факты парушэньняў у сфэры прадпрымальніцтва і падаткаабкладаньня» супрацоўнікамі дзяржаўнага камітэту фінансавых расьсьледаваньняў, як правіла, заканчвалася канфіскацыяй кампутараў, факсавых апаратаў і размнажальнае тэхнікі, а нярэдка й апячатваньнем памяшканьняў, якія арандавалі праваправыя арганізацыі. У дзень выбараў да гэтых захадаў дадаліся новыя: былі адключаныя кватэрныя тэлефоны ў актывістаў сыстэмы незалежнага назіраньня і тэлефоны іхных сядзібаў. Была блякаваная праца сайту й электроннае пошты ГІ «Незалежнае Назіраньне».

Своеасаблівым апатэозам у барацьбе зь незалежным назіраньнем стала пастанова Цэнтральнае камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў аб скасаваньні акрэдытацыі ўсіх назіральнікаў, накіраваных ГА «Праваабарончы цэнтар «Вясна». Гэтая пастанова прымалася ўдзень 8 верасьня, то бок у дзень, папярэдні галасаваньню. Увадначасьсе блізу 2 тысячаў назіральнікаў пазбавіліся магчымасьці зьдзяйсьняць назіраньне 9 верасьня. Акрамя гэтага ў Гарадзенскай вобласьці ў дзень галасаваньня з ініцыятывы абласное тэрытарыяльнае камісіі не дапусьцілі да назіраньня ўсіх назіральнікаў, накіраваных РГА «Фонд імя Лява Сапегі».

## Вынікі і значэньне незалежнага грамадзкага назіраньня

Заданьні, якія ставіла перад сабой ГІ «НН», — стварэньне дзеяздольнай сеткі назіраньня й забесьпячэньне дэмакратычнасьці, адкрытасьці, публічнасьці і празрыстасьці выбарчага працэсу — выкананыя не былі.

ГІ «НН» не ўдалося атрымаць верагодных і дакладных дадзеных, якія б сьведчылі пра ход галасаваньня і сапраўднае волевыяўленьне беларускіх выбарцаў. Пра гэта сьведчыць разнабой у дадзеных пра вынікі галасаваньня, якія прыводзіліся ўдзельнікамі сыстэмы незалежнага назіраньня. Напрыклад, прэс-служба ГІ «НН» заявіла 9 верасьня, што паралельны падлік дадзеных, якія былі сабраныя з 415 выбарчых участкаў, паказаў, што ў датэрміновым галасаваньні ўзялі ўдзел не 14,6% выбарцаў, як гэта прагучала ў афіцыйных зьвестках, а больш за 17%. Праз некалькі дзён М. Грыб назваў лічбу ў 20%, а пазьней яна вырасла да 25–30%. Лідэрам па колькасьці выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова, у вэрсіі ГІ «Незалежнае Назіраньне», была Віцебская вобласьць, а абсалютным рэкардсмэнам — Дубровенскі раён гэтае вобласьці, у якім такіх выбарцаў было больш за 50%.

У дні датэрміновага галасаваньня назіральнікі неаднаразова сьведчылі факты ўскрыцьця выбарчых скрынак. Гэта магло азначаць замену адных бюлетэняў на іншыя, напрыклад,

бюлетэні «за» У. Ганчарыка маглі быць замененыя бюлетэнямі «за» А. Лукашэнку. Практычна заўсёды пры падліку бюлетэняў з выбарчых скрыняў для датэрміновага галасаваньня суадносіны галасоў былі на карысьць А. Лукашэнкі. Звычайна ня менш за 80%, а часам і ўсе 100% выбарцаў выказваліся ў ягоную падтрымку, нават калі пры галасаваньні на выбарчым участку бальшыню галасоў атрымліваў У. Ганчарык. У якасьці прыкладу можна прывесьці выбарчы ўчастак № 4 Першамайскага раёну г. Менску: тут адсотак выбарцаў, якія пры датэрміновым галасаваньні прагаласавалі за А. Лукашэнку, быў роўны 89,6, а ў дзень выбараў — 38, а за У. Ганчарыка адпаведна — 4,7 і 48,8.

Несумненна, улады наўмысна занізілі адсотак выбарцаў, якія ўзялі ўдзел у датэрміновым галасаваньні. На думку ўладаў, гэта павінна было павялічыць значнасьць перамогі А. Лукашэнкі на выбарах: маўляў, нават калі адняць адсотак выбарцаў, што прагаласавалі датэрмінова (14,6%) ад агульнае колькасьці галасоў, аддадзеных за яго (75,65%), дык гэтая лічба ўсё адно будзе большай за 50%.

Хаця, паводле заяваў кіраўнікоў ГІ «НН», у дзень выбараў назіраньне вялося прыблізна на 70% выбарчых участкаў, атрымаць якія-колечы верагодныя дадзеныя не ўдалося. Выступаючы 12 верасьня на прэс-канфэрэнцыі па выніках незалежнага назіраньня, старшыня РГА «Беларускі Гельсынскі камітэт» Т. Процька заявіла, што «ў гэтых выбараў няма выніку. Улада сарвала ня толькі назіраньне, але й самі выбары». Па словах У. Ганчарыка, ён атрымаў на выбарах каля 40% галасоў, а А. Лукашэнка — каля 46%.

Нягледзячы на тое, што ў часе назіраньня не ўдалося разьвязаць заданьні, якія перад сабой ставілі яе кіраўнікі, дзейнасьць арганізацыяў, што ўваходзілі ў ГІ «НН», зрабіла вялікі ўплыў на ход выбарчае кампаніі. Настойлівае імкненьне ГІ «НН» наладзіць сыстэму незалежнага назіраньня змушала ўлады ісьці на яўныя парушэньні выбарчага заканадаўства, якія сьведчылі пра тое, што мінулыя выбары не былі адкрытымі й дэмакратычнымі. У выніку, рэжыму так і не ўдалося дамагчыся вырашэньня галоўнага для сябе заданьня: міжнароднага прызнаньня вынікаў выбараў, а значыць, і легітымацыі ўлады А. Лукашэнкі.

## ПАРУШЭНЬНІ ВЫБАРЧАГА ЗАКАНАДАЎСТВА ПАДЧАС ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ І ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ

### Парушэньні, зьдзейсьненыя Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў

Усе парушэньні, якая дапускала ў сваёй дзейнасьці Цэнтральная камісія па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў (далей ЦВК), цяжка пералічыць праз іх вялікую колькасьць. Таму спынімся адно на некаторых зь іх — найбольш істотных, якія парушалі правы альтэрнатыўных А. Лукашэнку кандыдатаў у прэзыдэнты і рабілі больш закрытым і непразрыстым выбарчы працэс.

Дзейная Канстытуцыя прадугледжвае, што адзін і той самы грамадзянін можа быць прэзыдэнтам ня болей за два тэрміны. На думку шматлікіх юрыстаў, ЦВК, зарэгістраваўшы 14

жніўня 2001 году А. Лукашэнку ў якасьці аднаго з кандыдатаў у прэзыдэнты, тым самым парушыла Асноўны Закон краіны, паколькі гэта дало яму магчымасьць балятавацца на трэці тэрмін. Сапраўды, адлік першага прэзыдэнцкага тэрміну А. Лукашэнкі пачаўся ў 1994 годзе. Новая рэдакцыя Канстытуцыі пачала адлік ягонага другога тэрміну. Пра гэта дастаткова ясна гаворыцца ў разьдзеле IX «Заключныя і пераходныя палажэньні». Аднак ЦВК ня стала разьбірацца ў юрыдычных нюансах і зьвяртацца ў Канстытуцыйны Суд па неабходныя тлумачэньні. Гэты юрыдычны «гордзіеў вузел» яна разьвязала проста — зарэгістравала А. Лукашэнку як кандыдата ў прэзыдэнты.

17 жніўня 2001 году ЦВК, нягледзячы на арт. 45 Выбарчага кодэксу, прыняла пастанову, якая забараняла правядзеньне сустрэчаў з выбарцамі на адкрытым паветры бяз санкцыяў мясцовых выканаўчых органаў улады. Гэта азначала, што з гэтага часу кандыдаты ў прэзыдэнты мусілі за 15 дзён да правядзеньня якой-колечы сустрэчы зьвяртацца па дазвол у мясцовы выканкам. Калі ўлічыць, што за пяць дзён да выбараў, г.зн. з 4 верасьня пачыналася датэрміновае галасаваньне, дык фактычна гэтая пастанова пакідала кандыдату ў прэзыдэнты толькі пяць дзён на сустрэчы з выбарцамі. Акурат за парушэньне гэтае пастановы — правядзеньне сустрэчы з выбарцамі на Кастрычніцкім пляцы ў Менску 2 верасьня — ЦВК зрабіла У. Ганчарыку папярэджаньне.

У адпаведнасьці з арт. 45 Выбарчага кодэксу на ўсю выбарчую кампанію кандыдаты ў прэзыдэнты атрымлівалі ад дзяржавы ўсяго каля 12 тысячаў даляраў. Недахоп сродкаў мог быць кампэнсаваны выпускам агітацыйных матэрыялаў у падтрымку таго ці іншага кандыдата палітычнымі партыямі альбо грамадзкімі аб’яднаньнямі. Каб гэтага не дапусьціць, ЦВК 17 жніўня прыняла адмысловую пастанову, якая, парушаючы арт. 45 Выбарчага кодэксу, Законы «Аб палітычных партыях», «Аб грамадзкіх аб’яднаньнях», «Аб прафэсійных саюзах», забараняла выпуск літаратуры такога роду нават з указаньнем усіх прадугледжаных законам выходных дадзеных.

Нягледзячы на дакладнае патрабаваньне Выбарчага кодэксу (арт. 55, ч. 2) весьці падлік галасоў паасобку, у «Пратаколе ўчастковай выбарчай камісіі аб выніках галасаваньня», які быў зацьверджаны ЦВК 8 чэрвеня, гэтае патрабаваньне праігнараванае. Камісіі вялі падлік бюлетэняў з усіх выбарчых скрынак разам, а не паасобку, што давала магчымасьць маніпуляваць ня толькі колькасьцю выбарцаў, але й вынікамі волевыяўленьня выбарцаў, якія галасавалі датэрмінова або паводле месца знаходжаньня. Праўда, 21 траўня 2001 году ЦВК адзначыла ў мэтадычных рэкамэндацыях для ўчастковых камісіяў, што «дадзеныя пра колькасьць бюлетэняў, што знаходзіліся ў кожнай са згаданых скрыняў для галасаваньня, і вынікі падліку галасоў усё ж павінны быць пазначаныя ў «рабочым пратаколе» паседжаньня ўчастковай камісіі». Аднак панятак «рабочы пратакол» у выбарчым заканадаўстве нідзе не ўжываецца. На запыт выбарчага штабу кандыдата ў прэзыдэнты У. Ганчарыка ў ЦВК — ці могуць зь ім азнаёміцца назіральнікі і ці будзе ягоная копія вывешвацца дзеля агульнага азнаямленьня, — быў дадзены адмоўны адказ.

8 верасьня, за дзень да галасаваньня, парушаючы дзейнае заканадаўства, ЦВК прыняла яшчэ дзьве пастановы. Адна зь іх датычыла дакумэнтаў, якія давалі права атрымаць бюлетэнь. Цяпер выбарцы маглі галасаваць, паказаўшы ня толькі пашпарт, але й любы іншы дакумэнт з фатаздымкам і прозьвішчам, імем і імем па бацьку. Цікава адзначыць, што 19 чэрвеня 2001 году, падчас збору подпісаў, ЦВК прыняла пастанову, трэці пункт якой абвяшчаў, што дакумэнтам, які замяняе пашпарт, зьяўляюцца: а) вайсковы білет для вайскоўцаў тэрміновае

службы і б) даведка, выдадзеная органамі ўнутраных справаў асобам, якія згубілі пашпарт або здалі яго на абмен.

Прынятая пастанова, па-першае, адкрыла шлях для ўдзелу ў галасаваньні замежным грамадзянам, у першую чаргу расійскім. Шмат хто зь іх жыў у інтэрнатах і меў пропуск, на якім быў фатаздымак і было пазначанае прозьвішча, а гэта мінімум, неабходны для атрыманьня выбарчага бюлетэню. Па-другое, пры жаданьні адзін і той самы чалавек мог некалькі разоў узяць удзел у выбарах, паколькі ў такога роду дакумэнтах, напрыклад, у пэнсійным пасьведчаньні, не пазначанае месца жыхарства. Таму выбарца мог патрабаваць унясеньня ягонага прозьвішча ў дадатковы сьпіс для галасаваньня на іншым участку, а пры жаданьні й прагаласаваць за іншага чалавека.

У другой пастанове ўтрымлівалася ўказаньне пра тое, каб тэрытарыяльныя і ўчастковыя камісіі скасавалі акрэдытацыю назіральнікаў, накіраваных грамадзкім аб'яднаньнем «Праваабарончы цэнтар «Вясна». У Выбарчым кодэксе ня згадваецца пра тое, што назіральнік можа быць пазбаўлены акрэдытацыі. Назіральнікаў, якія ўжо атрымалі акрэдытацыю, меў права выдаліць з памяшканьня для галасаваньня або з паседжаньня выбарчае камісіі толькі старшыня камісіі і толькі тады, калі назіральнікі мяшаліся ў працу выбарчае камісіі альбо сваімі дзеяньнямі перашкаджалі яе дзейнасьці.

Практыка прыняцьця ЦВК пастановаў, якія пярэчылі дзейнаму заканадаўству і здароваму сэнсу, сьведчыла пра тое, што яна кіравалася не законам, а палітычнай мэтазгоднасьцю. Да таго ж, усе гэтыя пастановы мелі не тлумачальны, а нормаўтваральны характар. Прымаць такога роду пастановы ЦВК ня мела права (арт. 33, ч. 1 Выбарчага кодэксу).

## Парушэньні пры фармаваньні выбарчых камісіяў

У Выбарчым кодэксе (арт. 11, ч.1) паказаныя чатыры суб'екты выбарчага права, якія маюць права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў: палітычныя партыі, грамадзкія аб'яднаньні, працоўныя калектывы, а таксама грамадзяне шляхам падачы заявы. Гэта азначае, што ў склад камісіі ў абавязковым парадку павінны ўваходзіць прадстаўнікі ўсіх вышэйпералічаных суб'ектаў, хай сабе і па адным. Аднак рэальны склад сфармаваных камісіяў сьведчыў пра адваротнае: у пераважнай бальшыні тэрытарыяльных камісіяў, не гаворачы пра ўчастковыя, увогуле не было прадстаўнікоў палітычных партыяў — ані праўрадавых, ані апазыцыйных. З больш чым 600 прадстаўнікоў ад палітычнае апазыцыі, вылучаных у склад тэрытарыяльных выбарчых камісіяў, ніхто так і ня быў уключаны ў іх склад.

Выканкамы, арганізуючы вылучэньне ў склад камісіяў зручных для сябе людзей ад працоўных калектываў і ад выбарцаў шляхам збору подпісаў, і тут парушылі закон, бо на практыцы гэта было не вылучэньне, а прызначэньне. Бальшыня будучых чальцоў камісіяў даведалася пра тое, што іх хацелі б бачыць у складзе камісій не на сходах працоўных калектываў, паколькі такія сходы не праводзіліся, і не ад выбарцаў у працэсе збору подпісаў, бо такі збор подпісаў ніхто не арганізоўваў, а ад свайго беспасярэдняга начальства. Гэта азначае, што ў бальшыні выпадкаў дакумэнты аб вылучэньні неабходных выканкамам чальцоў камісіяў былі проста сфальсыфікаваныя.

У адпаведнасьці з ч. 1 арт. 35 Выбарчага кодэксу суб'екты, якія маюць права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, могуць накіраваць у тэрытарыяльную альбо

ўчастковую камісію толькі аднаго свайго прадстаўніка. На мінулых выбарах гэтая норма закону груба парушалася мясцовымі органамі ўлады: пераважная бальшыня ўчастковых выбарчых камісіяў была сфармаваная з прадстаўнікоў аднаго й таго ж працоўнага калектыву.

Палата прадстаўнікоў, падыгрываючы прэзыдэнту, дужа доўга цягнула з абвяшчэньнем даты выбараў, і калі пастанова нарэшце была прынятая, дык на арганізацыю вылучэньня прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў засталося крыху больш за тыдзень. Палітычныя партыі, грамадзкія аб’яднаньні, працоўныя калектывы і выбарцы не змаглі за такі невялікі прамежак часу арганізаваць вылучэньне сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, тым больш, што ўзоры дакумэнтаў, якія пры гэтым неабходна было запаўняць, былі апублікаваныя не адначасова з абвяшчэньнем даты правядзеньня выбараў прэзыдэнта, а толькі на пяты дзень.

Такім чынам, залежнасьць старшыняў выканкамаў ад дзейнага галавы дзяржавы, недэмакратычнасьць парадку фармаваньня выбарчых камісіяў, а таксама парушэньні, якімі суправаджаўся працэс іх фармаваньня, дазволілі ўладам сфармаваць такія камісіі, якія былі гатовыя выканаць любую іх дырэктыву.

## Парушэньні ў пэрыяд збору подпісаў

Практычна ўсе ініцыятыўныя групы па зборы подпісаў былі зарэгістраваныя. Неадольных перашкодаў сябрам ініцыятыўных групаў, якія зьбіралі подпісы за дэмакратычных вылучэнцаў, улады не рабілі. У часе збору подпісаў парушэньні выбарчага заканадаўства праявіліся ў тым, што збор подпісаў у падтрымку А. Лукашэнкі паўсюдна зьдзяйсьняўся, у парушэньне Выбарчага кодэксу (арт. 61, ч. 8), адміністрацыяй прадпрыемстваў, арганізацыяў і ўстановаў з выкарыстаньнем службовага становішча, фактычна пад прымусам і ў працоўны час. У Гомельскай і асабліва ў Магілёўскай абласьцях былі адзначаныя выпадкі, калі супрацоўнікі МУС заміналі збору подпісаў за С. Домаша. У Клімавіцкім раёне Магілёўскай вобласьці ўлады патрабавалі ад некаторых сяброў ініцыятыўнай групы С. Домаша спыніць збор подпісаў пад пагрозай звальненьня з працы.

Непрыемнасьці чакалі меркаваных кандыдатаў у прэзыдэнты на этапе здачы падпісных лістоў у выбарчыя камісіі. Па-першае, шмат у якіх выканкамах улады з розных прычынаў адмаўлялі сьведчыць подпісы на падпісных лістах сяброў ініцыятыўных групаў, а па-другое, частка падпісных лістоў, аддадзеных у адпаведныя тэрытарыяльныя камісіі, бясьследна зьнікла.

## Парушэньні ў пэрыяд правядзеньня перадвыбарнай агітацыі

Ні на адным этапе выбарчае кампаніі не было столькі парушэньняў, як у часе перадвыбарнае агітацыі. Гэтыя парушэньні былі вынікам службовае залежнасьці галоўных рэдактараў дзяржаўных газэт і кіраўніцтва Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі ад аднаго з кандыдатаў у прэзыдэнты — А. Лукашэнкі. Нягледзячы на яўнае парушэньне дзейным прэ-

зыдэнтам ч. 2 арт. 73 Выбарчага кодэксу (прыцягненьне асобаў, якія знаходзяцца ў службовай або іншай залежнасьці, дзеля ажыцьцяўленьня ў працоўны час дзейнасьці, якая спрыяе абраньню прэзыдэнтам), ЦВК не зрабіла ніякіх захадаў супраць галоўнага парушальніка Выбарчага кодэксу.

Паводле дадзеных маніторынгу, праведзенага сацыямэтрычнай лябараторыяй «Новак» у пэрыяд з 23 ліпеня да 13 жніўня, 91% этэрнага часу, аддадзенага для сюжэтаў, зьвязаных з кандыдатамі ў прэзыдэнты, у перадачах навінаў на Беларускім тэлебачаньні і 99% на радыё былі прысьвечаны кандыдату ў прэзыдэнты А. Лукашэнку.

Аналягічную карціну можна было назіраць і ў друкаваных СМІ. Напрыклад, «Советская Белоруссия», дзяржаўная газэта з найвялікшым накладам, прысьвяціла 94,5% свае плошчы, прысьвечанай кандыдатам у прэзыдэнты, асьвятленьню дзейнасьці А. Лукашэнкі, «Рэспубліка» — 91%, «Народная газета» — 98%, «Звязда» — 98%, «7 дней» — 72%.

Імкнучыся захаваць манаполію на распаўсюджваньне інфармацыі, улады практыкавалі канфіскацыю накладаў незалежных газэтаў і забарону іх друку, калі ў іх утрымліваліся матэрыялы ў падтрымку У. Ганчарыка і супраць А. Лукашэнкі. Супрацоўнікі міліцыі, асабліва Магілёўскай і Гарадзенскай абласьцей, масава затрымлівалі актывістаў передвыбарнага штабу У. Ганчарыка і канфіскоўвалі ў іх афіцыйныя передвыбарныя плякаты, а часам ладзілі сапраўдныя напады на рэгіянальныя передвыбарныя штабы, як гэта было ў Магілёве 25 жніўня. Супрацоўнікам ЖЭСаў былі цішком дадзеныя ўказаньні зьдзіраць передвыбарныя плякаты У. Ганчарыка. У рэгіёнах органы выканаўчае ўлады распаўсюджвалі друкаваную тысячнымі накладамі, без указаньня выходных дадзеных, разнастайную агітацыйную літаратуру ў падтрымку А. Лукашэнкі (брашуры, буклеты, календары, плякаты, улёткі і да т.п.).

Публікуючы афіцыйны тэкст передвыбарнае праграмы А. Лукашэнкі, газэта «Советская Белоруссия» (21 жніўня) пайшла на беспасярэдняе парушэньне пастановы ЦВК «Аб вызначэньні парадку выкарыстаньня дзяржаўных сродкаў масавае інфармацыі». Замест прадугледжаных 9100 знакаў передвыбарная праграма А. Лукашэнкі налічвала 12 085. Прычым, нягледзячы на паказную гатоўнасьць ЦВК і дзяржаўных СМІ апублікаваць у павялічаным аб’ёме передвыбарную праграму У. Ганчарыка, гэта так і не было зроблена.

Апатэозам выкарыстаньня А. Лукашэнкам свайго службовага становішча сталі два наступныя захады.

З 3 да 5 верасьня 2001 году ўва ўсе паштовыя скрыні лістаношы бясплатна разьнесьлі газэту «Советская Белоруссия» (№ 255 за 5 верасьня 2001 г.), у якой, у парушэньне выбарчага заканадаўства, другі раз была надрукаваная передвыбарная праграма А. Лукашэнкі. Наклад газэты, афіцыйна паказаны ў выходных дадзеных, складаў 629 316 асобнікаў. Насамрэч ён быў роўны (прыблізна па колькасьці кватэраў) 3 млн. 780 тысячам. Натуральна, што выпуск гэтага нумару газэты ня быў аплачаны са сродкаў, якія былі афіцыйна прызначаныя А. Лукашэнку дзеля выданьня передвыбарных плякатаў (гэтых сродкаў не хапіла б нават для аплаты афіцыйна пазначанага накладу). Патрабаваньне У. Ганчарыка апублікаваць ягоную передвыбарную праграму ў гэтай самай газэце і такім самым накладам засталося без адказу.

4 верасьня 2001 году ў Палацы Рэспублікі праводзілася сустрэча А. Лукашэнкі з выбарцамі, якая трансьлявалася ў жывым этэры па радыё, а затым у запісе была двойчы паказаная па тэлебачаньні. Гэты выступ А. Лукашэнкі ня быў прадугледжаны графікам выступленьняў кандыдатаў у прэзыдэнты, які быў зацьверджаны ЦВК па выніках лёсаваньня, а значыць, меў

незаконны характар. Больш за тое, гэтая сустрэча праводзілася ў працоўны час, а яе ўдзельнікі (болей за 3 тысячы чалавек) былі бясплатна прывезеныя ў Менск на 80 аўтобусах і да пачатку сустрэчы накормленыя абедам. Выдаткі на яе правядзеньне па самых сьціплых падліках склалі больш за 14 млн. рублёў (10 000$).

Нягледзячы на тое, што Выбарчы кодэкс (арт. 47, ч. 2) забараняў кандыдату ў прэзыдэнты «ўзьдзейнічаць на грамадзянаў абяцаньнямі перадаць ім грашовыя сродкі, матэрыяльныя каштоўнасьці», А. Лукашэнка ўжываў гэты прыём на кожнай сустрэчы з працоўнымі калектывамі, якія штодзённа трансьляваліся па тэлебачаньні. Як правіла, гэта былі абяцаньні зьнізіць узровень падаткаў для гэтага канкрэтнага прадпрыемства, спрыяць у набыцьці новага абсталяваньня і да т.п. Своеасаблівым сымбалем раздачы абяцаньняў выбарцам стала карова, падораная А. Лукашэнкам аднаму з работнікаў саўгасу-камбінату «Мір» Баранавіцкага раёну.

Таксама ЦВК не зьвяртала ўвагі на факты агітацыі за А. Лукашэнку замежных грамадзянаў (Уладзімера Жырыноўскага, Генадзя Зюганава, Станіслава Гаварухіна, Надзеі Бабкінай і г.д.).

## Парушэньні ў пэрыяд правядзеньня датэрміновага галасаваньня

Выбарчы кодэкс (арт. 53, ч. 1) прадугледжвае, што ў датэрміновым галасаваньні могуць браць удзел адно тыя выбарцы, якія ў дзень выбараў ня маюць магчымасьці «знаходзіцца па месцы свайго жыхарства». Іншых падставаў для датэрміновага галасаваньня выбарчае заканадаўства не прадугледжвае.

Нягледзячы на гэта службовыя асобы, ужываючы адкрытыя пагрозы (звальненьне з працы, пазбаўленьні прэміі (стыпэндыі), перанос адпачынку, высяленьне з інтэрнату і г.д.), прымушалі сваіх падначаленых галасаваць датэрмінова, аж да таго, што часам патрабавалі ад іх прынесьці даведку з участковай камісіі аб тым, што яны сапраўды прагаласавалі.

У якасьці прыкладу дбайнай падрыхтоўкі ўладаў да датэрміновага галасаваньня можна прывесьці артыкул у газэце «Металлург», апублікаваны 25 жніўня 2001 г. (г. Жлобін, Гомельская вобласьць). У артыкуле, у прыватнасьці, апавядалася, што дзеля таго, каб праца па арганізацыі датэрміновага галасаваньня прайшла дакладна «кіраўнікі цэхаў павінны загадзя скласьці графікі, пракантраляваць прыход транспарту, наяўнасьць пашпартоў, аб’яваў пра датэрміновае галасаваньне, абмеркаваць перадвыбарную сытуацыю з калектывам і прафактывам». Часам улады ў сваім запале даходзілі да таго, што сумяшчалі датэрміновае галасаваньне з галасаваньнем па месцы жыхарства выбарцаў (удому), што не прадугледжана Выбарчым кодэксам.

Акты назіральнікаў аб парушэньнях даюць падставы казаць пра тое, што на гэтых выбарах улады зрабілі ўсё, што ад іх залежыць, каб у часе выбараў было лёгка замяніць зьмесьціва выбарчых скрынак для датэрміновага галасаваньня. Канструкцыя многіх зь іх была такая, што дазваляла лёгка вымаць донца або падкладаць дадатковыя бюлетэні праз шчыліну, якая не запячатвалася на ноч. Некаторыя выбарчыя скрыні проста не плямбаваліся і не запячатваліся. Але часьцей за ўсё камісіі пад безупынным кантролем уладаў ішлі на фальшаваньне: уночы напярэдадні галасаваньня зьмесьціва выбарчых скрыняў падмянялася, пра што сьвед-

чылі новыя плёмбы альбо новыя палоскі паперы, якімі яны запячатваліся.

Сярод іншых найбольш распаўсюджаных відаў парушэньняў выбарчага заканадаўства можна назваць такія: назіральнікам не прадстаўлялі інфармацыю пра колькасьць выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова, не давалі магчымасьці пазнаёміцца са сьпісамі выбарцаў і зь любое надуманае прычыны не дапускалі да назіраньня.

## Парушэньні ў дзень выбараў і пры падліку галасоў

Як і ў дні датэрміновага галасаваньня, выбарчыя камісіі не давалі назіральнікам знаёміцца са сьпісамі выбарцаў, не прадстаўлялі зьвестак пра колькасьць выбарцаў, якія прагаласавалі, і якая колькасьць бюлетэняў была выдадзена.

Сур'ёзнымі парушэньнямі выбарчага заканадаўства суправаджалася галасаваньне па месцы знаходжаньня выбарцаў (удому). Практычна ўсе назіральнікі адзначалі, што камісіі не складалі, як гэтага патрабуе закон, адмысловага сьпісу выбарцаў, якія выказалі жаданьне галасаваць удому. Такое галасаваньне часьцяком зводзілася да звычайнага абыходу кватэраў у пошуках выбарцаў, якія не прагаласавалі, прычым чальцы камісіі бралі з сабой значна большую колькасьць бюлетэняў, чым было пададзена заявак.

Парушэньнем Выбарчага кодэксу (арт. 51, ч. 1) было тое, што ня ўсе выбарчыя скрыні знаходзіліся ў полі зроку назіральнікаў, а пры патрабаваньні назіральнікаў выконваць закон старшыні камісіяў, як правіла, адказвалі катэгарычнай адмовай. Імкнучыся схаваць сапраўдную колькасьць бюлетэняў у скрынях для датэрміновага галасаваньня, камісіі паўсюдна парушалі ч. 2 арт. 55 Выбарчага кодэксу і падлічвалі бюлетэні не паасобку, а сумесна. Пры гэтым, карыстаючыся адсутнасьцю ў арт. 13 Выбарчага кодэксу беспасярэдняга запісу пра тое, што назіральнікі маюць права знаходзіцца каля стала, дзе падлічваюцца галасы, старшыні камісіяў забаранялі назіральнікам набліжацца да сталоў пад пагрозай выдаленьня з памяшканьня для галасаваньня. І калі на выбарах у Палату прадстаўнікоў практыка бязгучнага падліку галасоў сустракалася даволі рэдка, дык цяпер гэты досьвед, які дазваляў прыхаваць маніпуляцыі вынікамі галасаваньня, стаў выкарыстоўвацца паўсюдна. Гэта, у прыватнасьці, давала магчымасьць адвольна перакладаць бюлетэні з аднаго стосу ў другі. Нярэдка назіральнікам удавалася заўважыць, што ў стосе, у якім ляжалі бюлетэні «за» А. Лукашэнку, знаходзілася нямала бюлетэняў «за» У. Ганчарыка.

У ход ішлі і маніпуляцыі пратаколамі з вынікамі галасаваньня. Іх стараліся запаўняць алоўкамі або запаўнялі толькі пасьля дазволу вышэйшае выбарчае камісіі ці ў выканкаме. Пры гэтым нярэдка пасьля вяртаньня старшыняў камісіяў з тэрытарыяльных камісіяў падпісаныя да таго чальцамі ўчастковых камісіяў пратаколы перапісваліся наноў. Паўсюдна, з зусім зразумелых прычынаў, участковыя камісіі адмаўляліся вывешваць дзеля агульнага азнаямленьня копію выніковага пратаколу, што было парушэньнем ч. 13 арт. 55 Выбарчага кодэксу.

Як правіла, бальшыня такіх парушэньняў зьдзяйсьнялася адкрыта, на вачах назіральнікаў. Несумненна, што ўсе чальцы камісіяў цудоўна ведалі пра зьмест арт. 192 Крымінальнага кодэксу, які прадугледжваў пакараньне пазбаўленьнем волі тэрмінам да пяцёх гадоў за сьвядомае парушэньне падліку галасоў або якое іншае скрыўленьне вынікаў галасаваньня. Аднак яны не баючыся парушалі закон, бо былі ўпэўненыя, што ня будуць пакараныя за свае дзеяньні, бо суды і пракуратура з 1996 году знаходзяцца пад кантролем выканаўчае ўлады.

Вывучэньне актаў аб парушэньні выбарчага заканадаўства і справаздачаў назіральнікаў дазваляе зрабіць адназначную выснову пра тое, што фальсыфікацыя вынікаў галасаваньня ажыцьцяўлялася: а) шляхам замены бюлетэняў, што знаходзіліся ў выбарчых скрынях для датэрміновага галасаваньня; б) пры сьвядомым парушэньні падліку галасоў на выбарчым участку; в) шляхам сьвядомага запісу ілжывых вынікаў галасаваньня ў пратакол, які складала ўчастковая камісія; г) прывядзеньнем выніковых пратаколаў у раённых і гарадзкіх тэрытарыяльных камісіях у адпаведнасьць зь лічбамі, якія патрабаваў выканкам.

Зь якімі б парушэньнямі ні прайшлі выбары — дамагчыся прызнаньня іх вынікаў несапраўднымі практычна немагчыма, хаця фармальна гэта прадугледжана арт. 79 Выбарчага кодэксу. Цікава адзначыць, што тэкст гэтага артыкулу ў цалкам нязьменным выглядзе быў перанесены ў Выбарчы кодэкс з Закону аб выбарах прэзыдэнта 1994 году. Гэта сьведчыць пра тое, што, працуючы над тэкстам Выбарчага кодэксу, заканадаўцы з Палаты прадстаўнікоў цудоўна разумелі, што якой бы ні была рэдакцыя артыкулу, ува ўмовах гэтага рэжыму ён усё адно працаваць ня будзе.

Першы этап абскарджаньня вынікаў выбараў закончыўся 14 верасьня. Скаргу аб прызнаньні выбараў несапраўднымі падалі У. Ганчарык і грамадзкія аб’яднаньні, што вялі назіраньне за ходам выбараў — РГА «Беларускі Гельсынскі камітэт» і ГА «Праваабарончы цэнтар «Вясна». ЦВК не задаволіла гэтае скаргі. Няма сумневу, што такі ж лёс чакае і скаргі, накіраваныя імі ў Вярхоўны суд.

## УРОКІ ПРЭЗЫДЭНЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ 2001 ГОДУ

1. У 1999–2000 гг. беларускі рэжым ажыцьцявіў зачыстку палітычнага поля ў Беларусі. У выніку, беларускае грамадзтва траціла давер да палітычных партыяў і палітыкаў з выразнай партыйнай арыентацыяй.

Сацыялягічныя апытаньні 2000 году паказвалі, што ў выбарчай барацьбе будзе мець шанцы толькі такі палітык, які валодае іміджам незалежнага.

| Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Якім, на Вашу думку, павінен быць будучы прэзыдэнт Беларусі?» | |
|---|---|
| Прадстаўнік апазыцыі | 6,1% |
| Незалежны кандыдат | 50,4% |
| Ня мае значэньня | 40,1% |

Крыніца: НІСЭПД.

Пры гэтым сумарны рэйтынг лідэраў дэмакратычных партыяў быў на парадак меншы за рэйтынг Лукашэнкі.

Але і пры фармальнай слабасьці дэмсілаў правядзеньне імі выбарчай кампаніі было занадта важным працэсам, каб рэжым мог адмовіцца ад спробаў уплываць на яго. У лягеры лукашэнкаўцаў ізноў узьнікла патрэба ў спэцыялісту ў тонкай інтрызе, які б працаваў зь людзьмі, застаючыся ў ценю.

Напрыканцы лістапада 2000 г. указам Лукашэнкі Ўрал Латыпаў быў прызначаны на пасаду дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі. У яго сфэру адказнасьці ўвайшла арганізацыя выбар-

| «Калі б у Беларусі адбыліся выбары прэзыдэнта, за каго б Вы прагаласавалі?» | |
|---|---|
| А. Лукашэнка | 39,3% |
| С. Шушкевіч | 2,2% |
| З. Пазьняк | 1,2% |
| А. Лябедзька | 0,9% |
| М. Статкевіч | 0,3% |
| В. Палевікова | 0,2% |
| С. Багданкевіч | 0,2% |
| В. Вячорка | 0,2% |

Крыніца: НІСЭПД.

чай кампаніі Лукашэнкі. Пры Латыпаву Рада бясьпекі пераўтвараецца ў аналітычны цэнтар, а на месца «сілавікоў» Шэймана прыходзяць людзі, якія зрабілі кар'еру ў контравыведцы КДБ.

12 верасьня 2001 г. заслугі галоўнага арганізатара, паводле лукашэнкавых словаў, «элегантнай і прыгожай перамогі» У. Латыпава былі адзначаны самім беларускім прэзыдэнтам. Указам Лукашэнкі ён быў прызначаны на пасаду кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Разам зь ім зрабілі крок «наверх» і члены яго каманды.

2. У сакавіку 2001 г. магчымыя выбарчыя расклады сталі відавочнымі:

| Размеркаваньне адказаў на пытаньне «На каго з гэтых людзей Вы гатовы прагаласаваць на прэзыдэнцкіх выбарах, а за каго ні станеце галасаваць ні пры якіх абставінах?» (%) | | | |
|---|---|---|---|
| Варыянт адказу | Буду галасаваць | Не буду галасаваць | Цяжка адказаць |
| А. Лукашэнка | 39,8 | 36,4 | 23,8 |
| М. Чыгір | 17,9 | 45,1 | 37,0 |
| У. Ганчарык | 10,1 | 45,2 | 44,7 |
| С. Домаш | 8,1 | 46,2 | 45,7 |
| З. Пазьняк | 6,3 | 59,7 | 34,0 |
| П. Казлоўскі | 4,8 | 48,8 | 46,4 |
| Я. Крыжаноўскі | 4,3 | 47,7 | 48,0 |
| С. Гайдукевіч | 4,0 | 50,6 | 45,4 |
| С. Калякін | 2,8 | 51,7 | 45,5 |
| А. Ярашук | 2,6 | 49,2 | 48,2 |
| Л. Сініцын | 2,0 | 50,3 | 47,7 |

Крыніца: НІСЭПД.

Зьвернем увагу на палітыкаў, якія ў складзе «пяцёркі» былі аўтсайдэрамі. П. Казлоўскі і С. Калякін ня мелі ня толькі структураў і рэсурсаў для правядзеньня выбарчай кампаніі, яны ня мелі і якойсьці значнай падтрымкі з боку электарату.

Генэрал-палкоўнік П. Казлоўскі быў звольнены з пасады міністра абароны і паніжаны ў званьні Лукашэнкам у ліпені 1994 г. за «прычыненьне дзяржаве эканамічнай шкоды». «Справа Казлоўскага» выклікала ў той час вялікі рэзананс у грамадзтве. Гаворка ідзе аб праведзеным П. Казлоўскім за дзяржаўны кошт вясельлі свайго сына. У часе жорсткага эканамічнага крызысу яго за дзяржаўныя грошы пару дзён гулялі некалькі сот чалавек. Да таго ж, сын міністра

Казлоўскага дзякуючы бацькавай пратэкцыі па-за чаргой атрымаў вялікую кватэру ў прэстыжным раёне Менску ў той час, калі трэцяя частка беларускіх афіцэраў ня мела ўласнага жытла.

Сацыялягічныя апытаньні таксама паказваюць, што ў беларускім грамадзтве вайсковец ня мог стаць прэзыдэнтам.

| Размеркаваньне адказаў на пытаньне «Хто, на Ваш погляд, павінен быць будучым прэзыдэнтам Беларусі?» | |
|---|---|
| Цывільны | 44,2% |
| Вайсковец (у тым ліку ў адстаўцы) | 5,1% |
| Ня мае значэньня | 48,6% |

Крыніца: НІСЭПД.

3. Пасьля таго, як «адзіным» кандыдатам быў названы У. Ганчарык, супраць яго стартавала кампанія нэгатыўнага PR, ініцыяваная рэжымам. Яна разгортвалася ў двух кірунках. Першы — нэгатыўная інфармацыя: прэзэнтацыя Ганчарыка як прадстаўніка камуністычнай намэнклятуры.

Стаўленьне беларускіх выбарцаў да палітыка з намэнклятурнай мінуўшчынай было досыць адназначнае.

| Размеркаваньне адказаў на пытаньне «Якім, на Ваш погляд, павінен быць будучы прэзыдэнт Беларусі?» | |
|---|---|
| Звязаны з намэнклятурай | 9,4% |
| Не звязаны з намэнклятурай | 32,3% |
| Ня мае значэньня | 55,9% |

Крыніца: НІСЭПД.

Дарадцы Ганчарыка таксама паспрыялі павелічэньню эфэктыўнасьці нэгатыўнага PR, накіраванага супраць іхнага патрона. Сьляпое выкананьне камандай Ганчарыка раней выбранага курсу на дасягненьне кумулятыўнага пазытыўнага рэйтынгу шляхам дэлегаваньня падтрымкі з боку іншых кандыдатаў «адзінаму кандыдату» і ўлучэньне іх (перадусім А. Ярашука і М. Марыніча) да «супольнага» штабу абярнулася павелічэньнем кумулятыўнага нэгатыўнага рэйтынгу.

Лукашэнкаўская прапаганда ўмела запалохвала беларускіх грамадзянаў пагрозай «намэнклятурнага рэваншу», па-майстэрску выкарыстоўвала факт рэзкага падзеньня ўзроўню жыцьця ў 1991–1994 гг., у часе «ўсяўладзьдзя намэнклятуры». У масавую сьвядомасьць пры дапамозе розных камунікацыйных каналаў убіваўся стэрэатып: «Старая ўлада ўжо накрала, новая ж будзе красьці без упыну».

Лукашэнкаўскія прапагандысты па-свойму скарысталіся і тым, што «адзіны» кандыдат Ганчарык у недалёкім мінулым не супрацьдзейнічаў станаўленьню жорсткага аўтарытарнага рэжыму. Будучы кіраўніком ФПБ, ён не здабыў і вядомасьці «змагара за правы працоўных». Ганчарыкавы пэрыядычныя канстатацыі пагаршэньня эканамічнага становішча ў краіне і зьвязанага з гэтым пагаршэньня дабрабыту працоўных нічым не вылучаліся на агульным камунікацыйным фоне. Толькі кампанія ўціску на ФПБ з боку ўлады выклікала «палітызацыю» часткі прафсаюзнага кіраўніцтва.

Пры дапамозе сваёй выбарчай кампаніі Лукашэнка змагаўся за статус «усенародна абранага» прэзыдэнта, таму аб’ектам яго палітычнага апэтыту станавіўся і па-незалежніцку настроены сэгмэнт беларускага грамадзтва.

Другая хваля нэгатыўнага PR была накіравана акурат на іх.

4. Ганчарыка ў строгім сэнсе нельга было назваць «адзіным кандыдатам ад шырокай грамадзянскай кааліцыі» (за выняткам Домаша іншыя члены «пяцёркі» прадстаўлялі самі сябе, за

імі не стаяла ні магутных арганізацыяў, ні значнай сацыяльнай базы). Вынікі рэгістрацыі кандыдатаў пацьвердзілі гэта: неабходную колькасьць подпісаў у падтрымку свайго вылучэньня сабралі два кандыдаты, якія знаходзіліся ў рэальнай апазыцыі рэжыму Лукашэнкі. Пры гэтым найбольшыя дэмакратычныя арганізацыі працавалі на карысьць іншага кандыдата — С. Домаша.

Абвяшчэньне У. Ганчарыка адзіным кандыдатам, нягледзячы на ўсе вэрбальныя дэклярацыі, зрабіла Домаша простым назіральнікам выбарчага марафону.

У выніку «адзіны» кандыдат Ганчарык ня толькі не атрымаў падтрымкі ўсяго беларускага грамадзтва, але выклікаў адчужэньне з боку пэўнай часткі дэмакратычна настроеных выбарцаў. Паказальна, што сам Лукашэнка мог дазволіць сабе не выступаць з крытыкай пэрсанальна ў адрас Ганчарыка.

5. У 2001 г. тэмпы эканамічнага росту ў Беларусі хаця і запаволіліся (прырост ВНП склаў толькі 3%), тым ня менш забясьпечылі эканамічную стабільнасьць. Дзяржаўныя фінансы былі пераразьмеркаваныя для забесьпячэньня папулісцкіх перадвыбарных абяцаньняў Лукашэнкі. За кошт значнага скарачэньня інвэстыцыяў у асноўны капітал было павялічанае фінансаваньне сацыяльнай сфэры (павялічаныя памеры заробкаў, пэнсіяў, іншых сацыяльных выплат), а таксама было прафінансаванае добраўладкаваньне гарадоў (быў зроблены грунтоўны рамонт цэнтральнай часткі Менску і ўсіх абласных гарадоў).

Абвінавачаньні апанэнтаў Лукашэнкі ў неэфэктыўнасьці яго эканамічнай палітыкі («сярэдні заробак у Польшчы складае каля 350–400 даляраў, у Беларусі — 70–100») беларускія ўлады спрастоўвалі пры дапамозе таго ж самага прыкладу («колькасьць беспрацоўных у Польшчы — 15–20% ад агульнай колькасьці працаздольнага насельніцтва, у Беларусі — 1–3%»).

На гэтым фоне чарговае абяцаньне Лукашэнкі, што ў 2005 г. сярэдні заробак беларуса дасягне 250$ (пры захаваньні цяперашняга ўзроўню цэнаў), не выглядала для бальшыні беларусаў фантастычным.

6. Выбарчая кампанія дэмсілаў зь неабходнасьцю мусіла ўключаць пазытыўны блёк (пераконваньне грамадзтва ў большай эфэктыўнасьці сацыяльна-эканамічнай, культурнай, міжнароднай, міжнацыянальнай і інш. палітыкі новай дэмакратычнай улады). Аднак яна была збудаваная на аснове нэгатыўнай PR-акцыі.

Крытыка рэжыму будавалася на спэкуляцыях вакол зьнікненьня апазыцыйных палітыкаў Ю. Захаранкі, В. Ганчара, прадпрымальніка А. Красоўскага, журналіста Зьм. Завадзкага. Лукашэнку таксама ўскосна абвінавачвалі ў забойстве Г. Карпенкі. Пра эфэктыўнасьць гэтай крытыкі гавораць сацыялягічныя апытаньні (прыкладна 30% выбарцаў на момант выбараў нічога нічога ня ведалі аб гэтых фактах).

Да сярэдзіны жніўня (!) У. Ганчарыкам не была выпрацавана перадвыбарная праграма (гэты дакумэнт стане даступны толькі за 20 дзён да «ўсенароднага волевыяўленьня»). Дарма што яе сацыяльна-эканамічны блёк быў сфармуляваны дастаткова добра, у сваёй вуснай агітацыі Ганчарык унікаў канкрэтных размоваў на тэму паляпшэньня сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў краіне. «Адзіны» кандыдат так і ня даў адказаў на канкрэтныя, вельмі важныя для грамадзтва пытаньні.

7. Значная частка захадаў у межах выбарчай кампаніі дэмсілаў была накіраваная на дыскрэдытацыю ў вачах грамадзтва асобы А. Лукашэнкі (вулічныя графіці, налепкі, газэтныя публікацыі і г.д.). Пры гэтым не заўжды крытыка Лукашэнкі была сацыяльна і палітычна этычнаю. Празьмерны акцэнт на асобе Лукашэнкі ствараў уражаньне, што яго апанэнты выступаюць ня столькі супраць усталяванага ім жорсткага аўтарытарнага рэжыму, колькі супраць яго пэрсанальна.

## Разьдзел 4

# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА БЕЛАРУСІ ПАМІЖ 2001-2003

## КРЫЗЫС АПАЗЫЦЫІ ПАСЬЛЯ ПРЭЗЫДЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ 2001 ГОДУ

Атрымаўшы паразу на прэзыдэнцкіх выбарах і ня здолеўшы пераканаўча давесьці, што фальсыфікацыі ўладаў паўплывалі на іх вынік, беларуская апазыцыя апынулася ў стане, калі ілюзіі наконт хуткага дасягненьня сваіх галоўных мэтаў (адхіленьне ад пасады прэзыдэнта Лукашэнкі і распачацьцё працэсаў дэмакратызацыі ў краіне) былі разбураныя, а стратэгічнага бачаньня сваіх далейшых дзеяньняў не было. У гэтых умовах пэрыяд «ад выбараў да выбараў» быў выкарыстаны апазыцыяй не на дасягненьне сваіх праграмных мэтаў, а хутчэй на адаптацыю і барацьбу за выжываньне ў значна горшых палітычных умовах, у якіх стан самой апазыцыі вызначаўся наступнымі чыньнікамі.

Па-першае, узмацненьне рэпрэсіўнасьці палітычнага рэжыму пасьля прэзыдэнцкіх выбараў прывяло да таго, што апазыцыя канчаткова аформілася як складовая частка «трэцяга сэктару», якая пераўтварылася ў згуртаваньне буйных няўрадавых арганізацыяў, што займаюцца абаронай правоў чалавека, адраджэньнем культуры і мовы, адукацыйнымі і асьветніцкімі праграмамі. Пры гэтым яны не адмовіліся ад барацьбы за ўладу, але імкліва гублялі неабходныя для гэтага здольнасьці і рэсурсы.

Па-другое, пасьля прэзыдэнцкай кампаніі назіралася зацішша ў «трэцім сэктары» і прафсаюзным руху на фоне рэпрэсіяў супраць асобных арганізацыяў і высілкаў для стварэньня праўрадавага «трэцяга сэктару».

Па-трэцяе, у 2001—2002 гадох скончыўся пэрыяд масавых выступаў беларускай апазыцыі. Вулічныя акцыі пратэсту паступова пераўтварыліся ў руцінныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да знакавых датаў у палітычным календары. Яны перасталі зьбіраць вялікую колькасьць удзельнікаў. Спробы наладзіць сацыяльныя пратэсты як правіла канчаліся няўдачай таму, што арганізатарам не ўдавалася прыцягнуць увагу з боку патэнцыйнай аўдыторыі такіх акцыяў. Да таго ж дзяржаўны карны апарат значна ўзмацніў рэпрэсіі супраць удзельнікаў вулічных пратэстаў. Як вынік, мабілізацыйны патэнцыял апазыцыі ў пасьлявыбарны пэрыяд не перавышаў 1—2 тысячы чалавек у сталіцы і некалькіх дзясяткаў у абласных цэнтрах. Ува ўмовах абмежаванага вулічнага рэсурсу арганізацыя масавых акцыяў пераўтварылася ў барацьбу паміж асобнымі суб’ектамі апазыцыі за права лідэрства ў гэтым сэгмэнце палітычнага поля, што яшчэ больш нэгатыўна адбівалася на масавасьці мітынгаў і дэманстрацыяў.

Па-чацьвёртае, акрэсьліліся тэндэнцыі да фрагмэнтацыі ў палітычнай апазыцыі. Гэта вылілася ў драбленьне існых палітычных партыяў і ўзмацненьне супярэчнасьцяў як па пытаньнях стратэгіі і тактыкі, так і па ідэалягічных пытаньнях культурна-цывілізацыйнага выбару. На-

рэшце, яшчэ адным фактарам разлому сталі асабістыя непаразуменьні лідэраў палітычных партыяў.

Па-пятае, значна зьнізілася цікавасьць замежных палітычных актараў да дзейнасьці апазыцыі, што сьведчыла пра расчараваньне ў яе магчымасьцях і адсутнасьць уласнага бачаньня далейшага ўзаемадзеяньня зь Беларусьсю ўва ўмовах, калі пануючы рэжым адрозьніваўся вонкавай кансалідаванасьцю ды стабільнасьцю.

Стан апазыцыі пасьля верасьня 2001 году шмат у чым быў запраграмаваны яе папярэдняй палітычнай стратэгіяй, якая грунтавалася на трох асноўных прынцыпах. Па-першае, гэта было адмаўленьне (яшчэ да прэзыдэнцкай кампаніі) ад удзелу ў палітычных працэсах, што спансаравaліся лукашэнкаўскім рэжымам, каб паставіць пад сумнеў яго легітымнасьць, і стварэньне «паралельнага грамадзтва». Па-другое, гэта вызначэньне вонкавага (заходняга) фактару як прынцыповага чыньніка ўласнай палітычнай перамогі ўнутры краіны. Па-трэцяе, гэта стаўка на вулічныя акцыі (пераважна ў сталіцы) як асноўны інструмэнт дасягненьня ўнутрыпалітычных мэтаў. Гэтая стратэгія магла быць пасьпяховай толькі ўва ўмовах, калі ў «паралельным грамадзтве» існавалі аўтарытэтныя інстытуты, што маглі б перацягнуць на свой бок значную частку «афіцыйнага грамадзтва» (такія, як Касьцёл у Польшчы), калі б Захад сапраўды валодаў мэханізмамі ўплыву на Беларусь (і Лукашэнка меў матывацыю да легітымізацыі сваёй улады ў гэтым кірунку) і калі б мабілізацыйны патэнцыял апазыцыі сапраўды дазваляў праводзіць масавыя вулічныя акцыі (да таго ж, лукашэнкаўскаму рэжыму шэрагам папулісцкіх захадаў, такіх, як падвышэньне заробкаў, удалося значна зьнізіць пратэставыя настроі ў грамадзтве акурат перад прэзыдэнцкімі выбарамі). Існаваньне ў «паралельным грамадзтве» пашырала разрыў паміж апазыцыяй і выбарцамі, да большыні зь якіх проста не даходзіла інфармацыя аб дзейнасьці апанэнтаў Лукашэнкі (за выняткам дзяржаўных мэдыяў, якія старанна стваралі ёй нэгатыўны піяр). Гэта ніяк не стасавалася з прынцыповым рашэньнем апазыцыі прыняць удзел у прэзыдэнцкіх выбарах, дзе асноўныя спадзяваньні ўскладаліся на паўтарэньне «югаслаўскага варыянту» (перамога на выбарах пры вялікай замежнай дапамозе плюс вулічная барацьба ў абарону перамогі). На падтрымку грамадзтвам апазыцыйнага кандыдата на выбарах рабіўся аўтаматычны разьлік яшчэ і таму, што Лукашэнку паводле пэўных сацыялягічных апытаньняў падтрымлівала менш за палову насельніцтва. Усё, што павінна была зрабіць апазыцыя, гэта «дасягнуць кампрамісу вакол адзінага кандыдата і правесьці эфэктыўную кампанію за тры месяцы да галасаваньня»[1].

Вынік перадвыбарнай кампаніі ня толькі засьведчыў неабгрунтаванасьць гэтай палітычнай стратэгіі, але і стварыў сытуацыю, у якой выбар іншай быў надзвычай абцяжараны глыбокай дэмаралізацыяй апазыцыі (асабліва на нізавым узроўні) самім фактам паразы і тым, што ў пасьлявыбарны пэрыяд палітычны рэжым зрабіў шэраг захадаў па сваёй кансалідацыі, што перашкаджала ажыцьцяўленьню альтэрнатыўных палітычных праектаў. Так, Лукашэнка вельмі хутка адзначыў, што апорай яго ўлады (ці, як ён сам вызначыў, «грамадзянскай супольнасьці») мусяць стаць «адноўленыя прафсаюзы, моцныя моладзевыя арганізацыі ды мясцовыя Рады». Гэтай формулай была выразна акрэсьлена тая зона, у якой улады імкнуліся замацаваць сваю гегемонію праз ліквідацыю (ці недапушчэньне стварэньня) зонаў аўтаноміі для разгортваньня некантраляваных імі палітычных працэсаў. Да таго ж, вынікі прэзыдэнцкіх

[1] Joe Price. Yugoslavia Lesson for Belarusian Opposition // Belarusian Review. Vol. 12. № 3 (Fall 2000).

выбараў (а яшчэ раней — дадатковых парлямэнцкіх выбараў у сакавіку 2001 году) прадэманстравалі, што ўлады старанна адрэгулявалі мэханізм маніпуляцыі волевыяўленьнем выбарцаў, які раней, нават у кастрычніку 2000 году, мог даваць асобныя збоі. Стваралася парадаксальная сытуацыя: з аднаго боку, апазыцыя прыйшла да высновы, што яе адмова ад удзелу ў сыстэмнай палітыцы была беспэрспэктыўнай, зь іншага — эфэктыўнае вяртаньне ў яе зрабілася ўсё менш магчымым. У такіх тупіковых абставінах апазыцыйная стратэгія магла быць вызначаная толькі шляхам пробаў і памылак. Так, напрыклад, у кастрычніку 2001 году Каардынацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў (КРАПП) выступіла з ініцыятывай (упершыню агучанай АГП) узнавіць перамовы з уладамі ў пытаньнях дэмакратызацыі выбарчага заканадаўства, доступу апазыцыі да сродкаў масавай інфармацыі, наданьня рэальных паўнамоцтваў парлямэнту і стварэньня клімату палітычнага даверу ў краіне. Па сутнасьці, гутарка ішла пра той самы фармат перамоваў, што спрабавалі наладзіць у 1999—2000 гадох. Аднак у пасьлявыбарны пэрыяд магчымасьць такіх перамоваў выглядала яшчэ больш мізэрнай, чым два гады таму, калі ўлады дэманстратыўна іх праігнаравалі. Дадамо, што першая спроба наладзіць перамовы прадугледжвала фармат «перамовы ўлады з Захадам пры пасярэдніцтве апазыцыі». Гэта азначала, што галоўную ролю ў прасоўваньні палітычных зьменаў мусілі адыграць акурат міжнародныя структуры, якія аказаліся няздольнымі да аказаньня эфэктыўнага ціску на лукашэнкаўскі рэжым. Калі прыняць пад увагу становішча беларускай апазыцыі ў пасьлявыбарны пэрыяд, то стане ясна, што аднаўленьне перамоваў мусіла адбыцца якраз у тым самым фармаце. Аднак міжнародныя арганізацыі знаходзіліся ня ў меншай разгубленасьці, чым сама апазыцыя, што рабіла ўсю ідэю «круглага стала» нерэальнай.

Дыскусія наконт прычынаў і ўрокаў паразы на прэзыдэнцкіх выбарах, што разгарнулася ў апазыцыйным асяродзьдзі, на пэўны час адсунула на другі плян вызначэньне далейшых крокаў. У гэтай дыскусіі можна было вызначыць тры кірункі. Першай прычынай паразы вызначалася само грамадзтва, якое было проста не гатовае да зьмены палітычнага рэжыму. «Социюм, які пасталеў да самастойнай гістарычнай творчасьці, бярэ ўласны лёс у свае рукі, ні ў кога не пытаючыся на дазвол. Як гэта зрабіў у мінулым годзе югаслаўскі народ»[2]. Другой прычынай вызначалася намэнклятура, на якую памылкова зрабіла стаўку апазыцыйнае кіраўніцтва з надзеяй на тое, што яна будзе здольная нэўтралізаваць адміністрацыйны рэсурс рэжыму. Як выказаўся адзін з кіраўнікоў БНФ, «намэнклятура нясе адказнасьць за правал кампаніі. Мы таксама нясем адказнасьць за тое, што паставілі на намэнклятуру. Яны казалі нам, што змогуць забясьпечыць сапраўдны кантроль над выбарамі і падтрымку Расеі. Яны нам сказалі, наша справа мабілізаваць масы. І мы гэта зрабілі»[3]. Заўважым, аднак, што стаўка на намэнклятуру была сьвядомым выбарам, які быў зроблены акурат па ініцыятыве партыйнага кіраўніцтва: менавіта КРДС у сьнежні 2000 году прапанавала ў якасьці кандыдатаў апаратную тройку «Домаш — Чыгір — Ганчарык». У якасьці трэцяй прычыны многія апазыцыйныя лідэры ўжо называлі памылкі ўва ўласнай палітычнай стратэгіі, у тым ліку й ігнараваньне ў мінулым сваіх выбарцаў. «Час байкотаў прайшоў», — гэтую думку падзялялі

---

[2] Карбалевич Валерий. Лукашизм – тяжелая патология нации. Главный урок президентских выборов // Гражданский форум. Информационно-аналитический бюллетень Объединенной гражданской партии. 2001. № 1. С. 3.

[3] Белорусская деловая газета. 2001. 30 октября.

ўсе антылукашэнкаўскія сілы, за выняткам КХП-БНФ. Асобныя лідэры нават не ўтрымаліся ад спробаў абвінаваціць у правале адзін аднаго ці сваіх тактычных хаўрусьнікаў. Ужо пасьля выбараў адзін зь лідэраў БНФ, камэнтаваўшы паводзіны сваёй партыі падчас супольнай кампаніі, заявіў, што цяжка прывесьці сяброў БНФ на плошчу і прымусіць іх стаяць зь людзьмі пад чырвонымі ці сінімі сьцягамі. Таксама некаторыя лідэры сацыял-дэмакратыі публічна шкадавалі, што пайшлі на аб'яднаньне з правымі. Былымі паплечнікамі і Ганчарыка, і Домаша рабілася выснова, што больш мэтазгодным быў удзел у выбарах без стварэньня кааліцыі і аб'яднаньня (што, па сутнасьці, азначала: асабістыя і фракцыйныя інтарэсы зноў атрымалі перавагу над супольнай мэтай). Такім чынам, апазыцыйныя партыі пачалі шкадаваць аб вылучэньні адзінага беспартыйнага і намэнклятурнага кандыдата, бо праз гэта яны страцілі магчымасьць падчас выбараў'2001 больш выразна пазыцыянаваць свае ўласныя структуры ў палітычным полі, што рабіла праблематычным іх існаваньне пасьля кампаніі. Як вынік, пасьлявыбарны пэрыяд стаў часам вырашэньня ўнутрыпартыйных праблемаў, часьцяком сродкамі ўнутранай барацьбы, што толькі абвастрала нэгатыўныя тэндэнцыі ў стане апанэнтаў Лукашэнкі.

## Грантавы скандал

Скандал вакол нямэтавага выкарыстаньня апазыцыйнымі сіламі фінансавых сродкаў, што ішлі на іх падтрымку з-за мяжы, пачаўся адразу пасьля заканчэньня перадвыбарнай кампаніі і меў усе рысы «хатняй нарыхтоўкі», якая прытрымлівалася акурат для нанясеньня апошняга ўдару па апазыцыі, што цярпела няўдачу. Ужо 10 верасьня ў амэрыканскай газэце «The Christian Science Monitor» зьявілася публікацыя, у якой былі высунуты першыя абвінавачаньні ў адрас беларускай апазыцыі ў раскраданьні грошай, што выдаткоўваліся міжнароднымі арганізацыямі на падтрымку дэмакратыі ў Беларусі і, у прыватнасьці, на прэзыдэнцкую кампанію 2001 году[4]. Абвінавачаньні прагучалі з вуснаў журналіста Аляксандра Фядуты, які выказаў меркаваньне, што прыкладна трэцяя частка з тых грошай, што выдаткавалі замежныя грантадаўцы на падтрымку дэмакратыі ў Беларусі, выкарыстоўвалася «нямэтавым спосабам». Паводле ягоных словаў, гэта ўжо ператварылася ў своеасаблівы бізнэс, у які былі ўключаныя і некаторыя грантадаўцы, што атрымлівалі «таксу» з тых сродкаў.

Канфлікт хутка трапіў на старонкі беларускай прэсы, прычым дзяржаўныя газэты старанна перадрукоўвалі публікацыі зь незалежных мэдыяў і тым самым даносілі ўнутраныя скандалы апазыцыі да шырокай аўдыторыі. Асаблівую актыўнасьць праяўляў неспадзявана ўзьніклы ў сеціве сайт www.kompromatby.net (які потым гэтаксама нечакана зьнік). Наступная сэрыя абвінавачаньняў кранула сетку незалежнага назіраньня на прэзыдэнцкіх выбарах і вылілася ў скандальны сыход з праваабарончай арганізацыі «Вясна» аднаго зь яе кіраўнікоў Барыса Гюнтэра. У інтэрвію «Белорусской газете» Гюнтэр абвінаваціў кіраўніка «Вясны» Алеся Бяляцкага ў тым, што грошы, якія выдаткаваліся на назіраньне, пайшлі на зарплату чальцам яго сям'і й сваякам яго палітычных паплечнікаў, а таксама на куплю маёмасьці (сам Бяляцкі адкінуў гэтыя абвінавачаньні). Фармальнай падставай для скандалу паслужыла тое,

[4] Scott Peterson. US spends millions to bolster Belarus opposition // The Christian Science Monitor. 2001. 10 September.

што сам Гюнтэр ня быў уключаны Бяляцкім у заяўку на атрыманьне гранту. Гюнтэр таксама абвінаваціў Бяляцкага ў тым, што ён праз свае сувязі з грантадаўцамі нэўтралізаваў дзейнасьць больш вялікай структуры «Незалежнае назіраньне», якую ўзначальваў Мечыслаў Грыб ды Ўладзімер Гудзееў[5] (нагадаем, што 2000 назіральнікаў «Вясны» былі адхіленыя Цэнтравыбаркамам ад назіраньня і незалежнае назіраньне ня здолела падаць пераканаўчых фактаў фальсыфікацыяў на выбарах).

Арганізацыі і асобы, што наўпрост былі абвінавачаны ў «грантавай карупцыі», адразу ж выступілі з заявамі, у якіх абвінавацілі Фядуту ў паклёпе і супрацы зь беларускімі спэцслужбамі. Так, Зьміцер Бандарэнка, адзін зь лідэраў «Хартыі'97», камэнтуючы выступ Фядуты, заявіў: «Гэты чалавек дзейнічае вельмі нахабна. Ён разумее, што судзіцца зь ім у лукашэнкаўскім судзе мы ня будзем. Мне здаецца, што ён выконвае чыюсьці замову, робячы захады да таго, каб вярнуцца ў структуры ўлады. Па сутнасьці, гэты чалавек заўжды быў нягоднікам»[6]. Як доказ прыводзіліся лічбы, якія сьведчылі аб тым, што асноўная частка замежнай дапамогі Беларусі ішла на фінансаваньне чарнобыльскіх і адукацыйных праграм (адзначым, аднак, што сума ў адзін мільён даляраў, якая, як сьцьвярджалася, рэальна даходзіла да беларускага няўрадавага сэктару, была значна заніжаная: так, напрыклад, амэрыканскія дабрадзейныя фонды прынцыпова не фінансуюць дзяржаўных арганізацыяў). Рабілася выснова, што грантавы скандал — гэта толькі частка шырэйшай апэрацыі беларускіх уладаў па зачыстцы палітычнага поля пасьля прэзыдэнцкіх выбараў.

Фядута пазьней мусіў удакладніць, што яго абвінавачаньні тычацца не ўсяго недзяржаўнага сэктару і апазыцыі, а толькі «двух гэтак званых кіраўнікоў «Хартыі'97», аднаго з кіраўнікоў АГП і трох колішніх і сёньняшніх кіраўнікоў БНФ»[7], адзначыўшы, што яго атака мела на мэце прымусіць сысьці тых людзей, якія несьлі адказнасьць за правалы беларускай апазыцыі цягам сямёх гадоў, — некалькіх кіраўнікоў беларускай апазыцыі пэрыяду 1999—2001 гадоў (г.зв. «новая хваля»). Яны і вызначалі стратэгію апазыцыі ў перадвыбарны пэрыяд (нагадаем: яе асноўнымі элемэнтамі былі перамоўны працэс 1999—2000 гадоў, сэзон вулічных акцыяў, «Байкот'2000» і стварэньне шырокай грамадзянскай кааліцыі, узначаленай былой намэнклятурай). «Я ведаю, што двое з маіх абвінаваўцаў ужо былі паінфармаваныя, што праз іх структуры фінансаваньне дэмакратыі ажыцьцяўляцца ня будзе. Значыць, на адну трацiну мая задача выкананая»[8].

Асобную пазыцыю ў грантавым скандале заняла БСДП (НГ) Мікалая Статкевіча, якая, хоць і асудзіла Фядуту, але, каб зьняць усе падазрэньні, запатрабавала стварэньня адмысловай міжпартыйнай камісіі для расьследаваньня выкарыстаньня грантавых сродкаў падчас перадвыбарнай кампаніі. Аднак, калі Фядута ўдакладніў сьпіс тых, каго ён падазрае ў карупцыі, Статкевіч зьняў свае патрабаваньні, фактычна задаволіўшыся тым, што абвінавачваюцца яго канкурэнты.

Грантавы скандал лягчэй за ўсё сьпісаць на правакацыі беларускіх уладаў. Але, каб зразумець, чаму абвінавачаньні трапілі на спрыяльную глебу, адгукнуліся шэрагам міні-скандалаў і атрымалі доўгі працяг у незалежных сродках масавай інфармацыі, варта прыгадаць шэраг акалічнасьцяў, што вызначалі спэцыфіку супрацоўніцтва паміж беларускім няўрадавым сэк-

[5] Белорусская газета. 2001. 12 ноября.
[6] Белорусская газета. 2001. 22 октября.
[7] Белорусская деловая газета. 2001. 25 октября.
[8] Тамсама.

тарам і *democracy assistance community*. Па-першае, і беларускае заканадаўства, і заканадаўства бальшыні краін-донараў забараняюць беспасярэдняе фінансаваньне палітычных партыяў. З гэтай прычыны асноўнымі атрымальнікамі донарскай дапамогі маглі быць няўрадавыя арганізацыі, якія фармальна ня ёсьць суб'ектам палітычнага працэсу. Аднак апазыцыйная палітычная і грамадзянская супольнасьць у Беларусі шчыльна ўзаемазьвязаныя і перакрыжаваныя: вялікая колькасьць сяброў палітычных партыяў ёсьць адначасова і сябрамі няўрадавых арганізацыяў (як правіла, некалькіх), прычым партыйныя лідэры часьцяком сумяшчаюць свае палітычныя ролі зь лідэрскімі пазыцыямі ў няўрадавых арганізацыях. З гэтай прычыны дзейнасьць «трэцяга сэктару» непазьбежна палітызавалася, а атака на яго структуры пераўтваралася ў атаку на палітычных лідэраў і іх структуры. Па-другое, донарская дапамога такога кшталту дае ўладам зачэпку для палітычнага перасьледу і рэпрэсіяў. Таму фінансаваньне няўрадавага сэктару (больш дакладней — перадаваньне фінансавых сродкаў рэцыпіентам) час ад часу вялося праз «шэрыя» каналы, што аўтаматычна стварала падставы для абвінавачаньняў грантаатрымальнікаў у прысваеньні сродкаў, бо ў такіх акалічнасьцях, нават спрастоўваючы абвінавачаньні, яны «сьвяціліся» перад уладамі. Па-трэцяе, напаўпадпольныя ўмовы дзейнасьці «трэцяга сэктару» стварылі пэўную сыстэму гіерархіі ўнутры яго. Натуральна, зьяўляліся «пакрыўджаныя» ўсярэдзіне сэктару і правакаваліся ўнутраныя канфлікты, якія лёгка было перавесьці ў статус вонкавых. Па-чацьвёртае, значная частка ўсёй дапамогі выдаткоўвалася Злучанымі Штатамі Амэрыкі, якія мелі ўласную канцэпцыю ўзаемадзеяньня зь Беларусьсю (г.зв. палітыка «выбарачных кантактаў»), якая адрозьнівалася ад стратэгій іншых гульцоў (напрыклад, АБСЭ ці Эўразьвязу). Асабліва шчыльныя кантакты склаліся паміж грантадаўцамі і той часткай беларускай апазыцыі, што будавала сваю палітычную дзейнасьць паралельна з стратэгіяй «выбарачных кантактаў». Гэта зьніжала статус і магчымасьці той часткі апазыцыі, што не падзяляла гэтых перакананьняў, і грантавыя скандалы маглі быць скарыстаныя ёю для дыскрэдытацыі канкурэнтаў у разьмеркаваньні фінансавых плыняў. Паколькі шмат у чым барацьба за лідэрства ў апазыцыі вызначалася барацьбой за фінансавыя плыні, грантавы скандал быў шмат у чым помстай з боку тых асобаў, што былі ў свой час адхіленыя ад кіраўніцтва і ўплыву якраз праз грантавыя мэханізмы (напрыклад, падчас і пасьля парлямэнцкіх выбараў 2000 году рабіліся захады пазбавіць замежнага фінансаваньня тыя арганізацыі і асобаў, якія за імі стаялі, што адмовіліся ад байкоту). Выразна праявілася і тое, што асноўнымі фігурантамі скандалу сталі апазыцыйныя лідэры, якія былі набліжаныя да амэрыканскіх грантадаўцаў, тым часам як беспасярэдне ці ўскосна іх абвінавачвалі тыя, хто быў бліжэйшы да расейскіх ці эўрапейскіх спонсараў.

Грантавы скандал быў скарыстаны як сродак пазыцыянаваньня асобных апазыцыйных палітычных сілаў супраць сваіх жа канкурэнтаў. Ён выявіў тыя супярэчнасьці ў стане беларускай апазыцыі, што існавалі на працягу некалькіх гадоў і якія толькі на некаторы час замаскавала стварэньне «шырокай грамадзянскай кааліцыі». Апазыцыйныя сілы самаўхіліліся ад абмеркаваньня надзвычай балючых і актуальных для іх пытаньняў: што было прычынай няўдачы на прэзыдэнцкіх выбарах, апрача парушэньняў і фальсыфікацыяў уладаў; якой павінна быць доўгатэрміновая стратэгія апазыцыйных сілаў, у тым ліку і ў дачыненьні да наступных выбарчых кампаній; якім чынам можа быць павышана эфэктыўнасьць замежнай дапамогі? Адказу на гэтыя пытаньні не прагучала. У выніку, вызначэньне ўласнай стратэгіі стала невырашальнай праблемай і для саміх грантадаўцаў, што прывяло да рэзкага зьмяншэньня дапамогі ўсяму няўрадаваму сэктару і паставіла пад пагрозу існаваньне яго інфраструктуры.

Такім чынам, паколькі замежная дапамога стала асноўным сродкам забесьпячэньня дзейнасьці беларускай апазыцыі, склалася сытуацыя, пры якой, з аднаго боку, разьмеркаваньне ўплыву ў яе стане залежала ад доступу да грантадаўцаў, а зь іншага — здольнасьць апазыцыйнага лідэра да прыцягненьня замежных сродкаў для сваёй арганізацыі сталася чыньнікам, што забясьпечваў яго ўплыў і кантроль над сваімі структурамі (пра гэта, дарэчы, сьведчылі і праблемы ў штабе адзінага кандыдата падчас прэзыдэнцкіх выбараў, калі перабоі зь фінансамі справакавалі міні-страйк у шэрагах актывістаў кампаніі).

## Распад Каардынацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў

Наступным чыньнікам, які паглыбіў крызыс у апазыцыйным лягеры, стаў распад цягам 2002 году Каардынацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў — апошняй дэмакратычнай кааліцыі, што хоць у нейкай ступені аб’ядноўвала апазыцыйныя сілы і стварала гіпатэтычную магчымасьць каардынацыі іх дзейнасьці.

Да 2002 году ў апазыцыйным лягеры існавала некалькі кааліцый, якія адрозьніваліся складам і мэтамі. Першай такой структурай была Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў (КРДС), што была створаная напачатку 1999 году згодна з пастановай Кангрэсу дэмакратычных сілаў і выконвала ролю каардынацыйнага цэнтру палітычнай дзейнасьці дэмакратычнай апазыцыі. Каардынацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў (КРАПП) была створаная ў тым самым годзе пад патранажам АБСЭ і хутчэй выконвала ролю дыскусійнага форуму для выпрацоўкі пазыцыі палітычных партыяў у шэрагу пытаньняў, дзе яны мелі супольны інтарэс (напрыклад, зьмяненьні выбарчага заканадаўства). Апрача дэмакратычных апазыцыйных партыяў, КРАПП уключала таксама Лібэральна-дэмакратычную партыю С. Гайдукевіча і Партыю камуністаў Беларускую С. Калякіна, што падкрэсьлівала яе «форумны» фармат. Адсутнасьць адзінства праграмных мэтаў сярод партыяў — удзельнікаў КРАПП, багаж старых канфліктаў і сумнеўная апазыцыйнасьць некаторых яе ўдзельнікаў (перш за ўсё ЛДП) рабіла дзейнасьць гэтай арганізацыі малаэфэктыўнай.

Аднак нечаканая склаліся ўмовы, у якіх КРАПП была адзіным палітычным цэнтрам, у межах якога можна было супрацоўнічаць з рознымі апазыцыйнымі сіламі. Такому становішчу паспрыяў перш за ўсё распад КРДС, які пачаўся «па сьлядох» кампаніі «Выбары — байкот’2000», калі зь яе шэрагаў была выключаная БСДП (НГ) Мікалая Статкевіча за адмову ад тактыкі байкоту і спробу расколу ў апазыцыйным лягеры. Цэнтрабежныя тэндэнцыі ў КРДС на гэтым ня скончыліся. Пасьля сыходу БСДП — адной з трох найбуйнейшых апазыцыйных партыяў у краіне (разам з БНФ і АГП) — у радзе пачалі дамінаваць партыі правага і правацэнтрысцкага кірунку (БНФ і АГП), што выклікала незадаволенасьць прадстаўнікоў драбнейшых партыяў левага крыла, такіх, як партыя «Надзея», БСДГ С. Шушкевіча і Партыя працы. На працягу вясны-лета 2001 году гэтыя партыі сышлі з КРДС. (Дарэчы, выхад партыі «Надзея» быў шмат у чым абумоўлены тым, што яе тагачасны лідэр Валянціна Палевікова кіравала перадвыбарным штабам Уладзімера Ганчарыка, тым часам як бальшыня суб’ектаў КРДС падтрымлівала ў прэзыдэнцкай гонцы Сямёна Домаша.) Імкненьне партыяў да кааліцыйнага аб’яднаньня адыграла пэўную ролю як чыньнік у канкурэнцыі за вылучэньне адзі-

нага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах ад апазыцыі, але яно спрацавала хутчэй на яе раскол. Так, у ліпені 2001 году шэраг левых партыяў (БСДП, Партыя працы і ПКБ) заявілі аб стварэньні новай кааліцыі «За сацыяльныя перамены», у выніку чаго КРДС дэ-факта ператваралася ў аб'яднаньне правых партыяў, якое ўжо не магло выступаць ад усёй апазыцыі (так ці інакш, гэтыя два аб'яднаньні падтрымлівалі, адпаведна, Ганчарыка і Домаша).

Акрамя таго, трэцім дэмакратычным аб'яднаньнем, якое мела патэнцыял ахапіць усе палітычныя плыні ў апазыцыйным лягеры, можна ўмоўна прызнаць «шырокую грамадзянскую кааліцыю», што стварылася падчас прэзыдэнцкай кампаніі. Аднак, нягледзячы на заявы, што кааліцыя працягне сваю дзейнасьць і пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, яе існаваньне спынілася пасьля некалькіх пасьлявыбарных паседжаньняў штабу адзінага кандыдата. Перадвыбарнае аб'яднаньне было шмат у чым штучным альянсам, створаным пераважна пад ціскам звонку, якое, як тыповая сытуацыйная кааліцыя, распалася адразу ж пасьля выбараў.

Фактычна той жа лёс напаткаў і КРАПП як структуру, створаную пераважна пад вонкавым патранажам. Ува ўмовах, калі цікавасьць міжнародных гульцоў да апазыцыйных структураў зьнізілася, аб'яднаньне пачало цікавіць саміх удзельнікаў у першую чаргу як сродак аднаўленьня замежных кантактаў. Ужо ў студзені 2002 году паміж партыямі пачалася барацьба за тое, якая з кааліцыяў — КРАПП ці КРДС — мусіць прадстаўляць апазыцыю на міжнародных форумах. Як і можна было чакаць, у падтрымку КРДС выступілі суб'екты, якія падкрэсьлівалі магчымасьць больш жорсткай каардынацыі ў яе рамках, у той час як КРАПП баранілі прадстаўнікі ЛДП. Аднак паколькі КРДС страціла сваю прадстаўнічасьць, ролю «сувязнога» паміж апазыцыйнымі сіламі і эўраструктурамі пачала выконваць акурат КРАПП. У гэтых умовах пачалася барацьба за кантроль над прадстаўніцтвам у арганізацыі, якая трансфармавалася ў канкурэнцыю за доступ да замежных кантактаў і нават за іх манапалізацыю ўва ўмовах, калі падтрымка беларускай апазыцыі ў заходнім кірунку рабілася ўсё больш праблематычнай. Партыі-ўдзельнікі КРАПП пачалі выкарыстоўваць міжнародныя форумы (на якія запрашаліся іх прадстаўнікі) дзеля падвышэньня ўласнага статусу, што вылілася ўва ўнутранае высьвятленьне адносінаў. Так, напрыклад, удзел у 11-й сэсіі ПАСЭ ў Бэрліне ў ліпені 2002 году скончыўся скандалам, калі старшыня АГП А. Лябедзька заявіў, што ён зьяўляецца лідэрам КРАПП і прадстаўніком усёй беларускай апазыцыі. Скандал актыўна разьдзімала кіраўніцтва ЛДП, якое абвінавачвала лідэра АГП у спробе манапалізаваць кантакты з ПАСЭ і абмежаваць іх для іншых партыяў. Супярэчнасьці ўнутры КРАПП з нагоды прадстаўніцтва на міжнародных форумах узьнікалі яшчэ некалькі разоў летам-восеньню 2002 году.

Спроба выкарыстаць КРАПП для падрыхтоўкі апазыцыйнай кааліцыі для ўдзелу ў мясцовых выбарах засталася безвыніковай. У ліпені 2002 году група экспэртаў па заканадаўстве КРАПП падрыхтавала «Мэмарандум аб прынцыпах узаемаадносінаў і каардынацыі дзеяньняў палітычных партыяў у пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў у мясцовыя Рады». Дакумэнт прадугледжваў, што яго падпісантамі будуць кіраўнічыя органы мясцовых партыйных арганізацыяў, і абумоўліваў, што ўдзельнікі кааліцыі маюць права самастойна вызначаць мэханізм вылучэньня адзіных кандыдатаў у кожнай канкрэтнай акрузе, і толькі ў выпадку, калі няма адзінства, мясцовыя арганізацыі могуць зьвяртацца ў цэнтральныя органы па дапамогу. Удзельнікі пагадненьня самастойна вырашалі пытаньні аб супрацоўніцтве зь незалежнымі кандыдатамі, аб блякаваньні ў выпадку другога туру выбараў і аб стварэньні сыстэмы назіраньня. Калі адзінства ўсё ж не было дасягнута, дэмакратычныя партыі павінны былі трымацца цывілізаваных прынцыпаў паводзінаў, устрымлівацца ад узаемнай крытыкі і ад-

навіць кансультацыі адразу ж па першым туры[9]. Гэты дакумэнт, аднак, не знайшоў падтрымкі ў кіраўніцтве бальшыні партыяў, якія імкнуліся да цэнтралізацыі вырашэньня пытаньняў аб кааліцыйным будаваньні. Незадоўга да гэтага заклікі да аб’яднаньня апазыцыі для ўдзелу ў передвыбарнай кампаніі набылі выгляд палітычнай піяр-кампаніі, пры дапамозе якой асобныя партыі імкнуліся супрацьпаставіць сябе апанэнтам. Так, у траўні 2002 году лідэр БСДП (НГ) М. Статкевіч публічна крытыкаваў кіраўніцтва АГП і БНФ за нежаданьне аб’яднацца і, як было заяўлена, сабатаж падрыхтоўкі да выбараў (перад гэтым ён прапанаваў названым партыям стварыць передвыбарны блёк на базе КРАПП). Статкевіч заклікаў нізавыя структуры апазыцыйных партыяў самастойна вызначаць пытаньні аб’яднаньня[10]. Такія заклікі, аднак, былі расцэненыя канкуруючымі партыямі як памкненьне да расколу. Напрыклад, пасьля таго як на папярэдніх кааліцыйных перамовах паміж прадстаўнікамі менскіх арганізацыяў АГП і БСДП у чэрвені 2002 году з вуснаў кіраўнікоў раённых партыйных арганізацыяў прагучала крытыка ў адрас партыйных лідэраў, прадстаўнікам АГП быў забаронены ўдзел у такіх сустрэчах без кансультацыяў з сваім кіраўніцтвам. У рэшце рэшт, праблематычным зрабілася ўжо само існаваньне КРАПП, а ня толькі прыняцьце нейкіх рашэньняў у яе межах. Так, напрыклад, у жніўні-верасьні 2002 году паседжаньне рады зрывалася некалькі разоў пасьля таго, як КНГ АБСЭ, на тэрыторыі якой яна дагэтуль зьбіралася, адмовіла ў памяшканьні ў сувязі з згарненьнем дзейнасьці самой місіі. Паседжаньні на тэрыторыі штаб-кватэраў асобных палітычных партыяў кожны раз байкатаваліся некалькімі суб’ектамі КРАПП. Пазьней працу КРАПП падрывалі ўнутраныя канфлікты ў шэрагах некаторых партыяў. Так, напрыклад, паўнамоцтвы новага лідэра партыі «Надзея» Валянціны Матусевіч, якая была абраная ў ліпені 2002 году замест Валянціны Палевіковай, ставіліся пад сумнеў прадстаўнікамі АГП і БНФ (Матусевіч у той час займала пасаду прэсавага сакратара новаабранага старшыні цяпер ужо пралукашэнкаўскай ФПБ Леаніда Козіка, што ставіла пад сумнеў апазыцыйнасьць гэтай партыі пры новым кіраўніцтве).

Трэба зазначыць, што скандал вакол партыі «Надзея» ўзьнік дзякуючы імкненьню лідэраў найбуйнейшых партыяў да выкарыстаньня «карлікаў» у мэтах унутранай барацьбы. Так, яшчэ з канца 2000 году «правымі» партыямі правакаваўся раскол у шэрагах БСДП (НГ) з мэтай аслабіць пазыцыі Статкевіча, што не прыняў тактыкі байкоту выбараў у т.зв. палату прадстаўнікоў. Альтэрнатыву Народнай Грамадзе мусіла скласьці новая Аб’яднаная сацыял-дэмакратычная партыя, у якую павінны былі ўвайсьці фракцыя Аляксея Караля, якая выйшла з БСДП, партыя «Надзея» і БСДГ Станіслава Шушкевіча. Адхіленьне ад пасады В. Палевіковай і адмову «Надзеі» самаліквідавацца на карысьць АСДП шмат хто расцаніў як контрагульню Статкевіча. У знак пратэсту лідэры «правых» пагражалі сысьці з КРАПП. У адказ на гэта ў верасьні 2002 году БСДП (НГ), ПКБ і ЛДП агучылі ініцыятыву стварэньня новай Рады апазыцыйных сілаў.

Канчаткова КРАПП распалася ў сьнежні 2002 году, калі цягам двух тыдняў яе пакінулі ПКБ і Партыя БНФ. Першая матывавала сваё рашэньне тым, што праца КРАПП перастала насіць канструктыўны характар, другая канстатавала, што рада не дасягнула тых передвыбарных мэтаў, якія на яе ўскладаліся. Распад КРАПП пакінуў у апазыцыйным лягеры некалькі «падкааліцый»: КРДС (чыя дзейнасьць была амаль паралізаваная), Канфэдэрацыю «За

[9] Белорусская деловая газета. 2002. 1 августа.

[10] Белорусская деловая газета. 2002. 17 мая.

сацыяльныя перамены» (БСДП, Партыя працы і ПКБ), а таксама зноў створаныя кааліцыі — Сацыял-дэмакратычны саюз (БСДП, ПП і «Надзея») ды Кааліцыю «За незалежнасьць» (БНФ разам з АСДП), якія, да таго ж, самі не адрозьніваліся ўнутраным арганізацыйным адзінствам ці выразнай палітычнай актыўнасьцю. Гэта вяло да таго, што ўдзел апазыцыі ў мясцовых выбарах мог рэальна матэрыялізавацца выключна ў партыйным, а не ў кааліцыйна-апазыцыйным фармаце.

## Крызыс у партыйных структурах

Разбурэньне кааліцыйнага аб’яднаньня апазыцыі адбывалася паралельна з унутраным крызысам, які ў рознай ступені закрануў амаль усе вядучыя дэмакратычныя палітычныя партыі. Яго спрычыніла тая акалічнасьць, што супярэчнасьці, якія вызначалі агульны разлад у апазыцыйным стане (у першую чаргу — разыходжаньні наконт апазыцыйнай стратэгіі і тактыкі), вызначылі і лініі падзелаў унутры канкрэтных партыяў.

Адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў на мяжы расколу апынулася найстарэйшая апазыцыйная сіла краіны — Партыя БНФ. У ёй выявіліся супярэчнасьці паміж кіраўніцтвам партыі і прадстаўнікамі больш радыкальнай плыні — рухам «Малады Фронт», які падтрымліваў намесьнік старшыні БНФ Вячаслаў Сіўчык. Першапачатковай прычынай канфлікту стала пастанова Сойму БНФ аб скасаваньні трыццаціпрацэнтнай квоты для «Маладога Фронту» на зьезьдзе партыі. Гэтая пастанова дала пачатак працэсу, які скончыўся выхадам МФ з БНФ.

Прычынай крытыкі «радыкальнай» часткі БНФ свайго кіраўніцтва стала нязгода з абраным ім кірункам на кааліцыйнае супрацоўніцтва з палітычнымі сіламі, чыя адданасьць справе незалежнасьці знаходзілася пад пытаньнем (такая занепакоенасьць была выкліканая пэрспэктывай выбараў у парлямэнт Саюзу Беларусі і Расеі, што актыўна абмяркоўвалася пры канцы 2001 году; аб магчымасьці ўдзелу ў выбарах заявілі некаторыя апазыцыйныя партыі). Таксама рэзка крытыкаваўся і сам старшыня БНФ Вінцук Вячорка, які быў абвінавачаны ў няздольнасьці да кіраўніцтва арганізацыяй і ў тым, што БНФ страціў уплыў на палітычныя працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі. Аднак фактычна прычынай крытыкі В. Вячоркі было тое, што частка БНФ была незадаволеная тым, што старшыня партыі і яго каманда, па іх меркаваньнях, манапалізавалі кантроль над арганізацыяй і прыняцьцем рашэньняў праз структуры «трэцяга сэктару» і што дзейнасьць арганізацыі была падпарадкаваная акурат інтарэсам гэтых структураў, а ня мэтам ды ідэалёгіі фронту (так, Вячорка абвінавачваўся ў тым, што «здаў» Сямёна Домаша, якога падтрымлівала ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты большыня сяброў партыі). Альтэрнатыўная праграма дзеяньняў, прадстаўленая Сіўчыкам, прадугледжвала аднаўленьне ўзаемаадносінаў паміж дзьвюма часткамі расколатага БНФ, стварэньне «антысаюзнай» кааліцыі ў складзе БНФ, КХП-БНФ і БСДГ, уваходжаньне ў шырокую грамадзянскую кааліцыю пры ўмове, што астатнія яе суб’екты будуць выступаць за незалежнасьць, падтрымку грамадзянскіх ініцыятываў, што ня будуць пярэчыць Канстытуцыі 1994 году, барацьбу за выкананьне асноўных патрабаваньняў АБСЭ і вяртаньне да вулічных мэтадаў барацьбы з рэжымам. Вячорка парыраваў Сіўчыку, адзначыўшы, што такая тактыка прывядзе да маргіналізацыі БНФ, і выключыў магчымасьць сур’ёзных рэформаў унутры арганізацыі. Пры галасаваньні на зьезьдзе БНФ высьветлілася, што колькасьць апанэнтаў кіраўніцтва дасягала прыкладна чвэрці дэлегатаў (за Вячорку аддалі 246 галасоў, за Сіўчыка — 81).

Супярэчнасьці ўнутры БНФ праявіліся зноў у верасьні 2002 году, калі група рэгіянальных кіраўнікоў выступіла з адкрытым лістом, дзе выказваўся недавер кіраўніцтву партыі, якое зьвінавачвалася ў непадкантрольнасьці фінансавай дзейнасьці, непасьлядоўнасьці ў адстойваньні інтарэсаў партыі і ў мэтанакіраваным «выцісканьні» з партыі апанэнтаў кіраўніцтва. Кіраўніцтва БНФ успрыняло гэтую крытыку як спробу расколу партыі, у чым зноў зьвінавaціла В. Сіўчыка. Яшчэ большае падазрэньне выклікала самастойная палітычная дзейнасьць В. Сіўчыка, яго кантакты з палітычнымі партыямі, плынямі і незалежнымі палітыкамі, далёкімі ад БНФ, што ўспрымалася як ягоная спроба арганізацыі «трэцяй сілы» ў беларускай палітыцы. У выніку ў лютым 2003 году Сіўчык быў выключаны з Партыі БНФ, а крыху пазьней аформіўся «развод» партыі з «Маладым Фронтам».

Раскол у БСДП (НГ) юрыдычна аформіўся на зьезьдзе партыі ў сьнежні 2001 году, калі зь яе выйшла фракцыя пад кіраўніцтвам намесьніка старшыні партыі Аляксея Караля. Фракцыя «За адзінства» аформілася за год да таго, калі Кароль не падтрымаў рашэньне старшыні М. Статкевіча адмовіцца ад байкатаваньня выбараў у т.зв. палату прадстаўнікоў (Статкевіч пазьней абвінавачваў Караля ў тым, што яго фракцыйная дзейнасьць была інсьпіраваная правымі партыямі як помста за адмову ад тактыкі байкоту). Па выхадзе з БСДП (НГ) прыхільнікі Караля заявілі пра гатоўнасьць стварыць новую сацыял-дэмакратычную партыю, а таксама пра маючае адбыцца злучэньне з БСДГ С. Шушкевіча і партыяй «Надзея» В. Палевіковай у новую арганізацыю — Аб’яднаную сацыял-дэмакратычную партыю, што мелася стаць лідэрам на «левым» фланзе беларускай палітыкі.

Аднак стварэньне АСДП засталося нерэалізаваным праектам. Спачатку фракцыя Караля двойчы ня здолела зарэгістраваць уласную партыю (для чаго, згодна зь беларускім заканадаўствам, трэба было сабраць адну тысячу подпісаў заснавальнікаў новай партыі). Найбольшай перашкодай, аднак, стаў раскол у жаночай партыі «Надзея», адной з «карлікавых» партый на беларускай палітычнай сцэне, якая вылучалася адной акалічнасьцю — наяўнасьць прывабнага палітычнага «брэнду» рабіла «Надзею» цягам доўгага часу адзінай партыяй, рэйтынг якой стабільна перавышаў сацыялягічную пахібку пры апытаньнях публічнай апініі. Таму іншыя, больш моцныя палітычныя сілы імкнуліся трымаць «Надзею» ў якасьці хаўрусьніка. Кіраўнік партыі Валянціна Палевікова была шчыльна зьвязаная з кіраўніцтвам правых партыяў у рамках КРДС. Брэнд «Надзея» стаў разьменнай манэтай у супрацьстаяньні «буйных» апазыцыйных партыяў, а менавіта — БНФ і АГП, з аднаго боку, і БСДП (НГ) — зь іншага. У жніўні 2002 году група сяброўак партыі «Надзея» выступіла супраць аб’яднаньня ў АСДП, выказаўшы меркаваньне, што гэты крок вызначаецца выключна палітычнымі амбіцыямі Палевіковай і прывядзе да зьнікненьня ўплыву жаночага руху на палітычнай сцэне на карысьць буйных партыяў. Гэтая група правяла 17 жніўня пазачарговы зьезд «Надзеі», на якім Палевікова была адхіленая ад кіраўніцтва партыяй і замененая В. Матусевіч. У адказ група прыхільніц Палевіковай правяла праз тыдзень свой зьезд, на якім вынікі папярэдняга збору былі прызнаныя неправамоцнымі, было прынятае рашэньне аб ліквідацыі партыі і ўступленьні ў АСДП. Раскол у «Надзеі» быў справакаваны, на думку В. Палевіковай, партыяй Статкевіча, якая імкнулася не дапусьціць стварэньня канкуруючай арганізацыі на сацыял-дэмакратычным полі і такім чынам «адпомсьціць» правым партыям, што ў свой час нібыта падштурхоўвалі БСДП (НГ) да расколу. (Палевікова закідала Статкевічу, што менавіта ён у ліпені 2002 году ў Горадні падбухторыў тагачасных актывістаў штабу Ганчарыка арганізаваць пікеты, на якіх гучала патрабаваньне разьлічыцца за зробленую працу.) Дыспут паміж дзьвюма групоўкамі

вырашыла Міністэрства юстыцыі, якое пацьвердзіла паўнамоцтвы «Надзеі» В. Матусевіч.

Неўзабаве ў АСДП адмовілася ўвайсьці і БСДГ С. Шушкевіча. У ліпені 2002 году гэтая партыя выступіла з заявай, што БСДГ як партыя, афіцыйна зарэгістраваная Мінюстам, можа аб'яднацца зь дзьвюма непрызнанымі «паўпартыямі» толькі на ўмовах іх уступленьня ў Грамаду. Шушкевіч адзначыў, што аб'яднаньне ў новую структуру пагражала б ягонай партыі зьнішчэньнем. З БСДГ у АСДП адышла толькі невялікая група на чале з А. Трусавым, сябры якой, да таго ж, захавалі сяброўства ў партыі Шушкевіча, чый статут гэта дазваляе. Такім чынам, «аб'яднаньне» сацыял-дэмакратаў прывяло да драбленьня іх і бяз гэтага фрагмэнтаваных структураў.

Урэшце, «раскольніцкія» тэндэнцыі можна было назіраць і ў Аб'яднанай грамадзянскай партыі. Гэтая структура традыцыйна вырозьнівалася сярод апазыцыйных сілаў бадай што найменшым узроўнем унутранай дысцыпліны (нягледзячы на забарону, некаторыя яе сябры былі дэпутатамі т.зв. палаты прадстаўнікоў, да таго ж падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2001 году некаторыя яе функцыянэры абвінавачваліся ў падтрымцы Наталі Машэравай, якая па поглядах бліжэйшая да Лукашэнкі, чым да апазыцыі). Першым буйным скандалам стала выключэньне ў жніўні 2002 году з партыі кіраўніка Фрунзэнскай раённай арганізацыі Людмілы Бажок, якая надзвычай рэзка выказвалася пра кіраўніцтва АГП (за сабатаж аб'яднаўчых працэсаў у апазыцыі) і фактычна гуляла на баку галоўнага вонкавага крытыка палітыкі АГП — Міколы Статкевіча (дарэчы, пасьля выключэньня Бажок далучылася да БСДП (НГ). Яна была абвінавачана ў падробцы партыйных дакумэнтаў з мэтай іх перапродажу за грошы нядобрасумленным беларускім грамадзянам, якія ўсімі праўдамі й няпраўдамі імкнуцца атрымаць палітычны прытулак на Захадзе. Тады ж яна выступіла ў сродках масавай інфармацыі, заявіўшы, што рабіла гэта з згоды і ведама кіраўнікоў АГП (інтэрвію было перадрукаванае «Советской Белоруссией»). У кастрычніку 2002 году з АГП публічна сышлі кіраўнікі пяцёх раённых арганізацыяў у Менску, якія заявілі, што дзейнасьць партыі пасьля зьмены кіраўніцтва ў 2000 году займела «авантурны радыкальны характар» (тут маецца на ўвазе збліжэньне з БНФ і ўдзел у кампаніі «Байкот'2000»), а таксама выказалі нязгоду з гатоўнасьцю кіраўніцтва АГП падтрымаць інтэграцыю з Расеяй. Аднак партыя здолела мінімізаваць адмоўны эфэкт ад дэмаршу рэгіянальных лідэраў пасьля таго, як гэтыя захады былі асуджаныя яе ганаровым кіраўніком Станіславам Багданкевічам (які ў свой час таксама рэзка крытыкаваў новых кіраўнікоў АГП за падтрымку байкоту парлямэнцкіх выбараў і падтрымліваў сяброў партыі, якія насуперак рашэньню кіраўніцтва прынялі ў іх удзел).

Такім чынам, зыход з АГП асобных сяброў і кіраўнікоў сярэдняга зьвяна не прывёў да расколу, але актыўнае асьвятленьне ў сродках масавай інфармацыі ўнутраных скандалаў у партыі наўрад ці дадало ёй дадатнага іміджу.

## У Эўропу — праз Камчатку ці Варшаўскі мост?

Наступным паказьнікам крызысных тэндэнцыяў у апазыцыйным лягеры стала разыходжаньне па фундамэнтальных вартасных пытаньнях, чаму, як гэта ні парадаксальна, спрыяў крызыс ідэалёгіі самога рэжыму. Крытычныя выказваньні прэзыдэнта Расеі Ўладзімера Пуціна, у якіх ён абвінаваціў свайго беларускага калегу ў сабатажы інтэграцыі і маніпуляцыі ёй у сваіх палітычных мэтах, безумоўна, стварылі праблемы для Лукашэнкі і паставілі пад

пагрозу адзін з наймацнейшых сродкаў, з дапамогай якога ён на працягу амаль дзесяцігодзьдзя легітымізаваў свае прэтэнзіі на абсалютную ўладу на ўнутраным і расейскім палітычных рынках. Разбурэньне іміджу Лукашэнкі як галоўнага інтэгратара і тарпэдаваньне на некаторы час канфэдэрацыйнага праекту разьвеяла ілюзіі беларускага грамадзтва наконт таго, што саюз з усходняй суседкай зможа вырашыць усе праблемы краіны. Лукашэнка пачаў адстойваць дзяржаўны сувэрэнітэт, што паспрыяла нарошчваньню «незалежніцкага» палітычнага поля. Баронячыся ад Пуціна, беларускі прэзыдэнт мусіў гуляць на ідэалягічным полі апазыцыі.

Супярэчнасьці паміж двума лідэрамі, што праявіліся ўлетку 2002 году, падштурхнулі частку апазыцыйных сілаў краіны да палітычнай гульні з пуцінскім атачэньнем, відавочна, у надзеі на тое, што пасьля канфлікту актывізуецца і расейская прысутнасьць на ўнутраным палітычным рынку Беларусі, што дасьць новыя фінансавыя рэсурсы для «прарасейскай» дэмакратычнай апазыцыі. Яны дабіваліся кантактаў з пуцінскай адміністрацыяй, адной зь перадумоваў якіх была згода на поўнае ці частковае абмежаваньне дзяржаўнага сувэрэнітэту Беларусі. Выявілася і яшчэ адна неспрыяльная для апазыцыйных сілаў рэчаіснасьць. Уся іх палітычная дзейнасьць і ідэалёгія так ці інакш грунтаваліся на празаходняй і праэўрапейскай арыентацыі, на карціне сьвету, што складаўся з дэмакратычнага Захаду (як партнэра ды спонсара) і імпэрскай Расеі (як асноўнай вонкавай пагрозы). Але здольнасьць расейскага прэзыдэнта да стварэньня сытуацыйных кааліцыяў ці то з Злучанымі Штатамі (падчас вайны зь міжнародным тэрарызмам), ці то зь вядучымі эўрапейскімі дзяржавамі (падчас вайны ў Іраку) сьведчыла пра тое, што дзеля часткі апазыцыйных сілаў Расея аказвалася «сябром свайго сябра». Гэта азначала, што антырасейская рыторыка ўжо не магла быць эфэктыўным інструмэнтам забесьпячэньня падтрымкі на замежных палітычных рынках. Як вынік, некаторыя апазыцыйныя сілы, якія дагэтуль выразна арыентаваліся на ЗША, пачалі шукаць падтрымкі ў Расеі. Дадамо, што расейскі фактар мог раскалоць апазыцыю яшчэ раней, калі б былі абвешчаныя выбары ў саюзны парлямэнт, але канфлікт Пуціна з Лукашэнкам паказаў, што такія выбары немагчымыя.

Адразу пасьля першых заяваў Пуціна з ініцыятывай аб правядзеньні рэфэрэндуму аб інтэграцыі выступілі два былыя прэтэндэнты ў кандыдаты на пасаду прэзыдэнта Беларусі — Леанід Сініцын і Аляксандар Ярашук. Гэтую ініцыятыву можна было б разглядаць выключна як авантурны акт палітыкаў, што ня мелі ўласнай палітычнай базы (заўважым, што ініцыятыва была «сырая», а пытаньні, прапанаваныя А. Ярашуком — напрыклад, «ці давяраеце вы прэзыдэнту А. Лукашэнку вызначэньне палітыкі інтэграцыі з Расейскай Фэдэрацыяй», — не вытрымлівалі крытыкі зь юрыдычнага пункту гледжаньня), але яна атрымала даволі шырокі розгалас у незалежных сродках масавай інфармацыі. Так, у «Белорусской деловой газете» зьявіўся артыкул дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД) прафэсара Алега Манаева, у якім ён сьцьвярджаў, што Лукашэнка ня здолее супрацьстаяць Пуціну, калі пярэйдзе на пазыцыі абароны незалежнасьці, з той нагоды, што «незалежніцкае» поле было зьнішчана ім жа самім дзеля забесьпячэньня ўласнай інтэграцыйнай палітыкі.

Разыграць расейскую карту ў гульні супраць Лукашэнкі вырашыла АГП, адзіная сярод рэальна дзеючых на беларускім палітычным полі партыя, якая мела шчыльныя стасункі з расейскім Саюзам правых сілаў. АГП будавала сваё партнэрства з расейскімі правымі ледзьве ня з моманту свайго заснаваньня, але актывізавалася яно акурат пачынаючы з

2000 году, калі СПС заняў выразна прапуцінскія пазыцыі. Асновай узаемных дзеяньняў дзьвюх партыяў стала атака на Лукашэнку па двух пунктах: першае — парушэньні правоў чалавека ў Беларусі (так, СПС актыўна «раскручваў» тэму зьніклых беларускіх палітыкаў у расейскай інфармацыйнай прасторы), другое — яго нежаданьне рэальна інтэгравацца з Расеяй з мэтай захаваць уладу. Ідэйнай асновай антылукашэнкаўскай дзейнасьці гэтых сілаў мусіў стаць дакумэнт «Правы погляд на расейска-беларускую інтэграцыю». Дзьве партыі заявілі аб сваёй прыхільнасьці да інтэграцыі Беларусі і Расеі, у першую чаргу, эканамічнай, паводле мадэлі Эўразьвязу, і канстатавалі, што менавіта антыдэмакратычны рэжым Лукашэнкі зьяўляецца галоўным тормазам расейска-беларускага аб’яднаньня. Гэты дакумэнт выразна пазыцыянаваў абедзьве сілы як прапуцінскую апазыцыю да беларускай дыктатуры, аб чым адкрыта заявіў лідэр СПС Барыс Нямцоў: «Насьмелюся сказаць, што падпісанае паміж АГП і СПС пагадненьне на 90 адсоткаў будзе падтрымана Крамлём. Думаю, гэтая канцэпцыя нашмат бліжэйшая да расейскіх уладаў, чым усё тое, што публічна выказваецца»[11].

Аднак, імкнучыся перайграць Лукашэнку з дапамогай Пуціна, АГП перайшла тую мяжу, за якой пачыналіся кампрамісы наконт галоўнай вартасьці і прынцыпу, які аб’ядноўваў беларускі апазыцыйны рух, — адстойваньне незалежнасьці Беларусі. Нагадаем, што кіраўніцтва СПС на працягу некалькіх гадоў неаднаразова выказвала думку, што адзіным спосабам расейска-беларускай інтэграцыі можа быць уваходжаньне Беларусі ў склад Расеі. Да таго ж, калі такія меркаваньні выказваліся зноў у 2002 годзе, кіраўніцтва АГП не сьпяшалася іх спрастоўваць. Пра гэта сьведчыць, напрыклад, скандальная тэлефонная размова Б. Нямцова і А. Лябедзькі, чый транскрыпт зьявіўся на старонках афіцыйнай прэсы. (Нягледзячы на сумнеўнае паходжаньне стужкі, я карыстаюся яе транскрыптам, бо адзін з суразмоўцаў — Б. Нямцоў — пацьвердзіў факт размовы.)

«Нямцоў: Гэта значыць, вось другі варыянт Пуціна вельмі мяккі і захоўвае сувэрэнітэт.

Лябедзька: Так.

Нямцоў: Захоўвае як бы дзяржаўнасьць і гэтак далей — з аднаго боку. Зь іншага боку, дае магчымасьць праз стандартную эўрапейскую працэдуру ратыфікаваць агульнасаюзнае рашэньне, што зьвязана з падаткамі, з тарыфамі, з мытнямі і гэтак далей. Мне здаецца, што гэты варыянт вельмі выгадны, і ён дазволіць нам моцна давіць на Луку, каб яго скінуць. Выбраць парлямэнт. Дарэчы, я ня ведаю, ці чытаў ты маё інтэрвію?

Лябедзька: Чытаў, канечне.

Нямцоў: На мой погляд, вам цяпер выгадна, каб расейцаў там было больш, чым беларусаў. Я яшчэ раз, выходзячы абсалютна зь беларускіх меркаваньняў, гэта сказаў. Таму што, калі там будзе парытэт хоць які... Я канечне разумею, што з пункту гледжаньня шапказакідальніцтва і крыкаў, мы роўныя. Канечне, 50 на 50, можа быць, для Лукі 100% лепш. Але для вас гэта катастрофа. Таму што 50 будзе ім прызначана, плюс нашыя штрэйкбрэхеры — камуністы і нацыяналісты. І ў яго будзе кантрольны пакет, так ня пойдзе. Мы ніводнага пытаньня ня вырашым. Іншая справа, што мы можам, напрыклад, гэты парлямэнт зрабіць на пераходны пэрыяд, на пяць гадоў ці на тры гады, ня ведаю.

Лябедзька: Так.

Нямцоў: І вызначыць яго статус прапарцыйна колькасьці жыхароў, эканоміцы краінаў і

[11] Народная Воля. 2002. 4 траўня.

гэтак далей. Прычым гэта ня вам трэба выказваць, таму што гэта не прыгожа. Вас абвінавацяць у тым, што вы здаяце Беларусь. Гэта нам трэба казаць»[12].

Цягам лета-восені 2002 году АГП апынулася ў стане ізаляцыі з боку іншых апазыцыйных плыняў, што не згаджаліся зь яе палітыкай кампрамісаў у пытаньні незалежнасьці. Такая пазыцыя вяла да разрыву з галоўным партнэрам партыі на апазыцыйным полі — Партыяй БНФ. Кіраўніцтва АГП было вымушана абараняцца, тлумачачы, што стратэгічны курс партыі на партнэрства з Пуціным не азначае тое, што партыя згаджаецца на страту незалежнасьці краіны, а толькі мае на ўвазе аб'яднаньне намаганьняў дзьвюх краінаў для таго, каб інтэгравацца ў Эўропу, і ажыцьцяўляецца ў рамках лёзунгу «Разам з Расеяй — у Эўропу!». Так, А. Лябедзька тлумачыў: «Расейскі лідэр публічна фармулюе палітычную мэту: Расея — дэмакратычная краіна з рынкавай эканомікай, інтэграваная ў эўрапейскую палітычную і эканамічную прастору. Дазвольце, але гэта адпавядае нашым мэтам у дачыненьні да Беларусі. Па-другое, гэта на 180 градусаў не супадае з канцэпцыяй і стратэгіяй Лукашэнкі»[13]. Зазначым, аднак, што ў «правым поглядзе» выказвалася падтрымка некаторым захадам, што спрыялі б інкарпарацыі Беларусі ў Расею (такім, як мытны саюз ці допуск расейскіх алігархаў да прыватызацыі беларускай маёмасьці). Нават пакідаючы пытаньне незалежнасьці па-за ўвагай, зазначым, што інтэграцыя з пуцінскай Расеяй у палітычным пляне вяла б да замены аднаго аўтарытарнага рэжыму іншым, хіба што нязначна больш рынкавым[14]. Відавочна, што, маючы на ўвазе той стан, у якім рэальна знаходзіцца ўсходняя суседка Беларусі, інтэграцыя з Расеяй па прынцыпе Эўразьвязу і немагчымая.

Аднак ня менш неабгрунтаванай была і іншая крайнасьць — успрыняцьце Лукашэнкі як ратавальніка беларускай незалежнасьці і заклік яму падтрымкі, што агучвалася пэўнай часткай незалежніцкага лягера[15]. Такая пазыцыя дала падставу для абвінавачаньня ўжо лібэраламі нацыянал-дэмакратаў у аўтарытарным нацыяналізьме. Заўважым, што фармулёўка альтэрнатываў — «Беларусь з Лукашэнкам ці дэмакратыя безь Беларусі» — спрыяла частковаму выхаду беларускіх уладаў з ідэалягічнага крызысу, бо яна прымушала выбіраць паміж найменшым і найбольшым злом, пакідаючы апанэнтаў рэжыму перад выбарам паміж непрымальнымі і да таго ж маларэальнымі альтэрнатывамі.

Але ўжо сустрэча Пуціна і Лукашэнкі ў лістападзе 2002 году, вынікам якой стала рашэньне працягваць працу над канстытуцыйным актам па старой (фактычна — лукашэнкаўскай) схеме, пацьвердзіла, што ўспрымаць і Пуціна як ратавальніка беларускай дэмакратыі, і Лукашэнку як гаранта беларускай незалежнасьці было як мінімум заўчасна. Іронія ў тым, што і тэндэнцыі грамадзкага разьвіцьця, якія акрэсьліліся пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, і супрацьстаяньне Лукашэнкі і Пуціна ў чэрвені-лістападзе 2002 году, і ўзьніклая сьледам «сувэрэнізацыя» афіцыйнай рыторыкі беларускіх уладаў спрыялі таму, што апазыцыя магла палепшыць сваё становішча ў грамадзтве, проста захаваўшы кансэнсус вакол сваіх базавых вартасьцяў — незалежнасьці і дэмакратыі. Гэты кансэнсус, аднак, быў часова разбураны апартунізмам і палітычнай нізкавокасьцю асобных удзельнікаў апазыцыйнага лягера.

[12] Советская Белоруссия. 2002. 4 сентября.

[13] Народная Воля. 2002. 6 лістапада.

[14] У індэксе эканамічнай свабоды амэрыканскага фонду "Heritage" Беларусь і Расея адрозьніваліся толькі на некалькі пунктаў.

[15] Гл. газэту "Наша Ніва".

## Высновы

За пэрыяд пасьля прэзыдэнцкіх выбараў беларуская апазыцыя ня толькі не змагла пераадолець унутраных крызысных тэндэнцыяў, што былі прычынай яе паразы, але і дазволіла ім разгарнуцца. 2002 год прайшоў пад знакам яе далейшай фрагмэнтацыі адразу па некалькіх лініях, да якіх можна аднесьці ідэалягічныя разыходжаньні, канкурэнцыю асобных лідэраў, пытаньні стратэгіі і тактыкі, а таксама цывілізацыйна-геапалітычныя арыентацыі асобных плыняў у яе стане. Асабліва балючым чыньнікам расколу стала тое, што пад уплывам кароткатэрміновай лёгікі палітычнага дзеяньня пачаў разбурацца існы дагэтуль кансэнсус вакол вартасьцяў дзяржаўнага сувэрэнітэту і незалежнасьці.

І ўсё ж такі варта адзначыць, што «флірт» АГП з Расеяй і спробы ўзьняцьця свайго статусу пры дапамозе інтэграцыйнай тэматыкі мелі часовы эфэкт. Ужо ў 2003 годзе партыя адышла на свае ранейшыя пазыцыі падтрымкі дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі, а яе кіраўнікі рэзка выступалі супраць інтэграцыйных ініцыятываў, такіх, як увядзеньне расейскага рубля на тэрыторыі Беларусі. Аднак падобныя праявы кароткачасовага палітычнага апартунізму могуць у цэлым саслужыць благую службу доўгачасовым палітычным мэтам апазыцыі, бо могуць пагражаць разбурэньнем падмуркаў, на якіх магло б грунтавацца яе адзінства.

Унутраная фрагмэнтацыя дэмсілаў была шмат у чым спрычынена іх адчайнымі спробамі пераадолець крызыс ідэнтычнасьці, у якім амаль усе яны апынуліся пасьля кампаніі 2001 году, здабыць уласнае аблічча, пазнавальнасьць і палітычную нішу. Аднак спробы задаволіць натуральную для суб’ектаў палітычнага працэсу патрэбу ў самаідэнтыфікацыі ажыцьцяўляліся за кошт адмовы ад ідэі адзінай дэмакратычнай апазыцыі як дзейнай і эфэктыўнай альтэрнатывы існаму палітычнаму рэжыму. Таму эрозія лукашэнкаўскай гегемоніі над беларускім грамадзтвам не суправаджалася ўсталяваньнем контрагегемоніі з боку апазыцыі, а імкліва выраслы грамадзкі попыт на дэмакратычныя зьмены яшчэ на пэўны час застаўся без прапановы.

# УНУТРАНАЯ ПАЛІТЫКА РЭЖЫМУ ЛУКАШЭНКІ: ВЕРАСЕНЬ 2001 – ЛЮТЫ 2003 ГОДУ

Паліттэхнолягі, якія займаюцца правядзеньнем выбарчых кампаніяў, кажуць, што выбарчая кампанія пачынаецца ў той момант, калі сталі вядомыя вынікі папярэдніх выбараў. У першыя дні пасьля 9 верасьня 2001 году Аляксандар Лукашэнка наўрад ці ў поўнай ступені адчуў асалоду ад «прыгожай і элегантнай перамогі». Сухая афіцыйная фармулёўка: «другі прэзыдэнцкі тэрмін» — павінна была непрыемна рэзаць слых асобы, якая была так неразборлівая ў сродках для захаваньня ўлады. Другі — значыць, апошні. Паўстае пытаньне: што далей? З кожнай хвілінай набліжаўся 2006 год.

## Наладжваньне апарату

Ужо ў першай заяве, зробленай Лукашэнкам у якасьці новаабранага кіраўніка дзяржавы

10 верасьня 2001 году, былі акрэсьленыя абрысы новага пэрсанальнага складу найвышэйшых эшалёнаў улады. Неўзабаве новая кадравая палітыка матэрыялізавалася ў новых прызначэньнях: на галоўныя ролі выйшлі былыя кэдэбісты, якія сваёй працай, майстэрствам інтрыгі, гульнёй з апанэнтамі забясьпечылі высокі ўзровень арганізацыі і правядзеньня выбарчай кампаніі «кіраўніка дзяржавы». Кіраўнік выбарчага штабу Лукашэнкі, былы сакратар Рады Бясьпекі, палкоўнік КДБ Урал Латыпаў узначаліў Адміністрацыю Прэзыдэнта (АП). Ён ужо даўно адыгрываў вялікую ролю пры вызначэньні ўнутранай і замежнай палітыкі рэжыму, і цяпер гэтая роля ўвасобілася ў адпаведнай пасадзе. «Правая рука» Латыпава, былы першы намесьнік сакратара Рады Бясьпекі, генэрал-маёр КДБ Станіслаў Князеў быў прызначаны на пасаду першага намесьніка кіраўніка АП. Яго фармальнай сфэрай адказнасьці сталі пытаньні «дзяржаўнай ідэалёгіі». Былы віцэ-прэм'ер Леанід Козік, які раней ува ўрадзе адказваў за беларуска-расейскія сувязі, заняў месца, рангам ніжэйшае за Князева: атрымаў прызначэньне на пасаду намесьніка старшыні АП. Колішні дырэктар Барысаўскай шытной фабрыкі, дэпутат Вярхоўнай Рады 12-га і 13-га скліканьня, кіраўнік парлямэнцкай камісіі па эканамічнай рэформе, які пасьля паказаў сябе цьвёрдым прыхільнікам Лукашэнкі, Л. Козік быў прызначаны адказным за кадравую палітыку, эканамічныя пытаньні і ўзаемаадносіны паміж АП і ўрадам.

Першыя прызначэньні падкрэсьлілі статус структуры, якая выконвала ролю цэнтральнага мэханізму палітычнай сыстэмы, згодна з воляй кіраўніка дзяржавы прыводзіла ў дзеяньне «пэрыфэрыйныя» мэханізмы (урад, парлямэнт, інстытуты судовай улады, дзяржаўныя СМІ), а таксама «выканаўчую вэртыкаль». Толькі пасьля адпаведнай «настройкі» цэнтральнага мэханізму можна было аддаць увагу іншым элемэнтам дзяржаўнай машыны. Гэтыя прызначэньні сьведчылі аб адсутнасьці зьменаў у характары палітычнага рэжыму.

Выдаленьне зь першых роляў былога старшыні АП М. Мясьніковіча, намесьнікаў старшыні АП У. Замяталіна і Ю. Сівакова азначала зьмену эпох у гісторыі аўтарытарнага рэжыму. Гаспадарнік і добры выканаўца Мясьніковіч, палітработнік Замяталін, танкіст Сівакоў — яны адыгралі свае ролі і былі цяпер непатрэбныя. На першыя ролі выйшлі не акторы і выканаўцы, а сцэнарысты і рэжысэры ў адной асобе — кэдэбісты Латыпаў і Князеў. Прывід «намэнклятурнай рэвалюцыі» цяпер быў ужо непатрэбны. Не было ўжо і сэнсу захоўваць бачнасьць «фронды» намэнклятуры.

У нейкай ступені на характар кадравых прызначэньняў у складзе АП паўплывалі і вонкавыя чыньнікі. Перад пагрозай ціску з боку Масквы Лукашэнка не палічыў патрэбным паставіць этнічных расейцаў — Замяталіна і Сівакова — на нават нязначныя пасады. Яны былі выпраўленыя ў палітычнае небыцьцё. Добра паслужыўшы, М. Мясьніковіч быў прызначаны на пасаду «памочніка прэзыдэнта ў асаблівых даручэньнях»: нейкі час разглядалася магчымасьць выкарыстаць асабістыя кантакты Мясьніковіча з расейскай палітычнай элітай. Урэшце 19 кастрычніка 2001 году яго паставілі прэзыдэнтам Нацыянальнай акадэміі навук.

Адной з мэтаў новага кіраўніцтва АП была зачыстка палітычнай прасторы ад усяго, што нагадвала аб тым, як была дасягнутая «элегантная і прыгожая перамога». Важным заданьнем уладаў было «навядзеньне парадку» ў прафсаюзах, якія выйшлі з-пад кантролю. 15 верасьня прафсаюз работнікаў дзяржаўных установаў прыняў заяву, якая асуджала палітызацыю прафсаюзаў і ставіла пытаньне аб зьмене кіраўніцтва ФПБ. У. Ганчарык павінен быў сысьці. Зачыстка інфармацыйнага поля была даручана рэспубліканскай пракуратуры, узначаленай старым паплечнікам Лукашэнкі Віктарам Шэйманам. Удар быў нанесены па неза-

лежных СМІ, якія актыўна ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі. Гарадзенская пракуратура ініцыявала працэс ліквідацыі газэты «Пагоня». Ціск на незалежныя СМІ чыніў Дзяржаўны камітэт па друку, які, у прыватнасьці, зрабіў папярэджаньне газэце «Народная Воля».

Пры канцы верасьня ў выніку рэалізацыі «праграмы рэфармаваньня беларускага ўраду» быў значна спрошчаны апарат Рады Міністраў: колькасьць міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў і канцэрнаў была скарочаная амаль удвая, з 44 да 28. Два з чатырох прызначаных Лукашэнкам віцэ-прэм’ераў (да рэформы ўраду ў яго складзе былі сямёра віцэ-прэм’ераў) мелі беспасярэднюю дачыненьне да правядзеньня яго выбарчай кампаніі. На значную пасаду быў прызначаны былы намесьнік старшыні Гомельскага аблвыканкаму Сяргей Сідорскі — ён стаў апекавацца прамысловасьцю. Адной з прычынаў яго імклівага кар’ернага ўзьлёту быў дасягнуты ім улетку 2001 году посьпех: толькі ў яго рэгіёне абласныя прафсаюзы афіцыйна заявілі аб падтрымцы Лукашэнкі[1]. Віцэ-прэм’ерам, адказным за ахову здароўя, адукацыю, навуку і сацыяльную сфэру, быў прызначаны былы першы намесьнік старшыні Менскага аблвыканкаму Ўладзімер Дражын. Сваё прызначэньне — наглядніка за неляяльнай да рэжыму беларускай інтэлігенцыяй — Дражын заслужыў тым, што падчас выбарчай кампаніі ўзяў за свой кошт адпачынак, каб цалкам сканцэнтравацца на дзейнасьці на карысьць свайго патрона. Лукашэнка меў усе падставы быць упэўненым і ў правільнасьці выбару кандыдатуры першага віцэ-прэм’ера, які курыраваў «агульныя эканамічныя пытаньні». Гэту пасаду заняў вылучэнец Даўгалёва Андрэй Кабякоў, які цягам 1995—1999 гадоў займаў пасаду намесьніка старшыні КДК, а ў студзені-ліпені 2000 году яго ўзначальваў (на гэтай пасадзе яго зьмяніў кэдэбіст А. Тозік).

Пазбаўлены ў выніку праведзенай рэформы часткі кіраўнічых функцыяў, урад стаў больш кампактнай і больш празрыстай для кантролю з боку АП структурай. Тры з чатырох віцэ-прэм’ераў (віцэ-прэм’ерам, адказным за сельскую гаспадарку і харчовую прамысловасьць, быў прызначаны Аляксандар Папкоў) былі ня столькі прафэсійнымі мэнэджэрамі, колькі палітычнымі функцыянэрамі і кантралёрамі. Сідорскі, Дражын і Кабякоў забясьпечвалі палітычны кантроль над дзейнасьцю ўраду знутры гэтай установы.

24 верасьня стаў першым днём працы прызначанага Лукашэнкам ураду. У адрозьненьне ад іншых эўрапейскіх краінаў, у Беларусі існуе правіла прызначаць сьпярша чальцоў ураду, потым — прэм’ер-міністра. На практыцы гэта азначала, што чальцы ўраду нясуць пэрсанальную адказнасьць перад прэзыдэнтам, а не прэм’ер-міністрам, што рэзка зьмяншала значэньне самой гэтай пасады. Да таго ж на першыя ролі ўва ўрадзе вылучаліся віцэ-прэм’еры — асабіста адданыя Лукашэнку асобы.

Праграма рэфармаваньня ўраду прадугледжвала таксама ператтварэньне Дзяржаўнага камітэту ў справах друку ў Міністэрства інфармацыі. Адпаведна была пашыраная сфэра адказнасьці гэтай установы. У вэтэрана барацьбы на «інфармацыйным фронце» М. Падгайнага зьявілася значна большая прастора для дзеяньняў.

## Вызначэньне кірунку галоўнага ўдару

28 верасьня 2001 году каля дзьвюх тысяч рашуча настроеных рабочых МТЗ перакрылі каля свайго заводу рух у знак пратэсту супраць нявыплаты заробку. Акцыя мела палітычны

[1] Белорусская деловая газета. 2001. 26 сентября.

падтэкст: сярод работнікаў прайшла пагалоска, што іх грошы пайшлі на правядзеньне сьвята «Дажынкі» ў Мазыры, у якім браў удзел асабіста Лукашэнка. Выкліканыя на месца акцыі падразьдзяленьні міліцыі ўхіліліся ад якіх-колечы дзеяньняў: на МТЗ канчалася рабочая зьмена і дэманстрантаў прыбывала.

Уздым рабочага руху, масавыя выступы абураных работнікаў разглядаліся рэжымам як пагроза № 1. Натоўп працоўных перад будынкам ураду ў красавіку 1991 году як кашмар стаяў перад вачыма кіруючай эліты.

Падзея 28 верасьня аказала ўплыў на ўнутраную палітыку рэжыму. Смугой няяснасьці былі ахутаныя дачыненьні з Масквой: на адмову афіцыйнага Менска перадаць кантроль над стратэгічна важнымі прамысловымі аб’ектамі расейцы маглі адказаць эканамічным уціскам. Сваёй чаргой, рост сацыяльнай напружанасьці мог прывесьці да палітычных забурэньняў. Дзеля гэтага пад найпільнейшую ўвагу з боку Лукашэнкі лучыў перадусім менскі дырэктарат, а таксама працоўныя калектывы менскіх прадпрыемстваў. Улады таксама ўсяляк імкнуліся дасягнуць кантролю над прафсаюзным рухам.

1 кастрычніка 2001 году завяршылася інтрыга з прызначэньнем прэм’ер-міністра. Ім стаў інжынэр-будаўнік па прафэсіі, які ў савецкі час працаваў у абкаме КПБ, а за часоў незалежнасьці займаў пасаду міністра і віцэ-прэм’ера, Генадзь Навіцкі. З «дысцыплінаваным і выканаўчым» прэм’ерам урад канчаткова ператварыўся ў філію АП. Памяркоўны Навіцкі, ляяльнасьць якога не выклікала сумневу (ён ня быў фігурай, здольнай да самастойных крокаў ці незалежных ацэнак палітыкі Лукашэнкі), адцяпер нёс фармальную адказнасьць за эканамічную палітыку, да вызначэньня якой ён меў толькі ўскоснае дачыненьне. Тым самым працягвала існаваць мадэль «добры прэзыдэнт — кепскі ўрад», згодна зь якой Лукашэнка пэрыядычна перакладаў на ўрад адказнасьць за цяжкасьці нацыянальнай эканомікі і прыняцьце непапулярных рашэньняў.

31 кастрычніка 2001 году палата прадстаўнікоў прыняла закон «Аб надзвычайным становішчы». Адпаведны законапраект быў унесены АП яшчэ ў траўні 2001 году — тады ўлада рыхтавалася да «непрыемнасьцяў», якія магла выклікаць фальсыфікацыя вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. Закон даваў прэзыдэнту вельмі шырокі спэктар надзвычайных паўнамоцтваў. Указам кіраўніка дзяржавы аб увядзеньні надзвычайнага становішча маглі быць прадугледжаныя наступныя захады: «абмежаваньне свабоды друку і іншых СМІ шляхам увядзеньня папярэдняй цэнзуры з указаньнем умоваў і парадку яе ажыцьцяўленьня; канфіскацыя і арышт друкарскай прадукцыі, радыёперадавальных, гуказапісвальных, гукаўзмацняльных тэхнічных сродкаў і памнажальнай тэхнікі; устанаўленьне парадку акрэдытацыі журналістаў; прыпыненьне дзейнасьці палітычных партыяў і іншых грамадзкіх аб’яднаньняў, што перасьледуюць палітычныя мэты, якія перашкаджаюць ліквідаваць чыньнікі, што былі падставай для ўвядзеньня надзвычайнага становішча»[2]. Прыняцьце гэтага закону стварала праўную базу для жорсткіх захадаў пры дэстабілізацыі рэжыму.

Адначасна з правядзеньнем «прафіляктыкі» супраць палітычных выступаў эканамічнай эліты, працоўных калектываў і прафсаюзаў кіруючая эліта ў пачатку лістапада 2001 году аднавіла «баявыя дзеяньні» супраць дэмакратычных палітычных партыяў, якія сілком уцягваліся ў працяглае супрацьстаяньне з уладай. Такая тактыка дазваляла паступова зьнясіліць апазыцыю, ізаляваць найбольш актыўныя яе элемэнты. Праціўнікаў рэжыму было зручней

[2] Белорусская деловая газета. 2001. 1 ноября.

біць паасобку. 8 лістапада 2001 году адбыліся першыя арышты актывістаў «Маладога Фронту» і Беларускай партыі свабоды, якія выступалі супраць будаўніцтва акружной дарогі на месцы пахаваньняў ахвяраў сталінскіх рэпрэсіяў ува ўрочышчы Курапаты. Пачалася шматмесячная «абарона Курапатаў».

У пачатку лістапада 2001 году сярод шэрагу ўмоваў нармалізацыі адносінаў паміж Амэрыкай і Беларусьсю, сфармуляваных старшынём камісіі Сэнату ЗША ў міжнародных справах Джэсі Хелмсам, значылася «паданьне поўнай справаздачы аб зьніклых палітыках і пакараньне ўсіх адказных за іх зьнікненьне асобаў»[3]. Як вынікала з спавешчаньня Хелмса, цень падазрэньня ў датычнасьці да выкраданьня падаў на генпракурора В. Шэймана.

Як унутрыпалітычныя, так і замежнапалітычныя падзеі падштурхоўвалі да далейшага ўзмацненьня жорсткасьці палітычнага рэжыму. Першай ахвярай гэтай палітычнай лініі стала эканамічная эліта.

## «Справа» дырэктараў

Падчас знаходжаньня Лукашэнкі ўва ўладзе ў краіне пэрыядычна праводзіліся акцыі, пакліканыя трымаць эканамічную эліту на пэўнай дыстанцыі ад палітыкі. «Справы» былога кіраўніка Беларускага мэталюргічнага заводу Юр'я Феакцістава, Васіля Лявонава, Васіля Старавойтава мелі паказны характар. Дырэктарскі корпус мусіў зразумець: найменшая праява яго палітычнай неляяльнасьці мае вынікам прыцягненьне да крымінальнай адказнасьці па «вылучна» эканамічных артыкулах. Недасканаласьць заканадаўства, што рэгулявала гаспадарчае абарачэньне, дазваляла ўладзе прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці якога-любя кіраўніка.

Падчас выбарчай кампаніі 2001 году дырэктарат дазваляў сабе пэўныя вольнасьці. Генэральны дырэктар Менскага заводу лядоўняў (МЗЛ) Леанід Калугін спрабаваў зарэгістравацца кандыдатам у прэзыдэнты. Дырэктар МТЗ Міхаіл Лявонаў публікаваўся ў апазыцыйнай «Народнай Волі». Не чакаючы, пакуль дырэктарская фронда аформіцца арганізацыйна і кадрава, лукашэнкаўскі бок згуляў на апярэджаньне і вывеў з гульні тых, хто мог яе ўзначаліць. Учыненая для вырашэньня палітычных заданьняў чыстка дырэктарскага корпусу была з самага пачатку прыкрытая «антыкарупцыйнай кампаніяй». 21 лістапада 2001 году генпракурор В. Шэйман заявіў пра ўзбуджэньне крымінальнай справы што да начальніка Беларускай чыгункі Віктара Рахманька. Ува ўмовах аўтарытарнага рэжыму цяжка меркаваць аб ступені сапраўднай віны канкрэтнага прыцягнутага да крымінальнай адказнасьці прадстаўніка эканамічнай эліты: справядлівасьць рашэньняў падкантрольнага ўладам суду выклікае вялікія пытаньні. У дырэктарскіх «справах» дзяржаўнымі мэдыямі напачатку падавалася пераважна праўдзівая інфармацыя. Калі давер аўдыторыі ўжо заваяваны, такі прыём дазваляў пасьля эфэктыўна выкарыстоўваць ілжывыя зьвесткі.

Чыстка кіраўніцтва Беларускай чыгункі ад самага пачатку дзеялася як нацыянальная інфармацыйная акцыя. Дзяржаўныя СМІ пераконвалі публіку, што карупцыя пусьціла глыбокія карані ў грамадзтве і таму антыкарупцыйная кампанія павінна мець шырокамаштабны і доўгатэрміновы характар. У той жа час меркаваньні аб палітычным падтэксьце кампаніі прызнаваліся беспадстаўнымі.

[3] Белорусская деловая газета. 2001. 13 ноября.

22 лістапада 2001 году нацыянальныя СМІ паведамілі аб новай «сэнсацыі»: быў выпраўлены ў адстаўку памочнік прэзыдэнта Сяргей Посахаў. Некаторыя незалежныя СМІ адкамэнтавалі гэтую падзею ў тым духу, што адстаўка гэтага былога чальца бюро ЦК КПБ і аднаго з галоўных лукашэнкаўскіх ідэолягаў разам з адстаўкамі Замяталіна і Сівакова прадвяшчае лібэралізацыю рэжыму. Сфэру адказнасьці расейца Посахава ў АП пераняў Іван Карэнда*, якога паставілі начальнікам Галоўнай ідэалягічнай управы і памочнікам прэзыдэнта ў пытаньнях ідэалёгіі.

У той самы дзень супрацоўнікі пракуратуры і Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў КДК (ДФР КДК) затрымалі генэральнага дырэктара МЗЛ Л. Калугіна, які быў абвінавачаны па арт. 424, ч. 3 КК РБ «Злоўжываньне ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі»; арт. 225 «Невяртаньне з-за мяжы фінансавых актываў прадпрыемства» і арт. 233, ч. 2 «Незаконная прадпрымальніцкая дзейнасьць». За дзень да гэтага, 21 лістапада 2001 году, падчас сустрэчы Шэйман прапанаваў Лукашэнку адхіліць Рахманька ад пасады. Тады ж, магчыма, быў вырашаны і лёс Калугіна. Адразу пасьля арышту гендырэктара МЗЛ Лукашэнка выступіў з гучнай заявай, сэнс якой зводзіўся да таго, што гэта толькі пачатак і на чарзе яшчэ 15 дырэктараў.

«Справа» дырэктараў высунула на першыя ролі ў атачэньні Лукашэнкі генпракурора Віктара Шэймана і старшыню КДК Анатоля Тозіка (арыштам дырэктараў папярэднічала праверка іх дзейнасьці КДК). 5 сьнежня Шэйман быў зноў выкліканы да Лукашэнкі. Генэральны пракурор атрымаў загад «караць, нягледзячы на пасады».

Адначасна ўлада працягвала наступ на кіраўніцтва ФПБ. Праўда, 7 сьнежня чарговая атака правалілася. На пленуме ФПБ толькі кіраўнікі 4 з 32 галіновых прафсаюзаў — чальцоў арганізацыі выступілі за зьмену старшыні. У адказ на гэта 14 сьнежня Рада Міністраў забараніла дзяржаўным прадпрыемствам і арганізацыям пераводзіць сяброўскія складкі на рахункі прафарганізацыяў па безнаяўным разьліку. Такога ўдару ФПБ ня вытрымала. 21 сьнежня У. Ганчарык заявіў аб сваёй адстаўцы. Кіруючая эліта зрабіла першы крок да поўнага кантролю над ФПБ: старшынём быў абраны ляяльны ёй Францішак (Франц) Вітко.

7 студзеня 2002 году была арыштавана наступная ахвяра «антыкарупцыйнай кампаніі» — генэральны дырэктар Менскага трактарнага заводу (МТЗ) Міхаіл Лявонаў. Гендырэктару МТЗ было выстаўлена абвінавачаньне па арт.166, ч. 2 Крымінальнага Кодэксу «Злоўжываньне ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі» і арт. 168 «Нядбаласьць». Адзін з найбольш аўтарытэтных прадстаўнікоў беларускай эканамічнай эліты, Лявонаў узначальваў створаны пры канцы 1999 году Міжнародны клюб дырэктараў (МКД), чальцамі якога былі пераважна дырэктары буйных прадпрыемстваў Беларусі, а таксама шэраг расейскіх прамыслоўцаў. На паседжаньнях МКД дырэктарат між іншага выпрацоўваў сваю пазыцыю што да эканамічнага рэфармаваньня краіны. У пачатку траўня 2001 году прамысловым лобі нават разглядалася магчымасьць вылучэньня кандыдатуры М. Лявонава ў прэзыдэнты. Лукашэнкава рэакцыя тады ня змусіла сябе чакаць: на 55-гадовы юбілей МТЗ (29 траўня 2001 году), найбуйнейшага беларускага прадпрыемства (на ім працуе каля 20 тысяч чалавек, а на прадпрыемствах, зьвязаных зь ім тэхналягічным ланцугом — каля 120 тысяч), не зьявіўся ніводзін прадстаўнік улады.

* Іван Карэнда — ураджэнец сяла Крывічы Івейскага раёну Гарадзенскай вобласьці. Пасьля сканчэньня Гарадзенскага пэдагагічнага інстытуту нейкі час працаваў настаўнікам беларускай мовы. Потым — на камсамольскіх і партыйных пасадах, пасьля 1991 году быў намесьнікам міністра інфармацыі, намесьнікам міністра культуры, працаваў у выканкаме СБР.

Паказальна, што і Л. Калугін, і М. Лявонаў былі арыштаваныя вонках сваіх прадпрыемстваў, бо іх арышт на «сваёй» тэрыторыі мог выклікаць пратэсты працоўных калектываў. Арышты паказалі запалоханаму дырэктарату, якія высновы ён мае зрабіць. У адрозьненьне ад кагадзе арыштаванага Л. Калугіна, М. Лявонаў не хаваў сваіх эканамічных поглядаў, якія не супадалі з афіцыйнымі, у прыватнасьці, выказваў незадаволенасьць перацягваньнем фінансавых актываў прыбытковых прадпрыемстваў для падтрымкі прадпрыемстваў-банкрутаў.

У студзені 2002 году міністар сельскай гаспадаркі Міхаіл Русы заявіў, што дэфіцыт сродкаў, неабходных для правядзеньня сяўбы, складае 259 млрд. руб. Як і раней, яго значная частка меркавалася пакрывацца коштам фінансавых актываў прыбытковых прадпрыемстваў. На гэты раз незадаволеных галасоў з боку дырэктарату не было. Калгасы ў Беларусі ўжо даўно выконваюць ролю ня столькі эканамічных, колькі палітычных арганізацыяў. Датацыі з цэнтру дазваляюць падтрымліваць адданы Лукашэнку электарат і забясьпечваць функцыянаваньне структураў, якія ажыцьцяўляюць палітычны кантроль над вёскай.

Каб яшчэ больш прынізіць і запалохаць дырэктарат, на першыя ролі ў расьследаваньні «справы» дырэктараў выйшлі асобы, якіх падазравалі ў арганізацыі выкраданьня дзеячоў апазыцыі. Ажыцьцяўляць нагляд над расьследаваньнем справы Лявонава было даручана генпракурору Шэйману, ад якога Лукашэнка пры кожнай сустрэчы патрабаваў «забясьпечыць усебаковае расьследаваньне крымінальных справаў»[4]. Гэта значыла: трэба чакаць новых арыштаў.

У першым квартале 1999 году, будучы сакратаром Рады Бясьпекі, Шэйман выконваў ролю каардынатара дзейнасьці дзяржаўных органаў, накіраванай на зрыў альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў. Тады інтэнсіўны ціск на апазыцыю стаў адным з прыярытэтаў унутранай палітыкі рэжыму. У 2002 годзе яе прыярытэты зьмяніліся. Але зноўку на першы плян, ужо ў сіняй форме генпракурора, выйшаў Шэйман. Стыль яго працы застаўся ранейшы. Толькі калі ў 1999 годзе выпрацоўка праграмы дзеяньняў, скіраваных супраць апазыцыі, ішла на пашыраных паседжаньнях Рады Бясьпекі, то цяпер эпіцэнтар антыкарупцыйнай актыўнасьці ўладаў быў перанесены ў Генэральную пракуратуру. Акурат там 25 студзеня 2002 году пад кіраўніцтвам Шэймана было праведзена паседжаньне «пашыранай калегіі з удзелам кіраўнікоў праваахоўных, кантрольных і судовых органаў», у якім узялі ўдзел міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў, старшыня КДБ Леанід Ерын, старшыня КДК Анатоль Тозік, начальнік сьледчай управы ДФР КДК Генадзь Гапоненка, старшыня Вярхоўнага Суду Валянцін Сукала, сакратар Рады Бясьпекі Генадзь Нявыглас. Нагляд за працай ланцугу «КДК — пракуратура — суд» быў даручаны генпракурору.

Разам з інтэнсіўнай чысткай эканамічнай эліты Шэйман і каардынаваныя ім органы дзеялі і ў іншых кірунках. 29 студзеня 2002 году Лукашэнка падпісаў указ «Аб стварэньні спэцыялізаванай камісіі для праверкі дзейнасьці судоў, органаў пракуратуры і ўнутраных справаў г. Менску і Менскай вобласьці», якую ўзначаліў усё той жа Віктар Шэйман. Кіруючая эліта была зацікаўленая, каб акурат у цэнтры краіны рэпрэсіўны мэханізм дзеяў найбольш эфэктыўна. Незадоўга да падпісаньня ўказу падчас асабістай сустрэчы з Лукашэнкам генпракурор атрымаў загад узмацніць пракурорскі нагляд за расьследаваньнем карупцыйных справаў, а таксама актыўна правяраць дзейнасьць службовых асобаў судоў, органаў пракуратуры і ўнутраных справаў. Тыя, каго правяралі, мелі зразумець: у выпадку, калі па іхнай віне адбудзецца збой у працы «кантрольна-праваахоўна-судовага» мэханізму, вінаватага чакае лёс арыштаваных дырэктараў.

[4] Белорусская деловая газета. 2002. 31 января.

Арганічнай часткай «вайны з карупцыяй» была інфармацыйная кампанія, пакліканая запалохаць эканамічную эліту і неляяльную ўладам частку грамадзтва. Калі раней у АП за працу з СМІ адказваў У. Замяталін, то падчас «антыкарупцыйнай кампаніі» гэтую сфэру адказнасьці пераняў С. Князеў. Былы кэдэбіст проста не мог ня выкарыстаць звычайных для яго ведамства мэтадаў. У пачатку лютага 2002 году нацыянальныя СМІ паведамілі, што былы гендырэктар МЗЛ, які не прызнаваў сваёй віны, быў зьмешчаны ў псыхіятрычную клініку «Навінкі» на тэрмін з 9 па 31 студзеня для «правядзеньня судова-сьледчай экспэртызы». Навідавоку было імкненьне ня толькі маральна зламаць Л. Калугіна, але і запалохаць яго гіпатэтычных пераемнікаў на пасадзе генэральнага дырэктара МЗЛ. Эфэкт, выкліканы арыштамі дырэктараў МЗЛ і МТЗ, быў узмоцнены рэпрэсіўнымі дзеяньнямі супраць былых супрацоўнікаў Л. Калугіна і М. Лявонава, у прыватнасьці, 19 лютага 2002 году за «невыкананьне захадаў, прадугледжаных «Законам аб барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю і карупцыяй», з МТЗ быў звольнены памочнік дырэктара Ўладзімер Мядзьведзеў[5]. Кіраўнікам прадпрыемстваў, калі яны не хацелі згубіць працы, аставалася дыстанцыявацца ад усялякіх дзеяньняў з палітычным падтэкстам[*].

## Мабілізацыя сілаў рэжыму

На працягу зімы 2001—2002 гадоў Лукашэнка сустракаўся з генпракурорам не радзей разу ў два тыдні. Прэзыдэнцкая прэс-служба, выкарыстаўшы ўсе магчымыя варыянты тлумачэньня такіх частых сустрэчаў (сапраўдныя прычыны не маглі быць абнародаваныя), пад канец зімы стандартна паведамляла, што «ў ходзе асабістай сустрэчы была абмеркаваная крымінагенная сытуацыя ў краіне за два папярэднія тыдні». Пры канцы сакавіка Шэйман быў вызвалены ад абавязкаў каардынатара «антыкарупцыйнай кампаніі». Яго праца на пасадзе кіраўніка камісіі для праверкі дзейнасьці судоў, органаў пракуратуры і ўнутраных справаў Менску і Менскай вобласьці была высока ацэненая: Лукашэнка адзначыў адсутнасьць неабходнасьці кадравых зьменаў у сыстэме службаў бясьпекі.

Месцам паседжаньняў «пашыранай калегіі» на нейкі час робіцца АП. Карны апарат трэба было ізноў перанастроіць: ступень гвалту з боку сілавікоў павінна была дакладна адпавядаць той, якая была вызначана «наверсе». А для гэтага трэба было паставіць дзейнасьць праваахоўных органаў пад кантроль былых кэдэбістаў — кіраўнікоў АП. Практычна непадкантрольных судовым органам і маючых карт-бланш з боку пракуратуры супрацоўнікаў органаў

[5] Белорусская деловая газета. 2002. 21 февраля.

* Усяго ў межах т.зв. «справы» дырэктараў апрача Віктара й Андрэя Казекаў, Міхаіла Лявонава, Міхаіла Гардзея, Леаніда Калугіна, Яўгена Краўцова, Віктара Рахманька былі прыцягнутыя да адказнасьці тагачасны старшыня праўленьня ААТ «Беларускі Біржавы Банк» Андрэй Маркоўскі, першы заступнік старшыні праўленьня банку «Залаты талер» Зьміцер Міхалевіч, былы старшыня праўленьня «Белпрамбудбанку» Мікалай Ракаў, дырэктар Бабруйскага шынарамонтнага заводу Станіслаў Астрога, кіраўнік Дзяржынскага райвыканкаму Ўладзімер Ткачоў, дырэктар па замежнаэканамічных сувязях ВА «БелаўтаМАЗ» Аляксандар Якаўлеў (уцёк у Польшчу), дырэктар Гомельскага радыёзаводу Анатоль Кірыкаў, дырэктар «Каапэратыўнага нарыхтоўчага гандлю» Магілёўскага аблспажыўсаюзу Анатоль Пратасеня, дырэктар аўтарынку «Гандлёвага дому «Ждановічы» Аляксандар Сярэбраньнікаў, былы віцэ-прэзыдэнт ЗАТ «Пушэ» Станіслаў Чарнышэвіч, дырэктар ЗАТ «Гандлёвы сьвет «Колца» Аляксандар Васілеўскі, дырэктар Гомельскага караблебудаўнічага заводу Яўген Корзун і др. — Рэд.

МУС вырашылі прымусіць чуйна прыслухоўвацца да загадаў начальства.

26 сакавіка 2002 году адбылася вельмі рэдкая для аўтарытарнай краіны падзея. Суд Першамайскага раёну Менска за зьбіцьцё арыштаваных прысудзіў пяцёх супрацоўнікаў міліцыі да розных тэрмінаў пазбаўленьня волі — ад аднаго году да шасьцёх. У той жа дзень быў вызвалены палітычны вязень — дэпутат Вярхоўнай Рады 13-га скліканьня Андрэй Клімаў*. Гэтыя падзеі былі выкарыстаныя ўладай для працягу гульні ў «лібэралізацыю».

Передача функцыяў каардынатара «антыкарупцыйнай кампаніі» кіраўніцтву АП ня ўнесла зьменаў у яе характар і накіраванасьць. У сакавіку пад праверкі КДК трапілі прадпрыемствы канцэрну «Белнафтахім». У шэрагу выпадкаў, як гэта ўжо стала традыцыяй, усьлед за супрацоўнікамі КДК прыходзілі супрацоўнікі пракуратуры. Па выніках праверкі былі заведзеныя 64 крымінальныя справы. Падчас перамоваў з расейскімі нафтавікамі Лукашэнку было важна чарговы раз паказаць, што сытуацыя на кожным прадпрыемстве нафтахіміі знаходзіцца пад яго поўным кантролем. З такіх дробных момантаў складалася ўяўленьне аб моцы яго пазыцыяў у краіне.

На тле кампаніі супраць эканамічнай эліты былі ўдакладненыя прыярытэтныя кірункі дзейнасьці АП, між іншага ёй было даручана вядзеньне вайны супраць «трэцяга сэктару». 27 сакавіка 2002 году Лукашэнка падпісаў указ аб зацьверджаньні новага складу камісіі па рэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў. Трымаць руку на пульсе працэсаў, якія адбываюцца ў «трэцім сэктары», было даручана першаму намесьніку кіраўніка АП С. Князеву. Адыход у палітычнае небыцьцё вэтэрана вайны з дэмакратычнымі НДА У. Замяталіна не зьмяніў ідэалягічных падыходаў камісіі. У яе склад увайшлі чальцы кіраўніцтва КПБ дэпутаты Палаты Прадстаўнікоў Ігар Катляроў і Сяргей Касьцян, а таксама галоўны рэдактар інфармацыйна-аналітычнага бюлетэню АП «Политика» савецкі рэакцыянэр Эдуард Скобелеў.

Важным кірункам дзейнасьці АП заставалася ўсталяваньне поўнага кантролю над ФПБ. Просьбы прафсаюзнага кіраўніцтва аднавіць практыку безнаяўнага пералічэньня сяброўскіх складак заставаліся без увагі.

У пачатку красавіка 2002 году прэзыдэнт Лукашэнка ўнёс чарговыя карэктывы ў дзейнасьць КДК і пракуратуры. Шэйману было даручана ўзмацніць пракурорскі нагляд за захаваньнем заканадаўства кіраўнікамі выканаўчай вэртыкалі, рашуча спыняць любыя злоўжываньні ўладай і службовымі паўнамоцтвамі. У выніку пераразьмеркаваньня сфэраў адказнасьці ў лукашэнкаўскім асяродзьдзі роля каардынатара «антыкарупцыйнай кампаніі» зноў замацавалася за Шэйманам. Паседжаньні «пашыранай калегіі з удзелам кіраўнікоў праваахоўных, кантрольных, судовых органаў» адцяпер зноў адбываюцца на «тэрыторыі» Шэймана — у рэспубліканскай пракуратуры.

Статус каардынатара «антыкарупцыйнай кампаніі» дазваляў генпракурору істотна ўплываць на вызначэньне ўнутранай палітыкі. Мэтай праверак «выканаўчай вэртыкалі» было выяўленьне ня толькі фактаў злоўжываньняў, але і недастаткова лаяльных рэжыму чыноўнікаў, паколькі падчас іх фіксавалася ступень адпаведнасьці таго ці іншага чыноўніка сваёй пасадзе. Генпракурор атрымаў вельмі важны палітычны рэсурс — роля «вачэй і вушэй», «карнага мяча» Лукашэнкі дазваляла яму ўплываць на кадравую палітыку рэжыму. Тыя функцыянэры, што падтрымлівалі жорсткі ўнутрыпалітычны курс, атрымалі дадатковыя магчымасьці

* А. Клімаў прасядзеў за турэмнымі кратамі больш за чатыры гады — быў арыштаваны 11 лютага 1998 году. У верасьні 1999 году быў асуджаны на шэсьць гадоў зьняволеньня.

для кар'ернага росту. Некаторыя зь іх былі абавязаныя ім асабіста Шэйману.

Шырокамаштабная чыстка «вэртыкалі» ад неадпаведных сваёй пасадзе чыноўнікаў не была адзіным мэтадам мабілізацыі выканаўчай улады. У пачатку красавіка 2002 году УСП перадала найбольш эфэктыўна дзеючым рай- і гарвыканкамам 174 легкавыя «мэрсэдэсы». Паводле пэўных ацэнак, іх кошт складаў 3,9 млн. даляраў[6]. «Вэртыкальнікі» атрымалі таксама 119 самаходаў УАЗ для паездак па бездарожжы. Гэткая «змазка» мэханізму выканаўчай улады выклікала незадаволенасьць шэрагу дэпутатаў ПП: на правядзеньне сяўбы на той момант не ставала каля 39 млн. USD[7]. Аднак боку Лукашэнкі было важна забясьпечыць рай- і гарвыканкамы для падтрыманьня палітычнага кантролю.

15 красавіка 2002 году, у першы працоўны дзень пасьля вяртаньня з Масквы, Лукашэнка зноў выклікаў Шэймана на асабістую сустрэчу. 17 красавіка 2002 году Лукашэнка наведаў сваю гвардыю — 3-юю асобную брыгаду апэратыўнага прызначэньня. Дзяржаўныя СМІ адзначылі: прэзыдэнт застаўся задаволены станам справаў у брыгадзе, асабліва аддзелам хуткага рэагаваньня.

Набліжалася чарговае абвастрэньне адносінаў з усходнім суседам. У кароткачасовай пэрспэктыве зьяўлялася патрэба ў мабілізацыі апарату ўлады. Праверка яго дзейснасьці адбывалася ў кірунку зьнізу ўверх. Апошнім зьвяном у ёй стаў урад. 29 красавіка 2002 году на паседжаньні Рады Міністраў Лукашэнка жорстка раскрытыкаваў яе працу за першы квартал 2002 году, адзначыўшы павелічэньне запасаў гатовай прадукцыі і зьніжэньне канкурэнтаздольнасьці беларускіх тавараў. Прэм'ер-міністру Навіцкаму была вынесеная строгая вымова, віцэ-прэм'еры і асобныя міністры папярэджаныя, а кіраўнікі дзяржканцэрнаў «Беллеспрам», «Беллёгпрам», «Белбіяфарм», «Белдзяржхарчпрам», а таксама міністар аховы здароўя Ўладзіслаў Астапенка звольненыя з пасадаў. У лупцаваньні ўраду актыўны ўдзел узялі генпракурор В. Шэйман, старшыня КДК А. Тозік, старшыня КДБ Л. Ерын. Пададзеная імі інфармацыя стала падставай для абвінавачаньня чальцоў ураду ў прафэсійнай некампэтэнтнасьці. Лукашэнка абураўся: «Тыя, хто падманвае дзяржаву... Да Шэймана ўсіх!»[8]. Шырокае вызначэньне кола «тых, хто падманвае дзяржаву», стварала ілюзію таго, што генпракурор вось-вось «зоймецца» ўласьнікамі міністэрскіх партфэляў, што знаходзяцца пад пільным наглядам кампэтэнтных органаў.

Прэзыдэнт пагражаў сваім міністрам ня толькі тым, што яны могуць у кожны момант згубіць усе перавагі свайго статусу: у звычайнай для сябе манэры псыхалягічнага ціску ён падкрэсьліў, як шмат яны маюць дзякуючы яго ўладзе і што канкрэтна істэблішмэнт можа згубіць, калі пад ім пахісьнецца крэсла. Работнікі найвышэйшага зьвяна выканаўчай улады — прычым ня толькі чальцы ўраду — былі абвінавачаныя ў атрыманьні незаконных даходаў ад лабіраваньня інтарэсаў прыватнага бізнэсу, у прасоўваньні «сваіх людзей» у кіраўніцтва камэрцыйных арганізацыяў. СМІ данесьлі гэтыя пагрозы й абвінавачаньні да ўсіх эшалёнаў выканаўчай улады. Пагрозы «разабрацца» з намэнклятурным бізнэсам у сьвятле «антыкарупцыйнай кампаніі» наўрад ці ўспрымаліся функцыянэрамі як пусты гук. Аднак барацьба з намэнклятурным бізнэсам не была мэтай «антыкарупцыйнай кампаніі». З дапамогай палітыкі «бізуна і перніка» адбывалася мабілізацыя ўсяго апарату выканаўчай улады. Паляваньне на

[6] Белорусская деловая газета. 2002. 5 апреля.

[7] Тамсама.

[8] Белорусская деловая газета. 2002. 3 мая.

карупцыянэраў сярод дырэктарату і бюракратыі дазваляла пад прыкрыцьцём прыстойных намераў правесьці чыстку і наладку ўсёй «прэзыдэнцкай вэртыкалі». Так вырашаліся два заданьні: тактычнае — падрыхтоўка да абароны ўва ўмовах канфрантацыі з кіраўніцтвам Расеі, стратэгічнае — забесьпячэньне палітычнай будучыні Лукашэнкі пасьля 2006 году.

Спэктакль, разыграны пры канцы красавіка 2002 году, прызначаўся ня толькі для выканаўчай вэртыкалі. Лукашэнка імкнуўся захаваць імідж суровага, але справядлівага «бацькі» — «біча» намэнклятуры. 7 траўня быў арыштаваны былы кіраўнік канцэрну «Белдзяржхарчпрам» Віктар Казека*, 23 траўня — дырэктар Менскага заводу пеністых вінаў Міхаіл Гардзей. 24 траўня была пастаўлена кропка ў справе арыштаванага дырэктара ЗАТ «Стадыён «Трактар» Уладзімера Алейнікава — ён быў асуджаны да пяцёх гадоў зьняволеньня з канфіскацыяй маёмасьці. Усе гэтыя асобы былі абвінавачаныя ў хабарніцтве.

Мабілізаваўшы выканаўчую вэртыкаль напярэдадні сутыкненьня з Расеяй, рэжым займеў моцны тыл. Каб яшчэ больш умацаваць яго, рэжым пайшоў на павольныя зьмены і ў сваіх ідэалягічных установках. Яны мелі мэтай фармаваньне такой грамадзкай думкі, пры якой ціск з боку Масквы на афіцыйны Менск быў асуджаны на няпосьпех. Разам з тым т.зв. «беларусізацыя» мела абмежаваньні: яна павінна была застацца палавіністай. Беларусь, як яе бачыў Лукашэнка і яго паплечнікі, мелася застацца прарасейскай і антызаходняй, бо толькі ў гэтым выпадку мог быць захаваны імідж рэжыму як стратэгічнага хаўрусьніка Расеі. У адзінстве гэтых дзьвюх супярэчных тэндэнцыяў — хаўрусьнік Расеі, палкі прыхільнік усходнеславянскага адзінства і асьцярожны «беларусізатар» — Лукашэнка бачыў пэрспэктыву сваёй палітычнай кар'еры. Каб прадэманстраваць сваю адданасьць ідэі «ўсходнеславянскага адзінства», кіруючая эліта неўзабаве разыграла праваслаўную карту. 31 траўня 2002 году палата прадстаўнікоў зацьвердзіла зьмены і дапаўненьні да закону «Аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях», згодна зь якім Беларуская праваслаўная царква Маскоўскага патрыярхату была пастаўленая ў прывілеяванае становішча ў параўнаньні зь іншымі канфэсіямі. Супраць прыняцьця гэтага не адпаведнага дэмакратычным стандартам (ён абмяжоўваў магчымасьці дзяржаўнай рэгістрацыі рэлігійных суполак, што не адносіліся да праваслаўнай канфэсіі, а таксама ўводзіў абмежаваньні дзейнасьці рэлігійных суполак межамі той адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, дзе яны былі зарэгістраваныя) закону прагаласавалі 2 дэпутаты з 110.

## Новая ідэалёгія

На чэрвеньскае пахаладаньне ў беларуска-расейскіх стасунках лукашэнкаўскі рэжым адказаў крэнам у бок незалежніцкай рыторыкі. 2 ліпеня 2002 году на прэзэнтацыі дзяржаўнага гімну Лукашэнка чацьвёрты раз за ўвесь тэрмін знаходжаньня на пасадзе прэзыдэнта выступіў на беларускай мове. 3 ліпеня, выступаючы на сьвяце Дзень Рэспублікі, ён ні разу не прамовіў словаў «інтэграцыя» і «Расея». Імідж «абароньніка незалежнасьці» адкрываў перад Лукашэнкам вельмі шырокія пэрспэктывы палітычнай гульні, аб'ектыўна спрыяў узмацненьню яго палітычных пазыцыяў.

---

* В. Казека быў зьняты з пасады 29 красавіка. Яго сын Андрэй Казека — былы начальнік аддзелу збыту Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Крышталь» — быў арыштаваны ў пачатку сакавіка 2002 году.

Прыхільнікам уваходжаньня Беларусі ў склад Расеі выступаў вузкі сэгмэнт беларускага грамадзтва (ня болей за 15%) — пераважна людзі сталага веку і невысокага ўзроўню адукацыі. У гэтай групе адсутнічалі «лідэры думак». Самі прадстаўнікі гэтай групы мелі супярэчлівыя меркаваньні аб спосабе далучэньня да Расеі. З аднаго боку, яны бачылі ў аб'яднаньні шанец для вяртаньня да савецкага мінулага зь яго салідным пакетам сацыяльных гарантыяў. Зь іншага боку, іх палохаў «дзікі расейскі капіталізм», і яны ўсё ж такі сумняюцца ў магчымасьці рэстаўрацыі савецкага ладу. Колькасьць прыхільнікаў уваходжаньня Беларусі ў склад Расеі з кожным годам скарачаецца ў выніку натуральных дэмаграфічных зьменаў. Гэтая электаральная група робіцца нецікавай для палітычных лідэраў, якія імкнуцца выйсьці на шырэйшую аўдыторыю. Зрэшты, для Лукашэнкі не складала цяжкасьцяў захаваць падтрымку і гэтай параўнальна вузкай групы. Дзяржаўныя СМІ малявалі жахлівыя карціны з жыцьця расейскай правінцыі. На гэтым тле гарант беларускай канстытуцыі выступаў гарантам выкананьня дзяржавай сваіх сацыяльных абавязаньняў. Бальшыню ж электарату (60—70% выбарцаў) найбольш хвалююць сацыяльна-эканамічныя пытаньні. Яны прыхільна ставяцца да разьвіцьця эканамічнага супрацоўніцтва з Расеяй у межах эканамічнага саюзу, захаваньня праўнай базы, якая гарантуе абарону беларускіх грамадзян на тэрыторыі Расеі, захаваньня бязьвізавага рэжыму перасячэньня мяжы з Расеяй. Незалежніцкая рыторыка рэжыму троху зьмяняла характар яго стасункаў з трэцяй істотнай электаральнай групай — зь яго актыўнымі ці пасіўнымі супраціўнікамі, прыхільнікамі эўрапейскага шляху і дэмакратычнага разьвіцьця Беларусі. Зьняцьце з парадку дня вельмі вострага пытаньня страты незалежнасьці краіны суцішыла актыўнасьць пэўных колаў «незалежнікаў».

Адначасна спаважна адмянілася інфармацыйная палітыка рэжыму. Калі раней яна атакавала ўсё апазыцыйнае поле, то ў пачатку ліпеня 2002 году яе вастрыня была скіравана супраць «новага ворага незалежнасьці» — АГП, кіраўніцтва якой гэтым часам рэзка актывізавала кантакты з прадстаўнікамі расейскай палітычнай эліты.

Зьмены ў ідэалёгіі рэжыму засьпелі дэмакратычныя сілы зьнянацку. Бітвы за пачэснае месца галоўнага абаронцы незалежнасьці не адбылося. АГП ніколі не прэтэндавала на яго, а кіраўніцтва БНФ (які выканаў важную для нацыі ролю змагара за незалежнасьць, калі сувэрэнітэт і незалежнасьць былі прадметам гандлю з боку Лукашэнкі) палічыла, што заявы Лукашэнкі сьведчаць аб нейкіх кароткачасовых зьменах у пазыцыі ўлады. Улады змаглі бесьперашкодна нарошчваць свой незалежніцкі імідж у інфармацыйнай прасторы Беларусі.

## Старая палітыка

Сутыкненьне з Крамлём абумовіла новую хвалю кадравых перастановак у найвышэйшых эшалёнах улады. У АП меркавалі, што, каб апраўдаць давер, новыя прызначэнцы прынамсі сьпярша будуць працаваць актыўней за сваіх папярэднікаў. 3 ліпеня 2002 году Андрэя Кабякова на пасадзе першага віцэ-прэм'ера зьмяніў С. Сідорскі.

Кабякоў захаваў статус віцэ-прэм'ера і быў прызначаны міністрам эканомікі — прыдаўся яго досьвед прафэсійнага кантралёра. 9 ліпеня на просьбу Шэймана на пасаду намесьніка генэральнага пракурора быў прызначаны Мікалай Купрыянаў. Былы пракурор Менску асабіста курыраваў расьследаваньне «гарачых» справаў, у тым ліку і «справу» дырэктараў.

Палітычныя пазыцыі рэжыму ўзмацніліся пасьля ўсталяваньня кантролю над ФПБ. 16 ліпеня

Пленум ФПБ зацьвердзіў намесьніка кіраўніка АП Л. Козіка старшынём Фэдэрацыі. Адразу пасьля гэтага пачаўся наступ на неляяльнае кіраўніцтва галіновых прафсаюзаў, які асабіста каардынаваў новы старшыня ФПБ. Само кіраўніцтва ФПБ фактычна пераўтварылася ў аддзел АП: старшыня Фэдэрацыі Козік з моманту свайго абраньня на гэтую пасаду браў удзел у паседжаньнях ураду і кіраўніцтва АП.

18 ліпеня падчас сустрэчы Лукашэнкі з генпракурорам В. Шэйманам і старшынём КДК А. Тозікам зьвязка «КДК — пракуратура» была прызнана эфэктыўнай. А. Тозік атрымаў годнасьць генэрал-маёра. Аднак перавод працы КДК і пракуратуры ў звычайны рэжым не ўваходзіў у пляны іх патрона. Абодва ведамствы па-ранейшаму павінны былі канцэнтраваць свае намаганьні ў кірунках, вызначаных АП, — працягваць «антыкарупцыйную кампанію» і «аб’яднаць намаганьні ў барацьбе з эканамічнымі злачынствамі»[9]. Апрача вырашэньня гэтых заданьняў, генпракурору і старшыню КДК было даручана разабрацца з «частымі выпадкамі выкарыстаньня неадпаведнай сапраўднасьці інфармацыі для дыскрэдытацыі ў СМІ найвышэйшых службовых асобаў і чальцоў ураду»[10]. Лукашэнка публічна выказаў сваё абурэньне тым, што «некаторыя СМІ, парушаючы дзейнае заканадаўства, распаўсюджваюць перакручаныя факты і сьвядома дэстабілізуюць становішча ў грамадзтве»[11]. Так пачалася чарговая кампанія супраць незалежных СМІ. Яшчэ 24 чэрвеня суд прысудзіў журналістаў ліквідаванай газэты «Пагоня» Міколу Маркевіча і Паўла Мажэйку адпаведна да 2,5 і 2 гадоў зьняволеньня[12]. Неўзабаве пасьля гэтага міністар інфармацыі М. Падгайны заявіў, што журналісты шмат якіх незалежных выданьняў могуць быць абвінавачаныя па арт. 367 КК «Паклёп у адносінах да прэзыдэнта», арт. 368 «Абраза прэзыдэнта» і арт. 369 «Абраза прадстаўніка ўлады»[13].

Антыкарупцыйная актыўнасьць кампэтэнтных органаў пры канцы жніўня займела годны працяг. Супрацоўнікамі КДБ быў арыштаваны былы дырэктар «Менсккомплексбанку» Яўген Краўцоў. Арышт банкіра такога ўзроўню — выключная для Беларусі падзея, бо, як заяўляў у свой час былы старшыня Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч, камэнтуючы вынікі праверак дзейнасьці камэрцыйных банкаў, атрымальнікі вялікай колькасьці нявернутых крэдытаў дагэтуль займаюць пасады ў АП, кантрольных і сілавых структурах.

У АП былі задаволеныя дзейнасьцю пракуратуры і КДК. Падставаў сумнявацца ў асабістай адданасьці Шэймана і Тозіка Лукашэнку таксама не было. У той жа час там былі пэўныя пытаньні да ведамстваў У. Навумава і Л. Ерына. У пачатку 2002 году праца органаў МУС правяралася шэйманаўскай спэцыяльнай камісіяй. Стан справаў у КДБ задавальняў кіруючую эліту яшчэ менш. На паседжаньні ўраду 29 красавіка кіраўнік дзяржавы выказаў прэтэнзіі Л. Ерыну, што пэрыядычныя публікацыі ў заходняй і беларускай незалежнай прэсе пра гандаль Беларусьсю зброяй зьяўляюцца праз выцечку інфармацыі з КДБ, аднак яго кіраўніцтва ня здольнае выявіць яе каналаў. У пачатку чэрвеня 2002 году Лукашэнка адхіліў ад пасады начальніка Ўправы контравыведкі КДБ генэрал-маёра Канстанціна Хрушчова.

Факт арышту былога старшыні «Менсккомплексбанку» якраз супрацоўнікамі КДБ сьведчыў аб жаданьні ўладаў сутыкнуць ілбамі групоўкі ў складзе гэтай структуры. Вельмі імаверна, што хтосьці з кіраўніцтва КДБ карыстаўся паслугамі Я. Краўцова. Унутрыарганіза-

[9] Белорусская деловая газета. 2002. 23 июля.

[10] Тамсама.

[11] Тамсама.

[12] Белорусская деловая газета. 2002. 26 июня.

[13] Белорусская деловая газета. 2002. 22 августа.

цыйнае сутыкненьне ў КДБ стварала клімат узаемнай падазронасьці і недаверу сярод яго супрацоўнікаў, што было на руку ўладам падчас абвастрэньня адносінаў з Расеяй. Да таго ж Л. Ерын напярэдадні прызначэньня на пасаду старшыні КДБ узначальваў Управу ФСБ РФ у Маскве і Маскоўскай вобласьці, а шмат якія беларускія высокапастаўленыя кэдэбісты мелі асабістыя кантакты з кіраўніцтвам ФСБ. Улады таксама патроху расчынялі кіраўніцтва КДБ за кошт ураджэнцаў Беларусі, што праходзілі службу на яе тэрыторыі. Кэдэбісты, што зрабілі кар'еру ў Расеі і мелі цесныя сувязі з расейскімі спэцслужбамі, адчулі за сьпінай подых прадстаўнікоў «гарадзенскай хвалі».

На тле чысткі ўладных структураў ад патэнцыйных капітулянтаў працягвалася кампанія дыскрэдытацыі «прапуцінскіх» сілаў у складзе апазыцыі. Маргіналізацыя і першых, і другіх адпавядала доўгатэрміновым плянам «абароньніка незалежнасьці». 2 верасьня галоўны спэцыяліст Міністэрства юстыцыі Аляксандар Харытон, які праводзіў праверку адпаведнасьці дзейнасьці АГП патрабаваньням заканадаўства, заявіў аб тым, што АГП «за шматлікія парушэньні можа быць ліквідаваная»[14].

Стратэгічная мэта як унутранай, так і вонкавай палітыкі рэжыму з усёй выразнасьцю адкрылася 18 верасьня 2002 году, калі на тэлевізійнай прэс-канфэрэнцыі Лукашэнка ня выключыў, што, калі на ўсенародным галасаваньні будуць унесеныя адпаведныя зьмены ў Канстытуцыю, ён у 2006 годзе будзе ізноў змагацца за пасаду прэзыдэнта. Тактыку, абраную для захаваньня ўлады пасьля 2006 году, можна апісаць наступным чынам:

1. Зьмяншаць палітычную вагу апазыцыі і падштурхоўваць яе да ўнутранага крызысу.
2. Дабівацца поўнага падпарадкаваньня эканамічнай эліты.
3. Дабівацца поўнага кантролю над ФПБ і рабочым рухам.
4. Запалохваць незалежныя СМІ. Шляхам рэпрэсіяў прымусіць незалежныя выданьні да ўнутранай самацэнзуры.

Выказваньне Лукашэнкі падчас канфэрэнцыі таксама сьведчыла, што ў АП ужо ў той час напружана абмяркоўваліся розныя сцэнары падоўжаньня яго ўладных паўнамоцтваў. Гэтая тэма была падхопленая дэпутатамі ПП, чыя гатовасьць зацьвердзіць якія-любя зьмены ў заканадаўстве, што б падоўжылі палітычнае жыцьцё Лукашэнкі, не выклікала сумневу. Дэпутат Міхаіл Паплаўскі нагадаў, што прэзыдэнт ЗША Франклін Рузвэльт эфэктыўна кіраваў краінай цягам чатырох тэрмінаў, што было абумоўлена цяжкой сытуацыяй у дзяржаве. Дэпутат С. Касьцян заяўляў, што 90% грамадзян Беларусі настроеныя, каб у краіне застаўся цяперашні лідэр[15].

Увосень 2002 году ўнутры краіны нішто не перашкаджала Лукашэнку ініцыяваць і правесьці рэфэрэндум, каб скасаваць палажэньне Канстытуцыі, якое забараняе адной і той жа асобе займаць пасаду прэзыдэнта больш за два тэрміны запар. І ўсё ж такое рашэньне не было прынятае, магчыма, таму, каб не правакаваць лішняга разу расейцаў на непрыязныя дзеяньні (прызнаньне Крамлём вынікаў такога «волевыяўленьня беларускага народу» абмежавала б расейскі ўплыў на беларускую палітыку).

Аднак Крэмль нічога ня меў супраць палітыкі ўзмацненьня жорсткасьці беларускага рэжыму. Улада працягвала свой наступ. Яе пляны не абмяжоўваліся падпарадкаваньнем прафсаюзаў, якія ўваходзяць у склад ФПБ: Л. Козік заклікаў усе прафсаюзныя арганізацыі краіны ўступіць у склад «аўтарытэтнага, згуртаванага, магутнага нацыянальнага прафцэнтру»[16].

[14] Белорусская деловая газета. 2002. 4 сентября.
[15] Белорусская деловая газета. 2002. 24 сентября.
[16] Белорусская деловая газета. 2002. 20 сентября.

Працягвалася «антыкарупцыйная кампанія»: 4 кастрычніка 2002 году Лукашэнка сваім указам стварыў «Дзяржаўную камісію для расьсьледаваньня фактаў лабіраваньня інтарэсаў камэрцыйных структураў з боку службовых асобаў органаў дзяржаўнага кіраваньня і праваахоўнай сыстэмы»[17] і паставіў яе кіраўніком старшыню КДК А. Тозіка. На наступны дзень, 5 кастрычніка, усё той жа Тозік згодна з указам Лукашэнкі ўзначаліў «Дзяржаўную камісію для прадухіленьня злоўжываньняў у цэлюлёзна-папяровай прамысловасьці». Паралельна працягвалася і кампанія ўціску на незалежныя СМІ.

16 кастрычніка 2002 году была пастаўленая кропка ў дыскусіі на тэму пашырэньня паўнамоцтваў ПП. Марыянэткавы парлямэнт прыняў прэзыдэнцкую рэдакцыю закону «Аб Нацыянальным Сходзе», якая замацоўвала яго падпарадкаваны статус. Гэтая падзея падахвоціла да дзеяньняў дэпутацкую фракцыю «Рэспубліка». З ініцыятывы лідэра фракцыі Валер'я Фралова 56 дэпутатаў падпісалі запыт да генпракурора Шэймана, каб той даў справаздачу ў справе зьнікненьня журналіста Зьмітра Завадзкага. Сам В. Фралоў, які гуртаваў вакол сябе дэпутатаў, гатовых да самастойных палітычных дзеяньняў, дэманстратыўна наведаў паседжаньне КРАПП. Гэта не засталося незаўважаным уладамі. Фармаваньне ланцуга «фракцыя «Рэспубліка» — АГП — Крэмль» ніяк не адпавядала іх інтарэсам. 5 лістапада адзін з ініцыятараў сустрэчы — старшыня АГП А. Лябедзька — быў афіцыйна папярэджаны КДБ, што яго дзейнасьць можа падпасьці пад арт. 356 КК «Здрада дзяржаве ў форме аказаньня дапамогі замежнай краіне ў правядзеньні варожай дзейнасьці супраць Беларусі»[18], за што пагражае пазбаўленьне волі на тэрмін да 15 гадоў. 13 лістапада 2002 году тры (Надзея Цыркун, Мікалай Дуніч і Ўладзімер Семянюк) з 12 чальцоў фракцыі «Рэспубліка» заявілі аб сваім выхадзе зь яе складу, што паралізавала яе функцыянаваньне (згодна з рэглямэнтам ПП, фракцыя мае права на існаваньне, калі налічвае сама меней 10 дэпутатаў). Сам В. Фралоў неспадзеўкі праявіў упартасьць. У грамадзтве пэўны рэзананс выклікалі яго заявы аб тым, што ліквідацыя фракцыі — вынік інтэнсіўнага ціску з боку АП, кіраўніцтва ПП, а таксама ідэалягічнага аддзелу Менгарвыканкаму. З словаў былога генэрала таксама вынікала, што яго тэлефоны праслухоўваліся, а за ім была ўсталяваная сталая прасока.

Аднак нягледзячы на актыўнасьць фракцыі «Рэспубліка», у цэлым ПП заставаўся паслухмяным, ручным органам. Пры канцы лістапада ёй безь вялікіх дэбатаў быў зацьверджаны пададзены ўрадам праект бюджэту на 2003 год, згодна зь якім атрыманыя за кошт скасаваньня шэрагу сацыяльных ільготаў 146,2 млрд. руб. накіроўваліся ў рэзэрвовы фонд прэзыдэнта[19]. Структура бюджэту адлюстравала характар сацыяльна-эканамічнай палітыкі рэжыму. У 2002 годзе Беларусь стала адзінай постсавецкай краінай, дзе скарацілася колькасьць прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасьці*. Гэта значыла, што асноўным працадаўцам у краіне па-ранейшаму заставалася дзяржава.

У пачатку сьнежня быў зроблены наступны крок для фармаваньня праўнай базы, патрэбнай для расчысткі шляху да наступнага прэзыдэнцкага тэрміну Лукашэнкі. У ПП пачаўся разгляд падрыхтаваных АП зьменаў да заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Згодна з прапанаванымі зьменамі, суд мог ліквідаваць палітычныя партыі і грамадзкія аб'яднаньні ў выпадку

[17] Белорусская деловая газета. 2002. 9 октября.

[18] Белорусская деловая газета. 2002. 12 ноября.

[19] Белорусская деловая газета. 2002. 27 ноября.

* «Белорусская деловая газета» ад 27 лістапада 2002 году паведамляе, што па становішчы на 2002 году ў Беларусі на 1000 чалавек прыпадала 2 прадпрыемствы зь недзяржаўнай формай уласнасьці, у Расеі — 6, у ЗША — 180.

парушэньня імі парадку правядзеньня масавай акцыі без вынясеньня папярэджаньня.

3 сьнежня 2002 году старшыня ФПБ Л. Козік прапанаваў Пленуму прафсаюзу аўтамабільнага і сельскага машынабудаваньня зьмяніць лідэра — Аляксандра Бухвостава, але 55 з 77 чальцоў Пленуму прагаласавалі супраць унясеньня прапановы Козіка ў парадак дня[20]. 21 сьнежня правалілася і атака Козіка супраць лідэра прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці Генадзя Фядыніча. 49 з 50 чальцоў Рады прафсаюзу выказаліся супраць яго замены[21].

Працягвалася мабілізацыя рэжыму. 18 лютага на нарадзе з удзелам кіраўніцтва сілавых структураў Лукашэнка заявіў аб намеры ўзяць пад асабісты кантроль дзейнасьць «структураў улады і сыстэмаў кіраваньня», а таксама правесьці «комплексную праверку» дзейнасьці КДБ і МУС[22]. На авансцэну беларускай палітыкі зноў выйшлі В. Шэйман і А. Тозік — галоўныя «рухавікі» антыкарупцыйнай кампаніі.

### Высновы

З аднаго боку, сталыя праверкі дзейнасьці выканаўчай вэртыкалі, судовых органаў і сілавых структураў, з другога боку — хвалі чыстак дырэктарскага корпусу, наступ на прафсаюзы, ціск на СМІ і дэмакратычныя сілы — усё гэта дазваляе рэжыму падтрымліваць высокую ступень сваёй мабілізацыі пры захаваньні слабасьці сваіх палітычных апанэнтаў. Паніжэньне рэйтынгу Лукашэнкі не азначала аўтаматычнага ўзмацненьня электаральных пазыцыяў яго палітычных супраціўнікаў.

## ПАЛІТЫКА ЎЛАДАЎ НА ІНФАРМАЦЫЙНЫМ РЫНКУ. ВЕРАСЕНЬ 2001—ЛЮТЫ 2003

### Суды над журналістамі пасьля выбарчай кампаніі 2001 году

Зараз па прэзыдэнцкіх выбарах, што адбыліся ў верасьні 2001 году, ЭІСМІ апублікаваў папярэднюю справаздачу пра маніторынг беларускіх СМІ, які зьдзяйсьняўся ў часе выбарчай кампаніі 2001 году. Аляксандар Лукашэнка дамінаваў у асьвятленьні перадвыбарнай кампаніі на Беларускім тэлебачаньні, атрымліваючы 58% этэрнага часу, а ў інфармацыйных выпусках — 84% усяго часу, адведзенага на кампанію. І папулярныя ў беларускай аўдыторыі расейскія тэлеканалы ГРТ, РТР і НТБ прысьвячалі Аляксандру Лукашэнку больш за

[20] Белорусская деловая газета. 2002. 5 декабря.
[21] Белорусская деловая газета. 2002. 24 декабря.
[22] Белорусская деловая газета. 2003. 20 февраля.

90% часу, прысьвечанага кандыдатам на пасаду прэзыдэнта Беларусі.

Пасьля перамогі Аляксандра Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году да незалежных выданьняў, якія адкрыта праявілі неляяльнасьць у часе передвыбарнай кампаніі, былі ўжытыя санкцыі. Ужываліся перадусім такія артыкулы Крымінальнага Кодэксу, як «Паклёп у дачыненьні да Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі» (арт. 367), «Абраза Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі» (арт. 368), «Абраза прадстаўніка ўлады» (арт. 369). Максымальнае пакараньне, прадугледжанае гэтымі артыкуламі, — пазбаўленьне волі тэрмінам да 5 гадоў. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году гэтыя артыкулы тарнаваліся ў дачыненьні да незалежных выданьняў і журналістаў. Паказальнымі ў гэтым пляне сталі працэсы над галоўным рэдактарам газэты «Пагоня» Міколам Маркевічам і журналістам Паўлам Мажэйкам, а таксама галоўным рэдактарам газэты «Рабочы» Віктарам Івашкевічам.

Яшчэ напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году 27 жніўня 2001 году ВГС Беларусі прыняў да вядзеньня пазоў пракуратуры Гарадзенскай вобласьці да газэты «Пагоня», пададзены «ў інтарэсах дзяржавы» ў асобе Дзяржкамдруку. У час разьбіральніцтва, пазоўнік, Дзяржкамдрук, адмовіўся ад сваіх патрабаваньняў, але Гарадзенская пракуратура працягнула пачатую справу. 4 верасьня ў друкарні быў арыштаваны ўвесь наклад газэты. Пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце публікацыі ў канфіскаваным нумары артыкула Паула Мажэйкі «Ідзём на выбары», ліста чытача «Ён — не Лукашэнка» і верша нявызначанага аўтара «Абяшчал! Абяшчаю! Буду абяшчать!». Зьмест публікацыяў быў ацэнены як паклёп на прэзыдэнта Беларусі. За зьмест гэтага ж нумару 21 верасьня Гарадзенская пракуратура вынесла папярэджаньне рэдакцыі газэты, якое далучылі да справы, што разглядалася ВГС. 12 лістапада 2001 году судзьдзя ВГС Валер Жандараў пастанавіў зачыніць газэту «Пагоня» і ліквідаваць рэдакцыю.

24 чэрвеня 2002 году судом Ленінскага раёну Горадні галоўны рэдактар газэты «Пагоня» Мікола Маркевіч і журналіст Павал Мажэйка былі прызнаныя вінаватымі ў паклёпе на прэзыдэнта і асуджаныя да абмежаваньня волі на два з паловай і два гады адпаведна. Пракурор патрабаваў стражэйшага пакараньня — два і два з паловай гады пазбаўленьня волі ў калёніі строгага рэжыму. Але суд, з улікам таго, што Мікола Маркевіч — бацька двух непаўналетніх дзяцей, а журналісту Паўлу Мажэйку ўсяго 24 гады, прызначыў пакараньне, якое прадугледжвала працу ў спэцустанове (т.зв. «хімія»). Пазьней, пасьля шасьцёх месяцаў абмежаваньня волі, пакараньне Міколу Маркевічу зьмякчылі. Ён вярнуўся ў Горадню, дзе стаў працаваць экспэдытарам у фірме «Верасень» і быў абавязаны выплачваць дзяржаве 15% атрыманага заробку.

У верасьні 2002 году ў Менску пачаўся закрыты судовы працэс супраць галоўнага рэдактара газэты «Рабочы» Віктара Івашкевіча па справе аб паклёпе на Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. 20 чэрвеня 2002 году пракуратура Першамайскага раёну Менску абвінаваціла галоўнага рэдактара газэты «Рабочы» Віктара Івашкевіча ў замаху на абразу і паклёп у дачыненьні да прэзыдэнта Беларусі (часткі 2 артыкулаў 367 і 368 з ужыцьцём частак 1 і 2 артыкула 14 Крымінальнага Кодэксу). Зачэпкай для абвінавачаньня стала публікацыя ў газэце «Рабочы» 22 жніўня 2001 году пад загалоўкам «Злодзей павінен сядзець у турме». Матэрыял, перадрукаваны з Інтэрнэту, паведамляў пра карупцыю сярод найвышэйшага чынавенства Беларусі. Спэцыяльны выпуск, накладам 39 тысяч асобнікаў, быў канфіскаваны 28 жніўня 2001 году ў друкарні «Мэджык», якой перад прэзыдэнцкімі выбарамі апекаваўся намесьнік старшыні Дзяржкамдруку Ўладзімер Глушакоў.

Судовы працэс пачаўся 11 верасьня. Абарона заявіла колькі хадайніцтваў, спрабуючы дамагчыся прыцягненьня дадатковых матэрыялаў у справе і высьвятленьня, хто ж аўтар публікацыі. Хадайніцтвы былі адхіленыя. 16 верасьня судзьдзя Першамайскага суду Менску Ўладзімер Корбышаў на закрытым судовым паседжаньні прызнаў Віктара Івашкевіча вінаватым у замаху на абразу і замаху на паклёп што да прэзыдэнта Беларусі, асудзіўшы яго да двух гадоў абмежаваньня волі. У сьнежні 2002 году Віктар Івашкевіч паехаў адбываць тэрмін пакараньня ў места Баранавічы. Яму былі прапанаваныя некалькі ўстановаў адкрытага тыпу, у тым ліку і ў Менскай вобласьці, але ён выбраў Баранавічы. Асобы, якія адбываюць пакараньне ў Баранавічах, як правіла, працуюць на сельскагаспадарчых прадпрыемствах або ў будаўнічых трэстах.

## Адміністрацыйны і эканамічны ўціск на незалежныя друкаваныя СМІ

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў трое прадстаўнікоў незалежнай прэсы былі зьняволеныя. Аднак эканамічная дыскрымінацыя незалежных выданьняў — больш надзейны спосаб іх павольнай ліквідацыі, які не прыцягвае аж такой пільнай увагі грамадзтва, як суды над журналістамі. Незалежныя выданьні выціскаюцца з мэдыйнай прасторы Беларусі празь няроўныя ўмовы эканамічнай дзейнасьці для дзяржаўных і незалежных мэдыяў.

Афіцыйныя выданьні знаходзіліся ў выгаднейшых умовах у параўнаньні зь незалежнай прэсай задоўга да выбараў прэзыдэнта ў 2001 годзе. Яны атрымлівалі датацыі наўпрост зь бюджэту, для іх былі ўсталяваныя ніжэйшыя тарыфы на распаўсюджаньне і друк, яны падлягалі абавязковай ведамаснай падпісцы.

Мэтода эканамічнай дыскрымінацыі эфэктыўная ў беларускіх варунках ня менш за судовыя санкцыі. У 2002 годзе істотна падаражэлі паслугі дзяржаўнага манапаліста «Белпошта» на дастаўку падпіснога накладу для незалежных газэтаў, тым часам як дастаўка дзяржаўных газэтаў датавалася зь дзяржаўнага бюджэту. Цягам 2002 году для незалежных выданьняў усьцяж даражэлі паслугі друкарняў. Таксама ўзьніклі абмежаваньні для дзяржаўных прадпрыемстваў на разьмяшчэньне рэклямы ў незалежных СМІ. Для іх менскія ўлады ўвялі дадатковы пяціадсоткавы падатак з абарачэньня на некаторыя віды продажаў, у прыватнасьці, рэклямы і рэалізацыі накладу, вызваліўшы ад яго дзяржаўныя выданьні. Дзяржаўныя газэты мелі 20-адсоткавую зьніжку з ільготнай стаўкі арэндавага плацяжу. У выніку такой няроўнасьці эканамічнае становішча недзяржаўных СМІ значна пагоршылася. З эканамічных прычынаў спынілі сваё існаваньне такія газэты, як «Беларуская маладзёжная» і «Рабочы». Выкарыстаньне эканамічных і адміністрацыйных мэтадаў ціску дазваляла беларускім уладам, не ўжываючы адкрытага гвалту, эфэктыўна абмяжоўваць дзейнасьць апазыцыйных выданьняў.

Нягледзячы на спрыяльнейшыя варункі, эканамічныя праблемы былі і ў дзяржаўных выданьняў. Ужо на пачатку 2002 году рэдакцыі дзяржаўных газэтаў атрымалі распараджэньне скараціць штаты на 20% (яно не распаўсюджвалася на буйныя газэты «Советская Белоруссия», «Звязда», «Рэспубліка»), у дзяржаўных газэтах пачаліся затрымкі выплаты заробкаў[1].

[1] Белорусский рынок. 2002. 14 октября.

У жніўні 2002 году быў звольнены галоўны рэдактар газэты прафэсійных зьвязаў «Беларускі час» Аляксандар Старыкевіч. 2003 год у Фэдэрацыі прафэсійных зьвязаў Беларусі пачаўся з звальненьня журналістаў гэтае газэты. Рэдакцыйная палітыка пасьля звальненьня Аляксандра Старыкевіча не зьмянілася, і Ірыне Германовіч, якая выконвала абавязкі рэдактара, прапанавалі звольніцца паводле ўласнага жаданьня[2]. На пасаду галоўнага рэдактара была прызначаная Сьвятлана Балашова. Супрацоўнікам афіцыйна, — у сувязі з складаным фінансавым становішчам, — усталявалі няпоўны працоўны дзень, 2 гадзіны ў дзень з акладам 0,25 стаўкі. Нізкія авансы выплачваліся зь вялікімі затрымкамі. Журналісты, якія працавалі на падставе падраднай дамовы, цягам амаль двух месяцаў не атрымлівалі грошай увогуле. Напярэдадні Калядаў журналісцкі калектыў газэты звольнілі па скарачэньні штатаў у сувязі зь цяжкім фінансавым становішчам.

21 жніўня 2002 году адзін з чатырох заснавальнікаў газэты «Свободные новости» наважыў спыніць выпуск газэты і зьвярнуўся з заявай у Міністэрства інфармацыі. Міністэрства мела ў сваім распараджэньні месяц, каб уважліва вывучыць справу, але міністар Міхаіл Падгайны падпісаў заяву ў той жа дзень, і тады ж быў выдадзены загад — прызнаць, што пасьведчаньне аб рэгістрацыі газэты страціла моц. Адпаведныя распараджэньні былі накіраваныя ў друкарню і арганізацыі, якія займаліся распаўсюджаньнем газэты. Іншыя заснавальнікі выданьня, спасылаючыся на артыкул 16 Закону аб друку (паводле гэтага артыкулу, каб спыніць выпуск газэты, недастаткова жаданьня заснавальніка, неабходныя таксама падставы, прадугледжаныя статутам рэдакцыі ці дамовай паміж заснавальнікамі і рэдакцыяй газэты), зьвярнуліся ў ВГС. У 2001 годзе Сяргей Атрошчанка, уладальнік 60% акцыяў ЗАТ «СНА», што выдавала газэту, ужо дамагаўся зьмяненьня рэдакцыйнае палітыкі. У верасьні 2001 году спрэчка паміж сузаснавальнікамі была вырашаная дзякуючы перамовам паміж кіраўніцтвам рэдакцыі і Дзяржкамітэтам па друку, адным з прадстаўнікоў якога, у прыватнасьці, быў Міхаіл Падгайны. У той час ён не знайшоў падставаў спыніць выхад выданьня. Потым ЗАТ «СНА» перастала быць выдаўцом «Свободных новостей», заснавальнікамі засталіся фізычныя асобы: Аляксандар Уліцёнак, Васіль Зданюк, Аляксандар Тамковіч, Сяргей Атрошчанка. 21 жніўня 2002 году Сяргей Атрошчанка паведаміў рэдакцыі пра закрыцьцё выданьня. Міхаіл Падгайны, цяпер ужо ў якасьці міністра інфармацыі, быў на ягоным баку. Асноўны аргумэнт Сяргея Атрошчанкі палягаў у тым, што газэта апошнім часам нясе страты, наклад зьмяншаецца і далейшае яе існаваньне ня мае сэнсу. Абвінавачаньні ў стратнасьці газэты былі спраставаныя Аляксандрам Тамковічам, згодна зь якім за 2001 год даходы «Свободных новостей» склалі каля 14 млн. беларускіх рублёў, ці прыблізна 7600 USD.

16 кастрычніка 2002 году ВГС разгледзеў пазоў трох заснавальнікаў газэты «Свободные новости» (Аляксандра Ўліцёнка, Васіля Зданюка і Аляксандра Тамковіча) да Міністэрства інфармацыі з патрабаваньнем прызнаць несапраўдным загад міністра Міхаіла Падгайнага аб прызнаньні нядзейным пасьведчаньня аб рэгістрацыі газэты і адмовіў пазоўнікам у яго задавальненьні. Пасьля ліквідацыі «Свободных новостей» калектыў зарэгістраваў і пачаў выдаваць новую газэту — «Свободные новости Плюс».

У лістападзе 2002 году была зачыненая газэта «Местное время», — пасьпелі выйсьці толькі тры яе нумары. Прычынай ліквідацыі стала скасаваньне рэгістрацыі заснавальніка, ААТ «Местное время-пресс». Загад пра ануляваньне пасьведчаньня аб рэгістрацыі быў пад-

[2] Народная Воля. 2003. 15 студзеня.

пісаны міністрам інфармацыі Міхаілам Падгайным 26 лістапада. Рэдакцыя даведалася пра гэта толькі наступным днём. Падставай для загаду стала пастанова Менскага аблвыканкаму ад 21 лістапада пра скасаваньне сваёй жа ўласнай пастановы аб рэгістрацыі юрыдычнай асобы, выдаўца газэты, у выніку неадпаведнасьці юрыдычнага адрасу арганізацыі, запісанага ў рэгістрацыйных дакумэнтах, і адрасу, на якім фактычна знаходзілася арганізацыя.

Менаблвыканкам пастанавіў ліквідаваць выдаўца за тры дні пасьля папярэджаньня, у якім заснавальнікам даваўся месяц на выпраўленьне дакумэнтаў. Галоўны рэдактар газэты Анатоль Гуляеў растлумачыў такое імкненьне зьнішчыць газэту тым, што набліжаліся мясцовыя выбары, і чыноўнікі баяліся, што газэта будзе агітаваць на карысьць дэмакратычных сілаў, а таксама сяброўскімі стасункамі самага рэдактара з былым міністрам сельскай гаспадаркі Васілём Лявонавым. Незадоўга да выбараў у мясцовыя Рады, 27 лютага 2003 году, уступіла ў моц пастанова касацыйнай інстанцыі Гарадзенскага абласнога гаспадарчага суду аб ліквідацыі выдаўца «Новой газеты Сморгони». 3 лютага Гарадзенскі абласны гаспадарчы суд пастанавіў спыніць дзейнасьць індывідуальнага прадпрымальніка Рамуальда Ўлана, заснавальніка газэты, за неаднаразовыя парушэньні заканадаўства. Выпуск «Новой газеты Сморгони» быў прыпынены.

На тры месяцы Міністэрства інфармацыі прыпыніла ў Берасьцейскай вобласьці выхад незалежнай газэты «Вечерний Столин», якая выходзіла накладам у 7500 асобнікаў і складала канкурэнцыю дзяржаўнай газэце «Навіны Палесся». Газэта атрымлівала папярэджаньні адно за адным: 24 і 25 лютага за публікацыю «У знак пратэсту» («Вечерний Столин», № 5), за зьвесткі, накіраваныя на распальваньне сацыяльнай варажнечы і замах на гонар і годнасьць грамадзян, а таксама за артыкул «В Столинском районе нет мафии! У нас — вертикаль» («Вечерний Столин», № 6), дзе, паводле вэрсіі Міністэрства інфармацыі, раскрываліся матэрыялы зь яшчэ незавершанага папярэдняга сьледзтва безь пісьмовага дазволу сьледчых. Выдавец і галоўны рэдактар газэты Аляксандар Ігнацюк атрымаў абодва папярэджаньні 28 лютага, а днём раней, 27 лютага, — загад аб прыпыненьні выданьня. І таму ён ня змог абскардзіць пастановаў Міністэрства інфармацыі.

Кампанія мясцовых выбараў 2003 г. адбывалася на тле пагаршэньня, у параўнаньні з папярэднімі выбарамі, становішча з свабодай слова. На незалежныя СМІ чыніўся ціск, дзяржаўныя СМІ практычна не давалі магчымасьці дэмакратычным кандыдатам выказаць свае погляды, дадатковыя наклады раённых газэт — весьнікаў выканкамаў — з агітацыйнымі матэрыяламі кандыдатаў, падтрыманых адміністрацыяй, рассылаліся задарма ўсім выбарцам[3].

## Ператварэньні ў сфэры электронных СМІ

Палітыка ўладаў у дачыненьні да электронных СМІ ў краіне ў пэрыяд паміж прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 году і выбарамі ў мясцовыя Рады ў 2003 годзе была накіраваная на ўзмацненьне дзяржаўнага кантролю над распаўсюджаньнем інфармацыі. Прычым, улічваючы ролю расейскіх СМІ ў інфармацыйнай прасторы краіны, ужо зьдзейсьненыя і заплянаваныя ўладамі захады прадугледжвалі ўзмацненьне кантролю акурат над расейскім тэле- і радыёвяшчаньнем. Яшчэ ў лютым 2001 году НДТРК Беларусі пачала перакрываць рэкляму, якую

[3] БелаПАН. 2003. 4 сакавіка.

разьмяшчала ў айчынным этэры, а пры канцы першага кварталу замест яе пачала трансьлявацца беларуская рэкляма. У лютым 2002 году выйшаў указ Лукашэнкі «Аб стварэньні ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал». У тым жа месяцы прэзыдэнцкім указам старшынём ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» быў прызначаны Рыгор Кісель.

Новы нацыянальны канал атрымаў назоў АНТ — Агульнанацыянальнае тэлебачаньне — і павінен быў весьці трансьляцыю на частаце расейскага каналу ГРТ. 25 чэрвеня 2002 году канал АНТ пачаў вяшчаньне і ахапіў 98% тэрыторыі краіны. З пачаткам працы гэтага каналу ў БТ зьявіўся канкурэнт. АНТ вядзе барацьбу за грошы рэклямадаўцаў, складаючы БТ эканамічную канкурэнцыю. Пакеты акцыяў АНТ разьмеркаваліся наступным чынам: 51% — у руках дзяржавы, астатняя частка акцыяў была падзеленая паміж «Беларусбанкам» (29%) і прыватнай тэлекампаніяй «ФІТ» (20%). АНТ атрымала магчымасьць зьмяняць час паказу некаторых праграмаў ГРТ на больш зручны для беларускага гледача. Уласным прадуктам сьпярша была інфармацыйная перадача «Наши новости».

У сьнежні 2002 году было абвешчана ўжо пра пляны стварэньня нацыянальнага тэлеканалу «Спадчына». 24 сьнежня 2002 году Аляксандар Лукашэнка прыняў старшыню НДТРК Ягора Рыбакова. Паводле «Белорусской газеты», Ягор Рыбакоў прапанаваў прэзыдэнту стварыць яшчэ адзін нацыянальны тэлеканал, «Спадчына», прысьвечаны адукацыі і культуры[4].

Урэшце, 30 сьнежня 2002 году Рада Міністраў прыняла пастанову «Аб электронных і сеткавых СМІ», паводле якой да 1 чэрвеня 2003 году ўсе электронныя СМІ мусілі прайсьці перарэгістрацыю. Права разьмеркаваньня частотаў і выдачы ліцэнзіяў перайшло ад Міністэрства сувязі да Міністэрства інфармацыі. Да 1 чэрвеня 2003 году яно мелася правесьці перарэгістрацыю выдадзеных раней ліцэнзіяў на этэрную трансьляцыю гукавых і тэлевізійных праграмаў. Пад перарэгістрацыю ліцэнзіяў, выдадзеных Міністэрствам сувязі, падпалі 183 праграмы радыё- і тэлевяшчаньня, сярод якіх 129 праграмаў радыёвяшчаньня і 54 — тэлевяшчаньня, зарэгістраваныя на 1 студзеня 2003 году. Кампаніі, якія ўжо маюць ліцэнзію на вяшчаньне, мусілі атрымаць паўторную ліцэнзію. Тыя зь іх, што не прайшлі перарэгістрацыі, пазбавіліся ліцэнзіі.

Гэтая пастанова ад 30 сьнежня 2002 году не закранула кабэльнага тэлебачаньня: Міністэрства сувязі выдавала дазвол на будаўніцтва кабэльных сетак, а ўзгадненьне трансьляцыі пакету тэлеканалаў праводзілася зь мясцовымі органамі ўлады. Аднак у гутарцы з карэспандэнтам «Белорусской газеты» намесьнік міністра інфармацыі Сяргей Булацкі пацьвердзіў, што яго ўстанова мяркавала неўзабаве перарэгістраваць і кабэльныя СМІ[5]. Апэратары кабэльнага тэлебачаньня не выступаюць у ролі СМІ, выконваючы адно тэхнічныя функцыі. Але іхняе становішча істотна зьмяняецца пры нават мінімальным умяшальніцтве ў зьмест праграмаў, якія трансьлююцца. Уласныя ўстаўкі ў этэр якога-небудзь тэлеканалу, нават калі гэта толькі рэклямныя ролікі, навіны ці віншаваньні, перададзеныя праз кабэльнае вяшчаньне, патрабуюць абавязковай рэгістрацыі апэратара ў якасьці СМІ ў Міністэрстве інфармацыі.

Сяргей Булацкі таксама выступіў супраць простай рэтрансьляцыі расейскіх тэле- і радыёканалаў і заявіў, што дзяржава будзе патрабаваць ад «беларускага вяшчаньня» стварэньня арыгінальных інфармацыйных і іншых перадачаў.

---

[4] Белорусская газета. 2003. 20 января.

[5] Белорусская газета. 2003. 27 января.

## Абмежаваньне расейскага ўплыву на інфармацыйную прастору Беларусі

У жніўні 2002 году былі зьмененыя аб'ёмы вяшчаньня расейскіх тэлеканалаў у Беларусі. У заяве, агучанай 11 кастрычніка 2002 году аддзелам па сувязях з грамадзкасьцю Белтэлерадыёкампаніі, гэта тлумачылася цяжкасьцямі з аплатай паслугаў рэтрансьляцыі сыгналу. У першую чаргу працэс выцясьненьня расейскіх каналаў зь беларускага этэру закрануў беларускую правінцыю. З 1 лютага 2003 году сем перадавальнікаў, якія выкарыстоўваліся УДТРК для рэтрансьляцыі каналу РТР ў Браславе, Брагіне, Жлобіне, Майскім, Жыткавічах, Слоніме, Смургонях і Крычаве, былі перададзеныя для трансьляцыі рэгіянальнага тэлебачаньня. Паводле сьцьверджаньня Белтэлерадыёкампаніі, гэта дазволіла павялічыць зону пашырэньня сыгналу абласных тэлестудыяў амаль на 30%. Ад пачатку 2003 году аб'ём вяшчаньня абласных тэлестудыяў склаў блізу 13,5 гадзіны ў суткі.

Ідэйны сэнс гэтых захадаў выявіў галава Белтэлерадыёкампаніі Ягор Рыбакоў, які заявіў: «Беларускі глядач заўсёды вельмі заблытаны ў сувязі з прысутнасьцю тут трох імпэрскіх каналаў. Тэлевізійны рынак знаходзіцца ў нас пад вялікай пагрозай, і калі мы не пачнём забіраць перадавальнікі, мы пачнём сьпяваць, як Пугачова, ці гаварыць, як Максім Галкін. Мы забываемся, што ў нас ёсьць тэатар «Хрыстафор», ёсьць каманда КВЗ БДУ... Мы — сувэрэнная дзяржава, і мы будзем разьвіваць сваё тэлебачаньне»[6].

З 2 студзеня 2003 году на тэрыторыі Беларусі ў УКХ-дыяпазоне была спыненая рэтрансьляцыя трох расейскіх радыёстанцыяў: «Маяк», «Голос России» і «Юность». Месца папулярнага ў беларускіх радыёслухачоў «Маяка» заняла радыёстанцыя «Сталіца». Паводле афіцыйнай вэрсіі, адлучэньне расейскіх каналаў адбылося з эканамічных прычынаў.

Такім чынам, для абмежаваньня расейскага вяшчаньня выкарыстоўваліся эканамічныя аргумэнты, а таксама довады пра абарону і захаваньне Беларусьсю як сувэрэннай дзяржавай уласнай інфармацыйнай прасторы. У адказ на дамінаваньне ў тэлеэтэры расейскіх каналаў РТР, ГРТ, НТБ, «Культура» распачалося вяшчаньне каналу АНТ. У радыёэтэры пазыцыі беларускага боку былі больш грунтоўныя: тры нацыянальныя, пяць рэгіянальных каналаў і колькі FM-станцыяў. Але расейскія радыёстанцыі станавілі ім сур'ёзную канкурэнцыю, да прыкладу, FM-станцыі «Русское радио», «Европа+», «Хит FM». Радыёстанцыі «Маяк» і «Юность» працавалі ў УКХ-дыяпазоне і маглі прыймацца нават прымітыўнымі радыёпрымачамі.

Як і напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, падчас мясцовых выбараў 2003 г. кампаніі адбывалася ўзмацненьне кантролю над СМІ, перш за ўсё расейскімі. Пару гадоў таму Лукашэнка, гуляючыся ў беларуска-расейскую інтэграцыю, мусіў дэманстраваць прыязнасьць да Расеі і трываць расейскія СМІ. Хаця пра стварэньне другога нацыянальнага тэлеканалу ён заявіў яшчэ ў 2000 годзе, рэалізаваць ідэю ўдалося толькі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, якімі была пацьверджаная Лукашэнкава легітымнасьць унутры краіны. Крыху раней, у студзені 2001 году, замест «8 каналу» ў менскім тэлевізійным этэры зьявіўся канал СТБ. Нягледзячы на наяўнасьць усіх неабходных дакумэнтаў і ліцэнзіяў, «8-му каналу» не падоўжылі дамову арэнды перадавальніка.

[6] Белорусский рынок. 2003. 18 января.

## Стаўленьне беларусаў да СМІ і пэрспэктывы манапалізацыі інфармацыйнае прасторы Беларусі

У красавіку 2002 году ў рамках праекту «Павышэньне ролі незалежных сацыяльных дасьледаваньняў і экспэртных сетак у Беларусі» НІСЭПД правёў нацыянальнае апытаньне грамадзкай думкі. Былі апытаныя 1464 рэспандэнты (памылка выбаркі не перавышае 0,03). Паводле вынікаў гэтага апытаньня, супастаўляючы атрыманыя дадзеныя з матэрыяламі папярэдніх дасьледаваньняў, можна меркаваць пра паніжэньне даверу грамадзтва да дзяржаўных СМІ і паступовы ўзрост даверу да незалежных. Гл. табліцу 1.

**Табліца 1.** Дынаміка даверу да сродкаў масавай інфармацыі, %

| Варыянт адказу | 11'97 | 09'98 | 06'99 | 04'00 | 11'01 | 04'02 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзяржаўныя СМІ | | | | | | |
| - давяраюць | 43,7 | 41,8 | 39,8 | 38,5 | 40,4 | 38,7 |
| - не давяраюць | 21,0 | 26,0 | 31,0 | 31,6 | 42,4 | 43,1 |
| Недзяржаўныя СМІ | | | | | | |
| - давяраюць | 25,4 | 19,6 | 19,5 | 25,7 | 31,7 | 32,2 |
| - не давяраюць | 34,1 | 32,6 | 34,9 | 31,9 | 42,1 | 43,9 |

Ад канца 1997 году колькасьць тых, хто не давярае як дзяржаўным, гэтак і незалежным СМІ, павялічылася ўдвая. Аднак, калі група тых, хто давярае незалежным СМІ, таксама вырасла, гэтага не адбылося з аўдыторыяй дзяржаўных СМІ. Стаўленьне да дзяржаўнай прэсы цягам пяцёх гадоў было больш стабільнае. Аднак, згодна з вынікамі апытаньня красавіка 2002 году, ступень недаверу рэспандэнтаў дзяржаўным і незалежным СМІ была аднолькавая.

Пры гэтым асноўным канкурэнтам дзяржаўнае прэсы на рынку друкаваных СМІ ў Беларусі заставаліся не незалежныя выданьні, а беларускія выпускі расейскіх СМІ, такія, як «Комсомольская правда в Беларуси» або «Аргументы и факты в Беларуси», што не аддавалі шмат увагі палітыцы. Іх папулярнасьць значна ўзрасла пасьля 1997 году ў параўнаньні з рэгіянальнымі або агульнанацыянальнымі выданьнямі. Гл. табліцу 2.

Друкаваная прэса па папулярнасьці ў якасьці крыніцы інфармацыі знаходзілася на другім месцы пасьля тэлебачаньня. У якасьці асноўнае крыніцы сацыяльна-палітычнай і эканамічнай інфармацыі яе абралі трое зь пяцёх рэспандэнтаў (62,5%). Асноўнай крыніцай інфармацыі пра падзеі ў Беларусі і ў сьвеце для беларускай аўдыторыі заставалася тэлебачаньне. Чацьвёра зь пяцёх рэспандэнтаў (81,3%), адказваючы на адкрытае пытаньне, ставілі тэлебачаньне на першае месца сярод СМІ як найбольш даступны сродак масавай інфармацыі. Радыё саступала друкаваным СМІ, яго назвалі менш за палову рэспандэнтаў (42,7%). На гэтым тле неверагодна мізэрнай у інфармаваньні нашага грамадзтва заставалася роля «сусьветнага сеціва» — яму аддалі перавагу толькі 2% апытаных.

Найбольшым даверам сярод крыніцаў інфармацыі ў беларусаў таксама карысталася тэлебачаньне. Яго назвалі 28,6% рэспандэнтаў. Прэсе аддалі перавагу 13,8% апытаных, радыё — 8,1%. У часе апытаньня найбольшай папулярнасьцю ў Беларусі карысталіся расейскія тэлевізійныя каналы, перадусім агульнарасейскія, даступныя шырокай беларускай аўдыторыі. Гл. табліцу 3.

**Табліца 2.** Разьмеркаваньне адказу на пытаньне «Якія газэты Вы чытаеце?», % (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянты адказу | 06'97 | 07'00 | 10'01 | 04'02 |
|---|---|---|---|---|
| Мясцовая прэса ("Вечерний Минск", "Брестский курьер" і да т.п.) | 43.1 | 42.3 | -** | 48.3 |
| "Комсомольская правда в Белоруссии" | 4.1 | 21.0 | 35.6 | 39.4 |
| "Советская Белоруссия" | 23.2 | 29.4 | 37.7 | 34.8 |
| "АиФ в Белоруссии" | 22.0 | 25.6 | 40.5 | 31.5 |
| "Белорусская деловая газета" | 2,5 | 7,4 | 12,1 | 11,7 |
| "Народная Воля" | 5,5 | 9,8 | 12,8 | 10,5 |
| "Свободные новости" | 4.9 | 6.1 | 10.4 | 7.1 |
| "Известия в Беларуси" | -** | 6.1 | 10.7 | 6.2 |
| "Белорусская газета" | 2.5 | 4.4 | 8,4 | 5.2 |
| "Белорусский рынок" | 2.2 | 4,7 | 6,6 | 4,4 |
| "Наша свобода" | -** | 3,6 | 5,5 | 3,1 |
| "Беларускі час" | -** | -** | 5.2 | 2.6 |
| "Дзень" | -** | -** | 3.0 | 1.8 |
| "Рабочы" | 2.5 | 2.4 | 2,4 | 1.6 |
| "Беларуская маладзёжная" | -** | -** | -** | 0,9 |
| "Belarus Today" | -** | -** | -** | 0.5 |
| Іншыя | 21,9 | 16,6 | 21,9 | 17,8 |

* У гэтым апытаньні пытаньне фармулявалася крыху йначай: «Якія газэты вы чытаеце рэгулярна?»
** У гэтых апытаньнях указаныя газэты ня згадваліся.

**Табліца 3.** Разьмеркаваньне адказу на пытаньне «Якія тэлеканалы Вы глядзіце?», % (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянт адказу | 06'97* | 08'00 | 08'01 | 04'02 |
|---|---|---|---|---|
| ОРТ | 90.7 | 89.8 | 93,1 | 95,1 |
| РТР | 58.1 | 77.1 | 80,7 | 77.1 |
| Беларускае тэлебачаньне | 66,4 | 71.9 | 77.1 | 67.7 |
| НТВ | 27,7 | 56,1 | 54.9 | 50,5 |
| Мясцовае тэлебачаньне (абласное, гарадское) | -** | 37.2 | 39,0 | 32,4 |
| ТВ-6 | 4,8 | -** | -** | 12,3 |
| Кабельнае тэлебачаньне | -** | -** | -** | 9.3 |
| Спадарожнікавае тэлебачаньне | 1.3 | 10,0 | 9.7 | 5.3 |
| Іншае | -** | 7,6 | 7,4 | 4,9 |

* У гэтым апытаньні пытаньне фармулявалася крыху йначай: «Перадачы якіх каналаў вы глядзіце рэгулярна?»
** У гэтых апытаньнях указаныя тэлеканалы ня згадваліся.

У меру разьвіцьця радыёвяшчаньня і FM-вяшчаньня, у прыватнасьці, рэйтынг дзяржаўнага радыё зьніжаўся. Пры гэтым, як і ў выпадку з тэлебачаньнем, Беларусь, з прычыны моўнага бар'еру і нізкага ўзроўню жыцьця, якія абмяжоўваюць доступ да іншых каналаў інфармацыі, заставалася ў расейска-беларускай інфармацыйнай прасторы. Гл. табліцу 4.

Ступень даверу беларусаў да афіцыйных СМІ невысокая. Паводле вынікаў красавіцкага апытаньня 2002 году НІСЭПД, толькі 11,5% рэспандэнтаў адказалі, што інфармацыя з афіцыйных крыніцаў цалкам адпавядае рэальнаму жыцьцю, 66,7% адказалі, што адпавядае часткова, 16,1% — зусім не адпавядае.

Асаблівае ўвагі заслугоўваюць вынікі дасьледаваньня, прысьвечанага крыніцам інфармацыі, зь якіх беларусы атрымліваюць зьвесткі пра падзеі. Паводле дадзеных апытаньня грамадзкае думкі, праведзенага НІСЭПД у сьнежні 2002 году (апытаныя 1478 рэспандэнтаў,

**Табліца 4.** Разьмеркаваньне адказу на пытаньне «Якія радыёстанцыі Вы слухаеце?», % (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянт адказу | 06'97* | 07'00 | 08'01 | 04'02 |
|---|---|---|---|---|
| Беларускае дзяржаўнае радыё | 55.0 | 53.8 | 19,0 | 13,3 |
| Мясцовае радыё | ** | 34.2 | 37,9 | 32.4 |
| FM-станцыі | ** | 33.1 | 35.6 | 42.3 |
| Расейскія радыёстанцыі | ** | 30,2 | 31,0 | 22,5 |
| Беларуская служба радыё "Свабода" | 2,4 | 7,1 | 11,3 | 8,9 |
| Іншыя замежныя радыёстанцыі | ** | 1,6 | 5,6 | 1,4 |
| Расейская служба радыё "Свабода" | 3,0 | 4,2 | 6,9 | 4,4 |
| Іншыя радыёстанцыі | ** | 3,3 | 4,2 | 2,7 |

* У гэтым апытаньні пытаньне фармулявалася крыху йначай: «Якія радыёстанцыі вы слухаеце рэгулярна?»
** У гэтых апытаньнях указаныя радыёстанцыі не згадваліся.

**Табліца 5.** Разьмеркаваньне адказу на пытаньне «Зь якіх крыніцаў Вы звычайна атрымліваеце інфармацыю пра тое, што дзеецца ў Беларусі і за яе межамі?», % (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Расейскае тэлебачаньне | 78.1 |
| Беларускае тэлебачаньне | 64.1 |
| Ад сваякоў, сяброў, калегаў і г.д. | 30.4 |
| Беларускае дзяржаўнае радыё | 25.0 |
| Беларуская дзяржаўная прэса | 22,0 |
| FM-радыёстанцыі (Бі-Эй, Радыё-Рокс, Альфа-Радыё, Радыё-Сталіца і інш.) | 19.9 |
| Беларуская недзяржаўная прэса | 12.9 |
| На працы (інфармацыйныя сустрэчы, палітінфармацыі і да т.п.) | 9,9 |
| Замежныя радыёстанцыі | 3,3 |
| Зь іншых крыніцаў | 1,7 |
| Мне цяжка адказаць | 3.8 |

памылка рэпрэзэнтатыўнасьці не перавышае 0,03), на трэцім месцы сярод крыніцаў інфармацыі пра падзеі ў Беларусі і сьвеце былі названыя міжасабовыя кантакты — з сваякамі, сябрамі, калегамі і г.д. (Зацем: пры супастаўленьні рэйтынгу беларускага і расейскага тэлебачаньня ў гэтым апытаньні належыць улічваць, што беларускі канал АНТ выкарыстоўвае зьмяшанае вяшчаньне і ў ім пераважаюць расейскія праграмы. Таму частка рэспандэнтаў магла залічыць гэты канал да беларускага тэлебачаньня, частка — да расейскага). Гл. табліцу 5.

Гэтыя дадзеныя дазвалялі засумнявацца ў доўгатэрміновай эфэктыўнасьці ўжо прынятых і заплянаваных захадаў па ўзмацненьні кантролю за інфармацыйнай прасторай Беларусі.

## Высновы

Імкненьне дзяржавы манапалізаваць інфармацыйную прастору Беларусі прадыктаванае ня гэтак навязаньнем рэакцыйнае антылібэральнае ідэалёгіі, як патрэбай стрымліваць фармаваньне шырокага супраціву рэжыму ўнутры краіны.

Дзяржаўная палітыка што да беларускіх незалежных СМІ ў пэрыяд паміж прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 году і выбарамі ў мясцовыя Рады прынцыпова не адрозьнівалася ад палітыкі папярэдняга пэрыяду. Пашырэньне беларускага тэлевізійнага вяшчаньня за кошт расейскага, што пачало зьдзяйсьняцца пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, плянавалася раней. Прынцыпова новым крокам было абнародаваньне плянаў пераўтварэньня ў сфэры электронных СМІ. Але гэтыя пляны не былі зьвязаныя наўпрост з выбарамі ў мясцовыя Рады.

Перарэгістрацыя электронных СМІ, зьмены рэжыму вяшчаньня расейскіх тэле- і радыёкампаній мелі прэвэнтыўны характар. У пэрспэктыве — выбары ў Палату Прадстаўнікоў, магчымы рэфэрэндум аб падаўжэньні прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Аляксандра Лукашэнкі. Меліся і істотныя культурныя прычыны, якія перашкаджалі эфэктыўнаму выкарыстаньню дзяржаўных СМІ ў якасьці прылады прапаганды. Фармаваньню гібрыднага рэжыму ў Беларусі ў часе кіраваньня Аляксандра Лукашэнкі папярэднічаў перакрыш магутнай савецкай прапагандысцкай машыны. Беларускі рэжым існуе на яе ідэалягічных руінах і ня ў стане стварыць якой-небудзь выразнай рэакцыйнай ідэалёгіі. (Хаця неўзабаве пасьля выбараў у мясцовыя Рады прэзыдэнт ізноў падкрэсьліваў важную ролю дзяржаўнае ідэалёгіі.) У кіраўнічай эліты проста няма сыстэмы ідэяў, здольнай стаць падмуркам дзяржаўнае ідэалёгіі.

Асноўным заданьнем рэжыму з пары «пераможнага» рэфэрэндуму 1996 году застаецца не мабілізацыя электарату, а нэўтралізацыя незадаволеных, — разьяднаньне, блякада вогнішчаў грамадзкае супольнасьці ў Беларусі. Інфармацыйная палітыка ўладаў выяўляе сваю эфэктыўнасьць ня ў пляне ўкараненьня ў грамадстве нейкай ідэйнай сыстэмы, а ў пляне стрымліваньня працэсаў кансалідацыі, фармаваньня масавага руху супраць цяперашняга рэжыму.

Абмежаваны допуск грамадства да праўдзівай інфармацыі, кантроль над СМІ, выдаленьне непажаданых інфармацыйных плыняў з айчыннай інфармацыйнай прасторы — дастатковыя падставы для адтварэньня тутэйшага рэжыму. Стабільнасьць у Беларусі захоўваецца дзякуючы адчужэньню грамадства ад улады, высокай ступені палітычнай апатыі і разьяднанасьці.

Пры гэтым, як і ў эканоміцы, рэжым імкнуўся паразытаваць на расейскіх інфармацыйных

рэсурсах. Рэйтынг расейскіх СМІ, перадусім тэлебачаньня і радыё, быў вельмі высокі. У выпадку мэтанакіраванай інфармацыйнай палітыкі з боку Крамля яны могуць стаць сур'ёзнай зброяй супраць менскага рэжыму. Таму яго галоўнае заданьне — кантроль над інфармацыйнымі перадачамі, што трансьлююцца з Расеі. Пры гэтым забаўляльнае расейскае тэлевяшчаньне вырашае праблему напаўненьня этэрнага часу беларускіх тэлеканалаў. Такія каналы, як СТБ і АНТ, забясьпечваюць забаўляльны блёк вяшчаньня за кошт расейскіх праграмаў, а інфармацыйна-навінавы блёк прадукуюць самі. Забясьпечваючы масавую беларускую аўдыторыю мыльнымі сэрыяламі і спартовымі трансьляцыямі, расейскае тэлебачаньне дэ-факта мацуе беларускі рэжым, бо тэлебачаньне ў Беларусі выконвае ня толькі агітацыйна-прапагандысцкую, побач з інфармацыйнай, але й забаўляльна-адцягвальную функцыю.

Патрэба абмежаваць уплыў Крамля на Беларусь ставіла Аляксандра Лукашэнку і ягоных паплечнікаў у парадаксальную сытуацыю. Абвяшчаючы яднаньне з Расеяй, яны абмяжоўвалі у краіне расейскую інфармацыйную прысутнасьць. Тым самым Аляксандар Лукашэнка апынуўся ў ролі абароньніка беларускае інфармацыйнае прасторы ад расейскага ўплыву.

# ДЫНАМІКА ГРАМАДЗКАЙ ДУМКІ: ВЕРАСЕНЬ 2001 — ЛЮТЫ 2003 ГГ.

## Стаўленьне беларусаў да ўлады і апазыцыі

Праз год пасьля перамогі Аляксандра Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах у верасьні 2001 году НІСЭПД правёў апытаньне грамадзкае думкі. Паводле апытаньня, ацэнка беларусамі дзяржаўных інстытуцыяў зьніжалася прапарцыйна росту спадзеваў на ўласныя сілы. Вынікі апытаньня (1509 чалавек у веку 18 гадоў і старэйшыя, пры гранічнай памылцы рэпрэзэнтатыўнасьці не вышэйшай за 0,03) сьведчылі далейшае аддаленьне грамадзтва ад дзяржавы. Паволі, але няўхільна зьніжаўся рэйтынг прадстаўнікоў улады, рос недавер да іх насельніцтва. Гл. табліцу 1.

У сярэднім ацэнка дзяржаўных інстытуцыяў рэспандэнтамі хутчэй адпавядае ўзроўню «блага», чымся «здавальняюча». Праўда, прэзыдэнцкі бал можна акругліць да слабой «тройкі». Але парлямэнт і мясцовыя ўлады пры акругленьні балаў, паводле вынікаў апытаньня, пра-

**Табліца 1.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Як бы вы ацанілі па пяцібальнай шкале працу беларускіх уладаў?», %

| Інстытуцыя | Адзнака | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | У сярэднім |
| Прэзідэнт | 17,6 | 20,5 | 30,7 | 21,1 | 8,3 | 2,82 |
| Урад | 18,1 | 27,5 | 37,2 | 13,9 | 2,6 | 2,54 |
| Парламэнт | 20,3 | 28,7 | 35,5 | [illegible] | 2,2 | 2,46 |
| Мясцовыя ўлады | 24,0 | 25,1 | 31,4 | 14,8 | 2,7 | 2,46 |

ведзенага праз год пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, у сярэднім набіралі цьвёрдую «двойку». Бальшыня рэспандэнтаў так ці іначай паставіла беларускім інстытуцыям адзнакі ад «адзінкі» да «тройкі». «Чацьвёрку» самому Аляксандру Лукашэнку паставіў толькі адзін зь пяцёх, «выдатна» не паставілі й дзесяць з сотні.

Недавер да ўладаў разьвіваўся на тле трывожных чаканьняў. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў узмацнялася адчуваньне, што сытуацыя ў краіне разьвіваецца ў непажаданым кірунку. Гэта адлюстроўваюць параўнаньні вынікаў апытаньняў у кастрычніку 2001-га, красавіку і верасьні 2002 году. Гл. табліцу 2.

Адразу пасьля «элегантнай» перамогі Аляксандра Лукашэнкі на выбарах 2001 году элек-

**Табліца 2.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «На Ваш погляд, у цэлым сытуацыя ў нашай краіне разьвіваецца ў правільным кірунку ці ў няправільным?», %

| Варыянт адказу | 10'01 | 04'02 | 09'02 |
|---|---|---|---|
| У правільным кірунку | 38.1 | 21.4 | 21.3 |
| У няправільным кірунку | 36.7 | 55.5 | 49.1 |
| Цяжка адказаць | 25,2 | 23,1 | 29,6 |

тарат адчуў павелічэньне свайго матэрыяльнага дабрабыту. У кастрычніку 2001 году крытыкі беларускага шляху былі амаль роўныя па колькасьці прыхільнікам прэзыдэнта. Але ўжо ўвесну 2002 году настроі пачалі мяняцца. Вынікі апытаньняў НІСЭПД, што праводзіліся з красавіка 2000 да верасьня 2002 году, адлюстроўваюць дынаміку грамадзкае думкі адносна эканамічнай сытуацыі ў Беларусі. Гл. табліцу 3.

Адсотак тых, хто адзначаў пагаршэньне эканамічнай сытуацыі, зьнізіўся ў пэрыяд прэзы-

**Табліца 3.** Зьмены эканамічнай сытуацыі ў Беларусі за апошні год, %*

| Варыянт адказу | 04'00 | 10'00 | 08'01 | 10'01 | 04'02 | 09'02 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пагоршылася | 64.8 | 57.5 | 35.9 | 29,2 | 55.5 | 50,0 |
| Не зьмянілася | 27.9 | 33.8 | 40.7 | 47,4 | 33.2 | 37,8 |
| Палепшылася | 7,0 | 7.5 | 16.9 | 17.8 | 7,7 | 5.9 |

* Радкі «цяжка адказаць» і «няма адказу» выключаныя.

дэнцкіх выбараў 2001 году. У кастрычніку 2001 году найменшая колькасьць рэспандэнтаў, у параўнаньні з вынікамі іншых апытаньняў, адзначыла пагаршэньне эканамічнай сытуацыі, і найбольшая колькасьць выбрала адказ «эканамічная сытуацыя палепшылася».

Увосень, праз год пасьля прэзыдэнцкіх выбараў, ужо палова электарату лічыла, што Беларусь рухаецца не туды. Трэцяй частцы было цяжка ацаніць сытуацыю, і толькі адна пятая частка рэспандэнтаў глядзела ў будучыню з аптымізмам. Адпаведна настроям зьмяняліся і чаканьні. Гл. табліцу 4.

Прыхільнікі прэзыдэнта спадзяваліся на стабільнасьць і спакой. Яны ж, крыху меншай колькасьцю, чакалі, што ўлады забясьпечаць палепшаньне сытуацыі ў эканоміцы, аднак ня зьвязвалі яго з правядзеньнем эканамічных рэформаў. Прыхільнікі прэзыдэнта Лукашэнкі па-ранейшаму спадзяваліся на загадныя мэтады, з дапамогай якіх прэзыдэнт зможа выправіць сытуацыю.

Што да эканамічных рэформаў, збліжэньня з Захадам і нават інтэграцыі з Расеяй, як прыхільнікаў, гэтак і праціўнікаў прэзыдэнта яднала іхная малалікасьць. У верасьні 2002 году ні тыя, ні другія ў бальшыні сваёй не чакалі ад рэжыму ніякага рэальнага збліжэньня ані з

**Табліца 4.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Чаго Вы чакаеце ад цяперашніх беларускіх уладаў?», %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Прыхільнікі А.Лукашэнкі* | Праціўнікі А.Лукашэнкі** |
|---|---|---|---|
| Эканамічных рэформаў | 7,3 | 4,6 | 8,4 |
| Стабільнасьці | 20,0 | 34,7 | 12,1 |
| Палепшаньня эканамічнае сытуацыі | 24,4 | 27,9 | 15,9 |
| Збліжэньня з Захадам | 3,2 | 0,5 | 4,9 |
| Нічога ад уладаў не чакаю, спадзяюся толькі на сябе | 30,7 | 15,1 | 43,0 |

* Перакананыя прыхільнікі — гэта тыя, хто гатовы галасаваць за А. Лукашэнку на выбарах прэзыдэнта Беларусі, а таксама Зьвязу Беларусі і Расеі, хто давярае яму і лічыць ідэалам палітыка.

** Перакананыя праціўнікі — тыя, хто не давярае прэзыдэнту і ўва ўсіх іншых пытаньнях выбірае іншага палітыка.

усходнім суседам, ані з Захадам.

Адчужэньне грамадзтва ад улады адбівалася на ягоным стаўленьні да ўлады. Падчас сьнежаньскага (2002) апытаньня грамадзкае думкі, праведзенага НІСЭПД мэтадам «face to face» (1478 рэспандэнтаў пры памылцы рэпрэзэнтатыўнасьці, не вышэйшай за 0,03), выявілася, што бальшыня беларусаў не давярае ніводнай зь дзяржаўных інстытуцыяў, ні прафэсійным зьвязам, ні палітычным партыям, незалежна ад таго, ці яны прапрэзыдэнцкія, ці апазыцыйныя. Гл. табліцу 5.

Канкрэтныя дзяржаўныя і грамадзкія дзеячы таксама выклікалі ў рэспандэнтаў недавер. Прычым як афіцыйныя прадстаўнікі ўлады, так і найбольш вядомыя прадстаўнікі апазыцыі загадзя прайграюць прэзыдэнту Лукашэнку ў ступені вядомасьці сярод выбарцаў. Праблема апазыцыйных дзеячоў нават ня столькі ў недаверы з боку грамадзтва, колькі ў іх невядомасьці. Гл. табліцу 6.

Згодна з вынікамі апытаньня грамадзкае думкі, што праводзілася НІСЭПД у 2001—2002 гадох, напярэдадні выбараў у мясцовыя Рады беларусы збольшага ня верылі нікому, хто мог бы змагацца за ўладу.

## Дынаміка грамадзкае думкі што да Захаду і Расеі

Грамадзкая думка што да Расеі і Захаду ў пэрыяд паміж выбарамі прэзыдэнта і выбарамі ў мясцовыя Рады разьвівалася пад уплывам палепшаньня расейска-амэрыканскіх і расейска-эўрапейскіх стасункаў. Разам з тым, унутраная сытуацыя таксама істотна вызначала погляды на міжнароднае становішча. Беларусь яшчэ не ўспрымалася значнай часткай грамадзтва як самадастатковая, сувэрэнная і паўнавартасная дзяржава. Млявая, бясконцая палітычная інтэграцыя з Расеяй, падпісаньне дамоваў і прапаганда аб’яднаньня з абодвух бакоў ператварыліся ў звыклы фон беларускай палітыкі. Інтэграцыйная рыторыка да лета 2002 году была абавязковым элемэнтам афіцыйнае прапаганды.

Паводле вынікаў верасьнёўскага апытаньня 2002 году, інтэграцыю з Расеяй ўхвалялі й прыхільнікі, і праціўнікі беларускага прэзыдэнта. Разыходжаньне было адзначанае адно ў

**Табліца 5.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці давяраеце Вы наступным дзяржаўным і грамадзкім інстытуцыям?»*, %

| Інстытуцыя | Давяраю | Не давяраю |
|---|---|---|
| Праваслаўная царква | 65,7 | 22,4 |
| Незалежныя даследчыя цэнтры | 43,9 | 26,4 |
| Армія | 49,8 | 37,2 |
| Дзяржаўныя даследчыя цэнтры | 38,6 | 35,5 |
| Дзяржаўныя СМІ | 40,4 | 44,7 |
| Недзяржаўныя СМІ | 37,1 | 42,4 |
| Аб'яднаньні прадпрымальнікаў | 31,3 | 38,5 |
| Канстытуцыйны Суд | 36,4 | 43,9 |
| Прэзыдэнт | 38,2 | 48,3 |
| Каталіцкая царква | 32,9 | 43,2 |
| Свабодныя і незалежныя прафесійныя саюзы | 29,4 | 42,1 |
| Прафесійныя саюзы, што ўваходзяць у ФПБ | 27,8 | 45,4 |
| Урад | 29,5 | 53,6 |
| КДБ | 26,7 | 51,7 |
| Суды | 28,7 | 54,9 |
| Цэнтральная выбарчая камісія | 26,6 | 53,7 |
| Нацыянальны Сход | 23,1 | 50,7 |
| Палітычныя партыі, якія падтрымліваюць цяперашнюю ўладу | 21,7 | 55,1 |
| Мясцовыя выканаўчыя камітэты | 23,2 | 58,7 |
| Апазыцыйныя палітычныя партыі | 18,4 | 55,0 |
| Мясцовыя Рады дэпутатаў | 22,5 | 59,8 |
| Міліцыя | 24,6 | 67,4 |
| Пратэстанцкая царква | 13,4 | 58,4 |

* Радкі «цяжка адказаць» і «няма адказу» выключаныя.

сцэнарах, паводле якіх мусіла адбыцца інтэграцыя — па мадэлі Эўрапейскага Зьвязу або аншлюсу. Гл. табліцу 7.

Дакладнейшы абраз стаўленьня беларусаў да інтэграцыі выявіўся б пры наяўнасьці ў прапанаваных адказах НІСЭПД варыянту поўнай адмовы ад інтэграцыі. Таму ацэньваць вынікі гэтага апытаньня трэба з пэўнай асьцярожнасьцю, хаця наяўнасьць варыянту «цяжка адказаць» усё-ткі дазваляе інтэрпрэтаваць гэтыя дадзеныя.

Мяркуючы, што выбар нейкай мадэлі інтэграцыі фатальна непазьбежны, рэспандэнты давалі адпаведныя адказы. У выніку перакананыя прыхільнікі інтэграцыі на прынцыпах Эўрапейскага Зьвязу колькасьцю перасягнулі й прапрэзыдэнцкіх прыхільнікаў Эўразьвязу, і прыхільнікаў паглынаньня Беларусі Расеяй. Больш за траціну прэзыдэнцкага электарату ўстрымаліся ад адказу. Затое сярод незадаволеных Лукашэнкам тых, хто ня вызначыўся, было ўдвая менш.

Прыхільнікі беларускага прэзыдэнта, якія выступаюць як за паглынаньне Беларусі Расеяй, гэтак і за добрасуседзкія стасункі з Расеяй у рамках Эўрапейскага Зьвязу, выказаліся

**Табліца 6.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці давяраеце Вы наступным беларускім дзяржаўным і грамадзкім дзеячам?», %

| Дзеяч | Давяраю | Не давяраю | Не ведаю такога |
|---|---|---|---|
| Аляксандар Лукашэнка | 37.0 | 45.5 | 2,9 |
| Міхаіл Мясьніковіч | 16.8 | 25.1 | 44.9 |
| Генадзь Навіцкі | 21.2 | 35.0 | 26.4 |
| Лідзія Ярмошына | 18,7 | 35,5 | 27,5 |
| Леанід Козік | 13,9 | 28,8 | 42,6 |
| Рыгор Васілевіч | 10.2 | 20.7 | 58.9 |
| Урал Латыпаў | 13.3 | 30.3 | 43.6 |
| Пятро Пракаповіч | 11.2 | 28.0 | 47.9 |
| Валянцін Сукала | 8,9 | 23.1 | 56.2 |
| Анатоль Лябедзька | 11,5 | 31,1 | 40,6 |
| Аляксандар Вайтовіч | 7.7 | 23,4 | 55.4 |
| Мікалай Статкевіч | [illegible] | 29.3 | 45.6 |
| Валеры Фралоў | 5.7 | 20.1 | 62.3 |
| Віктар Шэйман | 10.4 | 32.0 | 44.8 |
| Вадзім Папоў | 7,0 | 25,1 | 55,1 |
| Станіслаў Шушкевіч | 15,5 | 51,2 | 15,1 |
| Сяргей Гайдукевіч | 13,4 | 48.3 | 19.9 |
| Вінцук Вячорка | 9.6 | 35.2 | 41.9 |
| Сяргей Калякін | 9,4 | 40.8 | 35.3 |
| Зянон Пазьняк | 9,3 | 58.9 | 17.2 |

**Табліца 7.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Нядаўна Ўладзімер Пуцін жорстка скрытыкаваў падыходы беларускага кіраўніцтва да інтэграцыі Беларусі й Расеі, а на апошняй сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам у Крамлі прапанаваў выбраць адно з двух: або аб’ядноўвацца паводле прынцыпаў Эўрапейскага Зьвязу (кожная дзяржава застаецца незалежнай, але разьлічвае на свае сілы), або Беларусь мусіць увайсьці ў склад Расейскай Фэдэрацыі (і атрымліваць падтрымку на роўных правах зь іншымі рэгіёнамі). Які з гэтых варыянтаў вы падтрымоўваеце?», %

| Варыянт адказу | У цэлым па выбарцы | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Інтэграцыю паводле прынцыпаў Эўрапейскага Зьвязу | 48,5 | 28,6 | 64.5 |
| Інтэграцыю шляхам уваходжаньня Беларусі ў склад Расеі | 21,9 | 28,6 | 17.7 |
| Цяжка адказаць | 29,6 | 41,8 | 17.8 |

аднолькава. «За» — адзін з трох.

У выпадку рэфэрэндуму наконт расейска-беларускага аб’яднаньня і ягоных прынцыпаў можна было чакаць, што дзьве траціны праціўнікаў Аляксандра Лукашэнкі прагаласуюць за мадэль Эўрапейскага Зьвязу. Да іх далучыцца яшчэ траціна прыхільнікаў А. Лукашэнкі.

**Табліца 8.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі б заўтра адбыўся рэфэрэндум наконт уваходу Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз, як бы вы прагаласавалі?», %

| Варыянты адказу | У цэлым па выбарцы | Праціўнікі А.Лукашэнкі | Прыхільнікі А.Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| За | 53,4 | 28,0 | 69,6 |
| Супраць | 8,1 | 21,5 | 3,9 |
| Ня стаў бы галасаваць | 13,0 | 17,2 | 8,9 |
| Цяжка адказаць | 25,5 | 33,2 | 17,6 |

Хаця кожны чацьвёрты ў верасьні 2002 году ня вызначыўся з адказам, у цэлым на аднаго праціўніка ўваходжаньня ў Эўропу прыпадала як мінімум пяць патэнцыйных прыхільнікаў Эўрапейскага Зьвязу. Гл. табліцу 8.

Такім чынам, кожны другі выказаў гатовасьць, не пакідаючы роднай старонкі, апынуцца ў Эўропе. Пры гэтым матывы для такога адказу маглі быць найразьнейшыя — ад жаданьня дасягнуць эканамічнага дабрабыту, «як у Эўропе», і да імкненьня да свабоды і праўнай абароненасьці, забесьпячэньня гарантыяў захаваньня правоў чалавека.

Пасьля краху нязьдзейсьненых надзеяў на вяртаньне ў СССР тупіковы характар беларускага шляху адчувалі нават старыя савецкія беларусы. Эўрапейскі ўзровень жыцьця — галоўны іхны матыў прагаласаваць за Эўрапейскі Зьвяз. Паступова выкаранялася нэгатыўнае стаўленьне нават да блёку NATO, чый вобраз агрэсара эфэктыўна насаджаўся яшчэ савецкай прапагандысцкай машынай. Літаральна за 5 месяцаў, з красавіка па жнівень 2002 году, яшчэ да Лукашэнкавай спробы прарвацца на праскі саміт NATO ў лістападзе, адбыўся пералом. У красавіку 2002 году бальшыня рэспандэнтаў НІСЭПД бачыла пагрозу ў пашырэньні NATO. У верасьні тых, хто бачыў у пашырэньні NATO небясьпеку для Беларусі, было на 10% менш, чымся тых, хто ня бачыў пагрозы ў пашырэньні альянсу. Гл. табліцу 9.

У значнай ступені на рост даверу да NATO паўплывала палепшаньне стасункаў Расеі і Захаду, што адбілася на характары прапаганды расейскіх электронных СМІ.

**Табліца 9.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці ёсьць пашырэньне NATO пагрозай для Беларусі?», %

| Варыянт адказу | 06'99 | 11'99 | 04'01 | 09'02 |
|---|---|---|---|---|
| Не | 17,6 | 20,2 | 23,5 | 41,2 |
| Так | 47,7 | 43,7 | 36,8 | 31,3 |

Быў і яшчэ адзін чыньнік папулярнасьці Расеі і Эўропы ў Беларусі. Гэта, апрача арыентацыяў Расеі на Эўропу, фактар пэрсаніфікацыі ўлады — імідж расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна. Расейскі прэзыдэнт быў больш сымпатычны беларусам, чым уласны. Такі адказ яшчэ ў красавіку 2002 году дала бальшыня апытаных НІСЭПД. На тле зьніжэньня рэйтынгу Аляксандра Лукашэнкі рэйтынг Уладзімера Пуціна, прэзыдэнта суседняй краіны, рос. Гл. табліцу 10.

Беларуская ўлада эксплёатавала непаўнавартасную нацыянальную самасьвядомасьць беларусаў, імкнучыся падтрымліваць яе ў такім стане. І цяпер трапіла ў пастку ёй жа самой выгадаванага палітычнага інфантылізму. У ніводнай зь дзяржаваў СНД грамадзтва не ўскладала столькі спадзеваў на Расею ў якасьці крыніцы пераменаў унутры ўласнае краіны, як у Беларусі!

**Табліца 10.** «Хто з сучасных палітыкаў найвышэйшага рангу ў найбольшай ступені Вам сымпатычны, адпавядае Вашаму ідэалу палітыка?», % (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянты адказу | 11'99 | 04'00 | 10'01 | 04'02 |
|---|---|---|---|---|
| У. Пуцін | -* | 55,5 | 65,2 | 68,1 |
| А. Лукашэнка | 44,9 | 27,0 | 36,8 | 26,0 |
| Г. Шродэр | 16,0 | 10,2 | 12,6 | 14,3 |
| Э. Блэр | 6,7 | 5,1 | 8,0 | 10,2 |
| Ж. Шырак | -* | 11,4 | 8,6 | 9,3 |
| Дж. Буш (малодшы) | -* | -* | 7,7 | 8,5 |
| Ф. Кастра | 14,7 | 7,7 | 9,1 | 7,9 |
| А. Квасьнеўскі | 7,9 | 5,9 | 4,6 | 7,4 |
| В. Гавэл | 8,0 | 5,7 | 4,3 | 5,3 |
| В. Адамкус | 7,2 | 2,6 | 2,5 | 4,6 |
| В. [illegible] | -* | -* | 3,1 | 2,0 |
| С. Хусэйн | 6,0 | 3,4 | 3,2 | 1,5 |
| Л. Кучма | 2,6 | 2,5 | 2,4 | 1,5 |
| Б. Клінтан | 29,6 | 24,3 | -* | -* |
| С. Мілошавіч | 2,8 | 2,0 | -* | -* |
| Б. Ельцын | 2,7 | -* | -* | -* |
| Іншыя | 7,1 | 1,7 | 8,2 | 7,6 |

* У той час прозьвішчы гэтых палітыкаў не называліся.

**Табліца 11.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Расейскі прэзыдэнт прапанаваў таксама ўвесну 2003 году правесьці рэфэрэндум па пытаньні: «Ці згодныя Вы, што Расея і Беларусь аб'яднаюцца ў адзіную дзяржаву на падставе наступных прынцыпаў: а) забесьпячэньне роўнасьці правоў і свабодаў грамадзянаў аб'яднанае дзяржавы; б) роўнасьць рэгіёнаў Расейскай Фэдэрацыі і Беларусі як суб'ектаў адзінае дзяржавы; в) стварэньне адзіных органаў улады ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй Расейскай Фэдэрацыі?»
Калі такі рэфэрэндум адбудзецца, як Вы будзеце галасаваць?», %

| Варыянт адказу | У цэлым па выбарцы | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Адкажу, што згодны | 32,3 | 41,7 | 27,0 |
| Адкажу, што нязгодны | 26,3 | 22,4 | 37,2 |
| Пакуль яшчэ не ведаю, пагляджу па абставінах | 31,7 | 29,5 | 28,5 |
| Не буду ўдзельнічаць у такім рэферэндуме | 8,0 | 6,4 | 7,2 |

Паводле вынікаў верасьнёўскага апытаньня НІСЭПД, у 2002 годзе магчымасьць страты дзяржаўнага сувэрэнітэту ня надта трывожыла беларусаў: ён быў ім не настолькі дарагі, каб змагацца за яго з зброяй у руках ці выказваць сваю незадаволенасьць мірнымі сродкамі. Гл. табліцы 11, 12. Ужо за год пасьля выбараў прэзыдэнта бальшыня беларусаў была гатовая ўдзельнічаць у выбарах у парлямэнт аб'яднанае дзяржавы, якія, згодна з прапановай прэзыдэнта Пуціна, меліся адбыцца ўвосень 2003 году. Гл. табліцу 13.

**Табліца 12.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі паводле вынікаў рэфэрэндуму Беларусь усё-ткі ўвойдзе ў склад Расейскай Фэдэрацыі, як Вы, хутчэй за ўсё, будзеце сябе паводзіць?» (адказваюць толькі тыя, хто на папярэдняе пытаньне адказаў «ня згодны» або «ня буду ўдзельнічаць»), %

| Варыянт адказу | У цэлым па выбарцы | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Пагаджуся з тым, таму што вынікаў рэфэрэндуму ўжо не зьменіш | 29,5 | 25,4 | 33,3 |
| Прыму ўдзел у масавых акцыях пратэсту (мітынгах, дэманстрацыях, страйках), каб паспрабаваць зьмяніць гэтыя вынікі | 7,9 | [illegible] | 13,8 |
| Зьеду ў іншую краіну на сталае жыхарства | 2,4 | 0 | 4,9 |
| Буду гатовы адстойваць незалежнасьць Беларусі са зброяй у руках | 2,1 | 0,1 | 2,9 |
| Цяжка адказаць | 11,2 | 12,9 | 10,2 |

Прычыны гатовасьці аб'яднацца з Расеяй былі ў значнай ступені тыя ж, што і ў жаданьні далучыцца да Эўрапейскага Зьвязу. У меру інтэграцыі Расеі ў сусьветную супольнасьць, у меру эканамічных пераўтварэньняў, ацэнка беларусамі расейскага ўзроўню жыцьця станавілася больш высокай у параўнаньні з ацэнкай стану рэчаў на радзіме. Апрача гэтага, як паказалі вынікі апытаньня НІСЭПД у сьнежні 2002 году, пераважная бальшыня дарослага насельніцтва Беларусі меркавала, што Расея дамаглася значна большых посьпехаў у дэмакратызацыі грамадзтва. Гл. дыяграму 1, табліцу 13.

**Табліца 13.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі будуць праводзіцца выбары ў парлямэнт Зьвязу Беларусі і Расеі, ці будзеце Вы браць у іх удзел?», %

| Варыянт адказу | У цэлым па выбарцы | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Так | 60,9 | 68,0 | 58,3 |
| Не | 17,3 | 7,5 | 24,4 |
| Цяжка адказаць | 21,8 | 24,5 | 17,3 |

У сьнежні 2002 году чацьвёра зь дзесяцёх беларусаў (44%) лічылі, што насельніцтва Расеі ў цэлым жыве лепш, чым у Беларусі; крыху больш за траціну (35,1%) лічылі, што горш.

Стаўленьне беларусаў да інтэграцыі з Расеяй шмат у чым вызначалася ня толькі шматгадовай прапагандай расейска-беларускага аб'яднаньня, якая абапіралася на ідэалягічную спадчыну савецкага часу, але і ў значнай ступені ўсё тым жа адчужэньнем грамадзтва ад уласных палітычных элітаў. Людзі прымалі інтэграцыю з Расеяй, як і ўваходжаньне ў Эўрапейскі Зьвяз, бо расцэньвалі гэта як спосаб разьвязаць унутраныя праблемы, — паколькі ані ўлада, ані апазыцыя іх не разьвяжа.

Тое, што за аб'яднаньне ці то з Расеяй, ці то з Эўразьвязам — аж да страты дзяржаўнасьці — дзеля разьвязаньня надзённых побытавых праблемаў выказвалася значная доля беларускага грамадзтва, тлумачылася ня толькі нястачай нацыянальнай сьвядомасьці ў беларусаў. Арыентацыі шараговых грамадзянаў Беларусі на інтэграцыю зь іншымі дзяржавамі, зафіксаваныя

**Табліца 14.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Дзе больш яшчэ нявырашаных праблемаў, у Беларусі ці ў Расеі?», %

| Варыянт адказу | Беларусь | Расеі |
|---|---|---|
| З свабодай сродкаў масавай інфармацыі | 71.0 | 20.6 |
| З свабоднымі і справядлівымі выбарамі | 66.3 | 25.3 |
| З захаваньнем правоў чалавека | 65.7 | 26.2 |
| З незалежнасьцю судовае ўлады | 63,6 | 28,2 |
| З падзелам паўнамоцтваў паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі | 61.6 | 29.3 |
| З дыскрымінацыяй грамадзянаў паводле палітычных, рэлігійных і інш. падставаў | 51.5 | 36.9 |

**Дыяграма 1.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Пасьля распаду СССР лідэры бальшыні былых савецкіх рэспублікаў абавязаліся будаваць дэмакратычныя дзяржавы і грамадзянскія супольнасьці. На Вашую думку, Беларусь ці Расея дасягнулі большага прагрэсу ў гэтым кірунку?», %




апытаньнямі НІСЭПД, — гэта своеасаблівы вотум недаверу беларускім элітам, якія існавалі ў сабе і дзеля сябе, раўналежна бальшыні грамадзтва.

Безгалосая бальшыня ня верыла элітам, не атрымлівала ад іх зразумелай мадэлі паводзінаў, якая б эфэктыўна арыентавала шараговых грамадзянаў у палітычнай сытуацыі. Грамадзтва аддадзенае самому сабе. Назіралася фактычная адсутнасьць палітычнага прадстаўніцтва грамадзтва пры фармальна існуючай дэмакратыі. Маўклівая беларуская бальшыня ў такой сытуацыі ўспрымала выбары як апошнюю магчымасьць заявіць пра сябе і сваё меркаваньне, не ўступаючы ў канфлікт з уладамі.

## Стаўленьне беларусаў да выбараў у мясцовыя Рады

У сьнежні 2002 году, паводле дадзеных дасьледаваньня НІСЭПД (1478 чалавек было апытана мэтадам «face to face», памылка выбаркі — ня большая за 0,03), яўная бальшыня рэспандэнтаў выказала гатовасьць браць удзел у абраньні мясцовых органаў улады. Гл. табліцу 15.

**Табліца 15.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне «Ці зьбіраецеся Вы браць удзел у выбарах у мясцовыя Рады?», %

| Варыянт адказу | 03'99 | 09'02 | 12'02 |
|---|---|---|---|
| Так | 45.0 | 60.3 | 63.6 |
| Не | 20.0 | 20.3 | 16.6 |
| Яшчэ ня ведаю | 34,0 | -* | -* |
| Цяжка адказаць | 1,0 | 19,4 | 19,8 |

* У гэтым апытаньні няма такога варыянту адказу.

Колькасьць прыхільнікаў неляяльных уладам кандыдатаў, паводле апытаньня, аказалася прыблізна аднолькавай. Пры гэтым, калі ў красавіку 2002 году палова рэспандэнтаў меркавала, што на мясцовых выбарах сымпатыі насельніцтва будуць на баку лукашэнкаўскіх стаўленікаў, то за сем месяцаў, у сьнежні, у іх перамогу на месцах верыла крыху больш за траціну рэспандэнтаў. Колькасьць упэўненага антыпрэзыдэнцкага электарату вырасла ўжо да чвэрці ад колькасьці апытаных. Гл. табліцу 16.

**Табліца 16.** Дынаміка разьмеркаваньня адказаў на пытаньне пра характар будучага галасаваньня, %

| Варыянт адказу | За якога кандыдата Вы б прагаласавалі? | | | За каго, на Вашую думку, прагаласуе большасьць? | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 04'02 | 09'02 | 12'02 | 04'02 | 09'02 | 12'02 |
| За кандыдата — прыхільніка А. Лукашэнкі | 29,2 | 27,9 | 31,1 | 19,5 | 35.0 | 36.5 |
| За кандыдата — праціўніка А. Лукашэнкі | 28,3 | 30,8 | 31,2 | 16,5 | 25.3 | 24.7 |
| За іншага кандыдата | 15,2 | 16,5 | 12,4 | 6,6 | 7,4 | 8,0 |
| Цяжка адказаць | 27,3 | 24,8 | 25,3 | 27,4 | 32,3 | 30,8 |

Такім чынам, на думку кожнага чацьвёртага рэспандэнта, гатовасьць электарату аддаць галасы лукашэнкаўцам істотна зьнізілася. Акурат уяўленьні пра тое, каму аддасьць перавагу бальшыня, часта вызначаюць, каму аддадуць перавагу тыя, хто яшчэ ня вызначыўся. У пэрспэктыве імкненьне быць падобным да бальшыні можа стаць прычынай для галасаваньня супраць прэзыдэнта й ягоных паплечнікаў.

Папулярнасьць палітычных партыяў у Беларусі была вельмі нізкая. Больш чым праз год пасьля прэзыдэнцкіх выбараў (дадзеныя апытаньня НІСЭПД у сьнежні 2002 году) бальшыня рэспандэнтаў не сымпатызавала канкрэтнай палітычнай партыі. Гл. табліцу 17.

У сьнежні 2002 году толькі 5% ад агульнай колькасьці ўдзельнікаў апытаньня заявілі пра свае партыйныя прыхільнасьці. Таму галоўным пытаньнем, якое вызначала стаўленьне да кандыдата, апрача яго перадвыбарнай праграмы, заставалася ягонае стаўленьне да прэзыдэнта Лукашэнкі і ягонае палітыкі. У гэтай сытуацыі вельмі нізкая інфармаванасьць насельніцтва пра палітычныя партыі Беларусі не была істотнай перашкодай для перамогі кандыдатаў ад апазыцыйных партыяў на мясцовых выбарах. Паводле дадзеных апытаньня ў сьнежні 2002 году, у кандыдатаў — праціўнікаў беларускага прэзыдэнта і ў прыхільнікаў шанцы атрымаць бальшыню галасоў на мясцовых выбарах былі супастаўляльныя. Гэтага нельга сказаць пра роўнасьць шанцаў на перамогу, паколькі лукашэнкаўцы валодалі адміністра-

**Табліца 17.** Дынаміка адказаў на пытаньне пра падтрымку партыйных кандыдатаў на выбарах у мясцовыя Рады, %

| Варыянт адказу | 04'02 | 09'02 | 12'02 |
|---|---|---|---|
| Жаночая партыя "Надзея" (В.Палевікова)* | 4,5 | 6,9 | 5,8 |
| Ліберальна-дэмакратычная партыя (С.Гайдукевіч) | 5,5 | 7,6 | 5,8 |
| Партыя камуністаў Беларуская (С.Калякін) | 2,7 | 3,3 | 4,8 |
| Аб'яднаная грамадзянская партыя (А.Лябедзька) | 3,8 | 3,6 | 3,9 |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада (С.Шушкевіч) | 3,8 | 2,9 | 3,5 |
| Беларускі народны фронт "Адраджэньне" (В.Вячорка) | 2,0 | 3,1 | 2,5 |
| Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ (З.Пазьняк) | 1,9 | 2,9 | 2,2 |
| Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя "Народная Грамада" (М.Статкевіч) | 2,6 | 2,7 | 2,1 |
| Камуністычная партыя Беларусі (В.Захарчанка) | 1,2 | -** | -** |
| Партыя працы (А.Бухвостаў) | 1,4 | 1,6 | 1,9 |
| Іншыя | 6,2 | 2,9 | 4,6 |
| Цяжка адказаць | 64,1 | 62,3 | 62,9 |

* Апытаньне праводзілася да абраньня новага кіраўніцтва партыі.

** У гэтых апытаньнях такі варыянт адказу не прадугледжваўся.

**Табліца 18.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Многія нашыя суграмадзяне не давяраюць вынікам выбараў, таму што ў складзе выбарчых камісіяў няма прадстаўнікоў апазыцыі. Што Вы думаеце на гэты конт?»

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| Давер да вынікаў выбараў быў бы вышэйшы, калі б у склад выбарчых камісіяў уваходзілі прадстаўнікі ўсіх палітычных сілаў | 70,4 |
| У склад камісіяў павінны ўваходзіць толькі тыя асобы, якія адстойваюць інтарэсы цяперашняй улады | 9,3 |
| Цяжка адказаць | 20,3 |

**Табліца 19.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Ці будуць, на Ваш погляд, афіцыйныя вынікі выбараў дэпутатаў мясцовых Радаў адпавядаць вынікам галасаваньня?», %

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Так | 40,1 | 63,7 | 23,7 |
| Не | 33,6 | 4,4 | 70,6 |
| Цяжка адказаць | 26,3 | 26,0 | 36,6 |

цыйным рэсурсам. Гэта значыць, што ў пэрспэктыве пры ўмове свабодных і празрыстых выбараў у мясцовыя Рады можа прайсьці дастаткова высокі адсотак прадстаўнікоў дэмакратычнай апазыцыі. Гл. табліцу 18.

Усьведамленьне фактычнае няроўнасьці варункаў для кандыдатаў-прыхільнікаў і праціўнікаў прэзыдэнта на мясцовых выбарах вызначыла стаўленьне рэспандэнтаў да афіцыйных вынікаў будучага галасаваньня. Гл. табліцу 19.

Толькі чацьвёра зь дзесяцёх апытаных верылі, што выбарцаў паінфармуюць пра рэальныя

вынікі галасаваньня, трэцяя частка — ня верыла, чвэрць рэспандэнтаў — сумнявалася, не была пэўная. І пры гэтым шасьцёра зь дзесяцёх выказалі жаданьне ўдзельнічаць у галасаваньні. Сямёра зь дзесяцёх выбарцаў, незадаволеных беларускім прэзыдэнтам і ягонай палітыкай, загадзя выказалі недавер вынікам выбараў у мясцовыя Рады. У верасьні 2002 году рэспандэнты НІСЭПД, што ня маніліся галасаваць на выбарах у мясцовыя Рады (прыблізна пятая частка апытаных, 20,3%), матывавалі сваю адмову гэтак: гл. табліцу 20.

**Табліца 20.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі Вы ня маеце намеру галасаваць, дык чаму?», %* (магчымы больш за адзін адказ)

| Варыянт адказу | Усе апытаныя | Прыхільнікі А. Лукашэнкі | Праціўнікі А. Лукашэнкі |
|---|---|---|---|
| Як не галасуй, дэпутатамі ўсё адно стануць тыя, каго падтрымліваюць улады | 12.2 | 4.3 | 16.2 |
| Няма годнага кандыдата, за якога можна прагаласаваць | 8,1 | 2,3 | 11,5 |
| Не веру, што выбары будуць свабоднымі і справядлівымі | 8,6 | 3,6 | 12.2 |
| Галасаваць бессэнсоўна, паколькі ў мясцовых Радаў няма ніякіх паўнамоцтваў | 9,8 | 4,[illegible] | 13,7 |
| Мяне гэта абсалютна не цікавіць | 7,0 | 4,3 | 7,8 |
| Няхай галасуюць тыя, хто разьбіраецца ў сытуацыі | 5,1 | 7,7 | 2,0 |
| Іншае | 1,8 | 2,4 | 1,2 |

* Табліца чытаецца па вэртыкалі.

Такім чынам, яшчэ ў верасьні 2002 году бальшыня тых, хто адмовіўся ад удзелу ў выбарах, назвала ў якасьці прычыны адмовы незалежнасьць улады ад выбарцаў. На другім месцы сярод прычынаў адмовы — фактычная адсутнасьць у мясцовых Радаў хоць якой рэальнай улады, то бок іх дэкаратыўная функцыя ў сыстэме рэальнага разьмеркаваньня палітычных паўнамоцтваў.

У сьнежні 2002 году дзьве траціны апытаных выявілі гатовасьць узяць удзел у галасаваньні. Але частка зь іх загадзя ня верыла ў сумленнасьць выбарчых камісіяў. Гатовасьць і жаданьне ўдзельнічаць у галасаваньні спалучаліся з упэўненасьцю ў несумленным падліку галасоў.

Такое стаўленьне да выбараў у мясцовыя Рады 2003 году цяжка растлумачыць рацыянальнымі чыньнікамі. Жаданьне браць удзел у выбарах і пэўнасьць, што ўсё адно падмануць, тлумачацца асаблівым стаўленьнем беларусаў да выбараў. З аднаго боку, для постсавецкай Беларусі любыя выбары прадстаўнікоў улады, сам факт, хай сабе сымбалічнага, уплыву на фармаваньне сыстэмы ўлады ўсё яшчэ застаюцца чымсьці накшталт сакральнага дзеяньня, рытуалу. Яго стараюцца выконваць, аднак саму сыстэму ўладных стасункаў дакладна не ўяўляюць. Палітычная культура беларусаў, якая б адпавядала стандартам дэмакратычнага грамадзтва, яшчэ ў стадыі фармаваньня. Зь іншага боку, выбары ў мясцовыя Рады давалі магчымасьць легальна і ананімна выказаць сваё стаўленьне да ўлады. Народ, які пакінуў вулічныя акцыі апазыцыі, прыйшоў да выбарчых скрыняў. Праблема ў тым, што рэальныя вынікі свайго волевыяўленьня грамадзтва не магло самастойна пракантраляваць.

## Высновы

Выбары ў мясцовыя Рады 2003 году адбываліся ў сытуацыі, калі бальшыня грамадзтва фактычна была адчужаная ад удзелу ў палітыцы. Адміністрацыйныя рэсурсы былі чыньнікам, які вызначаў вынікі выбараў, — не рэальныя лічбы, што адлюстроўваюць вынікі галасаваньня на выбарчых участках, а афіцыйныя вынікі.

Само сабою выяўленьне волі грамадзтва для кіраўнічай эліты Беларусі мала цікавае. Але ёй быў патрэбны адно факт правядзеньня выбараў у мясцовыя Рады дзеля абгрунтаваньня свайго паноўнага становішча. Пры наяўных адміністрацыйных і інфармацыйных рэсурсах уладам ставала яўкі некаторай часткі выбарцаў на ўчасткі й іх удзелу ў галасаваньні. Агітацыйная кампанія ў СМІ праходзіла досыць спакойна, нават ціха, у параўнаньні з кампаніяй 2001 году. Грамадзтва мела ведаць, што выбары адбудуцца і што галасаваць лепш датэрмінова. І афіцыйныя мэдыі яму пра гэта паведамлялі. Пры канцэнтрацыі адміністрацыйных рэсурсаў для ўладаў ужо ня мела значэньня, колькі адсоткаў выбарцаў прагаласуе сапраўды. Патрабавалася перадусім яўка некаторай колькасьці выбарцаў як сьведчаньне ўдзелу грамадзян у мясцовых выбарах.

Апазыцыя была значна больш зацікаўленая ў максымальнай яўцы выбарцаў на ўчасткі і найдакладнейшым падліку народнага волевыяўленьня. Але ў яе не было дастаткова рэсурсаў для таго, каб забясьпечыць празрыстасьць выбараў і дамагчыся роўных умоваў для кандыдатаў ад апазыцыі і ад улады. Праўда, пры ўзгодненых дзеяньнях і арганізацыі байкоту яна гэтаксама была б зацікаўленая ў максымальнай нняяўцы выбарцаў на ўчасткі.

І нарэшце само беларускае грамадзтва, якое брала ўдзел у выбарах, фармальна рэалізоўвала свае выбарчыя правы. Аднак фактычна выціснутае з палітычнае прасторы, падзеленае на ўзроўні сваіх палітычных прэфэрэнцыяў паміж уладай і апазыцыяй, яно ня мела рэальных інструмэнтаў кантролю за правядзеньнем выбараў і дзейсных сродкаў узьдзеяньня на парушальнікаў выбарчага заканадаўства.

Улада бачыла ў выбарах сродак яе легітымацыі пры гарантаваных афіцыйных выніках. Апазыцыя ўдзельнічала ў выбарах, паколькі, так і не выпрацаваўшы супольнае стратэгіі, не магла іх эфэктыўна байкатаваць і вымушаная была браць у іх удзел, спадзеючыся атрымаць нейкую колькасьць перамогаў на месцах. Грамадзтва, пазбаўленае эфэктыўнага палітычнага прадстаўніцтва і пакіненае самому сабе, ішло на выбары, каб выказаць сваё стаўленьне да ўлады, спадзеючыся на палепшаньне сытуацыі. Выбары застаюцца апошняй дэмакратычнай працэдурай, дзякуючы якой беларускае грамадзтва можа выказваць сваё стаўленьне да ўлады, знаходзячыся ў рамках дазволенай уладамі ж палітычнай актыўнасьці.

Выбары ў мясцовыя Рады 2003 году адбываліся пры высокім недаверы выбарцаў як да ўлады, так і да апазыцыі. Незадаволенасьць станам рэчаў у краіне нарастала пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, але ані ўлада, ані апазыцыя не ўспрымаліся значнай часткай беларусаў як сілы, здольныя рэальна зьмяніць сытуацыю да лепшага. У гэтым сьвятле гатовасьць рэспандэнтаў сацыялягічных апытаньняў падтрымаць інтэграцыю з Расеяй ці Эўропай, часта незалежна ад стаўленьня да асобы беларускага прэзыдэнта, выглядала як імкненьне разьвязаць унутраныя праблемы Беларусі праз замежную дапамогу, без спадзеву на ўласныя сілы.

Як апазыцыйныя партыі існуюць, ня маючы апоры ў грамадзтве, гэтак і бюракратычная

вэртыкаль улады функцыянуе перадусім дзеля свайго адтварэньня. Аднак і кіраўнічая эліта, і апазыцыя былі зацікаўленыя ў правядзеньні мясцовых выбараў дзеля легітымацыі сваёй улады або апраўданьня прэтэнзіяў на ўладу. Але ўлада і апазыцыя былі зацікаўленыя ў рознай ступені палітычнае актыўнасьці беларускага грамадзтва ў пэрыяд выбараў. Апазыцыя, пагадзіўшыся на ўдзел у выбарах, была зацікаўленая ў максымальнай актыўнасьці выбарцаў. Для ўладаў ставала мінімальнай ступені ўдзелу грамадзтва ў мясцовых выбарах. Ані апазыцыя, ані самі шараговыя выбарцы не былі здольныя ў часе выбараў сур'ёзна кантраляваць працэс галасаваньня, забясьпечыць ягоную поўную празрыстасьць (асабліва пры датэрміновым галасаваньні) і тым больш караць парушальнікаў правілаў выбарчай кампаніі. Апрача таго, ужо на стадыі вылучэньня кандыдатаў ні пазбаўленая рэальных вагароў уплыву на ўладу апазыцыя, ні неарганізаванае грамадзтва (а немалая яго частка незадаволеная рэжымам) не маглі забясьпечыць роўнасьці ўмоваў для кандыдатаў ад улады і ад апазыцыі. Гэтае становішча захоўвалася як пры вылучэньні кандыдатур, гэтак і ў часе перадвыбарнай кампаніі.

Пасьля выбараў палітычная актыўнасьць у Беларусі ня вырасла. Плянавыя акцыі апазыцыі, прымеркаваныя да гістарычных датаў, не сабралі істотнай колькасьці ўдзельнікаў. Выбарцы, маючы цьмяныя надзеі на перамены да лепшага дзякуючы свайму ўдзелу ў выбарах, не асабліва спадзяваліся быць пачутымі. Асноўным матывам галасаваньня быў пратэст, незадаволенасьць наяўнай сытуацыяй, а не прыхільнасьць да нейкай апазыцыйнай палітычнай праграмы.

Выбары ў мясцовыя Рады 2003 году сталі яшчэ адным эпізодам у разьвіцьці крызысу беларускае апазыцыі, аддаленьня сыстэмы бюракратычнае ўлады ад бальшыні грамадзтва і адчужэньня беларускага народу ад беларускае дзяржавы.

## ПАДРЫХТОЎКА ЎЛАДАЎ ДА МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ 2003

Як ужо згадвалася ў папярэдніх разьдзелах, сыстэма ўлады ў Беларусі пабудаваная так, што роля мясцовых прадстаўнічых органаў (за выняткам хіба што Менскай гарадзкой Рады) у прыняцьці рашэньняў і ўва ўплыве на палітычныя працэсы ў дзяржаве зьведзеная да мінімуму. З гэтай прычыны мясцовыя выбары пры любым выніку ня могуць спаважна пахіснуць палітычных пазыцыяў улады. Аднак, нягледзячы на гэта, інстытут мясцовага кіраваньня і, адпаведна, мясцовыя выбары ўсё ж ня пятае кола ў дзяржаўнай машыне, што будавалася прэзыдэнтам Лукашэнкам з 1994 г. Выбары — гэта дадатковы сродак пацьвердзіць непадзельную палітычную гегемонію прэзыдэнта і чарговым разам аслабіць апазыцыю. Значыць, кожныя выбары нясуць і пэўную пагрозу для ўладаў: калі яны ідуць «не паводле пляну», то іх вынік можа зьмяніць настроі ў грамадзтве і ў стане апазыцыі, стаць штуршком для яе актывізацыі. Акурат на недапушчэньне такога варыянту разьвіцьця падзеяў і працуе ўся дзяржаўная машына. А паколькі выбары трэба праводзіць з адпаведнай рэгулярнасьцю (іначай улады згубілі б апошнія аргумэнты на карысьць таго, што ў краіне існуе нейкая ўява дэмакратыі), то машына правядзеньня выбараў павінна знаходзіцца ў рэжыме заўсёднай гатовасьці. Акурат з гэтай нагоды ня мае асаблівага сэнсу гаварыць аб якойсьці спэцыфічнай падрыхтоўцы ўладаў да дадзеных канкрэтных выбараў. Умоўна ка-

жучы, яна пачалася яшчэ зь лістапада 1996 году, калі гвалтам была зьмененая Канстытуцыя, з красавіка 1999 году, калі быў абраны папярэдні склад мясцовых Радаў, ці зь лета 2000 году, калі быў зацьверджаны новы Выбарчы Кодэкс. Адмысловай ступеньню ў падрыхтоўцы былі і прэзыдэнцкія выбары'2001, калі была адпрацаваная мэтода падліку галасоў. Гэты мэханізм патрабаваў бы наладжаньня толькі тады, калі б арганізаваная па выпрацаваным шаблёне кампанія сутыкнулася з рэальнай і нечаканай пагрозай актыўнага, маштабнага і скансалідаванага супрацьдзеяньня з боку апанэнтаў. У 2003 годзе гэтага ня зьдзейлася. А значыць, гэтыя мясцовыя выбары сталі чарговай ступеньню ў падрыхтоўцы ўладаў да наступнай кампаніі. Ёсьць меркаваньне, што падчас далейшых выбараў будзе цяжка знайсьці месца ня толькі назіральнікам, ня толькі сябрам камісіяў ад апазыцыйных партыяў, а нават самім апазыцыйным кандыдатам ці нават выбарцам.

## Фармаваньне выбарчых камісіяў. Папярэднія заўвагі

Вядучая роля ў арганізацыі выбараў належыць выбарчым камісіям. Таму адным з найважнейшых этапаў выбараў становіцца іх фармаваньне. Апазыцыйныя палітыкі шмат скардзіліся і скардзяцца на гэты працэс. На такія скаргі існуюць важкія прычыны. Асноўная зь іх — празьмерны ўплыў выканаўчай «вэртыкалі». Нават у ідэальным варыянце празрыстых і справядлівых выбараў вельмі цяжка зусім адхіліць выканаўчую ўладу ад матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня выбарчых камісіяў памяшканьнямі, транспартнымі сродкамі, сродкамі сувязі і інш. Але што датычыць уплыву выканаўчай улады на фармаваньне выбарчых камісіяў, то ён павінен быць мінімальны. Аднак у нашых умовах дзейнічае адваротны прынцып: вызначальную ролю адыгрывае акурат уладная вэртыкаль, у той час як уплыў усіх іншых палітычных суб'ектаў зьведзены да мінімуму. Гэта перш за ўсё тычыцца грамадзянаў і палітычных партыяў. Фармальна кожны грамадзянін Беларусі рэалізуе ўладу праз прадстаўнічыя органы дзяржаўнага кіраваньня. Апрача таго, выбарцы (г.зн. грамадзяне, якія маюць выбарчыя правы) могуць удзельнічаць і ў дзейнасьці выбарчых камісій. Для гэтага яны могуць выкарыстаць адзін з спосабаў вылучэньня ў склад выбарчай камісіі: у якасьці прадстаўніка палітычнай партыі ці іншага грамадзкага аб'яднаньня; у якасьці прадстаўніка працоўнага калектыву; у якасьці прадстаўніка выбарцаў праз збор подпісаў; найбольш надзейны спосаб — працаваць у адным з органаў, што ўтвараюць выбарчыя камісіі. Нормы Выбарчага Кодэксу аб вылучэньні кандыдатаў у склад выбарчых камісіяў дастаткова акрэсьленыя. Таму кожная партыя, кожны працоўны калектыў ці група выбарцаў фармальна змогуць вылучыць свайго прадстаўніка ў склад выбарчай камісіі. Аднак насамрэч іх права абмежаванае тым, што мясцовыя органы ўлады самастойна адбіраюць прэтэндэнтаў у склад камісіяў на этапе іх фармаваньня. Дарэчы, зьдзіўляе і выкарыстаньне ў заканадаўстве слова «прадстаўнік». Прадстаўнік, згодна з тлумачальным слоўнікам, гэта асоба, якая дзейнічае на чыё-небудзь даручэньне, выражае чые-небудзь інтарэсы, погляды. Калі ўлічваць гэта, то прадстаўнік партыі ці працоўнага калектыву не павінен быць сябрам адпаведнай партыі ці працоўнага калектыву. У той жа час Выбарчы Кодэкс патрабуе адваротнага, што ўказвае на не зусім карэктнае выкарыстаньне тэрміналёгіі. На практыцы гэта азначае, што нават калі б Выбарчы Кодэкс патрабаваў уключэньня прадстаўнікоў палітычных партыяў у склад выбарчых камісіяў, іх удзел у працы апошніх, улічваючы малалікасьць партыйных структур на

мясцох, усё роўна быў бы абмежаваны, прынамсі ў рэгіёнах.

Асаблівай увагі заслугоўвае роля мясцовых Радаў у выбарчым працэсе. У гэтым пытаньні існуюць розныя думкі. Адны кажуць, што мясцовыя Рады нічога не вырашаюць у жыцьці дзяржавы і грамадзтва, іншыя так ня лічаць. Дадзеныя апытаньняў у 2003 г. сьведчылі, што каля 82% апытаных мяркавалі, што мясцовыя Рады і іх дэпутаты ніяк не ўплываюць ці ўплываюць нязначна на іх жыцьцё, толькі 10% мяркавалі, што мясцовыя Рады ўплываюць на жыцьцё значна[1].

Аднак, дарма што кампэтэнцыя Радаў у сфэры эканамічнай і сацыяльнай дзейнасьці зьведзеная дзейным заканадаўствам да мінімуму, мясцовыя прадстаўнічыя органы дзяржаўнага кіраваньня фармальна значна ўплываюць на ход фармаваньня выбарчых камісіяў (паводле Выбарчага Кодэксу, яны фармуюцца супольна прэзыдыюмамі і выканкамамі адпаведных камісіяў). Апрача таго, дэпутаты, зноў жа фармальна, маюць пэўныя паўнамоцтвы і для назіраньня за выбарамі. Тое, што на практыцы ўплыў і паўнамоцтвы Радаў і дэпутатаў не выкарыстоўваюцца, тлумачыцца тым, як прадстаўнічыя органы на месцах фармаваліся першапачаткова. Адным словам, абраўшы «паслухмяныя» Рады аднаго разу, улады значна палягчаюць сабе заданьне ў будучыні. Прычым гэта тычыцца ня толькі мясцовых, але і іншых (парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх) выбараў. Так, выбарчая кампанія 1999 году вызначыла вынікі выбараў у 2000 і 2001 гадох, а таксама — выбараў мясцовых Радаў 2003 году. Відавочна, выбары мясцовых Радаў у сакавіку 2003 году таксама шмат у чым вызначылі вынікі наступных выбараў. Гэтая акалічнасьць, дарэчы, прымушае разглядаць пытаньне аб падрыхтоўцы ўлады да выбараў зь іншага ракурсу: дэ-факта яно не абмяжоўваецца часавымі рамкамі адной кампаніі ці нават аднаго палітычнага цыклю «ад выбараў да выбараў»; падрыхтоўка ўяўляе сабой пэрманэнтны працэс, які цягам бягучай кампаніі набывае толькі троху больш дынамічны характар. Таму будзе дарэчным пытаньне: калі дэмакратычныя сілы прайгралі парлямэнцкія, прэзыдэнцкія і выбары мясцовых Радаў у 2003 г.? Адказ відавочны — задоўга да пачатку апошняй перадвыбарнай кампаніі. Так, пакуль яны займаліся віртуальнымі прэзыдэнцкімі выбарамі, улада правяла выбары згодна з сваім сцэнаром. Таму Рады з гледзішча асабістага складу ўяўлялі сабой фактычна прызначаных прадстаўнікоў выканаўчай улады. Пры такім раскладзе вынікі фармаваньня выбарчых камісіяў прадказальныя.

## Фармаваньне камісіяў у кампаніі 2003 году

Пасьля вылучэньня кандыдатаў у склад выбарчых камісіяў настае найбольш адказны працэс — фармаваньне іх складу. У прыняцьці гэтага рашэньня важную ролю адыгрываюць акурат мясцовыя Рады. Дэмакратычныя сілы выкарысталі магчымасьць вылучэньня сваіх прадстаўнікоў у склад камісіяў. Зразумела, што асаблівая актыўнасьць назіралася пры вылучэньні іх прадстаўнікоў у камісіі вышэйшага ўзроўню — абласныя, Менскую гарадзкую, буйных гарадоў. У пасялковых і сельскіх камісіях партыйныя прадстаўнікі амаль не сустракаліся. Як і трэба было спадзявацца, бальшыня прэтэндэнтаў ад дэмакратычных сілаў не была дапушчаная ў тэрытарыяльныя камісіі. Напрыклад, з 78 прэтэндэнтаў ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі здолеў атрымаць статус сябра тэрытарыяльнай камісіі толькі адзін. Іншым

[1] Белорусский рынок. 2003. 3 февраля.

партыям пашчасьціла больш. Так, у склад тэрытарыяльных камісіяў трапілі 19 прадстаўнікоў з Партыі камуністаў Беларускай, 11 — зь Лібэральна-дэмакратычнай партыі, 5 — зь Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада). Калі ўлічыць, што ў краіне былі створаныя 1673 тэрытарыяльныя камісіі, то відавочна, што такое прадстаўніцтва партыяў значна на ход выбарчай кампаніі не паўплывала, але было добрым піяраўскім крокам улады, што ствараў ілюзію аб нібыта маючым месца «прагрэсе» ў дэмакратычнасьці выбараў і зьмяншаў эфэкт адсутнасьці дэмакратычнага кантролю над акруговымі камісіямі, дзе лёс выбараў насамрэч і вырашаўся.

Адным з праблемных пунктаў у гэтай выбарчай кампаніі было партыйнае прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях, і таму кіраўнікі выканкамаў, Радаў, Цэнтральнай выбарчай камісіі пры кожным зручным выпадку маніпулявалі лічбамі. Але прадстаўнікоў прапрэзыдэнцкіх партыяў ці іншых грамадзкіх аб’яднаньняў нельга лічыць за тых, хто творыць плюралізм у выбарчых камісіях. А іх у камісіях было шмат, што і робіць афіцыйныя лічбы ўражальнымі. Да таго ж, камісіі ніжэйшага ўзроўню — пасялковыя, сельскія, участковыя — амаль спрэс засталіся без партыйных прадстаўнікоў, аб чым мы гаварылі вышэй. Так, прадстаўнікі палітычных партыяў у абласных і Менскай гарадзкой выбарчых камісіях складалі ад 15,4% у Магілёўскай абласной выбарчай камісіі да 76,9% у Менскай гарадзкой. Уся выбарчая кампанія фактычна рабілася на ніжэйшым узроўні, асабліва гэта датычыць участковых камісіяў. Камісіі вышэйшага ўзроўню амаль нічога ўжо не вырашалі, а толькі канстатавалі факт — адбыліся выбары ці не, а таксама абвяшчалі вынікі выбараў. Галоўнае ж у працэсе выбараў — хто лічыць бюлетэні.

Параўнаем такія лічбы. У краіне было створана 360 акруговых камісіяў для выбараў у абласныя Рады. З 4330 сяброў гэтых камісіяў 168 былі прадстаўнікамі партыяў, а прадстаўнікоў органаў, якія стварылі гэтыя камісіі (Рады і адпаведныя выканкамы), было 319 чалавек, што амаль удвая больш за партыйных прадстаўнікоў. Паказальна, што пры стварэньні камісіяў улічваўся досьвед працы на выбарах. З фармальнага пункту гледжаньня такі падыход цалкам апраўданы: тое, што бальшыня чальцоў камісіяў мае папярэдні досьвед працы, павінна рабіць камісіі больш прафэсійнымі. Аднак досьвед чальцоў камісіяў быў назапашаны падчас іх удзелу ў выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў у 1999 годзе, дэпутатаў палаты прадстаўнікоў у 2000 годзе і ў выбарах прэзыдэнта ў 2001 годзе. Апошнія дзьве кампаніі праходзілі паводле новага заканадаўства — Выбарчага Кодэксу — і былі ў пэўнай меры фазай падрыхтоўкі да кампаніі 2003 году. Тым, хто дабіваўся справядлівасьці ў папярэдніх кампаніях, шлях у камісіі ў кампаніі выбараў дэпутатаў мясцовых Радаў быў заказаны.

Дарма што адзінкавыя прадстаўнікі дэмакратычных сілаў трапілі ў выбарчыя камісіі, гэтая частка кампаніі скончылася няўдачай для апазыцыі. Далейшыя падзеі на этапе вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты і галасаваньня толькі ўзмацнілі пазыцыі прыўладных кандыдатаў у дачыненьні да кандыдатаў апазыцыйных.

## Рэгістрацыя кандыдатаў – «апазыцыйны» блёк

Зазнаўшы паразу на стадыі фармаваньня выбарчых камісіяў, апазыцыя сканцэнтравала свае высілкі на барацьбе за дэпутацкія мандаты. Чакалася, што яна падрыхтавалася да вельмі сур’ёзнай барацьбы за мандаты, а таму конкурс павінен быць значны. Але выйшла інакш. За трохі больш чым 24 тысячы мандатаў было вылучана каля 26 з паловай тысяч прэтэндэнтаў.

Калі ўлічыць, што пасьля праверкі дакумэнтаў, пададзеных у выбарчыя камісіі, чакаўся вялікі адсеў, то конкурс выйшаў зусім невялікі. У выніку абсалютная бальшыня засталася без альтэрнатывы, а дзьве акругі — нават без кандыдатаў.

Як і ў выпадку з вылучэньнем прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў, партыі, у прыватнасьці апазыцыйныя, асаблівую актыўнасьць выказалі пры вылучэньні кандыдатаў у Рады вышэйшага ўзроўню. Пры гэтым, нягледзячы на параўнальна вялікую колькасьць зарэгістраваных партыяў, жаданьне ўдзельнічаць у выбарах выказалі трохі больш за іх палову. Гэты факт сам за сябе сьведчыў, што партыі, якія ствараюцца перш за ўсё для барацьбы за ўладу, пакуль яшчэ ня здольныя былі выконваць сваю асноўную ролю. Лідэрамі ж у вылучэньні кандыдатаў сталі Лібэральна-дэмакратычная партыя, якая падала дакумэнты на 329 прэтэндэнтаў, Партыя камуністаў Беларуская — 208, Камуністычная партыя Беларусі — 141, Аб’яднаная грамадзянская партыя — 130, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) — 103, Партыя Беларускі Народны Фронт — 76 прэтэндэнтаў. Астатнія партыі, што ўзялі ўдзел у выбарах, вылучылі па адным кандыдату. Усяго ад партыяў было вылучана 1033 прэтэндэнты. Гэта ўсяго каля 4% ад лічбы колькасьці месцаў у Радах. Асноўная колькасьць гэтых прэтэндэнтаў сканцэнтравалася ў абласных Радах, Менскай гарадзкой Радзе, Радах вялікіх гарадоў і раёнаў. У першасныя ж Рады — пасялковыя, сельскія — прэтэндэнты ад партыяў амаль не вылучаліся. Найбольшы конкурс партыйцаў, як і чакалася, меў месца ў Менску. Тут з 305 прэтэндэнтаў 120 былі вылучаныя акурат партыямі. Больш за ўсё вылучыла прэтэндэнтаў Лібэральна-дэмакратычная партыя — 55. На выбарах у абласныя Рады партыйных кандыдатаў было значна менш. Напрыклад, у Віцебскую абласную Раду з 143 прэтэндэнтаў партыі вылучылі 38, у Гомельскую — 55 з 133.

Лукашэнкаўцы вылучылі сваіх прадстаўнікоў на ўсіх узроўнях — ува ўсе Рады па кожнай акрузе. Па-другое, у безальтэрнатыўных акругах, якіх аказалася пераважная бальшыня, месцы былі занятыя акурат прадстаўнікамі ўлады. У тым, што выбары ў шмат якіх акругах прайшлі без альтэрнатывы, была віна ня толькі ўлады, але й дэмакратычных сілаў. Адбылося гэта зь вядомай прычыны — не было каго высоўваць.

Іншая карціна складалася на ўзроўні раённых, гарадзкіх, абласных Радаў. Тут дэмакратычныя кандыдаты, асабліва ў гарадох абласнога падпарадкаваньня і абласьцях, у бальшыні акругаў зрабілі ўладзе канкурэнцыю. Але сам-насам апазыцыйных вылучэнцаў улада не пакінула. Побач з кожным партыйным прэтэндэнтам абавязкова бачым вылучэнца ад улады. Да таго ж, пры наяўнасьці вялікай колькасьці акругаў без дэмакратычных прэтэндэнтаў дзе-нідзе альтэрнатыву адзін аднаму стварылі апазыцыйныя вылучэнцы. Асабліва ў гэтай дзялянцы шчыравалі дзеячы «ўмоўна апазыцыйнай» ЛДП, якія як заўсёды знутра падрывалі адзінства дэмакратычных сілаў.

Дарэчы, цяжка назваць дакладную колькасьць усіх дэмакратычных, у прыватнасьці партыйных, прэтэндэнтаў. Некаторыя партыі падтрымлівалі так званых незалежных вылучэнцаў, а таксама некаторыя партыйцы, якія вылучаліся іншымі спосабамі, не паказвалі сваёй партыйнасьці. Напрыклад, БНФ ад партыі вылучыла 76 чалавек, а заявіла аб падтрымцы больш як паўтары сотні прэтэндэнтаў. Гэта адметная зьява: цалкам лягічна рабіць стаўку на тых грамадзян, якія з пэўных прычын не паказваюць сваёй партыйнай прыналежнасьці, але гатовыя дэ-факта прадстаўляць інтарэсы партыяў на палітычнай сцэне. Сярод «афіцыйных» партыйных кандыдатаў большую частку складалі кіраўнікі партыйных арганізацыяў і грамадзкіх аб’яднаньняў. Іх імёны нават не былі вядомыя шырокім колам грамадства. Няшмат з гэтых людзей змаглі пабачыць на свае вочы выбарцы.

Калі б значная частка прэтэндэнтаў змагла б вылучыцца кандыдатамі ў дэпутаты, а потым і выбрацца дэпутатамі, гэта б значна паўплывала на працу Радаў. Дастаткова адзначыць хаця б тое, што абласныя і Менская гарадзкая Рады дэпутатаў выбіраюць чальцоў рады рэспублікі. Але адмова ад удзелу ў папярэдніх выбарах выключыла партыі з сыстэмнай палітыкі: партыі і іх кандыдаты страцілі шанцы назапасіць досьвед і арганізацыйныя рэсурсы, якія б яны маглі скарыстаць у наступных кампаніях. Вынікам стаў масавы працэс адмоваў партыйным вылучэнцам у рэгістрацыі кандыдатамі ў дэпутаты, што справакавала новую хвалю крытыкі ўлады з боку апазыцыі. Назваць дакладныя зьвесткі ў гэтай справе цяжка, паколькі Цэнтравыбаркам не падаў іх у сыстэматызаваным выглядзе. Апрача таго, афіцыйныя дадзеныя аб рэгістрацыі партыйных кандыдатаў і тыя зьвесткі, што называліся партыямі, адрозьніваліся. Таму мы можам толькі ацаніць агульную тэндэнцыю, выходзячы зь зьвестак, што былі пададзеныя апошнімі ў сродкі масавай інфармацыі.

Асноўнай прычынай адмоваў стала адсутнасьць ніжэйшых партыйных структур. Неабходнасьць існаваньня такіх структур дзеля рэгістрацыі кандыдатаў была вядомая загадзя. Але паколькі бальшыня з апазыцыйных партыяў ня мела параўнальна сьвежага досьведу ўдзелу ў перадвыбарных кампаніях, яна забылася пра гэта.

На гэтым этапе партыі, ня ўлічваючы «карлікавых», згубілі шмат сваіх вылучэнцаў. Як у такім выпадку тлумачыць, што партыі вылучалі сваіх чальцоў акурат там, дзе гэтых першасных арганізацыяў няма? Магчымая прычына — улада не зарэгістравала «пярвічку», адмовіла беспадстаўна. Таму кандыдата ўсё ж вылучалі, а ў «парушэньні» заканадаўства вінавацілі ўладу. Аднак такая тактыка загадзя асуджала партыі на абмежаваны ўдзел у выбарчай кампаніі. Адзінай альтэрнатывай, якая дазволіла б палітычным партыям абыйсьці гэтую праблему, было жвавейшае партыйнае будаваньне ў рэгіёнах, дарма што напярэдадні выбараў улады маглі не рэгістраваць партыйных структураў у рэгіёнах, каб перашкодзіць іх актыўнейшаму ўдзелу ў гэтай палітычнай кампаніі. Аднак нормы Выбарчага Кодэксу былі вядомыя з 2000 году. Гэта азначала, што дадзеная праблема ўсё ж такі магла быць вырашаная загадзя. Такім чынам, зноў паўстае пытаньне аб пасьлядоўнай палітычнай стратэгіі.

Уладу часта абвінавачвалі ў тым, што Цэнтравыбаркам няправільна тлумачыць закон, які насамрэч не патрабуе існаваньня першасных арганізацыяў партыяў для вылучэньня імі кандыдатаў у дэпутаты. Хаця апанэнты ўлады маглі мець рацыю, разьлік на тое, што Цэнтравыбаркам будзе трактаваць спрэчныя артыкулы закону на карысьць партыяў, а ўлада і выбарчая сыстэма будуць працаваць на апанэнтаў існага рэжыму, быў памылковы. Урэшце, удзел у выбарах прадугледжвае барацьбу па правілах, што дыктуе сыстэма, у рамках якой гэтыя

**Табліца 1.** Адсеў партыйных кандыдатаў на стадыі рэгістрацыі

| Партыя | Вылучана прэтэндэнтаў | Зарэгістравана кандыдатамі | Адсотак "адсеву" |
|---|---|---|---|
| АСДП незарэгістраваная | 79 | 53 | 33% |
| БНФ | 154 | 107 | 31% |
| БСДП (НГ) | 220 | 119 | 45% |
| ЛДП | 1413 | 435 | 69% |
| АГП | 201 | 120 | 40% |

Крыніца: паведамленьні БелаПАН, уласныя зьвесткі партыяў.

выбары адбываюцца (калі толькі апанэнты ўлады ня здольныя навязаць сваіх уласных правілаў гульні).

Апрача партыйнага вылучэньня, альтэрнатыўныя кандыдаты выкарыстоўвалі і іншыя спосабы высоўваньня кандыдатаў у дэпутаты. Найцяжэйшы зь іх з пункту гледжаньня тэхналёгіі, але найвыгаднейшы з пункту гледжаньня агітацыі — збор подпісаў. Дарэчы, у параўнаньні з кампаніяй 1999 году цяпер такі спосаб вылучэньня кандыдатаў выкарысталі амаль удвая больш прэтэндэнтаў. Калі ў той кампаніі шляхам збору подпісаў вылучаліся шэсьць з паловай тысяч чалавек, то ў гэтай кампаніі подпісы зьбіралі амаль 12 тысяч групаў. Сярод іх былі і партыйныя. У абласныя і Менскую гарадзкую Рады з 605 заяваў ад ініцыятыўных групаў 147 былі пададзеныя акурат групамі партыйных прэтэндэнтаў.

Ці маглі ініцыятыўныя групы для збору подпісаў выратаваць сытуацыю? Так, партыйныя вылучэнцы маглі не хваляваца пра наяўнасьць першаснай арганізацыі. Але на шляху вылучэнцаў спосабам збору подпісаў існуе куды больш магчымасьцяў для дыскваліфікацыі «непатрэбных» прэтэндэнтаў. Так, уважлівае вывучэньне закону дазваляе зрабіць выснову, што нават нязначныя тэхнічныя памылкі могуць каштаваць кандыдацкага статусу, а магчыма і дэпутацкага мандату. Па-першае, часам з памылкамі запаўняецца тэкст па-за табліцай, дзе паказваюцца дадзеныя пра кандыдата, групу, чальца групы, які зьбірае подпісы. Часта падпісны аркуш з прозьвішчам аднаго чальца ініцыятыўнай групы аказваецца ў другога прадстаўніка гэтай групы, а часам і ўвогуле ня ў сябра ініцыятыўнай групы. Калі такі факт выяўляецца выбарчай камісіяй, то пра магчымасьць вылучыцца кандыдатам можна забыцца.

Па-другое, формула праверкі подпісаў такая, што зусім невялікая колькасьць несапраўдных подпісаў можа стаць прычынай адмовы ў рэгістрацыі кандыдата. Напрыклад, пры вылучэньні кандыдатам у абласную ці ў Менскую гарадзкую Рады трэба сабраць ня менш як 150 подпісаў. Дастаткова прызнаць несапраўднымі 9 подпісаў, каб адмовіць прэтэндэнту ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты. Гэта была асноўная прычына адмоваў прэтэндэнтам, якія рызыкнулі зьбіраць подпісы. Цікава і тое, зь якіх прычынаў подпісы прызнаваліся несапраўднымі. Напрыклад, сябры камісіяў хутка і дакладна выяўляюць, што ня выбарца паставіў дату і подпіс, а нехта іншы. Закон жа патрабуе, каб выбарца сам ставіў дату і сам падпісваўся. Вядома, што праверка почырку даволі складаная працэдура, і яна толькі дае падставу для сумненьня, а не даводзіць парушэньне. Доказам можа быць толькі асабістая заява грамадзяніна, што ня ён напісаў дату. Але ўявіце сабе, што чальцы камісіяў бегаюць па кватэрах за такімі заявамі. Вось тут і выяўляецца машына дзяржаўнай улады, калі ад адной толькі думкі, што дата магла быць напісана не самім выбарцам, подпісы прызнаюцца несапраўднымі. Гэтая прычына была бадай што найчасьцейшая пры адмовах у рэгістрацыі кандыдатам.

Узьнікае пытаньне, чаму з 12 тысяч такіх групаў было мала адмоваў у рэгістрацыі. На гэтае пытаньне могуць быць два адказы. Па-першае, подпісы зьбіралі ў асноўным ініцыятыўныя групы пралукашэнкаўскіх кандыдатаў, якія, безумоўна, не праходзілі такой жа строгай працэдуры праверкі, як дэмакратычныя кандыдаты. Па-другое, адміністрацыйны рэсурс на раньніх стадыях гэтых выбараў не выяўляўся так выразна, як у ранейшых кампаніях, а значыць, аркушы з подпісамі правяраліся ня так заўзята. Сапраўды, лукашэнкаўцам не было асаблівага сэнсу так рана задзейнічаць рэсурс, на які будзе шмат нараканьняў: яны і так бачылі, што вялікай бойкі з дэмакратычнымі кандыдатамі ня будзе. Тым больш, што наперадзе заставалася яшчэ галасаваньне, дзе, як будзе адзначана далей, адміністрацыйны рэсурс быў скарыстаны максымальна.

Наступны значны парог, які ня здолелі пераступіць шмат якія дэмакратычныя вылучэнцы, — дэклярацыя аб маёмасьці і даходах. Такая норма зьявілася ў Выбарчым Кодэксе зь некалькіх прычынаў. Па-першае, дадзеныя, якія зьмяшчаюцца ў дэклярацыі, даюць магчымасьць адмовіць у рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты. Па-другое, як сказала старшыня Цэнтравыбаркаму Лідзія Ярмошына на прэсавай канфэрэнцыі па выніках рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, няма той мінімальнай лічбы, якую можна дараваць прэтэндэнту і не заўважыць пры яго рэгістрацыі. Таму нават за рубель можна зьняць чалавека з дыстанцыі. Так, намесьніку старшыні партыі БНФ Юрасю Хадыку было адмоўлена ў рэгістрацыі за 24 тысячы рублёў, якія ён не задэкляраваў, сябру БСДГ Алегу Трусаву — за 72 тысячы, а беспартыйнаму кандыдату і дэпутату Менскай гарадзкой Рады папярэдняга скліканьня Юр'ю Данькову (Шыціку) — за 164 тысячы рублёў.

Гэтая норма — запаўненьне дэклярацыяў — фактычна стала дубцом у руках выбарчых камісіяў. Запаўненьне такой дэклярацыі ня ёсьць чымсьці асаблівым у сусьветнай практыцы, але гэтая працэдура мае іншую мэту — інфармацыйную (хлусьлівасьць кандыдатаў у дэпутаты, калі яна даведзеная да выбарцаў, можа істотна паўплываць на іх выбар). Для падатковых органаў незарэгістраваныя сумы грошай азначаюць укрыцьцё ад падаткаў. Аднак у дадзеным выпадку гэта ня тыя даходы, зь якіх падаткі не аплачаныя. Таму яны ня могуць быць падставай для пакараньня кандыдата. Аднак беларускае заканадаўства ўтрымлівае іншыя нормы.

Пасьля ўсіх працэдураў адсеву 693 партыйныя прэтэндэнты сталі кандыдатамі. Іншымі словамі, незарэгістраваная была прыкладна трэцяя частка партыйных прэтэндэнтаў. Гэтая лічба вырасьце яшчэ больш, калі ня ўлічваць «неапазыцыйных» партыяў. Партыйныя кандыдаты складалі амаль 40% незарэгістраваных кандыдатаў. Як бачым, адсотак адсеву дэмакратычных прэтэндэнтаў дасягнуў вялікай адзнакі. У той жа час, ён быў не такі вялікі, калі параўноўваць рэгістрацыю кандыдатаў на папярэдніх кампаніях. Так, на мясцовых выбарах'1999 бальшыня сяброў апазыцыйных партыяў была загадзя дыскваліфікаваная нормай выбарчага заканадаўства, што забараняла нават вылучэньне кандыдатамі тых асобаў, якія мелі адміністрацыйнае спагнаньне цягам аднаго году да пачатку выбараў. Два дэмакратычныя вылучэнцы, што ўсё ж паспрабавалі ўзяць удзел у кампаніі, былі дыскваліфікаваныя на стадыі рэгістрацыі. Адсотак адсеву на выбарах 2000 году ў Палату Прадстаўнікоў цяжка ацаніць дзеля байкоту выбараў бальшынёй апазыцыйных партыяў. У той жа час, сярод «незалежных» кандыдатаў (беспартыйных апазыцыянэраў) прыкладна 70% былі адсеяныя ў часе рэгістрацыі. Такім чынам, практыка рэгістрацыі альтэрнатыўных кандыдатаў на гэты раз была ўсё ж такі больш лагоднай, чым на папярэдніх кампаніях. Гэта, натуральна, не азначала, што настолькі ж лагоднай будзе і беспасярэдняе правядзеньне выбараў. Неспадзяванкі былі прыхаваныя ўладай да апошняга моманту.

## Рэгістрацыя кандыдатаў — «уладны» блёк

Што тычыцца стратэгіі вылучэньня кандыдатаў ад улады, то тут можна вызначыць некалькі адметнасьцяў. Па-першае, як і чакалася, улада забясьпечыла сваё прадстаўніцтва ўва ўсіх акругах. У кожнага альтэрнатыўнага кандыдата быў канкурэнт. Па-другое, супраць апазыцыянэраў была кіненая «цяжкая артылерыя» — кіраўнікі мясцовых органаў улады. Напрыклад, кандыдатамі ў дэпутаты былі зарэгістраваны ўсе старшыні абласных Радаў. Па-трэцяе,

стаўка рабілася на тых кандыдатаў, ляяльнасьць якіх да выканаўчай улады была спраўджаная: так, прыкладна палова з кандыдатаў ужо былі дэпутатамі мясцовых Радаў у папярэдніх скліканьнях. Амаль усе прэтэндэнты — былыя дэпутаты — без праблем прайшлі рэгістрацыю. Вынятак склалі толькі тыя, хто цягам свайго папярэдняга дэпутацкага тэрміну заняў больш-менш незалежную пазыцыю што да выканаўчай вэртыкалі. У Менску імі былі Дзьмітры Вус і Юры Данькоў.

На выбары пайшлі прадстаўнікі ня толькі прадстаўнічай, але і выканаўчай улады, пагатоў, што закон дазваляе адначасова займаць дзяржаўную пасаду і быць дэпутатам. І такіх дзеячоў даволі многа — 13,8%. Пры нармальным разьвіцьці палітычнай сыстэмы выканаўчая і прадстаўнічая ўлады ўраўнаважваюць адна адну, бо перакос вядзе да вельмі нэгатыўных наступстваў. Але ў Беларусі, як неаднаразова адзначаў прэзыдэнт краіны, улада ёсьць адзіным арганізмам — усё, у тым ліку і выбарчая сыстэма, а цяпер ужо культура і навука (пра гэта гаварылася ў яго пасланьні парлямэнту 2003 г.), павінна працаваць на ўмацаваньне такой улады.

Што да астатніх кандыдатаў, то 32% зь іх склалі працаўнікі вёскі, у асноўным кіраўнікі калгасаў і саўгасаў, што ня дзіўна пры такой колькасьці сельскіх і пасялковых Радаў. Больш уражваюць іншыя лічбы. Работнікі адукацыі, навукі і культуры займаў у сьпісе кандыдатаў 18,7%, мэдыкі — 7,5%. Шмат іх аказалася і ў выніковых сьпісах пасьля падвядзеньня вынікаў выбараў. Як бачым, склад кандыдатаў ад улады не выпадковы. Калі такі кандыдат і не працуе ў саміх органах улады, то беспасярэдне падначалены ім. Улада такім чынам улічыла і пэўныя стэрэатыпы выбарцаў: будуць галасаваць хутчэй за настаўніка ці лекара, чым за партыйнага дзеяча, на якога амаль штодня з экрана тэлевізара ці з старонак дзяржаўных газэт і часопісаў выліваюцца цэбары бруду.

Улада рабіла стаўку на надзейных кандыдатаў. Як і ў папярэднія гады, шмат вылучэнцаў было ад працоўных калектываў — 13 з паловай тысяч чалавек. Асноўная колькасьць прадпрыемстваў у нас дзяржаўная, таму і кандыдаты ад працоўных калектываў падначаленыя беспасярэдне выканкамам.

Сярод зарэгістраваных кандыдатаў было надзвычай мала прыватных прадпрымальнікаў — усяго 1,8%. Прычыны такіх паводзінаў прадпрымальнікаў ляжалі на паверхні. Так, месца ў Радзе можа дапамагчы ў вядзеньні свайго бізнэсу. Аднак, па-першае, гэтае месца яшчэ трэба атрымаць. Значыць таму, хто надумаў пайсьці ў прадстаўнічую ўладу, трэба ўлічваць уціск з боку выканаўчай улады. Па-другое, бізнэс павінен быць раскручаны, каб прафінансаваць кампанію. Аднак для таго, каб яна акупілася, дэпутацкі мандат павінен надаваць рэальныя гарантыі статусу свайму ўладальніку. Але ці можа абараніць прадпрымальніка ад непрыемнасьцяў яго статус як дэпутата мясцовай Рады?

## Пасьля рэгістрацыі

Вылучэньне і рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты — толькі чарговы этап выбарчай кампаніі. Таму тое, што некаторым дэмакратычным кандыдатам усё ж удалося зарэгістравацца, яшчэ не гарантавала канчатковага посьпеху, бо на кожнага дэмакратычнага кандыдата ўлада вылучыла свайго.

Як мы гаварылі, з аднаго боку, у інтарэсах улады было максымальнае скарачэньне

прадстаўніцтва апазыцыйных дэпутатаў у мясцовых Радах. Зь іншага — яна намагалася зрабіць выгляд, што выбары праходзяць справядліва і адкрыта. І ўсё-ткі сакратар Цэнтральнай выбарчай камісіі Мікалай Лазавік зрабіў заяву, што выбары праводзяцца не для Захаду. Гэта значыць: улада перш за ўсё будзе ўлічваць свае інтарэсы, а не падвышаць сваю легітымнасьць у вачах іншых дзяржаваў і міжнародных арганізацыяў.

Пра тое, што міжнародная грамадзкая думка наконт выбараў мясцовых Радаў уладу не цікавіць, сьведчыла наступнае: ні адміністрацыя прэзыдэнта, ні ўрад, ні Міністэрства замежных справаў, ні Цэнтравыбаркам не запрасілі на гэтыя выбары міжнародных назіральнікаў. Запрашаць ці не запрашаць на выбары назіральнікаў справа кожнай канкрэтнай краіны. Але, як склалася практыка, краіны, якія праводзяць трансфармацыю свайго грамадзкага ладу, як правіла запрашаюць назіральнікаў, каб забясьпечыць давер іншых краінаў і міжнародных арганізацыяў да аднаго з асноўных палітычных працэсаў.

Але міжнародныя назіральнікі — не адзіны галаўны боль для ўлады. Дарма што адны дзяржавы прызналі выбары і тыя органы, якія былі выбраныя, а іншыя не, — гэтыя органы працуюць і будуць працаваць надалей. Нашмат больш небясьпечны фактар — назіральнікі мясцовыя, якія жадаюць назіраць за ходам выбараў. Папярэднія выбары паказалі, што падрыхтаваны назіральнік мог значна паўплываць на дзеяньні сяброў выбарчай камісіі. Да таго ж, проста не дапусьціць яго на ўчастак для галасаваньня ці на паседжаньне выбарчай камісіі нельга. Для гэтага трэба выявіць парушэньні закону пры накіраваньні назіральніка. Але ў камісіяў і тут знайшоўся козыр — «дзіркі» ў Выбарчым Кодэксе. Толькі націск назіральніка, яго добрае веданьне закону, уменьне трактаваць артыкулы закону прымушала чальцоў камісіяў не дапускаць парушэньняў заканадаўства, у прыватнасьці, падчас галасаваньня і пры падліку галасоў. Аднак васьмёх тысячаў адукаваных і напорыстых назіральнікаў апанэнты ўлады ня мелі. У бальшыні ўчасткаў для галасаваньня былі ўсе магчымасьці для фальсыфікацыі выбараў.

Вынікі выбараў выйшлі не суцяшальныя. Перш за ўсё трэба адзначыць высокі адсотак датэрміновага галасаваньня — каля 20%. Так не бывае ў ніводнай краіне, дзе выбары праходзяць больш-менш дэмакратычна. Там гэты адсотак складае ня больш за тры, інакш можна сумнявацца ў адсутнасьці фальсыфікацыяў. У такой колькасьці грамадзян няма падставаў галасаваць датэрмінова. Пра гэта сьведчаць апытаньні выбарцаў, якія праводзіліся сацыялягічнай службай агенцыі БелаПАН «Люстра». Толькі 45% з выбарцаў, якія галасавалі датэрмінова, самі так пастанавілі, 22% апытаных сказалі, што ішлі галасаваць пад прымусам. Такім чынам, адсотак датэрміновага галасаваньня не павінен быў скласьці больш за 10%. Калі ж улічыць фактар страху, то можна меркаваць, што сярод тых, хто сказаў аб асабістым рашэньні галасаваць датэрмінова, ёсьць і тыя, хто пабаяўся сказаць аб прымусе.

Зважаючы на такую зацікаўленасьць улады ў датэрміновым галасаваньні, можна ўявіць сабе, каму патрэбны былі галасы, пададзеныя да 2 сакавіка, г.зн. тады, калі назіраць за галасаваньнем практычна немагчыма. Па-першае, дзе ўзяць такую колькасьць назіральнікаў, гатовых на некалькі дзён кінуць свае справы? Па-другое, назіраць за галасаваньнем можна толькі некалькі гадзін падчас беспасярэдняга галасаваньня, а ўночы скрынкі для галасаваньня знаходзяцца пад аховай усё той жа выканаўчай улады. Гэта стварае глебу для злоўжываньняў.

Як бы там ні было, але бюлетэні, кіненыя ў скрынкі пры датэрміновым галасаваньні, складалі толькі 20%. Усяго ж прагаласавала больш за 70% грамадзян, што маюць выбарчае

права, таму гэтыя бюлетэні значна паўплывалі на вынікі выбараў. Калі выбарцы сапраўды жадаюць зьмяніць склад прадстаўнічай улады, то тыя 20% ня вырашаць лёсу выбараў пры ўмове, што ў дзень галасаваньня за дэмакратычных кандыдатаў прагаласуе большая частка выбарцаў.

У дзень галасаваньня фальсыфікаваць выбары куды цяжэй, чым падтасоўваць датэрміновыя бюлетэні. Але камісіям зноў прыходзіць на дапамогу ўсё той жа кодэкс, напісаны не для ўдзельнікаў выбараў, а для іх арганізатараў. Умовы прысутнасьці назіральнікаў такія, што камісія мае магчымасьць нічога не паказваць ім пры галасаваньні і пры падліку галасоў. Формула забесьпячэньня прысутнасьці назіральнікаў не абавязвае камісіі забясьпечыць такія ўмовы назіраньня, каб былі бачныя сьпісы выбарцаў, бюлетэні пры іх падліку, камісіі нават не павінны абвяшчаць вынікаў галасаваньня і здымаць копіяў з пратаколаў камісіяў. Таму назіраньне за выбарамі носіць фармальны характар, і назіральніку трэба прыкласьці шмат высілкаў, каб давесьці парушэньні заканадаўства.

Найперш ацэнім вынікі галасаваньня. На гэтых выбарах, паводле афіцыйных дадзеных, удзельнічала каля 73,3% выбарцаў. Як мы гаварылі, грамадзяне скептычна ацэньвалі уплыў мясцовых Радаў на сваё жыцьцё. Несумненна, што выбары больш высокага ўзроўню — прэзыдэнта і парлямэнту — выклікаюць вялікі інтарэс. Таму, напрыклад, адсотак удзелу выбарцаў у выбарах прэзыдэнта ў 2001 г. — 83,9% — больш праўдападобны, хоць таксама выклікае некаторыя сумненьні. Сакавіцкія 2003 г. 73,3% сьведчаць аб вялікай зацікаўленасьці грамадзтва да фармаваньня прадстаўнічай улады, што супярэчыць сацыялягічным апытаньням.

Каб лепш уявіць сабе, чым займалася выканаўчая ўлада і створаныя ёй выбарчыя камісіі, трэба параўнаць колькасьць выбарцаў пры выбарах у 2001 годзе і ў сакавіку 2003 году. Акурат выканаўчая ўлада перадае сьпісы выбарцаў камісіям. Да таго ж, у мясцовых выбарах маюць права ўдзельнічаць выбарцы з расейскім грамадзянствам, якія стала жывуць на тэрыторыі Беларусі. Пры выбарах прэзыдэнта 2001 г. у сьпісы грамадзян былі ўнесеныя 7 356 343 чалавекі, а ў сьпісы выбарцаў у сакавіку 2003 году трапіла 7 104 428 чалавек, г.зн. выбарцаў, нават разам з расейцамі, стала менш на 251 915 чалавек. Што магло здарыцца? Першае — былі выкрасьленыя «мёртвыя душы». Другое — зьехалі ўсе расейцы. Трэцяе — у сьпісы выбарцаў ня ўносіліся тыя грамадзяне, якія традыцыйна не прыходзілі на выбары. Больш верагодна апошняе. Калі такі выбарца ўсё ж такі здолее прыйсьці на ўчастак для галасаваньня, яго ўнясуць у сьпіс дадаткова. Затое адсотак удзелу выбарцаў у галасаваньні будзе павялічаны. Гэта і ёсьць адным з мэханізмаў павышэньня яўкі, хаця й не адзіным.

Другі мэханізм — закіданьне бюлетэняў. Няважна, за каго яны будуць пададзеныя, ці нават будуць пустыя, несапраўдныя. (Дарэчы, акурат на тых выбарах было вельмі шмат несапраўдных бюлетэняў. Для параўнаньня: на выбарах прэзыдэнта Беларусі ў 2001 годзе несапраўдных бюлетэняў было 138 706, а на выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў — 332 011; трохі менш, чым у 2003 г., такіх бюлетэняў было на выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў 22-га скліканьня. Няўжо выбарцы акурат на мясцовых выбарах так памыляюцца?)

Ці цяжка зрабіць закіданьне бюлетэняў? Тут важна, каб колькасьць бюлетэняў супала з колькасьцю выбарцаў, якія ўзялі ўдзел у галасаваньні. Нават прысутнасьць назіральнікаў не зашкодзіць выканаць яго чыста. У сьпісе заўсёды знойдуцца выбарцы, якія не галасавалі. І сябра камісіі — дасьведчаны, патрыятычна настроены і надзейны — павінен толькі выканаць сваю справу: своечасова паставіць адзнакі аб удзеле такіх выбарцаў у галасаваньні.

Улада цішком атрымала амаль усе месцы ў Радах. Малаверагодна, што выбарцы так добра ведалі «вэртыкальных» кіраўнікоў другога шэрагу (намесьнікаў, кіраўнікоў аддзелаў, профільных мэдыкаў і кіраўнікоў навучальных установаў і г.д.). Напрыклад, бацькі добра могуць ведаць кляснага кіраўніка свайго дзіцяці, могуць добра ведаць сямейнага лекара, але няшмат людзей ведае галоўнага лекара паліклінікі ці яго заступніка. На што разьлічвалі кандыдаты ад улады, калі ў іх нават улётак не было? Тым ня менш якраз за такіх амаль на ўсёй Беларусі выбарцы галасавалі як адзін. Хто іх хоць раз бачыў на свае вочы? Няма чаго казаць і аб ацэнцы іх якасных характарыстык. У выніку, ня кажучы пра пасялковыя і сельскія Рады, мы атрымалі доктарска-настаўніцкія рады з украпленьнем кіраўнікоў выканаўчай улады — ідэальны склад для кіраўніцтва краіны.

## Высновы

Досьвед падрыхтоўкі да выбараў'2003 дазваляе гаварыць аб тым, што паводзіны ўлады адпавядаюць пэўнаму альгарытму, паводле якога былі адпрацаваныя ранейшыя выбарчыя кампаніі і ў які зь цягам часу ўносяцца толькі нязначныя карэктывы. Дзеяньні ўлады на кожнай стадыі падпарадкоўваюцца галоўнай мэце — недапушчэньню посьпеху дэмакратычных палітычных сілаў на выбарах.

Не хацелася б абвінавачваць усіх чальцоў выбарчых камісіяў, а гэта больш за 70 тысяч чалавек, але вынікі выбараў далі падставу сумнявацца ў сумленнасьці прынамсі кіраўніцтва гэтых камісіяў. Таму, калі і ў наступных выбарах пры стварэньні камісіяў будзе ўлічвацца досьвед удзелу ў выбарах, то аб дэмакратычнасьці выбараў можна забыцца. Адзінае выйсьце ў гэтай сытуацыі — дапусьціць у працу камісіяў зацікаўленыя бакі, г.зн. прадстаўнікоў кандыдатаў у дэпутаты і палітычных партыяў. Але на гэта патрэбна палітычная воля ўлады ахвяраваць адміністрацыйным рэсурсам дзеля забесьпячэньня міжнароднага прызнаньня выбараў.

Выбары чарговы раз засьведчылі, што дэмакратычнае разьвіцьцё краіны немагчымае без актыўнага ўдзелу партыяў у электаральных працэсах. Інакш раз за разам будуць фармавацца органы ўлады, легітымнасьць якіх будзе аспрэчвацца міжнароднай супольнасьцю. Адмова ўлады ад такога курсу была б куды больш значнай падзеяй, чымся адхіленьне таго ці іншага партыйнага функцыянэра ад удзелу ў выбарах. У такім выпадку й палітычныя партыі перасталі б удзельнічаць у выбарах толькі для таго, каб іх чарговым разам у сьвеце прызналі недэмакратычнымі.

## ПАДРЫХТОЎКА АПАЗЫЦЫІ ДА МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ

Ува ўмовах адсутнасьці рэальных мэханізмаў узьдзеяньня на ўладу палітычныя партыі падчас выбарчай кампаніі аддавалі перавагу не супольным інтарэсам дэмакратычнага руху, а ўласным унутрыпартыйным. Таму на выбарах яны дзеялі пераважна паасобку, а іх асноўнай мэтай было раскручваньне партыйных брэндаў, узьняцьце сваёй папулярнасьці ды павелічэньне колькасьці прыхільнікаў. Усе палітычныя партыі (у тым ліку і пралукашэнкаўскія) вылучылі 1033 кандыдаты, стадыю рэгістрацыі прайшлі 693 чалавекі[1], а дэпутатамі сталі 257 (гл. таксама артыкул «Падрыхтоўка ўладаў да мясцовых выбараў»). Калі ўлічыць, што частка дэмакратычных прэтэндэнтаў вылучалася шляхам збору подпісаў, а партыйная прыналежнасьць часткі дэпутатаў была чыста намінальная, то рэальнае прадстаўніцтва дэмакратычных сілаў у мясцовых Радах наўрад ці перавысіла дзьве сотні дэпутатаў. Усяго колькасьць дэпутатаў гэтага ўзроўню большая за 24 тысячы, таму доля апазыцыі, меншая за 1%, была мэтаскіравана заніжана.

Стратэгія апазыцыі на дэлегітымізацыю рэжыму Лукашэнкі праз няўдзел у палітычным жыцьці краіны на момант выбараў сябе вычарпала. Паказальна, што выказваньні апазыцыйных палітыкаў пра памылковасьць байкоту мясцовых выбараў 1999 году і парлямэнцкіх выбараў 2000 году перасталі быць прыклёпам для іх абструкцыі ў шэрагах дэмакратычных сілаў. Аднак пра іх мабілізацыю, як падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, гаворка не ішла: не былі створаныя адмысловыя каардынацыйныя цэнтры нацыянальнага маштабу, аналягічныя руху «За новую Беларусь» ці нефармальнаму аб'яднаньню «Рэгіянальная Беларусь»*. Намаганьні каардынаваць дзеяньні ўсяго палітычнага спэктру не спыняліся, але посьпеху ня мелі. Старыя каардынацыйныя цэнтры апазыцыі — КРАПП ды КРДС — выявілі сваю няздатнасьць прыстасавацца да новых патрэбаў дэмакратычнага руху. Новыя структуры, што ствараліся на іх аснове па ініцыятыве АГП (КРЛАПП) і БНФ (блёк «За незалежнасьць»), аказаліся нежыцьцяздольнымі, бо рэальная каардынацыя дзеяньняў апазыцыі падчас выбарчай кампаніі адбывалася ў рэгіёнах па-за гэтымі структурамі.

Першай прыкметай таго, што дэмакратычныя сілы ня будуць каардынаваць сваіх дзеяньняў на выбарах, быў крах ідэі з «Мэмарандумам аб прынцыпах узаемадачыненьняў і каардынацыі дзеяньняў палітычных партыяў у пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў у мясцовыя Рады», прапанаваным экспэртамі КРАПП. Гэтая ініцыятыва не была рэалізаваная дзеля амбіцыяў лідэраў апазыцыйных партыяў (гл. таксама артыкул «Крызыс апазыцыі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году»).

Падчас выбарчай кампаніі дэмакратычныя сілы слаба ўплывалі на грамадзкую думку. Найчасьцей у іх рыторыцы цэнтральнае месца займалі такія глябальныя праблемы, як незалежнасьць, дэмакратыя, падзел уладаў, мясцовае самакіраваньне ды інш., а не надзённыя

[1] БелаПАН. 2001. 5 лютага.

* Рух «За новую Беларусь» быў утвораны 21 траўня 2001 году на ініцыятыву Васіля Лявонава на базе камітэту «Зямля і воля» з удзелам старшыні былой Сялянскай партыі Яўгена Лугіна; «Рэгіянальная Беларусь» — на базе каардынацыйнага камітэту «Гарадзенская ініцыятыва» дзеля ўзгадненьня дзейнасьці грамадзкіх аб'яднаньняў, палітычных партыяў і прафсаюзаў. Падчас выбараў 2001 году «Рэгіянальная Беларусь» вылучыла ўласнага кандыдата ў прэзыдэнты, што прэтэндаваў на ролю адзінага кандыдата ад «шырокай грамадзянскай кааліцыі».

сацыяльна-бытавыя ці экалягічныя клопаты людзей. Калі ўлічыць, што грамадзтва скептычна ставілася да ролі й магчымасьцяў органаў мясцовага самакіраваньня, то пры такой агітацыі партыі маглі разьлічваць пераважна на пратэставае галасаваньне.

## Палітычныя партыі напярэдадні выбараў

БСДП (НГ) у гэты час перажывала пэрыяд унутранай трансфармацыі: яе фракцыя «За адзінства» на чале з Аляксеем Каралём канчаткова парвала зь лідэрам партыі Мікалаем Статкевічам. Супярэчнасьці паміж гэтымі двума дзеячамі пачаліся з пытаньня аб байкоце парлямэнцкіх выбараў: Кароль яго падтрымліваў, а Статкевіч сьпярша не забараняў сваім аднапартыйцам удзельнічаць у мясцовых выбарах'1999, а ў 2000 годзе й сам вылучыўся кандыдатам у дэпутаты ПП НС. Калі партыя Статкевіча была выключаная з КРДС, сацыял-дэмакратаў у ёй прадстаўляў Кароль.

У справе стварэньня сацыял-дэмакратычнай партыі без Статкевіча да Караля далучыліся Павал Знавец, Анатоль Гурыновіч, Міхась Чарняўскі, Тацяна Алесіна. Каб перацягнуць на свой бок лідэраў іншых сацыял-дэмакратычных партыяў, стваральнікі новай партыі плянавалі ўвесьці «інстытут ганаровага старшыні»[2]. Яны імкнуліся ўтварыць левацэнтрысцкі рух, у які б улілася БСДГ Станіслава Шушкевіча ды «Надзея» Валянціны Палевіковай.

2 сьнежня 2001 году прайшоў установчы сход БСДП (НГ) без Статкевіча. На ім новаўтвораная партыя была названая Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыяй (БСДП) і былі створаныя яе кіраўнічыя органы. Найвышэйшым заканадаўчым органам партыі застаўся Зьезд. У падпарадкаваны яму орган партыі — Нацыянальную раду, што павінна зьбірацца не радзей як двойчы на год, — увайшлі прадстаўнікі раённых арганізацыяў, сябры ЦК і ЦРК, а ўзначаліў яе Анатоль Гурыновіч. Старшыня ж ня быў абраны, што сымбалізавала гатовасьць стваральнікаў новай партыі да аб'яднаньня зь іншымі сацыял-дэмакратычнымі партыямі[3]. У адсутнасьць старшыні, паводле статуту партыі, яго паўнамоцтвы выконваў старшыня Нацыянальнай рады, то бок Гурыновіч. Выканаўчая ўлада ў партыі была нададзеная абранаму на зьезьдзе Цэнтральнаму камітэту, старшынём якога стаў Аляксей Кароль.

8 сьнежня 2001 году адбыўся пазачарговы VI зьезд БСДП (НГ) Статкевіча. З зыходам групы Караля яго пазыцыі ўнутры партыі ўмацаваліся. Статкевіча падтрымлівалі партыйныя кіраўнікі сярэдняга ўзроўню. Паводле агучаных ім зьвестак, яшчэ 4 кастрычніка 2001 году на паседжаньні ЦК партыі ў яго падтрымку прагаласавалі 53 чалавекі, супраць — 5, устрымаліся — 6[4]. Страта часткі партыйцаў падштурхнула БСДП (НГ) да актыўнейшага гуртаваньня зь іншымі партыямі ў межах канфэдэрацыі «За сацыяльныя перамены» (утворана 9 ліпеня 2001 году БСДП (НГ) і БПП) ды аднаўленага Сацыял-дэмакратычнага саюзу. У чэрвені 2002-га пасьля чарговага партыйнага зьезду ЦК БСДП (НГ) зацьвердзіў пагадненьне аб каардынацыі падрыхтоўкі й правядзеньня выбарчай кампаніі, прынятае ў рамках канфэдэрацыі паміж БСДП (НГ), ПКБ і БПП, і даручыў рэгіянальным камітэтам партыі супольна зь іншымі яе ўдзельнікамі правесьці кансультацыі з партыямі, што не ўваходзяць у канфэдэрацыю, пра разьмеркаваньне кандыдатаў па акругах. Пры канцы 2002 году да канфэдэрацыі «За сацы-

[2] Белорусская деловая газета. 2001. 29 ноября.

[3] Згода. 2001. 8—15 сьнежня.

[4] Белорусский рынок. 2001. 10 декабря.

яльныя перамены» далучыліся ЛДП Сяргея Гайдукевіча ды жаночая партыя «Надзея» Валянціны Матусевіч, а таксама чатыры галіновыя прафсаюзы (аўтамабільнага й сельскагаспадарчага машынабудаваньня, радыёэлектроннай прамысловасьці, машынабудаўнікоў ды прыладабудаўнікоў, мэталістаў).

Іншым кірункам передвыбарнай актыўнасьці партыі Статкевіча сталася аднаўленьне СДС. Гэты сацыял-дэмакратычны міжпартыйны блёк быў утвораны падчас парлямэнцкага крызысу 1995 году, калі зь першага разу Вярхоўная Рада 13-га скліканьня не была абраная і былі прызначаныя паўторныя выбары. У Вярхоўнай Радзе дэпутаты ад СДС стварылі фракцыю «Саюз працы» колькасьцю ў 18 чалавек. Пасьля рэфэрэндуму 1996 году і роспуску ВР 13-га скліканьня дзейнасьць СДС прыпынілася. Напярэдадні мясцовых выбараў'2003 гатовасьць аднавіць СДС пацьвердзілі БСДП (НГ), БПП ды «Надзея» Валянціны Матусевіч. Адпаведны дакумэнт быў падпісаны іх лідэрамі 28 лістапада 2002 году. Удзельнікі СДС узгаднілі сьпісы кандыдатаў па акругах, склалі супольную праграму й заявілі аб пачатку сумеснай выбарчай кампаніі. 20 сьнежня яны ўтварылі адзіны штаб, які ўзначаліў Мікалай Статкевіч.

24 жніўня 2002 году частка БСДП (НГ), якая адкалолася разам з Аляксеем Каралём, прызначыла зьезд Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, у якую меліся ўвайсьці таксама жаночая партыя «Надзея» Валянціны Палевіковай і БСДГ Станіслава Шушкевіча. Але ў апошні момант Станіслаў Шушкевіч адмовіўся ад аб'яднаньня і прапанаваў Аляксею Каралю й Валянціне Палевіковай самім увайсьці ў ягоную партыю. Як лідэр зарэгістраванай сацыял-дэмакратычнай партыі, Шушкевіч лічыў, што ў яго патэнцыйных хаўрусьнікаў ня будзе іншага выйсьця.

Яшчэ 17 жніўня 2002 году на трэцім надзвычайным зьезьдзе партыі «Надзея» яе старшынёй была абраная Валянціна Матусевіч, якая адначасна на грамадзкіх пачатках выконвала абавязкі прэс-сакратаркі Леаніда Козіка — старшыні Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларускай. Да разьвязаньня Міністэрствам юстыцыі пытаньня аб тым, якая з партыяў «Надзея» ёсьць легітымнай, аб'яднаўчы зьезд ня меў цьвёрдай юрыдычнай базы, і аб'яднаньня БСДП, БСДГ і «Надзеі» паводле заплянаванага сцэнару не адбылося (гл. таксама артыкул «Крызыс апазыцыі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году»). Зьезд пастанавіў зьмяніць назву партыі Аляксея Караля з БСДП (Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя) на АСДП (Аб'яднаная сацыял-дэмакратычная партыя) і прызначыць яе старшынёй Валянціну Палевікову. Старшынём выканкаму быў абраны Аляксей Кароль. Неаднаразовыя спробы зарэгістраваць АСДП не прынесьлі выніку. Міністэрства юстыцыі прызнала неправамоцным аб'яднаўчы зьезд 24 жніўня 2002 году, і ўрэшце партыя Караля й Палевіковай зацікавілася прапановай Шушкевіча ўвайсьці ў БСДГ на ягоных умовах. У студзені 2003 году кіраўніцтвы АСДП і БСДГ пачалі перамовы пра адзіны статут, назву партыі, а таксама пра аб'яднаўчы зьезд, які б зацьвердзіў пастанову незарэгістраванай АСДП увайсьці ў БСДГ. Аднак фармальна на момант выбарчай кампаніі адколатая частка партыі БСДП (НГ) не змагла ні стварыць новай партыі, ні ўвайсьці ў БСДГ, каб вылучыць уласных кандыдатаў ад імя гэтай партыі.

АГП падчас падрыхтоўкі да выбараў рабіла стаўку перадусім на ажваўленьне міжпартыйных узаемадачыненьняў у рамках КРАПП. На яе ініцыятыву на базе гэтай структуры былі распачатыя пэрыядычныя нефармальныя сустрэчы лідэраў партыяў — чальцоў КРАПП з кіраўніцтвам ПКБ і АСДП. Зь сьнежня 2002 году гэтыя нефармальныя сустрэчы адбываліся пад назвай «Кансультацыйная рада лідэраў апазыцыйных палітычных партыяў» (КРЛАПП), на якую выносіліся пераважна пытаньні ўнутрыпалітычнай дзейнасьці дэмакратычных сілаў. 17 сьнежня 2002 году ў яе ўвайшлі Анатоль Лябедзька ад АГП, Станіслаў Шушкевіч ад БСДГ, Леанід Лемяшонак ад Партыі

працы, а таксама Сяргей Калякін ад ПКБ ды Вінцук Вячорка ад БНФ, якія пакінулі КРАПП[5].

Ствараючы КРЛАПП, АГП пераняла ініцыятыву ў БНФ, які кантраляваў дзейнасьць іншай кааліцыйнай структуры апазыцыі — КРДС, што згубіла ролю органу «шырокай грамадзянскай кааліцыі» яшчэ ўвесну 2001 году пасьля страты кантролю над працэсам вылучэньня дэмакратычнага кандыдата на пасаду прэзыдэнта. 7 верасьня 2002 году на паседжаньні Сойму БНФ было пастаноўлена стварыць на базе КРДС грамадзка-палітычны блёк «За незалежнасьць без дыктатуры». Бальшыня ўдзельнікаў КРДС пагадзілася з гэтай ідэяй. Толькі АГП не сьпяшалася вызначыцца, бо не падзяляла катэгарычнага асуджэньня ініцыятара блёку якіх-любя хаўрусаў з Расеяй і якіх-любя перамоваў з расейскімі палітычнымі сіламі. У выніку найбольш значнымі сіламі ў блёку засталіся Партыя БНФ Вінцука Вячоркі ды незарэгістраваная АСДП Аляксея Караля. Зь цягам часу дадатак «без дыктатуры» ў назьве блёку адпаў, і ён стаў называцца папросту «За незалежнасьць».

1 сьнежня 2002 году адбыўся пазачарговы зьезд Партыі БНФ і БНФ «Адраджэньне», на якім упершыню з 1993 году была прынятая новая праграма. У праекце, падрыхтаваным Вінцуком Вячоркам, ставілася мэта дабіцца ўваходу Беларусі ў NATO і Эўрапейскі Зьвяз, а таксама прадугледжвалася ўвядзеньне ў Беларусі парлямэнцкай рэспублікі зь пераважна прадстаўнічай роляй прэзыдэнта. Альтэрнатыўная праграма намесьніка старшыні партыі Паўла Севярынца, згодна зь якой меркавалася ператварыць партыю ў масавы рух супраціву, была адхіленая (гл. таксама артыкул «Крызыс апазыцыі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году»).

Што да ўзаемадачыненьняў Партыі БНФ з КРАПП, то яны былі разарваныя 14 сьнежня 2002 году пастановай чарговага Сойму партыі. Паводле Вінцука Вячоркі, «КРАПП, на жаль, ператварылася ў поле для інтрыгаў, канфліктаў і падседжваньняў, перадусім з боку некаторых партыяў сацыял-дэмакратычнай часткі спэктру»[6].

КХП-БНФ Зянона Пазьняка напярэдадні выбараў па-ранейшаму ня ўдзельнічала ні ў якіх кааліцыйных структурах і трымалася тактыкі байкоту. 14 сьнежня 2002 году яна прыняла зварот да беларускай ды міжнароднай супольнасьці з заклікам байкатаваць мясцовыя выбары, бо іх вынікі будуць абавязкова сфальсыфікаваныя. Як адзначалася ў звароце, «рэжымам створаная такая сыстэма кантролю й фальсыфікацыі выбараў, што пры любым галасаваньні, пры любых выбарах рэжым заўсёды забясьпечвае неабходны яму вынік»[7].

З усяго дэмакратычнага руху толькі ўдзельнікі СДС намагаліся навязаць дыялёг з выбарчымі камісіямі, у прыватнасьці, яны заклікалі іх чальцоў не парушаць выбарчага заканадаўства. Плён ад гэтага быў сумнеўны, бо падчас рэгістрацыі ў дэпутаты кандыдатам ад БСДП (НГ) масава адмаўлялі з цалкам надуманых прычынаў.

## Лякальныя кааліцыі ды ініцыятывы падчас выбарчай кампаніі

Нягледзячы на нежаданьне цэнтральных партыйных органаў выконваць «Мэмарандум» аб узгадненьні дзеяньняў напярэдадні выбараў, ён часткова быў зрэалізаваны ў рэгіёнах.

[5] Белорусская деловая газета. 2002. 18 декабря.

[6] Згода. 2002. 20–27 сьнежня.

[7] БелаПАН. 2002. 17 сьнежня.

У Берасьці была ўтвораная кааліцыя паміж АГП, Партыяй БНФ і БСДП (НГ), якая кантралявала вылучэньне дэмакратычных кандыдатаў у акругах. У Горадні з гэтай мэтай быў утвораны рух дэмакратычных сілаў «Гарадзенскі выбар», які аб'яднаў гарадзенскія філіі БНФ, АГП, АСДП, фонду Лява Сапегі і іншых арганізацыяў. 9 сьнежня 2002 году ў Віцебску з той самай мэтай быў створаны Камітэт грамадзкага дзеяньня «Віцебск», у межах якога згуртаваліся мясцовыя структуры 15-ці грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў, у тым ліку мясцовыя арганізацыі АСДП, АГП, БСДП (НГ). Кааліцыі, утвораныя пад выбары, паўсталі таксама ў Жодзіне («Наш выбар»), Барысаве («Дэмакратычны Барысаў»), Полацку, Бабруйску, Рагачове ды інш. У іх межах ажыцьцяўляліся супольны збор подпісаў, правядзеньне агітацыйных кампаніяў ды назіраньня.

У тых акругах, дзе не ўдалося зарэгістраваць аніводнага дэмакратычнага кандыдата і выбары праходзілі безальтэрнатыўна, дэмакратычныя сілы часам выкарыстоўвалі тактыку лякальнага байкоту. У тых жа акругах, дзе супраць дэмакратычных кандыдатаў выкарыстоўваўся грубы адміністрацыйны ўціск, а спробы абскардзіць афіцыйныя вынікі заставаліся беспасьпяховымі, яны дамагаліся паўторных выбараў. Напрыклад, у Наваполацку пасьля таго, як камуністы-калякінцы былі недапушчаныя ў гарадзкую выбарчую камісію, дарма што адпаведныя дакумэнты былі пададзеныя імі ў гарвыканкам за тры тыдні да яе сфармаваньня, гарадзкі камітэт ПКБ заклікаў байкатаваць выбары.

Нярэдка дэмакратычныя сілы абмяжоўваліся ўльтыматумамі ўладам. Так, 20 лютага кіраўнікі рэгіянальных філіяў трох палітычных партыяў — Берасьцейскага абкаму ПКБ, Берасьцейскай гарадзкой арганізацыі БСДП (НГ) ды гарадзкой арганізацыі Партыі БНФ — пагражалі адклікаць сваіх кандыдатаў, зарэгістраваных Берасьцейскай абласной ды гарадзкой выбарчымі камісіямі, у выпадку далейшага парушэньня законных правоў выбарцаў і палітычных партыяў, у прыватнасьці, недапушчэньня ў склад участковых камісіяў прадстаўнікоў ад гэтых партыяў[8].

## Палітычны рух моладзі напярэдадні выбараў

16 чэрвеня 2002 году адбыўся IV сойм «Маладога Фронту», на якім было пастаноўлена ўдзельнічаць у мясцовых выбарах. Пасьля перавыбараў старшынём МФ застаўся Павал Севярынец, якога падтрымалі 89 дэлегатаў, хаця гэтым разам у яго зьявіўся моцны супернік з Горадні — Вадзім Саранчукоў, за якога прагаласаваў 71 дэлегат. Пасьля абвешчаньня вынікаў новаабраны лідэр прапанаваў канкурэнту пасаду свайго намесьніка, але той адмовіўся.

Сацыял-дэмакратычную моладзь на гэтых выбарах прадстаўлялі дзьве арганізацыі: паўсталая ў 1994 годзе «Маладая Грамада» і ўзьніклыя ў 1999 годзе «Маладыя сацыял-дэмакраты», ачоленыя Марынай Азаронак. Будучы ўтворанымі пры апецы Мікалая Статкевіча, «Маладыя сацыял-дэмакраты» ў сваёй палітычнай дзейнасьці захоўвалі ляяльнасьць да БСДП (НГ). Праўда, іх удзел у выбарах быў ускладнены адсутнасьцю рэгістрацыі, хаця адпаведныя дакумэнты ў Мінюст падаваліся. Каб удзельнічаць у выбарах, сябрам арганізацыі давялося альбо зьбіраць подпісы, альбо вылучацца ад мясцовых суполак БСДП (НГ).

[8] БелаПАН. 2003. 20 лютага.

Другая сацыял-дэмакратычная маладзёвая арганізацыя — «Маладая Грамада» — захоўвала ляяльнасьць да незарэгістраванай АСДП Аляксея Караля. На яе зьезьдзе 17 лютага 2002 году было пастаноўлена абмежаваць кантакты з БСДП (НГ), а таксама ўдзельнічаць у выбарах.

Маладзёвая арганізацыя АГП «Грамадзянскі форум» вылучыла на выбары каля 15 чалавек у Менску, Горадні, Берасьці і Берасьцейскай вобласьці, Магілёве. Палітычную актыўнасьць падчас выбараў праяўляла яшчэ адна маладзёвая арганізацыя, прыхільная АГП — «Маладзёвы хрысьціянска-сацыяльны саюз».

Найвялікшую актыўнасьць сярод дэмакратычных маладзёвых арганізацыяў выявіў «Малады Фронт», вылучыўшы 35 кандыдатаў.

## Вылучэньне й рэгістрацыя кандыдатаў

Рэгістрацыя кандыдатаў адбывалася з 22 па 26 сьнежня 2002 году. Ад ПКБ меліся вылучыцца каля 500 кандыдатаў, але дакумэнты на рэгістрацыю падалі 363 асобы. З сацыял-дэмакратаў найбольшую колькасьць кандыдатаў вылучыла БСДП (НГ) — больш як 300 кандыдатаў у адны толькі раённыя й гарадзкія Рады, то бок без уліку сельскіх Радаў. Ад БПП на выбары, па словах яе лідэра Аляксандра Бухвостава, ішло 40 чалавек, ад «Надзеі», паводле словаў Валянціны Матусевіч, — 15[9]. 14 студзеня 2003 году блёк СДС таксама зацьвердзіў тэзысы перадвыбарнай праграмы сваіх кандыдатаў. Ад АСДП было вылучана 79 кандыдатаў на выбарах, зь іх 54 прайшлі рэгістрацыю. АГП першапачаткова мелася вылучыць каля 400, але ўрэшце дакумэнты падаў 201 кандыдат. Паводле Аляксандра Дабравольскага, «зь іх чалавек 20 — ня сябры партыі, але гэта нашыя людзі»[10]. Каля 80 кандыдатаў ад АГП не прайшлі рэгістрацыі. На зьезьдзе Партыі БНФ і БНФ «Адраджэньне», адбытым 1 сьнежня 2002 году, плянавалася вылучыць 190 кандыдатаў, але калі справа дайшла да рэгістрацыі, то дакумэнты падалі каля 120 чалавек (само кіраўніцтва партыі давала іншыя лічбы).

Падчас рэгістрацыі партыйныя кандыдаты зазналі асаблівы ўціск з боку Цэнтральнага і мясцовых выбаркамаў. Пры тым, што ўсяго па краіне ў рэгістрацыі адмовілі 2,9% прэтэндэнтам, 45% зь іх склалі прадстаўнікі палітычных партыяў, што склала 4% ад агульнай колькасьці прэтэндэнтаў на рэгістрацыю.

Партыйныя кандыдаты пераважна ня мелі ілюзіяў наконт таго, як будзе адбывацца рэгістрацыя, таму нярэдка вылучаліся не ад мясцовых партыйных суполак (зь іх рэгістрацыяй, сваёй чаргой, у партыяў таксама былі праблемы), а шляхам збору подпісаў, пагатоў, што іх колькасьць, неабходная для рэгістрацыі, была даволі невялікай. Паводле арт. 65 Выбарчага Кодэксу, для вылучэньня ў Менскую гарадзкую ды абласную Раду трэба было набраць ня менш за 150 подпісаў; у раённую ды гарадзкую Раду ў гарадох абласнога падпарадкаваньня — ня менш за 75; у гарадзкую ў гарадох раённага падпарадкаваньня, пасялковую ды сельскую Рады — ня меней за 20 подпісаў выбарцаў, якія жывуць на тэрыторыі дадзенай акругі. Але ці дапамагло партыйным кандыдатам хаваньне сваёй партыйнай прыналежнасьці на гэтых выбарах — пытаньне спрэчнае, бо на іх для выбаркамаў апазыцыяй былі ўсе, хто ня быў

[9] Згода. 2002. 6—13 сьнежня.

[10] Згода. 2003. 31 студзеня — 7 лютага.

вылучэнцам ад улады (інакш у артыкуле «Падрыхтоўка ўладаў да мясцовых выбараў»).

У Менску дэмакратычныя сілы зь цяжкасьцю ўзгаднялі акругі паміжсобку. На пачатку кастрычніка 2002 году падчас сустрэчы кіраўнікоў менскіх суполак партыяў, што ўваходзяць у КРАПП, высьветлілася, што без уліку ЛДП на 52 месцы ў Менскую гарадзкую раду прэтэндуюць больш за 80 дэмакратычных кандыдатаў: 26 ад АГП, 40 ад БНФ, 16 ад БСДП (НГ)[11]. У выніку адмоваў у рэгістрацыі ды масавых фальсыфікацыяў падчас выбараў у Менскую гарадзкую Раду не прайшло аніводнага дэмакратычнага кандыдата. Даўжэй за ўсіх у передвыбарнай гонцы пратрымаўся сябра АГП Ігар Шынкарык, адзіны дэмакратычны кандыдат у Менскую гарадзкую Раду, які выйшаў у другі тур.

## Праўныя ўмовы выбараў

Нягледзячы на працу, праведзеную дэмакратычнымі сіламі, у прыватнасьці, на разробленыя экспэртамі КРАПП прапановы ўдасканаленьня выбарчага заканадаўства, праўныя ўмовы выбараў не палепшыліся. Гэтыя прапановы былі збольшага праігнараваныя ўладамі, якія наўмысна зацягвалі іх абмеркаваньне. Хаця яны былі падрыхтаваныя й прынятыя КРАПП яшчэ ўлетку 2002 году, іх шырокае абмеркаваньне з удзелам афіцыйных прадстаўнікоў пачалося толькі ў кастрычніку, калі ЦВК ужо выпрацавала ўласныя рэкамэндацыі для тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбаркамаў ды распрацавала праекты адпаведнай дакумэнтацыі для правядзеньня выбараў.

З свайго боку, ЦВК зрабіла ўсё, каб ня даць дэмакратычным кандыдатам на роўных спаборнічаць на выбарах з лукашэнкаўскімі стаўленікамі. Выбарчыя камісіі не давалі кандыдатам тлумачэньняў аб парадку рэгістрацыі. Работнікі ЦВК у сваіх публічных выступах ачарнялі імідж палітычных партыяў. Так, 23 сьнежня 2002 году на сэмінары-нарадзе з арганізацыйна-праўных пытаньняў працы выбарчых камісіяў у Гомелі Лідзія Ярмошына заявіла, што партыйныя статуты не адпавядаюць Выбарчаму Кодэксу[12]. Супярэчнасьці паміж партыйнымі статутамі й патрабаваньнямі выбарчага заканадаўства былі, але ўзьніклі яны не зь віны партыяў. Тэксты іх тагачасных статутаў былі зацьверджаныя падчас перарэгістрацыі, абвешчанай прэзыдэнцкім дэкрэтам у 1999 годзе, за год да парлямэнцкіх выбараў, тым часам як Выбарчы Кодэкс быў прыняты пасьля іх. У тым самым Гомелі Л. Ярмошына заявіла, што «кялейнасьць» вылучэньня партыйных кандыдатаў сьведчыць пра недасканаласьць выбарчага працэсу ў Беларусі. Між тым працэдура вылучэньня кандыдатаў вызначалася не партыямі, а пастановай ЦВК ад 16 сьнежня 2002 году № 34. У адпаведнасьці зь ёй, тым кандыдатам, якія вылучаліся агульнымі сходамі мясцовых філіяў партыяў, адмаўлялі ў рэгістрацыі за парушэньне парадку вылучэньня кандыдатаў. Пра ўдзел партыяў у выбарчай кампаніі старшыня ЦВК выказвалася як пра непазьбежнае зло: «Абмежаваньне партыйных інтарэсаў ёсьць рэклямай для прапаганды партыі»[13].

Хаця ад тактыкі байкоту апазыцыя адмовілася, гэтае рашэньне не было наступствам паляпшэньня ўмоваў яе палітычнай дзейнасьці. Да таго ж, як адзначыў палітоляг Валер Карбалевіч[14],

[11] Белорусская деловая газета. 2002. 22 октября.

[12] БелаПАН. 2002. 23 сьнежня.

[13] Тамсама.

[14] БелаПАН. 2003. 5 сакавіка.

у апазыцыі не было стратэгіі рэагаваньня на грубыя парушэньні закону з боку рэжыму, адсутнічала разуменьне месца й ролі гэтых выбараў у барацьбе за ўладу. Між тым заваяваць сымпатыі выбарцаў на гэтых выбарах дэмакратычным сілам было лягчэй, чымся на прэзыдэнцкіх, бо на іх улагоджаньне лукашэнкаўцы ня кінулі столькі рэсурсаў і ня ладзілі буйных інфармацыйных кампаніяў. Што да матываў, якімі кіраваліся выбарцы на мясцовых выбарах, то, паводле вынікаў апытаньня, праведзенага НІСЭПД на другі-чацьвёрты дні пасьля выбараў, яны былі даволі рацыянальныя, перш за ўсё людзі цікавіліся праграмамі кандыдатаў і іх папярэднімі справамі. Гл. табліцу 1.

**Табліца 1.** Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі Вы бралі ўдзел у галасаваньні, то чым кіраваліся пры выбары свайго кандыдата?», %

| | г. Менск | | Менская вобласьць | |
|---|---|---|---|---|
| | ад 16 год | ад 18 год | ад 16 год | ад 18 год |
| Праграмай кандыдата | 46 | 46 | 33 | 32 |
| Папярэднімі справамі кандыдата | 20 | 20 | 22 | 23 |
| Асабістымі якасьцямі кандыдата | 23 | 23 | 29 | 29 |
| Парадай сяброў, знаёмых | 9 | 9 | 5 | 5 |
| Вынікамі перадвыбарнай агітацыі | 5 | 5 | 8 | 8 |
| Іншае | 12 | 13 | 7 | 7 |

Крыніца: НІСЭПД.

Дэмаралізаванасьць апазыцыі падчас выбарчай кампаніі выразілася ў шэрагу капітулянцкіх заяваў, прынятых задоўга да галасаваньня. 1 лютага 2003 году Палітычная рада АГП прыняла заяву, што «абраныя органы мясцовай улады ня будуць мець належнай легітымнасьці»[15]. У адказ на адміністрацыйны ціск на сваіх кандыдатаў, 27 лютага АГП прыняла яшчэ адну заяву, што выбары «не адпавядаюць міжнародным стандартам»[16]. 12 лютага 2003 году лідэр БНФ Вінцук Вячорка заклікаў міжнародную супольнасьць не прызнаваць мясцовых выбараў свабоднымі й справядлівымі. Паводле яго словаў, з 201 вылучанага прадстаўніка партыі кандыдатамі сталі 112, 40 чальцоў партыі не прайшлі рэгістрацыю, а 49 самі зьнялі свае кандыдатуры, паддаўшыся на ўціск на працы[17]. Удзельнікі канфэдэрацыі «За сацыяльныя перамены», за выняткам ПКБ, выступілі 19 лютага з заявай «Аб недэмакратычнасьці выбараў у мясцовыя Рады», у якой было выказанае абурэньне недапушчэньнем амаль усіх яе прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, а таксама адмовай зарэгістраваць ад 30 да 40% дэмакратычных кандыдатаў[18].

## Высновы

Мясцовыя выбары паказалі, што такія арганізацыі, як Беларуская патрыятычная партыя, Партыя народнай згоды, Аграрная партыя ці Сацыяльна-спартовая партыя, пры статусе палітычных партыяў паводле сваёй ролі ў палітычным жыцьці збліжаюцца з групамі інтарэсаў,

[15] БелаПАН. 2003. 2 лютага.
[16] БелаПАН. 2003. 27 лютага.
[17] БелаПАН. 2003. 12 лютага.
[18] Белорусский рынок. 2003. 24 февраля.

што фармуюцца вакол тых ці іншых плыняў разьмеркаваньня дзяржаўных рэсурсаў. Удзел у публічнай палітыцы не асноўны кірунак іх дзейнасьці. Што да ляяльных уладам грамадзкіх аб'яднаньняў, прадстаўнікі якіх былі ўлучаныя ў выбарчыя камісіі, то на палітычнай сцэне яны адыгрываюць ролю, аналягічную той, што выконвалі інсьпіраваныя дзяржавай грамадзкія арганізацыі ў Савецкім Саюзе.

Усім палітычным сілам, якія страцілі сувязь з выбарцамі й досьвед узаемадзеяньня з уладай падчас байкотаў, цяжка было разьлічваць на беззасьцярожную перамогу. Але сваю праграму-мінімум, — вяртаньне ў т.зв. сыстэмную палітыку, што прадугледжвае нейкае ўзаемадзеяньне з органамі дзяржаўнай улады, дэмакратычныя сілы ўсё ж выканалі, не зважаючы на масавыя фальсыфікацыі й падтасоўкі. Што ж да ўзаемадзеяньня з грамадзтвам на лякальным узроўні, то тут далёка ня ўсё так гладка.

Якімі б ні былі сьціплыя здабыткі дэмакратычных сілаў і абмежаваныя самі паўнамоцтвы дэпутатаў мясцовых Радаў, гэтая выбарчая кампанія дала вялікі досьвед, які павінен быць скарыстаны.

Атрымала разьвіцьцё адна з ідэяў, выказаных у непадпісаным «Мэмарандуме аб прынцыпах узаемадачыненьняў і каардынацыі дзеяньняў палітычных партыяў у пэрыяд падрыхтоўкі і правядзеньня выбараў у мясцовыя Рады». Партыя БНФ выступіла з ініцыятывай стварэньня Канвэнту дэмакратычных дэпутатаў мясцовых Радаў, г.зн. аб'яднаньня т.зв. «легітымна абраных» дэпутатаў ад дэмакратычнай апазыцыі. Пры адсутнасьці эфэктыўных каардынацыйных цэнтраў дэмакратычных сілаў такая ініцыятыва мела свой палітычны сэнс. Сьпярша ініцыятары стварэньня Канвэнту спадзяюцца наладзіць інфармацыйны абмен паміж дэмакратычнымі дэпутатамі, каб пасьля зь іх удзелам утварыць шырэйшую міжпартыйную кааліцыю і ўключыць яе ў супрацоўніцтва на міжнародным узроўні.

# ХОД І ВЫНІКІ МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ 2003 Г.

## Агульныя ўмовы правядзеньня выбараў

У 2003 г. выбары ладзіліся за новым Выбарчым Кодэксам, прынятым у 2000 годзе. Колькасьць выбарцаў у краіне склала 7 104 428 чалавек. Права стаць дэпутатам атрымалі асуджаныя па адміністрацыйных правапарушэньнях (гэта перадусім датычыла дэмакратычных лідэраў, асуджаных за ўдзел у масавых акцыях пратэсту), а права галасаваць атрымалі арыштаваныя, якіх на момант выбараў было больш за тысячу. Кандыдаты, з свайго боку, атрымалі права пры дазволе ад Камітэту па выкананьні пакараньняў наведаць такіх выбарцаў і праводзіць сярод іх агітацыю. У выбарах узялі ўдзел каля 70 тысяч грамадзян Расеі, якія стала жывуць у Беларусі (у Віцебскай і Гомельскай абласьцях такіх было 11 787 і 11 746 адпаведна, на Гарадзеншчыне — 4708, на Магілёўшчыне — 7825, на Меншчыне — 8300, а ў Мен-

ску — 8632)[1]. Грамадзянам Расеі, што стала жывуць у Беларусі, дадзена было таксама права вылучаць кандыдатаў. Скараціўся час галасаваньня: з 7.00 — 21.00 да 8.00 — 20.00. На выбарах па мажарытарнай сыстэме меліся быць абраныя 24 012 дэпутаты Радаў усіх узроўняў за два туры, 2 і 16 сакавіка 2003 году. Паводле разьлікаў ЦВК, выдаткі на мясцовыя выбары 2003 году склалі каля 10,5 мільярдаў беларускіх рублёў.

Згодна з выбарчым заканадаўствам, выбары (першы тур) прызнаюцца сапраўднымі, калі ў галасаваньні ўзяло ўдзел больш за 50% выбарцаў акругі, улучаных у сьпісы грамадзян з правам голасу. Абраным у першым туры выбараў лічыцца кандыдат у дэпутаты, які атрымаў больш за палову галасоў выбарцаў, якія ўзялі ўдзел у галасаваньні. Калі ніводзін з кандыдатаў у дэпутаты не набраў неабходнай колькасьці галасоў, то адбываецца другі тур галасаваньня з двума кандыдатамі, што атрымалі найбольшую колькасьць галасоў. Калі адзін з кандыдатаў, улучаны ў бюлетэнь, у другім туры галасаваньня здымае сваю кандыдатуру, другі тур галасаваньня праводзіцца па адной кандыдатуры. Пры гэтым кандыдат лічыцца абраным, калі ён атрымаў больш за палову галасоў выбарцаў, што прагаласавалі. Выбары ў другім туры лічацца сапраўднымі, калі ў галасаваньні ўзялі ўдзел больш за 25% выбарцаў.

У адпаведнасьці з каляндарным плянам, зацьверджаным Цэнтравыбаркамам*, да 6 сьнежня 2002 году былі сфармаваныя тэрытарыяльныя, а да 16 сьнежня — 17 409 акруговых выбарчых камісіяў. Участкі для галасаваньня былі ўтвораныя да 31 сьнежня 2002 году, а ўчастковыя выбарчыя камісіі — да 15 студзеня 2003 году.

## Вылучэньне чальцоў выбарчых камісіяў

Чальцы выбарчых камісіяў маюць магчымасьць кантраляваць выбарчы працэс на сваім участку. Паводле артыкула 40 Выбарчага Кодэксу, да паўнамоцтваў тэрытарыяльных выбарчых камісіяў належаць утварэньне выбарчых акругаў, рэгістрацыя ініцыятыўных групаў для збору подпісаў за патэнцыйных кандыдатаў, судзеяньне ў іх вылучэньні, рэгістрацыя кандыдатаў і іх davераных асобаў, арганізацыя сустрэчаў кандыдатаў з выбарцамі й нават судзеяньне ў падрыхтоўцы плякатаў зь біяграфічнымі дадзенымі й перадвыбарнымі праграмамі кандыдатаў. За дзяржаўны кошт камісіі выдаюць супольны плякат, на якім зьмяшчаецца інфармацыя пра кожнага з кандыдатаў па адпаведнай акрузе. Па адным чальцу ў кожную акруговую, участковую камісію могуць вылучаць палітычныя партыі, грамадзкія аб’яднаньні, працоўныя калектывы арганізацыяў альбо іх структурных падразьдзяленьняў зь ліку сваіх чальцоў. У гэтыя камісіі таксама могуць вылучацца грамадзяне шляхам падачы заяваў. У апошнім выпадку ў залежнасьці ад узроўню камісіі для гэтага патрабуецца 10 альбо 30 подпісаў. Склад выбарчай камісіі вызначаецца супольнай пастановай прэзыдыюму адпаведнай мясцовай Рады й яе выканкаму, якая прымаецца бальшынёй галасоў пры кворуме ў дзьве трэціны ад складу. Органы, што ўтвараюць выбаркамы, могуць уключаць у іх склад сваіх прадстаўнікоў.

[1] Советская Белоруссия. 2002. 6 декабря.

* Гэты і іншыя дакумэнты ЦВК апублікаваныя ў кнізе: Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь 24 склікання. Факты і каментарыі. Менск: Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2003. — Рэд.

Гэтае правіла абумовіла мізэрную прысутнасьць палітычных партыяў у тэрытарыяльных выбарчых камісіях: поўная залежнасьць выбарчых камісіяў ад выканаўчай вэртыкалі рабіла ўваходжаньне партыйных прадстаўнікоў у іх склад малаверагодным. З усіх партыяў найбольш пасьпяховымі былі пралукашэнкаўскія ЛДП ды КПБ. Так, у 60 акруговых камісіяў, склад якіх быў зацьверджаны Менаблвыканкамам, увайшлі 637 чалавек, сярод якіх 20 партыйцаў: 8 ад ЛДП і 12 ад КПБ[2]. У Магілёўскай вобласьці ў склад камісіяў агульнай колькасьцю ў 1982 чалавекі былі ўключаныя ўсяго 3 прадстаўнікі ад палітычных партыяў і 27 ад грамадзкіх аб'яднаньняў: у прыватнасьці, прадстаўнік ЛДП патрапіў у аблвыбаркам, прадстаўнік ПКБ у Магілёўскі гарвыбаркам, а прадстаўнік КПБ — у Краснапольскую раённую камісію[3]. У Віцебскі абласны выбаркам, які складаўся з 13 чалавек, патрапілі 6 прадстаўнікоў палітычных партыяў (толькі ад пралукашэнкаўскіх КПБ ды ЛДП) і грамадзкіх арганізацыяў[4]. У 60 акруговых камісіях Віцебскай вобласьці пры агульным складзе 718 чалавек былі толькі 43 прадстаўнікі партыяў: 20 ад ЛДП, 12 ад КПБ, 6 ад Беларускай патрыятычнай партыі, 5 ад ПКБ. У 296 тэрытарыяльных выбаркамах Віцебскай вобласьці з агульнай колькасьцю 2295 чалавек было толькі 16 прадстаўнікоў палітычных партыяў — КПБ, ПКБ, ЛДП, БСДП (НГ) і Аграрнай партыі[5]. У Берасьцейскім аблвыбаркаме была прадстаўлена адно КПБ. Усяго ад палітычных партыяў у склад тэрытарыяльных выбарчых камісіяў увайшоў 61 чалавек, што складае менш за 0,5% ад іх агульнага колькаснага складу. Сакратар ЦВК М. Лазавік тлумачыў такое мізэрнае прадстаўніцтва партыяў адсутнасьцю ў іх разьвітых партыйных структураў у рэгіёнах[6]. Але насамрэч яно тлумачылася тым, што выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў былі сфармаваныя за прынцыпам ляяльнасьці да ўлады. Прысутнасьць у іх складзе дэмакратычнай апазыцыі была ня правілам, а выняткам.

Пра сваволю выканаўчай вэртыкалі пры фармаваньні камісіяў сьведчаць між іншым дзеяньні кіраўнікоў выканкаму й прэзыдыюму Жодзінскай гарадзкой Рады падчас стварэньня й зацьверджаньня гарадзкой выбарчай камісіі. 5 сьнежня 2002 году ў пачатку супольнага паседжаньня гэтых органаў старшыня выканкаму Валеры Кашэўскі зачытаў сьпіс кандыдатаў гарвыканкаму, не назваўшы прозьвішчаў трох прадстаўнікоў ад мясцовых філіяў Партыі БНФ, грамадзкага руху БНФ «Адраджэньне» й Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Чальцы выканкаму прагаласавалі за ўвесь сьпіс. Прысутныя на паседжаньні назіральнікі ад дэмакратычных сілаў Аляксандар Валчанін і Анатоль Суйкоў дамагліся таго, каб паўтарыць працэдуру зацьверджаньня з улікам прозьвішчаў усіх прэтэндэнтаў. Аднак гэта не зьмяніла вынікаў галасаваньня, бо ўсе трынаццаць чальцоў выбарчай камісіі нібыта былі ўжо абраныя. Тады Аляксандар Валчанін і Аляксей Лапіцкі ад перадвыбарнага блёку «Наш выбар» накіравалі адпаведныя звароты ў ЦВК. У адказ старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына заявіла, што Жодзінскі выканкам дзейнічаў у рамках існага заканадаўства, а саміх аўтараў абвінаваціла ў спробе «ператварыць шараговую сытуацыю ў палітычны скандал»[7].

[2] БелаПАН. 2002. 18 сьнежня.
[3] БелаПАН. 2002. 10 сьнежня.
[4] БелаПАН. 2002. 6 сьнежня.
[5] БелаПАН. 2002. 11 сьнежня.
[6] БелаПАН. 2002. 10 сьнежня.
[7] БелаПАН. 2003. 7 студзеня.

## Умовы й вынікі рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты

Паводле каляндарнага пляну, зацьверджанага Цэнтравыбаркамам, рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Радаў адбывалася з 21 па 30 студзеня 2003 году. На 24 012 дэпутацкіх месцаў прэтэндавалі 26 567 кандыдатаў. Адным з найцяжэйшых бар'ераў для кандыдатаў на стадыі рэгістрацыі стала запаўненьне дэкларацыяў аб даходах і маёмасьці, уведзеных пастановай ЦВК 16 сьнежня 2002 году[8]. На гэтых выбарах дэкларацыі былі ўведзеныя ўпершыню. Іх няправільнае запаўненьне павыбівала шмат кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі. Напрыклад, Зьмітру Лупачу і Юлі Буцы ад БСДП (НГ), што вылучаліся ў Глыбоцкую раённую Раду[9], адмовілі ў рэгістрацыі таму, што яны забыліся пазначыць у дэкларацыі даход ад продажу свойскай жывёлы. Алегу Воўчаку было адмоўлена ў рэгістрацыі, бо ён ня меў заробку ў грамадзкім аб'яднаньні «Праўная дапамога насельніцтву». У тлумачэньні Міністэрства працы й сацыяльнай абароны наконт гэтага выпадку гаварылася, што пры адсутнасьці заробку нельга казаць аб месцы працы.

Частай падставай для адмовы партыйным кандыдатам у рэгістрацыі стала патрабаваньне наяўнасьці зарэгістраваных нізавых структураў. Партыйных кандыдатаў маглі вылучаць толькі зарэгістраваныя кіраўнічыя органы абласных тэрытарыяльных структураў палітычных партыяў пры наяўнасьці падпарадкаваных ім структураў у выбарчай акрузе. Калі партыйная структура ніжэйшага ўзроўню створана ў адным раёне, а зарэгістравана альбо пастаўлена на ўлік у іншым, то кіраўнічыя органы партыі маглі вылучыць кандыдата толькі па адной з акругаў раёну, дзе была створана арганізацыйная структура[10]. Напрыклад, Полацкі гарадзкі выбаркам адмовіў старшыню Полацкай гарадзкой арганізацыі АГП Генадзю Воранаву ў рэгістрацыі таму, што яго вылучаў не кіраўнічы орган, а агульны сход гарадзкой арганізацыі. Між тым, паводле статуту АГП, рэгістрацыя ці пастаноўка кіраўнічых органаў на ўлік у мясцовых выканкамах ня ёсьць абавязкам мясцовых арганізацыяў АГП.

Цяжкасьці з вылучэньнем сваіх кандыдатаў нізавымі партыйнымі суполкамі вымушалі партыйных актывістаў зьбіраць подпісы. З гэтай прычыны дадзеныя ЦВК наконт колькасьці прадстаўнікоў партыяў у мясцовых Радах 24-га скліканьня не адпавядаюць сапраўднасьці. Напрыклад, 117 кандыдатаў ад БСДП (НГ) вылучаліся шляхам збору подпісаў, зь якіх былі зарэгістраваныя 83. Прыкладна з такім самым посьпехам зарэгістраваліся тыя кандыдаты ад БСДП (НГ), што вылучыліся ад партыйных структураў: вылучана 103, зарэгістравана 69[11]. Што да незарэгістраванай АСДГ, то ад яе ўсе кандыдаты вылучаліся шляхам збору подпісаў. Найбольшую колькасьць кандыдатаў вылучыла, згубіла й зарэгістравала ЛДП (не прайшлі рэгістра-

---

[8] Пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў ад 16 сьнежня 2002 году № 36 «Аб высьненьні ўжываньня палажэньняў Выбарчага Кодэксу Рэспублікі Беларусі, што прадугледжвае паданьне дэкларацыі аб даходах і маёмасьці асобаў, вылучаных кандыдатамі ў дэпутаты абласных, Менскай гарадзкой, раённых, гарадзкіх (гарадоў абласнога падпарадкаваньня) Радаў дэпутатаў».

[9] Наша Ніва. 2003. 28 лютага.

[10] Пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў ад 16 сьнежня 2002 году № 34 «Аб высьненьні ўжываньня палажэньняў часткі другой арт. 62 Выбарчага Кодэксу Рэспублікі Беларусі, што прадугледжваюць вылучэньне палітычнымі партыямі кандыдатаў у дэпутаты абласных, Менскай гарадзкой, раённых, гарадзкіх (гарадоў абласнога падпарадкаваньня) Радаў дэпутатаў».

[11] БелаПАН. 2003. 6 лютага.

цыі 145 з 329 партыйных кандыдатаў). У Гарадзенскай абласной Радзе на 60 месцаў пасьля рэгістрацыі прэтэндавалі 73 кандыдаты, сярод якіх палітычныя партыі прадстаўлялі 10 чалавек: 4 ад Аграрнай партыі, 3 ад ПКБ, 2 ад АГП, 1 ад ЛДП[12]. На столькі ж месцаў у Гомельскую абласную Раду вылучыліся 183 кандыдаты, зь якіх 47 ад ЛДП, 42 ад ПКБ, 37 ад КПБ, 29 ад АГП, 14 ад Партыі БНФ[13].

Апрача ўскладненай працэдуры вылучэньня дэмакратычным кандыдатам рабіліся перашкоды фармальнага характару. Яраслаў Берніковіч ад БНФ ня змог зарэгістравацца кандыдатам у Глыбоцкую раённую Раду: у раёне яму сьпярша адмовілі таму, што, маўляў, ён прапісаны па адным адрасе, а жыве па іншым. Абласная камісія апраўдала яго, але знайшла іншую прычыну — няправільна складзеную дамову з выдаўцом газэты, зь якой Берніковіч супрацоўнічаў[14]. З надуманых прычынаў з выбарчага працэсу выключаліся партыйныя лідэры, у прыватнасьці намесьнікі старшыні БСДП (НГ) Ніна Стужынская й Віталь Малашка, кіраўнік выбарчага штабу ЛДП Уладзімер Карунас і намесьнік старшыні ЛДП Алег Маркевіч. Шэраг дэмакратычных кандыдатаў (намесьнік АГП Сяргей Альфер, чальцы палітычнай рады АГП Сьвятлана Каралёва, Яўген Лабановіч, які быў зьняты зь перадвыбарнай дыстанцыі за тое самае парушэньне, за якое раней атрымаў папярэджаньне) быў зьняты 27 лютага, калі не было ўжо як аспрэчыць пастановы мясцовых камісіяў.

Найбольшы адсеў прэтэндэнтаў адбываўся ў абласных цэнтрах і Менску. З 769 прэтэндэнтаў на месцы ў абласныя Рады былі зарэгістраваныя 569, ці 74%. У Менску з 305 прэтэндэнтаў былі зарэгістраваныя кандыдатамі 165, ці 54,1%. У раённых Радах з 4795 былі зарэгіст-

**Табліца 1.** Колькасьць зарэгістраваных кандыдатаў ад партыяў[15]

| Партыя | Колькасьць зарэгістраваных кандыдатаў |
|---|---|
| ЛДП | 181 |
| СДПНЗ | 9 |
| АГП | 54 |
| Партыя БНФ* | 50 |
| БСДП (НГ) | 69 |
| КПБ | 111 |
| ПКБ | 173 |
| Аграрная партыя | 7 |
| БПП | 4 |
| Сацыяльна-спартыўная партыя | 2 |
| Усяго | 666 |

[12] БелаПАН. 2003. 3 лютага.
[13] Тамсама.
[14] Наша Ніва. 2003. 28 лютага.
[15] БелаПАН. 2003. 5 лютага.
* Самі рэчнікі Партыі БНФ абвяшчалі іншыя лічбы. Згодна з заявай Партыі БНФ ад 3 лютага 2003 году, з 154 вылучаных кандыдатаў зарэгістравана 107, адмоўлена ў рэгістрацыі 43, а лёс чатырох партыйных вылучэнцаў няпэўны. (Гл.: БелаПАН. 2003. 3 лютага.) Паводле словаў намесьніцы старшыні партыі Галіны Сямдзянавай, Партыя БНФ зарэгістравала 113 кандыдатаў, а страціла 40. Найвялікшыя праблемы з рэгістрацыяй у партыі былі ў Гарадзенскай вобласьці ды ў Менску. (Гл.: Белорусская газета. 2003. 10 февраля.)

раваныя 4658 кандыдатаў. У абласных гарадох — 1353 з 1572. У раённых Радах — 4658 з 4795. У раённых цэнтрах адмову ў рэгістрацыі атрымалі 3 вылучэнцы, у сельскіх Радах — 8, а ў пасялковых — 57. У сярэднім на адно дэпутацкае месца ў Менску прэтэндавала 5,55 чалавек; на месца ў абласным горадзе — 2,28; у гарадох раённага падпарадкаваньня — 1,37; у раённых — 1,13; у пасялковых — 1,09; у сельскіх Радах — 1,02 чалавекі. Агульная колькасьць зарэгістраваных партыйных кандыдатаў склала каля 2,8%. Таму яшчэ напярэдадні выбараў было відавочна, што прасоўваць інтарэсы дэмакратычных сілаў на мясцовым узроўні ня будзе каму.

## Умовы й вынікі агітацыі

На агітацыю Цэнтравыбаркам прызначыў пару з дня рэгістрацыі кандыдатаў (з 21 па 30 студзеня 2002 году) да 1 сакавіка 2003 году. Агітацыя была абстаўлена так, каб падчас яе ў грамадзтве захавалася абыякавасьць да палітыкі. Яна абмяжоўвалася грувасткай рэглямэнтацыяй з боку Цэнтравыбаркаму: кандыдатам, напрыклад, забаранялася выкарыстоўваць уласныя сродкі на агітацыю, а для таго, каб сустрэцца з выбарцамі, трэба было падаць заяўку за два тыдні. Звычнай рэччу падчас выбарчай кампаніі стала недапушчэньне ўладай агітацыі дэмакратычных кандыдатаў пры дапамозе адміністрацыйных рэсурсаў: яна зрывала сустрэчы з выбарцамі, забараняла друк перадвыбарных плякатаў (Берасьцейская абласная друкарня адмовілася друкаваць перадвыбарныя плякаты 17-цёх зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты ў Берасьцейскую абласную й гарадзкую Рады ад БСДП (НГ) дзеля таго, што на плякатах кожнага кандыдата апроч уласных фотаздымкаў, біяграфіяў ды праграмаў была зьмешчаная інфармацыя пра іншых кандыдатаў ад партыі[16]).

Папярэджаньні за парушэньне агітацыйнай кампаніі (найчасьцей кандыдатаў абвінавачвалі ў выкарыстаньні ўласных фінансавых сродкаў і арганізацыйных рэсурсаў) нярэдка выносіліся на паседжаньнях мясцовых выбаркамаў пры адсутнасьці кандыдатаў. Напрыклад, лідэру выбарчага блёку «Дэмакратычны Барысаў» Ляву Марголіну, чальцу Рады Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі Мікалаю Пахабаву й старшыню мясцовай філіі Таварыства абароны правоў спажыўцоў Валер’ю Чыстову былі вынесеныя папярэджаньні за парушэньне прынцыпу роўнасьці правоў перадвыбарнай агітацыі ў СМІ з прычыны публікацыі інтэрвію зь імі і тэкстаў іх агітацыйных улётак на старонках недзяржаўных газэт «Борисовские новости» і «Курьер из Борисова»[17]. На стадыі агітацыі ўлады таксама ўводзілі цэнзуру. У кандыдатаў у Віцебскую абласную Раду ад БСДП (НГ) Аляксея Гаўруцікава і Івана Пракапца выразалі цэлыя кавалкі іх выступаў у радыёэтэры[18]. Старшыня ЦВК Л. Ярмошына рэкамэндавала ўсе выступы кандыдатаў у мясцовых радыё- і тэлеканалах даваць у запісе. Паводле яе словаў, «бурнай дэмакратыяй» яе ўразіў Магілёў, дзе ўлады дазволілі кандыдатам выступаць у жывым этэры[19].

Кандыдатамі ад улады былі пераважна работнікі бюджэтнай сфэры: мэдработнікі, выкладчыкі, кіраўнікі дзяржаўных установаў і прадпрыемстваў. Шмат якія кандыдаты ад улады агулам не вялі агітацыйнай працы і нават не атрымалі кандыдацкага пасьведчаньня. На думку палітоляга

[16] БелаПАН. 2003. 17 лютага.
[17] БелаПАН. 2003. 25 лютага.
[18] Витебский курьер. 2003. 11 февраля.
[19] БелаПАН. 2002. 23 сьнежня.

Валера Карбалевіча, гэта выклікана тым, што іх прызначалі па разнарадцы, і ўласнае матывацыі да атрыманьня дэпутацкіх мандатаў яны ня мелі[20]. Агітацыя за іх зьдзяйсьнялася арганізавана і ў адміністрацыйным парадку: праз спэцвыпускі раённых газэтаў, што дасылаліся выбарцам бясплатна, праз сустрэчы з выбарцамі па месцах іх працы, праз бацькоўскія сходы ў школах і г.д. Напрыклад, у Баранавічах на запрашэньнях на выбары пазначаліся прозьвішчы кандыдатаў, за якіх трэба галасаваць, а ў Віцебску школьныя настаўнікі праз вучняў запрашалі іх бацькоў узяць удзел у галасаваньні[21].

## Датэрміновае галасаваньне

Датэрміновае галасаваньне на мясцовых выбарах'2003 пачалося 25 лютага ў 10.00. Цягам пяцёх дзён 6388 выбарчых участкаў працавалі з 10.00 да 14.00 і з 16.00 да 19.00. У першы дзень у датэрміновым галасаваньні ўзялі ўдзел 133 тысячы чалавек, або 1,8% ад агульнай колькасьці выбарцаў. Па выніках другога дня, тых, хто прагаласаваў, было ўжо 5,2%. А за тры дні прагаласавала 9,2%. Агулам колькасьць выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова, склала 20,7%. Выбарцаў на датэрміновае галасаваньне штурхалі адміністрацыйнымі мэтадамі. У ім удзельнічалі найбольш залежныя ад выканаўчай улады грамадзяне — студэнты, службоўцы, насельнікі інтэрнатаў, калгасьнікі, якіх прываблівалі выпіўкай і выдачай затрыманых заробкаў.

## Галасаваньне ў дні выбараў*

Адсутнасьць агульнанацыянальнай сеткі назіральнікаў, як падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году, спрыяла фальсыфікацыям з боку выбарчых камісіяў. Колькасьць бюлетэняў для галасаваньня немагчыма было адсачыць, бо яны ня мелі абароны ад капіяваньня й нярэдка рабіліся ўручную.

Паводле афіцыйных зьвестак, з больш як сямёх мільёнаў грамадзян, улучаных у сьпісы выбарцаў, у галасаваньні ўзялі ўдзел 5 214 895 чалавек, ці 73,4%. Выбары былі прызнаныя сапраўднымі ў 23 980 выбарчых акругах. У 21 акрузе выбары не адбыліся. У 525 былі прызначаныя паўторныя выбары. Усяго падчас першага туру было абрана 23 275 дэпутатаў, альбо 97% дэпутацкага корпусу. Зь іх 52,2% былі дэпутатамі Радаў ранейшых склікаўньняў. Паводле афіцыйных зьвестак, якія не адлюстроўвалі партыйнай прыналежнасьці той часткі кандыдатаў, якая вылучалася шляхам збору подпісаў, толькі 10 з абраных у гэты дзень дэпутатаў былі чальцамі палітычных партыяў[22]. Паводле дадзеных газэты «Наша Ніва», у першым туры выбараў перамаглі каля 110 з 750 зарэгістраваных дэмакратычных кандыдатаў, яшчэ 70 дэмакра-

[20] БелаПАН. 2003. 5 сакавіка.

[21] Звязда. 2003. 1 сакавіка.

* Дэталізаваныя табліцы аб афіцыйных выніках першага й другога тураў галасаваньня на выбарах дэпутатаў мясцовых Радаў былі зьмешчаныя на вэб-старонцы ЦВК www.rec.gov.by і ў кнізе: Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь 24 склікання. Факты і каментарыі. Менск: Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2003. — Рэд.

[22] Народная газета. 2003. 7 сакавіка.

таў выйшлі ў другі тур, але толькі 27 зь іх згадалі ў бюлетэнях пра сваю партыйную прыналежнасьць[23]. Паводле заявы БСДП (НГ), у першым туры чатыры чальцы іх партыі перамаглі ў раённых і шэсьць — у сельскіх Радах, а 22 — выйшлі ў другі тур выбараў у абласныя і гарадзкія Рады буйных гарадоў (Берасьце, Баранавічы, Пінск, Віцебск, Ворша, Бабруйск)[24]. У заяве БСДП (НГ) таксама гаварылася, што гэтыя выбары аказаліся беспрэцэдэнтнымі па ўзроўні фальсыфікацыяў (усе сямёра кандыдатаў ад гэтай партыі ў Менску занялі другія месцы, атрымаўшы, паводле афіцыйных дадзеных, да 35% галасоў).

У Менску, дзе за дэпутацкія мандаты змагаліся 64 партыйныя кандыдаты, у першым туры былі абраныя 52 дэпутаты з 55. У дзьвюх выбарчых акругах адбыўся другі тур галасаваньня, у адным — паўторныя выбары. Яўка выбарцаў склала 61%. 13 з 52 дэпутатаў пераабраныя на другі тэрмін, зь іх толькі адзін меў партыйную прыналежнасьць — уваходзіў у Беларускую сацыяльна-спартовую партыю. Сябра АГП Ігар Шынкарык выйшаў у другі тур, дзе прайграў свайму канкурэнту — старшыню прафкаму Менскага трактарнага заводу Аляксандру Карцаву[25]. Як заўважае Валер Карбалевіч, у Менску высокі адсотак удзельнікаў выбараў быў забясьпечаны шляхам рэзкага скарачэньня выбарчымі камісіямі сьпісаў грамадзян, надзеленых выбарчым правам, прычым у некаторых акругах іх колькасьць скарацілася ўдвая[26].

У 9 па 16 сакавіка ў 202 акругах праходзіў другі тур галасаваньня. 13 сакавіка ён адбыўся ў Берасьцейскай вобласьці, 14-га ў Гарадзенскай і Гомельскай, 15-га ў Віцебскай і Менскай, 16-га — у Магілёўскай. Усяго ў другім туры былі даабраныя 194 дэпутаты, зь якіх 22 былі прадстаўнікамі палітычных партыяў. Адзіная акруга ў Менскай вобласьці, дзе другі тур не адбыўся, бо ў ім удзельнічала менш за 25% выбарцаў, была ў Барысаве. У 14 астатніх акругах вобласьці дэпутаты ў другім туры былі абраныя. У Гомельскай вобласьці ў другім туры былі даабраныя 52 дэпутаты, у Берасьцейскай — 24, у Гарадзенскай былі даабраныя ўсе неабходныя дэпутаты, у Віцебскай — 75.

Колькасьць тых, хто галасаваў у другім туры, была наступнай. У другім туры выбараў у Менскую гарадзкую Раду ўдзельнічала 38,2% выбарцаў, у 27 акругах па выбарах у абласныя Рады — 43,4%, у 41 акрузе па выбарах у раённыя Рады — 38,3%, у 110 акругах па выбарах у гарадзкія (гарадоў абласнога падпарадкаваньня) Рады — 42,5%, у 22 акругах па выбарах у гарадзкія (гарадоў раённага падпарадкаваньня), пасялковыя й сельскія Рады — 53,7%. У другім туры выбары адбыліся ў 194 акругах і не адбыліся ў 8. У Магілёўскай вобласьці па выніках двух тураў выбараў дэпутаты былі абраныя ў 6 з 8 акругаў. У адной акрузе выбары не адбыліся. Пры гэтым у мясцовыя Рады патрапілі два прадстаўнікі дэмакратычных сілаў— сябра АГП Кірыла Шарапкін, абраны дэпутатам Магілёўскай гарадзкой Рады, і Андрэй Цімаеў ад «Грамадзянскага форуму», які стаў дэпутатам Горацкай раённай Рады[27].

Усяго падчас абодвух тураў галасаваньня было абрана 23 469 дэпутатаў мясцовых Радаў, або 97,8% дэпутацкага корпусу. Усе Рады абраныя ў паўнамоцным складзе. Што да тых акругаў, дзе выбары не адбыліся, то пытаньне аб іх правядзеньні было пакінута на водкуп

[23] Наша Ніва. 2003. 6 сакавіка.

[24] Народная Воля. 2003. 4 сакавіка.

[25] БелаПАН. 2003. 3 сакавіка.

[26] БелаПАН. 2003. 5 сакавіка.

[27] БелаПАН. 2003. 17 сакавіка.

тэрытарыяльным выбарчым камісіям[28]. З партыйных кандыдатаў дэпутатамі сталі 257 чалавек, альбо 1,1% дэпутацкага корпусу. Пры гэтым ЛДП пры 184 кандыдатах займела 5 дэпутацкіх месцаў (пры выхадзе 45 кандыдатаў у другі тур). ПКБ пры 173 кандыдатах займела 78 дэпутатаў, прычым амаль паўсюль у пасялковых Радах, а КПБ пры 114 кандыдатах атрымала 107 дэпутацкіх месцаў. Посьпехі іншых партыяў аказаліся сьціплейшымі. Партыя БНФ у першым туры галасаваньня здабыла 11 дэпутатаў пры 50 кандыдатах, БСДП (НГ) — 11 дэпутатаў у дробных раённых Радах з 69 кандыдатаў, АГП — 5 з 54 (14 выйшлі ў другі тур выбараў, у тым ліку ўва ўсе гарадзкія Рады, апрача Гомельскай і Магілёўскай).

На гэтых выбарах масава перамагалі кандыдаты ад улады — кіраўнікі прамысловых прадпрыемстваў, мэдычных установаў, дырэктары школаў, работнікі раённых адміністрацыяў. Але былі й выняткі. Так, у Белаазерску Берасьцейскай вобласьці бальшыню абраных дэпутатаў гарадзкой Рады склала дэмакратычная апазыцыя. Пры агульнай колькасьці ў 25 месцаў у першым туры галасаваньня была абрана 12 дэпутатаў, зь якіх 7 (прадстаўнікі такіх арганізацыяў, як Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, Цэнтар рэгіянальнага супрацоўніцтва, мясцовая жаночая ініцыятыва «Таіс» і г.д.) увайшлі ў так званую «непартыйную дэмакратычную групу»[29].

## Высновы

Падчас выбараў работнікі вэртыкалі ўпэўнена выкарыстоўвалі апрабаваныя раней спосабы фальсыфікацыяў. Паводле дадзеных БХК, каля 20% выбарцаў галасавалі па-за выбарчымі кабінамі ў прысутнасьці чальцоў выбарчых камісіяў ды іншых асобаў[30]. На думку праўніка Міхася Пліскі[31], на выбарах было сфальсыфікавана каля 15% галасоў выбарцаў. Характар і маштабы фальсыфікацыяў розьніліся ў залежнасьці ад рэгіёну. Калі ў Менску дэмакратычным кандыдатам не далі ніякіх магчымасьцяў перамагчы, то на пэрыфэрыі такія шанцы былі, і яны былі выкарыстаныя. Вельмі сымбалічнымі былі паводзіны прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі, які асабіста праігнараваў выбары, чым падкрэсьліў мізэрнасьць ролі мясцовых Радаў у палітычным жыцьці краіны.

Прэзыдэнцкая вэртыкаль у краіне збудаваная так, што яна ніяк не залежыць ад заканадаўчай і прадстаўнічай улады на месцах. Яна фармуе сама сябе на ўсіх узроўнях, нават там, дзе ў гэтым працэсе прадугледжваецца беспасярэдні ўдзел грамадзян. Яе дасягненьне ў выбарах 2003 г. у тым, што яны не спрычыніліся ні да аб'яднаньня й пасьпяховых супольных дзеяньняў дэмакратычных сілаў, ні да карэнных зьменаў у грамадзкай думцы. Палітычнай мабілізацыі грамадзтва, якая б магла стварыць перадумовы для дэмакратычных зьменаў, таксама не адбылося. Яшчэ адным здабыткам уладаў на гэтых выбарах можна лічыць адпрацаваныя тэхналёгіі падліку галасоў, якія забясьпечваюць патрэбны ўзровень фальсыфікацыяў.

Вынікі выбараў ня выявілі рэальных настрояў у грамадзтве, а мэханізм выбараў ня меў аніякага дачыненьня да агрэгіяваньня й артыкуляцыі яго інтарэсаў. Ход мясцовых выбараў

[28] Народная газета. 2003. 18 сакавіка.

[29] БелаПАН. 2003. 3 сакавіка.

[30] БелаПАН. 2003. 4 сакавіка.

[31] БелаПАН. 2003. 17 сакавіка.

засьведчыў тэндэнцыю вяртаньня да савецкай практыкі правядзеньня безальтэрнатыўных выбараў. Дачыненьні ўлады й апазыцыі па-ранейшаму захавалі выгляд гульні з нулявой сумай. Падчас падрыхтоўкі да выбараў галы ў заканадаўстве актыўна выкарыстоўваліся ўладай супраць апазыцыі. Дэмакратычныя сілы дапускаліся ў мясцовыя Рады толькі ў той колькасьці, якая была патрэбная для стварэньня ўявы дэмакратызацыі краіны. Іх слабыя вынікі (істотнага абнаўленьня складу мясцовых Радаў не адбылося) не ў апошнюю чаргу тлумачацца іх нізкай папулярнасьцю ў грамадзтве.

Нізкая зацікаўленасьць кандыдатаў у барацьбе за дэпутацкія мандаты абумовіла нізкую ступень мабілізацыі дэмакратычных сілаў у нацыянальным маштабе, пра што сьведчыць няўдзел у выбарах шмат якіх партыйных лідэраў. Толькі Менская гарадзкая Рада вылучае кандыдатуры васьмёх чальцоў для Рады Рэспублікі Нацыянальнага Сходу ды разглядае пытаньні прыватызацыі сталічнай уласнасьці. Гэтым і тлумачыцца асабліва заўзятая барацьба за месцы ў гэтым органе.

Тое, што для грамадзтва мясцовыя выбары 2003 году ня сталі падзеяй, таксама было сьведчаньнем паразы дэмакратычных сілаў. Вынікі выбараў засьведчылі, што ўлады настроеныя не дапусьціць дэмакратычных сілаў у парлямэнт і на наступных выбарах у 2004 годзе. Аднак параза дэмакратычных сілаў не была поўнай. На гэтых выбарах дэмакратычныя сілы адмовіліся ад тактыкі байкоту. Некалькі дзясяткаў іх прадстаўнікоў увайшлі ў склад выбарчых камісіяў, а некаторыя нават сталі дэпутатамі. Хаця пакуль яны не маглі ўплываць на палітыку ў нацыянальным маштабе, іх зьяўленьне ў мясцовых Радах стварала спрыяльныя ўмовы для ўзьнікненьня лякальных групаў інтарэсаў, зьвязаных з дэмакратычным рухам. Важным вынікам гэтых выбараў была таксама выпрацоўка дэмакратычнымі сіламі ў межах КРАПП рэкамэндацыяў для ўдасканаленьня выбарчага заканадаўства.

7

## НЕЗАЛЕЖНАЕ НАЗІРАНЬНЕ ЗА МЯСЦОВЫМІ ВЫБАРАМІ Й ЯГО ВЫНІКІ

Для дэмакратычных сілаў, якія ня здолелі правесьці дастатковай колькасьці сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі, адзіным сродкам запабегчы падтасоўкам на выбарах альбо, прынамсі, прыцягнуць да іх увагу беларускай і міжнароднай грамадзкасьці была арганізацыя сыстэмы грамадзкага назіраньня. Выканаўчая ўлада можа не ўлучаць дэмакратычных дзеячоў у склад камісіяў, але ня мае права не пусьціць назіральнікаў на паседжаньні выбаркамаў і дэпутатаў мясцовай Рады, а таксама на выбарчыя ўчасткі. Сёлета ўстаноўка арганізатараў мясцовых выбараў на падтасоўваньне іх вынікаў зноў ускладняла ўмовы працы як беларускіх, так і замежных назіральнікаў.

### Праўныя рамкі дзейнасьці назіральнікаў

Дзейнасьць назіральнікаў на выбарах у Беларусі рэглямэнтуецца Выбарчым Кодэксам, а таксама шэрагам законаў і падзаконных нарматыўных актаў. Паводле прынятых у 1999 годзе

законаў «Аб выбарах Прэзыдэнта» і «Аб выбарах дэпутатаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі», палітычная партыя, грамадзкае аб'яднаньне, працоўны калектыў ці выбарца могуць даслаць толькі аднаго прадстаўніка на паседжаньні выбарчых камісіяў ці ўчасткі для галасаваньня. У арт. 155 Выбарчага Кодэксу былі закладзеныя шырокія паўнамоцтвы назіральніка*, але на практыцы яны абмежаваныя падзаконнымі нарматыўнымі актамі, якія ўскладняюць незалежнае назіраньне за падрыхтоўкай і правядзеньнем выбараў. 13 ліпеня 2000 году ЦВК пастанавіла, што парадак накіраваньня назіральнікаў на паседжаньні выбаркамаў і выбарчыя ўчасткі напярэдадні выбараў вызначае... сама ЦВК.

У выбарчым заканадаўстве не прапісаны абавязак старшыняў і чальцоў участковых камісіяў зацьвярджаць копіі пратаколаў выбаркамаў, таму тыя копіі, што робяць самі назіральнікі, ня ёсьць юрыдычна значэннымі дакумэнтамі й ня могуць выкарыстоўвацца для абскарджаньня вынікаў галасаваньня. Істотнай перашкодай у дзейнасьці назіральнікаў стала нявызначанасьць парадку іх працы на выбарчых участках. У прыватнасьці, у арт. 13 Выбарчага Кодэксу назіральнікам забараняецца знаходзіцца каля сталоў выдачы бюлетэняў, каля кабінаў і скрыняў для галасаваньня. На практыцы ім забаранялі таксама знаходзіцца ля сталоў, за якімі вядзецца падлік бюлетэняў. У выніку назіральнікі не маглі ні спраўдзіць дакумэнты, на падставе якіх выбарцам выдаваліся бюлетэні, ні знаёміцца зь сьпісамі выбарцаў, ні сачыць за кабінамі для галасаваньня і г.д. Назіральнікаў маглі вывесьці з паседжаньняў выбарчых камісіяў ці ўчасткаў для галасаваньня без тлумачэньня прычынаў такога рашэньня.

Паводле арт. 21 Выбарчага Кодэксу, грамадзяне маюць магчымасьць азнаямляцца зь сьпісамі выбарцаў і правяраць правільнасьць іх складаньня ў памяшканьні ўчастковай камісіі. На сэмінары-нарадзе ў Гомелі старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына патлумачыла гэтае палажэньне наступным чынам: «Гэта не азначае, што любы можа ў гэтых сьпісах калупацца, а толькі той, хто пытаецца пра сябе самога»[1]. І наагул, як заявіў сакратар ЦВК Мікалай Лазовік, выбары ў Беларусі праводзяцца не для Захаду, «і калі якога-небудзь старшыню сельскай Рады не прызнае Захад — ён гэта, я спадзяюся, таксама перажыве»[2].

Нэўтралізацыя незалежных назіральнікаў стала часткай афіцыйнай выбарчай кампаніі. Паводле прэс-сакратаркі цэнтру «Вясна» Тацяны Равякі, у дзень выбараў была зафіксаваная значная колькасьць выпадкаў, калі назіральнікі не атрымоўвалі ад камісіяў нават інфармацыі аб тым, колькі чалавек галасуе[3]. Стаўленьне да незалежных назіральнікаў добра ілюструецца наступнымі прыкладамі. З словаў лідэра БСДП (НГ) Мікалая Статкевіча, у Бараўлянах супраць чальца яго партыі, сябры Менскай раённай тэрытарыяльнай выбарчай камісіі, была заведзеная адміністрацыйная справа за тое, што ён хацеў назіраць за падлікам галасоў у мясцовай клініцы[4]. Кіраўнік Берасьцейскага аддзяленьня праваабарончай арганізацыі «Вясна» Ўладзімер Вялічкін быў выстаўлены з выбарчага ўчастка № 78, што знаходзіўся ў школе

* Вызначэньне статусу назіральніка ў Выбарчым Кодэксе стала адным з дасягненьняў КРАПП падчас грамадзка-палітычнага дыялёгу паміж уладай і апазыцыяй. Разам з тым Выбарчы Кодэкс, прыняты ў лютым 2000 году, а таксама зьмены й дапаўненьні ў яго, зацьверджаныя ў ліпені таго самага году, за некалькі месяцаў да парлямэнцкіх выбараў, улічылі толькі найменш істотныя папраўкі з тых, што былі выпрацаваныя КРАПП і БДІПЧ АБСЭ.

1 БелаПАН. 2002. 23 сьнежня.

2 БелаПАН. 2002. 10 сьнежня.

3 БелаПАН. 2003. 2 сакавіка.

4 Народная Воля. 2003. 4 сакавіка.

№ 10, дзеля таго, што адна зь сябровак выбарчай камісіі палічыла, што ён правакатар[5].

Падчас выбараў упершыню ў гісторыі іх правядзеньня ўдалося дабіцца пераліку галасоў. Зьдзеялася гэта ў Малінаўскай акрузе гораду Менску № 9, дзе ў Менскую гарадзкую Раду балятаваўся памочнік дэпутата Палаты Прадстаўнікоў Уладзімера Навасяда Аляксандар Мельнікаў. З такой ініцыятывай выступілі чальцы парлямэнцкай групы «Рэспубліка» Палаты Прадстаўнікоў Валеры Фралоў і Ўладзімер Парфяновіч. Разам з Навасядам яны правялі выбарачнае назіраньне за ходам галасаваньня й атрымалі на рукі копіі пратаколаў участковых камісіяў аб выніках галасаваньня. Калі яны сабралі падпісаныя камісіямі пратаколы, а пасьля параўналі іх з дадзенымі, накіраванымі ў ЦВК на наступны дзень пасьля выбараў, высьветлілася, што выдадзеныя ім пратаколы не адпавядаюць апошнім пратаколам выбарчых камісіяў. Паводле першых пратаколаў, Мельнікаў перамагаў, а паводле другіх — не. Пасьля звароту дэпутатаў ЦВК пералічыла бюлетэні на спрэчных участках, але вынікі былі не на карысьць Мельнікава: паводле вынікаў пераліку галасоў, у акрузе з агульнай колькасьцю выбарцаў 20 943 чалавекі Мельнікаў пазбыўся каля 600 галасоў[6] (гл. таксама артыкул Віталя Сіліцкага «Зьмяненьне палітычнага раскладу пасьля мясцовых выбараў і пэрспэктывы наступных выбарчых кампаній»). Падчас гэтай працэдуры дэпутаты даведаліся, што бюлетэні з усяго Ленінскага раёну захоўваліся ў пакоі, які ўвечары 4 сакавіка быў расчынены, што засьведчыў менскі пракурор.

Назіральнікамі ад БСДП (НГ) было зафіксавана больш за 15 выпадкаў (пераважна ў Жодзіне, Воршы, Барані[7]), калі ўлады зрывалі выбары, каб не дапусьціць перамогі дэмакратычных кандыдатаў.

Тым ня менш на агульнанацыянальным узроўні маштабы незалежнага назіраньня былі абмежаваныя, таму цяжка дакладна іх ацаніць. З словаў сакратара ЦВК Мікалая Лазовіка, ЦВК ня мела дадзеных пра колькасьць унутраных назіральнікаў[8].

Па выбарах праваабарончая арганізацыя «Беларускі Хельсынскі камітэт»[9] прыняла заяву, у якой канстатавала наступныя парушэньні правоў назіральнікаў уладамі:

— назіральнікаў з розных прыклёпаў не дапусьцілі да назіраньня за фармаваньнем выбарчых камісіяў;

— ім не дазволілі ўдзельнічаць у апячатаньні скрыняў для галасаваньня;

— яны ня мелі рэальнай магчымасьці кантраляваць падлік галасоў;

— яны фактычна не запрашаліся да назіраньня за галасаваньнем з выязнымі скрынямі.

Выбарчыя камісіі таксама адмаўляліся зацьвярджаць копіі пратаколаў аб выніках галасаваньня, складзеныя назіральнікамі й даверанымі асобамі кандыдатаў. Паэтапная працэдура падліку галасоў не адлюстроўвалася ў форме выніковага пратаколу, зацьверджанага ЦВК: у ёй не прадугледжваецца месца для паэтапных падлікаў паводле стадыяў галасаваньня[10].

На выбары адрэагавалі таксама партыі, якія ўласнымі намаганьнямі ладзілі назіраньне на асобных участках. Лідэр БНФ Вінцук Вячорка заявіў, што амаль усе назіральнікі ад яго партыі былі адхіленыя ад кантролю за скрынямі для папярэдняга галасаваньня, а таксама падліку бюлетэняў і галасоў, а тыя, хто меў магчымасьць назіраць, зафіксавалі вялікую колькасьць

[5] БелаПАН. 2003. 2 сакавіка.
[6] Народная Воля. 2003. 7 сакавіка.
[7] БелаПАН. 2003. 3 сакавіка.
[8] БелаПАН. 2003. 27 лютага.
[9] БелаПАН. 2003. 4 сакавіка.
[10] Тамсама.

парушэньняў[11]. У заяве БСДП (НГ) выбары ў мясцовыя Рады былі названыя беспрэцэдэнтнымі па ўзроўні фальсыфікацыі.

## Міжнароднае назіраньне

Калі падчас падрыхтоўкі да парлямэнцкіх выбараў 2000 году і прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году ўлады запрашалі міжнародныя арганізацыі ўзяць удзел у назіраньні, то на мясцовых выбарах іх пазыцыя зьмянілася. З аднаго боку, яны па-ранейшаму дэкляравалі гатовасьць забясьпечыць празрыстасьць выбараў*, а зь іншага — імкнуліся зрабіць гэта так, каб выбары ня выклікалі інтарэсу міжнародных структураў.

Па выніках ранейшых выбараў, БДІПЧ АБСЭ рэкамэндавала ўвесьці ў Выбарчы Кодэкс палажэньні аб абароне правоў назіральнікаў пры іх парушэньні ў працэсе назіраньня; аб дазволе міжнародным і мясцовым назіральнікам сачыць за працэсам галасаваньня й падліку бюлетэняў зблізку, каб эфэктыўней заўважаць парушэньні; аб тым, што на першае патрабаваньне міжнародных і мясцовых назіральнікаў выбарчыя камісіі на ўсіх узроўнях маюць падаць зацьверджаную копію афіцыйных вынікаў; аб дазволе міжнародным і мясцовым назіральнікам суправаджаць пратаколы пры іх перадачы выбарчымі камісіямі на ўсіх узроўнях; аб зьняцьці забароны назіральнікам падтрымліваць кантакты з сродкамі масавай інфармацыі альбо праводзіць прэс-канфэрэнцыі, калі яны лічаць гэта неабходным. Аднак да пачатку падрыхтоўкі да выбараў у мясцовыя Рады гэтыя рэкамэндацыі не былі ўлічаныя.

Напярэдадні выбараў дэмакратычныя сілы заклікалі ўлады далучыцца да канвэнцыі СНД аб стандартах свабодных і дэмакратычных выбараў і прывесьці ў адпаведнасьць зь ёй айчыннае выбарчае заканадаўства. Канвэнцыя адкрытая для падпісаньня з 7 кастрычніка 2002 году і дае назіральнікам права атрымліваць копіі пратаколаў з вынікамі галасаваньня з кожнага выбарчага ўчастку, што дазваляе правесьці паралельны падлік і абвясьціць «свае» вынікі выбараў. 19 лютага левацэнтрысцкая канфэдэрацыя «За сацыяльныя перамены» даслала ў ЦВК зварот з заклікам падпісаць канвэнцыю ды прывесьці выбарчае заканадаўства ў адпаведнасьць зь ёй. Адказваючы на гэты зварот, Л. Ярмошына заявіла, што напярэдадні выбараў няма неабходнасьці падпісваць канвэнцыю, бо цэнтральныя выбарчыя камісіі Беларусі й Расеі вельмі актыўна яе распрацоўваюць[12]. Ярмошына таксама адзначыла, што назіраць за выкананьнем канвэнцыі павінна адмысловае бюро, на стварэньне якога няма грошай[13].

Хаця БДІПЧ АБСЭ не даслала ў Беларусь назіральную місію, яе стаўленьне да выбараў нельга было назваць абыякавым. 18 лютага прадстаўнік ЗША ў АБСЭ Стэфан Мінэкес выступіў на паседжаньні Сталай рады АБСЭ ў Вене і заклікаў беларускія ўлады супрацоўнічаць з офісам АБСЭ ў Менску і БДІПЧ у справе «выкананьня рэкамэндацыяў для палепшаньня

[11] БелаПАН. 2003. 3 сакавіка.

* У ноце, разасланай Міністэрствам замежных справаў усім дыпляматычным прадстаўніцтвам 24 лютага 2003 году, гаварылася, што «ўсе захады для правядзеньня выбараў – фармаваньне выбарчых акругаў і выбарчых камісіяў, вылучэньне кандыдатаў, іх рэгістрацыя, адкрытае й свабоднае абмеркаваньне перадвыбарных праграмаў, забесьпячэньне празрыстасьці выбарчага працэсу, удзел мясцовых і замежных назіральнікаў і свабода СМІ – адкрытыя для грамадзтва ў адпаведнасьці з прынцыпамі публічнасьці, мэтазгоднасьці і, найважнейшае, забесьпячэньня дэмакратычнага характару выбараў». Гл.: БелаПАН. 2003. 28 лютага.

[12] Белорусский рынок. 2003. 24 лютага.

[13] БелаПАН. 2003. 21 лютага.

клімату правядзеньня справядлівых і дэмакратычных мясцовых выбараў, якія ў будучыні маглі б быць прызнанымі міжнароднай супольнасьцю»[14]. Напярэдадні мясцовых выбараў Беларусь наведалі экспэрты БДІПЧ АБСЭ Іен Мітчэл і Камэн Іваноў, каб правесьці маніторынг выбарчай кампаніі для выпрацоўкі рэкамэндацыяў наконт удасканаленьня выбарчага заканадаўства Беларусі. Разам з калегамі зь менскага офісу АБСЭ яны назіралі за выбарамі: сустракаліся з прадстаўнікамі ўлады й апазыцыі, наведвалі выбарчыя ўчасткі, цікавіліся арганізацыяй выбарчай кампаніі, а таксама зьменамі ў беларускім выбарчым заканадаўстве.

Але паўнавартага назіраньня за выбарамі ня выйшла. Два экспэрты ад БДІПЧ АБСЭ, што прыехалі ў Беларусь, не прадстаўлялі назіральнай місіі як такой. Калі на прэзыдэнцкіх выбарах, паводле афіцыйных дадзеных, удзельнічала 717 міжнародных назіральнікаў з 45 краін, то на выбары ў мясцовыя Рады ЦВК не запрасіла ніводнага замежнага назіральніка, патлумачыўшы гэта агульнапрынятай міжнароднай практыкай[15]. 23 лютага 2003 году амбасада ЗША ў Менску перадала ў Міністэрства замежных справаў і ЦВК афіцыйны запыт на акрэдытацыю сваіх дыпляматаў у якасьці міжнародных назіральнікаў, але 25 лютага ЦВК адмовіла з той прычыны, што не накіроўвала ёй уласнага запрашэньня для назіраньня ў выбарах і не плянавала запрашаць на выбары замежных назіральнікаў. Пасьля гэтага амбасада ЗША ў Менску ў адпаведнай заяве, распаўсюджанай 28 лютага 2003 году, заклікала беларускае кіраўніцтва трымацца абавязаньняў што да правядзеньня выбараў, узятых на сябе ў рамках АБСЭ.

### Высновы

Улады маюць шырокія магчымасьці для маніпуляцыяў на ўсіх стадыях выбарчага працэсу: ад фармаваньня складу выбарчых камісіяў да падліку галасоў. Фальсыфікацыі робяцца важным фактарам пераемнасьці ўлады, што адбіваецца на яе стаўленьні да незалежнага назіраньня: выкарыстоўваюцца ўсе магчымыя зачэпкі, каб паралізаваць яго працу. Парадак вылучэньня незалежных назіральнікаў рэглямэнтуе ЦВК, а іх дзейнасьць — участковыя камісіі. Асабліва прыкра, што дзеяньні ўлады былі скіраваныя ня толькі на зрыў незалежнага назіраньня за выбарамі, але і публічных дыскусіяў наконт надзённых для грамадства пытаньняў.

## ЗЬМЯНЕНЬНЕ ПАЛІТЫЧНАГА РАСКЛАДУ ПАСЬЛЯ МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ 2003 І ПЭРСПЭКТЫВЫ НАСТУПНЫХ ВЫБАРЧЫХ КАМПАНІЙ

Дарма што выбары пры аўтарытарных рэжымах часьцяком праводзяцца ўва ўмовах шматпартыйнай сыстэмы і ёсьць альтэрнатыўнымі, іх нельга назваць мэханізмам, праз які адбываецца ратацыя ўлады. Гэта хутчэй сродак мацаваньня статус-кво, наданьня легітымнасьці існым уладным стасункам і дэмабілізацыі ды дэмаралізацыі ўнутранай апазыцыі шляхам перакананьня грамадства ў значнай перавазе рэжыму над яго апанэнтамі. Вынятак складаюць так званыя «шо-

[14] БелаПАН. 2003. 21 лютага.
[15] БелаПАН. 2003. 27 лютага.

кавыя выбары», праз якія апазыцыя альбо прыходзіць да ўлады, альбо набывае палітычную вагу і зьмяняе расклад сілаў унутры пануючага рэжыму. Шокавыя выбары — зусім не выключная зьява ў палітычнай гісторыі. Цягам апошніх трох дзесяцігодзьдзяў у сусьветнай практыцы можна налічыць прыкладна два дзясяткі такіх выпадкаў. За рэдкімі выняткамі (калі пануючыя эліты аказваюцца здольнымі на контрарэакцыю і апэратыўна прымаюць захады для кансалідацыі існых рэжымаў ці іх узмацненьня, часам коштам зьнішчэньня апазыцыі), шокавыя выбары даюць імпульс да працэсу трансфармацыі існага рэжыму шляхам яго лібэралізацыі, кампраміснага (пактавага) пераходу да дэмакратыі ці нават яго рэвалюцыйнай замены. Неабходным чыньнікам посьпеху шокавых выбараў зьяўляецца здольнасьць апазыцыі да абароны іх вынікаў праз вулічныя акцыі, якія могуць мець як гвалтоўны, так і негвалтоўны характар.

Адметнасьць шокавых выбараў — іх нечаканасьць як для рэжыму, так і часта для грамадзтва. У бальшыні выпадкаў да іх прыводзіць самаўпэўненасьць дыктатарскіх уладаў, іх нявер’е ў саму магчымасьць собскай паразы. Аднак вонкавая рэвалюцыйнасьць такіх выбараў насамрэч ёсьць вынікам доўгай і збольшага незаўважнай для назіральнікаў сацыяльнай і палітычнай эвалюцыі, што адбываецца ўнутры грамадзтва і прыводзіць да карэннай зьмены раскладу сілаў паміж лягерамі-праціўнікамі ў яго стане. Шокавыя выбары толькі робяць гэтыя зьмены відавочнымі і надаюць ім адпаведнае палітычнае ды інстытуцыйнае афармленьне.

Мясцовыя выбары, што адбыліся ў Беларусі ў сакавіку 2003 году, відавочна, ня сталі шокавымі. Іх вынік ня ўнёс наўпрост істотных зьменаў у палітычны статус-кво, што склаўся зь верасьня 2001 году. Зь іншага боку, паводзіны і тактыка кожнага з бакоў, што бралі ў іх удзел, не былі нечаканымі для назіральнікаў. У той жа час, выбары ня сталі і нейкім новым пунктам адліку і для ўладаў: руцінны характар кампаніі ў нейкай ступені адлюстроўваў тыя сацыяльныя і палітычныя тэндэнцыі, што разгортваліся ў краіне, пачынаючы з канца папярэдняй прэзыдэнцкай кампаніі. Як будзе адзначана далей, выбары ўскосна пацьвердзілі факт паступовага размываньня сацыяльнай базы існага рэжыму і ў той жа час адлюстравалі ўзмацненьне яго рэпрэсіўных магчымасьцяў. Таму выбары’2003 можна акрэсьліць як чарговы крок у эвалюцыі беларускай палітычнай сцэны, які паступова вядзе да стварэньня чыньнікаў дзеля пераменаў у будучым. Дзеля таго каб наблізіцца да вызначэньня вэктару далейшага палітычнага разьвіцьця краіны, неабходна адзначыць тыя зьмены, што адбыліся ў стане і статусе асноўных палітычных гульцоў. Акрамя традыцыйных актараў (рэжыму і апазыцыі), такі аналіз будзе праведзены і ў дачыненьні да пэрспэктываў узьнікненьня «трэцяй сілы» ў беларускай палітыцы, што даволі актыўна абмяркоўвалася на пачатку кампаніі.

## Улады: пасьпяховае «практыкаваньне ў правінцыйным аўтарытарызьме»* ці заканчэньне раману з электаратам?

Выбары’2003 можна вызначыць як адносна пасьпяховую кампанію для існага палітычнага

* Вызначэньне Ўладзімера Роўды. Гл.: Local Elections: An Exercise in Provincial Authoritarianism // Belarusian Review. Spring 2003.

рэжыму. Улады здолелі пасьпяхова запабегчы стварэньню «сыстэмнай апазыцыі» ў мясцовых Радах, зьвёўшы да мінімуму прадстаўніцтва апазыцыйных палітычных партыяў і незалежных ад прэзыдэнцкай вэртыкалі беспартыйных кандыдатаў яшчэ на стадыі рэгістрацыі. У выніку працэдуры, што прайшла 2 сакавіка, апазыцыя забясьпечыла сабе хіба што дэкаратыўны ўдзел у дэкаратыўных органах улады. Безумоўна, сама сабою структура ўлады ў беларускіх умовах (улічваючы фармальную мізэрную ролю, якая адводзіцца прадстаўнічым органам улады) пабудаваная такім чынам, што нават шырокае прадстаўніцтва апазыцыі ў Радах не наблізіла б яе да здабыцьця вагароў уплыву на палітычныя працэсы. Апрача таго, паколькі ў 90% акругах выбары былі безальтэрнатыўнымі і ўдзел у кампаніі палітычных партыяў быў мізэрны, кардынальнага інстытуцыйнага ўзмацненьня апазыцыі нельга было чакаць нават пры «найчысьцейшым» падліку галасоў. У той жа час, перамога на мясцовых выбарах магла б надаць апанэнтам рэжыму моцную псыхалягічную перавагу ў наступных палітычных кампаніях і павысіць ступень даверу да іх з боку як грамадзтва, так і вонкавых гульцоў. Вынік барацьбы ў тых некалькіх сотнях акругаў, дзе выбары можна было назваць уласна выбарамі, павінен быў высьветліць, ці можна ўвогуле ў беларускіх умовах зьвязваць зь імі спадзяваньні на перамены. На мясцовых выбарах’2003 быў прадэманстраваны альгарытм паводзінаў улады ўва ўмовах паступовага размываньня яе сацыяльнай базы (і зьнікненьня «квазідэмакратычнай легітымнасьці») ды трансфармацыі палітычнага рэжыму ў больш выразную султаністкую канструкцыю. Сярод яго асобных складнікаў можна вылучыць наступныя. Па-першае, гэта канчатковая страта зацікаўленасьці ў забесьпячэньні легітымнасьці ўласных інстытутаў улады як на замежных, так і на ўнутраных палітычных рынках. Улады дастаткова сур’ёзна падрыхтаваліся да перадвыбарнай кампаніі і ня сталі рызыкаваць, не дазволіўшы нават абмежаванай рэальнай канкурэнтнасьці выбараў, «зафіксаваўшы» іх вынікі яшчэ на пачатку кампаніі. Па-другое, гэта надзвычай жорсткае блякаваньне рэальнай канкурэнцыі ў буйных гарадох, і ў першую чаргу — у Менску, дзе гарадзкая Рада — па сутнасьці адзіны прадстаўнічы орган улады, які мае рэальныя паўнамоцтвы (і бюджэт гораду прыстойны, і васьмярых сяброў Рады Рэспублікі ён выбірае сам, а ня разам з сотнямі пасялковых Радаў). Дастаткова паказальным ёсьць той факт, што для таго, каб заблякаваць абраньне кандыдата «ад улады» па адзінай акрузе ў Менску (месьце, дзе антыпрэзыдэнцкі электарат стабільна перавышае палову насельніцтва), спатрэбілася ўмяшальніцтва адразу трох дэпутатаў парлямэнту ў якасьці назіральнікаў (прычым абраньне альтэрнатыўнага кандыдата, памочніка аднаго з трох дэпутатаў, было таксама заблякаванае праз «недахоп» некалькіх соцень галасоў у канчатковых пратаколах акруговай камісіі)*. Такім чынам, у адрозьненьне ад папярэдніх часоў, калі апазыцыя ў гарадох талеравалася з прычыны яўнай перавагі «вэртыкалі» на пэрыфэрыі (заўважым, што і большая частка «фронды» з палаты прадстаўнікоў былі таксама менскага паходжаньня), цяпер акурат у буйных мястох з асаблівай стараннасьцю мацуюцца асяродкі адміністрацыйнай рэакцыі. Па-трэцяе, гэта, калі верыць дадзеным апазыцыйных кандыдатаў, рэзкае павелічэньне адсотку фальсыфікацыі выбараў, які дасягаў максымуму ў Менску. Прычым, калі ў папярэдніх кампаніях доля сфальсыфікаваных га-

* Гутарка ідзе пра Малінаўскую выбарчую акругу № 9, дзе балятаваўся Аляксандар Мельнікаў, памочнік дэпутата палаты прадстаўнікоў Уладзімера Навасяда. Пратаколы ўчастковых камісіяў, атрыманыя кандыдатам, сьведчылі адназначна – перамог Мельнікаў, які набраў 6330 галасоў пры яўцы 11 556 выбарцаў. Паводле ж пратаколаў, перададзеных у акруговую камісію, Мельнікаў набраў толькі 5730 галасоў. Інакш кажучы, пры транспартаваньні «згубіліся» 600 галасоў.

ласоў, па незалежных дадзеных, знаходзілася ў рамках 15—20%*, то гэтым разам можна казаць аб павелічэньні прыкладна ўдвая. Пра гэта ўскосна сьведчаць дадзеныя незалежных сацыялягічных апытаньняў, якія былі апублікаваныя ў красавіку 2003 году. Так, згодна з НІСЭПД, колькасьць выбарцаў, што рэальна ўзялі ўдзел у першым туры галасаваньня, адрозьніваўся ад афіцыйных падлікаў прыкладна на 8% (65,8% супраць 73%), на такую ж лічбу адрозьніваўся і адсотак тых, хто ўзяў удзел у датэрміновым галасаваньні (12,5%, вызначаных незалежнымі дасьледчыкамі, супраць 20%, заяўленых уладамі). Зьвесткі аб пераканаўчай перамозе ўладаў спрастоўваў той факт, што толькі 21,6% апытаных заявілі, што галасавалі за кандыдатаў, што падтрымлівалі існую ўладу. (Тут, натуральна, гутарка ідзе аб тым, як кандыдаты ўспрымаліся насельніцтвам, а не аб іх рэальным палітычным статусе: так, практычна ўва ўсіх акругах, дзе выбары былі безальтэрнатыўнымі, кандыдаты прадстаўлялі «партыю ўлады».) Такім чынам, праўладныя кандыдаты зьбіралі галасы пераважна коштам свайго беспартыйнага статусу (дзякуючы чаму яны ўспрымаліся як «незалежныя») ці з прычыны абыякавасьці выбарцаў да самога працэсу галасаваньня (згодна з тым жа апытаньнем, больш за палову выбарцаў ня мелі дастатковай інфармацыі аб тым, за каго яны галасуюць)**. Па-чацьвёртае, гэта зьмяненьне ў тактыцы кааптацыі мясцовых элітаў. Апрача ўласнай намэнклятуры, на выбарах’2003 улады зрабілі стаўку выключна на прадстаўнікоў такіх прафэсіяў, як настаўнікі і дактары, чыя ляяльнасьць гарантавалася іх залежнасьцю ад дзяржаўнай адміністрацыі. У гэтым мясцовыя выбары кантраставалі з парлямэнцкімі выбарамі’2000 і нават папярэднімі мясцовымі выбарамі, калі сярод кандыдатаў, асабліва ў гарадзкіх акругах, быў даволі высокі адсотак прадстаўнікоў «вольных» прафэсіяў і прадпрымальнікаў (апошнія, напрыклад, складалі каля дзесяцёх адсоткаў цяперашняга складу палаты прадстаўнікоў другога склікаданьня). Нарэшце — гэта наўмыснае падштурхоўваньне сяброў выбарчых камісіяў да парушэньня заканадаўства, што мацавала іх ляяльнасьць да існага дзяржаўнага апарату, паколькі тым самым павышаецца верагоднасьць іх перасьледу ў выпадку зьмяненьня палітычнага рэжыму. Прадстаўнікі нізавой намэнклятуры пераўтвараюцца такім чынам у *stakeholders* існага статус-кво і надзейны мэханізм забесьпячэньня патрэбнага выніку ў наступных выбарчых кампаніях ці рэфэрэндумах.

Іншай прычынай, што дазваляла разглядаць мясцовыя выбары як пасьпяховую для ўладаў кампанію, было канчатковае спыненьне «ўнутрырэжымнага плюралізму», якім адрозьнівaліся, напрыклад, выбары ў ПП у 2000 годзе. Гэтым разам улада дамаглася таго, каб на адну выбарчую акругу амаль паўсюдна прыпадаў адзін яе ляяліст. Адсутнасьць унутрыўладнага плюралізму пазбаўляла выбары’2003 апошніх рысаў канкурэнтнага электаральнага працэсу нават у параўнаньні з выбарамі ў ПП у 2000 годзе, дзе ў цэлым шэрагу акругаў мы былі сьведкамі дуэляў паміж альтэрнатыўнымі кандыдатамі ад улады, спаборніцтваў адміністрацыйных і бізнэс-рэсурсаў. Можна зрабіць выснову, што ўва ўнутраным плюралізьме, нават

* Паколькі патрабаваньне закону аб асобным падліку галасоў на папярэднім галасаваньні амаль паўсюдна ігнаравалася, аб памеры парушэньняў можна ўскосна ўявіць па пратаколах падліку галасоў там, дзе асобны падлік усё ж такі адбыўся. Так, у акрузе № 8 па выбарах у Менскую гарадзкую Раду, дзе балятаваліся незалежны кандыдат Сяргей Казлоўскі і камандзір аддзелу ЗАХР Сяргей Хаменка, на двух участках вынікі былі адпаведна 688 на 487 і 874 на 271 голас на карысьць Казлоўскага (па галасаваньні 2 сакавіка) і 56 на 685 і 54 на 570 на карысьць Хаменкі (па папярэднім галасаваньні). Розьніца, такім чынам, сягала дзясяткаў разоў.

** Усе дадзеныя з красавіцкага апытаньня НІСЭПД тут і далей узятыя з сайту НІСЭПД (http://www.iiseps.by/press.html) 26 красавіка 2003 году.

калі ён не перарастае ў адкрытую апазыцыю і яго наступствы абмяжоўваюцца актывізацыяй лабісцкай дзейнасьці асобных груповак, улады ўбачылі ня меншую патэнцыйную небясьпеку, чым у пэрспэктыве прасоўваньня «пазасыстэмнай» апазыцыі ў інстытуты ўлады.

Нарэшце, трэба адзначыць і посьпех улады ў стварэньні атмасфэры сацыяльнай апатыі і абыякавасьці грамадзтва да палітычных працэсаў увогуле і выбараў у прыватнасьці, што стварала ёй дадатковыя магчымасьці дзеля рэалізацыі сваіх палітычных праектаў. У першую чаргу гэтаму паспрыяла фактычнае замоўчваньне перадвыбарнай тэматыкі афіцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі і ўжо традыцыйныя абмежаваньні на выкарыстаньне СМІ кандыдатамі дзеля перадвыбарнай агітацыі. Па-другое, адыграла сваю ролю і прэзэнтацыя мясцовых выбараў афіцыйнымі мэдыямі як «неістотных» з увагі на абмежаванасьць паўнамоцтваў саміх Радаў. Болей за тое, «прадказальнасьць» вынікаў выбараў зьніжала амаль да мінімуму грамадзкія спадзяваньні на тое, што выбары будуць дзейсным сродкам зьмяненьня незадавальняючага для грамадзян стану рэчаў. Як вынік, падала грамадзкая цікавасьць да выбарчых кампаніяў, а самі выбары паступова ператвараліся для выбарцаў у рытуал, што нагадвае працэдуры савецкіх часоў (акурат гэтым можна растлумачыць адначасовае суіснаваньне відавочнай абыякавасьці насельніцтва да выбараў, нізкую патрэбу ў інфармацыі і надзвычай высокага адсотку тых, хто заяўляе пра свой намер браць удзел у галасаваньні). Такім чынам, рост сацыяльнай незадаволенасьці ў грамадзтве не прыводзіў да стварэньня «пратэставага электарату»: электарат у сваёй масе проста пераставаў ўспрымаць выбары ўсур'ёз і, па сутнасьці, загадзя згаджаўся з наперад вядомым вынікам нават тады, калі галасаваў за альтэрнатывы, якія нейкім чынам здолелі трапіць у выбарчыя бюлетэні.

У той жа час, праз набліжэньне фармату правядзеньня выбараў да рытуалу савецкіх часоў, выбарчыя кампаніі паступова страчваюць ролю адпаведнага мэханізму камунікацыі паміж уладамі і грамадзтвам і мацаваньня ўнутранай легітымнасьці палітычнага рэжыму. Прычына ў тым, што паступовае пераўтварэньне выбараў у тэатралізаванае дзеяньне з загадзя вядомым вынікам стварае атмасфэру недаверу да іх у грамадзтве, што паступова пераходзіць у абыякавасьць да самой працэдуры. Як вынік, у адрозьненьне ад папярэдніх часоў, калі перамога на выбарах ці рэфэрэндуме вяла да росту рэйтынгу ўлады на 8—15%*, чарговыя заявы аб пераканаўчай перамозе ўлады і «ўсенародным заахвочаньні» дзяржаўнага курсу ўжо ня робяць адпаведнага ўплыву на масавую сьвядомасьць і не вядуць да рэзкай зьмены палітычных арыентацыяў па прынцыпе «bandwagon effect». Дадзеныя апытаньня НІСЭПД, што былі апублікаваныя ў красавіку 2003 году, засьведчылі, што мясцовыя выбары — гэта першая буйная палітычная кампанія, пасьля якой Лукашэнка страціў прыхільнікаў у грамадзтве. Яго ўласны рэйтынг зьнізіўся з 30,5% у сьнежні 2002 году да 26,2%, што ёсьць рэкордна нізкім паказьнікам за ўсе часы яго прэзыдэнцтва. Толькі 40% з тых выбарцаў, што прагаласавалі за Лукашэнку ў 2001 годзе, гатовыя зноў аддаць за яго галасы. Прычым, нягледзячы на гучныя заявы аб чарговай пераканаўчай перамозе ўладаў, амаль сем дзясятых усіх выбарцаў лічаць, што папулярнасьць уладаў апошнім часам зьнізілася. Яшчэ больш уражвае імклівасьць фармаваньня антылукашэнкаўскай сацыяльнай бальшыні. Так, ажно 64% выбарцаў жадалі ў красавіку 2003 году

* Так, пасьля рэфэрэндуму 1996 году рэйтынг Лукашэнкі павысіўся з 45 да 60%, пасьля выбараў у ПП 2000 году – з 33 да 41%, пасьля прэзыдэнцкіх выбараў'2001 – з 36% да пачатку кампаніі да 48% адразу пасьля яе заканчэньня. Усе дадзеныя – з вынікаў апытаньняў НІСЭПД розных гадоў.

абраньня новага прэзыдэнта і толькі 23% згодныя з тым, каб абраць Лукашэнку яшчэ на адзін тэрмін. Калі параўнаць з дадзенымі двухгадовай даўніны (тады суадносіны тых, хто жадаў і не жадаў абраньня Лукашэнкі на другі тэрмін, былі 36% на 41%), то можна зрабіць выснову аб тым, што колькасьць сацыяльных апанэнтаў рэжыму павялічваецца з хуткасьцю ў 1% за месяц. А паколькі сярэдняя хуткасьць скарачэньня базы яго прыхільнікаў складае толькі прыкладна 0,5% у месяц, то можна меркаваць, што фармаваньне антылукашэнкаўскай бальшыні адбываецца ў першую чаргу за кошт т.зв. «балота», ці выбарцаў, якія дагэтуль ня вызначыліся і не займелі сталых палітычных прэфэрэнцыяў. Размываньне «балота» ў сваю чаргу азначае абмежаваньне магчымасьцяў да аднаўленьня сацыяльнай базы рэжыму. Гэта ўзмацняецца яшчэ і тым, што хутка скарачаецца і базавы электарат Лукашэнкі. Так, ужо толькі 51% пэнсіянэраў зноў гатовыя аддаць за яго свае галасы (у 1998 годзе папулярнасьць прэзыдэнта сярод гэтай групы дасягала 88%). Улічваючы, што пэнсіянэры складаюць каля адной пятай часткі ўсіх выбарцаў, сацыяльная база рэжыму ў іншых групах складае ў сярэднім ня больш за 15—17%.

Далейшае размываньне фэномэну «квазідэмакратычнай легітымнасьці» аўтарытарнай улады падштурхоўвае яе да пошуку больш жорсткіх, таталітарных мэтадаў кантролю за грамадзтвам. Гэта і было прадэманстравана пры канцы сакавіка 2003 году, калі Лукашэнка распачаў (ці, больш дакладна, аднавіў) кампанію па выпрацоўцы новай «дзяржаўнай ідэалёгіі». Дарма што аўтарытарны рэжым па сваёй прыродзе ня здольны легітымізаваць самога сябе ідэалягічнымі сродкамі*, дадзеная кампанія заслугоўвае ўвагі зь некалькіх прычынаў. Першая — гэта ўзьвядзеньне яе ў ранг галоўнага дзяржаўнага прыярытэту. Другая — гэта спэцыфіка «пасланьня» да грамадзтва, асаблівы націск на такія вартасьці і прынцыпы, як калектывізм, традыцыяналізм і нават (амаль па канонах чучхеянства) аўтаркізм**, імкненьне да самаізаляцыі, таксама як і мэсіянскае вызначэньне ролі беларусаў як «духоўных лідэраў» ува ўсходнеэўрапейскім рэгіёне. Іншымі словамі, Лукашэнка імкнецца ўзьвесьці ў ранг дзяржаўнага ідэалу акурат таталітарныя вартасьці, якія легітымізуюць неабмежаванае выкарыстаньне рэпрэсіўнага апарату дзяржавы. Трэцяе — гэта тое, што ў якасьці ідэалу абвяшчаюцца вартасьці, што ўжо губляюць глебу ў палітычнай культуры беларускага грамадзтва. Чацьвёртае — гэта пэўная разгубленасьць самога Лукашэнкі, усьведамленьне ім самім штучнасьці сваіх ідэалягічных пошукаў (так, ужо ў прамове перад Нацыянальным Сходам 16 красавіка 2003 году ён прызнаўся, што сам ня мае ўяўленьня аб тым, якой павінна быць новая дзяржаўная ідэалягічная дактрына). Кволыя спробы аднавіць працу мэханізму «прамываньня мазгоў» сьведчаць толькі аб тым, што раман Лукашэнкі з электаратам амаль канчаткова вычарпаўся. У гэтых умовах галоўным чыньнікам выжываньня яго рэжыму ў будучыні ўяўляецца яго здольнасьць да падтрыманьня ўнутранай скансалідаванасьці ўладнага апарату ды апэратыўнага вынішчэньня ўзьнікаючых палітычных альтэрнатываў.

---

* Гэты клясычны паліталягічны аргумэнт сфармуляваны Хуанам Лінцам, гл.: Linz Juan J. Totalitarian and Authoritarian Regimes. Baltimore: Johns Hopkins University Press, 2001. Падсумаваньне па-расейску ў дачыненьні да лукашэнкаўскай «ідэалёгіі»: гл. мой артыкул «Новое платье короля» ў інтэрнэт-газэце naviny.by. (http://www.naviny.by/node.phtml?index=12528) 1 красавіка 2003 году.

** Так, па некаторых зьвестках, першым наступствам «узмацненьня ідэалягічнай працы» стаў загад абмежаваць міжнародныя кантакты студэнтаў дзяржаўных вышэйшых навучальных установаў.

## Апазыцыя: чарговы крок у замкнёным коле ці вяртаньне надзеі?

Апазыцыйныя сілы цалкам мелі рацыю, калі заяўлялі аб недэмакратычным характары мясцовых выбараў, які адлюстроўваў палітычны клімат у краіне, што імкліва пагаршаўся для апанэнтаў уладаў. У той жа час, гэтыя выбары адбываліся ў значна больш спрыяльным для дэмакратаў сацыяльным кантэксьце, чым прэзыдэнцкія ў 2001 г. Па дадзеных аксіямэтрычнай лябараторыі «Новак» за лістапад 2002 году, упершыню з 1994 году перавага была на баку тых беларускіх выбарцаў, што хацелі б прагаласаваць на мясцовых выбарах за кандыдата — супраціўніка Лукашэнкі. Так, галасаваць супраць уладаў зьбіраліся 38% ад усіх грамадзян і 39% ад тых, хто вызначыўся з сваім удзелам у выбарах. За стаўленікаў Лукашэнкі зьбіраліся галасаваць толькі 32% і 36% адпаведна. Гэтыя лічбы пацьвярджаліся і апытаньнямі НІСЭПД, згодна зь якімі расклад сілаў быў 31% супраць 34% на карысьць апанэнтаў Лукашэнкі. Згодна з дадзенымі «Новак», на першым месцы па электаральных сымпатыях знаходзіліся незалежныя кандыдаты — адпаведна 27 і 28%; за імі ішлі кандыдаты ад улады — 21 і 24%; потым — кандыдаты ад шырокага блёку грамадзянскіх сілаў (калі б такі ўзьнік) — 17 і 19%; нарэшце — кандыдаты ад палітычнай апазыцыі — 9 і 10%. У той жа час, рэйтынгі асобных партыяў знаходзіліся ніжэй за ўзровень памылкі выбаркі[1].

Аднак нават пры прыхільнасьці грамадзтва, чаго рэальна магла дамагчыся апазыцыя на гэтых выбарах ува ўмовах, калі адміністрацыйны рэсурс быў цалкам манапалізаваны ўладамі? Выбарчая кампанія нават пры такіх варунках можа служыць пашырэньню базы падтрымкі палітычнай контраэліты, што ў пэрспэктыве можа паспрыяць працэсу пераходу да дэмакратыі. Таму апазыцыя нават у найнеспрыяльнейшых умовах павінна ўдзельнічаць у выбарах, прапанаваць грамадзтву прыцягальную альтэрнатыву і нараджаць у людзях упэўненасьць у тым, што з дапамогай выбараў можна нешта зьмяніць. Зважаючы на недэмакратычны характар электаральнага спаборніцтва, палітычным партыям належала сканцэнтраваць сваю ўвагу ня столькі на спробе перамагчы, колькі на распрацоўцы папулярнай альтэрнатывы палітычнаму курсу Лукашэнкі. Трэба было таксама паклапаціцца пра ўлучэньне ў праграмы сваіх кандыдатаў прапановаў па рашэньні мясцовых праблемаў; пошук новых людзей, якія б удзельнічалі ў кампаніі ў якасьці незалежных кандыдатаў, але мелі б падтрымку з боку палітычных партыяў. І нарэшце — пра фармаваньне кааліцыі з удзелам партыйных і непартыйных кандыдатаў у сталіцы і гарадох, дзе падтрымка ідэй дэмакратыі і незалежнасьці зьяўляецца найвышэйшай.

Дарма што стратэгічная мэта апазыцыі (якую можна вызначыць як зьмяненьне балянсу сілаў на палітычнай сцэне шляхам забесьпячэньня ўласнага ўплыву ў «сыстэмнай» палітыцы) не была дасягнутая, можна, аднак, вызначыць некалькі яе тактычных посьпехаў, пераважна маральна-псыхалягічнага пляну. Да іх можна аднесьці тое, што апазыцыя выкарыстала перадвыбарную кампанію (у той ступені, у якой яна ўдзельнічала) дзеля нарошчваньня сваёй камунікацыі з грамадзтвам, што ў будучыні можа спрыяць яе выхаду з сацыяльнай, калі не палітычнай, ізаляцыі. Наступным дасягненьнем стала ўсьведамленьне ўласнай патэн-

[1] Гл.: Ровда В. Через урну и прессинг // http://www.naviny.by/node.phtml?index=12636. 2003. 3 красавіка.

цыйнай «абранасьці», што было адзначана як лідэрамі, так і шараговымі актывістамі апазыцыйных арганізацыяў. Апазыцыя, такім чынам, пачала пазбаўляцца ад пэўнага комплексу ўласнай непаўнавартасьці, што ствараўся раней рэальнай перавагай сымпатыяў электарату на карысьць Лукашэнкі. Многія апазыцыйныя кандыдаты выдатна «адпрацавалі» кампанію, здолелі стварыць пра сябе дадатнае меркаваньне сярод выбарцаў, і калі б фальсыфікацыя вынікаў не была гэтым разам настолькі нахабнай, шмат хто прайшоў бы ў дэпутаты. То бок, у электаральным пляне працаваць на выбарах апазыцыя ўжо навучылася, і гэта ўжо лепш, чым тое, што мы бачылі на прэзыдэнцкіх выбарах у 2001 г. Дзеля доказу апошняй высновы зноў прааналізуем дадзеныя тагачаснага апытаньня НІСЭПД. Так, толькі 9,9% выбарцаў прагаласавалі за кандыдатаў — апанэнтаў прэзыдэнта Лукашэнкі. У той жа час, задамо сабе пытаньне: а якая колькасьць выбарцаў увогуле мела шанец прагаласаваць за такіх кандыдатаў? Напрыклад, у Менску (дзе выбарчыя акругі былі найбуйнейшымі ў краіне) апазыцыйныя кандыдаты былі прадстаўленыя толькі ў 32 з 55 акругаў, што складала б прыкладна 9% ад усяго нацыянальнага электаральнага поля. Улічваючы выключна нізкую прысутнасьць апазыцыі ў выбарах у абласныя Рады (дзе выбарчыя акругі былі зноў жа буйнымі), астатнія некалькі соцень апазыцыйных кандыдатаў балятаваліся пераважна па маленькіх акругах у гарадзкія і сельскія Рады, што дазваляе ацаніць «пакрыцьцё» электаральнай тэрыторыі апазыцыяй на ўзроўні 13—15%. Калі параўноўваць гэтую лічбу з 9,9% тых, хто прагаласаваў за апазыцыю, вынікае даволі парадаксальная выснова: там, дзе апазыцыя ўсё ж трапіла ў выбарчыя бюлетэні, за яе прагаласавала пераважная большасьць выбарцаў! І нягледзячы на сумны агульны вынік выбараў, гэта ўжо можна занесьці апазыцыі ў актыў. Па-трэцяе, выбары выявілі адсутнасьць адмоўнага ўспрыняцьця партыйных брэндаў (нягледзячы на дэкляраванае ў апытаньнях імкненьне галасаваць за незалежных кандыдатаў). Як аказалася, плыні нэгатыўнай, часам скандальнай інфармацыі аб дзейнасьці апазыцыі мелі абмежаваны ўплыў на грамадзкую думку. Тут апазыцыйныя партыі, магчыма, нават «скарысталіся» з уласнай непазнавальнасьці ў грамадзтве, якая старанна ствaралася праз блякаду інфармацыі аб іх дзейнасьці з боку афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі. У рэшце рэшт, партыі атрымалі магчымасьць пачаць «ляпіць» сваё сацыяльнае аблічча з чыстага аркуша. Нарэшце, мясцовыя выбары паказалі наяўнасьць сацыяльнай базы для апазыцыі на пэрыфэрыі і нават у сельскай мясцовасьці, аб чым сьведчаць асобныя пераканаўчыя перамогі яе прадстаўнікоў там, дзе адміністрацыйны рэсурс усё ж такі ўдалося «зламаць»*.

Такім чынам, апазыцыя зрабіла істотны крок па выхадзе з сацыяльнай ізаляцыі. Гэтага, аднак, аказалася недастаткова для таго, каб прарваць ізаляцыю палітычную, дзеля чаго ў беларускіх варунках мала проста заваяваць сымпатыі выбарцаў. Беларуская апазыцыя пакуль што аказалася няздольнай да абароны ўласных палітычных посьпехаў неінстытуцыйнымі сродкамі. У той жа час і грамадзтва пакуль што не выявіла памкненьняў да абароны ўласнай волі, выказанай праз выбарчыя бюлетэні, на вуліцах. Безумоўна, на гэта былі аб'ектыўныя прычыны (такія, як грамадзкая апатыя, нізкі ўзровень сацыяльнай напружанасьці), якія не дазвалялі апанэнтам уладаў разьлічваць на высокую вулічную актыўнасьць. Да таго ж, грамадзтва ад пачатку ставілася з абыякавасьцю да мясцовых выбараў. Нягледзячы на

* Напрыклад, Алесь Міхалевіч з Партыі БНФ, які стаў дэпутатам Пухавіцкай раённай Рады з вынікам у больш за 60% галасоў, зазначыў, што яго перамога стала магчымай дзякуючы пэрыяду «міжуладзьдзя» ў раёне, калі наноўпрызначаны старшыня адміністрацыі яшчэ не пасьпеў адрэгуляваць адміністрацыйнай машыны.

адносна высокі адсотак тых, хто ўзяў у іх удзел, прыкладна чатыры пятыя выбарцаў лічылі, што мясцовыя ўлады аказваюць малы ці наагул аніякага ўплыву на іх жыцьцё. У той жа час, мабілізацыя грамадзтва на абарону вынікаў выбараў, нават пры больш буйным маштабе кампаніі, патрабуе ад апазыцыі іншага стылю перадвыбарнай кампаніі, чым той, які быў прадэманстраваны ўзімку 2003 году. Па-першае, такая кампанія не павінна нагадваць звычайную, руцінную акцыю, якая тычыцца толькі асобных кандыдатаў, а прыцягваць да сябе ўвагу ўсяго грамадзтва, што магчыма толькі тады, калі яна ўключае ў сябе моцны палітычны элемэнт, сапраўдную атаку на ўлады, якая б адлюстроўвала назапашанае ў народзе незадавальненьне існым станам рэчаў і якая б пазыцыянавала апазыцыю як сваіх сярод выбарцаў, абароньнікаў іх уласных інтарэсаў. Па-другое, такая кампанія павінна быць агрэгаванай — гэта азначае, што яна павінна весьціся ня толькі ад імя адзінай сілы, зь якой грамадзтва магло б сябе атаясаміць, але і закранаць супольныя для бальшыні выбарцаў пытаньні ў найразьнейшых выбарчых акругах і населеных пунктах. У адваротным выпадку, апазыцыйная кампанія ператвараецца ў «конкурс прыгажосьці» паміж асобнымі кандыдатамі, што выключае магчымасьць мабілізацыі грамадзтва на абарону вынікаў выбараў. Па-трэцяе, каб хаця на штонебудзь разьлічваць у гарадох, трэба было ствараць вялізарную перавагу ў дзясяткі адсоткаў над кандыдатамі ад улады. А значыць, гарадзкі апазыцыйны рэсурс павінен быў быць максымальна сканцэнтраваны і аб’яднаны. Па-чацьвёртае, палітычная кампанія павінна быць татальнай і весьціся па ўсёй краіне. Тая ж самая лічба ў 9,9% выбарцаў, што прагаласавалі за апанэнтаў улады, выразна кантрастуе зь лічбай у 38%, што зьбіраліся гэта зрабіць напярэдадні выбараў. «Згубленыя» галасы амаль трэцяй часткі выбарцаў і прыкладна трох чвэрцяў патэнцыйнага апазыцыйнага электарату сталі сьледзтвам дэфіцыту прапановы, у стварэньні якога ўлады можна вінаваціць толькі часткова.

Такім чынам, можна вызначыць асноўныя недахопы палітычнай стратэгіі апазыцыі, прадэманстраваныя падчас выбарчай кампаніі, якія перашкаджаюць яе ператварэньню ў сілу, здольную да ажыцьцяўленьня прарыву ў палітычным разьвіцьці краіны. Першы недахоп — гэта няздольнасьць да аб’яднаньня. Партыі вырашылі працаваць у аўтаномным рэжыме. На мой погляд, гэты фармат быў не зусім адэкватны сытуацыі, часу, спэцыфіцы мясцовых выбараў у Беларусі і собскім магчымасьцям. Сытуацыя патрабавала аб’яднаньня ўсіх дэмакратычных сілаў вакол супольнай ідэі і адзінага сцэнара дзеяньняў. Тым ня менш партыйныя лідэры ўжо каторы раз прадэманстравалі негатовасьць дамовіцца міжсобку і выступіць адзінай сілай на выбарах. Гаворка ідзе ня толькі пра цэнтральныя офісы, але і пра рэгіянальныя структуры, шмат зь якіх ня здолелі прыйсьці да кампрамісу нават у пытаньні пра разьмеркаваньне выбарчых акругаў.

Другая вада, што вынікала зь першай, гэта ператварэньне перадвыбарнай кампаніі ў «конкурс прыгажосьці». Выбраны фармат кампаніі быў у першую чаргу прадыктаваны пераважна вузкапартыйнымі мэтамі: пашырэньне базы электаральнай падтрымкі, павышэньне рэйтынгаў вядомасьці і даверу той ці іншай партыі ці, у шэрагу выпадкаў, нават выключна асобных іх прадстаўнікоў (што адсоўвала на другі плян прамоцыю партыйных брэндаў на карысьць індывідуальнага пазыцыянаваньня асобных кандыдатаў). Таму стратэгіі ўсіх без вынятку партыяў і бальшыні іх кандыдатаў адрозьніваліся моцным палітычным пазыцыянаваньнем, то бок імкненьнем максымальна прасунуць собскія партыйныя лэйблы, праграмныя мэты і лёзунгі[2]. У самім гэтым факце няма нічога адмоўнага, калі не лічыць таго, што

[2] Гл.: Чернов В. У партий есть один выбор: выживание или работа на общую победу // Белорусский рынок. 2003. 10 марта.

прамоцыя партыйных брэндаў не балянсавалася прамоцыяй брэнду дэмакратычнай апазыцыі (якой як адзінага і скансалідаванага суб'екта палітычнага працэсу на той момант дэ-факта і не існавала).

Акурат гэтыя два недахопы і стварылі сытуацыю, пры якой у кампаніі адсутнічаў агульнанацыянальны элемэнт, а значыць, нягледзячы на ўдзел асобных сваіх кандыдатаў, апазыцыя як палітычны фактар была слаба ў ёй прадстаўленая. Адсутнасьць адзінага альтэрнатыўнага палітычнага суб'екта ў кампаніі не дазваляла дэмакратычнай апазыцыі прыцягнуць увагу да атакаў улады на яго, а значыць, рабіла мабілізацыю грамадзтва на супрацьстаяньне парушэньням загадзя немагчымай. У выніку, факты злоўжываньня аказаліся па-за ўвагай грамадзтва. Так, толькі 25% выбарцаў прыйшлі па кампаніі да высновы, што ў кандыдатаў адсутнічалі роўныя ўмовы, 24% адзначылі, што ўлады падтрымлівалі кагосьці ў іх акрузе (калі насамрэч «праўладныя» кандыдаты былі бадай у кожнай акрузе), і 19% згадзіліся, што цягам выбараў былі дапушчаныя масавыя парушэньні закону (апошняя лічба, аднак, амаль супадае з нашай ацэнкай «пакрыцьця» электаральнага поля апазыцыяй).

Трэці недахоп — гэта геаграфічная аднабаковасьць кампаніі. Калі б апазыцыя не зацыклівалася на буйных гарадох, а максымальна выкарыстоўвала б гэтую перадвыбарную кампанію для апрацоўкі сельскага электарату, то, як паказваюць вынікі нават гэтых выбараў, можна было б дасягнуць больш спрыяльнага дзеля апазыцыі выніку.

Аднак галоўнае, што выбарчы працэс у Беларусі трансфармаваўся такім чынам, што выкарыстаньне яго дзеля вырашэньня вузкапартыйных, карпаратыўных ці пэрсанальных задачаў беспэрспэктыўнае. Пры той тактыцы, што выбрала ўлада (а яна была цалкам прадказальная), барацьба па прынцыпе «кожны сам за сябе» была абсалютна бессэнсоўная. Безумоўна, магчымасьці дзеля пасьпяховай рэалізацыі гэтай тактыкі існуюць. У адрозьненьне ад часоў трох-чатырохгадовай даўніны, калі само азначэньне «апазыцыя» было блага прадавальным палітычным брэндам, беларускае грамадзтва паступова пазбаўлялася ад нэгатыўных стэрэатыпаў. Так, у красавіку 2003 году сукупны рэйтынг сямёх асноўных апазыцыйных партыяў упершыню перавысіў рэйтынг самога Лукашэнкі, падняўшыся да адзнакі ў 27%*. Аднак той факт, што рэйтынг аніводнай з гэтых партыяў не перавышаў узроўню статыстычнай памылкі, сьведчыць аб тым, што посьпеху можна будзе дасягнуць толькі пры адзінстве дзеяньняў.

## «Трэцяя сіла»: міт ці рэчаіснасьць?

Апошні пункт аналізу зьмяненьня палітычнага раскладу пасьля мясцовых выбараў'2003 мусіць закрануць пэрспэктывы фармаваньня т.зв. «трэцяй сілы» ў беларускай палітыцы, аб чым вялася даволі жвавая дыскусія напярэдадні кампаніі**. Размовы аб магчымасьці ці неабходнасьці зьяўленьня новых актараў і суб'ектаў палітычнага працэсу ў альтэрнатыўным афіцыйнаму палітычным лягеры (пераважна зь лягеру былых ляялістаў рэжыму, знакавых асобаў, што здабылі вядомасьць у афіцыйных органах улады, такіх, як палата прадстаўнікоў, і

* ПКБ – 4,3%, АГП – 4,7%, БСДГ – 4,5%, БНФ – 3,9%, КХП-БНФ – 2,6%, БСДП – 3%, Партыя працы – 3,7%.

** Зазначым, што размовы аб стварэньні «трэцяй сілы» звычайна вядуцца ў двух аспэктах. Першы – гэта ўзмацненьне існай палітычнай апазыцыі за кошт прыцягненьня новых грамадзкіх, элітных групаў, пашырэньня ўплыву на новыя сацыяльныя слаі. Другі – гэта ўтварэньне новых палітычных сілаў, часам альтэрнатыўных і нават канкуруючых з «традыцыйнай» апазыцыяй.

перайшлі да больш незалежнага вызначэньня ўласнай палітычнай ролі) пачаліся яшчэ некалькі гадоў таму і адлюстроўвалі пэўную незадаволенасьць некаторых сэгмэнтаў няўрадавага сэктару існым станам апазыцыі, яе стратэгіяй і тактыкай, а таксама страту веры ў магчымасьці апошняй да зьдзяйсьненьня палітычных зьменаў. Унутраныя крызысныя тэндэнцыі, што сталі відавочнымі ў апазыцыйным лягеры пасьля паразы на прэзыдэнцкіх выбарах у 2001 г., толькі, здавалася б, стымулявалі пошук альтэрнатыўных усталяваных лідэрам і партыямі фігурантаў у гэтым сэгмэнце палітычнага поля. Цалкам зразумела, што такія размовы крытычна сустракаліся ў лягеры «традыцыйнай» апазыцыі, якая бачыла ў ёй хіба што «пятую калёну» ўладаў ува ўласным стане. Аднак у той жа час «нажніцы» паміж патэнцыйным і рэальна існым апазыцыйнымі электаратамі ў грамадзтве, здавалася б, стваралі дзеля яе ўзьнікненьня спрыяльную глебу. Абсалютным лідэрам у прэтэнзіях на стварэньне «трэцяй сілы» стала ў той час дэпутацкая група «Рэспубліка» ў палаце прадстаўнікоў, якая зь цягам часу ператварылася ўва ўсё больш заўважнага крытыка ўладаў і якая зрабіла шэраг крокаў на збліжэньне зь існай пазасыстэмнай апазыцыяй.

Зазначым адразу, што сьцьверджаньні аб тым, што «трэцяя сіла» можа ператварыцца ў «пятую калёну» ўлады, былі спраставаныя дзеяньнямі апошняй падчас мясцовых выбараў. Мэтанакіраванае выцісканьне незалежных кандыдатаў, што ў пэрспэктыве маглі ўтварыць сыстэмную апазыцыю, пачалося яшчэ на папярэдніх стадыях передвыбарнай кампаніі. Кажучы пра тактыку ўладаў на мясцовых выбарах, незалежныя аналітыкі аддалі шмат увагі масавай нерэгістрацыі апазыцыйных кандыдатаў. У той жа час быў амаль не заўважаны той факт, што ня менш урэзаны быў і сьпіс тых, каго па сутнасьці можна было аднесьці да патэнцыйнай «фронды» — карпаратыўных лабістаў, прадпрымальнікаў, вылучэнцаў найбольш лібэральных дэпутатаў ПП. Так, не былі зарэгістраваныя кандыдатамі памочнікі дэпутатаў Кірылы Халопіка, Васіля Хрола, Аляксея Ваганава. Ня трапіў у сьпіс прэтэндэнтаў у Менскую гарадзкую Раду Дзьмітры Вус — адзін з найбольш энэргічных дэпутатаў ранейшага скліканьня, які з трыюмфам выйграў папярэднія выбары. Відавочна, што ўлады ўзброіліся тактыкай: хто ня з намі (дакладней, не ад нас), той супраць нас, — прычым права мець «сваіх» лабістаў у Менскай гарадзкой Радзе былі пазбаўленыя ўсе райвыканкамы. У выніку, у Менску з 55 акругаў у 37 прысутнічаў толькі адзін беспартыйны кандыдат, і магчымасьць прасунуць патэнцыйна альтэрнатыўнага палітычнага гульца, які на пэўны час захоўваў выгляд лаяльнасьці да ўладаў, была зьведзеная на нішто. Іншымі словамі, выбарчыя камісіі атрымалі выразную ўстаноўку наконт таго, хто менавіта з кандыдатаў ішоў «ад улады». Ня выключана, што гэткім чынам прэзыдэнцкая адміністрацыя імкнулася забясьпечыць фармальную легітымнасьць выбараў, разьлічваючы на высокі ўзровень грамадзкай антыпатыі да палітычных партыяў акурат у сталіцы, дзе 81% рэспандэнтаў дэкляраваў імкненьне прагаласаваць за беспартыйнага кандыдата, у адрозьненьне ад 73 па краіне.

Такое абцінаньне сьпісаў кандыдатаў прывяло да рэзкага пагаршэньня адносінаў «франдэраў» зь менскай мэрыяй, якая паставіла іх перад вельмі непрыемным фактам. Дэпутатам, што прэтэндавалі на незалежнасьць ад уладаў, было паказана, які сцэнар можа быць рэалізаваны да іх на парлямэнцкіх выбарах у 2004 годзе, калі яны ня выкажуць пэўнай ляяльнасьці да ўлады. Наступным крокам дэмаралізацыі ўнутры фронды стала распаўсюджаньне чутак аб тым, што на наступныя выбары рыхтуецца стоадсоткавая замена складу Палаты. Дэпутаты-«франдэры» сталі перад выбарам: ці адмовіцца ад незалежнай ролі, ці нейкім чынам арганізавацца і ўступіць у палітычную гульню. Зазначым, што група «Рэс-

публіка» апошнім часам пайшла па іншым шляху. Так, яе збліжэньню з палітычнымі партыямі спрыяла правядзеньне круглага стала зь іх удзелам у сьценах палаты прадстаўнікоў у лютым 2003 году. Сама яго тэма, «Незалежная Беларусь яднае нас», сьведчыла аб імкненьні да пошуку пэўнага палітычнага мінімуму, які б стаў асновай для мацаваньня кансэнсусу паміж усімі дэмакратычнымі і незалежніцкімі сіламі краіны. Адзначым таксама і ўдзел дэпутатаў «Рэспублікі» ў вулічных акцыях у сакавіку 2003 году, а таксама адкрыты выступ дэпутатаў В. Фралова, У. Парфяновіча і У. Навасяда супраць падпісаньня канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы Расеі і Беларусі. Такім чынам, збліжэньне сьветапогляду зародкаў сыстэмнай і існай пазасыстэмнай апазыцыі было відавочнае. Нарэшце, група «Рэспубліка» ў красавіку 2003 году выступіла і з ініцыятывай аб стварэньні новай апазыцыйнай партыі.

Але ці значыць гэта, што на базе «фронды» ў ПП і ў мясцовых Радах магла узьнікнуць новая сыстэмная апазыцыя? Такі сцэнар разьвіцьця падзеяў выглядаў малаверагодным зь некалькіх прычынаў.

Па-першае, «фронда» ад апазыцыі розьніцца тым, што яна арыентаваная на разьвязаньне дробных праблемаў, другасных пытаньняў, а не на глябальнае зьмяненьне статус-кво. Яна можа сутыкнуцца зь яшчэ вастрэйшай праблемай адсутнасьці ўласнай палітычнай стратэгіі, чым тая, што адлюстроўвала крызыс «традыцыйнай» апазыцыі. Па-другое, у «фрондзе» так ці іначай будзе пераважаць намэнклятура, якая ў беларускіх умовах адрозьніваецца асьцярожнасьцю, якая мяжуе зь бяззубасьцю. Яе пераход у стан апазыцыі немагчымы, пакуль ня здарыцца заўважнага аслабленьня пазыцыяў улады. Па-трэцяе, каб уяўляць сабой рэальную палітычную сілу, ёй спатрэбяцца палітычныя структуры і пэўная ідэалёгія, што яна можа пазычыць толькі ў дзейнай пазасыстэмнай апазыцыі. Аднак у ідэалягічным пляне існая беларуская апазыцыя выразна структурызаваная, што робіць узьнікненьне новага брэнду малаверагодным (аб чым ускосна кажа і папярэдняя назва партыі, якую плянавалі ўтварыць дэпутаты групы «Рэспубліка» — «За годнае жыцьцё»). У ёй прысутнічаюць усе магчымыя палітычныя плыні (кансэрватары, лібэралы, сацыял-дэмакраты, нават камуністы). Гэта сьведчыць аб тым, што ўзьнікненьне новай сілы будзе азначаць пачатак барацьбы за існыя палітычныя брэнды. Таксама варта адзначыць тую акалічнасьць, што чалавечы патэнцыял апазыцыйнага асяродзьдзя і няўрадавага сэктару быў выключна абмежаваны. Таму фармаваньне новых структураў можа вырасьці і ў канкурэнцыю за чалавечыя рэсурсы. Нарэшце, паступовае размываньне сацыяльнага «балота» пазбаўляла патэнцыйную «трэцюю сілу» электаральных рэсурсаў, бо ўзьнікаючай антылукашэнкаўскай электаральнай бальшыні занадта «мяккая» апазыцыя можа быць чужая. У той жа час, выбары'2003 паказалі, што і інсайдэрскія рэсурсы ўнутранай «фронды» былі перабольшаныя гэтаксама, як два гады таму да таго перабольшваліся рэсурсы «намэнклятуры».

Таму найбольш рэальны шлях узмацненьня апазыцыі — гэта яе якаснае ўмацаваньне ў рамках існых структураў, а не ў стварэньні новых, якія, дарэчы, могуць быць проста зьліквідаваныя «ў зародку» — яшчэ на этапе іх рэгістрацыі. Але ж безумоўна, што ўзмацненьне апазыцыі немагчыма без пашырэньня яе кадравага складу і выпрацаваньня трывалых прынцыпаў і мэханізмаў каардынацыі і аб'яднаньня замест тых, што не перажылі палітычнага сэзону'2001.

## Пэрспэктывы разьвіцьця палітычнай сытуацыі і трансфармацыі палітычнага рэжыму пасьля мясцовых выбараў

Адметнасьцю новага цыклю, што распачаўся вясной 2003 году ў палітычным жыцьці Беларусі, было тое, што цягам яго мусіць вырашыцца пытаньне пра працяг палітычнай кар'еры прэзыдэнта Лукашэнкі, а значыць, і пра лёс існага ў Беларусі палітычнага рэжыму. Ці варта чакаць ад выбараў, што яны стануць фактарам палітычных зьменаў? Ува ўмовах страты «квазідэмакратычнай легітымнасьці» ўладам не застаецца іншага выйсьця, як пераўтварыць і парлямэнцкія, і прэзыдэнцкія выбары ў рытуальную (і як вынік малазьмястоўную) працэдуру з запраграмаваным вынікам. Вельмі верагодна, што гэта адбудзецца па ўжо вядомым сцэнары: адсячэньне найбольш рэальных кандыдатаў і палітычных структураў ад удзелу ў кампаніі на стадыі рэгістрацыі і давершаньне справы падчас галасаваньня сродкамі абсалютнага кантролю над выбарчымі камісіямі і працэсам падліку галасоў. Абсалютная манапалізацыя кантролю за выбарчым працэсам з боку ўладаў пакуль што робіць пэрспэктыву шокавых выбараў у Беларусі малаверагоднай. Як трапна заўважыў Валер Карбалевіч, апазыцыя можа ніколі не даведацца аб уласнай перамозе. У той жа час, калі працягнецца зьмяненьне балянсу сілаў паміж прыхільнікамі і апанэнтамі рэжыму на карысьць апошніх, будзе расьці і верагоднасьць таго, што мэханізмы адміністрацыйнага рэсурсу рана ці позна не спрацуюць.

Аднак пэрспэктывы палітычнага разьвіцьця краіны, таксама як і ход найбліжэйшых выбарчых кампаній, беспасярэдне вызначацца пасьля таго, як вырашыцца галоўнае ў 2003 годзе палітычнае пытаньне: ці адбудзецца рэфэрэндум па скасаваньні абмежаваньняў на заняцьцё пасады прэзыдэнта двума тэрмінамі, што дасьць, у выніку дадатнага адказу, прэзыдэнту Лукашэнку магчымасьць падоўжыць палітычную кар'еру, а гэта значыць — і захаваць цяперашні палітычны рэжым. Верагоднасьць такога рэфэрэндуму вызначаецца, па-першае, той акалічнасьцю, што іншыя варыянты пераадолець канстытуцыйнае абмежаваньне ў Лукашэнкі адсутнічаюць*. Па-другое, стварыўшы пэрсаналізаваную сыстэму ўлады, у якой адзін чалавек увасабляе ўвесь палітычны рэжым, Лукашэнка ня можа дазволіць сабе мець пераемніка. Пераемнік, як, скажам, у расейскім варыянце, выконвае дзьве функцыі. Першая — гэта захаваньне ўсталяваных правілаў палітычнай гульні. Другая — гэта захаваньне балянсу сілаў, які склаўся ў рамках папярэдняга кіраваньня. Парадокс беларускай сытуацыі, у якой прэзыдэнт — гэта адзінаасобны ўладар дзяржавы, у тым, што акурат кансэрвацыя правілаў гульні, іншымі словамі, палітычных інстытутаў, пры любым новым прэзыдэнту карэнным чынам зьмяняе палітычны расклад. Лукашэнка, калі пойдзе на варыянт пераемніка, мусіць перадаць яму нічым не абмежаваную ўладу, а ў такім выпадку і ён, і атачэньне робяцца бездапаможнымі перад гэтай уладай. Нельга выключаць, што «пераемнік» не ўтрымаецца перад спакусай выкарыстаць былога прэзыдэнта як «ахвярнага казла» за тыя цяжкасьці, зь якімі сутыкнецца краіна ў постлукашэнкаўскую эпоху. Па-трэцяе, Лукашэнка, дарма што ягоны электарат імкліва скарачаецца, можа аказацца ў «папулісцкай пастцы», значыць — спакусіцца на легітымізацыю ўлады праз народ, дзеля чаго яму неабходна стала падсілко-

* Адпаведны артыкул Канстытуцыі можа быць зьменены выключна праз рэфэрэндум.

ўваць сваю электаральную базу папулісцкімі дзеяньнямі: інакш і ў грамадзтва, і ў элітаў зьнікне ўпэўненасьць у непераможнасьці прэзыдэнта, якая цяпер іх дэмабілізуе.

Аптымальны для Лукашэнкі тэрмін для правядзеньня рэфэрэндуму быў увосень 2003 году. Гэта быў найзручнейшы час для самога Лукашэнкі, бо расейская палітычная эліта была занятая сваімі праблемамі (выбарамі ў Думу ў сьнежні 2003 году, адразу пасьля якіх, вясной 2004–га, надыйшлі прэзыдэнцкія), што мінімізавала верагоднасьць актыўнага супрацьдзеяньня асноўнага замежнага гульца на беларускім палітычным рынку ў гэты час. Заўважым, што вынік рэфэрэндуму, калі ён усё ж быў абвешчаны, ня мог выклікаць ілюзіяў, нягледзячы нават на непрыманьне гэтай ідэі беларускім грамадзтвам. У беларускіх умовах галоўным чыньнікам перамогі на выбарах (і рэфэрэндумах) ёсьць не галасаваньне, а падлік галасоў. Пры любым выніку рэфэрэндуму (і гэтым ён адрозьніваецца ад выбараў) кіраўнік дзяржавы застаецца на сваёй пасадзе пасьля яго правядзеньня як мінімум да канца свайго тэрміну паўнамоцтваў. А гэта значыць, што на любога прадстаўніка ўлады, які не забясьпечыў спадзяванага выніку, з боку прэзыдэнцкіх структураў адразу абрынуцца рэпрэсіі. Таму можна ўявіць, што фармат рэфэрэндуму ня будзе кардынальна адрозьнівацца ад усенароднага галасаваньня ў лістападзе 1996 году. Гіпатэтычна перашкодзіць правядзеньню рэфэрэндуму маглі, на мой погляд, наступныя акалічнасьці.

Першае — гэта рэзкі рост сацыяльнай напружанасьці ў грамадзтве, які прывядзе да таго, што малапапулярная палітычная кампанія справакуе пераўтварэньне пасіўнай, лятэнтнай сацыяльнай апазыцыі ў актыўную і яўную. У гэтых варунках рэфэрэндум толькі падагрэе працэсы зьмены палітычнага рэжыму. Але вельмі малаверагодна, што чыньнікі для такога разьвіцьця падзеяў склаліся б за кароткі адрэзак часу. Больш верагодным уяўляўся сцэнар, пры якім Лукашэнка не рызыкне пайсьці на рэфэрэндум ува ўмовах, калі дзеля такога кроку ён ня здолее атрымаць вонкавай палітычнай і фінансавай падтрымкі, у першую чаргу — з боку Расеі. Цэлы шэраг фактараў указваў на тое, што прэзыдэнт Расеі Ўладзімер Пуцін мог адмовіцца ад падтрымкі свайго беларускага калегі ў гэтай справе, у тым ліку і таму, што гэты крок сапсаваў бы стасункі Расеі зь некаторымі заходнімі дзяржавамі (асабліва з Злучанымі Штатамі, якія апошнім часам узмацнілі крытыку беларускага рэжыму), што зашкодзіць нармалізацыі расейска–амэрыканскіх дачыненьняў пасьля іх крызысу, выкліканага вайной у Іраку*. Аднак нават і ў гэтых абставінах, без блаславеньня расейскай палітычнай эліты, Лукашэнка ўсё ж мог наважыцца правесьці рэфэрэндум. Але ідучы на гэта ўва ўмовах ужо поўнай вонкавай ізаляцыі і адсоўваючы прэзыдэнцкія выбары на некалькі гадоў, Лукашэнка, безумоўна, сур'ёзна рызыкаваў. Тры гады маглі аказацца дастатковым тэрмінам, каб змабілізаваць намаганьні ўнутранай апазыцыі і вонкавых гульцоў, зацікаўленых у зьмене палітычнага рэжыму ў Беларусі. Таму цалкам магчымым уяўляўся яшчэ адзін варыянт паводзінаў беларускага прэзыдэнта: адразу пасьля рэфэрэндуму абвясьціць пра датэрміновыя прэзыдэнцкія выбары, шанцы прайграць якія ў Лукашэнкі былі мінімальныя**. Апошняе можна было прагназаваць з той прычыны, што ў такі кароткі тэрмін наўрад ці народзяцца якія–

* Аднак галоўны зь іх - гэта тое, што Пуцін тады не даваў згоды на рэфэрэндум па ўхваленьні канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы, які Лукашэнка мог скарыстаць і для ўнутрыбеларускага рэфэрэндуму.

** Датэрміновыя прэзыдэнцкія выбары да 2004 г. былі немагчымыя па Канстытуцыі без адстаўкі прэзыдэнта, але гэтую акалічнасьць таксама можна зьмяніць праз рэфэрэндум. * Датэрміновыя прэзыдэнцкія выбары пакуль што немагчымыя па Канстытуцыі без адстаўкі прэзыдэнта, але гэтую акалічнасьць таксама можна зьмяніць праз рэфэрэндум.

кольвек падводныя плыні ўсярэдзіне намэнклятуры, апрача таго, апазыцыю і вонкавых актараў такое разьвіцьцё падзеяў магло засьпець зьнянацку, што перашкодзіць зьместоўнаму ўдзелу альтэрнатыўных кандыдатаў у перадвыбарнай кампаніі. Калі б ажыцьцявіўся акурат гэты сцэнар, выбары найхутчэй канчаткова згубілі ролю мэханізму дасягненьня палітычных пераменаў, а канфрантацыя паміж прыхільнікамі і апанэнтамі існага рэжыму канчаткова перайшла ў поле пазасыстэмнай палітыкі.

Калі б абмежаваньне тэрмінаў знаходжаньня на прэзыдэнцкай пасадзе ўсё ж не было скасавана, Лукашэнку не засталося б нічога іншага, як усё ж такі прызначыць умоўнага пераемніка і дачакацца канца ўласных паўнамоцтваў у 2006 годзе. Пры такім варыянце Беларусь найхутчэй чакала б палітычная стагнацыя, пры якой сыстэма ўлады перажыла б толькі касмэтычныя зьмяненьні, а базавы расклад сілаў паміж дзяржаўнай бюракратыяй, з аднаго боку, і дэмакратычнай апазыцыяй ды грамадзтвам, зь іншага, хутчэй за ўсё застаўся б нязьмененым.

Улада пры такім разьвіцьці падзеяў пярэйдзе да лукашэнкаўскай намэнклятуры. Дарма што прыход да ўлады апазыцыі найбольш верагодны акурат у выбарах «без Лукашэнкі», якраз такія выбары найхутчэй справакуюць імкненьне асобных плыняў у яе лягеры да выкананьня вузкапартыйнага мінімуму. Вырашыўшы, што яе галоўная мэта (скіданьне Лукашэнкі) ужо дасягнутая, апазыцыя можа адразу ж дэзінтэгравацца, спрабуючы ў аўтаномным рэжыме прыстасавацца з максымальнай выгадай да новых палітычных рэаліяў: замест барацьбы за ўладу — зоймуцца барацьбой за ўдзел у ёй. Максымум, што тады чакае Беларусь — яшчэ больш звыродлівая вэрсія расейскай ці ўкраінскай «кіраванай дэмакратыі».

Нарэшце, выбары з удзелам Лукашэнкі ў 2006 годзе — гэта найдраматычнейшы сцэнар разьвіцьця падзеяў. У ім ня будзе месца намэнклятуры — як паказалі выбары'2001, любы апаратчык, які насьмеліцца кінуць выклік галоўнаму і адзінаму кандыдату ад улады, аўтаматычна пераходзіць у шэраг былых, пры гэтым губляючы магчымасьць узьдзеяць на намэнклятуру цяперашнюю. Наагул, удзел у выбарах адзінак, якія спрабуюць замяніць сваімі амбіцыямі адсутнасьць палітычных і арганізацыйных рэсурсаў, беспэрспэктыўны, і гэта, як і ўлетку 2001 году, хутчэй за ўсё скончыцца ўжо на стадыі рэгістрацыі кандыдатаў. А значыць, такія выбары найхутчэй пройдуць па мадэлі супрацьстаяньня «ўлада — апазыцыя». Дыяпазон палітычных магчымасьцяў пры такім сцэнары выключае паўтоны. Іншымі словамі, барацьба будзе ісьці на выжываньне, а стаўкай у палітычнай барацьбе будзе не прэзыдэнцкі фатэль, а лёс палітычнага рэжыму. Ці абгрунтаваныя спадзевы, што выбары ў фармаце «Лукашэнка супраць апазыцыі» змогуць прывесьці да кардынальнай зьмены палітычнага раскладу ў краіне і гальванізаваць працэсы трансфармацыі палітычнага рэжыму? На мой погляд, у сацыяльным кантэксьце, што цягам часу складаецца ў Беларусі, такое разьвіцьцё падзеяў цалкам магчыма, нават нягледзячы на ўзмоцненую рэпрэсіўнасьць уладнага апарату. Аднак такая магчымасьць будзе рэалізаваная толькі тады, калі апанэнты ўлады канчаткова зразумеюць, што пакуль цяперашні рэжым існуе, выбары, што адбываюцца пад яго патранажам, не выконваюць ролі рэкрутаваньня і зьмены палітычных элітаў, што пазбаўляе сэнсу вузкапартыйны ці пэрсанальны фармат удзелу ў іх. Апазыцыя можа дзейсна выкарыстаць выбары па лукашэнкаўскіх правілах толькі ў двух выпадках: у першым, калі падчас удзелу ў іх робіцца акцэнт на палітычнай інфармацыйнай кампаніі, што мае на мэце выкарыстаньне іх дзеля пашырэньня ўплыву ў грамадзтве і павелічэньня ўласнай сацыяльнай базы. У другім, калі выбары выкарыстоўваюцца як першапачатковая стадыя мабілізацыі грамадзтва дзеля актыўнага неінстытуцыйнага палітычнага ўзьдзеяньня (як гэта было ў Сэрбіі ў 2000 годзе, калі вуліч-

ныя акцыі абароны вынікаў выбараў вырасьлі ў вулічную рэвалюцыю). Такім чынам, у першым варыянце кампаніі пераважае агітацыйны элемэнт, у другім — мабілізацыйны. Гэта, канечне, ня значыць, што такія выбары цалкам пазбаўленыя электаральнага аспэкту (г.зн. барацьбы за галасы дэпутацкія і выбарцаў). Ён неабходны, але абсалютна не дастатковы элемэнт пасьпяховай апазыцыйнай кампаніі. Паколькі пасьпяховы ўдзел апазыцыі ў выбарах абумоўлены іншымі, акрамя заваёвы галасоў, чыньнікамі (напрыклад, здольнасьцю да абароны вынікаў), можна зрабіць выснову аб тым, што перацягваньне на свой бок электарату павінна ажыцьцяўляцца ня ў часе самой кампаніі, а задоўга да яе, у міжвыбарны пэрыяд шляхам адпаведных інфармацыйных і агітацыйных акцыяў. І, бадай што, найважнейшае: апанэнты ўладаў ня здолеюць дасягнуць аніводнай мэты кампаніі (інфармацыйнай, агітацыйнай ці электаральнай) у выпадку, калі іх удзел у выбарах будзе суправаджацца ўнутрыапазыцыйнай канкурэнцыяй і перасьледам вузкапартыйных ці карпаратыўных мэтаў. На жаль, кіраўніцтва асобных апазыцыйных партыяў пакуль што схіляецца акурат да такога фармату ўдзелу ў будучых парлямэнцкіх ды прэзыдэнцкіх выбарах*. Гэта нясе пагрозу таго, што і наступныя выбарчыя кампаніі стануць чарговым практыкаваньнем правінцыйнага аўтарытарызму, якому апанэнты ўлады ня здолеюць супрацьстаяць. Альтэрнатывай такому самагубчаму для апазыцыі варыянту паводзінаў можа быць толькі стварэньне палітычных кааліцыяў і рэанімацыя брэнду «дэмакратычная апазыцыя» як увасабленьня рэальнай альтэрнатывы аўтарытарнай уладзе.

KAMUNIKAT.ORG

# РАЗЬДЗЕЛ 5

# ПАЛІТЫЧНАЯ СЦЭНА БЕЛАРУСІ Ў 2003–2004. ПАРЛЯМЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ 2004 ГОДУ

## ПАЛІТЫЧНЫ КАНТЭКСТ НАПЯРЭДАДНІ ПАРЛЯМЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ І РЭФЭРЭНДУМУ

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. як унутраная, так і вонкавая палітыка адміністрацыі Лукашэнкі была падпарадкаваная мэце стварэньня спрыяльных умоваў для правядзеньня рэфэрэндуму аб "трэцім тэрміне".

Найбольшых посьпехаў бок Лукашэнкі дасягнуў на "ўнутрыпалітычным фронце". Была ліквідавана магчымасьць выступленьня на баку апанэнтаў рэжыму лідэраў дырэктарскага корпусу, усталяваны кантроль над ФПБ і галіновымі прафсаюзнымі аб'яднаньнямі. Ува ўмовах эканамічнага росту адсутнічала пагроза антырэжымных выступленьняў рабочых. Была праведзена "зачыстка" трэцяга сэктару.

На фоне слабасьці палітычных пазыцыяў апанэнтаў рэжым дасягнуў надзвычайна высокай ступені мабілізацыі рэсурсаў дзяржаўнага апарату. З аднаго боку, для гэтага была выкарыстаная "пуга" (узначаленыя генпракурорам Шэйманам камісіі праверылі дзеяздольнасьць органаў МУС, выканаўчай вэртыкалі, Рада бясьпекі выступіла з інспэкцыяй дзейнасьці КДБ), з другога — "пернік" (была працягнутая палітыка прыярытэтнага фінансаваньня "выканаўчай вэртыкалі", сілавых структураў, органаў судовай улады). У выніку намаганьняў улады ўзімку 2002/03 унутры краіны адсутнічалі фактары, якія б перашкаджалі Лукашэнку абвесьціць правядзеньне рэфэрэндуму 3 сакавіка 2003 г., "з мэтай эканоміі дзяржаўных сродкаў" сумясьціўшы рэфэрэндум з выбарамі ў мясцовыя Рады.

Але замежнапалітычная сытуацыя ў той час не спрыяла рэалізацыі плянаў Лукашэнкі. Адмова прадаць зьвязаным з Крамлём расейскім алігархам кантрольныя пакеты акцыяў найбольш рэнтабэльных беларускіх прадпрыемстваў мела вынікам "інтэграцыйныя" прапановы У. Пуціна і катэгарычныя заявы шэрагу расейскіх палітыкаў аб тым, што Масква не падтрымае "трэці тэрмін" Лукашэнкі.

Пры існаваньні пэрспэктывы аблогі заходнімі і ўсходнімі “ворагамі” было вельмі цяжка размаўляць аб стабільнасьці палітычнай кар’еры Лукашэнкі. Аднак захаваньне аб’ектыўных супярэчнасьцяў у адносінах Расеі з Захадам, складаны характар рэфармаваньня расейскага грамадзтва — усё гэта сьведчыла, што пагроза міжнароднай ізаляцыі мае кароткачасовы характар, у бліжэйшай пэрспэктыве Расея павінна даць “зялёнае сьвятло” руху да “трэцяга тэрміну”. Чакаючы свайго часу, Лукашэнка працягнуў палітыку, накіраваную на аслабленьне палітычных пазыцыяў сваіх апанэнтаў у Беларусі і канфрантацыю з Захадам, што падтрымлівае беларускіх дэмакратаў. Пры гэтым ён быў гатовы супрацьстаяць спробам Крамля ўзмацніць расейскі ўплыў у Беларусі і зрабіць натурыстага беларускага саюзьніка марыянэткай, паслухмянай волі Масквы.

## Цьвёрдая рашучасьць

У пачатку сакавіка 2003 г. адбыліся падзеі, якія істотна павялічвалі значэньне існага ў Беларусі рэжыму як стратэгічнага саюзьніка Расеі. Замежныя мэдыі паведамілі аб тым, што ў ходзе амэрыкана-польскіх перамоваў абмяркоўваецца магчымасьць перадысьлякацыі на базы на тэрыторыі Польшчы значнай часткі амэрыканскіх войскаў, разьмешчаных на тэрыторыі Нямеччыны. Асаблівае значэньне мела інфармацыя аб плянах стварэньня базаў ваенна-паветраных сілаў ЗША недалёка ад беларуска-польскай мяжы — каля гарадоў Мінск-Мазавецкі і Бяла-Падляска (апошні — за 35 км ад беларускай мяжы). Рэальная магчымасьць разгортваньня базаў NATO на тэрыторыі новых чальцоў альянсу — у Польшчы і Вугоршчыне — выклікала выбух абурэньня расейскага кіраўніцтва.

Рэзананс павялічваўся тым, што вялікую турботу афіцыйнай Масквы выклікаў факт разгортваньня базаў NATO на поўдні СНД: у Грузіі, Узбэкістане, Кыргыстане, будаўніцтва базаў у Азэрбайджане. Кіраўніцтва Грузіі заяўляла аб уступленьні краіны ў NATO як стратэгічнай мэце. Разьвіцьцё вайсковага супрацоўніцтва ЗША і іншых краінаў альянсу з цэнтральнаазіяцкімі і закаўкаскімі краінамі СНД суправаджалася інтэнсіўным разьвіцьцём эканамічнага супрацоўніцтва, што ў выніку азначала пашырэньне сфэры ўплыву ЗША і іх партнэраў.

Гэтыя крокі NATO азначалі, што тыя працэсы, якія назіраліся ў Цэнтральнай Азіі і Закаўказьзі, у недалёкай пэрспэктыве будуць адбывацца і каля заходніх межаў Расеі. Як красамоўная характарыстыка разьвіцьця цэнтрабежных працэсаў на абшарах СНД прагучала заява Зьбігнева Бжазінскага аб тым, што да 2017 г. Украіна і Беларусь могуць стаць чальцамі NATO.

Палітычную эліту і грамадзкую думку Расеі вельмі хвалявала ня толькі аслабленьне пазыцыяў у бліжэйшым замежжы, але і яўная няздольнасьць абараніць расейскія інтарэсы ў т. зв. далёкім замежжы. У пачатку сакавіка 2003 г. з дня на дзень чакаўся ўдар па рэжыме Хусэйна. Гэта азначала, што ў вельмі хуткай пэрспэктыве расейскія кампаніі згубяць магчымасьць зарабіць 10 млрд USD за ўдзел у будаўніцтве эканамічных аб’ектаў у Іраку і яшчэ 40 млрд USD — суму, у якую ацэньваліся абмяркоўваныя з Хусэйнам эканамічныя праекты.

У Лукашэнкі зьяўляліся моцныя вагары ўплыву на пазыцыю Крамля ў “беларускім пытаньні”. Ён мог быць упэўнены, што гульня на супярэчнасьцях паміж Расеяй і Захадам рана ці позна прынясе свае вынікі.

4 сакавіка афіцыйны Менск дэманстрацыйна прыняў дэлегацыю, узначаленую мэрам Баг-

даду Аднанам Хамэдам. У той жа час безвынікова скончыліся чарговыя перамовы па супольнай валюце. Менск і Масква зноў ня здолелі дамовіцца аб адзіным эмісійным цэнтры. (Беларуская дэлегацыя на перамовах катэгарычна настойвала на тым, каб у структуру эмісійнага цэнтру быў уключаны Нацыянальны банк РБ.) Тым самым расейскаму кіраўніцтву было дадзена зразумець: у абмен на аказаньне Расеі замежнапалітычнай падтрымкі беларускі саюзьнік разьлічвае на вельмі істотныя саступкі зь яе боку. Бясконцая гульня ў аб'яднаньне грашовых сыстэмаў дазваляла афіцыйнаму Менску, нягледзячы на напал жарсьцяў у адносінах з Расеяй, мець зручную падставу для таго, каб пры неабходнасьці пасадзіць расейскіх партнэраў за стол перамоваў з мэтай абмеркаваньня розных, у тым ліку і вырашальных, пытаньняў.

Адлігі ў адносінах з усходнім суседам трэба было пачакаць. Масква вуснамі пасла Расеі ў Беларусі нагадала Лукашэнку, што яна жадае атрымаць у абмен цяпер ужо на падтрымку "трэцяга тэрміну". 8 сакавіка Аляксандар Блахін адзначыў, што беларускі ўрад цягне з прыватызацыяй прадпрыемстваў і завышае цану кантрольных пакетаў акцыяў.

22 сакавіка Міхаіл Хвастоў, які на даручэньне Лукашэнкі адыгрываў ролю актыўнага ўдзельніка халоднай вайны з Захадам, быў прызначаны паслом у ЗША. Гэтае кадравае рашэньне было заклікана прадэманстраваць Захаду, што нармалізацыя адносінаў з афіцыйным Менскам магчымая толькі пры ўмове аднабаковых крокаў насустрач Лукашэнку. Хвастова на пасадзе міністра замежных справаў замяніў Сяргей Мартынаў, былы пасол у Бэльгіі, сталы прадстаўнік Беларусі пры эўрапейскай супольнасьці і NATO.

На фоне складанай сытуацыі ў адносінах з Расеяй Лукашэнка атрымліваў добрыя зьвесткі з "унутрыпалітычнага фронту". У шэрагах актыўных супрацiўнікаў рэжыму ў сакавіку адбыўся чарговы раскол. У выніку разьвіцьця канфліктнай сытуацыі ў складзе БНФ ад партыі адкалолася група Паўла Севярынца "Малады фронт". Як знак часу людзі ўспрымалі словы Васіля Быкава, адрасаваныя Першаму ўсебеларускаму сходу інтэлігенцыі (адбыўся ў Менску 16 красавіка): "Што рабіць? Мяняць кіраўніцтва. На якое? Ці не адбудзецца так, што на месца кепскага старога прыйдзе яшчэ больш кепскае новае?"

Для таго каб мець магчымасьць выкарыстаць слабасьць апанэнтаў, трэба было падтрымліваць высокую ступень гатоўнасьці "вэртыкалі" выконваць загады зьверху. Была працягнута барацьба з карупцыяй. АБЭЗ МУС атрымаў загад Лукашэнкі праверыць чысьціню шэрагаў "вэртыкалі". У выніку праверкі ў красавіку былі ўзбуджаныя крымінальныя справы ў адносінах да старшыні Драгічынскага райвыканкаму Сяргея Мамацюка, намесьніка старшыні Крупскага райвыканкаму Ўладзімера Ганчара і шэрагу чыноўнікаў Смалявіцкага райвыканкаму. Новы віток антыкарупцыйнай кампаніі стаў каталізатарам закуліснай барацьбы за ўплыў, магчымасьць прасоўваць "сваіх людзей" паміж найбліжэйшымі паплечнікамі Лукашэнкі. Генпракурор Віктар Шэйман разгарнуў наступ на пазыцыі галоўнага канкурэнта па сілавым кантролі над бюракратыяй і дырэктарскім корпусам — свайго былога вылучэнца старшыні КДК Анатоля Тозіка. 10 красавіка на нарадзе ў Лукашэнкі Шэйман адзначыў "адсутнасьць належнага кантролю за выкананьнем заканадаўства" з боку старшыні КДК. Генпракурор абвінаваціў ДФР КДК у адсутнасьці сур'ёзных вынікаў дзейнасьці.

Мэта была дасягнутая. Лукашэнка патрабаваў узмацненьня пракурорскага нагляду над КДК. Згодна зь яго загадам, у структуры пракуратуры было створанае ўпраўленьне па наглядзе за захаваньнем законнасьці ў падразьдзяленьнях КДК. Што было ня менш істотна, Шэйман замацаваў за сваім ведамствам выключнае права расьследаваць крымінальныя

справы, зьвязаныя з службовымі злачынствамі. Такім чынам Шэйман замацаваў статус найбольш уплывовай фігуры ў атачэньні Лукашэнкі.

Прысутнасьць Шэймана сярод першых пэрсон беларускай палітыкі сьведчыла аб адсутнасьці зьменаў у палітычным курсе. У пачатку траўня 2003 г. МЗС Беларусі ў сувязі з разглядам у Кангрэсе ЗША "Акту ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі" абвінаваціў Злучаныя Штаты ў намеры "аказаць ціск на Беларусь за яе незалежную ўнутраную і вонкавую палітыку". Патрабаваньне расьсьледаваньня справаў зьніклых апанэнтаў рэжыму, у сувязі з чым прагучала прозьвішча бліжэйшага хаўрусьніка Лукашэнкі, было названае афіцыйным Менскам "маніпуляваньнем праваахоўнай тэматыкай".

Працягваючы халодную вайну з Захадам, бок Лукашэнкі зрабіў рашучы крок, дэманструючы нежаданьне ісьці на саступкі ў адносінах з Расеяй. Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г., падчас абмеркаваньня ўмоваў прызнаньня расейскім бокам "элегантнай перамогі прэзыдэнта Беларусі", афіцыйная Масква вуснамі прэм'ер-міністра Міхаіла Касьянава выказвала вялікую зацікаўленасьць у набыцьці расейскімі нафтавымі кампаніямі кантрольных пакетаў акцыяў беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў: адзін з найбуйнейшых экспартэраў "чорнага золата" ў сьвеце, Расея адчувала востры недахоп магутнасьцяў перапрацоўкі нафты. У траўні 2003 г. стала вядома, што расейскія нафтавыя кампаніі адмовіліся ад удзелу ў конкурсе па продажы акцыяў ААТ "Нафтан", "Палімір", "ГроднаАзот", "Гроднахімвалакно". Нафтавым "баронам" было прапанавана набыць каля 43 % акцыяў гэтых прадпрыемстваў. Пры гэтым міністар эканомікі Беларусі Андрэй Кабякоў адзначыў, што кантрольныя пакеты акцыяў застануцца ўва ўласнасьці беларускай дзяржавы.

Сутыкненьне інтарэсаў у пытаньні прыватызацыі беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў стала першай прыкметай сканчэньня пэрыяду нармалізацыі беларуска-расейскіх адносінаў (у пэрыяд з чэрвеня і да першай паловы лістапада 2002 г. бакі "высьвятлялі адносіны" ў сувязі з прапановамі Пуціна аб уваходжаньні Беларусі ў склад Расейскай Фэдэрацыі).

Актуалізацыя за мяжой праблемы зьнікненьня палітычных апанэнтаў Лукашэнкі мела наступствы для вызначэньня характару палітычнага дыскурсу ў Беларусі. 7 траўня на прэсканфэрэнцыі дэпутацкай групы "Рэспубліка" Валеры Фралоў заявіў аб стварэньні грамадзкай камісіі для расьсьледаваньня зьнікненьняў (у яе склад увайшлі Валеры Фралоў, Зінаіда Ганчар, праваабаронцы Алег Воўчак, Гары Паганяйла, былы палкоўнік спэцназу Ўладзімер Барадач, былы маёр міліцыі Ўладзімер Арэсаў). Падчас прэс-канфэрэнцыі адбылася прэзэнтацыя ўсебеларускага грамадзкага руху "За годнае жыцьцё". Мэта руху (паводле В. Фралова) — "праз свабодныя і дэмакратычныя выбары зьмяніць палітычны і эканамічны курс краіны для забесьпячэньня годнага жыцьця грамадзянаў Беларусі".

Пытаньне, сфармуляванае Васілём Быкавым, не было пачутае апазыцыяй. На шчыт апанэнтамі Лукашэнкі падымалася ўжо ня новая для электарату тэма зьнікненьняў. Апазыцыя зноў уваходзіла ў каляіну крытыкі Лукашэнкі без прапанаваньня альтэрнатывы існаму рэжыму. Без адказу на пытаньне "каго" і "што" выбіраць заклік да барацьбы за свабодныя і дэмакратычныя выбары быў асуджаны застацца непачутым.

Узьнікненьне новых апазыцыйных арганізацыяў ня так турбавала ўладу, як дзейнасьць ужо даўно наяўных. "Зачыстка" трэцяга сэктару была адным з кірункаў руху да "трэцяга тэрміну". У траўні 2003 г. улады пачалі працэс ліквідацыі ГА "Грамадзянскія ініцыятывы", якое мела афіцыйна зарэгістраваныя філіялы ў 14 з 21 раёнаў Гомельскай вобласьці.

Удар быў нанесены і па незалежнай прэсе. Пры канцы траўня 2003 г. "Белорусская дело-

вая газета" атрымала тры папярэджаньні ад Міністэрства інфармацыі, а яе выхад быў прыпынены на тры месяцы. Зачыстка інфармацыйнага поля была расцэненая апанэнтамі рэжыму як прыкмета заплянаванага рэфэрэндуму.

## Сутыкненьне вакол "Белтрансгазу"

Карныя акцыі ў адносінах да грамадзкіх арганізацыяў, незалежнай прэсы былі адзначаныя кіраўніцай спэцыяльнай рабочай групы ПА АБСЭ па Беларусі Утай Цапф, якая пры канцы траўня 2003 г. наведала Беларусь. "Жорсткая і гарачая дыскусія" (паводле словаў У. Цапф) афіцыйнага Менску з ПА АБСЭ ў прыватнасьці і з Захадам увогуле заставалася важнай умовай пасьпяховай гульні з Расеяй.

Лукашэнка меў чым шантажаваць Маскву. Пры канцы траўня Польшчу з афіцыйным візытам наведалі прэзыдэнт ЗША Джордж Буш і брытанскі прэм'ер Тоні Блэр. Працягваліся перамовы аб разьмяшчэньні базаў NATO на польскай тэрыторыі. У падтрымку гэтай ідэі на старонках часопісу "Wprost" выступілі вядомыя польскія палітыкі, сярод якіх экс-прэзыдэнт Лех Валэнса і былы прэм'ер Ян Кшыштаф Бялецкі (на старонках часопісу было адзначана, што разьмяшчэньне базаў дазволіць Польшчы стварыць 20 тыс. працоўных месцаў, прыцягнуць больш за 20 млрд USD інвэстыцыяў, атрымліваць штогод прыбытак з кожнай базы ў 150 млн USD).

Гэтую інфармацыйную хвалю ўлады выкарысталі для арганізацыі чарговай дэманстрацыі значэньня Беларусі як саюзьніка Расеі. 3 чэрвеня А. Лукашэнка наведаў 115-ю зэнітную ракетную брыгаду ВПС і СПА РБ і зрабіў шэраг гучных заяваў аб вонкавай палітыцы Беларусі. Заплянаваную перадысьлякацыю амэрыканскіх войскаў у Польшчу ён назваў "пагрозай нацыянальнай бясьпецы Беларусі" і "неразумным крокам": "Яны моцна падстаўляюцца, разьмяшчаючы свае войскі ў зоне нашай дасягальнасьці. Гэтыя базы будуць узятыя ня толькі пад кантроль, але і пад прыцэл". Важнае значэньне для разуменьня бачаньня сытуацыі Лукашэнкам мае яго выказваньне аб тым, што Расея ніколі ня ўступіць у нейкія геапалітычныя саюзы з ЗША і краінамі Заходняй Эўропы. "Для Масквы, як і раней, прыярытэтам нумар адзін ёсьць абарона зоны сваіх жыцьцёвых інтарэсаў, якая пашыраецца на ўсю постсавецкую прастору. Можна гуляць у эканоміцы, палітыцы, дыпляматыі. Што датычыцца бясьпекі, тут гуляць нельга. Расея разумее гэта"[1].

Добра ведаючы свае казыры, афіцыйны Менск дэманстраваў Крамлю моц сваіх пазыцыяў. Вельмі непрыемнай зьвесткай для расейскага боку стала прыняцьце Радай міністраў праграмы рэканструкцыі найбольш прывабнага для расейскага бізнэсу нафтаперапрацоўчага прадпрыемства — ААТ "Нафтан". Было вырашана цягам 2004—2008 гг. мадэрнізаваць "Нафтан" пераважна за кошт уласных сродкаў. Пры гэтым падкрэсьлівалася, што кантрольны пакет "Нафтану" не падлягае продажу.

У той жа час афіцыйнай Маскве далі зразумець, што, калі яна ня будзе належным чынам ставіцца да беларускага саюзьніка, інвэстыцыі ў беларускую эканоміку прыйдуць з Захаду. Аўстрыйская фінансавая група "Reiffeisen" да 50 % акцыяў "Прыёрбанку", што ў яе ўжо былі, дакупіла яшчэ 8,5 %.

[1] Белорусский рынок. 2003. 9—15 июня.

Згодна з укладзеным 12 красавіка 2002 г. беларуска-расейскім пагадненьнем аб супрацоўніцтве ў газатранспартнай сфэры, афіцыйны Менск узяў на сябе абавязкі да 1 ліпеня 2003 г. стварыць на базе ААТ “Белтрансгаз” сумеснае прадпрыемства з “Газпромам”. Беларускі бок да апошняга часу цягнуў з прызначэньнем тэрміну перамоваў, на якіх павінен быў вырашыцца лёс гэтага стратэгічна важнага аб’екта для беларускай эканомікі. У Польшчы на адбытым 6 чэрвеня 2003 г. рэфэрэндуме было прынятае рашэньне аб уступленьні краіны ў ЭЗ. Але значна большае значэньне для пазыцыі беларускага боку мела іншая інфармацыя. 7 чэрвеня замежныя мэдыі паведамілі аб тым, што Польшча пацьвердзіла гатоўнасьць разьмясьціць на сваёй тэрыторыі кантынгенты войскаў ЗША і іншых краінаў NATO, а пры неабходнасьці — і элемэнты амэрыканскай сыстэмы СРА. Разгортваньне войскаў NATO на тэрыторыі новых чальцоў альянсу (Польшчы, Румыніі, Баўгарыі, краінаў Балтыі) прадугледжвалася распрацаваным пад кіраўніцтвам міністра абароны ЗША Дональда Рамсфэлда дакумэнтам “Усебаковы агляд становішча і пэрспэктываў разьвіцьця УС ЗША”. Наведаўшы Маскву, спэцыяльны дарадца генэральнага сакратара NATO ў пытаньнях Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы Крыс Данэлі даў зразумець, што Захад ня будзе браць пад увагу заклапочанасьць Крамля аб перадысьлякацыі войскаў альянсу.

11 чэрвеня 2003 г. беларуская дэлегацыя, узначаленая першым віцэ-прэм’ерам Сяргеем Сідорскім, правяла перамовы з кіраўніцтвам “Газпрому” ў Маскве. Расейскі бок прапанаваў стварыць сумеснае прадпрыемства на наступных умовах: 1) набыцьцё “Газпромам” кантрольнага пакету акцыяў ААТ “Белтрансгаз” за суму балянсавай вартасьці гэтага прадпрыемства (800 млн USD); 2) пастаўка Беларусі штогод 10,2 млрд м$^3$ газу за цану 5-га цанавога поясу Расеі.

У адказ беларуская дэлегацыя агучыла непрымальныя для Расеі ўмовы: 1) кантрольны пакет акцыяў застаецца ўва ўласнасьці беларускай дзяржавы; 2) “Газпром” поўнасьцю забясьпечвае патрэбы Беларусі ў стратэгічным для яе эканомікі паліве (у 2003 г. — 16,5 млрд м$^3$, у 2004 г. — 19 млрд м$^3$... у 2020 г. — 24 млрд м$^3$) за цану 5-га цанавога поясу Расеі; 3) рынкавая цана “Белтрансгазу” складае 3,5 млрд USD; 4) “Газпром” у бліжэйшыя два гады інвэстуе ў разьвіцьцё газатранспартнай сыстэмы Беларусі 200 млн USD; 5) інвэстар фінансуе будаўніцтва Прыбускага і Васілевіцкага падземных газасховішчаў.

Працягваючы гульню ў аб’яднаньне грашовых сыстэмаў, афіцыйны Менск пачаў іншую — ужо на “газавым полі”. Беларускі бок ня мог ня ведаць, што найбольш “прымальная” для інвэстара з сфармуляваных умоваў (адносна ацэнкі пакету акцыяў “Белтрансгазу”) — абсалютна непад’ёмная для “Газпрому”. На той момант вонкавы доўг апошняга складаў больш за 14 млрд USD.

Падзеі на самым важным для Лукашэнкі — “замежнапалітычным” фронце ў першай палове чэрвеня адбываліся пры адпаведным яго плянам разьвіцьці падзеяў у самой Беларусі.

4 чэрвеня 2003 г. на грунце ГА “Хартыя’97” узьнік новы дэмакратычны рух “Свабодная Беларусь”. Падрыхтоўка апазыцыі да выбараў ізноў палягала ня столькі ў працы з электаратам, інфармацыйнай актыўнасьці, колькі ў стварэньні прэтэндэнтаў на лідэрства ў выглядзе разнастайных рухаў.

Улада плянамерна рыхтавалася да выбараў. 5 чэрвеня ПП НС прыняла папраўкі да заканадаўства аб правядзеньні масавых мерапрыемстваў (законы “Аб палітычных партыях” і “Аб грамадзкіх аб’яднаньнях” былі прыведзеныя ў адпаведнасьць з прэзыдэнцкім дэкрэтам ад 7 траўня 2001 г. “Аб некаторых захадах для ўдасканаленьня парадку правядзеньня сходаў,

мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў і пікетаваньняў у РБ"; закон аб сходах, мітынгах, вулічных шэсьцях, дэманстрацыях і пікетаваньні быў прыведзены ў адпаведнасьць з прэзыдэнцкім дэкрэтам ад 9 верасьня 1999 г. "Аб некаторых захадах для папярэджаньня надзвычайных здарэньняў пры правядзеньні масавых мерапрыемстваў"). Была значна ўзмоцненая жорсткасьць патрабаваньняў да правядзеньня масавых мерапрыемстваў і ўзмоцненая адказнасьць арганізатараў за захаваньне парадку. Папраўкі прадугледжвалі ліквідацыю без судовага папярэджаньня палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацыяў "у выпадку незабесьпячэньня належнага парадку арганізацыі масавай акцыі і прычыненьня шкоды на суму 10 тысяч базавых велічыняў альбо істотнага парушэньня правоў і законных інтарэсаў грамадзянаў і грамадзтва".

6 чэрвеня 2003 г. у Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту РБ на даручэньне Лукашэнкі была створаная катэдра ідэалёгіі і палітычных навук. Яе мэтай была абвешчана падрыхтоўка спэцыялістаў у галіне ідэалягічнай працы. Лукашэнка даўно задумваўся аб тым, што задача "прамыўкі мазгоў", фармаваньне "правільнага мысьленьня" грамадзянаў патрабуе рэгулярнай дзейнасьці адпаведных агітатараў. Актуалізацыя пытаньня аб "трэцім тэрміне" падштурхнула паскорыць іх падрыхтоўку.

Выканаўшы прэвэнтыўны ўдар супраць імаверных апанэнтаў у складзе эканамічнай эліты, улады праявілі і міласэрнасьць. 12 чэрвеня суд Цэнтральнага раёну Менску вызваліў зь зьняволеньня былога гендырэктара ЗАТ "Атлянт" 64-гадовага Леаніда Калугіна. Але знаходжаньне за турэмнымі кратамі былога гендырэктара МТЗ М. Лявонава па-ранейшаму надавала "справе дырэктараў" палітычнае адценьне.

18 чэрвеня Лукашэнка выступіў з чарговай заявай аб намеры запытаць "дазвол народу" на свой удзел у прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. Упэўнены ў тым, што "народ падтрымае", ён працягваў зандаваць пазыцыю Расеі — ці "сасьпела" яна да кроку насустрач у гэтым пытаньні. Аднак Маскве быў патрэбны час, каб пераканацца ў поўнай немагчымасьці дабіцца ад афіцыйнага Менску саступак Крамлю і расейскаму буйному бізнэсу. 20 чэрвеня "Газпром" паўтарыў свае прапановы аб стварэньні СП. Кіраўніцтва кампаніі заявіла аб магчымасьці куплі кантрольнага пакету акцыяў ня больш за 1 млрд USD. 200 млн з гэтай сумы прыпадала на даўгі Беларусі за расейскі газ.

Прапановы "Газпрому" выклікалі абурэньне Лукашэнкі: "Ні за якія даўгі, ні за які намінальны кошт акцыі "Белтрансгазу" прадавацца ня будуць. І ніякія кланы, ніякія жулікі нашы прадпрыемствы за бесцань ня возьмуць"[2].

24 чэрвеня беларускі ўрад паўтарыў свае прапановы аб стварэньні СП з "Газпромам". Пры гэтым рынкавы кошт "Белтрансгазу" быў ацэнены ўжо ў 4,5—5 млрд USD (адпаведна "Газпрому" для набыцьця мінарытарнага — менш за 50 % — пакету акцыяў ААТ "Белтрансгаз" трэба было заплаціць ня менш як 2,25—2,5 млрд USD).

Сутыкненьне Менску і Масквы пры канцы чэрвеня закранула і ідэалягічную сфэру. 25 чэрвеня 2003 г., у дзень пахаваньня Васіля Быкава, Рада міністраў выдала пастанову № 850, якая ў мэтах "аптымізацыі навучальнага працэсу" прадугледжвала цягам двух месяцаў ліквідацыю Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Я. Коласа. Ціск на беларускасьць адбываўся на фоне гаворак пра зьмест навучальнага курсу "Ідэалёгія беларускай дзяржавы", які з новага навучальнага году павінен быў выкладацца ў ВНУ краіны. 27 чэрвеня, падчас сустрэчы з

[2] Белорусский рынок. 2003. 30 июня — 6 июля.

студэнтамі Калінінградзкага ўнівэрсытэту, У. Пуцін заявіў: “Адзіная дзяржаўная ідэалёгія — гэта прыкмета таталітарнай дзяржавы. У Расеі няма і ня будзе адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі. У любой краіне, якая прэтэндуе на эфэктыўнае разьвіцьцё, павінна адбывацца барацьба меркаваньняў”[3].

Прэзыдэнт Расеі ня мог ня ведаць аб “вынаходцы” Лукашэнкі. Рэакцыя ўлады на неразуменьне з боку Масквы зьявілася 28 чэрвеня, калі МУС пастанавіла выдаліць зь Беларусі журналістаў расейскага тэлеканалу НТВ Паўла Селіна і Юр’я Арэхава.

30 чэрвеня беларускі бок заняў яшчэ больш жорсткую пазыцыю ў пытаньні прыватызацыі “Белтрансгазу”. Згодна з пастановай ураду № 882 былі сфармуляваныя новыя ўмовы стварэньня СП з “Газпромам”: 1) Беларусь захоўвае кантрольны пакет акцыяў; 2) “Газпром” забясьпечвае патрэбы Беларусі ў газе ў значна большым (у параўнаньні з раней прапанаванымі беларускім бокам аб’ёмамі) памеры (у 2003 г. — 18,5 млрд $м^3$, у 2004 г. — 21,5 млрд $м^3$, у 2005 г. — 25 млрд $м^3$... у 2010 г. — 33 млрд $м^3$) за цану 5-га цанавога поясу Расеі; 3) 100 % акцыяў “Белтрансгазу” ацэненыя ў 4,5—5 млрд USD; 4) “Газпром” павялічвае аб’ём пампаваньня газу праз тэрыторыю Беларусі да 100 млрд $м^3$ (у 2003 г. праз тэрыторыю Беларусі было прапампавана 30,9 млрд $м^3$); 5) “Газпром” уносіць у статутны фонд СП у якасьці неграшовага ўнёску беларускі ўчастак газаправоду “Ямал—Эўропа”; 6) СП забясьпечвае ўнясеньне 1,726 млрд USD у рэканструкцыю газатранспартнай сыстэмы Беларусі.

У новай рэдакцыі патрабаваньні Менску былі непрымальнымі для Масквы ня толькі з эканамічных, але і з палітычных прычынаў. Іх рэалізацыя мела б вынікам згортваньне расейска-ўкраінскага супрацоўніцтва ў газатранспартнай сфэры. Расея губляла б адзін з найбольш важных інструмэнтаў уплыву на Ўкраіну. Гэта азначала б стварэньне ўмоваў для палітычнай арыентацыі Ўкраіны (а значыць, і Малдовы) на Захад і абумовіла б сытуацыю, пры якой усе намаганьні Расеі былі б сканцэнтраваныя на разьвіцьцё супрацоўніцтва з адным саюзьнікам ува Ўсходняй Эўропе — Беларусьсю.

10 ліпеня Лукашэнка адправіў у адстаўку прэм’ер-міністра Генадзя Навіцкага, віцэ-прэм’ера Аляксандра Папкова (адказваў за сельскую гаспадарку), міністра сельскай гаспадаркі Міхаіла Русага, старшыню канцэрну “Белдзяржхарчпрам” Анатоля Кузьму. Іх замянілі адпаведна Сяргей Сідорскі (першы віцэ-прэм’ер), Раман Унучка (памочнік прэзыдэнта, галоўны інспэктар у Менскай вобласьці), Зянон Ломаць (памочнік прэзыдэнта, галоўны інспэктар у Гомельскай вобласьці), Уладзімер Далжанкоў (старшыня Горацкага райвыканкаму, Магілёўская вобласьць).

У выніку ратацыі ў складзе вышэйшых эшалёнаў улады яшчэ больш узмацнілася прадстаўніцтва ўраджэнцаў усходніх рэгіёнаў Беларусі, даўніх знаёмых Лукашэнкі (Р. Унучка, З. Ломаць, У. Далжанкоў былі знаёмыя Лукашэнку яшчэ з сумеснай працы ў Вярхоўнай Радзе XII скліканьня). Фармальнай зачэпкай для адставак стала невыкананьне Г. Навіцкім і чальцамі яго кабінэту распараджэньня аб поўным пагашэньні запазычанасьці перад сялянамі. Але ў Лукашэнкі былі і іншыя прычыны замяніць памяркоўнага Г. Навіцкага. Ураду ўсё часьцей прыходзілася вырашаць задачы, зьвязаныя з “высьвятленьнем адносінаў” з Расеяй. Апошнім часам адказныя перамовы з расейскім бокам даручаліся С. Сідорскаму. Гэтая асоба значна больш адпавядала неабходнасьці дэманстрацыі афіцыйнай Маскве жорсткасьці пазыцыі Менску. Для таго каб дацiснуць Крэмль у пытаньні “трэцяга тэрміну”, было патрэб-

[3] Тамсама.

на, каб Беларусь у адносінах з Расеяй прадстаўляла асоба зь іміджам жорсткага палітыка. Паводле словаў намесьніка гендырэктара “Цэнтру палітычных тэхналёгіяў” РФ Дзьмітрыя Арлова, Навіцкі паплаціўся за тое, што рэальна разумеў расейскія інтарэсы ў Беларусі і імкнуўся іх задаволіць. Анатоль Лябедзька ўбачыў у адстаўцы Навіцкага элемэнт агульнай стратэгіі Лукашэнкі напярэдадні рэфэрэндуму для працягу сваіх паўнамоцтваў.

Думка, што рэфэрэндум можа быць абвешчаны ўвосень 2003 г., падштурхнула лідэраў БНФ, АГП, БСДГ, БПП, ПКБ да падпісаньня 15 ліпеня пагадненьня аб “агульнай стратэгіі супрацьдзеяньня правядзеньню рэфэрэндуму для працягу прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі”. Было заяўлена аб узгадненьні агітацыйнай кампаніі супраць прапановаў улады. Разам з тым лідэры партыяў выказалі думку, што Лукашэнка, магчыма, не прызначыць рэфэрэндуму, улічваючы свой беспрэцэдэнтна малы рэйтынг (12,8 %, паводле словаў А. Лябедзькі) і ня маючы яўнай падтрымкі з боку Расеі. “Пяцёрка” пацьвердзіла намер удзельнічаць у парлямэнцкіх выбарах 2004 г.

19 ліпеня Лукашэнка заявіў, што, “калі захоча народ”, ён гатовы застацца прэзыдэнтам. Быў зроблены чарговы зандаж пазыцыі Расеі — заява была зроблена падчас інтэрвію тэлеканалу НТВ. Інтрыга з вызначэньнем тэрміну правядзеньня рэфэрэндуму працягвалася. Паводле словаў Лукашэнкі, “у бліжэйшы час палітычных баталіяў” не прадбачылася[4].

22 ліпеня лідэры БНФ, АГП, БСДГ, БПП, ПКБ уклалі пагадненьне аб аб’яднаньні намаганьняў супраць “трэцяга тэрміну” з дэпутацкай групай “Рэспубліка”. Пагадненьне прадугледжвала тры кірункі захадаў: 1) дэмакратызацыя выбарчага заканадаўства; 2) узаемадзеяньне ў пытаньнях выбараў у парлямэнт; 3) супрацьдзеяньне імкненьню ўладаў зьмяніць рэдакцыю арт. 81 Канстытуцыі.

Пагадненьне стала каталізатарам расколу ў апазыцыі. Каардынатар “Хартыі’97” Андрэй Саньнікаў выступіў супраць стварэньня кааліцыі апазыцыйных партыяў з групай “Рэспубліка”. На яго думку, пагадненьне фактычна прызнала незаконна абраную “палатку”. Вельмі крытычна былі ім ацэненыя і пэрспэктывы кааліцыі зь пяці партыяў: “Партыі дакладна паўтараюць сцэнар “шырокай кааліцыі” 2001 г., у якой дзейнічалі прынцыпы “хто ў плот, а хто ў агарод” (”кто в лес, кто по дрова”). Аб’яднаньне ёсьць шырмай, за якой праглядаецца мэта рашэньня ўнутрыпартыйных задачаў асобна ўзятых партыяў. Цяжка ўявіць, каб падчас выбараў актывісты БНФ агітавалі за камуністаў і наадварот”[5].

Такім чынам, ужо ў ліпені 2003 г. стала ясна, што апазыцыя ня зможа выступіць адзіным фронтам на парлямэнцкіх выбарах, а таксама супраць “трэцяга тэрміну”. Апазыцыя была расколатая як на ўзроўні міжкааліцыйным, так і на ўзроўні міжпартыйным. І першым імпульсам для расколу стала інфармацыя аб заплянаваным рэфэрэндуме.

Пэрыядычныя сыгналы аб рэфэрэндуме трансьляваліся і з мэтай высьвятленьня магчымых апанэнтаў гэтай ідэі з боку прадстаўнікоў улады. 25 ліпеня старшыня Рады рэспублікі Аляксандар Вайтовіч у інтэрвію журналістам НТВ выказаўся аб тым, што ня бачыць неабходнасьці ў “трэцім тэрміне”. Ён асудзіў ліквідацыю Нацыянальнага ліцэю, заявіў аб неабходнасьці лібэралізацыі выбарчага заканадаўства. У той жа дзень Лукашэнка падпісаў указ аб скліканьні пазачарговай сэсіі верхняй палаты парлямэнту. 28 ліпеня на месца А. Вайтовіча быў абраны экс-прэм’ер Г. Навіцкі. Фармальнай падставай для адстаўкі А. Вайтовіча было

[4] Белорусский рынок. 2003. 21—27 июля.

[5] Белорусский рынок. 2003. 4—10 августа.

дасягненьне ім 65-гадовага ўзросту. Але свой юбілей ён адзначыў яшчэ 5 студзеня 2003 г.

Пералік прынадаў, якія Лукашэнка імкнуўся выкарыстаць для працягу бясконцай гульні з Масквой, не абмяжоўваўся супольнай валютай і "Белтрансгазам". Пры канцы ліпеня, падчас сумесных вайсковых вучэньняў падразьдзяленьняў УС РБ і РФ каля Воршы, камандуючы ВПС і СПА РБ генэрал-маёр Алег Пафераў адзначыў: "Адсутнічае нарматыўная база, якая дазваляла б на тэрыторыі Беларусі ўжываць адзіныя ўзброеныя сілы. Пакуль не падрыхтаваная база для ўкладаньня такога пагадненьня"[6].

У ліпені на фоне значнага паніжэньня актыўнасьці ў адносінах з Расеяй Лукашэнка атрымаў сыгналы аб нязьменнасьці пазыцыі Захаду ў ацэнках падзеяў у Беларусі. 19 ліпеня прэзыдэнт ЗША Дж. Буш назваў Беларусь у ліку краінаў, дзе адкрыта парушаюцца правы чалавека (у ліку дзяржаваў з рэпрэсіўнымі рэжымамі, акрамя Беларусі, былі названыя Іран, Паўночная Карэя, Куба, Бірма і Зімбабвэ). Палата прадстаўнікоў Кангрэсу ЗША прыняла акт аб міжнародных адносінах на 2004 і 2005 гг. Дакумэнт прадугледжваў увядзеньне санкцыяў супраць беларускага ўраду і выдзяленьне сродкаў на падтрымку беларускай дэмакратыі.

Нэгатыўныя навіны з Захаду атрымліваў ня толькі бок Лукашэнкі. Як зьяву разьвіцьця аўтарытарных тэндэнцыяў у Расеі Захад ацаніў разгортваньне справы "ЮКОСа" і ўзбуджэньне крымінальнай справы ў адносінах да найбагатшага расейскага бізнэсоўца Міхаіла Хадаркоўскага. Падобныя ацэнкі падзеяў у Расеі спрыялі ўзмацненьню пазыцыяў афіцыйнага Менску ў адносінах з Крамлём: расейскі бок, нават калі б хацеў, ня мог выкарыстаць як інструмэнт ціску на існую ў Беларусі ўладу абвінавачаньні ў адхіленьні ад дэмакратычных стандартаў.

У жніўні Лукашэнка паклаў на стол перамоваў з Расеяй яшчэ адзін козыр. З заявы намесьніка міністра эканомікі Алега Мельнікава вынікала, што Беларусь можа нацыяналізаваць нафтапрадуктаправоды, якія знаходзяцца на беларускай тэрыторыі. (У ліпені 2002 г. Найвышэйшы гаспадарчы суд Беларусі скасаваў рэгістрацыю расейскага прадпрыемства "Транснафтапрадукт". Нафтапрадуктаправоды, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, перасталі быць расейскай уласнасьцю. Іх статус стаў спрэчным.)

20 жніўня Лукашэнка зрабіў прызначэньні з мэтай узмацніць кантроль над інфармацыйнай прасторай. Міністрам інфармацыі быў прызначаны Ўладзімер Русакевіч. Вэтэран змаганьня зь незалежнай прэсай Міхаіл Падгайны атрымаў прызначэньне на іншы "фронт" — заняў пасаду гендырэктара РА "Белсаюздрук".

Пры канцы жніўня ўлада нанесла чарговы ўдар па трэцім сэктары. 21 жніўня Гарадзенскі абласны суд пастанавіў ліквідаваць абласное ГА "Ратуша". Пачаўся судовы разгляд пазову Менскага абласнога ўпраўленьня юстыцыі аб ліквідацыі ГА "Прававая дапамога насельніцтву". Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджаньне ГА "Беларускі Хельсынскі камітэт".

## Гульня на "трубе" і ў "рубель"

29 і 30 жніўня супрацоўнікі КДБ затрымалі начальніка замежнаэканамічнага ўпраўленьня Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта (КСП) Юр'я Матусевіча і 5 іншых кіраўнікоў структураў КСП. У іх ліку былі гендырэктар Галоўнага прамыслова-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства "Белая Русь" КСП Віктар Асіпенка і яго намесьнік Аляксандар Мурашка. Усе затрыманыя

[6] Белорусский рынок. 2003. 4—10 августа.

абвінавачваліся ў атрыманьні буйных хабараў і злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі. У атачэньні Лукашэнкі пачаўся новы падзел сфэраў кантролю над фінансавымі патокамі. Супраць кіраўніцы КСП Галіны Жураўковай адзіным блёкам выступілі сілавікі: В. Шэйман, А. Тозік, Л. Ерын. Яе арышт стаў справай часу і адбыўся 10 лютага 2004 г. За кратамі апынуліся і яе муж і старэйшы сын. Сьледзтва паводле яе справы было даручанае пракуратуры. 13 лютага 2004 г. таксама па падазрэньні ў злоўжываньні службовымі паўнамоцтвамі і хабарніцтве быў затрыманы гендырэктар НДТРК Ягор Рыбакоў.

Паводле вынікаў праверкі КСП, праведзенай КДК, распрацоўку КСП пачалі пракуратура і КДБ. Помста сілавікоў Г. Жураўковай за прычыненьне шкоды інтарэсам апяканых імі камэрцыйных фірмаў і прамысловых прадпрыемстваў мела палітычныя наступствы. 1. Кіраўніца КСП і яе асяродзьдзе выбывалі з кулюарнай барацьбы за “выхад” на Лукашэнку. Памятаючы пагром КСП, любы яе кіраўнік адцяпер будзе дзейнічаць з максымальным улікам інтарэсаў сілавікоў. 2. У выніку “распрацоўкі” КСП нядобразычліўца В. Шэймана, кіраўнік АП Урал Латыпаў губляў моцнага саюзьніка. 3. Выкарыстоўваючы ў якасьці саюзьнікаў А. Тозіка і Л. Ерына, В. Шэйман замацоўваў сваё становішча найбольш уплывовай фігуры ў асяродзьдзі Лукашэнкі.

Узбуджэньне крымінальных справаў што да шэрагу кіраўнікоў КСП шырока асьвятлялася СМІ. Лукашэнка меў свой інтарэс у інфармацыйным раскручваньні гэтай справы. 1. Ён пацьвярджаў свой імідж “змагара з карупцыяй”, “маланкі намэклятуры”. Ён мог быць упэўнены, што нават калі б рэфэрэндум быў прызначаны і пазьней за год пасьля распрацоўкі КСП, вялікая колькасьць выбарнікаў будзе памятаць гэтую гучную справу: дагэтуль у грамадзкай думцы было пашырана меркаваньне, што барацьба з карупцыяй ніколі не закране гаспадарку “змагара” і “маланкі”. Разьвеяць гэты міт было вельмі карысна. 2. “Бі сваіх, каб чужыя баяліся”... Лукашэнка мог быць упэўнены, што запалоханая эканамічная эліта правільна зразумее “справу КСП”, атрымае дадатковую матывацыю для ляяльных паводзінаў. 3. Ён мог быць цалкам упэўнены ў адданасьці тых, хто выконваў ролю яго “карнага мяча”. Кіраўніцтва КСП мела нямала нядобразычліўцаў унутры краіны, але пры неабходнасьці ўсё ж такі магло дамовіцца зь імі. Да кіраўнікоў КСП не было вялікіх прэтэнзіяў з боку замежных палітычных актараў. У выпадку калі абвяшчэньне рэфэрэндуму мела б усё ж такі стварэньне экстрэмальнай сытуацыі, існавала імавернасьць, што кіраўніцтва КСП “ударыць у сьпіну”, паспрабуе “сысьці з гульні” з добрай часткай дзяржаўнай маёмасьці.

29 жніўня расейскі бок ізноў паставіў перад Менскам пытаньне аб’яднаньня грашовых сыстэмаў. Міністар фінансаў Расеі Аляксей Кудрын заявіў, што Расея гатовая да падпісаньня пагадненьня аб увядзеньні супольнай валюты. Тэрмін падпісаньня залежаў цяпер толькі ад Беларусі. 1 верасьня Лукашэнка назваў увядзеньне супольнай валюты “часткай агульных праблемаў” і абвінаваціў Расею ў тым, што яна не выконвае палажэньняў саюзнай дамовы. Патрабуючы гарантыяў таго, што Беларусь не застанецца “бяз грошай, зарплатаў і пэнсіяў”, Лукашэнка паўтарыў сфармуляваныя раней непрымальныя для Расеі прапановы аб стварэньні адзінага эмісійнага цэнтру. Крамлю было прапанавана спачатку выканаць пагадненьні аб выроўнаваньні цэнаў і ўмоваў для прадпрыемстваў, поўнасьцю адкрыць свой рынак для беларускіх тавараў[7].

Такім чынам, афіцыйны Менск заняў больш жорсткую пазыцыю і ў пытаньні супольнай

[7] Белорусская деловая газета. 2003. 3 сентября.

валюты. Разыходжаньня пазыцыяў аб эмісійным цэнтры хапала, каб зрабіць беспэрспэктыўнымі ўсе перамовы на гэтую тэму, перасунуць іх з плашчыні рэальнай палітыкі ў сфэру палітычнай гульні. Шэраг новых умоваў, сфармуляваных Лукашэнкам, вызначаў і адзіныя цэны на паліва (у тым ліку на нафту і нафтапрадукты).

Як новыя радкі ў фантастычным рамане аб супольнай валюце прагучала новая ініцыятыва Лукашэнкі 8 верасьня. Расеі было прапанавана пачаць працэс аб'яднаньня грашовых сыстэмаў з прыняцьця канстытуцыйнага акту саюзнай дзяржавы. Беларускі варыянт гэтага дакумэнту паводле шэрагу палажэньняў быў абсалютна непрымальным для Расеі.

9 верасьня "Газпром" паведаміў беларускаму ўраду аб адкліканьні сваіх прапановаў аб стварэньні СП зь "Белтрансгазам" і намеры спыніць пастаўкі газу за ўнутрырасейскія цэны. Сам факт, што такі крок "Газпрому" быў зроблены не пры канцы чэрвеня, на што кампанія мела права згодна з умовамі пагадненьня ад 12 красавіка 2002 г., а пасьля значнага часу, калі газ працягваў паступаць у Беларусь за цану 5-га цанавога поясу Расеі, красамоўна сьведчыў аб посьпеху жорсткай размовы з Масквой. Атрымліваючы газ за цану 5-га цанавога поясу Расеі, Беларусь за год эканоміла 210 млн USD. Як апошняя прапанова абмяняць "трубу" на танны газ прагучала заява расейскага прэм'ера М. Касьянава пра тое, што ў бліжэйшы час будзе дэнансаваная пакетная дамова пра супрацоўніцтва ў газатранспартнай сфэры. У адказ на прапанову прыняць канстытуцыйны акт М. Касьянаў паўтарыў прынцыповую пазыцыю прэзыдэнта Расеі аб інтэграцыі дзьвюх краінаў: альбо Беларусь уваходзіць у склад Расеі і адбываецца стварэньне "паўнавартаснай дзяржавы", альбо інтэграцыя паводле мадэлі ЭЗ.

Як адказ на чарговы ўльтыматум з боку Расеі зьявілася інфармацыя пра канфіскацыю беларускімі мытнікамі буйных расейскіх грузаў на беларуска-польскай мяжы[8].

15 верасьня, пасьля доўгага перапынку, які сьведчыў аб даволі халодным клімаце ў беларуска-расейскіх адносінах, Лукашэнка сустрэўся з Пуціным у Сочы. Абодва яны не сустракаліся амаль 8 месяцаў. Прыём быў халодны. Пуцін дэманстрацыйна не сустрэў "стратэгічнага саюзьніка" ў аэрапорце, хоць 14 верасьня ўрачыста сустракаў Дж. Буша старэйшага. Было заяўлена, што Беларусь і Расея пераходзяць на рынкавыя адносіны ў газавай сфэры.

Займаючы жорсткую пазыцыю ў тым, што датычылася "інтэграцыі" з Расеяй, Лукашэнка дэманстраваў разуменьне інтарэсаў Расеі ў яе палітыцы на постсавецкай прасторы. 17 верасьня ў Ялце Беларусь, Казахстан, Расея, Украіна падпісалі дамову аб стварэньні "Адзінай эканамічнай прасторы", якая зьмяшчала пустыя дэклярацыі пра стварэньне супольнай мытнай тэрыторыі і супольныя прынцыпы работы эканомік, але мела і пэўнае практычнае значэньне: бакі ўзялі на сябе абавязкі ўзгадняць дзеяньні, накіраваныя на ўступленьне ў СГА.

Паставіўшы пакуль кропку ў гульні з Расеяй у пытаньні прыватызацыі "Белтрансгазу", афіцыйны Менск стварыў "тэатар абсурду" з "грашовай" тэматыкі. 6 кастрычніка быў сфармуляваны пералік умоваў стварэньня супольнай валюты: 1) адзіны эмісійны цэнтар уключае Цэнтральны банк РФ, Нацыянальны банк РБ і створаную бакамі Міжбанкаўскую валютную раду; 2) Расея ратыфікуе пагадненьне ад 12 красавіка 2002 г., якое прадугледжвае стварэньне роўных умоваў у цанавой сфэры; 3) газ у Беларусь пастаўляецца выключна "Газпромам" за цану 5-га цанавога поясу Расеі; 4) мытны кантроль у адносінах да тавараў з трэціх краінаў на беларуска-расейскай мяжы скасоўваецца (калі б Расея пагадзілася на гэта, то ў выніку

[8] Белорусская деловая газета. 2003. 17 сентября.

дзейнасьці структураў кшталту кампаніі “Торгэкспо”, “Фонду Махмуда Эсамбаева” яна зноў губляла б мільярды USD); 5) Расея кампэнсуе Беларусі страты ад уводзінаў расейскага рубля (2,1 млрд USD).

Пры канцы кастрычніка ў Расеі адбыліся падзеі, якія адцягнулі ўвагу Крамля ад Беларусі. Быў затрыманы кіраўнік кампаніі “ЮКОС” М. Хадаркоўскі. ЗША вуснамі свайго пасла ў Расеі Аляксандра Вэршбоў заявілі аб “выбарачным ужываньні расейскага заканадаўства”. Справа М. Хадаркоўскага была названая замежнымі мэдыямі палітычнай.

Заявы з боку дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША і АБСЭ выклікала і ліквідацыя (згодна з рашэньнем Вярхоўнага суду Беларусі) праваабарончага цэнтру “Вясна”. Кіраўнік амэрыканскай місіі пры АБСЭ Стэфан Мінікес адзначыў, што ўрад Беларусі па-ранейшаму не выконвае ўмоваў АБСЭ, вылучаных тры гады таму: спыненьне рэпрэсіяў і запалохваньня, свабода слова, празрысты выбарчы працэс, пашырэньне паўнамоцтваў парлямэнту.

У канфлікце з краінамі Захаду стала ўсё часьцей гучаць і тэма буйных канфіскацыяў тавараў на беларуска-польскай мяжы. Пасол Нямеччыны ў Беларусі Гельмут Фрык на спэцыяльна скліканай канфэрэнцыі заявіў, што калі беларуская мытня ня спыніць экспрапрыяцыю нямецкага абсталяваньня і транспартных сродкаў, то нямецкі бізнэс можа ўвогуле сысьці зь Беларусі.

Бок Лукашэнкі дэманстраваў рашучасьць працягваць “халодную вайну” з Захадам. 12 лістапада пачаўся судовы працэс у адносінах да актывістаў АГП Алеся Карніенкі і Васіля Палякова, якія былі абвінавачаныя ў парушэньні арт. 167 Адміністрацыйнага кодэксу (парушэньне парадку правядзеньня масавых мерапрыемстваў; паводле вынікаў праведзенага А. Карніенкам і В. Паляковым апытаньня, 1947 жыхароў Гомелю выказаліся “супраць” трэцяга тэрміну Лукашэнкі і 208 — “за”). 23 лістапада з грубымі парушэньнямі выбарчага заканадаўства былі праведзеныя давыбары ў Раду г. Белаазерску. Адміністрацыйны рэсурс быў выкарыстаны для “рэваншу” за паразу падчас першага туру выбараў у гарадзкую Раду. (Падчас першага туру выбараў у сакавіку 2003 г. дэмакраты, узначаленыя кіраўніком Берасьцейскай абласной арганізацыі БНФ Юрасём Губарэвічам, атрымалі 8 (з 13) месцаў у Радзе.)

28 лістапада ўлады зрабілі крок да спыненьня расьсьледаваньня справаў зьніклых. Суд Фрунзэнскага раёну г. Менску прызнаў Дзьмітрыя Завадзкага памерлым.

10 сьнежня лідэр БСДП (НГ) Мікалай Статкевіч абвясьціў пра стварэньне Эўрапейскай кааліцыі “Свабодная Беларусь”, мэта якой — інтэграцыя Беларусі ў ЭЗ. Словы М. Статкевіча сьведчылі пра раскол апазыцыі. Як і іншы чалец кааліцыі А. Саньнікаў, М. Статкевіч адзначыў: “Разнамасная кааліцыя камуністаў, лібэралаў і нацыяналістаў наўрад ці зможа прапанаваць эфэктыўную і папулярную праграму. Можна аб’яднаць нават ідэалягічна розныя партыі, але складана аб’яднаць іх электарат. Блякаваньне з камуністамі не дазволіць акумуляваць галасы праэўрапейска настроеных выбарнікаў”[9].

Дарма што раскол апазыцыі на шэраг неэфэктыўных кааліцыяў ня мог не задаволіць уладу, адсутнасьць вынікаў працы ў гэтым кірунку стала падставай для жорсткай крытыкі Лукашэнкі на адрас КДБ 16 сьнежня. “Спэцслужба ня бачыць і ня ведае каналаў паступленьня ў краіну фінансавых патокаў для радыкальнай апазыцыі. Складаецца ўяўленьне, што КДБ збоку наглядае так званы імпарт дэмакратыі”[10].

[9] Белорусская деловая газета. 2003. 12 декабря.

[10] Белорусская деловая газета. 2003. 19 декабря.

Абурэньне Лукашэнкі выклікалі і факты ўцечкі інфармацыі з КДБ. Л. Ерын быў абвінавачаны ў тым, што аслабіў міжведамасны кантроль па абароне дзяржаўных сакрэтаў.

З моманту абраньня першага намесьніка кіраўніка АП Леаніда Козіка старшынём ФПБ намаганьні ўлады былі накіраваныя на прасоўваньне “сваіх людзей” на пасады кіраўнікоў апошніх непадпарадкаваных галіновых прафсаюзаў. 27 сьнежня 2003 г. пад ціскам улады сход прафсаюзу працоўных аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня зьняў з пасады старшыні лідэра БПП Аляксандра Бухвостава. (Старшыня ФПБ, добра разумеючы, што пры тайным галасаваньні чарговая спроба зьняць А. Бухвостава зноў праваліцца, настаяў на адкрытым галасаваньні.) У складзе ФПБ застаўся толькі адзін галіновы прафсаюз, непадкантрольны ўладзе, — працоўных радыёэлектроннай прамысловасьці на чале з Генадзем Фядынічам.

7 студзеня 2004 г. Л. Козік выступіў з ініцыятывай правядзеньня рэфэрэндуму, на які будзе вынесенае пытаньне аб вяртаньні прафсаюзам права заканадаўчай ініцыятывы.

Парушэньне правоў прафсаюзаў у Беларусі стала прадметам разгляду ў Эўрапейскай камісіі. Як было заяўлена з боку ЭК, Беларусь можа быць пазбаўленая прэфэрэнцыяў у гандлі з ЭЗ, у выніку чаго будзе штогод губляць 100 млн эўра. (У 2003 г. аб’ём беларускага экспарту ў ЭЗ склаў 587 млн эўра.)

Аднак, працягваючы жорсткую размову з Захадам, прэзыдэнцкі бок атрымаў інфармацыю, якая сьведчыла аб скасаваньні адзінай перашкоды рэфэрэндуму — дадатных для яго зьменах у пазыцыі Расеі. 4 студзеня прэзыдэнтам Грузіі быў абраны Міхаіл Саакашвілі. Такі ж перакананы прыхільнік уступленьня краіны ў NATO, як і яго папярэднік, М. Саакашвілі выступаў за прыняцьце рашучых захадаў супраць дэзінтэграцыі Грузіі. “Грузінскае пытаньне” заўсёды востра стаяла ў амэрыканска-расейскіх адносінах. Падтрымка з боку Расеі абхаскіх, паўднёваасецінскіх і аджарскіх сэпаратыстаў павінна была выклікаць наступны віток напружанасьці ў адносінах Расеі з Захадам. Акцыі Лукашэнкі як саюзьніка Расеі падвышаліся.

8 студзеня сакратар ЦВК Мікалай Лазавік заявіў аб тым, што сумяшчэньне рэфэрэндуму з парлямэнцкімі выбарамі дазволіць удвая скараціць выдаткі на яго правядзеньне. У той жа дзень былы гендырэктар МТЗ М. Лявонаў быў прыгавораны судом да 8 гадоў пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці.

11 студзеня П. Севярынец абвесьціў аб стварэньні кааліцыі “Маладая Беларусь”. Падзеі ў Беларусі разьвіваліся самым спрыяльным для Лукашэнкі чынам.

## “Газавы тэрарызм”

24 студзеня 2004 г. пастаўкі расейскага газу ў Беларусь былі поўнасьцю спыненыя. Паводле паведамленьняў “Газпрому”, Беларусь 16 студзеня выбрала аб’ёмы газу, закупленыя ў кампаніяў “Ітэра” і “Транснафта” (адпаведна ў гэтых кампаніяў было закуплена 0,8 і 0,5 млрд м$^3$), а пасьля гэтага вяла несанкцыянаванае адпампаваньне паліва, якое прызначалася для заходніх пакупнікоў, — каля 300 млн м$^3$. Расея зноў паспрабавала прымусіць Лукашэнку аддаць “трубу”. Міністар энэргетыкі РФ Ігар Юсуфаў заклікаў беларускі ўрад разгледзець прапановы “Газпрому” аб стварэньні СП зь “Белтрансгазам”.

“Газпром” прапанаваў беларускаму ўраду падпісаць кантракт на пастаўку газу цаной 50 USD за 1 тыс. м$^3$ — як для Ўкраіны. Але, прывязаўшы “газавае” пытаньне да “грашовага”,

Менск адхіліў прапанову “Газпрому”. 30 студзеня ўрад уклаў дагавор з кампаніямі “Ітэра” і “Транснафта” аб пастаўках газу цаною 46,68 USD за 1 тыс. $м^3$.

Закупленага газу стала менш як на месяц. Да траўня ўключна беларускі ўрад пры канцы кожнага месяца ўкладаў кантракты на пастаўку месячнага аб’ёму газу кампаніямі “Ітэра”, “Транснафта” і “Сібур” цаной 46,68 USD за 1 тыс. $м^3$. Назапашаныя ў газасховішчах аб’ёмы, а таксама запасы мазуту дазвалялі Беларусі “пратрымацца” яшчэ месяц, пасьля якога — поўнае спыненьне эканомікі і холад у хатах. Лукашэнка ня меў ілюзіяў, што “Газпром”, не атрымаўшы “трубу”, будзе пастаўляць газ за расейскія ўнутраныя цэны. І тым ня менш Менск ставіў перад Масквой загадзя непрымальныя для яе ўмовы, адмаўляўся ад укладаньня доўгатэрміновага кантракту на пастаўку газу. Напярэдадні рэфэрэндуму бок Лукашэнкі сьвядома ствараў вострую канфліктную сытуацыю ў адносінах з Расеяй. Гэтым вырашаліся наступныя задачы.

1. Ува ўмовах выбуху зацікаўленасьці беларускага грамадзтва да “газавай” праблемы канфлікт выкарыстоўваўся для дыскрэдытацыі кіраўніцтва Расеі. Быў нанесены моцны інфармацыйны ўдар па станоўчым іміджы У. Пуціна, якога дагэтуль немалая частка беларускіх выбарнікаў успрымала як больш эфэктыўнага лідэра за Лукашэнку. Інфармацыйная кампанія была накіраваная на ўспрыманьне Пуціна як прадстаўніка інтарэсаў алігархічнага капіталу, які цісьне на Беларусь з мэтай куплі расейскімі “жулікамі” беларускіх прадпрыемстваў — з усімі нэгатыўнымі для звычайнага беларуса наступствамі.

2. Беларускай аўдыторыі была прапанаваная пераканаўчая аргумэнтацыя жорсткай пазыцыі афіцыйнага Менску ў адносінах з Расеяй: тая была абвінавачаная ў здрадзе беларускаму саюзьніку (было заяўлена, што, дзякуючы выкананьню Беларусьсю ролі “заходняга шчыта” Расеі, тая эканоміць больш за 21 млрд USD — суму, якую давялося б выдаткаваць на стварэньне вайсковай і абароннай інфраструктуры на беларуска-расейскай мяжы. Пры гэтым падкрэсьлівалася, што з геаграфічных прычынаў Расея безь “беларускага шчыта” ня можа мець эфэктыўнай сыстэмы СПА) і злоўжываньні альтруізмам афіцыйнага Менску. 26 студзеня ў інтэрвію БТ Лукашэнка заявіў, у прыватнасьці, што праз тэрыторыю Беларусі штогод за самыя льготныя тарыфы перавозіцца больш за 200 млн т грузаў: “Поўзаюць, езьдзяць, лётаюць... І ўсё бясплатна!”

Так былі падрыхтаваныя спрыяльныя ўмовы для таго, каб вытрымаць ціск з боку Расеі: любыя абвінавачаньні Крамля на адрас Лукашэнкі ня выклікалі рэзанансу сярод значнай большасьці беларусаў. Пераканаўшыся ў немагчымасьці прымусіць Лукашэнку пайсьці на саступкі, Масква павінна была яшчэ раз пераканацца ў тым, што яе палітыка адносна Беларусі абмежаваная дзьвюма альтэрнатывамі: Лукашэнка альбо яго праціўнікі, што выступаюць за ўступленьне краіны ў ЭЗ і NATO…

Доўгая, поўная ўзаемных абвінавачаньняў барацьба за “трубу” і “рубель” паміж Менскам і Масквой, якую беларускі бок падаграваў пэрыядычнымі буйнымі канфіскацыямі расейскіх тавараў на беларуска-польскай мяжы (за студзень — сакавік 2004 г. ДМК Беларусі канфіскаваў на беларуска-польскай мяжы расейскіх грузаў на суму 23,2 млн USD; пры захаваньні такой дынамікі за год было б канфіскавана расейскіх грузаў на 90 млн USD), была выкарыстаная Лукашэнкам для інфармацыйнай вайны супраць Крамля. Пры канцы траўня 2004 г. памочнік прэзыдэнта РФ Сяргей Прыходзька адзначыў: “Толькі 30 % публікацыяў у прапрэзыдэнцкай газэце “Советская Белоруссия” мае нэўтральны характар. 70 % — антырасейская прапаганда”[11].

[11] Белорусская деловая газета. 2004. 25 мая.

4 чэрвеня 2004 г., калі ўжо было вядома аб тым, што ў кастрычніку адбудуцца парлямэнцкія выбары і вельмі часта зьяўлялася інфармацыя аб магчымым сумяшчэньні зь імі рэфэрэндуму, Пуцін і Лукашэнка сустрэліся ў Сочы. "Газавая вайна" была скончаная на ўмовах захаваньня статус-кво. "Газпром", заяўляючы напярэдадні сустрэчы аб тым, што ўмовай укладаньня зь беларускім урадам кантракту на пастаўку газу будзе цана 53,5 USD за 1 тыс. м$^3$, пагадзіўся пастаўляць газ цаною 46,68 USD. Пры гэтым Расея зрабіла значны крок насустрач Лукашэнку. Беларусі быў выдзелены на самых ільготных умовах крэдыт на набыцьцё газу — 200 млн USD, хаця яшчэ ў сакавіку 2004 г. міністар фінансаў Расеі А. Кудрын катэгарычна заяўляў, што ня можа быць гаворкі аб крэдыце для Беларусі ўвогуле. У сваю чаргу, Лукашэнка пагадзіўся захаваць старую цану за пампаваньне газу праз тэрыторыю Беларусі — 0,75 USD за транзыт 1 тыс. м$^3$ на 100 км.

Акрамя таго, было вырашана адкласьці абмеркаваньне аб'яднаньня грашовых сыстэмаў да 2006 г. Тое, што на бліжэйшы час у беларуска-расейскіх адносінах не прадбачылася вострых дыскусіяў, пацьвярджалася тым, што У. Пуцін прыняў запрашэньне наведаць Беларусь 3 ліпеня, у лукашэнкаўскі дзень незалежнасьці Беларусі.

Шлях да "трэцяга тэрміну" быў адчынены.

Пасьля сочынскай сустрэчы "пеўчыя птушкі Крамля" (кшталту лідэра партыі "Радзіма" Дзьмітрыя Рагозіна), якія зусім нядаўна катэгарычна заяўлялі аб тым, што Расея не прызнае вынікаў рэфэрэндуму, ізноў разам сталі "сьпяваць" аб пэрспэктывах інтэграцыі і значэньні стратэгічнага саюзьніка.

***

Набліжэньне барацьбы паміж Расеяй і Захадам за Ўкраіну надавала Лукашэнку ўпэўненасьці ў тым, што Расея пасіўна (а большага ад яе і не патрабавалася) падтрымае яго ініцыятыву, заявіць аб тым, што рэфэрэндум — унутраная справа Беларусі. Ува ўмовах сілкаванага прытокам расейскіх нафтадаляраў росту УВП (10,6 %) ён мог быць упэўнены ў чарговай "элегантнай перамозе": на кожную незадаволеную галаву на вуліцах Менску мелася больш за дзясятак station ручкоў. Існуе толькі адна прычына таго, што Лукашэнка да апошняга часу цягнуў з прызначэньнем рэфэрэндуму, захоўваў інтрыгу: такім чынам абмяжоўваліся магчымасьці апазыцыі аказаць супрацьдзеяньне правядзеньню рэфэрэндуму. Пры ўсёй відавочнай яму слабасьці апазыцыі ён, магчыма, пераацэньваў функцыянальнае становішча актыўных апанэнтаў.

## КУЛЬТУРНЫ ФОН БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫКІ

Мэта гэтага артыкулу — разгледзець асобныя праблемы культурнага фону беларускай палітыкі. Перш за ўсё будуць прааналізаваныя вынікі ідэалягічнага "павароту" беларускіх уладаў пасьля 2001 г. Сутнасьць "павароту" ў адыходзе ад "рэвалюцыйнай" панславісцкай/русісцкай ідэалёгіі з элементамі савецкай рэстаўрацыі да "ідэалёгіі беларускай дзяржавы", якая адлюстроўвае пераход з "імпэрскага" да "тутэйшага". Панрусісцкая[1] палітычная мова

[1] Тэрміны "панславізм" і "панрусізм" (ідэя палітычнага і культурнага адзінства ўсіх "рускіх" народаў: беларусаў, расейцаў і ўкраінцаў) для Беларусі зьяўляюцца, па сутнасьці, тоеснымі. Таму ў гэтым артыкуле мы будзем ужываць іх як раўназначныя. Частка дасьледнікаў выкарыстоўвае для азначэньня сучасных вэрсіяў "славянскай ідэі" тэрмін "нэаславізм", але мы будзем прытрымлівацца больш традыцыйных азначэньняў.

дамінавала з самага пачатку прыходу А. Лукашэнкі да ўлады, а адпаведная ідэалёгія зьведала сапраўдны ўздым у 2-й палове 1990-х гг., фактычна атрымаўшы афіцыйны статус. Новая ідэалёгія фармавалася на жорсткай апазыцыі да ідэалёгіі беларускага адраджэньня, што мела ўздым у 1988–1995 гг., і шмат у чым — у апазыцыі да ідэі незалежнасьці. Але на пачатку XXI ст. панрусізм выявіў відавочную палітычную бездапаможнасьць і неадэкватнасьць як патрэбам беларускага грамадзтва, так і рэальным палітычным працэсам у Беларусі. 2000–2002 гг. увогуле сталі завяршэньнем эпохі транзыту і адпаведна выклікалі значныя зьмены ў палітычнай мове, а таксама праблематыцы палітычных дыскусіяў. У палітычнай мове практычна перасталі выкарыстоўвацца старая тэрміналёгія "пераходнага пэрыяду", фразэалёгія "камунізму" і "антыкамунізму". Акрамя таго, адбылося станаўленьне дзяржаўных і нацыянальных ідэнтычнасьцяў у новых постсавецкіх дзяржавах, што зьменшыла дыскусію пра нацыянальна-дзяржаўнае самавызначэньне. Паварот ад панрусізму да "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" — відавочная праява гэтага агульнага рэгіянальнага працэсу.

Далей мы разгледзім практычныя захады афіцыйных уладаў для стварэньня "ідэалёгіі беларускай дзяржавы", мадэль ідэнтычнасьці, якую прапануе ўзгаданы ідэалягічны комплекс, а таксама асноўныя тэндэнцыі культурнай і палітычнай ідэнтыфікацыі, характэрныя для беларускага грамадзтва.

## Праект "ідэалёгія беларускай дзяржавы"

На пачатку коратка пазначым праблему крыніцаў "ідэалёгіі беларускай дзяржавы". Пераважная большасьць дасьледнікаў, аналітыкаў і публіцыстаў яе зьяўленьне зьвязваюць з адраджэньнем савецкай палітычнай традыцыі, дзе існавала кананізаваная дзяржаўная ідэалёгія, ролю якой выконваў марксізм-ленінізм. Значныя складнікі савецкай ідэалёгіі (напрыклад русацэнтрызм, ідэя "адзінага народу") альбо ўвогуле не ўваходзілі ў склад кадыфікаванай ідэалёгіі, альбо прысутнічалі толькі ў якасьці фону. Зь "дзяржаўнай ідэалёгіяй" мы маем тую ж сытуацыю: далёка ня ўсе значныя для ўлады канцэпты (асабліва "палітычна некарэктныя") уключаныя ў яе корпус.

Збольшага ўплыў савецкай традыцыі відавочны, асабліва пры рэалізацыі гэтага праекту на нізавым узроўні. Але ўплыў мае месца ня ў зьмесьце ідэалёгіі — тут простых перайманьняў нямнога, найбольш паказальны прыклад — героіка Вялікай айчыннай вайны. Мае месца пераважна структурнае пераймапьне ідэі дзяржаўнай ідэалёгіі як "цэмэнтуючай і арганізуючай сілы" грамадзтва і ўяўленьне пра ідэалёгію як неабходны элемэнт завершанай дзяржавы. Непасрэдным пазычаньнем ёсьць і перайманьне самога тэрміну "ідэалёгія", які б не выкарыстоўваўся без уплыву савецкай традыцыі, асабліва ўлічваючы нэгатыўныя, часам нават палітычна некарэктныя канатацыі, якія ўзьнікаюць у сувязі зь ім. (У іншай сытуацыі замест "ідэалёгіі" ўжываўся б больш палітычна карэктны канцэпт "нацыянальная ідэя" ці "дзяржаўная ідэя", а яе рэалізацыя адбывалася б больш ускосным чынам — праз СМІ, гісторыю, літаратуру.) Што тычыцца зьместу, то савецкую ідэалягічную дактрыну лічыць крыніцаю "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" нельга, а тлумачыць беларускую ідэалёгію ўплывам расейскага мэсіянізму, як і мэсіянізмам увогуле, недарэчна. Нязначныя мэтафары "беларускай місіі" толькі эпізадычна і вельмі абмежавана прысутнічалі ў прамовах афіцыйных асобаў, напрыклад, А. Лукашэнкі на ідэалягічным сэмінары ў сакавіку 2003 г.: "Беларусь павінна

прыцягваць сілы патрыятычнай накіраванасьці з усёй нашай айчыны, постсавецкай прасторы. Менавіта тут людзі павінны атрымаць трыбуну, вольную ад нэалібэральнага тэрору і цкаваньня". Але такі мэсіянізм практычна не прысутнічае ў больш рафінаваных тэкстах і малаверагодна, каб задумваўся як нешта большае, чым мэтафара. Прынамсі, ні палітычная, ні ідэалягічная практыка пра гэта ня сьведчыць.

Завяршаючы агляд магчымых крыніцаў дзяржаўнай ідэалёгіі, трэба адзначыць, што яна ня мае інтэлектуальных сувязяў з традыцыяй беларускага нацыянальнага адраджэньня XIX–XX стст. Больш за тое, прынамсі фармальна, новая ідэалёгія знаходзіцца ў апазыцыі да нацыянальнай спадчыны. Уплыў заходне-русізму ў форме яго сучасных вэрсіяў, адноўленых вузкімі коламі расейскаарыентаванай інтэлігенцыі ў 1990-х гг., і розных канцэптаў расейскіх нацыяналістаў, якія былі перанятыя ў пэрыяд панаваньня панрусізму, больш адчувальны. Але такія ўплывы абмежаваныя інтэрпрэтацыяй гісторыі і рознымі антызаходнімі канцэпцыямі (а звычайна — толькі мэтафарамі), якіх, ізноў жа, адносна нямнога. Цэнтральнае месца ў новай спробе скласьці ідэалягічную дактрыну занялі ўсё ж праблемы "дзяржаўнага" і "беларускага": "беларуская мадэль разьвіцьця", "беларуская палітычная сыстэма", "беларускі шлях", "беларускі досьвед дзяржаўнага будаўніцтва" і г. д. Заходнярускія канцэпты выглядаюць у такім кантэксьце хутчэй як рудымэнт, які застаўся ад старых ідэалягічных схемаў.

На нашую думку, усе спробы знайсьці доўгую генэалёгію "дзяржаўнай ідэалёгіі" ня маюць падставаў. "Ідэалёгія беларускай дзяржавы" ёсьць пераважна новы фэномэн, які вельмі ўмоўна і ў абмежаванай ступені можна зьвязваць з апісанымі вышэй інтэлектуальнымі крыніцамі. Больш за тое, аснова новай ідэалягічнай дактрыны — канцэпт "беларускай дзяржавы" — практычна не спалучаецца ні з адной зь іх. "Ідэалёгія беларускай дзяржавы" мае характар апэратыўнага зводу канцэпцыяў, які складваецца як апісаньне існага рэжыму для патрэбаў "тут" і "цяпер", і па сутнасьці сваёй гэта вельмі фрагмэнтаваны і да гэтага часу не кадыфікаваны корпус.

Сама "дзяржаўная ідэалёгія" звычайна пазначае сваю кароткую генэалёгію. Пачатак уласна беларускай дзяржаўнасьці зь яе пазыцыяў месьціцца не ў расейскай мэтраполіі (заходнерусізм), не ў БССР (саветызм) ці ВКЛ/БНР (традыцыя адраджэньня), але ў значна больш позьнім пэрыядзе — у 1991 г., а больш дакладна — у 1994 г., калі пачаў складвацца сучасны рэжым.

Фармальна разгортваньне "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" як палітычнага праекту пачалося вясною 2003 г. з пасяджэньня дзейнага сэмінару кіраўнічых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў "Аб стане ідэалягічнай работы і захадах для яе ўдасканаленьня"[2]. Сэмінар адбыўся 27 сакавіка і суправаджаўся шырокай кампаніяй у дзяржаўных СМІ. Сама "ідэалёгія беларускай дзяржавы" была сфармуляваная як спалучэньне чатырох элемэнтаў: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі (праўная аснова ідэалёгіі дзяржавы), беларуская эканамічная мадэль (эканамічная аснова ідэалёгіі дзяржавы), беларуская палітычная мадэль (палітычная аснова ідэалёгіі дзяржавы) і беларуская ідэалягічная дактрына / нацыянальная ідэя (сьветапоглядная аснова ідэалёгіі дзяржавы).

На сэмінары не было адзінства аб пытаньні фармату ідэалягічнай працы і яе зьмесьце. У прыватнасьці, шэраг службоўцаў (сярод іх галоўны рэдактар газэты "Беларусь сегодня /

[2] Першыя вэрсіі будучай ідэалёгіі зьявіліся раней, яшчэ ў 2002 г., гл.: Белорусская модель развития: механизмы реализации / Под ред. Е. Матусевича. — Мн., 2003.

Советская Белоруссия" Павал Якубовіч) слушна выступалі супраць выкарыстаньня слова "ідэалёгія", "ідэалягічная праца" і прапаноўвалі гаварыць пра "інфармацыю" ды "інфармацыйную работу". А акадэмік Яўген Бабосаў выказаў меркаваньне, што ў якасьці асновы ідэалёгіі можна пакласьці "беларускасьць". Тым ня менш, гэтыя прапановы не былі падтрыманыя, а сам сэмінар распачаў праект "ідэалёгія беларускай дзяржавы" ў тым выглядзе, які мы маем цяпер. (Паказальнай таксама была дыскусія пра назву: "ідэалёгія беларускай дзяржаўнасьці" ці "ідэалёгія беларускай дзяржавы". Першая, натуральна, прадугледжвала б зусім іншую стылістыку разгортваньня ідэалягічных канцэптаў.)

Акрамя "навуковай" распрацоўкі ідэалягічных асноваў дзяржаўнай улады, гэты праект уключаў і іншыя арганізацыйныя захады. Зьмены датычыліся перш за ўсё выканаўчых органаў. Была ўтвораная "ідэалягічная вэртыкаль": у прыватнасьці, у структуру мясцовых выканаўчых органаў была ўведзеная пасада намесьніка старшыні па ідэалёгіі. Паступова "ідэалягічная вэртыкаль" пачала выконваць і іншыя функцыі, дзе-нідзе фармуючы "вэртыкаль палітычную". На яе, у прыватнасьці, была ўскладзеная значная частка працы для забесьпячэньня выбарчай кампаніі 2004 г. У 2003 г. была прызнаная незадавальняльнай праца Інстытуту сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта і праведзеная яго рэарганізацыя, акрамя таго, пастаўленае пытаньне пра павышэньне якасьці аналітычнай працы структурных падразьдзяленьняў Адміністрацыі прэзыдэнта ўвогуле.

Зьмены закранулі і сыстэму адукацыі. Быў распрацаваны навучальны курс для ВНУ "Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы". Ён быў уведзены ў навучальныя праграмы і пачаў выкладацца з 2003/04 навучальнага году. Для ідэалягічнай працы з насельніцтвам былі створаныя інфармацыйна-прапагандысцкія групы і праведзеныя некалькі спробаў рэанімацыі грамадзкага аб'яднаньня таварыства "Веды". Усе гэтыя спробы можна лічыць няўдалымі. Інфармацыйна-прапагандысцкія групы вельмі хутка паказалі сваю неэфэктыўнасьць, а навучальны курс для ВНУ склаўся ў значнай ступені як фармальны і несыстэмны. Шэраг захадаў тычыўся і арганізацыі інфармацыйнай прасторы: быў пашыраны ўплыў беларускіх тэлеканалаў, зьменены кампанэнты навінаў і павялічаны час гучаньня беларускай музыкі на FM-станцыях і г. д.

Ідэалягічныя зьмены сталі відавочнымі і пры арганізацыі выбарчай кампаніі 2004 г. Праблематыка замежнапалітычных стасункаў з Расеяй альбо Захадам была зьведзеная да мінімуму (асабліва ў параўнаньні з выбарамі 2001 г.). У палітычнай мове перастала ўжывацца апэляцыя да Расеі як сродку легітымацыі беларускай улады. Паказальна, што сымбалем кампаніі па рэфэрэндуме і выбарах у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу стаў цалкам "патрыятычны" лёзунг "За Беларусь".

## Вэрсія ідэнтычнасьці, прапанаваная "ідэалёгіяй беларускай дзяржавы"

Звычайна пры аналізе ідэнтычнасьці ў яе структуры вылучаюць кагнітыўную і афэктыўную частку. Кагнітыўная частка ўтрымлівае зьмест ідэнтычнасьці — вэрсіі гісторыі, канцэпцыі паходжаньня, крытэры ідэнтыфікацыі, моўную і культурную кампазыцыі, прыкметы ды маркеры групавой і індывідуальнай тоеснасьці і г. д. Афэктыўная частка ідэнтычнасьці зьвя-

заная з пачуцьцём гонару, пераживаньня, жаданьня належаць ці не належаць да той супольнасьці, зь якой пэўны чалавек сябе ідэнтыфікуе.

Для апісаньня кагнітыўнага кампанэнту ідэнтычнасьці зручна выкарыстоўваць цыркулярную мадэль, якая заключаецца ў вылучэньні "цэнтру" — асновы для самасьвядомасьці — і дастаткова шырокай "пэрыфэрыі", якая атачае гэты цэнтар. Цэнтрам прапанаванай у "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" ідэнтычнасьці, відавочна, ёсьць канцэпт "беларуская дзяржава". У сваю чаргу, гістарычная традыцыя і культурная ідэнтыфікацыя маюць у кантэксьце дзяржаўнай ідэалёгіі пэрыфэрыйнае значэньне. Гэта значыць, што адначасова яна можа ўтрымліваць некалькі вэрсіяў гісторыі і культурнай ідэнтыфікацыі, не парушаючы ўласнай цэласнасьці. Акрамя гэтага, зьмены, якія адбываюцца ў інтэрпрэтацыі гісторыі і культуры, мала ўплываюць на разуменьне "беларускай дзяржавы", у той час як нязначныя зьмены ў разуменьні апошняй выклікаюць актыўнае перапісваньне гісторыі і культуры.

"Беларуская дзяржава" ў межах праекту новай ідэнтычнасьці мае пераважна прасторавае ўвасабленьне, часавая рэпрэзэнтацыя (гісторыя, генэалёгія) акрэсьленая дастаткова слаба. Дзяржава ў кантэксьце ідэалёгіі — гэта перш за ўсё тэрыторыя, а таксама ўлада, якая дамінуе на гэтай тэрыторыі. Сутнасьць улады як атрыбуту "беларускай дзяржавы" — сыстэма дзяржаўных органаў, створаная ў другой палове 1990-х гг. У адрозьненьне ад беларускай нацыянальнай традыцыі, як і традыцыі большасьці краінаў Усходняй і Цэнтральнай Эўропы, у межах ідэнтычнасьці, якая прапануецца беларускімі ўладамі, дзяржаўнасьць ня зьвязваецца з доўгай гістарычнай і культурнай традыцыяй, а значыць, ідэя ўлады мае неакрэсьленае часавае вымярэньне.

Натуральна, падручнікі ідэалёгіі звычайна імкнуцца да фармуляваньня "глыбокай" генэалёгіі — Кіеўская Русь, БССР і г. д., але трывалай згоды на гэты конт не існуе. Частка аўтараў з інэрцыі падкрэсьліваюць "агульнаславянскую" сутнасьць палітычнай традыцыі Беларусі, іншыя асноўны ўхіл робяць на досьвед БССР ці нават спрабуюць упісаць у яе ВКЛ. Апісаньне генэалёгіі вельмі нестабільнае, таму, прынамсі на сёньня, гістарычная самасьвядомасьць займае пэрыфэрыйнае месца ў ідэнтычнасьці (у прынцыпе, уся гісторыя разглядаецца як дадзяржаўнае разьвіцьцё, гісторыя тэрыторыі). Такім чынам, "беларуская дзяржава" ў кантэксьце новай ідэнтычнасьці — гэта тэрыторыя, мытні, сыстэма заканадаўства, інстытут грамадзянства і іншыя атрыбуты, пэрсаніфікаваныя ў сыстэме дзяржаўных органаў, створаных пасьля 1994–1996 гг., гэта значыць створаных сучасным рэжымам. Усе спалучэньні яе з тымі ці іншымі гістарычнымі традыцыямі, міжнародным кантэкстам, культурнай спадчынай і г. д. маюць другаснае значэньне і пакуль не кадыфікаваныя. (Кадыфікаваная ідэалёгія патрабуе ня толькі апісаньня дзяржавы, але і "ідэі дзяржавы". Гэтага элемэнту пакуль няма, калі ня ўлічваць некалькіх мэтафарычных выказваньняў.)

Больш за тое, службовыя асобы і афіцыйныя СМІ дастаткова часта падкрэсьліваюць кароткую генэалёгію беларускай дзяржавы, яе малады характар[3]. Тэндэнцыя пачаць адлік гісторыі з 1994 г. вельмі паказальная. Што тычыцца пэрыяду 1991–1994 гг., то ён адназначна выступае ўвасабленьнем хаосу, нестабільнасьці і дэструктыўнасьці.

Як ужо было адзначана, выбар гістарычнай традыцыі для новай ідэалёгіі зьяўляецца праблематычным. З аднаго боку, рэцэпцыя "нацыянальнай" гістарычнай спадкаемнасьці (Полац-

[3] Пар. стылістыку сэрыялу "Найноўшая гісторыя" і кнігі: Лукашенко А. Г. Исторический выбор Беларуси : Лекции, прочитанные в высших учебных заведениях г. Минска. — Мн., 2003.

кае княства — Вялікае Княства Літоўскае — нацыянальна-вызваленчы рух XIX–XXст. — Беларуская Народная Рэспубліка — Рэспубліка Беларусь) з палітычных прычынаў немагчымая. Па-першае, яна доўгі час рэпрэсавалася ўладаю, асабліва на пачатку панславісцкага пэрыяду. Па-другое, такое разуменьне гісторыі асабіста не прымаецца часткаю кіраўнічай эліты і самім прэзыдэнтам.

Культываваньне панславісцкіх і, тым больш, панрусісцкіх вэрсіяў гісторыі, якія, як мы адзначалі на пачатку, былі асноваю ідэалягічнага аздабленьня рэжыму ў другой палове 1990-х гг., ёсьць дастаткова неэфэктыўным. Правал праекту расейска-беларускай інтэграцыі выявіў яго дрэнную прыстасаванасьць да патрэбаў незалежнай дзяржавы, хоць панрусісцкае разуменьне гісторыі і не адкінутае цалкам. Савецкая гістарычная традыцыя таксама ня можа быць цалкам прынятая. Па-першае, Беларусь цяжка лічыць спадкаемніцай СССР, па-другое, уздым настальгічных пачуцьцяў па былой вялікай дзяржаве даўно мінуў. Так ці інакш, дзяржаўная ідэалёгія не прапануе больш-менш акрэсьленай гістарычнай спадчыны.

## Культурная ідэнтыфікацыя

Нягледзячы на значную трансфармацыю палітычнага бачаньня Беларусі і фактычны пераход улады з "імпэрскіх" на "дзяржаўныя" пазыцыі, гэты пераход практычна не закрануў сфэры культурнай ідэнтыфікацыі, якая па-ранейшаму не грунтуецца на беларускай культурнай спадчыне. Манапольны статус расейскай мовы і, у значнай ступені, расейскай культуры не мяняецца. Легітымацыя расейскай мовы мае розныя формы, ад падкрэсьліваньня блізкасьці і агульнасьці яе зь беларускай да канструяваньня адпаведнай генэалёгіі: у ВКЛ дзяржаўнаю была руская мова, на гэтай мове Ф. Скарына выдаў сваю Біблію, празь яе мы атрымалі адукацыю і г. д. Часам уводзіцца тэзыс пра тое, што Беларусь як былая частка савецкай і расейскай імпэрыі мае права на яе культурную спадчыну, перш за ўсё моўную.

Варта адзначыць пэўнае зьмяненьне статусу расейскай мовы. Калі раней, у панславісцкі пэрыяд, расейская мова выступала як доказ адзінства і тоеснасьці беларускага і расейскага народаў і выступала як нешта супольнае і ўнівэрсальнае, то ў мове сучаснай ідэалёгіі сытуацыя выглядае троху інакш. Аргумэнтацыя зводзіцца да доказу таго, што расейская мова — "гэта ня толькі мова расейцаў, але і наша мова", "расейская мова не належыць расейцам", "у яе фармаваньні ўдзельнічалі і беларусы" і да т. п. Адбываецца так званая кантэкстуалізацыя, "лякалізацыя" расейскай мовы. Калі раней яна выступала як аргумэнт для "ўзьяднаньня", то цяпер пачынае інтэрпрэтавацца як фактар, які ўжо ня ёсьць падставаю для інтэграцыі.

Яшчэ больш відавочна гэта прасочваецца ў іншых культурных сфэрах. Улада і яе ідэалёгія практычна не выказваюць узьнёслых эмоцыяў у адносінах да расейскай культуры, асабліва сучаснай. Піетэт захоўваецца, звычайна, да клясычнай расейскай літаратуры ды культуры савецкага пэрыяду. Адпаведна, у большасьці працаў з ідэалёгіі актуалізацыя расейскай культурнай традыцыі альбо адсутнічае, альбо знаходзіцца на пэрыфэрыі. У той самы час узмацняюцца розныя формы культурнага пратэкцыянізму і падтрымкі беларускай культуры, як у яе традыцыйных, так і сучасных формах. Найбольш красамоўны прыклад — увядзеньне ў 2004 г. абавязковай квоты ў 50 % для беларускай музыкі ў этэры, пазьней квота была павялічаная да 75 %.

Такім чынам, расейскамоўная аснова культурнай ідэнтыфікацыі ў праекце новай ідэнтыч-

насьці захоўваецца, але зьмястоўнае напаўненьне гэтай формы ўсё больш надаецца культурным прадуктам мясцовага паходжаньня. У той жа самы час культурная традыцыя ў ідэалягічным корпусе не зусім прапісаная і звычайна адсылае да наступнай спадкаемнасьці: 1) адраджэньне другой паловы XIX — пачатку XX ст. Гэты пэрыяд быў цалкам упісаны ў савецкую гісторыю беларускай культуры і нацыі. Тут прызнаецца легітымнасьць клясыкаў літаратуры (Я. Купала, Я. Колас), нават "Нашай Нівы" і палітыкі беларусізацыі ў 1920-х гг.; натуральна, БНР, як і нацыянал-дэмакраты, з гэтага корпусу выпадаюць; 2) эпоха беларускай савецкай культуры; 3) сучаснасьць.

Беларуская мова і культура ў ідэалягічным корпусе фігуруюць звычайна ў форме нацыянальнага сымбалю. Фармальнае і публічнае прыязнае стаўленьне да яго ёсьць нормаю — "родная культура", "матчына мова", — але сацыяльная ізаляцыя і пэрыфэрыйнае існаваньне беларускай мовы лічыцца адным з дасягненьняў беларускай мадэлі "рэальнага" дзьвюхмоўя. Практычная палітыка ўлады ў моўнай і культурнай сфэры пабудаваная на прынцыпе захаваньня сацыяльнай ізаляцыі функцыянаваньня беларускай мовы і культуры — гэта значыць на захаваньні той культурнай кампазыцыі Беларусі, якая склалася ў БССР і была парушаная хваляй нацыянальнага ўздыму пачатку 1990-х.

Афіцыйна ўлада ніколі не адмаўляла ў каштоўнасьці і значнасьці беларускай мове. Гэта падкрэсьлівалася на ўзроўні як афіцыйных заяваў і публічных выступаў, так і шэрагу нарматыўных актаў. Тым ня менш, у адпаведнасьці з савецкай традыцыяй, легітымна беларуская мова мела падтрымку толькі ў вузкай сацыяльнай сфэры, куды ўваходзяць літаратура, мастацтва, часткова — гуманітарныя навукі (гісторыя Беларусі, філялёгія і г. д.), часткова — сфэра адукацыі. У іншых сфэрах улады схільны падтрымліваць дамінантны статус расейскай мовы, перш за ўсё прызнаньнем яе права на манаполію ў сыстэме гарадзкой адукацыі, ВНУ, бізнэсу і г. д. Праграмаў, што стымулявалі б выкарыстаньне нацыянальнай мовы, якія былі прынятыя практычна ўва ўсіх краінах рэгіёну, у тым ліку і ў Расеі ў адносінах да мовы расейскай, у Беларусі не існуе.

Што тычыцца публічнай сфэры, то ўлада не стымулюе прадстаўніцтва ў ёй беларускай мовы. Расейская мова даўно стала адзінай моваю ўлады. У апошнія гады нават Першы нацыянальны тэлеканал быў практычна цалкам пераведзены на расейскую мову, чаго не было нават у часы БССР (пераход быў патлумачаны, перш за ўсё, маркетынгавымі прычынамі), тое ж тычыцца і астатніх сродкаў масавай інфармацыі. Як паказвае аналіз прамоваў прэзыдэнта і шэрагу афіцыйных асобаў, выкарыстаньне беларускіх словаў і словазлучэньняў на 90 % зьвязана з цытаваньнем апазыцыі ці перадачай кантэксту апазыцыйнасьці. Жывая беларуская мова і культура ў значнай ступені працягваюць асацыявацца з апазыцыяй і апазыцыйнасьцю, а гэта значыць — неляяльнасьцю і крыніцаю дэстабілізацыі. Але гэта тычыцца практычнага ўспрыняцьця беларускай культуры, у корпусе "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" яна трактуецца цалкам паліткарэктна.

Сутнасьць афэктыўнай часткі ідэнтычнасьці, прапанаваная ў "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" як палітычным праекце, дастаткова відавочная. Эмацыйныя перажываньні грамадзяніна Беларусі павінны быць накіраваныя, перш за ўсё, на павагу да сучасных дзяржаўных інстытутаў і, адпаведна, на адчуваньне каштоўнасьці сучаснай эканамічнай і сацыяльнай сыстэмы, палітычнага рэжыму. У ідэале гэта значыць ператварэньне сучаснага палітычнага рэжыму ў аснову для грамадзянскай і нацыянальнай ідэнтыфікацыі насельніцтва краіны. З гэтай прычыны асноўнай праблематыкай тэкстаў па "ідэалёгіі беларускай дзяржавы" ёсьць апі-

саньне і канцэптуалізацыя існай эканамічнай і палітычнай мадэлі, у той час як эмацыйнаму стаўленьню да розных інтэрпрэтацыяў беларускай (ці нейкай іншай, напрыклад расейскай) культурнай і гістарычнай спадчыны адводзіцца другасная роля.

## Асноўныя тэндэнцыі культурнай і палітычнай ідэнтыфікацыі ў беларускім грамадстве

З розных прычынаў значная колькасьць сучасных дасьледнікаў вызначаюць Беларусь як няскончаны праект нацыятварэньня, што робіцца ў адпаведнасьці з схемамі сучаснай тэорыі нацыяналізму Э. Сьміта, Э. Гелнэра, Б. Андэрсана. У значнай ступені яны маюць рацыю. Беларусы як нацыя не прайшлі ўсе стадыі нацыянальнага самасьцьвярджэньня і не валодаюць моцнай нацыянальна-культурнай ідэнтычнасьцю. Беларускія культура і мова большую частку гісторыі рэпрэсаваліся і былі пазбаўленыя, за выключэньнем кароткага пэрыяду 1990–1994 гг., уладнай легітымацыі.

Відавочна, большасьць насельніцтва Беларусі атаясамлівае сябе зь беларускай нацыяй — 81,2 % (паводле агульнанацыянальнага перапісу 1999 г.). Але для большасьці Беларусь ідэнтыфікуецца не з культурнай ці гістарычнай традыцыяй, але з тэрыторыяй, месцам пражываньня. У той жа час, абсалютная большасьць насельніцтва за 15 гадоў існаваньня дзяржавы прыняла ідэю яе незалежнасьці, што адпаведным чынам адлюстравалася ў ідэнтычнасьці. Таму пераход ад панславізму да “нацыяналізму” для ўладаў быў у значнай ступені вымушаны, прадыктаваны аб’ектыўнымі працэсамі разьвіцьця беларускага грамадзтва і эвалюцыі яго сьвядомасьці. Існаваньне незалежнай беларускай дзяржавы спрычынілася да складаньня новай самасьвядомасьці, якая прыняла беларускую дзяржаўнасьць, але захавала індыфэрэнтнае стаўленьне да нацыянальнай культурнай традыцыі.

Натуральнае разьвіцьцё грамадзкай сьвядомасьці стала адной з прычынаў няўдачы панрусісцкага (фактычна — заходнерасейскага) праекту нацыянальнай ідэнтычнасьці, які меў афіцыйны статус у 1995–2000 гг. Нягледзячы на значныя ідэалягічныя, інфармацыйныя і арганізацыйныя захады ў другой палове 1990-х гг., розныя варыянты расейскай ды агульнарускай ідэнтычнасьці практычна ня мелі ўплыву на грамадзкую сьвядомасьць, за выключэньнем вузкіх колаў расейскаарыентаванай інтэлігенцыі[4]. Электаральная падтрымка ідэі беларуска-расейскай інтэграцыі ў 1990-х гг. мела пераважна практычную сутнасьць, якая была моцна зьвязаная з надзеямі на эканамічныя прэфэрэнцыі і прыхільным стаўленьнем да савецкай спадчыны.

Радыкальны пералом ідэалягічнай арыентацыі рэжыму і яго практычна поўны адыход ад панрусісцкай і панславісцкай рыторыкі ня выклікаў ніякай прыкметнай рэакцыі насельніцтва, а новы “нацыяналізм” быў успрыняты ляяльна, хоць і з пэўнай іроніяй у гарадзкім асяродзьдзі. Ідэалягічны “паварот” уладаў пасьля 2001 г. быў ня толькі — а магчыма, ня столькі — адкідваньнем ужо зусім не актуальных з палітычнага пункту гледжаньня панславісцкіх і “рэстаўрацыйных” ідэяў, але прывядзеньнем ідэалягічнай сыстэмы ў адпаведнасьць зь існай культурнай сытуацыяй. Гэтыя працэсы можна лічыць “аб’ектыўнымі” як для насельніцтва, якое пасьля пэўнага пэрыяду нявызначанасьці прыняло ідэі дзяржаўнай незалежнасьці, так і

[4] Паказальны і адначасова радыкальны прыклад: Кріштаповіч Л. Е. Белоруссия и Русская цивилизация. Русь и Беларусь. — Мн., 1999.

для ўлады, для якой ідэалягічны "пералом" быў выкліканы меркаваньнямі палітычнай мэтазгоднасьці. Нават сама расейская праблематыка практычна зьнікла з палітычнай сцэны, саступіўшы месца праблематыцы "ўнутранай".

У адпаведнасьці зь перапісам 1999 г. 85,6 % беларусаў назвалі сваёй роднай мовай беларускую, 41,3 % зь іх карыстаюцца беларускай моваю ў побытавых зносінах — гэта 33,6 % ад агульнага насельніцтва. (Дакладнасьць дадзеных перапісу часта крытыкавалася, у прыватнасьці, з сацыялягічных пазыцыяў. Але, па-першае, дакладнасьць сацыялягічных апытаньняў непараўнальна меншая, чым нацыянальнага перапісу. Па-другое, такая крытыка вельмі часта ператвараецца ў лінгвістычную спрэчку пра тое, ці аднесьці тую ці іншую гаворку да дрэннай беларускай ці сапсаванай расейскай. Так ці інакш, тое, што значная колькасьць людзей адказала на пытаньне анкеты такім чынам, сьведчыць на карысьць іх культурнай ідэнтычнасьці.) Але большасьць беларусаў карыстаецца расейскай моваю, выбар якой, аднак, зьвязаны не з адданасьцю расейскай культурнай традыцыі, але практычнай мэтазгоднасьцю, якая суправаджаецца фэномэнам нацыянальнай і культурнай індыфэрэнтнасьці. Большасьць беларусаў мае практычнае, а не ідэалягічнае стаўленьне да нацыянальнай мовы, як і да ўсяго, што зьвязанае з "сыстэмаю нацыянальных каштоўнасьцяў".

Гэта тлумачыць тое, чаму фармаваньне новай ідэнтычнасьці ня выклікала прынцыповых зьменаў у адносінах да беларускай культуры і мовы. Іх становішча застаецца ізаляваным з сацыяльнага і палітычнага пункту гледжаньня, палітыка ўладаў у гэтай сфэры накіраваная на захаваньне і замацаваньне status quo.

Тым ня менш, беларуская мова застаецца важным этнічным (нацыянальным) сымбалем для беларусаў. Дарма што дастаткова вялікая частка насельніцтва не гаворыць на беларускай мове, яна прызнаецца роднаю, прызнаецца важным сродкам нацыянальнай і культурнай ідэнтыфікацыі. Акрамя гэтага, беларуская мова захоўвае сваё важнае месца ў сукупнасьці фэномэнаў, якія вызначаюць у грамадзкай сьвядомасьці фэномэн "беларускасьці" і "нацыянальнай культуры". Хоць у значнай ступені гэты вобраз набывае ня столькі нацыянальны, колькі этнаграфічны характар.

Нягледзячы на ўстойлівыя неспрыяльныя ўмовы для разьвіцьця і пашырэньня беларускай мовы, яна паказвае адносна стабільныя тэмпы ўзнаўленьня колькасьці сваіх носьбітаў. Яна таксама адносна ўстойліва ўзнаўляе сябе ў інтэлектуальнай сфэры, перш за ўсё ў гуманітарных навуках.

Такім чынам, за апошнія гады ў Беларусі завяршылася фармаваньне новай грамадзкай самасьвядомасьці. Большасьць насельніцтва прыняла ідэю дзяржаўнай незалежнасьці, а праблемы яе сьцьвярджэньня адышлі ў палітычных дыскусіях на другі плян. Прыняцьце незалежнасьці, аднак, ня выклікала пашырэньня сацыяльных практыкаў беларускай мовы і культуры.

За апошнія гады адбыўся значны паварот у ідэалёгіі ўлады. Розныя вэрсіі панрусізму і панславізму, якія фактычна мелі афіцыйны статус у другой палове 1990-х гг., з прычынаў натуральнай эвалюцыі беларускай дзяржавы і меркаваньняў палітычнай мэтазгоднасьці былі замененыя на новы ідэалягічны корпус — "ідэалёгію беларускай дзяржавы". Галоўнай уласьцівасьцю новай ідэалёгіі стала актуалізацыя ідэі беларускай дзяржаўнасьці, а таксама спробы апісаньня і канцэптуалізацыя спэцыфічных рысаў эканамічнай мадэлі і сучаснага палітычнага рэжыму, у тым ліку і для фармаваньня ляяльнай да ўлады самасьвядомасьці большасьці насельніцтва краіны.

# СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ЎЛАДАЎ У 2003—2004 ГГ.

## Хто і якім чынам рабіў гэта[1]

Часавыя межы падрыхтоўкі ўладаў да правядзеньня выбараў былі вызначаныя датай 14 ліпеня 2004 г., калі быў падпісаны ўказ прэзыдэнта аб прызначэньні выбараў у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу трэцяга скліканьня. Гэтая дата была фармальнай рысай падзелу паміж падрыхтоўкай да выбараў і выбарчай кампаніяй. Прызначэньне прэзыдэнтам даты рэфэрэндуму паўтара месяца пазьней (7 верасьня) храналягічна падзяліла палітычную кампанію на дзьве стадыі: да 7 верасьня, калі рэфэрэндуму чакалі і ўлады, і апазыцыя, але пры гэтым апазыцыя рыхтавалася да выбараў, а ўлады ня вельмі хавалі сваёй падрыхтоўкі да рэфэрэндуму; і пасьля 7 верасьня, калі абвяшчэньне рэфэрэндуму прынцыпова зьмяніла ход кампаніі, павысіўшы ўзровень палітычных ставак, але ня надта павялічыўшы палітычнага напалу ў грамадзтве, як таго чакалі лідэры апазыцыі. Для дэмакратычных сілаў абвяшчэньне рэфэрэндуму якасна зьмяніла ход перадвыбарнай кампаніі, улады ж найхутчэй загадзя сплянавалі сумяшчэньне выбарча-рэфэрэндумнай кампаніі, пра што сьведчылі неаднаразовыя ўцечкі інфармацыі. Таму мы будзем разглядаць падрыхтоўку ўладаў да парлямэнцкіх выбараў напярэдадні іх абвяшчэньня ў сувязі з падрыхтоўкай да рэфэрэндуму (у гэтым выпадку падрыхтоўчы пэрыяд працягваецца да 7 верасьня). Зьместоўным ядром палітычных працэсаў 2004 г. было падаўжэньне палітычнага жыцьця дзейнага прэзыдэнта, а парлямэнцкія выбары ня толькі адышлі ў цень гэтай галоўнай палітычнай кампаніі, але сталіся адным зь яе дапаможных элемэнтаў.

Што да іншага часавага абмежаваньня — пачатку падрыхтоўкі да рэфэрэндуму, — то тут вызначальны час — адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г., калі прэзыдэнт і ягоная Адміністрацыя пабачылі на даляглядзе канец сваёй улады. Памкненьне да неабмежаванай улады прыйшло ў супярэчнасьць з артыкулам 81 Канстытуцыі і выклікала дзеяньні ўладнай сыстэмы для яе пераадоленьня. Яе цэнтрам ёсьць асабіста прэзыдэнт і ягонае непасрэднае атачэньне, пэрыфэрыю ўтварае ягоная Адміністрацыя, якая ў шырокім (неюрыдычным) сэнсе ўключае ў сябе акрамя самога дзяржаўнага органу — Адміністрацыі прэзыдэнта — усю гэтак званую вэртыкаль выканаўчай улады разам зь дзяржаўнай часткай эканомікі на чале з дырэктаратам дзяржаўных прадпрыемстваў, судовую сыстэму, пераважную большасьць парлямэнту і структураў мясцовага кіраваньня, а таксама ўнівэрсытэты і Нацыянальную акадэмію навук, прафсаюзы, дзяржаўныя і ляяльныя да дзяржавы грамадзкія аб’яднаньні, неапазыцыйныя палітычныя партыі. У цэнтры гэтай сыстэмы прымаюцца ўсе больш-менш значныя палітычныя рашэньні, менавіта адсюль зыходзяць імпульсы да далейшага захопу палітычных пляцдармаў і панаваньня ў палітычнай прасторы. Нягледзячы на высокую ступень яго гамагеннасьці, у ім самім існуюць розныя плыні, праекты, бачаньні будучыні існага рэжыму. Таксама і на ўладнай пэрыфэрыі (у рэгіёнах альбо ў адносна аўтаномных галіновых холдынгах і сілавых “княствах”) узровень “абмежаванага плюралізму” (а дакладней, дазво-

[1] Мы будзем разглядаць тую частку актыўнасьці кіраўнічай эліты Беларусі, якая мела месца да пэрыяду афіцыйнага абвяшчэньня выбараў і рэфэрэндуму і працавала на дасягненьне пажаданага для гэтага суб’екта выніку выбарча-рэфэрэндумнай кампаніі. Тым самым мы задаём часавыя і зьместоўныя межы для дасьледаваньня.

лены максымум неляяльнасьці — палітычнай "ерасі" альбо карупцыі — гаспадарчай "ерасі") кіраванага Адміністрацыяй цэнтру дае магчымасьць палітычным актарам рэалізоўваць уласную палітычную і эканамічную стратэгію ў той ступені, у якой яна не супярэчыць альбо не перашкаджае існаму генэральнаму пляну Адміністрацыі. Узгадненьне запытаў розных частак кіраўнічай эліты, задавальненьне альбо здушэньне палітычных і эканамічных лабісцкіх імпульсаў з розных кліентэльскіх груповак, балянсаваньне інтарэсаў рэгіянальных і гаспадарча-галіновых элітаў сталася важным кірункам падрыхтоўкі ўладнага цэнтру да выбараў і рэфэрэндуму. Хоць доступ да інфармацыі ў гэтым пытаньні абмежаваны і вымушае кіраваца толькі інтуіцыйнымі здогадамі і аналізам ускосных зьвестак, можна меркаваць, што згаданыя працэсы былі больш інтэнсіўныя, чым захады ўладаў у кірунку процістаяньня палітычнай апазыцыі альбо замежнапалітычнай актыўнасьці.

Такім чынам, суб'ект "улада" ня зводзіцца да "дзяржавы" ў разуменьні сучасных тэорыяў палітычнага таталітарызму, а выглядае нечым падобным да аўтарытарнай і пэрсаніфікаванай бюракратычнай і іерархічнай сыстэмы, якая існавала ў Эўропе часоў росквіту абсалютысцкіх манархіяў. У гэтым разуменьні фармальна выбарчы характар не зьмяняе прынцыповага падабенства сыстэмы ўлады Лукашэнкі да ўлады абсалютысцкай Францыі XVII ст. альбо Прусіі часоў Фрыдрыха II, з папраўкай на памеры краіны і наяўнасьць сучаснай тэхналягічнай базы[2]. Несупадзеньні ў юрыдычнай тэрміналёгіі ў гэтым выпадку не павінны засьціць сутнасьці існай у Беларусі сыстэмы панаваньня, заснаванай на падпарадкаванасьці публічнай сфэры волі вярхоўнага сувэрэна і ўладзе прызначаных ім асобаў. Пры гэтым усе ўзгадненьні паўнамоцтваў і падзел рэсурсу ўлады ўнутры кіраўнічай іерархіі ладзяцца нефармальна. Ня будучы часткай публічнай палітыкі, яны не афішуюцца. Пэрсанальная легітымнасьць лідэра пашыраецца на ўсе органы ягонай улады ў публічнай сфэры, якія выступаюць як адзіны суб'ект, зацікаўлены ў максымальным падаўжэньні існага ладу. У адрозьненьне ад таталітарнай сыстэмы, улады пакуль не ажыцьцяўляюць поўнага кантролю за ўсёй публічнай прасторай — дастаткова выкараненьня "апазыцыйнасьці" і дэманстрацыі магчымасьці кантролю.

Дзеяньні ўладаў, наўпрост скіраваныя на забесьпячэньне "патрэбнага" ходу і выніку выбараў і рэфэрэндуму, збольшага зводзіліся да: а) забесьпячэньня пераканаўчай большасьці на рэфэрэндуме, дастатковай ня толькі для ўнясеньня ў Канстытуцыю зьменаў, але і для пацьверджаньня пэрсаніфікаванай легітымнасьці рэжыму ўнутры краіны; б) забесьпячэньня перамогі (de facto і de jure) сьпісу кандыдатаў у дэпутаты парлямэнту, якія б задавальнялі ўладны цэнтар. Яны мелі як просты характар (напрыклад, фармаваньне і падтрымка адміністрацыйнага сьпісу кандыдатаў, ціск на палітычных апанэнтаў), так і ўскосны (прапаганда дасягненьняў існага ў краіне рэжыму і падтрымка "пазытыўнага настрою" ў грамадстве). Апошні ўзровень актыўнасьці неабходна адрозьніваць ад звычайнай рэпрэсіўнай актыўнасьці ўладаў, якая можа мець руцінны альбо надзвычайны характар, нескіраваны непасрэдна на выбарчы працэс. Напрыклад, палітычны перасьлед іншадумства, культ асобы прэзыдэнта ў Беларусі маюць пэрманэнтны характар: іх наяўнасьць ня зьвязаная з правядзеньнем палітычных кампаніяў, адно толькі што ў пэрыяды такіх кампаніяў формы гэтых дзеяньняў зьмяня-

[2] Можна выкарыстаць марксысцкі падыход і падаць усталяваньне рэжыму абсалютызму ў Беларусі як лягічны вынік разьвіцьця станавага (намэнклятурнага) панаваньня. У гэтым сэнсе цяперашняя прэзыдэнцкая Адміністрацыя ёсьць трыюмфам палітычнай эвалюцыі стану намэнклятуры і ператварэньня яе ў кіраўнічую клясу "мэнэджэраў", якія фармальна не валодаюць нацыянальнай эканомікай, але паўнапраўна распараджаюцца ёю без абмежаваньня з боку іншых актараў унутры краіны.

юцца характарам і інтэнсіўнасьцю ды набываюць больш рацыянальны характар. Умацаваньне палітычнага самаўладзьдзя ў Беларусі, наўпрост ня зьвязанае з правядзеньнем рэфэрэндуму 2004 г., становіць шырэйшую праблему і выходзіць за межы дадзенага аналізу.

Дзяржаўную палітыку падрыхтоўкі да выбараў у Беларусі нельга параўноўваць з звычайнай передвыбарнай палітыкай кіраўнічай партыі ў нейкай іншай краіне, але пакуль нельга атаясамліваць і з псэўдавыбарамі ў Савецкім Саюзе. Выяўленьне грамадзянскай волі і імпульсаў падтрымкі ад народу да ўладаў (асабліва асабіста дыктатара) падчас рэфэрэндумаў застаюцца важнай крыніцай легітымацыі і важным сродкам кансалідацыі грамадзтва і ўладаў. Усе ўсьведамляюць прадвызначанасьць юрыдычнага выніку, і ў гэтым сэнсе афіцыйныя лічбы даюць мала матэрыялу для аналізу, але палітычныя вынікі па-ранейшаму ўяўляюць інтарэс.

Значны сэгмэнт уладнага апарату не зазнаў значнага ўплыву передвыбарнай гонкі, руцінна ўмацоўваючы дыктатуру альбо вырашаючы будзённыя задачы дзяржаўнага кіраваньня. Але чым бліжэй да выбараў, тым большая частка дзяржаўнай палітыкі пераходзіла ў рэжым передвыбарнай істэрыі, а пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму (гэта значыць ужо пасярэдзіне кампаніі выбараў у парлямэнт) ужо амаль уся дзяржаўная палітыка рабілася зыходзячы зь неабходнасьці забясьпечыць патрэбныя лікі на рэфэрэндуме: калі ў канцы чэрвеня 2004 г. пытаньне падачы гарачай вады ў асобны дом альбо рамонту даху ці дарогі мела толькі камунальны характар і знаходзілася на мікраўзроўні палітыкі, а перавод супрацоўніка на кантрактную форму працы ці адмова ў задавальненьні канкрэтнай індывідуальнай скаргі лічыліся прыватнымі пытаньнямі, то ў канцы верасьня таго ж году ўсе яны маглі займець выразнае палітычнае гучаньне. Недзе на пачатку кастрычніка на ўсе скаргі, накіраваныя грамадзянамі ў дзяржаўныя органы, мусіў быць дадзены адказ, па магчымасьці дадатны ці такі, які б пакідаў у скаргадаўца ўражаньне, што дзяржава і ейны кіраўнік пра яго клапоцяцца.

Тое, што вялікая частка дзеяньняў уладаў да пачатку передвыбарнай кампаніі ня мела непасрэднага дачыненьня ані да выбараў, ані да рэфэрэндуму, не парадокс. Легітымнасьць беларускага рэжыму толькі ў малой ступені вызначаецца вынікамі выбараў. Рэфэрэндум як падзея меў большую значнасьць, аднак і перамога на ім не была галоўнай мэтаю лукашыстаў. Галоўная мэта — застацца пры амаль неабмежаванай уладзе і закансэрваваць гэтае становішча на як мага працяглы тэрмін. У гэтым сэнсе правядзеньне рэфэрэндуму было мэтадам, а правядзеньне выбараў — інсцэнаваньнем, неабходным для дасягненьня мэты.

Рэжым мог ужыць і іншы сродак падаўжэньня ўласнага існаваньня — з удзелам Лукашэнкі альбо нават і безь яго. Альтэрнатыўныя варыянты стратэгіяў Адміністрацыі абмяркоўваліся, напрыклад, журналістам Міхаілам Падаляком у выпусках газэты “Время” вясной — летам 2004 г. (некаторыя лічылі гэтыя публікацыі пасланьнямі расейскіх спэцслужбаў на адрас беларускай намэнклятуры). Гаворка ішла пра гандаль з замежнымі цэнтрамі ўплыву, змовы, перадачу ўлады пераемніку з захаваньнем гарантыяў Лукашэнку, падаўжэньне існаваньня рэжыму праз рэфэрэндум і перамогу на парлямэнцкіх выбарах альбо празь неплебісцытарныя маніпуляцыі з Канстытуцыяй, канфрантацыю з Захадам альбо нават “паход на Захад”. Няма сумневаў, што і аналітыкі Адміністрацыі ў 2002–2004 гг. разглядалі прыкладна тыя самыя варыянты.

Пасьля аналізу магчымых шляхоў падаўжэньня паўнамоцтваў Лукашэнкі імі была выпрацавана праграма дзеяньняў, скіраваная на дасягненьне гэтай “галоўнай” мэты праз правядзеньне палітычнай гульні “рэфэрэндум”, сумешчанай з парлямэнцкімі выбарамі. Праграма прадугледжвала стварэньне нарматыўна-праўнай і арганізацыйнай базы для непасрэднай працы

дзяржорганаў падчас правядзеньня выбараў, дзеяньні ў прапагандысцкім і інфармацыйным кірунку, шэраг падрыхтоўчых апэрацыяў на замежнапалітычным полі, у сацыяльнай сфэры, мінімізацыю ўзьдзеяньня на кампанію палітычнай апазыцыі, структураў грамадзянскай супольнасьці і непадкантрольных крыніцаў інфармацыі, а таксама вонкавых актараў, кансалідацыю розных груповак унутры Адміністрацыі. Гэтыя кірункі дзеяньняў працавалі на дасягненьне патрэбнага тактычнага выніку — перамогі ў кампаніі. Пабочным кірункам дзеяньняў было забесьпячэньне спрыяльнага эканамічнага фону для правядзеньня пазначаных захадаў — ён быў дасягнуты шмат у чым дзякуючы сусьветнай каньюнктуры цэнаў на нафту і попытам на беларускія тавары на асноўных рынках збыту, аднак нават і бяз гэтага ён быў бы дасягнуты. Эканамічныя захады лукашыстаў мы ня будзем разглядаць спэцыяльна, разумеючы іх другасны характар. Гаспадарчае вымярэньне ня ёсьць вырашальным фактарам ува ўмацаваньні беларускай аўтарытарнай мадэлі.

Увесь зьмест гэтых выбарча-рэфэрэндумных захадаў ня быў загадзя кадыфікаваны ў адным тэксьце — хутчэй, тут дзейнічалі законы творчага працэсу, калі аўтар сам да заканчэньня твору ня ведае, як павядуць сябе галоўныя пэрсанажы ў разьвязцы. І сама фігура аўтара — Адміністрацыя — уведзеная намі як фікцыя для таго, каб апэраваць тымі катэгорыямі, якія сапраўды выкарыстоўваліся ў грамадзкай сьвядомасьці для пазначэньня суб’ектаў палітычнага працэсу. У гэтым сэнсе “Адміністрацыя” як катэгорыя ёсьць антонімам таго, што ў палітычным дыскурсе разумеецца як “апазыцыя”.

## Нормы і структуры забесьпячэньня вынікаў выбараў

Маторам машыны для дасягненьня неабходнага для ўладаў выніку выбараў і рэфэрэндуму былі нормы і інстытуцыі, якія забясьпечылі праўныя, нарматыўныя і кадрава-арганізацыйныя падставы для перамогі. Мэтады пры гэтым былі скарыстаныя традыцыйныя: умацаваньне дысцыпліны шляхам выданьня 11 сакавіка 2004 г. дырэктывы № 1 “Аб захадах для ўмацаваньня грамадзкай бясьпекі і дысцыпліны”. Яна была прысьвечаная прадухіленьню нядбаласьці ў працы прадпрыемстваў усіх формаў уласнасьці і ўстанаўленьню павышанай адказнасьці за парушэньне нормаў заканадаўства ў галіне грамадзкай бясьпекі і парадку. Яе адметнасьцю было тое, што само яе выданьне не стасавалася зь існай у Беларусі гіерархіяй нарматыўна-праўных актаў і не прадугледжвалася заканадаўствам. У ёй прэзыдэнт прадэманстраваў сваё разуменьне прынцыпу падзелу ўладаў, даўшы распараджэньні органам мясцовага самакіраваньня, парлямэнту і іншым дзяржаўным інстытуцыям. На практыцы выкананьне дырэктывы ператварылася ў чарговую кампанію супраць п’янства і за дысцыпліну на вытворчасьці. Гэта выглядала як лягічны працяг рэпрэсіяў супраць намэнклятуры, што разгортваліся ў 2001–2003 гг.: запалохваньне, пагрозы перад тэлекамэрамі, сюсюканьні прэзыдэнта з вэртыкальнікамі без тэлекамэр, паказальныя працэсы над Марынічам, Жураўковай, Рыбаковым. У разгар і напярэдадні кампаніі перасьлед дырэктарату быў запаволены (прысуд былому кіраўніку МТЗ Міхаілу Лявонаву быў вынесены ў лютым 2004 г. “па сьлядох” мінулых кампаній). З другой паловы 2003 г. асноўная ўвага Адміністрацыі была скіраваная не на дырэктарскі корпус, які быў ужо заплямлены да таго, а на чынавенства і асабліва на сілавыя структуры, у тым ліку на КДБ. Пры гэтым Лукашэнка працягваў традыцыйны “кадравы пасьянс”, не даючы аформіцца “намэнклятурнай апазыцыі”.

Важным элемэнтам машыны перамогі быў Выбарчы кодэкс 2000 г., які давёў эфэктыўнасьць падчас кампаніяў 2000 і 2001 гг. і таму ня быў зьменены ў 2004 г. Ён ня столькі рэгуляваў выбарчы працэс, колькі ствараў магчымасьці для яго парушэньня, вызначаючы працяглы час для датэрміновага галасаваньня і не рэгулюючы праўнага статусу назіральнікаў. Яшчэ больш істотная яго хіба палягала ў неўрэгуляванасьці працэдуры фармаваньня выбарчых камісіяў. З аднаго боку, існуе норма, што выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў, акрамя Цэнтральнай, фармуюцца з прадстаўнікоў палітычных партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў, працоўных калектываў і грамадзянаў. Аднак яна не гарантуе ўдзелу ў выбарчых камісіях палітычнай альтэрнатывы. У рэчаіснасьці выбарчыя камісіі фармуюцца практычна безь яе ўдзелу: цалкам у адпаведнасьці зь літарай Выбарчага кодэксу дэмакраты не ўключаюцца ў склад камісіяў, а камісіі ўтвараюць амаль выключна прадстаўнікі Адміністрацыі (вылучэнцы органаў выканаўчай улады, дзяржаўных прадпрыемстваў, навучальных установаў і г. д.). Пакуль выбары рэальна праводзяцца ня выбарчымі камісіямі, а органамі выканаўчай улады, яны ня будуць сумленнымі.

Найбольш фальсыфікацыяў адбываецца дзякуючы норме Выбарчага кодэксу пра пяцідзённае датэрміновае галасаваньне. Ад пачатку кіраваньня Лукашэнкі колькасьць выбарнікаў, што галасуюць датэрмінова, пастаянна павялічвалася і паводле афіцыйных дадзеных, і паводле сьведчаньняў назіральнікаў. Цяпер пад адміністрацыйным ціскам у ім бяруць удзел да 30 % выбарнікаў. Замяніць бюлетэні ў непразрыстых скрынях для датэрміновага галасаваньня — справа тэхнікі. Зручна фальсыфікаваць бюлетэні і падчас падліку галасоў. Неістотна, якія бюлетэні сапраўды былі кінутыя выбарнікамі ў скрыні, старшыня і сакратар участковай камісіі, пры пасіўнасьці астатніх сяброў камісіі, могуць пазначыць у выніковым пратаколе любыя загадзя заплянаваныя лічбы. Адсутнасьць назіраньня за апрацоўкай пратаколаў з участковых камісіяў у акруговых камісіях дазваляе дадаткова карэктаваць лічбы і на гэтай стадыі: пратаколы папросту перапісваюцца нанава.

Такі стан рэчаў прымусіў апазыцыйныя сілы патрабаваць лібэралізацыі выбарчага заканадаўства. Шырокі розгалас мела ініцыятыва парлямэнцкай групы “Рэспубліка” ў палаце прадстаўнікоў 2-га скліканьня ўвесьці ў Выбарчы кодэкс шэраг дэмакратычных нормаў. Аднак пасьля працяглай працэдуры ўзгадненьняў у парлямэнцкіх камісіях большасьць зь іх нават не была ўключаная ў канчатковы законапраект. Каб дамагчыся хаця б малых зьменаў, група пагадзілася пакінуць у сваёй прапанове толькі нормы аб праве назіральнікаў весьці назіраньне за падлікам галасоў з зручнага для іх месца ды аб удзеле ў працы выбарчых камісіяў прадстаўнікоў палітычных партыяў з статусам сяброў камісіяў і правам дарадчага голасу. Але нават у такім выглядзе вынясеньне законапраекту на разгляд сэсіі замаруджвалася. Каб дамагчыся яго разгляду парлямэнтам да чарговых парлямэнцкіх выбараў, дэпутатам “Рэспублікі” давялося пайсьці на галадоўку. Пад яе ціскам гэтыя пытаньні ўсё ж былі разгледжаныя 22 чэрвеня 2004 г. і адхіленыя (“за” — 8, “супраць” — 71). Галадоўка сталася своеасаблівым сыгналам пра бессэнсоўнасьць спадзяваньняў на зьмену ўлады выбарчым шляхам.

Лібэральна настроены дэпутат палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня Ўладзімер Навасяд у часе галадоўкі “рэспубліканцаў” прапанаваў зьвярнуцца да Цэнтральнай выбарчай камісіі з дэпутацкім запытам аб тлумачэньні парадку і прынцыпаў фармаваньня выбарчых камісіяў, а таксама кантролю за захаванасьцю выбарчых скрыняў шляхам прастаўленьня на іх уласнаручнага подпісу назіральнікаў. Дэпутат цікавіўся, ці могуць назіральнікі і журналісты выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі пры назіраньні, асьвятленьні галасаваньня і падліку галасоў, а

таксама які парадак рэалізацыі права назіральніка на азнаямленьне з выніковымі пратаколамі галасаваньня і атрыманьня іх копіяў. Палата прадстаўнікоў падтрымала гэтую ініцыятыву, аднак аніякага зьмястоўнага адказу ад ведамства Ярмошынай не дачакала. Выбарчае заканадаўства задавальняла Адміністрацыю, паколькі дазваляла праводзіць выбары з загадзя падрыхтаваным вынікам, ажно да вызначэньня адсотку жанчын і былых парлямэнтароў.

Трэба канстатаваць: прынцыповыя зьмены беларускага выбарчага заканадаўства, якія б дазволілі апазыцыі легальна прыйсьці да ўлады, магчымыя толькі пад ціскам, які ў сёньняшняй сытуацыі можа быць аказаны толькі звонку. У гэтым кантэксьце можна згадаць комплекс патрабаваньняў ад БДІПЧ АБСЭ, датычных дэмакратызацыі выбарчага працэсу ў краіне. Адсутнасьць зьменаў у Выбарчым кодэксе аўтаматычна азначала невыкананьне ўладамі аднаго з чатырох патрабаваньняў БДІПЧ АБСЭ. Аднак нават у гэтых умовах улады таргаваліся з Захадам, скарыстаўшы для гэтага пляцоўку сэсіі Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ ў Эдынбургу. У ліпені 2004 г. там была падпісаная сумесная дэклярацыя рабочай групы ПА АБСЭ па Беларусі і афіцыйнай беларускай парлямэнцкай дэлегацыі (статус палаты прадстаўнікоў у гэтай структуры быў адноўлены ў 2003 г.). Ня даўшы аніякіх гарантыяў правядзеньня свабодных і дэмакратычных выбараў, Адміністрацыя, тым ня менш, праз дэпутата палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня, лідэра БРСМ Міхаіла Арду прадэманстравала намер весьці перадвыбарную барацьбу сумленна. Сам сп. Арда падпісаў дэкляраныйны дакумэнт і тым самым дамогся адкладаньня жорсткіх рэзалюцыяў у беларускай праблеме, ня ўзяўшы пры гэтым на сябе аніякіх канкрэтных забавязаньняў. Натуральна, што надалей выбарчы працэс у Беларусі аніякім чынам не перакрыжоўваўся з прынцыпамі дадзенай дэклярацыі — Адміністрацыя яе папросту не заўважыла.

Адзінай косткай, якая была кінутая дэмакратам, стала ўключэньне прадстаўнікоў палітычных партыяў з правам дарадчага голасу ў склад Цэнтральнай камісіі па выбарах. (Яно падавалася дзяржаўнымі СМІ як крок насустрач адкрытым і празрыстым выбарам, чаго рэальна можна было дасягнуць толькі масавым уключэньнем апазыцыі ў склад акруговых, участковых і тэрытарыяльных выбарчых камісіяў.) Фактычна яны ня мелі аніякіх правоў, акрамя права выступаць на пасяджэньні камісіі і выказваць сваю пазыцыю. Але і ў гэтай якасьці Міхась Пліска ад АГП, Алесь Бяляцкі ад Партыі БНФ, Алена Скрыган ад ПКБ, Уладзімер Нісьцюк ад БСДП “Народная грамада” здолелі дапамагчы шэрагу дэмакратычных кандыдатаў абараніць свае правы на папярэдніх этапах выбарчай кампаніі.

На самай справе правядзеньне выбараў і вызначэньне пераможцаў адбывалася па-за сьценамі выбарчых камісіяў, чый загадзя вядомы склад (за выняткам чыста касмэтычнага ўключэньня апазыцыянэраў) павінен быць зарукай кантраляванага і спакойнага вядзеньня выбарчага працэсу. Выкрыцьцё парушэньняў закону ў ходзе выбараў цягнула за сабой толькі маральную адказнасьць удзельнікаў выбарчых камісіяў. Таму ролю гэтых органаў ня трэба перабольшваць. Палітычную адказнасьць за правядзеньне выбараў і іх вынікі несьлі структуры выканаўчай улады, і менавіта на іх было ўскладзена іх забесьпячэньне.

З досьведу выбараў 2001 г. вядома, што вялікую ролю ў гэтай працы адыгрывае КДБ, аднак асноўная місія адводзіцца вэртыкалі выканаўчай улады. Яшчэ ў 2003 г. у рэгіёнах з удзелам кіраўнікоў выканкамаў, мясцовых Радаў дэпутатаў, мясцовых сілавых структураў ствараліся г. зв. рады абароны, хутчэй за ўсё, з прыцэлам на правядзеньне будучага рэфэрэндуму. Ужо ўлетку 2004 г. гэтыя структуры былі легалізаваныя ў выглядзе групаў для арганізацыі выбараў, створаных у выканкамах на базе арганізацыйных аддзелаў і кадраў з

згаданых радаў абароны. Яны каардынавалі правядзеньне рэфэрэндуму (выбары не былі асноўным пунктам увагі): зьбіралі і аналізавалі інфармацыю, прымалі ключавыя рашэньні, ажыцьцяўлялі іх узгадненьне з Адміністрацыяй. Пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму менавіта яны вызначылі склад тэрытарыяльных камісіяў. Ужо ў часе выбарчай кампаніі назіральнікі сутыкнуліся зь дзіўнай сытуацыяй: участковыя і акруговыя выбарчыя камісіі (безь якіх нельга правесьці галасаваньне) дэманстрацыйна падпарадкоўваліся не вышэйшым выбарчым камісіям, а выключна адпаведнаму мясцоваму выканкаму ў выглядзе згаданай групы.

Найбольш яскрава гэтая залежнасьць праявілася ў горадзе Бяроза Берасьцейскай вобласьці. Мясцовая выбарчая камісія адмовіла ў рэгістрацыі кандыдату ад Партыі БНФ Юрасю Губарэвічу. Цэнтральная камісія скасавала гэтае рашэньне і пастанавіла зарэгістраваць сп. Губарэвіча ў якасьці кандыдата. Нечакана акруговая выбарчая камісія адмовілася выконваць гэтую пастанову, а яе старшыня выказаў намер... зьвярнуцца ў Вярхоўны суд з пазовам аб скасаваньні гэтага рашэньня! І толькі пасьля нефармальных перамоваў Цэнтральнай камісіі з органамі выканаўчай улады пастанова была выкананая. Як адзначыў намесьнік старшыні АГП Сяргей Альфер, сама Цэнтральная камісія была адмежаваная ад працэсу выбараў і сталася мэханізмам легалізацыі яго вынікаў[3].

Органы выканаўчай улады ажыцьцяўлялі на месцах арганізацыю і правядзеньне выбараў з прыцягненьнем міліцыі, МНС, пракуратуры, КДБ і службы бясьпекі прэзыдэнта, праўрадавых грамадзкіх аб’яднаньняў і палітычных партыяў, кіраўніцтва дзяржаўных прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, органаў сацыяльнай абароны і іншых элемэнтаў Адміністрацыі. У нас няма зьвестак пра характар дзейнасьці і рэальны падзел працы ў гэтых структурах, таму ацэньваць іх функцыянаваньне мы можам толькі з ускосных дадзеных, атрыманых з мэдыяў і ад назіральнікаў напярэдадні і пасьля выбарчай кампаніі. Напрыклад, прызначэньне Алега Праляскоўскага на пасаду намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта напярэдадні ідэалягічнай нарады, якая адбылася 27 сакавіка 2003 г., можна разглядаць як старт кампаніі кадравага забесьпячэньня патрэбнага выніку выбараў і рэфэрэндуму.

Стварэньне рэальнай падтрымкі прэзыдэнцкім ініцыятывам было другасным, ня зьвязаным непасрэдна з выбарамі пытаньнем для мясцовых уладаў, але яно такі турбавала іх. Згодна зь неправеранай інфармацыяй, пасьля выбараў пад кантролем пракуратуры і КДБ адбываўся падлік рэальна пададзеных галасоў, а яго вынікі мелі значэньне для лёсу мясцовых вэртыкальнікаў.

## Нэўтралізацыя грамадзянскай супольнасьці

Актыўнасьць уладаў у гэтым кірунку мае стадыяльны характар. У пэрыяд падрыхтоўкі да палітычных кампаніяў улады падрываюць інстытуцыйную базу грамадзянскай супольнасьці і фармуюць праўныя ўмовы для перасьледу іншадумства. Напрыклад, у 1999 г., напярэдадні выбараў у палату прадстаўнікоў 2-га скліканьня, улады “зачысьцілі” трэці сэктар шляхам перарэгістрацыі грамадзкіх аб’яднаньняў і палітычных партыяў. На гэтай стадыі выкарыстоўваюцца судовыя і юрыдычныя працэдуры перасьледу, прымаюцца новыя дыскрымінацыйныя законы, абмяжоўваюцца магчымасьці для палітычнай і грамадзянскай дзейнасьці,

[3] Инфофокус: Ежемесячный электронный бюллетень центра документации НИСЭПИ. 2004. Октябрь.

непажаданай для ўладаў, ажыцьцяўляецца рознабаковая падтрымка раскольніцкай дзейнасьці ў асяродзьдзі палітычных партыяў і рухаў, каб перашкодзіць іх нармальнаму функцыянаваньню і пабудове партыйных кааліцыяў. На другой стадыі, якая прыпадае на пэрыяд палітычнай кампаніі, большую вагу мае нефармальны перасьлед: у структурах грамадзянскай супольнасьці праводзяцца ператрусы, канфіскуецца аргтэхніка і абсталяваньне, наклады ўлётак і газэт, арыштоўваюцца грамадзкія актывісты. У гэты пэрыяд уладам даводзіцца рэагаваць на падзеі апэратыўна, таму яны часта дзейнічаюць бяз праўнага абгрунтаваньня. Нарэшце, па заканчэньні палітычнай кампаніі ўлады помсьцяцца апазыцыі: звальняюць з працы яе актывістаў, ліквідуюць яе структуры і г. д., г. зн. выпраўляюць тое, што не было зроблена раней дзеля недагляду альбо залішняй лібэральнасьці. Пакрысе рэпрэсіўная актыўнасьць уладаў усё больш пакрываецца праўнай абалонкай і ўрэшце падыходзіць да пачатку цыклу — падрыхтоўкі да чарговай палітычнай кампаніі.

Зачыстка няўрадавага сэктару "пад рэфэрэндум" пачалася ў першай палове 2003 г., амаль адразу пасьля выбараў у мясцовыя Рады. Калі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. улады адпомсьцілі апазыцыйным структурам, заангажаваным у выбарчы працэс, шляхам іх ліквідацыі (такі лёс напаткаў грамадзкія аб'яднаньні "Задзіночаньне беларускіх студэнтаў", "Моладзевы інфармацыйны цэнтар", берасьцейскі "Цэнтар падтрымкі рэгіянальных ініцыятываў "Вежа") або замены іх кіраўніцтва з далейшым пераводам ува ўлоньне Адміністрацыі (ФПБ), то 2002 г. быў у гэтым сэнсе больш-менш спакойным. Хіба што ўлада рыхтавалася да выбараў у мясцовыя Рады (сакавік 2003 г.), правакуючы дэзінтэграцыю ў стане апазыцыйных палітычных партыяў і плянамерна выкараняючы іншадумства (згадаем прыняцьце новага закону пра веравызнаньне і падпісаньне ў 2003 г. канкардату аб асаблівых дачыненьнях паміж Адміністрацыяй і Беларускай праваслаўнай царквой Маскоўскага патрыярхату).

Умоўнай датай пачатку новай кампаніі можна назваць правядзеньне сэмінару з пытаньняў ідэалёгіі ў сакавіку 2003 г. Падчас яго прэзыдэнтам была пастаўленая задача "ўпарадкаваць" колькасьць грамадзкіх аб'яднаньняў і дадзеныя іншыя даручэньні.

Якія аб'екты ў грамадзянскай супольнасьці прыцягнулі рэпрэсіўную ўвагу ўладаў? Самі празь сябе асяродкі іншадумства ў выглядзе дэмакратычных няўрадавых аб'яднаньняў не нясуць для Адміністрацыі асаблівай небясьпекі, у іх нават ёсьць карысьць, бо іх наяўнасьць дазваляе кантраляваць іншадумцаў, абмяжоўваць іх актыўнасьць і фармаваць "плюралістычны" імідж рэжыму. Гэтыя структуры грамадзянскай супольнасьці разглядаюцца як дапушчальны элемэнт датуль, пакуль яны рэальна не ўплываюць на настроі ў грамадзтве. Аднак падчас падрыхтоўкі да выбараў і рэфэрэндуму сама магчымасьць інстытуцыялізацыі народнай незадаволенасьці рэжымам недапушчальная, таму "дэмакратычнае гета" абмяжоўваюць, а некаторыя яго сэгмэнты выціскаюць за межы праўнага поля.

Асноўны ўдар быў нанесены па моладзевых і праваабарончых аб'яднаньнях, рэгіянальных рэсурсных цэнтрах, а таксама іншых арганізацыях, якія актыўна праяўлялі сябе падчас апазыцыйных выбарчых кампаніяў (прыцягвалі грамадзян да палітычнай дзейнасьці, ажыцьцяўлялі агітацыю і контрагітацыю, назіралі за выбарамі). Дзякуючы іх ліквідацыі ўлады таксама імкнуліся перакрыць вонкавыя каналы паступленьня фінансавых сродкаў для апазыцыі.

Калі пра атрыманьне апазыцыяй сур'ёзнай фінансавай падтрымкі ад беларускага бізнэсу цяжка гаварыць пачынаючы недзе з 1999 г., то актыўней перакрываць замежныя крыніцы фінансаваньня дэмсілаў улады пачалі з сакавіка 2001 г., пасьля падпісаньня прэзыдэнтам славутага дэкрэту № 8 пра ўдасканаленьне парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай

бязвыплатнай дапамогі. Большасьць дэмакратычных структураў "трэцяга сэктару" не падпарадкаваліся яму, за што былі пакараныя канфіскацыяй абсталяваньня і іншай маёмасьці, а таксама прыцягненьнем сваіх актывістаў да адміністрацыйнай адказнасьці за парушэньне нормаў гэтага дэкрэту.

Факты нелегальнага атрыманьня грантаў па-ранейшаму мелі месца, і 28 лістапада 2003 г. быў прыняты дэкрэт прэзыдэнта № 24 "Аб атрыманьні і выкарыстаньні замежнай бязвыплатнай дапамогі". За нелегальнае фінансаваньне грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў уводзілася іх ліквідацыя, а для западозраных у гэтым замежнікаў — дэпартацыя. Сьпіс замежнікаў, якім быў забаронены ўезд у Беларусь, пастаянна папаўняўся, а іх дэпартацыі з 2003 г. сталі будзённасьцю. Былі пазбаўленыя акрэдытацыі прадстаўніцтвы амэрыканскіх агенцыяў "IREX/ProMedia", "Internews network". У 2004 г. не была працягнутая акрэдытацыя прадстаўніцтва амэрыканскай агенцыі "Каўнтэрпарт" і фонду "Эўразія". На пачатку 2004 г. супраць Беларускага Хельсынскага камітэту, Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў "Рада", ГА "Воля да разьвіцьця" (Слонім), што атрымлівалі гранты па праграме TACIC, былі выстаўленыя абвінавачаньні ўва ўхіленьні ад сплаты падаткаў. Гаспадарчыя суды прызналі абвінавачваньні незаконнымі, прычым мяркуецца, што гэтаму паспрыяў ультыматум TACIC з пагрозай спыніць фінансаваньне пераабсталяваньня беларуска-польскай мяжы на суму 16 млн эўра і шэраг іншых праектаў.

У красавіку 2003 г., на наступны месяц пасьля памянёнага ідэалягічнага сэмінару, органамі Міністэрства юстыцыі былі пададзеныя пазовы пра ліквідацыю Гарадзенскага абласнога грамадзкага аб'яднаньня "Ратуша", Агенцыі рэгіянальнага разьвіцьця "Варута", Гомельскага абласнога грамадзкага аб'яднаньня "Грамадзянскія ініцыятывы", Грамадзкага аб'яднаньня "Моладзевы хрысьціянска-сацыяльны саюз". З красавіка 2003 г. да канца году было ліквідавана 51 грамадзкае аб'яднаньне. Яшчэ 78 грамадзкіх аб'яднаньняў "на прапанову" органаў юстыцыі самаліквідаваліся. (За 8 месяцаў 2004 г. самаліквідавалася больш за 20 няўрадавых арганізацыяў.) Таксама ў 2003 г. падчас беспрэцэдэнтных праверак з боку органаў рэгістрацыі, пад якія патрапілі пару соцень НДА, было вынесена 810 папярэджаньняў. (Для параўнаньня: у 2002 г. такіх папярэджаньняў было толькі 121.) НДА сталі ліквідоўваць нават за адно парушэньне і без папярэджаньняў. Таксама паказальна, што ніводная зь ліквідаваных арганізацыяў ("Праўная дапамога насельніцтву", "Праваабарончы цэнтар "Вясна", "Жаночы адказ", "Фонд імя братоў Луцкевічаў" у 2003 г., "Беларускае аб'яднаньне маладых палітыкаў", "Цэнтар канстытуцыяналізму і параўнальна-праўных дасьледаваньняў", "Незалежнае таварыства праўных дасьледаваньняў" у 2004 г.) ня здолела адстаяць сваё права на існаваньне ў судзе.

Таксама былі ліквідаваныя і некаторыя арганізацыі-фантомы, якія актыўна ня дзейнічалі, але маглі быць скарыстаныя апазыцыяй у якасьці "запасных аэрадромаў" (напрыклад, "Асацыяцыя маладых прадпрымальнікаў" і г. д.). Юрыдычныя падставы для падачы ў суд пазоваў на ліквідацыю ня гралі тут аніякага істотнага значэньня: і Міністэрства юстыцыі, якое падавала пазоў, і суд, які яго разглядаў не на карысьць няўрадавай арганізацыі, і пракуратура, якая патурала гэтаму, былі тут ня больш чым выканаўцамі палітычных рашэньняў, прынятых у больш высокіх органах Адміністрацыі. (Кампанія ліквідацыі грамадзкіх аб'яднаньняў была распачатая з вуснага даручэньня прэзыдэнта — усе дзеяньні па надзвычайных праверках і ліквідацыі грамадзкіх аб'яднаньняў рабіліся ў выкананьне гэтага даручэньня[4].)

[4] Гл.: Пастанова № 31 калегіі Міністэрства юстыцыі ад 29 кастрычніка 2003 г. // Юстиция Беларуси. 2003. № 5.

Адначасова з правядзеньнем кампаніі ліквідацыі пачынаючы з 2003 г. Міністэрства юстыцыі стала патрабаваць ад грамадзкіх аб'яднаньняў штогадовыя справаздачы пра іх дзейнасьць, праведзеныя мерапрыемствы, колькасьць сяброў і ўскладніла рэгістрацыю новых грамадзкіх аб'яднаньняў. Яе зацьвярджае Камісія па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадзкіх аб'яднаньняў, на чале якой паставілі ідэоляга Алега Праляскоўскага. Колькасьць новых зарэгістраваных НДА падала: у 2003 г. было зарэгістравана толькі 10 арганізацыяў нацыянальнага ўзроўню і 61 мясцовага, прычым пераважная большасьць зь іх мае спартовы кірунак дзейнасьці.

Улады таксама процідзеялі аб'яднаньню НДА ў саюзы і асацыяцыі: іх колькасьць паменшылася за гэты пэрыяд з 26 да 16. Калі браць колькасьць зарэгістраваных НДА на душу насельніцтва, то іх у Беларусі на парадак меней, чым у іншых постсавецкіх краінах, ня кажучы ўжо пра эўрапейскія дзяржавы.

Працэс нэўтралізацыі дэмакратычных НДА суправаджаўся стварэньнем праўладнага "трэцяга сэктару". З аднаго боку, для выкананьня дзяржаўных задач шляхам аб'яднаньня грамадзянаў узьнікалі гэтак званыя дзяржаўныя грамадзкія аб'яднаньні. Указам прэзыдэнта № 335 ад 30 чэрвеня 2003 г. "Аб рэспубліканскіх дзяржаўна-грамадзкіх аб'яднаньнях" легалізуецца існаваньне парадаксальных "дзяржаўных недзяржаўных арганізацыяў", якія становяцца часткай Адміністрацыі. Дзяржаўнымі і паводле функцыяў, і паводле фінансаваньня застаюцца грамадзкія аб'яднаньні, што захаваліся з савецкіх часоў ці былі наноў створаныя (накшталт Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі, які абвесьціў сябе пераемнікам ленінскага камсамолу). З другога боку, замест незалежных дзейных або ліквідаваных грамадзкіх аб'яднаньняў ствараюцца іх псэўданедзяржаўныя эрзацы. Так, у 2002–2003 гг. пад апекай выканаўчай улады ўва ўсёй Беларусі для барацьбы з прадпрымальніцкім рухам пратэсту былі створаныя псэўданезалежныя грамадзкія аб'яднаньні прадпрымальнікаў. І, нарэшце, улады ажыцьцяўляюць "нацыяналізацыю" грамадзкіх аб'яднаньняў (выпадак ФПБ). Напярэдадні выбараў з такіх НДА былі ўтвораны Рэспубліканская рада кіраўнікоў палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў(з структурамі ў рэгіёнах) і парасонавае аб'яднаньне для моладзевых арганізацыяў, што прызналі сваім сюзэрэнам БРСМ. На выбарах яны выкарыстоўваліся для прапаганды шырокай грамадзкай падтрымкі прэзыдэнта на рэфэрэндуме і кандыдатаў у дэпутаты ад Адміністрацыі.

Пры гэтым пачынаючы з 1999 г. у Беларусі дзейнічала забарона на дзейнасьць незарэгістраваных грамадзкіх і рэлігійных арганізацыяў, уведзеная дэкрэтам прэзыдэнта № 2 ад 26 студзеня 1999 г. За дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі была ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасьць у выглядзе арышту альбо штрафу. Прыцягвалі да адказнасьці паводле гэтага артыкулу найбольш падчас палітычных кампаніяў: калі ў 2001 г. так каралі актывістаў "Маладога фронту" і "Зубра", то ў 2002 г. гэтая мера не выкарыстоўвалася. Падчас выбарчай кампаніі 2004 г. да адказнасьці паводле гэтага артыкулу было прыцягнута больш за 20 актывістаў "Зубра", "Маладога фронту", "Хартыі'97", Народнай кааліцыі "5+".

Чым бліжэйшы быў час абвяшчэньня рэфэрэндуму, тым большы перасьлед адчувалі на сабе ня толькі арганізацыйныя структуры грамадзянскай супольнасьці, але і яе шараговыя актывісты. Адміністрацыйныя арышты, запалохваньне і шантаж па месцы працы альбо вучобы, выклікі на допыты і "размовы" ў пракуратуры і КДБ і, як самы жорсткі сродак, крымінальны перасьлед станавіліся нормай. Арыштам Міхаіла Марыніча быў дадзены сыгнал для намэнклятурнай апазыцыі: "гэтак будзе з кожным". Напярэдадні абвяшчэньня рэфэрэндуму

лідэраў прадпрымальніцкага руху Валер’я Леванеўскага і Аляксандра Васільева зьняволілі на два гады за абразу прэзыдэнта. Так рэжым адпомсьціў прадпрымальніцкаму руху за той аўтарытэт і арганізацыйную моц, якую ён займеў у апошнія гады.

У 2003 г. у закон пра масавыя мерапрыемствы былі ўведзеныя дадатковыя абмежаваньні, якія дазволілі легалізаваць практыку неабгрунтаваных адмоваў у правядзеньні мітынгаў і пікетаў. У новай рэдакцыі закон патрабаваў папярэдняй аплаты паслуг… ахоўнікаў парадку, прыборкі тэрыторыі і працы “хуткай дапамогі” падчас мерапрыемстваў. Таксама адметна тое, што яго дзеяньне пашыралася і на сходы грамадзянаў у памяшканьнях: калі памяшканьне не прызначанае для такога роду сходаў, то на сход таксама трэба прасіць дазвол за 15 дзён і аплачваць вышэйпазначаныя паслугі. Заяўляльнікам акцыі зь меркаванай колькасьцю ўдзельнікаў больш за 1000 чалавек можа быць толькі арганізацыя, але за парушэньне парадку прадугледжваецца ліквідацыя гэтай арганізацыі. Такім чынам, напярэдадні кампаніі 2004 г. былі створаныя ўмовы, калі любая акцыя пратэсту магла быць прызнаная незаконнай.

Пасьля падпарадкаваньня ў 2001–2002 гг. ФПБ улады не спынілі наступу на незалежныя прафсаюзы і рэпрэсіяў у дачыненьні да прафсаюзных актывістаў. Ціск Міжнароднай арганізацыі працы, масавыя выступленьні працоўных і страйкі ў 2002 і 2003 гг., адчувальны, хоць і пасіўны супраціў насельніцтва прымусоваму перавядзеньню на кантрактную форму найму — усё гэта прымушала Адміністрацыю не вынішчаць да астачы незалежны прафсаюзны рух, а праводзіць прапагандысцкія захады накшталт гучнага падвышэньня заробкаў.

У 2004 г. у дачыненьні да партыяў была абраная тактыка ліквідацыі іх мясцовых аддзяленьняў у судовым парадку. У якасьці паказальнай ахвяры была абраная Беларуская партыя працы, якая была ліквідаваная. Усе астатнія палітычныя партыі, што ўвайшлі ў Народную кааліцыю “5+”, атрымалі папярэджаньне за яе незаконнае ўтварэньне. Тым самым аб’яднаная апазыцыя была пазбаўленая магчымасьці легальна выступаць у якасьці калектыўнага суб’екта, лідэры апазыцыі былі вымушаныя заявіць, што яны дзейнічаюць у складзе Народнай кааліцыі “5+” як фізычныя асобы ў фармаце грамадзянскай ініцыятывы. Надалей гаворка ішла ўжо не пра кааліцыю палітычных партыяў, а пра іх падтрымку палітычнай праграмы “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”. У параўнаньні з Народнай кааліцыяй “5+” эўрапейская кааліцыя “Свабодная Беларусь” і іншыя ініцыятывы зазналі менш рэпрэсіяў і нэгатыўнага асьвятленьня дзяржаўнымі СМІ. На наш погляд, гэта сьведчыла пра рэальную ацэнку Адміністрацыяй сваіх патэнцыйных апанэнтаў.

Ці дасягнутыя мэты гэтага маштабнага і рознаскіраванага перасьледу? Ці здабылі ўлады перамогу над грамадзянскай супольнасьцю? Часткова, зразумела, так, — пра гэта сьведчылі ход і вынікі выбараў і рэфэрэндуму. Структуры грамадзянскай супольнасьці былі амаль спрэс занятыя пытаньнямі свайго выжываньня і дасягненьня кароткатэрміновых плянаў: спробы стратэгічнага плянаваньня нежыцьцяздольныя дзеля ціску ўладаў.

## Маніпуляцыі ў інфармацыйнай прасторы і пагроза рэфэрэндуму

Напярэдадні абвяшчэньня рэфэрэндуму грамадзкая думка была збольшага на карысьць

апазыцыі (табл. 1[5]). Таму перад уладнымі паліттэхнолягамі стаяла складаная задача: па-першае, павысіць рэйтынг Лукашэнкі, па-другое, перашкодзіць апазыцыі скарыстацца нечакана высокай грамадзкай падтрымкай у пытаньні падаўжэньня тэрміну праўленьня Лукашэнкі, па-трэцяе, забясьпечыць максымальны ўзровень падтрымкі непапулярнай ідэі пра права Лукашэнкі балятавацца на пасаду прэзыдэнта бясконцую колькасьць разоў.

Уладам неабходна было забясьпечыць легітымнасьць загадзя вядомага выніку, таму пытаньні перамогі ў інфармацыйна-псыхалягічнай і ідэалягічнай сфэрах сталіся прыярытэтнымі для іх напярэдадні кампаніі.

Ужо пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. з эканамічных прычынаў або ў выніку забароны закрыліся газэты “Пагоня”, “Рабочы”, “Наша свабода”, “День”, “Беларуская маладзёжная”, “Навінкі”, “Свободные новости” і шэраг іншых. У 2003 г. пасьля прыпыненьня выданьня, забароны распаўсюду ў раздроб празь дзяржаўную сетку і праз падпіску (якая з 1 траўня 2004 г. знаходзіцца ў манаполіі дзяржавы) фактычна была выціснутая з мэдыйнага рынку ўплывовая “Белорусская деловая газета”. Асаблівую рэпрэсіўную ўвагу ўлады скіроўвалі на рэгіянальныя мясцовыя выданьні, паколькі менавіта лякальная незалежная прэса карысталася найбольшым даверам чытачоў. За 2–3 тыдні да саміх выбараў і рэфэрэндуму быў прыпынены выхад больш за 10 уплывовых рэгіянальных газэтаў. За некалькі месяцаў да выбарчай кампаніі фактычна быў абвешчаны мараторый на рэгістрацыю новых выданьняў. У выніку ў краіне ўсё большую вагу набіраў нелегальны або напаўлегальны друк, а таксама друкаваньне СМІ за мяжой.

Нягледзячы на наяўнасьць на 1 кастрычніка 2003 г. у Беларусі 1492 пэрыядычных выданьняў (у тым ліку 886 газэт), паводле ацэнак БАЖ толькі 250 з рэгулярных выданьняў можна назваць “інфармацыйнымі мэдыямі”, зь іх ліку толькі 82 прыватныя. У выніку юрыдычнага і эканамічнага ўціску на момант абвяшчэньня выбараў (паводле афіцыйных дадзеных на 1 ліпеня 2004 г.) колькасьць зарэгістраваных пэрыядычных выданьняў зьменшылася да 1324 (у тым ліку 813 газэт, 463 часопісы, 48 бюлетэняў, пэрыядычных каталёгаў і альманахаў).

Дзяржаўныя СМІ напярэдадні выбараў фактычна ператварыліся ў органы масавай прапаганды, распачаўшы сапраўдную інфармацыйна-псыхалягічную вайну супраць “гэтак званай апазыцыі” — паводле азначэньня М. Арды, “палітычна варожых нашаму грамадзтву колаў”. На ўсіх тэлеканалах быў паказаны ананімны (яго стваральнікі схаваліся пад псэўданімамі) фільм “Дарога ў нікуды”, прысьвечаны ганьбаваньню апазыцыі з ужываньнем няпраўдзівых

**Табліца 1.** Згода галасаваць на рэфэрэндуме за зьмену Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі так, каб А. Лукашэнка змог выбірацца прэзыдэнтам у трэці раз, %

| Варыянт адказу | 03'03 | 08'03 | 09'03 | 03'04 | 05'04 | 06'04 | 07'04 | 08'04 | 09'04 | 10'04 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Абавязкова “за” | 17,1 | 9,0 | 22,6 | 24,9 | 9,1 | 35,2 | 17,2 | 11,7 | 16,2 | 39,0 |
| Хутчэй “за” | | 16,4 | | | 17,2 | | 21,0 | 18,4 | 19,5 | |
| Хутчэй “супраць” | 47,0 | 24,8 | 51,8 | 47,8 | 24,8 | 50,9 | 22,7 | 17,2 | 15,3 | 32,5 |
| Абавязкова “супраць” | | 40,7 | | | 34,1 | | 31,9 | 32,6 | 29,1 | |
| Яшчэ не вырашыў | 27,5 | | 20,8 | 22,1 | | | | 15,0 | 15,7 | 20,5 |
| ЦА/НА | 8,4 | 9,2 | 4,8 | 4,9 | 14,7 | 13,9 | 7,2 | 5,1 | 4,2 | 8,0 |

[5] Паводле вынікаў сацыялягічных апытаньняў, зладжаных The Gallup Organization / Baltic Surveys і НІСЭПД у 2002–2004 гг.

і абразьлівых зьвестак. Дэманстраваліся іншыя падобныя тэлесэрыялы. У выніку за пэрыяд 02.10.2004 — 09.10.2004 толькі ў праграме "Нашы навіны" каналу ОНТ час пазытыўнай рэпрэзэнтацыі Лукашэнкі займаў 56,50 % праграмы ў параўнаньні з астатнімі палітыкамі (у пэрыяд 06.09.2004 — 16.09.2004 гэты паказьнік складаў 51,25 %). Тэме рэфэрэндуму было прысьвечана 6 хв. 20 сек. (3 % ад агульнага часу), між тым як "выбарам" — 4 хв. 10 сек. (2 % ад агульнага часу, у некалькі разоў меней, чым надвор'ю). Магілёўскае абласное тэлебачаньне (праграма "Навіны Магілёва") аддала прэзыдэнту 46 % агульнага часу, пры гэтым проста ігнаруючы апазыцыю. Дзяржаўныя электронныя і друкаваныя СМІ працягвалі выяўляць палітычную апазыцыю ў непэрсаналізаванай, адмоўнай альбо скрайне адмоўнай форме.

Спэцыяльны выпуск газэты "Советская Белоруссия", распаўсюджаны па ўсёй краіне з разьлікам адзін асобнік на кожнага выбарніка, падтрымліваў пазытыўную кампанію па рэфэрэндуме, а нэгатыў пра апазыцыю быў зьмешчаны так, каб не прыцягваць да яе залішняй увагі. Увогуле, напярэдадні рэфэрэндуму дамінавала "пазытыўная тэхналёгія", яскравым узорам якой было сацыялягічнае апытаньне ў нумары "Советской Белоруссии" за 9 верасьня 2004 г., калі рэспандэнтам было прапанавана адказаць на пытаньне "Што зроблена прэзыдэнтам для народу Беларусі за 10 гадоў?" з варыянтамі адказу: 1. Вельмі шмат карыснага; 2. Шмат карыснага; 3. Даволі шмат добрага.

Дзяржаўная прапаганда павелічэньнем часу і плошчы, прысьвечаным асабіста Лукашэнку, пераносіла акцэнт з выбараў на рэфэрэндум. Калі падчас выбарчай кампаніі 2001 г. Лукашэнку падавалі як у рознабаковага, шматграннага чалавека, здольнага выконваць розныя статусныя ролі (спартовец, начальнік, "просты мужык", прыхільнік беларускай культуры і г. д.), то ў 2004 г. ён пазыцыянаваўся аднатыпна: правадыр-галоўнакамандуючы, які бароніць Беларусь ад ворагаў, але пытаецца дазволу ў беларускага народу на гаспадараньне над ім (характэрны лёзунг кампаніі: "За Беларусь!" — такім чынам, Беларусь — гэта Лукашэнка, і наадварот). Апазыцыя разглядалася па-за пытаньнем рэфэрэндуму і выбараў і зьвязвалася з постацьцю правадыра: гэта ворагі, якія перашкаджаюць Лукашэнку ўва ўсіх ягоных пазытыўных пачынаньнях.

Асобным пунктам у прапагандзе было выяўленьне "вонкавага кола ворагаў" у выглядзе замежных урадаў, супрацоўнікаў пасольстваў і шпіёнаў, міжнародных арганізацыяў. Вялікую ролю тут грала антыамэрыканская рыторыка. Нападкі на заходні сьвет прыводзілі да зусім анэкдатычных выпадкаў: першы нацыянальны тэлеканал з замілаваньнем распавядаў пра мужных барацьбітоў за свабоду ірацкага народу, якія ў гэты час па іншым канале адсякалі галовы бяззбройным закладнікам. У дзяржаўных СМІ існавала забарона на падаваньне альтэрнатыўных пунктаў гледжаньня на рэфэрэндум. Такім чынам яны навязвалі карціну ўсеагульнай падтрымкі рэфэрэндуму грамадзкай думкай.

Выцісьненьне расейскіх мэдыяў зь беларускай мэдыйнай прасторы пад лёзунгам інфармацыйнай бясьпекі дзяржавы стала важным кірункам дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі з часу прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Да 2004 г. сфэра публіцыстычных мэдыяў за выняткам інтэрнэт-СМІ стала аўтаномнай ад расейскай інфармацыйнай прасторы. Паводле словаў расейскага амбасадара Аляксандра Блахіна, за два гады пасьля выбараў 2001 г. сетка вяшчаньня расейскіх тэлеканалаў скарацілася на 70 %, прычым менавіта за кошт выдаленьня публіцыстычных і дыскусійных праграмаў. Цягам двух гадоў былі запушчаныя некалькі нацыянальных тэлевізійных праектаў: СТБ, АНТ, "Лад", якія былі пакліканыя заступіць зьніклыя расейскія каналы. Па сутнасьці, на вялізнай тэрыторыі краіны расейскага тэлевяшчаньня не

засталося зусім, калі не лічыць забаўляльных перадачаў расейскай вытворчасьці. Тое самае адбывалася і ў радыйнай справе: 4 студзеня 2003 г. было абвешчана стратэгічнае рашэньне пра разьвіцьцё рэгіянальных сетак вяшчаньня за кошт скарачэньня часу вяшчаньня расейскіх каналаў. Дэпартацыя альбо ціск на замежных журналістаў за крытычныя рэпартажы пра дзеяньні беларускіх уладаў сталіся адным з традыцыйных мэтадаў палітыкі Адміністрацыі: напрыклад, несупадзеньне рэпартажу НТВ з афіцыйнымі зьвесткамі ў ацэнцы колькасьці ўдзельнікаў апазыцыйнай акцыі 21 ліпеня 2004 г. было ўспрынята міністрам унутраных справаў Навумавым як асабістая абраза. Напярэдадні выбараў улады выслалі з краіны Міхаіла Падаляка — журналіста газэты "Время", які зьяўляўся грамадзянінам Украіны.

Дзяржаўная палітыка імкнулася да цэнзураваньня нават непубліцыстычнай інфармацыі, пра што сьведчыла, напрыклад, увядзеньне на FM-станцыях квоты ў 50 %, потым нават 75 % беларускай музыкі і спробы прадукаваньня на дзяржаўных тэлеканалах пасьпяховых забаўляльных прадуктаў (частка зь іх пазьней была з посьпехам скарыстаная для разьдзьмуваньня рэйтынгу прэзыдэнта). Для большага кантролю за публічнай думкай Адміністрацыя ў 2002–2004 гг. пасьлядоўна абмяжоўвала студэнцкія і выкладніцкія абмены. Практыку абавязковага разьмеркаваньня студэнтаў пасьля заканчэньня ВНУ таксама можна разглядаць з гэтай пэрспэктывы. Гэтай мэце служыла распрацоўка і пашырэньне гэтак званай "дзяржаўнай ідэалёгіі". У яе межах адбывалася стварэньне "ідэалягічнай вэртыкалі" ў органах выканаўчай улады, пашырэньне практыкі палітінфармацыяў на прадпрыемствах усіх формаў уласнасьці, распрацоўка падручнікаў і дапаможнікаў па курсе "Асновы ідэалёгіі беларускай дзяржавы", увядзеньне яго ў якасьці абавязковага ўва ўсіх ВНУ.

Гэтая актыўнасьць успрымалася як свайго роду "перадрэфэрэндумная" кампанія Адміністрацыі. Выглядае, што мэты пашырэньня лукашэнкаўскай ідэалёгіі сягалі далёка за межы палітычнай кампаніі 2004 г. і былі скіраваныя на стварэньне і захаваньне ўмоваў, калі якаялюбя палітычная альтэрнатыва існаму рэжыму ў прынцыпе ня зможа разьлічваць на падтрымку грамадзтва.

Грамадзкая падтрымка ініцыятывы прэзыдэнта была забясьпечаная за кошт павышэньня ягонага рэйтынгу пры дапамозе кантраляваных СМІ, выкараненьня магчымасьцяў для атрыманьня альтэрнатыўнай інфармацыі, крытыкі апазыцыі, рэпрэсіяў супраць незалежных СМІ і контрпрапагандысцкай кампаніі дзяржаўных СМІ. Нэгатыўнаму рэйтынгу Лукашэнкі не дазволілі ператварыцца ў пазытыўны рэйтынг апазыцыі, а галасаваньне за першапачаткова непапулярнае пытаньне на рэфэрэндуме прыраўнавалі да галасаваньня на карысьць "стабільнасьці" і супраць "хаосу" (адно з азначэньняў апазыцыі ў дзяржаўных СМІ напярэдадні рэфэрэндуму — "сейбіты хаосу").

Асобным пунктам у падрыхтоўцы да рэфэрэндуму была інтрыгоўная сытуацыя зь яго абвяшчэньнем. Прэзыдэнт нібы какетлівая дзяўчына рабіў неадназначныя заявы на гэты конт (падчас памянёнага ідэалягічнага сэмінару ў 2003 г., і падчас выступаў перад студэнтамі, і падчас прэсавых канфэрэнцыяў, і ў пасланьні парлямэнту 14 красавіка 2004 г., і ў іншых публічных выступах), ухіляўся ад адказу на наўпрост зададзеныя пытаньні, гаварыў намёкамі. Адначасова зь неадназначнымі заявамі былі сыгналы пра будучы рэфэрэндум накшталт неафіцыйнага фармаваньня тэрытарыяльных камісіяў, непатрэбных падчас парлямэнцкіх выбараў, правядзеньня актыўнай агітацыйнай кампаніі, ня зьвязанай з выбарамі, уцечкі інфармацыі зь беларускіх амбасадаў за мяжой, што там "рыхтуюцца скрыні пад рэфэрэндум". Адміністрацыя рабіла зандаж грамадзкай думкі праз заявы прэзыдэнта і санкцыянаваныя

выкіды інфармацыі — і яго вынікі яе задаволілі. Грамадзтва праз чуткі і двухсэнсоўную інфармацыю прызвычаілася да таго, што рэфэрэндум будзе праведзены падчас парлямэнцкіх выбараў. Апазыцыя разьлічвала, што менавіта абвяшчэньне рэфэрэндуму аб непапулярным пытаньні зможа даць ёй моцную зброю супраць кандыдатаў ад уладаў, кабператварыць 110 парлямэнцкіх кампаніяў у 110 міні-прэзыдэнцкіх выбараў супраць Лукашэнкі.

Апазыцыі не далі зьдзейсьніць гэты сцэнар. Стаў больш жорсткім і кантроль за вылучэньнем праўладных кандыдатаў: калі раней кандыдатуры вызначаліся лякальнымі структурамі Адміністрацыі і былі ў пэўным сэнсе прадстаўнічымі фігурамі, зацьверджанымі ў цэнтры на прапановы зь месцаў, то цяпер кандыдатуры вызначаліся непасрэдна ў Менску зь мінімальным і збольшага кансультацыйным удзелам рэгіянальных груповак. Складаньне адзінага “сьпісу ўлады” з цэнтру мела выключыць пранікненьне ў парлямэнт дэпутацкай апазыцыі кшталту групы “Рэспубліка”. У гэты сьпіс трапілі людзі зь мясцовай эліты: улады імкнуліся дасягнуць ня толькі пазначанага прэзыдэнтам прадстаўніцтва асобных сацыяльных і палавых групаў, але і ў сваім разуменьні зрабіць парлямэнт бясьпечным і прадстаўнічым для ўсёй Адміністрацыі. Задача фармаваньня паслухмянага парлямэнту без апазыцыі была першаснай, другой было задавальненьне заяўленых Лукашэнкам нормаў прадстаўніцтва, і толькі ў трэцюю чаргу ўлады дбалі пра лабісцкія інтарэсы. Пры гэтым квоты для галіновых і тэрытарыяльных лобі вызначаліся таксама ў цэнтры. У гэтых умовах выбары ў раду рэспублікі сталіся для мясцовых элітаў магчымасьцю дамагчыся патрэбнага ўзроўню прадстаўніцтва сваіх інтарэсаў, то бок рада рэспублікі выканала сваю канстытуцыйную ролю забесьпячэньня тэрытарыяльнага прадстаўніцтва ў парлямэнце.

Бліжэй да саміх выбараў Адміністрацыя паспрабавала задаволіць прынцып карпаратыўнага прадстаўніцтва. У выніку 67 дэпутатаў палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня падалі заявы пра рэгістрацыю ўласных ініцыятыўных групаў, а былі зарэгістраваныя ў якасьці кандыдатаў толькі 55, у парлямэнт 3-га скліканьня прайшло яшчэ менш. Прэзыдэнт даў указаньне, колькі павінна быць у парлямэнце дэпутатаў з старога складу, — і гэтае ўказаньне было выкананае. Дырэктыва прэзыдэнта адносна прадстаўніцтва ў парлямэнце жанчын і моладзі была выкананая падчас вызначэньня сьпісу ўладных кандыдатаў. Бізнэсоўцы былі пастаўленыя перад фактам, што цяпер лабіяваць свае інтарэсы ім давядзецца па-за парлямэнтам.

На замежнапалітычным полі Адміністрацыя паставіла перад дыпляматамі задачу дабіцца прызнаньня рэфэрэндуму і выбараў (лёгіка бюракратычнай сыстэмы прадугледжвае пастаноўку і невырашальных задачаў). У рэальнасьці, аднак, беларускія дыпляматы актыўнічалі ў асноўным у кірунку супрацоўніцтва з такімі ж, як і Беларусь, краінамі-ізгоямі кшталту Іраку (да яго акупацыі), Лівіі, Кубы, Судану і Ірану, а дзяржаўны сувэрэнітэт Беларусі, пад якім разумелася неўмяшальніцтва (перш за ўсё недапушчэньне гуманітарнай інтэрвэнцыі і праваабарончай дзейнасьці звонку) замежных суб’ектаў ува ўнутраныя справы Беларусі, ператварыўся ў ідэалягему ўладаў. Адміністрацыя мела патрэбу ізалявацца ад пагрозаў непадкантрольнага вонкавага асяродзьдзя. Будучы арыентаванай на аўтаркію і ізаляцыю (імкненьне да максымальнай ізаляцыі выклікаецца бездапаможнасьцю ў сфэры замежнай палітыкі), таму што ёй чужое мастацтва кампрамісу, асноўнай замежнапалітычнай мэтай Адміністрацыя зрабіла абарону ўнутранай самаўладнай палітыкі і непрыняцьце сучаснага сусьветнага парадку. Зрабіць канфрантацыю з заходнім сьветам нарожным элемэнтам сваёй замежнапалітычнай дактрыны беларускі рэжым адкрыта пакуль ня можа (гэта раўназначна канфрантацыі з магутнай антытэрарыстычнай кааліцыяй), таму афішуецца яго шматвэктарнасьць, якая насам-

рэч ажыцьцяўляецца паводле прынцыпу "сябруем з тымі, хто ня ўмешваецца ў нашыя ўнутраныя справы". Дзеяньні міжнародных арганізацыяў і замежных дзяржаваў дзеля ізаляцыі Беларусі, якія на словах варожа ўспрымаюцца Адміністрацыяй, насамрэч граюць на яе карысьць.

Новая палітычная ініцыятыва Лукашэнкі не магла быць прызнаная на Захадзе. Злучаныя Штаты, традыцыйна крытычна настроеныя супраць узмацненьня дыктатуры ў Беларусі, распачалі ў 2002 г. працэс прыняцьця Акту аб дэмакратыі ў Беларусі. Эўрапейскія інстытуцыі на аснове спавешчаньня дэпутата Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы Хрыстаса Пургурыдэса "Зьніклыя асобы ў Беларусі" і зьвязаных зь яго вынікамі рашэньняў западозрылі асобаў зь непасрэднага атачэньня Лукашэнкі ўва ўчыненьні цяжкіх злачынстваў. І амэрыканская, і эўрапейская дыпляматыя актывізавала крытыку беларускага рэжыму за парушэньне ім правоў чалавека. У 2003 і 2004 гг. камісіяй па правах чалавека ААН былі прынятыя адмысловыя рэзалюцыі па Беларусі і прызначаны спэцыяльны дакладчык ААН у беларускім пытаньні. Дзеяньні беларускіх уладаў у адказ не насілі сыстэмнага характару і зводзіліся да абвінавачаньняў у выкарыстаньні палітыкі падвойных стандартаў дзеля "незалежнасьці" беларускай дзяржавы.

Замежнапалітычны фактар быў мінімальны пры вызначэньні складу парлямэнту і не ўплываў на падрыхтоўку парлямэнцкіх выбараў. Тое самае датычыць рэфэрэндуму: прыняўшы рашэньне падоўжыць паўнамоцтвы Лукашэнкі, вызначыўшы спосаб яго ажыцьцяўленьня, Адміністрацыя болей не зважала ані на славутую "руку Масквы", ані на ціск з Захаду. Прыняцьце напярэдадні рэфэрэндуму амэрыканскім Кангрэсам Акту аб дэмакратыі ў Беларусі дало прапагандзе толькі дадатковую падставу для антыамэрыканскай і антызаходняй гістэрыі.

(Замежнапалітычная дактрына Лукашэнкі выявілася ў выступе 22 ліпеня 2004 г. перад супрацоўнікамі МЗС "Замежная палітыка Рэспублікі Беларусі ў новым сьвеце". Відавочна, што менавіта ўяўленьні, фобіі і фрустрацыі прэзыдэнта вызначаюць замежную палітыку Беларусі. Дзеля гэтага прафэсійная беларуская дыпляматыя знаходзіцца ў глыбокім і працяглым крызысе. Выступ быў насычаны фармулёўкамі "мы не в западне", "стенания об "изолированности" нашей страны — это комплекс неполноценности малодушных", "основа внешней политики — суверенитет, энергетическая и сырьевая независимость", "наш главный партнёр — Россия, страна, меняющаяся на глазах", "Мы в Евросоюз не просимся, Европу мы сами создаем у себя"...)

Такім чынам, адкладаньне абвяшчэньня рэфэрэндуму на самы апошні тэрмін дазволіла Адміністрацыі мінімізаваць пагрозы з боку апазыцыі і вольнага сьвету. У выніку яна атрымала на рэфэрэндуме вынік, які, нягледзячы на абвінавачаньні ў фальсыфікацыях, быў успрыняты значнай часткай грамадзтва як легітымны.

***

Падрыхтоўка да правядзеньня рэфэрэндуму і выбараў ня мела прынцыпова нечаканых альбо парадаксальных рысаў. Гэтая кампанія была тыповай, базавалася на мэтадах, якія былі апрабаваныя падчас мінулых кампаніяў: экстэнсіўным нарошчваньні палітычнага ўціску ды павелічэньні маштабаў дзяржаўнага кантролю за палітычным жыцьцём і грамадзянскай супольнасьцю. Адзінае пытаньне, якое ўносіла элемэнт нечаканасьці ў гульню, — калі ж прэзыдэнт адважыцца адкрыта абвесьціць курс на ўласную палітычную бесьсьмяротнасьць? —

было вырашанае 7 верасьня 2004 г. З гэтай даты палітычная кампанія страціла элемэнт непрадказальнасьці і падзеі зноў пабеглі па ўжо накатанай каляіне “элегантнай перамогі”.

У ходзе падрыхтоўкі да выбараў Адміністрацыя дасягнула практычна ўсіх пастаўленых мэтаў. Апазыцыя і заходняя дыпляматыя здолелі супрацьпаставіць ёй стварэньне шырокай партыйнай кааліцыі і ўзмацненьне ціску, што на вынікі кампаніі паўплывала слаба. Выбарчая і плебісцытарная кампаніі не былі працэсам узаемадзеяньня трох суб’ектаў (улада, апазыцыя, народ) у электаральным полі, адбылася гульня, падчас якой адзін суб’ект — Адміністрацыя — выкарыстоўваў беларускі народ як матэрыял для павышэньня сваёй легітымацыі. У выніку кампанія за кампаніяй улада павялічвае ступень сваёй адчужанасьці ад беларускага народу — гэта адчуваецца ў дадзеных сацыялягічных апытаньняў, але не ўплывае на характар электаральных працэсаў.

Адміністрацыя дасягнула тактычнай мэты, чаго нельга сказаць пра дасягненьне яе стратэгічнай звышмэты. Яна аказалася замкнёнай сама на сабе, яе дзеяньні ў межах краіны засталіся залежнымі толькі ад самой сябе, а не ад меркаваньняў і памкненьняў беларускага народу: выбарча-прапагандысцкая машына не дэманструе тэндэнцыяў да памылак. Такая мадэль можа працаваць і падчас наступных палітычных кампаніяў — няма сумневу, што ўлады скарыстаюць прыкладна тыя ж схемы і напярэдадні выбараў прэзыдэнта ў 2006 г.: мэханізм арганізацыі выбараў наладжаны, сродкаў хапае, людзі ёсьць, палітычныя партыі і грамадзянская супольнасьць амаль не ўплываюць на пераразьмеркаваньне ўладаў, народ сядзіць пад інфармацыйна-прапагандысцкім коптурам. І ўсе пагрозы адладжанаму мэханізму “патрэбнага выніку” выбараў застаюцца, хоць і ляжаць па-за межамі электаральных працэсаў, па-за межамі сыстэмы, пазначанай у гэтым артыкуле.

Варта не забывацца на аксіёму геапалітыкі: геаграфія — гэта лёс. І палітычная геаграфія — гэта таксама лёс. Іншае пытаньне, колькі часу спатрэбіцца, каб лёс зрабіў сваю справу і колькі гэта будзе каштаваць беларускаму грамадзтву.

## ПАЛІТЫЧНАЕ РАЗЬВІЦЬЦЁ АПАЗЫЦЫІ Ў 2003—2004 ГГ.

Падчас выбараў у мясцовыя Рады дэмакратычныя сілы не стваралі шчыльнай палітычнай кааліцыі. Сытуацыя выбараў 2003 г. выявіла адносна нізкую канкурэнцыю паміж дэмакратычнымі кандыдатамі ў асобных выбарчых акругах, што ў значнай ступені было зьвязана зь нізкай палітычнай актыўнасьцю. Большасьць асобаў, здольных весьці актыўную выбарчую кампанію, не канкуравалі, а супярэчнасьці і нязначныя канфлікты вырашаліся лякальнымі перамовамі. Самастойны ўдзел кожнай партыі меў сваю лёгіку, бо дазваляў выявіць палітычны патэнцыял, які захавалі палітычныя суб’екты пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Практычна ўсе палітычныя суб’екты сутыкнуліся з праблемаю матываваньня сваіх актывістаў і патэнцыйных кандыдатаў на ўдзел у мясцовых выбарах. Гэта было зьвязана з малою вераю ў магчымасьць сумленных выбараў, боязьзю звальненьня і іншых формаў ціску з боку выканаўчай улады, нязначнай колькасьцю рэсурсаў і пэўнай стагнацыяй пасьля кампаніі 2001 г. (натуральны адток палітычных актывістаў, дыстанцыяваньне ад палітыкі структураў НДА і г. д.). Акрамя таго, правядзеньне агульнанацыянальнай агітацыйнай кампаніі з арганізацыйных прычынаў было немагчымае. З гэтых і шэрагу іншых пазыцыяў фармавань-

не шырокай палітычнай кааліцыі мела мала сэнсу. Большасьць партыяў перадалі ініцыятыву стварэньня перадвыбарных блёкаў на рэгіянальны ўзровень, у некалькіх рэгіёнах такія кааліцыі былі створаныя.

Вынікі кампаніі былі супярэчлівыя. З аднаго боку, апазыцыйныя групы правялі вельмі мала кандыдатаў у мясцовыя Рады. З другога, кампанія мела дадатны псыхалягічны эфэкт, бо на лякальным узроўні была адчута магчымасьць палітычнай перамогі. Выбарчая кампанія выявіла наяўнасьць пэўнага арганізацыйнага патэнцыялу палітычных партыяў і стала важным досьведам у разуменьні мэханізмаў магчымага мадэляваньня вынікаў галасаваньня[1].

Вынікі выбараў яшчэ раз пацьвердзілі існую недзе з 1999—2000 гг. структуру апазыцыйнага палітычнага поля Беларусі, цэнтар якой складаюць чатыры адносна буйныя партыі: БНФ, АГП, БСДП (НГ) і ПКБ, якія валодаюць прыкладна аднолькавым палітычным патэнцыялам.

Вынікі выбараў 2003 г. сталі асноваю для ініцыяваньня працэсу палітычных перамоваў і адкрылі новыя магчымасьці для стварэньня кааліцыяў і ўдзелу ў парлямэнцкіх выбарах 2004 г. Было адчуваньне, што сур'ёзнай канкурэнцыі паміж партыямі на парлямэнцкіх выбарах не пазьбегнуць. Акрамя таго, аб'яднаньне было неабходнай перадумоваю для акумуляваньня рэсурсаў, неабходных для кампаніі. Для большасьці палітычных партыяў ніякіх асаблівых перашкодаў у стварэньні кааліцыі не існавала. Палітычныя амбіцыі згубілі сваю вастрыню ўва ўмовах сямёх гадоў пазасыстэмнай дзейнасьці, а ідэалягічнае супрацьстаяньне страціла сваю актуальнасьць і энэргетыку. Асобным фактарам аб'яднаньня выступала міжнародная супольнасьць, якая дэкляравала аб'яднаньне ўсіх дэмакратычных сілаў як важную перадумову для аказаньня вонкавай падтрымкі.

Як паказаў досьвед палітычнага разьвіцьця апазыцыі 2003—2004 гг., утварэньне кааліцыяў адбывалася не на ідэалягічнай аснове, але на прынцыпах "арганізацыйнай спалучальнасьці". Галоўнымі сталі фактары ўзаемнага даверу, магчымасьці выконваць пагадненьні і іншыя абавязкі. Ня меншае значэньне мела дасягненьне адносна жорсткай структураванасьці кааліцыі і адпаведнасьць удзелу ў кіраваньні розных суб'ектаў іх рэальнаму палітычнаму патэнцыялу.

Трэба зазначыць, што ў пытаньні магчымага рэфэрэндуму і зьменаў у Канстытуцыю, якія б дазволілі А. Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін, кансэнсус у колах апазыцыі быў дасягнуты яшчэ раней. Натуральна, што адсутнасьць дакладнай інфармацыі пра намеры ўладаў у адносінах да рэфэрэндуму рабіла немагчымым плянаваньне супольных дзеяньняў (першыя выказваньні кіраўніка беларускай дзяржавы пра магчымасьць "трэцяга тэрміну" адносяцца да 2002 г. Практычна ўвесь 2003 г. хадзілі настойлівыя чуткі пра непазьбежнасьць рэфэрэндуму і яго хуткае правядзеньне, у якасьці магчымага часу называліся лета — восень 2003 г., пазьней даты пераносіліся. Нягледзячы на высокі кансэнсус апазыцыйных сілаў што да рэфэрэндуму, ува ўмовах няпэўнасьці плянаваньне і каардынацыя дзеяньняў былі сумнеўныя).

---

[1] Маніпуляваньне вынікамі падчас выбараў 2003 г. для палітычных партыяў было відавочным, тым ня менш, быў досьвед і адносна "сумленных" выбараў. У першай палове 2003 г. практычна ўсе меркавалі, што маніпуляцыі будуць часткаю кампаніі 2004 г., але здавалася, што ім можна будзе супрацьдзейнічаць і яны ня будуць мець татальнага характару, асабліва ўлічваючы магчымы кантроль з боку міжнароднай супольнасьці. Так ці інакш, праблема мадэляваньня вынікаў выбарчымі камісіямі яшчэ не ўяўлялася такой непераадольнай.

## Народная кааліцыя “5+”

Адразу пасьля выбараў у мясцовыя Рады паміж палітычнымі партыямі пачаліся кансультацыі пра магчымасьць стварэньня шырокай апазыцыйнай кааліцыі. Папярэднія перамовы выявілі магчымае кола чальцоў: БНФ, АГП, БСДГ, ПКБ, БПП. Шэраг кансультацыяў з БСДП (НГ) у першай палове 2003 г. ня меў выніку. Трэба адзначыць, што калі раней, у 1997—2001 гг., вялікую ролю ў кансалідацыі апазыцыі адыгрывала КНГ АБСЭ ў Менску, то пасьля 2001 г. галоўную функцыю ў гэтай сфэры стаў выконваць офіс “IRI” ў Вільні. Аб’яднаньне палітычнага патэнцыялу трох адносна буйных партыяў: БНФ, АГП, ПКБ, а таксама БСДГ, БПП і шэрагу іншых палітычных і каляпалітычных арганізацыяў у адзін палітычны блёк выглядала як стварэньне манапаліста на апазыцыйным палітычным полі Беларусі, хоць гэтая манаполія і не была поўнаю без БСДП (НГ). Магчымая кааліцыя сапраўды мела б вельмі шырокі характар і аб’яўдноўвала вельмі розныя палітычныя сілы, ад камуністаў да кансэрватараў і нацыянал-дэмакратаў. Такое аб’яднаньне адразу паставіла пытаньне пра ідэалягічную сумяшчальнасьць удзельнікаў кааліцыі і магчымасьць іх шчырае супольнае працы. Асобнай праблемаю была нэгатыўная рэакцыя функцыянэраў сярэдняга і ніжняга зьвяна ў БНФ і ПКБ. Але практыка паказала, што непрыманьне мела абмежаваны характар. Нават калі прыняць пад увагу “антыкамуністычную” пазыцыю “Маладога фронту” і “Зубра” на перамовах з “5+” (восень 2003 г.), то яна мела выключна рытарычны характар, за якім хавалася ўласная палітычная стратэгія на перамовах.

Практычнае стварэньне кааліцыі пачалося з кансультацыяў і папярэдніх дамоўленасьцяў у красавіку — траўні 2003 г., публічная прэзэнтацыя пачалася з шэрагу інфармацыйных акцыяў. У траўні 2003 г. палітычныя партыі (суб’екты кааліцыі) прапанавалі супольны праект зьменаў у выбарчае заканадаўства Беларусі. (У межах акцыі быў падрыхтаваны адпаведны зварот палітычных партыяў супольна з шэрагам грамадзкіх арганізацыяў у Канстытуцыйны суд Рэспублікі Беларусі. Суд, праўда, не прыняў зварот да разгляду.) Праект прадугледжваў зьмену працэдуры фармаваньня выбарчых камісіяў (уключэньне ў іх сяброў апазыцыйных палітычных партыяў), статусу наглядальнікаў (наданьне ім дадатковых правоў, у прыватнасьці — права на атрыманьне інфармацыі) і скасаваньне датэрміновага галасаваньня. Зьмены павінны былі зрабіць працэдуру волевыяўленьня празрыстай і прадухіліць магчымыя фальсыфікацыі. У чэрвені 2003 г. на ініцыятыву чатырох партыяў (БНФ, БСДГ, АГП, ПКБ) утварылася Асамблея дэпутатаў мясцовых Радаў — каардынацыйны орган для дэмакратычных дэпутатаў, якія атрымалі мандаты на выбарах 2003 г. Функцыянальная карыснасьць ад Асамблеі адразу была пад пытаньнем, але асноўнаю яе мэтаю быў працяг інфармацыйнай кампаніі кааліцыі праз дэманстрацыі сваіх дасягненьняў, арганізацыйнага патэнцыялу і палітычнага капіталу.

З чэрвеня 2003 г. сустрэчы кіраўнікоў пяці партыяў (БНФ, АГП, ПКБ, БСДГ, БПП) сталі пастаяннымі, фактычна сфармаваўся супольны цэнтар прыняцьця палітычных рашэньняў. У гэтым жа месяцы была дасягнутая дамоўленасьць пра стварэньне супольнага сьпісу кандыдатаў на парлямэнцкія выбары 2004 г. Гэта значыць, кааліцыя, якая атрымала назву “5+” (пяць палітычных партыяў, якія склалі аснову кааліцыі, плюс грамадзкія аб’яднаньні, вядомыя асобы, прафэсійныя саюзы і г. д., якія далучыліся пазьней. “Плюс” сымбалізаваў незакрытасьць працэсу пашырэньня і магчымых перамоваў. Прычым у якасьці абазначэньня было

рэкамэндавана ўжываць “пяць” лацінскімі лічбамі — “V+”, як на лягатыпе, што павінна было перагукацца з лац. victoria — перамога), набыла фармальныя рысы. Намаганьні пашырыць кааліцыю працягваліся, і ў ліпені было падпісана пагадненьне з дэпутацкай групаю “Рэспубліка” пра каардынацыю сумесных дзеяньняў, аднак трывалага супрацоўніцтва ня выйшла. У пачатку 2004 г. далучылася яшчэ адна партыя, Экалягічная. Канчатковая назва кааліцыі — Народная кааліцыя “5+”. Улетку і восеньню 2003 г. яна правяла перамовы наконт далучэньня з моладзевымі арганізацыямі, прафэсійнымі саюзамі, незалежнымі СМІ, НДА, што часткова пашырыла яе арганізацыйную і палітычную аснову.

Найбольш важным палітычным пытаньнем для кааліцыі было стварэньне адзінага ўзгодненага сьпісу кандыдатаў у дэпутаты. Праца над сьпісам ішла ў межах прынятай формулы 110 + 110, гэта значыць па два кандыдаты ад кааліцыі на кожную акругу. Адзін — умоўна “левай” арыентацыі, другі — умоўна “правай”. Прапанаваная схема павінна была забясьпечыць ахоп максымальнай колькасьці электарату, а таксама засьцерагчы ад магчымай нерэгістрацыі аднаго з дэмакратычных кандыдатаў. Акрамя сьпісу, разглядаліся розныя мэханізмы адбору найбольш пэрспэктыўных кандыдатаў (з жніўня 2003 г.), зьняцьця кандыдатураў дэмакратычных “канкурэнтаў” непасрэдна перад днём галасаваньня ці падчас агітацыі і г. д. На першых этапах фармаваньня сьпісу канкурэнцыя паміж партыямі і патэнцыйнымі кандыдатамі, асабліва ў Менску і іншых буйных гарадох, была вельмі высокаю, таму знайсьці кампраміс было не заўсёды проста. У 2003 г. канкурэнцыя за некаторыя акругі мела месца ня толькі паміж партыямі, але і ўнутры саміх партыяў, што прыводзіла да асабістых канфліктаў. Было адчуваньне, што гэта “важна” і “ганарова”.

У адзіны сьпіс уключаліся ня толькі прадстаўнікі палітычных партыяў, але і непартыйныя кандыдаты, якія сымпатызавалі “5+”, проста вядомыя асобы. Усё гэта павінна было забясьпечыць высокую канкурэнтаздольнасьць кааліцыі. Першы варыянт сьпісу кандыдатаў быў вельмі шырокі, што адлюстроўвала пачатковы аптымізм, але з часам актыўнасьць патэнцыйных кандыдатаў з розных прычынаў спала. Афіцыйная прэзэнтацыя кандыдатаў кааліцыі “5+” адбылася ў студзені 2004 г. Сьпіс утрымліваў каля 150 кандыдатаў і быў дастаткова фармальным і незавершаным, значная колькасьць асобаў не была заяўленая, што тлумачылася іх нежаданьнем раней часу прыцягваць увагу ўладаў (асабліва гэта тычылася сяброў ПКБ).

Трэба адзначыць, што ў кадыфікаванай і нязьменнай форме адзіны сьпіс ніколі не існаваў, некаторыя асобы траплялі туды статусна, але ніколі сур’ёзна не зьбіраліся балятавацца, іншыя адмаўляліся ад удзелу пасьля ціску з боку ўладаў, уразуменьня арганізацыйных складанасьцяў. Сьпіс пастаянна карэктаваўся, адначасова ў партыях ішоў працэс пошуку новых кандыдатаў. Людзі пагаджаліся, адмаўляліся, потым ізноў пагаджаліся, мянялі выбарчыя акругі, і гэты працэс не перапыняўся да самой выбарчай кампаніі.

Палітычная сытуацыя канца 2003 — пачатку 2004 гг. сур’ёзна зьмяніла псыхалягічнае стаўленьне да выбараў. Недзе ўвесну 2004 г. стала зразумела, што маштабнай выбарчай кампаніі, хутчэй за ўсё, ня выйдзе. Летам 2004 г. гэта было відавочна для большасьці ангажаваных у палітыку, нягледзячы на агучаныя нізкія рэйтынгі А. Лукашэнкі і вялікія магчымасьці для электаральнай працы. Акрамя гэтага, стала ясна, што справядлівых выбараў ня будзе і ўлада ня дасьць перамагчы, а пры неабходнасьці будзе дзейнічаць жорстка. Да таго ж, не было акумулявана дастатковай колькасьці арганізацыйных і матэрыяльных рэсурсаў для шырокай агітацыйнай кампаніі, а ўзровень вонкавай падтрымкі быў значна ніжэйшы, чым

чакалася. На пачатку для большасьці патэнцыйных кандыдатаў удзел у выбарах падаваўся гонарам і прыкметаю палітычнай значнасьці і адкрываў, як здавалася, вялікія пэрспэктывы. Бліжэй да выбараў зьявілася адчуваньне, што "нічога ня будзе", дэманстрацыя сілы з боку ўлады і дастаткова няпэўная падтрымка з боку міжнароднай супольнасьці ўзмацнялі такія настроі. Вылучэньне ў кандыдаты паступова стала непрыемным абавязкам, які быў зьвязаны зь ціскам з боку дзяржаўных органаў і адсутнасьцю рэальных пэрспэктываў. Атрыманьне мандата ўсё больш выглядала нерэальным, а актыўная дзейнасьць — бессэнсоўнай. Такія настроі былі характэрныя для ўсіх кааліцыяў і "незалежных" кандыдатаў, хоць і нельга сказаць, што яны былі татальныя.

## Кампанія "110+1"

Зь сярэдзіны 2003 г. у межах кааліцыі "5+" абмяркоўвалася неабходнасьць правядзеньня так званай кампаніі "110+1" (ці "111-ы"). Гэта значыць, што акрамя акруговых кампаніяў павінна была зьдзяйсьняцца і агульнанацыянальная кампанія кааліцыі, якая б вялася пад супольным брэндам, лёзунгамі і інфармацыйнай актыўнасьцю. Кампанія "100+1" павінна была ўключаць у сябе мабілізацыю, мэтавую працу з сацыяльнымі групамі (моладзь, жанчыны, сталыя людзі і г. д.) і работу ў "слабых" акругах. Але ў выніку, акрамя нязначнай колькасьці брэндавых і інфармацыйных захадаў, шырокая агульнанацыянальная кампанія не праводзілася. Сярод галоўных прычынаў звычайна называліся абмежаванасьць арганізацыйных і матэрыяльных рэсурсаў, а таксама супрацьдзеяньне з боку ўлады, у прыватнасьці ціск з боку Міністэрства юстыцыі на суб'ектаў кааліцыі і СМІ за распаўсюд інфармацыі ад імя "незарэгістраванай ува ўстаноўленым парадку кааліцыі "5+", а пазьней — і ліквідацыя БПП Вярхоўным судом.

## Іншыя палітычныя блёкі

У апазыцыйным палітычным полі заставалася кола суб'ектаў, якія з розных прычынаў не былі ўцягнуты ў працэс пабудовы кааліцыі "5+" ды імкнуліся да арганізацыі самастойных палітычных праектаў.

*Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя "Народная грамада".* БСДП (НГ), якую ўзначальваў М. Статкевіч, пасьля канстытуцыйнага крызысу 1996 г. і роспуску Вярхоўнай Рады XIII скліканьня стала часткаю дэмакратычнай апазыцыі, якая мела ў той час крыху іншую канфігурацыю. Яна ўключала БНФ, АГП, БСДП (НГ), БСДГ і іншыя арганізацыі, якія былі аб'яднаныя ў Каардынацыйную раду дэмакратычных сілаў, і выключала некаторыя іншыя арганізацыі, якія цяпер адносяцца да дэмакратычных, у прыватнасьці ПКБ. Канфрантацыя паміж БСДП (НГ) і большасьцю апазыцыі пачалася ў 2000 г. "Народная грамада" не падтрымала ідэю байкоту парлямэнцкіх выбараў, якую актыўна прасоўвала большая частка апазыцыйных партыяў, разглядаючы яго як вельмі важную кампанію. Пазыцыя М. Статкевіча ўспрымалася як разбуральная. БСДП (НГ) ізалявалася ад большасьці апазыцыйнага поля і пачала дыстанцыявацца ад шчыльнага ўзаемадзеяньня зь іншымі апазыцыйнымі партыямі. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. БСДП (НГ) адкрыта выступіла з абвінавачаньнямі ў адрас лідэраў шэрагу партыяў, а таксама "Хартыі'97" у нямэтавым выкарыстаньні грошай і карупц-

цыі, што паспрыяла павышэньню ўзроўню палітычнага недаверу. Калі пасьля выбараў 2003 г. пачаліся кансультацыі пра стварэньне шырокай кааліцыі, БСДП (НГ) намагалася захаваць сваю аўтаномную і крытычную пазыцыю, таму больш шчыльная інтэграцыя партыі ў "5 +" была практычна немагчымаю. БСДП (НГ) шукала альтэрнатыўных палітычных праектаў.

Трэба сказаць, што з палітычнага пункту гледжаньня БСДП (НГ) выйграла. Пры далучэньні да кааліцыі "5 +" БСДП (НГ) не заняла б там дамінантных пазыцыяў. Яе арганізацыйны патэнцыял прыкладна раўназначны БНФ, АГП, ПКБ (паасобку), але ня большы. У Эўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь", якая была створана як альтэрнатыва "5+", БСДП (НГ) стала адзінай структурай, якая мела палітычную вагу. Дзякуючы добрай інфармацыйнай кампаніі, Эўрапейская кааліцыя атрымала статус другой кааліцыі, ці ня роўнай "5+", дзе палітычнае значэньне БСДП (НГ) мела вырашальнае значэньне.

*"Хартыя'97"*. Палітычны капітал — гэта ня толькі арганізацыйны патэнцыял (структуры, людзі і г. д.), але і інфармацыйныя, тэхналягічныя ды, часам, проста крэатыўныя магчымасьці. Менавіта гэта вызначае месца невялікай групы "Хартыя'97" у палітычнай структуры беларускай апазыцыі. "Хартыя'97" ствралася ў 1997 г. як свайго роду каардынацыйны цэнтар апазыцыі для арганізацыі дзейнасьці пасьля канстытуцыйнага крызысу 1996 г. Дзейнасьць была ня толькі ў каардынацыі, але і ў прасоўваньні розных палітычных праектаў, акцыяў і г. д. Аднак імкненьне дамінаваць у партыйным полі ў 2000—2001 гг. пастугова прывяло да несупадзеньня інтарэсаў партыйнага мэнэджмэнту і кіраўніцтва "Хартыі'97", асабліва недзе пасьля кампаніі байкоту. "Хартыя'97" ніколі не была разгалінаванаю структураю, але дзякуючы добрым стасункам з замежжам, кантактам з апазыцыйнымі функцыянэрамі, здольнасьці весьці інфармацыйныя кампаніі і фармаваць палітычныя брэнды стала часткаю палітычнага поля. Да 1999—2000 гг. "Хартыя'97" спрабавала актыўна ўплываць на разьвіцьцё палітычных партыяў, а пазьней перайшла да самастойных палітычных праектаў. У 2001 г. падчас прэзыдэнцкай кампаніі "Хартыя'97" стварыла і прасоўвала, часам дастаткова пасьпяхова, моладзевую арганізацыю "Зубр", кантроль над якой захоўваецца і дагэтуль.

*"Зубр"* у палітычных кансультацыях 2003—2004 гг. фармальна захоўваў нэўтралітэт, пазыцыянуючы сябе як рух, які не зьбіраецца непасрэдна ўдзельнічаць у выбарах — вылучаць кандыдатаў ці весьці агітацыю за пэўную палітычную сілу. Сваю ролю "Зубр" абазначыў пераважна ў мабілізацыйнай і "нэгатыўнай" кампаніі. Практычна, падчас выбараў 2004 г. "Зубр" быў у сыстэме распаўсюджваньня палітычнай інфармацыі.

Непасрэднага ўдзелу ў мясцовых выбарах "Хартыя'97" ня брала, але ўжо ўвесну 2003 г. пачала падрыхтоўку да выбараў 2004 г. Удзел у кааліцыі палітычных партыяў, якія пазьней склалі "5+", быў праблематычны, калі ўвогуле магчымы, прынамсі на ўзроўні прыняцьця найбольш важных палітычных рашэньняў, таму "Хартыя'97" пачала працаваць над уласнымі палітычнымі праектамі. Першым такім праектам стала кааліцыя "Свабодная Беларусь", якая была створаная ў траўні 2003 г.

"Свабодная Беларусь" фармальна была першай абвешчанай выбарчай кааліцыяй. Яна складалася зь сьпісу вядомых асобаў і "рэгіянальных лідэраў" розных кірункаў. Асобы зь сьпісу павінны былі ў пэрспэктыве стаць кандыдатамі ў дэпутаты, мэнэджэрамі, супрацоўнікамі штабоў і г. д. Блёк ня быў прывязаны да палітычных структураў і ня меў афармленай структуры. "Свабодная Беларусь" ставіла за мэту фармаваньне сьпісу з 110 кандыдатаў у дэпутаты. Акрамя гэтага, блёк ставіў задачу арганізацыі акцыяў грамадзянскага непадпарадкаваньня ў выпадку фальсыфікацыяў выбараў. Мэты блёку, прынамсі дэклярацыйна, выходзілі за

межы выбарчай кампаніі 2004 г. і ўключалі распрацоўку стратэгіі разьвіцьця Беларусі ў пасьлявыбарны пэрыяд.

*“Рэспубліка”.* Парлямэнцкая група “Рэспубліка”, якая аб’ядноўвала ў розныя часы ад 3 да 10 дэпутатаў палаты прадстаўнікоў, не была масавай і ня мела арганізацыйных структураў. Тым ня менш, яна валодала выключным сымбалічным капіталам і мела адносна шырокую папулярнасьць. Група рэпрэзэнтавала свайго роду “сыстэмную” апазыцыю, якая нечакана зьявілася ў, здавалася б, цалкам ляяльным для прэзыдэнта парлямэнце. Фактычным лідэрам парлямэнцкай групы “Рэспубліка” быў Валеры Фралоў, адстаўны вайсковец, выбраны дэпутатам у Гарадзенскай вобласьці. Шэраг палітычных групаў і аналітыкаў нават называлі Фралова сярод патэнцыйных кандыдатаў у прэзыдэнты ад апазыцыі ў 2006 г. Пэўную актыўнасьць у дзейнасьці “Рэспублікі” праяўлялі таксама Ўладзімер Парфяновіч і Сяргей Скрабец. Як было адзначана, дэпутацкая група мела папулярнасьць і ўнікальную для апазыцыйнага поля легітымнасьць, таму розныя палітычныя групы імкнуліся да супрацоўніцтва зь ёй. Амбіцыі “Рэспублікі” і, перш за ўсё, яе лідэра, былі вялікія. Сярод іншага, яны ўключалі імкненьне заняць “цэнтральную” пазыцыю ў апазыцыйным полі, а таксама быць свайго роду каардынатарам працэсу аб’яднаньня дэмакратычных сілаў: у пачатку 2004 г. В. Фралоў неаднаразова прапаноўваў свае паслугі пасярэдніка для перамоваў дзеля аб’яднаньня. “Рэспубліка” ўклала пагадненьне з “5+”, але зьдзяйсьняла сталыя кантакты з “Эўрапейскай кааліцыяй “Свабодная Беларусь”, зь якой склаліся трывалыя стасункі, і нарэшце В. Фралоў стаў сябром БСДП (НГ).

Найбольш гучнай акцыяй “Рэспублікі” ў 2004 г. стала галадоўка ў чэрвені трох найбольш актыўных сяброў групы: В. Фралова, С. Скрабца, У. Парфяновіча, да якой далучыўся шэраг актывістаў АГП і БНФ. Мэтай галадоўкі былі зьмены ў Выбарчым кодэксе, якія павінны былі павысіць празрыстасьць і дэмакратычнасьць парлямэнцкіх выбараў, вызваленьне зьняволенага Міхаіла Марыніча і недапушчэньне пераабраньня Лукашэнкі на трэці тэрмін. Галадоўка трывала 18 дзён, але была праігнаравана афіцыйнымі структурамі, у тым ліку і парлямэнтам. Акцыя суправаджалася шырокай інфармацыйнай кампаніяй у краіне (толькі ў незалежнай прэсе) і за яе межамі, а таксама акцыямі падтрымкі і мела шырокі грамадзкі рэзананс.

*“Маладая Беларусь”.* У першай палове 2003 г. адбыўся канчатковы разрыў паміж партыяй БНФ і яе моладзевай арганізацыяй “Малады фронт”. Канфлікт быў зьвязаны, перш за ўсё, з пагаршэньнем стасункаў лідэра “Маладога фронту” П. Севярынца з кіраўніцтвам партыі. Восеньню 2003 г. адбыліся кансультацыі “Маладога фронту” і іншых моладзевых палітычных арганізацыяў (“Зубр”, “Маладыя дэмакраты” (АГП), ЛКСМБ) з “5+” пра магчымасьць супрацоўніцтва ў арганізацыі і мабілізацыі кампаніі перад выбарамі 2004 г. Але перамовы былі безвыніковымі, і “МФ” стварыў уласны блёк маладых кандыдатаў “Маладая Беларусь”. (Фактычна размова ніколі ня йшла пра кааліцыю ў поўным разуменьні гэтага слова, але толькі пра складаньне сьпісу кандыдатаў, якія мелі тыя альбо іншыя дачыненьні да “Маладога фронту”.) Першапачаткова дэклюравалася, што ў склад “Маладой Беларусі” ўключана 80 чалавек, пазьней лічба была паменшана да 30, да фармаваньня ініцыятыўных групаў прыступілі толькі 17, непасрэдна ў выбарах удзельнічалі яшчэ меней, прычым некаторыя сябры “Маладой Беларусі” адначасова ўваходзілі і ў больш значныя кааліцыі: “5+” і “Эўрапейскую кааліцыю”. Патэнцыялу адной арганізацыі “МФ” было недастаткова для фармаваньня самастойнай і тым больш значнай палітычнай сілы.

*Эўрапейская кааліцыя “Свабодная Беларусь”.* Палітычныя суб’екты, якія намагаліся рабіць

самастойныя палітычныя праекты, ня мелі той колькасьці структураў і рэсурсаў, каб быць самадастатковымі. Гэта прымушала да пошуку розных формаў аб'яднаньня для павышэньня ўласнай значнасьці. Гэтага патрабавала ня толькі стварэньне шырокай кааліцыі "5+", але і замежнапалітычная каньюнктура.

Кансультацыі для стварэньня новай кааліцыі пачаліся ў сярэдзіне лета 2003 г. Увосень яны праходзілі ў фармаце "рабочай групы". Фармальна колькасьць суб'ектаў перамоваў была дастаткова шырокая, але фактычна перамовы ішлі паміж БСДП (НГ) і "Хартыяй'97". У выніку 1 лістапада 2003 г. было аб'яўлена пра стварэньне Эўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь".

Кааліцыя відавочна мела палітычныя мэты, але яе прэзэнтацыя была стылізавана ў значна шырэйшым фармаце, як, дарэчы, большасьць ініцыятываў "Хартыі'97" (дастаткова згадаць, што на першых этапах сваёй прэзэнтацыі ў пачатку 2001 г. "Зубр", кіраваны "Хартыяй'97", падаваў сябе як "экалягічны рух"). Кааліцыя дэкляравала сярод сваіх мэтаў ня толькі фармаваньне дэмакратычнай дзяржавы і ўдзел у выбарах. У якасьці місіі аб'яднаньня называліся сацыяльныя і культурныя трансфармацыі, у прыватнасьці пашырэньне ідэяў эўрапейскай інтэграцыі, а эўрапейская ідэя была выбраная ў якасьці "плятформы" новага ўтварэньня. (Першай і галоўнай прычынаю ўзьнікненьня гэтага ўтварэньня трэба лічыць канфліктныя стасункі з БНФ, хоць у якасьці прычыны называлася прысутнасьць у кааліцыі "5+" камуністаў і "адсутнасьць стратэгіі".) У практычнай дзейнасьці непалітычныя і каляпалітычныя мэты кааліцыі ў хуткім часе адышлі на другі плян. Збольшага інфармацыйная кампанія "Эўрапейскай кааліцыі" была больш эфэктыўнай, чым "5+".

У склад новай кааліцыі ўвайшлі БСДП (НГ), Беларуская партыя жанчын "Надзея", "Хартыя'97" (дакладней, блёк "Свабодная Беларусь"), а таксама шэраг грамадзкіх арганізацыяў і прадпрымальніцкіх структураў (усяго каля 20). Стварэньне новай кааліцыі было падтрыманае рухам "Зубр" і "Маладым фронтам". Нягледзячы на спробы пашырыць кааліцыю ці ўвогуле правесьці поўнае аб'яднаньне ўсіх дэмакратычных сілаў, фармат Эўрапейскай кааліцыі не зьмяніўся да выбараў 2004 г. Непасрэдна перад выбарамі, 20 жніўня, паміж Эўрапейскай кааліцыяй "Свабодная Беларусь", "Рэспублікай" (В. Фралоў на гэты час ужо быў сябром БСДП (НГ)) і "Маладой Беларусьсю" было ўкладзена пагадненьне пра супрацоўніцтва. Поўная інтэграцыя "Маладой Беларусі" ў Эўрапейскую кааліцыю адбылася ўжо пасьля выбараў і рэфэрэндуму.

Увесну 2004 г. Эўрапейская кааліцыя "Свабодная Беларусь" была аслабленая ў выніку арышту Валера Леванеўскага і Міхаіла Марыніча (праўда, ёсьць зьвесткі, што апошні схіляўся да ўдзелу ў "5+"). В. Леванеўскі, сябра каардынацыйнага камітэту Эўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь", старшыня Агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў, непасрэдна ўдзельнічаў у арганізацыі страйку прадпрымальнікаў і мітынгу 1 траўня 2004 г. у Горадні. У сярэдзіне траўня супраць В. Леванеўскага была ўзбуджана крымінальная справа паводле ч. 2 арт. 368 КК Беларусі "Зьнявага прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі" ("зьнявага", у адпаведнасьці з пазыцыяй праваахоўных органаў, утрымлівалася ўва ўлётцы, якую В. Леванеўскі распаўсюджваў перад мітынгам 1 траўня; разам з В. Леванеўскім паводле гэтага артыкулу быў асуджаны намесьнік старшыні Агульнанацыянальнага страйкавага камітэту прадпрымальнікаў Аляксандар Васільеў). Яго ўтрымлівалі ў СІЗА, а пазьней асудзілі на два гады пазбаўленьня волі. У красавіку 2004 г. быў зьмешчаны ў сьледчы ізалятар блізкі да Эўрапейскай кааліцыі грамадзкі і палітычны дзяяч М. Марыніч. Ён быў абвінавачаны паводле ч.

2 арт. 295 (“Незаконныя дзеяньні ў адносінах да агняпстрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў”) і ч. 4 арт. 210 (“Крадзеж праз злоўжываньне службовым становішчам”). У лістападзе 2004 г. справа была накіраваная ў суд для разгляду, а ў студзені 2005 г. Марыніча асудзілі на 5 гадоў пазбаўленьня волі (пасьля тэрмін быў зьменшаны да 3,6 году).

## Праблема поўнага аб'яднаньня

Магчымасьць і нават неабходнасьць стварэньня адзінай дэмакратычнай кааліцыі апазыцыйных сілаў абмяркоўвалася цягам 2003—2004 гг. Працэс суправаджаўся ня толькі кансультацыямі, але і ўзаемнымі абвінавачаньнямі розных палітычных сілаў у нежаданьні аб’ядноўвацца ды дэструктыўнай палітычнай пазыцыі. Пра аб’яднаньне многа казалі ня толькі беларускія, але эўрапейскія і амэрыканскія палітыкі (у прыватнасьці, на гэтым настойваў “IRI”; пра магчымыя схемы аб’яднаньня — “5+1”, пяць партыяў кааліцыі “5+” і БСДП (НГ), — казала Ута Цапф і г. д.), але звычайна без дастатковага разуменьня сытуацыі. Шэраг палітычных групаў намагаліся заняць пазыцыю пасярэднікаў і каардынатараў аб’яднаньня (“Рэспубліка”), але такія захады посьпеху ня мелі. Часткова прычыны складанасьцяў пры аб’яднаньні былі пазначаны пры разглядзе працэсу фармаваньня дзьвюх асноўных перадвыбарных кааліцыяў, але варта зазначыць наступнае. Умовы для поўнага аб’яднаньня апазыцыі ў 2003 — пачатку 2004 гг. ня склаліся, супраць гэтага было многа арганізацыйных і псыхалягічных фактараў, і мэханічнае аб’яднаньне, безь неабходнага ўзроўню ўзаемнага даверу, было б безвыніковым і бессэнсоўным. Для зьняцьця многіх праблемаў было неабходна рэальнае супрацьстаяньне з уладаю і фармаваньне новай палітычнай сытуацыі, што магло адбыцца толькі ў працэсе выбараў. У той жа час дасягнуты кансэнсус паміж палітычнымі сіламі апазыцыі наконт такіх праблемаў, як прадухіленьне крытыкі і ўзаемнай нэгатыўнай агітацыі, сумеснае назіраньне і магчымае супрацоўніцтва ў другім туры, ня выклікаў пярэчаньняў у апазыцыйным полі.

Такім чынам, у выніку палітычных перамоваў 2003—2004 гг. склаліся дзьве розныя палітычным патэнцыялам кааліцыі дэмакратычных сілаў: Народная кааліцыя “5+” і Эўрапейская кааліцыя “Свабодная Беларусь”, а таксама дзьве адносна аўтаномныя невялікія групы: “Маладая Беларусь” і “Рэспубліка”. Існаваньне некалькіх блёкаў не прывяло да канфрантацыі. Прагнозы пра тое, што барацьба зь існай уладаю скончыцца супрацьстаяньнем партыяў, не апраўдаліся. Пераважная большасьць палітычных суб’ектаў разумела адзінства палітычных інтарэсаў (прынамсі тактычных), супрацоўніцтва ў большасьці выпадкаў было канструктыўнае, а адчуваньне фатальнасьці і нэгатыўныя эмоцыі былі скіраваныя на непранікальны маналіт дзяржаўнага апарату.

Варта адзначыць, што практычна ўсе палітычныя групы выявілі сваё жаданьне і імкненьне да актыўнага ўдзелу ў выбарах, выключэньне склала Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ, якая стварылася ў выніку расколу БНФ у 1999 г. На зьезьдзе КХП БНФ у сьнежні 2003 г. партыя пацьвердзіла сваю вернасьць вядомаму палітычнаму дзеячу 1990-х гг. З. Пазьняку, які знаходзіцца ў эміграцыі (абавязкі старшыні ў яго адсутнасьць выконвае Юры Беленькі). Як і ў адносінах да мясцовых выбараў 2003 г., КХП БНФ прыняла рашэньне байкатаваць выбары і магчымы рэфэрэндум, а таксама зьвярнулася з адпаведнай заяваю да шырокай грамадзкасьці.

## Эвалюцыя партыйнай сыстэмы

У 2003—2004 гг. партыйная сыстэма Беларусі не зазнала прынцыповых палітычных зьменаў. Як і раней, большасьць дзеяздольных і ўсе буйныя і дэмакратычныя партыі знаходзіліся ў апазыцыі. У сваёй аснове апазыцыя носіць несыстэмны характар і практычна ня ўключаная ў дзяржаўныя органы. Большасьць партыяў захавала сваю цэласнасьць, ідэалягічныя схільнасьці, а таксама пераймальнасьць мэнэджмэнту. Найбольш значныя зьмяненьні закранулі сацыял-дэмакратычнае поле, а таксама партыю БНФ, дзе фактычна адбылася зьмена генэрацыяў у кіраўніцтве.

*БСДГ.* Як вядома, пасьля расколу ў БСДП (НГ) апазыцыйная фракцыя Аляксея Караля, частка партыі "Надзея" і БСДГ (С. Шушкевіч) у 2002 г. зрабілі спробу стварыць новую партыю. Але ў верасьні 2002 г. Міністэрства юстыцыі адмовіла ў рэгістрацыі Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі. У сувязі з гэтым адбылася інкарпарацыя розных сацыял-дэмакратычных групаў у БСДГ, што некалькі зьмяніла яе нутраную структуру. На працягу 2003 г. мела месца абмеркаваньне будучыні партыі і яе ідэалягічнага пазыцыянаваньня, частка сталых сяброў БСДГ настойвала на "правым" і "адраджэнскім" вызначэньні, у той час як кіраўніцтва і новыя групы былі схільныя да прасоўваньня клясычных сацыял-дэмакратычных ідэяў. Зьезд БСДГ некалькі разоў пераносіўся і ў рэшце рэшт адбыўся ў студзені 2004 г., завяршыўшы інтэграцыю новых партыйных структураў у БСДГ, дэклараваная колькасьць якіх склала 600 чалавек. Старшынём быў пераабраны С. Шушкевіч, намесьнікамі старшыні сталі вядомыя палітыкі А. Кароль, М. Грыб.

*БСДП(НГ).* На фоне зьменаў у БСДГ назіралася адхіленьне палітычнага балянсу ў самай буйной сацыял-дэмакратычнай партыі — БСДП (НГ). У 2004 г. да БСДП (НГ) фактычна далучылася парлямэнцкая група "Рэспубліка", а яе лідэр В. Фралоў стаў сябром партыі. Шчыльныя кантакты паміж В. Фраловым і шэрагам партыйных структураў склаліся яшчэ ў 2003 г. Перш за ўсё гэта тычылася берасьцейскай абласной арганізацыі, якая стала галоўнай рухальнай сілай унутрыпартыйнай апазыцыі ў БСДП (НГ) у 2004 г. Старшыня партыі М. Статкевіч само зьяўленьне "апазыцыі" зьвязваў з інтрыгаю сяброў парлямэнцкай групы "Рэспубліка". На VIII зьезьдзе партыі, які адбыўся 25 чэрвеня 2004 г., імкненьне да зьмены мэнэджмэнту партыі прыняло адкрытую форму. М. Статкевіч захаваў пасаду старшыні, атрымаўшы толькі 95 галасоў супраць 81 у яго галоўнага канкурэнта Анатоля Ляўковіча (г. Берасьце), які стаў намесьнікам старшыні партыі. У выніку галасаваньня адбылося пэўнае абнаўленьне кіраўнічага складу партыі. Зьмены, з аднаго боку, узмацнілі апазыцыю, але і дазволілі захаваць М. Статкевічу кантроль над партыяй: палітычная барацьба не прывяла да сур'ёзнага расколу і канфрантацыі. Некаторае кадравае абнаўленьне адбывалася і пазьней (у прыватнасьці, пры абраньні сяброў выканаўчага бюро на пасяджэньні Цэнтральнага камітэту ў жніўні 2004 г.).

У сувязі з новай кансалідацыяй палітычных сілаў, у межах левых партыяў працягваліся дыскусіі пра магчымасьць стварэньня адзінай сацыял-дэмакратычнай партыі, ідэя якой падтрымлівалася рознымі групамі сацыял-дэмакратаў, але была цяжкай для рэалізацыі.

*БНФ.* Значныя зьмены адбыліся ў кіраўніцтве партыі БНФ. На VII зьезьдзе партыі, які адбыўся ў сьнежні 2003 г., старшынства як вынік кансэнсусу большасьці ўнутрыпартыйных групаў захаваў В. Вячорка. Намесьнікамі старшыні сталі В. Івашкевіч, Ю. Хадыка, а такса-

ма прадстаўнікі "маладой генэрацыі" функцыянэраў А. Міхалевіч і А. Янукевіч. Вынікі зьезду зьмянілі расклад у партыі, а таксама фактычныя ўплывы на прыняцьце рашэньняў, што дазваляе казаць пра зьмену генэрацыі ў найстарэйшай палітычный арганізацыі Беларусі.

Парадаксальным чынам гэта адбылося паралельна з радыкальным разрывам партыі БНФ з моладзевай арганізацыяй "Малады фронт". Крызыс стасункаў прывёў да поўнага разрыву і, у рэшце рэшт, выключэньня лідэра "Маладога фронту" П. Севярынца з партыі БНФ. Гэтая акалічнасьць стала галоўнаю прычынаю таго, чаму "Малады фронт" ня змог наладзіць супрацоўніцтва з кааліцыяй "5+" і заснаваў невялікі блёк "Маладая Беларусь", які моцна імкнуўся да Эўрапейскай кааліцыі.

*АГП.* Значных палітычных зьменаў у АГП у 2003—2004 гг. не назіралася, збольшага партыя дэманструе ўстойлівасьць сваёй гіерархіі з 2000 г. VII зьезд у траўні 2004 г. фактычна ня ўнёс ніякіх зьменаў ува ўнутрыпартыйны расклад, як і ня выявіў больш-менш трывалых апазыцыйных ці "абнаўленчых" групаў. Захавалі свае пасады тры з чатырох намесьнікаў старшыні: С. Альфер, Я. Раманчук, А. Дабравольскі (нягледзячы на праблему з падтрымкаю зьездам, у прыватнасьці, С. Альфера). Чацьвёртай намесьніцай старшыні стала Л. Гразнова, але гэта быў больш сымбалічны жэст, чым палітычнае прызначэньне. Адзінай шумнай падзеяй у асяродзьдзі АГП стала акцыя былога палітвязьня Андрэя Клімава. А. Клімаў прыпыніў сяброўства ў партыі і абвясьціў пачатак уласнай прэзыдэнцкай кампаніі, што суправаджалася актыўнай крытыкаю кіраўніцтва АГП. Клімаў выступіў на зьезьдзе ў траўні 2004 г., яго пазыцыя была прынятая да ўвагі, але не падтрыманая ўдзельнікамі зьезду.

Пэўныя зьмены тычыліся моладзевай арганізацыі АГП. Як вядома, у лістападзе 2002 г. адбылося аб'яднаньне "Моладзі АГП" і Моладзевага хрысьціянска-сацыяльнага саюзу ў новую арганізацыю — МХСС "Маладыя дэмакраты", якая стала афіцыйнай моладзевай арганізацыяй партыі. У чэрвені 2003 г. МХСС "МД" быў ліквідаваны пастановай Вярхоўнага суду і надалей вымушаны працягваць дзейнасьць як незарэгістраваная арганізацыя.

*ПКБ.* ПКБ, як і АГП, захавала арганізацыйную стабільнасьць і пераемнасьць уласных палітычных органаў. На чарговым VII (XXXVIII) зьезьдзе ПКБ, які адбыўся 25 траўня 2003 г., кіраўнічыя органы партыі засталіся практычна бязь зьменаў. Старшынём быў абраны С. Калякін (які кіруе партыяй з 1994 г.). Трэба адзначыць і стабільнасьць складу сакратароў ЦК ПКБ. Два зь пяці займаюць свае пасады з 1993 г. (Іван Акінчыц, Анатоль Лашкевіч) і два — з 1997 г. (Алена Скрыган, Аляксандар Пахлопка). Тым ня менш, ПКБ выявіла значныя зьмены ў ідэалёгіі і стратэгіі палітычных дзеяньняў. З 2003 г. (асабліва пасьля зьезду ў траўні 2003 г. і прыняцьця новай праграмы) назіраецца тэндэнцыя да мадэрнізацыі партыі і яе ідэйных пазыцыяў. У праграмных дакумэнтах, а таксама публічных заявах больш увагі акцэнтуецца на неабходнасьці дэмакратычнага разьвіцьця краіны, каштоўнасьцях свабоды і г. д., у той час як традыцыйная савецкая рыторыка адыходзіць на другі плян, хоць і не зьнікае поўнасьцю. Відавочным зьяўляецца ўплыў эўрапейскага левага дыскурсу на палітычную мову ПКБ. Больш за тое, пасьля мясцовых выбараў 2003 г. партыя ўзяла курс на актыўнае палітычнае супрацоўніцтва з шырокім спэктрам дэмакратычных сілаў Беларусі, што зрабіла магчымым стварэньне шырокай палітычнай кааліцыі "5+".

Палітычная эвалюцыя апазыцыі 2003—2004 гг. была моцна зьвязаная з падрыхтоўкай да выбарчай кампаніі 2004 г. У выніку шматлікіх кансультацыяў і ўзгадненьняў былі створаны дзьве палітычныя кааліцыі: Народная кааліцыя "5+" (заснаваная 5 палітычнымі партыямі) і

Эўрапейская кааліцыя "Свабодная Беларусь" (заснаваная БСДП (НГ) і "Хартыяй'97"), якія сталі цэнтрамі прыцягненьня для астатніх дэмакратычных сілаў. Менавіта гэтыя дзьве кааліцыі сталі асноўнымі ўдзельнікамі палітычнай кампаніі 2004 г. і шмат у чым вызначалі яе разьвіцьцё.

## ПАЛІТЫЧНАЯ КАМПАНІЯ ЎЛАДАЎ 2004 Г.

Выбары ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу трэцяга скліканьня былі абвешчаныя ўказам прэзыдэнта ад 14 ліпеня і прызначаныя на 17 кастрычніка 2004 г. (гл. указ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 14 ліпеня 2004 г. "Аб прызначэньні выбараў у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі трэцяга скліканьня"). З выданьнем 7 верасьня яшчэ аднаго ўказу палітычная кампанія пачала мець падвойны характар. Указ абвесьціў правядзеньне адначасова з выбарамі рэспубліканскага рэфэрэндуму (гл. указ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 7 верасьня 2004 г. № 431 "Аб прызначэньні рэспубліканскага рэфэрэндуму").

Абедзьве кампаніі былі моцна зьвязаныя. Само празь сябе іх сумяшчэньне пэўны час лічылася ўладаю непажаданым, бо давала магчымасьць зьвесьці ўсе парлямэнцкія выбары да чорна-белага "за"-"супраць", але позьняе абвяшчэньне рэфэрэндуму дазволіла мінімізаваць усе нэгатыўныя наступствы ад такога сумяшчэньня.

Адразу пасьля абвяшчэньня было пастаўленае пытаньне пра адпаведнасьць рэфэрэндуму законам Рэспублікі Беларусі. Па-першае, п. 2 ч. 3 арт. 112 Выбарчага кодэксу не дазваляе "выносіць на рэфэрэндум пытаньні, зьвязаныя з абраньнем і вызваленьнем прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі". Зь іншага боку, у адпаведнасьці з Канстытуцыяй (ч. 3 арт. 140) зьмены ў разьдзел 4, які ў тым ліку вызначае і асновы працэдуры абраньня прэзыдэнта, могуць быць унесеныя толькі праз рэфэрэндум. Па-другое, на рэфэрэндум фактычна выносіліся два пытаньні ў форме аднаго, што супярэчыць ч. 2 арт. 118 Выбарчага кодэксу. Але гэтыя акалічнасьці ня выклікалі рэакцыі афіцыйных органаў.

17 жніўня былі абвешчаныя таксама выбары ў верхнюю палату парлямэнту — раду рэспублікі (гл. указ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ад 17 жніўня 2004 г. "Аб прызначэньні выбараў у Раду рэспублікі нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі трэцяга скліканьня"). Нават фармальная выбарчая кампанія тут не праводзілася. Як вядома, сяброў рады рэспублікі абіраюць дэпутаты мясцовых Радаў базавага ўзроўню. Вынікі мясцовых выбараў 2003 г. былі адназначна спрыяльнымі для ўлады, і выбары ў раду рэспублікі, якія праводзіліся пасьля 17 кастрычніка, мелі фармальны і безальтэрнатыўны характар.

Сучасны стан разьвіцьця дзяржаўнай сыстэмы Беларусі дазваляе ня толькі забясьпечваць ляяльнасьць выбарчых органаў, але і дакладна плянаваць іх пэрсанальны склад, прадстаўніцтва розных сацыяльных групаў, а таксама кантраляваць працэс волевыяўленьня. Палітычная кампанія ўладнай эліты падзяляецца на дзьве часткі, якія вызначылі вынікі парлямэнцкай кампаніі 2004 г.: 1) стварэньне сыстэмы органаў, што ажыцьцяўляюць падрыхтоўку і правядзеньне выбараў; 2) уласна выбарчая і інфармацыйная кампанія.

Першая частка кампаніі — адміністрацыйнае забесьпячэньне выбарчага працэсу — уключала стварэньне, дысцыплінаваньне і кантроль над выбарчымі камісіямі. Па сутнасьці, гэта надавала шырокія магчымасьці для мадэляваньня вынікаў галасаваньня: вызначэньне лічбаў удзе-

лу ў выбарах, колькасьці галасоў, аддадзеных за кандыдатаў і г. д. Другая частка складалася з сэлекцыі кандыдатаў, забесьпячэньня іх фінансавай і адміністрацыйнай падтрымкаю, захадаў супраць апанэнтаў і апазыцыі. Яе інтэграваным складнікам была інфармацыйная кампанія, мэта якой — павышэньне электаральнай папулярнасьці ўладных групаў і легітымнасьці рэжыму ўвогуле.

Трэба зазначыць, што палітычная кампанія 2004 г. значна адрозьнівалася ад выбараў 2000 г. Адміністрацыйны кантроль над выбарчымі камісіямі выйшаў на першае месца, а агітацыйна-інфармацыйныя кампаніі выконвалі дадатковую функцыю. Акрамя гэтага, у параўнаньні з 2000 г. адбылося значнае зьніжэньне магчымасьці для адкрытай канкурэнцыі за пасады сярод ляяльных кандыдатаў. Таксама значна ўзрасла цэнтралізацыя (у сэлекцыі кандыдатаў, напрыклад) і кантроль за працэсам з боку выканаўчых структураў.

## Сыстэма адміністраваньня выбарчага працэсу

Спробы аднаўленьня дзяржаўнай сыстэмы кантролю над правядзеньнем выбараў у сучаснай Беларусі пачыналіся з другой паловы 1995 г. — часу афармленьня выканаўчай "вэртыкалі". Тым ня менш, кампаніі 1996 г. (выбары і рэфэрэндум) яшчэ ня мелі цеснага адміністрацыйнага кантролю за выбарчым працэсам. Наступныя выбарчыя кампаніі (1999–2000 гг.) байкатаваліся апазыцыяй, таму не патрабавалі арганізацыі цэнтралізаванай і дысцыплінаванай выбарчай сыстэмы. Сучасная арганізацыя выбарчага працэсу з высокім узроўнем адміністрацыйнага кантролю і цэнтралізацыі склалася перад выбарамі прэзыдэнта 2001 г. (першай пасапраўднаму буйной палітычнай кампаніяй з 1996 г.). Мясцовыя выбары 2003 г. пацьвердзілі і ўдасканалілі існаваньне гэтай сыстэмы.

Існая мадэль арганізацыі выбарчага працэсу ў Беларусі збольшага самадастатковая. Выніковыя лічбы камісіі не заўсёды залежаць ад фактычнага волевыяўленьня электарату і дазваляюць практычна неабмежавана мадэляваць канчатковыя вынікі. Існаваньне такой сыстэмы можа мінімізаваць наступствы падзеньня легітымнасьці, бо ўтрыманьне ўлады ў існай сыстэме больш не патрабуе шырокай і энэргічнай электаральнай падтрымкі, якую, збольшага, можна ігнараваць. Трэба адзначыць, што мадэляваньне вынікаў галасаваньня стала звыклай практыкай, генэтычна зьвязанаю з палітычнай культураю часоў БССР. Для сяброў выбарчых камісіяў такія дзеяньні рэдка зьвязваюцца зь "няправільнасьцю" ці "крымінальнасьцю". Большасьць асобаў, якія ўдзельнічаюць у мадэляваньні вынікаў, не адчуваюць адказнасьці за свае дзеяньні і лічаць іх збольшага "нармальнымі".

## Выбарчая вэртыкаль

Кантроль за вынікамі галасаваньня ў значнай ступені залежыць ад выбарчых камісіяў, таму ляяльнасьць "выбарчай вэртыкалі" заставалася важным элемэнтам палітычных кампаніяў 2004 г. Як і ўсе папярэднія гады, выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў фармаваліся непасрэдна выканаўчаю ўладаю, пераважна з сваіх прадстаўнікоў з забесьпячэньнем абсалютнай ляяльнасьці. (Акрамя кантролю за вынікамі галасаваньня, выбарчыя камісіі — акруговыя і цэнтральная — уплываюць на колькасны склад і актыўнасьць удзельнікаў выбарчага працэ-

су: рэгіструюць і скасоўваюць рэгістрацыю кандыдатаў, разглядаюць іх скаргі, выносяць папярэджаньні і г. д.)

Палітычная ляяльнасьць Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў (Цэнтральная камісія; у беларускіх СМІ і нават афіцыйных заявах шырока ўжываецца іншая абрэвіятура для абазначэньня Цэнтральнай камісіі па выбарах — ЦВК, якая, тым ня менш, не базуецца на афіцыйнай назьве камісіі) не выклікала сумневу. Яе сучасны склад быў сфармаваны 31 студзеня 2002 г. зь людзей, большасьць зь якіх зьвязаныя з органамі выканаўчай улады і неаднаразова выказвалі сваю палітычную падтрымку афіцыйнаму палітычнаму курсу і пэрсанальна прэзыдэнту. Асабліва гэта тычыцца старшыні Цэнтральнай камісіі Л. Ярмошынай. У адпаведнасьці з дэкрэтам прэзыдэнта ад 3 верасьня ў склад Цэнтральнай камісіі з правам дарадчага голасу былі ўключаныя прадстаўнікі палітычных партыяў, якія вылучалі кандыдатаў у палату прадстаўнікоў (у тым ліку апазыцыйных). Гэта дазволіла прадстаўнікам палітычных партыяў непасрэдна ўдзельнічаць у працы Цэнтральнай камісіі і, прынамсі, атрымоўваць больш поўную і дакладную інфармацыю пра яе дзейнасьць, што, аднак, не магло істотна паўплываць на прыняцьце камісіяй палітычна значных рашэньняў.

У адпаведнасьці з заканадаўствам для правядзеньня выбараў у парлямэнт было створана 110 акруговых камісіяў, у склад якіх увайшло 1430 чалавек (паводле дадзеных Цэнтральнае камісіі, 20 % склалі прадстаўнікі грамадзкіх аб’яднаньняў, зь іх “апазыцыйных” меней за 0,3 %, прадстаўнікі палітычных партыяў — 7,1 %). Апазыцыйныя партыі вылучылі ў склад акруговых выбарчых камісіяў больш за 300 чалавек, сталі сябрамі камісіяў толькі 28 (ПКБ — 19, АГП — 5, БНФ — 2, БСДП (НГ) — 2), што склала 1,96 % ад агульнай колькасьці. Такім чынам, больш за 2/3 (74,5 %) акруговых камісіяў ня мелі прадстаўніцтва ад апазыцыі ўвогуле.

Для правядзеньня рэфэрэндуму былі створаныя тэрытарыяльныя камісіі; дарэчы, у парушэньне заканадаўства, яны былі створаныя і пачалі сваю працу да афіцыйнага абвяшчэньня рэфэрэндуму. Прадстаўніцтва ад апазыцыйных групаў у тэрытарыяльных камісіях склала менш за 1 %.

Для сучаснай Беларусі, аднак, найбольш важным ёсьць фармаваньне ўчастковых камісіяў, дзе адбываецца непасрэдны падлік галасоў і найбольш важныя мадэляваньні вынікаў. Паводле інфармацыі ЦВК, было створана 6659 участкаў для галасаваньня і адпаведна такая ж колькасьць участковых камісіяў. У іх склад увайшло больш за 72 тыс. чалавек. Прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях апазыцыйных групаў і дэмакратычных арганізацыяў было яшчэ меншым і склала меней за 0,2 %.

Такім чынам, выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў былі сфармаваныя выканаўчаю ўладаю і іх склад быў ляяльным. Прычым ня менш за 2/3 камісіяў, якія ўдзельнічалі ў арганізацыі працэсу волевыяўленьня ў 2004 г., мелі той жа склад, што і камісіі, сфармаваныя для мясцовых выбараў 2003 г. Значная колькасьць участковых камісіяў складалася з прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыву, і паміж сябрамі камісіяў меліся адносіны службовай залежнасьці. Гэта, натуральна, робіць працу значна больш дысцыплінаванай і ўзгодненай, але менш празрыстай і адэкватнай для ажыцьцяўленьня дэмакратычных працэдураў.

Практычны ўдзел у палітычнай кампаніі і ўплыў на вынікі галасаваньня выбарчых камісіяў быў дастаткова вялікі. Паказьнікі ўдзелу ў выбарах павялічваліся таксама за кошт датэрміновага галасаваньня, галасаваньня на месцы жыхарства, скарачэньня сьпісаў выбарнікаў. Акрамя таго, непразрыстымі былі апэрацыі зь бюлетэнямі, а таксама падлік галасоў. Усё гэта дазваляе пашырыць рамкі для мадэляваньня вынікаў.

## Палітычная кампанія ўладаў

Палітычная кампанія ўладаў мела цэнтралізаваны характар. Традыцыйна адзіны брэнд ці публічны "сьпіс" кандыдатаў ад улады не актуалізаваўся, толькі агітацыйная кампанія па рэфэрэндуме мела адкрыты агульнанацыянальны характар.

## Кіраваньне палітычнай кампаніяй

Агульнае палітычнае кіраваньне кампаніяй 2004 г. ажыцьцяўлялася Адміністрацыяй прэзыдэнта, якая вызначала кола будучых дэпутатаў, кіравала інфармацыйнай кампаніяй, фармулявала асноўныя патрабаваньні і рэкамэндацыі да іншых дзяржаўных структураў. Функцыя непасрэднай арганізацыі выбарчай кампаніі была ўскладзеная на інфармацыйныя і ідэалягічныя аддзелы Адміністрацыі прэзыдэнта, якія, фактычна, склалі агульнарэспубліканскі штаб па рэфэрэндуме і выбарах. Аналітычнае і мэтадычнае забесьпячэньне кампаніі 2004 г. выконваў Інстытут сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Кіраваньне кампаніяй на рэгіянальным узроўні ажыцьцяўлялі ідэалягічныя і інфармацыйныя аддзелы адпаведных выканаўчых камітэтаў ("палітычная/ідэалягічная вэртыкаль"), а таксама штабы кандыдатаў. У адных выпадках штабы дзейнічалі практычна цалкам аўтаномна ад выканаўчай вэртыкалі, у іншых практычна зьліваліся зь ёй. Да палітычнай кампаніі далучалі і іншыя органы ўлады, асабліва калі іх функцыянэры самі балятаваліся на выбарах. Асобнае месца займала кіраваньне дзяржаўнымі СМІ — ад нацыянальных тэлеканалаў да раённых газэтаў ("інфармацыйная вэртыкаль") — і каардынацыя іх дзейнасьці. Агульнае кіраваньне ў гэтай сфэры забясьпечвалася непасрэдна Адміністрацыяй прэзыдэнта.

## Сэлекцыя дэпутатаў

Сэлекцыя будучых дэпутатаў улічвала, па-першае, нарматыўныя задачы па складзе новага парлямэнту (колькасьць дэпутатаў ПП другога склікаництва, жанчын, моладзі і г. д.), па-другое, пэрсанальныя характарыстыкі парлямэнтароў (палітычная ляяльнасьць, прадстаўленьне лабісцкіх групаў, прафэсійныя якасьці). Высокая ступень плянаваньня пры вызначэньні пэрсанальнага складу парлямэнту абмежавала ўдзел бізнэс-эліты ў прадстаўнічых органах, а таксама абумовіла прысутнасьць у парлямэнце (да 20 %) палітычнага "балясту" ў выглядзе дырэктараў школаў, мэдыкаў і г. д.

Асноўную групу кандыдатаў ад улады склалі дэпутаты палаты прадстаўнікоў другога скліканьня (больш за 40 %), якія павінны былі сфармаваць палітычную і прафэсійную аснову новага парлямэнту. Каля 20 % прадстаўлялі рэгіянальную эканамічную эліту, каля 14 % — рэгіянальную вэртыкаль і каля 20 % складалі функцыянэры з сфэры адукацыі і аховы здароўя. Наагул, падзел на групы тут дастаткова ўмоўны. Супрацоўнік сфэры культуры ці адукацыі можа адначасова быць рэгіянальным вэртыкальнікам, а супрацоўнік вэртыкалі — часткаю мясцовае бізнэс-эліты. Тым ня менш, гэты падзел дазваляе выявіць асноўныя тэндэнцыі і лёгіку прадстаўніцтва ў парлямэнце.

## Правілы палітычнай канкурэнцыі

У парлямэнцкіх выбарах 2004 г. узялі ўдзел практычна ўсе апазыцыйныя палітычныя групы, таму ўлада ў цэлым і яе кандыдаты ў прыватнасьці павінны былі пэўным чынам канкураваць з апазыцыяй, тым больш што перамога нават нязначнай колькасьці дэмакратычных кандыдатаў разглядалася як рэальная пагроза стабільнасьці. Натуральна, кандыдаты, якія трапілі ў "сьпіс" улады, і астатнія прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты не знаходзіліся ў роўных умовах, але самі празь сябе перавагі на карысьць праўладных кандыдатаў яшчэ не маглі гарантаваць перамогі.

Зьніжэньне канкурэнцыі дасягалася, перш за ўсё, зьмяншэньнем колькасьці рэальных і патэнцыйных удзельнікаў палітычнай кампаніі. Працэдуры зьніжэньня канкурэнцыі тычыліся ня толькі апазыцыйных кандыдатаў, але і "нэўтральных", большасьць зь якіх здымалі свае кандыдатуры ці адмаўляліся ад удзелу ў выбарах пасьля кансультацыяў ці рэкамэндацыяў з боку выканаўчай улады. Тое ж мела месца і ў выпадку з прадстаўнікамі эканамічнай эліты, якія маглі стаць канкурэнтамі зацьверджаным прадстаўнікам улады.

## Дачыненьні з апазыцыяй

Зьніжэньне канкурэнцыі з боку апазыцыйных і "незалежных" кандыдатаў дасягалася рознага кшталту пагрозамі ў звальненьні, праблемамі з праваахоўнымі органамі, адміністрацыйным ціскам і нават пагрозамі фізычнай расправы. Такі ж ціск зьдзяйсьняўся на валянтэраў, сяброў ініцыятыўных групаў, мэнэнджэраў і г. д. Інтэнсіўнасьць працы залежала ад энэргічнасьці кандыдата, жаданьняў мясцовай улады і вызначалася прынцыпам палітычнай мэтазгоднасьці. Розныя формы ўзьдзеяньня на апазыцыйных кандыдатаў былі агульнай практыкай.

## Адміністрацыйны рэсурс

Для Беларусі характэрная поўная залежнасьць вынікаў галасаваньня ад стаўленьня цэнтральнай і рэгіянальнай улады, таму адміністрацыйны рэсурс выступае ня столькі як "спрыяньне" перамозе, колькі як вырашальная прычына і неабходная ўмова перамогі.

Для кандыдатаў ад улады адміністрацыйны рэсурс азначаў магчымасьць шырокага выкарыстаньня для ўласнай палітычнай рэклямы мясцовых і цэнтральных дзяржаўных СМІ (перад агітацыяй і падчас яе), выкарыстаньня службовага становішча для збору подпісаў, фармаваньня каманды валянтэраў, вылучэньня ад працоўных калектываў, выкарыстаньня службовых памяшканьняў, транспарту і г. д. Пазытыўнае стаўленьне выканаўчай улады да кандыдатаў дазваляла бесьперашкодна весьці кампанію, арэндаваць памяшканьні, друкаваць рэклямную прадукцыю, сустракацца з выбарнікамі і працоўнымі калектывамі і нават атрымоўваць дапамогу ў афармленьні неабходных дакумэнтаў для рэгістрацыі ад акруговых выбарчых камісіяў.

Кандыдаты ад улады маглі вольна парушаць выбарчае заканадаўства, у прыватнасьці: распаўсюджваць друкаваную прадукцыю без выходных зьвестак, перавышаць адведзеныя за-

канадаўствам памеры выбарчага фонду, весьці агітацыю да рэгістрацыі ці ў дзень выбараў. Акруговыя камісіі на гэтыя і іншыя парушэньні звычайна не рэагавалі.

Вялікая колькасьць кандыдатаў ад улады, нават маючы ўсе спрыяльныя магчымасьці, не вяла актыўнай выбарчай кампаніі, разьлічваючы выключна на свой прывілеяваны палітычны статус. Калі акцэнтаваць увагу на кампаніі па рэфэрэндуме, то выкарыстаньне адміністрацыйнага рэсурсу для агітацыі "за" зьмены ў Канстытуцыі было ўсеагульным і максымальна шчыльным.

## Інфармацыйная палітыка

За апошнія гады ў Беларусі адбылося зьніжэньне інфармацыйнага дамінаваньня расейскіх тэлекампаніяў. Сыстэма электронных СМІ дапаўняецца агульнанацыянальнымі і рэгіянальнымі выданьнямі, якія належаць дзяржаве і дамінуюць на інфармацыйным рынку, прынамсі ў накладах. (Самая буйная дзяржаўная газэта "Советская Белоруссия / Беларусь сегодня" мае наклад, які перавышае сукупны наклад усіх недзяржаўных выданьняў.) Падчас кампаніі 2004 г. дзяржаўныя СМІ актыўна асьвятлялі палітычныя падзеі, але рэпрэзэнтацыя поля была асымэтрычнай: прэзыдэнту аддавалася ад 80 % да 90 % увагі — выключна ў пазытыўным сэнсе (прыкладна такія лічбы даюць вынікі доўгатэрміновага назіраньня за выбарамі ў палату прадстаўнікоў АБСЭ.) Большая частка палітычных матэрыялаў падавалася ў форме навінаў, астатняе — у аналітычных праграмах, спэцыяльных агітацыйных роліках, прапагандысцкіх фільмах і г. д. Зьмест палітычных паведамленьняў зводзіўся да актуалізацыі дасягненьняў існага палітычнага і эканамічнага ладу, неабходнасьці падтрымліваць яго праз выбары. Пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму акцэнт агітацыі зьмясьціўся на асобу А. Лукашэнкі як гаранта стабільнасьці і ўстойлівага разьвіцьця Беларусі. Традыцыйна інфармацыйная кампанія прэзэнтавала апазыцыю выключна нэгатыўна і абразьліва, а выступленьні кандыдатаў, гарантаваныя заканадаўствам, праходзілі цэнзуру. Адкрытыя выказваньні супраць рэфэрэндуму і падаўжэньня паўнамоцтваў прэзыдэнта часта не дапускаліся ў этэр.

Паралельна з кампаніяй дзяржаўных СМІ была значна звужана інфармацыйная прастора апазыцыі. Непасрэдна падчас выбарчай кампаніі быў спынены выхад больш як 10 нацыянальных і рэгіянальных недзяржаўных выданьняў ("Время", "Местная газета" і г. д.). Шэраг захадаў для абмежаваньня інфармацыйнага поля стаў адной з прычынаў няўдалай прамоцыі адзінага брэнду для дэмакратычнай кааліцыі "5+".

Ключавая роля ў агітацыі пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму адводзілася кампаніі "За Беларусь" (гэта значыла галасаваньне "за" на рэфэрэндуме), якая праводзілася ў электронных і друкаваных СМІ штабамі ляяльных кандыдатаў, выканаўчымі органамі і нават выбарчымі камісіямі. У межах гэтай кампаніі адбывалася бясплатнае распаўсюджваньне спэцыяльных выпускаў дзяржаўных газэтаў, плякатаў і ўлётак. У прыватнасьці, перад самымі выбарамі распаўсюджваліся ўлёткі з выявамі кандыдатаў і подпісамі кшталту "Референдум — голосуйте за Беларусь", звычайна без выходных зьвестак. Напярэдадні рэфэрэндуму быў распаўсюджаны спэцыяльны выпуск газэты "Советская Белоруссия" накладам 800 тыс. асобнікаў, пры гэтым апазыцыя заявіла, што рэальны наклад быў большы за 2 млн. Сымболіка кампаніі павінна была актуалізаваць дабрабыт, клопат і павагу да розных сацыяльных групаў (вэтэраны, моладзь, сяляне), стабільнасьць і пэрспэктыву, якія гарантаваныя дзяржавай і 10-

гадовай палітыкай прэзыдэнта.

Афіцыйную інфармацыйную кампанію, асабліва тую частку, якая тычылася рэфэрэндуму, можна назваць эфэктыўнай. Нават калі зьвярнуцца да сацыялягічных дадзеных “Gallup’у”, за верасень — пачатак кастрычніка 2004 г. узровень падтрымкі пытаньня рэфэрэндуму павысіўся ня менш чым на 15 %, хаця рост быў выкліканы, натуральна, ня толькі інфармацыйнай кампаніяй.

Палітычная кампанія ўладаў 2004 г. мела цэнтралізаваны характар, асабліва што тычыцца агітацыі за рэфэрэндум. У якасьці мэты выбараў у парлямэнт была пастаўленая задача абсалютнага дамінаваньня ўладных групаў і захаваньне несыстэмнага характару апазыцыі. Для гэтага выскарыстоўваліся наяўныя сродкі і магчымасьці дзяржаўнага апарату, дзяржаўныя СМІ, а таксама праца выбарчых камісіяў. У пэўнай ступені гэтая кампанія была эфэктыўнай, бо дазволіла сфармаваць цалкам ляяльны парлямэнт. Зь іншага боку, нягледзячы на выкарыстаньне дзяржаўнага рэсурсу, шчыльную агітацыйную кампанію і значныя фінансавыя выдаткі, безумоўная і актыўная падтрымка электарату не была забясьпечаная.

## АПАЗЫЦЫЯ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ 2004 Г.

Палітычная сытуацыя пачатку лета 2004 г. была неспрыяльная для апазыцыі. Дыспрапорцыя ў фінансавых і арганізацыйных магчымасьцях паміж апазыцыйнымі групамі і ўладаю на карысьць апошняй была відавочнаю. Таму рэальныя мэты палітычнай кампаніі апазыцыі, з улікам рашучасьці ўлады захоўваць уласную палітычную манаполію, былі даволі сьціплымі. Большасьць палітычных партыяў максымальным посьпехам лічыла атрыманьне некалькіх палітычных мандатаў і фармаваньне невялікай фракцыі ці групы ў новым парлямэнце. Лічылася, што мандат можна атрымаць праз масавы ўдзел апазыцыйных кандыдатаў у выбарах і пераканаўчую перамогу ў канкрэтнай акрузе. Пытаньне неабходнасьці “абароны” вынікаў галасаваньня неаднаразова ўздымалася (у прыватнасьці, “Хартыяй ’97”), але ніколі сур’ёзна не абмяркоўвалася. Ставіліся і дадатковыя мэты — “псыхалягічная перамога над рэжымам”, адбудова рэгіянальных структураў, прыцягненьне ўвагі, інфармаваньне насельніцтва і г. д.

У апазыцыйным стане мелі месца дыскусіі пра стратэгію ўдзелу ў кампаніі 2004 г. У прыватнасьці, былі прапановы здымаць усіх дэмакратычных кандыдатаў пры нерэгістрацыі знакавых асобаў альбо пры масавых парушэньнях выбарчага заканадаўства. Але большасьць палітычных суб’ектаў аддалі перавагу стратэгіі “ісьці да канца”. У тых выбарчых акругах, дзе былі зьнятыя ўсе дэмакратычныя кандыдаты, палітычныя партыі рэкамэндавалі выбарнікам галасаваць супраць усіх. Праўда, спэцыяльных кампаніяў “супраць усіх” не было і такія заклікі ня мелі вялікага ўплыву на электарат.

Існуе шмат доказаў таго, што дэмакратычныя кааліцыі да пэўнай ступені спадзяваліся на лякальныя перамогі. Магчымасьць перамогі асобных кандыдатаў падмацоўвалася досьведам мясцовых выбараў, а таксама ўстойлівымі чуткамі пра рашэньне ўладаў дапусьціць некалькіх апазыцыйных кандыдатаў у парлямэнт для яго легітымізацыі і аслабленьня вонкавапалітычнага ціску. Сваю ролю адыгрывала і адчуваньне замежнага кантролю за выбарамі, спадзяваньні на які, у рэшце рэшт, ня спраўдзіліся.

## Структура палітычнай кампаніі

Палітычная кампанія апазыцыі ў 2004 г. была менш разгалінаваная, чым у 2001 г., і адначасова больш шчыльная, чым на мясцовых выбарах 2003 г. Збольшага кампанія складалася з спробаў арганізаваць агульнанацыянальную кампанію з супольным брэндам і лёзунгамі, а таксама з сукупнасьці лякальных кампаніяў кандыдатаў у канкрэтнай акрузе. У 2004 г. не было мабілізацыйнай кампаніі, кшталту "Выбірай" у 2001 г. Зрэшты, яўка на выбарах і рэфэрэндуме ўсё роўна была вельмі высокая. Адсутнічала і колькі-небудзь структураваная нэгатыўная кампанія, кшталту "Час выбіраць" 2001 г. Пэўныя функцыі нэгатыўнай кампаніі выконвалі акцыі супраць рэфэрэндуму, але яны ня мелі сыстэмнага характару. Дзейнасьць "несыстэмных" групаў (кшталту "Зубра") зьвялася да нязначнай вулічнай актыўнасьці і падрыхтоўкі нешматлікіх акцыяў пратэсту ў першы дзень пасьля выбараў — 18 кастрычніка. (Вулічныя акцыі працягваліся практычна ўвесь тыдзень пасьля выбараў. 18 кастрычніка дэманстранты не сустрэлі супрацьдзеяньня праваахоўных органаў, затое 19 кастрычніка мелі месца сур'ёзныя сутыкненьні.) Перад выбарамі апазыцыйныя сілы правялі толькі адну дастаткова масавую акцыю — 21 ліпеня, у дзень дзясятай гадавіны ўступленьня А. Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта. Акцыя сабрала некалькі тысяч удзельнікаў і скончылася масавымі затрыманьнямі.

Спробы арганізацыі агульнанацыянальнай перадвыбарнай кампаніі — з супольнымі брэндам, лёзунгамі ды стратэгіяй — таксама былі ня вельмі ўдалыя. Такую кампанію спрабавала праводзіць толькі "5+" і ў значна меншай ступені — "Эўрапейская кааліцыя". Няўдача агульнанацыянальнай кампаніі збольшага была абумоўленая ціскам з боку ўлады, асабліва на палітычныя партыі і СМІ. Спробы рабіць прамоцыю незарэгістраванай "пяцёркі" праз прасоўваньне супольнага брэнду і сумесныя акцыі выклікалі нэгатыўную рэакцыю Міністэрства юстыцыі: палітычным партыям — суб'ектам кааліцыі "5+" за дзейнасць ад яе імя было вынесена папярэджаньне. У той жа час, выкарыстаньне брэнду патэнцыйна пагражала нерэгістрацыяй кандыдатаў ці пазбаўленьнем іх рэгістрацыі. Але ў значна большай ступені агульнанацыянальная кампанія не была актыўнай з прычыны недахопу чалавечых і арганізацыйных рэсурсаў, якія былі адцягнуты працаю ў канкрэтных выбарчых акругах. Натуральна, што дапаможныя кампаніі (мабілізацыйная, нэгатыўная і г. д.) павінны праводзіцца ня столькі партыямі, колькі каляпартыйнымі структурамі і НДА, але каньюнктура для іх маштабнага прыцягненьня да выбарчай актыўнасьці была неспрыяльная.

Асноўнымі элемэнтамі агульнанацыянальнай кампаніі было інфармаваньне пра дзейнасьць кааліцыяў у СМІ, інфармаваньне пра рэпрэсіўныя акцыі ўладаў, прэсавыя і навукова-практычныя канфэрэнцыі, праца з замежжам. "5+" надавала вялікае значэньне сумесным рэгіянальным паездкам лідэраў партыяў, "Эўрапейская кааліцыя" — акцыям, скіраваным на "распаўсюджваньне эўрапейскай ідэі". Фактычна агульнанацыянальная кампанія пачалася ўвесну 2003 г. Якраз у гэты час адбыліся першыя інфармацыйныя акцыі блёку "Свабодная Беларусь" і будучай "пяцёркі". Зь лета 2003 г. палітычныя прээнтацыі, акцыі, наўпрост альбо ўскосна зьвязаныя з выбарамі, сталі рэгулярнымі. Непасрэдна перад выбарамі інфармацыйная кампанія стала інтэнсіўнай і ўвабрала ў сябе элемэнты адкрытай агітацыі, прасоўваньня брэнду (у тым ліку і ўва ўлётках кандыдатаў), інфармаваньне пра сьпісы кандыдатаў, "галадоўку" і вулічныя акцыі, але так і ня стала дастаткова шчыльнаю.

Палітычная кампанія дэмакратычнай апазыцыі ўключала ў сябе шэраг этапаў. Фармаваньне сьпісу кандыдатаў у дэпутаты перадвыбарнымі кааліцыямі пачалося на пачатку лета 2003 г. і не спынялася аж да рэгістрацыі кандыдатаў. Стварэньне сьпісу суправаджалася перамовамі розных палітычных групаў, спачатку ў межах кааліцый, пазьней паміж кааліцыямі. Недзе зь лета 2004 г. пачалася больш-менш сыстэмная перадвыбарная агітацыя, а ад жніўня стартаваў нарматыўна прапісаны выбарчы працэс: збор подпісаў, рэгістрацыя кандыдатаў, перадвыбарная кампанія ў выбарчых акругах.

Ня толькі агульнанацыянальная, але ў значнай ступені і "акруговая" кампаніі пачаліся да афіцыйнага абвяшчэньня выбарчай кампаніі. Дзейныя дэпутаты распаўсюджвалі справаздачы пра сваю працу на карысьць выбарнікаў, апазыцыйныя кандыдаты праводзілі рознага кшталту сацыялягічныя апытаньні і вывучалі мясцовыя праблемы для атрыманьня вядомасьці і складваньня электаральнай мапы акругі. (Невялікая частка апазыцыйных кандыдатаў рыхтавалі сваё вылучэньне яшчэ падчас мясцовых выбараў.) Адначасова фармаваліся штабы і падбіраліся каманды валянтэраў. Падрыхтоўчая кампанія была нераўнамернаю, яе правядзеньне залежала ад асобы кандыдата, а вельмі актыўных было ня так і шмат. Агульная колькасьць прадстаўнікоў апазыцыі, якія пачалі датэрміновую працу ў сваіх акругах, не была значнай.

Фармальна выбары ў парлямэнт былі абвешчаны ўказам прэзыдэнта Беларусі ад 14 ліпеня 2004 г. На падставе ўказу Цэнтральная камісія па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў распрацавала і зацьвердзіла плян выбарчай кампаніі па выбарах у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу 3-га скліка765ньня. Першыя тры этапы былі арганізацыйныя: навучаньне, вызначэньне акругаў, фармаваньне акруговых і ўчастковых камісіяў, — таму толькі ўскосна закраналі палітычную кампанію апазыцыі. Палітычныя партыі спрабавалі ўдзельнічаць у фармаваньні выбарчых камісяў, але ня вельмі пасьпяхова. Уласна выбарчая кампанія пачалася з 8 жніўня, з этапу рэгістрацыі ініцыятыўных групаў для вылучэньня ў кандыдаты.

У адпаведнасьці з графікам, вылучэньне кандыдатаў цягнулася да 6 верасьня. Адпаведна рэгістрацыя кандыдатаў адбывалася 7—16 верасьня. Пасьля рэгістрацыі пачалася агітацыйная кампанія, якая доўжылася да 16 кастрычніка.

## Рэгістрацыя ініцыятыўных групаў

Ініцыятыўныя групы для вылучэньня кандыдатаў у адпаведнасьці зь беларускім заканадаўствам ствараюцца для збору подпісаў і падачы іх у акруговую выбарчую камісію. Разам з вылучэньнем ад партыі і працоўнага калектыву, гэта адзін з сродкаў удзелу ў выбарах. Але палітычнае значэньне працэдуры больш высокае. Збор подпісаў звычайна выкарыстоўваецца кандыдатамі як дадатковая агітацыя, нават калі існуе магчымасьць партыйнага вылучэньня.

Рэгістрацыя групаў была завершаная 17 жніўня. Паводле інфармацыі Цэнтральнай выбарчай камісіі, было пададзена 635 заяваў на рэгістрацыю ініцыятыўнай групы, зь іх 71 групе было адмоўлена. Такім чынам, паказьнік нерэгістрацыі склаў больш за 11 %, што даволі многа. У прыватнасьці, на выбарах у палату прадстаўнікоў II скліканьня 2000 г. гэты паказьнік не перавышаў 4 %. У 2004 г. акруговыя камісіі значна больш уважліва ставіліся да

рэгістрацыі ініцыятыўных групаў, чым калі-небудзь у сучаснай гісторыі Беларусі. Ужо на гэтым этапе выбарчай кампаніі апазыцыйныя групы пачалі скардзіцца на адміністрацыйны ўціск і дыскрымінацыйнае стаўленьне да дэмакратычных кандыдатаў.

Агульная колькасьць ініцыятыўных групаў, якія былі сфармаваныя шасьцю найбольш буйнымі апазыцыйнымі партыямі, склала 188. (Тут і надалей ідзе аналіз пераважна партыйных кандыдатаў. Натуральна, што гэта не ахоплівае ўсіх кандыдатаў, якіх можна аднесьці да апазыцыі, — у прыватнасьці, непартыйных сяброў абедзьвюх кааліцыяў, але больш-менш дакладных зьвестак пра іх вылучэньне няма.) Найбольшую актыўнасьць праявілі АГП — 54 і БСДП (НГ) — 50, затым БНФ — 38, ПКБ — 24, БСДГ — 16 і БПП — 6 (такім чынам, удзельная вага “5+” склала 73 % ад апазыцыйных кандыдатаў). З 188 групаў не зарэгістравалі 16,5 % (31 групу). Такім чынам, узровень адмоваў для апазыцыйных кандыдатаў быў вышэйшы, чым сярэдні паказьнік у краіне. Найвялікшы ўзровень нерэгістрацыі быў для БСДП (НГ) — адмоўлена 30 % ініцыятыўных групаў. Для астатніх партыяў гэты адсотак ня быў такім значным (самы высокі сярод астатніх — у БСДГ: амаль 19 %). Сярэдні ўзровень адмоваў па Народнай кааліцыі “5+” склаў 11,6 %, што практычна супадае зь сярэднім узроўнем у краіне.

## Вылучэньне кандыдатаў ад партыяў

Партыйнае вылучэньне больш надзейнае, чым вылучэньне зборам подпісаў, таму яго актыўна выкарыстоўвалі. Абсалютная большасьць апазыцыйных кандыдатаў вылучаліся ад палітычных партыяў. Як вядома, партыя можа вылучыць свайго прадстаўніка толькі ў тым выпадку, калі мае на тэрыторыі акругі зарэгістраваныя арганізацыйныя структуры, таму з гэтай магчымасьці не маглі скарыстацца ўсе партыйныя кандыдаты.

Права на вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты ад палітычных партыяў маюць вышэйшыя кіраўнічыя органы гэтых арганізацыяў, таму большасьць партыяў правялі ў жніўні 2004 г. нечарговыя зьезды, якія мелі збольшага тэхнічны характар і разглядалі пераважна пытаньне вылучэньня кандыдатаў. Некаторыя зь іх закранаілі таксама і праблемы партыйнага будаўніцтва, зацьвярджэньне перадвыбарнай плятформы (у прыватнасьці, БСДГ). Геаграфія вылучэньня залежала, перш за ўсё, ад наяўнасьці рэгіянальных структураў, а таксама кааліцыйных дамоўленасьцяў і кандыдатаў, здольных весьці актыўную палітычную кампанію.

VIII нечарговы зьезд партыі БНФ адбыўся 29 жніўня. Кандыдатамі было вылучана 40 асобаў. Калі прааналізаваць геаграфію вылучэньня, то прадстаўнікі Менску і Берасьцейскай вобласьці склалі 53 % ад усіх вылучаных кандыдатаў, у акругах, якія зьмешчаныя ў Менскай вобласьці, вылучана 8 чалавек, у астатніх абласьцях — ад 1 да 4 чалавек.

Усяго, паводле заяваў кіраўніцтва, партыя БНФ вылучыла 55 кандыдатаў, 40 — партыйным вылучэньнем і 15 — праз збор подпісаў. Гэтая колькасьць была значна скарочаная ў выніку адмоваў у рэгістрацыі, ад удзелу ў кампаніі, зьняцьця кандыдатураў на карысьць іншых кандыдатаў, а таксама пазбаўленьня рэгістрацыі найбольш актыўных кандыдатаў. У бюлетэнях 17 кастрычніка засталося толькі 30 сяброў БНФ, гэта значыць 54,5 % ад вылучаных. У дзень выбараў партыя БНФ была прадстаўленая ў 27,3 % выбарчых акругаў: 8 кан-

дыдатаў у Менску, 6 — у Берасьцейскай вобласьці, 5 — у Віцебскай, 4 — у Менскай, па 3 — у Гарадзенскай і Гомельскай, 1 — у Магілёўскай*.

29 жніўня быў праведзены VIII пазачарговы зьезд АГП, на якім было вылучана 57 кандыдатаў. Зьезд суправаджаўся арганізацыйнымі цяжкасьцямі. Адміністрацыя гатэлю "Менск", дзе была арэндаваная заля для зьезду, у апошні момант адмовіла ў яго правядзеньні, і кіраўніцтва АГП было вымушанае шукаць іншае памяшканьне. Улічваючы абставіны зьезду, нават паўстала пытаньне яго легітымнасьці. Пры рэгістрацыі кандыдаткі ад партыі АГП З. Бандарэнкі ў 61-й выбарчай акрузе мясцовая акруговая камісія адмовіла ёй, спаслаўшыся на несапраўднасьць рашэньняў зьезду. Праўда, пазьней Міністэрства юстыцыі прызнала легітымнасьць зьезду АГП і вылучэньне партыйных кандыдатаў. Акрамя 57 чалавек, якія былі вылучаныя ад партыі, яшчэ 5 сяброў АГП вылучаліся праз збор подпісаў. Такім чынам, агульная колькасьць кандыдатаў ад АГП (паводле інфармацыі партыйнага кіраўніцтва) склала 62 асобы. У выбарах 17 кастрычніка прынялі ўдзел 29 кандыдатаў ад АГП, гэта значыць 46,8 % ад вылучаных у жніўні. АГП мела прадстаўніцтва ў 26,4 % выбарчых акругаў: Менск — 6, Магілёўская, Гомельская і Віцебская вобласьці — па 5, Менская — 4, Берасьцейская — 3 і Гарадзенская — 1.

Нечарговы зьезд БСДГ таксама адбыўся 29 жніўня. Партыя, як і АГП, мела праблемы з арэндаю памяшканьня, таму зьезд праходзіў у сядзібе ПКБ. Было вылучана 16 кандыдатаў (Менск — 8 чалавек, Берасьцейская вобласьць — 3, Магілёўская — 2 і па 1 у Віцебскай, Гомельскай, Менскай і Магілёўскай). Яшчэ тры сябры партыі дэкляравалі намер вылучацца праз збор подпісаў; такім чынам, агульная колькасьць вылучэнцаў склала 19 асобаў. Акрамя вылучэньня кандыдатаў, зьезд партыі разгледзеў і зацьвердзіў перадвыбарную плятформу БСДГ. За аснову была прынятая праграма Народнай кааліцыі "5+" з шэрагам дапаўненьняў, большасьць якіх тычылася абароны сацыяльных правоў. У бюлетэнях 17 кастрычніка было 12 сяброў БСДГ, гэта значыць 63,2 % ад падтрыманых кандыдатаў. Партыя БСДГ была прадстаўлена ў 10,9 % выбарчых акругаў: Менск і Берасьцейская вобласьць — па 3 кандыдаты, Магілёўская — 2, Віцебская, Гомельская, Гарадзенская, Менская вобласьці — па 1.

ПКБ для ўдзелу ў выбарах вылучыла 38 кандыдатаў, але колькасьць тых, хто ўзяў удзел у кампаніі, была меншая — перш за ўсё праз адмовы ў рэгістрацыі. 17 кастрычніка ў выбарчых бюлетэнях было 27 сяброў ПКБ, гэта склала 71,1 % ад вылучаных і было самым высокім паказьнікам сярод апазыцыйных партыяў. Партыя ПКБ мела сваіх прадстаўнікоў у чвэрці (24,5 %) выбарчых акругаў: 8 — у Гомельскай вобласьці, па 6 — у Берасьцейскай і Віцебскай, 3 — у Гарадзенскай, 2 — у Менску і па 1 — у Магілёўскай і Менскай абласьцях.

Кандыдаты ў дэпутаты ад БСДП (НГ) былі вылучаныя 21 жніўня Цэнтральным камітэтам партыі, найвышэйшым, у адпаведнасьці з статутам, рэспубліканскім кіраўнічым органам яе. Гэтая акалічнасьць на пэўны час паставіла пад пытаньне легітымнасьць вылучэньня, бо старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі выказала меркаваньне, што правам вылучаць кандыдатаў валодае толькі зьезд партыі, пасьля чаго рэкамэндавала акруговым камісіям не рэгістраваць кандыдатаў, якія былі вылучаныя іншым органам. У гэтай сытуацыі Міністэрства юстыцыі не падтрымала пазыцыі Цэнтральнай камісіі і прызнала права БСДП (НГ) вылучаць сваіх канды-

* Інфармацыя ЦВК на аснове пратаколаў акруговых камісіяў: Итоги выборов депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь третьего созыва 17 октября 2004 года; http://rec.gov.by/elect/ppns3/ppns3itogi.html

датаў рашэньнямі Цэнтральнага камітэту. Партыя БСДП (НГ) вылучыла 56 кандыдатаў, але неўзабаве чатыры зь іх адмовіліся ад удзелу ў кампаніі (кіраўніцтва партыі патлумачыла гэта ціскам з боку дзяржаўных структураў) і колькасьць вылучэнцаў скарацілася да 52 чалавек. Непасрэдны ўдзел у выбарах узялі 31 чалавек. БСДП (НГ) мела прадстаўніцтва ў 28,2 % выбарчых акругаў: 9 кандыдатаў — у Віцебскай вобласьці, 7 — у Берасьцейскай, 6 — у Менску, 5 — у Менскай вобласьці, 3 — у Магілёўскай вобласьці і 1 — у Гомельскай.

Партыйнае вылучэньне дазваляе зрабіць аналіз палітычнай актыўнасьці буйных перадвыбарных кааліцыяў. Сумарнае вылучэньне ад Народнай кааліцыі "5+" склала 174 кандыдаты (35,6 % — АГП, 31,6 % — БНФ, 21,9 % — ПКБ і 10,9 % — БСДГ)*. У адпаведнасьці з дадзенымі Цэнтральнай выбарчай камісіі ўсяго было вылучана 692 прэтэндэнты на 110 месцаў у парлямэнце, такім чынам, агульная доля прадстаўнікоў "пяцёркі" склала 25,1 %. З падлікам прадстаўнікоў Эўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" узьнікаюць складанасьці, больш-менш дакладная інфармацыя ёсьць пра БСДП (НГ) — 8,1 % ад усіх прэтэндэнтаў. Наколькі вядома, жаночая партыя "Надзея" кандыдатаў у дэпутаты не вылучала, найбольш уплывовыя фігуры блёку "Свабодная Беларусь" таксама не выстаўлялі сваіх кандыдатураў. На пасяджэньні яго Каардынацыйнага камітэту 8 лістапада 2004 г. было абвешчана, што ад блёку вылучаліся 107 чалавек (15,5 % ад 692), але гэты лік, відавочна, значна завышаны. Тым больш што зарэгістравана было толькі 36 чалавек (33,6 % ад вылучаных, гэта вельмі нізкі паказьнік, нават для апазыцыйнага блёку). Улічваючы тое, што ад БСДП (НГ) было зарэгістравана ня менш як 28 чалавек, астатнія суб'екты кааліцыі здолелі зарэгістраваць толькі 8 кандыдатаў. Калі адняць партыйцаў БСДП (НГ), то працэнт рэгістрацыі прадстаўнікоў іншых суб'ектаў "Эўрапейскай кааліцыі" складзе 9,8. Гэты лік можна лічыць нерэальным, нават калі ўзяць пад увагу значны ціск з боку ўлады.

Калі прааналізаваць узровень допуску да выбараў суб'ектаў Народнай кааліцыі "5+", то найбольш нізкі гэты паказьнік у АГП (дапушчана меней за 47 %), а самы высокі — у ПКБ (71 %). Такі разрыў можна тлумачыць ня толькі нэгатыўным стаўленьнем улады да кандыдатаў ад АГП, ня менш значную ролю адыграла недастатковая стараннасьць пры адборы патэнцыйных кандыдатаў. Гэта пацьвярджаецца і прыкладна аднолькавай колькасьцю прадстаўнікоў буйных партыяў, якія захавалі свой статус кандыдатаў да 17 кастрычніка 2004 г. Агулам удзельнікаў выбараў ад Народнай кааліцыі было 98** чалавек (зь іх БНФ — 30,6 %, АГП — 29,6 %, ПКБ — 27,6 %, БСДГ — 12,2 %). Узровень "допуску" да выбараў удзельнікаў Народнай кааліцыі "5+" склаў 56,3 %, гэта нават трошкі вышэй за сярэдні паказьнік у краіне. Усяго ў краіне з 671 было зарэгістравана акруговымі камісіямі 359 (51,9 %) прэтэндэнтаў, адмоўлена ў рэгістрацыі — 312 (45,1 %). Кандыдаты ад Народнай кааліцыі на выбарах былі прадстаўлены ў 72 акругах, што складае толькі 65,5 % ад агульнай колькасьці. Найбольшая колькасьць "бесьпяцёрачных" акругаў была ў Менскай вобласьці — 9, затым у Гомельскай, Гарадзенскай і Магілёўскай — па 6.

---

* Лічба разыходзіцца з пададзенай у табліцы 3 артыкулу Юр'я Чавусава "Ход і вынікі парлямэнцкіх выбараў…", бо вынікае з аўтарскіх падлікаў (БНФ — 55, АГП 62, БСДГ 19, ПКБ 38 = 174) на аснове афіцыйных прэсрэлізаў і копіяў матэрыялаў зьездаў. Такім чынам, аўтарская мэтадалёгія падліку тут наступная:

1. Колькасьць вылучаных партыйцаў – публічна заяўленая і зацьверджаная ўпаўнаважаным органам (зьезды і г.д.) інтэнцыя партыяў. Прычыны далейшае адмовы (нерэгістрацыя, страх і г.д.) не аналізуюцца.
2. Колькасьць партыйных кандыдатаў узгоднена з выніковай пастановай ЦК па выбарах. — ***Рэд.***

** Лічба грунтуецца на аўтарскіх падліках. — ***Рэд.***

Аналіз, заснаваны на выніках выбараў, не дае дастатковых падставаў для сыстэмных высновы, улічваючы адсейваньне многіх апазыцыйных кандыдатаў, тым ня менш, ён можа выявіць пэўныя тэндэнцыі, напрыклад адносна высокую прысутнасьць партыйных кандыдатаў ад усіх партыяў у Берасьцейскай вобласьці (каля 25) і нізкую — у Гарадзенскай (каля 8), вялікае значэньне Менску для большасьці партыяў, акрамя ПКБ, адносна моцныя пазыцыі БСДП (НГ) у Віцебскай вобласьці і г. д. Аднак фэномэны рэгіянальнай палітычнай дыспрапорцыі патрабуюць асобнага дасьледаваньня, і таму нейкія дакладныя высновы тут немагчымыя.

Вынікі выбараў пацьвердзілі існаваньне ў Беларусі апазыцыйнай партыйнай сыстэмы, якую можна апісаць формулаю 4+1. Чатыры адносна буйныя партыі — БНФ, АГП, ПКБ, БСДП (НГ) — і БСДГ, якая трывала займае пятую пазыцыю. Ніводная зь іншых палітычных арганізацыяў (у прыватнасьці жаночая партыя “Надзея”, блёк “Свабодная Беларусь”, “Маладая Беларусь”) ня мела параўнальнага палітычнага патэнцыялу.

## Кааліцыйнае будаўніцтва апазыцыі перад выбарамі

Падчас палітычнай кампаніі працягваўся працэс інтэграцыі апазыцыйных сілаў. Працэс аб’яднаньня быў шматмерным і даволі гнуткім. Мела месца як укладаньне перадвыбарных пагадненьняў, так і перамовы пра каардынацыю дзеяньняў, сумеснае назіраньне, пазьбяганьне ўзаемнай крытыкі, кансультацыі аб зьняцьці кандыдатураў на карысьць палітычных саюзьнікаў. Акрамя таго, падчас кампаніі адбывалася ўзмацненьне кантактаў паміж інстытуцыялізаванаю апазыцыяй і “незалежнымі” кандыдатамі, якія з розных прычынаў вырашылі ісьці ў парлямэнт і ўступілі ў канфлікт з уладаю.

Найбольш значнай, з сымбалічнага пункту гледжаньня, падзеяй стала падпісаньне пагадненьня паміж Эўрапейскай кааліцыяй “Свабодная Беларусь”, грамадзянскай кааліцыяй “Рэспубліка” і блёкам “Маладая Беларусь” 20 жніўня ў Менску. Яно прадугледжвала цесную каардынацыю падчас парлямэнцкіх выбараў і стварэньне адзінага сьпісу пасьля рэгістрацыі кандыдатаў. Ад Эўрапейскай кааліцыі подпіс пад дакумэнтам паставіў М. Статкевіч і А. Саньнікаў, ад “Рэспублікі” — В. Фралоў, ад “Маладой Беларусі” — З. Дашкевіч. Народная кааліцыя “5+” фармальна падтрымала аб’яднаньне трох дэмакратычных апазыцыйных групаў, хоць і скептычна паставілася да іх арганізацыйных здольнасьцяў. Лідэры “пяцёркі” нават выказвалі меркаваньне пра магчымасьць зьняцьця ўласных кандыдатаў, калі прадстаўнікі дэмакратычных групаў будуць мець большы шанец на перамогу. Пагадненьне мела пераважна сымбалічны і дэманстрацыйны характар і відавочна было часткаю інфармацыйнай кампаніі. Практычнага значэньня пагадненьне ня мела. В. Фралоў балятаваўся ад БСДП (НГ), а колькасьць зарэгістраваных кандыдатаў ад “Маладой Беларусі” была мінімальная. Палітычная сувязь паміж блёкамі, якія падпісалі пагадненьне, была і да гэтага часу. У прыватнасьці, “МФ” яшчэ ў канцы 2003 г. вітаў стварэньне Эўрапейскай кааліцыі “Свабодная Беларусь”, а В. Фралоў актыўна супрацоўнічаў з шэрагам рэгіянальных арганізацыяў БСДП (НГ). Канчатковае аб’яднаньне гэтых палітычных групаў адбылося ўжо пасьля выбараў. 8 лістапада на пасяджэньні каардынацыйнага камітэту “Эўрапейскай кааліцыі” было прынята рашэньне пра далучэньне “МФ” да кааліцыі. Старшыня “МФ” П. Севярынец стаў сябром каардынацыйнага

камітэту выбарчага блёку. Акрамя гэтага, да кааліцыі далучылася незарэгістраваная Беларуская партыя свабоды і прагрэсу, створаная на аснове моладзевай арганізацыі "Грамадзянскі форум", якая адкалолася ад АГП у 2000 г. Яе старшыня У. Навасяд быў абраны дэпутатам палаты прадстаўнікоў у 2000 г., але ў 2004 г. ня быў нават зарэгістраваны ў якасьці кандыдата ў дэпутаты.

## Кампанія супраць рэфэрэндуму і магчымых фальсыфікацыяў

Абвяшчэньне 7 верасьня прэзыдэнтам Беларусі рэфэрэндуму наконт дазволу балятавацца яму на трэці тэрмін выклікала кансалідаваную нэгатыўную рэакцыю апазыцыі. Ужо 8 верасьня была прынята дэклярацыя аб адзінстве дэмакратычных сілаў, якую падпісалі прадстаўнікі Народнай кааліцыі "5+", Эўрапейскай кааліцыі "Свабодная Беларусь" і шэраг вядомых культурных і грамадзкіх дзеячоў. Дэклярацыя падкрэслівала цынічнае выкарыстаньне ўладаю падзеяў у Бэслане для ўласных палітычных мэтаў і неканстытуцыйнасьць абвешчанага рэфэрэндуму. Прадстаўнікі дэмакратычных сілаў заявілі пра сваё адзінства і рашучасьць "разам супрацьстаяць пагрозе ўсталяваньня ў Беларусі пажыцьцёвай і неабмежаванай улады аднаго чалавека". Адзначалася таксама, што большасьць грамадзянаў Беларусі выступае супраць працягу паўнамоцтваў прэзыдэнта і што кансалідацыя дэмакратычных сілаў неабходная для таго, каб "гэтая большасьць перамагла".

Абвяшчэньне рэфэрэндуму не было нечаканасьцю для апазыцыі. Адзінае, што было невядома, — дакладная дата правядзеньня. Апазыцыя, збольшага, сур'ёзна не рыхтавалася да кампаніі супраць рэфэрэндуму, стратэгічны плян дзеяньняў таксама адсутнічаў. Кампанія супраць рэфэрэндуму афармілася ў межах ужо разгорнутай кампаніі па выбарах у парлямэнт. Сацыялягічныя дадзеныя, якія былі распаўсюджаны службай "Gallup" у жніўні і пачатку верасьня, выклікалі пэўны аптымізм, які неабгрунтавана супакоіў апазыцыю, бо паказвалі падтрымку ідэі зьменаў у Канстытуцыі на ўзроўні, значна меншым за неабходны, — 32 %. Большасьць апазыцыйных лідэраў былі ўпэўненыя, што гэтае пытаньне непапулярнае і сапраўднай электаральнай перамогі А. Лукашэнка на рэфэрэндуме не атрымае. Зь іншага боку, было відавочна, што для забесьпячэньня перамогі ўлада будзе выкарыстоўваць усе наяўныя сродкі і правядзеньне сумленнае кампаніі малаімавернае. Але эфэктыўнасьць прапаганды і палітычных захадаў улады была для апазыцыі нечаканаю.

Для правядзеньня кампаніі супраць рэфэрэндуму былі створаныя рэгіянальныя штабы. Натуральна, большасьць арганізацыйных рэсурсаў былі ўжо адцягнутыя на парлямэнцкую кампанію, але было відавочна, што далёка ня ўсе апазыцыйныя кандыдаты будуць зарэгістраваныя. Плянавалася, што яны ня будуць спыняць сваёй актыўнасьці і далучацца да правядзеньня агітацыі супраць рэфэрэндуму ў сваіх акругах. Натуральна, што зарэгістраваныя кандыдаты ад дэмсілаў таксама павінны былі весьці актыўную кампанію супраць рэфэрэндуму. Задача гэтая была рэалізаваная толькі эпізадычна.

Кампанія распачалася пад назваю "Скажы Лукашэнку НЕ!". Народная кааліцыя "5+" прапанавала адпаведную формулу, якая адлюстроўвала спалучэньне дзьвюх кампаніяў: "Скажы Лукашэнку НЕ! Зрабі пяць крокаў да лепшага жыцьця". Кампанія ставіла за мэту ня толькі

агітацыю супраць (бо пытаньне рэфэрэндуму і бяз гэтага лічылася непапулярным), але і арганізацыю актыўнага непрыманьня рэфэрэндуму і, магчыма, масавых акцыяў пратэсту.

Спалучэньне дзьвюх кампаніяў стварала вялікія арганізацыйныя складанасьці, пры тым што дзяржаўныя органы разгарнулі вельмі актыўную агітацыю "за", якая давала свой плён, і колькасьць прыхільнікаў зьменаў у Канстытуцыі расла. Тое, што базыснымі структурамі кампаніі сталі штабы зарэгістраваных кандыдатаў і ў меншай ступені — спэцыялізаваныя штабы і незарэгістраваныя кандыдаты, значна паўплывала на ход агітацыі "супраць". Кампанія была нераўнамерная і няшчыльная, некаторыя рэгіёны ёй не былі закранутыя ўвогуле, ахоп іншых быў недастатковым. Кампанію па рэфэрэндуме шмат у чым напаткаў лёс агульнанацыянальнай агітацыйнай кампаніі, якая так і ня стала дастаткова шырокай. На гэта было дзьве галоўныя прычыны: брак часу (паўтара месяца — замалая колькасьць часу ў існых умовах), адцягненьне большай часткі арганізацыйных рэсурсаў парлямэнцкай кампаніяй.

Асобным пытаньнем кампаніі 2004 г. была праблема магчымых фальсыфікацыяў і супрацьдзеяньне ім. Актуальнасьць гэтага пытаньня ўзрастала з набліжэньнем выбараў. Лідэры асноўных палітычных групаў заклікалі ня браць удзелу ў датэрміновым галасаваньні. Менавіта датэрміновае галасаваньне, у якім у некаторых рэгіёнах бралі ўдзел больш за 40 % ад агульнага сьпісу выбарнікаў, разглядалася як найбольш важны мэханізм маніпуляцыяў. Заклік гэты, аднак, ня мог выправіць сытуацыю. Арганізацыя датэрміновага галасаваньня была задачай дзяржаўных органаў, і гэтая задача была поўнасьцю выканана праз выкарыстаньне адпаведных адміністрацыйных мэханізмаў. Былі і дадатковыя захады, у прыватнасьці, БНФ заклікаў прыхільнікаў дэмакратычных пераменаў арганізаваць назіраньне за выбарчымі ўчасткамі ў ноч перад выбарамі, каб не дапусьціць маніпуляцыяў зь бюлетэнямі для датэрміновага галасаваньня. Прапаноўваліся і іншыя акцыі, але большасьць зь іх ня сталі палітычнай практыкай, прынамсі масавай. Некаторыя спадзяваньні на прадухіленьне фальсыфікацыяў ускладаліся на міжнародных назіральнікаў і актыўнасьць з боку прадстаўнікоў дэмакратычных кандыдатаў у дэпутаты, але збольшага кіраўніцтва выбарчых камісіяў не дазволіла ім кантраляваць выбарчы працэс. Масавыя акцыі супраць фальсыфікацыяў 18 кастрычніка мелі характар сымбалічны і эмацыйны, вельмі далёкі ад акцыяў "абароны вынікаў галасаваньня", "супраціву фальсыфікацыям" і г. д. Для апазыцыі кампанія супраць фальсыфікацыяў мела інфармацыйны, а не рэальна палітычны характар. Удзельнікі акцыяў, у сваю чаргу, выказвалі грамадзянскую пазыцыю, а не адстойвалі палітычныя мэты.

## Выбраныя тэмы перадвыбарных дыскусіяў

На выбарах 2004 г. апазыцыя выразна прэзэнтавала сябе як альтэрнатыву існаму рэжыму, прычым альтэрнатыву пазытыўную і сучасную. Зьмест "альтэрнатывы" адлюстроўваўся ў перадвыбарных праграмах.

Народная кааліцыя "5+" аформіла сваю перадвыбарную праграму ў фармаце "пяць крокаў да лепшага жыцьця", якія канцэнтравана выражалі ідэі кааліцыі: 1. Дастойнае жыцьцё кожнаму (агульныя фразы пра дабрабыт). 2. Праца для людзей (супраць кантрактнай сыстэмы). 3. Улада для народу (супраць рэфэрэндуму). 4. Народныя грошы на службе народу (ліквідацыя прэзыдэнцкіх фондаў і апора на кааліцыю). 5. Павага ў сьвеце (пераадоленьне ізаляцыі). Пытаньне дзяржаўнасьці і незалежнасьці (актуальнае ў 1990-х гг.) у 2004 г. практычна не гучала.

Прадстаўнікі партыяў, натуральна, мелі свае дадатковыя праграмы і агітавалі па-рознаму, выкарыстоўваючы “пяць крокаў” як аснову. Некаторыя партыі, як БСДГ, мелі дадатковую праграму. Прадстаўнікі Эўрапейскай кааліцыі больш увагі надавалі ідэі эўрапейскай інтэграцыі. Пры канцы 2003 г. кааліцыя нават абвесьціла 2004 г. у Беларусі годам Эўропы і дэклявала правядзеньне на гэты конт некалькіх маштабных акцыяў. Пазьней у фармаце “Эўрапейскага выбару” быў абвешчаны збор подпісаў “за інтэграцыю Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз”. Плянавалася сабраць ня менш за 1 млн подпісаў у падтрымку гэтай ідэі, але задума так і не была рэалізаваная.

*Канстытуцыйная рэформа.* Канстытуцыйнае ўладкаваньне Беларусі выяўляе значную незбалянсаванасьць розных галінаў улады зь відавочным дамінаваньнем прэзыдэнта пры вырашэньні ўсіх важных дзяржаўных справаў. Канстытуцыйная рэформа разглядалася апазыцыяй як важны крок да дэмакратызацыі палітычнай сыстэмы. Перш за ўсё гэта тычылася скарачэньня паўнамоцтваў прэзыдэнта (у прыватнасьці, выдаваць часовыя дэкрэты, якія маюць большую юрыдычную сілу, чым закон) і павышэньня ролі парлямэнту. Праекты рэформаў таксама прадугледжвалі стварэньне дзейснага самакіраваньня, незалежнай судовай улады і новай выбарчай сыстэмы. У прыватнасьці, прапаноўвалася ўвядзеньне сыстэмы прапарцыйнага прадстаўніцтва. Дэмакратычная апазыцыя практычна аднагалосна заяўляла, што правядзеньне канстытуцыйнай рэформы будзе першаснай задачай пры зьмене ўлады. Натуральна, апазыцыя вельмі нэгатыўна паставілася да ідэі А. Лукашэнкі ўнесьці зьмены ў існую Канстытуцыю і зьняць абмежаваньні на колькасьць тэрмінаў, на працягу якіх адна і тая ж асоба можа займаць пасаду прэзыдэнта.

*Эканоміка.* Па сутнасьці, апазыцыя ў кампаніі 2004 г. вяла размову ня столькі пра эканоміку, колькі пра дабрабыт. У параўнаньні зь мінулымі гадамі рыторыка стала значна больш абстрактнай і сацыяльнай, “набліжанай да людзей”. Вялікае значэньне мела таксама актуалізацыя эканамічных праблемаў як кантраст афіцыйнай інфармацыйнай кампаніі, якая вялася пад лёзунгамі дасягненьняў беларускай эканамічнай мадэлі: стабільнасьць, адносны дабрабыт, росквіт большасьці галінаў гаспадаркі. Рыторыка эканамічных рэформаў, прынамсі глыбінных, адышла ў мове апазыцыі на другі плян, значна больш увагі стала надавацца мяккаму “ўдасканаленьню”: супрацiву кантрактнай сыстэме працоўных адносінаў, скарачэньню падаткаў, спрашчэньню працэдураў арганізацыі бізнэсу, больш лібэральным умовам для ліцэнзаваньня, стварэньню спрыяльнага інвэстыцыйнага клімату і г. д. Праекты рэформаў у эканамічнай галіне прадугледжвалі прыватызацыю значнай часткі дзяржаўных прадпрыемстваў, рэформу сельскай гаспадаркі, зьніжэньне ролі дзяржавы ў рэгуляваньні эканомікі і агульную лібэралізацыю фінансавай сфэры.

*Вонкавая палітыка.* У адрозьненьне ад папярэдніх кампаніяў значна большае значэньне было нададзена праблемам адносінаў з Эўрапейскім Зьвязам. Не ў апошнюю чаргу гэта было зьвязана з пашырэньнем ЭЗ на ўсход і аднаўленьнем цікавасьці многіх эўрапейскіх краінаў да праблематыкі Беларусі, іх “новага суседа”. Абсалютная большасьць апазыцыйных групаў актыўна выступілі ў падтрымку ідэі эўрапейскай інтэграцыі і, у пэрспэктыве, сяброўства Беларусі ў ЭЗ. Для “Эўрапейскай кааліцыі” гэтае пытаньне стала цэнтральным у інфармацыйнай і агітацыйнай кампаніі пачынаючы зь лістапада 2003 г. Нэгатыўнае стаўленьне да ідэі ўваходжаньня Беларусі ў ЭЗ захоўвала толькі ПКБ, але за апошнія гады партыя стала значна больш станоўча ставіцца да праектаў супрацоўніцтва з краінамі Захаду.

У кампаніі 2004 г. абмеркаваньне стасункаў з Расеяй мела пэрыфэрыйны характар. Ідэя

беларуска-расейскай інтэграцыі перастала быць часткаю іміджу А. Лукашэнкі, прапаганда гэтай ідэі празь дзяржаўныя СМІ, вельмі актыўная ў мінулым, была практычна цалкам спыненая. (Афіцыйны лёзунг кампаніі 2004 г., як вядома, быў “За Беларусь”.) Паралельна назіралася паступовае падзеньне цікавасьці да інтэграцыі з боку шырокіх колаў грамадзтва. Расейская праблематыка мела месца ў агітацыйнай кампаніі апазыцыі, але была слабавыяўленай і зводзілася звычайна да дэкляраваньня неабходнасьці “разьвіцьця ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва”, “наладжваньня нармальных адносінаў” і “раўнапраўнага ўзаемадзеяньня”.

***

Разгортваньне палітычнай кампаніі апазыцыі вызначала магчымыя вынікі. Прагнозы саміх палітычных гульцоў звычайна паказвалі магчымасьць, пры спрыяльных умовах, стварэньня дэмакратычнай фракцыі ў парлямэнце. Як падаецца, пры ўмове мяккага выкарыстаньня адміністрацыйнага рэсурсу ўладамі, Народная кааліцыя “5+” магла б сфармаваць у парлямэнце фракцыю з 20—25 дэпутатаў. Разам зь іншымі дэмакратычнымі кандыдатамі гэта склала б чалавек 40 (у найлепшым выпадку). Гэта была б ня большасьць, але вельмі сур’ёзная дэстабілізацыя існай палітычнай сыстэмы. Тым ня менш, “мяккай” кампаніі ня выйшла і, нягледзячы на ўсе намаганьні, апазыцыя не атрымала ніводнага мандату.

## ХОД І ВЫНІКІ ПАРЛЯМЭНЦКІХ ВЫБАРАЎ І РЭФЭРЭНДУМУ 2004 Г.*

Адметнасьцю гэтай выбарчай кампаніі было тое, што яна адбывалася адначасова з кампаніяй па правядзеньні рэфэрэндуму, які быў прызначаны ўказам прэзыдэнта ад 7 верасьня 2004 г. на тую ж дату — 17 кастрычніка 2004 г. Выступаючы ў жывым этэры беларускага тэлебачаньня 7 верасьня, А. Лукашэнка азнаёміў грамадзянаў Беларусі з сваёй прапановай — правесьці ўсенародны рэфэрэндум паводле наступнага пытаньня:

Разрешаете ли Вы первому Президенту Республики Беларусь Лукашенко А. Г. участвовать в качестве кандидата в Президенты Республики Беларусь в выборах Президента и принимаете ли часть первую статьи 81 Конституции Республики Беларусь в следующей редакции:

*“Президент избирается на пять лет непосредственно народом Республики Беларусь на основе всеобщего, свободного, равного и прямого избирательного права при тайном голосовании”*? (Тэкст пытаньня быў афіцыйна сфармуляваны толькі на расейскай мове.)

* Пры падрыхтоўцы гэтага артыкулу выкарыстоўваліся зьвесткі, апублікаваныя на афіцыйнай інтэрнэт-старонцы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў www.rec.gov.by, няўрадавых арганізацыяў, што ажыцьцяўлялі маніторынг выбарчага працэсу: інфармацыя Праваабарончага цэнтру “Вясна”, апублікаваная на сайце www.spring96.org, і выданьне Грамадзянскай ініцыятывы “Партнэрства”: Референдум и выборы в Палату представителей 2004 г. : Факты и комментарии. — Москва: Можайск-Терра, 2004.

Гэтая ініцыятыва А. Лукашэнкі была скіраваная на скасаваньне шляхам рэфэрэндуму нормы папярэдняй рэдакцыі артыкулу 81 Канстытуцыі Беларусі пра недапушчальнасьць займаць пасаду прэзыдэнта адной асобай болей за два тэрміны. Паводле меркаваньняў некаторых экспэртаў (у тым ліку правазнаўцаў Беларускага Хельсынскага камітэту, іншых праваабарончых арганізацыяў, Грамадзянскай ініцыятывы “За справядлівыя выбары”), нават сама пастаноўка пытаньня, вынесенага на рэфэрэндум, супярэчыла патрабаваньням Канстытуцыі і Выбарчага кодэксу, які забараняе выносіць на рэфэрэндум пытаньні, зьвязаныя з абраньнем прэзыдэнта. Такое меркаваньне было падтрыманае Вэнэцыянскай камісіяй — паважанай эўрапейскай інстытуцыяй экспэртаў-юрыстаў, якая палічыла недапушчальным вынясеньне на рэфэрэндум пытаньня зьмены Канстытуцыі, зьвязанага з суб’ектыўнымі правамі адной асобы.

Такім чынам, пачынаючы з 7 верасьня ў Беларусі адбывалася сумешчаная выбарча-рэфэрэндумная кампанія.

## Стварэньне акругаў і фармаваньне выбарчых камісіяў

У адпаведнасьці з артыкулам 15 Выбарчага кодэксу, у Беларусі напярэдадні парлямэнцкіх выбараў ствараюцца 110 выбарчых акругаў, па якіх адбываюцца выбары дэпутатаў палаты прадстаўнікоў згодна з мажарытарнай сыстэмай. Межы выбарчых акругаў былі вызначаныя пастановай Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў ад 15 ліпеня 2004 г. “Аб стварэньні выбарчых акругаў па выбарах дэпутатаў палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі трэцяга скліканьня”.

Згодна з вызначэньнем Цэнтральнай камісіі ад 20 траўня 2004 г., сярэдняя колькасьць выбарцаў у адной выбарчай акрузе павінна была складаць 64 585 чалавек. Агульная колькасьць выбарцаў у Беларусі была разьлічаная як 7 125 056 чалавек. У параўнаньні зь мінулымі парлямэнцкімі выбарамі сьпісавы склад электарату паменшыўся на 249 144 чалавекі. Надалей агульны сьпісавы склад выбарчага корпусу быў істотна зьменены ў бок зьмяншэньня, аднак на гэтым этапе выбарчай кампаніі фігуравалі менавіта першыя лічбы. Пры гэтым відавочным нонсэнсам выглядала павелічэньне колькасьці выбарцаў у параўнаньні з выбарамі ў мясцовыя Рады 2003 г., калі ў сьпісы было ўнесена 7 104 428 чалавек, сярод якіх пэўную колькасьць складалі грамадзяне Расейскай Фэдэрацыі. Такім чынам, рэальная колькасьць выбарцаў, якія фактычна жылі на тэрыторыі выбарчай акругі, не закладалася ў аснову “нарэзкі акругаў”, што стварыла пэўныя магчымасьці для “джэрымандэрынгу”. Адзначым, што праекты нарэзкі акругаў былі падрыхтаваныя абласнымі выканаўчымі камітэтамі і Менгарвыканкамам, а асновай для гэтых прапановаў павінен быў стаць сьпіс выбарцаў паводле стану на час правядзеньня мінулых выбараў.

Артыкул 15 Выбарчага кодэксу дазваляе адхіляцца на 10 % у бок павелічэньня альбо памяншэньня колькасьці выбарцаў па акрузе ў параўнаньні зь сярэдняй па краіне. У шэрагу выпадкаў гэтае абмежаваньне парушалася: напрыклад, у Талачынскай выбарчай акрузе № 31 было 56 200 выбарцаў, што было ніжэй за дазволеную ніжнюю мяжу.

Разьмеркаваньне выбарчых акругаў па абласьцях не зьмянілася: у Менску было створана 18 акругаў, у Берасьцейскай вобласьці — 16, у Віцебскай — 16, у Гомельскай — 17, у Гарадзенскай — 13, у Магілёўскай — 13, у Менскай — 17, па кожнай зь іх абіраўся адзін

дэпутат палаты прадстаўнікоў. Пры гэтым межы акругаў, у параўнаньні зь мінулымі парлямэнцкімі выбарамі, зьмяніліся ў 77 акругах. Асабліва істотна зьмяніліся межы выбарчых акругаў у Менску.

Межы выбарчых акругаў не супадалі зь межамі адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак: некаторыя з выбарчых акругаў былі разьмешчаныя ў двух і болей раёнах: напрыклад, тэрыторыя Касьцюковіцкай выбарчай акругі № 69 уключала ў сябе Клімавіцкі, Касьцюковіцкі, Хоцімскі, Краснапольскі раёны, а межы Гарадзенскай сельскай выбарчай акругі № 54 уключалі ў сябе акрамя тэрыторыі Гарадзенскага раёну і тэрыторыю Горадні.

Наступным этапам работы па падрыхтоўцы да выбараў было вызначэньне межаў выбарчых участкаў, якое ажыцьцяўлялася органамі выканаўчай улады. У гэтай працы ўлады прытрымліваліся адміністрацыйна-вытворчага прынцыпу: участкі ў Беларусі традыцыйна ствараюцца такім чынам, каб забясьпечыць зручнасьць кіраваньня выбарчым працэсам, яны звычайна замацоўваюцца за дзяржаўнымі ўстановамі і прадпрыемствамі. Колькасьць выбарцаў, што пражываюць на тэрыторыі ўчасткаў, павінна была складаць ад 20 да 3000 чалавек.

У адпаведнасьці з заканадаўствам, місія арганізацыі і правядзеньня выбараў ускладзеная ў Беларусі на сыстэму выбарчых камісіяў. На чале гэтай сыстэмы стаіць Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў. Гэта сталы орган, склад якога не зьмяняецца напярэдадні выбараў — у яго ўваходзяць асобы, прызначаныя прэзыдэнтам і радай рэспублікі.

Акрамя таго, у сыстэму органаў для правядзеньня парлямэнцкіх выбараў уваходзяць акруговыя выбарчыя камісіі і ўчастковыя выбарчыя камісіі. Тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі ў арганізацыі парлямэнцкіх выбараў не былі задзейнічаныя, аднак у 2004 г., пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму, яны былі закліканыя для арганізацыі канстытуцыйнага рэфэрэндуму ў выглядзе абласных, раённых, раённых у гарадох і гарадзкіх выбарчых камісіяў. Усяго падчас рэфэрэндуму дзейнічала 168 тэрытарыяльных выбарчых камісіяў. Пры гэтым нанава фармаваўся склад толькі раённых выбарчых камісіяў у гарадох з раённым дзяленьнем. Таксама паўнамоцтвы для падрыхтоўкі і правядзеньня рэфэрэндуму 2004 г. былі ўскладзеныя на гарадзкія і раённыя камісіі, што былі створаныя для арганізацыі і правядзеньня мясцовых выбараў 2003 г. Участковыя камісіі ў 2004 г. сумяшчалі функцыі арганізацыі і правядзеньня выбараў і рэфэрэндуму. Акруговыя камісіі займаліся выключна пытаньнямі выбараў дэпутатаў, не закранаючы пытаньняў правядзеньня рэфэрэндуму.

Стадыя фармаваньня акруговых камісіяў стала ў 2004 г. знакавым этапам выбарчай кампаніі. У гэты час яшчэ не было на сто адсоткаў вядома пра намер Лукашэнкі ініцыяваць плебісцыт для падаўжэньня ўласных прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў, аднак працэдура фармаваньня гэтых камісіяў і іх выніковы склад задалі агульную атмасфэру будучай палітычнай кампаніі. Пасьля таго як стаў вядомы склад выбарчых камісіяў, пацьвердзіліся здагадкі пра тое, што наступная кампанія будзе вельмі і вельмі жорсткай у дачыненьні да апанэнтаў цяперашняй дзейнай палітычнай адміністрацыі. Шмат хто з удзельнікаў кампаніі пазбавіліся ілюзіяў адносна магчымага дэмакратычнага яе ходу менавіта тады, калі стаў вядомы склад акруговых выбарчых камісіяў (табл. 1).

Актыўны ўдзел апазыцыі ў парлямэнцкіх выбарах 2004 г., у адрозьненьне ад байкатаваньня выбараў у 2000 г., вызначыў і актыўны ўдзел апазыцыйных сілаў у фармаваньні выбарчых камісіяў. Менавіта на тое, каб прасунуць у склад акруговых выбарчых камісіяў сваіх людзей, былі сканцэнтраваныя высілкі апазыцыйных і незалежных кандыдатаў, апазыцый-

ных палітычных партыяў, грамадзкіх аб'яднаньняў. Гэтаму спрыяла і тое, што апазыцыя ўжо мела за плячыма досьвед выбарчай кампаніі ў мясцовыя Рады і ведала, наколькі важна мець свайго чалавека ў складзе акруговай выбарчай камісіі. Таму, нягледзячы на ўсе магчымыя сыгналы пра тое, што “склад камісіяў ужо вызначаны загадзя”, апазыцыйныя сілы імкнуліся патрапіць у гэтыя органы.

Выбарчыя камісіі ў Беларусі фармуюцца сумесным рашэньнем прэзыдыўму мясцовай Рады і выканаўчага камітэту адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Фактычна вырашальную ролю ў вызначэньні складу камісіі мае выканаўчы камітэт. Гэта дазваляе органам выканаўчай вэртыкалі фармаваць камісіі з найбольш зручным і паслухмяным складам. Шляхі вылучэньня ў склад акруговых і іншых выбарчых камісіяў вызначаныя Выбарчым кодэксам. Правам вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў валодаюць палітычныя партыі і іншыя грамадзкія аб'яднаньні (у асобе сваіх рэспубліканскіх кіраўнічых органаў), працоўныя калектывы і грамадзяне шляхам збору подпісаў (для вылучэньня ў акруговую камісію трэба сабраць 100 подпісаў грамадзянаў, якія пражываюць на тэрыторыі адпаведнай выбарчай акругі). Гэтыя суб'екты, акрамя грамадзянаў, маюць права вылучыць у склад адпаведнай выбарчай камісіі аднаго свайго прадстаўніка. Органы, якія фармуюць склад камісіяў, таксама маюць права ўключаць у іх сваіх прадстаўнікоў. Цэнтральная камісія, з свайго боку, распрацавала ўзоры пратаколаў для вылучэньня прадстаўнікоў у склад выбарчых камісіяў.

Вылучэньне ў склад акруговых камісіяў пачалося з моманту апублікаваньня сьпісу выбарчых акругаў (хоць такі час пачатку вылучэньня ня вызначаны заканадаўча) і павінна было скончыцца да 30 ліпеня 2004 г. Прынцыпы фармаваньня выбарчых камісіяў не зафіксаваныя ў актах заканадаўства альбо ў нейкіх мэтадычных рэкамэндацыях. Больш за тое, Цэнтральная камісія неаднаразова адзначала, што яна ня ўмешваецца ў гэтую працу, якая знаходзіцца

**Табліца 1.** Вынікі вылучэньня ў акруговыя камісіі па апазыцыйных палітычных партыях

| | ПБНФ* | АГП | БСДГ | ПКБ** | Партыя працы | БСДП “НГ” | Агулам ад апазыцыйных партыяў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вылучана ў склад акруговых камісіяў | 50 | 61 | 23 | 78 | 26 | 80 | 318 |
| Уключана ў склад акруговых камісіяў | | | | | | | |
| Менск | 1 | 0 | 0 | 4 | 0 | 0 | 5 |
| Менская вобл. | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Берасьцейская вобл. | 1 | 1 | 0 | 4 | 0 | 1 | 7 |
| Віцебская вобл. | 0 | 1 | 0 | 6 | 0 | 1 | 8 |
| Гомельская вобл. | 0 | 3 | 0 | 5 | 0 | 0 | 8 |
| Гарадзенская вобл. | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Магілёўская вобл. | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 | 0 |
| Агулам уключана ў склад | 2 | 5 | 0 | 19 | 0 | 2 | 28 |

Крыніца: Права на волю : Бюлетэнь праваабарончага цэнтру “Вясна”. 2004. №15. Жнівень.

*Акрамя таго, у склад акруговых камісіяў патрапілі два сябры Партыі БНФ, вылучаныя ад ГА “БНФ “Адраджэньне”.

** Акрамя таго, у склад акруговых выбарчых камісіяў быў уключаны адзін прадстаўнік моладзевай арганізацыі ЛКСМБ.

ў юрысдыкцыі мясцовых прадстаўнічых і выканаўчых уладаў, — яна толькі выказвала пажаданьне бачыць у складзе падначаленых ёй камісіяў адукаваных і дасьведчаных супрацоўнікаў. У выніку выканаўчая вэртыкаль мела магчымасьць не ўключаць прэтэндэнтаў ад апазыцыйных сілаў у склад выбарчай камісіі, нават калі ўсе дакумэнты былі аформленыя ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі заканадаўства, сам прэтэндэнт меў вышэйшую юрыдычную адукацыю і валодаў досьведам працы ў камісіі. Прынцыпам фармаваньня камісіяў на практыцы была іх кантраляванасьць: улады імкнуліся да таго, каб склад выбарчай камісіі надалей не ствараў ім перашкодаў для арганізацыі патрэбнага выніку выбараў і рэфэрэндуму.

Рэальна ў склад акруговых камісіяў здолелі патрапіць толькі 9,2 % ад колькасьці вылучаных апазыцыйнымі партыямі прэтэндэнтаў (28 з 318). Пры агульнай колькасьці сяброў акруговых выбарчых камісіяў у 1430 чалавек (зыходзячы з вызначаных у Выбарчым кодэксе межаў у 9–13 чалавек у складзе кожнай камісіі, усе камісіі былі сфармаваныя ў максымальным складзе — па 13 чалавек) прадстаўнікі апазыцыйных палітычных партыяў здолелі заняць толькі 2 % месцаў, што ніяк не дазваляла ўплываць на рашэньні выбарчых камісіяў. Спробы прадстаўнікоў апазыцыйных палітычных партыяў абскардзіць у судзе адмовы ўва ўключэньні ў склад камісіяў не былі прадуктыўнымі: суды беспадстаўна вырашылі, што такі від пазоваў не падлеглы суду, хоць у скаргах прыводзілася дастаткова сур'ёзнае юрыдычнае абгрунтаваньне (грамадзяне Беларусі маюць права абскарджваць у судзе любое рашэньне органаў адміністрацыйнай альбо мясцовай улады, якое абмяжоўвае іх правы і законныя інтарэсы). Трэба адзначыць, што рашэньні пра адмову ўключыць апазыцыйных прадстаўнікоў у склад акруговых камісіяў прымаліся дзяржаўнымі органамі нематывавана і часта нават без абмеркаваньня. Гэта таксама датычыцца і вызначэньня складу ўчастковых і тэрытарыяльных камісіяў.

У той жа час у акруговыя камісіі ўвайшло дастаткова прадстаўнікоў ляяльных да рэжыму палітычных партыяў — Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі (27 сяброў камісіяў), Камуністычнай партыі Беларусі (37 сяброў), Аграрнай партыі (4), Патрыятычнай партыі (1), Сацыяльна-спартыўнай партыі (4). Дарма што гэтыя арганізацыі (акрамя ЛДП і КПБ) вылучалі толькі адзінкі сваіх прадстаўнікоў у склад акруговых камісіяў, усе яны туды патрапілі: адмоваў ім не было. Разам прадстаўнікі апазыцыйных і праўрадавых палітычных партыяў складалі блізу 7 % сьпісавага складу акруговых выбарчых камісіяў.

Іншы суб'ект выбарчага працэсу — грамадзкія аб'яднаньні — таксама шырока скарыстаўся сваім правам вылучэньня прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісіяў. Гэта датычыцца і незалежных грамадзкіх аб'яднаньняў (якія ўладамі расцэньваюцца як апазыцыйныя), і праўрадавых. І ў гэтым выпадку назіраецца тая сама тэндэнцыя: узровень адсеву прадстаўнікоў апазыцыйных арганізацыяў быў вельмі вялікі, у той час як нешматлікія праўрадавыя прэтэндэнты звычайна без пытаньняў уключаліся ў склад выбарчых камісіяў.

Так, прадзяржаўная Фэдэрацыя прафсаюзаў беларуская атрымала 80 месцаў у акруговых выбарчых камісіях, БРСМ — 94, Саюз вэтэранаў — 66, Беларускі саюз жанчын — 28. У той жа час, грамадзкае аб'яднаньне "БНФ "Адраджэньне" атрымала толькі 2 месцы ў камісіях пры наяўнасьці 35 вылучэнцаў. Беларускі Хельсынскі камітэт, які вылучыў 11 прадстаўнікоў, правёў у склад камісіяў толькі 1 чалавека. Таксама туды патрапілі некалькі прадстаўнікоў грамадзкіх аб'яднаньняў "Усебеларускае аб'яднаньне казацтва", "Беларускае таварыства чырвонага крыжа", "Беларускі саюз вэтэранаў вайны ў Аўганістане", ЛКСМБ і некаторых іншых. Агулам прадстаўнікі ўсіх грамадзкіх аб'яднаньняў склалі 20 % ад сьпісавага складу акруговых выбарчых камісіяў.

Найбольшае прадстаўніцтва ў акруговых камісіях мелі вылучэнцы ад грамадзянаў, што пражываюць на тэрыторыі дадзенай выбарчай акругі. Збольшага гэтыя вылучэнцы таксама належалі да праўладнага кола. Тыя актывісты апазыцыі, якія пайшлі шляхам збору подпісаў, найчасьцей таксама атрымлівалі адмовы. Усяго вылучэнцы грамадзянаў склалі 33,4 % ад складу камісіяў.

Такая ж самая тэндэнцыя была характэрная і для прадстаўнікоў працоўных калектываў — збольшага гэта былі прадстаўнікі дзяржаўных арганізацыяў і органаў улады, таму іх заяўкі на ўключэньне ў склад камісіяў былі задаволеныя і яны склалі 28,5 % ад агульнага складу камісіяў.

Акрамя таго, больш за 11 % сяброў акруговых выбарчых камісіяў былі наўпрост кааптаваныя органамі, якія ажыцьцяўлялі фармаваньне гэтых камісіяў, — гэта значыць органамі выканаўчай вэртыкалі. Згодна з паведамленьнем Цэнтральнай выбарчай камісіі, у складзе акруговых выбарчых камісіяў было 50 % жанчын і 9 % моладзі (асобаў да 30 гадоў).

У выніку, нягледзячы на актыўны ўдзел апазыцыйных палітычных партыяў і незалежных грамадзкіх аб'яднаньняў у кампаніі вылучэньня прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісіяў, гэтыя сілы ня толькі ня здолелі ўзяць асобныя з выбарчых камісіяў пад уласны кантроль, але нават і не атрымалі ў іх хоць нейкае істотнае прадстаўніцтва. Усе без выключэньня акруговыя выбарчыя камісіі знаходзіліся пад поўным кантролем прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі, якія фармальна вылучаліся ад праўладных палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, а пераважна — ад працоўных калектываў дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацыяў альбо шляхам збору подпісаў з выкарыстаньнем адміністрацыйнага рэсурсу. Гэта сьведчыла пра тое, што і надалей гэтая выбарчая кампанія будзе йсьці недэмакратычным чынам, пад поўным кантролем дзяржаўнай адміністрацыі, і ў некаторай ступені сталася ўскосным сыгналам пра канчатковы несправядлівы вынік гэтых выбараў.

Тэрытарыяльныя камісіі, якія не патрэбныя пры правядзеньні выбараў у парлямэнт, фактычна былі створаныя і распачалі сваю працу яшчэ да афіцыйнага абвяшчэньня рэфэрэндуму, і толькі потым адбылося іх юрыдычнае афармленьне. Правядзеньне рэспубліканскага рэфэрэндуму ажыцьцяўлялася Менскай гарадзкой, раённымі, гарадзкімі (у гарадах абласнога падпарадкаваньня) тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі, сфармаванымі падчас правядзеньня выбараў у мясцовыя Рады дэпутатаў Рэспублікі Беларусі 24-га склікаваньня, прадстаўнікоў апазыцыі ў іх складзе амаль не было. Толькі ў адной з абласных тэрытарыяльных каімісіяў працаваў прадстаўнік ад апазыцыйнай Партыі камуністаў Беларускай (Гомельская абласная камісія). Тыя з тэрытарыяльных камісіяў, склад якіх павінен быў фармавацца нанава (раённыя ў гарадах з раённым падзелам), былі створаныя таксама амаль на 100 % з прадстаўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацыяў — у склад гэтых 24 камісіяў быў уключаны толькі адзін прадстаўнік ПКБ. Аналягічная сытуацыя існавала ў раённых і гарадзкіх (гарадах абласнога падпарадкаваньня) камісіях для правядзеньня рэспубліканскага рэфэрэндуму. Акрамя таго, трэба ўлічваць, што праца тэрытарыяльных камісіяў дублявалася працай раённых і гарадзкіх "штабоў", створаных у органах мясцовай выканаўчай улады. Таксама і на абласным узроўні існавалі каардынацыйныя групы для арганізацыі рэфэрэндуму і зьвязанай зь ім інфармацыйнай працы, падпарадкаваныя "кантралёрам" зь Менску (напрыклад, працу інфармацыйна-арганізацыйнай групы па Гарадзенскай вобласьці курыраваў Віктар Шэйман).

У Беларусі было створана 6659 выбарчых участкаў (у тым ліку 40 участкаў за межамі Беларусі) і, адпаведна, столькі ж участковых камісіяў. Згодна з пастановай Цэнтральнай

камісіі ад 8 верасьня 2004 г. № 66 участковыя камісіі пры правядзеньні выбараў і рэфэрэндуму былі супольнымі і для выбараў, і для рэфэрэндуму. Усяго ў склад участковых выбарчых камісіяў было ўключана 72 350 чалавек, зь іх 50,6 % былі вылучаныя ад грамадзянаў, 36,4 % — ад працоўных калектываў, 5 % былі дэлегаваныя органамі выканаўчай і прадстаўнічай улады, што стваралі камісіі. Палітычныя партыі і грамадзкія аб’яднаньні атрымалі 7 % месцаў (тая ж самая прапорцыя, што і з акруговымі камісіямі), аднак апазыцыйныя партыі і арганізацыі тут мелі толькі каля 0,2 % месцаў. У параўнаньні зь мінулымі парлямэнцкімі выбарамі склад участковых выбарчых камісіяў быў абноўлены на 32 %.

Вылучэньне прадстаўнікоў ува ўчастковыя камісіі ладзілася апазыцыйнымі сіламі ня так масава, як вылучэньне ў акруговыя камісіі: у большасьць участковых камісіяў прадстаўнікі апазыцыі нават і не спрабавалі вылучацца. Гэта зьвязана з тым, што фармаваньне акруговых камісіяў прадэманстравала марнасьць гэтых намаганьняў, а таксама і з простым недахопам кваліфікаваных партыйных кадраў. Некаторыя з арганізацыйных структураў апазыцыйных палітычных партыяў увогуле ўхіліліся ад вылучэньня сваіх прадстаўнікоў у склад участковых камісіяў. Усяго апазыцыйнымі партыямі і грамадзкімі аб’яднаньнямі ў склад выбарчых камісіяў было вылучана больш за 2000 чалавек, зь якіх у склад участковых камісіяў патрапілі толькі каля 140. Напрыклад, ад партыі АГП было вылучана 472 кандыдаты ў склад участковых камісіяў 14 акруг, разьмешчаных у горадзе Менску, аднак ніхто зь іх у склад камісіяў не прайшоў. У Жодзінскай выбарчай акрузе № 81 прадстаўнікі АГП былі вылучаныя ў склад 20 участковых камісіяў з 53 камісіяў, — ніхто зь іх не прайшоў. Усяго з 709 прадстаўнікоў, вылучаных АГП, у склад участковых камісіяў патрапілі толькі 27 чалавек, зь іх 15 — па адной з акругаў у Віцебскай вобласьці, а таксама ў дзьвюх іншых акругах — у адным выпадку 5, у другім — 7 прадстаўнікоў. Такая сытуацыя характэрная і для вылучэнцаў ад іншых апазыцыйных палітычных партыяў. Пры гэтым матываў адмоваў, як і ў выпадку з фармаваньнем акруговых камісіяў, у большасьці выпадкаў пададзена не было.

Адметна, што ўлады, насуперак патрабаваньням заканадаўства, зрабілі маладаступнай інфармацыю аб складзе ўчастковых выбарчых камісіяў. Дзяржаўныя рэгіянальныя газэты, якія павінны былі зьмясьціць інфармацыю аб складзе ўчастковых камісіяў ува ўсіх абласьцях краіны, выйшлі зьніжаным накладам, іх не атрымалі падпісчыкі і бібліятэкі. Напрыклад, газэта “Няміга”, якую выдае адміністрацыя Цэнтральнага раёну Менску, выпусьціла нумар з складам участковых камісіяў накладам 200 асобнікаў, а нумар, дзе ажыцьцяўлялася агітацыя за праўладных кандыдатаў, — накладам у некалькі тысяч.

У вялікай колькасьці выпадкаў участковыя выбарчыя камісіі былі створаныя з прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыву. Прыкладам такога кшталту “аўтаномных” камісіяў можа быць участковая камісія 516-га ўчастку Ўсходняй выбарчай акругі № 107 у Менску: усе сябры ўчастковай камісіі былі супрацоўнікамі Менскага дзяржаўнага гандлёвага каледжу, кіраўніком камісіі быў завуч гэтага каледжу, то бок іх беспасярэдні адміністрацыйны начальнік, а дырэктар гэтай навучальнай установы быў… даверанай асобай кандыдата ад улады. З улікам таго, што на дадзеным участку вялікая колькасьць выбарцаў былі навучэнцамі каледжу, робіцца зразумелай наяўнасьць шырокіх магчымасьцяў для адміністрацыйнага ціску як на выбарцаў, так і на сяброў камісіі.

Такім чынам, і ўчастковыя камісіі, якія выконваюць асноўную працу для арганізацыі галасаваньня, былі цалкам кантраляваныя ўладамі. Гэта дазволіла бесьперашкодна выкарысто-

ўваць падрыхтаваныя загадзя адміністрацыйныя мэханізмы дасягненьня патрэбнага выніку выбараў і рэфэрэндуму, вялікая частка якіх супярэчыла патрабаваньням заканадаўства.

## Вылучэньне і рэгістрацыя кандыдатаў

Вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты парлямэнту, згодна зь беларускім заканадаўствам, можа ажыцьцяўляцца трыма шляхамі: рашэньнем вышэйшага органу палітычнай партыі пры наяўнасьці на тэрыторыі акругі зарэгістраваных альбо пастаўленых на ўлік партыйных структураў; шляхам збору 1000 подпісаў грамадзянаў, што пражываюць на тэрыторыі акругі; вылучэньнем ад працоўнага калектыву прадпрыемства, што месьціцца на тэрыторыі акругі.

Выбары дэпутатаў палаты прадстаўнікоў 3-га скліканьня ў 2004 г. адрозьніваліся ад выбараў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня 2000 г. тым, што аб'яднаная апазыцыя была настроеная на актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі. У параўнаньні зь мінулымі парлямэнцкімі выбарамі 2000 г., якія апазыцыя байкатавала, колькасьць заяўленых ініцыятыўных групаў для збору подпісаў істотна вырасла, з 488 да 635. Таму і ўладам трэба было павялічыць жорсткасьць выбарчага працэсу, стварыўшы дадатковыя абмежаваньні для ўдзелу апазыцыйных кандыдатаў у выбарах. Адным з такіх крокаў было стварэньне перашкодаў у рэгістрацыі ініцыятыўных групаў грамадзянаў для вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў.

Працэс рэгістрацыі ініцыятыўных групаў суправаджаўся ціскам на іх сяброў і прэтэндэнтаў у кандыдаты. Гэта стала прычынай выхаду людзей з удзелу ў ініцыятыўных групах апазыцыйных кандыдатаў, што цягнула за сабой адмову ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Вынікам гэтай сплянаванай кампаніі стаў даволі вялікі адсотак адмоваў у рэгістрацыі ініцыятыўных групаў незалежных кандыдатаў ці сяброў дэмакратычных палітычных партыяў. Напрыклад, шэраг навучэнцаў Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту пад ціскам з боку адміністрацыі навучальнай установы былі вымушаныя адмовіцца ад удзелу ў выбарчай кампаніі, што пацягнула за сабой нерэгістрацыю ініцыятыўнай групы сябра АГП Генадзя Воранава. У Барысаве прадстаўнік Партыі БНФ Сяргей Салаш і сябра АГП Леў Марголін спачатку спрабавалі зарэгістраваць ініцыятыўныя групы даволі вялікага колькаснага складу, аднак, сутыкнуўшыся зь ціскам на сваіх прыхільнікаў, былі вымушаныя перазаявіць ініцыятыўныя групы меншага складу. Акруговыя камісіі адмовілі ў рэгістрацыі 71 ініцыятыўнай групе, зь якіх 31 была створаная для вылучэньня ў якасьці кандыдата сябра апазыцыйнай палітычнай партыі (табл. 2). Такім чынам, было адмоўлена ў рэгістрацыі 11,5 % ініцыятыўных групаў (для параўнаньня: падчас парлямэнцкіх выбараў 2000 г. адмоўлена ў рэгістрацыі толькі 13, што склала 4,5 % ад агульнай колькасьці). Такія дзеяньні ўладаў сталіся неспадзяванкай для апа-

**Табліца 2.** Вынікі рэгістрацыі апазыцыйных ініцыятыўных групаў

| | Партыя БНФ | АГП | ПКБ | БСДП (НГ) | Партыя працы | БСДГ | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Заяўлена | 38 | 54 | 24 | 50 | 6 | 16 | 188 |
| Зарэгістравана | 32 | 51 | 21 | 35 | 5 | 13 | 157 |
| Адмоўлена | 6 | 3 | 3 | 15 | 1 | 3 | 31 |

Паводле зьвестак Праваабарончага цэнтру "Вясна"

зыцыйных актывістаў, і большасьць зь іх ня здолелі дамагчыся аднаўленьня рэгістрацыі ўласных ініцыятыўных групаў. Толькі 5 ініцыятыўных групаў здолелі зарэгістравацца праз абскарджаньне ў Цэнтральнай камісіі.

Усяго было створана (зарэгістравана) 558 ініцыятыўных групаў. Аднак, згодна з дадзенымі Цэнтральнай камісіі, толькі 81 кандыдат быў зарэгістраваны такім спосабам вылучэньня. Такі вялікі адсотак адсеву тлумачыцца, па-першае, тым, што большасьць сяброў палітычных партыяў, якія зьбіралі подпісы, выкарысталі сваё права на партыйнае вылучэньне; па-другое, вялікая колькасьць адмоваў у рэгістрацыі ў якасьці кандыдатаў прыпадае менавіта на гэты спосаб вылучэньня празь цяжкасьць ці амаль немагчымасьць пракантраляваць вынікі праверкі подпісаў. Працэдура праверкі подпісаў урэгуляваная заканадаўствам такім чынам, што стварае магчымасьць для адвольнага і нематываванага прызнаньня несапраўднымі подпісаў, пастаўленых на карысьць кандыдата. Нават калі людзі пасьля прыходзілі ў суд і пераконвалі судзьдзю ў тым, што гэты подпіс яны паставілі ўласнаручна, адмову ў рэгістрацыі кандыдата не скасоўвалі. Іншыя прычыны адмовы ў рэгістрацыі (у тым ліку за падаваньне нібыта несапраўдных зьвестак у дэклярацыі пра даходы і маёмасьць, што было другой шырока ўжыванай падставай) у шэрагу выпадкаў былі прызнаныя Цэнтральнай камісіяй неабгрунтаванымі, дастаткова вялікая колькасьць кандыдатаў праз абскарджаньне ў Цэнтральнай камісіі былі зарэгістраваныя: у якасьці кандыдатаў былі зарэгістраваныя сябры партыі БНФ Юры Губарэвіч і Юры Хадыка, вылучэнцы партыі АГП Мікалай Гаўрыленка і Іван Анташкевіч, вылучэнец БСДГ Мечыслаў Грыб, вылучэнец незадоўга перад гэтым ліквідаванай Партыі працы Генадзь Фядыніч, лідэр групы “Рэспубліка” Валеры Фралоў.

Працэс вылучэньня кандыдатаў ад палітычных партыяў выклікаў масавыя праверкі іх рэгіянальных структураў, у выніку якіх былі ліквідаваныя: у АГП — 10, Партыі БНФ — 2, ПКБ — 8, БСДП (НГ) — 10 такіх структураў, што паслужыла падставай для нерэгістрацыі вылучаных кандыдатаў. Асноўная прычына ліквідацыяў — незнаходжаньне структураў па юрыдычным адрасе ці парушэньні пры атрыманьні юрыдычных адрасоў. Найчасьцей арганізацыйныя структуры ліквідоўваліся за некалькі дзён да заканчэньня рэгістрацыі кандыдатаў альбо непасрэдна ў апошні дзень рэгістрацыі — 16 верасьня 2004 г. У прыватнасьці, праз скасаваньне партыйнай структуры ня здолеў вылучыцца актывіст БСДП (НГ) Андрэй Казановіч з Салігорску. Ліквідацыя Партыі працы напярэдадні выбараў пазбавіла яе прадстаўнікоў магчымасьці вылучацца ад сваёй арганізацыі — для іх застаўся толькі шлях збору подпісаў.

Па рэгістрацыі кандыдатаў ад дэмакратычных партыяў акруговымі камісіямі не былі дапушчаныя да ўдзелу ў выбарчай кампаніі больш за 40 % вылучаных партыямі кандыдатаў.

**Табліца 3.** Вынікі рэгістрацыі сяброў апазыцыйных палітычных партыяў партыйным вылучэньнем і шляхам збору подпісаў выбарцаў*

| | Партыя БНФ | АГП | ПКБ | БСДП (НГ) | БСДГ | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Вылучана | 52 | 59 | 38 | 26 | 19 | 227 |
| Зарэгістравана | 30** | 27 | 24 | 21 | 3 | 136 |
| Адмоўлена | 15 | 32 | 14 | 21 | 11 | 96 |

Паводле зьвестак праваабарончага цэнтру “Вясна”

* Без уліку зьняцьця кандыдатаў акруговымі камісіямі альбо рэгістрацыі рашэньнем Цэнтральнай камісіі.

** 4 сябры партыі зьнялі свае кандыдатуры.

Як паказалі вынікі абскраджаньня адмоваў у рэгістрацыі ў Цэнтральнай камісіі, пераважная колькасьць нематываваных адмоваў прыпадала на прадстаўнікоў дэмакратычных палітычных партыяў. Усяго ў Цэнтральную камісію было пададзена 164 скаргі на адмову ў рэгістрацыі. З 44 рашэньняў Цэнтральнай камісіі аб рэгістрацыі кандыдатаў, якім папярэдне было адмоўлена акруговымі камісіямі, 33 датычыліся аднаўленьня рэгістрацыі партыйных кандыдатаў. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, у якасьці кандыдатаў у дэпутаты акруговымі камісіямі было зарэгістравана: ад Партыі БНФ — 24 кандыдаты, ад АГП — 26, ад ПКБ — 21, ад БСДП (НГ) — 25, ад БСДГ — 8 (без уліку вылучэньня шляхам збору подпісаў). Агулам шляхам партыйнага вылучэньня было зарэгістравана 104 кандыдаты ад апазыцыйных палітычных партыяў. Пасьля абскарджаньня ў Цэнтральнай камісіі колькасьць вылучэнцаў ад апазыцыйных партыяў павысілася і склала: ад Партыі БНФ — 30 кандыдатаў, ад АГП — 37, ад ПКБ — 30, ад БСДП (НГ) — 28, ад БСДГ — 11. Праўладная ЛДП, якая вылучала 107 кандыдатураў, здолела дамагчыся рэгістрацыі 38 зь іх (пазьней некаторыя былі зьнятыя на карысьць іншых праўладных кандыдатаў), КПБ вылучыла 15 чалавек, зь якіх 5 былі зарэгістраваныя. Агульная колькасьць партыйных вылучэнцаў пасьля абскарджаньня ў Цэнтральнай камісіі склала 186 кандыдатаў, зь якіх 136 прадстаўлялі палітычныя партыі апазыцыйнага спэктру — ад нацыянал-дэмакратаў да камуністаў. Абскарджаньне адмовы рэгістрацыі ў Вярхоўным судзе (пасьля незадавальненьня скаргі на нерэгістрацыю ў Цэнтральнай камісіі) ня стала эфэктыўным сродкам аднаўленьня кандыдатаў.

Шляхам вылучэньня ад працоўных калектываў было зарэгістравана 139 кандыдатаў у дэпутаты (у тым ліку 2 кандыдаты рашэньнем Цэнтральнай камісіі), што склала 32,2 % ад агульнай колькасьці кандыдатаў. Дадзены шлях вылучэньня найбольш часта выкарыстоўваўся для вылучэньня кандыдатаў ад улады. Улічваючы фактычна татальную кантрактызацыю работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў, сходы для вылучэньня кандыдатаў у дэпутаты ад працоўных калектываў праходзілі ў асноўным з аднагалосным галасаваньнем за прапанаванага кандыдата і фактычна былі праявай выкарыстаньня адміністрацыйнага рэсурсу. Пры такім спосабе вылучэньня парушаўся прынцып свабоднага ўдзелу ў выбарах.

Усяго былі пададзеныя дакумэнты на рэгістрацыю 692 прэтэндэнтаў у кандыдаты, зь іх акруговымі камісіямі зарэгістравана ў якасьці кандыдатаў — 359 (51,88 %), адмоўлена ў рэгістрацыі — 312 (45,09 %), частка прэтэндэнтаў адмовілася ад удзелу ў выбарах. Паказьнік значна вышэйшы за той, які быў зафіксаваны на парлямэнцкіх выбарах 2000 г., калі было адмоўлена менш чым 29 % прэтэндэнтаў.

Пасьля падвядзеньня вынікаў вылучэньня і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты высьветлілася, што ў 8 акругах (7,27 % ад агульнай колькасьці) выбары адбудуцца на безальтэрнатыўнай аснове, бо зарэгістраваны толькі адзін кандыдат — натуральна, ад адміністрацыйнага сьпісу. Збольшага безальтэрнатыўнасьць характэрная была для Гомельскага рэгіёну.

Зь ліку наяўных кааліцыяў апазыцыйных сілаў найбольшую актыўнасьць праявілі кандыдаты ад Народнай кааліцыі “5+”, меншую — кандыдаты ад Эўрапейскай кааліцыі “Свабодная Беларусь”. Кандыдаты ад праўладных партыяў (напрыклад ад ЛДП) вылучаліся шырока, аднак збольшага не разьлічвалі на перамогу. У шэрагу акругаў кандыдаты ад адміністрацыйнага сьпісу ішлі парамі, для стварэньня бачнасьці плюралізму і дэмакратыі, аднак у далейшым часта заставаўся нехта адзін. Улады шырока выкарыстоўвалі кандыдатаў, скіраваных на адцягваньне галасоў у апазыцыйных вылучэнцаў. Калі ж у такіх выпадках апазыцыянэра здымалі з выбарчай гонкі — здымаўся таксама і праўладны кандыдат-дублёр. Падчас

агітацыйнай кампаніі дадзеныя з колькасьцю зарэгістраваных кандыдатаў зьмяніліся ў бок памяншэньня з прычыны актыўнага выкарыстаньня акруговымі камісіямі працэдуры зьняцьця кандыдатаў. Таму ня ўсе з зарэгістраваных кандыдатаў патрапілі ў выбарчыя бюлетэні, а некаторыя былі зьнятыя з выбарчай гонкі ўжо падчас датэрміновага галасаваньня (яны былі выкрасьленыя зь бюлетэняў).

Што датычыцца вылучэньня ў якасьці кандыдатаў дзейных дэпутатаў палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня, то з 67 заяваў 10 дэпутатаў атрымалі адмовы. Гэта зьвязана з тым, што шэраг дэпутатаў, якія ня здолелі патрапіць у адміністрацыйны сьпіс (а гэта і дэпутаты апазыцыйнай групы “Рэспубліка”, і дэпутаты-бізнэсоўцы, і інш.), усё ж такі паспрабавалі высунуць свае кандыдатуры, насуперак волі прэзыдэнцкай адміністрацыі (напрыклад, былы лідэр БПСМ Усевалад Янчэўскі, западозраная ў “рэспубліканізьме” Надзея Цыркун, прадпрымальнік Юры Марозаў). У якасьці кандыдатаў было зарэгістравана 57 дзейных парлямэнтароў (уключна з прадстаўніком апазыцыйнай групы “Рэспубліка” Валер’ем Фраловым). Парлямэнт пазбавілі ад парлямэнтароў-бізнэсоўцаў: згодна з воляй Лукашэнкі, адмовіліся ад парлямэнцкай гонкі дэпутаты Аляксей Ваганаў, Андрэй Нарэйка, Уладзімер Александровіч. Увогуле, пасьля рэгістрацыі кандыдатаў стала зразумела, што вынік выбараў будзе цалкам адпавядаць пажаданьням Лукашэнкі бачыць у складзе парлямэнту пэўнае прадстаўніцтва жанчын, моладзі і былых парлямэнтароў і ня бачыць там бізнэсоўцаў.

Афіцыйныя зьвесткі пра рэгістрацыю кандыдатаў ад Цэнтральнай выбарчай камісіі паводле стану на 4 кастрычніка (гэта значыць пасьля заканчэньня тэрміну абскарджаньня адмоваў у рэгістрацыі, але без уліку зьняцьця кандыдатаў у ходзе агітацыйнай кампаніі) зьведзеныя ў табліцы 4–8.

Этап вылучэньня кандыдатаў і збору подпісаў грамадзянаў характарызаваўся жорсткім ціскам з боку выканаўчых уладаў і выбарчых камісіяў як на саміх кандыдатаў, так і на сяброў іх ініцыятыўных групаў, а таксама выбарцаў, якія паставілі свае подпісы за іх вылучэньне. Улады ў гэтым выпадку выкарыстоўвалі ня толькі знаёмы з ранейшых кампаніяў “фільтар” неабгрунтаваных адмоваў у рэгістрацыі кандыдатаў, але таксама адмаўляліся рэгістраваць ініцыятыўныя групы. Таксама сродкам ціску на апазыцыйных кандыдатаў стала

**Табліца 4.** Агульная колькасьць зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты*

| Рэгіён | Вылучаныя кандыдатамі | Адмоўлена ў рэгістрацыі | Зарэгістравана кандыдатамі |
|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 100 | 25 | 68 |
| Віцебская вобл. | 95 | 31 | 61 |
| Гомельская вобл. | 92 | 48 | 44 |
| Гарадзенская вобл. | 79 | 33 | 36 |
| Менская вобл. | 111 | 40 | 71 |
| Магілёўская вобл. | 84 | 37 | 47 |
| Менск | 131 | 51 | 76 |
| Усяго па краіне | 692 | 265 | 403 |

* Частка прэтэндэнтаў ў кандыдаты была зарэгістравана рашэньнем ЦВК, таму зьвесткі адрозьніваюцца ад прыведзеных на с.238; некалькі прэтэндэнтаў адмовіліся ад удзелу ў выбарах.

**Табліца 5.** Колькасьць зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты па рэгіёнах

| Рэгіён | Ад працоўных калектываў | Ад грамадзянаў шляхам збору подпісаў | Ад палітычных партыяў |
|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 18 | 19 | 31 |
| Віцебская вобл. | 18 | 18 | 28 |
| Гомельская вобл. | 18 | 3 | 23 |
| Гарадзенская вобл. | 17 | 7 | 12 |
| Менская вобл. | 29 | 15 | 27 |
| Магілёўская вобл. | 19 | 9 | 19 |
| Менск | 20 | 10 | 46 |
| Усяго па краіне | 139 | 81 | 186 |

**Табліца 6.** Колькасьць зарэгістраваных вылучэнцаў палітычных партыяў*

| Рэгіён | Партыя БНФ | БСДП (НГ) | ПКБ | КПБ | БСДГ | ЛДПБ | АГП | СД ПНЗ | РП |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 8 | 5 | 6 | 0 | 7 | 5 | 3 | 1 | 0 |
| Віцебская вобл. | 4 | 9 | 6 | 0 | 1 | 4 | 1 | 0 | 0 |
| Гомельская вобл. | 3 | 1 | 8 | 1 | 1 | 2 | 5 | 2 | 0 |
| Гарадзенская вобл. | 1 | 0 | 4 | 0 | 0 | 3 | 3 | 1 | 0 |
| Менская вобл. | 5 | 5 | 2 | 2 | 0 | 6 | 7 | 0 | 0 |
| Магілёўская вобл. | 1 | 2 | 1 | 1 | 2 | 7 | 5 | 0 | 0 |
| Менск | 8 | 6 | 3 | 1 | 4 | 1[illegible] | 10 | 0 | 3 |
| Усяго па краіне | 30 | 28 | 30 | 5 | 11 | 38 | 37 | 3 | 3 |

**Табліца 7.** Сацыяльны склад кандыдатаў у дэпутаты

| Рэгіён | Жанчыны | Маладзей за 30 гадоў | Раней былі дэпутатамі |
|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 13 | 3 | 10 |
| Віцебская вобл. | 15 | 1 | 8 |
| Гомельская вобл. | 8 | 3 | 8 |
| Гарадзенская вобл. | 9 | 2 | 5 |
| Менская вобл. | 16 | 9 | 10 |
| Магілёўская вобл. | 8 | 1 | 7 |
| Менск | 11 | 5 | 9 |
| Усяго па краіне | 80 | 24 | 57 |

* Згодна з пэўнымі крыніцамі, ад СДП НЗ балятаваліся ня 3, а 4 кандыдаты, ад АГП у Віцебскай вобласьці балятаваліся, прынамсі, 5 кандыдатаў.

Андрэй Казакевіч налічыў 12 вылучэнцаў ад БСДГ у аналізе “Палітычная кампанія апазыцыі ў 2004 г.” на той падставе, што ў гарадзенскай акрузе №52 выбары сьпярша не адбыліся, але ў іх удзельнічаў вылучэнец БСДГ. Згодна з атрыманай гэтым аўтарам інфармацыяй, у Менску ад партыі балятаваўся толькі Аляксей Кароль у акрузе № 85. — ***Рэд.***

**Табліца 8.** Прафэсійны склад кандыдатаў у дэпутаты

| Рэгіён | Прадстаўнікі прамысловасьці, транспарту, сувязі | Прадстаўнікі сельскай гаспадаркі | Прадстаўнікі адукацыі, культуры, навукі | Прадстаўнікі ахоўы здароўя і сацыяльнай абароны | Прадстаўнікі гандлю і бытавога абслугоўваньня | Прадстаўнікі дзяржаўных органаў | Кіраўнікі праваахоўных органаў | Прадпрымальнікі | Беспрацоўныя | Іншыя |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 7 | 2 | 9 | 10 | 0 | 0 | 2 | 13 | 9 | 6 |
| Віцебская вобл. | 7 | 4 | 11 | 1 | 0 | 3 | 1 | 5 | 6 | 16 |
| Гомельская вобл. | 10 | 1 | 7 | 2 | 0 | 5 | 1 | 2 | 3 | 6 |
| Гарадзенская вобл. | 2 | 1 | 5 | 3 | 0 | 3 | 2 | 5 | 5 | 5 |
| Менская вобл. | 11 | 0 | 9 | 4 | 0 | 7 | 1 | 10 | 5 | 14 |
| Магілёўская вобл. | 5 | 2 | 6 | 6 | 1 | 1 | 0 | 9 | 4 | 6 |
| Менск | 5 | 0 | 10 | 8 | 3 | 4 | 0 | 2 | 5 | 33 |
| Усяго па краіне | 47 | 10 | 57 | 34 | 4 | 23 | 7 | 46 | 37 | 86 |

ліквідацыя структураў апазыцыйных палітычных партыяў. Тактычным крокам уладаў была арыентацыя на рэгістрацыю лідэраў апазыцыйных рухаў і партыяў і знакавых партыйных пэрсонаў, у той час як лідэры грамадзкай думкі на месцах і іншыя “праходныя кандыдаты” часта атрымлівалі адмову ў рэгістрацыі альбо былі пазьней зьнятыя за ўяўныя парушэньні.

У справе вылучэньня праўладных кандыдатаў назіралася канкурэнцыя паміж вылучэнцамі, вызначанымі ў цэнтры, і мясцовымі кандыдатамі. У абсалютнай большасьці выпадкаў вылучэнцы ад мясцовых элітаў былі вымушаныя саступіць першым кандыдатам, часам нават і не з сваёй волі.

## Агітацыйная кампанія

Агітацыйная кампанія для кандыдатаў ажыцьцяўлялася з моманту іх рэгістрацыі ў якасьці кандыдата і да 16 кастрычніка ўключна. Агітацыя па рэфэрэндуме была дазволеная таксама да 16 кастрычніка. І ў першым, і ў другім выпадках заканадаўчыя нормы значна абмежавалі магчымасьці для бесьперашкоднага вядзеньня агітацыі ўсімі суб’ектамі выбарчага працэсу. Да таго ж незаконныя, а часам і злачынныя практыкі стварылі ўмовы для несправядлівага вядзеньня агітацыйнай кампаніі, з актыўным выкарыстаньнем адміністрацыйнага рэсурсу ў розных формах. Таксама для пэрыяду агітацыйнай кампаніі было характэрна, што адносіны кандыдатаў да рэфэрэндуму і асабіста да Лукашэнкі мелі большае значэньне, чым іх палітычная праграма і нават іх дачыненьне да апазыцыйных сілаў.

Агітацыя ўключае ў сябе свабоду агітаваць як “за”, так і “супраць” кожнага з кандыдатаў, свабоду абмяркоўваць праграмы кандыдатаў, іх палітычныя, спраўныя і асабістыя якасьці. Перадвыбарная агітацыя — дзейнасьць грамадзянаў Беларусі, палітычных партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў, працоўных калектываў, кандыдатаў, іх давераных асобаў, ініцыятыўных групаў,

што ажыцьцяўляюць збор подпісаў для вылучэньня кандыдатаў, якая мае на мэце заахвоціць выбарцаў да ўдзелу ў выбарах, да галасаваньня за тых альбо іншых кандыдатаў ці супраць іх. Такім чынам, перадвыбарная агітацыя за кандыдата дазваляецца ня толькі з моманту пачатку агітацыйнай кампаніі, гэта значыць з моманту рэгістрацыі кандыдата, але і на этапе збору подпісаў. Аднак ажыцьцяўленьне перадвыбарнай агітацыі да абвяшчэньня выбарчай кампаніі разглядалася акруговымі камісіямі як парушэньне і цягнула за сабой папярэджаньне альбо адмову ў рэгістрацыі (напрыклад, прадстаўніку Партыі БНФ Яраславу Берніковічу з Глыбокага). Шэрагу кандыдатаў рэгістрацыя была адмененая за агітацыю да афіцыйнай рэгістрацыі ў якасьці кандыдатаў. У дзень выбараў ажыцьцяўленьне агітацыі забароненае, у тым ліку і заклікі да ігнараваньня выбараў, таму пэрыяд агітацыйнай кампаніі заканчваецца апоўначы напярэдадні асноўнага дня выбараў. Гэта значыць, што падчас пашыранага ў Беларусі датэрміновага галасаваньня ажыцьцяўленьне агітацыі зьяўляецца законным, аднак улады трактавалі гэтую норму адвольна: міліцыянты затрымлівалі распаўсюднікаў улётак на той падставе, што быццам бы падчас датэрміновага галасаваньня агітацыя забароненая, адначасова вялася найактыўнейшая агітацыя з боку рэжыму за рэфэрэндум і за праўладных кандыдатаў.

Агітацыю за кандыдата могуць ажыцьцяўляць ня толькі сам кандыдат і ягоныя давераныя асобы, але таксама ўсе грамадзяне, палітычныя партыі і грамадзкія аб'яднаньні, працоўныя калектывы. У агітацыі, прамой ці ўскоснай, ня маюць права прымаць удзел сябры выбарчых камісіяў і замежныя грамадзяне, а таксама замежныя арганізацыі. У дачыненьні да пытаньняў рэфэрэндуму гэтае правіла груба парушалася дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі, якія актыўна зьмяшчалі выступы расейскіх палітыкаў у падтрымку рэфэрэндуму.

Заканадаўства вызначае формы для рэалізацыі права кандыдата, ягоных давераных асобаў і іншых грамадзянаў на вядзеньне агітацыі: на сходах і мітынгах, на сустрэчах з выбарцамі і падчас іншых перадвыбарных мерапрыемстваў, праз разьмяшчэньне інфармацыі ў мэдыях і распаўсюджваньне іншых друкаваных агітацыйных матэрыялаў.

У правядзеньні перадвыбарных сходаў і мітынгаў, іншых сустрэчаў з выбарцамі кандыдаты ад апазыцыйных сілаў былі абмежаваныя нормамі закону пра масавыя мерапрыемствы, які патрабаваў падаваць заяўку на правядзеньне мерапрыемства за 15 дзён да падзеі. Зь іншага боку, для праўладных кандыдатаў шырока ладзіліся афіцыйныя сьвяткаваньні: разнастайныя "дні раёну", канцэрты і іншыя забаўляльна-палітычныя дзеі (напрыклад, падобныя мерапрыемствы ладзіліся у Менску ў падтрымку Ўладзімера Крука). Увогуле, пытаньне арганізацыі сустрэчаў кандыдатаў з выбарцамі апынулася ў поўнай залежнасьці ад пазыцыі акруговай камісіі і мясцовай адміністрацыі.

Што да друкаваных матэрыялаў, то апазыцыйныя кандыдаты былі моцна абмежаваныя ў іх вырабе. Акрамя таго што выдзеленыя для агітацыі дзяржаўныя сродкі былі мізэрныя (50 базавых адзінак — на той момант блізу 450 даляраў ЗША), нават улёткі на гэтыя сродкі надрукаваць было цяжка: шмат якія друкарні адмаўляліся праз ціск і пагрозы з боку органаў кантролю, а часам і надрукаваныя афіцыйна наклады ўлётак канфіскоўваліся праваахоўнымі органамі. Увогуле, у дачыненьні да друкаваных матэрыялаў і газэтаў з боку праваахоўных органаў была выразная пазыцыя — спыняць распаўсюд і канфіскоўваць усё бяз розьніцы: і легальныя, і нелегальныя ўлёткі, і з выходнымі зьвесткамі, і без выходных зьвестак, і зарэгістраваныя, і незарэгістраваныя газэты. Зь іншага боку, агітацыйная друкаваная прадукцыя на карысьць праўладных кандыдатаў распаўсюджвалася бесьперашкодна і нават зь перавышэньнем сродкаў, выдзеленых на агітацыю (напрыклад, у выглядзе гэтак званых спра-

вздачаў пра дэпутацкую дзейнасьць для дэпутатаў палаты прадстаўнікоў 2-га скліканьня, такіх, як Вольга Абрамава ў Менску).

Прыціснутыя да сьцяны, апазыцыйныя кандыдаты былі вымушаныя праводзіць агітацыю з пастаяннай рызыкай быць зьнятымі, карыстаючыся нелегальна выпушчанымі ўлёткамі, дадатковымі накладамі ўлётак легальнага ўзору і агітацыйнымі матэрыяламі Народнай кааліцыі “5+” (часта гэта прыводзіла да зьняцьця кандыдатаў зь перадвыбарнай гонкі, як адбылося з намесьнікам старшыні Партыі БНФ Аляксеем Янукевічам). Зафіксаваныя выпадкі, калі распаўсюджвалася фальшывая агітацыйная прадукцыя ад імя апазыцыйных кандыдатаў з мэтай абвінавачаньня ў парушэньнях. Такія выпадкі зафіксаваныя ў Берасьці (пацярпеў Зьміцер Шыманскі), Горадні, Менску (у прыватнасьці, праз падробленыя ўлёткі, распаўсюджаныя нібыта ад імя кандыдата, была скасаваная рэгістрацыя намесьніка старшыні Партыі БНФ Алеся Міхалевіча па Ўруцкай выбарчай акрузе № 109). Тыя кандыдаты, якія былі зарэгістраваныя па скаргах у Цэнтральную камісію (а гэта, вядома, збольшага прадстаўнікі апазыцыйных партыяў), былі вымушаныя пачаць перадвыбарную агітацыю пазьней за сваіх канкурэнтаў.

Асабліва навязьліва і шырока вялася агітацыя ў падтрымку пытаньня, вынесенага на рэфэрэндум. Балазе на яго не пашыралася абмежаваньне ў сродках, на дзяржаўныя грошы ды грошы дзяржаўных і фармальна “прыватных” прадпрыемстваў разьмяшчалася шыкоўная рэкляма ў выглядзе біг-бордаў і каляровых плякатаў. Асобным крокам была дастаўка ў кожную беларускую паштовую скрыню асобніка выдадзенай шматмільённым накладам “Советской Белоруссии”, спэцвыпуск якой быў заклікаНы пераканаць чытача ў неабходнасьці выказаць падтрымку ініцыятыве Лукашэнкі. У той жа час друкаваныя матэрыялы супраць рэфэрэндуму распаўсюджваць было вельмі складана: міліцыя рэагавала на іх нават больш жорстка, чым на агітацыйныя матэрыялы апазыцыйных кандыдатаў.

Што ж датычыцца стратэгіі апазыцыі падчас агітацыйнай кампаніі, то яна ня можа быць ацэненая адназначна. З аднаго боку, паўстаньне шматбаковай кааліцыі “5+” і раскрутка адзінага брэнду прывяла да пэўнага посьпеху: апазыцыйныя кандыдаты асацыяваліся з супольнай праграмай, якая займела пэўную вядомасьць у грамадзтве. Перавага кааліцыі была ў дэцэнтралізацыі, аднак менавіта з прычыны дэцэнтралізацыі яна ня склалася ў адзіную агульнанацыянальную кампанію процідзеяньня антыканстытуцыйным памкненьням дзейнага прэзыдэнта. Правядзеньне 110 з плюсам супрацьрэфэрэндумных кампаніяў аказалася малаэфэктыўным. Збольшага ўся супрацьрэфэрэндумная агітацыя залежала ад пазыцыі самога кандыдата на дадзенай акрузе: ён і ягоная каманда маглі весьці актыўную агітацыю супраць пытаньня, вынесенага на рэфэрэндум, як гэта рабіў прадстаўнік Партыі БНФ Сяргей Салаш; пазыцыянаваць сябе як пасьлядоўнага антылукашыста, як гэта рабіў прадстаўнік Партыі БНФ Аляксей Янукевіч; папросту ператварыць свой тэлевізійны выступ у палымяную прамову супраць Лукашэнкі, як гэта зрабіў прадстаўнік АГП Яўген Лабановіч; зусім не заўважаць пытаньня рэфэрэндуму.

Улады, як і падчас выбараў 2001 г., выкарыстоўвалі раскручаныя апазыцыяй брэнды дзеля сваіх мэтаў: напрыклад, ажыцьцяўлялася агітацыя пад лёзунгам “Пяць “Так!” прэзыдэнту”, які відавочна павінен быў адпавядаць раскручанай апазыцыйнай праграме “Пяць крокаў да лепшага жыцьця”.

Падчас агітацыйнай кампаніі, а асабліва пры яе канцы, улады актыўна скасоўвалі рэгістрацыю апазыцыйных кандыдатаў за ўяўныя парушэньні парадку агітацыі. За гэта былі пазбаўленыя рэгістрацыі вылучэнцы АГП Марына Багдановіч, Аляксандар Дабравольскі, Аляксандар Цынкевіч, Аляксандар Ваўчанін, Валянціна Палевікова, кандыдат ад БСДГ Алег Воўчак,

кандыдаты ад Партыі БНФ Аляксей Янукевіч, Алесь Міхалевіч, Лера Сом, Уладзіслаў Токараў, кандыдат ад ПКБ Віктар Дашкевіч, кандыдат ад Эўрапейскай кааліцыі Павал Севярынец і яшчэ некалькі чалавек. Былі звольненыя з працы кандыдаты ад Партыі БНФ Вольга Лагвіновіч і Аляксей Сюдак.

Увогуле пэрыяд агітацыйнай кампаніі праходзіў паводле сцэнару ўладаў. Агітацыйная кампанія была шанцам для таго, каб сказаць народу праўду, — і ўлады рабілі ўсё, каб гэтая праўда не была пачутая беларусамі.

## Галасаваньне

Датай правядзеньня галасаваньня на парлямэнцкіх выбарах і рэфэрэндуме было вызначана 17 кастрычніка. Аднак рэальна галасаваньне распачалося за пяць дзён да таго, 12 кастрычніка. Улады шырока карысталіся адміністрацыйным прымусам, каб забясьпечыць высокі адсотак датэрміновага галасаваньня (табл. 9).

Паводле зьвестак назіральнікаў ГІ “Партнэрства”, усяго па краіне датэрмінова прагаласавала больш за 25 % выбарцаў (табл. 10).

На апошніх выбарах афіцыйны адсотак выбарцаў, якія прагаласавалі датэрмінова, быў штучна заніжаны. На асобных участках да 95 % выбарцаў прагаласавалі датэрмінова. Заява

**Табліца 9.** Колькасьць тых, хто прагаласаваў датэрмінова, паводле зьвестак Цэнтральнай выбарчай камісіі, %

| Раён | 12.10 | 13.10 | 14.10 | 15.10 | 16.10 |
|---|---|---|---|---|---|
| Берасьцейская вобл. | 1.19 | 4.66 | 7,26 | 11.53 | 12,46 |
| Віцебская вобл. | 3.27 | 8.20 | 9,60 | 12.63 | 14,91 |
| Гомельская вобл. | 3.36 | 6.64 | 9,16 | 12.88 | 16,89 |
| Гарадзенская вобл. | 2,48 | 5,71 | 8.79 | 11,87 | 15,31 |
| Менская вобл. | 3,20 | 7,62 | 14.85 | 22.7 | 22.7 |
| Магілёўская вобл. | 1.78 | 4.04 | 7,93 | 10,14 | 11.6 |
| Менск | 2.44 | 5.54 | 8,78 | 13.15 | 23,02 |
| Усяго па краіне | 2.68 | 6.11 | 9,60 | 13.72 | 17,39 |

**Табліца 10.** Колькасьць тых, хто прагаласаваў датэрмінова, паводле ГІ “Партнэрства”, %

| Раён | 12.10 | 13.10 | 14.10 | 15.10 | 16.10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Берасьце | 1.19 | 3.32 | 7,10 | 7.10 | 7,46 | 26,16 |
| Віцебск | 2.25 | 7,25 | 7,01 | 8.33 | 9,12 | 33,96 |
| Гомель | 1.78 | 3,51 | 5.72 | 5.35 | 5,35 | 21,71 |
| Гродна | 1,51 | 3,64 | 3,91 | 3,85 | 4,53 | 17,43 |
| Менск | 2,01 | 3.51 | 4,72 | 4,99 | 4,83 | 19,64 |
| Менская вобласьць | 0.76 | 6.51 | 9,21 | 7.85 | 7,19 | 31,52 |
| Магілёў | 2.16 | 4,14 | 6,05 | 6.21 | 6,54 | 25,09 |
| Усяго | 1.66 | 4,55 | 6.19 | 6.24 | 6,43 | 25,08 |

Цэнтральнай выбарчай камісіі 30 верасьня пра тое, што, як чакаецца, больш за 30 % выбарцаў прагаласуюць датэрмінова, сталася інструкцыяй для дзеяньняў на месцах (ці, хутчэй, адкрыла існаваньне нейкай іншай інструкцыі для дасягненьня долі датэрміновага галасаваньня, дастатковай для фальсыфікаваньня вынікаў рэфэрэндуму і выбараў у неабходным памеры). Гэта выклікала неўразуменьне ў назіральнікаў ад АБСЭ. 30 % — гэта значна болей, чым было на папярэдніх выбарах: афіцыйная колькасьць датэрміновага галасаваньня на мясцовых выбарах 2003 г. склала 14 %. На прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г., паводле афіцыйных зьвестак датэрмінова прагаласавалі амаль 23 %. Гэта дазваляе меркаваць, што ў 2004 г. маштаб фальсыфікацыяў шляхам падмены бюлетэняў з скрыняў для датэрміновага галасаваньня быў беспрэцэдэнтны, а таксама ўскосна сьведчыць, што вынікі выбараў былі сфальсыфікаваныя сама мала на 30 % пры дапамозе гэтага і іншых мэтадаў фальсыфікацыяў. У параўнаньні зь мінулымі выбарчымі кампаніямі заўважана, што ўлады яшчэ больш павялічылі адміністрацыйны прымус для датэрміновага галасаваньня ў дачыненьні да залежных ад іх асобаў. Асноўныя катэгорыі грамадзянаў, на якіх быў аказаны моцны ціск, — навучэнцы і студэнты, работнікі дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў, вайскоўцы.

У дзень асноўнага галасаваньня 17 кастрычніка намаганьні ўладаў (у тым ліку і супрацоўнікаў выбарчых камісіяў) былі сканцэнтраваныя на тым, каб стварыць карціну як мага большага ўдзелу электарату ў галасаваньні. Ініцыятыву прэзыдэнта павінны былі падтрымаць больш за палову ад агульнага сьпісавага складу выбарцаў. Гэтая праблема была вырашаная проста: сьпіс выбарцаў быў радыкальна скарочаны (на сотні тысяч грамадзянаў), у яго не была ўключаная значная частка малаактыўных выбарцаў. Да таго ж сьпісы выбарцаў не былі пададзеныя для ўсеагульнага азнаямленьня, інфармацыя аб колькасьці зарэгістраваных выбарцаў і колькасьці ўдзельнікаў у датэрміновым галасаваньні не давалася назіральнікам і давераным асобам кандыдатаў. Людзі прыходзілі на ўчастак і часта не знаходзілі сябе ў сьпісах для галасаваньня.

У выніку, паводле паведамленьня Цэнтральнай выбарчай камісіі ад 17 кастрычніка, агулам у краіне ў сьпісы для галасаваньня было ўключана 6 986 163 грамадзяніны Беларусі, зь іх у галасаваньні прыняло ўдзел 6 307 395 грамадзянаў, што складае 90,28 % ад сьпісавага складу электарату. Для параўнаньня, падобнае ж паведамленьне Цэнтральнай выбарчай камісіі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у 2001 г. зафіксавала ў Беларусі 7 356 343 выбарцы, а колькасьць удзельнікаў у галасаваньні склала 6 169 087 (83,86 %). Такім чынам, колькасьць афіцыйна ўлічаных выбарцаў у пэрыяд з 9 верасьня 2001 г. па 17 кастрычніка 2004 г. паменшылася на 370 180 чалавек, альбо на 5,3 %. Гэта яскрава сьведчыць пра маніпуляцыі зь сьпісамі з мэтай іх штучнага скарачэньня, паколькі, паводле паведамленьняў Міністэрства статыстыкі, за гэты пэрыяд колькасьць грамадзянаў векам ад 16 гадоў павялічылася на 94 000 чалавек, што непазьбежна павінна было пацягуць павелічэньне корпусу выбарцаў. У выніку па многіх участках яўка выбарцаў перавысіла 100 %. Так быў дасягнуты патрэбны адсотак яўкі — тыя, хто праігнаравалі выбары і рэфэрэндум, папросту не патрапілі ў сьпісы для галасаваньня. Пазьней, калі гэтыя маніпуляцыі сталіся відавочнымі, выбарчыя камісіі трохі падкарэктавалі сьпісы на нацыянальным узроўні, аднак сам прынцып застаўся нязьменны.

Тое, што ў дзень выбараў 17 кастрычніка падкантрольныя ўладам дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі актыўна тыражавалі пераможныя дадзеныя сумнеўных экзыт-полаў, праведзеных моладзевымі дзяржаўнымі аб'яднаньнямі і малавядомымі сацыялягічнымі службамі, ня трэба расцэньваць як правядзеньне агітацыі ў дзень выбараў. Уладам не было неаб-

ходнасьці турбавацца адносна зьместу бюлетэняў, што былі ўкінутыя ў скрыні, і пратаколаў, якія будуць падпісаныя ўчастковымі камісіямі. Хутчэй, абвяшчэньне дадзеных экзыт-полаў было часткай мэханізму, скіраванага на выкананьне функцыі легітымізацыі вынікаў рэфэрэндуму.

У адрозьненьне ад мінулых выбарчых кампаніяў, гэтым разам галасавала ўдому даволі значная колькасьць людзей (блізу 1 %). Прычынай гэтага была тая ж самая неабходнасьць забясьпечыць пераможны для Лукашэнкі адсотак яўкі. Гэткае галасаваньне праходзіла з парушэньнямі прынцыпу таямніцы галасаваньня і прынцыпу свабоднага ўдзелу ў выбарах: найчасьцей сьпісы для вынасных скрыняў рыхтаваліся без заяваў выбарцаў, а часам скрыню нават проста насілі па вуліцах, дазваляючы галасаваць усім ахвотным і апэратыўна ўключаючы іх імёны ў сьпісы.

У графе падпіснога ліста аб атрыманьні бюлетэняў па выбарах дэпутатаў і рэфэрэндуме выбарцы ставілі толькі адзін подпіс, што стварыла падставы для маніпуляцый і фальсыфікацый. Паколькі сьпісы выбарцаў для рэфэрэндуму і выбараў былі супольныя, выбарцы не маглі, напрыклад, прыняць удзел у выбарах дэпутатаў і не прыняць удзелу ў рэфэрэндуме: адмовіцца ад рэфэрэндуму было нельга. Да таго ж такая практыка дазволіла пазьбегнуць магчымага пераўліку сьпісаў па рэфэрэндуме.

Дзеля неабходнасьці павялічыць яўку да максымуму выбарчыя камісіі з дазволу Цэнтральнай выбарчай камісіі выдавалі бюлетэні пасьля паказу любога дакумэнту, а ня толькі пашпарта ці даведак на яго замену. Выбарцы галасавалі і па студэнцкіх білетах, і па пэнсійных пасьведчаньнях — то бок па дакумэнтах, у якіх няма пацьвярджэньня беларускага грамадзянства. Зафіксаваны масавыя выпадкі, калі грамадзяне, зьявіўшыся на ўчастак, высьвятлялі, што за іх і за іх сям'ю ўжо нехта прагаласаваў (гэта найбольш характэрна для тых, хто падышоў на ўчасткі недзе каля 20.00, у канцы галасаваньня).

Але, натуральна, найбольш важным момантам у дзень галасаваньня для выбарчых камісіяў быў час падліку галасоў. Дзеля патрабаваньняў канфідэнцыйнасьці працэдура падліку галасоў была пабудаваная такім чынам, каб ніводзін зь сяброў камісіі ня мог з пэўнасьцю засьведчыць сапраўднасьць лічбаў, зафіксаваных у пратаколе, — пра гэта звычайна ведаў толькі старшыня камісіі і, часам, сакратар. Вельмі часта сябры ўчастковых камісіяў былі вымушаныя падпісваць пустыя пратаколы, якія запаўняліся ўжо ў акруговых камісіях. Найбольш яскрава сьведчаць пра характар падліку галасоў выпадкі ў горадзе Менску: па акрузе № 106 кандыдат Калякін яшчэ да дня галасаваньня распаўсюдзіў выніковыя дадзеныя падліку галасоў — прагноз спраўдзіўся амаль на сто адсоткаў; на акрузе № 107 перад пачаткам падліку галасоў назіральнік ад міжнароднай арганізацыі "ЭНЭМА" агучыў лічбы, што паведаміла яму ананімная крыніца з гарвыканкаму, — у выніковых дадзеных камісіі былі зафіксаваныя менавіта гэтыя самыя лічбы. Падобны выпадак зарэгістраваны і на акрузе № 102. Такім чынам, прынамсі на некаторых участках ніхто нават і не лічыў бюлетэняў, вынікі іх падліку ня ўносіліся ў пратакол і не агучваліся, а на некаторых акругах былі вызначаныя ў органах выканаўчай улады задоўга да дня выбараў.

Насуперак патрабаваньням заканадаўства, асобнік выніковага пратаколу ня быў вывешаны дзеля азнаямленьня для грамадзкасьці і назіральнікаў — гэтая практыка абсалютна нечакана была выкарыстаная на ўсіх выбарчых участках краіны. Была вывешаная толькі паперка з колькасьцю галасоў за кожнага з кандыдатаў і колькасьцю галасоў, пададзеных за пытаньне, вынесенае на рэфэрэндум. Ніякіх подпісаў на гэтай паперчыне звычайна ня ставілася, і

яна не магла лічыцца афіцыйным дакумэнтам. Гэта было зроблена, каб прадухіліць магчымы паралельны падлік галасоў.

Улады ўлічвалі магчымасьць і іншага разьвіцьця падзеяў — на некаторых участках у Менску прысутнічалі да дзясяці міліцыянтаў, а побач з участкамі "тусаваліся" асобы, якія называліся "дружыньнікамі": улады былі гатовыя і да таго, што відавочныя фальсыфікацыі вынікаў рэфэрэндуму прывядуць да народных пратэстаў.

## Вынікі рэфэрэндуму і выбараў

Афіцыйныя вынікі былі падведзеныя Цэнтральнай выбарчай камісіяй 21 кастрычніка. Аднак і да таго ў сваіх паведамленьнях і інтэрвію яе супрацоўнікі выказваліся наконт чарговай пераканаўчай падтрымкі Лукашэнкі беларускім народам і факту фармаваньня парлямэнту ў правамоцным складзе ўжо ў першым туры. На рэфэрэндуме было зацьверджана рашэньне пра зьмяненьне Канстытуцыі, зьняцьце абмежаваньня часу прэзыдэнтуры і быў дадзены дазвол прэзыдэнту Лукашэнку балятавацца на трэцюю прэзыдэнцкую кадэнцыю ў 2006 г. Ніводзін апазыцыйны кандыдат ня толькі ня быў абраны ў парлямэнт, але нават ня выйшаў у другі тур.

Згодна з пастановай Цэнтральнай выбарчай камісіі ад 21 кастрычніка, у галасаваньні на рэфэрэндуме ўзялі ўдзел 6 307 395 грамадзянаў, што складае 90,28 % ад колькасьці тых, што маюць права голасу і былі ўключаныя ў сьпісы для галасаваньня. Цэнтральная выбарчая камісія вырашыла лічыць прынятым рашэньне па пытаньні, вынесеным на рэфэрэндум. За гэта прагаласавалі 5 548 477 грамадзянаў, што складае 79,42 % ад агульнай сьпісавай колькасьці. Усяго ў сьпісы для рэфэрэндуму было ўключана 6 986 163 грамадзянаў. Бюлетэні атрымалі 6 315 825 чалавек. Атрымалі бюлетэнь, але не паклалі яго ў скрыню для галасаваньня 8430 выбарцаў. Супраць зьмяненьня Канстытуцыі прагаласавалі 691 917 грамадзянаў, што складае 9,9 % ад сьпісавай колькасьці выбарцаў. Колькасьць несапраўдных бюлетэняў — 67 001.

Такім чынам, рашэньне на рэфэрэндуме было прынятае на карысьць Аляксандра Лукашэнкі. Адсотак тых, хто падтрымаў Лукашэнку, паводле зьвестак афіцыйных органаў, павялічыўся і ў параўнаньні зь мінулымі прэзыдэнцкімі выбарамі 1994 і 2001 гг., і ў параўнаньні зь мінулымі прэзыдэнцкімі рэфэрэндумамі: пытаньне пра зьмену рэдакцыі Канстытуцыі ў 1996 г. падтрымалі 5 175 664 чалавекі, а на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г. (другі тур) і 2001 г. за Лукашэнку прагаласавалі адпаведна 4,2 і 4,6 млн выбарцаў. Пры гэтым у 2004 г. ашаламляльна павысілася яўка (на рэфэрэндуме 1995 г. яна складала 64,8 %, на рэфэрэндуме 1996 г. — 84,14 %), што тлумачыцца згаданай тэхналёгіяй штучнага скарачэньня сьпісаў выбарцаў.

Што да парлямэнцкіх выбараў, то Цэнтральная выбарчая камісія сваёй пастановай ад 22 кастрычніка вызначыла сьпіс абраных дэпутатаў і паведаміла, што з унесеных у сьпісы 6 986 163 грамадзянаў узяло ўдзел у выбарах 6 297 600, што складае 90,14 % ад сьпісавага складу (нагадаем, што сьпіс і для рэфэрэндуму, і для выбараў быў супольны). Выбары адбыліся ўва ўсіх 110 выбарчых акругах, па якіх было абрана 108 дэпутатаў. У дзьвюх акругах выбары адбыліся, але ніхто з кандыдатаў не набраў больш за палову галасоў выбарцаў. У Наваполацкай выбарчай акрузе № 25 быў праведзены другі тур, а ў Гарадзенскай цэнтральнай выбарчай акрузе № 52 былі праведзеныя паўторныя выбары. Ува ўсіх акругах перамаглі праўладныя кандыдаты. Сярод партыйных вылучэнцаў дэпутацкія мандаты атрымалі стар-

шыня ЛДП Сяргей Гайдукевіч, які правёў кампанію пад лёзунгамі барацьбы з аб'яднанай апазыцыяй, і восем сяброў праўладнай КПБ.

Дадзеныя экзыт-полу, праведзенага сацыялягічнай службай Гелапа, сьведчылі пра іншую карціну: вялікая колькасьць апазыцыйных кандыдатаў выйшла ў другі тур, а вылучэнец Партыі БНФ Уладзімер Колас нават перамог у першым туры (у Старавіленскай акрузе ў Менску). Гэтая служба таксама сьцьвярджае, што лік падтрымкі ініцыятывы прэзыдэнта для зьмяненьня Канстытуцыі не дасягнуў узроўню, патрэбнага для прыняцьця рашэньня, і склаў 48,4 % ад агульнай колькасьці выбарцаў за ўсе дні галасаваньня (памылка выбаркі — 1 %). Дадзеныя цэнтру "Экаом" таксама адрозьніваюцца ад афіцыйных: згодна зь імі, падтрымалі прэзыдэнта толькі 74,6 % выбарцаў (адсотак магчымай памылкі не паведамляўся).

Парлямэнцкія выбары і рэфэрэндум адбыліся паводле вызначанага ўладамі сцэнару і прывялі да неабходных уладам вынікаў. Ці патрэбныя Лукашэнку падобныя агульнанацыянальныя кампаніі ў будучыні? Імгненна распаўзьліся чуткі пра тое, што прэзыдэнцкія выбары будуць прызначаныя датэрмінова, у 2005, а не ў 2006 г., у сувязі з тым, што ў 2006 г. эканамічная сытуацыя ня будзе спрыяльнай для ўлады. Гэта малаверагодна, паколькі тэхналёгія 2004 г. дазваляе Лукашэнку атрымліваць "элегантную перамогу" нават пры нізкай падтрымцы з боку насельніцтва. Аднак яму ж неабходна рэгулярна мабілізоўваць уласных прыхільнікаў, патрэбныя агульнанацыянальныя прапагандысцкія акцыі. Выцягваньне людзей да выбарчых скрыняў дазваляе гэта рабіць максымальна эфэктыўна, ствараючы ілюзію дэмакратычнай працэдуры палітычнай легітымацыі правадыра.

## НАЗІРАНЬНЕ ЗА ПАЛІТЫЧНЫМІ КАМПАНІЯМІ Ў 2004 Г.

У гэтым аналізе мы паспрабуем прааналізаваць генэалёгію фармаваньня сыстэмы назіраньня за выбарамі ў Беларусі і ацаніць эфэктыўнасьць яе працы падчас кампаніі выбараў у палату прадстаўнікоў трэцяга скліканьня і правядзеньня канстытуцыйнага рэфэрэндуму ў 2004 г. Пры гэтым мы аддаем перавагу акурат высьвятленьню тых чыньнікаў, якія паўплывалі на станаўленьне гэтай сыстэмы, зьвяртаючы мінімальную ўвагу на тыя дадзеныя, якія былі атрыманыя ў выніку назіраньня, — гэты аспэкт працы назіральнікаў быў адлюстраваны ў артыкуле "Ход і вынікі парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму" гэтага выданьня.

### Функцыі назіраньня за выбарамі

Звычайна перад унутранымі назіральнікамі на выбарах у краінах, якія пераходзяць да дэмакратычнага ладу, ставіцца задача абароны дэмакратычнай волі грамадзянаў, выяўленай падчас галасаваньня. Такому назіраньню наканаваная роля быць сродкам праверкі сапраўднасьці вынікаў выбараў[1].

У традыцыйнай схеме "штучнай аксамітнай рэвалюцыі" (у адрозьненьне ад сапраўднай "аксамітнай рэвалюцыі", якая адбываецца спантанна і ў якой вырашальную ролю грае маса-

[1] Альфер С. А., Бугрова И. И., Вашкевич А. Е. и др. Выборы: подлинные, свободные и справедливые. — Мн. : Тесей, 1999. С. 22.

вае грамадзкае дзеяньне — “вуліца”) агульнанацыянальныя кампаніі назіраньня за выбарамі, што часам даюць свае вынікі выбараў раней за іх афіцыйныя, служаць абаронцамі маладой дэмакратыі ад рэцыдываў аўтарытарызму. Назіраньне за выбарамі набывае вялікае значэньне там, дзе працэс дэмакратызацыі ўжо распачаты, але ня мае незваротнага характару. Аўтарытэт унутраных назіральнікаў і адпаведнасьць агучаных імі вынікаў сапраўдным настроям у грамадзтве абумовілі высокі ўзровень даверу да гэтых структураў. Цяпер як такое ўнутранае назіраньне ў краінах Усходняй Эўропы ўжо не нясе гэтай былой функцыі: падмуркам дэмакратыі тут мала што пагражае і нешматлікім унутраным назіральнікам застаецца толькі канстатаваць, што выбары адбыліся справядліва і дэмакратычна. У гэтым сэнсе гэтыя палітычныя сыстэмы набліжаюцца да традыцыйных “старых” дэмакратыяў, дзе аніякія назіральнікі за выбарамі ўвогуле не патрэбныя. Замежныя назіральнікі, назіральнікі ад АБСЭ ўва Ўсходняй Эўропе таксама збольшага ўжо ня схільныя да крытычнай ацэнкі электаральных працэсаў, звычайна сьцьвярджаючы іх агульную справядлівасьць, дэмакратычнасьць і празрыстасьць. Пры гэтым вонкавыя і ўнутраныя назіральнікі абмяжоўваюцца выяўленьнем лёгкіх, несур’ёзных недахопаў, існаваньне якіх не аспрэчваецца нават і самімі арганізатарамі выбараў. Тыя факты, якія для маладой, пераходнай дэмакратыі былі б сьведчаньнем несправядлівасьці выбараў, для старой, кансалідаванай дэмакратыі робяцца, з пункту гледжаньня тэорыі назіраньня, неістотнымі акалічнасьцямі: напрыклад, масавае датэрміновае галасаваньне, падача голасу пры дапамозе факсавага апарата, абмежаваньне правоў унутраных і замежных назіральнікаў альбо нават простая забарона самога інстытуту назіраньня ў Злучаных Штатах не вымушалі прадстаўнікоў Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе ставіць пад сумнеў справядлівасьць і дэмакратычнасьць выбараў амэрыканскага прэзыдэнта ў лістападзе 2004 г. Мабыць, калі б назіральнікам, напрыклад з Македоніі, выкласьці схему арганізацыі і правядзеньня выбараў… ну, напрыклад у Нарвэгіі, не называючы пры гэтым краіну, тыя б непазьбежна адзначылі грунтоўныя недасканаласьці заканадаўства і практыкі, якія перашкаджаюць прызнаньню праведзеных там выбараў. Натуральна, гэта аўтарская інтэрпрэтацыя мэтадалягічных асноваў назіраньня за выбарамі, але, на нашу думку, яна адпавядае таму, што мы бачым цяпер у сьвеце.

Аднак яшчэ сьвежыя ў памяці тыя дзеяньні, якія былі зьвязаныя з выкарыстаньнем вынікаў унутранага назіраньня ў Югаславіі ў 2000 г., калі апошнія радыкальна не супалі з афіцыйнымі вынікамі. Пры гэтым спроба скрасьці народную перамогу ў Югаславіі выклікала масавыя грамадзянскія пратэсты ў абарону “сапраўдных” вынікаў, што ў рэшце рэшт (зразумела, пры вырашальнай ролі іншых складнікаў кампаніі па ажыцьцяўленьні “аксамітнай рэвалюцыі”) прывяло да падзеньня рэжыму Мілошавіча. У Славакіі ў 1998 г. у іншай сытуацыі, калі кампанія назіраньня за выбарамі была адносна самастойным і больш істотным складнікам працэсу, а аўтарытарныя памкненьні рэжыму не такімі грубымі, каб парушыць інстытуты электаральнай дэмакратыі, афіцыйныя органы былі вымушаныя прызнаць слушнасьць высноваў назіральнікаў і зацьвердзіць вынікі, якія сьведчылі пра паразу існага на той час рэжыму Меч’яра.

Такім чынам, функцыя засьцярогі вынікаў выбараў ад фальсыфікацыяў, функцыя абароны волевыяўленьня грамадзянаў традыцыйна ёсьць асноўнай для ўнутраных назіральнікаў за выбарамі ў пераходных краінах. Арганізацыйныя формы, у якіх яна выконваецца, могуць быць рознымі — гэта можа быць і назіраньне, ня зьвязанае наўпрост з тымі палітычнымі сіламі, якія непасрэдна прымаюць удзел у выбарчай кампаніі (гэтак званае “незалежнае на-

зіраньне"), гэта можа быць і назіраньне, арганізаванае тымі, хто спадзяецца атрымаць у ходзе выбараў нейкі канкрэтны вынік для сваёй палітычнай групоўкі (партыйнае, зацікаўленае назіраньне). Але і для першай, і для другой формы дзеяньняў праз адзінства іх функцыі характэрнае тое, што на іх выхадзе маецца канкрэтны вынік у выглядзе выніковых лікаў. Гэтыя лікі ўспрымаюцца палітычнай апазыцыяй і грамадзкасьцю як юрыдычны доказ, які ўжо пасьля можа стаць падставай для палітычных альбо грамадзкіх дзеяньняў, нават такіх бурлівых, як у 2000 г. у Югаславіі. Таму, на наш погляд, было б слушна гэтую традыцыйную функцыю ўнутраных назіральнікаў на выбарах ува Ўсходняй Эўропе ўмоўна назваць "прававой" альбо "праваабарончай" функцыяй. Зразумела, мы сьвядома бяром гэтае вызначэньне ў двукосьсе: ні пра якую юрыдычную значнасьць выніковых лічбаў назіраньня казаць найчасьцей не выпадае[2].

Але ж у кантэксьце палітычнай барацьбы агучаныя назіральнікамі зьвесткі пазыцыянуюцца адным з бакоў палітычнага процістаяньня як юрыдычны доказ, юрыдычны факт, здольны паставіць пад сумнеў афіцыйныя вынікі сапраўды ўпаўнаважаных органаў. Таму падобнае азначэньне функцыі назіраньня, пры ўсёй яго ўмоўнасьці і катэгарыяльнай неакрэсьленасьці, уводзіцца намі штучна не дзеля аналізу фэномэну назіраньня як такога, а як мэтадалягічны сродак дзеля лепшага разуменьня асаблівасьцяў той функцыі, якую выконвае (можна казаць, ужо на працягу пэўнага пэрыяду, што ўключыў у сябе не адну электаральную кампанію) унутранае назіраньне ў нашай краіне.

Натуральна, што ў беларускіх умовах менавіта такія спадзяваньні традыцыйна і ўскладаюцца грамадзкай апініяй на ўнутраных назіральнікаў напярэдадні выбараў — іх таксама яшчэ часта разглядаюць як сілу, якая здолее прымусіць улады прызнаць "сапраўдныя" вынікі галасаваньня і сваю паразу на выбарах. У сваю чаргу, з боку ўладаў трансьлюецца страх таго, што дзеяньні назіральнікаў могуць быць скіраваныя на падрыў існага ладу, што яны могуць пахіснуць рэжым, паставіўшы пад сумнеў афіцыйныя вынікі выбараў і даўшы штуршок кампаніі грамадзянскіх дзеяньняў у абарону "сапраўдных" вынікаў. У гэтым сэнсе ўнутраных назіральнікаў на выбарах у Беларусі па-ранейшаму, нягледзячы на досьвед 2001 г., успрымаюць як спадкаемцаў тых, хто дамогся зьмены палітычнага рэжыму ў Славакіі, Югаславіі, зусім нядаўна спрыяў перамозе апазыцыі ў Грузіі, але пацярпеў паразу ў Азэрбайджане. Ня ёсьць у гэтым сэнсе выключэньнем і кампанія выбараў у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу трэцяга скліканьня, якая была сумешчаная з правядзеньнем канстытуцыйнага рэфэрэндуму аб зьняцьці абмежаваньняў, што перашкаджалі Аляксандру Лукашэнку знаходзіцца ля ўлады пажыцьцёва. Функцыя назіраньня, на разуменьне некаторых аглядальнікаў, як і раней, палягала ў абароне волі грамадзянаў ад яе скажэньня кантраляванымі лукашэнкаўскім рэжымам выбарчымі камісіямі. У апошнія сорак дзён перад галасаваньнем (пачынаючы з абвяшчэньня прэзыдэнцкага ўказу пра прызначэньне рэфэрэндуму) гэткае разуменьне было падмацаванае перакананьнем, што Аляксандар Лукашэнка ня мае падтрымкі большасьці выбарнікаў адносна вынесенага на рэфэрэндум пытаньня. Такі пункт гледжаньня, як нам здаецца, некрытычна пашыраў на ўнутраных беларускіх назіральнікаў на выбарах тую "пра-

[2] Прыклад агучваньня "сапраўдных" вынікаў выбараў апісаны ў Югаславіі. Дэманстрацыя дыскеты з "сапраўднымі" вынікамі і зьнішчэньне асноўнага рэчавага носьбіту гэтых вынікаў — выбарчых бюлетэняў — пры дастатковай падтрымцы натоўпу можа ірацыянальна ўспрымацца як "юрыдычны" доказ сфальсыфікаванасьці выбараў. Гэты прыклад экстрэмальны і наўпрост ня зьвязаны з сыстэмай назіраньня, але, па сутнасьці, ён заснаваны на прынцыпах, якія тоесныя прынцыпам "незалежнага назіраньня". Гл.: Ягораў А. ОТПОР!: Палітычны досвед / / Палітычная сфера. 2002. № 2. С. 57—61.

ваабарончую" функцыю, якую выконвалі і часам яшчэ выконваюць іх калегі ў іншых краінах рэгіёну. Аднак думаецца, пасьля досьведу мінулых выбарчых кампаніяў і спадарожных кампаніяў назіраньня казаць пра здольнасьць назіральнікаў паўплываць на вынік выбараў было б памылкай. Некрытычны перанос на беларускую глебу функцыянальнага напаўненьня замежнага назіраньня за выбарамі перашкаджае разуменьню сапраўднай ролі гэтага фэномэну ў беларускай палітыцы.

Вынікі назіраньня ў Беларусі не ператвараюцца ў афіцыйныя, паколькі адсутнічае суб'ект, які мог бы ўпэўнена патрабаваць перагляду несапраўдных лічбаў, абвешчаных Цэнтральнай выбарчай камісіяй. А тым больш гэта немагчыма, калі асноўная частка апазыцыйных сілаў ставіцца падкрэсьлена нэгатыўна да агульнанацыянальнай сыстэмы назіраньня як абароны выбараў ад фальсыфікацыяў. Гэта зброя, якая можа быць скарыстана толькі моцным суб'ектам пры наяўнасьці адпаведнай палітычнай волі і, відаць, ува ўмовах пэўнай слабасьці, дэзінтэграцыі ці "інстытуцыянальнай стомленасьці" складнікаў рэжыму. На жаль, пакуль нашае грамадзтва ў асобе дэмакратычнай апазыцыі ня ў стане выкарыстоўваць гэтую зброю паводле прызначэньня, яна занадта моцная для яго — альбо занадта слабая для выкарыстаньня супраць кансалідаванага і ўпэўненага беларускага аўтарытарызму. Таму ў беларускіх умовах функцыянальная роля назіраньня за выбарамі адрозьніваецца ад яе традыцыйнага "праваабарончага" разуменьня.

Нашае назіраньне было створанае на ўзор сыстэмаў назіраньня за выбарамі іншых краінаў, дзе выкарыстаньне рознага кшталту арганізацыйных тэхналёгіяў давяло сваю пэўную эфэктыўнасьць у справе выкананьня памянёнай "праваабарончай" функцыі. Але ў Беларусі яно выконвае функцыю абароны волевыяўленьня грамадзянаў толькі ўскосна, пераважна толькі ў той ступені, у якой яе выкананьне дасягаецца самой прысутнасьцю назіральнікаў на выбарчых участках. Такая прысутнасьць перашкаджае самым грубым і нахабным мэтадам фальсыфікацыяў выбараў, але не зьмяняе іх канчатковага выніку. Магчыма, прычына такога функцыянаваньня сыстэмы назіраньня за выбарамі ў сіле і энэргіі беларускага аўтарытарнага рэжыму, магчыма — у слабасьці і нескаардынаванасьці дзеяньняў іншых удзельнікаў выбарчага працэсу.

У гэтым сэнсе нашае назіраньне сапраўды спрыяе выкананьню падчас працэдуры галасаваньня падставовых патрабаваньняў заканадаўства і прынцыпаў здаровага сэнсу, не дапускае простага ўкідваньня стосаў запоўненых бюлетэняў у скрыню, не дазваляе беларускім выбарам канчаткова ператварыцца ў інсцэнаваньне на туркмэнскі ўзор, але… не ўплывае на тое, якія лічбы будуць абвешчаныя паводле вынікаў галасаваньня. Інакш кажучы, беларускае інсцэнаваньне выбараў ад гэтага робіцца больш пераканаўчым, больш падобным да сапраўдных выбараў. Такая роля нашых назіральнікаў у нечым дапамагае "арганізатарам выбараў", паколькі дазваляе казаць пра выкананьне мінімальных дэмакратычных стандартаў, дазваляе ўладам бяз страху запрашаць ляяльных "назіральнікаў з краінаў СНД" і да іх падобных суб'ектаў. Гэткая дзейнасьць сыстэмы назіраньня дапаўняецца рэгістрацыяй апазыцыйных кандыдатаў, якія гарантавана не карыстаюцца падтрымкай выбарнікаў: рызыкі, што яны пройдуць у парлямэнт, няма, а вось засьведчыць сваёй прысутнасьцю пэўную дэмакратычнасьць беларускага выбарчага працэсу і паспрыяць прызнаньню выбараў яны могуць.

Назіраньне за выбарчым працэсам таксама можа рабіцца і элемэнтам палітычнай барацьбы, пераважна на вонкавых кірунках, для якіх характэрны велізарны ўплыў на пал-

ітычны статус інстытутаў, што фармуюцца шляхам выбараў, альбо, з улікам беларускай спэцыфікі, — на прызнаньне альбо непрызнаньне прынятых шляхам рэфэрэндуму рашэньняў. Якраз гэты ўплыў на прызнаньне звонку рэальна і ёсьць асноўнай функцыяй для нашых унутраных назіральнікаў, якія такім чынам выконваюць дапаможную ролю для назіральнікаў вонкавых, што традыцыйна накіроўваюць у Беларусь параўнальна нешматлікія дэлегацыі, ня здольныя да сапраўднага рэальнага ўплыву на выбарчыя працэсы. Акурат гэтая функцыя, другасная для назіральнікаў у іншых краінах рэгіёну, якія ўжо пасьпелі прайсьці далёка наперад ад Беларусі па шляху транзыту да дэмакратыі, і ёсьць для нашых назіральнікаў той “палітычнай” функцыяй, якая выходзіць на першы плян.

Падчас байкатаваньня апазыцыяй выбараў у парлямэнт у 2000 г. і давыбараў у 2001 г. сэнс назіраньня палягаў у канстатацыі несумленнасьці выбарчай кампаніі як такой — без прэтэнзіі на абвяшчэньне нейкіх уласных вынікаў, якія б маглі рэпрэзэнтавацца як “сапраўдныя” вынікі выбараў. З гэтага паўставала задача — сабраць як мага болей фактаў парушэньняў, якія пасьля могуць быць кадыфікаваныя і апублікаваныя. Нешта падобнае адбылося і падчас назіраньня за прэзыдэнцкімі выбарамі ў 2001 г. — ані ў ноч падліку галасоў, ані на наступны дзень, ані праз тыдзень назіраньне не абвесьціла якіх-колечы надзейных лікаў, датычных агульнанацыянальнага ўзроўню. Тыя лічбы, што абвяшчаліся ў гарачы пасьлявыбарчы пэрыяд, былі вынікам уяўленьня пэўных індывідаў і не маглі ўспрымацца сур’ёзна — выніковыя лікі назіраньня былі абвешчаныя значна пазьней і ня мелі вялікага розгаласу[3]. Верагодна, гэта адбылося дзеля супадзеньня некалькіх фактараў: сваю ролю адыграла і палітычная ангажаванасьць часткі назіральнікаў у кампанію аднаго з кандыдатаў, які быў вымушаны зьняць сваю кандыдатуру; нястача досьведу агульнанацыянальнага маніторынгу выбарчага працэсу выклікала збоі тэхналягічнага парадку; жорсткая пазыцыя ўладаў і неспрыяльныя праўныя ўмовы для ажыцьцяўленьня назіраньня стварылі перашкоды ў зборы інфармацыі. Але, напэўна, галоўным фактарам было тое, што пасьля выбараў-2001 грамадзкая апінія збольшага прыняла перамогу Лукашэнкі як сапраўдны факт. Такім чынам, і падчас прэзыдэнцкіх выбараў назіральнікі рэальна выконвалі функцыю ўплыву на прызнаньне/непрызнаньне дадзеных выбараў — “палітычную” функцыю.

Акурат у такім кантэксьце рабіўся аналіз папярэдніх кампаніяў назіраньня, акурат гэтая функцыя на практыцы сталася асноўнай і для агульнай кампаніі назіраньня за выбарамі і рэфэрэндумам у 2004 г. Такія вынікі ўнутранага назіраньня адрасуюцца пераважна не беларускаму грамадзтву (хоць і яму ў нейкай ступені таксама), а вонкавым інстытуцыям — тым жа АБСЭ і накіраваным ёю назіральнікам, Радзе Эўропы, Эўразьвязу, краінам Эўропы, Злу-

[3] Укладальнікі выніковага выданьня Грамадзянскай ініцыятывы “Незалежнае назіраньне” сьвядома не канцэнтравалі ўвагі на ўласных выніках падліку галасоў паводле копіяў пратаколаў. (Выборы Президента Республики Беларусь – 2001 : Факты и комментарии / Под ред. М. К. Плиско. — Мн. : Тесей, 2002. С. 157). Большая ўвага надавалася апісаньню ходу выбарчага працэсу і парушэньняў выбарчага заканадаўства, выяўленых назіральнікамі. Таксама аўтары адзначалі, што рэальнае назіраньне за выбарамі практычна магчыма ажыцьцявіць значна меншымі сіламі, выкарыстоўваючы мэтодыку паралельнага падліку галасоў (тамсама, с. 38). З гэтага можна зрабіць выснову пра разьвіцьцё незалежнага назіраньня ад імкненьня да поўнага пакрыцьця назіраньнем усіх выбарчых участкаў да вызначэньня рэпрэзэнтацыйнай групы ўчасткаў, вынікі назіраньня за якімі могуць быць экстрапаляваныя на ўсю краіну.

чаным Штатам[4]. Калі вынікі папярэдніх кампаніяўназіраньня, уключна з 2004 г., можна назваць больш-менш пасьпяховымі, то толькі ў межах згаданай "палітычнай" функцыі.

Калі ўлічыць існаваньне гэтай "палітычнай" функцыі, робіцца зразумелым імкненьне нашых назіральнікаў да кадыфікацыі парушэньняў выбарчага заканадаўства і нормаў выбарчага працэсу[5]. Звычайна гэтыя дадзеныя не даюць падставаў для прызнаньня выбараў несапраўднымі ў юрыдычным сэнсе, да таго ж беларускае заканадаўства і праўная практыка і не прадугледжваюць такой магчымасьці. Але пры сваёй юрыдычнай нікчэмнасьці (якая, у прыватнасьці, была выяўленая падчас падачы некалькіх пазоваў у Вярхоўны суд аб прызнаньні несапраўднымі вынікаў выбараў прэзыдэнта ў 2001 г.) гэтыя дадзеныя ствараюць кантэкст, у якім вынікі выбараў ацэньваюцца ўдзельнікамі беларускага палітычнага працэсу, беларускай апазыцыяй. Такая функцыя назіраньня за выбарчым працэсам уплывае на легітымнасьць існага палітычнага рэжыму пры гэтым набліжае ўнутранае назіраньне да назіраньня вонкавага. Не выконваючы функцыі абароны "сапраўдных" вынікаў выбараў, засяродзіўшыся на выяўленьні парушэньняў і недахопаў з мэтай уплываць на вонкавую легітымнасьць выбараў, нашы назіральнікі рызыкуюць выпасьці з актуальнай унутранай палітыкі.

Такім чынам, у дачыненьні да палітычнай кампаніі лета — восені 2004 г. мы маем права казаць пра назіраньне ў праўным сэнсе як пра элемэнт выбарчай сыстэмы, які дзейнічае згодна зь беларускім заканадаўствам і які, у прынцыпе, закліканы выконваць функцыю абароны палітычнай волі грамадзянаў ад скажэньня і вынікаў выбараў ад фальсыфікацыі. Мы маем права прынамсі разглядаць назіраньне як элемэнт праўнай абароны вынікаў галасаваньня ў межах стратэгіяў пэўных палітычных сілаў. А ў палітычным сэнсе мы можам казаць пра назіраньне за выбарамі як пра зброю ў палітычнай барацьбе за прызнаньне вынікаў дадзенай кампаніі, прызнаньне парлямэнту новага скліканьня і, што больш важна, прызнаньне права Аляксандра Лукашэнкі балятавацца на пасаду прэзыдэнта неабмежаваную колькасьць разоў.

---

[4] Тут паўстае пытаньне пра тое, ці сапраўды патрэбнае назіраньне, якое ня проста няздольнае выканаць "праваабарончую" функцыю, але нават не скіраванае на выкананьне гэтай функцыі. Калі сваё выніковае пасланьне сыстэма назіраньня накіроўвае вонкавым суб'ектам, яно страчвае глебу ўнутры краіны, губляе магчымасьць уплываць на рэальныя палітычныя працэсы. У выніку схема пераходу ад аўтарытарызму да дэмакратыі губляе адзін з сваіх важных складнікаў, што нэгатыўна ўплывае на эфэктыўнасьць гэтай схемы. Паказальнай у гэтым сэнсе была парада аднаго зь югаслаўскіх назіральнікаў падчас відавочных фальсыфікацыяў на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 г. у Беларусі. На пытаньне беларускага назіральніка: "Што мне рабіць?" — Зоран Лучыч адказаў: "Калі б гэта здарылася ў маёй краіне, я проста адчыніў бы вокны і паклікаў бы людзей з вуліцы на дапамогу" (Сіліцкі В. Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі // ARCHE. 2003. № 6. С. 192.). Інструкцыі спадара Лучыча скарысталі і ў Грузіі, і ўва Ўкраіне, але ў Беларусі такая парада была невыканальная і ў 2001 г., і ў 2004 г.

[5] У дачыненьні да выбараў 2001 г. такая кадыфікацыя была зробленая ў згаданай выніковай справаздачы Грамадзянскай ініцыятывы "Незалежнае назіраньне" і ў выданьні "Мониторинг нарушений избирательного законодательства во время выборов Президента Республики Беларусь" (Менск : Гражданская инициатива "Независимое наблюдение", 2002), яна амаль цалкам складаецца з сухога пераліку парушэньняў. Паводле вынікаў выбараў у мясцовыя Рады такая кадыфікацыя была зробленая ў выданьні "Выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусі 24 склікання. Факты і каментарыі" (Менск, 2001) і ў аналягічных выданьнях Беларускага Хельсынскага камітэту і Беларускай асацыяцыі рэсурсных цэнтраў. Пачатак гэтаму шэрагу публікацыяў быў пакладзены выданьнем "Выборы депутатов Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь по результатам наблюдения" (Менск, 2000).

## Праўныя ўмовы назіраньня за выбарамі ў Беларусі

Праўны статус унутраных назіральнікаў у тым выглядзе, у якім ён склаўся ў Беларусі напярэдадні парлямэнцкіх выбараў 2004 г., ёсьць вынікам супярэчлівага ўзаемадзеяньня ўнутранага заканадаўства Беларусі з патрабаваньнямі міжнародных інстытуцыяў, перш за ўсё — Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе.

Гістарычна ў Беларусі выбарчая сыстэма захоўвала некаторыя прыкметы старой савецкай сыстэмы выбараў, якая фармальна прадугледжвала магчымасьці назіраньня за выбарчым працэсам з боку прадстаўнікоў грамадзкасьці[6]. Некаторыя з гэтых элемэнтаў былі ў 1990-я гг. перанесеныя ў нацыянальнае выбарчае заканадаўства, што ў пэўнай ступені спрыяла дэмакратычнасьці і транспарэнтнасьці выбарчых кампаніяў, якія мелі месца ў гэты час. Сёньня праўным падмуркам нацыянальнай выбарчай сыстэмы, у тым ліку і ў пытаньні аб вызначэньні праўнага статусу ўнутраных назіральнікаў за выбарамі, ёсьць Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусі 2000 г.

Пра ўдзел назіральнікаў у выбарчым працэсе гаворыць артыкул 13 Выбарчага кодэксу “Галоснасьць пры падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў, рэфэрэндуму, адкліканьня дэпутата палаты прадстаўнікоў, сябра рады рэспублікі, дэпутата мясцовай Рады дэпутатаў”, які быў значна зьменены ўжо пасьля таго, як кодэкс уступіў у сілу. Вялікую ролю ў тым, што ў Выбарчым кодэксе былі ўсё ж замацаваныя нормы пра праўны статус назіральнікаў, адыграла пазыцыя Арганізацыі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе і, у прыватнасьці, дзейнасьць Кансультацыйна-назіральнай групы АБСЭ ў Менску на чале з Гансам-Гееаргам Вікам. Да прыняцьця Выбарчага кодэксу беларускія заканадаўчыя акты пра выбары дэпутатаў парлямэнту і мясцовых Радаў толькі канстатавалі магчымасьць накіраваньня назіральнікаў за выбарамі, а пытаньні правоў і абавязкаў гэтых назіральнікаў рэгуляваліся пастановамі Цэнтральнай камісіі. Менавіта патрабаваньні АБСЭ да беларускай адміністрацыі аб выкананьні прынцыпаў, замацаваных у пункце 8 дакумэнту Капэнгагенскай нарады Канфэрэнцыі па чалавечым вымярэньні і Парыскай Хартыі для новай Эўропы, прымусілі дэталізаваць у Выбарчым кодэксе прыняцьце міжнародных і ўнутраных назіральнікаў, вызначыць іх правы і абавязкі. Такім чынам, Беларусь як краіна-ўдзельніца АБСЭ была вымушаная фармальна падпарадкавацца патрабаваньням гэтай міжнароднай арганізацыі і заканадаўча замацаваць праўную магчымасьць арганізацыі ўнутранага назіраньня за выбарамі.

Але часткова гэтая саступка была кампэнсаваная тым, што Цэнтральная камісія па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў па-ранейшаму прытрымліваецца практыкі дадатковага ўрэгуляваньня і абмежаваньня ўнутранага назіраньня за выбарамі сваімі паста-

[6] Міхась Пліска выводзіць генэалёгію інстытуту назіраньня за выбарамі з нормаў савецкага заканадаўства пра галоснасьць выбараў. Так, артыкул 36 Закону СССР “Аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР” ад 6 чэрвеня 1978 г. прадугледжваў магчымасьць прысутнасьці на пасяджэньнях выбарчых камісіяў і пры некаторых выбарчых дзеяньнях прадстаўнікоў грамадзкіх аб’яднаньняў, працоўных калектываў, друку, тэлевізіі, радыё (гл.: Плиско М. К. Институт наблюдателей: Проблемы теории и практики. — Мн. : Тесей, 2001). І сапраўды, фармулёўкі гэтага закону былі захаваныя ў пазьнейшых заканадаўчых актах ужо незалежнай Беларусі. Але пры гэтым трэба ўлічваць, што гэтыя нормы былі адарваныя ад рэчаіснасьці і мелі ня праўны, а дэклярацыйны характар. Напрыклад, гэта бачна ўжо з таго, што гаворыцца пра “магчымасьць” прысутнасьці, а не пра “права” прысутнічаць пры падліку галасоў.

новамі. Згодна з дадзенай практыкай, Цэнтральная камісія напярэдадні кожных выбараў прымае пастанову, якая тлумачыць парадак прытарнаваньня артыкулу 13 Выбарчага кодэксу падчас канкрэтнай кампаніі. Такім чынам, Цэнтральная камісія фактычна бярэ на сябе права афіцыйнага тлумачэньня гэтай нормы заканадаўства — орган, створаны, каб выконваць закон, займаецца яго тлумачэньнем і рэальна стварае новыя праўныя нормы. Ня стала выключэньнем і передвыбарная кампанія 2004 г. — 15 ліпеня Цэнтральная камісія прыняла пастанову № 13 “Аб парадку выкарыстаньня часткі 3 артыкулу 13 Выбарчага кодэксу пры падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў у палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі трэцяга скліканьня”. У ёй былі растлумачаныя пытаньні накіраваньня назіральнікаў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў і на ўчасткі для галасаваньня, а таксама ўнесеныя некаторыя дадатковыя абмежаваньні для накіраваньня назіральнікаў. Ужо ў ходзе выбарчай кампаніі (за пяць дзён да пачатку датэрміновага галасаваньня) у праўным рэгуляваньні назіраньня адбылася чарговая зьмена — была прынята пастанова Цэнтральнай камісіі за № 245, якая таксама рэгулявала парадак выкарыстаньня артыкулу 13 Выбарчага кодэксу што да рэспубліканскага рэфэрэндуму. У некаторых сваіх палажэньнях гэтыя дзьве пастановы ўваходзілі ў супярэчнасьць: напрыклад, рэспубліканскія кіраўнічыя органы палітычных партыяў мелі права накіраваць назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі па правядзеньні выбараў у палату прадстаўнікоў, але ня мелі права накіраваць назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі па рэфэрэндуме. Гэта толькі адзін з прыкладаў той няпэўнасьці, якая ўносілася ў выбарчую кампанію практыкай дадатковага абмежаваньня правоў удзельнікаў выбарчага працэсу праз выданьне тлумачальных пастановаў Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Такім чынам, напярэдадні выбараў і рэфэрэндуму 2004 г. інстытут назіраньня за выбарамі і праўны статус назіральнікаў быў урэгуляваны артыкулам 13 Выбарчага кодэксу, асобнымі нормамі некаторых іншых артыкулаў Выбарчага кодэксу і пастановамі Цэнтральнай выбарчай камісіі. Таксама важную ролю адыгрывала і праваўжывальная практыка, а менавіта тыя рашэньні, якія прымаліся кіраўнікамі ўчастковых і акруговых выбарчых камісіяў што да пытаньняў рэгістрацыі і дзейнасьці назіральнікаў. Напрыклад, літаральна за некалькі дзён да выбараў на шэрагу выбарчых акруг Віцебшчыны старшыні ўчастковых камісіяў з маўклівай згоды Цэнтральнай выбарчай камісіі ўвялі не прадугледжанае законам абмежаваньне колькасьці назіральнікаў, якія маглі б знаходзіцца на ўчастках. У выніку нават неспрыяльныя для назіральнікаў нормы Выбарчага кодэксу і пастановы Цэнтральнай выбарчай камісіі яшчэ больш пагаршаліся свавольнай рэпрэсіўнай і абмежавальнай практыкай з боку малаадукаваных, але “адданых справе” старшыняў камісіяў.

У пераліку суб’ектаў, якія мелі права ажыцьцяўляць назіраньне, не адбылося карэнных зьменаў у параўнаньні зь мінулымі выбарчымі кампаніямі. Як і раней, правам прысутнасьці на выбарчых участках валодалі прадстаўнікі сродкаў масавай інфармацыі, дэпутаты дзейнага парлямэнту і мясцовых Радаў, давераныя асобы кандыдатаў у дэпутаты, а таксама прадстаўнікі палітычных партыяў, грамадзкіх аб’яднаньняў, працоўных калектываў, замежныя назіральнікі. Усе гэтыя асобы былі аб’яднаныя ў частцы 3 артыкулу 13 Выбарчага кодэксу ў катэгорыю “назіральнікі”, аднак зыходзячы з практыкі склалася больш вузкае разуменьне таго, хто назіральнік на самай справе. Так, адносіць да іх парлямэнтароў ды дэпутатаў мясцовых Радаў, а таксама давераных асобаў было б неправамерна — зыходзячы з далейшых нормаў пра праўны статус назіральніка відавочна, што яны мусяць адносіцца да іншай катэгорыі ўдзельнікаў выбарчага працэсу. Таксама адмысловым праўным статусам валодаюць

міжнародныя назіральнікі і сродкі масавай інфармацыі, хоць для некаторых кандыдатаў яны і былі важным складнікам іх праграмы назіраньня за выбарамі. Таму найбольшую ўвагу трэба надаць назіральнікам у вузкім сэнсе гэтага слова, гэта значыць прадстаўнікам палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў, а таксама працоўных калектываў. Менавіта грамадзкія аб'яднаньні і палітычныя партыі былі тымі суб'ектамі, якія вылучалі назіральнікаў у межах стратэгіяў незалежнага грамадзкага назіраньня. Улады таксама шырока выкарыстоўвалі вылучэньне назіральнікаў ад ляяльных палітычных партыяў, праўрадавых і дзяржаўных грамадзкіх аб'яднаньняў, працоўных калектываў.

Згодна з тлумачэньнем Цэнтральнай выбарчай камісіі, кіраўнічыя органы палітычных партыяў і грамадзкіх аб'яднаньняў мелі права накіроўваць назіральнікаў на выбарчыя ўчасткі і ў выбарчыя камісіі розных узроўняў. У дачыненьні да назіраньня за рэфэрэндумам гэтае права партыяў і аб'яднаньняў было неабгрунтавана абмежаванае — яны маглі накіраваць назіральнікаў толькі на пасяджэньні тэрытарыяльных камісіяў. Кіраўнічыя органы рэгіянальных структураў палітычных партыяў і рэспубліканскіх грамадзкіх аб'яднаньняў, іх першасныя арганізацыі мелі права накіроўваць назіральнікаў і на выбары, і на рэфэрэндум ува ўсе камісіі і на ўсе ўчасткі ў межах тэрыторыі сваёй дзейнасьці. Тут трэба ўлічваць, што падчас падрыхтоўкі да выбараў улады пры дапамозе органаў юстыцыі пазбавілі рэгістрацыі (а гэта значыць і легальнага статусу, неабходнага для ажыцьцяўленьня назіраньня) тыя грамадзкія аб'яднаньні, якія займаліся назіраньнем падчас мінулых выбарчых кампаніяў і прынята рашэньне аб ліквідацыі Беларускай партыі працы. Улічваючы, што ў 2003 г. улады адмовіліся зарэгістраваць грамадзкае аб'яднаньне "Партнэрства", гэта абмежавала магчымасьці для стварэньня шырокай сеткі грамадзкага і партыйнага назіраньня напярэдадні выбараў і рэфэрэндуму 2004 г.

Тактыка ўладаў, акрамя запалохваньня арганізацыяў магчымасьцю перасьледу ў выпадку актыўнага ўдзелу ў назіраньні, уключала ў сябе і вылучэньне ўласных назіральнікаў. Тут быў скарыстаны і пашыраны досьвед мінулых выбарчых кампаніяў. У асноўным назіральнікі ўладаў вылучаліся праз кантраляваныя дзяржаўныя і калядзяржаўныя грамадзкія аб'яднаньні, якія таксама актыўна праявілі сябе на этапе фармаваньня выбарчых камісіяў: Фэдэрацыя прафсаюзаў Беларусі, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, шэраг жаночых, вэтэранскіх і іншых больш дробных арганізацыяў. На карысьць уладаў працавалі назіральнікі ад ляяльных рэжыму Лібэральна-дэмакратычнай і Рэспубліканскай партыяў. Зразумела, толькі ўладамі выкарыстоўваўся і шлях вылучэньня назіральнікаў ад працоўных калектываў. Ад іх збольшага не патрабавалася аніякай актыўнасьці — іхная роля палягала ў тым, каб сваёй прысутнасьцю (агульнай колькасьцю ў некалькі тысяч чалавек па краіне) засьведчыць дэмакратычнасьць праведзеных уладамі палітычных кампаніяў. Таму асноўнай функцыяй гэтага залежнага ад уладаў назіраньня таксама была функцыя палітычная, функцыя ўплыву на легітымнасьць вынікаў выбараў і прынятага на рэфэрэндуме рашэньня (гэтае пасланьне было арыентаванае перш за ўсё замежным адрасатам).

Што датычыцца працэдуры рэгістрацыі назіральнікаў, то акрамя агульнага патрабаваньня Выбарчага кодэксу зарэгістравацца за дзень да пачатку назіраньня, яна больш аніякага іншага праўнага рэгуляваньня не атрымала. Але ў той жа час на гэтай стадыі практыка дэманстравала выпадкі неабгрунтаванага абмежаваньня магчымасьцяў назіральнікаў. Акрамя згаданай віцебскай вынаходкі пра абмежаваньне колькасьці назіральнікаў, можна прывесьці пашыраныя прыклады нерэгістрацыі назіральнікаў з прычыны адсутнасьці пасьвед-

чаньня сябра партыі альбо аб'яднаньня (у большасьці арганізацыяў такія дакумэнты не прадугледжаныя), прычэпкі да беларускай мовы ў пратаколах вылучэньня ("У законе сказана пра "членаў" партыі, а ў вашым пратаколе напісана, што вы "сябра" партыі, гэта значыць яе "друг", — казалі старшыні ўчастковых камісіяў), незаконныя абмежаваньні на тэрмін для рэгістрацыі, проста неабгрунтаваныя адмовы. І натуральна, што якраз на гэтай стадыі на назіральнікаў аказваўся жорсткі прэсынг з мэтай не дапусьціць іх прысутнасьці на дадзеным выбарчым участку альбо змусіць мінімізаваць актыўныя дзеяньні з боку назіральнікаў.

Апісаньне правоў назіральнікаў у Выбарчым кодэксе мае мала супольнага з рэчаіснасьцю. Вырашальнай у дадзеным пытаньні была тая трактоўка, якую давалі нормам Выбарчага кодэксу старшыні канкрэтных акруговых і ўчастковых камісіяў, а яны, як вядома, былі зацікаўленыя акурат у нэўтралізацыі назіральнікаў. Так, права прысутнічаць пры плямбаваньні скрыняў для галасаваньня нэўтралізоўвалася тым, што назіральнікам не паведамлялі пра час, калі адбудзецца гэтае дзеяньне. Права назіраць за падлікам галасоў ня дзейнічала дзеля таго, што назіральнікі пры гэтым выдаляліся як мага далей ад стала падліку галасоў. Права прысутнічаць пры пасяджэньнях камісіяў адпаведных узроўняў не рэалізоўвалася таму, што ўва ўсіх камісіях (акрамя, можа, Цэнтральнай) усе важныя пытаньні вырашаліся кулюарна альбо папярэдне і толькі фармальна, дзеля пратаколу агучваліся альбо нават і не агучваліся на пасяджэньні камісіі. Масавае і прымусовае датэрміновае галасаваньне, асноўны рэсурс для фальсыфікацыяў з боку ўладаў, апынулася фактычна па-за кантролем з боку назіральнікаў праз сваю працягласьць: мала хто мог забясьпечыць назіраньне за скрыняй для галасаваньня ўночы, калі рабілася падмена выбарчых бюлетэняў. Таксама і назіраньне за галасаваньнем у асноўны дзень выбараў сустракалася з процідзеяньнем: вельмі нэрвовую рэакцыю камісіяў выклікалі нават такія простыя і бяскрыўдныя мэтады кантролю, як падлік колькасьці выбарцаў, што наведалі выбарчы ўчастак (гэта самы просты і дастаткова эфэктыўны сродак зафіксаваць масавае галасаваньне за "мёртвых душаў"). А права атрымліваць інфармацыю ад выбарчых камісіяў і знаёміцца з вынікамі падліку галасоў таксама не магло быць выканана ўва ўмовах падкрэсьлена адмоўнага стаўленьня да назіральнікаў з боку сяброў камісіяў[7].

Як вядома, у дачыненьні да назіральнікаў (акрамя, натуральна, кантраляваных уладай) выбарчымі камісіямі была распрацаваная адмысловая тактыка процідзеяньня. Інструкцыі распаўсюджваліся ў 2001 г. напярэдадні выбараў прэзыдэнта — магчыма, нейкія такія мэтадычкі былі і напярэдадні палітычных кампаніяў 2004 г. У іх старшыням камісіяў даваліся парады, як зрабіць немагчымым рэальнае назіраньне за галасаваньнем, як справакаваць назіральнікаў на забароненыя дзеяньні, як ускладніць рэгістрацыю назіральнікаў і іх працу на ўчастку. Старшыні камісіяў былі арыентаваныя на процідзеяньне ня ўсім назіральнікам, а

[7] Правы назіральніка адлюстраваныя ў частцы 4 арыкулу 13 Выбарчага кодэксу, а частка 5 гэтага артыкулу адзначае, чаго назіральнік ня мае права рабіць. Гл.: Избирательный кодекс Республики Беларусь. — Изд. 2, с изм. и доп. — Минск : Национальный центр правовой информации Республики Беларусь, 2001. Пры разглядзе гэтых праўных нормаў трэба ўлічваць, што ў дадзенай сытуацыі агульнапраўны прынцып "што не забаронена, тое дазволена" на практыцы ня дзейнічае: каб дамагчыся выкананьня сваіх патрабаваньняў, назіральнік мусіць знайсьці ў Выбарчым кодэксе альбо ў мэтадычных рэкамэндацыях па працы ўчастковых камісіяў норму, на якую ён можа спаслацца дзеля абгрунтаваньня сваіх дзеяньняў — інакш дамагчыся неабходнага вельмі і вельмі цяжка.

найперш самым актыўным зь іх, пры гэтым найбольшая ўвага зьвярталася на стварэньне ўмоваў, якія б не дазвалялі назіральнікам бачыць выдачу бюлетэняў і падлік галасоў, і на выдаленьне найбольш небясьпечных назіральнікаў.

Што да тых парушэньняў з боку назіральнікаў, якія б маглі выклікаць іх выдаленьне з участку, то яны былі сфармуляваныя ў артыкуле 13 Выбарчага кодэксу наўмысна туманна. Гэта спрыяла становішчу, калі любы назіральнік мог быць выдалены з участку за выкананьне сваіх непасрэдных абавязкаў. Так, напрыклад, замацаванае заканадаўча права назіральнікаў задаваць пытаньні старшыню камісіі трактавалася як забароненае тым жа Выбарчым кодэксам стварэньне перашкодаў працы камісіяў. Спробы засьведчыць пры дапамозе выбарнікаў выпадкі парушэньня заканадаўства тлумачыліся як забароненыя апытаньні грамадзянаў, якія парушаюць тайну галасаваньня. Патрабаваньні назіральнікаў спыніць фальсыфікацыі, выкладзеныя ў вызначанай Выбарчым кодэксам форме, успрымаліся як умяшальніцтва ў працу камісіяў. Падобныя інтэрпрэтацыі двухсэнсоўных нормаў кодэксу, сумешчаныя зь незразумелай забаронай назіральнікам аказваць інфармацыйную альбо мэтадычную дапамогу, стваралі становішча, калі кожны назіральнік мог быць выдалены з участку на жаданьне старшыні камісіі. Таксама выкарыстоўваліся і іншыя мэтодыкі псыхалягічнага ціску на назіральнікаў як на ўчастках, так і па-за іх межамі, часам нават з выкарыстаньнем сілавых сродкаў. Найбольш нахабнымі мэтадамі гэткі ціск ажыцьцяўляўся ў правінцыі, але ў розных формах фіксаваўся таксама ў буйных гарадах.

У гэтых умовах назіраньне за ходам галасаваньня ў значнай ступені рызыкавала страціць сваю эфэктыўнасьць і набыць фармальны характар: дамагчыся сапраўднай рэалізацыі сваіх правоў маглі толькі актыўныя і нават агрэсіўныя назіральнікі, якія за гэта маглі быць выдаленыя з выбарчых участкаў. Яны павінны былі ня толькі ведаць зьмест сваіх правоў, але таксама мусілі валодаць пэўнымі псыхалягічнымі тэхнікамі, якія б дазволілі гэтымі правамі скарыстацца. Падрыхтоўка такіх назіральнікаў, здольных процістаяць неспрыяльнаму і варожаму стаўленьню з боку выбарчых камісіяў, — такая задача стаяла перад арганізатарамі назіраньня за парлямэнцкімі выбарамі і рэфэрэндумам 2004 г.

Дзеля ціску на назіральнікаў і розных спосабаў процідзеяньня іх працы некаторыя з кандыдатаў у дэпутаты імкнуліся шырэй выкарыстоўваць магчымасьці іншых суб’ектаў назіраньня. Да такой тактыкі таксама падштурхоўвала інфармацыя пра пасьпяховасьць выкарыстаньня ў якасьці назіральнікаў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў падчас выбараў у Менскую гарадзкую раду, калі кансалідаванымі намаганьнямі групы дэпутатаў парлямэнту былі прызнаныя несапраўднымі вынікі выбараў у адной з акругаў. Аднак парлямэнцкія выбары — не мясцовыя, стаўкі тут былі больш высокія, і цалкам паўтарыць падобную мэтодыку было немагчыма. Таму спробы скарыстацца з магчымасьцяў назіраньня з боку дэпутатаў палаты прадстаўнікоў (абмежавана) і міжнародных назіральнікаў ад АБСЭ (больш шырока дзеля адноснай шматлікасьці сёлетняй місіі назіральнікаў), іншых замежных назіральнікаў не адыгралі вырашальнай ролі, хоць і паўплывалі на паводзіны канкрэтных участковых камісіяў у станоўчы бок.

Усе апазыцыйныя кандыдаты скарысталіся правам ажыцьцяўляць назіраньне праз сваіх давераных асобаў. Пры гэтым да апошняга моманту заставалася няпэўнасьць адносна таго, ці будуць яны дапушчаныя да працэдуры падліку галасоў па рэфэрэндуме. Да таго ж давераных асобаў у кандыдата магло быць ня болей за пятнаццаць, чаго было недастаткова для паўнавартаснага кантролю за галасаваньнем і падлікам галасоў. І, зразумела, зьняцьце са-

мога апазыцыйнага кандыдата аўтаматычна азначала адыход ад працы на ўчастку і ягоных давераных асобаў. Некаторыя з кандыдатаў актыўна прыцягвалі да маніторынгу выбарчага працэсу прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. Але пытаньне пра іх права назіраць за падлікам галасоў было неўрэгулявана Выбарчым кодэксам. Пры гэтым некаторыя камісіі патрабавалі ад журналістаў акрамя пасьведчаньня яшчэ і рэдакцыйнае заданьне ў выглядзе накіраваньня на дадзены выбарчы ўчастак, што беспадстаўна абмяжоўвала магчымасьці журналістаў назіраць за выбарамі і рэфэрэндумам.

У пытаньні экзыт-полу ў параўнаньні зь мінулымі выбарчымі кампаніямі пазыцыя выбарчых камісіяў рэзка зьмянілася. Дарма што такое дзеяньне не прадугледжанае нашым заканадаўствам, анічога проціпраўнага ў ім няма — пра гэта заяўлялі і сакратар Цэнтральнай камісіі Лазавік, і старшыня гэтай камісіі Ярмошына. Але раней, у 2001 г., гэтыя ж асобы вельмі апантана выступалі супраць экзыт-полу, таксама як і супраць усіх мэтодыкаў, зьвязаных з паралельным падлікам галасоў[8]. Цяпер такой варожасьці ў дачыненьні да мэтодыкі экзыт-полу і схемаў паралельнага падліку галасоў праяўлена не было, наадварот, дэманстравалася спрыяльнае стаўленьне. Правядзеньне экзыт-полу інсцэнаваў БРСМ — у яго руках гэтая праграма сталася папросту дадатковай прапагандысцкай акцыяй і сродкам абысьці забарону на агітацыю ў дзень галасаваньня (яшчэ адным такім сродкам былі апытаньні людзей на выхадзе з участкаў журналістамі дзяржаўных тэлеканалаў). Да таго ж, паводле ацэнак спэцыялістаў, мэтодыка правядзеньня экзыт-полу з боку БРСМ і яго партнэраў з ініцыятывы “Молодёжь за справедливые выборы” была дылетанцкай. Відаць, менавіта гэтая ініцыятыва і стала прычынай зьмены стаўленьня выбарчых камісіяў да экзыт-полу.

Зь іншага боку, правядзеньне 17 кастрычніка экзыт-полу сацыялягічнай службай Гелапа сутыкнулася з процідзеяньнем з боку міліцыянтаў: згодна з паведамленьнямі прэсы, у гэты дзень пры апытаньні выбарцаў на выхадзе з участкаў было затрымана больш за сто апытальнікаў.

Само праз сябе правядзеньне экзыт-полу ёсьць не элемэнт назіраньня, а адна з тэхналёгіяў канкурэнцыі на мэдыйным рынку. У гэтым сэнсе экзыт-пол БРСМ, быў бліжэйшы да сапраўднага экзыт-полу, чым тое, што рабіла апазыцыя пры дапамозе службы Гелапа. Такое ператварэньне “апазыцыйнага” экзыт-полу з сацыялягічна-інфармацыйнага мерапрыемства ў заменьнік назіраньня было выклікана тым, што немагчымасьць атрымаць ад назіральнікаў канкрэтныя лічбы вынікаў кампаніі была відавочная задоўга да выбараў. Але і дадзеныя экзыт-полу, праведзенага службай Гелапа, былі скарыстаныя замест дадзеных сыстэмы назіраньня — г. зн. не з “праваабарончай” функцыяй, а дзеля ацэнкі легітымнасьці вынікаў выбараў і рэфэрэндуму, то бок з “палітычнай” функцыяй.

Сытуацыя з дазволеным экзыт-полам сталася толькі адной з тых неспадзяванак, якую ўлады падрыхтавалі незалежным назіральнікам падчас выбараў 2004 г. Самай вялікай і істотнай зь іх была татальная адмова назіральнікам у азнаямленьні на ўчастках з выніковымі пратаколамі падліку галасоў, калі замест звыклага вывешваньня ў памяшканьні камісіі поўнай копіі выніковага пратаколу старшыні камісіяў вывешвалі 17 кастрычніка непадпісаную сябрамі камісіі цыдулку зь некалькімі лічбамі. Самыя жорсткія мэтады абмежаваньня правоў назіральнікаў,

[8] Гл., напрыклад, зьвесткі пра пазыцыю дзяржаўных службоўцаў у дачыненьні да розных мэтодыкаў маніторынгу выбарчага працэсу: Ревяко Т. Освещение деятельности гражданской инициативы “Независимое наблюдение” в СМИ // Выборы Президента Республики Беларусь – 2001: Факты и комментарии / Под ред. М. К. Плиско. — Минск : Тесей, 2002. С. 53—64.

якія раней выкарыстоўваліся ў правінцыі, у аддаленых раёнах, былі пашыраныя на ўсю краіну.

Такім чынам, замацаваўшы ў Выбарчым кодэксе магчымасьць ажыцьцяўленьня назіраньня за выбарамі, улады радыкальна абмежавалі яе прыняцьцем падзаконных актаў і пашырэньнем незаконных практык. Напярэдадні парлямэнцкіх выбараў і канстытуцыйнага рэфэрэндуму яны ўжылі дадатковыя захады для нэўтралізацыі небясьпекі, якая паўставала перад дзяржаўнай машынай фальсыфікацыяў. Гэтыя захады ўключалі ў сябе таксама напады на офісы незалежнай сыстэмы назіраньня, зьбіцьцё назіральнікаў і журналістаў, выдаленьне замежных назіральнікаў і г. д. Аднак і ў гэтых неспрыяльных умовах незалежнае назіраньне здолела разгарнуцца дзякуючы досьведу, які быў атрыманы падчас папярэдніх выбарчых кампаніяў у Беларусі.

## Палітычная гісторыя ўнутранага назіраньня за выбарамі ў Беларусі

Першая агульнанацыянальная і сыстэмная кампанія назіраньня за выбарамі была падчас выбараў дэпутатаў палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі 2-га скліканьня ў 2000 г., з давыбарамі ўвесну 2001 г. Гэтая кампанія праводзілася па ўступленьні ў сілу Выбарчага кодэксу. Яго прыняцьце паклала канец той схеме працы назіральнікаў (збольшага зьвязаных з БНФ і не арганізаваных у адзіную сыстэму назіраньня), якая пераважала да 1996 г., калі назіральнікі карысталіся павагай з боку камісіяў, а часам нават і лічылі галасы разам зь іх сябрамі.

Падчас выбараў у палату прадстаўнікоў у 2000—2001 гг. функцыя абароны іх вынікаў была пакінутая цалкам па-за ўвагай незалежных назіральнікаў — стаўка была зробленая на выяўленьне максымальнай колькасьці парушэньняў заканадаўства з тым, каб давесьці несправядлівасьць гэтых выбараў і незаконнасьць сфармаванага ў іх ходзе парлямэнту. Менавіта ў гэтым напрамку ішла праца па маніторынгу выбарчай кампаніі, распачатая Праваабарончым цэнтрам “Вясна”. Адначасова маштабная кампанія назіраньня была зьдзейсьненая групай грамадзкіх аб’яднаньняў на чале з Цэнтральнай каардынацыйнай радай (ЦКР) па назіраньні за выбарамі пры арганізацыйна-мэтадычнай дапамозе АБСЭ. Паралельна Беларускім Хельсынскім камітэтам пры падтрымцы Міжнароднай Хельсынскай фэдэрацыі ладзілася ўласная праграма маніторынгу парушэньняў.

Дзейнасьць структураў ЦКР у 1999—2001 гг., калі на выбарчыя ўчасткі было накіравана 5000 назіральнікаў, стала першай спробай сапраўды маштабнага і сыстэмнага назіраньня за выбарамі. Арганізацыйныя і аналітычныя распрацоўкі ўдзельнікаў гэтай сыстэмы сталі падмуркам для кампаніі назіраньня за выбарамі прэзыдэнта ў 2001 г. Але і ўлады зразумелі, што ў іх зьявіўся новы небясьпечны вораг.

Схема сыстэмы назіраньня за выбарамі прэзыдэнта ў 2001 г. была пабудаваная шляхам зрошчваньня структураў ЦКР і Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі — найбуйнейшага парасонавага аб’яднаньня “трэцяга сэктару”, якое заявіла пра свой намер удзельнічаць у назіраньні на сваім III кангрэсе. У выніку перамоваў паміж кіраўніцтвам ЦКР, якая мела досьвед агульнанацыянальнага назіраньня за папярэднімі парлямэнцкімі выбарамі, і кіраўніцтвам Асамблеі НДА, якое абапіралася на жаданьне двухсот грамадзкіх аб’-

яднаньняў паўдзельнічаць у назіраньні, была ўтворана Грамадзянская ініцыятыва "Незалежнае назіраньне", якая і ажыцьцяўляла назіраньне падчас выбарчай кампаніі 2001 г.

Вынік назіраньня быў няўцешны. Гэта тлумачылася слабасьцю няўрадавых арганізацыяў як такіх (яны прадэманстравалі высокі ўзровень супрацоўніцтва, але мелі мала сяброў і не карысталіся падтрымкаю ў грамадзтве). Расчараваньне ўзмацнялася адсутнасьцю ўплыву незалежнага назіраньня на ход палітычнай барацьбы. На яго таксама паў і цень зьняверанья ў дэмакратычнай апазыцыі, якая ня здолела вылучыць моцнага кандыдата, рэальна ня здолела перамагчы і не паказала кірунку працы, які мог бы прывесьці да перамогі. Пашыралася меркаваньне, што назіральнікі мусяць быць зацікаўленыя ў выніках выбараў, мусяць быць на адным з бакоў у палітычнай барацьбе, мусяць адстойваць інтарэсы дэмакратычнай апазыцыі і ўвогуле працаваць на карысьць зьмены ўлады ў Беларусі. Міт пра "незалежнасьць" і "незацікаўленасьць" назіральнікаў быў разьвеяны.

## Структуры назіраньня-2004

Незалежнае назіраньне ў 2004 г. мела канфігурацыю, якая была вызначаная некалькімі рознымі чыньнікамі. Па-першае, выкладзены ў папярэднім падразьдзеле досьвед папярэдніх кампаніяў назіраньня стаў прычынай стварэньня Грамадзянскай ініцыятывы "Партнэрства", якая заявіла пра стварэньне спэцыяльнай шырокай структуры для назіраньня за выбарчым працэсам, зь вялікай колькасьцю назіральнікаў на ўчастках. Узьнікненьне такой структуры, незалежнай ад лідэраў беларускіх апазыцыйных партыяў (хоць і нельга казаць, што створанай бязь іх ведама), выклікала іх незадаволенасьць, бо яны таксама прэтэндавалі на стварэньне ўласнай (партыйнай) сыстэмы назіраньня. Па-другое, у 2004 г. былі выдаленыя з гульні шмат якія структуры, якія б маглі ажыцьцяўляць назіраньне (займаліся ім раней, падчас папярэдніх выбараў, альбо валодалі дастатковым аўтарытэтам і досьведам, каб заняцца ім): у 2003 г. судамі быў зачынены шэраг патэнцыйна небясьпечных грамадзкіх аб'яднаньняў, супраць кіраўніцтва БХК была ўзбуджаная крымінальная справа, шэраг актывістаў адчувалі на сабе ціск з боку спэцслужбаў. Па-трэцяе, паменшаў аптымізм што да магчымасьцяў назіраньня паўплываць на ход і вынікі выбараў.

Мэта, якая ставілася перад ГІ "Партнэрства", палягала ў стварэньні стала дзейнай структуры для назіраньня за выбарамі. Новая структура плянавала абаперціся на правядзеньне сацыяльных кампаніяў для мясцовых супольнасьцяў, якія б забясьпечылі пазытыўны імідж для арганізацыі на лякальным узроўні і прыцягнулі б да працы новых людзей. Таксама выстаўлялася задача наладжваньня кантактаў і супрацоўніцтва з органамі мясцовай улады і самакіраваньня — гэта дазволіла б напярэдадні выбараў заручыцца іх спрыяльным альбо нэўтральным стаўленьнем да правядзеньня выбарчага маніторынгу.

Такая схема працы сутыкнулася зь неспадзяванымі цяжкасьцямі. Мясцовыя кампаніі не прывялі да масавага прытоку ў арганізацыю новых актывістаў, а большасьць грамадзянаў з розных прычынаў не былі настроеныя на выяўленьне палітычнай актыўнасьці нават падчас выбараў. Сацыяльная актывізацыя мясцовай супольнасьці пры дапамозе грамадзянскіх кампаніяў не пацягнула за сабой павелічэньня чалавечага рэсурсу структураў назіраньня. Адначасова намер супрацоўніцтва зь мясцовымі органамі ўлады і кіраваньня так і застаўся намерам. Менавіта гэтае палажэньне ў статуце ГІ "Партнэрства" сталася прычынай для адмовы ў яе

рэгістрацыі, і яна была вымушаная, як і ў 2001 г., дзейнічаць у паўлегальным стане "грамадзянскай ініцыятывы". У выніку ГІ "Партнэрства" як арганізацыя была выведзеная з-пад юрыдычнага ціску (яе юрыдычна не існавала), але яе актывісты адчувалі прэсынг з боку КДБ, пракуратуры, іншых сілавых структураў. Адсутнасьць легальнага статусу выклікала таксама пэўныя тэхнічныя нязручнасьці пры вылучэньні назіральнікаў на ўчасткі — іх даводзілася вылучаць ад іншай (зарэгістраванай) няўрадавай арганізацыі альбо шляхам збору подпісаў.

"Партнэрства" адразу выклікала крытыку з боку палітычных партыяў. Адсутнасьць іх кантролю за працай сыстэмы назіраньня (як на нацыянальным, так і на лякальным узроўнях) азначала страту важнага палітычнага праекту, які разглядаўся як важны фінансавы рэсурс для палітычнай дзейнасьці. Выказвалася перасьцярога, што незалежныя назіральнікі будуць працаваць на карысьць адной з палітычных сілаў. Адзначалася, што новая структура была навязаная звонку, а ня ўзьнікла ў выніку перамоваў грамадзкіх лідэраў. Таксама і яе падкрэсьлена пазапартыйны характар прыводзіў альбо да канфліктаў з партыйнымі структурамі на месцах, альбо, у некаторых выпадках, да дзіўнай сытуацыі: мясцовыя партыйныя структуры і кандыдаты ад партыяў шчыльна супрацоўнічалі з "Партнэрствам" у той час, як цэнтральныя апараты партыяў выяўлялі рэзка адмоўнае стаўленьне да яго. На этапе фармаваньня і навучаньня корпусу назіральнікаў на адрас ГІ "Партнэрства" сыпаліся абвінавачаньні ў празэлітызьме — перацягваньні актывістаў з партыйных структураў і старых няўрадавых арганізацыяў. Прамежкавыя справаздачы доўгатэрміновага незалежнага назіраньня таксама крытыкаваліся за тое, што ў іх часам фіксаваліся парушэньні з боку партыйных кандыдатаў. Але з набліжэньнем выбараў крытыка ГІ "Партнэрства" рабілася ўсё больш сытуацыйнай (крытыкаваліся асобныя дзеяньні і пасажы з справаздачаў) і ў рэшце рэшт была амаль спыненая.

Альтэрнатывай назіраньню з боку ГІ "Партнэрства", на думку партыйных актывістаў, павінны былі стаць партыйныя назіральнікі. Напярэдадні выбараў Народнай кааліцыяй "5+" пачала фармавацца ўласная сетка партыйнага назіраньня, арыентаваная на кандыдатаў. Іх большасьць належала да палітычных партыяў і карысталася магчымасьцю вылучэньня назіральнікаў на ўчасткі. Агульная колькасьць партыйных назіральнікаў, давераных асобаў кандыдатаў і зьвязаных з кандыдатамі назіральнікаў ад грамадзкіх аб'яднаньняў складала больш за 3000 і была параўнальная з колькасьцю назіральнікаў ГІ "Партнэрства", але як адзіная сетка гэтыя назіральнікі не працавалі, збор інфармацыі на агульнанацыянальным узроўні не праводзіўся. Згодна з схемай супрацоўніцтва гэтых дзьвюх структураў, назіральнікі, зьвязаныя з палітычнымі партыямі і кандыдатамі, павінны былі перш за ўсё працаваць на прадухіленьне фальсыфікацыяў на канкрэтным выбарчым участку, часам нават рызыкуючы быць выдаленымі з участку, назіральнікі ж ад "Партнэрства" павінны былі забясьпечыць апэратыўны і якасны паралельны падлік галасоў, а таксама выяўленьне парушэньняў заканадаўства. Такім чынам, на кандыдацкае назіраньне была ўскладзеная функцыя назіраньня, якую мы пазначылі як "праўную", а незалежнае назіраньне арыентавалася на выкананьне "палітычнай" функцыі. На жаль, падобная схема існавала толькі як тэарэтычная мадэль, якая выкарыстоўвалася для матывацыі і навучаньня назіральнікаў, як рэальны мэханізм яна не спрацавала. Ва ўмовах, калі большасьць участковых выбарчых камісіяў ужо мелі загадзя падрыхтаваныя выніковыя лічбы галасаваньня, праца абедзьвюх групаў назіральнікаў была ў чарговы раз зьведзеная да канстатацыі несумленнасьці, недэмакратычнасьці і непразрыстасьці выбараў і рэфэрэндуму.

У адрозьненьне ад партыйнага назіраньня назіральнікі ад ГІ "Партнэрства" не залежалі ад палітычнага раскладу ў канкрэтнай мясцовасьці. Калі ў канцы верасьня адбываліся масавыя нерэгістрацыі кандыдатаў, а ў тыдзень датэрміновага галасаваньня — зьняцьце кандыдатаў за парушэньні парадку агітацыі, ня ўсе дэмакратычныя кандыдаты знайшлі ў сабе сілы працягваць сыстэмнае назіраньне за выбарамі і рэфэрэндумам. Назіральнікі ГІ "Партнэрства" (іх было больш за 3500) прадказальна сталі асноўным рэсурсам інфармацыі пра ход датэрміновага галасаваньня. Але аніякіх прынцыпова новых тэхналёгіяў назіраньня ані ГІ "Партнэрства", ані партыйныя назіральнікі не прадэманстравалі — праца абедзьвюх групаў не стварала ўражаньня арыентаванай на ўдзел у пераможнай стратэгіі.

Барацьба за кантрольны пакет у палітычным праекце "назіраньне за выбарамі" не была зьвязаная з павышэньнем яго рэальнай эфэктыўнасьці. Палеміка паміж партыйным і незалежным назіраньнем не адыграла істотнай ролі ў выніках кампаніі і засталася прыватнай дыскусіяй паміж неўплывовымі актарамі. Яна стала індыкатарам адсутнасьці ў апазыцыі бачаньня мэханізму заваёвы ўлады — найбольш выразна гэта ўсьведамлялі самі шараговыя назіральнікі, якія часам не маглі растлумачыць сабе, якую карысьць прынесла іх прысутнасьць на выбарчым участку.

Больш пасьпяховым кірункам працы структур незалежнага назіраньня ў пэрыяд перадвыбарнай кампаніі было яе праўнае забесьпячэньне. Напрыклад, гучнай акцыяй Беларускага Хельсынскага камітэту была юрыдычная ацэнка прызначанага рэфэрэндуму — рэакцыяй на яе была імгненная падача ў Вярхоўны суд пазову аб ліквідацыі БХК (пазьней гэты пазоў быў вернуты Вярхоўным судом на дапрацоўку).

Незадоўга да саміх выбараў была заяўленая спроба стварыць адзіны каардынацыйны цэнтар для розных структураў назіраньня пад шыльдай Аргкамітэту грамадзянскай ініцыятывы "За справядлівыя выбары". Адбывалася гэта тады, калі розныя цэнтры, здольныя ажыцьцяўляць назіраньне, ужо сплянавалі сваю працу. Таму навастворaная ініцыятыва пад кіраўніцтвам акадэміка Аляксандра Вайтовіча ня здолела выканаць заяўленай функцыі і абмежавалася распаўсюджваньнем інфармацыі пра ход выбараў і рэфэрэндуму.

Аналіз канфігурацыі назіральніцкіх структураў быў бы няпоўны, калі б мы не ўлічылі "назіральнікаў", высунутых уладамі. Зыходзячы з аналізу паведамленьняў Цэнтральнай выбарчай камісіі, іх колькасьць была небывала вялікай і сягала, прынамсі, 10 000 асобаў. У гэтым назіраньні бралі ўдзел чальцы вэтэранскіх і жаночых грамадзкіх аб'яднаньняў, ФПБ, БРСМ, палітычных партыяў "канструктыўнай апазыцыі" — Беларускай патрыятычнай партыі, Лібэральна-дэмакратычнай партыі, іншых праўладных арганізацыяў. Яны выконвалі тую ж функцыю, што і місія назіральнікаў ад краінаў СНД, — засьведчыць справядлівасьць і дэмакратычнасьць выбараў і рэфэрэндуму. Іх іншай, менш заўважнай функцыяй была нэўтралізацыя назіральнікаў, накіраваных дэмакратычнымі сіламі, часам нават з ужываньнем фізычнай сілы. Гэтаму ж служыла і новая прыдумка ўладаў: ці не ўпершыню ў Менску былі зафіксаваныя "фальшывыя незалежныя назіральнікі", якія маскаваліся пад дэмакратычных назіральнікаў. Місіі "назіральнікаў" ад органаў унутраных справаў, КДБ, пракуратуры і службы аховы прэзыдэнта, ад выканаўчай вэртыкалі на некаторых участках перавышалі колькасьцю склад участковай камісіі. Часам гэтыя "назіральнікі" валодалі большымі паўнамоцтвамі, чым самі сябры камісіі, — некаторыя зь іх і былі той сілай, якая рэальна арганізоўвала і кантралявала правядзеньне выбараў.

Такім чынам, канфігурацыя назіраньня за выбарамі і рэфэрэндумам 17 кастрычніка 2004

г. складалася з разгалінаванай сыстэмы незалежнага назіраньня і дэцэнтралізаванай ды арыентаванай на кандыдатаў сыстэмы партыйнага, зацікаўленага назіраньня. Яна таксама ўключала ў сябе шэраг арганізацыяў, якія займаліся доўгатэрміновым назіраньнем і маніторынгам выбарчага працэсу. Такая канфігурацыя структураў назіраньня процістаяла "машыне дасягненьня патрэбнага выніку". Якімі былі вынікі гэтага процістаяньня? Як і раней, функцыя ўплыву на вынікі выбараў і абароны волевыяўленьня народу не была выкананая.

## Вынікі назіраньня-2004

Пагроза з боку назіральнікаў для ўладаў у "югаслаўскім" варыянце адсутнічала. Наша назіраньне не зьмяніла палітычнага рэжыму ў краіне — ды яно і ня ставіла перад сабой такой мэты ў кароткатэрміновай пэрспэктыве. Здаецца, гэта зразумелі і апазыцыя (на назіральнікаў ускладалася менш спадзяваньняў), і ўлады. Калі ў 2001 г. назіральнікі былі для лукашэнкаўскай прапаганды адным з галоўных ворагаў, то ў 2004 г. шальмаваньне незалежнага назіраньня за выбарамі займала менш месца. Намаганьні ўладаў процідзеяць назіральнікам сталі больш эфэктыўнымі. Адмова ў азнаямленьні з пратаколамі волевыяўленьня канчаткова зрабіла зь яго дзяржаўную таямніцу — у назіральнікаў практычна не засталося рэчавых доказаў таго, што сапраўды адбывалася 17 кастрычніка на выбарчых участках пры падліку галасоў.

Сыстэма арганізацыі перамогі дзейнага рэжыму і падліку галасоў дзейнічала настолькі эфэктыўна, што не пакінула і ценю сумневу пра сапраўдны характар гэтых палітычных кампаніяў. У параўнаньні нават зь мінулымі выбарчымі кампаніямі і рэфэрэндумамі ўзровень ціску быў у 2004 г. непараўнальна большы. Сёньня гэтая сыстэма дазваляе кіраўнічаму рэжыму дамагчыся патрэбных лікаў нават тады, калі пераважная большасьць грамадзтва выступае супраць яго. Назіраньне само празь сябе ня можа перашкодзіць ёй — яно можа толькі канстатаваць тое, што адбываецца. Сама наяўнасьць назіральнікаў на выбарчых участках не ўплывае на ўзровень і маштаб парушэньняў і фальсыфікацыяў.

Ці выканала назіраньне сваю функцыю? Так, функцыя фіксацыі парушэньняў і ўплыву на прызнаньне/непрызнаньне выбараў і рэфэрэндуму была выкананая пасьпяхова. Ці дасягнула назіраньне сваёй мэты прадухіленьня парушэньняў? Не. Зыходзячы з афіцыйных вынікаў, немагчыма нават прыблізна ацаніць, якая была воля беларускага народу. Ці патрэбнае нам назіраньне як абавязковы элемэнт мэханізму трансфармацыі аўтарытарнага рэжыму ў дэмакратычны? Гэта выклікае сур'ёзныя сумневы.

Назіраньне як элемэнт абароны вынікаў выбараў спрацоўвае тады, калі краіна аб'ектыўна рухаецца да дэмакратыі: у грамадзтве ёсьць адпаведны настрой, грамадзянская супольнасьць мае разьвітую сетку структураў, уладная эліта перажывае стомленасьць і страх перад апазыцыяй. У Беларусі нічога такога няма: аўтарытарны рэжым не лібэралізуецца, а ўмацоўваецца, а аўтарытарны лідэр упэўнена праводзіць палітыку кансалідацыі ўсяго грамадзтва пад сваім кантролем — і інсцэнаваньне выбараў выконвае ўсяго толькі функцыю яднаньня грамадзтва, а не выяўленьня народнай волі.

Ці магчымы ў Беларусі югаслаўскі, украінскі альбо грузінскі варыянт пераходу да дэмакратыі? Масавыя акцыі і актыўныя грамадзянскія дзеяньні пратэсту ёсьць прынцыповым мэханізмам адстойваньня сапраўдных вынікаў выбараў. Бяз гэтага назіраньне застаецца толькі

маніторынгам парушэньняў, а абараніць волю народу няздольнае. 18 кастрычніка быў вынік, які трэба было абараняць, але волі абараняць яго ў грамадзтве не было. Народ, за выняткам некалькіх тысячаў чалавек, зьмірыўся з тым, што ягоныя галасы не былі пачутыя кіраўнічай элітай. У кастрычніку 2004 г. адбылося тое ж, што адбылося і ў верасьні 2001 г., з той толькі розьніцай, што абараніць свой грамадзянскі голас выйшла яшчэ менш людзей.

Падобная да спэктаклю кампанія 17 кастрычніка была расцэненая некаторымі назіральнікамі як канец выбараў у Беларусі. Гэта галоўны вынік назіраньня. Канец выбараў азначае канец назіраньня за выбарамі. Нашу сыстэму назіраньня можна ўдасканальваць, але без эфэктыўнай стратэгіі, скіраванай на дасягненьне перамогі, яна — нішто.

## САЦЫЯЛЯГІЧНЫЯ ДАСЬЛЕДАВАНЬНІ Ў ПАЛІТЫЧНАЙ КАМПАНІІ 2004 Г.

Першая канцэптуальная крытыка электаральных дасьледаваньняў у Эўропе пачынаецца ў 1960-х гг., калі іх маніпуляцыйны эфэкт на масавую сьвядомасьць становіцца відавочным, як і непазьбежнасьць сацыяльнай і палітычнай ангажаванасьці сацыёляга. З таго часу сацыялягічныя дасьледаваньні ды іх крытыка ёсьць неад’емнай часткаю ляндшафту палітычных сыстэмаў.

Электаральныя дасьледаваньні ня гралі істотнай ролі ў палітычнай практыцы выбараў у Вярхоўную Раду ў 1990 г., першых адносна свабодных і дэмакратычных. Было б няправільна зьвязваць гэта зь неразьвітасьцю сацыялягічнай інфраструктуры. Палітычная культура асноўных удзельнікаў выбарчага працэсу была далёкая ад сацыялягічнага разуменьня выбарчага працэсу і ў сваіх чаканьнях і прагнозах арыентавалася на “народ”, які разумеўся як супольнасьць уласнага досьведу, альбо тэарэтычны канструкт. Паводзіны людзей лічыліся хутчэй відавочнымі, чым рацыянальнымі, і сьвядомасьць “народу” была абсалютна празрыстай і схільнай да навучаньня ды асьветы[1].

Толькі з каляпсам савецкай рэчаіснасьці празрысты народ пачаў распадацца на непразрыстую грамадзкую думку, якая патрабавала ўжо не лягічнага ці гістарычнага аналізу, але матэматычнага вымярэньня, вымярэньня ў адсотках, якое дасягалася з выкарыстаньнем ужо зусім непразрыстых як для палітыкаў, так і грамадзтва сацыялягічных працэдураў, што выступалі ад імя “навукі” і “аб’ектыўнасьці”[2].

Успрыманьне сацыялягічных апытаньняў павольна мянялася — да іх пачалі ставіцца больш сур’ёзна, хоць вельмі часта — некрытычна. Сацыялёгія станавілася важным элемэнтам палітычнага жыцьця, у той жа час яе адаптацыя была вельмі неаднастайная сярод розных палітычных сілаў. Цяпер ужо можна казаць пра агульную веру ў адэкватнасьць

[1] Гэты апошні пэрыяд “асьветніцтва” вызначаўся адсутнасьцю канцэпту “палітычныя тэхналёгіі” і вялікай цікавасьцю да “навукі” ды “праўды”, а таксама слабым разуменьнем удзельнікамі палітычнага працэсу сацыялёгіі як такой.

[2] Хуткасьць адаптацыі залежала ня толькі ад палітычнай культуры “кансэрватары/прагрэсісты”, але і пэрсанальных якасьцяў лідэраў. “Крыжакі”, адданыя ідэі, былі менш схільныя цікавіцца сацыялёгіяй, чым “прагматыкі”, схільныя да перайманьня настрояў свайго атачэньня. (Пра палітычныя і псыхалягічныя адрозьненьні “крыжакоў” і “прагматыкаў” гл. падрабязьней: Снарэ Ч. Калі я як палітычны аналітык магу ўплываць на палітычны працэс // Палітычная сфера. 2002. № 2.)

“сацыялягічнага мэтаду”, пры тым што захоўваўся недавер да канкрэтных крыніцаў сацыялягічнай інфармацыі[3].

Практыка электаральных сацыялягічных дасьледаваньняў зьявілася на пачатку 1990-х гг., але доўгі час заставалася на пэрыфэрыі палітычнага працэсу. Пра валіднасьць гэтых дасьледаваньняў таксама вельмі цяжка казаць, у любым выпадку яны былі ня вельмі дакладныя і ня вельмі папулярныя. На прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г. праводзілася некалькі агульнанацыянальных апытаньняў, найбольш характэрнымі рысамі якіх было заніжэньне папулярнасьці ня столькі З. Пазьняка (4—11 % — паводле сацыялягічных дасьледаваньняў, на выбарах — 12,8 %; памылку ў 1—2 % ня варта лічыць ганебнай), колькі А. Лукашэнкі (20—21 % — паводле сацыялягічнага дасьледаваньня, на выбарах — 44,8 %). Далейшыя выбары, рэфэрэндумы 1995—1996 гг. мала зьмянілі палітычную ролю сацыялёгіі. Але ўжо пасьля 1997 г., калі апазыцыя набывае несыстэмны характар, сацыялёгія становіцца ці не адзіным сродкам інфармацыі пра грамадзтва і яго палітычныя настроі. У гэты ж час на сацыялягічныя дасьледаваньні пачынаюць ускладацца неапраўдана высокія надзеі, а сацыялягічныя дадзеныя абмяркоўваюцца для тлумачэньня прычынаў паражэньня палітычных сілаў. Гэты дыскурс становіцца ўсё больш і больш уплывовым, і, у рэшце рэшт, недзе з 1999 г. ніякае палітычнае плянаваньне ці дыскусія не вядзецца без апэляцыі да сацыялёгіі. У другой палове 1990-х “сацыялягічны” дыскурс трывала пранікае ў тканку палітычнага працэсу і ў пэўнай ступені пачынае кіраваць моваю і лёгікай палітычных групаў. З кампаніі 2001 г. узрастаньне актыўнай палітычнай ролі эмпірычнай сацыялёгіі становіцца відавочным, менавіта падчас апошніх прэзыдэнцкіх выбараў яна фармуецца ў адзін з сродкаў палітычнай гульні.

Пасьля атрыманьня сацыялягічнымі дасьледаваньнямі неабходнай легітымнасьці адкрываюцца шматлікія шляхі іх палітычнага выкарыстаньня. Сацыялёгія можа даваць інфармацыю для палітычнага плянаваньня, у такой форме яна пачынае паўсюдна выкарыстоўвацца ў беларускіх палітычных кампаніях недзе з 2000 г.

“Веда пра рэйтынг”, аднак, парадаксальным чынам уплывае на сам рэйтынг. Гэты фэномэн быў заўважаны яшчэ да другой сусьветнай вайны, што паступова ператварыла яго ў адну з так званых “палітычных тэхналёгіяў”. Высокі рэйтынг дае доступ да іншага ўзроўню сацыяльнай і палітычнай рэпрэзэнтацыі, натхняе прыхільнікаў і актывістаў да больш эфэктыўнай працы і стварае ў інфармацыйнай прасторы вобраз рэспэктабэльнасьці і ўплывовасьці, што яшчэ больш павялічвае рэйтынг. Дэманстраваньне рэйтынгу вельмі істотна для сэлекцыі значнасьці, а ўва ўмовах пазасыстэмнай дзейнасьці гэта яшчэ больш варта ўвагі. У беларускіх палітычных кампаніях першае шчыльнае дэманстраваньне рэйтынгу мела месца ў кампаніі 2001 г., калі важнымі былі паведамленьні пра “падзеньне рэйтынгу А. Лукашэнкі”, кампанія 2004 г. замацавала актуальнасьць такіх практыкаў.

Яшчэ адной значнай палітычнай функцыяй электаральных дасьледаваньняў ёсьць кантроль за сапраўднасьцю вынікаў палітычнага працэсу — галасаваньня. Менавіта вэрыфікацыя афіцыйнай інфармацыі праз сацыялёгію стала важнай часткаю палітычнай кампаніі па выбарах у парлямэнт і рэфэрэндуме 2004 г. Ува ўмовах адсутнасьці даверу да працэдуры падліку, дадзеныя сацыялягічных дасьледаваньняў прэзэнтаваліся як інфармацыя, якая заслугоўвае даверу, закліканая альбо павысіць легітымнасьць афіцыйных вынікаў, альбо разбурыць яе.

[3] “Сацыялягічная” аргумэнтацыя і спасылкі на “сацыялягічныя дасьледаваньні” ёсьць важны элемэнт практычна любой сучаснай палітычнай дыскусіі.

## Працэдуры сацыялягічнага дасьледаваньня

Для таго каб далей аналізаваць электаральную сацыялёгію, трэба коратка пазначыць асноўныя мэханізмы дасьледаваньняў, якія вызначаюць іх валіднасьць[4].

Першая працэдура — складаньне анкеты (сьпіс пытаньняў і адказы на іх). Гэтая стадыя можа спараджаць памылкі, якія ўплываюць на якасьць дасьледаваньня, а таксама адкрываюць прастору для маніпуляваньня будучымі вынікамі (часам і спробы маніпуляваць грамадзкай думкай пры дапамозе сацыялягічных дасьледаваньняў спараджаюць такія памылкі, калі, напрыклад, сацыялягічная агенцыя праводзіць выбарку на дзяржаўных прадпрыемствах пад кантролем іх кіраўніцтва). Пэўным чынам пастаўленае пытаньне можа прадвызначыць адказ. У прыватнасьці, фірма “Экаом”, праводзячы свае апытаньні ў жніўні 2004 г., на пытаньне “Что сделано президентом Беларуси за последние 10 лет” прапаноўвала адказы “очень много полезного”, “много полезного”, “немало хорошего”, “мало чего полезного”, “ничего хорошего”. Ці яшчэ больш красамоўна: на пытаньне “Что ждет страну, если президентом РБ будет избран член оппозиции?” прапаноўваліся адказы “неопределенность”, “политическая неразбериха”, “развал” и “прихватизация” экономики”, “процветание” и “ничего не изменится”. Натуральна, што такое апытаньне будзе паказваць больш высокія рэйтынгі кіраўнічых групаў і вельмі нізкія — для апазыцыі.

Але галоўнай праблемаю кампаніі 2004 г. стала фармуляваньне ў сацыялягічных дасьледаваньнях пытаньня пра рэфэрэндум. Да верасьня ўсе недзяржаўныя інстытуцыі задавалі яго ў форме, падобнай да такой: “Если на референдум будет вынесен вопрос об отмене ограничений на право занимать президентский пост одним и тем же человеком более двух раз, как вы будете голосовать?” (“Новак”). Але гэта, з палітычнага пункту гледжаньня, далёка ня тоесна таму, што потым было надрукавана ў бюлетэнях:

“Разрешаете ли Вы первому Президенту Республики Беларусь Лукашенко А. Г. участвовать в качестве кандидата в Президенты Республики Беларусь в выборах Президента и принимаете ли часть первую статьи 81 Конституции Республики Беларусь в следующей редакции:

“Президент избирается на пять лет непосредственно народом Республики Беларусь на основе всеобщего, свободного, равного и прямого избирательного права при тайном голосовании”?[5]

Калі пытаньне ў дасьледаваньнях было сфармулявана такім чынам, паказьнікі падтрымкі ўзрасьлі — з 32 % да 39 % у “Gallup”, а ў ЦСПД пры БДУ склалі нават 68,6 %.

Наступным праблемным элемэнтам працэдуры сацыялягічных дасьледаваньняў ёсьць сетка анкетэраў, праца якіх часта выступае асноўнаю прычынаю вялікай розьніцы ў лічбах і крыніцаю памылак.

Анкетэры таксама людзі — яны могуць самастойна запаўняць анкеты, распаўсюджваць іх

[4] Адразу выключым магчымасьць сьвядомых маніпуляцыяў вынікаў, гэта не патрабуе аналізу.

[5] Фармулёўка пытаньня рэфэрэндуму мела вельмі вялікае значэньне, улічваючы непрыхільнасьць большасьці беларусаў да зьмены Канстытуцыі ў прынцыпе. Менавіта таму пытаньне на рэфэрэндуме так і не было зьмешчана ў бюлетэнях на беларускай мове.

выключна сярод сваіх сяброў і іншымі сродкамі несумленна выконваць сваю працу, асабліва калі дасьледаваньні ідуць адзін за адным і сетка выяўляе прыкметы стомленасьці. Выбар сеткі мае вялікае значэньне для вынікаў дасьледаваньня, і тут неэфэктыўна выбіраць найбольш лёгкі шлях. Напрыклад, існуюць усе падставы лічыць, што ІСПД і "Экаом" у якасьці асновы для апытаньняў выкарыстоўвалі розныя структуры выканаўчай вэртыкалі. "Gallup-IRI", у сваю чаргу, занадта актыўна выкарыстоўвае для сацыялягічных мэтаў структуры грамадзянскай супольнасьці і палітычных актывістаў.

У прыватнасьці, у сацыялягічным дасьледаваньні "Gallup-IRI" ўвосень 2002 г. (прэзэнтавана ў пачатку 2003 г.) рэйтынгі вядомасьці такіх грамадзкіх арганізацыяў, як "Верас", "РША", цэнтар "Рэгіён" і г. д., якія малавядомыя нават для ангажаваных у сыстэму НДА, складалі 20—30 %, што проста нерэальна і больш чым сумнеўна (гл.: Бюлетэнь асамблеі няўрадавых арганізацыяў. Люты—сакавік 2003 г.). Недавер таксама выклікае тое, нібыта ўлетку 2004 г. 26—29 % насельніцтва адчувала, што такія палітычныя суб'екты, як "Зубр", "Свабодная Беларусь" і "Рэспубліка", разумеюць праблемы шараговых беларусаў (Gallup, жнівень 2004 г.).

Наступны важны момант — ацэнка вынікаў, кантроль і інтэрпрэтацыя дадзеных. Ацэнка можа выявіць "недапрацоўкі" ланцугоў сеткі, ігнараваньне якіх можа нэгатыўна ўплываць на аналітыку сацыялягічнага дасьледаваньня. На стадыі ацэнкі можна выявіць неабгрунтаванае заніжэньне ці завышэньне вынікаў, малаверагодную раскладку па рэгіёнах ці ўзроставых групах і для "збалянсаваньня" правесьці дадатковыя дасьледаваньні.

## Поле эмпірычнай сацыялёгіі

Доступ да рынку сацыялягічных дасьледаваньняў электарату зьвязаны з пэўнымі абмежаваньнямі — перш за ўсё арганізацыйнага характару. Толькі нязначная колькасьць інстытуцыяў Беларусі здольная праводзіць такія дасьледаваньні, яшчэ меншая мае досьвед і адпаведную замову.

*Інстытут сацыялёгіі Нацыянальнай акадэміі навук.* "Акадэмічная" сацыялягічная ўстанова Беларусі, утвораная ў 1990 г. (раней акадэмічная сацыялёгія існавала ў межах Інстытуту філязофіі і права АН БССР). Акрамя фундамэнтальных дасьледаваньняў, інстытут праводзіць маніторынг сацыяльных працэсаў Беларусі, у тым ліку і палітычных. Частка палітычных дасьледаваньняў мае "плянавы" характар і ўваходзіць у фармат пэрыядычнага маніторынгу сацыяльных працэсаў у Беларусі. Другая частка праводзіцца на замову дзяржаўных органаў. У жніўні 2004 г. інстытут выконваў прыблізную электаральную ацэнку і прагназаваньне вынікаў палітычнае кампаніі 2004 г. Вынікі ацэнкі, аднак, не былі распаўсюджаны ў інфармацыйнай прасторы. (На працягу ўсяго свайго існаваньня Інстытут сацыялёгіі рэдка выступаў у якасьці актыўнага newsmaker'а для СМІ, за выключэньнем хіба непрацяглага пэрыяду 1992—1993 гг.)

*Цэнтар сацыялягічных і палітычных дасьледаваньняў БДУ.* Утвораны ў 1996 г. і пераважна займаецца дасьледаваньнямі на замову дзяржаўных органаў ды камэрцыйных установаў. (Палітычныя дасьледаваньні праводзяцца, як правіла, на дзяржаўную замову.) У палітычнай кампаніі 2004 г. гэты цэнтар адзначыўся абвяшчэньнем вынікаў свайго дасьледаваньня грамадзкай думкі 13—18 верасьня. Дасьледаваньне выявіла 68,6 % падтрымкі ў грамадзтве ідэі дазволіць А. Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін і ўнесьці адпаведныя зьме-

ны ў Канстытуцыю, што стала абсалютным рэкордам пазытыўнага рэйтынгу ўлады ў кампаніі 2004 г. Аднак гэтыя лічбы ня сталі аб'ектам шчыльнай крытыкі, як гэта было ў выпадку з "Экаомам".

*Інстытут сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў пры Адміністрацыі прэзыдэнта.* Утвораны ў верасьні 1997 г. для інфармацыйнага забесьпячэньня дзейнасьці Адміністрацыі прэзыдэнта; сацыялягічнымі дасьледаваньнямі займаецца адпаведны Цэнтар сацыялягічных дасьледаваньняў. ІСПД доўгі час выконваў важную арганізацыйную ролю ў сацыялягічным маніторынгу Беларусі, у тым ліку каардынацыю працы дзяржаўных сацыялягічных службаў падчас выбарчых кампаніяў 1999—2001 гг. (мясцовыя выбары 1999 г., парлямэнцкія 2000 г., прэзыдэнцкія 2001 г.). ІСПД таксама праводзіў дасьледаваньні падчас выбараў у мясцовыя Рады 2003 г. Аднак выглядае на тое, што праца ІСПД была прызнана не зусім эфэктыўнаю, і з 2003 г. інстытут знаходзіцца ў стадыі сур'ёзнай рэарганізацыі, а частка "палітычных" замоваў была перададзена ў Нацыянальную акадэмію навук. У якасьці галоўных недахопаў інстытуту звычайна называлі актыўнае выкарыстаньне "адміністрацыйнага" сеціва пры правядзеньні сацыялягічных дасьледаваньняў, што некалькі зьніжала іх валіднасьць. У палітычнай кампаніі 2004 г. інфармацыя ад ІСПД практычна не фігуравала.

*Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў.* Інстытуцыя, створаная ў форме грамадзкага аб'яднаньня ў 1992 г. НІСЭПД сыстэматычна дасьледуе палітычны настрой беларускага грамадзтва, вынікі дасьледаваньняў звычайна публікуюцца і шырока абмяркоўваюцца ў СМІ. Удзел інстытуту ў палітычнай кампаніі гэтага году быў не такі актыўны, як у 2001 г. НІСЭПД праводзіў дасьледаваньні ў сакавіку і чэрвені 2004 г., у адпаведнасьці зь якімі ўзровень падтрымкі ідэі ўнясеньня зьменаў у Канстытуцыю вагаўся ў межах 20—30 %. Супрацоўнікі інстытуту бралі актыўны ўдзел у камэнтаваньні сацыяльна-палітычнай сытуацыі перад выбарамі і рэфэрэндумам, а таксама вынікаў сацыялягічных дасьледаваньняў, якія праводзіліся іншымі арганізацыямі (у прыватнасьці "Экаомам").

*Сацыялягічная лябараторыя "Новак".* Закрытае акцыянэрнае таварыства, створанае ў 1992 г. Спэцыялізуецца на правядзеньні розных сацыялягічных дасьледаваньняў, у тым ліку і на замову дзяржаўных структураў (у прыватнасьці БТ). Мае імідж пераважна камэрцыйна арыентаванай арганізацыі, значна менш уцягнутай у палітычныя працэсы, чым, напрыклад, НІСЭПД. У 2004 г. "Новак" праводзіў сем нацыянальных дасьледаваньняў сацыяльна-палітычнай сытуацыі, што сапраўды вельмі многа — кожны месяц у студзені — ліпені 2004 г. Вынікі ўсіх апытаньняў супадалі з "вузкім калідорам" у 20—30 % падтрымкі ідэі зьменаў у Канстытуцыі, якія б дазволілі А. Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін, праўда, гэтыя вынікі ня мелі шырокага распаўсюду ў інфармацыйнай прасторы. Падчас выбарчай кампаніі 2004 г. "Новак" выконваў сацыялягічныя дасьледаваньні ў акругах для кандыдатаў у дэпутаты.

Вышэй былі пазначаны "традыцыйныя" структуры сацыялягічнай інфраструктры, але акрамя іх у кампаніі 2004 г. сваю візію палітычнай сытуацыі падавалі некалькі адносна "новых" для гэтай сфэры інстытуцыяў. Гэта, па-першае, аналітычны цэнтар "Экаом", а па-другое, "Gallup Organization / Baltic Surveys".

*"Экаом".* Арганізацыя, якая, падаецца, выклікала найбольшыя эмоцыі ў кампаніі 2004 г. Адразу пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму "Экаом" падаў дзяржаўным СМІ вынікі свайго дасьледаваньня (жнівень 2004 г.). У адпаведнасьці зь яго лічбамі пэрсанальны рэйтынг А. Лукашэнкі склаў 66,5 %, што выразна кантраставала з вынікамі іншых апытаньняў, якія вызначалі рэйтынг недзе ў два разы ніжэй. Да гэтага "Экаом" займаўся пераважна камэрцыйнымі дась-

ледаваньнямі ў сфэры калядзяржаўнага бізнэсу, таму яго зьяўленьне на полі палітычных вышукаў было нечаканым. Акрамя абвінавачаньняў у ангажаванасьці, "Экаом" спарадзіў вялікую колькасьць мэтадалягічных пытаньняў, большасьць зь якіх былі абгрунтаваныя.

Акрамя дасьледаваньня ў жніўні, "Экаом" правёў 17 кастрычніка экзыт-пол (exit poll — апытаньне на выхадзе) з цалкам станоўчымі для ўлады вынікамі: 74,6 % падтрымкі ад агульнай колькасьці ўдзельнікаў.

*The Gallup Organization / Baltic Surveys.* Удзел замежных інстытуцыяў у электаральных дасьледаваньнях Беларусі нельга назваць новым. У прыватнасьці, перад выбарамі 2001 г. такія апытаньні праводзіліся "Wirthlin Worldwide" (сумесна зь НІСЭПД). Аднак калі ў 2001 г. сацыялягічная інфармацыя была, хутчэй, для ўнутранага карыстаньня і аналізу, то ў 2004 г. дадзеныя дасьледаваньняў міжнароднай арганізацыі "Gallup" актыўна прысутнічалі ў інфармацыйнай прасторы і былі часткаю палітычнага працэсу.

Адразу адзначым, што з аўтарствам дасьледаваньняў "Gallup'у" ўзьнікаюць пэўныя складанасьці. Беларускія дасьледаваньні "Gallup'у" зьвязаны з замовамі IRI ("International Republican Institute", Інстытут Рэспубліканскай партыі ЗША; аддзел, які займаецца Беларусьсю, знаходзіцца ў Вільні) і былі запачаткаваныя ўвосень 2002 г. Матэрыялы апытаньняў вельмі часта прэзэнтаваліся проста як дасьледаваньні "IRI", калі-нікалі — "Gallup-IRI" і пазьней — проста "Gallup". Такая блытаніна мае месца і пры прэзэнтаваньні нават адных і тых жа дасьледаваньняў, таму дастаткова цяжка вызначыць разьмеркаваньне роляў гэтых дзьвюх інстытуцыяў: ці IRI толькі замаўляе збор інфармацыі, ці часткова яго праводзіць праз складаньне анкеты або забесьпячэньне сеткай інтэрвіюераў. Адносіны "Gallup'у" зь беларускімі дасьледчымі інстытуцыямі таксама непразрыстыя. Можна ўзгадаць, што дадзеныя дасьледаваньняў напярэдадні выбараў 2001 г. прэзэнтаваліся выключна як інфармацыя "Wirthlin Worldwide — IRI", хоць, хутчэй за ўсё, яны былі атрыманыя сумесна зь НІСЭПД і лябараторыяй "Новак"[6].

У 2004 г. беларускія арганізацыі выконвалі значную (ці практычна ўсю) працу па правядзеньні сацыялягічных дасьледаваньняў, якія прэзэнтаваліся як інфармацыя "Gallup'у". У любым выпадку, калі далей у тэксьце будзе ўжывацца назва "Gallup", трэба мець на ўвазе, што размова ідзе толькі пра "брэнд". Замоўцам выступае "IRI", фактычнымі выканаўцамі — беларускія сацыялягічныя арганізацыі, перш за ўсё НІСЭПД і "Новак". Роля непасрэдна "The Gallup Organization / Baltic Surveys" не зусім зразумелая. Магчыма, яна заключаецца ў фармуляваньні задачаў дасьледаваньня ці кантролі вынікаў. Магчыма, роля зводзіцца да даваньня брэнду ды забесьпячэньня інфармацыйнае кампаніі.

Перад выбарамі і рэфэрэндумам, у жніўні, верасьні і пачатку кастрычніка, "Gallup" праводзіў "пакрокавае" апытаньне (tracking poll) насельніцтва Беларусі. У пачатку кастрычніка "Gallup" прагназаваў 39 % падтрымкі зьменаў у Канстытуцыі, перад датэрміновым галасаваньнем — 41 % (у жніўні гэты паказьнік быў 32 %, у верасьні — 38 %). На аснове сваіх дадзеных "Gallup" рабіў адкрытыя палітычныя заявы пра тое, што А. Лукашэнка ня можа сумленна атрымаць перамогу.

"Gallup" праводзіў апытаньні на датэрміновым галасаваньні і рабіў экзыт-пол у дзень выбараў. У выніку было абвешчана, што за зьмену Канстытуцыі на рэфэрэндуме прагаласавалі толькі 48,7 % ад унесеных у выбарчыя сьпісы.

---

6 Манаев Олег. Президентские выборы: что было на самом деле : Заметки социолога // Выборы президента Республики Беларусь. Факты и комментарии. — Мн., 2002.

## Сацыялягічныя войны: адрозьненьні і няпэўны зьмест

Такім чынам, на пачатак верасьня 2004 г., перад абвяшчэньнем рэфэрэндуму, шырокай грамадзкасьці былі пададзены лічбы летніх нацыянальных апытаньняў "Новаку" (чэрвень і ліпень 2004 г.), чэрвеньскага — НІСЭПД і ліпеньскага — "Gallup'у". Усе яны паказвалі ўзровень падтрымкі магчымай ініцыятывы зьмяніць Канстытуцыю ў межах 22—30 %. Пытаньне задавалася выключна ў форме стаўленьня да "зьмены Канстытуцыі", без падкрэсьліваньня факту, што гэта дазвол А. Лукашэнку ўдзельнічаць у выбарах 2006 г. Толькі чэрвеньскае дасьледаваньне "Gallup'у" выявіла больш высокі ўзровень падтрымкі — амаль 40 %, але гэтыя вынікі былі пастаўленыя пад сумнеў самім "Gallup'ам", які тлумачыў высокі ўзровень падтрымкі "завышанай рэпрэзэнтацыяй" (over sampling) прыхільнікаў А. Лукашэнкі[7].

У сваіх паведамленьнях "Gallup" асабліва падкрэсьліваў, што ўзровень падтрымкі зьменаў у Канстытуцыі ў межах "вузкага калідору" ў 20—30 % ёсьць доўгатэрміновая тэндэнцыя. Пачынаючы з 2002 г. прыкладна аднолькавыя паказьнікі выявілі 25 "апытаньняў, якія заслугоўваюць даверу", — НІСЭПД, "Новаку" і "Gallup'у".

У жніўні "Gallup" распачаў "пакрокавае" апытаньне. З інтэрвалам у адзін дзень апытваецца 200 чалавек, што дазваляе ня толькі атрымаць дадзеныя пра стан грамадзкай думкі, але і адсочваць тэндэнцыі; узровень памылкі ў такім дасьледаваньні даволі высокі — каля 4 % (нагадаем, што такое апытаньне праводзілася непасрэдна перад выбарамі 2004 г.). Узровень падтрымкі зьменаў у Канстытуцыі складаў 29—32 %, гэтыя вынікі былі шырока распаўсюджаныя на пачатку верасьня, у тым ліку і праз СМІ, чаго раней "Gallup-IRI" звычайна не практыкаваў.

Але адразу пасьля абвяшчэньня А. Лукашэнкам рэфэрэндуму ў "вузкага калідора" ў 20—30 % зьявілася альтэрнатыва. Аналітычны цэнтар "Экаом" распаўсюдзіў празь дзяржаўныя СМІ дадзеныя свайго жнівеньскага апытаньня, якія паказалі пэрсанальны рэйтынг А. Лукашэнкі ў 66,5 %. Лічбы "Экаому" адразу былі шырока скрытыкаваныя. Асноўныя абвінавачаньні тычыліся палітычнай ангажаванасьці і прамой сувязі з уладаю. Акрамя таго, адзначаліся сур'ёзныя недахопы пры стварэньні анкеты (гл. вышэй), адсутнасьць досьведу электаральных дасьледаваньняў, неабходнай рэпутацыі і непрыналежнасьць да "сацыялягічнай супольнасьці" (што асабліва адзначыў А. Манаеў у сваім інтэрвію "Беларускім навінам"). Пэўную дыскусію выклікала і выбарка — 5000 чалавек — якая, у прынцыпе, для такіх дасьледаваньняў непатрэбная.

Абвяшчэньне рэфэрэндуму (і дакладнае фармуляваньне яго пытаньня) зьлёгку зьмяніла дасьледчыя задачы і прымусіла карэктаваць анкету. Пасьля зьмены фармулёўкі пытаньня пра рэфэрэндум адбылося пэўнае павышэньне ўзроўню падтрымкі ў апытаньнях "Gallup'у". "Пакрокавае" апытаньне 8—17 і 18—26 верасьня выявіла 38 % "за", а ў першай дэкадзе кастрычніка гэты лік стаў 41,4 %. Дадзеныя экзыт-полу былі яшчэ больш высокія. Ужо пасьля выбараў і рэфэрэндуму прадстаўнікі "Gallup'у" абгрунтоўвалі рост падтрымкі адміністрацыйным ціскам падчас датэрміновага галасаваньня.

Адначасова былі агучаны цалкам альтэрнатыўныя лічбы, на гэты раз Цэнтрам сацыялягічных і палітычных дасьледаваньняў БДУ, які распаўсюдзіў вынікі свайго збору інфармацыі 13—18 верасьня. Апытаньне выявіла 68,6 % падтрымкі пытаньня рэфэрэндуму, што стала

[7] The Gallup Organization / Baltic Surveys. Memorandum September 6, 2004.

рэкордам сацыялягічнай кампаніі.

Адразу паўстала пытаньне прычыны розьніцы паміж апытаньнямі ЦСПД БДУ і групы "Новак"—НІСЭПД—"Gallup". На гэты раз большасьць дадзеных былі пададзеныя інстытуцыяй, "легітымнай" у межах сацыялягічнага поля; асаблівых заўваг да анкеты і мэтадалёгіі не было, хоць часам і падкрэсьлівалася ангажаванасьць цэнтру як дзяржаўнай інстытуцыі, што само сабой ня можа быць доказам няправільнасьці вынікаў апытаньня.

Частка аналітыкаў (у прыватнасьці Ю. Дракахруст) тлумачылі гэтыя вынікі выключна анкетнаю фармулёўкаю: незалежныя цэнтры пыталіся пра зьмену Канстытуцыі, а ЦСПД — пра дазвол А. Лукашэнку балятавацца на трэці тэрмін празь зьмену Канстытуцыі. Але такая інтэрпрэтацыя наўрад ці можа растлумачыць разыходжаньне рэйтынгаў на 30 %. Тым больш гэта не тлумачыць разыходжаньня дадзеных ЦСПД і "Gallup'у" пасьля карэгаваньня пытаньня. Адзінай рацыянальнай высновай можа быць тое, што нехта з бакоў (ці абодва бакі) памыліўся, і тут перавага, прынамсі колькасна, на баку групы "Новак"—НІСЭПД—"Gallup".

Такім чынам, перад выбарамі быў сфармаваны сацыялягічны mainstream з групы "Gallup-IRI"—"Новак"—НІСЭПД, які на працягу 2002—2004 гг. вызначыў "вузкі калідор" падтрымкі ідэі зьменаў у Канстытуцыі ў 20—30 %, эвалюцыяй якога сталі дасьледаваньні "Gallup'у" ў верасьні — кастрычніку — 38—41 % падтрымкі. Рост падтрымкі на 10—20 % тлумачыўся шчыльнай інфармацыйнай кампаніяй за рэфэрэндум і новаю фармулёўкаю пытаньня пра яго ў анкетах.

Альтэрнатыву mainstream склалі дадзеныя ЦСПД БДУ і "Экаому" (ЦСПД БДУ — для "сацыялягічнай супольнасьці", "Экаому" — для СМІ), якія вызначылі пэрсанальны рэйтынг прэзыдэнта і ўзровень падтрымкі ідэі рэфэрэндуму для зьмены Канстытуцыі ў межах 66—69 %.

## "Exit poll"

Экзыт-пол, альбо апытаньне выбарнікаў на выхадзе зь месца галасаваньня, у кампаніі 2004 г. першы раз у гісторыі Беларусі сталі часткаю палітычнага працэсу. Экзыт-пол выкарыстоўваецца для атрыманьня раньніх дадзеных пра ход галасаваньня і яго магчымыя вынікі. Але для палітычнай сытуацыі ў Беларусі асноўнаю стала іншая функцыя — кантроль за справядлівасьцю вынікаў выбараў. Колькасьць экзыт-полу, якія праводзіліся 17 кастрычніка ў Беларусі, дакладна вызначыць цяжка. Вядома, што іх было дастаткова шмат. Але толькі дзьве інстытуцыі абвесьцілі пра агульнанацыянальны маніторынг — "Gallup" і "Экаом" (свае вынікі падавала таксама ініцыятыва "Моладзь за справядлівыя выбары", створаная на базе БРСМ, але гэтыя дадзеныя нельга лічыць сур'ёзнымі).

"Gallup" абвесьціў, што ў пэрыяд датэрміновага галасаваньня (12—16 кастрычніка) у 20 раёнах было праведзена апытаньне 19205 рэспандэнтаў (у першых паведамленьнях 18 кастрычніка гэтыя дадзеныя чамусьці таксама прэзэнтаваліся як экзыт-пол). 21,3 % паведамілі, што аддалі свой голас датэрмінова, зь іх "за" — 62,6 %. Як бачым, размова ідзе не пра экзыт-пол, а пра нешта падобнае да агульнанацыянальнага апытаньня, якое праводзілася пяць дзён з выбаркаю ў 19 тыс. чалавек. Выбарка фантастычная, асабліва калі ўлічыць, колькі людзей павінны былі працаваць цэлы тыдзень; цяжка сказаць нешта пэўнае пра яе рэпрэзэнтацыйнасьць, як і пра агульную мэтадалёгію дасьледаваньня (магчыма, яна стане вядомая пазьней). У дзень галасаваньня (трэба разумець, уласна экзыт-пол) было апытана 18397

чалавек. 53,1 % зь іх выказаліся “за” ініцыятыву А. Лукашэнкі. На аснове гэтага ліку рабіўся вывад, што пры ўдзеле 87,3 % адказалі “за” на пытаньне рэфэрэндуму 48,37 % ад сьпіскавай колькасьці. Гэта значыць, паводле меркаваньня “Gallup’у”, прэзыдэнт не атрымаў перамогі. Але гэтыя лічбы сьведчаць пра вялікую імавернасьць перамогі. Узровень магчымай памылкі ў гэтым дасьледаваньні каля 1 %, але, калі ўлічыць іншыя абставіны, ён можа быць большым. Напрыклад, цалкам магчымыя памылкі “Gallup’у” пры тыпалягізацыі раёнаў, асабліва ўлічваючы дастаткова спрэчны аналіз рэгіёнаў у дасьледаваньні канца жніўня 2004 г.[8]

Прыкладна 16,63 % апытаных адмовіліся даваць адказ на пытаньне экзыт-полу, вядома, з пэўнай імавернасьцю іх можна аднесьці да тых, хто галасаваў “супраць”, але працэдуру, якую прапануе “Gallup”, нельга назваць цалкам дакладнай.

На жаль, сацыялягічныя мэтады дасьледаваньняў у нашай сытуацыі нельга прымаць за абсалютна дакладныя, асабліва калі ўлічыць адсутнасьць досьведу экзыт-полу (каб удакладніць яго мэтадалёгію) і, галоўнае, немагчымасьць вэрыфікацыі праз афіцыйныя дадзеныя выбараў. Гэта значыць, ня могуць быць дакладна ацэненыя адэкватнасьць выкарыстанай мэтадалёгіі дасьледаваньняў і эфэктыўнасьць працы сеткі анкетэраў. Больш за тое, “гвалтаваньне” сеткі на працягу тыдня (12—17 кастрычніка), калі анкетэры (іх групы) павінны былі апытваць па некалькі соцень чалавек у дзень, магло сур’ёзна зьнізіць эфэктыўнасьць працы. Сьпіс акалічнасьцяў можна працягваць. Такім чынам, узровень памылкі ў экзыт-пол можа быць значна большым, і сяганьне падтрымкі прэзыдэнта вышэй за 50 %, калі базавацца на дасьледаваньні “Gallup’у”, цалкам магчымае. Прынамсі, доказам недахопу 1,6 % галасоў гэта можа быць зь цяжкасьцю.

“Экаом” як прадстаўнік супрацьлеглай сацыялягічнай пазыцыі праводзіў альтэрнатыўны экзыт-пол з цалкам альтэрнатыўнымі вынікамі. Было праведзена апытаньне 18 460 чалавек, 74,6 % выказаліся “за”. Праблемы з даверам да “Экаому” абмяркоўваліся вышэй, ацаніць валіднасьць экзыт-пол практычна немагчыма, прынамсі, інфармацыі тут значна менш, чым па “Gallup’е”, ды палітычная ангажаванасьць відавочная. Прамежкавыя дадзеныя “Экаому” агучваліся дзяржаўнымі СМІ падчас галасаваньня, што таксама красамоўна.

Галоўны парадокс і інтрыга дадзеных “Экаому” ў тым, што яны таксама вельмі моцна адрозьніваюцца ад афіцыйных. Паводле афіцыйных дадзеных ЦВК, удзел у рэфэрэндуме ўзялі 6 307 395 чалавек, за прыняцьце пытаньня рэфэрэндуму прагаласавалі 5 548 477[9], такім чынам, “за” прагаласавалі каля 88 % (87,97 %), гэта значыць, альбо памылка экзыт-полу “Экаому” склала 13,37 %, што катастрафічна і тоесна выяўленьню поўнай няздольнасьці да правядзеньня такога кшталту маніторынгу, альбо нават дасьледаваньне “Экаому” ёсьць доказам істотнага маніпуляваньня вынікамі галасаваньня.

Што тычыцца “лякальных” экзыт-полаў, то яны праводзіліся рознымі “суб’ектамі”, ад прых-

[8] Напрыклад, пры выкладаньні вынікаў жнівеньскага дасьледаваньня (IRI-Gallup Belarus Tracking Poll Update — Issue #3 August 16 to 23) IRI-Gallup дае раскладку па абласьцях, але пры выбарцы 200 чалавек рабіць такое некарэктна. Акрамя гэтага, раскладка выразна выяўляе “правальваньне” дадзеных зь Віцебскай вобласьці, дзе, паводле вынікаў дасьледаваньня, прыхільнікі А. Лукашэнкі складаюць толькі 18 % (для параўнаньня: Менск — 40 %, Гарадзенская вобласьць — 33 %). Віцебская вобласьць аказваецца самаю прадэмакратычнаю, што вельмі сумнеўна. Тым больш сумнеўна рабіць на падставе такіх дадзеных сыстэмныя вывады пра палітычнае раянаваньне Беларусі, што робіцца ў аналітычнай частцы дакладу.

[9] Пастанова Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў ад 21 кастрычніка 2004 г. № 268.

ільнікаў пэўных кандыдатаў да замежных недзяржаўных арганізацыяў. Магчыма, некаторыя зь лякальных экзыт-полаў былі ўключаны ў сетку "буйных" дасьледаваньняў (у прыватнасьці, "Gallup'у"), астатнія мелі самастойны характар, але нешта пэўнае пра гэта цяпер сказаць цяжка.

У якасьці прыкладу аднаго з такіх экзыт-полаў, вынікі якога знаходзяцца ў адкрытым доступе, можна назваць апытаньне дацкай арганізацыі SILBA (Support Initiative for Liberty and Democracy in the Baltic Area). Апытаньне праводзілася ў сямі выбарчых акругах, але пададзеныя вынікі, відаць, складзеныя на аснове апытаньняў на адным участку з акругі, што, натуральна, ня мае практычна ніякай эмпірычнай каштоўнасьці.

## Некаторыя высновы

Эмпірычная сацыялёгія прэзэнтуе сябе як навука, таму яе мэтодыкі патрабуюць вэрыфікацыі. Невідавочныя памылкі ў мэтадзе, працэдуры і аналізе дасьледаваньняў могуць прывесьці да значных скажэньняў дадзеных, большасьць з такіх памылак і недакладнасьцяў можна выявіць праверкаю праз рэальнасьць, але гэта ў цяперашніх палітычных умовах больш чым праблематычна. Простае выкананьне стандартаў, на што часта спасылаюцца сацыёлягі, ні ў якім разе не прадухіляе самыя нечаканыя памылкі. Звычайна вэрыфікацыяй зьяўляюцца афіцыйныя вынікі галасаваньня. У беларускай сытуацыі электаральная сацыялёгія ня толькі ня можа быць вэрыфікавана праз выбары, але ўсё больш існуе для таго, каб кантраляваць афіцыйныя вынікі і выкрываць тое, наколькі яны адрозьніваюцца ад рэчаіснасьці.

Сацыялёгія не вэрыфікуецца выбарамі, выбары не вэрыфікуюцца палітычнай практыкай, і гэта ёсьць сур'езнай праблемай для атрыманьня беларускай сацыялёгіяй статусу, які яна мае ўва ўмовах дэмакратыі.

Гэта ня значыць, што ня трэба давяраць эмпірычнай сацыялёгіі як практыцы, але да яе, прынамсі, трэба ставіцца крытычна, і тым больш не арыентавацца на "брэнд" — "сусьветна вядомая інстытуцыя", "незалежная аналітычная служба" і г. д.: у выпадку з электаральнай сацыялёгіяй такія брэнды нічога не гарантуюць.

Сацыялягічныя дасьледаваньні 2004 г. не даюць доказу таго, што на рэфэрэндуме меней за 50 % насельніцтва прагаласавала "за": магчыма, так, магчыма, не. Адзінае, пра што можа быць вядома практычна дакладна, — несапраўднасьць лічбаў ЦВК і практычна бессумнеўнае "мадэляваньне" канчатковых вынікаў галасаваньня.

Яшчэ ў большай ступені гэта тычыцца выбараў у парлямэнт. Як вядома, ня больш за 1/3 агульнай колькасьці "кандыдатаў ад улады" вялі актыўныя кампаніі ў сваіх акругах і, магчыма, сапраўды перамаглі, іншыя разьлічвалі выключна на адміністрацыйны рэсурс, які працаваў зусім не бездакорна[10].

Парадокс у тым, што, паводле дадзеных ЦВК, вынікі і першых, і другіх практычна не адрозьніваюцца, што дадаткова зьніжае да іх давер.

[10] Аўтаматычная падтрымка "кандыдатаў ад улады" усімі, хто галасаваў "за" рэфэрэндум, больш чым сумнеўная і не адпавядае ні практыцы выбараў 1995—1996 і 2000 гг., ні існай палітычнай культуры. Такія дадзеныя дае ў тым ліку і каляздзяржаўная сацыялёгія. У прыватнасьці, паводле дасьледаваньня Менскага навукова-дасьледчага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных праблемаў (г. Менск, чэрвень 2004 г.), за кандыдата ад улады зьбіраліся галасаваць толькі 12,9 %, скепсыс да дэпутатаў быў выяўлены і дасьледаваньнем ЦСПД БДУ (верасень 2004 г.).

# РАСКЛАД І ТЭНДЭНЦЫІ ПАСЬЛЯ ВЫБАРАЎ І РЭФЭРЭНДУМУ 2004 Г.

Пасьля рэфэрэндуму 1996 г. у Беларусі зьнікла палітыка як працэс здабыцьця ўлады і карыстаньня ёю, які адбываецца ўва ўмовах электаральнай альбо элітнай канкурэнцыі. У Беларусі з 1996 г. палітыкай насамрэч займаецца толькі адзін чалавек — кіраўнік дзяржавы. Астатнія альбо спрабуюць здабыць вагары адміністрацыйнага ўплыву праз збольшага цырыманіяльныя палітычныя інстытуты (такія, як парлямэнт і выбары), альбо спрабуюць выкарыстаць цырыманіял як сродак піяр-кампаніі. Аднак пасьля кожнага электаральнага цыклу расклад сілаў застаецца нязьменны: палітыкай у беларускай дзяржаве і надалей займаецца адзін чалавек.

Выбарчая кампанія 2004 г. — ужо трэцяя ў найноўшай гісторыі Беларусі, калі парлямэнцкія выбары сумяшчаліся з рэфэрэндумам. Ці выпадковае такое сумяшчэньне? Здавалася б, у ім няма нічога асаблівага. У рэшце рэшт, выбары, давыбары і перавыбары ў парлямэнт праводзіліся найчасьцей: за апошнія 10 гадоў Беларусь перажыла як мінімум пяць такіх кампаніяў (выбары ў Вярхоўную Раду ў траўні 1995 г., давыбары ў сьнежні таго ж году, недарэчныя, як выявілася, давыбары ў лістападзе 1996 г., выбары ў палату прадстаўнікоў 2000 г., нарэшце, выбары 2004 г.), прапаноўваючы такім чынам найлепшыя варункі для сумяшчэньня з рэфэрэндумамі "ў мэтах эканоміі сродкаў". Аднак варта прасачыць і іншую заканамернасьць. Кожны з трох рэфэрэндумаў (на якія ў цэлым было вынесена дванаццаць пытаньняў, зь іх дзевяць — прэзыдэнтам Лукашэнкам) перасьледаваў за мэту зьнішчэньне палітычных альтэрнатываў прэзыдэнцкаму панаваньню. Галасаваньне 1995 г. зьліквідавала хісткую і частковую культурна-ідэалягічную гегемонію нацыянальна-дэмакратычнага палітычнага дыскурсу, што ўсталявалася ў 1990—1991 гг. з прызнаньнем беларускай мовы як дзяржаўнай, прыняцьцем нацыянальнай сымболікі ды, нарэшце, абвяшчэньнем незалежнасьці. Рэфэрэндум 1995 г. быў адзіным, які меў на ўвазе стварэньне пэўнага ідэалягічнага і інфармацыйнага фону з мэтай дыскрэдытацыі палітычных апанэнтаў прэзыдэнта (у той час — партыі БНФ) і недапушчэньня іх у парлямэнт. Сама празь сябе гэтая тактыка мела толькі частковы посьпех. Тым ці іншым шляхам, БНФ ня быў дапушчаны ў Вярхоўную Раду 13-га скліканьня, што не змагло, аднак, перадухіліць стварэньня парлямэнцкай апазыцыі прэзыдэнцкай вэртыкалі, якая складала дзьве трацiны ад абраных дэпутатаў. З аднаго боку, народная падтрымка лідэра не гарантавала ляяльнасьці ў іншай сытуацыі выбару, дзе Лукашэнка наўпрост не прысутнічаў. Заяўленая ляяльнасьць палітычных суб'ектаў магла быць у любы час перагледжана. Акрамя таго, сама празь сябе прырода лукашэнкаўскай улады аказалася такой, што яна была несумяшчальная ня проста з ідэалягічнымі альтэрнатывамі, а зь любымі зонамі інстытуцыянальнай аўтаноміі, непадкантрольнымі наўпрост ружоваму будынку на Карла Маркса, 38 у Менску (ён не стварыў ані прапрэзыдэнцкай партыі, ані моцнай фракцыі ў парлямэнце менавіта таму, што само разуменьне палітычнай канкурэнцыі, дзеля якой ствараюцца партыі, не пасуе яго бачаньню ўлады).

Дзеля гэтага наступныя рэфэрэндумныя кампаніі мелі на ўвазе ўжо зьнішчэньне менавіта інстытуцыянальных альтэрнатываў. Рэфэрэндум 1996 г. зьнішчыў іх "у прасторы" — ён зьліквідаваў аўтаномію парлямэнту і Канстытуцыйнага суду — двух інстытутаў, якія знаходзіліся па-за простым прэзыдэнцкім кантролем у першыя два гады прэзыдэнцтва Лукашэнкі

і само існаваньне якіх выяўляла сумнеўную легальнасьць той практыкі панаваньня, якую Лукашэнка ўвёў (нагадаем: у першыя два гады Канстытуцыйны суд прызнаў неадпаведнымі Канстытуцыі каля дваццаці прэзыдэнцкіх указаў, Вярхоўная Рада неаднаразова пераадольвала яго вэта, аднак прэзыдэнт настойваў, каб органы вэртыкалі бездакорна выконвалі яго загады). Рэфэрэндум 2004 г. зьнішчыў інстытуцыянальныя альтэрнатывы "ў часе" — ён зьліквідаваў недарэчным чынам пакінутую ў Канстытуцыі перашкоду для пажыцьцёвага панаваньня прэзыдэнта, а значыць, і для захаваньня існай сыстэмы ўлады на нявызначаны прамежак часу. Парлямэнцкія выбары — лягічны мэханізм прадукаваньня палітычных альтэрнатываў — пры сумяшчэньні з рэфэрэндумам гублялі сваю значнасьць — як для грамадзтва, так, шмат у чым, і для палітычных суб'ектаў, — думаю, не памылюся, калі скажу, што ў 1995 г. БНФ сам бы добраахвотна адмовіўся ад прэтэнзіяў на дэпутацкія мандаты, калі б гэта дапамагло захаваць нацыянальныя сымбалі і дзяржаўнасьць мовы. Таксама і ў 2004 г. з моманту абвяшчэньня рэфэрэндуму выбары ў палату прадстаўнікоў згубілі той сэнс, які б яны маглі мець у іншых варунках.

І ў той жа час, нязьвязаныя з рэфэрэндумам кампаніі нейкім чынам прыводзілі да стварэньня сыстэмнай апазыцыі. Так было ў 1995 г., калі дэмакратычныя фракцыі былі амаль цалкам абраныя ў сьнежні. Так было і ў 2000 г., калі, нягледзячы на байкот дэмакратычнымі сіламі і звышсумнеўную дэмакратычнасьць самой працэдуры, у новым складзе палаты прадстаўнікоў у рэшце рэшт зьявілася апазыцыйная фракцыя. Акрамя ўсяго іншага, ступень мабілізацыі прэзыдэнцкай улады (што ў Беларусі азначае ўлады ўвогуле) на нерэфэрэндумных кампаніях была значна меншай.

Пачынаючы з 1996 г. аніводныя выбары, аніводны рэфэрэндум, што праводзіліся ў Беларусі, не былі прызнаныя міжнароднай супольнасьцю як свабодныя і справядлівыя (выключэньне складалі, вядома, Расея і краіны СНД). Нелегітымнасьць улады Лукашэнкі стала аб'ектам палітычнага ціску і, на пэўны пэрыяд часу, пунктам адліку, ад якога апанэнты прэзыдэнта спрабавалі будаваць свае палітычныя стратэгіі. З пункту гледжаньня права, гэта было слушна. Нагадаем, што рэфэрэндум 1996 г. быў прызнаны як абавязковы прэзыдэнцкім указам, які скасаваў пастанову Канстытуцыйнага суду (на што Лукашэнка ня меў законнага права), і што нават бюлетэні для галасаваньня былі надрукаваныя з заўвагай аб кансультацыйным характары рэфэрэндуму. З пункту гледжаньня палітоляга, аднак, праблемы зь легітымнасьцю ўлады ўзьнікаюць не пры парушэньні дэмакратычных правілаў і нават нормаў закону, а калі яе апанэнты здольныя арганізаваць контрагегемонію, якая не дазваляе ўладзе прыняць і выкарыстоўваць такія правілы гульні, якія яна пажадае. Палітычная і сілавая стратэгіі Лукашэнкі, такім чынам, пераадольвалі неабходнасьць у набыцьці дэмакратычнай легітымнасьці. Ягоныя нелегітымныя дзеяньні вялі да зьнішчэньня палітычных і інстытуцыянальных альтэрнатываў (тых самых, што здольныя супрацьстаяць гегемоніі прэзыдэнта), што надавала прэзыдэнцкай уладзе легітымнасьць іншага кшталту — не праз дэмакратычныя працэдуры, а праз фактычную безальтэрнатыўнасьць. З Лукашэнкам мусяць мець справы па-за межамі краіны, яму вымушаны падпарадкоўвацца ўнутры яе таму, што яго замена на пасадзе прэзыдэнта ня ёсьць магчымай.

Безальтэрнатыўнасьць, здавалася б, робіцца магчымай дзякуючы аднаму аспэкту лукашэнкаўскай улады, які быццам бы надае ёй рысы дэмакратычнай (ці, вызначым так, квазідэмакратычнай) легітымнасьці. У мінулым пасьля кожнай выбарчай кампаніі можна было чуць галасы, што, маўляў, выбарчыя працэдуры далёкія ад ідэалу, але калі б усё было паводле

правілаў, Лукашэнка ўсё роўна перамагаў бы. Зазначым, аднак, што тут мы маем справы не з дэмакратычнай (ці нават квазідэмакратычнай), а, хутчэй, плебісцытарнай легітымнасьцю. Дэмакратычная легітымнасьць надаецца шляхам дэмакратычных працэдураў, якія могуць быць болей ці меней дасканалымі (адсюль і прыстаўка квазі-), аднак мусяць захоўваць элемэнты канкурэнтнасьці і выбару з больш-менш свабодна ўтвораных альтэрнатываў. Плебісцыт — гэта працэдура валідацыі ўлады, у якой альтэрнатыва альбо не прысутнічае, альбо фармуецца самой уладай. Гэта галасаваньне, у якім варыянты выбару — паміж лідэрам і невядомасьцю. Фактычна ўсе тры рэфэрэндумы ў гісторыі незалежнай Беларусі былі менавіта плебісцытамі — галасаваньнямі наконт даверу Лукашэнку. У кожнай з гэтых кампаніяў атмасфэра страху перад невядомасьцю і безальтэрнатыўнасьцю старанна фармавалася афіцыйнай прапагандай (выключэньне складаў бадай што рэфэрэндум 1995 г. — там альтэрнатыва была выразна вызначана ў выглядзе старанна дэманізаванага БНФ). Плебісцытарнасьць грунтуецца на ідэі (якую, дарэчы, старанна культываваў Лукашэнка з моманту прыходу да ўлады) аб тым, што воля народу, што ўвасобілася ў асобе лідэра, мае перавагу над іншымі правіламі, законамі, канстытуцыяй ды асабістымі правамі. Болей за тое, гэтая воля дае падставу, якая дазваляе лідэру ад імя народу ліквідаваць альтэрнатывы (размываецца мяжа паміж уладай і рэжымам — дзеяньні, накіраваныя на зьмену ўлады, хай і выключна канстытуцыйным шляхам, трактуюцца як антыдзяржаўныя, прыналежнасьць да апазыцыі ёсьць дастатковай прычынай для адмовы ў карыстаньні пэўнымі грамадзянскімі правамі, такімі, як права на працу ці свабоду асацыяцыяў, якія могуць быць вернутыя, і то неабавязкова, толькі пры падпарадкаваньні ўладзе). Пасьля гэтага ўтвараецца замкнёнае кола: калі надыходзіць час ізноў падтрымаць лідэра на выбарах ці рэфэрэндуме, абгрунтаваньне неабходнасьці падтрымаць яго базуецца, акрамя ўсяго, на адсутнасьці альтэрнатываў.

Пачынаючы з 1996 г. выбары ўсіх гатункаў у Беларусі таксама дэ-факта ператварыліся ў плебісцыты. Напярэдадні галасаваньня мэдыі заклікаюць выбарнікаў падтрымаць менавіта дзяржаўны курс (галасаваць супраць — гэта як быццам бы супраць дзяржавы). Канкурэнцыя нібыта прысутнічае (за выняткам мясцовых выбараў 1999 г., у якіх удзел апазыцыі быў фактычна забаронены дзякуючы норме закону, якая не дазваляла рэгістрацыі кандыдатаў, што мелі адміністрацыйнае ці крымінальнае пакараньне на працягу апошняга году), але яна старанна фільтруецца. Адсеў пачынаецца на далёкіх подступах да выбарчых скрыняў — дастаткова ўзгадаць падзеі 1999 г. альбо арышт Міхаіла Марыніча ў 2004-м. Мэханізмы рэгістрацыі і правілы правядзеньня агітацыі дазваляюць правядзеньне мэтадычнай сэлекцыі ў шэрагах апанэнтаў.

Рэфэрэндум наконт зьняцьця канстытуцыйных абмежаваньняў на знаходжаньне Аляксандра Лукашэнкі на пасадзе прэзыдэнта (вызначаю менавіта так: вельмі сумнеўна, што любы іншы прэзыдэнт Беларусі будзе кіраваць паводле гэтай Канстытуцыі і з гэтымі паўнамоцтвамі) мусіў, здавалася б, даць адказ на пытаньне: ці можа такая самадастатковая мадэль рэпрадукцыі плебісцытарнай легітымнасьці працаваць бясконца? Сапраўды, на працягу 2001—2004 гг. прыхільнікі неабмежаванага знаходжаньня Лукашэнкі ля ўлады знаходзіліся ў выразнай меншасьці (да незалежных сацыёлягаў, што праводзілі апытаньні, вядома, могуць быць прэтэнзіі: у пытаньнях, як правіла, ня ўзгадваўся Лукашэнка, што заніжала працэнт тых, хто прагаласаваў бы “за”, аднак нават калі яго прозьвішча зьяўлялася, колькасьць тых, хто зьбіраўся галасаваць “супраць”, усё роўна заставалася большай за палову). Безумоўна, аўтар разумее, у якой краіне жыве, і далёкі ад думкі, што само празь сябе галасаваньне

“супраць” магло б прывесьці да нейкіх палітычных зьменаў, нават калі б рэальная колькасьць супала б з прадказаньнямі незалежных апытаньняў. Але гэта магло справакаваць пэўныя тэктанічныя штуршкі ў грамадзкай сьвядомасьці, якія б цяжка было знэўтралізаваць аднымі рэпрэсіямі. Менавіта пачуцьцё падманутасьці разбурае плебісцытарную легітымнасьць і правакуе трывалы недавер да ўлады. Апошняя можа не пацярпець доўгім часам, паколькі ў яе распараджэньні застаецца рэсурс сілы і рэпрэсіяў. Але, як сьведчыць гісторыя, зьмена рэжымаў, што будуюцца выключна ці пераважна на сіле, пры супадзеньні пэўных абставінаў можа адбыцца хутка і нечакана (менавіта з гэтых меркаваньняў аўтар пасьлядоўна надае столькі ўвагі ўзроўню грамадзкай падтрымкі лукашэнкаўскай улады — фактару, які часьцяком ігнаруецца іншымі аналітыкамі з прычыны бессэнсоўнасьці самаго разважаньня аб ёй у палітычных варунках, падобных тым, што існуюць у сёньняшняй Беларусі). Цяпер відавочна, што, нягледзячы на ранейшы стан масавай сьвядомасьці, плебісцытарны мэханізм ізноў збольшага спрацаваў.

Безумоўна, важную ролю адыграла значнае паляпшэньне сацыяльна-эканамічнага становішча ў Беларусі перад восеньню 2004 г. (нагадаем, абвал рэйтынгу Лукашэнкі ў 2002 г. здарыўся шмат у чым дзеля эканамічных цяжкасьцяў, што насталі за прэзыдэнцкімі выбарамі 2001 г., і адпаведна расчараваньнем насельніцтва на фоне шчодрых абяцаньняў павышэньня дабрабыту ў ходзе прэзыдэнцкай кампаніі). Сацыяльны кантракт застаецца важным аспэктам захаваньня стабільнасьці беларускага рэжыму, што пацьвярджае сам Лукашэнка, рэгулярна абяцаючы павышэньне заробкаў то да 100, то да 250, то да 750 даляраў у месяц. Зь іншага боку, камандная мадэль беларускай эканомікі дазваляе ажыцьцяўляць павышэньне ўзроўню жыцьця і правакаваць узрост сацыяльнага аптымізму акурат перад выбарчымі кампаніямі (што адбылося і ў 2001, і ў 2004 гг.). Аднак, згодна з дадзенымі сацыёлягаў, узьлёт падтрымкі прэзыдэнта адбыўся менавіта ў пэрыяд з 7 верасьня, калі быў абвешчаны рэфэрэндум, да моманту галасаваньня. Складваецца ўражаньне, што падзеньне рэйтынгу Лукашэнкі ажыцьцяўляецца менавіта тады, калі ўлада часова ўстрымоўваецца ад прапаганды і піяр-кампаніяў. Паколькі кампанія вядзецца ў старанна сканструяваных умовах плебісцытарнай безальтэрнатыўнасьці, узьлёт рэйтынгу цалкам лягічны. Гэта не азначае, што лічбы, якія выдаваліся ў пэрыяд палітычнага зацішша, не адлюстроўвалі адпаведным чынам стан грамадзкага настрою ў той момант. Аднак яны відавочна не вызначалі верхняй мяжы сацыяльнага рэсурсу ўлады.

Як вынік, масавага пачуцьця падманутасьці вынікі рэфэрэндуму не справакавалі (калі, зразумела, не лічыць масай 35 % тых, хто адкрыта заявіў апытальнікам, што ня верыць афіцыйным дадзеным)[1].

Размовы пра фальсыфікацыі і парушэньні праходзяць міма вушэй тых, хто галасаваў за прапанову ўлады і, натуральна, схільны верыць, што ўсё было прыстойна. Болей за тое, паводле ўсіх іншых паказьнікаў стану масавай сьвядомасьці Беларусь быццам бы адкацілася да ўзроўню канца 90–х. Але гэта — з пункту гледжаньня тых, хто стаіць у апазыцыі да ўлады. Зь іншага боку, адсотак расчараваных вынікамі выбараў здаецца найбольшым за ўсе апошнія кампаніі. Калі б палітычныя варункі засталіся хаця б такімі, якімі яны былі ўвосень 2004 г., узьнікненьне той самай “фігі ў кішэні” ў будучым выглядае цалкам магчымым. Нягледзячы на 48—49 % тых, хто прагаласаваў “за” (паводле двух незалежных апытаньняў),

[1] Тут і далей прыводзяцца дадзеныя НІСЭПД.

амаль столькі ж жадалі, каб у 2006 г. быў абраны новы прэзыдэнт. Таксама адсотак тых, хто жадаў прагаласаваць за дэмакратычную апазыцыю на наступных прэзыдэнцкіх выбарах, выйшаў далёка за межы гіпатэтычнай памылкі і дасягнуў 32 % (што толькі на 10 % менш за колькасьць тых, хто зьбіраўся галасаваць за Лукашэнку). Можна зазначыць, што практыка фармаваньня "плебісцытарнай безальтэрнатыўнасьці" (выбару паміж Лукашэнкам і невядома чым) усё ж не да канца дасягнула сваіх мэтаў. Пэўная колькасьць грамадзянаў ужо гатовая падтрымліваць "невядома што" супраць кіраўніка дзяржавы. Паводле водгукаў некаторых былых апазыцыйных кандыдатаў, ім было дастаткова пазыцыянаваць сябе як "супраць Лукашэнкі", каб прыцягнуць увагу і спачуваньне выбарнікаў. Нарэшце, заўважым: сытуацыя пяцігадовай даўніны вярнулася ў іншых сацыяльна-эканамічных варунках, пры іншай ступені кансалідацыі ўлады і з рэзка звужаным абшарам для апазыцыйнай і проста аўтаномнай грамадзкай і палітычнай дзейнасьці. Папросту кажучы, кошт падтрыманьня статус-кво за апошнія некалькі гадоў значна ўзрос.

З усяго вышэйсказанага вынікае простая выснова. Далейшае падтрыманьне статус-кво магчымае толькі пры пасьлядоўным і мэтанакіраваным зьнішчэньні тых зонаў аўтаноміі, што яшчэ засталіся ў Беларусі і што нават тэарэтычна здольныя выпрадукаваць палітычную альтэрнатыву лукашэнкаўскай уладзе альбо прыняць зьместоўны ўдзел у рэалізацыі палітычных праектаў. Пытаньне нават ня ў тым, што ўлада ня можа сабе дазволіць нейкую лібэралізацыю грамадзкага і палітычнага жыцьця: патэнцыйную пагрозу ўяўляе нават кансэрвацыя кантролю на пэўным узроўні і адмова ад яго далейшага ўзмацненьня. Нават імітацыя дэмакратычных працэдураў можа прывесьці да зьяўленьня палітычнай апазыцыі. Нават загнаная ў рэзэрвацыю, грамадзянская супольнасьць здольная з часам самаарганізавацца настолькі, каб несьці пагрозу цяперашняму рэжыму.

Дарэчы, працэс звужэньня сацыяльнага абшару для самаарганізацыі грамадзтва рэзка паскорыўся адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Нагадаем: закрыцьцё дзясяткаў няўрадавых арганізацыяў, рэзка пагоршаныя ўмовы існаваньня незалежнай прэсы, захады для абмежаваньня міжнародных кантактаў студэнтаў і навучэнцаў, гісторыя зь ліквідацыяй коласаўскага Ліцэю і Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту, узмацненьне жорсткасьці пакараньняў журналістаў, выцясьненьне апошніх міжнародных дабрачынных арганізацыяў. Такім чынам адбываўся працэс ліквідацыі ня толькі попыту на сацыяльныя і палітычныя зьмены, але і прапанаваньня (болей дакладна, таго, што можа яго скласьці). Працэсы працягнуліся пасьля 17 кастрычніка: перарэгістрацыя нізавых суполак палітычных партыяў можа прывесьці да зьнікненьня нават намінальных зьяваў палітычнага плюралізму. Працягваецца і паглыбляецца палітыка закрыцьця грамадзтва ад навакольнага сьвету (варта нагадаць хаця б заклікі прэзыдэнта Лукашэнкі да спыненьня праграмаў гуманітарнай дапамогі і аздараўленьня дзяцей). Як пагроза пачала ўспрымацца нават спроба самарэфлексіі аб стане грамадзтва. Гэта, на думку аўтара, і справакавала атаку на НІСЭПД. Здавалася б, інстытут выдаў дадзеныя, якія па сутнасьці няшмат адрозьніваліся ад яго ранейшых дасьледаваньняў: Лукашэнка па ўсіх парамэтрах апераджае сваіх апанэнтаў, і падставаў для чаканьня нейкіх палітычных зрухаў няма. У мінулым гэтага было дастаткова, каб дадзеныя, што ставілі пад сумнеў афіцыйныя лічбы Цэнтравыбаркаму, ня выклікалі рэакцыі з боку ўладаў. Зразумела, НІСЭПД перайшоў пэўную мяжу, не пабаяўшыся апублікаваць вынікі апытаньняў, што нібыта сьведчылі ня проста пра завышэньне ўзроўню падтрымкі прэзыдэнта, а пра тое, што гэта магло паўплываць на вынік рэфэрэндуму. Аднак падобна на тое, што нэрвовая рэакцыя ішла ўжо

на само разьвянчаньне міту пра ненаяўнасьць у Беларусі попыту на палітычныя альтэрнатывы. Ува ўсё гэта лягічна ўбудоўваюцца новыя заканадаўчыя ініцыятывы (законапраект пра барацьбу з экстрэмізмам, папраўкі да законаў аб партыях ды грамадзкіх арганізацыях, прапановы наконт цэнзураваньня Інтэрнэту вядуць да фактычнай крыміналізацыі альтэрнатыўнай грамадзкай і палітычнай дзейнасьці).

Адно з найболей пашыраных меркаваньняў аб беларускай апазыцыі сьцьвярджае, што лукашэнкаўскай уладзе яна патрэбная. Маўляў, такая апазыцыя заўсёды яму прайграе і ніколі ня будзе здольнай канкураваць зь ім за папулярнасьць у грамадзтве, ня кажучы ўжо аб змаганьні за ўладу. Лукашэнка сам калісьці нібыта пацьвердзіў гэтую тэзу, заявіўшы, што яму трэба маліцца на такую апазыцыю. І ўсё ж мы назіраем паступовы працэс ліквідацыі палітычных альтэрнатываў уладзе, нават такіх, здавалася б, неэфэктыўных і асуджаных на паразу. Чаму?

Магчыма, прычынай таму ёсьць нейкі экзыстэнцыйны страх. У рэшце рэшт, апазыцыя падобная да той чэхаўскай стрэльбы, якая ў трэцім дзеяньні мусіць непазьбежна стрэліць, хай нават і будучы незараджанай. У сёньняшняй беларускай улады няма "стратэгіі выхаду", яна ня мысьліць свайго існаваньня без Лукашэнкі, таму што без Лукашэнкі яна немагчымая, а значыць, яна адмаўляецца вызначыць для сябе той часавы адрэзак, калі можа адбыцца яе зьмена (узрост кіраўніка дзяржавы дазваляе). Так што, калі трэцяе дзеяньне і наступіць, хай сабе праз пятнаццаць-дваццаць-трыццаць гадоў, гэта ня робіць пачуцьцё пагрозы менш вострым. Безумоўна, што і падзеньне некалькіх аўтарытарных рэжымаў за апошнія гады прымусіла беларускія ўлады думаць аб перадухіленьні пагрозаў. Пасьля рэвалюцыі ў Сэрбіі ў 2000 г. Лукашэнка вызначыў для сябе галоўны ўрок з падзеяў у тым, што "ўладу трэба бараніць". Пасьля памаранчавай рэвалюцыі ўва Ўкраіне ў 2004 г. ён зразумеў, якія пагрозы можа несьці пэрсаналізаванай уладзе недастаткова падкантрольны ўладны апарат. Здавалася б, Беларусь ня Сэрбія альбо Ўкраіна. Але яна таксама не Ўзбэкістан і Туркмэністан. Тут нават невялікае адкрыцьцё сацыяльнай і палітычнай прасторы для аўтаноміі і канкурэнцыі выклікае ўзьнікненьне попыту на палітычныя альтэрнатывы. Тое, што гэты попыт застаецца незадаволеным, толькі прыводзіць да яго ўзрастаньня ў будучыні. Яго цалкам магчыма радыкальна зьменшыць безь ліквідацыі фармальнай апазыцыі; але зьліквідаваць яго можна толькі тады, калі з калектыўнай сьвядомасьці зьнікне памяць аб існаваньні прапанаваньня.

У нейкім сэнсе, аднак, апазыцыя можа занесьці палітычную кампанію 2004 г. сабе ў актыў. Паводле дадзеных Інстытуту Гелапа, якія не атрымалі вялікага рэзанансу, пераважная большасьць тых, хто на рэфэрэндуме прагаласаваў "супраць", на парлямэнцкіх выбарах галасавалі за прэтэндэнтаў ад дэмакратычных сілаў — "5+", Эўрапейскай кааліцыі ды "Рэспублікі". Згодна з экзыт-поламі, за апазыцыйных кандыдатаў галасавала каля трацiны выбарнікаў, альбо да 40 % тых, хто меў такую магчымасьць (нагадаем, што дэмакратычныя кандыдаты былі дапушчаныя да галасаваньня толькі ў 75 з 110 акругаў). Для тых, хто ня згодны з вэрсіяй Лідзіі Ярмошынай, відавочна, што сярод часткі грамадзтва, якая не падтрымлівае Лукашэнку, пошук палітычнай альтэрнатывы лягічна прыводзіць да падтрымкі дэмакратаў. Вось вам і слабасьць. Уявіце сабе баксэра, які быў бы выстаўлены супраць Майка Тайсана з завязанымі рукамі і ўсё ж зьвёў бы бой унічыю, калі б пункты лічыліся адпаведным чынам! Зь іншага боку — і кампанія 17 кастрычніка гэта таксама пацьвердзіла — маўклівы, пасіўны грамадзкі пратэст не надае сілы апазыцыі, а хутчэй наадварот, прыводзіць да яе далейшага

вынішчэньня, правакуючы яе разбурэньне карнымі і адміністрацыйнымі сродкамі. Болей за тое, дадаліся і іншыя чыньнікі. Дэмакратычныя рэвалюцыі ў Грузіі і Ўкраіне прымушаюць усё яшчэ дзейных аўтакратаў чыніць папераджальныя меры для выкараненьня тых чыньнікаў, што робяць гэтыя рэвалюцыі магчымымі. Сюды трапляе ня толькі і, магчыма, ня столькі апазыцыя як такая, а любыя некантраляваныя асяродкі альтэрнатыўнай самаарганізацыі і мысьленьня. Гістарычнае паскарэньне працэсаў дэмакратызацыі, аб якім пасьля ўкраінскіх падзеяў лістапада — сьнежня 2004 г. казаў Зьбігнеў Бжазінскі, можа абярнуцца для Беларусі яшчэ больш імклівым гістарычным адкатам.

Апазыцыя ў Беларусі, хутчэй за ўсё, ня будзе фармальна зьліквідаваная. У рэшце рэшт, грамадзкая падтрымка, фармальна атрыманая ўладаю ў канкурэнтных выбарах, дагэтуль застаецца надзейным шчытом супраць больш жвавага ўмяшальніцтва ў беларускія справы вонкавых актараў. Калі ж падтрымка будзе здабывацца на безальтэрнатыўных выбарах, яе вартасьць будзе прыкладна раўняцца 100 % галасоў, што набраў Садам Хусэйн на рэфэрэндуме 2002 г. для падаўжэньня сваіх паўнамоцтваў. Таму фармальныя прыкметы канкурэнтнасьці, хутчэй за ўсё, застануцца. Аднак на палітычнай прасторы будзе толькі цалкам кантраляваная апазыцыя, згодная прызнаваць дасягненьні ўлады і прасіць прабачэньня за свае паводзіны ў мінулым, як патрабаваў прэзыдэнт у адозьве з нагоды падпісаньня вынікаў рэфэрэндуму 17 лістапада 2004 г. Цалкам верагодна, што такую апазыцыю ніхто і ня будзе ствараць: дастаткова некалькім прарэжымным партыям (такім, як КПБ) заявіць пра сваю “канструктыўную апазыцыйнасьць”, а іншым (напрыклад ЛДП) — нават пра дэмакратычную арыентацыю. Фармат прэзыдэнцкіх выбараў 20011 г. кшталту “Лукашэнка — Гайдукевіч — Катляроў (Касьцян)” будзе выглядаць надзвычай плюралістычным. Чаму не? У рэшце рэшт, нават у Туркмэністане выбары (праўда, толькі парлямэнцкія) праводзяцца фармальна на альтэрнатыўнай аснове.

На думку аўтара, вызначальным пытаньнем для беларускай апазыцыі на бліжэйшыя некалькі гадоў будзе выбар паміж дысыдэнцтвам і працягам спробаў удзельнічаць у палітычным жыцьці. Магчыма, цягам некалькіх наступных гадоў у Беларусі застанецца месца толькі для апазыцыі дысыдэнцкіх інтэлектуалаў, якія, прызнаючы сваю бездапаможнасьць, сыйдуць у сьвет “антыпалітыкі”, самаўстрымоўваючыся ад канфрантацыі з уладай і канструючы паралельную, тайную, амаль падпольную жыцьцёвую прастору для ідэяў індывідуальнай свабоды і інтэлектуальнага плюралізму, магчыма, чакаючы, калі зьмены здарацца самі сабою. Аднак чаканьне можа быць вельмі доўгім. Кіраўніку дзяржавы яшчэ далёка нават да пэнсіі, прызначэньне пераемніка (нават сярод сыноў) неверагоднае цягам бліжэйшых пятнаццаці — дваццаці гадоў, надзея на элітныя ці вонкавыя варыянты палітычнай трансфармацыі даволі хісткая.

Пераход жа да вулічнай барацьбы сёньня проста немагчымы. Адлегласьць Чыжоўкі ды Малінаўкі ад Кастрычніцкай плошчы вызначаецца зусім не кілямэтрамі ці хвілінамі праезду на аўтобусе — яна мерыцца страхам і зьняверанасьцю ў саму магчымасьць зьменаў. Стаўшы ў позу “хай гара ідзе да Магамэта”, мы мала каго дачакаемся — як было і некалькі гадоў таму, калі хадзіць на мітынгі было нашмат менш небясьпечна. Чарговы пэрформанс з эксклюзіўным правам на інтэрпрэтацыю ў БТ загоніць беларусаў глыбей у страх і зьняверанасьць. Кадры “слабой” апазыцыі, што ня мае падтрымкі ў насельніцтва, папоўняцца яшчэ сотнямі мэтраў кінаплёнкі. Вулічны супраціў заўважаць хіба што за мяжой — і то ня ўсе. У сьвеце досыць дыктатураў, дзе прыхільнікі дэмакратыі змагаюцца сапраўды ў нечалавечых умовах.

Таму дарма што схема “югаслаўскага варыянту” ў Беларусі не спрацоўвае, а спробы яго імітацыі толькі пагаршаюць становішча апазыцыі, апошняя амаль асуджаная на працяг спробаў выбарчай барацьбы. Ёй давядзецца (наколькі гэта магчыма) займацца сызыфавай выбарчай працай, проста каб зьняпраўдзіць чуткі аб сваёй сьмерці. Магчыма, адзін раз камень можна будзе і дапхаць да гары — калі і не праз выбары, то шмат у чым дзякуючы ім. Сёньня, аднак, цяжка прадказаць, калі гэта адбудзецца. Дзясяткі паліталягічных тэорыяў могуць даць пэўнае ўяўленьне аб тых працэсах і чыньніках, што прывядуць да палітычных зьменаў у Беларусі, аднак яны апавядаюць хіба аб магчымых сцэнарах. У рэальнасьці Беларусь чакае доўгі пэрыяд палітычнага застою, калі не летаргіі.

KAMUNIKAT.org

# Разьдзел 6.

# БЕЛАРУСКА-РАСЕЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

## ЭКАНАМІЧНАЯ ПАЛІТЫКА ЛУКАШЭНКІ

### Фармаваньне антырынкавых эканамічных падыходаў у постсавецкі пэрыяд

Па пераходным пэрыядзе ў былым сацыялістычным лягеры разьвіліся, умоўна кажучы, два тыпы рынкавай эканомікі. Першы зь іх можна ахарактарызаваць як “дэмакратычны капіталізм”. Гэтая эканамічная сыстэма вызначаецца стабільнасьцю, што тлумачыцца аднолькавымі, празрыстымі й справядлівымі правіламі гульні для ўсіх суб’ектаў эканамічных адносінаў. Яна паўстала збольшага ў сярэднеэўрапейскіх, а таксама прыбалтыйскіх краінах, палітычна-эканамічнае ўладкаваньне якіх у асноўных сваіх прынцыпах капіюе ўзоры заходніх дэмакратыяў. Пасьпяховасьць іхных эканамічных мадэляў пацьвярджаецца ўступленьнем гэтых краін Эўразьвязу і НАТО. Другі тып — так званы “алігархічны капіталізм”, які адрозьніваецца празьмерным умяшаньнем дзяржавы ў эканоміку дзеля абароны вузкіх інтарэсаў службовых асобаў ці іхных фаварытаў, а таксама шырокім ужываньнем адміністрацыйных мэтадаў кіраваньня эканамічнымі працэсамі. “Алігархічны капіталізм” замацаваўся ў Расіі, Украіне, бальшыні засталых краінаў СНД і некаторых паўднёваэўрапейскіх дзяржавах.

Беларусь — асобны выпадак, які не трапляе ні ў адну з гэтых катэгорыяў. Ад пачатку эканамічных пераўтварэньняў наша краіна знаходзілася сярод аўтсайдэраў рэгіёну ў абсягу рэформаў, што пацягнула за сабой правал макраэканамічнай лібэралізацыі, марудную прыватызацыю і абумовіла мізэрную долю простых замежных інвэстыцыяў у рэструктурызацыю вытворчасьці, спрыяла несупыннаму ўмяшаньню дзяржавы ў эканоміку. Беларусь —

* З ангельскай мовы пераклад зрабіў Сяргей Петрыкевіч. Аўтар выказвае падзяку *Central European University, Special and Extention Programs*, за падтрымку, якая зрабіла магчымым напісаньне гэтай працы, а таксама Максіму Туміловічу за каштоўныя парады.

адзіная краіна ў рэгіёне, эканоміка якой амэрыканскім фондам “Спадчына” (Heritage) ахарактарызавана як рэпрэсіўная. Больш за тое, палавіністыя рэформы, праведзеныя на пачатку 1990-х гадоў, былі спыненыя Лукашэнкам, чый падыход да эканомікі палягаў у імкненьні аднавіць татальны кантроль над ёй з боку ўраду праз зглумленьне прыватнай ініцыятывы і незалежнай дзелавой актыўнасьці. Гэта суправаджалася рэнацыяналізацыяй банкаў, перасьледам прыватных фірмаў, спробай рэанімаваць пяцігадовыя пляны ў якасьці асновы кіраваньня эканомікай і вяртаньнем да інфляцыйнай стымуляцыі ў мэтах паскарэньня эканамічнага росту. Тым ня менш, адсутнасьць пераўтварэньняў не прывяла да каляпсу эканомікі, а ўзровень вытворчасьці і матэрыяльнага дабрабыту ў Беларусі, нават паводле ацэнак вядучых заходніх аналітычных інстытутаў, аказаўся супастаўным, а сям-там і перавысіў адпаведныя паказьнікі больш прыхільных да рэформаў суседніх дзяржаваў. Апроч таго, антырынкавая палітыка не перашкодзіла хуткаму эканамічнаму росту. Вядома, чарада беларускіх урадаў, якія адмаўлялі рынак, не змагла закласьці надзейную аснову для паступальнага эканамічнага разьвіцьця краіны. З блізкай пэрспэктывы, аднак, такая палітыка аказалася дзейснай для падтрыманьня сацыяльнай стабільнасьці і захаваньня існага палітычнага становішча пры маўклівай падтрымцы бальшыні грамадзтва.

Мэтай гэтай публікацыі ёсьць ня толькі апісаньне трансфармацыі эканамічнага курсу Беларусі але й асэнсаваньне ўплыву выразна антырынкавай эканамічнай стратэгіі на стабільнасьць рэжыму Лукашэнкі. Не адмаўляючы велічыні гэтай ролі, я ня бачу падставаў уважаць сыстэму цэнтралізаванага плянаваньня адзіным фактарам, які вызначае дынаміку палітычна-

**Табліца 1.** Асобныя эканамічныя паказьнікі на працягу 1991—2001 гг.

| | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001* |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт, % | 2,8 | 11,4 | 8,4 | 3,4 | 5,8 | 4,1 |
| Прамысловая прадукцыя, % | 4 | 19 | 12 | 10 | 8 | 5 |
| Сельскагаспадарчая прадукцыя*, % | 2,4 | -4,1 | -0,7 | -8,3 | 9,9 | 1,8 |
| Інфляцыя, спажывецкія цэны, % | 53,7 | 63,9 | 72,9 | 293,7 | 168,6 | 46,1 |
| Інфляцыя, цэны вытворцаў, % | 35,0 | 86,5 | 73,5 | 355,8 | 185,6 | 39,1 |
| Валавыя ўнутраныя інвестыцыі*, % | 5 | 20 | 25 | 8 | 2 | 8 |
| Экспарт, US$ млрд. | 5,790 | 6,919 | 6,172 | 5,646 | 6,932 | 7,525 |
| Імпарт, US$ млрд. | -6,939 | -8,326 | -7,673 | -6,216 | -7,840 | 8,046 |
| Гандлёвы баланс, US$ млрд. | -1,149 | -1,407 | -1,501 | -570 | -908 | -521 |
| У % да ВУП, % | -7,3 | -10,0 | -9,3 | -4,7 | -7,1 | |
| Баланс рахунку бягучых апэрацыяў, US$ млрд. | -516 | -859 | -1,017 | -194 | -232 | |
| У % да ВУП, % | -3,5 | -6,1 | -6,7 | -1,6 | -1,3 | |
| Простыя замежныя інвэстыцыі, US$ млрд. | 105 | 352 | 203 | 444 | 90 | |
| Вонкавы доўг, US$ млрд. | 1,105 | 1,171 | 1,154 | 982 | 851 | |
| У % да ВУП, % | 7,5 | 8,3 | 7,6 | 8,1 | 6,7 | |
| Беспрацоўе*, % | 2,9 | 2,8 | 2,3 | 2,1 | 2,1 | 2,3 |

Крыніца: Міжнародная фінансавая карпарацыя

* Міністэрства статыстыкі і аналізу РБ

га працэсу за Лукашэнкам. Беларуская мадэль захавала такія элемэнты сацыялістычнай сыстэмы, як панаваньне дзяржаўнай уласнасьці, разьмеркаваньне матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, рэгуляваньне цэнаў і, як вынік, цэнавыя дыспрапорцыі. Ня менш важнае значэньне меў і ўдзел дзяржавы ў сыстэме “бюракратычнага гандлю” (практыка ўкладаньня ўгодаў на ўзроўні ўраду, зазвычай пры дапамозе бартэрных пагадненьняў, якія вызначалі, колькі расійскай нафты і газу атрымае беларускі ўрад у абмен на пастаўку агаворанай колькасьці прамысловай прадукцыі), у рамках якога ўрадавыя органы ператвараліся ў дылераў для дзяржаўных прадпрыемстваў, што страцілі або добраахвотна саступілі дзяржаве свае правы на самастойнае вядзеньне справаў. З другога боку, аднаўленьне цэнтралізаванага плянаваньня ў такім выглядзе, у якім яно існавала ў СССР, было немагчымае, паколькі адсутнасьць поўнага кантролю над уваходнымі патокамі тавараў і капіталаў ды цэнамі не дазваляла рэстаўраваць сыстэму “матэрыяльных балянсаў” і “нарматываў”. А спроба ўстанавіць такі кантроль пры наяўнасьці вялікага (паводле савецкіх мерак) прыватнага сэктару, адкрытасьці беларускай эканомікі ды ейнай глыбокай інтэграцыі з новапаўсталымі рынкавымі эканомікамі суседніх краінаў непазьбежна прывяла б да імклівага пашырэньня “чорнага рынку”. У выніку пры выпрацоўцы эканамічнага курсу дзеля дасягненьня намечаных (і даволі амбіцыйных) паказьнікаў росту вытворчасьці беларускаму кіраўніцтву даводзілася абапірацца на макраэканамічнае стымуляваньне попыту (павелічэньне грашовай масы, квазіфіскальныя апэрацыі Нацыянальнага банку, стымуляваньне спажываньня) і разам з тым на бюракратычнае плянаваньне і каардынацыю з боку прапановы. Слушней ахарактарызаваць тып Лукашэнкавай эканамічнай мадэлі як камандна-адміністрацыйны зь перавагай папулісцкіх мэтадаў.

## Чаму папулізм? Падабенствы і адрозьненьні паміж беларускім і лацінаамэрыканскім досьведам

Эканамічны папулізм — зьява, добра вядомая ў рэформавых эканоміках лацінаамэрыканскага рэгіёну. У палітэканамічных аналізах папулізм вызначаецца як падыходы да эканамічнай палітыкі, якія “робяць акцэнт на росьце і памеры даходаў, ігнаруючы рызыкі інфляцыі й бюджэтнага дэфіцыту, вонкавыя фактары і рэакцыю ўдзельнікаў эканамічных адносінаў на агрэсіўную антырынкавую палітыку”[1]. Палітыкі-папулісты прагнуць здабыць імгненную папулярнасьць любой цаной, дарма што гэта можа выклікаць катаклізмы ў будучым. Яны імкнуцца пашырыць сваю сацыяльную базу, у першую чаргу за кошт гарадзкой сярэдняй клясы і гарадзкога люмпэн-пралетарыяту, і на першае месца ставяць дзяржаўныя і арыентаваныя на ўнутраны рынак сэктары эканомікі, пакідаючы за бортам інтарэсы вясковага насельніцтва, а таксама прыватныя і вонкаваэканамічныя сэктары. Набор інструмэнтаў для дасягненьня гэтых мэтаў звычайна ўключае павелічэньне заробкаў і рэгуляваньне цэнаў, кантроль над абменным курсам валюты і нармаваньне водпуску тавараў, а таксама экспансіяністую фіскальную і грашовую

[1] Гэтае найбольш папулярнае азначэньне ўзята з выданьня: Rudiger Dornbusch and Sebastian Edwards. The Macroeconomics of Populism in Latin America. The World Bank Policy Planning and Research Working Papers, December 1989. P. 1. Глядзі таксама: The Macroeconomics of Populism in Latin America, ed. Rudiger Dornbusch and Sebastian Edwards. Chicago: University of Chicago Press, 1991.

**Табліца 2.** “Беларуская эканамічная мадэль”: падноўленая плянавая эканоміка

| Элементы плянавай (каманднай) эканомікі, прадстаўленыя ў “беларускай мадэлі” | Элементы плянавай (камандна-адміністрацыйнай) эканомікі, адсутныя ў “беларускай мадэлі” | Шэраг рынкавых механізмаў, якіх “беларускай мадэлі” не ўдалося ўнікнуць |
|---|---|---|
| * Панаваньне дзяржаўнай уласнасьці<br>* рэгуляваньне цэнаў (няпоўнае)<br>* цэнтралізаванае разьмеркаваньне матэрыяльных і грашовых рэсурсаў паміж дзяржаўнымі прадпрыемствамі<br>* давядзеньне плянаў да прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў<br>* “бюракратычны гандаль” (у міждзяржаўным гандлі: вызначэньне цэнаў, аб'ёмаў і [illegible], не з дапамогай рынкавых механізмаў, а праз міжўрадавыя ўгоды)<br>* адсутнасьць рынку працоўнай сілы | * адсутнасьць інстытутаў цэнтралізаванага плянаваньня, падобных да тых, што меліся ў СССР<br>* адсутнасьць дзейнай сыстэмы матэрыяльна-тэхнічнага забесьпячэньня і нарматываў | * глыбокая інтэграцыя з эканомікамі, заснаванымі на рынкавых прынцыпах<br>* наяўнасьць даволі значнага (па мерках клясычнай каманднай эканомікі) прыватнага сэктару<br>* частковая лібэралізацыя цэнаў<br>* немагчымасьць цалкам абмежаваць перамяшчэньне капіталаў і, як вынік, усталяваць кантроль над валютным курсам |

палітыку. Падобныя папулісцкія экспэрымэнты, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам прэзыдэнтаў Сальвадора Альендэ ў Чылі (1970—73) і Алана Гарсія ў Пэру (1986—89), трывалі нядоўга і мелі цыклічны характар. Звычайна такія цыклы ўключалі ў сябе наступныя стадыі: хуткі рост, павелічэньне макраэканамічных дыспрапорцыяў, спробы кіраўнічых колаў запачаткаваць палітычныя рэформы і, нарэшце, вяртаньне да папулісцкіх захадаў. Завяршаліся яны, як правіла, пагаршэньнем стану эканомікі, спыненьнем прытоку замежных інвэстыцыяў, павелічэньнем крытыкі антырынкавай палітыкі замежнымі дзяржавамі і (або) ваенным пераваротам.

Камуністычную плянавую сыстэму і лацінаамэрыканскі папулізм лучаць наступныя рысы: 1) палітыка, скіраваная на пераразьмеркаваньне нацыянальнага даходу ад вясковага насельніцтва да гарадзкога; 2) пасьлядоўнае абмежаваньне імпарту; 3) панаваньне дзяржаўнага сэктару над прыватным; 4) дыскрымінацыя замежных інвэстараў; 5) аднолькавыя мэты — эканамічны рост, пераразьмеркаваньне даходаў без увагі на ціск з-за мяжы; 6) аднолькавыя спосабы дасягненьня гэтых мэтаў — бюджэтны дэфіцыт і кантроль за валютным курсам[2].

Гэтае падабенства паміж сацыялізмам і папулізмам дазваляе бязь цяжкасьці тарнаваць лацінаамэрыканскія мэтады ажыўленьня эканомікі ў амаль нерэфармаванай беларускай гаспадарцы. Апроч таго, назіраецца дзівоснае падабенства ня толькі ў эканамічнай, але і ў палітычнай сфэры. Ужываньне псэўдапапулісцкіх захадаў мае пад сабой глыбокія палітычныя матывацыі. Сярод іх — узмацненьне ўлады шляхам кансэрвацыі эканамічных і сацыяльных

[2] Bela Greskovits. The Political Economy of Protest and Patience: East European and Latin American Transformations Compared. Budapest: CEU Press, 1998.

структур, што ўтвараюць грунт для кіраўнічага рэжыму; пашырэньне ягонай сацыяльнай базы праз выбарачную падтрымку асобных ключавых сэктараў эканомікі і сацыяльных слаёў (асабліва тых, якія не належалі да найбольш актыўных прыхільнікаў гэтага рэжыму); легітымізацыя (як вонкавая, так і ўнутраная) новапаўсталай палітычнай сыстэмы пры дапамозе гучных эканамічных посьпехаў.

Гамаваньне рэформаў у беларускай эканоміцы стварыла спрыяльныя ўмовы для папулісцкай палітыкі. На пачатку эканамічных пераўтварэньняў на постсавецкай прасторы шматлікія экспэрты прадказвалі сацыяльныя ўзрушэньні й палітычную нестабільнасьць, што могуць прывесьці да паступовага ўсталяваньня аўтарытарызму з прычыны “непазьбежных аўтарытарных схільнасьцяў” “урадаў-банкрутаў” і “антырэфарматарскіх элітаў”[3] ці поўнага крышу “рынкавай” палітыкі пасьля “выбухаў нездаволенасьці, страйкаў і мітынгаў пратэсту”[4] з боку тых, хто найбольш пацярпеў ад рэформаў, альбо “тых мільёнаў людзей, якія паддадуцца ўплыву дэмагогаў”[5].

Як правіла, палітычная адкрытасьць і дэмакратызацыя не ўяўлялі асноўнай пагрозы рынкавым рэформам у постсавецкіх краінах, нават калі зьмены цягнулі за сабой рэзкі эканамічны спад і беспрацоўе. Эфэктыўнасьць спалучэньня “дэмакратыя-рынак” забясьпечвалася ў першую чаргу трохі нечаканай — для крытыкаў нэалібэралізму — узаемазалежнасьцю паміж радыкальнымі рэформамі, эканамічным ростам і адносна роўным разьмеркаваньнем даходаў. Краіны, якія адважыліся на найбольш рашучыя рэформы адразу па заняпадзе камунізму, зьведалі найменшы і далёка не такі глыбокі, як прадракалі левыя палітыкі, эканамічны спад. У гэтых краінах сацыёлягамі адзначаўся найбольшы ў рэгіёне рост расходаў на сацыяльную абарону[6]. Як вынік, сацыяльнае расслаеньне, выражанае каэфіцыентам Джыні, расло ў іх найменшымі тэмпамі[7]. Істотную ролю тут адыгралі і такія фактары, як, з аднаго боку, структура насельніцтва, значную долю якога складалі вясковыя жыхары і пэнсіянэры, якія мелі большую патрэбу ў сацыяльнай абароне, а з другога — наяўнасьць пэўнага сацыяльнага досьведу: дзякуючы падабенству паміж папулізмам і сацыялізмам людзі ў гэтых краінах засвоілі, што папулісцкая палітыка не забясьпечвае ўстойлівага эканамічнага росту і павелічэньня дабрабыту, таму яны палічылі за лепшае адмовіцца ад яе на карысьць лібэральных рэформаў. Праз нейкі час шок мінуў, і грамадзтва аказалася гатовым да перадзелу ўласнасьці. Пры гэтым нэалібэральныя рэформы здолелі так перакраіць сацыяльна-эканамічны ляндшафт, што правядзеньне папулісцкай палітыкі аказалася ўжо немагчымым. Пераходны

[3] Adam Przeworski. Democracy and the Market: Political and Economic Reforms in Eastern Europe and Latin America, Cambridge: Cambridge University Press, 1991, P. 189—90. Цытуецца паводле: Bela Greskovits. Crisis-Proof democracy: On Failed Predictions and the Realities of the Eastern Europe’s Transformations // International Politics. № 34. June 1997. P. 195.

[4] David Ost. Labor and Societal Transition // Problems of Communism. №5—6. 1992. P. 48—51. Цытуецца паводле: Greskovits. Crisis-Proof Democracy... P. 195—96.

[5] Тамсама.

[6] Tomasz Inglot. The Politics of Social Policy Reform in Post-Communist Poland: Government Responses to the Social Insurance Crisis During 1989—1993 // Communist and Post-Communist Studies, № 3, 1995: P. 361—73; Janos Kornai. // Paying the Bills for the Goulash-Communism: Hungarian Development and Macro-Stabilization in Political Economy Perspective” // Struggle and Hope: Essays on Stabilization and Reform in Post-Socialist Economy (Cheltenham, UK; Northhampton, MA, USA, 1996, P. 137—41.

[7] Зьвесткі глядзі ў працы: Joel Hellman, “Winners Take All: The Politics of Partial Reform in Post-communist Transitions”, World Politics 50, no. 2 (January 1998).

пэрыяд зьмяніў грамадзкія настроі й спарадзіў новыя сацыяльныя групы ды галіны прамысловасьці, якія спрыялі далейшай эканамічнай лібэралізацыі. Беларусь у гэтым сэнсе складае вынятак, які ў вялікай ступені пацьвердзіў галоўнае правіла. У адрозьненьне ад іншых краінаў рэгіёну Беларусь не ўвайшла ў постпапулісцкую эру адразу пасьля крышу камуністычнай ідэалёгіі. Савецкая сыстэма пераўвасобілася тут у своеасаблівую палітыку псэўдарэформаў, узятую на ўзбраеньне ўрадам Кебіча, што ўгнаіла глебу для папулізму так, як, бадай, нідзе больш на постсавецкай прасторы. Беларусь успадкавала эканоміку зь перавагай вялікіх прамысловых прадпрыемстваў, бальшыня зь якіх належалі да ваенна-прамысловага комплексу альбо выраблялі прадукцыю, канкурэнтаздольную вылучна на савецкім рынку. Пераважная частка беларускага электарату лёгка куплялася на абяцаньні запусьціць старыя заводы і “аднавіць вытворчыя сувязі”. Распачатыя псэўдарэформы мелі на мэце хутчэй захаваць старую эканамічную структуру, чымся зьмяніць яе. Спробы ўвесьці элемэнты новых гаспадарчых адносін былі спарадычныя (напрыклад, так і не атрымаў значнага разьвіцьця малы бізнэс і прыватная сфэра паслуг), таму сацыяльна-эканамічны ўклад беларускага грамадзтва, як і ягоная палітычная сыстэма, амаль не зьмяніўся з канца васьмідзясятых гадоў.

Да таго ж у Беларусі не дасягнула крытычнага пункту незадаволенасьць мінулым ладам, паколькі краіна ў рамках савецкай эканамічнай сыстэмы займала прывілеяванае становішча (магчымасьць атрыманьня сыравінных рэсурсаў па нізкіх цэнах з гарантаванымі рынкамі продажу прамысловай прадукцыі па завышанай цане), а досьвед рэформаў быў замалы, калі наогул пра яго можна гаварыць. На пачатку і ў сярэдзіне дзевяностых гадоў трывалыя антырынкавыя настроі ў беларускім грамадзтве падмацоўваліся стаўкай многіх беларускіх эканамістаў і палітыкаў на плянавую эканоміку і дзяржаўнае рэгуляваньне. Прэзыдэнт Лукашэнка ня быў тут выняткам. Станіслаў Багданкевіч, тагачасны старшыня Нацыянальнага банку Беларусі, прыгадваў:

> Я глыбока ўпэўнены, што кіраўнік нашай дзяржавы — шчыры прыхільнік сацыялізму. Некаторы час ён спрабаваў узяцца за рынкавыя рэформы. Але потым ягоныя ўнутраныя перакананьні прымусілі яго замяніць рыначнікаў людзьмі, якія верылі, што краіна добра жыла ў мінулым. Пасьля маёй адстаўкі ён узяў пад кантроль валютны курс, ён паспрабаваў рэгуляваць яго ў “сацыяльна значных мэтах”. Ён зрабіў спробу замарозіць цэны на энэрганосьбіты, мяркуючы, што праблемы можна вырашыць такім спосабам. Ён палічыў, што цэны растуць, таму што ніхто іх не кантралюе, значыць, некаму трэба гэтым займацца. І ён стаў вяртаць усё тое, што было звыклым даўней, калі цэны ў Беларусі стаялі на месцы[8].

Нарэшце, згодна з новай Канстытуцыяй Беларусі, прынятай у сакавіку 1994-га, была ўведзена пасада “моцнага” прэзыдэнта, які ў хуткім часе падмяў пад сябе мэханізм падзелу ўладаў і перабудаваў беларускую палітычную сцэну паводле прынцыпу “пераможца забірае ўсё”, што як найлепш адпавядала заданьню стрымліваньня рэформаў[9].

Шэраг разыходжаньняў паміж лацінаамэрыканскімі папулізмамі і досьведам Беларусі не

[8] Гутарка аўтара са Станіславам Багданкевічам.

[9] Чаму як дэмакратыі, так і рынку ўва Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропе спрыяюць парлямэнцкія сыстэмы, тлумачаць праца Хельмана (гл. спасылку 7), а таксама мае артыкулы “Прэзыдэнцкая ці парлямэнцкая рэспубліка: досьвед постсавецкіх краін, выбар Беларусі” // Адкрытае грамадзтва. Менск. № 9. 2000. “Quo Vadis, або Развагі над беларускай стратэгіяй” // Беларуская пэрспэктыва. Менск. 2000, май-ліпень, таксама даступны на сайце http://www.mdi.newmail.ru.

павінен уводзіць нас у зман. Папулізм — гэта спроба "дамагчыся росту шляхам рэактывацыі й пераразьмеркаваньня". Хоць інструмэнты рэактывацыі і пераразьмеркаваньня ў Беларусі часам адрозьніваліся ад лацінаамэрыканскіх, яны не выходзілі за рамкі адрозьненьняў паміж палітычным ладам і палітычнымі традыцыямі двух рэгіёнаў. Напрыклад, нізкі афіцыйна зарэгістраваны ўзровень бюджэтнага дэфіцыту з мэтай утаіць рэальныя перарасходы, пра якія сьведчылі субсыдыі Нацыянальнага банку рэальнаму сэктару эканомікі, кепскі фінансавы стан банкаў і прадпрыемстваў, рэзкае скарачэньне рэзэрваў Нацбанку — усё гэта можа быць ахарактарызавана як альтэрнатыўныя мэтады стымуляцыі попыту*. Павелічэньне інвэстыцыяў у беларускім выпадку было кароткатэрміновае і збольшага абумоўленае ростам невытворчых капіталаўкладаньняў, якія фактычна былі завуаляванай формай субсыдаваньня спажываньня. Прытрымліваючыся агульнай лёгікі эканамічнага папулізму і выкарыстоўваючы некаторыя прыёмы, характэрныя для лацінаамэрыканскай сыстэмы гаспадараньня (рэгуляваньне цэнаў і валютнага курсу, фіскальная і манэтарная экспансія), Лукашэнкаў урад ужываў і захады, пераняты ад каманднай эканомікі (цэнтралізаванае крэдытаваньне і г. д.), якія не былі пашыраны ў Лацінскай Амэрыцы. Стымуляваньне эканомікі шляхам праяданьня абаротных сродкаў было насамрэч абумоўленае недавыкарыстаньнем магутнасьцяў дзяржаўных прадпрыемстваў пасьля эканамічнага спаду на пачатку дзевяностых і адбывалася савецкімі мэтадамі: прадпрыемствам даваліся танныя крэдыты замест таго, каб заахвочваць попыт праз павышэньне рэальных даходаў (хоць магчымая і камбінацыя абодвух спосабаў). Даходы пераразьмяркоўваліся ад жыцьцяздольнай часткі эканомікі (якую ўтвараў прыватны сэктар) ці ад выбарцаў зь нізкім узроўнем пратэстных настрояў (сельскае насельніцтва) да дзяржаўнага сэктару пры дапамозе мэтадаў, некаторыя зь якіх былі вельмі тыповыя для Лацінскай Амэрыкі, улучна з рэгуляваньнем валютнага курсу і абмежаваньнем свабоды рынку (яны ж былі ўласьцівыя і каманднай эканоміцы). Гэта не абавязкова вяло да паляпшэньня становішча зьбяднелай часткі насельніцтва, асабліва ўлічваючы тое, што колькасьць багатых у Беларусі была невялікай, паколькі, сутыкнуўшыся са значным ростам сацыяльнага расслаеньня ў пачатку 1990-х гг., улада імкнулася не дапускаць яе далейшага павелічэньня.

Рэзкае пагаршэньне макраэканамічных паказьнікаў і ціск звонку штурхалі да перагляду эканамічнай стратэгіі. Аднак шэраг фактараў (у першую чаргу адарванасьць ад заходніх рынкаў, адсутнасьць вялікага вонкавага доўгу і асаблівасьці расійска-беларускіх адносінаў) стварылі ў Беларусі ўмовы для працягу антырынкавай палітыкі. Агромністая няяўная падтрымка Расіі вызваляла Лукашэнку ад неабходнасьці ўваходу ў рынак, пакуль гэтая падтрымка моцна не паменшала ў 1999 годзе. У Беларусі працягвала дзеяць "цыклічная" мадэль, пры якой рост зьмяняецца выразнымі крызыснымі тэндэнцыямі, нерашучае вяртаньне да рынку — крахам спробаў рэформаў. Але гэты цыкль не пацягнуў за сабой, як у краінах трэцяга сьвету, макраэканамічнага краху і крызысу (ці нават разбурэньня) палітычнага рэжыму. Кансалідацыя Лукашэнкавай сыстэмы ўлады і зьнішчэньне рэальнай апазыцыі зрабілі лягчэйшым падтрыманьне стабільнасьці сыстэмы і дазволілі чаргаваць традыцыйную эканамічную палітыку з рынкавымі захадамі. Рашучая адмова ад дзяржаўнага ўмяшаньня ў эканоміку нясе беларускаму палітычнаму рэжыму пагрозу самаразбурэньня, паколькі спыненьне яго падтрымкі з боку асобных слаёў грамадзтва ліквідавала б яго сацыяльную базу.

* Вялікі бюджэтны дэфіцыт праяўляецца ня толькі ў некаторым росьце ВУП, але і ў вялікай ступені манэтарызацыі эканомікі й наступнай гіпэрінфляцыі.

## Эканамічная палітыка беларускіх урадаў за Кебічам

Распад Савецкага Саюзу паставіў перад Беларусяй шэраг праблем. Першай рэакцыяй на яго беларускіх уладаў стала імкненьне як мага даўжэй пазьбягаць рэформаў. Фактычна Кебічаў урад зьвёў рынкавыя рэформы ў краіне да размоваў пра іх. Галоўнымі элемэнтамі эканамічнай палітыкі за Кебічам былі:

— абмежаваньне разьвіцьця прыватнага сэктару на карысьць выжываньня дзяржаўных прадпрыемстваў (у пачатку 1994 году больш чым 90% уласнасьці належала дзяржаве);

— выдзяленьне субсыдыяў дзяржаўным прадпрыемствам: каля 20—30% расходнай часткі бюджэту ішло на падтрымку сельскай гаспадаркі, такая ж сума выдзялялася ў выглядзе цэнтралізаваных крэдытаў Нацыянальнага банку (80% усіх цэнтралізаваных крэдытаў);

— захаваньне традыцыйных рынкаў Расіі й краінаў СНД пры дапамозе мэханізмаў “бюракратычнага гандлю”;

— захаваньне шматлікіх сацыяльных гарантыяў (ці іх бачнасьці, улічваючы хуткае зьбядненьне насельніцтва);

— рэгуляваньне цэнаў (у 1994 годзе дзяржава кантралявала цэны больш чым на 50% тавараў);

— падтрымка прадпрыемстваў-банкрутаў з мэтай прадухіліць масавае беспрацоўе;

— спэкуляцыя на недасканаласьці мэханізмаў адзінай эканамічнай прасторы ўнутры СНД, такіх як рублёвая зона і трывалы дысбалянс паміж цэнамі на сыравіну ды гатовую прадукцыю.

Гэтая стратэгія была ня толькі эканамічная, але і палітычная, паколькі выжываньне “партыі ўлады” ўва ўсё больш зьменлівым і канкурэнтным палітычным асяродзьдзі было пастаўлена пад пагрозу. Не пазьней як празь месяц пасьля распаду СССР фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце выступіла з ініцыятывай правядзеньня рэфэрэндуму аб даверы парлямэнту. На працягу двух месяцаў было сабрана амаль паўмільёна подпісаў у падтрымку рэфэрэндуму. БНФ абгрунтоўваў сваю ініцыятыву адсутнасьцю ўва ўраду крэдыту даверу і яго няздольнасьцю перадолець эканамічны крызыс. Кебіч хутка зразумеў, што найлепшай ягонай палітычнай стратэгіяй перад выклікам апазыцыі будзе падтрыманьне ў грамадзтве савецкіх патэрналісцкіх настрояў. Ягоны кабінэт перш-наперш узяў пад жорсткі кантроль раздробавыя цэны, што дазволіла на кароткі час прыпыніць зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва. Аднак у доўгатэрміновай пэрспэктыве гэты захад гукнуўся паважнымі непрыемнасьцямі, паколькі ўраду давялося кампэнсаваць страты прадпрыемстваў, бо гуртовыя цэны былі ўжо лібэралізаваныя*. Гэта было зроблена шляхам субсыдаваньня дзяржаўнага сэктару, што дзякуючы існаваньню рублёвай зоны не нанесла адчувальнай шкоды фінансавай сыстэме краіны. У выніку Кебічаў урад мог ганарыцца вышэйшым, чымся ў іншых рэспубліках былога СССР, жыцьцёвым узроўнем беларусаў (асабліва ў параўнаньні з краінамі Балтыі, дзе радыкальныя палітычныя захады, накіраваныя на разрыў гаспадарчых сувязяў з постсавецкай прасторай, выклікалі эканамічны спад да 40% на год) і патрабаваць ад народу ўхваленьня сваёй палітыкі максымальна павольных рэформаў, калі пра гэткія наагул можна было гаварыць. Прапановы апазыцыі, якая абяцала адно выпрабаваньні “шокавай тэрапіяй” у найбліжэйшы час і паляпшэньне ў няпэўнай будучыні, былі куды менш прывабныя. Кампанія БНФ па арганізацыі рэфэрэндуму правалілася

* 70—80% цэнаў вытворцаў былі лібэралізаваныя ў 1992 годзе, гл.: Antczak et at., 6.

значна раней за кастрычнік 1992 году, калі Вярхоўны Савет адмовіў у яго правядзеньні. Ідэя датэрміновых выбараў перастала быць папулярнай сярод большыні грамадзтва ўжо ў красавіку 1992-га. Так, у лютым 1992 году рэфэрэндум падтрымлівалі 64% беларусаў, у той час як 23% былі супраць. У красавіку гэтыя лічбы зьмяніліся адпаведна на 35 і 38%[10].

Здольнасьць Кебічавага ўраду сяк-так стрымаць падзеньне жыцьцёвага ўзроўню і пазьбегнуць беспрацоўя шмат у чым тлумачылася бязладзьдзем у эканамічных адносінах паміж краінамі СНД, якое дазваляла тым зь іх, што заставаліся ў рублёвай зоне, атрымліваць выгаду ад фактычнага крэдытаваньня і падсілкоўваньня сваіх эканомік Расіяй (тлумачэньне гэтаму будзе дадзена ў наступным разьдзеле), якая гамавала інфляцыю, паглынаючы рублі, што ўва ўсё большай колькасьці друкаваліся ў іншых постсавецкіх рэспубліках. Пасьля таго як у ліпені 1993 году расійскі рубель спыніў сваё абарачэньне ў межах СНД, у Беларусь прыйшла гіпэрінфляцыя. Спробы макраэканамічнай стабілізацыі былі фактычна замененыя перамовамі пра аднаўленьне рублёвай зоны з Расіяй. Паколькі намаганьні стварыць новы грашовы саюз ні да чога не прывялі, рэзкае скарачэньне ўзроўню вытворчасьці і адчувальнае падзеньне матэрыяльнага дабрабыту надзвычай пагоршыла палітычнае становішча ўраду якраз напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году.

## Прыход Лукашэнкі. Эканоміка і выбарчая кампанія

У ходзе свайго раскручваньня Лукашэнка стварыў сабе вобраз “самотнага ваўка”, што процістаіць як кіруючай намэнклятуры, так і дэмакратычнай апазыцыі, якую ён называў чарговым пакаленьнем зладзеяў і абвінавачваў у змове з уладай. Ён дакладна намацаў і скарыстаў раскол паміж шырокімі масамі і “элітарнымі” палітыкамі, які ў Беларусі няспынна паглыбляўся. Лукашэнкава стратэгія мела супярэчлівы характар. З аднаго боку, абяцаньні выкараніць карупцыю, спыніць інфляцыю, аднавіць разарваныя сувязі з Расіяй і іншымі краінамі СНД супалі з настроямі, якія панавалі тады сярод большыні беларусаў. З другога боку, ён здолеў прадставіць сябе як альтэрнатыву і ўладзе, і апазыцыі, завяяваўшы падтрымку нэўтральных выбарцаў. У ягоных папулісцкіх заявах спалучаліся падтрымка палітычнага саюзу з Расій і абарона сувэрэнітэту краіны, крытыка рынку і абяцаньні прадоўжыць прыватызацыю, абвінавачаньні высокапастаўленых урадоўцаў у карупцыі й запэўніваньні, што чысткі дзяржапарату ня будзе. Такая стратэгія забясьпечыла Лукашэнку максымальную грамадзкую падтрымку, паколькі яна цалкам адлюстроўвала разлад у грамадзкай думцы*. Лукашэнкавы лёзунгі асабліва прыйшліся даспадобы рабочым дзяржаўнага сэктару эканомікі ды калгасьнікам** (сярод

[10] Советская Белоруссия. 1992. 25 мая.

* Так, рэспандэнты ў ходзе сацыялягічных апытаньняў маглі ўхваляць узаемавыключальныя захады, напрыклад, умацаваньне незалежнасьці і ўступленьне ў саюз з Расіяй, будаўніцтва рынкавай эканомікі і рэгуляваньне цэнаў і г.д. Гл. Новости НИСЭПИ. 1999. №4. С. 20—45.

** Роля аграпрамысловага комплексу як апоры для папулісцкай палітычнай плятформы ў Беларусі патрабуе некаторага тлумачэньня, паколькі ў Лацінскай Амэрыцы сяляне звычайна выступаюць з антыпапулісцкіх пазыцыяў, а ў некаторых выпадках нават бываюць апорай лібэральных рэформаў. Асаблівасьць постсавецкага сельскагаспадарчага сэктару ў тым, што гэта не экспартны сэктар, як у большыні краінаў Лацінскай Амэрыкі (у Беларусі, як амаль усюды на постсавецкай прасторы, імпарт прадуктаў харчаваньня пераважае над экспартам). Да таго ж, за дзесяцігодзьдзі калгаснага ладу сельская гаспадарка зрабілася адным з найбольш залежных ад дзяржавы сэктараў эканомікі. Калгасьнік у Беларусі больш падобны да наёмнага рабочага, а старшыня калгасу — да дзяржаўнага службоўца, чымся да ўласьніка, які сам распараджаецца плёнам сваёй працы.

іх Лукашэнку падтрымалі 68,65 і 66,8% адпаведна), асобам безь сярэдняй адукацыі (65,6%) і пажылым людзям. У той жа час сярод спэцыялістаў з вышэйшай адукацыяй і кваліфікаваных рабочых колькасьць ягоных прыхільнікаў складала ўсяго каля паловы ад сярэдняй велічыні[11]. У тагачасных даволі лібэральных умовах Лукашэнкавых навыкаў хапіла, каб зьдзейсьніць цалкам легітымную папулісцкую рэвалюцыю. Аднак, улічваючы жудасны стан эканомікі, пераможца ня мог кіравацца зычэньнямі публікі й сваімі передвыбарнымі абяцаньнямі ў далейшых рэальных дзеяньнях. Як ні дзіўна, перш чым абмежаваць рынак, Лукашэнку давялося зь ім пафліртаваць.

## Пэрыяд палавіністых рэформаў

Апынуўшыся сам-насам са сваімі передвыбарнымі абяцаньнямі й змрочнай эканамічнай рэальнасьцю, сутыкнуўшыся зь першапачаткова халодным стаўленьнем Масквы, Лукашэнка быў вымушаны перагледзець, прынамсі часова, свае прыярытэты. Эканамічную праграму ягонага ўраду складалі ўрадоўцы, што прыхільна ставіліся да рэформаў. Пазьней шмат хто зь іх, у тым ліку прэм’ер-міністар Міхаіл Чыгір і старшыня Нацыянальнага банку Станіслаў Багданкевіч, зрабіліся віднымі дзеячамі апазыцыі. Праграма прадугледжвала некаторыя рынкавыя захады — макраэканамічную стабілізацыю, лібэралізацыю вонкавага гандлю, лібэралізацыю цэнаў, абмежаваньне сумы крэдытаў Нацбанку ўраду чатырма адсоткамі ВУП, абмежаваньне дэфіцыту бюжэту шасьцю адсоткамі ВУП, спыненьне практыкі ўзаемнага сьпісаньня даўгоў прадпрыемствамі і ўвядзеньне бюджэтных абмежаваньняў для дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў і аграпрамысловага сэктару. Згодна зь ёй, у канцы 1994 году месячная інфляцыя павінна была складаць штомесяц 10—11%, а ў канцы 1995-га — 3—4% супраць 54% у жніўні 1994-га[12]. У той жа час Лукашэнка пацьвердзіў сваё абяцаньне не дапусьціць “дзікай” прыватызацыі й пакляўся замарозіць цэны пасьля таго, як у жніўні 1994 г. некаторыя прадукты харчаваньня падаражэлі амаль у дзесяць разоў*. Апроч таго, ён паабяцаў накласьці абмежаваньні на банкаўскія стаўкі рэфінансаваньня, “любой ценой” (г. зн. адміністрацыйным спосабам) стабілізаваць валютны курс і не дапусьціць “абвалу вытворчасьці”[13].

Дарма што прыняцьцё ў цэлым рынкавай праграмы суправаджалася антырынкавай рыторыкай, рэальны эканамічны курс некаторы час амаль дакладна адпавядаў дэклараванаму. Па-першае, крэдыту даверу, які меў Лукашэнка, было цалкам дастаткова, каб перажыць цяжкі пэрыяд “шокавай тэрапіі”. Па-другое, Расія працягвала ставіцца да Лукашэнкі без энтузіязму. Ня толькі ідэя грашовага саюзу, але і пэрспэктыва далейшага атрыманьня танных расійскіх энэрганосьбітаў здавалася нерэальнай. Расійскія афіцыйныя асобы адкрыта заяўлялі, што ранейшыя абяцаньні былі зробленыя зыходзячы з таго, што на пасаду прэзыдэнта будзе абраны Кебіч і што пасьля адбудзецца палітычнае аб’яднаньне, да якога Лукашэнка быў яшчэ не гатовы. Па-трэцяе, беларускі прэзыдэнт яшчэ ня цалкам кантраляваў урад і

[11] Гл. Карбалевіч Валер. Путь Лукашенко к власти // Белоруссия и Россия: общества и государства. Москва, 1998. С. 226—258.

[12] Белорусская деловая газета, 1994 г., 1 августа, с. 3; 1994 г., 10 октября, с. 1.

* Цэны на хлеб вырасьлі ў 18 і на малако — у 13 разоў фактычна за адну ноч.

[13] “Праект праграмы гатовы — засталося пачаць і скончыць” // БДГ, 19 верасьня 1994 г.

дзяржаўны апарат, у якім, як гэта ні парадаксальна, пабольшала рыначнікаў. Так, Лукашэнка ня меў ніякіх вагароў уплыву на Нацыянальны банк, які, паводле Канстытуцыі, падпарадкоўваўся парлямэнту і атрымаў ад апошняга карт-блянш на дастаткова жорсткую грашова-крэдытную палітыку.

Лукашэнку, аднак, усё больш і больш перашкаджала рынкавая арыентацыя Чыгіра і Багданкевіча. Цэнавая лібэралізацыя вяла да няспыннага росту цэнаў, бо ўлады не сьпяшаліся абмежаваць рост грашовай масы, а былі вымушаны згодна з Лукашэнкавымі перадвыбарнымі абяцаньнямі павышаць заробкі, што дало штуршок гіпэрінфляцыі ў жніўні й выклікала абвал нацыянальнай валюты ў кастрычніку (хоць расійскія падзеі, асабліва “чорны аўторак”, таксама адыгралі сваю ролю). Сваім дэкрэтам № 114 ад 20 верасьня 1994 году Лукашэнка забараніў дзяржаўным вытворцам прадаваць прадукцыю прыватным фірмам і прадпісаў мясцовым органам улады “знайсьці рэсурсы для павелічэньня вытворчасьці спажывецкіх тавараў і прадуктаў харчаваньня”[14]. Пасьля таго як у кастрычніку 1994-га было выкананае Лукашэнкава абяцаньне павысіць зарплату бюджэтнікам, курс беларускага рубля ўпаў утрая, выклікаўшы яшчэ адзін віток інфляцыі. Раззлаваны Лукашэнка выступіў па нацыянальным тэлебачаньні, загадаўшы гандлёвай сетцы адкруціць цэны назад, а ўраду — кампэнсаваць страты. Урад, у сваю чаргу, каб запыніць рост цэнаў, прымусіў прадпрыемствы працаваць зь мінімальнай рэнтабэльнасьцю. Такія захады спрыялі праяданьню асноўных фондаў. І ўсё ж Чыгіру і Багданкевічу часткова ўдавалася ўтрымліваць Лукашэнку ад татальнага рэгуляваньня цэнаў і чыніць захады для стабілізацыі эканомікі.

Рынкавыя рэформы сягнулі найдалей у грашова-крэдытнай палітыцы. Нацыянальны банк пад кіраўніцтвам Багданкевіча здолеў абмежаваць рост грашовай масы, устанавіць рэальныя працэнтныя стаўкі па крэдытах і ўкладах, прадаць больш чым 80% пазык на крэдытных аўкцыёнах па рынкавых цэнах, лібэралізаваць валютны курс, рэзка скараціць пакрыцьцё НББ урадавых нядоімак (у 1995 г. яно не перавышала 1%), пераключыцца на дзяржаўныя скарбавыя забавязаньні як асноўную крыніцу фінансаваньня дэфіцыту бюджэту і дазволіць юрыдычным і фізычным асобам свабодна прадаваць і купляць замежную валюту. За кароткі час аднавіўся грамадзкі давер да банкаўскай сыстэмы, і валютныя рэзэрвы Нацыянальнага банку хутка вырасьлі (з 3,5 млн. даляраў у красавіку 1994-га да 104,9 млн. даляраў у чэрвені 1995-га)[15]. Нэгатыўным эфэктам такой палітыкі сталася імклівае павышэньне рэальнага валютнага курсу (з-за яго абмежаваньня ў 1995-м). Як ні дзіўна, гандлёвы балянс на працягу 1995 году істотна не пагоршыўся (-709,7 млн. даляраў у 1994 г. супраць -528,9 млн. у 1995 г.). Парадаксальным быў і рост агульнага тавараабарачэньня (экспарту плюс імпарту) з 5991,3 да 9769,9 мільёна даляраў ЗША[16]; апрача таго, у трэцім квартале 1995-га на кароткі час удалося дасягнуць яго дадатнага балянсу. Усяму гэтаму паспрыяла падпісаньне гандлёвых пагадненьняў з ЭЗ, якія часова адкрылі беларускім прадпрыемствам доступ на эўрапейскія рынкі, пакуль дзеяньне дамоўленасьцяў не было прыпынена ў чэрвені 1996 году пасьля парушэньня правоў чалавека беларускімі ўладамі[17].

Тое, што адбылося ў Беларусі ў 1994—96 гг., было стабілізацыяй без структурнай перабу-

---

[14] Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі № 114 “Аб мерах па насычэньні рынку рэспублікі таварамі і спыненьні неабгрунтаванага росту цэн на іх”.

[15] Паводле зьвестак МВФ.

[16] Republic of Belarus — Recent Economic Developments 97/111.

[17] Белорусский рынок. 1995. № 32.

довы і таму безь якіх-небудзь істотных сацыяльна-эканамічных зьменаў, у выніку чаго эканоміка заставалася пад пераважным кантролем дзяржавы. Тут ляжыць адказ на пытаньне, чаму пасьля пасьпяховага старту і дасягненьня макраэканамічнай стабілізацыі ўсё-такі адбылося згарненьне рэформаў. Зробленыя захады дазволілі дасягнуць становішча, калі фіскальная і манэтарная экспансія, а таксама кантроль за валютным курсам не пагражалі неадкладным эканамічным крахам, але не перабудавалі псыхалёгіі выбарцаў, якія па-ранейшаму жадалі правядзеньня пераразьмеркавальнай палітыкі і не прымалі рынкавых рэформаў. Абмежаваньне інфляцыі зьменшыла цэнавы прэсынг на грамадзтва, але спарадзіла сацыяльную напружанасьць іншага роду. Так, на павелічэньне нагрузкі на вытворчы сэктар у выніку росту працэнтных ставак дзяржаўныя прадпрыемствы адрэагавалі запазычанасьцямі па заробках. Сукрытае беспрацоўе дасягнула 15%, а паводле ацэнак незалежных аналітыкаў — было ўдвая большае (звальненьне лішніх работнікаў зь дзяржаўных прадпрыемстваў было забаронена прэзыдэнцкім дэкрэтам). Павялічвалася і колькасьць тавараў на складох. Беларускае кіраўніцтва (і перш за ўсё Лукашэнка) стала перад выбарам: працягваць рынкавыя рэформы, пераходзячы да іх новай стадыі, або вяртацца да ранейшай палітыкі, што ўрэшце і было зроблена.

## Атака на рэформы: аслабленьне макраэканамічнай дысцыпліны і наступ на банкаўскі сэктар

Няма нічога дзіўнага ў тым, што атака на рынкавыя рэформы пачалася з галіны, дзе яны займелі найбольшы посьпех. Лукашэнка ніколі не сымпатызаваў жорсткай грашова-крэдытнай палітыцы, якую праводзіў Багданкевіч, адмаўляючыся выдаваць бясконцыя льготныя крэдыты дзяржаўнаму сэктару. Старшыня Нацыянальнага банку быў абвінавачаны ў “дзікім манэтарызьме”, што разбурыў беларускую прамысловасьць і стварыў велізарныя запазычанасьці ў заробках. З гэтага часу намеры аслабіць макраэканамічную палітыку і ўзяць камэрцыйныя банкі пад кантроль дзяржавы занялі ў плянах Лукашэнкі адно з прыярытэтных месцаў. Канчаткова пераканаў Лукашэнку адмовіцца ад ранейшага эканамічнага курсу тагачасны дэпутат ВС Пётар Пракаповіч, які ў лютым 1995 году выступіў з публічнай крытыкай дзеяньняў кіраўніцтва Нацбанку. Лукашэнку яўна спадабаўся Пракаповічаў выступ, паколькі неўзабаве ён зрабіў дэпутата намесьнікам прэм’ер-міністра ў эканамічнай палітыцы, а ўрэшце і старшынём Нацыянальнага банку (пасьля адбору шэрагу прэтэндэнтаў, які доўжыўся 3 гады).

Зьмены ў макраэканамічнай палітыцы пачаліся ў апошнім квартале 1995 году, калі Багданкевіч пакінуў пасаду старшыні НББ. Пасьля ягонай адстаўкі крэдытаваньне ўраду Нацбанкам пачало расьці і, што важней, была адноўлена практыка выдзяленьня рэальнаму сэктару цэнтралізаваных мэтавых крэдытаў па адмоўных працэнтных стаўках. Другая зьмена ў палітыцы была асабліва важная, паколькі яна азначала вяртаньне мяккіх бюджэтных абмежаваньняў для дзяржаўнага сэктару. Гэта адпавядала эканамічным ідэям, прапагандаваным Лукашэнкам і Пракаповічам, якія спадзяваліся знайсьці спосаб спыніць рост цэнаў пры працягу безагляднага крэдытаваньня дзяржаўных прадпрыемстваў[18]. “Быў выказаны пункт гледжань-

[18] “Антыінфляцыйная палітыка дзяржавы будзе падпарадкаваная... найважнейшым заданьням: не дапусьціць самаразбурэньня прамысловасьці і далейшага зьбядненьня насельніцтва” — // Советская Белоруссия, 1996 г., 11 сентября.

ня, што павелічэньне вытворчасьці і адпаведны рост эканомікі зьнізіць кошт асобнай адзінкі прадукцыі, створыць канкурэнцыю сярод беларускіх вытворцаў і ўтаймуе інфляцыю. Другі аргумэнт рабіў акцэнт на малой велічыні грашовай масы і ўсеагульным пашырэньні неплацяжоў ды бартэру, якія сталі вынікам жорсткай манэтарнай палітыкі”[19].

Лукашэнка пачаў задумвацца над нацыяналізацыяй банкаў у 1994—95 гг., калі ён нейкі час ня мог устанавіць кантролю над Нацыянальным банкам дзеля канстытуцыйных абмежаваньняў, якія забаранялі яму мяшацца ў дзейнасьць банку і якія ён ня мог яшчэ скасаваць сваімі дэкрэтамі. Для таго каб падарваць уладу Багданкевіча, Лукашэнка задумаў рэнацыяналізаваць камэрцыйныя банкі, каб зь іх дапамогай забясьпечыць дзяржаўныя прадпрыемствы льготнымі крэдытамі. Нацыяналізацыю банкаў падтрымалі фракцыі камуністаў і аграраў у Вярхоўным Савеце Беларусі, якія па выніках выбараў 1995 году склалі ў парлямэнце ці не бальшыню.

Банкаўскі сэктар быў абвінавачаны ў нежаданьні падтрымліваць нацыянальную эканоміку і выдаваць крэдыты “рэальнаму сэктару”. Лукашэнка абвінаваціў банкі таксама ў атрыманьні звышпрыбыткаў пры дапамозе “спэкуляцыйных апэрацыяў”, да якіх адносілася выдача міжбанкаўскіх пазык (прыбытковасьць такіх угодаў, сьцьвярджаў Лукашэнка, перавышала 600%), а таксама продаж і купля замежнай валюты. Апрача таго, у характэрнай для яго манеры ён абвінаваціў банкаўскіх работнікаў у атрыманьні даходаў у памеры 2—3 мільёнаў даляраў (!) штомесяц. Нарэшце, Лукашэнка абураўся, што “акцыі ў банках належаць банкірам, а не сялянам”[20].

Распачынаючы кампанію супраць прыватных банкаў, Лукашэнка ўсклаў на Багданкевіча адказнасьць за зьмяншэньне капіталу беларускіх банкаў з 800 млн. даляраў у 1991 г. да 100 млн. даляраў у 1996 г.[21], адначасова абвінаваціўшы банкі ў празе нажывы ў той час, “калі ўрад мае запазычанасьці перад настаўнікамі, мэдыкамі, рабочымі, пэнсіянэрамі”[22]. Другім аб’ектам крытыкі сталася жорсткая грашова-крэдытная палітыка, якую праводзіў Нацыянальны банк. “Праблема ў тым, — сказаў Лукашэнка, — што ўрад і дзяржаўныя прадпрыемствы змагаюцца з камэрцыйнымі фірмамі за крэдыты. Але хіба спадар Багданкевіч не разумее, што ўраду і дзяржаве не перамагчы ў гэтым змаганьні?”[23]. Апроч таго, ён паставіў Багданкевічу ў віну раскраданьне дзяржаўных сродкаў, намінуўшы, што той прымусіў камэрцыйныя банкі выдаць незваротныя пазыкі фірме, якую ўзначальваў ягоны сын.

Выйсьцем, прапанаваным Лукашэнкам, была нацыяналізацыя банкаў. Яе пачатак супаў з пасьпяховым зьняцьцем з пасады Багданкевіча. У жніўні 1995 году Лукашэнка выдаў указ аб зьліцьці Ашчаднага банку з камэрцыйным (і прыватным) “Беларусбанкам” на чале з Тамарай Віньнікавай. Гэтая нечаканая пастанова мела колькі перадумоваў. “Беларусбанк” быў утвораны ў 1990 годзе шэрагам дзяржаўных прадпрыемстваў ды афіцыйных асобаў і знаходзіўся, як лічылася, пад патранажам Міхаіла Мясьніковіча, Кебічавага намесьніка, які захаваў сваю пасаду і пасьля прыходу Лукашэнкі. З другога боку, “Беларусбанк”, які меў вялікую дэбіторскую запазычанасьць, дзякуючы аб’яднаньню з больш устойлівым Ашчадным банкам палепшыў свае справы. Пратэстуючы супраць зьліцьця, Баг-

[19] Максім Туміловіч. Анамалія...

[21] Белорусская деловая газета, 1996 г., 18 января.

[22] Советская Белоруссия, 1996 г., с. 2, 22 февраля.

[23] Тамсама.

данкевіч пайшоў у адстаўку. Урэшце ў лютым 1996-га ягонае месца заняла Віньнікава. Мясьніковіч тым часам быў назначаны кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта. Новая крэдытная ўстанова, якая атрымала назву "Акцыянэрны ашчадны банк "Беларусбанк", сталася крыніцай фінансаваньня шэрагу ўрадавых праграм, такіх як субсыдаваньне жытловага будаўніцтва.

Нацыяналізацыя прадоўжылася ў 1996 годзе. Дбаючы пра палітычныя дывідэнды, Лукашэнка ператварыў банкаўскае пытаньне ў чарговы этап сваёй антыкарупцыйнай эпапэі. Ён заявіў, што доля дзяржавы ў статутным капітале банкаў (якая часам складалася з такіх актываў, як офісныя будынкі й іншая нерухомасьць) з 1991 году не пераацэньвалася адпаведна інфляцыі. Указ № 209 "Аб захадах што да дзяржаўнага рэгуляваньня банкаўскай дзейнасьці ў Рэспубліцы Беларусі"[24] ад 24 мая 1996 году прадпісваў зрабіць перацэнку актываў згодна з Лукашэнкавымі патрабаваньнямі. Пасьля "пераацэнкі" дзяржава атрымала кантроль над шасьцю найбуйнейшымі беларускімі банкамі — "Беларусбанкам", "Белпрамбудбанкам", "Белаграпрамбанкам", "Белвонкаваэканамбанкам", "Прыёрбанкам" і "Белбізнэсбанкам". Гэтыя шэсьць банкаў кантралявалі 85% актываў, 85% выдадзеных крэдытаў і 40% уласнага капіталу ўсяго беларускага банкаўскага сэктару[25]. Апрача таго, указ загадваў праверыць законнасьць акцыянаваньня былых савецкіх спэцыялізаваных банкаў.

Разам зь няяўнай рэнацыяналізацыяй вышэйзгаданых камэрцыйных банкаў указ № 209 патрабаваў прывязаць заробкі ў банкаўскім сэктары да тарыфнай сеткі, вызначанай для дзяржаўных прадпрыемстваў і ўстановаў. Банкам таксама загадвалася паведамляць уладам пра кожны выдадзены крэдыт памерам больш за 10 тысяч даляраў і інфармаваць іх аб ходзе вяртаньня такіх крэдытаў.

## Спыненьне прыватызацыі

Падчас сваёй перадвыбарнай кампаніі Лукашэнка абяцаў спыніць "дзікую" прыватызацыю, прымушаючы гадаць, пра якое "дзікунства" пры распродажы дзяржаўнай уласнасьці ідзе гаворка. Пазьней ён растлумачыў, што меў на ўвазе ліквідацыю самой магчымасьці "дзікага" распродажу, зьвязваючы гэтую тэму са сваёй улюбёнай тэмай карупцыі. "Перад маім выбраньнем на пасаду прэзыдэнта ўсё нацыянальнае багацьце ў Беларусі было падрыхтавана да дзяльбы. Кожны "наверсе" ведаў, які кавалак яму дастанецца"[26], — сказаў ён, выступаючы перад "Усебеларускім народным сходам", скліканым у кастрычніку 1996 году. У сакавіку 1995-га Лукашэнка падпісаў указ аб ануляваньні вынікаў першага чэкавага аўкцыёну, праведзенага ў рамках дзяржаўнай праграмы прыватызацыі, і прыпыніў дзейнасьць чэкавых інвэстыцыйных фондаў больш як на год. Нарэшце, летам 1995 году ён забараніў укладаць любыя буйныя ўгоды па прыватызацыі безь ягонага асабістага дазволу. У выніку ўсіх гэтых крокаў у 1995 годзе форму ўласнасьці зьмянілі ўсяго толькі 53 прадпрыемствы супраць 140 у 1993 і 184 у 1994 гадох (што складала адпаведна 3,2, 4,2 і 1,2% ад агульнай колькасьці прадпрыемстваў, якія падлягалі прыватызацыі). З гэтых прадпрыемстваў 52 былі

[24] "Советская Белоруссия", 17 жніўня 1996 г.

[25] Зборнік указаў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. — Менск, 1995. С. 225—228.

[25] "Белорусская деловая газета", 29 лютага 1996 г.

[26] "Советская Белоруссия", 20 кастрычніка 1996 г.

акцыянаваныя, г. зн. пераўтвораны ў акцыянэрныя таварыствы зь пераважнай дзяржаўнай уласнасьцю. У 1995—97 гг. на аўкцыёне ці праз тэндэр не было прададзена ніводнага прадпрыемства рэспубліканскай уласнасьці[27].

## Зьнішчэньне прыватнага сэктару эканомікі

Лукашэнка пасьлядоўна абвінавачваў прыватны бізнэс у падрыве дзяржаўных эканамічных інтарэсаў. Разгорнуты наступ на беларускіх бізнэсоўцаў прэзыдэнт пачаў у лютым 1996 году, калі па адной тэлефанаграме была прыпыненая рэгістрацыя прыватных прадпрыемстваў. Указ № 208 ад 24 мая 1996 г. прадугледжваў перарэгістрацыю ўсіх прыватных фірмаў у Беларусі. Апроч гэтага, у гэты дзень была падпісана цэлая сэрыя ўказаў (іншыя датычылі банкаўскага сэктару і рэклямнага бізнэсу), якія значна загамавалі працэс эканамічных рэформаў у Беларусі. Указ № 208 накладаў на прыватны бізнэс паважныя абмежаваньні: так, фірмы, што панесьлі страты па выніках папярэдняга году, альбо разьмяшчаліся не па зарэгістраваным "юрыдычным адрасе", альбо не прадставілі належнай фінансавай справаздачы ў падатковую інспэкцыю, падлягалі ліквідацыі. Уладальнікі ліквідаваных фірмаў пазбаўляліся права на адкрыцьцё новай справы. Дэкрэт таксама павялічваў памер мінімальнага статутнага фонду для прыватных кампаніяў, што надзвычай ускладняла перарэгістрацыю для шмат якіх ужо даведзеных да галечы прадпрымальнікаў. Працэдура перарэгістрацыі з таго часу звычайна паўтаралася штогод, а разнастайныя органы ўлады пачалі выкарыстоўваць свае паўнамоцтвы па кантролі за прыватным бізнэсам для папаўненьня мясцовых бюджэтаў шляхам вымаганьня грошай ад прыватных структураў. Рэгуляваньне прыватнага сэктару сталася сродкам палітычнага ціску, бо пазбаўляла апазыцыю эканамічнай базы, а таксама карала "адступнікаў", якія перасталі быць ляяльнымі прэзыдэнту. Паводле словаў аднаго з тагачасных Лукашэнкавых паплечнікаў Аляксандра Фядуты, дзяржаўнаму апарату было даручана "зьнішчаць любую прыватную фірму, якая магла б удзельнічаць у фінансаваньні прэзыдэнцкай кампаніі апазыцыі".

Усталяваньне кантролю над прыватным бізнэсам прадоўжылася і пасьля рэфэрэндуму 1996 году. У 1998 годзе Лукашэнка загадаў увесьці заднім чыслом на буйных прадпрыемствах, якія зьведалі поўную ці частковую прыватызацыю да ягонага заступленьня на пасаду прэзыдэнта, правіла "залатой акцыі". "Залатая акцыя" дазволіла амаль без абмежаваньняў мяшацца ў дзейнасьць гэтых прадпрыемстваў і азначала іх фактычную рэнацыяналізацыю. Апроч частай перарэгістрацыі, малыя і сярэднія фірмы мусілі процістаяць росту падатковага цяжару, новым і новым абмежаваньням (даходзіла да сьмешнага — прымусовай закупкі пэўнага тыпу кіёскаў у дзяржаўнага вытворцы, само сабой, па завышаных цэнах) і ўсё большаму ціску з боку падатковых органаў і разнастайных кантрольных службаў. Зьменлівасьць падатковага заканадаўства і правілаў вядзеньня бугальтарскага ўліку прывяла да таго, што бугальтараў у Беларусі стала болей за настаўнікаў і лекараў. Шмат хто зь іх сутыкаўся з судовым перасьледам за надуманыя парушэньні, што прывяло да рэзкага росту колькасьці асуджаных за эканамічныя злачынствы.

[27] ВЕТ, красавік-чэрвень 1998, с. 51. Пры гэтым было прададзена 131 прадпрыемства камунальнай уласнасьці ў 1996 і 192 — у 1997 г.

## Вяртаньне да мяккай бюджэтнай палітыкі

Лукашэнка пастанавіў заяваць галасы выбарцаў, забясьпечваючы поўную занятасьць (хоць бы на паперы: афіцыйны ўзровень беспрацоўя ў 1994, 1995 і 1996 гг. складаў адпаведна 2,1, 2,7 і 3,9%) на шкоду рэструктурызацыі вытворчасьці і прадукцыйнасьці працы. Для гэтага яму давялося забараніць скарачэньні ў вытворчасьці й зьняць многія абмежаваньні бюджэтных выдаткаў, якія вытрымліваліся ў першыя паўтара году ягонага кіраваньня. “Мы павінны расстацца з такімі кіраўнікамі, што сёньня плянуюць скарачэньні рабочай сілы на 3, 5, 10%, каб стымуляваць тых, хто застаецца. У гэты цяжкі час наш абавязак — падтрымаць людзей, абараніць рабочых і сялян, а не выкідаць іх за вароты дзяржаўных прадпрыемстваў”[28].

Лукашэнка ўвёў практыку пэрсанальнага “замацаваньня” намесьнікаў прэм’ер-міністра за стратнымі прадпрыемствамі. Прэтэндэнтамі на першачарговую дапамогу дзяржавы ён вызначыў чатыры дзяржаўныя заводы — МАЗ, МТЗ, ВА “Інтэграл” і “Гарызонт”[29]. Прэзыдэнцкімі ўказамі была зацьверджана адмысловая “праграма разьвіцьця” асобных галінаў прамысловасьці. Напрыклад, тэлевізійныя вытворцы былі вызваленыя ад мытных плацяжоў на ўвоз імпартных камплектуючых, ад ПДВ, а таксама ад паловы другарадных (“чарнобыльскага” і іншых) падаткаў (зрэшты, гэты звычайны захад для стымуляваньня арыентаваных на экспарт кампаніяў сам па сабе нельга лічыць антырынкавым); апроч таго, прадпрыемствам-“сумежнікам” прадпісвалася не патрабаваць аплаты пратэрмінаваных запазычанасьцяў, а падатковай інспэкцыі — не спаганяць штрафаў за неаплачаныя падаткі. Нарэшце, указ уводзіў ліцэнзаваньне вытворчасьці тэлевізараў, што звужала канкурэнцыю на адпаведным сэгмэнце рынку[30].

Лукашэнка аднавіў Кебічаву практыку выкарыстаньня замежных пазык для падтрымкі дзяржсэктару. Першы транш крэдыту “стэнд-бай”, выдадзены МВФ у верасьні 1995 году, пайшоў на аплату даўгоў Расіі за паліва і куплю ўгнаеньняў для сельскай гаспадаркі. Аднак з часу яўнай адмовы ўраду ад рынкавых рэформаў у 1996 годзе ніякіх новых крэдытаў ад МВФ у Беларусь не паступала (Сусьветны банк працягваў даваць Беларусі крэдыты да 1997 году).

## Спробы вяртаньня пяцігадовых плянаў

Рэстаўрацыя асноўных элемэнтаў каманднай эканомікі завяршылася ў другой палове 1996 году, калі былі абнародаваныя “Асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця на 1996—2000 гг.”. Увесь дакумэнт складаўся з абяцаньняў, зробленых Лукашэнкам з мэтай выйграць заплянаваны на лістапад 1996 году рэфэрэндум па новай рэдакцыі Канстытуцыі. Перапісаная Канстытуцыя давала прэзыдэнту практычна неабмежаваную ўладу, улучна з

[28] Прамова на першым пасяджэньні Вярхоўнага Савету XIII скліканьня // “Советская Белоруссия”, 10 студзеня 1996 г.

[29] Тамсама.

[30] Указ Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі № 226 “Аб рэалізацыі праграмы фінансава-эканамічнага аздараўленьня прадпрыемстваў тэлевізійнай галіны” // Зборнік указаў і пастаноў Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. — Менск, 1996 г.

правам на роспуск парлямэнту, падмену законаў дэкрэтамі і кантроль над усімі бяз вынятку дзяржаўнымі інстытутамі. Лукашэнкава ініцыятыва на першых часох раскалола грамадзтва, і перад прэзыдэнтам стаяла заданьне так ці інакш заваяваць падтрымку бальшыні.

Дакумэнт прадугледжваў курс на развіцьцё беларускай эканомікі з выкарыстаньнем старой індустрыйна-тэхнічнай базы, уставічнае ўмяшаньне дзяржавы ў эканамічныя адносіны і захаваньне традыцыйных гаспадарчых сувязяў з краінамі былога СССР, перш за ўсё Расіяй, замест інтэграцыі ў сусьветную эканоміку. Лукашэнка працягваў настойваць, што камандная эканоміка не вінаватая ў цяперашніх цяжкасьцях Беларусі. “Сытуацыя, карані якой ляжаць у Белавескай пушчы, не мая віна, але мой боль і смутак”[31], — заявіў ён, прадстаўляючы праграму. Як і Кебіч у 1992 годзе, Лукашэнка выказаў прыхільнасьць да “сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі”, якая б насьледавала сыстэмам Швэцыі й Нямеччыны, дзе “рынак ураўнаважваецца клопатам пра чалавека”. Былі вызначаныя такія прыярытэты, як “экспарт, вытворчасьць прадуктаў харчаваньня і жытловае будаўніцтва”. Праграма дэклявала правядзеньне рынкавых рэформаў, улучна з прыватызацыяй і макраэканамічнай стабілізацыяй, і прадугледжвала да 2000 году зьнізіць штомесячную інфляцыю да 0,5—1,5%, завяршыць малую прыватызацыю, рэструктурызацыю “прыярытэтных галін вытворчасьці” і г. д. Падобныя мэты і намеры не адзін раз абвяшчаліся як Лукашэнкам, так і Кебічам, і ніводзін зь іх не праяўляў аніякай настойлівасьці ў іх дасягненьні. Асобныя пункты праграмы паўтаралі тыя захады, што ў свой час ужо прыносілі плён пры Чыгіру і Багданкевічу: пасураўленьне грашова-крэдытнай палітыкі, абмежаваньне крэдытаваньня, увядзеньне крэдытных аўкцыёнаў. Іншыя пункты былі проста сьмеху вартыя: так, плянавалася прыцягваць інвэстыцыяў на 1 млрд. даляраў штогод (у 1996 годзе паступіла толькі 19 мільёнаў). Нарэшце, многія палажэньні праграмы толькі захоўвалі статус-кво, а некаторыя сьведчылі нават пра

**Табліца 3.** “Асноўныя кірункі сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця на 1996—2000 гг.”: пляны і рэальнасьць

| Паказьнік | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |
|---|---|---|---|---|
| Рост ВУП, % | 5 (11,4) | 4-5 (8,4) | 4-5 (3,4) | 4-5 (5,8) |
| Рост прамысловай вытворчасьці, % | 6 (18,4) | 5-7 (12,4) | 5-7 (10,2) | 5-7 (8,0) |
| Рост сельскагаспадарчай вытворчасьці, % | 3-4 (-4,9) | 2-4 (-0,7) | 2-4 (-8,5) | 2-4 (9,3) |
| Гадавая інфляцыя, % | 26,8 (64) | 6,2-19,6 (73) | 6,2-19,6 (294) | 6,2-19,6 (169) |
| Дэфіцыт бюджэту % ад ВУП | 1 (-2) | 3-1 (-1,4) | 3-1 (-2,9) | 3-1 (3,0) |
| Курс даляру | 15748-19682 (26000) | 31448-35880 (46400) | 33707-50065 (251000) | 35379-39878 (720000)* |
| Беспрацоўе, % | 5 | 5-5,5 | 5-5,5 | 5-5,5 (2,1) |
| Гандлёвы баланс, % ад ВУП | -3 да 0,1 (-9,8) | -3 да 0,1 (-9,8) | -3 да 0,1 (-6,3) | -3 да 0,1 (-9,2) |

Крыніца: “Советская Белоруссия” — для афіцыйных прагнозаў, EIU (Economist Intelligence Unit) — для рэальных лічбаў.
*недэнамінаваны.

[31] “Советская Белоруссия”, 20 кастрычніка 1996 г.

далейшае згарненьне рэформаў, у прыватнасьці павелічэньне льготнага фінансаваньня аграпрамысловага комплексу і будаўніцтва, жорсткі кантроль за валютным курсам, строгае рэгуляваньне цэнаў і дазвол на прыватызацыю толькі “са згоды працоўнага калектыву”.

“Асноўныя кірункі” былі прынятыя, каб задэкляраваць абавязаньне ўраду дасягнуць пазытыўных зьменаў у нацыянальнай эканоміцы, не зважаючы на бягучы стан гэтай эканомікі, і каб падкрэсьліць ролю дзяржавы ў палітыцы ўсебаковага спрыяньня гэтым зьменам. Вялікае адрозьненьне паміж прагназаванымі і рэальна дасягнутымі паказьнікамі засьведчыла, што ўлады ня сталі абцяжарваць сябе зборам зьвестак аб стане эканомікі за працяглы пэрыяд і іх экстрапаляцыяй на будучыню дзеля забесьпячэньня дакладнага прагнозу. Прагнозныя паказьнікі ігнаравалі тэндэнцыі ў сусьветнай эканоміцы, унутранае становішча прамысловасьці й гаспадарчую сытуацыю ў суседніх краінах. Аднак Лукашэнка заставаўся папулістам, які гуляўся з спадзевамі электарату. Ён раздаваў абяцаньні, імкнучыся да поўнага кантролю над дзяржавай. Пасьля Лукашэнкавай перамогі ў барацьбе за ўладу Беларусь займела свайго Пінaчэта, які завяршыў многія з пачынаньняў Альендэ.

## Пасьля 24 лістапада: палітычная сытуацыя

Лукашэнка здолеў дамагчыся поўнай перамогі на вельмі неадназначна ўспрынятым міжнароднай супольнасьцю рэфэрэндуме 24 лістапада 1996 году, які да таго ж, згодна з пастановай Вярхоўнаьга Савету 13 скліканьня, меў статус кансультацыйнага. Хоць варыянт Канстытуцыі, прапанаваны прэзыдэнтам, ухваліла пераважная бальшыня тых, хто галасаваў, нельга сказаць, што грамадзтва беззасьцярожна падзяляла ягоныя ідэі (на працягу трох месяцаў перад рэфэрэндумам Лукашэнкаў дадатны рэйтынг вагаўся ад 60% да 40%). Перамога на гэтым рэфэрэндуме адначасова і ўзмацніла, і аслабіла легітымнасьць Лукашэнкавай улады: хоць ягоная папулярнасьць рэзка ўзрасла, шмат хто ўвачавідкі пераканаўся, што галасаваньне было праведзена са шматлікімі парушэньнямі. Сацыялягічныя дасьледаваньні сьведчылі, што толькі адна чвэрць насельніцтва (пераважна пэнсіянэры ды вяскоўцы, чый сьветапогляд быў сфармаваны савецкай эпохай і ўжо не паддаваўся зьменам) цалкам падтрымлівала Лукашэнку. Для засталых, не такіх зацятых ягоных прыхільнікаў на ступень ляяльнасьці да ўлады беспасярэдне ўплываў стан эканомікі й асабістага дабрабыту. Да таго ж, Лукашэнка не валодаў змогай раз і назаўсёды спыніць выступы апазыцыі й прадухіліць акцыі пратэсту. Таму, каб павялічыць прывабнасьць і легітымнасьць сваёй улады, а таксама апраўдаць ужываньне аўтарытарных захадаў, ён мусіў дабівацца эканамічных посьпехаў. Другім стымулам зрабіць зь Беларусі ўзор эканамічнага росту, дасягнутага без рэформаў, было Лукашэнкава імкненьне заняць значнейшае месца на расійскай палітычнай арэне. Ён стараўся як мага болей уразіць выбарцаў у расійскай правінцыі эканамічнымі дасягненьнямі Беларусі, проціпастаўляючы іх эканамічнай нестабільнасьці, сацыяльнаму расслаеньню і затрымкам заробкаў ў Расіі. У выпадку свайго посьпеху беларускі экспэрымэнт зрабіўся б узорам для расійскіх нацыяналістаў і камуністаў, доказам жыцьцяздольнасьці ізаляцыяніcцкай палітыкі, якую яны адстойвалі. Падтрымліваючы расійскіх радыкалаў, Лукашэнка не без падставаў мог разьлічваць на лідэрства ў іхнай частцы палітычнага спэктру Расіі. Такім чынам ён выконваў дзьве палітычныя ролі — жорсткага дыктатара ў Беларусі ды папуліста-аўтсайдэра ў Расіі.

## Імклівы ўзьлёт, 1997—98 гг. “Беларускі эканамічны цуд”

Зыходзячы з “Агульных кірункаў”, Лукашэнка выдаў указ, што абавязваў усе дзяржаўныя прадпрыемствы павялічыць вытворчасьць у 1997 годзе на 5%. Каб зрабіць такі рост магчымым, Нацыянальны банк, які цяпер падпарадкоўваўся вылучна Лукашэнку, атрымаў загад друкаваць грошы, з тым каб забясьпечыць дзяржаўны сэктар простымі крэдытамі ў памеры каля 20% ВУП. У той жа час, каб стрымаць інфляцыю, прадпрыемствам было забаронена павышаць цэны больш чым на 2—2,5% у месяц.

Лукашэнкавы намаганьні фарсаваць эканамічны рост без рэфармаваньня эканомікі былі высьмеяныя як беларускай апазыцыяй, так і замежнымі назіральнікамі. Аднак калі зьявіліся статыстычныя зьвесткі, шмат хто з крытыкаў зьнямеў у зьдзіўленьні. Беларуская эканоміка, якая шэсьць гадоў (з 1990 па 1995 г.) запар перажывала спад, у 1997 годзе дала рост прыблізна на 11%, а прамысловасьць — і яшчэ вышэй (каля 18%). Рост у некаторых галінах вытворчасьці даходзіў да адзнакі ў 30—35%.

Рост быў забясьпечаны экспартам, пераважна на расійскі рынак, які толькі ў 1997 годзе павялічыўся больш чым на 40% (у выніку гэтага доля Расіі ў сукупным аб’ёме беларускага экспарту вырасла з 46,1% у 1994 і 53,2% у 1996 да 64,7% у 1997, у той жа час імпарт з Расіі ўпаў з 61,1% у 1994 да 53,6% у 1997). Запас непрададзеных тавараў пачаў хутка зьмяншацца і дасягнуў усяго 60% ад узроўню 1995 году, што аспрэчвала цьверджаньні Лукашэнкавых крытыкаў, нібыта выраблены тавары проста аселі на складох. Лукашысты як у краіне, так і за мяжой абвясьцілі Беларусь “усходнеэўрапейскім эканамічным тыграм” па аналёгіі з імклівым гаспадарчым узьлётам дзяржаваў Усходняй Азіі. Палітыка Лукашэнкавага ўраду, даводзілі яны, і перш за ўсё захаваньне дзяржаўнага сэктару прамысловасьці, а таксама мэтавая падтрымка найбольш пэрспэктыўных прадпрыемстваў і галінаў, не магла не прывесьці да посьпеху.

**Табліца 4.** Аб’ём прамысловай вытворчасьці ў Беларусі, 1995—1999 гг., у % да папярэдняга году

| Галіна | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|---|
| Электраэнэргетыка | -15,8 | -1,6 | 5,6 | -7,4 | 5,4 |
| Нафтаперапрацоўчая прамысловасьць | 12,3 | -5,5 | -1,0 | 0,7 | 1,9 |
| Хімічная і нафтахімічная прамысловасьць | 8,9 | 7,2 | 19,4 | 7,7 | 7,9 |
| Чорная металюргія | -1.4 | 23.4 | 35,1 | 14,9 | н/д |
| Машынабудаваньне і металаапрацоўка | -20,5 | 1,6 | 25,7 | 15,5 | 16,2 |
| Лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлёзна-папяровая прамысловасьць | -9,6 | 14,2 | 34,7 | 21,7 | 16,0 |
| Вытворчасьць будматэрыялаў | -21,2 | -4,0 | 26.1 | 15.2 | 1,5 |
| Лёгкая прамысловасьць | -34,1 | 11,9 | 27.1 | 22.8 | 10,8 |
| Харчовая прамысловасьць | -12,7 | 5.5 | 21.0 | 19.2 | 14,4 |
| Уся прамысловасьць | -11,7 | 3.5 | 18.3 | 12.4 | 10,3 |

Крыніцы: МВФ, “Republic of Belarus—Recent Economic Developments”.

## Беларускі “цуд” і лацінаамэрыканскія ўзоры папулізму: падабенствы і адрозьненьні

**Бюджэтны дэфіцыт.** Адным з абсягаў, дзе беларускі досьвед разыходзіцца з лацінаамэрыканскім, ёсьць бюджэтная палітыка. Сапраўды, афіцыйна зацьверджаны фіскальны дэфіцыт беларускага бюджэту звычайна ня быў вялікі. Аднак гэтая лічба не ўключала так званага “квазіфіскальнага дэфіцыту”, што складаўся з чыстых крэдытаў асобным галінам народнай гаспадаркі, якія Нацыянальны банк мусіў даваць на загад Лукашэнкі. Калі ж скласьці гэтыя крэдыты і афіцыйны дэфіцыт, лічба значна вырасьце.

**Табліца 5.** Фіскальны і квазіфіскальны дэфіцыты

| | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 |
|---|---|---|---|---|
| Фіскальны дэфіцыт, % ад ВУП | -2,8 | -1,9 | -2,4 | -1,4 |
| Квазіфіскальны дэфіцыт*, % ад ВУП | -3,6 | -4,4 | -4,4 | -4,3 |

Крыніца: Белорусский рынок. 1998. 22 марта.

Скачок квазіфіскальнага дэфіцыту быў выкліканы павелічэньнем выдадзеных Нацыянальным банкам простых крэдытаў народнай гаспадарцы на загад выканаўчай улады. Пасьля таго як Лукашэнка ў 1996 годзе ўзяў пад свой кантроль усе дзяржаўныя інстытуты, Нацыянальны банк апынуўся пад беспасярэднім уплывам прэзыдэнта (з сакавіка 1998 г. да чэрвеня 2000 г. Нацыянальны банк быў перададзены пад кантроль ураду, што зрабіла яго яшчэ менш самастойным у сваіх дзеяньнях) і друкаваў столькі грошай, колькі ад яго патрабавалася. Напампоўваньне эканомікі пустымі грашыма, што выдаваліся ў выглядзе льготных крэдытаў дзяржаўным прадпрыемствам і банкам (якія, у сваю чаргу, таксама давалі крэдыты прадпрыемствам), было характэрна хутчэй для каманднай эканомікі савецкага тыпу, чым для лацінаамэрыканскіх папулісцкіх рэжымаў, якія рабілі тое самае праз павелічэньне афіцыйнага бюджэтнага дэфіцыту. Што да вынікаў, дык яны былі падобныя ў абодвух выпадках: перараьзмеркаваньне разам з часовым ажыўленьнем эканомікі й нарастаньнем доўгатэрміновых макраэканамічных дыспрапорцыяў.

Рост простых пазык і крэдытаў ураду паскараўся на працягу 1997—98 гг. З усіх гэтых пазык толькі мізэрная частка была прададзена на крэдытных аўкцыёнах (супраць 80% у 1995 годзе). Пачынаючы з 1996 г., ціск на банкаўскую сыстэму зрабіўся асноўнай прычынай росту грашовай масы. Яна вырасла на 188% у 1996 г., на 154% у 1997 г. і на 201% у 1998 г., значна апераджаючы інфляцыю. Толькі ў 1997 годзе крэдыты нефінансавым прадпрыемствам склалі каля 13% ВУП**. Рэальны прыбытак, прынесены такімі крэдытамі, з другога кварталу 1996 году стаў выражацца адмоўнымі лічбамі. Гэта быў яшчэ адзін аспэкт эканамічнай палітыкі, у якім Беларусь вярнулася да сваіх зыходных пазыцыяў.

Простае крэдытаваньне Нацыянальнага банку ішло ў двух кірунках. Першым была сельс-

* Квазіфіскальны дэфіцыт роўны суме афіцыйнага дэфіцыту бюджэту і квазіфіскальнай дзейнасьці Нацыянальнага банку (варта ўлічваць тое, што больш чым 95% крэдытаў, рэфінансаваных НББ, ішло ў спэцыялізаваныя банкі).

** Нашы падлікі грунтуюцца на даных ВЕТ па ВУП і валютнай статыстыцы.

**Табліца 6.** Шэраг грашова-крэдытных паказьнікаў (у працэнтах да ВУП).

| | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|
| Чысты ўнутраны крэдыт | 16,07 | 17,74 | 36,65 | 20,82 |
| Чысты ўнутраны крэдыт Нацыянальнага банку | 7,98 | 8,45 | 14,82 | 6,95 |
| Чысты крэдыт НБ ураду | 4,16 | 3,54 | 7,17 | 4,8 |
| Простыя крэдыты НБ | 2,85 | 3,91 | 4,65 | 0,96 |
| Стаўка рэфінансаваньня | 35—55 | 36—42 | 38—50 | 48—110 |
| Сеньёраж (у % да ВУП) | 7,15 | 7,46 | 6,59 | 5,47 |
| Норма ашчаджэньняў* | 21 | 11 | 12 | 5 |
| Крэдыты банкаўскай сыстэмы (у % да ВУП) | 11.95 | 13.82 | 28.67 | 15.32 |
| Атрымальнікі: | | | | |
| дзяржаўныя прадпрыемствы | 4.68 | 4,78 | 11.02 | 5.19 |
| акцыянэрныя таварыствы | 4.87 | 5,26 | 11.45 | 6.6 |
| прыватны сэктар | 1.56 | 0,89 | 4.82 | 2.76 |
| Рызыкоўныя актывы (у % да балянсу чыстых актываў) | 26,9 | 26.5 | 31,2 | 52,9 |

Крыніца: Максім Туміловіч. Анамальны эканамічны рост і загадкавы бюджэтны дэфіцыт: беларускі выпадак. Неапублікаваны рукапіс.

кая гаспадарка, што ў 1997—98 гг. атрымлівала на сяўбу і збор ураджаю звыш 60% крэдытаў НББ, якія часам даваліся па намінальнай працэнтнай стаўцы 5%. Крэдытаваньне аграпрамысловага комплексу, аднак, не кампэнсоўвала яго стратаў ад фіксаваных цэнаў (дзяржаўныя гуртовыя закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю не пакрывалі і чвэрці

**Графік 1.** Рэальныя працэнтныя стаўкі па крэдытах.




Крыніца: ВЕТ.

* Уключаючы каштоўныя паперы і дэпазыты ў замежнай валюце, выражаныя ў працэнтах ад грашовага даходу.

**Графік 2.** Сярэднія намінальныя і рэальныя стаўкі рэфінансаваньня НББ.




Крыніца: намінальныя стаўкі — НББ, рэальныя — падлічаныя Максімам Туміловічам.

**Графік 3.** Рэзэрвы Нацыянальнага банку Беларусі, млрд. даляраў ЗША




Крыніца: BET

ейнага сабекошту). Другім кірункам крэдытаваньня служыла прамысловасьць, якая трапіла ў лік прыярытэтаў часткова дзякуючы трывалым пазыцыям ува ўрадзе намесьніка прэм'ер-міністра і з сакавіка 1998 г. старшыні Нацбанку Пятра Пракаповіча. Ён лабіраваў інтарэсы прамысловасьці, называючы яе “лякаматывам эканамічнага росту” ў Беларусі, што, відавочна, было даспадобы Лукашэнку.

Экспансіяністцкая манэтарная палітыка і актыўнае крэдытаваньне эканомікі вычэрпвалі валютныя рэзэрвы Нацыянальнага банку і зьмяншалі ягоны капітал. Вось два прыклады няяўнага перарасходу грашовых сродкаў, не адлюстраванага ў радках афіцыйнага бюджэту.

**Інвэстыцыйная палітыка.** Яшчэ адной сфэрай, дзе паралелі паміж Беларусяй і Лацінскай Амэрыкай выглядаюць нацягнутымі, ёсьць інвэстыцыйная палітыка. Так, Лукашэнкаў урад пераламіў тэндэнцыю скарачэньня інвэстыцый (якія ў Лацінскай Амэрыцы былі прынесены ў ахвяру дзеля павышэньня спажываньня), і з 1997 году Беларусь запісала ў свой актыў салідны інвэстыцыйны рост.

**Табліца 7.** Інвэстыцыі ў беларускую эканоміку, % (1994 = 100)

| | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Сукупны памер інвэстыцыяў | 69 | 66 | 79 | 94 | 90 | 78 |
| Вытворчых | 71 | 73 | 83 | 104 | 90 | 73 |
| Невытворчых | 67 | 57 | 73 | 91 | 91 | 86 |

Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусі, 2001.

Як відаць з гэтых зьвестак, павелічэньню колькасьці інвэстыцыяў пачынаючы з 1997 году папярэднічала яе рэзкае падзеньне ў 1995, прычым першапачатковы ўзровень так і ня быў дасягнуты. Напрыклад, у 2000 годзе, калі, згодна з афіцыйнай статыстыкай, аб'ём прамысловай вытворчасьці на 0,8% перавысіў узровень 1990 году, колькасьць інвэстыцыяў склала ўсяго 44,4% ад яго ўзроўню. Па-другое, вялікая доля інвэстыцыяў прыпадала на невытворчую сфэру, напрыклад на вылучаны дзяржавай у разрад прыярытэтных будаўнічы сэктар, і ў некаторай ступені нагадвала сукрытае субсыдыяваньне спажываньня. Па-трэцяе, эфэктыўнасьць інвэстыцыйнай палітыкі выклікала паважныя сумненьні. Разам з гэтым, павелічэньне інвэстыцыяў у вытворчым сэктары было недастатковае, каб кампэнсаваць амартызацыю асноўных фондаў, якія па-ранейшаму праядаліся, паколькі расходы на іх абнаўленьне былі абмежаваны прэзыдэнцкімі ўказамі і ледзьве дасягалі 29% ад патрэбнай велічыні. Замест гэтага грошы траціліся на фінансаваньне росту вытворчасьці. У выніку прамысловае абсталяваньне было зношана прыблізна на 70—80%. Сярэдняя рэнтабэльнасьць апрацоўчай прамысловасьці зьнізілася з 12,2% у першыя пяць месяцаў 1997 г. да 10,8% у такі самы пэрыяд 1998 г.*. Кожнае пятае прамысловае прадпрыемства ў гэты час працавала са стратамі. У паліўнай і энэргетычнай галінах у 1998 годзе са стратамі працавала 45% прадпрыемстваў супраць 22,5% год назад. У сфэры паслуг фінансавая сытуацыя ў першыя чатыры месяцы 1998 году была яшчэ горшая, чымся ў прамысловасьці: страты меліся ў 46,4% установаў, у тым ліку ў 45,7% прадпрыемстваў бытавога абслугоўваньня і 43,4% транспартных прадпрыемстваў.

**Кантроль за валютным курсам.** Усталяваньне жорсткага кантролю над валютным курсам пачалося ў першай палове 1996 году, калі была нацыяналізаваная Менская фондавая біржа і адноўленая сыстэма множнасьці валютных курсаў. Дзяржава імкнулася кантраляваць рынак замежнай валюты для таго, каб мець магчымасьць забіраць СКВ у прадпрыемстваў-экспартэраў і накіроўваць яе на "стратэгічна важныя закупкі", якія падзяляліся на дзьве катэгорыі. Да першай адносілася харчаваньне, паколькі Беларусь не забясьпечвае сябе многімі важнымі сельскагаспадарчымі таварамі, напрыклад, пшаніцай цьвёрдых сартоў. Другую катэгорыю складалі камплектуючыя і абсталяваньне, неабходныя для павышэньня канкурэн-

* Хоць гэта не абавязкова гаворыць пра эфэктыўнасьць вытворчасьці. Нават пры вялікай рэнтабэльнасьці агульная сума прыбытку магла павялічыцца ня вельмі істотна.

**Табліца 8.** Сярэдні курс даляра да беларускага рубля, вызначаны Нацыянальным банкам і Паралельным міжбанкаўскім рынкам.

| Год | BRB/USD, НБ | BRB/USD, ПМР | Розьніца, % |
|---|---|---|---|
| 1995 | 11579 | 11643 | 1 |
| 1996 | 13367 | 16409 | 22,8 |
| 1997 | 26230 | 34681 | 32,2 |
| 1998 | 46597 | 112672 | 142,0 |
| 1999 | 250947 | 366356 | 46,0 |

Крыніца: BET.

таздольнасьці вырабляных у Беларусі транспартных сродкаў і іншых прамысловых тавараў. Уся гэтая прадукцыя хоць і не магла быць прададзена за валюту, але затое карысталася попытам на расійскім рынку дзякуючы нізкім цэнам і высокім мытам у Расіі на імпартныя тавары аналягічнага прызначэньня. Продаж на расійскім рынку быў тады надзвычай выгадны таму, што расійскі рубель можна было свабодна абмяняць на любую іншую валюту, а ягоны курс быў даволі стабільны з 1995 г. аж да “чорнага панядзелка” 17 жніўня 1998 г. (зрэшты, пераважная частка расійска-беларускага гандлю ажыцьцяўлялася праз бартэрныя ўгоды; гл. табліцу ніжэй). Дзеля атрыманьня прыбытку ад апэрацыяў са свабодна канвэрсоўнай валютай дзяржава прымушала беларускіх рэзыдэнтаў прадаваць да 70% яе па афіцыйным курсе (у 1997 годзе квоту панізілі да 30%, але празь некалькі месяцаў зноў паднялі да 40%). Розьніца паміж афіцыйным і рынкавым (г. зн. такім, што вызначаўся на Маскоўскай валютнай біржы, якую Лукашэнка, зразумела, кантраляваць ня мог) курсам складала каля 40% у 1997 годзе, а ў 1998 г. падскочыла да васьмідзесяці і нават больш як ста адсоткаў. Танная валюта затым даставалася эканамічным суб’ектам, кола якіх старанна выбіралася ўладамі. Усім астатнім цьвёрдую валюту даводзілася купляць на аўкцыёнах так званага Паралельнага міжбанкаўскага рынку па завышаным курсе. Апроч таго, вулічным абменным пунктам было прадпісана прадаваць і купляць замежную валюту па пастаянна заніжаным афіцыйным курсе. Вынікам быў моцны дэфіцыт свабодна канвэрсоўнай валюты і павелічэньне розьніцы паміж афіцыйным і неафіцыйным курсамі, якое рабіла выгаднымі валютныя спэкуляцыі. У адказ на гэта Лукашэнка падпісаў дэкрэт № 1, які аднаўляў крымінальную адказнасьць за нелегальны продаж і куплю валюты. Але, нягледзячы на рэпрэсіі супраць валютчыкаў, чорны рынак буяў.

Падобная палітыка эксплюатацыі прадпрыемстваў-экспартэраў звычайная для лацінаамэрыканскіх эканомік падчас папулісцкіх экспэрымэнтаў і спробаў стварыць імпартазамяняльную вытворчасьць. Яна, на першы погляд, трохі дзіўная для Беларусі, якая спэцыялізуецца пераважна на экспарце прадукцыі машынабудаваньня, а не прадуктаў сельскай гаспадаркі ці прыродных рэсурсаў, як лацінаамэрыканскія краіны. Аднак аналіз геаграфічнай накіраванасьці і галіновай спэцыфікі вонкавага гандлю паказвае, што, калі ня браць пад увагу шэрагу прадпрыемстваў, якія сапраўды прадаюць сваю прадукцыю за цьвёрдую валюту, а не абменьваюць яе праз укладзеныя дзяржавай бартэрныя ўгоды, Беларусь насамрэч падобная да краінаў Лацінскай Амэрыкі.

Як відаць з табліцы, структура вонкавага гандлю Беларусі дэманструе цікавы прыклад інтэрнацыяналізацыі. Тэхналягічна складаныя прамысловыя тавары (транспарт, абсталяваньне, электроніка) прадаюцца пераважна ў краіны былога СССР, перш за ўсё ў Расію. Вялікая

**Табліца 9.** Таварная структура вонкавага гандлю (у % ад сукупнага аб’ёму)

| | Экспарт у СНД | | Імпарт з СНД | | Экспарт у "далёкае замежжа" | | Імпарт з "далёкага замежжа" | | Сукупны экспарт | | Сукупны імпарт | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1998 | 1999 | 1998 | 1999 | 1998 | 1999 | 1998 | 1999 | 1998 | 1999 | 1998 | 1999 |
| Прамысловасьць | 97,7 | 96,2 | 95,4 | 94,3 | 98,1 | 99,5 | 96,4 | 95,2 | 97,8 | 97,5 | 95,8 | 95,2 |
| Электраэнергетыка | 0,0 | 0,0 | 2,1 | 2,2 | 0,0 | 0,0 | 3,7 | 0,9 | 0,0 | 0,0 | 3,7 | 0,9 |
| Нафтаперапрацоўчая прамысловасьць | 5,9 | 4,3 | 30,9 | 2,1 | 2,8 | 15,0 | 0,7 | 1,3 | 3,0 | 8,4 | 20,0 | 1,3 |
| Металургія | 7,9 | 4,7 | 16,2 | 14,[illegible] | 10,4 | 9,9 | 7,3 | 9,1 | 8,6 | 6,7 | 13,0 | 9,1 |
| Хімічная і нафтахімічная прамысловасьць | 17,6 | 16,4 | 13,8 | 41,8 | 33,0 | 32,1 | 31,4 | 30,2 | [illegible] | [illegible] | 16,6 | 30,2 |
| Машынабудаваньне і металаапрацоўка | 35,0 | 41,4 | 18,5 | [illegible] | 21,1 | 22,0 | 26,8 | 24,4 | 20,9 | 34,0 | 25,1 | 34,4 |
| Лясная, дрэваапрацоўчая і цэлюлёзна-папяровая прамысловасьць | 7,7 | 6,9 | 2,7 | 2,9 | 3,5 | 8,1 | 3,9 | 3,3 | 7,1 | 6,6 | 3,1 | 3,3 |
| Вытворчасьць будаўнічых матэрыялаў | 2,5 | 3,[illegible] | 1,0 | 2,0 | 1,4 | 1,8 | 1,6 | 1,4 | 2,2 | 2,6 | 1,2 | 1,4 |
| Лёгкая прамысловасьць | 8,3 | 9,0 | 2,7 | 2,9 | 17,9 | 10,1 | 7,2 | 10,0 | 9,6 | 9,4 | 4,5 | 10,0 |
| Харчовая прамысловасьць | 11,8 | 10,0 | 5,2 | 7,4 | 1,3 | 2,3 | 12,6 | 14,4 | 8,7 | 7,0 | 7,9 | 14,4 |
| Іншыя галіны прамысловасьці | 1,0 | 0,4 | 2,4 | 0,9 | 10,7 | 0,3 | 1,2 | 0,3 | 3,9 | 0,4 | 1,9 | 0,3 |
| Сельская гаспадарка | 1,0 | 2,5 | 2,6 | 3,9 | 1,9 | 0,5 | 3,3 | 4,5 | 1,3 | 1,7 | 2,9 | 4,5 |
| Іншае | 1,2 | 1,3 | 1,9 | 1,9 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,3 | 0,9 | 0,8 | 1,5 | 0,3 |
| Усяго | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 |

Крыніца: EIU.

ж доля экспарту за межы былога СССР прыпадае галоўным чынам на прадукцыю хімічнай прамысловасьці (пераважна калійныя ўгнаеньні, паколькі Беларусь мае найбольшыя ў сьвеце запасы калійных соляў; гэта адзіны прыродны рэсурс, якога ў Беларусі досыць), тэкстыльныя вырабы і невысакародныя мэталы (пераважна прадукцыя Беларускага мэталюргічнага заводу ў Жлобіне). Аналіз структуры беларускага імпарту сьведчыць, што тэхналягічна складаныя тавары (абсталяваньне і электроніка) імпартаваліся пераважна з Захаду, а прыродныя рэсурсы і сыравіна — з краінаў СНД. Парадаксальнае становішча беларускай эканомікі ў тым, што яна выконвае ролю сыравіннага прыдатку Захаду, у той час як былы СССР ёсьць такім прыдаткам для яе самой*. У гэтакай сытуацыі кантроль над прадпрыемствамі-экспартэрамі быў неабходны для падтрыманьня неканкурэнтаздольнай беларускай прамысловасьці, паколькі замежная валюта накіроўвалася на куплю камплектуючых (паўпра-

* Такой самай была структура вонкавага гандлю ў многіх усходнеэўрапейскіх краінах да пачатку пераўтварэньняў у іх.

**Графік 4.** Гандлёвы балянс і балянс бягучага рахунку ў адносінах да ВУП у Беларусі, 1995—2000 гг.




Крыніцы: уласныя падлікі на аснове зьвестак па замежнагандлёвым балянсе — Міністэрства статыстыкі й аналізу Рэспублікі Беларусі, па балянсе бягучых апэрацый — EIU.

ваднікоў для радыёэлектроннай прамысловасьці ці рухавікоў для аўтамабільнай), якія рабілі беларускія тавары прывабнейшымі на расійскім рынку. Падтрымліваючы з 1996 году штучна завышаны абменны курс, беларускі ўрад ператварыўся ў зьбіральніка рэнты з экспартнага сэктару. Палітыка множнасьці валютных курсаў дапамагала пераразьмяркоўваць валютныя даходы ад сыравінных галінаў і сельскай гаспадаркі да прамысловасьці так, як гэта рабілася ў Лацінскай Амэрыцы пры рэалізацыі імпартазамяняльных праграм. Такая палітыка звычайна вядзе да павышэньня ўнутранага спажываньня і зьнясіленьня прадпрыемстваў-экспартэраў, а ў выніку — да павелічэньня дэфіцыту ў вонкавым гандлі. Урэшце ўзрастае ціск на нацыянальную валюту, што прыводзіць да яе дэвальвацыі (калі дэвальвацыя стрымліваецца ўрадам, эканоміка церпіць ад усё большай нястачы свабодна канвэрсоўнай валюты, нястрымнага разрастаньня чорнага рынку, і ў найгоршым выпадку настае крах нацыянальнай валюты і гіпэрінфляцыя). Рэзкае павелічэньне вонкавагандлёвага дэфіцыту назіралася ў Беларусі ў гады найвышэйшага эканамічнага росту (дэфіцыт у памеры каля 10% ВУП лічыцца значным перавышэньнем "парогу бясьпекі"). У той жа час стабільнае функцыянаваньне сфэры паслуг дазволіла зьмякчыць ціск на беларускі рубель і ўтрымаць бягучы плацежны дэфіцыт на прымальным узроўні. Гэта адтэрмінавала валютны крызыс да жніўеньскіх падзеяў 1998 году.

**Рэгуляваньне цэнаў.** Пачынаючы яшчэ з пачатку 1996 году, беларускія ўлады зноў "забыліся" аб манэтарнай прыродзе інфляцыі й вярнуліся да спробаў барацьбы зь ёй мэтадамі дзяржаўнага рэгуляваньня цэнаў. Дзеля забесьпячэньня адміністрацыйнага кантролю за цэнамі беларускія ўлады выкарыстоўвалі некалькі інструмэнтаў. У іх складзе — адміністрацыйнае абмежаваньне росту цэнаў да адзначанага ў прагнозных паказчыках узроўню, зьніжэньне "максымальна дапушчальнага ўзроўню рэнтабэльнасці" на аснове "плянавага сабекошту", карныя санкцыі за "неапраўданае павышэньне цэнаў" і г.д. Адпаведна, разнастайнымі былі й мэтады пазьбяганьня гэтых мераў. Рэгуляваньне цэнаў стымулявала бартэр, вяло да некантраляванага (у лексыконе беларускіх уладаў — неарганізаванага) экспарту харчовых тавараў, росквіту чорнага рынку і г.д. Цікавым быў мэханізм у піўной галіне, дзе раптам найбуйнейшыя бровары краіны пачалі выпускаць новыя гатункі піва (ці разьліваць сваю прадукцыю

ў бутэлькі з новымі этыкеткамі) амаль кожны месяц. Урэшце, адміністрацыйны кантроль за цэнамі прывёў да эфэкту, адваротнага таму, які чакаўся. Кампэнсацыя стратаў ад рэгуляваньня цэнаў у выглядзе субсыдыяў вяла да раскручваньня інфляцыі, па ўзроўні якой Беларусь трывала займала першае месца на постсавецкай прасторы.

## Пераможцы і пераможаныя: эканамічныя і палітычныя вынікі

Важнай палітычнай передумовай эканамічнай палітыкі Лукашэнкі было ягонае жаданьне прадэманстраваць перавагі беларускай мадэлі разьвіцьця. Таму пераразьмеркаваньне выкарыстоўвалася як сродак нэўтралізацыі пратэстных настрояў грамадзтва дзеля забесьпячэньня хоць бы часовай стабільнасьці. Мэтай было захаваць прадтрымку тых групаў, якія заўсёды падтрымлівалі Лукашэнку, і дамагчыся большай ці меншай ляяльнасьці ад апанэнтаў (ці хоць бы ад нэўтральна настроеных сацыяльных групаў). Таму даходы пераразьмяркоўваліся да сярэднезабясьпечанага гарадзкога насельніцтва, а забіраліся найчасьцей у найменш багатых вяскоўцаў.

**Табліца 10.** Разьмеркаваньне сацыяльных трансфэртаў (паміж пяцьцю групамі ў парадку ўзрастаньня агульнай колькасьці атрымліваных ільгот)

| | Найніжэйшы ўзровень | Другі ўзровень | Трэці ўзровень | Чацьвёрты ўзровень | Найвышэйшы ўзровень |
|---|---|---|---|---|---|
| Харчаваньне | 2 | 3 | 1 | 4 | 5 |
| Грамадзкі транспарт | 5 | 4 | 3 | 1 | 2 |
| Камунальныя паслугі | 5 | 4 | 1 | 3 | 2 |
| Лекі | 5 | 4 | 2 | 3 | 1 |
| Іншыя льготы | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Усяго льготаў | 5 | 3 | 1 | 4 | 2 |

Крыніца: Спавешчаньне аб узроўні чалавечага разьвіцьця Прадстаўніцтва ААН у Беларусі, (2000).

Субсыдаваньне цэнаў на харчаваньне пераразьмяркоўвала даход на карысьць гарадзкіх жыхароў, шкодзячы сельскай гаспадарцы. Дарма што пераважная колькасьць простых дзяржаўных крэдытаў ішла на падтрыманьне сельскай гаспадаркі, яна па-ранейшаму заставалася стратнай, паколькі ўлады прымушалі калгасы прадаваць усю выробленую імі прадукцыю па цане, якая пакрывала часам усяго каля 43% выдаткаў. Гаспадаркі вымушаны былі прыстасоўвацца, зьмяншаючы пагалоўе свойскай жывёлы (гл. табліцу) і колькасьць урабляемае зямлі.

Адначасна урад лічыў цалкам дапушчальнай зьявай запазычанасьці ў заробках у агарпры-

**Табліца 11.** Пагалоўе свойскай жывёлы, у % да папярэдняга году

| | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|---|
| Буйная рагатая жывёла | -6,5 | -3,9 | -1,1 | -3,4 | -7,7 |
| Сьвіньні | -2,7 | -4,6 | -0,8 | 0,7 | -3,6 |
| Авечкі | -11,3 | -24,0 | -18,1 | -16,5 | -13,2 |

Крыніцы: EIU, МВФ, “Republic of Belarus–Recent Economic Developments”, 1999 і 2000.

мысловым комплексе. Хоць у Беларусі ў 1996—98 гг. затрымкі ў выплаце заработнай платы былі далёка не такімі частымі, як у Расіі ці Ўкраіне, асноўная іх колькасьць (да 45%) прыпадала на сельскую мясцовасьць.

Несупыннае фінансаваньне будаўніцтва таксама мела пад сабой палітычную падаснову. У Беларусі, як і ў іншых постсавецкіх краінах, існуе востры дэфіцыт жытла, што ёсьць асабліва адчувальнай праблемай для маладых сем'яў, якія вымушаныя дзесяцігодзьдзямі жыць разам з бацькамі. У той самы час моладзь менш за іншыя групы падтрымлівае Лукашэнку і ягоную палітыку: ува ўзроставай катэгорыі да 30 год Лукашэнкавых прыхільнікаў напалову менш, чым сярод усіх выбарцаў, і ўтрая менш, чым сярод пажылых людзей. Таму адным з галоўных заданьняў Лукашэнкавага рэжыму сталася перацягваньне на свой бок моладзі*. У рамках нацыянальнай праграмы забесьпячэньня жытлом маладых сем'яў выдавалася асноўная частка льготных крэдытаў на жытловае будаўніцтва.

Выдача льготных крэдытаў спрыяла стымуляцыі дзяржаўнага сэктару эканомікі. Прадпрыемствы пашыралі неэфэктыўную вытворчасьць, паколькі гэта вяло да павелічэньня субсыдыяў, і, пакуль захоўвалася магчымасьць прадаць (ці часьцей абмяніць па бартэры) выробленае, у іх не было ніякіх падставаў быць незадаволенымі Лукашэнкавай палітыкай: рабочыя былі забясьпечаныя працай, стабільнай, хоць і невялікай, зарплатай ды бясплатнымі сацыяльнымі дабротамі, што заставаліся яшчэ з савецкіх часоў (заводзкія дзіцячыя сады і палацы культуры, бясплатная мэдыцына, танныя пуцёўкі і г.д.).

Пэнсіянэры былі сацыяльнай групай, якая найбольш падтрымлівала Лукашэнку і чые даходы пачалі расьці зь ягоным прыходам да ўлады. Як і ў многіх іншых краінах, гэта была і найбольш актыўная група выбарцаў. Таму праз увесь час Лукашэнкавага прэзыдэнцтва даволі істотна расьлі пэнсіі (рост сярэдняй зарплаты за пэрыяд з 1993 па 1997 г. склаў толькі 75% росту пэнсіяў).

**Графік 5.** Узровень рэальнай заработнай платы і рэальных пэнсіяў, 1993—99 гг.




Крыніца: ВЕТ.

* Апроч таго, Лукашэнка спадзяваўся шляхам жытловага будаўніцтва стымуляваць эканоміку. Аднойчы ён сказаў: мы дамо людзям кватэры, а каб абставіць іх, яны будуць купляць нашы тавары. Ён не разумеў пры гэтым, што купленыя тавары будуць найхутчэй замежнай вытворчасьці.

У цэлым сацыяльныя прыярытэты Лукашэнкавага ўраду былі падобныя да тых, што адзначаліся ў лацінамэрыканскіх папулістаў. Фінансавыя рэсурсы пераразьмяркоўваліся ад канкурэнтаздольных прадпрыемстваў-экспартэраў галінам, якія не маглі існаваць безь дзяржаўнай падтрымкі, і ад бізнэсмэнаў ды сялянаў — да мала- і сярэднезабясьпечанага гарадзкога насельніцтва. Паказальна, што Лукашэнка мог дазволіць сабе дыскрымінацыю той часткі сельскіх жыхароў, якія не належалі да ягоных безумоўных прыхільнікаў, не баючыся нейкіх непажаданых вынікаў. Гэтаму спрыялі чатыры фактары. Па-першае, калгасьнікі, як і ў савецкі час, заставаліся групай, якую было асабліва лёгка трымаць пад кантролем. Па-другое, сіла кансэрватыўных настрояў у вёсцы была настолькі вялікай, што ўрад мог не сумнявацца ў пасіўнасьці сялян нават пры прыняцьці надзвычай непапулярных рашэньняў. Па-трэцяе, хоць сельскія працаўнікі ў выніку Лукашэнкавай палітыкі апынуліся ў відавочным пройгрышы, умацавалася становішча пэнсіянэраў (чыя доля ў сельскім насельніцтве няўхільна расла дзеля скарачэньня нараджальнасьці і ад’езду вялікай часткі моладзі ў месты), што забясьпечыла ў сельскай мясцовасьці дастатковы ўзровень ляяльнасьці. Па-чацьвёртае, наяўнасьць у вёсцы альтэрнатыўных крыніцаў існаваньня ў выглядзе натуральнай гаспадаркі рабіла фактар заробкаў менш істотным, у выніку чаго іх нявыплата не вяла да такіх вялікіх сацыяльных узрушэньняў, як запазычанасьці ў местах Расіі ці Ўкраіны.

## Расійскі фактар у захаваньні ўмоваў для росту

Павелічэньне сукупнага попыту можа стымуляваць рост на працягу нейкага часу, але наступная інфляцыя можа зьменшыць попыт і ўвядзе эканоміку ў стагнацыю. Спробы спыніць рост цэнаў шляхам усталяваньня кантролю над імі, а таксама над абменным курсам і валютным рынкам толькі пагаршаюць сытуацыю, выклікаючы дэфіцыт і крызыс неплацяжоў. У выніку гэтага катастрафічна падае жыцьцёвы ўзровень і робяцца недаступнымі нават тавары першай неабходнасьці. Падобныя змрочныя сцэнары ў рэшце рэшт і ажыцьцяўляліся ў лацінаамэрыканскіх краінах, дзе да ўлады прыходзілі папулісты. Што да Беларусі, дык тут крызыс не сьпяшаўся грукаць у дзьверы, хоць асобныя нядобрыя прыкметы, накшталт дэфіцыту асноўных прадуктаў харчаваньня, даліся ў знакі на пачатку 1998 году. Тым ня менш, даволі шпаркі эканамічны рост працягваўся аж да абвалу расійскага рубля ў жніўні 1998-га. Пасьпяховая стадыя беларускага папулісцкага экспэрымэнту, такім чынам, трывала трохі даўжэй, чым гэта было на пачатку 1970-х гг. у Чылі альбо ў 1980-х у Пэру, і тлумачыцца гэта асаблівым становішчам Беларусі ў дачыненьні да свайго адзінага палітычнага саюзьніка і ягонага неабсяжнага рынку. Гэтае становішча стварала шэраг кароткатэрміновых пераваг, якія Лукашэнка напоўніцу выкарыстоўваў.

Дасягненьне эканамічных палёгак з боку Масквы за кошт саступак у вайсковай і палітычнай сфэрах, а таксама абяцаньняў далучыць Беларусь да Расіі (выкананьне ці невыкананьне якіх было вылучна справай Лукашэнкавага гонару) зрабілася часткай стратэгіі беларускага прэзыдэнта, накіраванай на ўмацаваньне асабістай улады. Так, у сакавіку 1996 году ён выгаргаваў сьпісаньне аднаго мільярда даляраў беларускага доўгу Расіі, фармальна ў абмен на дазвол пакінуць на сваёй тэрыторыі расійскія вайсковыя базы. Праз год, падпісаўшы дамову аб стварэньні саюзу (дакладней, аморфнага аб’яднаньня дзьвюх асобна кіраваных краінаў) з Расіяй, Беларусь атрымала неабмежаваны доступ на расійскі рынак, а таксама магчымасьць

набываць нафту і газ за тыя ж цэны, што і расійскія спажыўцы (напрыклад, нафту па 50 даляраў ЗША за тону, што было прыблізна ўдвая ніжэй за сусьветную цану). Мытны саюз паміж дзьвюма дзяржавамі даў Беларусі кантроль амаль над 70 працэнтамі ўсяго расійскага экспарту і імпарту на Захад і з Захаду, якія праходзілі празь яе тэрыторыю. Мыты на расійскі імпарт зьбіраліся беларускімі ўладамі, і фармальна частка іх пераводзілася ў Расію. Аднак беларускі бок пасьля гэтага нярэдка заставаўся ў плюсе. Толькі ў 1998 годзе сума ўтоеных Беларусяй мытаў, спагнаных з імпартных аўтамабіляў, што пераганяліся ў Расію, склала каля 600 млн. даляраў.

Яшчэ больш істотнай прэфэрэнцыяй Беларусі з боку Расіі былі ўмовы, на якіх ажыцьцяўляўся гандаль паміж дзьвюма краінамі. Толькі частка гэтага гандлю была манэтызаваная, рэшту займалі бартэрныя ўгоды. Гандлёвая практыка паміж дзьвюма краінамі была такая, што завышэньне валютнага курсу, якое спадарожнічала ёй, не наносіла імгненнай шкоды расійскаму прамысловаму экспарту. Бартэрныя апэрацыі звычайна палягалі ў абмене таварамі на пэўную суму, выражаную ў далярах ЗША згодна з афіцыйным курсам. Дапусьцім, Расія дамаўлялася зь Беларусяй аб пастаўцы з аднаго боку нафты, а з другога — абсталяваньня на суму 1 мільярд даляраў. Аб’ём паставак з кожнага боку (г.зн. колькасьць тон нафты і адзінак тэхнікі) цяпер залежаў ад таго, як той ці іншы бок ацэніць сваю прадукцыю ў даляравым эквіваленце. Паколькі беларусы вызначалі кошт сваіх трактароў ці цяжарнікоў ў адпаведнасьці з афіцыйным курсам, які, скажам, на 30% перавышаў рынкавы, расійскія пакупнікі фактычна пераплачвалі 30% ад кошту тавару. Некаторыя тавары — хімічнае валакно, цукар — Расія такім чынам купляла ў Беларусі па цэнах, на 60% вышэйшых за сусьветныя. Апрача таго, існаваньне клірынгавых мэханізмаў і бартэрных схемаў дазволіла Беларусі аплаціць значную частку сваіх даўгоў за энэрганосьбіты куды хутчэй, чым калі б гэта адбывалася за жывыя грошы.

Цесная залежнасьць рэсурсаёмістай беларускай эканомікі ад расійскіх энэрганосьбітаў тлумачыла, чаму ВУП, пачынаючы з 1995-га, падаў на працягу першага і чацьвёртага кварталаў (г.зн. у зімовыя месяцы) кожнага году, калі спажываньне электрычнасьці й паліва пачынала хутка расьці. У цэлым суму штогадовых расійскіх датацыяў беларускай эканоміцы ў пэрыяд 1997—1998 гг. можна ацаніць у 1,5—2 мільярды даляраў[32].

Аналіз расійскіх эканамічных саступак Лукашэнку вядзе да высновы, што беларускі прэзыдэнт з посьпехам здолеў аднавіць, прынамсі ў эканамічнай сфэры, такі тып адносінаў паміж Белярусяй і яе колішняй мэтраполіяй, які меў месца ў савецкую эпоху і які зрабіў магчымым імклівую мадэрнізацыю беларускай эканомікі па другой сусьветнай вайне. Як і тады, Беларусь абменьвала свае пераацэненыя прамысловыя вырабы на недаацэненыя расійскія энэргарэсурсы, дзякуючы таму што грошы адыгрывалі малую ролю ўва ўзаемным гандлі. Аднак была і другая нечаканая прычына кароткатэрміновага посьпеху Лукашэнкавага курсу, у меншай ступені зьвязаная з палітыкай. Павелічэньне экспарту ў Расію шмат у чым было выклікана моцным ростам унутранага попыту ў РФ у выніку штучнага стрымліваньня курсу расійскага рубля ў спалучэньні зь велізарным фіскальным дэфіцытам і магчымасьцю прафінансаваць яго замежнымі пазыкамі. Таму за падтрымку “беларускага цуду” Лукашэнку варта было б падзякаваць расійскім лібэралам, якія здолелі атрымаць шматміль-

[32] Кірк Мільднэр “Чаму Беларусь ня вучыцца” // Штоквартрльнік клюбу эканамістаў, № 1/2000; Леанід Злотнікаў. “Унесенные ростом” // “Белорусский рынок”, 22 сьнежня 1997 г.

ярдныя крэдыты ад МВФ пры ўмове рэформаў, ня маючы для іх ажыцьцяўленьня дастатковых палітычных сродкаў; расійскаму Цэнтрабанку, які адмаўляўся дэвальваваць рубель, пакуль той ня абваліўся падчас жнівеньскага крызысу; Дзяржаўнай Думе, якая ўхваляла ўкладзеныя з калясальным дэфіцытам бюджэты; нарэшце, міжнароднай фінансавай супольнасьці, якая давала Расіі танныя крэдыты, не кантралюючы правядзеньня рэформаў. Як ні парадаксальна, усе гэтыя суб'екты (за выняткам Думы) зьяўляліся палітычнымі ворагамі Лукашэнкі. Накладваючыся адзін на другі, розныя аспэкты беларуска-расійскай інтэграцыі ператваралі яе ў гульню ў адны вароты, пры якой эканамічны рост у Беларусі рабіўся магчымым пры запаволеньні росту ў самой Расіі. З аднаго боку, нерэфармаваная беларуская эканоміка была здольная прадэманстраваць шпаркі рост вылучна дзякуючы самаахвярнасьці Расіі, якая брала буйныя дзяржаўныя пазыкі, цярпела дэфіцыт бюджэту, сьпісвала даўгі й адмаўлялася ад спагнаньня мытаў. З другога — пакуль беларускія ўлады субсыдавалі сваю прамысловасьць, расійскія прадпрыемствы, што выраблялі аналягічныя тавары, перажывалі балючую рэструктурызацыю. Але ў гэтага мэдаля ёсьць і адваротны бок: калі ў 1999 годзе расійскія вытворцы, мадэрнізаваўшы сваю тэхналягічную базу, пачалі ажываць, беларускія тавары сталі выцясьняцца з расійскага і нават уласнага, беларускага рынку.

## Абвал беларускага рубля ў Маскве

Першым паважным ударам па Лукашэнкавай эканамічнай стратэгіі стаўся абвал беларускага рубля на Маскоўскай валютнай біржы 12 сакавіка 1998 году. Ён быў выкліканы дысбалянсам паміж ростам грашовай масы і рэгуляваным абменным курсам беларускага рубля, які вёў да дэфіцыту ў Беларусі цьвёрдай валюты і, адпаведна, лішку беларускіх рублёў. Ня маючы магчымасьці супраціўляцца ціску беларускага ўраду, Нацыянальны банк Беларусі быў вымушаны выпускаць у абарачэньне столькі грошай, што эфэктыўнае кіраваньне валютным курсам, улічваючы памер валютных рэзэрваў у краіне, аказалася немагчымым. Крызыс набліжала і традыцыя праводзіць буйную грашовую эмісію перад кожнай сяўбой дзеля яе фінансаваньня.

З 1995-га і да лета 1998 году беларускі рубель валодаў частковай канвэрсоўнасьцю і мог амаль свабодна экспартавацца і імпартавацца. Ведаючы, што ўрад прымусіць прадаць большую частку заробленай СКВ па заніжаным афіцыйным курсе, экспартэры не сьпяшаліся пераводзіць свае даходы ў Беларусь. У той жа час, паколькі курс беларускага рубля да даляра на замежных рынках (перш за ўсё ў Маскве, але таксама ў Рызе і Кіеве) быў ніжэйшы, чым на Паралельным міжбанкаўскім рынку ў Менску, а беларускія імпартэры плацілі за імпарт у нацыянальнай валюце, зьявіўся шырокі замежны рынак беларускай валюты, не кантраляваны беларускімі ўладамі. Падлічана, што ў 1998 годзе сем з васьмі беларускіх рублёў купляліся і прадаваліся за замежную валюту па-за Беларусяй. Каб зьменшыць замежныя запасы беларускага рубля, НББ актыўна скупляў яго на замежных рынках увесь 1997 год.

Цяжка сказаць, ці чулі калі-небудзь беларускія кіраўнікі пра "трылему макраэканамічнай палітыкі" і ці ведалі яны, што рухомасьць капіталу, самастойнасьць у правядзеньні грашова-крэдытнай палітыкі й фіксаваны валютны курс — рэчы несумяшчальныя. (Зрэшты, у дачыненьні да Беларусі варта гаварыць не пра кантроль за капіталам, а пра абмежаваньне абара-

чальнасьці бягучых плацяжоў і жорсткае валютнае рэгуляваньне.) Ім давялося даведацца пра гэта, калі на працягу двух тыдняў курс беларускага рубля да даляра ЗША ўпаў з 44 000 да 57 800 BRB/USD. Гэты абвал адчувальна ўдарыў па беларускай эканоміцы: нядоўгае паляпшэньне становішча экспартэраў было зь лішкам кампэнсавана ростам цэнаў на імпарт, перш за ўсё энэрганосьбіты. Істотна, што ў дзяржаўны бюджэт і рэгуляваныя дзяржавай раздробавыя цэны ў строгай адпаведнасьці з прэзыдэнцкім указам была закладзена толькі 2-працэнтная штомесячная інфляцыя. У выніку рэальныя даходы насельніцтва пачалі імкліва зьніжацца нават раней, чымся ў Расіі здарыўся жнівеньскі крызыс і яго вынікі закранулі бальшыню постсавецкіх дзяржаў (гл. графік 5).

Рэакцыя ўладаў на абвал валютнага курсу выявіла ўпэўненасьць беларускага кіраўніцтва (і перш за ўсё Лукашэнкі) у тым, што зусім не афіцыйная эканамічная стратэгія паслужыла прычынай краху*. Яго першым крокам стала прызначэньне старшынём Нацыянальнага банку Пракаповіча, які нарэшце атрымаў магчымасьць ажыцьцявіць свае “наватарскія” ідэі. Па-другое, Нацыянальны банк быў падпарадкаваны ўраду і фактычна ператварыўся ў ягоную філію. Па-трэцяе, была часткова скасавана канвэрсоўнасьць беларускага рубля: нерэзыдэнтам забаранілі выкарыстоўваць у плацяжах вэксалі, намінаваныя ў беларускіх рублях; былі забаронены выплаты беларускімі грашыма па валютных крэдытах; абмяжоўвалася магчымасьць захаваньня нерэзыдэнтамі беларускіх рублёў на карэспандэнцкіх рахунках; нарэшце, цалкам забараняўся вываз беларускіх рублёў[33].

## 17 жніўня і ягоныя вынікі

Беспасярэднім наступствам жнівеньскага фінансавага крызысу ў Расіі быў крах расійскага рынку ў выніку раптоўнага зьніжэньня даходаў і дэвальвацыі расійскага рубля, што прывяло да сур’ёзнага спаду попыту на імпарт і ў рэшце рэшт дало айчынным вытворцам велізарную перавагу над імпартэрамі. Інфляцыя ў Расіі амаль адразу выклікала й інфляцыю ў Беларусі, паколькі абвал расійскага рубля выклікаў крыш і ягонага беларускага цёзкі.

Скачок інфляцыі, узровень якой падвоіўся ў верасьні 1998 году, рэзка падцяў рэальныя заробкі й пэнсіі. На працягу месяца пасьля крызысу сярэдняя зарплата зьнізілася з 70 да 45 даляраў ЗША, а ў сьнежні ўпала нават ніжэй за 30 даляраў. Сярэдні памер пэнсіяў пад канец году склаў 15 даляраў. Катастрафічнае падзеньне попыту ў Расіі й прыпыненьне расійскімі банкамі плацяжоў па экспарце падарвала міждзяржаўны гандаль. Штомесячны аб’ём экспарту ў Расію зьменшыўся з 421 мільёна даляраў (у сярэднім) у першай палове году да 170 млн. у кастрычніку. Асабліва пацярпеў гандаль, які вёўся за жывыя грошы: са студзеня па лістапад 1998 году доля бартэру склала 34,2% у экспарце і 27,9% у імпарце, тады як у 1997 годзе аналягічныя паказьнікі былі роўныя 27,5% і 30,2%[34]. Шмат якім беларускім прадпрыемствам не заставалася нічога іншага, як адпраўляць выробленую прадукцыю на склад. У

[33] “Белорусская газета”, 13 ліпеня 1998 г.

* “Эканоміка расьце, а абменны курс зьніжаецца. Чаму? Дзе грошы, дзе замежная валюта? Хто іх хавае? Сёй-той хавае іх у Расіі, на карэспандэнцкіх рахунках... А дзе міністэрства фінансаў, Нацыянальны банк? Вы мусіце даць мне адказ, чаму кучка махляроў утойвае грошы.” // “Вэрсіі”, электронная газэта “Open.by”, 17 сакавіка 1998 г.

[34] EIU, 1/1999.

кастрычніку 1998 году доля непрададзеных тавараў дасягнула ў сярэднім 66% ад месячнага аб’ёму вытворчасьці, а ў машынабудаваньні — ашаламляльных 129%. У студзені 1999 году не знайшлі попыту каля 85% вырабленых тавараў.

Гэтыя драматычныя падзеі, аднак, не прымусілі Лукашэнку засумнявацца ў правільнасьці абранага эканамічнага курсу. Захадамі ў адказ на жнівеньскі крызыс сталіся далейшае ўмацаваньне кантролю за цэнамі й валютным курсам, а таксама падтрымка прамысловага сэктару новымі льготнымі крэдытамі па яшчэ меншых працэнтных стаўках. У выніку павялічыўся дэфіцыт прадуктаў харчаваньня, актывізаваўся чорны рынак і шпарка вырас ценявы экспарт танных прадуктаў у Расію, Украіну і Прыбалтыку. Але і гэта не спыніла Лукашэнку. У лістападзе ён выдаў указ, які забараняў “стыхійны” вываз прадуктаў харчаваньня і аднаўляў мытныя пасты на мяжы з Расіяй. У якасьці карных захадаў у дачыненьні да кантрабандыстаў былі прадугледжаныя вялікія штрафы, а таксама канфіскацыя транспартных сродкаў і прадуктаў, якія вывозіліся. Зь зьяўленьнем другога прэзыдэнцкага ўказу, які загадваў стварыць “надзвычайны штаб” па барацьбе з дэфіцытам прадуктаў харчаваньня, урад быў амаль цалкам пазбаўлены самастойнасьці. На чале гэтага новага органу быў пастаўлены кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта М. Мясьніковіч, якому цяпер павінен быў даваць справаздачу прэм’ер-міністар. Намаганьні новай адміністрацыйнай структуры, аднак, ня мелі плёну, паколькі мясцовыя ўлады былі вымушаны ўводзіць нармаваны водпуск харчовых тавараў. Паміж тым нястача асноўных прадуктаў харчаваньня тлумачылася народу якраз нядбайнасьцю мясцовых кіраўнікоў, а не заганамі макраэканамічнай палітыкі.

Тым часам грашова-крэдытная палітыка заставалася глыбока экспансіянісцкай, паколькі ўлады жадалі захаваць высокія тэмпы росту незалежна як ад унутраных, так і ад вонкавых макраэканамічных умоваў. Як паказвае табліца 6, рэакцыяй на абодва крызысы 1998 г. было рэзкае павелічэньне крэдытаў Нацыянальнага банку ўраду і прамысловым прадпрыемствам*. Ня маючы іншага выйсьця, НББ павысіў гадавую стаўку рэфінансаваньня ўсяго да 12%, хоць дзеля эфэктыўнай барацьбы з інфляцыяй яна павінна была б скласьці ад 48 да 60% у студзені 1999 году і 90% — у красавіку. Да таго ж, было зроблена яшчэ адно гіганцкае ўліваньне ў сельскую гаспадарку.

Крэдытная экспансія, аднак, не змагла захавацца на ўзроўні 1997—98 гг. У студзені-лютым 1999 г. ВУП упаў на 0,7% у параўнаньні з тым самым леташнім пэрыядам. І хоць да красавіка рост ВУП аднавіўся, выйшаўшы на 2-працэнтны ўзровень (у параўнаньні зь леташнім красавіком), яму ўжо было ня дадзена дасягнуць уражальных двухзначных паказьнікаў мінулага году. У той час як рост у прамысловасьці запаволіўся, сельская гаспадарка пайшла на спад, які ў першым квартале 1999 году дасягнуў 5,2%. Настойлівае імкненьне ўраду захаваць рост любой цаной наносіла шкоду спажыўцам: рэальныя месячныя заробкі ў красавіку зьнізіліся на 20%, а пэнсіі — амаль на 40% у параўнаньні з дакрызысным станам.

Дзеля велізарнага скачка курсу даляра і адначасовага зьмяншэньня попыту на расійскім рынку структура беларускага вонкавага гандлю вярнулася да стану, у якім знаходзілася перад 1996 годам. Доля Расіі як у экспарце, так і ў імпарце скарацілася, і экспартныя рынкі

* Вядома, варта ўлічыць, што за адзін квартал абменны курс павялічыўся больш чым на 300%, адпаведна вырасьлі замежныя актывы і запазычанасьці банкаўскай сыстэмы. Усё гэта імгненна адбілася на росьце квазігрошай. Таму можна дапусьціць, што ў некаторай ступені чыстыя крэдыты Нацбанку дзяржаўным прадпрыемствам вырасьлі дзеля гэтага.

перамясьціліся пераважна на Захад і іншыя краіны, што не належалі да СНД. Зьніжэньне ж у сукупным аб'ёме вонкавага гандлю адбылося амаль вылучна за кошт дзяржаваў "блізкага замежжа". Паніжэньне попыту на імпарт, выкліканае інфляцыяй, паспрыяла часовай стабілізацыі бягучага плацежнага балянсу, які ў першым квартале 1999 году ўпершыню аказаўся дадатным. Стабілізацыя вонкавагадлёвага сэктару, аднак, была дасягнута хутчэй непрапарцыйна вялікім зьніжэньнем імпарту, чымся павелічэньнем экспарту.

За выняткам сальда бягучых плацяжоў агульны стан эканомікі быў крытычны. Пераход да больш рэалістычнай макраэканамічнай і валютнай палітыкі ў Расіі амаль не пакідаў надзеі на хуткае аднаўленьне ўнутранага попыту на галоўным экспартным рынку Беларусі. Апроч таго, беларускі ўрад сутыкнуўся з адмовай Расіі ад некаторых мэтадаў субсыдаваньня беларускай эканомікі, што падтрымлівалі яе ў папярэднія гады. Так, у той час як для спажыўцоў у Расіі цэны на нафту і газ у даляравым эквіваленце ўпалі дзякуючы дэвальвацыі, для Беларусі яны не пераглядаліся да другой паловы 1999 году. У выніку працягвала зьніжацца канкурэнтаздольнасьць беларускіх тавараў, а доўг Расіі за энэрганосьбіты зноў пачаў расьці. Доля стратных прадпрыемстваў па-ранейшаму расла і ў траўні дасягнула 23% ад іх агульнай колькасьці (у параўнаньні з 20% годам раней), у тым ліку ў сельскай гаспадарцы — 40%[35]. Наступным ударам па эканоміцы быў спад вытворчасьці ў сельскай гаспадарцы. Рэальная сельскагаспадарчая вытворчасьць на працягу году зьнізілася больш як на 10%, што было выклікана благім надвор'ем (афіцыйная вэрсія), а таксама няспынным выпампоўваньнем рэсурсаў з аграрнага сэктару дзеля дыспарытэту цэнаў (рэальнейшая прычына, якая тлумачыць значна лепшы ўраджай у суседніх Польшчы і Летуве, што маюць падобныя кліматычныя ўмовы). Канчатковым вынікам году стаўся 2-працэнтны эканамічны рост (паводле афіцыйных ацэнак), дасягнуты цаной 257-працэнтнай гадавой інфляцыі (лічба не адлюстроўвае сукрытай інфляцыі). Пад канец году дзякуючы павышэньню спажывецкага попыту, якому спрыяла не такое хуткае абясцэньваньне нацыянальнай валюты, часткова аднавіўся дакрызісны жыцьцёвы ўзровень. Гэта, аднак, толькі вярнула на сваё месца вонкавагандлёвы дэфіцыт.

## Флірт з рэформамі?
## Паварот у 2000 годзе да рынкавай палітыкі

Эканамічны заняпад, зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва і зьмяненьне ў 1999 годзе вонкавае кан'юнктуры зрабілі для Лукашэнкі праблематычным працяг ранейшага курсу і далейшы супраціў рынкавым рэформам. Сыстэма множнасьці валютных курсаў ператварылася для беларускага ўраду ў праблему, што патрабавала неадкладнага разьвязаньня, паколькі яна была асноўнай прычынай паглыбленьня макраэканамічных і структурных дыспрапорцыяў у беларускай эканоміцы.

Неабходнасьць лібэралізаваць валютны курс сталася яшчэ вастрэйшай пасьля жнівеньскага крызысу, калі, сутыкнуўшыся з дэфолтам Расіі, Лукашэнка вымушаны быў зьвярнуцца да МВФ з просьбай аб дапамозе ў выглядзе стомільённай экстраннай пазыкі, якая магла

[35] EIU.

быць выдзеленая пад эгідай “compensatory contingency financing facility”. У адказ адразу было вылучана патрабаваньне ўніфікаваць валютны курс. Беларускія ўлады саступілі патрабаваньням МВФ у сакавіку 1999 году і прадставілі плян аб’яднаньня валютных курсаў, а таксама скасавалі другую сэсію валютнай біржы. Уніфікаваны курс склаў 229 000 беларускіх рублёў за даляр і быў куды бліжэйшы да рынкавага. Усё ж розьніца па-ранейшаму была даволі вялікая, дый усе іншыя абмежаваньні (у тым ліку на куплю і продаж СКВ фізычнымі асобамі) былі зьнятыя толькі ў сьнежні 1999 году. Упершыню больш як за тры гады людзі змаглі свабодна купляць і прадаваць валюту ў абменных пунктах па рынкавым курсе. Афіцыйны курс Нацыянальнага банку, аднак, застаўся завышаны, хоць бездань паміж ім і курсам чорнага рынку зьнікла.

У канцы 1999 году ўрад і Нацыянальны банк абвясьцілі намер панізіць узровень сярэднямесячнай інфляцыі з 10%, якія назіраліся ў 1999 годзе, да 4% у 2000-м. Праграма, прадстаўленая ў лістападзе 1999 г., прадугледжвала такія захады, як абмежаваньне росту грашовай масы, частковую лібэралізацыю цэнаў, скарачэньне ўрадавых субсыдыяў і пераход да адзінага курсу абмену рубля з наступным увядзеньнем сыстэмы зьменнага фіксаванага курсу. Хоць у канчатковую арыентацыю беларускімі ўладамі на рынкавыя рэформы верылася насілу, у многіх галінах сапраўды быў дасягнуты прагрэс, і на працягу 2000 году ў эканоміцы назіралася нерашучая рэанімацыя рынкавых мэханізмаў.

Відавочным посьпехам гэтага году стаўся выхад на адзіны валютны курс. Дзеля гэтага Нацыянальнаму банку давялося пайсьці на значнае абясцэньваньне беларускага рубля ў дачыненьні да даляра ЗША (у сярэднім на 14% у месяц, пачынаючы з мая). Пераход завяршыўся ў верасьні, калі была дасягнута адпаведнасьць паміж рынкавым і афіцыйным курсамі й скасаваныя тры розныя курсы, якія існавалі датэтуль. Сярэднямесячная інфляцыя сягнула ніжэй за 10% ужо ў лютым і ў далейшым працягвала зьніжацца, вагаючыся на працягу году паміж 3,6 і 6,1%. Адбывалася, хоць і з рыпам, лібэралізацыя цэнаў: сьпіс тавараў, цэны на якія рэгуляваліся ўрадам, быў значна скарочаны. Намер рухацца далей па шляху рэформаў быў пацьверджаны прыняцьцем новага Палажэньня аб банкруцтве і абвяшчэньнем плянаў продажу акцыяў шэрагу прамысловых прадпрыемстваў на Менскай валютнай і Фондавай біржах.

**Графік 6.** Дынаміка даходаў і запазычанасьці ў беларускай эканоміцы, 1999—2001 гг.




Крыніца: Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусі.

Усе гэтыя захады, аднак, не насілі характару комплексных усёахопных эканамічных рэформаў, а былі, бадай, фліртам з рынкам. Адыход ад нетрадыцыйных экспэрымэнтаў над экономікай і частковая адмова ад кантролю за цэнамі й валютным курсам маглі быць растлумачаныя бягучай патрэбай утаймаваць інфляцыю і спыніць далейшае падзеньне жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва наконадні парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў, а таксама жарстчэйшай пазыцыяй расійскага ўраду, які ўжо ня мог дазволіць сабе сілкаваць беларускую эканоміку ў ранейшым аб’ёме. Новае інтэграцыйнае пагадненьне паміж Расіяй і Беларусяй прадугледжвала пяцігадовы тэрмін пераходу да адзінай валюты, на працягу якога Беларусь павінна была ўніфікаваць сваю макра- і мікраэканамічную палітыку з расійскай. Расія мелася дапамагчы дасягнуць у Беларусі макраэканамічнай стабілізацыі, але абавязковай умовай гэтага рабіўся пераход Лукашэнкі да эканамічных рэформаў. Выдзяленьне Цэнтрабанкам Расіі абяцанага стабілізацыйнага крэдыту затрымлівалася на працягу году, пакуль Лукашэнка хоць часткова не пачаў выконваць гэтую ўмову. Пастанова аб прывязцы беларускага рубля да расійскага, прынятая ў студзені 2001 году, запатрабавала далейшага пасураўленьня грашова-крэдытнай палітыкі й наклала новыя абмежаваньні на беларускае кіраўніцтва, якое цяпер павінна было каардынаваць свае дзеяньні з прыхільнейшымі да рынку ўсходнімі суседзямі.

Хоць у асобных галінах рэформы мелі посьпех, у іншых шмат што заставалася па-ранейшаму. Так, аб’ём грашовай масы амаль падвоіўся ў параўнаньні з 1999 годам, што было выклікана выдзяленьнем новых крэдытаў сельскай гаспадарцы і актыўнай купляй Нацыянальным банкам СКВ з мэтай павялічыць свае рэзэрвы. Манэтарная палітыка заставалася экспансіянісцкай, а зьніжэньне інфляцыі было дасягнута галоўным чынам праз абмежаваньне крэдытаваньня ў папярэднім годзе і стрымліваньне цэнаў. І хоць сярэднямесячны рост грашовай масы ўрэшце зьнізіўся з 18% у красавіку менш як да 4% у кастрычніку, назапашаны грашова-крэдытны дэфіцыт пагражаў ізноў раскруціць махавік інфляцыі ў будучыні. Паколькі аб’яднаньне валютных курсаў прывяло да страты прывілеяванымі прадпрыемствамі магчымасьці купляць валюту па заніжаным курсе, многія зь іх працягвалі несьці страты, бо аказаліся непадрыхтаванымі да працы ў рэальных эканамічных умовах. Пад канец 2000 году стратнымі аказаліся больш як 40% прадпрыемстваў, а ў аграрным сэктары гэты паказьнік быў яшчэ вышэйшы.

І ў той час як аднаўленьне попыту і ажыўленьне вытворчасьці ў Расіі дазволіла беларускай экономіцы дасягнуць 6-працэнтнага росту, падаражэньне расійскіх энэрганосьбітаў выклікала павелічэньне бягучага плацежнага дэфіцыту. Да таго ж частковае аднаўленьне эканамічнага росту і рэальных даходаў было дасягнута шляхам стымуляцыі попыту, аплачаным істотным скарачэньнем інвэстыцыяў.

## Кола замкнулася? Гады выбараў

Дзьве кволыя Лукашэнкавы спробы правесьці абмежаваныя рынкавыя рэформы — у 1994—95 і 2000 гг. — мелі адну супольную рысу: у абодвух выпадках ягоны рэйтынг адчувальна зьніжаўся (з 56% выбарцаў, што прагаласавалі за яго ў ліпені 1994-га, да 27%, паводле апытаньняў НІСЭПД, у студзені 1995-га, а таксама больш чым з 52% у верасьні 1998-га да 33% у жніўні 2000-га). Падобнае падзеньне папулярнасьці было недапушчальнае ў год

прэзыдэнцкіх выбараў. Таму Лукашэнка вярнуўся да сваіх традыцыйных мэтадаў і зрабіў асновай уласнай выбарчай кампаніі абяцаньне павысіць увосень 2001 году сярэднямесячныя заробкі да 100 даляраў. У сярэднім павышэньне павінна было скласьці 30%, што, улічваючы амаль застойны стан беларускай эканомікі і менш чым трохпрацэнтны яе рост у тым годзе, не магло быць дасягнута без павелічэньня інфляцыі ці адмовы ад стрымліваньня спажывецкіх цэнаў (а таксама стабілізацыі валютнага курсу, бо заробкі павінны былі расьці ў даляравым эквіваленце. Акурат водпуск цэн на тавары першай неабходнасьці быў дзейсным захадам для ўтрыманьня курсу даляра, у той час як стрымліваньне ўсё большай інфляцыі за кошт назапашаных рэзэрваў магло працягвацца толькі да іх вычарпаньня). Абодва спосабы, аднак, не давалі ніякай палітычнай выгады ад свайго выкананьня. Пры адзіным валютным курсе інфляцыйнае павелічэньне расходаў не магло не адбіцца на курсе беларускага рубля, і намаганьні, патрачаныя на павышэньне заробкаў, пайшлі б на глум. Таму выкананьне галоўнага перадвыбарнага абяцаньня было дасягнута далейшым павелічэньнем падатковага цяжару (і запазычанасьцяў па выплаце зарплаты), якое суправаджалася катастрафічным зьмяншэньнем інвэстыцыяў (ад любай уладам схемы субсыдаваньня будаўніцтва, укаранёнай у 1996—97 гг., давялося адмовіцца падчас крызысу дзеля дасягненьня фінансавай стабілізацыі; у выніку ў будаўнічай галіне адбыўся рэзкі спад). Апроч таго, павялічыўся націск на фінансавы сэктар. Банкам загадвалі пашыраць выдзяленьне крэдытаў на фінансаваньне павялічаных заробкаў, нягледзячы на імклівы рост дэбіторскай запазычанасьці. Некаторыя прадпрыемствы, кіраўнікам якіх Лукашэнка асабіста прыгразіў турмой, калі яны да верасьня не забясьпечаць сваіх работнікаў стодаляравай зарплатай, нават былі вымушаны дзеля выкананьня прэзыдэнцкага абяцаньня закласьці або прадаць частку свайго абсталяваньня. Павелічэньне заробкаў вымагала таксама замарожваньня фінансаваньня шэрагу ўрадавых праграмаў. Паколькі ўрад згадзіўся пайсьці на гэта, імкнучыся дасягнуць нізкага дэфіцыту бюджэту, чакалася нарошчваньне запазычанасьцяў па яго расходнай частцы.

16 траўня 2001 г. урад абнародаваў новую пяцігадовую праграму разьвіцьця народнай гаспадаркі, якая грунтавалася на ранейшым прынцыпе кантролю дзяржавы над эканомікай і пакідала мала надзеі на нейкія больш-менш істотныя рэформы. Захоўваючы цэнтралізаваны кантроль, урад плянаваў за наступныя пяць гадоў дабіцца павелічэньня ВУП на 6—7% штогод, утрымаць афіцыйны ўзровень беспрацоўя ў межах 2% ад агульнай колькасьці працаздольных і прывесьці сярэднегадавую інфляцыю да ўзроўню каля 22%. На працягу гэтага пэрыяду ўрад меўся таксама павысіць сярэдні месячны заробак з 85 да 250 даляраў ЗША ды забясьпечыць прыток простых замежных інвэстыцыяў для павелічэньня ўзроўню вытворчасьці. Невядома, ці сапраўды ўрад усьвядоміў неабходнасьць значных эканамічных пераўтварэньняў, аднак у кожным выпадку ягоныя намеры былі асуджаныя на правал, паколькі яны былі ўзаемна несумяшчальныя. Напрыклад, паскарэньне эканамічнага росту, павелічэньне узроўню вытворчасьці й заработнай платы, абяцаныя ўрадам, былі немагчымыя без істотнага росту інвэстыцыяў — які, у сваю чаргу, выглядаў малаімаверным, пакуль урад настойваў на захаваньні жорсткага кантролю над эканомікай. Калі ж раптам было б пастаноўлена рушыць шляхам лібэралізацыі, гэта павялічыла б шанцы дасягчы эканамічнага пад’ёму, павелічэньня прадукцыйнасьці й зарплаты, але толькі за кошт адмовы ад поўнай занятасьці насельніцтва, паколькі структурная перабудова прадпрыемстваў не абышлася б без павелічэньня беспрацоўя пры адсутнасьці разьвітага прыватнага сэктару, здольнага паглынуць лішнюю працоўную сілу.

Сутыкнуўшыся зь несумяшчальнасьцю пастаўленых задач, Лукашэнку давялося вызначыцца з сваімі прыярытэтамі. Адзіным палітычна прымальным шляхам для Лукашэнкі, які дазволіў бы і захаваць рост, і не дапусьціць беспрацоўя, заставалася далейшае субсыдаваньне дзяржаўнага сэктару, а значыць, і далейшая грашовая эмісія. Намер уладаў захаваць шчодрыя датацыі з мэтай утрымаць эканоміку на плаву даволі выразна вынікаў з новай доўгатэрміновай праграмы рэфармаваньня аграрнага сэктару. Аднак гэтыя датацыі не маглі выратаваць сельскую гаспадарку, бо плянавалася захаваць цэнтралізаваны кантроль над ёй і толькі часткова трансфармаваць існуючыя калгасы шляхам увядзеньня некаторых рынкавых мэханізмаў і забесьпячэньня іх большай фінансавай самастойнасьці. Такія захады ўжо рабіліся ў дачыненьні да прамысловых прадпрыемстваў перад распадам Савецкага Саюзу — і аказваліся пераважна неэфэктыўнымі. Урэшце падчас выбарчай кампаніі Лукашэнка перастаў маніпуляваць прыгожай статыстыкай новага пяцігадовага пляну. Замест гэтага ён паабяцаў пэўную эканамічную лібэралізацыю, улучна з падтрымкай малога бізнэсу, падатковай рэформай і аслабленьнем дзяржаўнага ўмяшаньня ў бізнэс.

Макраэканамічныя дыспрапорцыі адразу пасьля выбараў запатрабавалі прыняцьця неадкладных захадаў. Рост заробкаў трэба было нечым кампэнсаваць, і замарожаныя да верасьня цэны на асноўныя тавары й тарыфы на камунальныя паслугі рэзка пайшлі ўгору. Зьмяншэньне валютных рэзэрваў Нацыянальнага банку, выдаткаваных на стабілізацыю абменнага курсу, вяло да больш рэальнай ацэнкі рубля і павелічэньня нагрузкі на экспартэраў. І калі прыйшоў час выканаць забавязаньні па расходнай частцы бюджэту, стала зразумела, што год будзе завершаны з дэфіцытам. Паколькі пакрыць дэфіцыт можна было толькі фінансаваньнем Нацыянальнага банку, гэта прывяло да чарговага вітку інфляцыі.

Абяцаньні лібэралізацыі й рынкавых рэформаў сталіся прыкметай новага тыпу расійска-беларускіх адносінаў, якія радыкальным чынам зьмяніліся пасьля прыходу ў Крэмль Пуціна. І да Пуціна ліквідацыя шкоды, нанесенай жнівеньскім эканамічным крызысам, запатрабавала ад расійскіх уладаў усталяваньня жорсткай фінансавай дысцыпліны, мабілізацыі ўсіх дзяржаўных рэсурсаў, зьнішчэньня “чорных дзірак” у бюджэтнай і мытнай сыстэмах. У выніку цэны на энэрганосьбіты для беларускіх спажыўцоў узрасьлі, бартэрныя ўгоды пачалі выцясьняцца гандлем за жывыя грошы, а ціск да ўніфікацыі мытнага заканадаўства дзьвюх краінаў узмацніўся. Гэта пацягнула за сабой рэзкае скарачэньне сукрытага субсыдаваньня Расіяй беларускай эканомікі.

За некалькі месяцаў пасьля прыходу Пуціна Беларусі давялося ўстанавіць такія экспартныя тарыфы для нафты і газу, якія паклалі канец кантрабандзе энэрганосьбітаў. У 2001 годзе нарэшце адбылася ўніфікацыя мытных кодэксаў, якая спыніла паток не абкладзенага мытамі імпарту на расійскі рынак. Перавод на грашовую аснову гандлю паміж дзьвюма дзяржавамі-саюзьніцамі прывёў да рэзкага скарачэньня долі бартэру ў структуры вонкавага гандлю Беларусі: у 2001 годзе яна склала 18% экспарту і 13% імпарту, г.зн. каля паловы ад узроўню 1997 году[36]. У выніку тыя галіны прамысловасьці, што рабілі стаўку на бартэр і забясьпечылі эканамічны рост у 1997—98 гг., у 2001 г. перажывалі застой. Выцясьненьне “бюракратычнага гандлю” ўдарыла па прадпрыемствах, якія не маглі прадаваць сваю прадукцыю звычайным спосабам, і ліквідавала выгадныя для Беларусі цэнавыя скрыўленьні. Павелічэньне ўнутранай канкурэнтаздольнасьці расійскай прамысловасьці вымусіла бела-

[36] Белорусская газета. 2002. 4 марта.

рускіх вытворцаў зьніжаць цэны, гранічна скарачаючы рэнтабэльнасьць, а часам працуючы і са стратамі (напрыклад, МТЗ і МАЗу даводзілася гандляваць у Расіі па цэнах, што нават не пакрывалі выдаткаў вытворчасьці). У 2001 годзе фізычны аб'ём экспарту вырас на 9,5%, у той час як даходы ад яго скараціліся на 7,5%[37].

Такім чынам, эканамічная дапамога і палітычная падтрымка з боку Расіі пачалі сёе-тое каштаваць беларускаму лідэру. Так, пры стварэньні стабілізацыйнага фонду для беларускага рубля ў сьвятле падрыхтоўкі да меркаванага грашовага саюзу паміж дзьвюма краінамі расійцы выставілі наступныя патрабаваньні:

— адмова ад фінансаваньня бюджэтнага дэфіцыту пазыкамі Нацыянальнага банку;
— спыненьне выдачы любых ільготных крэдытаў;
— спыненьне рэгуляваньня тарыфаў на транзыт нафты;
— правядзеньне "малой" прыватызацыі;
— продаж дзяржаўных пакетаў акцыяў вялікіх прадпрыемстваў на фондавай біржы;
— прыватызацыя прадпрыемстваў, якім пагражае банкруцтва;
— уніфікацыя беларускіх мытнага і падатковага кодэксаў з расійскімі[38].

Фактычна патрабаваньні, вылучаныя Расіяй як умова ўкладаньня грашовага саюзу, шмат у чым паўтараюць стандартныя рэкамэндацыі Міжнароднага валютнага фонду, што ўтрымліваюцца ў ягоных праграмах стабілізацыі й структурнай перабудовы эканомікі. Галоўная розьніца, аднак, у тым, што Расія наўрад ці магла б забясьпечыць валютнае фінансаваньне такіх праграмаў. Стабілізацыйная пазыка ў 100 млн. даляраў, паабяцаная ў 2000 годзе, урэшце была выдзелена, але так і ня трапіла ў Беларусь, бо адразу была накіравана на пагашэньне даўгоў за энэрганосьбіты. Другой асаблівасьцю расійскіх "рэкамэндацыяў" было падштурхоўваньне беларускага боку да буйнамаштабнай прыватызацыі, якая дазволіла б узяць беларускую прамысловасьць пад кантроль расійскіх фінансава-прамысловых групаў. Гэты ціск спарадзіў меркаваньні, што падтрымку Крамля на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году Лукашэнка здабыў узамен на абяцаньні перайсьці да прыватызацыі адразу пасьля заканчэньня выбарчай кампаніі[39]. Масква, якая дазволіла Лукашэнку з адносным посьпехам ажыцьцяўляць свае эканамічныя экспэрымэнты, можа зрабіцца і ягоным далакопам.

## Высновы

Эканамічны экспэрымэнт Лукашэнкі трываў даўжэй, чым прадказвалася як беларускімі, так і замежнымі назіральнікамі. Даволі працяглы час ягоная палітыка дазволіла захоўваць высокі ўзровень эканамічнага росту і поўную занятасьць без правядзеньня рынкавых рэформаў і пры рэвізіі ўжо праведзеных. Здольнасьць падтрымліваць ступень дабрабыту на прымальным ці, прынамсі, цярпімым для бальшыні жыхароў краіны ўзроўні прынесла Лукашэнку немалыя палітычныя дывідэнды, бо стварыла ўмовы для кансалідацыі і ўмацаваньня рэжыму, мінімізаваўшы пэрспэктыву грамадзкага выбуху шляхам укладаньня своеасаблівай "сацыяльнай дамовы". Гэтае цьверджаньне наконт эканамічнай стабілізуючай кампанэн-

[37] Тамсама.
[38] Белорусская газета. 4 декабря. 2000.
[39] Белорусский рынок, 2001. № 41.

**Табліца 12.** Дынаміка ВУП у разьліку на душу насельніцтва і рэальных даходаў у Беларусі, 1991—2000 гг.

| | 1991 | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Сярэднедушавы ВУП, зьмена за год, % | -1,28 | -10.92 | -11,68 | -19.93 | -10.11 | 3,15 | 11.94 | 8,92 | 3,67 | 6.31 |
| Сярэднедушавы ВУП, 1990=100%, % | 0.99 | 88,33 | 78.08 | 62,31 | 55,83 | 57.39 | 63,93 | 69,31 | 71,66 | 75,96 |
| Рэальныя даходы, зьмена за год, %* | -2.80 | -14,40 | 12,20 | -35,60 | -10,00 | 5.10 | 14,00 | -13.30 | 24,00 | 21.10 |
| Рэальныя даходы, 1990=100%, % | 97.20 | 83.20 | 93,35 | 60.12 | 54,11 | 56,87 | 64.83 | 56.21 | 69,70 | 84,40 |

Крыніцы: Economist Intelligence Unit, уласныя падлікі.
* Зьвесткі за 1996 і 1997 гг. прадастаўлены Міністэрствам статыстыкі й аналізу Рэспублікі Беларусі.

**Табліца 13.** ВУП у разьліку на душу насельніцтва, выражаны ў парытэце пакупніцкай здольнасьці. Беларусь, Расія і Ўкраіна, 1996—2000 гг.

| | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |
|---|---|---|---|---|---|
| Беларусь | 3683 | 4154 | 4554 | 4891 | 5675 |
| Расія | 4150 | 4780 | 4141 | 4369 | 5167 |
| Украіна | 2133 | 2136 | 2143 | 2130 | 2511 |

Крыніца: Economist Intelligence Unit

**Табліца 14.** Каэфіцыент Джыні ў некаторых пераходных краінах

| | 1992 | 1993 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларусь | 33.6 | 23,3 | 30,2 | 26.8 | 27.3 | 23,1 |
| Расія | 38,1 | | 44,9 | 45.9 | 42,4 | 40,8 |
| Украіна | 36.8 | 34.8 | 27,2 | 35.4 | 35.1 | 33,1 |
| Малдова | 39.2 | 39.7 | 37,9 | 38.0 | | |
| Польшча | 24,0 | 31.7 | 32,8 | 32.4 | 33.1 | 34,2 |
| Вугоршчына | 20,4 | 22.7 | 23,2 | 24.3 | 24.5 | 24,6 |
| Славакія | 18,6 | 19.7 | 20,8 | 20.0 | 24.3 | 23,4 |
| Чэхія | 20,3 | 21.6 | 22,1 | 21.5 | 28.1 | 27,6 |
| Румынія | 25,1 | 26.2 | 26,2 | 31.2 | 30.6 | 30,5 |
| Баўгарыя | 31,1 | 31.9 | 35,6 | 37.2 | 34.3 | 34,6 |
| Латвія | 32,5 | 26.9 | 32,7 | 34.9 | 35.4 | 34,4 |
| Літва | 37,0 | | 37,5 | 34.9 | 34.3 | 33,1 |
| Эстонія | 41,2 | 38.8 | 39,6 | 39.0 | 37.4 | 34,0 |
| Югаславія | 30,0 | 33.8 | 34,3 | 33.7 | 35.5 | |

Крыніца: Сусьветны банк.

ты палітычнага рэжыму ў Беларусі можа быць з абурэньнем сустрэтае шмат якімі Лукашэнкавымі крытыкамі, схільнымі ацэньваць стан краіны як “убогі”. Нельга аспрэчыць, аднак, што на працягу значнай часткі свайго панаваньня Лукашэнка здолеў захаваць супастаўны, калі не вышэйшы, узровень жыцьця ў ёй у параўнаньні з тым, што назіраецца ў больш прасунутых у пляне рэформаў дзяржавах былога СССР. Як гэта ні парадаксальна, ацэнкі міжнародных аналітычных цэнтраў памеру беларускага ВУП у разьліку на душу насельніцтва ў вялікай ступені пацьвярджаюць заявы афіцыйнай Лукашэнкавай прапаганды, якая не стамляецца выхваляцца перавагамі жыцьця ў Беларусі на фоне змрочнага досьведу рэформаў у суседзяў.

Апрача таго, паколькі роўнасьць у разьмеркаваньні даходаў была адной з мэтаў афіцыйнай палітыкі (каэфіцыент Джыні ў Беларусі ніжэйшы, чым у якой іншай зь пераходных краінаў), гэта дазволіла прадухіліць крайнюю галечу, пашырэньне якой магло б нанесьці шкоду рэжыму.

Кароткачасоваму посьпеху Лукашэнкавага праекту паспрыялі тры фактары. Першым стался багацейшая, чымся меркавалася, спадчына савецкай эканомікі, якая дазволіла амаль дзесяць гадоў эксплюатаваць асноўныя фонды без эканамічнага краху. Другім фактарам паслужыў спрыяльны зьбег вонкавых і ўнутраных абставінаў, якія забясьпечылі фінансаваньне пра-

**Табліца 15.** Узровень карупцыі і “адміністрацыйнага ўплыву” на дзяржаўныя органы

| | Карупцыя* | “Захоп дзяржавы”** | “Адміністрацыйны ўплыў”*** |
|---|---|---|---|
| Беларусь | 1,3 | 8 | 5 |
| Расія | 2,8 | 32 | 7 |
| Украіна | 4,4 | 32 | 14 |
| Малдова | 4,0 | 37 | 14 |
| Армэнія | 4,6 | 16 | 3 |
| Казахстан | 3,1 | 12 | 4 |
| Польшча | 1,6 | 12 | 3 |
| Вугоршчына | 1,7 | 7 | 3 |
| Чэхія | 2,5 | 11 | 8 |
| Славаччына | 2,5 | 24 | 4 |
| Эстонія | 1,6 | 24 | 11 |
| Латвія | 1,4 | 30 | 14 |
| Летува | 2,8 | 11 | 5 |
| Румынія | 3,2 | 21 | 9 |
| Баўгарыя | 2,1 | 28 | 8 |
| Альбанія | 4,0 | 16 | 4 |

* Зьмерана ў 2000 г. па сямібальнай шкале ад 0 да 6. Паказьнік 0 азначае, што кампаніяў, якія даюць хабар ураду дзеля атрыманьня палёгак, няма, 6 — што такіх кампаніяў больш за 25%.

** Працэнт фірмаў, якія плацяць грошы дзеля лабіяваньня заканадаўчых і нарматыўных актаў заканадаўцам і ўрадоўцам

*** Працэнт фірмаў, якія ўзьдзеюць на дзяржаўную палітыку, не даючы хабару. Мэтодыка падліку ўзята з працы: Joel S.Hellman, Geraint Jones, and Daniel Kaufmann, “Seize the State, Seize the Day: State Capture, Corruption, and Influence in Transition,” The World Bank Policy Research Working Paper No. 2444, September 2000.

екту звонку і мінімізавалі колькасьць пратэстаў з боку як найбольш абдзеленых групаў, так і грамадзтва ў цэлым у моманты, калі назапашаныя эканамічныя дыспрапорцыі выклікалі паніжэньне жыцьцёвага ўзроўню. Трэці фактар — характар палітычнага рэжыму ў краіне, які лепей за ўсё ахарактарызаваць як сыстэму неабмежаванай улады прэзыдэнта. Яе здольнасьць, з аднаго боку, манапалізаваць і паставіць пад кантроль збор “рэнты”, а з другога — як мінімум палову сабранага накіроўваць назад у эканоміку выразна кантрастуе зь нястрымнымі, бязладнымі й спарадычнымі паборамі нестабільных і слаба арганізаваных алігархічных груповак, якія паўсталі ў Расіі і Ўкраіне і, карыстаючыся словамі Ольсана, могуць быць названыя “разбойнікамі зь вялікай дарогі”[40]. Адносна нізкі ўзровень карупцыі, выкарыстаньня дзяржавы для прыкрыцьця ўласных камэрцыйных інтарэсаў і адміністрацыйных рэсурсаў для прамоцыі ўласнага бізнэсу — вось адметныя рысы беларускай сыстэмы, якія кідаюцца ў вочы і робяць яе значна больш эфэктыўнай у пляне захаваньня ўмоваў своеасаблівай “сацыяльнай дамовы”.

У цэлым, нягледзячы на інэрцыю афіцыйнай прапаганды, якая цьвердзіць пра ўнікальнасьць “беларускай мадэлі”, апошняя ня выпрацавала ўсебаковай і пасьлядоўнай эканамічнай стратэгіі. Цямкі эканамічны рост 1997—98 гг. быў часовай зьявай, якая ня мела ніякіх шанцаў існаваць доўга. Беларускія ўлады здолелі пазьбегнуць макраэканамічных дыспра-

**Табліца 16.** Асобныя эканамічныя паказьнікі. Беларусь, Расія і Ўкраіна, 1997—2001 гг., у % да папярэдняга году

| | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001* |
|---|---|---|---|---|---|
| ВУП | | | | | |
| Беларусь | 11,4 | 8,4 | 3,4 | 5,8 | 3,0 |
| Расія | 0,9 | -4,9 | 5,4 | 8,3 | 5,7 |
| Украіна | -3,2 | -1,7 | -0,2 | 5,8 | 9,3 |
| Узровень прамысловай вытворчасьці | | | | | |
| Беларусь | 18,4 | 12,4 | 10,2 | 8,0 | 4,6 |
| Расія | 2,0 | -5,0 | 8,0 | 9,0 | 5,2 |
| Украіна | -0,3 | -1,0 | 4,0 | 12,0 | 16,6 |
| Узровень сельскагаспадарчай вытворчасьці | | | | | |
| Беларусь | -4,9 | -0,7 | -8,3 | 9,3 | -1,5 |
| Расія | 2,0 | -13,0 | -1,0 | 7,0 | 7,1 |
| Украіна | -2,0 | -10,0 | -7,0 | 10,0 | 8,6 |
| Узровень інфляцыі | | | | | |
| Беларусь** | 19,6 | 24,0 | -8,2 | –13,4 | 0,4 |
| Расія (ІСЦ) | -5 | -12 | 5,0 | 17,0 | 8,0 |
| Украіна (ІСЦ) | -9 | 6,0 | 0,4 | 14 | 25,0 |

Крыніцы: Міждзяржаўны камітэт СНД па статыстыцы.
* студзень-верасень.
** Міністэрства статыстыкі і аналізу РБ.

[40] Mansur Olson. Power and Prosperity: Outgrowing Communist and Capitalist Dictatorships. New York: Basic Books, 2000.

порцыяў у памерах, якія б прывялі да новага выбуху гіпэрінфляцыі й краху эканомікі, часткова коштам выпраўленьня найбольш адыёзных уласных памылак. Галоўным доўгатэрміновым наступствам Лукашэнкавага экспэрымэнту, аднак, зьявілася тое, што спрыяльныя варункі другой паловы 1990-х гг. былі выкарыстаныя не для структурных рэформаў, а дзеля кансэрвацыі эканамічнай структуры, успадкаванай ад савецкай эпохі, і адцягваньня балючых пераходных працэсаў. Калі старая прамысловая база дасягне крайняй ступені сваёй зношанасьці, а вонкавыя эканамічныя і палітычныя абставіны перастануць быць спрыяльнымі, квазіпапулісцкі экспэрымэнт Лукашэнкі сутыкнецца з крызысам, які можа стаць пачаткам ягонага канца. Але пэрспэктыва эканамічнага краху выглядае ўсё ж малаімавернай у кароткатэрміновай пэрспэктыве: паляпшэньне становішча ў суседніх краінах, і перш за ўсё ў Расіі, удыхне новыя сілы ў беларускую эканоміку і можа нават забясьпечыць далейшы ейны рост за кошт пашырэньня экспарту. У той жа час Беларусь, хутчэй за ўсё, прысудзіла сябе на хранічнае адставаньне: яна ўжо страціла статус краіны з найбольш хуткім разьвіцьцём эканомікі ў былым СССР і з 2000 году перайшла ў групу дзяржаваў з найбольш павольным эканамічным ростам у рэгіёне; ейны ВУП за гэны год вырас на 5,8%, што на 2% менш, чымся ў сярэднім па СНД. На працягу першых трох кварталаў 2001 г. рост склаў усяго 3%, што было найніжэйшым паказьнікам на ўсёй постсавецкай прасторы. Зь зьяўленьнем "беларускага эканамічнага цуду" дзяржаўная статыстычная служба зрабіла завядзёнкай параўнаньне беларускіх паказьнікаў з расійскімі, каб прадэманстраваць перавагу афіцыйнага эканамічнага курсу. Цяпер, аднак, тую самую мэтодыку можна ўжыць для таго, каб паказаць "вузкія месцы" і патэнцыйныя недахопы стратэгіі ўхіленьня ад пераўтварэньняў. На працягу апошніх гадоў у Расіі й Украіне (краінах, якія афіцыйная прапаганда выкарыстоўвала ў якасьці пудзіла, каб дыскрэдытаваць ідэю рэформаў ў вачох грамадзтва) эканоміка разьвівалася больш пасьпяхова, чымся ў Беларусі. Імклівае павелічэньне ўзроўню вытворчасьці й прытоку інвэстыцыяў у гэтых краінах кантрастуе з прамысловым застоем і зьніжэньнем інвэстыцыяў у

**Табліца 17.** Папулярнасьць розных формаў уласнасьці, %

| Колькасьць тых, хто лічыць больш эфэктыўнай | Сьнеж 1993 | Ліст. 1994 | Чэрв. 1995 | Чэрв. 1996 | Чэрв. 1997 | Ліст. 1997 | Чэрв. 1999 | Ліст 1999 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| прыватную ўласнасьць | 52,8 | 45,9 | 41,8 | 42,5 | 48,3 | 41,4 | 50,7 | 53,3 |
| дзяржаўную ўласнасьць | 29 | 39,7 | 47,1 | 44,8 | 44 | 45,5 | 40,5 | 36,9 |

Крыніца: апытаньні НІСЭПД.

**Табліца 18.** Узровень падтрымкі рынкавай эканомікі, %

| Колькасьць тых, хто аддае перавагу... | Ліст 1994 | Чэрв 1995 | Чэрв 1996 | Чэрв. 1997 | Ліст 1997 | Вер 1998 | Сак 1999 | Чэрв. 1999 | Ліст. 1999 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| рынкавай эканоміцы | 51 | 52,1 | 53,8 | 65,4 | 69 | 74,6 | 67,4 | 73,1 | 72,2 |
| рынкавай эканоміцы зь невялікай роляй дзяржавы | | | | 30,4 | 32,8 | 35,2 | 39 | 36,8 | 40,5 |
| рынкавай эканоміцы зь пераважнай роляй дзяржавы | | | | 35 | 36,2 | 39,4 | 28,4 | 35,3 | 31,7 |
| камандавай эканоміцы | 46,2 | 45,1 | 44,2 | 30,5 | 25,7 | 22,8 | 23,9 | 24,7 | 24,8 |

Крыніца: апытаньні НІСЭПД.

Беларусі. Паколькі абедзьве дзяржавы-суседкі ўжо мінулі некаторыя балючыя стадыі трансфармацыйнага спаду і прамысловага абнаўленьня, застаецца мала надзеі на тое, што Беларусь зможа здагнаць іх у хуткім часе.

Ці азначае гэта, што ў Беларусі у хуткім часе настане постпапулісцкая эпоха? Ёсьць падставы меркаваць, што так. Па-першае, новыя геапалітычныя павевы (перш за ўсё нядаўняя лібэралізацыя эканамічнай палітыкі Расіі й канец “рамантычнага” пэрыяду ў расійска-беларускіх адносінах) пазбавіла ўлады надзеі на ўзнаўленьне ў ранейшым аб’ёме расійскага падсілкоўваньня беларускай эканомікі. Па-другое, узровень антырынкавых настрояў сярод шырокай грамадзкасьці за апошнія гады прыметна зьнізіўся.

Пытаньне, аднак, застаецца ў тым, ці здолее Лукашэнка замірыцца зь неабходнасьцю правядзеньня рынкавых рэформаў, бо гэта творыць пагрозу самой аснове ягонага палітычнага рэжыму. Цяпер за ўсялякія пераўтварэньні давядзецца заплаціць нават большую эканамічную і палітычную цану, чым дзесяцігодзьдзе таму. Разам з тым абставіны, што склаліся апошнім часам, робяць немагчымым вяртаньне да папулісцкіх экспэрымэнтаў, ува ўсякім разе такіх маштабных, як раней. Адсутнасьць канкурэнцыі на ўнутранай палітычнай арэне, магчыма, зьнізіць палітычны кошт рэформаў для прэзыдэнта, але цалкам прадухіліць страты ня ўдасца. Аблога з усіх бакоў расійскімі алігархамі можа пакінуць Лукашэнку вельмі абмежаваную свабоду дзеяньняў. У кожным выпадку ён можа страціць магчымасьць выконваць умовы “сацыяльнай дамовы” і заваёўваць падтрымку папулісцкімі сродкамі. Больш за тое, ня змогуць зрабіцца выйсьцем для Лукашэнкі і частковыя рэформы, бо яны толькі паглыбяць эканамічны застой і ня створаць мэханізмаў далейшага разьвіцьця. Пры такім сцэнары тыя, хто падтрымлівае прэзыдэнта, баючыся зьменаў і анархіі, паступова адыдуць ад яго. Калі гэта здарыцца, Лукашэнка зможа захаваць уладу толькі шляхам павелічэньня жорсткасьці рэжыму. Кволую лібэралізацыю ў гэтым выпадку цалкам можа зьмяніць павелічэньне палітычных рэпрэсіяў.

# ПАЛІТЫЧНАЯ ЭКАНОМІЯ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ*

Лукашэнкава настойлівасьць у інтэграцыі з Расіяй і ягонае імкненьне аднавіць палітычны саюз паставецкіх дзяржаваў разглядаліся некаторымі назіральнікамі як частка яго "двайнога праекту" па канцэнтрацыі ўлады ў сваёй краіне і адначасовай здачы яе Расіі[1].

Спробы *структурна растлумачыць* гэты фэномэн абапіраліся на цесную эканамічную і вайсковую інтэграцыю паміж Беларусяй і Расіяй: Беларусь залежыць ад энэргетычных рэсурсаў Расіі, прывязана да яе ўнутранага рынку, на якім толькі і можа прадаваць свае неканкурэнтаздольныя тавары, а расійскія ваенныя і геапалітычныя стратэгі нязьменна ўключаюць Беларусь у кола сваіх інтарэсаў.

*Культурныя вытлумачэньні* завастралі ўвагу на этнічнай, культурнай і моўнай блізіні беларусаў і расійцаў, што ўзмацнялася працяглай русіфікацыяй Беларусі, панаваньнем расійскай праваслаўнай царквы пры адсутнасьці сапраўды нацыянальнай канфэсіі, слабасьцю нацыянальнага руху і пранезалежніцкіх настрояў сярод беларускага грамадзтва, а таксама забыцьцём трагічных старонак узаемаадносінаў двух народаў.

Былі і *спасылкі на савецкую спадчыну*. Паводле словаў аднаго вядучага польскага інтэлектуала, "Лукашэнка — гэта не расійская марыянэтка, а савецкая лялька"[2].

Націск на асаблівую ролю савецкай спадчыны й культурнай блізіні з Расіяй, якімі тлумачыўся "недахоп нацыяналізму", спрыяў замацаваньню гэтых момантаў у якасьці першапрычынаў правалу дэмакратызацыі ў Беларусі. Адсутнасьць адчуваньня еднасьці й асаблівай супольнай ідэнтычнасьці, згодна зь імі, перашкодзіла ўтварэньню як згуртаванай нацыі, так і моцнай нацыянальнай дзяржавы. Таму параза дэмакратыі й страта мёртванароджанай незалежнасьці былі, з гэтага пункту гледжаньня, лягічныя і ўзаемна абумоўленыя.

Аргумэнтаў структурнага і культурнага пляну, аднак, недастаткова, каб адказаць на пытаньне, чаму інтэграцыйная палітыка спарадзіла ў вялікай ступені фармальны саюз дзьвюх краін і, больш за тое, тармазілася Лукашэнкам кожны раз, калі рабілася магчымым канчатковае аб'яднаньне. Апроч таго, зьвязваць няўдачу дэмакратызацыі на пачатку дзевяностых з "расійскасьцю" беларусаў — значыць уводзіць сябе ў зман, хаця відавочна, што Беларусь вымушана прыстасоўвацца да больш плюралістычнай палітычнай і эканамічнай сыстэмы Расіі, падобна да таго як гэта рабіла НДР перад аб'яднаньнем Нямеччыны. Такое разуменьне беларуска-расійскай інтэграцыі пакідае нас у недаўменьні, чаму Лукашэнка, насуперак сваім інтэграцыйным памкненьням, часьцей і ахватней заяўляе пра сябе як пра будаўніка нацыянальнай дзяржавы, чым пра палітыка, першаступеннай місіяй якога ёсьць выпраўленьне гістарычнай памылкі, дапушчанай у Белавескай пушчы ў сьнежні 1991-га, чаму ён заяўляе, што "сувэрэнітэт і незалежнасьць Беларускай дзяржавы — сьвятыя тэрміны для кожнага грамадзяніна"[3]. Аргумэнт "савецкай спадчыны" ў гэтым выпадку аспрэчваецца простым фактам: пра-

* Артыкул быў напісаны на ангельскай мове для часопіса "Ab Imperio" (Казань, Расея). З ангельскай мовы пераклад зрабіў Сяргей Петрыкевіч. Аўтар выказвае падзяку *Central European University, Special and Extention Programs* за падтрымку, якая зрабіла магчымым напісаньне гэтай працы.

[1] Simonsen Sven Gunnar, Belarus, www.prio.no/publications/reports/osce/osce-belarus.asp

[2] Gazeta Wyborcza. 1996. № 279.

[3] Советская Белоруссия. 1999. 5 января.

ект рэстаўрацыі Савецкага Саюзу ад пачатку быў асуджаны на няўдачу дзеля велізарнага адрозьненьня палітычных і эканамічных сыстэмаў дзьвюх краін і той акалічнасьці, што Расія, непазьбежны стрыжань новага альянсу, занадта зьмянілася, каб весьці свае колішнія "рэспублікі-сёстры" назад у мінулае. Дый якім чынам дэкляраваная адмова ад нацыянальнай незалежнасьці і сувэрэнітэту магла спалучацца з умацаваньнем у Беларусі аўтарытарнай сыстэмы кіраваньня? Якім чынам працэс інтэграцыі мог адбывацца паміж краінамі з розным палітычным і эканамічным ладам?

Я мяркую, што структурныя і культурныя чыньнікі, акрэсьленыя ў дасьледаваньнях на тэму беларуска-расійскіх адносінаў, адыгрывалі істотную ролю ў фармаваньні дынамікі беларуска-расійскіх дачыненьняў на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя. Гэтыя чыньнікі, аднак, не спрацоўваюць пры вызначэньні найважнейшай рухальнай сілы інтэграцыйнага працэсу. Асноўная мэта гэтай публікацыі — даць апісаньне беларуска-расійскай інтэграцыі як адной з формаў стратэгіі прэзыдэнта Лукашэнкі па канцэнтрацыі ўлады. У гэтым разрэзе адносіны паміж Беларусяй і Расіяй былі часткай унікальнага Лукашэнкавага праекту па стварэньні ў сваёй краіне сыстэмы неабмежаванай улады і ейнай стабілізацыі. Прынамсі ў пачатковы пэрыяд ход і ўмовы беларуска-расійскай інтэграцыі не навязваліся Лукашэнку, а ўстанаўляліся ім. Магчымасьць вызначэньня ўмоваў беларуска-расійскага ўзьяднаньня забясьпечыла беларускаму прэзыдэнту:

— гарантаваную падтрымку расійскіх палітычных і эканамічных элітаў у ягонай барацьбе за ўладу;

— істотныя эканамічныя польгі з боку Расіі, якія спрыялі адноснаму посьпеху Лукашэнкавай эканамічнай мадэлі і дазволілі не дапусьціць больш-менш значнай унутранай дэстабілізацыі і народнага нездавальненьня ягонай палітыкай;

— мінімізацыю вынікаў міжнароднай ізаляцыі праз пабудову "альтэрнатыўнай" сыстэмы міжнародных стасункаў у абход эўрапейскіх інстытутаў;

— нарэшце, становішча, няхай часовае, уплывовага незалежнага гульца на расійскім палітычным полі.

Разглядаючы адносіны паміж дзьвюма краінамі вылучна як палітычны праект, я адкідаю два процілеглыя пункты гледжаньня, адзін зь якіх сьцьвярджае, што інтэграцыяператварыла Беларусь у "частку Расіі ўва ўсім, апрача назвы"[4], а другі настойвае на тым, што аб'яднаньне вылілася ўва ўтварэньне нейкай віртуальнай канструкцыі. Насупраць, гэты працэс і яго вынікі моцна залежалі ад суладнасьці паміж Лукашэнкавымі амбіцыямі ў дачыненьні як да Беларусі, так і да Расіі з аднаго боку і поступам расійскай унутранай і вонкавай палітыкі — з другога.

## Інтэграцыя за Кебічам і Шушкевічам

Замежная палітыка Беларусі пасьля атрыманьня незалежнасьці, у тым ліку і яе адносіны з Расіяй, вызначалася інтарэсамі і ўяўленьнямі пануючых элітаў, якія ажыцьцяўлялі кантроль над палітычным працэсам. Крах камуністычнай партыі ў жніўні 1991 г. перадаў уладу ў рукі ўраду і Вярхоўнаму Савету, у якім пераважалі прадстаўнікі партыйна-савецкай намэнкляту-

[4] Huntington Samuel. The Clash of Civilizations and the Remaking of World Order. London. Touchstone Books, 1998. P.164.

ры ды кіраўнікі дзяржаўных прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Ні першыя, ні другія не былі гатовыя да кіраваньня незалежнай краінай, дый не адчувалі захапленьня ад такой пэрспэктывы. Беларусь у колішнім СССР выконвала ролю "зборачнага цэху", для якога ўвесь Саюз, і ў першую чаргу Расія, быў свайго роду сыравінным прыдаткам. Беларусь, у якой жыло 3,5% насельніцтва СССР, вырабляла 4,2% яго ВУП, апярэджваючы ў гэтых суадносінах усе астатнія рэспублікі. Каля 50% беларускіх прадпрыемстваў знаходзіліся пад юрысдыкцыяй саюзных (разьмешчаных у Маскве) міністэрстваў, і больш за палову індустрыяльнай прадукцыі Беларусі даваў ваенна-прамысловы комплекс. Рэальнае значэньне Беларусі ў параўнаньні зь іншымі рэспублікамі насілу паддавалася ацэнцы. Такое становішча забясьпечвала дадатны гандлёвы баланс ува ўнутрысаюзным гандлі (што давала нагоду беларускай апазыцыі для заяваў наконт эксплюатацыі Беларусі саюзным цэнтрам), які, аднак, у вялікай ступені быў вынікам заганнай цэнавай палітыкі, што спрыяла перавытворчасьці гатовай прадукцыі. Праз усё гэта Беларусь за саветамі, можна лічыць, атрымлівала выгаду ад выдаткаў каманднай эканомікі*. І няма дзіва, што ў пазьнейшыя часы ўрадоўцы і прамысловыя лабісты бачылі ў захаваньні статусу-кво альтэрнатыву рэфармаваньню нацыянальнай эканамічнай сыстэмы. Таму Беларусь падпісала дамову аб эканамічным саюзе ў кастрычніку 1991 году і рыхтавалася да падпісаньня новай саюзнай дамовы ў лістападзе 1991-га, ня робячы пры гэтым ніякіх спробаў увесьці ўласную валюту, паколькі гэты крок мог прывесьці да спыненьня паставак танных энэрганосьбітаў з Расіі. І калі Савецкі Саюз распаўся насуперак волі беларускай эліты (хоць і пры ўдзеле яе тагачасных лідэраў, якія памылкова прынялі СНД за новую форму саюзу), урад Кебіча па інэрцыі працягваў праводзіць старую эканамічную палітыку, канцэптуальна распрацаваную яшчэ ўвосень 1990-га.

Найважнейшым крокам у вонкавай палітыцы, зьдзейсьненым адразу пасьля распаду СССР, было прынятае Шушкевічам і Кебічам рашэньне ўстрымацца ад удзелу ў Дамове аб калектыўнай бясьпецы краінаў СНД, падпісанай у Ташкенце ў красавіку 1992 году. Гэты крок быў абумоўлены палажэньнем Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце 1990 г., якое абвяшчала пра імкненьне Беларусі да нэўтральнага і бязьядравага статусу. У той час ён быў амаль не заўважаны расійскімі палітычнымі элітамі, для якіх была больш актуальнай барацьба за ўладу паміж ельцынскім урадам і ўсё больш актыўнай пракамуністычнай бальшынёй у Вярхоўным Савеце. Абвяшчэньне Беларусяй нэўтральнага статусу было, такім чынам, пабочным прадуктам постперабудовачнай інэрцыйнай палітыкі і ў сапраўднасьці ніколі не ўспрымалася ўсур'ёз "партыяй улады".

Ключавым інтарэсам Кебіча і ягоных прыхільнікаў у парлямэнце ў той час было захаваньне адзінай рублёвай зоны і ранейшых умоваў гандлю з Расіяй, якія пратрымаліся амаль да другой паловы 1993 году. Адзіная рублёвая зона пакідала Цэнтральнаму банку Расіі статус манапаліста ў сфэры грашовай эмісіі, але дазваляла і цэнтральным (нацыянальным) банкам іншых рэспублік выдаваць крэдыты для прадпрыемстваў альбо для пакрыцьця бюджэтнага дэфіцыту, г.зн. ствараць "пустыя рублі". Расійскі Цэнтрабанк фактычна вымушаны быў цыраваць дзіркі ў бюджэтах рэспублік праз друкаваньне тых рублёў. Беларусь пакрыла такімі трансфэртамі 13% свайго ВУП у 1992-ім і 8% ВУП за сем месяцаў 1993 году, аж пакуль

* Я ня маю намеру дэталёва раскрываць тут сутнасьць гэтых сукрытых выдаткаў, марнуючы час на разгляд недасканалай у параўнаньні з рынкам эканамічнай мадэлі, якая была навязана Беларусі, як і іншым камуністычным краінам.

рублёвая зона не спыніла свайго існаваньня. Варта нагадаць, што рублі, якія выпускаліся ў абарачэньне, напрыклад, у Беларусі, мелі такую ж вартасьць у Расіі ці Казахстане. Дзякуючы гэтаму ўрады і нацыянальныя банкі невялікіх постсавецкіх рэспублік маглі не зважаць на бескантрольную эмісію супольных рублёў, паколькі інфляцыйныя эфэкты "расьцярушваліся" па ўсёй постсавецкай прасторы. У адрозьненьне ад Украіны, якая выйшла з рублёвай зоны ў 1992 годзе, Беларусь карысталася яе перавагамі амаль на восем месяцаў даўжэй. Апроч таго, каб кампэнсаваць дэфіцыт расійскіх наяўных грошай, які ўзьнік у выніку новай грашова-крэдытнай палітыкі Расіі, пачатай у першай палове 1992 году, Беларусь увяла сваю ўласную сурагатную валюту — беларускі рубель, вядомы як "зайчык", які першапачаткова канвэртаваўся да расійскага ў суадносінах 1:1. Статус "вольнага пасажыра" даў беларускаму ўраду магчымасьць надрукаваць дастаткова грошай для таго, каб выплаціць заробкі і крэдытаваць дзяржаўныя прадпрыемствы ды калгасы, пры гэтым церпячы толькі частку інфляцыйных выдаткаў.

Яшчэ адным першаступенным Кебічавым заданьнем у той час было забясьпечыць пастаўку расійскай нафты і газу па цэнах расійскага ўнутранага рынку. Гэта выратавала б беларускую эканоміку ад спаду вытворчасьці й гіпэрінфляцыі, якія тады ж напаткалі Украіну (хоць тагачасная эканамічная палітыка дзьвюх краін была амаль ідэнтычная), падоўжыла б палітычнае жыцьцё беларускай "партыі ўлады", цешачы яе надзеямі на мажлівасьць пазьбегнуць у найбліжэйшай будучыні буйных эканамічных рэформаў.

Маючы безахвоцьце да дзяржаўнага будаўніцтва, але затое вялікія палітычныя амбіцыі, якія палягалі ня толькі ў захаваньні статусу-кво, "партыя ўлады" была гатова заплаціць пэўную палітычную цану за фінансавыя саступкі. Ужо ў верасьні 1992 году Кебіч падпісаў дамову аб вайсковым супрацоўніцтве з Расіяй, якая падоўжыла тэрмін знаходжаньня расійскіх войскаў на тэрыторыі Беларусі да 2000 году. У сакавіку 1993-га беларускі ўрад прыняў рашэньне адмовіцца ад нэўтральнага статусу Беларусі і далучыцца да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы краінаў СНД пры ўмове, што Расія будзе працягваць пастаўкі танных энэрганосьбітаў. Мяркуючы, што прывілеяванае становішча ў рублёвай зоне і забесьпячэньне таннымі энэргарэсурсамі могуць трываць вечна, Кебічаў урад у верасьні 1993-га без ваганьняў падпісаў папярэдняе пагадненьне аб аднаўленьні рублёвай зоны з Расіяй, якое прадугледжвала паўторнае ўвядзеньне расійскага рубля ў якасьці адзінага плацежнага сродку, выкананьне Расіяй абавязаньняў па пастаўцы ў Беларусь танных энэргарэсурсаў і дэкляравала раўнапраўны ўдзел дзьвюх краінаў у выпрацоўцы манэтарнай палітыкі. Кебіч абяцаў, што, як толькі грашовы саюз будзе ўкладзены, кошт нафты для беларускіх спажыўцоў адразу ўпадзе з васьмідзесяці да пяцьдзесят пяці даляраў ЗША за тону[5].

Мэханізм аб'яднаньня грашовых сыстэмаў прапаноўваўся амаль што нерэальны. Умова, якая прадугледжвала абмен беларускіх рублёў на расійскія па курсе 1:1, не магла быць выканана з той простай прычыны, што пасьля ліпеня 1993-га ўзровень інфляцыі ў Беларусі быў у некалькі разоў большы, чым у Расіі, дзе прыкладаліся куды больш сур'ёзныя намаганьні для стрымліваньня росту грашовай масы. Зрабілася ясна, што пагадненьне служыць перш за ўсё палітычным мэтам Кебіча, якому заманулася стаць прэзыдэнтам Беларусі, дарма што гэтая пасада яшчэ нават не была зацьверджаная парлямэнтам.

Існавалі дзьве эканамічныя й палітычныя канцэпцыі, якія падагравалі антысаюзныя на-

[5] Народная газета. 1994. 8 января.

строі як у Беларусі, так і ў Расіі. У Беларусі прынцыповым апанэнтам Кебічавага праекту па аб'яднаньні грашовых сыстэмаў выступаў БНФ, які тады быў вядучым апазыцыйным рухам і які настойліва заяўляў, што адмова ад нацыянальнай валюты ў сукупнасьці з распродажам найбольш каштоўнай дзяржаўнай маёмасьці расійскаму капіталу і каапэрацыяй з Расіяй у вайсковай сфэры цалкам пазбавіць Беларусь нованабытай незалежнасьці. У той жа час Шушкевіч пярэчыў толькі супраць адмаўленьня ад нэўтралітэту, але ўхваляў грашовы саюз пры ўмове, што той будзе заснаваны на раўнапраўнасьці Беларусі і Расіі ў вызначэньні манэтарнай палітыкі ўнутры рублёвай зоны. У Расіі аднымі зь першых супраць расійска-беларускай інтэграцыі выступілі лібэральныя рэфарматары ельцынскага кабінэту. Найбольш значнымі постацямі ў ім былі Ягор Гайдар, які вярнуўся ўва ўрад у верасьні 1993-га пасьля паўгадавога адыходу ад палітычнай дзейнасьці, Анатоль Чубайс, "архітэктар расійскай прыватызацыі" зь беларускімі каранямі, і Барыс Фёдараў, тагачасны віцэ-прэм'ер і міністар фінансаў. Асноўным довадам лібэралаў супраць ідэі грашовага саюзу была Кебічава непрыхільнасьць да рынкавых рэформаў. Гэта, сьцьвярджалі яны, пагражала змарнаваць намаганьні, прыкладзеныя імі для фінансавай стабілізацыі ў Расіі, паколькі пагадненьне аб рублёвай зоне нельга было ўкласьці, не запусьціўшы зноў друкарскага станка, дзеля таго каб забясьпечыць дзяржаўны сэктар беларускай эканомікі льготнымі крэдытамі. Апроч таго, лібэралы мелі ў запасе і другі аргумэнт, які ў той час нават з большым посьпехам мог паўплываць на расійскага прэзыдэнта. Сустракаючы моцнае процідзеяньне сваім інтэграцыйным прапановам у Крамлі, Кебіч пачаў рабіць стаўку на парлямэнцкага сьпікера Руслана Хасбулатава — лідэра кааліцыі камуністычных ды нацыяналістычных партыяў, што ўтварылася ў Зьезьдзе народных дэпутатаў. Знамянальна, што Хасбулатаў езьдзіў у Менск на перамовіны з Кебічам у сакавіку 1993-га, калі Ельцын абвясьціў пра сваё рашэньне распусьціць Зьезд. У Менску ён заявіў пра пачатую супраць Ельцына працэдуру імпічмэнту, якая ў канчатковым выніку правалілася. І хоць Кебіч застаўся на баку лідэраў краінаў СНД, якія на менскім саміце ў красавіку, напярэдадні расійскага рэфэрэндуму аб даверы прэзыдэнту, пастанавілі падтрымаць Ельцына, ягоны флірт з расійскай апазыцыяй працягваўся. Праз некалькі месяцаў на ягоныя запросіны Беларусь наведала група палітыкаў і эканамістаў — прыхільнікаў Хасбулатава, каб перасьцерагчы тутэйшую публіку наконт згубнасьці эканамічнай праграмы Ельцына і давесьці неабходнасьць ейнага згарненьня. Нават пасьля таго як Ельцын атрымаў падтрымку сваёй палітыкі на рэфэрэндуме, рэгулярныя кантакты паміж беларускімі дэпутатамі, якія падтрымлівалі Кебіча, і прыхільнікамі Хасбулатава працягваліся ўсё лета 1993 году. У адну з дэлегацыяў, пасланых Кебічам у расійскі парлямэнт з мэтай дамовіцца пра зьніжэньне цэн на энэрганосьбіты і ануляваньне беларускай запазычанасьці за газ і нафту, увайшоў і тады яшчэ малавядомы дэпутат Аляксандар Лукашэнка. Стала відавочна, што Кебіч, імкнучыся захаваць свой эканамічны курс і палітычнае дамінаваньне "партыі ўлады", паставіў на зьмену крамлёўскага атачэньня. У такім кантэксьце сабатаваньне дамовы аб грашовым саюзе зрабілася для ельцынскіх рэфарматараў часткай буйнамаштабнай барацьбы за працяг рэформаў у Расіі. Пасьля роспуску Зьезду і здушэньня кастрычніцкага антыельцынскага мяцяжу крамлёўскія лібэралы атрымалі, здавалася, усю паўніню ўлады, і пэрспэктывы грашовага ці якога-небудзь іншага саюзу зь Беларусяй выглядалі пахаванымі назаўсёды. Двума месяцамі пазьней, аднак, посьпех нацыяналістаў і камуністаў на выбарах у Думу палічыў дні каманды Гайдара (на наступны дзень пасьля галасаваньня ў Расіі Лукашэнкаў антыкарупцыйны даклад незваротна памяняў расстаноўку сілаў на палітычнай арэне і ў Беларусі). На

працягу месяца пераважная яе частка была заменена прадстаўнікамі “старой гвардыі”, якія значна прыхільней ставіліся да прапановаў Кебіча наконт саюзу і, што немалаважна, падзялялі ягоную перакананасьць наконт спрыяльнага ўплыву грашовай эмісіі на ажыўленьне нацыянальнай эканомікі. Зьнікненьне крамлёўскай падтрымкі рэфарматарскіх сілаў у Беларусі, відавочна, вырашыла лёс Станіслава Шушкевіча, аднаго зь нямногіх праціўнікаў інтэграцыі сярод беларускага кіраўніцтва, які быў зьняты з сваёй пасады 26 студзеня 1994 году. “The Economist” адрэагаваў на ягоную адстаўку артыкулам “Забудзьцеся пра Belo” (маючы на ўвазе *Belorussia*, ангельскую трансьлітарацыю назвы краіны, прынятую за савецкім часам, другая частка якой была ідэнтычная назьве Расіі ў ангельскім напісаньні).

У цэлым ідэя грашовага саюзу, гэтак жа як і адносіны з Расіяй, эксплюатавалася ў эпоху Кебіча “кансэрватыўнай” беларускай намэнклятурай, якая ўзяла ў свае рукі ўсе вагары ўплыву і ўмела ўжывала іх для абароны ўласных інтарэсаў. Гэтая ашуканская палітыка была заснаваная на выкарыстаньні патэрналісцкіх настрояў насельніцтва, якое кармілі невыканальнымі абяцанкамі “таннага паліва” і “аднаўленьня гаспадарчых сувязяў”[6]. Лукашэнка працягваў гэтую ж палітыку — але зь іншым імпэтам і амбіцыямі.

## Выбарчая кампанія: інтэграцыйная карта

Несумненна, спадзяванае ўкладаньне грашовага саюзу было галоўным матывам Кебічавага рашэньня перапыніць амаль гадавы палітычны зацішак і распачаць у Беларусі першую постсавецкую выбарчую кампанію. Больш за тое, паколькі ўвядзеньне расійскага рубля амаль гарантавала хуткае вырашэньне бягучых эканамічных праблемаў краіны, ён настояў на ўвядзеньні інстытуту прэзыдэнцтва шляхам фарсаванага прыняцьця новай Канстытуцыі 15 сакавіка 1994 году. Тады ж абвешчаныя выбары задумваліся як “бліцкрыг”, трыюмф Кебіча, забясьпечаны цудадзейным эканамічным паляпшэньнем, якое павінен быў прынесьці з сабой грашовы саюз. Аднак былі дзьве перашкоды такому бездакорнаму, на першы погляд, пляну. Па-першае, з боку расійскага кіраўніцтва не было цьвёрдых абавязаньняў укласьці саюз цягам найбліжэйшых тыдняў. Сапраўды, безьліч праблемаў юрыдычнага і тэхнічнага характару, выяўленых падчас абмеркаваньня дэталяў будучай дамовы, — ад неабходнасьці ўнясеньня зьменаў у новапрынятую беларускую канстытуцыю, якая забараняла замену нацыянальнай валюты якім-небудзь іншым плацежным сродкам, да небясьпекі зрыву выкананьня бюджэту і страты канкурэнтаздольнасьці беларускіх тавараў на вонкавых рынках — засьведчыла, што аб’яднаньне грашовых сыстэмаў простае на словах, але неймаверна складанае на справе. Дый інтэграцыйны імпэт расійцаў, калі ня браць пад увагу афіцыйных заяваў і пратаколаў аб намерах, быў больш чым сумнеўны. Ні расійскі ўрад, ні Цэнтральны банк не праяўлялі ахвоты выконваць неакрэсьленыя абавязаньні, якія пагражалі цяжкапрадказальнымі вынікамі для расійскай эканомікі. За некалькі тыдняў грашовы саюз ператварыўся ў эфэмэрную пэрспэктыву, адзіным заданьнем якой было заставацца праўдападобнай, пакуль трывае выбарчая кампанія. Успомнім, як Кебіч прасіў у расійцаў два вагоны расійскіх рублёў, каб потым іх аддаць пасьля выбараў[7]. Аднак у той час, калі інфляцыя ў Беларусі дасягала

[6] Труд. 21 января. 1994.
[7] Имя. 1998. 6 февраля.

адзнакі 45% у месяц, адных такіх абяцаньняў для посьпеху Кебічавай выбарчай кампаніі было недастаткова.

Другой перашкодай быў Лукашэнка, чыя кампанія набірала абароты ашаламляльнымі тэмпамі. Ён здолеў нэўтралізаваць выбарчую стратэгію Кебіча двума манэўрамі. Па-першае, ён пераключыў увагу грамадзтва з расійска-беларускіх грашовых адносінаў на распачатую ім барацьбу з карупцыяй. Увага да самога Лукашэнкі была падагрэтая замахам, быццам бы зьдзейсьненым на яго ў пачатку чэрвеня, і новымі абвінавачаньнямі ў адрас вышэйшых урадоўцаў (так, Лукашэнка абвінаваціў новага парлямэнцкага сьпікера ў спрыяньні беларускай мафіі). Па-другое, ён заявіў, што дамова аб грашовым саюзе, падпісаная Кебічам у красавіку 1994 году, шкодзіць інтарэсам Беларусі, і паабяцаў вярнуцца да леташняга верасьнёўскага пагадненьня, заснаванага на формуле “адна валюта — два нацыянальныя банкі”. У адрозьненьне ад нацыяналістаў, Лукашэнка выступаў супраць ураду, не адкідваючы ягоных плянаў, а абяцаючы ажыцьцявіць іх на больш выгадных для Беларусі ўмовах. За два тыдні да выбараў Кебічава казырная карта была пабіта.

## Першыя крокі Лукашэнкі: ад прыціркі на новай пасадзе да інтэграцыйнай гонкі

Расійскае кіраўніцтва прызналася ў афіцыйнай падтрымцы Крамлём Кебіча толькі пасьля абвяшчэньня Лукашэнкі пераможцам на прэзыдэнцкіх выбарах. Адразу пасьля інаўгурацыі прэм’ер-міністар Віктар Чарнамырдзін і ягоны намесьнік Аляксандар Шохін заявілі, што дамова аб грашовым саюзе была падпісаная ў сьвятле чаканага выбраньня Кебіча прэзыдэнтам Беларусі і наступнага за гэтым зьліцьця дзьвюх краінаў. Перамогу Лукашэнкі ў Крамлі прынялі з пэўным безахвоцьцем, паколькі за ім ужо пасьпеў замацавацца імідж адзінокага і непрадказальнага дзівака. Праз гэта ніякай новай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі й яе новага лідэра адразу пасьля выбараў выпрацавана не было. Што да Лукашэнкі, дык ён цяпер вымушаны быў кіраваць краінай без расійскай дапамогі. Сутыкнуўшыся з гэтым, ён неўпрыкмет зьменшыў сваю інтэграцыйную рыторыку і ў першай прамове пасьля інаўгурацыі ўрачыста паабяцаў умацоўваць сувэрэнітэт Беларусі. Настаў пэрыяд Лукашэнкавых ваганьняў і сумненьняў.

Кульмінацыяй у пахаладаньні адносінаў Масквы і Менску стала адкрытае сутыкненьне паміж Ельцыным і Лукашэнкам у кастрычніку 1994-га, калі Ельцын, яўна наперакор Лукашэнку, прапанаваў Кебічу ўзначаліць нядаўна заснаваны Міждзяржаўны эканамічны камітэт краінаў СНД і перанесьці сталіцу Садружнасьці зь Менску ў Маскву. І хоць Лукашэнка здолеў заблякаваць абедзьве ініцыятывы, нацягнутасьць адносінаў была відавочнай нават для старонньяга вока.

Зіма 1994—95 гг. сталася для Лукашэнкі надзвычай сур’ёзным выпрабаваньнем. Ён вымушаны быў даваць рады нарастаючай гіпэрінфляцыі, перамагчы якую было нельга без адмовы ад сваіх перадвыбарных абяцаньняў трымаць пад кантролем цэны. Працяг эканамічнага спаду падарваў Лукашэнкаву папулярнасьць, і ягоны рэйтынг зьнізіўся больш чым напалову ў параўнаньні зь летам, што пагражала перамогай БНФ на блізкіх парлямэнцкіх выбарах. Тым часам завяршыўся “пэрыяд ста дзён”, адведзеных апазыцыяй новаму прэзыдэнту

ў якасьці выпрабавальнага тэрміну. Роўна праз год пасьля таго, як Лукашэнка антыкарупцыйным дакладам распачаў свой крыжовы паход па ўладу, фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце разгарнула ўласную атаку, ужыўшы ў якасьці галоўнай палітычнай зброі той самы інструмэнт. Апазыцыйны дэпутат Сяргей Антончык выступіў з прамовай, у якой абвінаваціў першых асобаў Лукашэнкавага атачэньня ў дачыненьні да карупцыі. Рэзананс ад гэтай акцыі быў павялічаны зьяўленьнем белых плямаў у дзяржаўных газэтах, якія паспрабавалі былі апублікаваць тэкст выступу. За чатыры месяцы да парлямэнцкіх выбараў Лукашэнка быў вымушаны абараняцца.

На фоне такога аслабленьня сваіх пазыцыяў у краіне ён хапатліва павярнуўся ў бок Расіі, шукаючы там палітычнай ды эканамічнай падтрымкі, няхай сабе і сымбалічнай. Гэты крок быў прадыктаваны імкненьнем прадухіліць перамогу апазыцыі на майскіх выбарах, зрушыўшы акцэнты будучай агітацыйнай кампаніі зь бягучых эканамічных справаў і асабістых дасягненьняў Лукашэнкі як прэзыдэнта на пытаньні, больш прыцягальныя для пераважнай часткі ягонага электарату — пэнсіянэраў, вяскоўцаў і жыхароў Усходняй Беларусі. Так больш чым праз паўгоду ідэя інтэграцыі з Расіяй і аднаўленьня Савецкага Саюзу выплыла з туману і зноў запанавала на беларускай палітычнай арэне. 2 лютага 1995 году на пасяджэньні Саюзу вэтэранаў Лукашэнка паведаміў пра свой намер правесьці рэфэрэндум у наступных пытаньнях:

— увядзеньне ў Беларусі расійскай мовы ў якасьці другой дзяржаўнай;

— замена нацыянальных герба і сьцяга, якія Лукашэнка і камуністы лічылі сымбалямі калябарантаў часоў Вялікай Айчыннай вайны;

— прыпыненьне прыватызацыі;

— ухваленьне палітыкі “шырокай” інтэграцыі з Расійскай Фэдэрацыяй.

Ухваленьне гэтых прапановаў прывяло да крызысу дэмакратычную апазыцыю, паколькі адмаўляла яе найістотнейшыя постперабудовачныя дасягненьні — угрунтаваную на нацыянальных сымбалях і беларусізацыі ўсяго грамадзтва незалежнасьць. Апроч таго, гэта паскорыла ўсталяваньне гегемоніі Лукашэнкі ў палітычнай і ідэалягічнай сфэры: нацыянальны патрыятызм у якасьці ідэалягічнай дамінанты цяпер саступаў месца “савецкаму кансэрватызму”, а бальшыня дзеячоў дэмакратычнай апазыцыі адсоўвалася на ўзбочыну палітычнага жыцьця. Калі гаварыць па сутнасьці, рэфэрэндум прадэманстраваў павярхоўнасьць беларускага нацыянальнага адраджэньня пачатку дзевяностых гадоў XX ст., а таксама малую прыцягальнасьць палітычнай плятформы ў вэрсіі Пазьняка. Паколькі нацыяналізм аказаўся няздольны запоўніць ідэалягічны вакуум, стаўка на звыклы сьветапогляд выявілася эфэктыўным палітычным манэўрам. Ён ня толькі дапамог умацаваць унутраны ўплыў Лукашэнкі як абаронцы палітычных традыцый, які апэлюе да бальшыні грамадзтва, але і спрыяў раскручваньню прапагандысцкай шуміхі, што заблякавала выбраньне кандыдатаў ад БНФ у новы парлямэнт.

Паралельна Лукашэнка пераадолеў канфлікты з Крамлём, што награмадзіліся ў першыя месяцы ягонага прэзыдэнцтва, зрабіўшы Маскве некалькі шчодрых інтэграцыйных прапановаў, ад якіх тая не змагла адмовіцца. У верасьні прэзыдэнт Ельцын наведаў зь візытам Менск, каб падпісаць зь Беларусяй Дамову аб дружбе і супрацоўніцтве. Згодна зь ёй, Расія захоўвала сваю вайсковую прысутнасьць на тэрыторыі Беларусі да 2010 году і атрымлівала доступ да сродкаў беларускай супрацьпаветранай абароны; паміж дзьвюма краінамі ўкладаўся мытны саюз; паўночна-заходняя мяжа Беларусі фактычна ператваралася ў вайсковую і часткова

мытную граніцу Расійскай Фэдэрацыі, паколькі ўводзілася сумесная ахова межаў і сумесны мытны кантроль; Беларусь выказвала гатоўнасьць забясьпечыць Расіі транзытны калідор да Калініградзкай вобласьці; нарэшце, Беларусь адмаўлялася ад спагнаньня платы за транзыт некаторых расійскіх тавараў (у першую чаргу нафты і газу) праз сваю тэрыторыю. Узамен Беларусь атрымлівала гарантыі працягу паставак энэрганосьбітаў па зьніжаных цэнах і неабмежаваны доступ на расійскі рынак. Дамова замацоўвала расійскае дамінаваньне ў сфэры бясьпекі ды вайсковага супрацоўніцтва і давала падставу для размоваў пра магчымую інкарпарацыю Беларусі ў склад Расіі. Яна сустрэла інтэнсіўнае процідзеяньне з боку апазыцыі, але была ратыфікаваная Вярхоўным Саветам у красавіку 1995 году.

У той час як Лукашэнкаў флірт з савецкай палітычнай спадчынай і сымболікай рабілі зь яго ікону камуністычнай і нацыяналістычнай апазыцыі Расіі, ягоныя шчодрыя саступкі Расіі ў палітычным, эканамічным і вайсковым абсягах здабывалі яму ўсеагульную падтрымку ў асяродзьдзі расійскай эліты (за выняткам дзьвюх лібэральных партыяў — “Дэмакратычнага выбару” Я. Гайдара і “Яблыка” Р. Яўлінскага, які, паводле сваіх словаў, выступаў супраць “саюзу з Лукашэнкам”, але, тым ня менш, не наважваўся ганьбіць ідэю расійска-беларускага саюзу ўвогуле). Для Лукашэнкі гэта была пара ідэальнай “злагады” паміж інтэграцыйнымі ініцыятывамі ды наступнымі эканамічнымі і палітычнымі ўгодамі з Расіяй, якія ўмацоўвалі ягоную ўладу. Распад Савецкага Саюзу стаўся велізарнай траўмай для расійскага грамадзтва і яго эліты, якая вымушана была перагледзець собскую палітычную і культурную ідэнтычнасьць, сутыкнуўшыся са шматразовым аслабленьнем колішняй супэрмагутнасьці і зьмяншэньнем тэрыторыі дзяржавы да межаў перадымпэрскай, г.зн. дапятроўскай Расіі XVII стагодзьдзя. Палітычная і эканамічная нестабільнасьць сілкавала камуністычныя і ультранацыяналістычныя плыні сярод расійскіх палітыкаў, якія заваявалі рашучую перамогу на парлямэнцкіх выбарах 1993 году. Рэстаўрацыя Расійскай імпэрыі й аднаўленьне палітычнага і эканамічнага дамінаваньня Расіі над рэспублікамі былога СССР зноў станавіліся першараднымі палітычнымі заданьнямі таго часу. Антызаходнія настроі прыйшлі на зьмену “рамантычнаму” пэрыяду ў адносінах Расіі й Захаду, які завяршыўся пасьля ўварваньня ў Чачэнію і пашырэньня НАТО на ўсход насуперак зычэньням Расіі. Палітычная эліта і большая частка насельніцтва прасякаліся сымпатыямі да старых-новых геапалітычных канцэпцыяў эўраазійства (якое гаварыла аб прызначэньні Расіі стаць ядром асаблівай цывілізацыйнай супольнасьці, якая не належыць ні да Эўропы, ні да Азіі і ўключае ў сябе тэрыторыю былога СССР), панславізму (грунтаваўся на ідэі “расійскага сьвету”, які ахоплівае *мінімум* Расію разам з Украінай і Беларусяй) і “альтэрнатыўнага саюзу” Расіі з такімі азіяцкімі дзяржавамі, як Кітай, Іран, Індыя, дзеля супольнага процістаяньня заходняму ўплыву на кантынэнт. І хоць рэінтэграцыя былых савецкіх рэспублік заставалася амаль невыканальным заданьнем, гатоўнасьць Беларусі да хуткага і шматузроўневага палітычнага, эканамічнага і вайсковага аб’яднаньня давала элітам выдатную магчымасьць давесьці сваім выбарцам ажыцьцяўляльнасьць інтэграцыйнага праекту ў цэлым. Лукашэнка, лідэр краіны, самастойнае існаваньне якой насілу ўспрымалася расійскай грамадзкай думкай, зь вялікім посьпехам здолеў зрабіць сябе галоўным сымбалем надзеі на вяртаньне Расіяй яе страчанай велічы. Крамлю ж тым часам заручыны з Лукашэнкам дапамагалі адхіляць абвінавачаньні апазыцыі ў палітычнай бязвольнасьці й ігнараваньні расійскіх нацыянальных інтарэсаў, а напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў 1996 году дазволілі дэзарыентаваць камуністычна і нацыяналістычна настроены электарат.

Лукашэнка ўмела маніпуляваў настроямі расійскіх палітычных элітаў, здабываючы з гэта-

га карысьць для сваіх уладных рэсурсаў унутры краіны. Ён прыдбаў велізарны палітычны капітал сваім пасьпяховым візытам у Расію ў сакавіку 1996 году, у ходзе якога была дасягнутая прынцыповая дамоўленасьць аб стварэньні Супольнасьці Беларусі й Расіі. Лукашэнка прызначыў цану за сваю гатоўнасьць зблізіцца з Расіяй: тая згадзілася сьпісаць каля аднаго мільярда даляраў беларускіх даўгоў. Гэта было з захапленьнем сустрэта беларускім грамадзтвам, і Лукашэнкаў рэйтынг ізноў падскочыў да недасягальных для іншых беларускіх палітыкаў вышынь. Ельцын, са свайго боку, выкарыстаў новую дамову для дэманстрацыі сваёй рашучасьці аднавіць парваныя сувязі паміж былымі савецкімі рэспублікамі і выкупіць уласную “віну” за падпісаньне Белавескіх пагадненьняў, якое шмат хто ў Расіі працягваў лічыць зрадай. Ён пасьпяхова працягваў прыкрываецца Лукашэнкам ад нападак камуністычнай апазыцыі й пасьля выбарчай кампаніі; асабліва плённай у гэтым сэнсе была паездка Ельцына ў Берасьцейскую крэпасьць 22 чэрвеня 1996 году, на пяцьдзясят пятую гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Хоць новая дамова з Расіяй была ў вялікай ступені фармальнай і не дадала нічога істотнага ў адносіны паміж дзьвюма краінамі, яна справакавала сэрыю пратэстаў у Менску, якія сталі вядомыя пад назвай “Менская вясна”. Упершыню выступы апазыцыі скончыліся масавымі сутычкамі з праваахоўнымі сіламі. Гэтыя падзеі атрымалі вялікі розгалас у расійскіх электронных сродках масавай інфармацыі. Кадры са сцэнамі гвалту, ужытага супраць дэманстрантаў, зноў і зноў паказваліся гледачам з мэтай запалохаць іх і зьнеахвоціць галасаваць за камуністаў, якія падтрымлівалі Лукашэнкавы дзеяньні. Расійскія СМІ празрыста намякалі, што камуністы мараць, прыйшоўшы да ўлады ў ходзе чэрвеньскіх выбараў, учыніць падобную, калі ня горшую, расправу са сваімі апанэнтамі. Расійскім лібэралам праявы гвалту ў Менску далі падставу распачаць адкрытую атаку на Лукашэнку ў сувязі з парушэньнем ім правоў чалавека. Яны яўна недагледзелі значэньне “Лукашэнкавага фактару” ў расійскай палітыцы: калі раней ён выклікаў лёгкае раздражненьне, дык пасьля таго, як стала відавочнай шырыня палітычных амбіцыяў беларускага прэзыдэнта, ператварыўся ў рэальную пагрозу інтарэсам дэмакратаў. Трохі нечаканым было далучэньне да гэтага хору абураных Ельцына, які публічна запатрабаваў вызваленьня арыштаваных дэманстрантаў. Паводле некаторых зьвестак, рэзкасьць Ельцына была выклікана чуткамі аб фінансавай падтрымцы Лукашэнкам кандыдата ад камуністаў Генадзя Зюганава. Пацьвярджэньнем гэтых чутак сталася тое, што Лукашэнка адзіны з кіраўнікоў дзяржаў СНД ухіліўся ад звароту да расійскіх выбарцаў з просьбай падтрымаць Ельцына.

Калі Лукашэнка прызначыў на 7 лістапада правядзеньне канстытуцыйнага рэфэрэндуму (пазьней ён быў перанесены на 24 лістапада), перамога Ельцына на выбарах і ягоная адкрытая нездаволенасьць стылем кіраўніцтва Лукашэнкі пакідалі некаторую надзею на тое, што расійскае кіраўніцтва ўмяшаецца і паўстрымае беларускага лідэра ад фактычнага задушэньня дэмакратыі ў краіне. Асобныя члены беларускай апазыцыі, асабліва прадстаўнікі АГП, раз за разам езьдзілі зь Менску ў Маскву, упрошваючы дзеячоў накшталт Чубайса або Гайдара дапамагчы пераканаць Ельцына падтрымаць Вярхоўны Савет. Яны лічылі, што расійскія дэмакраты не павінны моўчкі назіраць за ўсталяваньнем аўтакратыі ў Беларусі. Аднак беларускія апазыцыянэры перабольшвалі магчымасьць Крамля ўплываць на Лукашэнку. Разам з гэтым яны недаацэньвалі вагу імпэрскіх настрояў у расійскім грамадзтве, асабліва пасьля таго, як стала відавочнай непазьбежнасьць пашырэньня НАТО на ўсход і зьвязаная з гэтым страта Расіяй уплыву на Сярэдня-Ўсходнюю Эўропу. Так ці іначай, але Лукашэнка гаранта-

ваў Расіі забесьпячэньне яе геапалітычных інтарэсаў у Беларусі, у тым ліку будаўніцтва “Газпрамам” — канцэрнам, цесна зьвязаным з Чарнамырдзіным, — новай ніткі газаправоду Ямал—Усходняя Эўропа, а таксама захаваньне на беларускай тэрыторыі вайсковых базаў. Такім чынам, усё, што трэба было зрабіць Лукашэнку, каб атрымаць падтрымку Расіі ў правядзеньні рэфэрэндуму, — гэта згадзіцца на вывад ядравай зброі, што прадугледжвалася дамовай СНУ-2 і было неабходна для паляпшэньня адносінаў паміж Расіяй і ЗША. І неўзабаве пасьля рэфэрэндуму апошняя расійская ракетная ўстаноўка “Топаль-М” была выведзеная зь Беларусі.

Разыгрываньне расійскай карты скончылася палітычным крахам для апазыцыі й парлямэнту, паколькі пазбавіла іх шанцу на імпічмэнт, які ў той сытуацыі быў адзіным сродкам перашкодзіць рэфэрэндуму і захаваць ранейшую палітычную сыстэму. У гандлі з Лукашэнкам расійскае кіраўніцтва аддало перавагу прагматызму перад ідэалёгіяй. Настаў пэрыяд “вымучанай далікатнасьці”, калі Расія, якая па-ранейшаму імкнулася выглядаць дэмакратычнай краінай у вачах міжнароднай супольнасьці, пакрывала Беларусь на міжнароднай арэне, а Лукашэнка, употайкі пагарджаны бальшынёй ельцынскіх паплечнікаў, атрымліваў прызнаньне расійскай эліты, нягледзячы на велізарнае адрозьненьне ягонай палітычнай філязофіі й практыкі ад памкненьняў “маладых рэфарматараў”, якіх ачунялы пасьля апэрацыі на сэрцы Ельцын набраў у сваю каманду з мэтай зьдзейсьніць найсьмялейшы праект па лібэралізацыі эканомікі, пачынаючы з гайдараўскай шокавай тэрапіі 1992-га. Будучы задуманай і ажыцьцёўленай як “шлюб па разьліку”, які служыў бягучым палітычным мэтам абодвух прэзыдэнтаў, беларуска-расійская інтэграцыя перажывала застой кожны раз, калі інтарэсы бакоў разыходзіліся, але атрымлівала шанцы на посьпех, як толькі ўзаемная патрэба ў ёй аднаўлялася.

## Drang nach Osten? Лукашэнка ў гіпатэтычнай бітве за Крэмль

Дыскусія аб пэрспэктывах беларуска-расійскай інтэграцыі ў абедзьвюх краінах засяроджвалася вакол пытаньня, ці імкнецца Лукашэнка стаць новым крамлёўскім уладаром і ці не патрэбна яму аб’яднаньне ў якасьці пляцдарму для дасягненьня гэтай мэты. Першыя намінкі на існаваньне такога імкненьня, якое прыпісвалася Лукашэнку, зьявіліся ў прэсе ўзімку 1995 году. Як паведамлялі некаторыя СМІ, пасьля сустрэчы з Аляксандрам Сьцерлігавым, лідэрам ультранацыяналістычнага Кангрэсу расійскіх суполак (абшчын), Лукашэнка быццам бы заявіў, што Беларусь у ягонай кар’еры — пройдзены этап.

Хоць асабістыя намеры й патаемныя спадзяваньні цяжка пацьвердзіць дакумэнтальна, Лукашэнкава бачаньне інтэграцыі, характар патрабаваньняў да расійскага кіраўніцтва, якія ён вылучаў перад падпісаньнем кожнага чарговага інтэграцыйнага пагадненьня, спосаб яго зьяўленьняў на расійскай палітычнай сцэне, а таксама эфэкт ад ягоных палітычных акцыяў служаць довадамі таго, што ў Лукашэнкі былі падобныя амбіцыі. Больш за тое, жаданьне адыгрываць большую ролю ў расійскай палітыцы не пакідала Лукашэнку ўсе гады ягонай прэзыдэнтуры, чаго нават ён сам ня можа адмовіць.

Лукашэнкава перамога на рэфэрэндуме ў лістападзе 1996 году адразу пацягнула за сабой

прапанову пераўтварыць Супольнасьць Беларусі й Расіі ў цясьнейшы палітычны саюз дзьвюх дзяржаваў. Гэтым разам ініцыятыва належала Ельцыну, чый ліст да беларускага калегі, датаваны студзенем 1997-га, зьмяшчаў падрабязныя прапановы наконт аб'яднаньня. Як і ў выпадку папярэдняй інтэграцыйнай кампаніі, на саюз з Лукашэнкам Ельцына штурхалі ўнутраныя палітычныя прычыны. Пашырэньне НАТО на ўсход, якое ён ня ў сілах быў запыніць, патрабавала падтрыманьня ў грамадзтве ілюзіяў наконт геапалітычнай магутнасьці Расіі й яе здольнасьці пераадолець усё больш прыкметную міжнародную ізаляцыю.

Лукашэнка з ахвотай адгукнуўся на гэтыя прапановы, хоць тое, як ён гэта зрабіў, наўрад ці задаволіла Ельцына. У лютым 1997-га ён выступіў на сходзе камуністаў-артадоксаў пад назвай "Кангрэс народаў СССР", які праходзіў у Менску, і ўрачыста паабяцаў, што саюз Расіі й Беларусі будзе першым крокам да аднаўленьня Савецкага Саюзу. Празь некалькі тыдняў ім былі абвешчаныя тры ўмовы, на якіх Беларусь была гатова аб'яднацца з Расіяй. Па-першае, сувэрэнітэт і незалежнасьць Беларусі мусілі быць цалкам захаваны ў новым саюзе. Па-другое, беларускія прызыўнікі не павінны былі праходзіць службу за межамі сваёй краіны. Па-трэцяе, саюз меўся быць выгадным для абодвух бакоў.

Было відавочна, што Лукашэнка зацікаўлены не ў зьліцьці дзьвюх дзяржаваў, а ў максымальна цеснай канфэдэрацыі — палітычным утварэньні, якое дазволіла б яму ўвесь час падтрымліваць надзею на пасьпяховы фінал гэтага грандыёзнага праекту. (Дарэчы, гэта пацьвердзілася ўжо на першым этапе Лукашэнкавай прэзыдэнтуры — пытаньне аб "эканамічнай інтэграцыі", вынесенае на рэфэрэндум 1995 году, дало ладны PR-эфэкт, які ствараў Лукашэнку імідж галоўнага інтэгратара.) Паводле азначэньня, канфэдэрацыя — гэта наднацыянальны саюз, які грунтуецца на роўнасьці ўдзельнікаў, што захоўваюць дастатковую самастойнасьць у сваіх унутраных справах. У выпадку пасьпяховага ажыцьцяўленьня такога аб'яднаньня Лукашэнка ўзаконьваў бы сваю прысутнасьць на расійскім палітычным полі, але не дапускаў бы якіх-небудзь замахаў на сваю неабмежаваную ўладу ўнутры краіны. Якой бы абсурднай думка, што Расія добраахвотна адмовіцца ад істотнай часткі свайго сувэрэнітэту на карысьць саюзу з суседам, меншым за яе па насельніцтве ў пятнаццаць разоў, ні здавалася староньняму назіральніку, яна ледзьве не ажыцьцявілася ў красавіку 1997 году. Чарнавы варыянт дамовы аб стварэньні Саюзу Беларусі й Расіі прадугледжваў перадачу некаторай сымбалічнай колькасьці паўнамоцтваў у галіне абароны, бясьпекі, фіскальна-грашовай палітыкі і г.д. Найвышэйшай Радзе Саюзу — наднацыянальнаму органу, у які ўваходзілі па чатыры прадстаўнікі ад кожнай краіны: прэзыдэнт, прэм'ер-міністар і старшыні верхняй ды ніжняй гасподаў нацыянальных парлямэнтаў — і адзін сакратар, які выбіраўся васьмі сталымі членамі. Пастановы ўнутры Найвышэйшай Рады прымаліся простай бальшынёй. Такім чынам, чатыры галасы зь беларускага боку плюс голас старшыні расійскай Дзяржаўнай Думы Генадзя Селязьнёва, камуніста і даўняга Лукашэнкавага паплечніка, забясьпечвалі беларускаму прэзыдэнту перавагу ў новым саюзе як дэ-факта, так і дэ-юрэ. Заставаліся два дні да падпісаньня праекту дамовы, якая прадугледжвала такую структуру саюзных органаў улады і ўжо была папярэдне ўхваленая абедзьвюма рабочымі групамі, калі інфармацыя аб ёй раптоўна пратачылася ў расійскія сродкі масавай інфармацыі. Разгарэўся палітычны скандал, у ходзе якога лібэралы на чале зь першым віцэ-прэм'ерам Анатолем Чубайсам і Барысом Нямцовым абвінавацілі камуністаў і Лукашэнку ў змове з мэтай адхіліць Ельцына ад рук. Празь некалькі дзён ваганьняў Ельцын загадаў перапісаць дамову, у выніку чаго яна ператварылася ў чарговы фармальны пакт. Гэты інцыдэнт, аднак, праясьніў стратэгію і вяду-

чыя матывы галоўных палітычных актораў Расіі й Беларусі ў інтэграцыйнай гульні.

Адкрытая падтрымка Лукашэнкі з боку расійскіх камуністаў і нацыяналістаў была выкліканая іхнай відавочнай няздольнасьцю дасягнуць жаданых палітычных мэтаў сваімі сіламі. Дарма што яны мелі бальшыню ў Думе і кантралявалі шэраг рэгіёнаў, у іх адсутнічаў харызматычны лідэр, сымпатычны шырокім колам грамадзтва, безь якога яны былі вымушаны заставацца вечнымі аўтсайдэрамі ў палітычнай барацьбе. Шмат хто зь іх бачыў у Лукашэнку якраз таго, каго яны шукалі. Нават калі ягоныя шанцы заваяваць Крэмль праз удзел у легальных выбарах былі не такія вялікія, заставалася магчымасьць прыдумаць якую-небудзь інтрыгу, аналягічную той, што была амаль удалася на пачатку 1997-га. Канфэдэрацыя была выточным пунктам, які задавальняў і камуністаў, і Лукашэнку, паколькі, нават калі б самі яе стваральнікі засталіся другараднымі асобамі ў расійскай палітыцы, каапэрацыя зь беларускім прэзыдэнтам давала ім перавагу ў наднацыянальных органах. З другога боку, пэрспэктыва далучэньня Беларусі да Расіі ў якасьці аднаго з рэгіёнаў руйнавала гэты палітычны праект, паколькі ператварэньне Беларусі ў адзін (альбо шэсьць, калі лічыць асобныя вобласьці) з суб'ектаў фэдэрацыі аўтаматычна панізіла б Лукашэнкаў статус да статусу звычайнага губэрнатара.

Разам з узмацненьнем альянсу з камуністычнай і нацыяналістычнай апазыцыяй Лукашэнка пачаў шукаць падтрымкі расійскіх рэгіянальных лідэраў. Пачынаючы з 1996 году ён зьдзейсьніў мноства паездак у расійскія рэгіёны, у ходзе якіх падпісваў дамовы аб эканамічным супрацоўніцтве і актыўна прапагандаваў "беларускую мадэль" разьвіцьця сярод жыхароў расійскай правінцыі. У Лукашэнкавых прамовах гучала таксама незавуаляваная крытыка Ельцына і эканамічнага курсу ягонага ўраду, якая бывала асабліва зьедлівай у тых рэгіёнах, кіраўніцтва якіх падзяляла ягонае непрыманьне крамлёўскай палітыкі.

Гэтая рыторыка, як правіла, выклікала ў расійцаў захапленьне. Краснадарскі губэрнатар Мікалай Кандраценка (мабыць, найактыўнейшы камуніст сярод расійскіх рэгіянальных лідэраў), якога лучыў з Лукашэнкам стыль кіраваньня і нават супольная мянушка "бацька", вітаў яго як прыяцеля і, нягледзячы на розьніцу ўва ўзросьце, як настаўніка: "У наш час цяжкіх выпрабаваньняў беларусы паказваюць прыклад таго, як мы павінны жыць. Мы шчасьлівыя, што ў славян ёсьць такі лідэр, як Аляксандар Лукашэнка. Нам, славянам, патрэбны такія кіраўнікі, каб мы маглі абараніць сваіх дзяцей і ўнукаў"[8].

Усьведамляючы патэнцыйную небясьпеку ператварэньня альянсу Лукашэнкі з камуністамі ў выбуховую сумесь, расійскія лібэралы й іхныя саюзьнікі ў крамлёўскай адміністрацыі выступалі прынцыповымі праціўнікамі расійска-беларускага саюзу. Аднак, проста ганьбячы Лукашэнкавы палітычныя пляны, гэтыя палітыкі не маглі разьлічваць на посьпех. Яны адчувалі настроі грамадзтва, якое ўсё больш і больш прасякалася ідэяй расійска-беларускай інтэграцыі, і выбралі для атакі гатоўнасьць да аб'яднаньня самога Лукашэнкі. Яны настойліва сьцьвярджалі, што адзіным рэальным спосабам аб'яднаньня ёсьць ліквідацыя беларускай дзяржавы і далучэньне да Расіі шасьці яе абласьцей у якасьці асобных суб'ектаў фэдэрацыі альбо, у крайнім разе, улучэньне Беларусі ў склад Расіі як рэспублікі, роўнай паводле статусу Татарстану ці Башкірыі. Лёгіка падобнай аргумэнтацыі была простая: немагчыма стварыць раўнапраўны саюз паміж дзьвюма краінамі, адна зь якіх па насельнітцве ў пятнаццаць разоў большая за другую (варта згадаць, што прыблізна такая ж розьніца паміж дзьвю-

[8] Белорусский рынок. 1998. 23 апреля.

ма часткамі новай Югаславіі — Сэрбіяй і Чарнагорыяй; гэтая фэдэрацыя, можна лічыць, спыніла сваё існаваньне ў канцы 1990-ых, калі жаданьне Чарнагорыі здабыць большы сувэрэнітэт прывяло да зьяўленьня ў яе асобнай валюты, мытні і нават войска; адносна нядаўна быў афіцыйна выведзены з ужытку тэрмін "Югаславія"). Іншыя аргумэнты на карысьць такога вырашэньня праблемы зводзіліся да таго, што Канстытуцыя Расіі не дапускае ніякай іншай формы аб'яднаньня, а таксама што аб'яднаньне моцна ўдарыць па расійскім бюджэце. Тагачасны кіраўнік ельцынскай адмінстрацыі Анатоль Чубайс сфармуляваў гэтую пазыцыю наступным чынам: *"Я ня думаю, што мы можам ажыцьцяўляць наша ўзьяднаньне зь Беларусяй на аснове поўнай роўнасьці бакоў. Я ня згодны. Няма роўнасьці, і сёй-той павінен гэта зразумець. Узяць любы парамэтар: наша насельніцтва ў пятнаццаць разоў большае, наш бюджэт у пяцьдзясят разоў большы, наш ВУП у шэсьцьдзесят восем разоў большы* … Калі адкінуць дыпляматыю і назваць рэчы сваімі імёнамі… формула простая: мы павінны гаварыць не пра аб'яднаньне роўных партнэраў, а пра звычайнае ўваходжаньне Беларусі ў склад Расіі"*[9].

Барыс Нямцоў, калега Чубайса ў бытнасьць першым віцэ-прэм'ерам Расіі ў 1997—98 гг., разьвіў ягоны пункт гледжаньня ў даволі саркастычнай манэры: "Падчас інтэграцыі мы меркавалі, што мытня будзе расійскай, а ён зробіцца чальцом Рады Фэдэрацыі, губэрнатарам. Калі гэта ня так, то гэта не адна краіна. Гэта павінна быць зразумела ўсім. Я сказаў яму: "Добра, няхай будзе сапраўды адзіная дзяржава, гэта ў нашых супольных інтарэсах: мы пампуем нафту, перш за ўсё праз "Дружбу", нашы газаправоды ідуць празь Беларусь, а твой чортаў "Белтрансгаз" ня плаціць нам ні капейкі, ты амаль цалкам жывеш за наш кошт, і мы сытыя табой па горла. Мы заплацім табе сто мільёнаў, але возьмем тут усё пад свой кантроль". Я кажу яму як эканаміст: "Ты будзеш чальцом Рады Фэдэрацыі: калі ласка, вось ваша ганаровае месца, сядайце. Калі хочаш, мы зробім цябе намесьнікам сьпікера, нам ня шкода". Ён гаворыць: "Вы звар'яцелі? Я ж такі самы, як Ельцын!" У якім сэнсе? Ён гэтак жа блага гуляе ў тэніс, гэта праўда. Ува ўсім астатнім ён зусім не такі. Ельцын — цар усяе Русі, а ён хто?"[10]

Зразумела, такія заявы рабіліся з усьведамленьнем таго, што Лукашэнка ніколі ня згодзіцца на "нямецкую мадэль" узьяднаньня. Уносячы альтэрнатыўныя ноткі ў дэбаты вакол інтэграцыі, Лукашэнкавы апанэнты маглі ўстаўляць ёй палкі ў колы да таго часу, пакуль трываў іхны палітычны ўплыў. Адмаўленьне праекту канфэдэрацыі ельцынскай адміністрацыяй прымушала Лукашэнку сьцішыць свой імпэт. Сутыкнуўшыся зь немагчымасьцю хуткага ажыцьцяўленьня сваіх плянаў і будучы контратакаваны з усіх бакоў у сродках масавай інфармацыі, ён вымушаны быў перайсьці да абароны правоў Беларусі на незалежнасьць і сувэрэнітэт. Гэтая зьмена ў рыторыцы зусім ня сьведчыла пра паварот Лукашэнкі да нацыяналізму ці пра ягонае расчараваньне інтэграцыйным праектам. Наадварот, гульня ў незалежніка была для яго спробай выратаваць гэты праект бяз рызыкі для наяўнай палітычнай базы, якая магла незваротна зьнікнуць у выпадку простага паглынаньня Беларусі Расіяй. Паказальна, што Лукашэнка пачаў ствараць сабе вобраз будаўніка нацыянальнай дзяржавы адразу пасьля

* Розьніца ў памерах сярэдняга бюджэту і ВУП была значна перабольшана Чубайсам. Насамрэч расійскі цэнтральны бюджэт перавышае беларускі ня больш чым у 15 разоў. Гл. таксама наш нарыс пра эканамічную палітыку ў гэтай кнізе.

[9] Асабісты сайт Анатоля Чубайса, http://www.chubais.ru

[10] Газета слонімская.1999. 7 студзеня.

таго, як крамлёўскія лібэралы перашкодзілі падпісаньню першапачатковай рэдакцыі саюзнай дамовы 1997 году і агучылі ў СМІ свае патрабаваньні што да ўваходжаньня Беларусі ў склад Расіі.

"Ёсьць межы, якіх я ня маю права пераступаць. Перш за ўсё гэта датычыць дзяржавы — незалежнасьці й сувэрэнітэту нашай рэспублікі. Мы ня можам далучацца ні да якай іншай краіны ў якасьці рэгіёну або правінцыі. Нашы людзі, які б саюз мы ні стварылі, не павінны ехаць ваяваць у "гарачыя кропкі". І найважнейшае, любы саюз мусіць быць раўнапраўны"[11].

"Кожны раз, калі Менск праяўляе натуральнае жаданьне пашырыць дыялёг з нашымі заходнімі партнэрамі, а таксама з Украінай, гэта выклікае дзіўную рэакцыю ў некаторых расійскіх палітыкаў… Мы не зьбіраемся аб'ядноўвацца ні з кім на правах зямлі, княства ці правінцыі "[12].

Апроч таго, Лукашэнка абвінавацію аўтараў "інкарпарацыйнага" праекту ў адмысловым процістаяньні інтэграцыі й сьвядомым вылучэньні непрымальных для яго прапановаў з мэтаў не дапусьціць ніякага аб'яднаньня ўвогуле:

"Сёньня расійскае кіраўніцтва не гатовае да саюзу. Яно запатрабавала ад Беларусі далучыцца да Расіі. Мы ня можам зрабіць гэтага цяпер. У нас ёсьць Канстытуцыя, якая забараняе нам гэта. Сёй-той хацеў бы зьнішчыць саму ідэю аб'яднаньня і гаворыць: "Давайце ўключым Беларусь у склад Расіі". Але ж такога не было нават у Савецкім Саюзе. Мы былі рэспублікай. І, скажу я вам, у нас было ня менш сувэрэнітэту, чым цяпер"[13].

У дадатак да ўсяго Лукашэнка пачаў актыўна супраціўляцца ідэі адначасовага правядзеньня ў Расіі й Беларусі рэфэрэндуму ў пытаньні расійска-беларускага саюзу, баючыся, што Расія сфармулюе пытаньне так, каб ухваліць інкарпарацыю Беларусі. Ягоная контраргумэнтацыя была простая: беларусы двойчы выказваліся на рэфэрэндуме за саюз, першы раз у 1991 годзе і другі — у 1995, таму няма патрэбы праводзіць яшчэ адно галасаваньне. Гэты довад быў слабы з праўнага пункту гледжаньня: на рэфэрэндум 1991 году выносілася пытаньне аб захаваньні канаючага СССР, а ў 1995 годзе гаворка ішла толькі пра эканамічную інтэграцыю. Больш за тое, калі ўжо Лукашэнка так настойваў на непарушнасьці Канстытуцыі 1996 году, ён павінен быў браць пад увагу яе вядомае палажэньне, якое абвяшчала Беларусь незалежнай дзяржавай, што імкнецца да нэўтральнага статусу. Фактычна процідзеяньне рэфэрэндуму было палітычным манэўрам з мэтай ня толькі прадухіліць найбольш непажаданы вынік інтэграцыі, але і забясьпечыць сабе прастору для манэўру ў перамовінах наконт аб'яднаньня.

Хоць Лукашэнка шмат гаварыў пра "братнюю дружбу" паміж двума народамі, яму самому неаднаразова даводзілася выслухоўваць абвінавачаньні ў намеры ашукаць Расію пры пераразьліку бягучых і пратэрмінаваных даўгоў. На гэта ён неяк заявіў, што насамрэч Расія вінавацііца Беларусі кругленькую суму ў мільярд даляраў штогод. Сярод пунктаў выстаўленага Лукашэнкам расійцам рахунку значыліся затраты на ахову дзяржаўнай мяжы, абслугоўваньне комплексаў проціпаветранай абароны паблізу Ганцавічаў і Вялейкі, якія быццам бы забясьпечвалі ахову расійскай паветранай прасторы "ад Кіева да Рыгі", і стварэньне толькі трыма беларускімі прадпрыемствамі сама меней 1,2 мільёна працоўных месцаў у Расіі дзя-

[11] Дракохруст Юрий, Фурман Дмитрий. Перипетии интеграции (Развитие процесса белорусско-российского объединения) // Белоруссия и Россия: Общества и государства. Москва: Права человека, 1998. С. 348.

[12] Тамсама.

[13] Институт стран СНГ Институт диаспоры и интеграции Информационно-аналитический бюллетень.

куючы супрацоўніцтву з расійскімі пастаўшчыкамі і падрадчыкамі.

*"Калі ласка, не абвінавачвайце мяне і беларускі народ ува ўтрыманстве й існаваньні за ваш кошт. Вы пытаеце, у колькі абыдзецца гэтае аб'яднаньне? Колькі Расіі давядзецца заплаціць за саюз? Яна заробіць на ім тры мільярды даляраў у год. Вось колькі гэты саюз будзе каштаваць для Расіі"*[14].

Стала ясна, што Лукашэнкава стаўка на "савецкі кансэрватызм" (падрабязьней пра гэта глядзі вышэй) была дзейсным інструмэнтам ажыцьцяўленьня ягоных палітычных плянаў, прызначаным ня толькі для ўнутранага ўжытку. Бо толькі пры апэляцыі да СССР можна было абгрунтаваць нават тэарэтычную роўнасьць Расіі й Беларусі як сузаснавальнікаў аб'яднанай дзяржавы і такім чынам апраўдаць шырокі ўдзел беларускага прэзыдэнта ў расійскай палітыцы. Хоць цяжка сказаць, чаму Лукашэнка пастанавіў замяніць у якасьці ідэалягічнага ляйтматыву сваёй дзейнасьці канцэпцыю вялікай Расіі на сумесь беларускага нацыяналізму з "савецкім кансэрватызмам", узьнікненьне такога сымбіёзу ў перакананьнях беларускага прэзыдэнта наўрад ці можна аспрэчыць. Гэта, аднак, прыводзіла да таго, што Лукашэнкаў варыянт палітычнага саюзу быў прыцягальны вылучна для антыельцынскай апазыцыі, што толькі павялічвала рашучасьць прыхільнікаў расійскага прэзыдэнта пусьціць інтэграцыйны лякаматыў пад адхон. На думку расійскіх аналітыкаў, праціўнікі інтэграцыі пераважалі ў той час над яе адэптамі як ува ўрадавым апараце, так і сярод асобаў, што вызначалі інфармацыйную палітыку СМІ. І хоць пралукашэнкаўскі лягер меў немалую вагу ў выбарных органах улады, яго рэальны ўплыў у посткамуністычнай Расіі быў непараўнальны з магутнасьцю ўрадоўцаў і алігархаў, альянс якіх склаўся вакол Ельцына.

**Табліца 1.** Рэйтынг палітычнага ўплыву асноўных прыхільнікаў і праціўнікаў расійска-беларускага саюзу ў Расіі на 1998 год

| Прыхільнікі | | | Праціўнікі | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Публічныя палітыкі | Апаратныя палітыкі | Грамадзкія дзеячы | Публічныя палітыкі | Апаратныя палітыкі | Грамадзкія дзеячы |
| **Юры Лужкоў** (мэр Масквы) 6,7 | **Віктар** Чарнамырдзін 7,8 | **Аляксандар** Салжаніцын 5,4 | **Рыгор** Яўлінскі 7,6 | **Анатоль** Чубайс 8,2 | **Ягор** Гайдар 7,4 |
| Генадзь Зюганаў 6,5 | Яўген Прымакоў 5,9 | Аляксандар Лебедзь 5,1 | Галіна Старавойтава 4,7 | Валянцін Юмашаў 7,1 | Андрэй Чаркізаў 5,5 |
| Генадзь Селязнёў 6,4 | Валеры Сярой 4,6 | Міхаіл Шакум 4,5 | Канстанцін Баравой 4,6 | Альфрэд Кох 6,8 | Сяргей Даранка 5,3 |
| **Генадзь** Ціханаў 4,7 | **Іван** Рыбкін 4,2 | **Аляксандар** Вольскі 4,0 | **Андрэй** Козыраў 4,4 | **Якаў** Урынсон 6,5 | **Валерыя** Навадворская 3,9 |
| Сяргей Бабурын 4,7 | Сяргей Шахрай 4,1 | Мікалай Гончар 3,9 | Сяргей Юшанкоў 3,8 | Сяргей Ястржэмбскі 6,2 | Дзьмітры Ліхачоў 3,6 |

Крыніца: Нацыянальная служба навін Расіі, http://www.nns.ru/analytdoc/rbprot2.html

[14] "Мы должны быть вместе!" // "Советская Белоруссия", 27 кастрычніка 1999 г.

Як відаць з гэтай табліцы, кола прыхільнікаў інтэграцыі ўключала больш уплывовых "публічных палітыкаў" (г.зн. выбарных афіцыйных асобаў і дэпутатаў парлямэнту), у той час як сярод праціўнікаў дамінавалі тыя, хто быў у ельцынскай адміністрацыі надзелены правам прымаць рашэньні.

І хоць Лукашэнка марна спрабаваў прабіцца праз "Крамлёўскі мур" падазрэньняў і варожасьці ў дачыненьні да свайго палітычнага праекту, выглядала малаімаверным, што расійцы будуць вечна навязваць Беларусі "ўсходнегерманскі" варыянт узьяднаньня. У процідзеяньні простаму паглынаньню Беларусі Расіяй Лукашэнку падтрымала ня толькі бальшыня беларускай намэнклятуры, для якой ліквідацыя сувэрэнітэту краіны азначала паніжэньне статусу да ўзроўню расійскай правінцыйнай бюракратыі, але і, неспадзявана для расійцаў, пераважная частка беларускага грамадзтва. Зусім ужо нечаканым для іх было тое, што, нягледзячы на дамінаваньне тэмы інтэграцыі ў беларускай палітыцы праз увесь час Лукашэнкавага кіраваньня і нават да яго, падтрымка аб'яднаньня сярод беларусаў перажыла адчувальны спад. Што праўда, ён ня быў незваротны й не прывёў да ўсплёску беларускага нацыяналізму. Наагул, дастатковы ўзровень падтрымкі таго ці іншага віду саюзу паміж дзьвюма краінамі назіраўся заўсёды, адно што ў верасьні 1998 году прыхільнікі поўнай самастойнасьці ненадоўга ўзялі верх над усімі астатнімі. Пры гэтым, аднак, іх колькасьць была амаль утрая большай, чымся ў часы Кебіча і Шушкевіча, у той час як лік тых, хто быў гатовы падтрымаць аб'яднаньне, якое б цалкам ліквідавала беларускую дзяржаўнасьць, рэзка ўпаў.

Аб чым сьведчылі гэтыя зьмены ў грамадзкай думцы? Бясспрэчна, аб пашырэньні пранезалежніцкіх настрояў і аб тым, што здабыцьцё Беларусяй незалежнасьці не прайшло марна для вялікай часткі беларускага грамадзтва, асабліва калі ўлічыць, што падтрымка незалежнасьці была мацнейшай з боку маладога пакаленьня, якое ня зьведала савецкіх часоў і для якога Беларусь была адзінай краінай, зь якой яно сябе ідэнтыфікавала. Але ня толькі гэта: нежаданьне аб'ядноўвацца з Расіяй у саюз ці ў адзіную краіну ўзрастала штораз, калі ўнутранае становішча ў гэтай краіне пагаршалася ў сувязі з эканамічным або ваенным крызысам. Упершыню гэта здарылася пасьля заканчэньня першай чачэнскай вайны, другой наго-

**Табліца 2.** Узровень падтрымкі саюзу з Расіяй

| Пажаданы тып адносінаў з Расіяй | Сак. 1994* | Май 1996** | Ліст 1997 | Чэр. 1998 | Сак 1999 | Ліст. 1999 | Крас. 2000 | Ліст 2000 | Чэрв 2001 | Ліст. 2001 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Добрасуседскія адносіны дзьвюх незалежных дзяржаваў | 8 | 34,7 | 34,5 | 50,8 | 43,2 | 42,4 | 41,0 | 40,6 | 30,2 | 36,1 |
| Саюз незалежных дзяржаваў | 41 | 47 | 26,8 | 26,2 | 28,1 | 30,5 | 32,4 | 31,6 | 39,2 | 34,5 |
| Аб'яднаньне ў адну дзяржаву | 45,6 | 31,2 | 27,5 | 20,1 | 24,1 | 21,8 | 25,3 | 27,5 | 33,3 | 16,5 |

Крыніца: сацыялягічнае дасьледаваньне НІСЭПД. Апублікавана ў матэрыяле "Жыцьцё ў наш час" // Навіны НІСЭПД. № 4 (1999. Сьнежань). С. 20—45.

* Даныя лябараторыі "Новак", гл. RFE/RL daily report. 1994. 9 June.

** Даныя лябараторыі "Новак", гл.: Уладзімер Падгол, "Структура мэнталітэту грамадзян Беларусі" // Грамадзянская супольнасьць і праблемы нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі ў Беларусі. Берасьце: Шлях, 1996. С. 70.

дай стаўся жнівеньскі фінансавы крызыс 1998 году, а трэцяй паслужыла ўзнаўленьне ваеннага канфлікту на Каўказе ў жніўні 1999-га. Затое падтрымка аб'яднаньня вырасла падчас натаўскай кампаніі ў Косаве (чаму паспрыяла афіцыйная антызаходняя прапаганда), а таксама пасьля перамогі Пуціна на прэзыдэнцкіх выбарах, якую шмат хто і ў адной, і ў другой дзяржаве зьвязаў з пачаткам ажыўленьня расійскай эканомікі й аднаўленьня магутнасьці Расіі ў сьвеце. Гэтыя пертурбацыі паставілі Лукашэнку перад нялёгкім выбарам. Хоць расійскія крызысы далі яму зручную магчымасьць прадэманстраваць грамадзтву перавагі сваёй унутранай палітыкі, проціпастаўляючы "беларускі парадак" "расійскаму хаосу", перабор з крытыкай усходняга суседа значна аслабіў бы энтузіязм вакол ягонага інтэграцыйнага праекту. З другога боку, падтрымка ідэі саюзу ўзмацнілася б са зьяўленьнем новага лідэра, што ўспрымаўся як альтэрнатыва ня толькі Ельцыну, але і самому Лукашэнку.

Але па-ранейшаму ў масах была падтрымка ідэі "саюзу дзьвюх незалежных дзяржаваў", якая легітымізавала адначасовае Лукашэнкава імкненьне і да "поўнага аб'яднаньня", і да "поўнай незалежнасьці". Выяўная супярэчнасьць паміж гэтымі жаданьнямі можа быць растлумачана дзьвюма прычынамі. З аднаго боку, хацелася "злавіць халяву": шмат кім у Беларусі такі саюз разглядаўся як зручная формула, якая дазваляла павысіць жыцьцёвы ўзровень, атрымаўшы льготныя цэны на расійскую нафту і газ, і адначасова не плаціць за гэта адпраўкай навабранцаў у Чачэнію. З другога боку, вялікая частка грамадзтва працягвала бачыць працэс інтэграцыі як рух да аднаўленьня колішняга СССР, няхай і ўва ўцятым выглядзе. Рэстаўрацыя элемэнтаў савецкай гісторыі й эканомікі, якая была дамінантай Лукашэнкавай "практычнай ідэалёгіі", дапамагала падтрымліваць перакананасьць у тым, што сувэрэнітэт і саюз — цалкам сумяшчальныя рэчы. Тут варта закрануць тэму адрозьненьня ўва ўспрыманьні інтэграцыі беларускім і расійскім грамадзтвамі. Для прасавецка настроенай беларускай публікі яна была працэсам аднаўленьня краіны, якая грунтавалася на еднасьці й роўнасьці народаў, а таксама, як сьцьвярджалася, дала пачатак дзяржаўнасьці й самастойнасьці Беларусі. У адрозьненьне ад усходняй суседкі, дзе СССР трактаваўся ў большай ступені як чарговы этап існаваньня тысячагадовай Вялікай Расіі, беларускае бачаньне савецкай мінуўшчыны было прасякнута мітамі пра роўнасьць і братэрства. Аднак такі саюз проціпастаўляўся ня толькі "нацыянальнай" Беларусі, узьнікненьне якой у 1918 г. малявалася як інтрыга нямецкага кайзэра з мэтай аслабіць бальшавікоў, але й імпэрскай Расіі, якую камуністычная прапаганда ўсьлед за Леніным ахрысьціла "турмой народаў". Пэрспэктыва аднаўленьня Расійскай імпэрыі, натуральна, не была папулярная ў беларускім грамадзтве: на адзіных свабодных парлямэнцкіх выбарах 1995 году прарасійскія нацыяналістычныя сілы пацярпелі поўнае фіяска. Аб'яднаньне магло быць прыцягальным для беларусаў, толькі калі ажыцьцяўлялася паводле савецкай мадэлі й цягнула за сабой аднаўленьне савецкіх парадкаў: нягледзячы на дэманстрацыю рашучай падтрымкі інтэграцыі, толькі мізэрная колькасьць жыхароў Беларусі (менш за 1%) бачылі сучасную Расію ўзорам, вартым перайманьня. "Жаданьне беларусаў уступіць у саюз або нават у адзіную дзяржаву з Расіяй — гэта прага вярнуцца ня столькі ў савецкае мінулае, колькі ўва ўяўную савецкую мінуўшчыну, гэта імкненьне зрабіць глыбока ўкаранёныя ў сьвядомасьці таталітарныя догмы рэчаіснасьцю посттаталітарнага сьвету"[15].

Тым часам у Расіі працэс інтэграцыі куды часьцей разглядаўся як першы крок да аднаў-

[15] Дракохруст Юрий, Фурман Дмитрий. Перипетии интеграции (Развитие процесса белорусско-российского объединения) // Белоруссия и Россия: Общества и государства. Москва: Права человека, 1998. С. 358.

леньня былой імпэрскай велічы, дасягнутай Пятром I і ўмацаванай Кацярынай II, але ня Леніным, які быў толькі адным з эпізадычных актораў на яе гістарычнай сцэне. Нават КПРФ, каб павялічыць свой палітычны капітал, вымушана была прасіць "бласлаўленьня" ў Расійскай праваслаўнай царквы і выкарыстоўваць вобразы цара ды военачальнікаў імпэрскай эпохі для палітычнай мабілізацыі "патрыятычна" настроеных расійцаў.

Як мы былі сказалі, інтэграцыя зь Беларусяй дапамагала расійскім элітам "аднавіць веру ў сябе, пераадолець, выкараніць глыбока заселы комплекс непаўнавартасьці"[16], выкліканы стратай у постсавецкі пэрыяд статусу супэрдзяржавы. Расійскія нацыяналісты і эўраазійцы ўспрымалі яе як першы этап выбудовы (адбудовы) "расійскага сьвету"[17], трактаванага імі як натуральная жыцьцёвая прастора расійскай нацыі. Вайскоўцам яно дазваляла адсунуць заходнія межы дзяржавы яшчэ на шэсьцьсот кілямэтраў ад Смаленску. Ніводная з гэтых канцэпцыяў і мэтаў, вядома ж, не пакідала месца Беларусі як самастойнай дзяржаве і ніводная зь іх не магла быць прынятая нацыянальна арыентаванай ці нават "памяркоўнай" часткай беларускага грамадзтва, ня кажучы ўжо пра яго палітычную ды кіруючую эліту і, у рэшце рэшт, Лукашэнку.

Цікава, што лукашэнкаўская палітыка русіфікацыі не затармазіла павелічэньня падтрымкі ідэі незалежнасьці ў беларускім грамадзтве. Наадварот, яна спарадзіла фэномэн "беларускага расійскамоўнага нацыяналізму". Гэты фэномэн палітычнай культуры Беларусі, які пашырыўся на працягу апошняга дзесяцігодзьдзя, пацьвердзіў, паводле Яна Запрудніка, "павелічэньне розьніцы паміж моўнай ды палітычнай русіфікацыяй. Расійская мова ў Беларусі ў шматлікіх выпадках стала такой жа мовай культурнага адраджэньня краіны ды ўмацаваньня яе незалежнасьці, як і беларуская. Можна нават правесьці, хоць і грубае, параўнаньне з ангельскай мовай у Ірляндыі ды нямецкай у Аўстрыі"[18]. Узьнікненьне "беларускага расійскамоўнага нацыяналізму" паглыбіла палітычны раскол у незалежніцкім лягеры, які падзяліўся на прыхільнікаў "этнічнага" ды "грамадзянскага" нацыяналізму. "Этнічны" нацыяналізм апэлюе да этнічнай/нацыянальнай моўнай ды культурнай традыцыі й культывуе міт аб "адвечнасьці" нацыі. Грамадзянскі нацыяналізм адштурхоўваецца ад лібэральнага бачаньня нацыі як прадукту "грамадзкай дамовы". Нацыя (таксама як і яе атрыбуты) у першым выпадку — вартасьць мэтафізычная, у другім — вылучна інструмэнтальная, сродак дасягненьня іншых, у тым ліку палітычных мэтаў, такіх як дэмакратызацыя, дэсаветызацыя ды вэстэрнізацыя. Для прыхільнікаў "этнічнага" нацыяналізму нацыянальнае адраджэньне ёсьць зарукай пабудовы дэмакратыі ў незалежнай дзяржаве, тым часам як для тых, хто аддае перавагу "грамадзянскаму" нацыяналізму, наадварот, дэмакратыя выступае рухавіком у справе пабудовы нацыі.

У Беларусі "этнічны" ды "грамадзянскі" нацыяналізм мае сваіх палітычных носьбітаў у дэмакратычным лягеры (БНФ з аднаго боку і АГП з другога, хаця ідэалягічныя бар'еры паміж гэтымі партыямі апошнім часам сталі менш адчувальнымі), а таксама свой базавы электарат (з аднаго боку — нацыянальна-сьвядомая інтэлігенцыя ды моладзь, зь іншага — касмапалітычнае гарадзкое насельніцтва, частка эканамічнай эліты ды дзяржапарату). Асноўнае адрозьненьне паміж "этнічнымі" ды "грамадзянскімі" нацыяналістамі паходзіць па

[16] Известия. 15 апреля. 1997.

[17] Сергеев Н. и Фадеев А., Анатомия Союза России и Белоруссии// Независимая Газета. 23 сентября. 1998 г.

[18] Jan Zaprudnik. Belarus: In Search of National Identity, 1990-2000 // Belarusian Review. Vol. 13, Issue 2.

лініі стаўленьня да нацыянальнай мовы. Калі ў традыцыі этнічнага нацыяналізму акурат нацыянальная мова ператварае насельніцтва ў нацыю, то з пункту гледжаньня нацыяналізму грамадзянскага асобна ўзятая беларуская нацыя можа быць і расійскамоўнай, і дзьвюхмоўнай.

Не зьбіраючыся тут абмяркоўваць плюсы ды мінусы той ці іншай рэдакцыі беларускага нацыяналізму, зазначым, аднак, што два супярэчлівыя міжсобку падыходы спарадзілі доўгатэрміновы падзел у дэмакратычнай апазыцыі на "нацыянальны" і "лібэральны" блёкі, які прывёў да падзеньня іх сукупнага ўплыву на беларускае грамадзтва. Не ў апошнюю чаргу праз гэта падзелены нацыянальна-дэмакратычны лягер ня мог дагэтуль стварыць жыцьцяздольную альтэрнатыву лукашэнкаўскаму "савецкаму кансэрватызму". Трэба сказаць, што і саветызаваная частка беларускага грамадзтва ўсё болей станавілася адной з палітычных меншыняў. Таму натуральнае для кожнага аўтакрата імкненьне легітымізаваць сваю ўладу, выкарыстоўваючы вартасьці й сымбалі палітычнай культуры, якія пераважаюць у грамадзтве, падштурхнула Лукашэнку стала імкнуцца да фармаваньня "кааліцыі мяншыняў" (гэта значыць фармуляваць сваю палітычную праграму так, каб яна знаходзіла водгук у розных сацыяльных групах, часам зь несумяшчальнымі інтарэсамі ды прэфэрэнцыямі). Такая тактыка звычайная для бальшыні аўтарытарных рэжымаў, якія ў выніку няздольнасьці выпрацаваць сваю ўласную ідэалёгію замяняюць яе "клопатам пра кожнага чалавека". Адсюль усе Лукашэнкавы апартуністычныя зыгзагі ў рыторыцы — ад пагарджаньня беларускай мовай да ўслаўленьня беларускай незалежнасьці, ад дэманізацыі НАТО да "пагрозы" тэрмінова нармалізаваць стасункі з Захадам, ад "Славянскіх базараў" да параўнаньня самога сябе з "таварышам Сапегам", адсюль і Лукашэнкаў "doublespeak" — тэрміны накшталт "рынкавага сацыялізму", "праваслаўнага атэізму" ды, нарэшце, "поўная інтэграцыя з поўным сувэрэнітэтам". Раздваеньне Лукашэнкавай рыторыкі сьведчыць передусім пра "раздваеньне сьвядомасьці" ў беларускім грамадзтве ці, хутчэй, пра яго падзеленасьць на некалькі палітычных мяншыняў. Істотна, што "савецкая" меншыня знаходзіцца дзесьці пасярэдзіне паміж "нацыянальна-дэмакратычнай" ды "прарасійскай" мяншынямі. Акурат гэтая, прыкладна трэцяя частка грамадзтва, якая выступае і за інтэграцыю, і за сувэрэнітэт, дае пажыву для Лукашэнкавых апартуністычных выкрутасаў у рыторыцы — ад прызнаньня Расіі другой бацькаўшчынай беларускага народу да адстойваньня сьвятога права беларусаў на незалежнасьць і сувэрэнітэт — з заўсёднай падтрымкай адной з узаеманесумяшчальных пазыцыяў, вызнаваных бальшынёй грамадзтва. Становячыся на бок "сярэдняга выбарца", Лукашэнка мог таксама процістаяць нападкам унутранай апазыцыі, чые патрабаваньні поўнай незалежнасьці ўсё яшчэ не здабылі падтрымкі бальшыні. Такі манэўр дазваляў Лукашэнку камфортна адчуваць сябе ў Беларусі, ведучы, хоць і з паўзамі, перамовы з Крамлём. Пабочным эфэктам гэтых паўзаў, аднак, было запаволеньне інтэграцыйнага працэсу і зьмяншэньне цікавасьці да яго з боку грамадзтва. Лукашэнку даводзілася перасьцерагаць наконт гэтага сваіх прыхільнікаў у Расіі: "Маладое пакаленьне, якое сёньня ўступае ў вялікую палітыку, ня мае ўяўленьня пра жыцьцё ў Савецкім Саюзе, пра тое, як савецкія людзі дасягалі сваіх высокіх ідэалаў. Ідзе пераацэнка вартасьцяў. Старэйшае пакаленьне выцясьняецца прагматычнымі, жорсткімі "маладымі ваўкамі". Вось чаму мы ня можам, ня маем права зацягваць свае ваганьні на гады або дзесяцігодзьдзі"[19].

Па іроніі лёсу, калі Лукашэнкава здольнасьць маніпуляваць працэсам інтэграцыі ў сваіх

[19] Советская Белоруссия. 29 октября. 1999.

інтарэсах зрабілася відавочнай, у ягоных прыхільнікаў на расійскай палітычнай сцэне не засталося выбару, як прыняць прапанаваную Лукашэнкам мадэль саюзу. Нават Жырыноўскі, для якога Ўкраіна зь Беларусяй былі ня больш чым расійскімі правінцыямі, падтрымаў ідэю канфэдэрацыі на той падставе, што, паколькі нацыянальныя мяншыні ўжо карыстаюцца непрапарцыйна высокім прадстаўніцтвам на фэдэральным узроўні*, цалкам справядліва будзе дазволіць і намнога меншым славянскім суседзям сумесна кіраваць супольнай краінай.

Прагрэс ува ўтварэньні палітычнага саюзу эфэктыўна тармазіла ня толькі канкурэнцыя паміж кансэрватыўным Лукашэнкам і ягонымі расійскімі камуністычнымі ды нацыяналістычнымі прыхільнікамі, але і несумяшчальнасьць стратэгіяў асноўных палітычных актораў у Расіі й Беларусі, а таксама іх спадзяваньняў ад саюзу. Найбольш пажаданы эфэкт аб’яднаньня для аднаго з бакоў выглядаў зусім непрывабным для другога. Як вынік, працягваў трываць статус-кво.

Моцны супраціў інтэграцыйнаму праекту Лукашэнкі з боку значнай часткі расійскай палітычнай эліты ўрэшце прымусіў беларускага прэзыдэнта публічна спраставаць заявы аб ягоным намеры выкарыстаць саюз у якасьці пляцдарму для заваёвы Крамля: *“Расійскім грамадзянам увесь час уводзяць у вушы, што Лукашэнка разыгрывае расійскую карту ў сваіх палітычных інтарэсах. Што ён мроіць пра “шапку Манамаха”** і толькі для гэтага яму патрэбная дамова. Я не хачу гаварыць, наколькі гэтая правакацыя мяне абражае. Я яшчэ раз заяўляю з гэтай трыбуны: саюзная дзяржава ствараецца не дзеля задавальненьня амбіцый палітыкаў, а дзеля паляпшэньня жыцьця і задавальненьня інтарэсаў дзесяці мільёнаў простых людзей, нашых людзей”*[20].

Тым ня менш Лукашэнка працягваў настойваць на сваіх інтэграцыйных прапановах, аж пакуль ня стала ясна, што Расія, і перш за ўсё Ельцын, нізавошта ня пойдзе на ўтварэньне канфэдэрацыі. Адраджэньню ягоных надзеяў пасьля фінансавага краху 1998 году паспрыяў палітычны крызыс у Крамлі, які быў вырашаны праз прызначэньне новым прэм’ер-міністрам вэтэрана камуністычнай партыі й былога кіраўніка Службы вонкавай выведкі Яўгена Прымакова. Прымакоў здолеў хутка здабыць грамадзкую падтрымку ды неўзабаве стварыць сабе імідж самага прадказальнага палітыка ў краіне і найімавернейшага кандыдата ў пераемнікі Ельцына на пасадзе прэзыдэнта. Мабыць, Лукашэнка палічыў Прымакова патэнцыйным палітычным саюзьнікам дзякуючы прыхільнасьці новага прэм’ера да камуністаў, а таксама, ня выключана, з прычыны ягонага паважнага ўзросту. Апошняя акалічнасьць прадвяшчала зьяўленьне чарговага “крамлёўскага старца”, на фоне якога Лукашэнка зноў мог прадстаўляць сябе ў якасьці маладзейшай і здаравейшай альтэрнатывы. Апроч таго, паколькі расійскі эканамічны крызыс адгукнуўся ў Беларусі ростам сацыяльнай нездаволенасьці, Лукашэнка меў патрэбу ў хуткай палітычнай акцыі, каб супакоіць электарат хоць бы абяцаньнямі пазытыўных зьменаў. Тое самае трэба было і расійскаму прэзыдэнту, якога крытыкавалі, апроч унутраных справаў, за бязьдзейнасьць перад пэрспэктывай натаўскай ваеннай апэрацыі ў Косаве. Няздольнасьць расійскай дыпляматыі прадухіліць яе пагражала чарговы

* Напрыклад, і ў Эвенцкай аўтаномнай акругі з насельніцтвам трохі больш за шаснаццаць тысяч жыхароў, і ў дзесяцімільённай Масквы колькасьць прадстаўнікоў у Радзе Фэдэрацыі была аднолькавая — два чалавекі.

** Рэгалія вялікіх маскоўскіх князёў і расійскіх цароў да Пятра I.

[20] Прамова Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на пленарным паседжэньні Дзяржаўнай Думы Расійскай Фэдэрацыі 27 кастрычніка 1999 году.

раз прадэманстраваць слабасьць Ельцына і ўскладніць працэс перадачы ўлады пераемніку. Як гэта здаралася і раней, супадзеньне інтарэсаў абодвух бакоў нарадзіла новую інтэграцыйную кампанію. 25 сьнежня 1998 году Лукашэнка і Ельцын падпісалі дэклярацыю аб намеры стварыць Саюзную дзяржаву Беларусі й Расіі.

Палітычная сытуацыя ў Расіі, аднак, хутка мянялася. Ельцын, у рэшце рэшт, здолеў пазбавіцца ад Прымакова ў траўні 1999-га, а новы прэм’ер-міністар Сяргей Сьцяпашын — перакананы лібэрал, нягледзячы на колішнія сувязі з КДБ, — не выказваў захапленьня саюзам. Праект новай саюзнай дамовы, падрыхтаваны пад наглядам Сьцяпашына і вынесены на суд грамадзкасьці ў чэрвені, быў сустрэты Лукашэнкам з абурэньнем, паколькі ён не прадугледжваў самай важнай для яго пасады — пасады прэзыдэнта. Замест гэтага прапаноўвалася, каб усе саюзныя пастановы зацьвярджаліся прэзыдэнтамі дзьвюх краінаў, якія павінны былі падпісваць дакумэнты, прынятыя саюзным парлямэнтам і ўрадам. Гэтым самым праект абмяжоўваў магчымасьці інстытутаў, якімі мог бы пачаць маніпуляваць беларускі прэзыдэнт, што прэтэндаваў на значнейшую ролю ў расійскай палітыцы (г. зн. парлямэнту і Найвышэйшай Рады, дзе падтрымка расійскіх камуністаў забясьпечвала яму бальшыню галасоў, а значыць, і лідэрства ў саюзе). Да таго ж, сфэра паўнамоцтваў наднацыянальных органаў улады была моцна звужаная ў параўнаньні з тым, што прапаноўваў Лукашэнка. Усе разам узятыя, яны не пакідалі яму магчымасьці аказаньня найменшага ўплыву на расійскую ўнутраную палітыку. Лукашэнка абвясьціў праект дамовы “пустым”, абвінаваціў Сьцяпашына ў падрыве інтэграцыі й нават прыгразіў пераарыентаваць сваю замежную палітыку ды “нармалізаваць адносіны з Захадам”, калі Расія адмовіцца прыняць ягоныя ініцыятывы. Апошняя пагроза была ўспрынята Сьцяпашыным з іроніяй. Ён вітаў меркаваны паварот у беларускай замежнай палітыцы, адзначыўшы пры гэтым, што “саюз Беларусі й Расіі ніколі ня зьявіцца перашкодай для інтэграцыі ў Эўропу”[21].

## Лукашэнка і расійскія СМІ

Нягледзячы на ўсю спрэчнасьць палітычных дасягненьняў Расіі часоў Ельцына, адзін абсяг, у якім палітыка расійскага прэзыдэнта выразна кантраставала з Лукашэнкавай, усё ж быў. Маюцца на ўвазе сродкі масавай інфармацыі. Шырокая свабода прэсы і амаль поўная разьняволенасьць палітычных дыскусіяў у Расіі — дасягненьне, якое прызнаюць нават самыя зацятыя крытыкі Ельцына, — не маглі не аказваць уплыву на яе менш лібэральнага суседа. Беларусь мела надзвычай нізкі ўзровень разьвіцьця ўласных электронных СМІ. Нават пасьля абвяшчэньня незалежнасьці яна заставалася з адзіным агульнанацыянальным тэлеканалам, які знаходзіўся пад поўным кантролем рэжыму. Недастатковая яго прафэсійнасьць, аднак, прымушала гледачоў пераключаць свае тэлевізары на адзін зь пяці даступных расійскіх каналаў, што пераўзыходзілі БТ як па колькасьці аўдыторыі, так і па якасьці сваіх праграмаў. Магло падавацца, што ў сьвятле аб’яднаньня дзьвюх краінаў гэта не было заганай, а, наадварот, сьведчыла пра вялікі посьпех інтэграцыі ў гэтай сфэры, які прывёў да паглынаньня інфармацыйнага рынку ў Беларусі расійскімі тэлекампаніямі. Аднак Лукашэнка быў не ў захапленьні ад такога посьпеху. Пранікненьне расійскіх тэлеканалаў у глыбіню беларускай інфар-

[21] Белорусская деловая газета. 1999. 7 июля.

мацыйнай прасторы парушала манаполію дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі на асьвятленьне падзеяў і, такім чынам, пакідала апанэнтам прэзыдэнта пэўную магчымасьць данесьці свае крытычныя погляды да грамадзтва.

Першы канфлікт беларускага лідэра з расійскімі тэлеканаламі адбыўся пасьля таго, як тыя паказалі сцэны гвалтоўнага разгону менскіх мітынгаў вясной 1996 году. Лукашэнка накінуўся на кіраўніцтва вядучых тэлекампаній з абвінавачаньнямі ў прызначэньні ўласнымі карэспандэнтамі ў Менску "беларускіх нацыяналістаў — злосных ворагаў Расійскай Фэдэрацыі й адчайных праціўнікаў беларускага прэзыдэнта"[22]. Дарма што расійскія журналісты былі прадстаўнікамі "братняй краіны", падчас разгону дэманстрацый па іх ня раз прайшліся гумовыя дубінкі і сьлезацечны газ. На яшчэ большую нездаволенасьць Лукашэнкі, іхныя рэпартажы аб зьбіваньні і арыштоўваньні актывістаў апазыцыі выклікалі рэзкую рэакцыю з боку Ельцына, для якога падобны стыль кіраваньня быў ужо непрымальны. Лукашэнкаў гнеў тым часам перарос у пагрозы прыняць суровыя меры ў дачыненьні да расійскіх тэлежурналістаў. Аляксандар Ступнікаў, кіраўнік прадстаўніцтва НТВ у Беларусі, быў пазбаўленьны акрэдытацыі й выпраўлены з краіны, што, несумненна, ішло ўразрэз з Лукашэнкавым інтэграцыйным імпэтам. Сапраўды, выгнаньне грамадзяніна ў краіну, зь якой прадугледжвалася хуткае аб'яднаньне, можна было параўнаць хіба што з пазбаўленьнем савецкага грамадзянства найбольш вядомых дысыдэнтаў у часы Брэжнева. Цікава, аднак, што, апраўдваючы рэпрэсіі супраць незалежных журналістаў, афіцыйны Менск вымушаны быў часта спасылацца на сувэрэнітэт краіны і пратэставаць супраць умяшаньня Расіі ў тое, што ён лічыў сваімі ўнутранымі справамі.

У чэрвені 1997 году Павел Шарамет са сваёй здымачнай групай зрабіў рэпартаж пра адсутнасьць належнага пагранічнага кантролю на беларуска-літоўскай мяжы, у якім выказаў меркаваньне, што такое становішча можа выкарыстоўвацца карумпаванымі асобамі сярод беларускіх памежнікаў і мытнікаў для нелегальнай перапраўкі грузаў. Не прайшло і некалькіх дзён, як Шарамет са сваім памочнікам, апэратарам Зьмітром Завадзкім, быў арыштаваны па абвінавачаньні ў незаконным пераходзе дзяржаўнай граніцы. У жніўні яшчэ адна здымачная група ОРТ была затрымана з той жа прычыны. Арышты выклікалі буру крытыкі ў расійскіх СМІ, а таксама, што было трохі нечакана для Лукашэнкі, раздражненьне ў Крамлі. У ліпені губэрнатар Калінінградзкай вобласьці адмовіўся прыняць Лукашэнку ў сваім рэгіёне, абгрунтаваўшы гэта рознагалосьсямі паміж расійскім і беларускім лідэрамі ў справе Шарамета. Амаль адразу пасьля гэтага Ельцын выступіў з жорсткай заявай, запатрабаваўшы растлумачыць факт арышту і неадкладна вызваліць журналістаў. Лукашэнка быў абвінавачаны ў недружалюбных дзеяньнях, якіх нельга было б чакаць нават ад лютых ворагаў Расіі. Беларускі прэзыдэнт хутка адказаў на абвінавачаньні, растлумачыўшы рэзкасьць Ельцына інтрыгамі лібэралаў у ягоным атачэньні. Як заявіў Лукашэнка, Ельцын падпаў пад уплыў "лялькаводаў" Чубайса, Гайдара і іншых, якія "ненавідзяць усё расійскае" і хацелі б скарыстаць справу рэпарцёраў ОРТ для разбурэньня Саюзу Беларусі й Расіі[23]. Супрацьстаяньне нарастала. Прэс-сакратар Ельцына Сяргей Ястржэмбскі папярэдзіў, што "цярпеньне на зыходзе" і саюз чакае змрочная будучыня, пакуль Шарамет і ягоныя калегі ня будуць вызвале-

[22] Дракохруст Юрий, Фурман Дмитрий. Перипетии интеграции (Развитие процесса белорусско-российского объединения) // Белоруссия и Россия: Общества и государства. Москва: Правы чалавека, 1998. С. 352.

[23] Belarusian Monitor. 1997. 1 ліпеня.

ны. Нямцоў, тагачасны першы віцэ-прэм'ер, паабяцаў перагледзець графік пастаўкі энэрганосьбітаў у Беларусь. У рэшце рэшт, Лукашэнка яшчэ раз сутыкнуўся з пагардай Ельцына 2 кастрычніка, калі ягоны самалёт не пусьцілі ў паветраную прастору Расіі, сарваўшы тым самым заплянаваныя візыты ў Ліпецкую і Яраслаўскую вобласьці. Толькі пасьля такога націску апальныя рэпарцёры нарэшце былі вызваленыя. На працягу трох месяцаў адбыўся суд, які прысудзіў Шарамету і Завадзкаму адпаведна два і паўтара году пазбаўленьня волі ўмоўна. Як адзначылі назіральнікі, "адносіны паміж Лукашэнкам і Ельцыным ня вельмі сапсаваліся, паколькі яны ніколі не былі дужа добрыя"[24]. Дарма што інцыдэнт з журналістамі ОРТ быў вычарпаны, Лукашэнка працягваў "ставіць на месца" расійскія СМІ, як толькі яму надаралася такая магчымасьць. Ён, аднак, быў вымушаны цярпець прысутнасьць недружалюбных журналістаў, таму што адключэньне расійскіх каналаў з той пары, як яны зрабіліся ключавымі пастаўнікамі інфармацыі й забаўляльных праграмаў для беларускіх гледачоў, не магло абысьціся без скандалу. Такі крок быў бы зь вялікай незадаволенасьцю сустрэты ў Маскве і даў бы апанэнтам Лукашэнкі зручную магчымасьць абвінаваціць яго ў процідзеяньні інтэграцыі. Адзінай рэальнай умовай, пры якой стаўленьне расійскіх СМІ да Лукашэнкавых мэтадаў кіраваньня магло б памяняцца, было аднаўленьне ўціску незалежнай прэсы ў самой Расіі. Часткова гэтак сталася з прыходам Пуціна, чыё абыходжаньне з апазыцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі дапамагло яму разам з Лукашэнкам трапіць у сумнавядомы сьпіс дзесяці самых заўзятых праціўнікаў свабоднай прэсы, які штогод складаецца амэрыканскім незалежным "Камітэтам абароны журналістаў". Але нават новы расійскі лідэр палічыў патрэбным паклапаціцца аб вызваленьні некалькіх дзясяткаў расійскіх тэлежурналістаў, затрыманых пры разгоне шэсьця 25 сакавіка 2000 году, прымеркаванага да Дня Волі, які па сваёй бесцырымоннасьці пераўзышоў усе папярэднія акцыі беларускіх уладаў. І хоць імкненьне Пуціна ўзмацніць палітычны кантроль над незалежнымі СМІ зьменшала патэнцыйную небясьпеку для Лукашэнкі апынуцца пад зьнішчальным агнём крытыкі ў часе выбарчай кампаніі 2001 году (паводле некаторых зьвестках, адна праграма "Адзін дзень з Аляксандрам Лукашэнкам", паказаная на РТР за некалькі дзён да выбараў, падвысіла яго рэйтынг на адзінаццаць адсоткаў), выглядала на тое, што за аднаўленьне крамлёўскай падтрымкі давядзецца заплаціць цану, якая надоўга ляжа цяжарам на ягоны палітычны рэжым.

## Расійска-беларускі саюз: эканамічная выгада для Беларусі

Нельга аспрэчыць, што эканамічная інтэграцыя з Расіяй спрыяла ажыўленьню беларускай эканомікі й была для яе адзіным сродкам, здольным кампэнсаваць вынікі міжнароднай ізаляцыі, у якой краіна апынулася пасьля лістападаўскага рэфэрэндуму 1996 году.

Дасягненьне гандлёва-эканамічных прэфэрэнцыяў з боку Масквы за кошт саступак у вайсковай і палітычнай сфэрах зрабілася часткай стратэгіі беларускага прэзыдэнта, накіраванай на ўмацаваньне асабістай улады. Так, у сакавіку 1996 году ён вытаргаваў сьпісаньне аднаго мільярда даляраў беларускіх пазык Расіі, фармальна ў абмен на дазвол пакінуць

[24] Дракохруст Юрий, Фурман Дмитрий. Перипетии интеграции (Развитие процесса белорусско-российского объединения) // Белоруссия и Россия: Общества и государства. Москва: Правы чалавека, 1998. С. 356.

Аб’ём замежнага гандлю Беларусі, 1995—1999 гг., млн. даляраў ЗША.

| Год | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сукупны экспарт | 4,803 | 5,652 | 7,301 | 7,070 | 5,909 |
| Экспарт у краіны СНД | 3,027 | 3,764 | 5,379 | 5,160 | 3,622 |
| У тым ліку ў Расію | 2,185 | 3,024 | 4,730 | 4,608 | 3,222 |
| Доля Расіі ў сукупным экспарце, % | 45.5 | 53.5 | 64.5 | 65.2 | 54.5 |
| Экспарт за межы СНД | 1,776 | 1,888 | 1,922 | 1,910 | 2,287 |
| Сукупны імпарт | 5,564 | 6,939 | 8,689 | 8,549 | 6,674 |
| Імпарт з краін СНД | 3,677 | 4,570 | 5,817 | 5,554 | 4,289 |
| У тым ліку з Расіі | 1,965 | 3,522 | 4,673 | 4,670 | 3,767 |
| Доля Расіі ў сукупным імпарце, % | 35.3 | 50.9 | 53.8 | 54.7 | 56.4 |
| Імпарт з-за межаў СНД | 1,887 | 2,369 | 2,872 | 2,995 | 2,385 |

Крыніца: Economist Intelligence Unit.

на сваёй тэрыторыі расійскія вайсковыя базы. Праз год, падпісаўшы дамову аб стварэньні саюзу (дакладней, аморфнага аб’яднаньня дзьвюх асобна кіраваных краінаў) з Расіяй, Беларусь атрымала неабмежаваны доступ на расійскі рынак, а таксама магчымасьць набываць нафту і газ амаль па тых жа цэнах, што і расійскія спажыўцы (напрыклад, нафту па 50 даляраў ЗША за тону, што было прыблізна ўдвая ніжэй за сусьветную цану). Мытны саюз паміж дзьвюма дзяржавамі даў Беларусі кантроль амаль над 70 працэнтамі ўсяго расійскага экспарту і імпарту на Захад і з Захаду, якія праходзілі празь яе тэрыторыю. Мыты на расійскі імпарт зьбіраліся беларускімі ўладамі, і фармальна частка іх пераводзілася ў Расію. Аднак беларускі бок пасьля гэтага нярэдка заставаўся ў плюсе. Толькі ў 1998 годзе сума ўтоеных Беларусяй мытаў, спагнаных з імпартных аўтамабіляў, што пераганяліся ў Расію, склала каля 600 млн. даляраў.

Істотнай палёгкай Беларусі з боку Расіі былі ўмовы, на якіх ажыцьцяўляўся гандаль паміж дзьвюма краінамі. Толькі частка гэтага гандлю грунтавалася на грашовым разьліку, рэшту займалі бартэрныя ўгоды. Гандлёвая практыка паміж дзьвюма краінамі была такая, што завышэньне валютнага курсу, якое спадарожнічала ёй, не наносіла імгненнай шкоды беларускаму прамысловаму экспарту. Бартэрныя апэрацыі звычайна палягалі ў абмене таварамі на пэўную суму, выражаную ў далярах ЗША згодна з афіцыйным курсам. Дапусьцім, Расія дамаўлялася зь Беларусяй аб пастаўцы з аднаго боку нафты, а з другога — абсталяваньня на суму 1 мільярд даляраў. Аб’ём паставак з кожнага боку (г.зн. колькасьць тон нафты і адзінак тэхнікі) цяпер залежаў ад таго, як гэты бок ацэніць сваю прадукцыю ў даляравым эквіваленце. Паколькі беларусы вызначалі кошт сваіх трактароў ці цяжарнікоў у адпаведнасьці з афіцыйным курсам, які, скажам, на 30% перавышаў рынкавы, расійскія пакупнікі фактычна пераплачвалі 30% ад кошту тавару. Некаторыя тавары — хімічнае валакно, цукар — Расія такім чынам купляла ў Беларусі па цэнах, на 60% вышэйшых за сусьветныя[25]. Апрача таго, існаваньне клірынгавых мэханізмаў і бартэрных схемаў дазволіла Беларусі аплаціць значную частку сваіх пазык за энерганосьбіты куды хутчэй, чым калі б гэта адбывалася наўпрост. Як правіла, парадак узаемазалікаў быў такі. Беларускі ўрад улазіў у даўгі “Газпра-

[25] Белорусский рынок. 1997. 22 декабря.

Доля бартэру ў беларускім гандлю

| Экспарт | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 |
|---|---|---|---|---|
| Усяго | 27 | 34 | 37 | 26 |
| У Расею | 33 | 42 | 50 | 43 |
| За межы СНД | 10 | 17 | 11 | 8 |
| Імпарт | | | | |
| Усяго | 29 | 25 | 28 | 21 |
| З Расеі | 45 | 36 | 38 | 27 |
| З-за межаў СНД | 8 | 14 | 17 | 9 |

Крыніцы — Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусі, Economist Intelligence Unit, уласныя разьлікі.

му” за пастаўлены газ. У той самы час у канцэрну назапашвалася запазычанасьць па плацяжах у расійскі бюджэт, якімі расійскі ўрад зьбіраўся пакрыць свае расходы на Міністэрства абароны. Уключаўся клірынгавы мэханізм: беларускія ўлады дамаўляліся з вайскоўцамі пра пастаўкі прадуктаў харчаваньня ці тэхнікі, тым самым пакрываючы запазычанасьць перад імі з боку расійскага ўраду, апошні сьпісваў “Газпраму” ягоныя даўгі перад бюджэтам, а той, у сваю чаргу, залічваў беларускія неплацяжы. Суадносіны паміж коштам беларускіх тавараў і велічынёй сьпісаных пазык вызначаліся з дапамогай мэтаду “бюракратычнага гандлю”. Трэба адзначыць, што падобныя схемы маглі тарнавацца толькі пры ўмове спагаднага стаўленьня расійскага ўраду да бартэру ўнутры сваёй уласнай эканомікі й яго згоды на выплату падаткаў натурай. У 1997 г. цэнавыя дыспрапорцыі дапамаглі Беларусі зэканоміць каля 300 мільёнаў даляраў пры разьліку за энэрганосьбіты і ўпершыню пасьля 1990 году дазволілі дасягнуць дадатнага гандлёвага балянсу з Расіяй[26].

Утварэньне супольнасьці, а потым і саюзу спрыяла імкліваму росту расійска-беларускага гандлю, пераважна дзякуючы пашырэньню бартэрных схемаў, якія Лукашэнка актыўна лабіраваў падчас сваіх візытаў у расійскія рэгіёны.

Заслугоўвае ўвагі, што амаль палова беларускага экспарту накіроўвалася ўсяго ў адзін расійскі рэгіён — Маскву, чый гадавы бюджэт быў супастаўны з памерам беларускага ВУП. Адной з асноўных прычын гэтага было ўзьнікненьне ўзаемнай сымпатыі паміж Лукашэнкам і мэрам Масквы Юр’ем Лужковым, які ў той час лічыўся галоўным кандыдатам у не такой далёкай выбарчай гонцы 2000 году. Лужкоў здабываў выгаду зь ненатуральна высокай канцэнтрацыі капіталу і матэрыяльных каштоўнасьцяў у сваім месьце, якая давала яму кантроль над велізарнымі паводле расійскіх мерак грашовымі рэсурсамі, што паступалі ў выглядзе мясцовых падаткаў і збораў. Ён актыўна шукаў падтрымкі ў нацыяналістычных груповак і, нягледзячы на працяглы саюз зь Ельцыным, які трываў да 1998—99 гг., усё больш і больш схінаўся да антызаходняй і ксэнафобскай рыторыкі, імкнучыся заваяваць сымпатыі электарату ў правінцыі. Ягоная падтрымка Лукашэнкі выглядала часткай кампаніі па мадэрнізацыі іміджу колішняга дэмакрата і лібэрала. Гэтая дружба збольшага аплачвалася зь бюджэту Масквы, якая радыкальна мяняла сваю закупачную палітыку, аддаючы перавагу беларускім прадуктам харчаваньня, абсталяваньню, транспартным сродкам, будаўнічым матэрыялам і

[26] Тамсама.

г. д. перад заходнім імпартам, які быў запаланіў расійскую сталіцу на пачатку дзевяностых.

Спагаднае стаўленьне Расіі да беларускай запазычанасьці за энэрганосьбіты было чарговай крыніцай фінансаваньня "беларускага эканамічнага цуду". Гэта давала Беларусі штогадовую эканомію ў памеры 2,7% яе ВУП. Апроч таго, Беларусь увесь час перапрадавала расійскі газ і нафту, атрымліваючы іх па зьніжаных цэнах (часам амаль удвая меншых за тыя, якія панавалі на сусьветным рынку). Паколькі нафта і газ складалі амаль палову расійскага экспарту ў Беларусь, гэта была яшчэ адна істотная крыніца даходаў для беларускага бюджэту (хоць можна палічыць гэта платай Расіі за свабодны транзыт празь Беларусь сваіх энэрганосьбітаў). У цэлым суму штогадовых расійскіх датацыяў беларускай эканоміцы ў пэрыяд 1997—1998 гг. можна ацаніць у 1,5—2 мільярды даляраў[27].

Аналіз расійскіх эканамічных саступак Лукашэнку вядзе да высновы, што беларускі прэзыдэнт з посьпехам здолеў аднавіць, прынамсі ў эканамічнай сфэры, такі тып адносінаў паміж Беларусяй і яе колішняй мэтраполіяй, які меў месца ў савецкую эпоху і які зрабіў магчымым імклівую мадэрнізацыю беларускай эканомікі па заканчэньні другой сусьветнай вайны. Як і тады, Беларусь абменьвала свае пераацэненыя прамысловыя вырабы на недаацэненыя расійскія энэргарэсурсы, дзякуючы таму што грошы адыгрывалі малую ролю ўва ўзаемным гандлі. Таму стабільнасьць беларускага эканамічнага росту вызначалася першнаперш згодай Расіі на гэта і ейнай гатоўнасьцю падтрымліваць яго. У той жа час нейкіх падставаў меркаваць, што Расія ў хуткім часе зьменіць сваю палітыку, не назіралася. Падзеньне прэстыжу краіны на міжнароднай арэне і паступовая страта ўплыву ў межах СНД схілялі грамадзкую думку на карысьць захаваньня адзінага вернага саюзьніка любой цаной. Беларусь займала адно зь першых месцаў у расійскай ваеннай дактрыне; яна ахвотна ўдзельнічала ў нагнятаньні гістэрыі вакол пашырэньня НАТО і ўсё часьцей успрымалася як апора Расіі на захадзе. Нарэшце, беларускі "цуд" служыў для расійскіх левых важкім доказам таго, што камандную эканоміку рана сьпісваць з рахункаў. Падтрымка Лукашэнкі ў асяродзьдзі кансэрватыўна настроеных работнікаў расійскага дзяржаўнага апарату і, што найважнейшае, бальшынёй расійскага парлямэнту была моцнай, што давала яму магчымасьць безь перашкодаў выкарыстоўваць гэты палітычны капітал і ў Беларусі.

## Мытная і валютная інтэграцыя

У пачатку артыкулу я спасылаўся на структурныя тлумачэньні ды "савецкую спадчыну" як магчымыя перадумовы рэінтэграцыі Беларусі й Расіі. Аднак эканамічныя рэаліі й палітычныя стратэгіі, заснаваныя на "савецкім сымбалічным капітале", сталі перашкодай на шляху аб'яднаньня ў дзьвюх галінах, у якіх "інтэгратары" заўжды праяўлялі незвычайную актыўнасьць, — валютна-фінансавай і мытнай.

Пагадненьне аб мытным саюзе было з помпай падпісана 6 студзеня 1995 году. Дакумэнт мусіў быць ажыцьцёўлены ў дзьве стадыі. На першай скасоўваліся ўнутраная беларуска-расійская мяжа ды адбывалася ўніфікацыя гандлёвай палітыкі абедзьвюх краінаў. На другім меліся паўстаць супольныя памежныя войскі, а таксама супольнае мытнае заканадаўства. Аднак пасьля вядомага "выкапаньня" памежнага слупа Лукашэнкам і Чарнамырдзіным у

[27] Тамсама.

траўні 1995 году прагрэс у справе пабудовы мытнага саюзу запаволіўся. Прайшло шмат часу з моманту падпісаньня дамовы, у Беларусі ды Расіі існуюць розныя тарыфы на значную частку тавараў ды паслуг.

Вось няпоўны сьпіс парушэньняў дамоўленасьцяў.

У 1994 годзе прэзыдэнт Лукашэнка надаў кампаніі “Торгэкспа” права льготнага імпарту алькаголю, цыгарэтаў, аўтамабіляў замежнай вытворчасьці і г.д. Дзякуючы “дзірцы” на мяжы Беларусі і Расіі ў апошнюю было ўвезена тавараў на сотні мільёнаў даляраў, якія не абкладаліся расійскімі мытамі ды акцызамі. Лукашэнка сам прызнаўся, што падобныя льготы былі нададзеныя дзясяткам кампаніяў. Падобныя былі і ў Расіі. Бакі пачалі канкураваць міжсобку ў наданьні льготаў суб’ектам гаспадараньня (асаблівых посьпехаў тут дасягнулі бізнэс-структуры Расійскай праваслаўнай царквы).

У студзені 1996 году беларускі ўрад абнізіў мыта на імпартныя аўтамабілі, павялічыўшы тым самым імпарт “беларускіх” іншамарак у Расію. Прыкладна тады ж Беларусь стала актыўна рээкспартаваць расійскую нафту, таму што яна не абкладалася тымі ж экспартнымі падаткамі, як у Расіі. Як вынік, Наваполацкі ды Мазырскі нафтаперапрацоўчыя камбінаты былі загружаныя замовамі. Калі ў кастрычніку 1996 году гуманітарная дапамога ў Беларусі была пазбаўленая мытных збораў, у Расіі “чамусьці” павялічыўся імпарт харчаваньня і лекаў.

Расія адказала на злоўжываньні беларускага боку ўвядзеньнем абавязковай кампэнсацыі розьніцы паміж беларускімі ды расійскімі мытнымі зборамі. Пачынаючы з 1996 г. на беларуска-расійскай мяжы расійцамі былі абсталяваныя перасоўныя мытныя пункты, а з 1997 году ім быў нададзены статус рэгулярнай мытні. Больш за тое, Расія адмовілася ад свайго ранейшага абяцаньня прафінансаваць 50% кошту добраўпарадкаваньня “супольнай” мытнай мяжы на поўначы ды захадзе Беларусі. Замест гэтага яна выдзеліла 20% сродкаў, і тое ў выглядзе абсталяваньня, а ня грошай.

У лістападзе 1998 году прэзыдэнт Лукашэнка выдаў указ, які забараняў “неарганізаваны экспарт” харчаваньня ў Расію пад пагрозай канфіскацыі тавараў, сродкаў транспарту і штрафаў. У сакавіку 2000 году расійскі ўрад пазбавіў Беларусь статусу “краіны прызначэньня” пры спагнаньні падатку на даданую вартасьць з тавараў, якія накіроўваюцца ў Беларусь транзытам праз Расію. У верасьні 2000 году мытны кантроль экспарту ў Расію зноў быў уведзены ў Беларусі[28].

Палітычная “надбудова” мытнага саюзу, відавочна, увайшла ў супярэчнасьць з “базысам” супольных эканамічных інтарэсаў. Болей за тое, мытная інтэграцыя выклікала адзін з найбуйнейшых канфліктаў паміж “славянскімі братамі”. Пасьля размоваў аб узаемнай карысьці бакі пачалі падлічваць свае выдаткі ды суседзкія прыбыткі. Расійскія афіцыйныя асобы давалі самую розную ацэнку сваіх стратаў, ацэньваючы іх да 4 мільярдаў даляраў[29]. У той жа час адзіная мытная прастора не абыходзілася бяз стратаў і для Беларусі. Значная частка расійскага экспарту ў Беларусь была насамрэч рээкспартам тавараў з “далёкага замежжа”, якія ўвозіліся праз Расію (кампутары, бытавая тэхніка, бытавая хімія, адзеньне і г. д.) і за якія Беларусь не атрымлівала мытных паступленьняў[30]. Цяжка падлічыць страты й прыбыткі бакоў

[28] http://www.custom-house.ru/cgi-bin/db_new.cgi?mode=98

[29] Белорусская деловая Газета. 1997. 23 января.

[30] Романчук Ярослав. Белорусская газета. / 2000. 24 красавіка.

з-за недастатковай празрыстасьці мытнай палітыкі абедзьвюх краінаў. Можна толькі здагадацца, што з-за значна большага памеру расійскага рынку беларускі бок меў большыя магчымасьці ў “мытных гульнях”. У той жа час трэба зазначыць, што спалучэньне адчыненай унутранай мяжы і розных гандлёвых рэжымаў звонку стварала неабмежаваныя магчымасьці дзеля здабываньня рэнтаў на розьніцы ўва ўзроўнях тарыфаў. Пераможцамі былі тыя, хто быў здольны выбіць мытныя льготы ў адной краіне ды напоўніць рынак іншай таннымі таварамі. Аднак бюджэты абедзьвюх краінаў у такой гульні прайгравалі.

Калі ня браць пад увагу чыньнік карупцыі, дык стварэньне беларуска-расійскага мытнага саюзу дыктавалася тымі ж памкненьнямі, якія вызначалі беларуска-расійскія адносіны. Паколькі Беларусь адмовілася ад рэфармаваньня індустрыяльнай базы, беларускія эліты спадзяваліся атрымаць доступ да расійскага рынку, дзе яшчэ заставалася магчымасьць збыту неканкурэнтаздольных беларускіх тавараў. Таго ж самага дамагаліся і расійцы. Яшчэ ў 1995 годзе ў аналітычнай запісцы беларускага дыпляматычнага прадстаўніцтва ў Маскве гаварылася, што мытны саюз ствараецца Расіяй з мэтай “пастаўкі нам электронікі жоўтай зборкі, сыравінных ды будаўнічых матэрыялаў, якія не адпавядаюць сусьветным стандартам якасьці, абсталяваньня, самалётаў ды аўтамашынаў, якія цяжка прадаць на сусьветным рынку”[31]. На нейкі час такія ўзаемаадносіны спрыялі выжываньню неканкурэнтаздольных вытворчасьцяў у абедзьвюх краінах і ў першую чаргу ў Беларусі, якая пэрыяд структурнай перабудовы ды глыбокай трансфармацыйнай рэцэсіі ў Расіі выкарыстала для таго, каб ажывіць старую індустрыйную базу. Аднак, калі пэрыяд спаду скончыўся ды пачаўся хуткі эканамічны рост, высьветлілася, што тэмпы росту ў беларускай эканоміцы загамаваліся акурат у тых сэктарах, у якіх быў адзначаны буйны рост у Расіі.

Такім чынам, партнэры па саюзе становяцца найбольш жорсткімі канкурэнтамі на супольным рынку. У гэтых варунках зьяўляецца спакуса выкарыстаньня дзяржаўнага рэгуляваньня (у тым ліку і мытнай палітыкі) для павышэньня канкурэнтаздольнасьці сваіх вытворцаў. Болей за тое, розная структура беларускай ды расійскай эканомік спрыяе значнаму разы-

**Табліца 4.** Паказьнікі выпуску прамысловай прадукцыі ў Беларусі і Расіі, 1997—2001 гг.

| | 1997 B | 1997 R | 1998 B | 1998 R | 1999 B | 1999 R | 2000 B | 2000 R | 2001 B | 2001 R |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Хімія і нафтахімія | 19.4 | 2.0 | 7.7 | -6.6 | 7.0 | 21.7 | | 14.3 | 11.0 12.31* | 6.5 |
| Чорная металургія | 35.1 | 5.1 | 14.9 | -9.0 | N/a | 14.4 | | 15.6 | 8.3 | 0.0 |
| Машынабудаваньне і металаапрацоўка | 25.7 | 2.5 | 15.5 | -7.5 | 16.2 | 15.9 | | 15.1 | 2.1 | 7.2 |
| Будаўнічыя матэрыялы | 26.1 | -1.2 | 15.2 | -6.5 | 1.5 | 7.7 | | 7.6 | N/a | 5.5 |
| Лёгкая прамысловасьць | 27.1 | 0 | 22.8 | -14 | 10.8 | 20.0 | | 22 | 1.9 | 5.0 |
| Харчовая прамысловасьць | 21.0 | 0 | 19.2 | -2 | 14.4 | 7.5 | | 7.1 | 8.2 | 4.4 |

* Толькі нафтахімія.

Крыніцы — Міжнародны валютны фонд, Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусі, Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусі, Economist Intelligence Unit.

[31] Цыт. паводле: Белорусская деловая газета. 1997. 23 января.

ходжаньню прыярытэтаў у вызначэньні гандлёвага рэжыму. Беларускі тэлевізар “Гарызонт” мае шанец быць прададзеным на расійскім рынку толькі з усходнеязіяцкай “накрыпкай”. Беларускім вытворцам таму проста нявыгадна падтрымліваць расійскіх вытворцаў камплектуючых. Расійскім уладам, з свайго боку, няма падстаў бараніць свой унутраны рынак для “Гарызонтаў”, якія канкурэнтаздольныя на ім толькі дзеля дэмпінгавых цэнаў, па якіх яны прадаюцца. З той жа прычыны мала каму ў Беларусі выгадна бараніць рынак для “Жыгулёў”, а ў Расіі — для МАЗаў.

Пры далейшым разьвіцьці рынкавых адносінаў і дэпалітызацыі гандлю з адначасовым захаваньнем палітычнай незалежнасьці абедзьвюх краінаў гэтыя супярэчнасьці будуць паглыбляцца. Іх можна зьняць, прызнаўшы, што максымальна высокі ўзровень мытнай інтэграцыі паміж дзьвюма краінамі — гэта зона вольнага гандлю (бестарыфны ўвоз і вываз тавараў і паслуг, якія былі выробленыя ўнутры абедзьвюх дзяржаваў, пры захаваньні ўсіх атрыбутаў нацыянальнага гандлёвага рэжыму для гандлю з трэцімі краінамі). Фактычна на ўзроўні зоны вольнага гандлю мытная інтэграцыя паміж абедзьвюма краінамі ўжо даўно і спынілася.

Тыя ж самыя фактары, якія вынікаюць з структуры эканамікі і эканамічнай палітыкі, гамуюць **манэтарную** інтэграцыю. Напачатку артыкулу я ўжо апавядаў пра першае анэкдатычнае “аб’яднаньне грашовых сыстэмаў Расіі й Беларусі” і пра тое, чым яно скончылася. З адраджэньнем ідэі стварэньня грашовага саюзу ў 1998 годзе і падпісаньнем “Заявы аб стварэньні саюзнай дзяржавы” існасьць манэтарнай інтэграцыі амаль не зьмянілася. У гэтым пытаньні найбольш праявілася стратэгія беларускіх уладаў на спалучэньне “поўнай інтэграцыі” з “поўным сувэрэнітэтам”, на выкарыстаньне ўсіх патэнцыйных перавагаў саюзу (у гэтым выпадку — дасягненьня манэтарнай стабільнасьці за кошт увядзеньня валюты іншай дзяржавы) і адначасовае імкненьне пазьбегчы платы за гэтыя перавагі (у гэтым выпадку — адмаўленьня ад аўтаноміі пры вызначэньні нацыянальнай манэтарнай палітыкі праз формулу “адна валюта — два эмісійныя цэнтры”). Болей за тое, патрабаваньні беларускага боку да расійскага зь цягам часу сталі яшчэ больш суровымі. Калі Кебіч быў гатовы ўвесьці на тэрыторыі Беларусі расійскі рубель, то Лукашэнка з Пракаповічам цяпер патрабуюць увядзеньня прынцыпова новай наднацыянальнай валюты — саюзнага рубля. Ня будзем пераказваць аргумэнты, чаму беларускія прапановы для расійцаў цалкам непрымальныя і заўжды будуць блякавацца Расіяй. Адзначым толькі, што, па-першае, ужо на пачатковым этапе ажыцьцяўленьня захадаў, накіраваных на ўвядзеньне адзінай валюты, высьветлілася, што Расія пачала адсякаць Беларусі магчымасьць выкарыстоўваньня інтэграцыі як сродку ўніканьня рэформаў (уніфікацыя абменных курсаў — першае патрабаваньне Расіі на шляху манэтарнай інтэграцыі — значна павялічыла б колькасьць стратных прадпрыемстваў у Беларусі й паставіла б на парадак дня пытаньне рэструктурызацыі ды прыватызацыі). Па-другое, манэтарнае аб’яднаньне з даўжэйшай пэрспэктывы непазьбежна прывядзе да канфлікту ў вызначэньні манэтарнай палітыкі паміж абедзьвюма краінамі з рознымі структурамі эканомікі. Абменны курс расійскага рубля ў значнай ступені залежыць ад ваганьня сусьветных цэнаў на нафту. Падвышэньне цэнаў на нафту вядзе да прытоку замежнай валюты ў Расію ды павелічэньня рэальнага курсу расійскага рубля, а адначасова — да паніжэньня канкурэнтаздольнасьці прамысловага сэктару расійскай эканомікі. Беларусь жа можа карыстаць з гэтага толькі пры ўмове наяўнасьці ўласнай менш “цяжкай” валюты, якая дае магчымасьць беларускім таварам канкураваць на расійскім рынку дзякуючы іх нізкай цане (як ужо і было ў 1997—98 гг., калі пераацэнены расійскі рубель спрыяў беларускаму экспарту ў Расію). Пры наяўнасьці адзінай валюты ў

такіх варунках беларускую прамысловасьць чакае рэцэсія. Нават калі Беларусь атрымае некаторыя эканамічныя выгады ад увядзеньня супольнай валюты, яны наўрад ці пакрыюць як палітычныя, так і эканамічныя выдаткі ад гэткага кроку. Пагатоў што Беларусі яшчэ давядзецца прайсьці праз структурную перабудову эканомікі, якую ўжо даўно ажыцьцяўляе Расія, і канкурэнтаздольнасьць беларускіх вытворцаў яшчэ доўга будзе вызначацца, нават на расійскім рынку, нізкім коштам вытворчасьці, які ў кароткатэрміновай пэрспэктыве можна будзе забясьпечыць толькі паніжэньнем рэальнага абменнага курсу нацыянальнай валюты.

## Саюзны бюджэт і фінансава-прамысловыя групы

Дамовы аб стварэньні Супольнасьці і Саюзу Беларусі і Расіі 1996 і 1997 гг. прадугледжвалі наяўнасьць у новых утварэньняў уласнага бюджэту, зь якога павінны былі фінансавацца рознага роду сумесныя праграмы — эканамічныя, вайсковыя, культурныя, адукацыйныя і г. д. Шмат якія з гэтых так званых "саюзных праграмаў" мелі на мэце аднавіць супрацоўніцтва паміж высокатэхналягічнымі галінамі прамысловасьці Беларусі і Расіі, што дазволіла б пераадолець спад вытворчасьці і "разрыў вытворчых сувязяў", які адбыўся на пачатку 1990-х. У фантастычных марах прыхільнікаў інтэграцыі саюз мусіў ператварыцца ў бастыён супраць эканамічнай глябалізацыі й экспансіі заходніх транснацыянальных карпарацыяў на постсавецкай прасторы.

Памер саюзнага бюджэту, аднак, выявіў нерэальнасьць гэтых плянаў. Першы такі бюджэт, прыняты на 1998 год, меў велічыню ўсяго 60 млн. даляраў ЗША, што складала трохі больш за адзін працэнт ад афіцыйнага дзяржаўнага бюджэту Беларусі, менш чым адну дзясятую працэнту расійскага фэдэральнага бюджэту і, калі на тое пайшло, каля адной тысячнай ад сумы прафіцыту амэрыканскага бюджэту на той год. Прыкладна палова расходаў накіроўвалася на ўзмацненьне памежнай аховы, 17% ішло на фінансаваньне культурных мерапрыемстваў накшталт "Славянскага базару". Рэшта грошай расьцярушвалася больш чым на пяцьдзясят "саюзных праграмаў", ператвараючы бюджэт хутчэй у нязначную крыніцу дадатковых сродкаў для выбраных прадпрыемстваў, чымся ў эфэктыўны інструмэнт "агульнасаюзнай" прамысловай палітыкі.

Чарговым "грандыёзным" эканамічным праектам было абвешчанае ў наступныя два гады ўтварэньне больш як дзесяці фінансава-прамысловых групаў (ФПГ) з удзелам беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў і банкаў. Найбольш вядомымі (дакладней, сумнавядомымі) зь іх былі "БелРасАўта" — канцэрн, які прывязваў аўтамабільныя заводы Беларусі да расійскіх вытворцаў рухавікоў, "Элетэкс" — група, што аб'ядноўвала прадпрыемствы дзьвюх краінаў па вырабе тэлевізараў і камплектуючых да іх дзеля выкананьня праграмы "Саюзны тэлевізар", "Фармаш" — кансорцыюм хімічных вытворчых аб'яднаньняў, "Абаронныя сыстэмы" — альянс прадпрыемстваў вайсковага прызначэньня — і "Белаграінвэст", які яднаў вытворцаў мінэральных угнаеньняў. Стварэньню ФПГ спрыяў ня толькі палітычны націск з мэтай прадэманстраваць поступ саюзу, але і ўласныя інтарэсы прадпрыемстваў, якія сягалі далей за просты пошук партнэраў. Некаторыя зь іх, напрыклад "Беларуськалій", бачылі ў ФПГ надзею на прыход інвэстыцыяў ад расійскіх камэрцыйных банкаў, якія дапамаглі б зьмякчыць палітыку нацыянальнага ўраду па выпампоўваньні сродкаў з прамысловых вытворцаў, у тым ліку праз сыстэму множнасьці валютных курсаў. Для іншых, уключаючы ўдзельнікаў

“Абарончых сыстэмаў”, гэта была спроба аднавіць супрацоўніцтва ў межах некалі адзінага ВПК і сумесна пралабіраваць прыняцьце адзінага для абедзьвюх дзяржаваў пляну закупак вайсковай тэхнікі. Вытворцы, што ўваходзілі ў “БелРасАўта”, разьлічвалі захаваць манаполію — адны на пакупнікоў, а другія на рынкі збыту, а таксама спадзяваліся сумеснымі намаганьнямі спрыяць устанаўленьню высокіх мытаў унутры саюзу як на рухавікі, так і на аўтамабілі. Для многіх зь іх, аднак, гэта была проста зручная магчымасьць атрымаць дадатковыя бюджэтныя субсыдыі й гарантаваныя замовы.

Апошняе асабліва ярка прадэманстраваў правал праграмы “Саюзны тэлевізар”. Старт ёй быў дадзены ў 1998 годзе, а канчатковай мэтай быў перадзел расійска-беларускага рынку тэлевізійных прымачоў, 70% якога было захоплена замежнымі, пераважна азіяцкімі кампаніямі. Плянавалася, што да 2005 году доля тутэйшых вытворцаў дасягне 50%. Дзеля гэтага патрабавалася мадэрнізаваць тэхналягічны працэс і ўніфікаваць базу камплектуючых, наладзіўшы адзіную сетку распаўсюджваньня і тэхнічнага абслугоўваньня тэлевізараў усіх беларускіх і расійскіх прадпрыемстваў. У той час “тутэйшыя” вытворцы (пераважна беларускія “Гарызонт” і “Віцязь”) імпартавалі з “далёкага замежжа” амаль дзьве трацiны камплектуючых, паколькі вытворчасьць адных зь іх, улучаючы кінэскопы, перастала існаваць на тэрыторыі былога СССР, а іншыя не адпавядалі патрабаваньням якасьці. Будаўніцтва ўсяго аднаго заводу па вырабе сучасных кінэскопаў патрабавала 500 млн. даляраў, ці прыблізна дзесяці саюзных бюджэтаў. Ужо адно гэта выразна паказвала нерэалістычнасьць праграмы “Саюзны тэлевізар”. У выніку яе дзеяньне зьвялося да націску на вытворцаў з мэтай прымусіць іх купляць кінэскопы ў адзінага прадпрыемства такога профілю, што захавалася з часоў СССР, — заводу ў Варонежы, чыя прадукцыя значна саступала замежным аналягам як па якасьці, так і па цане. Гэты націск прывёў да выхаду з праграмы расійскага заводу “Рубін”, для якога залежнасьць ад паставак з Варонежу азначала страту канкурэнтаздольнасьці ягонай прадукцыі на фоне недарагіх і тэхналягічна прасунутых усходнеазіяцкіх тэлевізараў. Такое ж рашэньне прынялі й беларускія вытворцы, якія самі аддавалі перавагу кінэскопам фірмаў “Самсунг”, “Томпсан” і “Філіпс”, каб мець магчымасьць прадаваць свае тэлевізары на расійскім рынку. Праграма канчаткова развалілася, калі высьветлілася, што некаторыя яе расійскія ўдзельнікі атрымлівалі фінансаваньне з саюзнага бюджэту, не выконваючы абавязаньняў па распрацоўцы і вытворчасьці прадукцыі. Гэтае выкрыцьцё дало пачатак крымінальнаму расьследаваньню, праведзенаму расійскімі праваахоўнымі органамі.

ФПГ “БелРасАўта” напаткаў шчасьлівейшы лёс, паколькі яна дапамагла пашырыць вытворчасьць абодвум сваім асноўным удзельнікам — Менскаму аўтамабільнаму заводу і Яраслаўскаму заводу рухавікоў. Найбольш адчувальную дапамогу ад гэтай праграмы атрымаў яраслаўскі завод “Аўтадызэль”, які знаходзіўся на мяжы банкруцтва і на 1997 год амаль спыніў вытворчасьць. У значнай ступені палітычнае рашэньне аб працягу супрацоўніцтва з “Аўтадызэлем” і адхіленьні альтэрнатыўных прапановаў з боку такіх эўрапейскіх вытворцаў, як “Вольва” ці “Шкода”, паспрыяла зьніжэньню якасьці беларускіх цяжарнікоў, але затое дазволіла МАЗу амаль непадзельна панаваць на расійскім рынку (асноўны расійскі вытворца цяжарнікоў КамАЗ быў у той час у глыбокім заняпадзе), будучы пад абаронай яго мытаў. Усё гэта забясьпечыла пэўную карысьць абодвум бакам альянсу, якая, праўда, сталася сумнеўнай пасьля прыняцьця Эўрапейскім Зьвязам новых экалягічных стандартаў для рухавікоў “Эўра-2”. Ня здолеўшы дабіцца саступак, усходнеэўрапейскія (у тым ліку беларускія і расійскія) фірмы страцілі эўрапейскі рынак камэрцыйных перавозак, ільвіная доля якога была

захоплена імі раней пры дапамозе дэмпінгу. Хоць рухавікі, што адпавядалі стандарту “Эўра-2”, былі распрацаваныя ў Яраслаўлі, наладжваньне іх масавай вытворчасьці патрабавала салідных інвэстыцыяў, якіх ні фінансава-прамысловая група, ні саюзны бюджэт забясьпечыць не маглі. У выніку, нягледзячы на мытныя абмежаваньні, аднавілася канкурэнцыя на мясцовым рынку. Не спадзеючыся на Саюз, МАЗ шукаў выйсьця ў супрацоўніцтве зь нямецкім канцэрнам “МАН” і стварыў зь ім сумеснае прадпрыемства па вытворчасьці цяжарнікоў. “Аўтадызэль” тым часам апынуўся ў руках алюмініевай манаполіі “Сібал”, уладальнік якой Алег Дзерыпаскаператварыўся ў вядучага расійскага алігарха. Марачы стварыць уласную аўтамабільную імпэрыю, ён скупіў асноўныя аўтамабільныя заводы і аб’яднаў іх у холдынг. Статус “Аўтадызэлю” як манапольнага пастаўніка МАЗу палягчаў Дзерыпаску націск на Лукашэнку, каб той даў дазвол на прыватызацыю заводу і наступнае ўключэньне яго ў холдынг. У рэшце рэшт прыйшоў час плаціць за манапольны доступ на расійскі рынак стратай кантролю над прадпрыемствам.

## Вайсковае супрацоўніцтва

Беларусь атрымала ў спадчыну ад Савецкага Саюзу нямала ваеннага абсталяваньня, а таксама заводаў па яго вытворчасьці. Не ў апошнюю чаргу гэта здарылася таму, што тут знаходзілася, ува ўсіх значэньнях гэтага слова, трэніровачная база Савецкай арміі і жылі 250 тысячаў ваенных спэцыялістаў з найлепшай падрыхтоўкай, якую толькі маглі даць у СССР.

Вайсковае супрацоўніцтва паміж дзьвюма краінамі амаль не перапынялася з распадам Савецкага Саюзу, дарма што Беларусь вытрымала гадавую паўзу перад уступленьнем у Дамову аб калектыўнай бясьпецы краінаў СНД. 20 жніўня 1992 году Беларусь і Расія падпісалі пакет з 24 пагадненьняў, якія ўключалі 19 дакумэнтаў эканамічнай і 5 вайсковай накіраванасьці. Міністры Павал Грачоў і Павал Казлоўскі ўзгаднілі яшчэ 20 пытаньняў, у тым ліку праграму вываду зь Беларусі расійскіх вайсковых часьцей і вайсковага абсталяваньня, які павінен быў завяршыцца ў 1996 годзе, плян узаемадзеяньня паміж двума міністэрствамі абароны, вайсковыя аспэкты праекту ташкенцкай Дамовы аб калектыўнай бясьпецы (была падпісаная 15 мая 1992 г.), парадак вайскова-тэхнічнага супрацоўніцтва і сумеснай проціпаветранай абароны, пытаньні падрыхтоўкі пэрсаналу і зьнішчэньня вайсковай тэхнікі і г. д. Згодна з артыкулам 11 Статуту Саюзу Беларусі й Расіі, падпісанага 23 мая 1997 г., супольнымі абавязкамі дзьвюх дзяржаваў у дачыненьні адна да адной былі: “а) прыняцьце ў выпадку неабходнасьці сумесных мераў па прадухіленьні пагрозы сувэрэнітэту і незалежнасьці кожнай зь дзяржаваў — удзельніцаў Саюзу; б) каардынацыя дзейнасьці дзяржаваў — удзельніцаў Саюзу ў галіне вайсковага будаўніцтва і разьвіцьця іх узброеных сілаў, сумеснае выкарыстаньне вайсковай інфраструктуры і ўжываньне іншых захадаў з улікам інтарэсаў дзяржаваў — удзельніцаў Саюзу для падтрыманьня як іх абараназдольнасьці, так і абараназдольнасьці Саюзу ў цэлым; в) распрацоўка і разьмяшчэньне сумеснага абароннага заказу, забесьпячэньне на яго аснове паставак і рэалізацыі ўзбраеньняў і вайсковай тэхнікі, стварэньне аб’яднанай сыстэмы тэхнічнага забесьпячэньня ўзброеных сілаў дзяржаваў — удзельніцаў саюзу; г) ажыцьцяўленьне ўзгодненай памежнай палітыкі; д) барацьба з карупцыяй, тэрарызмам і іншымі відамі злачыннасьці”[32]. У сьнежні 1997 году

[32] Гл. http://terrorism.wallst.ru/zakon0027.htm.

была ўкладзеная Дамова аб ваенным супрацоўніцтве паміж Расіяй і Беларусяй. Яна прадугледжвала прыняцьце супольнай ваеннай дактрыны саюзу, стварэньне супольнай Калегіі міністэрстваў абароны, распрацоўку праграмы навучаньня беларускіх вайскоўцаў у расійскіх вайсковых навучальных установах і г. д. Згодна з Дамовай аб стварэньні Саюзнай дзяржавы 1999 г., на аснове беларускіх Узброеных сілаў і Маскоўскай вайсковай акругі мелася быць створана аб'яднаная расійска-беларуская вайсковая групоўка. Праект сумеснай ваеннай дактрыны быў падрыхтаваны ў 2001 годзе.

Найбольш прыкметнага прагрэсу аб'яднаньне ўзброеных сілаў дзьвюх дзяржаў дасягнула ў галіне проціпаветранай абароны. Страціўшы савецкія вайсковыя базы ў Прыбалтыцы, у тым ліку радыёлякацыйную станцыю ў Латвіі, расійскія вайскоўцы апынуліся ў вялікай залежнасьці ад падобных установак у Беларусі, паколькі ў паўночна-заходняй частцы Расіі іх аналягаў, што маглі б забясьпечыць надзейную абарону найважнейшага рэгіёну краіны, улучна з Масквой і Санкт-Пецярбургам, не было. Асновай супольных узброеных сілаў сталіся радыёлякацыйныя станцыі ў Заходняй Беларусі, якія засталіся ў спадчыну ад СССР і пасьля яго распаду пры дапамозе Расіі былі мадэрнізаваныя. (Станцыя радыёлякацыйнага і паветранага кантролю паблізу Ганцавічаў была перададзеная Расіі на 25 год у бясплатнае карыстаньне з умовай, што беларускім вытворцам будзе адкрыты доступ на расійскі рынак, а таксама будуць захаваныя пастаўкі танных энэрганосьбітаў.) Шчыльнае супрацоўніцтва беларускіх і расійскіх войскаў проціпаветранай абароны пачалося 1 красавіка 1997 году, а ў 2000 годзе адпаведныя сілы афіцыйна былі падпарадкаваныя супольнаму камандаваньню. Гэта павялічыла стратэгічнае значэньне Беларусі як "ваеннага шчыта" Расіі. Разам з гэтым вырасла вага і значэньне Лукашэнкі ў вачах расійскай вайсковай і палітычнай эліты, асабліва ў пэрыяд канфрантацыі з Захадам з прычыны пашырэньня НАТО на ўсход і апэрацыі ў Косаве.

Супрацоўніцтву ў сфэры абароны паспрыяла рэінтэграцыя беларускага і расійскага ВПК, якая актыўна ішла ў 1990-х гадах. Залежнасьць Расіі ад беларускага ВПК тлумачылася асаблівасьцямі закладзенай у савецкі час тэхналягічнай і вытворчай сыстэмы, якая рабіла неабходным удзел беларускіх прадпрыемстваў у вытворчасьці расійскай зброі. Напрыклад, знакамітыя ракетныя комплексы "С-300" і "Тополь-М" базаваліся на плятформе, што выраблялася Менскім заводам колавых цягачоў (МЗКЦ); беларускія радыёэлектронныя заводы выраблялі навігацыйныя сыстэмы для вайсковай авіяцыі. Утварэньне міждзяржаўных фінансава-прамысловых групаў пачалося ў 1995 г. з арганізацыі ФПГ "Граніт", што вырабляла прылады, неабходныя для мадэрнізацыі сыстэмаў проціпаветранай абароны. У 1997 годзе была створана ФПГ "Дакладнасьць", якая спэцыялізавалася на вытворчасьці і ўдасканаленьні процітанкавых і артылерыйскіх саманаводных комплексаў. Найбольш амбіцыйны праект супрацоўніцтва ў галіне абароны стартаваў у лютым 2000 году, калі была дасягнутая дамоўленасьць аб улучэньні шэрагу беларускіх абаронных прадпрыемстваў, у тым ліку МЗКЦ і Гомельскага радыёзаводу, у фінансава-прамысловую групу "Абарончыя сыстэмы" ("АС") — вайскова-прамысловы канглямэрат, у распараджэньні якога апынулася значная частка расійскіх абаронных заказаў. У кампэтэнцыю ФПГ "АС" увайшло таксама пераразьмеркаваньне фінансавых патокаў Міністэрства абароны і курыраваньне расійскага гандлю зброяй, у тым ліку сумнеўных паставак проціракетных комплексаў у Кітай і на Кіпр (група эфэктыўна кантралявалася холдынгам "Інтэррос" Уладзімера Патаніна — былога першага віцэ-прэм'ера Расіі й аднаго зь нямногіх алігархаў, які здолеў захаваць свой фінансавы і палітычны капітал пасьля крызысу 1998 году і прыходу да ўлады Пуціна). Посьпеху праекту "Абарон-

чых сыстэмаў” спрыяла занепакоенасьць Расіі недасканаласьцю колавых плятформаў, якія выкарыстоўваліся ў комплексах “С-300”, “Топаль-М” і “Пячора”, што падрывала эфэктыўнасьць расійскай проціракетнай абароны. Згодна з праектам, МЗКЦ атрымліваў буйныя інвэстыцыі на мадэрнізацыю вытворчасьці ад расійскіх камэрцыйных банкаў, што прапанавалі свае паслугі “Абарончым сыстэмам”. Росквіт гэтай і іншых фінансава-прамысловых групаў у межах ВПК забясьпечваўся павелічэньнем вайсковага бюджэту Расіі й закупак вайсковай тэхнікі ўнутры кріаны, а таксама аб’яднаньнем пляну гэтых закупак зь беларускім, якое было ажыцьцёўлена ў 2000 годзе. Апошняе міждзяржаўнае пагадненьне ў гэтай сфэры прадугледжвала ўтварэньне ФПГ “Аэракасьмічнае абсталяваньне” (“АКА”), у якую ўвайшлі й два беларускія прыладабудаўнічыя заводы. “АКА” спэцыялізуецца на вытворчасьці сыстэмаў катролю і сыгналізацыі для расійскіх рэактыўных зьнішчальнікаў “МіГ-29СМТ”, “Су-30МК” і баявых верталётаў “Чорная акула” — найдасканалейшай авіяцыі, што знаходзіцца на ўзбраеньні расійскай арміі. У той час як удзел беларускіх вытворцаў у пералічаных і іншых праектах быў ключавой умовай мадэрнізацыі расійскай арміі, ім гэта забясьпечыла стабільныя кантракты, загрузку і прыбытак, што ў канчатковым выніку паспрыяла ажыўленьню цэлага сэктару, да якога перад распадам СССР належала каля паловы беларускіх прамысловых прадпрыемстваў. У Лукашэнкі тым часам зьяўлялася зручная нагода выкарыстаць вайскова-прамысловы комплекс у якасьці казырнай карты ў эканамічных і палітычных стасунках з Расіяй.

Захаваньне абароннай прамысловасьці дазволіла Беларусі ў 1997 годзе папоўніць сьпіс дзесяці найбуйнейшых у сьвеце экспарцёраў зброі (Расія ў гэтым пераліку была другой пасьля ЗША). Хоць такі статус быў дасягнуты збольшага дзякуючы распродажу лішкаў перастарэлага абсталяваньня, якое засталося ад СССР (колькасны склад беларускіх узброеных сілаў у постсавецкі пэрыяд скараціўся з 350 000 да 80 000 чалавек), прадметам гандлю былі і некаторыя ўзоры высокатэхналягічнай зброі. Продаж узбраеньняў дзяржавам-ізгоям і ў “гарачыя пункты” плянэты выклікаў падазрэньні, што Беларусь служыць толькі пасярэднікам для расійскіх вытворцаў зброі, чый беспасярэдні ўдзел у такіх угодах мог бы прывесьці да пагаршэньня адносінаў Расіі з Захадам. Частковым пацьвярджэньнем гэтаму паслужыла тое, што ў асобных выпадках прадавалася зброя, прамысловая база для вытворчасьці якой адсутнічае ў Беларусі. Да сумнеўных паставак падобнага роду адносіцца продаж у 1999 г. васьмі рэактыўных зьнішчальнікаў “МіГ”, папярэдне пастаўленых Расіяй для беларускіх ВПС, у Альжыр (паводле справаздачы лёнданскага Інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў, іх колькасьць магла даходзіць да 64), чатырох самалётаў “Су” — у Анголу, амаль трохсот танкаў “Т-80” — у Паўночную Карэю і г. д. Апроч таго, выявілася, што зьнішчальнікі “МіГ”, у 1996 г. афіцыйна прададзеныя Беларусяй у Пэру, былі дастаўлены туды проста з аэрадрому “Сокал”, што ля Ніжняга Ноўгараду. Да таго ж, Расія празь нейкі час падпісала з Пэру кантракт на тэхнічнае абслугоўваньне самалётаў і, больш за тое, тады ж была заўважана ў пастаўках такіх самых зьнішчальнікаў у Эквадор, зь якім Пэру ў той час меў прыгранічны канфлікт. Цікава адзначыць, што некаторыя расійскія назіральнікі палічылі, нібыта Беларусь займала ў гэтым канфлікце бок Пэру, паколькі яна літаральна “перабіла” Расіі ўгоду дэмпінгавай цаной[33]. Хоць у сапраўднасьці гэта быў спосаб замаскаваць наўмыснае супрацоўніцтва, каб пазьбегнуць абвінавачаньня ў невыкананьні міжнароднага права, якое забараняе ад-

[33] http://projects.sipri.se/expcon/cis/rusbyr2.htm.

начасовы продаж зброі двум ваюючым бакам. (Адмовіўшыся ад гэтай мадэлі, у 1999 г. Расія адначасова паставіла зброю Эрытрэі й Этыёпіі, якія ў той час ваявалі міжсобку.)

## Прыход Пуціна

З абраньнем Пуціна прэзыдэнтам зьмяніўся палітычны кампанэнт расійска-беларускага саюзу. У адрозьненьне ад свайго папярэдніка, Пуцін быў пазбаўлены “комплексу віны” ў развале Савецкага Саюзу, які ўвесь час вісеў над Ельцыным. Карыстаючыся паўсюднай і ўсебаковай грамадзкай падтрымкай у сваёй краіне, Пуцін ня меў патрэбы ўцягвацца ў інтэграцыйныя гульні зь Беларусяй дзеля павелічэньня свайго палітычнага капіталу. У першы год ягонага прэзыдэнцтва Саюз Беларусі й Расіі служыў пераважна месцам ганаровай палітычнай ссылкі, куды можна было адправіць, зьняўшы з ключавых пасад ува ўрадзе, прадстаўнікоў ельцынскай “сям’і”. Такі лёс напаткаў Паўла Барадзіна, некалі ўсёмагутнага кіраўніка справаў прызыдэнта Ельцына, якога ў студзені 2000 году прызначылі сакратаром Саюзнай дзяржавы. Праз год Барадзін быў арыштаваны ў Нью-Ёрку на просьбу швайцарскіх уладаў, якія абвінавацілі яго ў атрыманьні хабару пры падпісаньні кантракту на рэканструкцыю Крамля са швайцарскай фірмай “Мабэтэкс”. Паказальна, што Пуцін адрэагаваў на арышт з прыметнай абыякавасьцю і пасіўнасьцю, чым даў зразумець, што Барадзін для яго застаецца ў большай ступені прадстаўніком групы канкурэнтаў у расійскай палітычнай эліце, чымся адной зь першых асобаў новай дзяржавы.

Пуцін памкнуўся палепшыць адносіны Расіі з Захадам, што ўрэшце прывяло да новага ўзроўню партнэрства паміж імі пасьля тэрарыстычнай атакі на ЗША 11 верасьня 2001 г. Паварот да прыязных стасункаў з Захадам пазбавіў кіраўніцтва Расіі неабходнасьці карміць грамадзтва ілюзіямі аднаўленьня былой велічы пры дапамозе псэўдаальянсаў з найменш паважанымі чальцамі міжнароднай супольнасьці. Усё гэта азначала просты выклік Лукашэнкаваму палітычнаму рэжыму і ягоным эканамічным плянам: у Расіі не было больш ні патрэбы, ні жаданьня плаціць за інтэграцыю зь Беларусяй. Замест гэтага далейшае эканамічнае і палітычнае збліжэньне павінна было аплачвацца беларускім кіраўніцтвам.

Апошнім ударам для “беларускай эканамічнай мадэлі” рызыкаваў стаць націск на Лукашэнку з боку расійскіх палітычных і дзелавых колаў, якія патрабавалі дазволу на прыватызацыю найсмачнейшых кавалкаў беларускай прамысловасьці расійскімі алігархамі.

У 2000 годзе кампанія “Ітэра” выказала зацікаўленасьць у атрыманьні кантролю над Беларускім мэталюргічным заводам (БМЗ), прадпрыемствамі нафтахімічнай галіны, тэлевізійнымі заводамі і г. д. Ёй удалося авалодаць 45% акцыяў “Белпаку” — манапаліста па вытворчасьці палімэраў у межах СНД. У 2001 годзе прэзыдэнт “Ітэры” абвясьціў пра свой намер інвэставаць у Беларусь звыш 200 млн. даляраў. Кампанія таксама вылучыла плян прыватызацыі “Беларуськалію”. Пры гэтым два прадпрыемствы, якія найбольш зацікавілі “Ітэру”, — “Беларуськалій” і БМЗ — прыносяць каля 60% валютных даходаў прамысловага сэктару Беларусі.

Раман Абрамовіч, на сёньняшні дзень вядучы расійскі алігарх, праявіў інтарэс да куплі кампаніі “Слаўнафта”. У Крамлі гэтую ўгоду ўхвалілі пасьля таго, як алігарх перадаў у рукі дзяржавы кантроль над тэлекампаніяй ОРТ. Расійскі “Аэрафлёт” ня тоіць інтарэсу да беларускай авіякампаніі “Белавія”. РАТ “АЭС Расіі” падпісала шматмільярдны кантракт на пастаўку электрычнасьці ў Польшчу і Нямеччыну, улучыўшы ў гэты праект і Бярозаўскую ДРЭС,

а таксама пачало перамовіны наконт укладаньня інвэстыцыяў у беларускія электрастанцыі і здабыцьця кантролю над імі.

2001 год адзначыўся тэндэнцыяй да павелічэньня прысутнасьці ў Беларусі расійскага капіталу. Алег Дзерыпаска, уладальнік "Сібалу", стварыў аўтамабільную холдынгавую кампанію "Распрамаўта", да якой захацеў далучыць і МАЗ. Дзеля гэтага ў кастрычніку 2001 году расійцы спрабавалі давесьці МАЗ да банкруцтва, калі Яраслаўскі маторны завод, частка Дзерыпаскавай аўтамабільнай імпэрыі й манапольны пастаўнік рухавікоў для МАЗу, рэзка павялічыў цэны на сваю прадукцыю, чым значна ўскладніў становішча менскіх партнэраў. Дзерыпаска выказаў ахвоту купіць і шэраг беларускіх прадпрыемстваў — пастаўнікоў камплектуючых для МАЗу.

Міністэрства сувязі аддало ліцэнзію другога апэратара сеткі GSM у Беларусі расійскай тэлекамунікацыйнай кампаніі "МТС", якой апякуецца мэр Масквы Юры Лужкоў. МТС абавязалася ў пяцігадовы тэрмін укласьці інвэстыцый на суму 190 млн. даляраў. Лужкову прыпісваецца і ініцыяваньне перамовінаў па аб'яднаньні НВА "Інтэграл" з высокатэхналягічнымі кампаніямі ў Зеленаградзе, што каля Масквы.

Шынны холдынг, кантраляваны банкам "Авангард", выказаў зацікаўленасьць у набыцьці кантролю над бабруйскім вытворцам шынаў "Белшына". Што да "Белшыны", то за кантроль над ёй змагаліся некалькі расійскіх кампаніяў, у тым ліку "Лукойл".

"Слаўнафта" прапанавала свой плян прыватызацыі нафтавага і хімічнага комплексу, уключаючы заводы "Азот" у Горадні і "Палімір" у Наваполацку. З "Слаўнафтай" супернічаў "Лукойл", кіраўніцтва якога паабяцала ўкласьці 1 мільярд даляраў у нафтаперапрацоўчы комплекс "Нафтан", заводы "Азот", "Палімір", а таксама ў магілёўскае "Хімвалакно" — зразумела, у абмен на кантроль над гэтымі прадпрыемствамі.

Кампанія "Балтыка", асноўны расійскі вытворца піва, імкнулася ўстанавіць кантроль над менскім бровaрам "Крыніцай", маючы намер укласьці ў яго 50 млн. даляраў. Падобныя праекты распрацоўваліся Ачакаўскім піўзаводам і Асацыяцыяй піваварaў Івана Таранава.

Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў'2001 "беларускае пытаньне", відаць, было вырашана ў Расіі шляхам угоды паміж зацікаўленымі асобамі. Найбольш уплывовае лобі, якое падтрымлівае Лукашэнку, утвараюць фінансава-прамысловыя групы, што выступалі эканамічнай базай "канструктыўнай" апазыцыі на чале зь Зюганавым, Селязьнёвым і Лужковым*. Калі таемнае пагадненьне сапраўды мела месца, значыць, Лукашэнка заплаціў за сваю перамогу шэрагам абяцаньняў і забавязаньняў.

## Высновы

Якім чынам дэкляраваная адмова ад нацыянальнай незалежнасьці і сувэрэнітэту магла спалучацца з умацаваньнем у Беларусі аўтарытарнай сыстэмы кіраваньня? З такога пытаньня пачынаўся гэты аналіз. І каб слушна адказаць на яго ў фінале, варта засумнявацца, ці сап-

* Гэта пацьвярджаецца тым, што ў ліку першых на ўдзел у беларускай прыватызацыі прэтэндавалі групы, чый уплыў у Расіі моцна пахіснуўся падчас кіраваньня Пуціна, — сярод іншых кампаніі "Лукойл", "Авангард", а таксама дзелавыя колы, зьвязаныя з Лужковым. Гэта, аднак, не датычыць "Альфабанку", "Ітэры" ды "Сібалу": іхны статус на працягу 2000—2001 гг. зьведаў павышэньне.

раўды палітыка будаўніцтва расійска-беларускага саюзу вядзе да здачы беларускай дзяржаўнасьці. У размовах пра саюз мінула больш за дзесяць год, былі падпісаны сама меней чатыры аснаватворныя дамовы, але расійска-беларуская дзяржава існуе пераважна на паперы. Іронія лёсу палягае ў тым, што працэс палітычнага аб'яднаньня, які гамавала раскручваньне Лукашэнкам свайго грандыёзнага, непрымальнага для Расіі канфэдэрацыйнага праекту, і Лукашэнкава стаўка на савецкія мэтады кіраваньня эканомікай і палітыкай, што прывялі да разыходжаньня шляхоў посткамуністычнага разьвіцьця дзьвюх дзяржаваў, мог быісьці куды шпарчэй пры менш амбіцыйным лідэру ў Менску.

Гаворачы гэта, нельга адмаўляць відавочнага посьпеху інтэграцыі ў паасобных сфэрах (разам з поўным яе правалам у іншых). Прагрэс быў дасягнуты там, дзе адрозьненьні ў эканамічным, палітычным і грамадзкім ладзе дзьвюх краінаў былі найменшыя, а суладнасьць памкненьняў двух бакоў — найбольшая. Тут крыецца адказ на другое пытаньне, пастаўленае ў гэтым аналізе: якім чынам працэс аб'яднаньня паміж аўтарытарнай Беларусяй і дэмакратызаванай ды рынкавай Расіяй мог спрыяць умацаваньню беларускага рэжыму? У некаторай ступені інтэграцыя зь Беларусяй была сапраўдным выпрабаваньнем для расійскіх рэформаў. Яе аналіз дэманструе жывучасьць "бюракратычнага гандлю" і бартэрных пагадненьняў у эканоміцы; брак фінансавай дысцыпліны з боку расійскага фэдэральнага ўраду; само ажыцьцяўленьне беларуска-расійскай інтэграцыі не было б магчымае без грубага ўмяшаньня ў справы бізнэсу многіх расійскіх рэгіянальных лідэраў, чыя схільнасьць да ўсталяваньня міні-аўтакратыяў у сваіх рэгіёнах рабіла іх натуральнымі палітычнымі саюзьнікамі Лукашэнкі; завуаляваная дружба Расіі з краінамі-ізгоямі, прыхільнасьць вайсковай і палітычнай расійскай эліты да рыторыкі і сьветаўспрыманьня часоў "халоднай вайны", гонка расійскіх алігархаў за палітычнай і эканамічнай магутнасьцю, а таксама схільнасьць расійскага дзяржаўнага апарату да хабарніцтва і карупцыі. Наяўнасьць усіх гэтых зьяваў (якія сьведчаць, што ў Расіі яшчэ мала ўмацаваліся новыя вартасьці — дэмакратыя і рынкавая эканоміка) і дазволіла аб'яднаньню прасунуцца настолькі, наколькі палітычныя амбіцыі Лукашэнкі й ягоная ўнутраная палітыка адпавядалі інтарэсам найбуйнейшых палітычных, эканамічных і вайсковых колаў Расіі, якія імкнуліся ў абмен на падтрымку беларускага прэзыдэнта атрымаць бясплатны транзыт, доступ да вайсковай інфраструктуры, магчымасьць няблага нажыцца на саюзных праграмах і г. д. Усюды, дзе адрозьненьні паміж Расіяй і Беларусяй праяўлялася выразна, інтэграцыя спынялася, а яе нарошчваньне пагражала Лукашэнку дэстабілізацыяй створанага ім рэжыму. Так было і са сродкамі масавай інфармацыі, і са спробай падзяліць кантроль над уласнасьцю паміж беларускімі ўладамі ды расійскімі алігархамі і г.д.

Прыход у Крэмль новага лідэра — Уладзімера Пуціна — зрабіў Лукашэнкавы надзеі на большую ролю ў расійскай палітыцы абсалютна нерэальнымі: згодна з апытаньнямі грамадзкай думкі, Лукашэнка страціў шанец выйграць гіпатэтычныя выбары прэзыдэнта Саюзнай дзяржавы нават у сваёй краіне. Курс Пуціна на эканамічную лібэралізацыю стаўся сур'ёзным выклікам для "беларускай эканамічнай мадэлі": ёй давялося прыстасоўвацца да павелічэньня ролі рынкавых мэханізмаў у эканоміцы суседняй дзяржавы (гэта выявілася ў адмове ад бартэру і зьмяншэньні долі "бюракратычнага гандлю", зьніжэньні падаткаў і правядзеньні больш рэалістычнай грашова-крэдытнай палітыкі, што паспрыяла ажыўленьню расійскіх вытворцаў, і г. д.). Расійскае кіраўніцтва ўжо ня хоча бесьперапынна датаваць Беларусь наўзамен за яе гатоўнасьць быць адзіным палітычным саюзьнікам Масквы. Нарэшце, паварот у расійскай вонкавай палітыцы да зьбліжэньня і супрацоўніцтва з Захадам падарваў значэньне

беларускага кіраўніцтва як рупару антызаходняй рыторыкі. Пры захаваньні такіх тэндэнцыяў зьнікненьне ключавых перадумоваў, што стымулявалі разьвіцьцё расійска-беларускіх адносінаў на працягу 90-ых гг., можа ператварыць "расійскі фактар" з гаранту стабільнасьці ў патэнцыйную крыніцу небясьпекі для асабістай улады Лукашэнкі.

Застаецца высьветліць, ці не прывядуць ужо гэтыя зьмены Беларусь праз нейкі час да страты незалежнасьці? Хачу адразу засьцерагчы, што пытаньне незалежнасьці для невялікай дзяржавы, якая шчыльна інтэграваная ў сусьветную эканоміку (хай і зь вялізным перакосам на карысьць усходняй суседкі) — гэта не пытаньне пазбаўленьня ад вонкавага эканамічнага і палітычнага ўплыву. У гэтым "максымалісцкім" трактаваньні ў сёньняшнім сьвеце незалежнымі ня ёсьць ані малыя дзяржавы (такія, як Летува ці Данія), ані вялікія (такія, як Расія ці нават сама Нямеччына). Незалежнасьць у эпоху глябалізацыі — гэта перадусім захаваньне інстытутаў дзяржаўнасьці, легітымнасьці прэтэнзіі на дзяржаўны сувэрэнітэт, а таксама здольнасьць самастойна вызначаць стратэгію існаваньня, разьвіцьця і адаптацыі собскай краіны ува ўзаемазьвязаным свеце.

Дарма што найбольш істотным вынікам інтэграцыі сталася канцэнтрацыя ў Расіі бальшыні палітычных, эканамічных і вайсковых вагароў уплыву на ўнутрыбеларускую палітыку і тэарэтычна гэтыя вагары могуць быць ужытыя для інкарпарацыі Беларусі ў склад Расіі, шанцаў на фармальную страту Беларусяй дзяржаўнасьці вельмі няшмат. Па-першае, для гэтага сёньня патрэбны рэфэрэндум у Беларусі, які Расія, пры цяперашнім стане адносінаў зь міжнароднай і перадусім эўраатлянтычнай супольнасьцю, наўрад ці захоча праводзіць па Лукашэнкавым сцэнары. Вядома, Расія здольная, у разе адмысловай патрэбы, парушаць міжнароднае права і супрацьставіць сябе зноў Захаду. Але колькі за гэта давядзецца заплаціць дзяржаве, якая, нягледзячы на арсэнал ядравай зброі, уяўляе сабой краіну трэцяга сьвету з пункту гледжаньня ўзроўню жыцьця і структуры нацыянальнае эканомікі, характару інтэграцыі ў міжнародную гаспадарку, і якой Захад дазволіў павялічыць экспарт нафты ў абмен на ляяльнасьць да эўраатлянтычнай глябальнай палітыкі? Ці згодзіцца расійская палітычная й эканамічная эліта несьці выдаткі й страты, якія настануць пасьля такіх захадаў? Да таго ж, павелічэньне ў цяперашні пераходны пэрыяд падтрымкі беларускай незалежнасьці і сувэрэнітэту як беларускім грамадзтвам, так і яго палітычнымі ды эканамічнымі элітамі, абумоўленае імкненьнем Лукашэнкі "дасягнуць немагчымага", робіць малаверагодным дадатны вынік такога галасаваньня што да адзінага варыянту аб'яднаньня, на якім настойвае Расія, — да ўваходжаньня Беларусі ў склад гэтай краіны на правах суб'екта фэдэрацыі. Да таго ж, беларускія палітычныя эліты, асабліва тая яе частка, якая гуртуецца вакол Лукашэнкі, заўсёды маюць магчымасьць заблякаваць рэфэрэндум аб інкарпарацыі. Пытаньне ж аб саюзе дзьвюх дзяржаваў выносіць на рэфэрэндум не выпадае, бо гэты варыянт інтэграцыі не задавальняе ўжо Расію. Па-другое, прынамсі цяпер адміністрацыя Пуціна на першае месца ў адносінах зь Беларусяй ставіць эканамічныя, а не палітычныя і геастратэгічныя чыньнікі, тым самым аддаючы перавагу менш відавочнаму, але ня менш дзейснаму спосабу абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў. Па-трэцяе, тут важную ролю выконвае яшчэ адзін чыньнік: Расія апошнім часам намагаецца кампэнсаваць страту геапалітычнага ўплыву ў Цэнтральнай Азіі пашырэньнем свайго ўплыву ў эўрапейскай частцы СНД, прычым ня толькі ў Беларусі, але і ўва Ўкраіне. Таму інкарпарацыя Беларусі ў любой форме будзе азначыць крах шырэйшай расійскай палітыкі на захадзе СНД. Паглынуўшы Беларусь, расійцы могуць страціць свае ранейшыя здабыткі і прысьпешыць інтэграцыю Ўкраіны і Малдовы ў эўраатлянтычную супольнасьць.

У пляне эканомікі можна зрабіць наступную выснову. Беларуска-расійская інтэграцыя заходзіла настолькі далёка, наколькі яна дазваляла Лукашэнкавай Беларусі існаваць як дзяржаве-кліенту Расіі. Але ж і Расія магла дазволіць сабе ўтрымліваць Беларусь у такім стане толькі таму, што яна сама была дзяржавай-кліентам Захаду (гл. падрабязьней наш артыкул пра эканамічную палітыку — **Аўт.**)! І вось, калі адна кліентура фактычна сканала пасьля 17 жніўня 1998 году (адцяпер Расія мусіла жыць па сродках, што зусім няблага адбілася на ейным эканамічным становішчы), то і другая кліентура мусіла зьнікнуць.

Наступствы павелічэньня ўплыву расійскага капіталу на Беларусь, улучна з прыватызацыяй расійскім капіталам беларускай прамысловасьці, спрагназаваць пакуль цяжка, таксама як і патэнцыйны аб'ём пранікненьня расійскага капіталу ў Беларусь. Імавернасьць таго, што частка беларускай эканомікі, якой ён завалодае, будзе проста "выключаная зь яе кантэксту" і пераведзеная ў стан самадастатковага сэктару, для якога будуць створаныя адмысловыя, цяплічныя ўмовы, дзякуючы якім будзе існаваць магчымасьць атрыманьня супэрпрыбытку ў Беларусі ў абмен на фінансавую падтрымку пануючага рэжыму, мізэрная. Каб такое было магчымым (і гэта паказвае досьвед краінаў трэцяга сьвету, дзе замежныя карпарацыі калісьці існавалі ў такіх "цяпліцах"), патрэбны вялікі і замкнёны ўнутраны рынак збыту: ані першага, ані другога ў Беларусі не існуе. Болей за тое, досьвед уваходжаньня кампаніі "Балтыка" на беларускі рынак "пад гарантыі прэзыдэнта" ўжо засьведчыў цану гэтых гарантыяў і прадэманстраваў патэнцыйную рызыку інвэставаньня ў Беларусь нават расійскага капіталу (здаецца, нават з "Макдональдсам" абышліся больш гуманна). Нават пры палітычнай падтрымцы Крамля без стварэньня элемэнтарных базавых рынкавых перадумоваў каналы расійскага капіталу для пранікненьня ў Беларусь застаюцца вельмі вузкімі (гэта датычыць і буйных карпарацыяў, якім цяжэй вярнуць свае інвэстыцыі, чым той жа "Балтыцы"). А гэта значыць, што ізноў будзе ўзьнятае пытаньне аб рэфармаваньні беларускай эканомікі. Калі Лукашэнка ня здолее ці не захоча правесьці рэформаў, то зь цягам часу перад Беларусяй устане пытаньне не мадэрнізацыі, а замены яе тэхнічна-індустрыйнай базы, якая цяпер мэтадычна "праядаецца" для забесьпячэньня кароткатэрміновай палітычнай стабільнасьці (у 2000 годзе пры ўзроўні вытворчасьці ў памеры 100,8% да 1990 году ўзровень інвэстыцыяў ледзь дасягнуў 44% ад ўзроўню 1990 г.). А такая "замена", як паказвае досьвед пераходных эканомік, узмацняе ролю транснацыянальных карпарацыяў, а не тутэйшых алігархаў. Але калі гіпатэтычна ўявіць, што правілы гульні такі зьменяцца і расійскія інвэстыцыі прыйдуць пры Лукашэнку, то хутчэй за ўсё само рэфармаваньне эканомікі выкліча працэс эканамічнай дэзынтэграцыі. Лёгіка тут простая — як я стараўся паказаць, інтэграцыя найлепш ішла паміж гэтак званымі нярынкавымі сэктарамі ў расійскай і беларускай эканоміцы. Выглядае, што запачатканьне эканамічных рэформаў у Беларусі непазьбежна прывядзе да стану на пачатак-сярэдзіну 1990-х гг., калі гандлёвыя сувязі з Расіяй былі ўжо амаль што збалянсаваныя сувязямі з Захадам. Ужо цяпер Беларусі патрабуюцца заходнія інвэстыцыі для таго, каб быць канкурэнтаздольнай нават на расійскім рынку, таксама як расійцам патрабуецца заходні капітал, каб утрымацца на сваім уласным. Дарэчы, ня варта забывацца, што некаторыя з расійскіх кампаніяў, якія спрабуюць ці спрабавалі інвэставаць у Беларусь, на самай справе кантралююцца заходнімі інвэстарамі. Гэтая праблема набудзе яшчэ большую актуальнасьць пасьля ўступленьня Расіі (а некалі, магчыма, і Беларусі) ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю, што паставіць шэраг яе (таксама і нашых) прамысловых сэктараў у варункі міжнароднай канкурэнцыі.

Падсумоўваючы, можна канстатаваць, што на сёньняшні дзень магчымы (але не гарантаваны) прыход расійскага капіталу ў Беларусь ня дасьць ані палітычнага, ані эканамічнага адказу на выклікі глябалізацыі. Таму гэты прыход я б разглядаў акурат як выклік, а не як пагрозу. Для малой краіны і адкрытай экономікі адэкватны (і адзіны) адказ на аднабаковую залежнасьць — гэта “дывэрсыфікацыя залежнасьці”. Гэта значыць, што ў будучым адзінае, што можа рэальна зьменшыць патэнцыял трансфармацыі эканамічнага ўплыву ў шчыльнейшую палітычную залежнасьць, — гэта паступовае наладжваньне гандлёвых, інвэстыцыйных і да т.п. сувязяў з разьвітымі заходнімі экономікамі. “Трэцяга шляху” для Беларусі няма і ня будзе.

## СТРУКТУРА РАСІЙСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ЭЛІТАЎ І ІХ СТАЎЛЕНЬНЕ ДА БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Беларуска-расійская інтэграцыя ня ёсьць тэмай, якую замоўчваюць, хутчэй наадварот. Пра інтэграцыю пішуць вельмі часта як у Беларусі, так і ў Расіі. У гэтым шматслоўі вельмі цяжка зразумець, што ж адбываецца насамрэч. Якім чынам можна апісаць адносіны паміж Расіяй і Беларусяй? Бачаньне інтэграцыі ў Беларусі пазначана радыкальным падзелам на яе прыхільнікаў і праціўнікаў. Агульны тон дэбатаў паміж першымі і другімі вельмі ірацыянальны й заідэалягізаваны. Таму такія дэбаты, як правіла, не даюць адказу на пытаньне, якія выгады і пагрозы прыносіць інтэграцыя беларускай дзяржаве, як і наколькі гэта адпавядае беларускім нацыянальны інтарэсам. Афіцыйны падыход можна коратка апісаць наступным чынам: інтэграцыя разглядаецца з пазыцыі “што выгадна і што нявыгадна” для асабістай улады прэзыдэнта Лукашэнкі, дзеля гэтага адбываецца падмена дзяржаўных інтарэсаў “прыватнымі інтарэсамі” каляўладнай групоўкі*. Спэктар іншых поглядаў вар’юецца ад скрайняга непрыняцьця інтэграцыі** да больш памяркоўнай пазыцыі — прызнаньня мэтазгоднасьці эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй***.

Як ставяцца да беларуска-расійскай інтэграцыі ў Расіі, дакладней, якая ёсьць пазыцыя расійскіх элітаў? Аб’ектам нашага аналізу будзе дынаміка, ці, хутчэй, эвалюцыя ў стаўленьні расійскіх элітаў да паняцьця інтэграцыі як аднаго з тыпаў стасункаў паміж новымі незалежнымі дзяржавамі, былымі рэспублікамі СССР, у асобным выпадку — да беларуска-расійскай інтэграцыі. Для гэтага трэба зразумець пазыцыі актораў, што бяруць удзел у гэтых працэсах з расійскага боку. Апрача гэтага, трэба адказаць на пытаньне: ці сапраўды сярод расійскіх элітаў існуе *карэнны* інтарэс да інтэграцыі як да аб’яднаньня дзьвюх дзяржаваў на раўнапраўнай аснове? Ці не тлумачыцца гэтая зацікаўленасьць толькі ўнутранымі фактарамі

* Прыкладам гэтага ёсьць заява, зробленая А. Лукашэнкам падчас аднаго з паседжаньняў Найвышэйшай дзяржаўнай рады Саюзнай дзяржавы ў (сьнежані 2001 г.): “Курс на збліжэньне з Расіяй ёсьць прыярытэтнай неабходнасьцю, тым часам як адыход ад гэтага курсу будзе для нас палітычнай сьмерцю”. Цыт. паводле інтэрнэт-выданьня “LENTA.RU”: “Лукашенко признался, что без союза с Россией ему труба”, 12 сьнежня 2001, http://lenta.ru/russia/2001/12/26/meeting/.

** Асноўнымі праціўнікамі інтэграцыі з Расіяй ёсьць прадстаўнікі правых партыяў (КХП-БНФ, БНФ “Адраджэньне”, БСДГ С. Шушкевіча).

*** Гэтай пазыцыі прытрымліваюцца досыць розныя па сваіх праграмных поглядах партыі — ад правых лібэралаў (АГП) да камуністаў.

(змаганьне за ўладу), ці не разглядаецца інтэграцыя як адзін з элемэнтаў новага ўзмацненьня Расіі, аднаўленьня імпэрыі?

Адной з найбольшых праблемаў пры вывучэньні стаўленьня элітаў да якойсьці ўнутранай праблемы ці прыярытэтаў вонкавай палітыкі ёсьць акрэсьленьне кола актораў, якія ўдзельнічаюць ў выпрацоўцы гэтага стаўленьня. Трэба ўлічваць, што сама інтэграцыя на постсавецкай прасторы часта ёсьць штучным, кан'юнктурным адказам на новапаўсталую палітычную рэчаіснасьць, сродак у барацьбе за ўладу некаторых рэгіянальных лідэраў.

## 1. Некаторыя заўвагі да паняткаў "эліта" і "інтэграцыя" ў расійскім кантэксьце

Каб зразумець эвалюцыю расійскіх элітаў, трэба разгледзець перадгісторыю іх зьяўленьня, таксама варункі працяканьня "трансфармацыйных працэсаў" у Расіі цягам астатніх дзесяці гадоў.

### 1.1. Праблема палітычнай эліты ў Расіі

За савецкімі часамі ў СССР існавалі хутчэй не палітычныя эліты, а палітычная кляса. Прычынай гэтага была адсутнасьць мінімальнай разнароднасьці ўнутры кіруючай верхавіны савецкага грамадзтва з мэханізмам функцыянаваньня, кантролю і рэкрутаваньня кадраў.

*А) Савецкая спадчына*

Кантэкстам фармаваньня новых палітычных элітаў у Расіі быў распад савецкай палітычнай сыстэмы ці, дакладней кажучы, барацьба за зьмену ўлады ўнутры сыстэмы. Бальшыня сучасных расійскіх палітыкаў выйшла з розных атожылкаў савецкай палітычнай клясы. Пацьвярджэньне гэтага можна знайсьці, аналізуючы мэханізм перадачы ўлады і забесьпячэньня пераемнасьці й стабільнасьці палітычнай сыстэмы. Акурат гэты элемэнт здаецца цэнтральным у савецкім/расійскім кантэксьце[1]. Згаданы мэханізм можа быць названы тэрмінам Ж. Баляндзье "зьмена праз заблытваньне, празь зьнішчэньне папярэдніка"[2]. Але Ж. Баляндзье больш апісвае сымбалічны бок падобнага мэханізму стабілізацыі й забесьпячэньня пераемнасьці ўлады, тады як у савецкім/расійскім выпадку справа часта даходзіла да фізычнага вынішчэньня папярэднікаў, затым ішло сымбалічнае ганеньне ці прымяншэньне заслугаў папярэдніка. Ад часоў Сталіна барацьба за ўладу ў Расіі ішла толькі ўнутры апарату партыі, разьвіючыся ў кірунку "прасоўваньня" сваіх людзей на адміністрацыйныя пасады ды вынішчэньня папярэднікаў[3]. Адрозьненьне сытуацыі Ельцын/Гарбачоў у тым, што іх змаганьне выйшла за межы сыстэмы і прывяло да дэсэктарызацыі палітычнай прасторы і страты рацыянальнасьці (савецка-партыйнага тыпу) палітычнымі акторамі. Для перамогі Ельцын быў вымушаны аддаць частку ўлады рэгёнам (рэспублікам), каб захаваць за сабой цэнтральную ўладу. Наступныя гады ён быў заняты выключна ўмацаваньнем сваёй уладнай пазыцыі, а не пабудовай дэмакратычных легітымных інстытутаў.

---

[1] Шевцова Лилия. Режим Бориса Ельцина. Москва: Моск. Центр Карнеги, РОССПЭН, 1999.

[2] Balandier George, Pouvoir sur scune. Paris. Fayard. 1988.

[3] Авторханов А. Технология власти. Лондон: Посев. 1981.

Падобны стабілізацыйны мэханізм прыводзіць да стварэньня асаблівай замкнёнай кіраўнічай клясы, якая зацікаўленая ў захаваньні паўсталай сыстэмы. Падтрыманьне яе жыцьцяздольнасьці магчыма пры ўмове кантролю з боку кіраўнічай клясы за фінансавымі плынямі, а таксама манапалізацыі мэханізмаў рэкрутаваньня элітаў. Распад СССР паспрыяў стварэньню такой сыстэмы, але разам з тым паменшыў колькасьць рэсурсаў у сувязі з аддаленьнем былых саюзных рэспублік. Аналіз працэсаў апошніх гадоў дапаможа зразумець, якім чынам фармавалася расійская "палітычная эліта" ў варунках узмацненьня яе аднароднасьці, а таскама высьветліць тып рацыянальнасьці, які ўласьцівы расійскай палітычнай прасторы.

*Б) Дынаміка расійскай трансфармацыі*

Часта, гаворачы аб дэмакратызацыі, вылучаюць прыярытэтны кірунак — інстытуцыйнае рэфармаваньне, пабудову мэханізмаў забесьпячэньня функцыянаваньня дэмакратыі. Аднак жа адной з галоўных праблемаў дэмакратызацыі ёсьць дылема "адначасовасьці", апісаная Офэ[4]. Калі палітычным акторам даводзіцца праводзіць рэформы адразу ў некалькіх кірунках — інстытуцыйным, эканамічным і сацыяльным, — гэта моцна ўскладняе працэс рэфармаваньня. Адначасна тое, як палітыкі спрабуюць пераадолець узгаданую дылему, сьведчыць аб характары зьменаў.

М. Гарбачоў, пачаўшы "перабудову", ня меў на мэце стварэньне дэмакратычнай сыстэмы. Ён імкнуўся мадэрнізаваць камуністычную сыстэму, каб забясьпечыць стабільнасьць і далейшую трываласьць СССР, з камуністычнай партыяй на чале*. Далейшыя працэсы сьведчаць пра захаваньне тэндэнцыі. У часы Ельцына галоўнымі праведзенымі рэформамі сталі лібэралізацыя цэнаў (спыненьне дзяржаўнага рэгуляваньня) і прыватызацыя (посткамуністычнымі ўрадамі часта спэцыяльна захоўваецца звышканцэнтрацыя вытворчасьці — гэта ім выгадна, каб захоўваць кантроль над эканамічнымі рэсурсамі). Асноўныя вынікі гэтых захадаў — спад вытворчасьці, зьмяншэньне дзяржаўных выдаткаў на сацыяльную сфэру, усё больш выразны падзел на бедных і багатых.

Аднак гэта толькі вонкавы бок дэмакратызацыі. Прыхаваным застаецца тое, што адбыўся працэс прыўлашчваньня былымі намэнклятурнікамі некалі "супольнай" сацыялістычнай маёмасьці, зрастаньне палітычных элітаў з эканамічнымі, што спрыяла аслабленьню дзяржавы дзякуючы зьмяншэньню рацыянальнасьці, уласьцівай гэтай форме арганізацыі палітычнай ўлады**, і захаваньню ўлады былой палітычнай клясай. Дэмакратычныя інстытуты існуюць толькі як сродак рэкрутацыі новых чальцоў эліты. Працэс прыняцьця рашэньняў пэрсаніфікаваны, дзяржаўныя інстытуцыі ня маюць праўнай незалежнасьці. Такім чынам, разгляд адбываных працэсаў у тэрмінах "пасьпяховая/непасьпяховая дэмакратызацыя" ня мае сэнсу.

[4] Elster Jon, Offe Claus, and Preuss Ulrich K. with Boenker Frank, Goetting Ulrike, and Rueb Friedbert W. Institutional Design in Post-communist Societies. Rebuilding the Ship at Sea. Cambridge, Cambridge University Press, 1998.

* Акурат Ельцын, падтрыманы сярэднім чынавенствам і рэгіянальнымі кіраўнікамі, першы адышоў ад КПСС, забараніў яе і тым самым пазбавіўся ад Гарбачова, які меў магчымасьць парваць з камуністычнай партыяй, але ёй не скарыстаўся.

** У Расіі, як і іншых посткамуністычных краінах, мы маем справу з падменай рацыянальнасьці дзяржавы некалькімі рацыянальнасьцямі — прыватнай (вышэйшых дыгнітарыяў, алігархаў), рынкавай — створаных дзяржавай прадпрыемстваў (Газпрам, РАТ ЭС), якія твораць сеціва адносінаў паміж сабою, выкоўзваючыся з-пад кантролю дзяржавы. Гэта прыводзіць да сумяшчэньня найвышэйшымі расійскімі ўрадоўцамі функцыяў у дзяржаўным апараце з пасадамі у камэрцыйных структурах (банках і г.д.) ці, наадварот, працы людзей зь бізнэсу на найвышэйшых дзяржаўных пасадах.

Тое самае датычыць і панятку "эліты", пад якім традыцыйна разумецца існаваньне розных груповак, якія канкуруюць паміжсобку за навязаньне грамадзтву свайго бачаньня грамадзкіх праблемаў, варыянтаў магчымай палітыкі, прыняцьця ці непрыняцьця канкрэтных рашэньняў у рамках існых інстытуцыяў. Напраўду ў Расіі мы маем справу з палітычнай клясай, якая вызначаецца гамагеннасьцю і аднароднасьцю складу, вузінёй адбору новых чальцоў, для якой галоўная вартасьць — забесьпячэньне стабільнасьці палітычай сыстэмы, патрэбнай для яе існаваньня.

*В) Эліта ці палітычная кляса*

Новая расійская палітычная кляса сягае сваім карэньнем савецкіх часоў. Тады ўлада ўтрымлівалася асобнай клясай, якую часам называюць намэнклятурай. Цэнтрам прыняцьця рашэньняў было Палітычнае бюро, у розныя пэрыяды паўставалі й іншыя ўладныя цэнтры, як, напрыклад, Рада па абароне, што, праўда, не прымяншала кіраўнічай ролі Палітбюро. Пасьля распаду савецкай сыстэмы Ельцын замяняе Палітбюро інстытутам прэзыдэнта Расіі, адмаўляецца ад камуністычнай ідэалёгіі, забараняе камуністычную партыю. Потым ён паступова зьмяншае ролю Вярхоўнага Савету, замяняючы яго ўрэшце на Думу, якая мае меншыя паўнамоцтвы. Апошнюю ён надалей спрабуе кантраляваць праз стварэньне дзьвюхгаловай (права- і левацэнтрысцкай) "партыі ўлады", каб аслабіць апазыцыю.

У гэты ж час адбываецца прыватызацыя й ідзе зрастаньне ўлады з алігархічным капіталам, які фінансуе дзяржаўныя інстытуты ці ўрадоўцаў, а наўзамен атрымлівае гандлёвыя льготы й акцыі прадпрыемстваў. Крызыс 1998 году істотна аслабляе пазыцыі алігархаў, і новым цэнтрам улады робяцца сілавыя структуры ці, дакладней, спэцыяльныя службы. Досыць толькі ўзгадаць расійскіх прэм'ер-міністраў у 1998—99 гадох: Прымакоў, Сьцяпашын, Пуцін.

Пералічым "вартасьці", якія дамінуюць сярод расійскай палітычнай эліты:

— Прызнаньне дапушчальным "дзяржаўнага прадпрымальніцтва", калі дзяржаўныя службоўцы карыстаюць зь дзяржаўных пасадаў у мэтах зарабляньня грошай. Даходы ад гэтага "бізнэсу" трапляюць не ў дзяржаўны скарб, а людзям, што абслугоўваюць уладу.

— Праўны нігілізм. У палітычна-адміністрацыйным асяродзьдзі існуе прагматычны падыход да права альбо, як кажа ўкраінскі палітоляг В. Палахала, назіраецца "выкарыстоўваньне алігархіяй, клянамі дэмакратычных нормаў і працэдураў у якасьці дэкарацыяў, неабходнай формы сваёй легітымізацыі, тэхнікі маніпуляваньня грамадзкай сьвядомасьцю"[5]. "Права" разглядаецца як рэсурс улады, зь якога можна скарыстаць, каб перамагчы канкурэнта ў палітычнай гульні. Больш за тое, права трактуецца як найменш затратны спосаб, каб захапіць ці выкарыстаць больш паўнамоцтваў.

— Кар'ерызм прадстаўнікоў палітычнай эліты, скіраванасьць на захаваньне сваёй пасады і, тым самым, крыніцы ўлады. Гэта тлумачыцца палітычным мінулым большыні палітычных актораў у Расіі, якія выгадаваныя камуністычнай намэнклятурай. Кар'ера такіх палітыкаў залежала ад здольнасьці ісьці за "лініяй партыі", вагацца разам зь ёй і бараніць аснову сваіх прывілеяў, якія грунтаваліся на неабмежаванай уладзе, сканцэнтраванай у руках апарату партыі. Падчас працэсаў "трансфармацыі" адбылося "прыўлашчаньне" дзяржаўнай маёмасьці

[5] Полохало В. Политология посткоммунистических обществ в Украине и России. К методологии политического анализа // Полис. 1998. № 3.

і тое, што польскі палітоляг Ядзьвіга Станішкіс называе “калянізацыяй дзяржавы”*[6].

— Пачуцьцё элітызму і зьняважлівае стаўленьне да грамадзтва; уласьцівая карпарацыйнай этыцы савецкай намэнклятуры клянавасьць і рэгіянальная фрагмэнтаванасьць, ізаляцыяніцкія альбо залежніцкія настроі адносна вонкавага сьвету (Захаду).

Разуменьне спэцыфікі палітычных элітаў Расіі дапаможа зразумець, якія погляды дамінуюць у яе асяродзьдзі (і чаму акурат яны) на беларуска-расійскія стасункі ды інтэграцыю наагул. На пачатку 1990-х, пакуль ішоў працэс гамагенізацыі элітаў, у іх асяродзьдзі існаваў пэўны плюралізм у падыходах да беларуска-расійскай інтэграцыі, была спроба выпрацаваць адрозную ад савецкага/расійскага каляніялізму пазыцыю. Паўстаньне палітычнай клясы і зварот да традыцыяналізму ва ўнутранай і вонкавай палітыцы Расіі сьведчаць пра тое, што розьніцы ў стаўленьні да гэтага пытаньня (у сэнсе сутыкненьня пазыцыяў) больш няма. Вар’явацца могуць толькі погляды на тое, які канкрэтныя мэханізмы ўжываць, каб трымаць пад кантролем постсавецкую прастору, якая разглядаецца як зона інтарэсаў і ўплываў Расіі, ад кантролю над якой залежыць бясьпека РФ**.

## 1.2. Праблема тыпу стасункаў паміж новапаўсталымі дзяржавамі. Беларуска-расійская інтэграцыя ў вачах расійскай палітычнай клясы

На нашу думку, чыньнікамі, якія ўплываюць на фармаваньне пазыцыі расійскай палітычнай клясы ў дачыненьні інтэграцыйных працэсаў паміж Расіяй і Беларусяй, ёсьць:

— распад СССР і перазьмеркаваньне ўлады на карысьць рэспублік — пэрыфэрыі;

— дэбаты аб постсавецкай прасторы, з двума сэнсавымі полюсамі: мадэль “раўнапраўнага рэгіянальнага супрацоўніцтва” і мадэль “цэнтар/пэрыфэрыя”, згодна зь якой Расія, маючы больш рэзэрваў, мае заняць дамінуючую і кантралюючую пазыцыю на абшарах СНД;

— кліенталісцкі характар стасункаў паміж беларускай і расійскай палітычнай клясай.

*А) Праблема распаду СССР*

Сам варыянт “роспуску Савецкага Саюзу” зьявіўся дастаткова позна, тым часам як ідэя яго рэфармаваньня паўстала значна раней. Апошняе было абумоўлена немагчымасьцю пасьпяховага ўдасканаленьня таталітарнай сыстэмы СССР. Перабудова задумвалася як спроба мадэрнізацыі савецкай сыстэмы, каб захаваць уладу ў руках партыі.

Аднак паралельна працэсу сыстэмнай трансфармацыі СССР унутры партыі ішоў працэс змаганьня за ўладу. Гарбачоў, заняўшы фармальна пасаду генэральнага сакратара ЦК КПСС у сакавіку 1985 г., пачынае праводзіць уласную кадравую палітыку*. Гульня разгортваецца ў

* Стварэньне на базе дзяржаўных ведамстваў фірмаў з рынкавай рацыянальнасьцю, якія за бюджэтныя грошы займаюцца камэрцыйнай дзейнасьцю. Кожнае з такіх ведамстваў творыць сеціва меншых фірмаў г.д. У выніку ціск на бюджэт павялічваецца, паступова губляецца кантроль і магчымасьць каардынаваць дзейнасьць утвораных сетак дзяржаўных інстытуцыяў. Рэальна ўлада пераходзіць да тых, хто кантралюе новапаўсталае сеціва адносінаў. Такім чынам, мадэрнізацыя сыстэмы з боку дзяржавы робіцца немагчымай.

[6] Гл. Staniszkis Jadwiga. Postkommunizm Próba opisu. Gdańsk: Sčowo/obraz terztoria. 2001. S. 191—229.

** Эвалюцыя ў поглядах добра прасочваецца ў афіцыйных дакумэнтах РФ, аб чым пойдзе гаворка ніжэй.

некалькіх кірунках: Гарбачоў увесь час кідаецца то да "дэмакратычных" груповак, каб нэўтралізаваць кансэрватыўны рух "цьвёрдагаловых", то да кансэрватараў, каб іх рукамі нэўтралізаваць Ельцына і яго групу. Апошні таксама гуляе з Гарбачовым. Нарэшце ў "групы Ельцына", хоць і даволі позна, ужо пасьля жнівеньскіх падзеяў 1991 году ў Маскве, высьпявае плян развалу СССР. Ельцын, выкарыстаўшы жнівеньскі путч у сваіх карысьлівых мэтах, парывае з партыяй (забараняе КПСС) і нэўтралізуе гарбачоўскія пляны стварэньня новага мадыфікаванага Саюзу падпісаньнем "белавескіх пагадненьняў", г.зн. празь зьнішчэньне СССР. У гэтых варунках Ельцына і яго групу ня надта цікавіла, якімі могуць быць стасункі паміж былым імпэрскім цэнтрам і былымі саюзнымі рэспублікамі, што атрымалі незалежнасьць. На той час для Ельцына і ягоных людзей галоўным было атрымаць уладу ў цэнтры і былую сацыялістычную ўласнасьць, а дзеля гэтага трэба было прызнаць сувэрэнітэт іншых саюзных рэспублікаў.

*Б) Канцэпцыя "блізкага замежжа", альбо шанец на рэгіянальнае супрацоўніцтва*

Першапачатковы курс расійскай палітыкі ў дачыненьні да постсавецкай прасторы быў вонкава дэмакратычны і абапіраўся на канцэпцыю "рэгіянальнага супрацоўніцтва". На нейкі час цэнтрам СНД робіцца Менск, і ініцыятывы аб супрацоўніцтве зыходзяць ня толькі з Масквы. Затым даволі хутка адбываецца зьмена ў прыярытэтах вонкавай палітыкі Расіі. Супрацьстаяньне Ельцына зь Вярхоўным Саветам, які заклікаў аднавіць імпэрскую веліч Расіі, прыводзіць да таго, што Ельцын сам пасьля перамогі пачынае ўжываць тую самую "праімпэрскую" рыторыку. Гэты этап вызначаецца ваганьнямі ельцынскай адміністрацыі паміж новым, звонку дэмакратычным курсам і традыцыяналізмам. Пераломным момантам стаецца візыт Ельцына ў Польшчу ў 1993 годзе, калі ён рабіць заяву, што Расія ня будзе супраць уваходу Польшчы ў НАТО. Потым гэтую заяву расійцы спрабуюць дэзавуяваць. Вайсковая дактрына Расіі 1995 году ўжо ўжывае іншыя тэрміны. У ёй ідзе ўжо гаворка пра "блізкае замежжа" як пра зону ўплыву Расіі, а любая непрарасійская палітыка разглядаецца як беспасярэдняя пагроза бясьпецы РФ. У далейшым гэтая лінія будзе толькі ўзмацняцца.

Што да Беларусі, то ідэя "інтэграцыі з Расіяй" стаецца адным з асноўных дыскурсаў беларускай палітыкі. Можна гаварыць пра кліенталісцкі характар стасункаў паміж беларускай палітычнай клясай і расійскай, дзе апошняя выступае ў якасьці патрона, што дае рэсурсы й падтрымку, а беларуская — як залежны ад яго кліент.

*В) Міт ці рэчаіснасьць адмысловага тыпу беларуска-расійскіх стасункаў. Постсавецкі кліенталізм*

З усіх постсавецкіх інтэграцыйных праектаў найбольш пасьлядоўным ёсьць беларуска-расійскае збліжэньне. Беларускі бок быў найбольш зацікаўлены ў атрыманьні танных энэргетычных рэсурсаў, на аплату якіх ён ня мае "жывых грошай". За гэтыя рэсурсы ён імкнуўся разьлічвацца па бартэрных схемах: наўзамен Расіі аддаваліся беларускія тавары, збольшага неканкурэнтаздолльныя дзеля іх дарагоўлі і нізкай якасьці. Апрача гэтага, пэрыядычна ўсплывае ідэя стварэньня рублёвай зоны, якая пакуль не ўкаранавалася посьпехам. Таксама існуе мытны зьвяз.

* Увесь гэты час працягвалася замена старых партыйных і савецкіх кадраў на новыя пад лёзунгамі толькі распачатай перабудовы, якія агучыў Красавіцкі пленум ЦК КПСС 1985 году. Новыя кадры прыходзяць з рэгіёнаў. Сярод іх пачынае фармавацца асобны рух, ці група, якую ўзначаліць Ельцын, — група "рэгіяналаў", якія неўзабаве пачынаюць прэтэндаваць на ўладу, ідучы ўжо супраць Гарбачова.

Якія ж прычыны “прарасійскасьці” беларускай палітычнай клясы? Зазвычай гавораць пра путы камунізму, пра расійскі каляніялізм і слабасьць беларускай незалежнасьці. Цікава зірнуць на гэты фэномэн скрозь прызму кліенталізму. Яго клясычнае азначэньне — “заснаваныя на двухбаковым абмене выгадаў… паміж патронам і кліентам, дзе першы мае большыя рэсурсы і кантралюе іх, асабістыя ці прыватныя стасункі, якія ствараюць залежнасьць”[7].

Беларускія камуністы рабілі стаўку на Расію, каб захаваць уладу ў сытуацыі нястачы рэсурсаў для “савецкай” эканамічнай сыстэмы (зь яе дамінаваньнем вялікіх прадпрыемстваў, залежных ад танных энэрганосьбітаў і сыравіны). Пошук і забесьпячэньне беларускай эканомікі гэтымі двума рэсурсамі сталіся галоўным уладным клопатам для беларускіх посткамуністаў. Знайсьці іх можна было толькі ў Расіі. Расійскі ж бок быў галоўна зацікаўлены ў той час у беспраблемным транзыце сыравіны на Захад, а Беларусь была каналам гэтага транспартаваньня. Тым самым у Беларусі забясьпечвалася рэпрадукцыя энэргазатратнай эканамічнай сыстэмы, у чым Расія таксама была зацікаўлена і што складае адну з асноўных выгадаў дзяржавы-патрона[8].

За карыстаньне таннымі расійскімі энэрганосьбітамі Беларусь таксама расплачвалася з Расіяй передачай апошняй “у арэнду” свайго сымбалічнага капіталу, які яна мае як сувэрэнная дзяржава: напрыклад, права голасу ў міжнародных арганізацыях, дзе Беларусь стала падтрымлівае Расію, ці ўставічнае агучваньне Менскам антынатаўскіх заяваў і праектаў, якія, па ўсёй верагоднасьці, паходзяць з Масквы. Аднак гэта не азначае, што беларускія эліты ня могуць праводзіць сваю гульню. Гэтым больш-менш пасьпяхова займаўся прэзыдэнт Лукашэнка да прыходу да ўлады прэзыдэнта Пуціна, дарма што сёньня апошні спрабуе заклікаць дзяржаву-кліента “да парадку”.

## 2. Розныя ўспрыманьні інтэграцыі. Беларусь як несапраўдны рэгіён РФ

Трэба зьвярнуць увагу на тое, што існуюць некалькі бачаньняў беларуска-расійскай інтэграцыіі. Першае бачаньне — інтэграцыя накіраваная на аднаўленьне сувязяў, страчаных разам з распадам СССР. Другое — інтэграцыя бачыцца як сродак аднавіць веліч Расійскай дзяржавы (імпэрыі).

### 2.1. Вымушаны распад як неабходнасьць для ўзмацненьня былога “Цэнтру”

Немагчымасьць мадэрнізаваць увесь Саюз ССР падштурхоўвала “расійскіх рэфарматараў” да прыняцьця распаду СССР. У 1991—1993 гг. галоўны клопат расійскіх палітычных элітаў палягаў у здабыцьці міжнароднага прызнаньня і “інстытуцыйнага ўваходжаньня” ў міжнародную супольнасьць, а разам з гэтым і здабыцьці замежных крэдытаў. У Беларусі тым часам посткамуністычныя эліты ўмацоўваюць сваю ўладу дзякуючы расійскім рэсурсам і падтрымцы.

*А) “Праз распад да кансалідацыі”. Палітычныя перадумовы расійскіх інтэграцыйных памкненьняў*

[7] Badie Bertrand. L’Etat importй. Paris: Fayard, 1992. P. 37.

[8] Гл. падрабязьней на гэты конт: Bertrand Badie, цыт. тв., р. 43—44.

Расійская Фэдэрацыя паўставала ў барацьбе некалькіх груповак за цэнтральную ўладу, таму давесьці, калі паўстала і якой была дакладная пазыцыя што да характару адносінаў паміж былымі рэспублікамі сярод расійскіх элітаў мяжы 80-х і 90-х гг. XX ст., цяжка. Спробу прасачыць эвалюцыю іх стаўленьня да Беларусі абцяжарвае таксама той факт, што ў першай палове 90-х ідзе гамагенізацыя расійскіх элітаў, паўстае палітычная кляса, дзе спаборніцтва паміж акторамі пераходзіць на пазаінстытуцыйны ўзровень.

Абапіраючыся на аналіз поглядаў палітычных актораў і на аналіз палітычнага працэсу, можна сьцьвердзіць, што ідэя інтэграцыі паўстае адначасова з прыняцьцем опцыі "распад СССР" як мэханізму канчатковага прыходу да ўлады "групы Ельцына"* і як магчымасьці прасьцей правесьці патрэбныя пераўтварэньні.

Дасьледаваньні, якія праводзілі замежныя спэцыялісты ў пасьлясавецкай Расіі, паказваюць на выразны падзел сярод элітаў у некаторых пытаньнях. Паводле сваёй пазыцыі яны ствараюць дзве групы: "гарбачоўцы" і "ельцынцы". Зразумела, што першыя блага ставяцца да распаду СССР і да "ельцынскай" рэдакцыі інтэграцыі ў рамках СНД, тым часам як другія маюць пазытыўнае стаўленьне да аднаго і другога[9]. Да гэтага трэба дадаць той факт, што яны ўсе выйшлі з савецкай сыстэмы і ўсе выказваюцца за моцную дзяржаву і за захаваньне ўплыву на былыя саюзныя рэспублікі.

Галоўнае для Масквы — захаваць "стабільнасьць, каб не было пагрозы ўнутраным рэформам" (Канцэпцыя вонкавай палітыкі РФ), разьвіваць "цэнтраскіраваныя, інтэграцыйныя тэндэнцыі, каб не было пагрозы распаду Расіі", забясьпечыць "бясьпеку ў рэгіёне", гэта значыць не дазваляць стварэньня антырасійскіх кааліцыяў і існаваньня варожых Расіі рэжымаў на прасторы СНД. Дзеля гэтага прыярытэтам Расіі ёсьць стварэньне вайсковай і эканамічнай супольнасьцяў з цэнтрам у Маскве. Тым самым расійцы імкнуцца дасягнуць рэпрадукаваньня нязначна скарэгаванай савецкай рэгіянальнай палітыкі, толькі што былыя рэспублікі маюць статус сувэрэнных дзяржаваў і большую сувэрэннасьць у параўнаньні з часамі СССР.

Беларуска-расійская інтэграцыя ёсьць прыкладам гэтай палітыкі, які не выходзіць па-за рамкі апісанай вышэй мадэлі. Нельга забывацца, што пачаткі інтэграцыі трэба шукаць яшчэ ў часы перабудовы. За яе гады адбылося да 86% кадравых зьменаў у ЦК КПСС, прыкладна такая ж інтэнсіўнасьць зьменаў назіралася і ў рэгіёнах[10]. Валянцін Паўлаў, былы прэм'ер-міністар СССР, так пісаў аб праведзеных дзьвюх кампаніях абнаўленьня партыйнага кіраўніцтва: "Першая, калі, выкарыстоўваючы традыцыйныя мэтады партыйнай барацьбы, Міхаіл Гарбачоў рукамі Ягора Лігачова, Міхаіла Саломенцава, Барыса Ельцына здымаў з

* Мы разумеем штучнасьць гэтага тэрміну. Цяжка гаварыць пра групу Ельцына падчас апошніх гадоў існаваньня СССР. Ельцын, зразумела, меў групу паплечнікаў, але спэкуляваў на інтарэсах і чаканьнях шырэйшага кола людзей, якія падтрымлівалі яго і ў розныя часы працавалі зь ім. Перш за ўсё гэта расійскі партыйны і вайсковы апарат, нацыянальныя дзеячы савецкіх рэспублік, прадстаўнікі дэмакратычных рухаў. Ускосны фактар, які пра гэта сьведчыць, — падтрымка Ельцына расійскімі вайскоўцамі і супрацоўнікамі КДБ падчас жнівеньскага путчу 1991 г.

[9] Гл.: Lane David. L'Ïlite politique sous Gorbachev et Eltsine au dЇbut de la pЇriode de transition: Їtude analytique de rЇputation // Cultures & Conflits. № 17, printemps 1995.

[10] Челноков Михаил. Россия без Союза, Россия без России (записки депутата расстреляного парламента). Москва: Новая слобода. 1994. С. 91.

пасадаў першых сакратароў, замяняючы іх на другіх, потым трэціх”[11]. Гэтыя апошнія “чысьцілі” Саветы народных дэпутатаў, перадусім іх выканаўчыя камітэты. Другая кампанія — “крытыкі старых партыйных кадраў”, гэтаксама крытыкі тагачаснага кіраўніцтва (апрача Гарбачова), праводзілася Аляксандрам Якаўлевым пад лёзунгамі “барацьбы супраць сталінізму” (у першым выпадку) і “адарванасьці ад народу і абрастаньня прывілеямі” (у другім). Потым пачынаецца кампанія ўжо супраць Я. Лігачова, які стаўся небясьпечным канкурэнтам для Гарбачова ў 1986—1988 гг. Апошні рабіў гэта рукамі Ельцына, які, відавочна, перасьледаваў пры гэтым свае мэты[12].

Адначасова, каб легітымізаваць свае рэформы і зацьвердзіць кадравыя зьмены, Гарбачоў апэлюе да Зьезду народных дэпутатаў СССР, скліканага ўпершыню ў 1989 г. Аднак адначасна пачынаецца гульня супраць яго: яе праводзяць тыя людзі, якіх ён паставіў замест старых апаратчыкаў. Паўстае апазыцыя ўнутры Зьезду ў выглядзе Міжрэгіянальнай дэпутацкай групы, якая выступае за перагляд стасункаў цэнтар/рэгіёны. Гарбачоў пачынае тады новаагароўскі працэс, спрабуючы замацаваць сваё становішча, і настойвае на падпісаньні новага саюзнага пагадненьня. Аднак працэс перамоваў прыводзіў толькі да паступовага зьмяншэньня колькасьці рэспублік, якія пагаджаліся падпісаць дамову. Пасьля путчу са складу СССР выйшлі краіны Балтыі, абвесьціўшы 21 жніўня незалежнасьць, потым каўкаскія рэспублікі і Малдова (24 жніўня). Паступова ад імпэрскага цэнтру адыходзіла і Ўкраіна, так што ўжо ў сярэдзіне лістапада 1991 году формула новага Саюзу выглядала як “1+5+0” (Расія+сярэднеазіяцкія пратэктараты+сымбалічны прэзыдэнт) замест вясновай 9+1. У гэтай сытуацыі Ельцын, які пасьля путчу жніўня 1991 г. усё менш і менш пагаджаецца на існаваньне двух цэнтраў улады, знаходзіць выйсьце ў роспуску СССР і стварэньні СНД.

*Б) Пераходны момант у расійскім стаўленьні да постсавецкай прасторы. Стварэньне органаў, адказных за фармаваньне расійскай палітыкі ў СНД*

Пасьля падпісаньня Белавескіх пагадненьняў (9.12.1991) расійскае кіраўніцтва выступае толькі за такую СНД, якая ахоплівала б максымальна магчымую колькасьць былых савецкіх рэспублік. Іншыя варыянты інтэграцыі — 1+1 (Расія+Беларусь) ці 1+5 (Расія+сярэднеазіяцкія рэспублікі) — не выклікаюць у Маскве вялікага энтузіязму. Але ў расійскім падыходзе да СНД надалей застаецца пэўная падвоенасьць. На практыцы Масква гуляла на ўтрыманьне былых саюзных рэспублік у зоне свайго ўплыву. У сваім арсэнале яна мела ў асноўным мэханізмы заахвочваньня (захаваньне рублёвай зоны і спрыяльнай эканамічнай палітыкі, наданьне вайсковай дапамогі)* і мэханізмы запалохваньня і шантажу (узьняцьце пытаньня аб пераглядзе межаў, разьмяшчэньне вайсковых базаў на тэрыторыі рэспублік, распальваньне

[11] Павлов Валентин. Август изнутри. Горбачев-путч. Москва: Деловой мир. 1993. С. 18—19.

[12] Павлов Валентин, цыт. тв., с. 20-22.

* У залежнасьці ад канкрэтнага выпадку Расія прапанавала тры рэдакцыі эканамічнае палітыкі. Першая — з краінамі, якія выступаюць за шчыльнейшую інтэграцыю (Беларусь, Казахстан, Кыргыстан), — азначала скасаваньне ліцэнзіяў і квотаў на экспарт, “празрыстыя межы”, адзіную фіскальную, цэнавую, крэдытна-грашовую палітыку. Гэта азначала таксама магчымасьць атрымоўваць крэдыты з расійскага бюджэту і з ЦБР (за 1994 год выдадзена было крэдытаў на суму $5,6 млрд., асноўнымі атрымальнікамі былі Казахстан і Беларусь, гл.: Коммерсант Daily, 10 сьнежня 1994). Другая рэдакцыя — з краінамі, якія не прымалі інтэграцыю (прыбалтыйскія рэспублікі), — азначала пераход на міжнародныя прынцыпы ўзаемадзеяньня, разьлікі ў валюце, расійскія пастаўкі па сусьветных

міжэтнічных канфліктаў)*. Адначасова ў афіцыйных дакумэнтах па вонкавай палітыцы, якія ў той час выпрацоўвала збольшага расійскае МЗС, гаварылася пра пабудову раўнапраўных стасункаў і ўмацаваньне добрасуседзтва ў СНД, што павінна было спрыяць рэформам і мінімалізаваць рызыку дэзынтэграцыі самой Расіі.

Гэта быў першы этап станаўленьня расійскай вонкавай палітыкі. "Ён пачаўся адразу пасьля краху СССР і доўжыўся прыблізна да сярэдзіны 1993 году. Нават тыя дасьледнікі, што зычліва ставіліся да аўтараў вонкавай палітыкі таго часу, называюць яе "рамантычнай" ці "ідэалісцкай". Ідэйныя супраціўнікі тагачаснага кіраўніцтва МЗС вызначаюць яе як "празаходнюю" і "антырасійскую", ставячы знак роўнасьці паміж двума паняткамі"[13]. Зыходны пункт тагачаснай вонкавай палітыкі Расіі палягаў у тым, што яна павінна быць падпарадкаваная інтарэсам рынкавых пераўтварэньняў эканомікі, максымальна хуткага фармаваньня дэмакратычных інстытутаў, а таксама радыкальнай дэмілітарызацыі грамадзтва і дзяржавы.

Тут трэба спыніцца на ролі расійскага МЗС: якія паўнамоцтвы мела гэтае ведамства і хто ў ім меў асноўныя ролі. У савецкія часы вонкавапалітычная лінія дыктавалася Палітбюро, распрацоўкай стратэгіі вонкавай палітыкі тады займаўся Міжнародны аддзел ЦК КПСС у каапэрацыі з КДБ і Міністэрствам абароны. Пасьля распаду СССР пазыцыі КДБ былі моцна

---

цэнах, жорсткі памежны і мытны рэжым. Трэцяя лінія — з краінамі, якія займаюць няпэўнае становішча (Каўказ, засталыя краіны Сярэдняй Азіі), — азначае стымуляваньне разьвіцьця беспасярэдніх дамоўленасьцяў паміж вытворцамі, вольнае перасоўваньне тавараў, капіталаў, грамадзянаў. (Гл.: Кириченко Никита, Шпагина Марина, Единое экономическое пространство: Россия посылает всех на три стороны // "КоммерсантЪ. № 34 (84), 1992. 17—24 августа. с. 20.) Да гэтага трэба яшчэ дадаць і расійскія абяцаньні крэдытаў, пра якія гаварылася ўжо з 23 жніўня 1991 г. і якія выдавалі пры ўмове захаваньня адзінага цэнтру. Гэтым цэнтрам рабілася паступова адміністрацыя Ельцына, які ліквідаваў саюзныя структуры, замяняючы іх на расійскія. (Напрыклад, 31 кастрычніка Ельцын падпісвае ўказ аб ліквідацыі Дзяржбанку СССР і ЦБ Расіі, на іх месцы ствараецца адзіны банк пад юрысдыкцыяй РСФСР. Гл.: "Рублёвая зона превращается в кладбище рублей" // *КоммерстантЪ*, № 44, 11—18 лістапада 1991, с. 21.) Калі казаць пра вайсковую інтэграцыю, то яна давала двухбаковую выгаду — як Расіі, дзе ў гэтым былое зацікаўленае Міністэрства абароны і Генэральны штаб, так і краінам Сярэдняй Азіі, якія не маглі самі сябе абараніць ад пагрозы з боку ісламскіх рухаў, а таксама беларускаму кіраўніцтву, бо Расія крэдытавала беларускі ВПК у выглядзе сумесных праектаў. Напрыклад, калі Беларусь і Расія падпісалі дамову аб сыстэме раньняга вайсковага апавяшчэньня "Пароль", беларускі ВПК атрымаў 2,5 млрд. рублёў.

* Яшчэ ў жніўні 1991 году Ельцын пачынае кампанію "перагляду межаў". 26 жніўня 1991 г. прэс-сакратар расійскага прэзыдэнта Павал Вашчанаў афіцыйна заявіў аб тым, што Расія можа перагледзець свае межы з тымі рэспублікамі (апроч Латвіі, Літвы, Эстоніі), якія ня згодзяцца падпісаць саюзную дамову. Прэтэнзіі выстаўляліся пераважна на паўночны Казахстан, Крым і левабярэжную Ўкраіну. У той жа дзень Анатоль Сабчак прапанаваў, выступаючы на паседжаньні ВС СССР, спачатку ў межах адной краіны "зьняць гіры з ног краіны і ліквідаваць структуры камунізму", а толькі потым думаць пра незалежнасьць. 27 (у Маскве) і 28 (у Бэрліне) жніўня Гаўрыла Папоў, мэр Масквы, выказаў прапановы адцяць у дадатак ад Украіны Адэскую вобласьць ды Прыднястроўе ад Малдаўшчыны. Як адзін з сродкаў націску Масквой выкарыстоўвалася пытаньне разьмяшчэньня і вываду расійскіх войскаў з тэрыторыі былых хаўрусьнікаў па Саюзе ці па Варшаўскім пакце. Што да прыбалтыйскіх рэспублік — гл. Eitvydas Bajarnas, Mare Haab, Ilmars Viksne, sous la direction de Peter Van Ham. "Les Etats baltes: sйcuritй et dйfense aprиs l'indйpendance" // *Cahiers de Chaillot*, juin 1995, Cйline Bayou. Etats baltes: le dilemme de l'ancrage йconomiques" // *Courrier des pays de l'Est*, n°438, mars 1999. Асабліва пасьпяхова Расія распальвала этнічныя канфлікты на Каўказе, упаасобку ў Грузіі й Азэрбайджане. Гл. Њwiktochowski Tadeusz. *Azerbejdżan i Rosja. Kolonializm, islam i narodowoœæ w podzielonym kraju.* Warszawa, Instytut Studiów Politycznych PAN, 1998, s. 245–264.

[13] Фёдоров Юрий. Кризис внешней политики России: концептуальный аспект // Pro et Contra. 2001. Том 6. № 1—2. С.34.

пахіснутыя, дзейнасьць Міністэрства абароны была паралізаваная да траўня 1992 году*. На той час МЗС пачынае граць першую ролю ў фармаваньні вонкавапалітычнага курсу Расіі. Пра гэта на пачатку 1992 году гаворыць намесьнік міністра замежных справаў РФ Віталь Чуркін: "...Не хацелася б у гэтым выпадку гаварыць пра манапалізм, таму што ў прэзыдэнта ёсьць уласныя дарадцы, аднак жа мы — тое ведамства, якое разрабляе як асноўную вонкавапалітычную лінію, так і пляны канкрэтных вонкавапалітычных акцыяў"[14]. 8 лістапада 1992 г. Ельцын распараджэньнем "Аб забесьпячэньні адзінай палітычнай лініі РФ у міжнародных стасунках" надае МЗС функцыі кантролю і каардынацыі працы іншых органаў па выпрацоўцы адзінай вонкавапалітычнай лініі[15]. Гэты дакумэнт быў раскрытыкаваны ВС РФ, Міністэрствам абароны, якое пачынала праводзіць уласную палітыку, асабліва ў краінах СНД. У выніку МЗС не змагло стаць адзіным цэнтрам выпрацоўкі вонкавай палітыкі Расіі. Больш за тое, сам міністар Андрэй Козыраў ня змог "эфэктыўна арганізаваць працу Міністэрства замежных справаў як бюракратычнага цэнтру", а потым стаў аб'ектам "нэгатыўнай кампаніі ў прэсе, калі прыватныя слабасьці й памылкі міністра зьвязваліся са стратэгіяй, якую ён рэалізоўваў"[16]. Адсюль залежнасьць працы міністэрства і міністра ад унутранай палітычнай кан'юнктуры**. Паступова пад уплывам канфлікту з ВС Ельцын прыходзіць да зьмены сваёй пазыцыі. Адначасова пачынаецца аслабленьне МЗС як галоўнага органу, які вызначае лінію вонкавай палітыкі, на карысьць органаў, падпарадкаваных наўпрост прэзыдэнту ці прэзыдэнцкай адміністрацыі. Надалей МЗС стаецца органам, які займаецца больш тэхнічнай працай: падрыхтоўкай дакумэнтаў, інфармацыйна-дарадчым забесьпячэньнем міжнародных візытаў, сустрэчаў і форумаў.

Узмацненьне Адміністрацыіі прэзыдэнта і органаў, падпарадкаваных прэзыдэнту, прыпа-

---

[14] Дипломатический вестник. 1992. 31 января — 15 февраля. С. 34—35. Аб гэтым жа піша Ли Ён Квон, цыт. тв., с. 136.

[15] Дипломатический вестник. 1992. 15—31 декабря. С. 59.

[16] Фёдоров Юрий, цыт. тв., с.37

* Гэта было абумоўлена недаверам Ельцына да вайскоўцаў, а таксама няскончаным працэсам тварэньня расійскіх вайсковых структураў замест савецкіх. Яшчэ ў 1991 годзе, пасьля падзеяў у Вільні 13 студзеня 1991 г., Ельцын заяўляе, што Расія мусіць стварыць уласнае войска. 31 студзеня 1991 г. Дзяржаўны камітэт па супрацоўніцтве зь Міністэрствам абароны СССР і КДБ СССР быў ператтвораны ў Дзяржкамітэт па абароне і бясьпецы РСФСР, які ўзначаліў К. Кабец. Затым 5 траўня 1991 г. ён быў падзелены на Дзяржкамітэт у справах абароны РСФСР і на КДБ РСФСР. Пасьля падзеяў жніўня 1991 г. і пасьля распаду СССР Ельцын пачынае рэфармаваць Міністэрства абароны. 16 сакавіка 1992 г. Ельцын бярэ на сябе кіраўніцтва над міністэрствам, намесьнікамі прызначаюцца генэрал Павал Грачоў і Андрэй Какошын (былы намесьнік дырэктара Інстытуту ЗША і Канады). 4 красавіка 1992 г. распараджэньнем № 158-рп Прэзыдэнта РФ ствараецца Дзяржаўная камісія па стварэньні Міністэрства абароны, арміі і флёту РФ. Яе ўзначальвае дарадца Прэзыдэнта РФ Дзьмітры Валкагонаў, намесьнікі Павал Грачоў, Андрэй Какошын, Канстанцін Кабец, Юры Скокаў. 7 траўня выдаюцца ўказы аб стварэньні Ўзброеных Сілаў РФ. Пры Міністэрстве абароны ствараецца Камісія па падрыхтоўцы законапраектаў, якую ўзначальвае Сяргей Філатаў (першы намесьнік Старшыні ВС, сталы сябра Рады бясьпекі), а таксама Вышэйшая атэстацыйная камісія на чале зь Юр'ем Скокавым. Толькі 18 траўня Міністэрства абароны атрымоўвае кіраўніка Паўла Грачова. Больш падрабязную інфармацыю гл.: Ли Ён Квон. Внешняя политика России в 1990-е годы (проблемы и тенденции). Москва: Институт Российской истории. РАН. 1999. С. 143—145.

** Гэта ілюструе выступ А. Козырава 14 сьнежня 1992 г. падчас нарады міністраў замежных справаў краін НБСЭ ў Стакгольме, дзе ён заклікаў да зьняцьця санкцыяў ААН з СРЮ і выступіў супраць пашырэньня прысутнасьці НАТО ў Прыбалтыцы й іншых рэгіёнах былога СССР. Адразу ж па выступе Козыраў заявіў, што ён гэта была разыгранка і што ягоная прамова — гэта збор патрабаваньняў расійскай апазыцыі. (Гл. Известия. 1992. 15 декабря.)

дае на пэрыяд, насталы па восеньскім крызысе 1993 году і перамогі Ельцына. Аднак база для гэтага закладалася яшчэ раней. У чэрвені 1992 г. ствараецца Рада бясьпекі РФ. Першым сакратаром яе стаў Юры Скокаў, які ўзначаліў 3 ліпеня Камісію па распрацоўцы прапановаў, структуры і парадку дзейнасьці Рады бясьпекі РФ. Рада складалася з прэзыдэнта, віцэ-прэзыдэнта, прэм'ер-міністра, старшыні ВС РФ, сакратара Рады бясьпекі, міністраў замежных, унутраных справаў, абароны, юстыцыі, фінансаў, эканомікі. Першапачатковы апарат налічваў 10 асобаў, паступова быў павялічаны да 80-ці. 7 ліпеня 1992 г. выйшаў указ "Аб парадку рэалізацыі пастановаў Рады бясьпекі РФ", які даваў Ю. Скокаву (які крытыкаваў лінію МЗС і раіў адправіць Козырава ў адстаўку) права каардынаваць працу выканаўчых органаў падчас рэалізацыі пастановаў Рады, што значна аслабіла пазыцыі МЗС[17]. 16 сьнежня 1992 г. была створана Міжведамасная вонкавапалітычная камісія Рады бясьпекі РФ з мэтай каардынацыі працы па падрыхтоўцы вонкавапалітычных пастановаў у складзе сакратара камісіі (Ю. Скокаў), міністраў замежных і ўнутраных справаў, абароны, юстыцыі. Аднак да 1993 г. уплыў Рады стрымліваўся пазыцыяй ВС: бальшыня дэпутатаў бачыла ў існаваньні Рады парушэньне канстытуцыі. Згодна з канстытуцыяй, якая дзеяла ў Расіі з 1991 г., вонкавую палітыку вызначаў больш ВС, чымся прэзыдэнт. Толькі пасьля зьмены структуры адносінаў паміж выканаўчай і заканадаўчай уладай (перамогі Ельцына ў канкурэнцыі з парлямэнтам і далейшай кансалідацыі паўнамоцтваў у руках Ельцына) Рада бясьпекі пачынае выходзіць на першы плян. Ужо ў Канстытуцыі 1993 году плянаваньне і рэалізацыя вонкавае палітыкі робяцца прэрагатывамі прэзыдэнта, які вызначае яе асноўныя кірункі (арт. 80, п., арт. 86, пп. "а"). Ён фармуе і ўзначальвае Раду бясьпекі, прымае вайсковую дактрыну, прызначае і вызваляе з пасадаў найвышэйшае вайсковае кіраўніцтва.

Тым самым паўнамоцтвы для распрацоўкі і правядзеньня ў жыцьцё вонкавае палітыкі сканцэнтраваў у сваіх руках прэзыдэнт і некалькі структураў каля яго, перадусім Адміністрацыя прэзыдэнта, якая рэгулярна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы замежных візытаў прэзыдэнта і прыняцьці дзяржаўных дзеячоў іншых краінаў, і Рада бясьпекі. Потым, пры канцы сьнежня 1995 году, указам прэзыдэнта ствараецца яшчэ адзін орган — "Рада ў вонкавай палітыцы пры прэзыдэнту РФ". Кампэтэнцыя апошняй — распрацоўка прапановаў і рэкамэндацыяў што да лініі вонкавае палітыкі, а таксама інфармацыйнае забесьпячэньне прэзыдэнта і кіраўніка Адміністрацыі ў абсягу вонкавае палітыкі (з 1996 году). У гэтую Раду ўваходзяць прэзыдэнт Расіі, прэм'ер-міністар, ягоны першы намесьнік, міністры фінансаў, вонкаваэканамічных сувязяў, замежных справаў, абароны, дырэктар ФСБ, ФПС, дырэктар СВР, сакратар Рады ў вонкавай палітыцы, сакратар Рады бясьпекі і кіраўнік Рады бясьпекі*. У выніку гэтага апарат прэзыдэнта паставіў пад кантроль разработку і правядзеньне вонкавае палітыкі.

На гэтым канчаецца пэрыяд нявызначанасьці і нерашучасьці ў стаўленьні да інтэграцыйных працэсаў на прасторы СНД. Дагэтуль стаўленьне да інтэграцыі вызначалася лёгікай канкурэнцыі/змаганьня, спачатку за ўладу, калі Ельцын, абапіраючыся на рэгія-

[17] Лі Ён Квон, цыт. тв., с. 127—128.

* Згодна з указам ад 21 студзеня 1997 г., тым часам як першы ўказ у сьнежні 1995 г. не ўлучаў сакратара Рады бясьпекі ў склад Рады ў вонкавай палітыцы. Гл.: Дипломатический Вестник. 1997. Февраль. С. 4—6. У тым жа 1997 годзе была створана Камісія ў міжнароднай бясьпецы пры Радзе бясьпекі (указ ад 19 верасьня 1997 г.), якую ўзначаліў Яўген Прымакоў. У сьнежні 1997 года Рада бясьпекі атрымала новыя паўнамоцтвы: забясьпечваць прэзыдэнта аналізам міжнароднай сытуацыі, прагназаваць зьмены, разрабляць дырэктывы Прэзыдэнта РФ для рэалізацыі канцэпцыі нацыянальнае бясьпекі.

нальныя эліты, ліквідаваў Савецкі Саюз разам зь яго прэзыдэнтам, а потым за большую ўладу, калі Ельцын перарабляў Канстытуцыю і зьмяняў паўнамоцтвы парлямэнту (гэтым разам супраць яго пайшлі тыя, хто падтрымаў яго ў 1991 г., — Аляксандар Руцкой і інш.). Імпэратывам палітыкі ў дачыненьні да былых савецкіх рэспублік было спыненьне дэзінтэграцыйных працэсаў, якія несьлі пагрозу распаду самой Расіі, і недапушчэньне ўмацаваньня антырасійскіх рэжымаў у краінах СНД, што вяло б да ізаляцыі Расіі. Увесь гэты час Масква падштурхоўвала былыя савецкія рэспублікі да рэінтэграцыі на аснове эканамічнага зьвязу з адзінай вайскова-стратэгічнай прасторай і аб'яднанымі войскамі. У "Канцэпцыі вонкавае палітыкі РФ" 1992 году напісана: "Інтарэсам Расіі адпавядала б найшчыльнейшае ахапленьне ўзаемнымі абавязкамі ў рамках СНД розных сфэраў міждзяржаўных стасункаў і як мага шырэйшага кола краінаў-удзельніцаў"[18]. Да 1993 году Расія змагла назьбіраць у СНД дванаццаць краінаў. 22 студзеня 1993 г. на сустрэчы ў Менску з ініцыятывы Расіі быў падпісаны Статут СНД. Аднак адмова некаторых краінаў (Украіна, Малдова і Туркмэністан) падпісаць Статут азначала паразу палітыкі "максымальнай кансалідацыі".

Што да беларуска-расійскай інтэграцыі, то ў той пэрыяд ейнае ўспрыманьне расійскімі палітыкамі не выходзіла за межы агульнай лініі вонкавае палітыкі Расіі — узмацненьня СНД. Расія імкнулася адстаяць забесьпячэньне бязмытнага транзыту расійскай нафты і газу празь Беларусь, а таксама разьмяшчэньне расійскіх вайсковых базаў на беларускай тэрыторыі* ў абмен на падтрымку (у выглядзе паставак нафты і газу, а таксама крэдытаў) былой партыйнай намэнклятуры. Адносіны, што склаліся тады паміж Менскам і Масквой, мелі рысы кліенталісцкіх стасункаў, у якіх апошняя выступала ў якасьці патрона, даючы рэсурсы, патрэбныя беларускаму кіраўніцтву для захаваньня ўлады**.

Зьмена кіруючай верхавіны ў Беларусі зыначвае сытуацыю ў тым сэнсе, што А. Лукашэнка спрабуе ўвайсьці на расійскае палітычнае поле, выкарыстоўваючы рыторыку інтэграцыі й лучнасьці славянскіх народаў. Расійскі падыход да стасункаў з краінамі СНД таксама мадыфікуецца, ён пачынае вызначацца перадусім новым бачаньнем постсавецкай прасторы, якая мусіць быць зынтэграваная пад эгідай Расіі[19], і выкарыстаньнем "великодержавной", нацыяналістычнай рыторыкі.

---

[18] *Дипломатический вестник*, специальный выпуск, январь 1993, с. 7.

* Гэта напісана ў артыкуле № 9 дамовы ад 12 красавіка 1994 году. З свойго боку, Расія абяцала пастаўляць нафту ў Беларусь бяз экспартных збораў, а таксама паэтапна аб'яднаць грашовыя сыстэмы Расіі й Беларусі. (Гл.: Константин Смирнов, "Дешевая нефть лучше шороха рублей", *КоммерсантDaily*, 7 октября 1994, с. 3.) Выкананьня апошняга пункту ўрад В. Кебіча ня здолеў дамагчыся ад расійцаў. Новы кіраўнік А. Лукашэнка выказваўся супраць рублёвай зоны, затое выступаў за стварэньне адзінай мытнай прасторы. (Гл.: Семенинов Григорий: Россия и Беларусь движутся в таможенный Союз // *КоммерсантDaily*, 1 ноября 1994. с. 2.)

** Тут трэба ўзгадаць, што беларускае камуністычнае кіраўніцтва фактычна падтрымала жнівеньскі путч 1991 году. 20 жніўня Прэзыдыюм ВС БССР у сваім звароце да грамадзянаў Рэспублікі заявіў, што дзейнасьць ДКНС (ГКЧП) "прадыктаваная неабходнасьцю спыніць анархію, заняпад эканамікі і распад адзінай дзяржавы". Мікалай Дземянцей прызнаўся, што лічыць адхіленьне Гарбачова ад пасады законным. ЦК КПБ таксама выказаў у звароце да грамадзянаў ад 20 жніўня абсалютную падтрымку дзеяньняў ДКНС. У той жа час Рада Міністраў безьдзейнічала. В. Кебіч ня выйшаў з свайго адпачынку. (Васильева Ольга. Республики во время путча (опыт комментированной хроники) // *Русский Журнал*, 1997, http://www.russ.ru/antolog/1991/vasil1.htm).

[19] Гл.: Николай Косолапов, "Становление субъекта российской внешней политики", *Pro et Contra*, Том 6, № 1—2, Зима-весна 2001, а таксама Юрий Фёдоров, цыт. тв..

### 2.2 Кантроль ці супрацоўніцтва: Беларусь як сродак ці як мэта палітыкі Расіі?

Зусім іншы палітычны расклад паўстае ў 1995 годзе. "Стратэгічны курс Расіі ў дачыненьні да дзяржаваў — удзельніцаў СНД", зацьверджаны ў верасьні 1995 году, гаворыць пра "ўмацаваньне Расіі ў якасьці кіруючай (асноўнай) сілы фармаваньня новай сыстэмы міждзяржаўных палітычных і эканамічных адносінаў на тэрыторыі постсавецкай прасторы"[20]. З прыходам Я. Прымакова* на пасаду міністра замежных справаў у студзені 1996 году пачынае праводзіцца іншая вонкавая палітыка. Яна характарызуецца спробай рэалізаваць шматбаковую дыпляматыю: умацаваньне пазыцыі Расіі за кошт паглыбленьня адносінаў з асноўнымі дзяржавамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёну (Кітай, Іран), узмацненьне інтэграцыйных працэсаў пад эгідай Расіі** на постсавецкай прасторы (Супольніцтва Беларусі й Расіі), спроба ўплываць на эўрапейскую палітыку з дапамогай энэргетычнага дыктату[21] і выпіхваньне Злучаных Штатаў з удзелу ў эўрапейскай бясьпецы. Разам з тым, слоган беларуска-расійскай інтэграцыі выкарыстоўваўся і як сымбалічны рэсурс у змаганьні за галасы выбарцаў з апазыцыяй унутры Расіі.

А) Асноўныя пэрспэктывы расійска-беларускай інтэграцыі

Беларуска-расійскую інтэграцыю расійскае кіраўніцтва ў тыя часы разглядала ў трох пэрспэктывах: унутрыпалітычнай, узьдзеяньня на стасункі зь іншымі краінамі СНД, вонкавапалітычнай.

Сам Б. Ельцын крута зьмяніў стаўленьне да беларуска-расійскай інтэграцыі ў 1996 годзе. З партнэра малазацікаўленага і пасіўнага ён пачынае выступаць як энтузіяст інтэграцыі. Падпісаньне 2 красавіка 1996 году дамовы аб стварэньні Супольнасьці Беларусі й Расіі адбылося падчас кампаніі па выбарах расійскага прэзыдэнта. Будучы ў цяжкой сытуацыі, крытыкаваны як лібэраламі, так і кансэрватарамі (у расійскім выпадку — камуністамі), Ельцын заснаваў сваю выбарчую стратэгію на разыгрываньні "інтэграцыйнае" карты, а таксама на спыненьні расійска-чачэнскае вайны[22].

---

* Француская дасьледніца Франсуаза Том называе яго прыхільнікам "чэкісцкай дыпляматыі" зь яе маніпуляцыямі што да партнэраў, пагардай да іх, расьцярушваньнем высілкаў па розных кірунках, прыманьнем жаданага за сапраўднае. Апрача гэтага, сьветагляд Прымакова быў паважна дэфармаваны за часы "халоднай вайны": "Мы все в руководстве СВР, — писал Примаков, — хорошо представляли себе, что с окончанием "холодной войны" понятие противник не исчезнет… Руководители ряда западных стран действуют с целью не допустить особой роли России в стабилизации обстановки в бывших республиках СССР, сорвать развитие тенденций на их сближение с Российской Федерацией" // Примаков Е. *Годы в большой политике*. — Москва, 1999. — с. 133, 135.

[20] *Дипломатический Вестник*, № 10, 1995, с. 3.

** "У якасьці асновы ўзаемадачыненьняў з новымі незалежнымі дзяржавамі была выбраная, па ўсёй верагоднасьці, мадэль "цэнтар/пэрыфэрыя". Адылі апошняя павінна была выконваць ролю рынку збыту неканкурэнтнай расійскай прадукцыі, крыніцы таннае сыравіны і галоўнае — пэўнага стратэгічнага падмурку, дзе можна будзе месьціць расійскія войскі, каб супрацьдзейнічаць пагрозам бясьпекі на аддаленых межах" // Юрий Фёдоров, тв., цыт., с. 37.

[21] На гэтую тэму гл.: артыкул Franзoise Thom, "Union europйenne — Russie: le partenariat йnergйtique", *Gйopolitique*, n°72, dйcembre 2000, с. 54—60. Беларускі пераклад: Франсуаз Том. Эўрапейскі Зьвяз — Расія: энэргетычнае партнэрства // *Наша Ніва*, 15 сакавіка 2001.

[22] Параўн. Serguei Fount, " Les tendances intйgratrices dans l'espace post-soviйtique : l'Union Russie-Biйlorussie ", Mйmoire de fin d'йtudes, Facultй Franco-Biйlorussienne des Sciences Politiques, Universitй Europйenne des Sciences Humaines de Minsk, 1999, p. 79.

На працягу 1994—1999 гадоў беларуска-расійскія адносіны ў вялікай ступені вызначаліся “дэклярацыйнасьцю”. Пагадненьне аб адзінай мытнай прасторы было падпісанае ў 1995 годзе, аднак на пачатак 2001 году “няўзгодненымі заставаліся 508 мытаў на імпарт і 139 экспартных мытаў”[23]. Падпісаны ў сьнежні 1999 году акт аб стварэньні саюзнай дзяржавы Беларусі й Расіі, нягледзячы на паважнасьць назвы, не замацоўвае юрыдычна стварэньне адзінай дзяржавы, а толькі забясьпечвае праўную базу пераходнага пэрыяду. Больш таго, вызначаная праграма дзеяньняў з канкрэтнымі датамі па рэалізацыі акту ўжо цяпер часткова сарваная[24]. Далейшае зблiжэньне Расіі й Беларусі перакрэсьлівала раней дасягнуты кампраміс паміж фэдэральным цэнтрам і аўтаномнымі рэспублікамі і магло справакаваць дэзінтэграцыю Расіі. У рэдакцыі Лукашэнкі працэс інтэграцыі азначае адмаўленьне ад часткі нацыянальнага сувэрэнітэту, якая перадаецца наддзяржаўнаму(ым) органу, на што Расія не хацела йсьці.

Інтэграцыя гамуецца расійцамі таму, што ў Расіі дзякуючы посткамуністычным пераўтварэньням стварылася гібрыдная сыстэма, у якой дзяржаўныя інстытуцыі зрастаюцца з напаўдзяржаўнымі фірмамі ці агенцыямі, якія кіруюцца капіталістычнай рацыянальнасьцю — атрыманьнем максымальнага прыбытку (праўда, робячы бізнэс на грошах, узятых зь бюджэту), што робіць іх непадуладнымі дзяржаўнаму кантролю (у інстытуцыйным вымярэньні). Адначасна творыцца аднародная палітычная кляса зь дзяржаўных службоўцаў і работнікаў банкаў, прыватных кампаніяў і сілавых структураў. У такім становішчы кіраўнічая кляса найбольш зацікаўленая ўва ўтрыманьні ўлады, рэпрадукуючы пабудаваную сыстэму палітычных адносінаў. Дэмакратычныя інстытуты, такія як выбары і парлямэнт, атрымліваюць толькі функцыю адбору новых чальцоў эліты ды іх вонкавай легітымізацыі. Таму паўстаньне наддзяржаўных органаў, што ёсьць адной з праяваў заглыбленьня інтэграцыі дзьвюх дзяржаваў, азначае зьмену сыстэмы і пагражае стратай кантролю за палітычнымі працэсамі. Іншы ж варыянт аб’яднаньня дзьвюх краінаў, т.зв. інкарпарыцыя Беларусі ў Расію, можа выклікаць крызыс самой фэдэральнай сыстэмы Расіі*. Найбольш імаверным застаецца яго сёньняшні варыянт, з той засьцярогай, што ўва ўласнасьць расійскіх каляўрадавых кампаніяў могуць быць передадзеныя галоўныя беларускія прадпрыемствы, у прыватнасьці нафтахімічнага комплексу.

Беларуска-расійская інтэграцыя разглядаецца расійскім кіраўніцтвам як мадэль “нармалізацыі” стасункаў зь іншымі постсавецкімі рэспублікамі, інакш кажучы, выстаўляюцца напаказ *вартыя перайманьня* выгады зблiжэньня Беларусі з Расіяй. Гэтая пазыцыя была набольш рэльефна сфармулявана ў спавешчаньні РВАП “Ці адродзіцца Саюз?” (1996), у якім было заяўлена, з аднаго боку, што пэрспэктывы расійска-ўкраінскіх стасункаў залежаць ад таго, як пойдуць справы зь Беларусяй (і з Казахстанам), а зь іншага боку, было адзначана, што павелічэньне, — дзякуючы супрацоўніцтву з Расіяй, — дабрабыту беларусаў перашкодзіць Кіеву праводзіць “палітыку самаізаляцыі”[25]. Вынікам такой палітыкі за-

---

[23] Мошес Аркадий. Славянский треугольник Украина и Белоруссия в российской внешней политике 90 х годов // *Pro et Contra*. — Зима-весна 2001. Том 6, № 1—2. — С. 113.

[24] Мошес Аркадий, цыт. тв., с. 113-114.

* Пасьля абраньня У. Пуціна расійскім прэзыдэнтам адной зь першых яго рэформаў было ўмацаваньне цэнтральных органаў улады. Адначасова з гэтым былі абмежаваныя візыты А. Лукашэнкі па расійскіх рэгіёнах. У выніку інтэграцыйная ініцыятыва засталася ў руках Масквы, стаўшы для яе яшчэ адным інструмэнтам у дасягненьні сваіх палітычных мэтаў.

[25] *Возродится ли Союз?: Будущее постсоветского пространства* // Тезисы СВОП. — Москва: Независимая газета, 1996. — С. 31.

ахвочваньня сталася толькі стварэньне мытнага зьвязу (Расія, Беларусь, Казахстан, Кыргыстан і Таджыкістан) ды заяўленае імкненьне Малдовы далучыцца да зьвязу Беларусі й Расіі пасьля перамогі на выбарах тамтэйшага камуніста Ўладзімера Вароніна, пасьля чаго А. Лукашэнка заявіў, што Ўкраіна "нікуды не падзенецца ад Зьвязу", бо будзе абкружаная ім з усіх бакоў*.

Эканамічная інтэграцыя зь Беларусяй стратная для расійскай эканомікі, якая ёсьць донарам, бо частка расійскага нацыянальнага даходу перапампоўваецца ў краіны "блізкага замежжа" дзякуючы адзінай мытнай прасторы, бартэрным схемам разьліку за энэргарэсурсы й г.д. Гэта яшчэ раз падкрэсьлівае палітычныя матывы ў інтэграцыі паміж дзьвюма краінамі**. Падобнае субсыдаваньне мела б сэнс толькі тады, калі б беларусы куплялі тавары расійскай вытворчасьці. Але аналіз спажывецкіх настрояў беларусаў даводзіць адваротнае.

Б) 2000 Пуцін і новае аблічча інтэграцыі

Прыход да ўлады ў Расіі У. Пуціна азначыўся павелічэньнем прагматызму ў расійскай палітыцы што да СНД. Адміністрацыя Пуціна спрабуе пераняць ініцыятыву, паменшыць субсыдыяваньне краінаў СНД, у тым ліку Беларусі і Ўкраіны. Аднак Крэмль застаецца надалей перад складанай дылемай. Як сказаў у лютым 2001 году тагачасны сакратар Рады бясьпекі Сяргей Іваноў падчас свайго выступу на вайскова-палітычным форуме ў Мюнхене, за апошні год стала відавочна: немагчыма ператварыць СНД у дзеяздольнае інтэграцыйнае аб'яднаньне, і, такім чынам, паўстае пытаньне: ці працягваць разглядаць расійскаму караўніцтву рэінтэграцыю былых савецкіх рэспублік як абсалютную вартасьць, ці шукаць матэрыяльную карысьць ад адносінаў паміж Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД[26]. Апошні падыход лепш суадносіцца з рэальнай сытуацыяй на постсавецкай прасторы. За мінулыя дзесяць гадоў СНД распалася на некалькі рэгіянальных блёкаў: Цэнтральна-азіяцкую эканамічную супольнасьць (Казахстан, Кыргыстан, Таджыкістан, Узбэкістан), Эўразійскую эканамічную супольнасьць (Беларусь, Казахстан, Кыргыстан, Расія, Таджыкістан), саюзную дзяржаву Беларусі й Расіі, а таксама эканамічны блёк ГУУАМ (Грузія, Украіна, Узбэкістан, Азэрбайджан, Малдова).

* Зь іншага боку, Лукашэнка разыгрывае ўкраінскую карту, каб нэўтралізаваць расійскія спробы навязаць Беларусі сваю палітычную волю. Асабліва паказальная сустрэча А. Лукашэнкі і Л. Кучмы 17 студзеня 1997 г., якая выглядала як адказ на інтэграцыйныя заявы Ельцына, зробленыя чатыры дні таму. У сакавіку 1997 года перад візытам Лукашэнкі ў Маскву, дзе мелася быць абмеркаваная дамова аб зьвязе Беларусі й Расіі, міністар замежных справаў Беларусі Іван Антановіч адведаў Кіеў, дзе заявіў, што для беларускага народу незалежнасьць краіны — найвялікшая вартасьць.

** Аб эканамічных стратах Расіі піша Леанід Злотнікаў ("Выживание или интеграция?" // *Pro et Contra*, Том 3, № 2, весна 1998, с. 81-94) пра палітычныя матывы расійскага фінансаваньня стратных інтэграцыйных праектаў піша Юры Шышкоў ("Россия и СНГ: неудавшийся брак по расчёту" // *Pro et Contra*, Том 6, № 1—2, Зима-весна 2001, с. 93—106). Ён гэта тлумачыць наступным чынам: "...Москва стремилась возможно быстрее и прочнее привязать к себе страны Содружества экономически, необратимо скрепить их с российским хозяйственным организмом. Этим объясняются постоянные попытки наперекор объективным возможностям ускорить интеграционные процессы. И чем больше трещин появлялось на политическом и военно-стратегическом пространстве СНГ, тем настойчивее пробовали сцементировать экономическое. (...) Можно предположить, что руководство страны считает такое явное и скрытое субсидирование государств Содружества платой за сохранение своего политического влияния в регионе, предотвращение распада постсоветского военно-стратегического пространства, возможность использовать (...) объекты его инфраструктуры.", с. 93, 101.

[26] А. Касаев. Совет безопасности решил закрыть СНГ // Независимая газета, 7 февраля 2001. Гл. таксама: Шишков Юрий, цыт. тв., с. 105.

## Высновы

Расійскае стаўленьне да інтэграцыі прайшло пэўную эвалюцыю ад дэкларацыйнай пабудовы "рэгіянальнага супрацоўніцтва" да звароту да традыцыяналісцкай расійскай палітыкі што да былых імпэрскіх рэгіёнаў/пэрыфэрыяў, прычым апошняя паважна больш не дыскутуецца расійскай палітычнай клясай, зрабіўшыся аксыёмай, або "*doxe*". Беларуска-расійская інтэграцыя вылучаецца тым, што адносіны паміж двума цэнтрамі — Масквой і Менскам — носяць кліенталісцкі характар. Абодва цэнтры імкнуцца выкарыстоўваць "інтэграцыйную" рыторыку для дасягненьня ўнутрыпалітычных і вонкавапалітычных мэтаў. Інакш кажучы, як у Расіі, так і ў Беларусі інтэграцыя робіцца стаўкай ува ўнутрыпалітычнай гульні. Можна гаварыць і аб існаваньні розных рацыянальнасьцяў успрыманьня "інтэграцыі" сярод расійскай палітычнай клясы ў залежнасьці ад часавага пэрыяду або месца яе ўдзельнікаў у палітычнай гіерархіі.

Сьпярша дыстанцыя расійскага кіраўніцтва ад інтэграцыі тлумачылася стратэгіяй пазбаўленьня ад рэгіёнаў, што рабіла магчымым рэфармаваньне савецкай сыстэмы. У гэтым кантэксьце адыход былых саюзных рэспублік успрымаўся як шанец "нармалізаваць" адносіны паміж цэнтрам і рэгіёнамі, забясьпечыць прыход новых элітаў, рэкрутаваных з "другога эшалёну" былой сыстэмы (рэгіянальныя кіраўнікі) і кваліфікаваных кадраў (спэцыялісты)[27]. У далейшым у Расіі на стаўленьне да "інтэграцыі" ўплывала лёгіка барацьбы за кансалідацыю ўлады паміж парлямэнтам і прэзыдэнцкай адміністрацыяй. На думку маскоўскага палітоляга Дз. Фурмана, умацаваньне ў Расіі рэжыму "прыватызаванай прэзыдэнтам улады" надало вельмі прыкладны характар інтэграцыйным праектам, абмежаваным канкрэтнымі палітычнымі мэтамі расійскага кіраўніцтва. Беларусь робіцца ўсё больш адным са сродкаў дасягненьня мэтаў, але ніяк не разглядаецца як мэта ў сабе. Такой мэтай, напрыклад, можа быць пабудова прыязных адносінаў з суседняй сувэрэннай дзяржавай.

Часткова гэта тлумачыцца расійскімі гістарычнымі і культурнымі комплексамі. Няздольнасьць рэальна глядзець на адносіны з Беларусяй, па ўсёй верагоднасьці, тлумачыцца т. зв. комплексам "спакусы інтэграцыяй"*, пры якім на першы плян выходзіць не ацэнка рэальнай сытуацыі, вызначэньне мэтаў, а падлік прымальнага палітычнай і эканамічнай цаны за пачуцьцё вяртаньня расійскай велічы, здабыцьцё якой расійцы традыцыйна зьвязваюць з захопам/інтэграцыяй усходнеславянскіх земляў у склад расійскай імпэрыі. Комплекс жа "старэйшага брата" прыводзіць да таго, што расійская палітычная кляса ігнаруе гісторыю, культуру Беларусі, разглядае яе толькі як свайго "малодшага брата" ці як "залежнага кліента", якому аказвае пэўную дапамогу наўзамен за паслугі ці рэсурсы. Аднак калі "малодшы брат" настойліва патрабуе — больш і больш выяўляе незадавальненьне такой новай роляй. Культываваньне міту аб блізіні беларусаў і расійцаў толькі ўскладняе сытуацыю, бо насамрэч на

[27] Гл. Wasilewski J., Elita poityczna. 1998. Warszawa, 1999.

* Гэты выраз (анг. *Integrationist temptation*) быў уведзены амэрыканскім дасьледнікам Шэрманам Гарнэтам (Sherman Garnett), аўтарам кнігі *"Keystone in the Arch: Ukraine in the Emerging Security Environment of Central and Eastern Europe"*. Washington, Carnegie Endowment for International Peace, 1997, выдаўцом, сумесна з Робэртам Легвольдам (Robert Legvold), кнігі *"Belarus at the Crossroads"*. Washington, Carnegie Endowment for International Peace, 1999. Цыт. з Alaksandr Lahviniec. Orient ou Occident: Les et ambiguпťйs et les incertitudes de la politique йtrangиre bйlarussienne // выступ на сэмінары "Approches croisйes sur le Bйlarus contemporain (science politique, sociologie, anthropologie)". Варшава, 6—7 красавіка 2002 г.

побытавым узроўні ў беларусаў існуе нэгатыўнае стаўленьне да расійцаў і Расіі як да краіны недаразьвітай і неўпарадкаванай. Таму “інтэграцыя” ў сёньняшняй форме не спрыяе “нармалізацыі” беларуска-расійскіх адносінаў у сэнсе паглыбленьня ведаў аб Беларусі ў Расіі, без чаго немагчымыя раўнапраўныя кантакты, а не кан’юнктурная мітатворчасьць.

## СТРУКТУРА КІРАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ РАСІІ Й БЕЛАРУСІ

За гады існаваньня беларуска-расійскага саюзу яго структура не набыла арганізацыйнай дакладнасьці і палітычнай эфэктыўнасьці, дастатковай для таго, каб “Саюзную дзяржаву Беларусі й Расіі” пачалі ўважаць у сьвеце за паўнавартаснае дзяржаўнае ўтварэньне. На сёньняшні дзень палітычны хаўрус Беларусі й Расіі мае назоў “Саюзная дзяржава” (СД). Дамова пра яе стварэньне была падпісана 8 сьнежня 1999 г. і ўступіла ў дзеяньне 26 сьнежня 2000 г. Паводле гэтае дамовы былі заснаваныя кіраўнічыя органы Саюзнай дзяржавы — Найвышэйшая дзяржаўная рада (НДР), Рада міністраў (РМ), Сталы камітэт (СК) і Парлямэнт Саюзнай дзяржавы, які дагэтуль яшчэ ня створаны.

Стварэньню СД папярэднічала Дамова аб стварэньні Супольнасьці 2 красавіка 1996 г., Дамова аб стварэньні Саюзу ад 2 красавіка 1997 г. і Дэклярацыя аб далейшым яднаньні Беларусі й Расіі ад 25 сьнежня 1998 г. Ніводнае з гэтых пагадненьняў не зьмяшчала юрыдычнага афармленьня статусу аб’яднаньня Беларусі й Расіі. У арт. 4 Статуту Саюзу гаворыцца пра яго міжнародную правасуб’ектнасьць. Аднак гэтая правасуб’ектнасьць належыцца яму толькі ў той меры, у якой ён надзелены ёю з боку дзяржаваў, кожная зь якіх рэгулярна пацьвярджае, што застаецца пры сваім сувэрэнітэце й атрыбутах дзяржаўнасьці. Так, у саюзнай дамове ад 3 красавіка 1997 г. напісана: “Кожная дзяржава — удзельніца Саюзу захоўвае дзяржаўны сувэрэнітэт, незалежнасьць і тэрытарыяльную цэльнасьць, Канстытуцыю, дзяржаўны сьцяг, герб ды іншыя атрыбуты дзяржаўнасьці” (арт. 1). У Дэклярацыі аб далейшым яднаньні ад 25 сьнежня 1998 г. гаворка йдзе пра добраахвотнае аб’яднаньне ў “Саюзную дзяржаву пры захаваньні нацыянальнага сувэрэнітэту дзяржаў — удзельніцаў Саюзу”[1]. У Дамове аб стварэньні Саюзнай дзяржавы ўказваецца: “Кожная дзяржава-ўдзельніца захоўвае з улікам добраахвотна перададзеных Саюзнай дзяржаве паўнамоцтваў сувэрэнітэт, незалежнасьць, тэрытарыяльную цэльнасьць, дзяржаўны лад, Канстытуцыю, дзяржаўны сьцяг, герб ды іншыя атрыбуты дзяржаўнасьці” (ч. 1, с. 6), прычым у артыкуле 17 дамовы, дзе пералічаюцца прадметы выключнага распараджэньня Саюзнай дзяржавы, не пазначаецца, што такім прадметам ёсьць *уся* міжнародная дзейнасьць і міжнародныя дамовы Расіі й Беларусі. Пакуль абедзьве дзяржавы пасьлядоўна адмаўляюцца ад інтэграцыі за кошт уласнага сувэрэнітэту, на практыцы найбольш дзейсным інструмэнтам рэглямэнтацыі беларуска-расійскага аб’яднаньня выступаюць дамовы, упаасобку тыя зь іх, якія выконваюць ролю ўстаноўчых і статутных дамоўна-праўных актаў[2].

[1] Декларация о дальнейшем единении России и Беларуси (г. Москва, 25 декабря 1998 г.)

[2] Румянцев О.Г. Объединение России и Белоруссии: политико-правовые проблемы // Бизнес и политика. — 1997. № 2. С. 21.

З гледзішча міжнароднага права, Саюзная дзяржава ёсьць новаўвядзеньнем, наконт якога ні паміж палітыкамі, ні паміж экспэртамі няма згоды. Дэпутат Дзяржаўнай думы РФ Мікалай Ганчар сьцьвярджаў, што Саюзная дзяржава ня што іншае як фэдэрацыя[3]. Так сама ўважаў дзяржаўны сакратар СД Павал Барадзін[4]. Зь імі поўніцай ня згодны беларускі прэзыдэнт, які неаднаразова заяўляў, што пра фэдэрацыю ў прынцыпе, ня можа быць размовы[5]. А. Лукашэнка выказваецца за пашырэньне паўнамоцтваў Саюзнай дзяржавы як супольнай для Беларусі й Расіі арганізацыйнай надбудовы, але такая мадэль не задавальняе Маскву.

Правазнаўцы бачаць у Саюзнай дзяржаве складаную фэдэрацыйна-канфэдэрацыйную структуру. Саюзная дзяржава — гэта "ўжо не міжнароднае аб'яднаньне і яшчэ не дзяржава"[6]. І Беларусь, і Расія па-ранейшаму захоўваюць сваё сяброўства ў ААН ды іншых міжнародных арганізацыях. Аднак, тэарэтычна, па ўзаемнай дамоўленасьці ня выключана і адзінае сяброўства. На думку прафэсара катэдры міжнароднага права Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Юр'я Броўкі, калі СД — гэта канфэдэрацыя, то яна можа спалучаць у сабе рысы міжнароднай арганізацыі й дзяржавы. Аднак пры ставарэньні адзінай дзяржавы СД павінна ўступіць у ААН, што будзе каштаваць Расіі сяброўства (з правам вэта) ў Радзе бясьпекі ААН, а Беларусі — статусу незалежнай дзяржавы[7]. Пакуль гэтага не адбудзецца, Саюзная дзяржава як суб'ект міжнародных адносінаў можа разьлічваць у міжнародных структурах ня больш як на статус назіральніка[8].

Вызначыць дзяржаўны лад Саюзнай дзяржавы й ейную праўную сыстэму павінен Канстытуцыйны акт (арт. 62 Дамовы ад 8.12.99). Як адзначаў тагачасны старшыня камітэту Дзярждумы ў справах СНД і сувязях з суайчыньнікамі Барыс Пастухоў, падрыхтоўка гэтага дакумэнту ідзе вылучна марудна, без асаблівага спрыяньня расійскага й беларускага кіраўніцтва. Больш за тое, навідавоку імкненьне пэўных сілаў адкласьці прыняцьце гэтага дакумэнту на няпэўны тэрмін[9]. Разыходжаньні ў пытаньні аб канстытуцыйным акце Саюзнай дзяржавы зьвязаныя з тым, як у ім павінны быць апісаныя суадносіны паўнамоцтваў дзяржаваў і саюзных органаў. А. Лукашэнка перакананы, што саюзныя органы павінны быць наднацыянальнымі. Акурат гэта зробіць бакі юрыдычна раўнапраўнымі і, з улікам ранейшых дамоваў паміж імі, дасьць Беларусі гарантыю захаваньня сувэрэнітэту. Павал Барадзін, наадварот, лічыць, што спрэчка наконт канстытуцыйнага акту можа весьціся толькі ў пляне выбару такой формы фэдэрацыі, якая была б прывабнай для іншых краінаў[10]. Нагэтулькі адрозныя погляды на тое, якім павінна быць беларуска-расійскае аб'яднаньне, дазваляюць выснаваць, што канстытуцыйны акт Саюзнай

[3] Бровка Ю.П. Белорусско-российская интеграция с точки зрения международного права // Белорусско-российские отношения: проблемы и перспективы: Мат-лы Второго "круглого стола" белорусских и российских ученых. Минск, 26—27 января 1999 г. Минск, 2000. С. 29.

[4] Независимая газета. 2000. 9 июня.

[5] Козырь А. Новый этап в единении Беларуси и России // Юстиция Беларуси. 1999. № 1. С. 11.

[6] Авакьян С.А. Договор между Республикой Беларусь и Российской Федерацией о создании союзного государства: конституционно-правовой анализ // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 11, Право. 2001. № 1. С. 3—15.

[7] Селиванова И.Ф. Россия — Беларусь: проблемы и перспективы отношений // Власть. 1999. № 4. С. 81.

[8] Прибытковский Ф. Единение России и Беларуси: проблемы и перспективы (информация о 3-м "круглом столе" ученых России и Беларуси) // Белорусский журнал международного права и международных отношений. 2000. № 1.

[9] Пастухов Б.Н. Актуальные проблемы становления Союзного государства // Выступление на международной научно-практической конференции "Актуальные проблемы строительства и развития Союзного государства" (7—8 декабря 2000 г., С.-Петербург).

[10] Бородин П. Социальные и политические аспекты объединения Белоруссии и России // Власть. 2000. № 1. С. 6—7.

дзяржавы, нават пасьля працы адмыслоўцаў, не разьвяжа прынцыповых пытаньняў аб арганізацыйна-праўнай прыродзе Саюзнай дзяржавы, і ў выпадку хуткага прыняцьця яго чакае лёс чарговай дэкляраціі.

На якой жа праўнай аснове грунтуецца структура органаў СД? Статут Саюзу, прыняты 23 траўня 1997 г., перастарэў, канстытуцыйны акт Саюзнай дзяржавы яшчэ не прыняты, а пастановы, што прымаюцца Парлямэнцкім сходам (ПС), нікчэмныя з гледзішча права, паколькі, па-першае, ПС не абіраецца насельніцтвам, па-другое, яго пастановы ня могуць супярэчыць канстытуцыям дзьвюх краінаў. Пакуль заканадаўчай базай Саюзнай дзяржавы застаюцца рашэньні, якія носяць пераважна рэкамэндацыйны характар, дзяйсьнейшым мэханізмам нарматворчасьці выступаюць акты саюзных органаў, якія трансфармуюцца ў пастановы нацыянальных органаў выканаўчай улады.

## Органы Саюзнай дзяржавы

Органамі Саюзнай дзяржавы зьяўляюцца Найвышэйшая дзяржаўная рада, у якую ўваходзяць кіраўнікі дзяржаваў, парлямэнтаў і ўрадаў, і Рада Міністраў, якая складаецца з чальцоў урадаў. Рабочы орган Саюзнай дзяржавы — Сталы камітэт. У адпаведнасьці з Дамовай ад 8 сьнежня 1999 г., парлямэнт Саюзнай дзяржавы мае быць створаны ў будучым. Яго вышняя гаспода павінна фармавацца заканадаўчымі органамі дзяржаваў-удзельніцаў на парытэтнай аснове, а ніжняя — на аснове простых выбараў. Пакуль найвышэйшы заканадаўчы і прадстаўнічы орган СД — парлямэнт Саюзнай дзяржавы — ня створаны, заканадаўчыя функцыі выконвае толькі Найвышэйшая дзяржаўная рада.

Найвышэйшая дзяржаўная рада — пераемніца Найвышэйшай рады Супольнасьці Беларусі й Расіі, прадугледжанай Дамовай ад 2 красавіка 1996 г. У выкананьне Дамовы аб стварэньні Саюзу ад 2 красавіка 1997 г. яна пераўтворана 23 траўня 1997 г. у Найвышэйшую Раду Саюзу, а з падпісаньнем Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы ад 8 сьнежня 1999 г. атрымала цяперашнюю назву. НДР — найвышэйшы орган беларуска-расійскага аб’яднаньня. Згодна з статутам, яна надзеленая паўнамоцтвамі для разьвязаньня найважнейшых пытаньняў у Саюзнай дзяржаве. У яе кампэтэнцыі знаходзяцца ўтварэньне органаў СД, улучна з органамі кіраваньня галіновага й функцыянальнага характару; прызначэньне выбараў у Гасподу Прадстаўнікоў парлямэнту Саюзнай дзяржавы; зацьверджаньне бюджэту; зацьверджаньне міжнародных дамоваў СД, ратыфікаваных парлямэнтам (п. 1 арт. 35 Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы). Сьпіс паўнамоцтваў НДР ёсьць адкрытым. НДР мае апошняе слова ў прыняцьці законаў Саюзнай дзяржавы, падрыхтаваных Парлямэнцкім сходам.

У паседжаньнях НДР удзельнічае таксама старшыня Суду Саюзнай дзяржавы (ч. 3 арт. 34 Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы). Пры Саюзе ў Найвышэйшую раду ўваходзіў таксама старшыня Выканаўчага камітэту Саюзу з правам дарадчага голасу (арт. 20 Статуту Саюза Беларусі й Расіі ад 23 траўня 1997 г.). З часу стварэньня Саюзу старшынём Найвышэйшай рады, а пасьля НДР, па чарзе ёсьць адзін з прэзыдэнтаў краінаў-удзельніцаў Саюзу. Пастановы НДР прымаюцца аднагалосна паводле прынцыпу “адна дзяржава — адзін голас”. Галасаваньне на паседжаньнях НДР ад імя дзяржаваў-удзельніцаў Саюзу зьдзяйсьняюць іх прэзыдэнты альбо асобы, імі ўпаўнаважаныя (ч. 2 арт. 37 Дамовы ад 8.12.99). Пытаньне аб тым, ці магчыма прыняцьце акту НДР, калі раптам кіраўнік дзяржавы ня будзе

згодны з рашэньнем упаўнаважанага ім прадстаўніка, у дамове не прапісанае.

Статус НДР вызначаны так, што гэты орган можа выконваць дваякую ролю: будучы найвышэйшым органам беларуска-расійскага аб’яднаньня, ён адначасова служыць “сталом перамоваў”, за якім кіраўнікі дзьвюх краінаў нефармальна абмяркоўваюць бягучыя пытаньні. Статут Найвышэйшай Рады, зацьверджаны ейнай пастановай № 10 ад 22 студзеня 1998 г., пашырыў яе паўнамоцтвы. У іх лік былі ўлучаныя прызначэньне на пасады старшыні Выканаўчага камітэту Саюзу, яго намесьнікаў і кіраўніка справамі Выканкаму, а таксама іх вызваленьне з пасадаў; зацьверджаньне палажэньня аб Выканкаме, яго колькасным складзе й выдатках на ўтрыманьне яго апарату. 27 ліпеня 2000 г. пастановай НДР № 7 быў зацьверджаны рэглямэнт НДР, які дэталізаваў яе паўнамоцтвы. Разам з тым, у дзеяньні застаўся арт. 7 Статуту Найвышэйшай рады, якая забараняе НДР прымаць рашэньні, якія супярэчаць канстытуцыям дзяржаваў-удзельніцаў.

## Выканаўчая ўлада

За пэрыяд з 1996 па 1999 гг. структуры выканаўчай улады ў беларуска-расійскім хаўрусе перажылі грунтоўныя зьмены. З падпісаньнем Дамовы аб утварэньні Саюзнай дзяржавы адзіны выканаўчы орган Саюзу — Выканаўчы камітэт — быў ператвораны ў два органы з больш рэглямэнтаванымі паўнамоцтвамі: Раду Міністраў і Сталы камітэт. Сталы камітэт падпарадкаваны Радзе Міністраў, якая мае выконваць функцыі саюзнага ўраду.

**Выканаўчы камітэт** Саюзу Беларусі й Расіі быў створаны як стала дзейны выканаўчы орган Саюзу, які фармуецца Найвышэйшай Радай (арт. 11 Дамовы аб стварэньні Супольнасьці Беларусі й Расіі ад 2 красавіка 1996 г.). Больш дэталёва яго дзейнасьць рэглямэнтуецца ў Статуце Саюзу, дзе напісана, што ў Выканкам уваходзіць роўная колькасьць прадстаўнікоў дзяржаваў-удзельніцаў, а яго пэрсанальны склад зацьвярджаецца асабіста кіраўнікамі дзяржаваў (арт. 27 Статуту Саюзу). Старшыня Выканкаму й яго намесьнікі прызначаліся Найвышэйшай Радай, прычым старшыня ўваходзіў у Найвышэйшую Раду з правам дарадчага голасу. Найвышэйшай радай прызначаюцца таксама намесьнікі старшыні Выканкаму (па адным ад кожнай дзяржавы) і кіраўнік справамі Выканкаму, які ўзначальваў яго апарат. Намесьнікі кіраўніка справамі прызначаліся й здымаліся з пасадаў Выканкамам на квотнай аснове, з роўным прадстаўніцтвам дзяржаваўудзельніцаў. Па такім жа прынцыпе прызначаліся й вызваляліся ад пасадаў кіраўнікі аддзелаў апарату Выканкаму.

У Рэглямэнце Выканкаму, зацьверджаным пастановай Выканкаму № 2 ад 2 сьнежня 1997 г., гэтаму органу нададзены паўнамоцтвы для вядзеньня саюзных справаў у пэрыяды паміж паседжаньнямі Найвышэйшай рады. У кампэтэнцыі Выканкаму апынулася арганізацыя ўсёй практычнай працы для выкананьня Дамовы аб Саюзе ад 2 красавіка 1997 г., выкананьня пастановаў Найвышэйшай рады і ўласных пастановаў, каардынацыя дзейнасьці галіновых ды іншых органаў Саюзу, арганізацыяў Саюзу ды міждзяржаўныя сувязі ўва ўсіх сфэрах, ад вайсковай да культурнай. Выканкаму таксама даручалася забесьпячыць захады для ўніфікацыі грашова-крэдытных, бюджэтных, валютных сыстэмаў і фінансавых рынкаў; узгадніць асновы антыманапольнага, падатковага й інвэстыцыйнага заканадаўства; стварыць неабходныя ўмовы для ўвядзеньня адзінай валюты. Функцыі й паўнамоцтвы Выканаўчага камітэту

Саюзу былі такімі шырокімі з прычыны яго беспасярэдняй падпарадкаванасьці Найвышэйшай радзе. Пры неразьвітасьці спэцыялізаваных органаў заканадаўчай і судовай улады ў Саюзе частку іх функцыяў брала на сябе ня толькі Найвышэйшая рада, але й Выканкам. У існасьці Выканкам выконваў ролю стала дзейнага аддзелу Найвышэйшай рады, адказнага за апэратыўныя рашэньні.

Пра самадастатковасьць Выканкаму сьведчыць тое, што нават палажэньне аб Выканкаме зацьвярджалася Найвышэйшай радай на прапанову самога ж Выканкаму (абз. 1 арт. 26 Статуту Саюзу Беларусі й Расіі). Такая самадастатковасьць Выканкаму давала надзвычай шырокія паўнамоцтвы кіраўніку апарату Выканкаму — кіраўніку справамі. У яго кампэтэнцыю ўваходзіла арганізацыйнае забесьпячэньне паседжаньняў Выканкаму і ўзаемадзеяньне з органамі галіновага ды іншага характару, а таксама арганізацыямі Саюзу, міністэрствамі, ведамствамі ды арганізацыямі дзяржаваў-удзельніцаў Саюзу, перш за ўсё тымі, якія зьдзяйсьняюць каардынацыйныя функцыі для супрацоўніцтва зь дзяржавамі — удзельніцамі СНД (арт. 35 Рэглямэнту Выканкаму).

У заданьні Выканкаму ўваходзіла падрыхтоўка дакумэнтаў, кантроль за выкананьнем пастановаў Найвышэйшай рады, улучна з прызначэньнем прамоўцаў у пытаньнях, вынесеных на яго паседжаньні. Плян дзейнасьці Выканкаму ствараўся на падставе пастановаў Найвышэйшай рады. На прапанову старшыні паседжаньня альбо чальцоў Выканкаму ў парадак яго паседжаньня магло быць улучанае любое пытаньне без папярэдняй яго падрыхтоўкі апаратам Выканкаму[11].

Арт. 29 Статуту Саюзу вызначаў, што пастановы Выканкаму прымаюцца аднагалосна паводле прынцыпу “адна дзяржава — адзін голас”. Тыя зь іх, якія не выходзілі за межы кампэтэнцыі Выканкаму, г.зн. не парушалі канстытуцыяў дзяржаваў-удзельніцаў Саюзу, выконваліся падпарадкаванымі органамі й арганізацыямі Саюзу ў парадку, вызначаным нацыянальнымі заканадаўствамі. Кантроль за выкананьнем пастановаў Выканкаму зьдзяйсьняў яго апарат, а таксама апараты нацыянальных урадаў. Найвышэйшая рада мела права прыпыняць і скасоўваць любую пастанову Выканкаму. Больш за палову з 290 пытаньняў, што былі разгледжаныя за пэрыяд з 1996 па 1999 гг., тычыліся фінансава-эканамічных і сацыяльных праблем. Кожнае пятае пытаньне насіла кантрольны характар[12].

Згодна з Дамовай аб стварэньні Саюзнай дзяржавы, Выканкам павінен дзеяць да стварэньня Рады міністраў, а яго апарат — да фармаваньня Сталага Камітэту (арт. 70).

**Рада Міністраў** была заснаваная Дамовай аб стварэньні Саюзнай дзяржавы. Палажэньне аб Радзе Міністраў Саюзнай дзяржавы зацьверджана пастановай НДР ад 27 чэрвеня 2000 г. № 12. Старшыня Рады Міністраў, як некалі кіраўнік справамі Выканкаму, прызначаецца й вызваляецца з пасады Найвышэйшай дзяржаўнай радай. Старшыня й чальцы Рады міністраў ня могуць дзейнічаць насуперак афіцыйнай пазыцыі НДР (п. 3 Рэглямэнту Рады Міністраў Саюзнай дзяржавы). У ліку паўнамоцтваў Рады міністраў знаходзіцца скасаваньне актаў галіновых і функцыянальных органаў Саюзнай дзяржавы ў выпадку іх супярэчнасьці з нарматыўна-праўнымі актамі Саюзнай дзяржавы (арт. 46 Дамовы ад 8.12.99). З 26 студзеня

[11] Беларусь и Россия: организационно-правовые основы интеграции (1996—2001) / Л.П. Козик, М.В. Мясникович, А.М. Абрамович и др. Минск, 2001. С. 38.

[12] Беларусь и Россия: организационно-правовые основы интеграции (1996—2001) / Л.П. Козик, М.В. Мясникович, А.М. Абрамович и др. Минск: Полымя, 2001. С. 37.

2000 г. да Рады Міністраў перайшло кіраваньне ўласнасьцю Саюзнай дзяржавы (арт. 46 Дамовы ад 8.12.99).

**Сталы камітэт** (СК) Саюзнай дзяржавы — орган, які выконвае функцыі яе апарату. СК падпарадкаваны Радзе Міністраў, якая яго фармуе (п. 1 арт. 48 Дамовы ад 8.12.99). На СК ускладзена забесьпячэньне дзейнасьці органаў сэсійнага характару (п. 2 арт. 46 Дамовы ад 8.12.99), а таксама адказнасьць за падрыхтоўку паседжаньняў НДР і Рады Міністраў.

Паўнамоцтвы Сталага камітэту вызначаныя ў палажэньні, зацьверджаным пастановай НДР ад 27 чэрвеня 2000 г. Кіраўніком СК ёсьць Дзяржаўны сакратар, які прызначаецца й вызваляецца ад пасады Найвышэйшай дзяржаўнай радай на прапанову старшыні Рады міністраў. Дзяржсакратар распараджаецца фінансавымі й матэрыяльнымі сродкамі, а таксама ўкладае грамадзянска-праўныя дамовы зь юрыдычнымі й фізычнымі асобамі. Апрача гэтага, СК можа атрымліваць ад дзяржаваў-удзельніцаў маёмасьць, неабходную для зьдзяйсьненьня ўскладзеных на яго абавязкаў. Дзяржаўным сакратаром прызначаны Павал Барадзін.

## Заканадаўчая ўлада

Да стварэньня Парлямэнту Саюзнай дзяржавы найвышэйшым прадстаўнічым органам СД зьяўляецца **Парлямэнцкі сход** (ПС), заснаваны ў адпаведнасьці з арт. 10 Дамовы аб стварэньні Супольнасьці ад 2 красавіка 1996 г. ПС ёсьць правобразам будучай вышняй гасподы парлямэнту Саюзнай дзяржавы. ПС складаецца зь дзьвюх дэпутацыяў, дэлегаваных парлямэнтамі Беларусі й Расіі — Нацыянальным сходам РБ і Фэдэральным сходам РФ. Кожная парлямэнцкая дэпутацыя ўключае ў сябе роўную колькасьць прадстаўнікоў: па 36 чалавек ад кожнай дзяржавы–ўдзельніцы Саюзнай дзяржавы. Агульная колькасьць дэпутатаў ПС складае 72 чалавекі. Дэлегаваньне прадстаўнікоў у ПС і іх адкліканьне нацыянальныя парлямэнты зьдзяйсьняюць самастойна, паводле ўласных рэглямэнтаў.

ПС прымае модульныя заканадаўчыя акты і ўносіць адпаведныя прапановы ў органы, якія маюць права заканадаўчай ініцыятывы, у парлямэнты Беларусі й Расіі, а таксама ў НДР. Пастановы ПС прымаюцца кваліфікаванай бальшынёй галасоў. Паседжаньні правамоцныя, калі на іх прысутнічае ня менш за дзьве траціны дэпутатаў ад кожнай з краінаў. Кіраўнічым органам ПС ёсьць Рада, якая складаецца са старшыні, яго намесьнікаў і старшыняў сталых камісіяў.

Сьпярша парадак фармаваньня, кампэтэнцыя й графік працы ПС Супольнасьці былі вызначаны Пагадненьнем аб Парлямэнцкім сходзе Супольнасьці, укладзеным паміж Фэдэральным сходам РФ і Вярхоўным Саветам РБ 29 красавіка 1996 г. Паводле арт. 2 гэтага пагадненьня, дэпутацыі нацыянальных парлямэнтаў дзяржаваў-удзельніцаў складаліся з 25 парлямэнтароў ад кожнай краіны. Праз год, з прыняцьцем Статуту Саюзу, колькасьць прадстаўнікоў абодвух парлямэнтаў павялічылася і склала па 36 ад кожнай дзяржавы.

Галоўная праблема ПС дагэтуль палягае ў яго нелегітымнасьці. Ня будучы беспасярэдне абраным, гэты орган ня можа лічыцца прадстаўнічым. Таму прынятыя ім законы ёсьць мадэльнымі й, для таго каб уступіць у сілу, патрабуюць зацьверджаньня ў нацыянальных органах дзяржаўнай улады, якія маюць права заканадаўчай ініцыятывы. У

Камісіі Парлямэнцкага сходу Саюзнай дзяржавы (на стан 2001 г.)

| | Назоў камісіі | Кіраўніцтва | Колькасьць чальцоў |
|---|---|---|---|
| 1. | па заканадаўстве й рэгламэнце | Мізуліна Алена — старшыня, Андрэйчык Наталя — намесьнік старшыні | 7 |
| 2. | па эканамічнай палітыцы | Ціканаў Георгі — старшыня, Забалонец Сяргей — намесьнік старшыні | 13 |
| 3. | па бюджэце й фінансах | [illegible] Уладзімер — старшыня, [illegible] Аляксей — намесьнік старшыні | 10 |
| 4. | па сацыяльнай палітыцы, навукі, культуры й гуманітарных пытаньнях | [illegible] Сьцяпан — старшыня, [illegible] Анатоль — намесьнік старшыні | 7 |
| 5. | па пытаньнях вонкавай палітыкі | [illegible] Мікалай — старшыня | 7 |
| 6. | па бясьпецы, абароне й барацьбе са злачыннасьцю | Бікін Барыс — старшыня, [illegible] — намесьнік старшыні | 7 |
| 7. | па пытаньнях экалёгіі, прыродакарыстаньня й ліквідацыі наступстваў аварыяў | Худая Марыя — старшыня, [illegible] Паўла — намесьнік старшыні | 7 |
| 8. | па інфармацыйнай палітыцы і ўзаемасувязі з грамадзкімі арганізацыямі | [illegible] Наталя — старшыня, Біндзюкоў Мікалай — намесьнік старшыні | 8 |

якасьці асноўных прадметаў дзейнасьці ПС у яго Статуце ўказаныя пытаньні разьвіцьця нарматыўна-праўнай базы інтэграцыі й прыняцьцё нарматыўна-праўных актаў, якія маюць статус “заканадаўчай рэкамэндацыі, што патрабуе першачарговага разгляду й прыняцьця ўва ўстаноўленым парадку парлямэнтамі дзяржаваў–удзельніц Саюзу” (арт. 23 Статуту Саюзу). Прыняцьце законаў, абавязковых для выкананьня, не ўваходзіць у кампэтэнцыю ПС. Хаця арт. 26 Статуту і прадугледжвае далейшую трансфармацыю ПС у заканадаўчы орган, фактычна ПС выконвае ролю дарадчага органу. У той жа час у кампэтэнцыі ПС знаходзіцца разгляд праекту саюзнага бюджэту, што прыцягвае ўвагу да ПС з боку лабістаў.

Што да права заканадаўчай ініцыятывы, дык яго ў Саюзнай дзяржаве маюць кіраўнікі дзяржаваў, парлямэнты, урады, дэпутаты колькасьцю ня менш за адну пятую ад агульнай колькасьці дэпутатаў ПС ды дэпутацыі Беларусі й Расіі.

Пэрыядычнасьць чарговых паседжаньняў ПС такая ж, як і ў нацыянальных парлямэнтаў, — 2 разы на год (ст. 24 Статуту Саюзу Беларусі й Расіі). Старшыня ПС і яго першы намесьнік абіраюцца з складу ПС тэрмінам на адзін год на парытэтнай аснове (старшыня й яго намесьнік ня могуць быць грамадзянамі адной дзяржавы).

Дамова аб стварэньні Саюзнай дзяржавы зьмяніла структуру найвышэйшага прадстаўнічага органу беларуска-расійскага аб’яднаньня. Паводле арт. 39 Дамовы ад 8.12.99, Парлямэнт Саюзнай дзяржавы павінен складацца зь дзьвюх гасподаў: Гасподы Саюзу й Гасподы прадстаўнікоў. У Гасподу Саюзу маюць увайсьці па 36 дэпутатаў ад гасподаў Нацыянальнага сходу РБ і гасподаў Фэдэральнага Сходу РФ. У Гасподу прадстаўнікоў на аснове ўсеагульнага тайнага галасаваньня будуць абраныя 28 дэпутатаў ад Беларусі й 75 ад Расіі (арт. 39 Дамовы ад 8.12.99).

Сэсіі Парлямэнцкага Сходу Супольнасьці й Саюзу Беларусі й Расіі

| № | Дата | Месца | [illegible] |
|---|---|---|---|
| 1 | [illegible] 1996 г. | [illegible] | [illegible] |
| 2 | 21 кастрычніка 1996 г. | Мінск | [illegible] |
| 3 | 11—12 красавіка 1997 г. | Мінск | [illegible] |
| 4 | [illegible] 1997 г. | Масква | [illegible] |
| 5 | 12—13 ліпеня 1997 г. | [illegible] | (shared with row 4) |
| 6 | 3—4 лістапада 1997 г. | Калінінград | [illegible] |
| 7* | [illegible] 1997 г. | Масква | [illegible] |
| 8 | 3—5 траўня 1998 г. | Гомель | [illegible] |
| 9 | [illegible] 1998 г. | [illegible] | [illegible] |
| 10* | 21 студзеня 1999 г. | Мінск | [illegible] |
| 11* | 1 красавіка 1999 г. | Масква | [illegible] |
| 12* | [illegible] 1999 г. | Мінск | [illegible] |
| 13* | 4 лістапада 1999 г. | Масква | [illegible] |

* нечарговыя сэсіі.

Фармаваньне парлямэнту Саюзнай дзяржавы, у сваю чаргу, тармозіцца беларускімі ўладамі. Як прыклёп выкарыстоўваецца тая акалічнасьць, што для правядзеньня выбараў у Гасподу прадстаўнікоў Саюзнай дзяржавы неабходна прыняць адпаведныя законы. Увосень 2001 г. у Дзярждуме Расіі і ў Гасподзе Прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу РБ праекты адпаведных законаў прайшлі стадыю першага чытаньня. Ані ў Маскве, ані ў Менску тады не выключалі магчымасьці правядзеньня выбараў у саюзны парлямэнт ужо ў сакавіку 2002 г. Аднак гэта магло спраўдзіцца толькі ў тым выпадку, калі б абодва нацыянальныя парлямэнты пасьпелі разгледзець і ўхваліць праекты адпаведных законаў да лістапада 2001 г.[13]. Прыняць закон аб выбарах у Гасподу Прадстаўнікоў парлямэнту Саюзнай дзяржавы ў расійскіх і беларускіх дэпутатаў неяк ня выйшла.

Цяжка беларускаму і расійскаму кіраўніцтву даецца і ўдакладненьне парадку дзейнасьці парлямэнту Саюзнай дзяржавы. Найбольш спрэчнае пытаньне — якой павінна быць сыстэма ўзаемадзеяньня беларускіх і расійскіх дэпутатаў Парлямэнту Саюзнай дзяржавы й нацыянальных дзяржаў. У ч. 2 арт. 41 Дамовы ад 8.12.99 напісана: “Дэпутаты Гасподы прадстаўнікоў працуюць на ўставічнай прафэсійнай аснове й ня могуць знаходзіцца на дзяржаўнай службе, займацца іншай аплатнай дзейнасьцю, акрамя выкладніцкай”. Ці могуць дэпутаты нацыянальных парлямэнтаў быць адначасова дэпутатамі Гасподы Прадстаўнікоў Саюзнай дзяржавы, застаецца няясна. Складана ідзе ўзгадненьне квотаў прадстаўніцтва расійскага й беларускага бакоў у саюзных структурах. Пры норме прадстаўніцтва 75 чалавек ад РФ і 28 ад РБ для прыняцьця пастановы ў Гасподзе Прадстаўнікоў неабходная бальшыня галасоў ад агульнага колькаснага складу гасподы (ч. 5 арт. 43 Дамовы). Гэта грае на карысьць расійскаму боку. Некаторыя гарантыі абароны інтарэсаў беларускага боку закладзены ў ч. 5 арт. 43 Дамовы, дзе напісана: “Пастанова Гасподы прадстаўнікоў лічацца не прынятай, калі супраць яе прагаласавала больш за адну чвэрць ад агульнай колькасьці дэпутатаў”. Гэта значыць, што пастанова не прымаецца пры 26 галасох супраць. Некаторыя экспэрты лічаць такое рашэньне несправядлівым і прапануюць удасканаліць працэдуру галасаваньня ў Саюзным парлямэнце[14]. Апрача таго, расійскія дэпутаты хацелі б надаць права заканадаўчай ініцыятывы ў саюзным парлямэнце гасподам нацыянальных парлямэнтаў.

Пакуль парлямэнт Саюзнай дзяржавы ня створаны, яго функцыі ў межах сваіх паўнамоцтваў працягвае выконваць Парлямэнцкі сход. Важным кірункам дзейнасьці ПС ёсьць наладжваньне міжнародных сувязяў. ПС рэгулярна прымае звароты і ўдзельнічае ў паседжаньнях Міжпарлямэнцкай Асамблеі СНД. Пры ПС працуюць наглядальнікі. Такі статус можа быць нададзены органам дзяржаўнай улады дзяржаваў — удзельніцаў Саюзу ды іншых дзяржаваў, міждзяржаўным аб’яднаньням, міжнародным парлямэнцкім арганізацыям, нацыянальным і міжнародным грамадзкім аб’яднаньням. Наглядальнікамі пры ПС Саюзнай дзяржавы ў розны час былі міжфракцыйнае дэпутацкае аб’яднаньне “За садружнасьць сувэрэнных славянскіх дзяржаў” Вярхоўнай Рады Украіны, міжфракцыйнае дэпутацкае аб’яднаньне Вярхоўнай Рады Украіны “За саюз Украіны, Беларусі і Расіі” (ЗУБР), пазапартыйнае грамадзкае аб’яднаньне “Армянская народная ініцыятыва Расія—Беларусь—Арменія”, “дэпутацкая ініцыятыва Расія—Беларусь—Арменія” Нацыянальнага сходу Рэспублікі Арменія, Расійскі гра-

[13] Белорусская деловая газета. 26 сентября. 2001.

[14] Авакьян С.А. Договор между Республикой Беларусь и Российской Федерацией о создании союзного государства: конституционно-правовой анализ // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 11, Право. 2001. № 1. С. 3—15.

мадзкі камітэт судзеяньня Саюзу Беларусі й Расіі, беларуска-расійскі грамадзкі камітэт “Саюз”, Скупшчына Саюзнай Рэспублікі Югаславія.

Дзейнасьць Парлямэнцкага сходу асьвятляецца ў “Інфармацыйным бюлетэні Парлямэнцкага сходу Саюзу Беларусі й Расіі” і ўкладцы “Союзное вече”, а таксама ў расійскай “Парламентской газете” й беларускіх газэтах “Народная газета” і “Звязда”.

## Судовая ўлада

Суд і Падліковая гаспода Саюзнай дзяржавы ёсьць пэрспэктывай, яшчэ больш аддаленай за парлямэнт. Яны павінны быць створаны на квотнай аснове: у Судзе не павінна быць больш за 5 судзьдзяў — грамадзянаў адной дзяржавы, у Падліковую гасподу не павінна ўваходзіць больш за 7 грамадзянаў ад адной дзяржавы.

Роля **Суду** Саюзнай дзяржавы палягае ў забесьпячэньні аднастайнага тлумачэньня і ўжываньня нарматыўна-праўных актаў Саюзнай дзяржавы. Статут і Рэглямэнт Суду павінны зацьвярджацца Найвышэйшай дзяржаўнай радай.

Па Дамове 8.12.99 у склад Суду павінны ўвайсьці 9 судзьдзяў, якія будуць прызначацца парлямэнтам Саюзнай дзяржавы на прапанову НДР. Судзьдзі прызначаюцца з грамадзян Саюзнай дзяржавы. Кожныя два гады мяркуецца праводзіць абнаўленьне трацiны складу чальцоў Суду. Першапачаткова трацiна судзьдзяў мае прызначацца тэрмінам на 2 гады і трацiна — на 4 гады. Зь ліку судзьдзяў Суд абірае старшыню й яго намесьніка, якія ня могуць быць грамадзянамі адной дзяржавы.

Дзяржавы-ўдзельніцы й органы Саюзнай дзяржавы могуць перадаваць на разгляд Суду любыя пытаньні, зьвязаныя з тлумачэньнем і ўжываньнем нарматыўна-праўных актаў Саюзнай дзяржавы. Пастановы Суду прымаюцца бальшынёй у дзьве трацiны галасоў ад агульнай колькасьці судзьдзяў, маюць абавязковую юрыдычную сілу і павінны быць афіцыйна апублікаваныя.

Пакуль Суд Саюзнай дзяржавы ня створаны, да ўкладзеных у яе рамках дамоваў тарнуюцца нормы міжнароднага права.

**Падліковая гаспода** мае быць заснаваная ў адпаведнасьці з п. 1 арт. 55 Дамовы аб стварэньні Саюзнай дзяржавы. У яе кампэтэнцыі знаходзіцца кантроль за фінансамі Саюзнай дзяржавы. Падліковая гаспода павінна зьдзяйсьняць кантроль за выкананьнем бюджэту Саюзнай дзяржавы ў аб’ёме, структуры й мэтавым прызначэньні, праверку справаздачаў аб даходах і выдатках усіх органаў Саюзнай дзяржавы, вызначаць, ці ёсьць законнымі іх даходы й выдаткі, а таксама вызначаць, наколькі рацыянальным было кіраваньне фінансамі, кантраляваць эфэктыўнасьць выкарыстаньня маёмасьці Саюзнай дзяржавы. Сёньня такой структуры не існуе, а кантроль за фінансамі зьдзяйсьняе Рада Міністраў, Сталы камітэт, а таксама Міністэрства фінансаў РФ і Міністэрства фінансаў РБ.

У склад Падліковай гасподы маюць уваходзіць 11 чалавек, якія прызначаюцца на 6 год. Падліковая гаспода ўстанаўляе ўласны рэглямэнт, які зацьвярджаецца Радай Міністраў. Чальцамі Падліковай гасподы могуць быць грамадзяне дзяржаваў-удзельніцаў, якія маюць адпаведны досьвед і кваліфікацыю.

Мяркуецца, што дзейнасьць Падліковай гасподы будзе мець наступны характар. Чальцы Падліковай гасподы прызначаюцца парлямэнтам Саюзнай дзяржавы на прапанову Рады

Міністраў. Чальцы Падліковай гасподы абіраюць з свайго складу Старшыню й яго намесьніка, якія выконваюць свае абавязкі на працягу 2 гадоў і могуць быць пераабраны. Пры гэтым Старшыня Падліковай гасподы й яго намесьнік ня могуць быць грамадзянамі адной і той жа дзяржавы. Органы Саюзнай дзяржавы, нацыянальныя аўдытарскія арганізацыі альбо кампэтэнтныя органы дзяржаваў-удзельніцаў накіроўваюць у Падліковую гасподу на яе запыт любыя дакумэнты й інфармацыю, неабходныя для выкананьня яе функцыяў. Па выніках фінансавага году Падліковая гаспода прадстаўляе Радзе Міністраў і Парлямэнту штогадовую справаздачу, на падставе якой вышэйзгаданыя органы, дзеючы сумесна, могуць уносіць у НДР прапановы для аздараўленьня фінансавага становішча Саюзнай дзяржавы.

Цяпер праект нарматыўна-праўнага акту "Аб Падліковай гасподзе Саюзнай дзяржавы" накіраваны ў Раду Міністраў для выкарыстаньня пры падрыхтоўцы адпаведнага дакумэнту.

21 студзеня 2002 г. падпісана пагадненьне паміж Падліковай гасподай РФ і Камітэтам дзяржаўнага кантролю РБ, якое прадугледжвае абмен досьведам і інфармацыяй дзеля ўдасканаленьня кантрольнай дзейнасьці, а таксама ўзаемадзеяньня ў сфэры падрыхтоўкі кадраў. Апрача таго, плянуецца стварэньне адмысловых сумесных групаў спэцыялістаў для кантрольных праверак ў розных сфэрах узаемадзеяньня Беларусі й Расіі.

## Высновы

Агульная тэндэнцыя разьвіцьця беларуска-расійскага аб'яднаньня такая, што дамовы і пагадненьні ў яе рамках падпісваюцца лёгка, а выконваюцца зь вялікай напругай або зусім не выконваюцца. Гэта тлумачыцца палітычнымі прычынамі. Пасьпяховая інтэграцыя дзяржаваў зь недэмакратычнымі палітычнымі рэжымамі немагчымая таму, што ёй замінаюць амбіцыі ўласных жа кіраўнікоў.

Настойваючы на захаваньні дзяржаўнага сувэрэнітэту Беларусі й раўнапраўным аб'яднаньні, А. Лукашэнка не зьбіраецца мяняць сваё стаўленьне да эканамічнай палітыкі беларускай дзяржавы. Калі ўлічыць, што бакі яшчэ не падышлі да праграмы практычных дзеяньняў па стварэньні адзінай дзяржавы, то паважнасьць намераў кіраўніцтва Беларусі й Расіі будаваць адзіную дзяржаву выклікае сур'ёзныя сумневы. Пэрспэктывы яе пабудовы цьмяныя, воля ініцыятараў інтэграцыі да паскарэньня гэтага працэсу амаль высіленая, таму, магчыма, далейшай фазай разьвіцьця Саюзнай дзяржавы можа стаць разбурэньне яе ўжо функцыянуючых інстытутаў.

## СТРУКТУРА БЮДЖЭТУ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ І ЯГО ВЫКАНАНЬНЕ

Асноўныя прынцыпы фармаваньня бюджэту Супольнасьці Беларусі й Расіі былі ўхваленыя 17 кастрычніка 1996 г. і зацьверджаныя 2 сьнежня 1997 г. пастановай Выканкаму Супольнасьці. Згодна зь імі, бюджэт Саюзнай дзяржавы ствараецца за кошт штогадовых адлічэньняў дзяржаваў-удзельніцаў і паступленьняў ад выкарыстаньня маёмасьці Саюзнае дзяржавы. Магчымыя таксама іншыя крыніцы паступленьняў у бюджэт (арт. 30 Статуту Саюзу). Парадак напаўненьня бюджэту зь іншых крыніцаў устанаўляе Найвышэйшая дзяржаўная Рада (НДР) на прапанову Рады міністраў, ухваленую Парлямэнтам (ч. 3 арт. 32 Дамовы аб стварэньні Саюзнае дзяржавы).

Асноўная частка саюзнага бюджэту йдзе на фінансаваньне сумесных праграмаў расійскіх і беларускіх суб'ектаў гаспадараньня, такіх як праграма разьвіцьця дызэльнага аўтамабілебудаваньня "БелРасАўта", праграма разьвіцьця радыёэлектронікі "Саюзны тэлевізар", праграмы ў галіне хімічнай прамысловасьці, ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС, вайсковага супрацоўніцтва, разьвіцьця мытнай інфраструктуры і г.д. Характэрна, што з саюзнага бюджэту пераважна фінансуюцца тыя праграмы, якія бяз гэтага маюць фінансаваньне зь дзяржаўных бюджэтаў. У прыватнасьці, гэта тычыцца вытворчасьці вайсковай тэхнікі, што сьведчыць пра ўплывовасьць у "саюзных" структурах групаў інтарэсаў, якія "выбіваюць" грошы для вайсковых праграм.

На сродкі саюзнага бюджэту ўтрымліваюцца органы Саюзнай дзяржавы, хаця пры адпаведнай пастанове НДР магчымыя й іншыя сродкі іх фінансаваньня (арт. 30 Статуту Саюзу). Выдаткі на захады, не прадугледжаныя бюджэтам, нясуць дзяржавы-ўдзельніцы Саюзу.

### Прынцыпы і практыка бюджэтнага працэсу

Сьпярша ў Саюзе Беларусі й Расіі беспасярэднім атрымальнікам сродкаў бюджэту быў Выканаўчы камітэт. За выкананьнем бюджэту сачыў кіраўнік справамі Выканкаму (разьдзел 4 Асноўных прынцыпаў фармаваньня бюджэту Саюзу). У 1999 г. на падставе пастановы Найвышэйшай Рады "Аб парадку залічэньня даходаў у бюджэт Саюзу Беларусі й Расіі ў ходзе яго выкананьня ў 1999 г." ад 28 красавіка 1999 г. старшыня Выканкаму атрымаў магчымасьць ствараць з адлічэньняў дзяржаваў-удзельніцаў Саюзу ўласны рэзэрвовы фонд. Гэтае правіла было ўведзена, каб устанавіць парадак залічэньня даходаў, не прадугледжаных артыкуламі бюджэту на 1999 г. Сродкі з гэтага фонду выкарыстоўваліся Выканкамам пры ўзгадненьні з рабочай групай, што складалася з чальцоў Выканкаму й дэпутатаў Парлямэнцкага Сходу. Пры гэтым Выканкам меў права пераразьмяркоўваць сродкі бюджэту па артыкулах выдаткаў.

У меру рэарганізацыі структуры органаў выканаўчай улады паўнамоцтвы для выкананьня бюджэту перайшлі ад Выканкаму да Рады міністраў і Сталага камітэту. 11 кастрычніка 2000 г. была прынята пастанова Рады міністраў Саюзнай дзяржавы № 6 "Аб бюджэтнай палітыцы Саюзнае дзяржавы", якая замацавала функцыю выкананьня бюджэту Саюзнай дзяржавы за нацыянальнымі скарбамі Беларусі й Расіі. Адцяпер выкананьне бюджэту неабходна прад-

стаўляць на разгляд старшыні Рады міністраў Саюзнай дзяржавы. У пастанове Рады міністраў ад 17 лістапада 2000 г. № 20 у якасьці распарадчыка саюзнага бюджэту названы Сталы камітэт.

Доля Беларусі ў саюзным бюджэце складае 35%, Расіі — 65%. Вынятак — фінансаваньне Праграмы сумеснай дзейнасьці для пераадоленьня наступстваў чарнобыльскай катастрофы на 2002—2005 гг., якое прадугледжвалася ў роўных прапорцыях. Бюджэт фармуецца і разьлічваецца ў расійскіх рублях, але Беларусь мае права скіроўваць на рэалізацыю праграмаў і сродкі ўва ўласнай валюце, умоўна пералічваючы іх у расійскіх рублях. На сёньняшні дзень на бюджэтныя сродкі Саюзнай дзяржавы рэалізуецца каля 30 міждзяржаўных праграмаў і праектаў.

| Год | Памер, у млн рас. руб. |
|---|---|
| 1998 | 585 |
| 1999 | 800 |
| 2000 | 2230 |
| 2001 | 2360 |

### Агульны памер саюзнага бюджэту Беларусі й Расіі

Першым саюзным бюджэтам быў бюджэт на 1998 г., які склаў 585,3 млн. расійскіх рублёў. З гэтай сумы на рэалізацыю сумесных праграмаў было скіравана амаль 94%[1]. Галоўнай праблемай бюджэту 1998 г. стала яго напаўненьне. Выканкам Саюзу быў вымушаны прызнаць, што на 1 кастрычніка 1998 г. бюджэт быў выкананы ўсяго на 37,8%. Пры гэтым забавязаньні Беларусі былі выкананы на 71,7%, а Расіі — на 19,4%[2]. Напаўненьне бюджэту "інтэграсты" паспрабавалі скарэгаваць пры дапамозе пастановы Выканкаму № 19 "Аб парадку зьдзяйсьненьня ўнёскаў у бюджэт Саюзу Беларусі й Расіі", які ўстанаўляў штомесячнае ўнясеньне складак міністэрствамі фінансаў абедзьвюх краінаў у памеры адной дванаццатай ад гадавой квоты сваёй краіны.

20 сакавіка 1999 г. быў зацьверджаны бюджэт Саюзу на 1999 г. Яго даходная частка склала 800 млн. расійскіх рублёў (520 млн. — унёсак Расіі, 280 — Беларусі). Агульнай тэндэнцыяй пераразьмеркаваньня сродкаў стала скарачэньне фінансаваньня абаронных праграмаў і павелічэньне выдаткаў на патрэбы вытворчасьці ды сацыяльнай сфэры.

### Працэнтныя суадносіны заплянаваных выдаткаў бюджэтаў 1998 і 1999 гг.

Зьніжэньне заплянаваных у 1999 г. выдаткаў на бясьпеку было выклікана завяршэньнем будаўніцтва і ўводам у эксплюатацыю аб'ектаў сумеснага карыстаньня на заходняй мяжы Беларусі, улучна з аб'ектамі мытнай інфраструктуры.

[1] Беларусь и Россия: организационно-правовые основы интеграции (1996—2001) / Козик Л.П., Мясникович М.В., Абрамович А.М. и др. — Минск: Полымя, 2001. — 335 с. — С. 234.

[2] Тамсама. С. 231.

| Артыкул выдаткаў | 1998, % | 1999, % |
|---|---|---|
| Інвестыцыі | 51,3 | 28,8% |
| Ахова навакольнага асяроддзя (у тым ліку пераадоленьне наступстваў катастрофы на ЧАЭС) | 9,4 | 18,0 |
| Сельская гаспадарка | 9,2 | 6,6 |
| Вытворчасьць (у тым ліку транспарт) | 3,64 | 21,9 |
| Сацыяльнае забесьпячэньне | 4,3 | 12,4 |
| Фундаментальныя дасьледаваньні | 2,4 | 2,9 |
| Іншыя выдаткі | 19,7 | 9,5 |

У 1999 г. годзе бюджэтныя сродкі пачалі выдавацца на зваротнай аснове. Акурат на такіх умовах было выдаткавана 180 з 200 млн. руб. на праграму “Разьвіцьцё дызэльнага аўтамабілебудаваньня” і 45 з 70 млн. руб. на праграму “Саюзны тэлевізар”[3]. Пры выкананьні бюджэту сродкі паміж праграмамі былі ў значнай меры пераразьмеркаваныя: сродкі, прызначаныя паводле бюджэту на фінансаваньне адных праграмаў, былі накіраваны на дадатковае фінансаваньне іншых. Так, было скарочанае фінансаваньне праграмы стварэньня расійскіх сыстэмаў гуртовых харчовых рынкаў на 1998—2000 гг., праграмы падрыхтоўкі вайскоўцаў у навучальных установах Міністэрства абароны Расіі, фэстывалю “Славянскі базар”, а таксама пакрыцьцё выдаткаў удзельнікам міжнароднай канфэрэнцыі парлямэнтароў “Эўропа — наш супольны дом”. За кошт гэтых праграмаў болей сродкаў удалося выдаткаваць на распрацоўку оптыка-мэханічнага й кантрольнага абсталяваньня для вытворчасьці звышвялікіх інтэгральных схемаў, на разьвіцьцё тэхналёгій падвойнага, вайскова-цывільнага прытарнаваньня, на мытню і ўладкаваньне супольнай мяжы, на дзейнасьць філіі Маскоўскага дзяржаўнага сацыяльнага ўнівэрсытэту ў Менску й выданьне матэрыялаў канфэрэнцыі “Эўропа — наш супольны дом”. Пры гэтым 15 млн. расійскіх рублёў былі выдаткаваныя з рэзэрвовага фонду для фінансаваньня 7 праграмаў, сярод якіх былі выданьне нарматыўных актаў аб ахове навакольнага асяродзьдзя, разьвіцьцё шытнога машынабудаваньня, праграма сумеснай дзейнасьці ў разьвіцьці заканадаўства ў сацыяльна-працоўнай сфэры[4].

Частку даходаў трэцяга бюджэту склалі сродкі, ня выкарыстаныя ў 1999 г. Апрача гэтага, з 2000 г. у бюджэт пачалі паступаць сродкі ад вяртаньня бюджэтных пазыкаў і платы за іх. Таму доля ўнёскаў зь бюджэтаў краінаў зьнізілася. У бюджэце на 2000 г. было прадугледжана каля 40 праграмаў.

## Найзначнейшыя праграмы 2000 г.

У гэным годзе затрымка з напаўненьнем бюджэту была найвялікшай: бюджэт быў зацьверджаны толькі 27 чэрвеня. Праект бюджэту шматразова пераглядаўся Радай міністраў і Парлямэнцкім Сходам. Шмат у чым яго зацьвярджэньне затрымалася з-за расійскага Міністэр-

[3] Шурубович А. Как заставить работать союзный бюджет // Вестник Содружества. 2001. № 3 (31). С. 19.
[4] Белорусская газета. 2000. 22 мая.

| Назоў праграмы | Фінансаваньне (млн. RUR) |
|---|---|
| Прамысловасьць, энэргетыка, будаўніцтва | 924,6 |
| 1. Распрацоўка й стварэньне оптыка-мэханічнага й кантрольнага абсталяваньня для вытворчасьці звышвялікіх інтэгральных схемаў | 31 |
| 2. Арганізацыя сэрыйнага выпуску абсталяваньня для выпуску хімічных валокнаў | 23 |
| 3. Праграма разьвіцьця вытворчасьці тэлеапаратуры на прадпрыемствах РБ і РФ (1998—2001 гг.) | 215 |
| 4. Развіцьцё дызэльнага аўтамабілебудаваньня | 500 |
| Сельская гаспадарка | 50,7 |
| 1. Павышэньне рэнтабельнасьці вытворчасьці й перапрацоўкі лёну | 25,7 |
| 2. Павышэньне эфэктыўнасьці вытворчасьці бульбы (1998—2000 гг.) | 17 |
| 3. Развіцьцё вытворчасьці абсталяваньня для забесьпячэньня якаснай малочнай прадукцыі | 8 |
| Ахова навакольнага асяродзьдзя, гідралёгія, картаграфія й геадэзія | 9,1 |
| 1. Праграма ўдасканаленьня й разьвіцьця адзінай тэхналёгіі атрыманьня, збору, аналізу й прагнозу, захаваньня й распаўсюджваньня гідралягічнай інфармацыі й зьвестак аб забруджваньні прыроднага асяродзьдзя | 7,1 |
| Транспарт, дарожная гаспадарка, сувязь і інфарматыка | 43 |
| 1. Распрацоўка й выкарыстаньне касьмічных сродкаў і тэхналёгій назіраньня, апрацоўкі і адлюстраваньня касьмічнай інфармацыі (1999—2002 гг.) | 28 |
| 2. Абарона сумесных інфармацыйных рэсурсаў РБ і РФ | 15 |
| Прадухіленьне й ліквідацыя наступстваў вытворчых катастрофаў і стыхійных бедзтваў | 200 |
| Праграма сумеснай дзейнасьці для пераадоленьня наступстваў чарнобыльскай катастрофы ў рамках Саюзу | 200 |
| Культура, мастацтва, кінэматаграфія | 86,5 |
| 1. Правядзеньне міжнароднага фэстывалю “Славянскі базар” у Віцебску | 50 |
| 2. Кансэрвацыя, рамонт і рэстаўрацыя мэмарыяльнага комплексу “Берасьцейская цьвердзь — герой” | 20 |
| Адукацыя | 14,2 |
| 1. Фінансаваньне філіі Маскоўскага дзяржаўнага сацыяльнага ўнівэрсытэту Міністэрства працы і сацыяльнага разьвіцьця РФ у Менску | 14,2 |
| Праваахоўная дзейнасьць і забесьпячэньне бясьпекі | 400 |
| 1. Уладкаваньне межаў | 100 |
| 2. Праграма першачарговага разьвіцьця мытнай інфраструктуры памежных пераходаў мытнага афармленьня (пунктаў пропуску) на тэрыторыі РБ на пэрыяд 1997—2000 гг. | 200 |

ства фінансаў, якое не пагаджалася на фінансаваньне “Славянскага базару” і праекту рэканструкцыі Берасьцейскай цьвердзі.

За першыя 8 месяцаў 2000 г. саюзны бюджэт быў выкананы ўсяго на чвэрць, што паставіла пад пагрозу рэалізацыю буйных сумесных праектаў. У кастрычніку 2000 г. усяго на 2,8% ад заплянаванай сумы была прафінансаваная праграма дызэльнага аўтамабілебудаваньня “БелаРасАўта”, хаця беларускае кіраўніцтва надавала ёй вялікае значэньне. У рамках гэтай праграмы канструктарамі Менскага аўтамабільнага заводу ў супрацоўніцтве зь яраслаўскімі аўтамабілебудаўнікамі быў створаны вайсковы цяжарнік МАЗ-6317, прыняты на ўзбраеньне беларускім войскам. Дзеля нястачы фінансаваньня была прыпынена сумесная праграма ў

галіне электронных тэхналёгіяў, у рэалізацыі якой былі зацікаўлены вайсковыя ведамствы абедзьвюх краінаў. Зацягнулася таксама выкананьне праграмы “Саюзны тэлевізар”, у выніку чаго спынілася праца на беларускіх прадпрыемствах НВА “Інтэграл”, “Планар” і ВА “Гарызонт”. Не было разьвязанае пытаньне аб фармаваньні Сталага камітэту Саюзу і стварэньні сумесных сродкаў масавай інфармацыі.

У 2000 г. Расія выплаціла свой унёсак у бюджэт поўніцай, але толькі ў верасьні. Беларусь жа ўпершыню ня выканала сваіх забавязаньняў па саюзным бюджэце, унёсшы ўсяго 30,6% ад патрэбнай сумы. У выніку на 1 сьнежня бюджэт быў выкананы ўсяго на 55%.[5]

Бюджэт 2001 г. стаўся першым бюджэтам Саюзнай дзяржавы, які зьдзяйсьняўся праз органы фэдэральнага скарбу Міністэрства фінансаў РФ і Міністэрства фінансаў РБ. З прычыны нястачы сродкаў беларускі бок ізноў сарваў яго выкананьне. З гэтай нагоды Парлямэнцкі сход пастанавіў зьвярнуцца ў НДР з прапановай даручыць Радзе міністраў распрацаваць дзяйсьнейшы мэханізм забесьпячэньня своечасовых адлічэньняў дзяржавамі-ўдзельніцамі сродкаў у даходную частку бюджэту, у тым ліку разгледзець магчымасьць прытарнаваньня санкцыяў. У іх якасьці былі прапанаваныя кампэнсацыйныя выплаты.

З праблемамі выконваліся бюджэты і на пазьнейшыя гады.

## Кантроль за выкананьнем бюджэту. Праблемы бюджэтнага працэсу

На сёньняшні дзень у Саюзнай дзяржаве ня створаны ні суд, ні Падліковая гаспода, якія б маглі пракантраляваць бюджэтны працэс. Праўная рэглямэнтацыя пытаньняў саюзнай уласнасьці й выкананьня бюджэту застаецца неакрэсьленай, што пакідае глебу для злоўжываньняў. Толькі нядаўна, падчас ХХ сэсіі Парлямэнцкага сходу, адбытай 13-14 сакавіка 2002 г., удалося прыняць Парадак фармаваньня й выкананьня бюджэту Саюзнай дзяржавы, які ўпершыню дэталёва прапісвае бюджэтны працэс. Аднак для ўступленьня ў сілу ён павінен быць зацьверджаны адпаведным дэкрэтам НДР.

Першыя праверкі выкананьня бюджэту Саюзнай дзяржавы былі арганізаваныя пасьля падпісаньня Дамовы ад 08.12.99. З нагоды пераўтварэньня Выканкаму Саюзу ў Сталы камітэт Саюзнай дзяржавы рабочая група Сталага камітэту пачала праверку выкананьня саюзных праграмаў. У межах праверкі была заплянаваная рэвізія 15—20 найбуйнейшых саюзных праграмаў, у тым ліку “БелРасАўта” і “Саюзны тэлевізар”. Сумесная праверка Падліковай гаспады РФ і Камітэту дзяржаўнага кантролю РБ выкрыла факты нямэтавага выкарыстаньня бюджэтных сродкаў Саюзнай дзяржавы за 2000 г. і першае паўгодзьдзе 2001 г. у памеры 180 млн. расійскіх рублёў. Парушэньні ў выкарыстаньні бюджэтных сродкаў меліся як у

---

[5] Пастухов Б.Н. Актуальные проблемы становления Союзного государства // Выступление на международной научно-практической конференции “Актуальные проблемы строительства и развития Союзного государства” (7—8 декабря 2000 г., С.-Петербург).

цэнтральных, так і ў мясцовых органах Саюзнай дзяржавы. Так, з 130 млн. руб., выдаткаваных “БелРасАўта”, не па прызначэньні былі выкарыстаныя 71 млн. руб.[6].

## Асноўныя праблемы бюджэту

1. *Памер бюджэту.* Для Расіі памер саюзнага бюджэту складае прыкладна 0,1% сумы дзяржаўнага бюджэту, а для Беларусі — 1%. Дзеля большага памеру ўнёску Беларусі цяжэй яго заплаціць.

2. *Крыніцы напаўненьня бюджэту.* Роля крыніцаў даходаў, альтэрнатыўных бюджэтам абедзьвюх краінаў, застаецца мізэрнай. Такімі крыніцамі ёсьць пагашэньне раней выдадзеных крэдытаў і прыбытак ад арэнды й эксплюатацыі саюзнай уласнасьці. Доля фінансаваньня на зваротнай аснове з году ў год расьце, але яе вага невялікая: у 2000 г. з 2230 млн. руб. на зваротнай аснове меліся вытраціць 645 млн. руб., а ў 2001 г. доля паступленьняў ад вернутых крэдытаў была заплянаваная ў памеры 0,6%[7]. Дэпутаты Парлямэнцкага сходу прапануюць, каб у бюджэт Саюзнай дзяржавы паступалі падаткі ад прадпрыемстваў, што знаходзяцца ўва ўласнасьці Саюзнай дзяржавы, такіх як кампанія “Слаўнафта” пасьля адпаведнай рэарганізацыі. Але пакуль закон аб уласнасьці Саюзнай дзяржавы не прыняты, аб’екты саюзнай уласнасьці канчаткова ня вызначаныя.

3. *Разьмеркаваньне бюджэтных сродкаў.* Заўсёднай практыкай саюзнага бюджэту стала адвольнае перакідваньнне грошай з адных праграмаў на другія (недафінансоўваюцца праграмы, якія з гледзішча саюзных начальнікаў маюць другасную значнасьць: праграмы ў абсягу культуры і мастацтва, фізкультуры й спорту, гідрамэтэаралёгіі й аховы навакольнага асяродзьдзя) за кошт такіх праграмаў, як разрабленьне канцэпцыі вонкавагандлёвай палітыкі Саюзнай дзяржавы, разьвіцьцё аб’яднанай транспартнай сыстэмы, падрыхтоўка прагнозаў сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця.

4. *Спазьненьні з напаўненьнем і рэалізацыяй бюджэту.* Частыя затрымкі зь фінансаваньнем, а часам і зрыў сумесных праграмаў выкліканыя тым, што звычайна да жніўня-кастрычніка ад абодвух бакоў у саюзны бюджэт надыходзіць усяго 20—25% бюджэтных сродкаў. Мэханізм своечасовага напаўненьня бюджэту дагэтуль не адладжаны.

5. *Нізкі ўзровень адказнасьці за выкананьне бюджэту.* Сродкі, выдзеленыя Масквой на праграму “Саюзны тэлевізар”, былі “пракручаны” ў Расіі праз 14 фірмаў[8]. Але расійскі бок не панёс кары за гэткія дзеяньні.

## Высновы

За гады існаваньня Саюзнай дзяржавы ейны бюджэтны працэс не наладзіўся. Рэгулярныя затрымкі з прыняцьцём бюджэту Парлямэнцкім сходам, складаная працэдура яго праходжаньня ў структурах выканаўчай улады і, нарэшце, нясвоечасовае выкананьне пастановаў аб бюджэце не дазваляюць забясьпечыць сталае бесьперабойнае фінансаваньне саюзных

[6] Известия. 2001. 21 декабря.

[7] Шурубович А. Как заставить работать союзный бюджет // Вестник Содружества. 2001. № 3 (31). С. 22.

[8] Советская Белоруссия. 2001. 23 января.

праграмаў. Бюджэт Саюзнай дзяржавы мае мала супольнага зь бюджэтам дзяржавы. Ён не папаўняецца з простых падаткаў, а яго сума несупастаўная з памерамі бюджэтаў дзяржаваў — удзельніцаў Саюзнай дзяржавы. Структуры, адказныя за кантроль выкананьня саюзнага бюджэту, яшчэ ня створаныя. Таму саюзны бюджэт усё болей нагадвае фонд падтрымкі буйных вытворцаў. Ён стварае бачнасьць эканамічнай інтэграцыі, дарма што ня створана адзіная эканамічная прастора, няма адзінага цэнтру валютнага рэгуляваньня, ня ўзгоднены працэс рэфармаваньня крэдытна-грашовай сыстэмы, не адрэгуляваныя пытаньні адзінай мытнай палітыкі.

KAMUNIKAT.org

## Разьдзел 7

# ПАРТЫЙНАЯ СЫСТЭМА БЕЛАРУСІ. БЕЛАРУСКІЯ ПАЛІТЫКІ

## РАЗБУРЭНЬНЕ МАНАПОЛІІ КПСС І ПАЧАТАК ФАРМАВАНЬНЯ ШМАТПАРТЫЙНАЙ СЫСТЭМЫ

Разьвіцьцё партыйнай сыстэмы ў Беларусі пасьля распаду СССР не было абапертым на старыя традыцыі. Самае позьняе ад 1939 году, калі ўся тэрыторыя сёньняшняй Беларусі апынулася ў СССР, пра партыйную сыстэму ў Беларусі гаварыць не выпадае. Пасьля гэтага мінуў задоўгі час, апроч таго, нацыянальная эліта, якая магла б хоць часткова перахаваць старыя традыцыі, была амаль цалкам зьнішчаная падчас сталінскіх рэпрэсій.

Новая партыйная сыстэма Беларусі напачатку разьвівалася пад уплывам вонкавых фактараў, наймя, пад уплывам уздыму шырокіх нацыянальна-дэмакратычных рухаў у іншых краінах былога СССР, найперш у суседніх балтыйскіх дзяржавах і Ўкраіне, а таксама пад уплывам актывізацыі дэмакратычна настроенай расійскай інтэлігенцыі, найперш маскоўскай ды ленінградзкай (санкт-пецярбурскай).

Дэмакратычныя настроі ахоплівалі ўсё шырэйшыя слаі: шырыліся сярод элітаў і сярод насельніцтва ўвогуле. У першыя гады пасьля пачатку «перабудовы» камуністычная партыя надалей захоўвала поўную ўладу ў СССР. На змаганьні з гэтым галоўным праціўнікам засяроджваліся высілкі ўсіх дэмакратычна настроеных групаў; палітычны працэс вызначала супрацьстаяньне камуністычнай партыі і праціўнікаў ейнай аўтарытарнай улады.

Вялікая частка сёньняшніх дэмакратычных партыйных элітаў пачынала свой палітычны шлях у разнастайных нефармальных суполках. У другой палове 1980-х гадоў у Беларусі паўстае шэраг нефармальных моладзевых суполак («Талака», «Тутэйшыя», «Паходня», «Узгор'е» ды шмат інш.), якія займаліся асьветнай, гістарычна-рэстаўрацыйнай дзейнасьцю, адраджалі нацыянальныя сьвяты, ладзілі краязнаўчыя экспэдыцыі, літаратурныя вечарыны, зьбіралі подпісы за школьную адукацыю на беларускай мове і г.д. Палітызаванасьць гэтых суполак, якая была непазьбежнаю ўва ўмовах дзяржаўнага ўціску нацыянальнай мовы

і культуры, урэшце прывяла да ўзьнікненьня грамадзка-палітычнага руху Беларускі народны фронт «Адраджэньне», устаноўчы зьезд якога адбыўся ў 1989 годзе. Узорам для стварэньня БНФ «Адраджэньне» былі падобныя рухі ў суседніх рэспубліках СССР. Як і ў летувіскім «Саюдысе» ці ўкраінскім «Руху», у ідэалёгіі БНФ поруч стаялі нацыянальнае адраджэньне і дэмакратычныя рэформы, прычым галоўны акцэнт рабіўся менавіта на адраджэньні нацыянальнай мовы і культуры. БНФ неўзабаве стаў магутнай грамадзкай сілай, флягманам руху за дэмакратызацыю грамадзтва ў Беларусі. Сябры тагачаснага БНФ сёньня складаюць аснову трох палітычных партый: уласна БНФ «Адраджэньне», КХП БНФ і БСДГ.

Калі для ўдзельнікаў БНФ нацыянальнае адраджэньне і дзяржаўны суверэнітэт Беларусі ад самага пачатку станавілі найвышэйшыя вартасьці, дык іншая частка беларускага дэмакратычнага руху, якую вельмі ўмоўна можна пазначыць як расійскамоўную альбо расійскакультурную (апошняе, бадай, больш слушнае), сьпярша разьвівалася ў рамках агульнасавецкай пратэстнай плыні. Вытокі беларускай расійскамоўнай дэмакратыі сягаюць 1987 году, калі ў Менску быў заснаваны дыскусійны клюб «Сучасьнік» («Современник»). У гэты клюб уваходзілі эканамісты, журналісты, філёзафы, якія прапагандавалі дэмакратычныя ідэі і крытыкавалі палітычны лад Савецкага Саюзу. Ядро сяброў клюбу, а таксама беларусы-сябры «Дэмакратычнай плятформы ў КПСС» (рэфармісцкага крыла КПСС) у 1990 годзе ўвайшлі ў склад Аб’яднанай дэмакратычнай партыі Беларусі (АДПБ) — першай афіцыйна зарэгістраванай палітычнай партыі ў Беларусі. Іншыя спробы арганізацыі расійскамоўнай дэмакратычнай эліты рабіліся ў 1991 годзе — стварэньне Руху за дэмакратычныя рэформы (зарэгістраваны ў лютым 1992) на ўзор аднайменнага расійскага руху, у 1994 годзе — заснаваньне Грамадзянскай партыі. Пазьней гэтая частка беларускай эліты збольшага кансалідавалася ў Аб’яднанай грамадзянскай партыі, якая ўтварылася ў 1995 годзе ў выніку зьліцьця АДПБ і Грамадзянскай партыі. На пачатку расійскамоўныя дэмакраты не надавалі выключнага значэньня беларускай нацыянальнай дзяржаўнасьці, а канцэнтраваліся на пытаньнях эканамічных рэформаў і агульнай дэмакратызацыі грамадзтва. Пасьля няўдалай спробы путчу ў Маскве, калі СССР ужо стаў на мяжы развалу, яны выказаліся супраць выхаду Беларусі з СССР, тлумачачы гэта эканамічнымі меркаваньнямі. Адылі зь цягам часу іхныя пагляды ў стасунку да беларускай дзяржаўнасьці зьмяніліся.

У апошні год існаваньня СССР да КПБ, БНФ і АДПБ дадаецца шэраг новых палітычных партыяў. У лютым 1991 году аграрнікі, якія выступалі за радыкальныя рэформы сельскай гаспадаркі, скасаваньне калгасаў, ствараюць Беларускую сялянскую партыю. У сакавіку частка сяброў БНФ, якой праграма эканамічных рэформаў БНФ падавалася занадта радыкальнаю, на чале зь Міхасём Ткачовым засноўвае Беларускую Сацыял-Дэмакратычную Граmaду. У чэрвені ўтвараецца Беларуская Хрысьціянска-дэмакратычная злучнасьць, у ліпені — Нацыянальна-дэмакратычная партыя. Апошнія дзьве партыі ня здолелі стаць рэальнымі грамадзкімі сіламі, бо і з гледзішча ідэалёгіі былі фактычна дублёрамі БНФ.

## Разьвіцьцё партыйнай сыстэмы: 1991–1996

Новы этап у разьвіцьці беларускай партыйнай сыстэмы пачынаецца ў 1991 годзе ў зьвязку з паразаю жнівеньскага путчу артадаксальнай савецкай намэнклятуры і распадам СССР. Фракцыі БНФ у Вярхоўным Савеце ўдалося дамагчыся прыпыненьня дзейнасьці Камуні-

стычнай партыі Беларусі. Вярхоўны Савет абвяшчае незалежнасьць Беларусі. Такім чынам, супрацьстаяньне нацыянал-дэмакратаў і камуністаў скончылася сымбалічнай перамогай першых. Пачынаецца перараразьмеркаваньне палітычнага поля, узьнікаюць новыя палітычныя партыі. Да першых у незалежнай Беларусі парлямэнцкіх выбараў (1995 год) колькасьць партыяў дасягае 34, прычым амаль палова зь іх была створаная ў год перад выбарамі.

Посткамуністычнае грамадзтва ў выніку сацыялістычнай «ураўнілаўкі», адсутнасьці інстытуту прыватнай уласнасьці, закрытасьці грамадзтва за часам СССР было слаба структураванае, таму працэс утварэньня партыяў пасьля распаду СССР быў у пэўным сэнсе хаатычным. Часта палітычныя партыі ствараліся без рэальнага падмурку, без сацыяльнай базы, без акрэсьленай ідэалёгіі і служылі адно для палітычнай прамоцыі пэўнай асобы або невялікай групы асобаў. Традыцыйная клясыфікацыя беларускіх палітычных партыяў паводле шкалы «левыя — правыя» хоць і магчымая, але яна не адлюстроўвае найбольш істотных грамадзкіх супярэчнасьцяў і тэндэнцый.

Усё ж і ў грамадзтве і, адпаведна, у партыйным будаўніцтве можна вызначыць пэўныя лініі падзелу: 1) стаўленьне да «беларусізацыі», да адраджэньня нацыянальнай мовы, культуры, адукацыі і г.д.; 2) стаўленьне да дэмакратызацыі і рынкавых рэформаў; 3) стаўленьне да дзяржаўнага сувэрэнітэту і да Савецкага Саюзу (зь цягам часу пытаньне аднаўленьня СССР трансфармуецца ў пытаньне інтэграцыі з Расіяй).

Калі ў першыя гады фармаваньня партыйнай сыстэмы вызначальнымі былі першыя два крытэры, на якіх і грунтавалася супрацьстаяньне нацыянал-дэмакратаў (БНФ, БСДГ) і былой камуністычнай намэнклятуры, дык у 1992–1994 гг., калі беларусізацыя праводзіцца на дзяржаўным узроўні, а неабходнасьць рэформаў так ці йнакш прызнаюць практычна ўсе, узрастае роля трэцяга. Пагаршэньне эканамічнага становішча, якое храналягічна супадае з будоваю незалежнай дзяржавы, дае спрыяльную глебу ідэям рэстаўрацыі супольнай дзяржавы зь іншымі былымі рэспублікамі СССР. Інтэграцыя з Расіяй і іншымі былымі рэспублікамі СССР становіць галоўную тэму падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году, гэтае пытаньне мае вялікае значэньне таксама і падчас выбараў у Вярхоўны Савет 13 скліканьня ў 1995 годзе. Няяўна ўтвараюцца два супрацьлеглыя лягеры. Трэба адзначыць, што як сярод прыхільнікаў інтэграцыі, так і сярод яе праціўнікаў збольшага пануе падабенства пагляд аў што да беларусізацыі, эканамічных і сацыяльных рэформаў грамадзтва (адмоўнае ці індыфэрэнтнае стаўленьне ў першым выпадку, дадатнае ці індыфэрэнтнае ў другім), адылі ёсьць і пэўныя адрозьненьні.

Першаю ў лягеры інтэгратараў была Партыя камуністаў беларуская, заснаваная ў 1992 годзе пераемніца КПБ. Камуністы выказвалі рэстаўрацыйныя ідэі пасьлядоўна і проста — у форме закліку да аднаўленьня СССР. Таксама ў 1992 годзе была заснаваная радыкальная панславісцкая партыя Славянскі Сабор «Белая Русь», якая абвясьціла сваёй галоўнай мэтай «узьядналньне братніх славянскіх народаў». За СССР у абноўленым выглядзе выступалі таксама Лібэральна-дэмакратычная партыя, Аграрная партыя, лёзунгі больш ці менш шчыльнай інтэграцыі з Расіяй і іншымі былымі рэспублікамі СССР эксплюатавалі і «карлікавыя» партыі, якія ствараліся малавядомымі палітыкамі ў якасьці інструмэнтаў для асабістай палітычнай кар'еры.

У 1993 годзе адбываецца спроба кансалідацыі інтэгратараў — ствараецца Народны рух Беларусі (НРБ), які абвяшчае сваёй галоўнай мэтай аднаўленьне СССР. У яго ўвайшлі Славянскі Сабор «Белая Русь», ПКБ і шэраг драбнейшых партыяў і арганізацыяў. НРБ быў ство-

раны пры інтэнсіўнай падтрымцы ўраду Кебіча, які меркаваў выкарыстаць гэты рух у барацьбе за пасаду прэзыдэнта. Але перад прэзыдэнцкімі выбарамі 1994 году НРБ разваліўся. ССБР і шэраг іншых арганізацыяў падтрымалі (з засьцярогамі) кандыдатуру Аляксандра Лукашэнкі, камуністы вылучылі свайго кандыдата Васіля Новікава, тады як рэшта руху і ягоны лідэр Сяргей Гайдукевіч (старшыня заснаванай у лютым 1994 году Лібэральна-дэмакратычнай партыі) працягвалі падтрымліваць Вячаслава Кебіча.

Ядро супрацьлеглага, незалежніцкага лягеру, натуральна, утварылі нацыянал-дэмакратычныя БНФ і БСДГ. Згаданыя вышэй партыі расійскамоўных інтэлектуалаў — АДПБ і Грамадзянская партыя — таксама паступова схіляліся да абароны незалежнасьці Беларусі. Верагодна, тут сваю ролю адыгрывала пагаршэньне іміджу Расіі ў іх вачах з прычыны небясьпечнага ўзмацненьня пракамуністычных настрояў у тамтэйшым насельніцтве, а таксама простае «прызвычаеньне» да сувэрэнітэту і разуменьне таго, што пэрспэктывы асабістага кар'ернага росту лепшыя ў незалежнай беларускай дзяржаве. Да незалежніцкага лягеру належалі таксама Беларуская сялянская партыя, Беларуская Хрысьціянска-дэмакратычная злучнасьць, Беларуская партыя жанчын «Надзея», Беларуская партыя зялёных, Беларуская партыя «Зялёны сьвет», шэраг іншых дробных «перадвыбарных» партый.

Прэзыдэнцкія выбары 1994 году найвыразьней прадэманстравалі слабасьць партыяў — абодва кандыдаты, якія выйшлі ў другі тур выбараў, былі беспартыйнымі.

## 1996–2001

Абраньне Аляксандра Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта і ўсталяваньне ягонага аўтарытарнага кіраваньня, якое канчаткова аформілася праз канстытуцыйны пераварот 1996 году, прывяло да новай расстаноўкі сілаў у сыстэме партыяў. Лукашэнка выйграў выбары пад лёзунгамі барацьбы з карупцыяй і інтэграцыі з Расіяй, таму камуністы і іншыя прыхільнікі рэстаўрацыі СССР напачатку віталі ягонае абраньне і прапаноўвалі яму сваю падтрымку. Але вельмі хутка Лукашэнка даў зразумець, што яму ня трэба падтрымка ніякіх партый. Роспуск Вярхоўнага Савету 13 скліканьня і ўтварэньне марыянэткавай Палаты прадстаўнікоў у 1996 годзе ўвогуле зрабілі бессэнсоўнай дзейнасьць палітычных партыяў, накіраваную на атрыманьне месцаў у парлямэнце, бо, згодна з новай Канстытуцыяй, орган заканадаўчай улады ніякай рэальнай улады ня меў. Ідэалягічныя супярэчнасьці паміж палітычнымі партыямі адышлі на задні плян, а вызначальным стала стаўленьне да прэзыдэнта Лукашэнкі і зьдзейсьненага ім канстытуцыйнага перавароту. Перад партыямі стаіў выбар: выступіць супраць дыктатуры (і трапіць у «чорны сьпіс» арганізацыяў і асобаў, якім закрыты доступ да дзяржаўных СМІ) альбо ператварыцца ў «псэўдапартыі», адмовіцца ад барацьбы за палітычную ўладу наагул.

Ядро апазыцыі рэжыму Лукашэнкі фармуюць БНФ і Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП, прадукт зьліцьця АДПБ і Грамадзянскай партыі). Супраць Лукашэнкі выступаюць таксама ПКБ і Аграрная партыя. Адміністрацыя прэзыдэнта ініцыюе раскол у ПКБ — частка камуністаў выходзіць з ПКБ, аднаўляе Камуністычную партыю Беларусі і абвяшчае аб сваёй ляяльнасьці рэжыму. Аграрная партыя таксама падзяляецца на прыхільнікаў і праціўнікаў прэзыдэнта і фактычна развальваецца. Раскол адбываецца таксама ў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» (БСДП (НГ)), якая ўзьнікла ў 1996 годзе ў вын-

іку аб’яднаньня БСДГ і Партыі народнай згоды (ПНЗ): ПНЗ выходзіць са складу БСДП (НГ), якая становіцца ў апазыцыю прэзыдэнту. Да апазыцыі далучаюцца створаныя на базе прафсаюзаў Беларуская партыя жанчын «Надзея» і Беларуская партыя працы (БПП).

Партыі, якія засталіся ляяльнымі рэжыму, улучна з ЛДП і КПБ, ня маюць аніякага ўплыву на сытуацыю ў краіне і на дзяржаўную палітыку. Іхнае існаваньне і ўдзел у прадстаўнічых органах улады служаць толькі для надта неэфэктыўнага маскаваньня дыктатуры.

Як камуністычная партыя да 1991 году, так цяпер Лукашэнка падштурхоўвае да кансалідацыі ўсе дэмакратычна настроеныя грамадзкія групы. Сем найбольш уплывовых апазыцыйных партыяў яшчэ да другога рэфэрэндуму, улетку 1996 году, ствараюць «круглы стол» для каардынацыі дзеяньняў па барацьбе з дыктатурай; у кастрычніку 1996 году праводзіцца Нацыянальны кангрэс «У абарону дэмакратыі, супраць дыктатуры». У 1999 годзе, пасьля ініцыяваных АБСЭ перамоваў паміж уладамі і палітычнай апазыцыяй, утвараецца Кансультацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў, у якую ўвайшлі БНФ, АГП, ПКБ, БСДП (НГ) і БСДГ (правае крыло сацыял-дэмакратаў, якое аддзялілася ад БСДП (НГ) у 1998 годзе), Беларуская партыя працы, Беларуская партыя жанчын «Надзея» . З ініцыятывы кіраўніка КНГ АБСЭ ў Беларусі Г.-Г. Віка ў Кансультацыйную раду былі ўлучаныя ЛДП і грамадзка-палітычнае аб’яднаньне «Яблык», якія пазьней выйшлі са складу рады. Пасьля Кангрэсу дэмакратычных сілаў у студзені 1999 году, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх уплывовых апазыцыйных партыяў, была створаная Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў (КРДС), у якую ўвайшлі БНФ, АГП, ПКБ, БСДП (НГ), БСДГ, БПП, жаночая партыя «Надзея», экалягічная партыя «БЭЗ», а таксама Асамблея няўрадавых арганізацыяў, аб’яднаньне «Хартыя’97» і Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў. Меркавалася, што КРДС забясьпечыць выступленьне апазыцыі адзіным фронтам падчас парлямэнцкай і прэзыдэнцкай выбарчых кампаніяў.

Адылі КРДС ня здолела здабыць дастатковы для гэтага аўтарытэт. Часткова гэта тлумачыцца ўціскам з боку ўладаў, інфармацыйнай несвабодай і мэтадычнай дыскрэдытацыяй апазыцыйных палітыкаў праз дзяржаўныя СМІ, часткова — недастатковай прафэсійнасьцю саміх апазыцыйных палітыкаў. Магчымасьці дэмакратычных партыяў данесьці сваю думку да шырокіх слаёў насельніцтва былі моцна абмежаваныя. Брутальныя разгоны дэманстрацыяў і пікетаў, арышты бізнэсоўцаў, якія падтрымлівалі апазыцыйныя партыі, пагроза звальненьня палітычных актывістаў з працы ці адлічэньня з ВНУ стваралі атмасфэру страху, у якой было немагчымым павелічэньне колькаснага складу партыяў. Інфармацыйная ізаляцыя спрыяла падазронасьці, мала ня модным стала абвінавачваць палітычных апанэнтаў у сувязях зь беларускімі ці расійскімі спэцслужбамі (якія, зрэшты, наўрад ці заставаліся ў баку ад жыцьця апазыцыйных партыяў). Хоць зь неабходнасьцю ўтварэньня моцнай аб’яднанай апазыцыі рэжыму быццам бы згаджаліся ўсе апазыцыйныя партыі, на справе ў гісторыі беларускіх палітычных партыяў пасьля 1996 году больш было расколаў, чым аб’яднаньняў. На стадыі станаўленьня партыйнай сыстэмы быў заканамерным пошук палітыкамі свайго месца на правым ці левым флянгу, падзелы партыяў, у якіх пры заснаваньні аб’ядноўваліся людзі з досыць рознымі паглядамі, як выяўлялася пазьней. Гэтак, у 1998 годзе адбываецца раскол у БСДП (НГ), а пасьля спробы арганізацыі прэзыдэнцкіх выбараў у 1999 годзе расколваецца БНФ, і ягоная больш радыкальная частка — КХП БНФ — аддаляецца ад іншых апазыцыйных сілаў. Супрацоўніцтва паміж апазыцыйнымі партыямі ўскладнялася праз напружаныя

ўзаеміны былых аднапартыйцаў.

У 2001 годзе вынікі сацыялягічных апытаньняў паказваюць настолькі слабыя шанцы патэнцыйнага кандыдата ад аб'яднанай апазыцыі, што КРДС сама не вылучае адзінага кандыдата, а саступае ініцыятыву ўтворанаму ў траўні 2001 г. аб'яднаньню пяцёх апазыцыйных беспартыйных (за выняткам камуніста Калякіна) кандыдатаў. Пазыцыі КРДС дадаткова аслабляюцца пасьля заявы БСДГ аб магчымым выхадзе з гэтага органу ў зьвязку з тым, што падтрыманая КРДС пяцёрка дэмакратычных кандыдатаў публічна выказалася за інтэграцыю з Расіяй. Затым пра канчатковы разрыў з КРДС абвяшчаюць БСДП (НГ) і БПП. У ліпені 2001 году лідэры гэтых партыяў абвяшчаюць аб стварэньні левацэнтрысцкай канфэдэрацыі «За сацыяльныя перамены». Гэты новы суб'ект палітычнага працэсу, паводле словаў арганізатараў, ствараецца як процівага КРДС, якая прадстаўляе правацэнтрысцкую апазыцыю.

Такім чынам, у партыйнай сыстэме Беларусі ў 2001 годзе прысутнічалі левы і правы край: ПКБ і КХП БНФ адпаведна, і аб'яднаныя левы і правы цэнтры: канфэдэрацыя «За сацыяльныя перамены» і КРДС (асобны статус мае БСДГ, якая не выключала магчымасьці падтрымкі на выбарах лідэра КХП БНФ З. Пазьняка). Пры гэтым ані КРДС, ані левацэнтрысты не наважваюцца назваць свайго кандыдата, а падтрымліваюць «пяцёрку» і чакаюць яе пастановы аб адзіным дэмакратычным кандыдату.

## 2001-2005

Пэрыяд узмацненьня аўтарытарнага рэжыму і атамізацыі грамадзтва стаў часам далейшага заняпаду беларускіх партый. На пачатак 2002 г., паводле зьвестак Міністэрства юстыцыі, у 18 партый агулам уваходзіла каля 62000 чалавек. У наступныя гады колькасьць актывістаў у большасьці партыяў (напрыклад, БНФ) зьніжалася, асобныя партыі зазнавалі расколы (ЛДП, БСДП (НГ)), а рэгістрацыя новых (Аб'яднаная сацыял-дэмакратычная партыя, Партыя свабоды і прагрэсу) блякавалася ўладамі. З 1999 году ў Беларусі не зарэгістравана ніводнай новай партыі. Тым ня менш, у 2005 годзе было абвешчана пра заснаваньне прынамсі двух рухаў, якія будуць імкнуцца да афіцыйнай рэгістрацыі ў якасьці партый (Беларуская хрысьціянская дэмакратыя П. Севярынца; рух У. Мацкевіча). Увесну 2005 г. высоўвалася ідэя стварэньня партыі прадпрымальнікаў на базе грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва».

Захаваная мажарытарная сыстэма выбараў мінімізуе шанцы апазыцыйных партый на атрыманьне дэпутацкіх мандатаў у парлямэнце. Як і ў 2000 г., у 2004 г. актывісты партый на час выбарчай кампаніі нярэдка прыпынялі ў іх сваё сяброўства. Выйсьцем магло б стаць узбуйненьне палітычных груповак з блізкай ідэалёгіяй, што дазволіла б падвысіць аўтарытэт партыйных вылучэнцаў у выбарцаў, аднак у пазначаны пэрыяд такога не адбылося. Сваю нэгатыўную ролю, апрача пазыцыі ўладаў, адыгралі амбіцыі асобных партыйных лідэраў. У выніку, рэйтынг даверу партыям як палітычнаму інстытуту застаецца фатальна нізкім у параўнаньні з рэйтынгамі прэзідэнта, войска або царквы. Як паказваюць апытаньні грамадзкай думкі, значная частка грамадзянаў па-ранейшаму мала знаёмая зь дзейнасьцю беларускіх палітычных партыяў і не цікавіцца ёю.

Адным з істотных чыньнікаў далейшага зьніжэньня ролі партый у палітычнай сыстэме стала насаджэньне ў Беларусі «дзяржаўнай ідэалёгіі» (з 2003 г.). Сэнсам існаваньня гэтай эклектычнай «ідэалёгіі», што скарыстоўвае зь бюджэтнай падтрымкі, зьяўляецца канфармізм,

які ўваходзіць у сутыкненьне з прынцыпам партыйнасьці. Канкурэнцыя партыйных праграмаў *ipso facto* супярэчыць лёгіцы аўтарытарнага рэжыму, які шукае апірышча ня ў партыях, а ў падкантрольных прафсаюзах, моладзевых і вэтэранскіх арганізацыях. Выяўляецца, што нават «прыдворныя» партыі накшталт КПБ ня здольныя стварыць дзейную фракцыю ў палаце прадстаўнікоў.

Сьведчаньнем малой уплывовасьці апазыцыйных партыяў было вылучэньне беспартыйнага А. Мілінкевіча ў якасьці «адзінага прэтэндэнта ад дэмакратычных сілаў» у 2005 г. Зрэшты, наяўнасьць сытуацыйных кааліцый паміж прадстаўнікамі розных партый («Пяцёрка-плюс» і «Свабодная Беларусь» у 2003-2004 гг.; штаб А. Мілінкевіча, у які ўвайшлі кіраўнікі АГП, БНФ, ПКБ і ліквідаванай БПП, у 2005 г.) сьведчыць аб патэнцыйнай моцы партыйнага актыву. Няма сумневу, досьвед удзелу ў агульнанацыянальных кампаніях (выбары ў мясцовыя саветы ў 2003 г.; выбары ў палату прадстаўнікоў у 2004-2005 гг.) прыдасца сябрам партый у будучыні, падчас адбудовы ў краіне канкурэнтнай палітычнай сыстэмы.

## Рэглямэнтацыя ўтварэньня і дзейнасьці партыяў

Як ужо адзначалася, станаўленьне шматпартыйнай сыстэмы ў Беларусі, як і ў СССР у цэлым, не было абапертым на традыцыю. Да 1990 году ў СССР не было ніякіх заканадаўчых актаў, якія б рэгулявалі дзейнасьць партыяў, вызначалі б іхнае месца ў грамадзтве. З кастрычніка 1990 году Савет міністраў БССР прыняў «Часовае палажэньне аб парадку ўтварэньня і дзейнасьці грамадзкіх аб’яднаньняў грамадзянаў у Беларускай ССР», у якім упершыню зьявіўся тэрмін «палітычныя партыі». Гэтае часовае Палажэньне служыла юрыдычнай асновай утварэньня і дзейнасьці партыяў на працягу чатырох гадоў, пакуль 5 кастрычніка 1994 году ня быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусі «Аб палітычных партыях». Новы Закон утрымліваў вызначэньне паняцьця палітычнай партыі, вызначаў правы палітычных партыяў, крыніцы фінансаваньня (забаранялася фінансаваньне з-за мяжы), парадак рэгістрацыі і кантролю дзейнасьці партыяў з боку дзяржавы. Паводле гэтага Закону, мінімальная колькасьць грамадзянаў, якія маюць права заснаваць палітычную партыю, складала 500 чалавек. Пасьля перарэгістрацыі партыяў у адпаведнасьці з новым Законам у Беларусі былі зарэгістраваныя 34 палітычныя партыі.

Для рэжыму Лукашэнкі палітычныя партыі неўзабаве стаюцца непатрэбным, дакучлівым абмежаваньнем аўтарытарнага кіраваньня. Улады ня могуць дазволіць сабе адкрыта пазбавіцца партыяў, але спрабуюць стварыць як мага менш спрыяльныя ўмовы для іх дзейнасьці, атмасфэру страху, чаканьня закрыцьця ў любы момант. Пачынаецца ціск на палітычныя партыі і незалежныя грамадзкія аб’яднаньні. Закон аб партыях прадугледжвае кантроль адпаведнасьці дзейнасьці партыяў іхным статутам, які павінен ажыцьцяўляцца Міністэрствам юстыцыі. Гэтае палажэньне дазволіла Міністэрству юстыцыі, напрыклад, на пачатку 1999 году ініцыяваць закрыцьцё апазыцыйнай Хрысьціянска-дэмакратычнай партыі на падставе нясвоечасовага правядзеньня партыйных сходаў. Увогуле, бальшыня афіцыйных папярэджаньняў палітычным партыям робіцца Міністэрствам юстыцыі акурат на падставе парушэньня тэрмінаў правядзеньня прадугледжаных статутам партыі абавязковых мерапрыемстваў; апроч таго, значная колькасьць папярэджаньняў робіцца «на падставе публікацый у прэсе, г.зн. паведамленьняў аб правядзеньні мітынгаў, дэманстрацый і г.д., у якіх згадваюцца неза-

конныя дзеяньні той ці іншай партыі». Любая палітычная партыя можа быць закрытая ў выпадку «паўторнага на працягу году зьдзяйсьненьня дзеяньняў, за якія было зроблена пісьмовае папярэджаньне».

На пачатку 1999 году прэзыдэнт Лукашэнка выдаў дэкрэт «Аб некаторых захадах па ўпарадкаваньні дзейнасьці палітычных партыяў, прафэсійных саюзаў і іншых грамадзкіх аб'яднаньняў», згодна зь якім усе гэтыя арганізацыі мусілі прайсьці перарэгістрацыю да 1 ліпеня таго ж году. Дзейнасьць арганізацыяў, якія ня пройдуць перарэгістрацыю, прыпынялася. Дэкрэт падвысіў колькасную планку для рэгістрацыі партыі з 500 да 1000 заснавальнікаў; апроч таго, партыі мусілі мець рэгіянальныя структуры ня меней як у 4 абласьцях краіны. Для разгляду пытаньняў перарэгістрацыі была ўтвораная адмысловая рэспубліканская камісія, якую ўзначаліў У. Замяталін, які тады быў віцэ-прэм'ерам. З 43 зарэгістраваных на пачатак 1999 году партыяў дзейнымі лічыліся 27, але некаторыя зь іх ня мелі неабходнай для перарэгістрацыі колькасьці чальцоў і нават не спрабавалі перарэгістравацца. Беларуская сялянская партыя не падала дакумэнты на перарэгістрацыю ў знак пратэсту; яе чальцы часткова перайшлі ў БНФ. З прычыны таго, што да прызначанай даты Міністэрства юстыцыі пасьпела перарэгістраваць толькі 5 партыяў (ПКБ, ЛДП, жаночую партыю «Надзея», Рэспубліканскую партыю працы і справядлівасьці (РПТС) і АГП), тэрмін перарэгістрацыі быў працягнуты да 1 жніўня.

Партыі, недзяржаўныя СМІ, незалежнае беларускае грамадзтва ўспрынялі дэкрэт як узмацненьне ціску на палітычныя партыі перад выбарамі ў мясцовыя Саветы альбо нават як спробу пазбавіцца апазыцыйных партыяў (у 1999 годзе заканчваўся легітымны тэрмін прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў). Адылі ўсе найбольш уплывовыя апазыцыйныя партыі перарэгістрацыю прайшлі. Магчыма, першапачатныя пляны ўладаў што да вынікаў перарэгістрацыі парушыла актыўная рэакцыя грамадзтва.

Пасьля 2001 году, перачакаўшы, пакуль спадзе хваля грамадзкага ўзрушэньня, лукашэнкаўцы распачалі новы наступ на структуры палітычных партый, прыкрыты юрыдычнымі і псэўдаюрыдычнымі аргумэнтамі. Шырока выкарыстоўваліся папярэджаньні, ліквідацыя мясцовых суполак праз пазбаўленьне юрыдычных адрасоў, адмова ў рэгістрацыі новых партыяў па надуманых падставах. У жніўні 2004 году адна з партыяў (БПП) была ліквідаваная праз суд за «парушэньні заканадаўства». У чэрвені 2003 году ў Закон аб палітычных партыях было ўнесена дапаўненьне, якое дазволіла зачыніць партыю (празь Вярхоўны суд) нават за аднаразовае парушэньне закону аб масавых мерапрыемствах, што надалей абмежавала актыўнасьць партыяў у арганізацыі мітынгаў, шэсьцяў і дэманстрацый.

Зьмены, унесеныя ў закон «Аб палітычных партыях» у ліпені 2005 году, якія ўступілі ў сілу ў кастрычніку 2005 г. забаранілі дзейнасьць незарэгістраваных партый і саюзаў. Раней, у 2004 г., міністэрства юстыцыі выносіла папярэджаньні партыям, лідэры якіх заявілі пра ўдзел у нефармальнай кааліцыі "Пяцёрка-плюс". Згодна з новай рэдакцыяй закона, міністэрства атрымала велізарныя кантрольныя і карныя паўнамоцтвы, у прыватнасьці, права прыпыняць (праз падачу заявы ў Вярхоўны суд) дзейнасьць партый на тэрмін ад аднаго да шасьці месяцаў у выпадку адсутнасьці належнай рэакцыі партыі на папярэджаньне аб парушэньні заканадаўства. Апроч таго, закон зьмясьціў адсылачную норму на "заканадаўчыя акты аб барацьбе з тэрарызмам і экстрэмізмам", якімі могуць устанаўлівацца іншыя "нормы адказнасьці" ў дачыненьні да палітычных партый.

Яшчэ адна навэля закону – неабходнасьць для партый мець Менскую гарадзкую і чатыры

абласныя зарэгістраваныя суполкі. У сьнежні 2005 г. Міністэрства юстыцыі выносіла папярэджаньні за невыкананьне гэтай нормы адначасова пяці партыям: Беларускай партыі “Зялёныя”, БСДП (Г), Беларускай партыі жанчын “Надзея”, партыі “БНФ” і Беларускай патрыятычнай партыі. Відавочна, яны знаходзяцца пад пагрозай прыпыненьня (якое, згодна з арт. 31, не дапускаецца ў часе выбарчай кампаніі) або закрыцьця пасьля выбараў прэзыдэнта ў сакавіку 2006 г. Зрэшты, паводле паведамленьня агенцтва БелАПАН (16 сьнежня 2005 г.) намесьнік старшыні партыі БНФ В. Івашкевіч так адрэагаваў на пагрозу: «Мы вылучаем кандыдатаў у дэпутаты – іх не рэгіструюць, мы вылучаем кандыдатаў у члены выбарчых камісій – іх таксама не рэгіструюць, мы друкуем афіцыйныя ўлёткі – іх канфіскоўваюць, мы ладзім партыйныя зьезды і сходы – іх не прызнаюць легітымнымі. Так што, нават страціўшы афіцыйны статус, мы фактычна нічога не страцім».

## Аб’яднаная грамадзянская партыя (АГП)

Старшыня партыі (інтэрнэт-старонка http://www.ucpb.org) — Анатоль Лябедзька, юрыст, былы старшыня Камісіі па міжнародных справах у Вярхоўным Савеце 13 скліканьня, ганаровы старшыня — Станіслаў Багданкевіч, доктар эканамічных навук, прафэсар, былы старшыня Нацыянальнага банку.

АГП утварылася 1 кастрычніка 1995 году празь зьліцьцё Аб’яднанай дэмакратычнай партыі (заснаваная ў 1990 годзе, старшыня Аляксандар Дабравольскі) і Грамадзянскай партыі (заснаваная ў 1994 годзе, старшыня Васіль Шлындзікаў).

Паводле статутных дакумэнтаў, АГП — партыя лібэральна-кансэрватыўнага кірунку, якая ставіць правы асобы вышэй за інтарэсы сацыяльных групаў, дзяржавы ці нацыі. Прыярытэтныя пункты ідэалёгіі АГП: правы чалавека, адкрытае грамадзтва і дэмакратычная форма кіраваньня, вяршэнства закону, абарона права ўласнасьці, свабоднае прадпрымальніцтва, рынкавая эканоміка. АГП выступае за выбары ў парлямэнт па зьмяшанай мажарытарна-партыйнай сыстэме, прамыя выбары мясцовых кіраўнікоў адміністрацыі. У ліку мэтаў партыі — уваходжаньне Беларусі ў Савет Эўропы і ў пэрспэктыве — у Эўрапейскі Зьвяз.

У пачатку 2000-х гадоў АГП мела пярвічныя арганізацыі ўва ўсіх абласьцях і амаль у 80 раёнах Беларусі, актыўную моладзевую арганізацыю «Моладзь АГП». Пазьней, пад уціскам дзяржаўных органаў, многія пярвічныя суполкі былі зачынены. АГП супрацоўнічае з уплывовымі замежнымі правымі партыямі і аб’яднаньнямі (Эўрапейскі дэмакратычны саюз; «Саюз свабоды», Польшча; «Саюз правых сілаў», Расія; «Рэформы і парадак», Украіна і інш.).

АГП аб’яднала ў сваіх шэрагах вялікую частку расійскамоўнай палітычна актыўнай эліты. Першапачатна галоўнае значэньне надавалася ня масавасьці партыі, а прыцягненьню ў партыю дасьведчаных і аўтарытэтных палітыкаў і эканамістаў. Засяроджанасьць АГП на эканамічных пытаньнях, адсутнасьць эмацыйнай рыторыкі, уласьцівай БНФ, рабіла партыю прывабнаю для бізнэсоўцаў. У пэўным сэнсе, АГП была больш прафэсійнаю партыяй, чым найбліжэйшы да яе па шкале «права-лева» БНФ, больш здатнаю да працы ў парлямэнце.

Пераломнымі ў гісторыі АГП сталі парлямэнцкія выбары 1995–1996 гадоў. На выбарах у Вярхоўны Савет 13 скліканьня АГП атрымала 9 месцаў. Дэпутаты ад АГП утварылі парлямэнцкую фракцыю «Грамадзянскае дзеяньне» на чале з тагачасным старшынём партыі С. - Багданкевічам. Пасьля далучэньня да «Грамадзянскага дзеяньня» іншых дэпутатаў зь лібэ-

ральнымі паглядамі фракцыя складалася з 22 чалавек. Адылі для наступнага разьвіцьця партыі і трансфармацыі яе праграмных установак больш істотнаю была ня колькасьць здабытых ёю месцаў у парлямэнце, а тая акалічнасьць, што БНФ ня здолеў правесьці ў парлямэнт ніводнага свайго кандыдата. Такім чынам, АГП аказалася адзінаю правай сілай, прадстаўленай у Вярхоўным Савеце 13 скліканьня, палову якога складалі прадстаўнікі левай Аграрнай партыі і ПКБ.

У гэтай сытуацыі роля фракцыі АГП «Грамадзянскае дзеяньне» стаецца падобнаю да ролі апазыцыі БНФ у папярэднім Вярхоўным Савеце. Актыўнасьць і ўплыў фракцыі несувымерныя зь яе малым колькасным складам. Больш за тое, пры адсутнасьці ў парлямэнце дэпутатаў ад БНФ фракцыя «Грамадзянскае дзеяньне» вымушана становіцца галоўным абаронцам дзяржаўнага сувэрэнітэту Беларусі, калі Лукашэнка радыкалізуе працэс інтэграцыі Беларусі і Расіі. Ад 1991 году стаўленьне расійскамоўнай эліты да незалежнасьці Беларусі павольна зьмянялася ад адмоўнага праз абыякавае да прыхільнага, але цяпер, калі пытаньне стаіць рубам, яна мусіць зрабіць выразны выбар і робіць яго на карысьць сувэрэнітэту Беларусі, актыўна выступаючы супраць ратыфікацыі інтэграцыйных пагадненьняў. Абавязковым пунктам праграмы АГП становіцца падтрымка ідэі адраджэньня нацыянальнай культуры, сымболікі, рэальнага зацьвярджэньня беларускай мовы ў ролі дзяржаўнай. АГП становіцца, побач з БНФ, адным з цэнтраў апазыцыі Лукашэнку. У лістападзе 1996 году ніводзін дэпутат з фракцыі «Грамадзянскае дзеяньне», апрача Ўладзімера Навасяда, не перайшоў у створаную Лукашэнкам палату прадстаўнікоў.

Пасьля канстытуцыйнага перавароту лістапада 1996 году, калі ўдзел палітычных партыяў у кіраваньні краінай стаецца немагчымым, а магчымасьці для прапаганды сваіх ідэяў праз СМІ — моцна абмежаванымі, паступова мяняецца першапачатная канцэпцыя АГП. «Элітарная» АГП вымушана йсьці на вуліцы: браць удзел у арганізацыі масавых акцыяў пратэсту, пікетаў і г.д. У 1999 годзе прымаецца афіцыйнае стратэгічнае рашэньне аб паступовым ператварэньні партыі з «элітарнай» у «народную».

Ад самага пачатку дыялёгу паміж апазыцыйнымі Лукашэнку сіламі АГП адыгрывае ў ім вельмі істотную ролю. Яе прадстаўнікі складаюць бальшыню ценявога ўраду, створанага Вярхоўным Саветам пасьля канстытуцыйнага перавароту. АГП удзельнічае ў Кансультацыйнай радзе апазыцыйных палітычных партый, у КРДС. Вага АГП у КРДС робіцца яшчэ большай пасьля расколу БНФ і адыходу ягонай артадаксальнай часткі ад супрацоўніцтва зь іншымі дэмакратычнымі партыямі (хоць трэба прызнаць, што павелічэньне вагі АГП у КРДС адбывалася хутчэй за кошт зьмяншэньня ўплыву КРДС як такой).

У 2000 годзе АГП, згодна з рашэньнем КРДС, байкатуе выбары ў палату прадстаўнікоў, а годам раней таксама выбары ў мясцовыя Саветы (некаторыя сябры АГП кандыдуюць і нават абіраюцца ў палату прадстаўнікоў, але перад удзелам у выбарах прыпыняюць сяброўства ў партыі). У 2001 годзе АГП, разам з БНФ, настойвала на неабходнасьці вылучэньня адзінага дэмакратычнага кандыдата, хаця асобныя яе кіраўнікі (П. Данейка) схіляліся на карысьць падтрымкі прафсаюзнага дзеяча А. Ярашука.

На пачатак 2002 году ў АГП налічвалася 3125 сяброў. На VI зьезьдзе АГП у 2002 годзе і на VII зьезьдзе ў 2004 г. быў выказаны давер старшыню партыі А. Лябедзьку, які дагэтуль зьяўляецца бясспрэчным лідэрам і "тварам" партыі. Аднак, насупор спадзевам, партыя ня стала насамрэч "народнай". У 2002 годзе яе скаланулі скандалы: шэраг актывістаў раённага ўзроўню пакінулі АГП, абвінаваціўшы лідэраў у аўтарытарызьме. У верасьні 2002 году А.

Лябедзька правёў перамовы аб супрацоўніцтве з тагачасным кіраўніком расійскага Саюзу правых сілаў Б. Нямцовым, якія сталі прадметам жорсткай крытыкі ня толькі з боку ўладаў, але і ў самім апазыцыйным лягеры (актывісты “Маладога фронту” праводзілі акцыю па “зборы грошай на квіток у Расею”, маючы на ўвазе, што кіраўнік АГП трымаецца прарасейскага курсу).

АГП была адным з цэнтральных зьвеньняў у кааліцыі “Пяцёрка-плюс”, утворанай у канцы 2003 году, аднак дэ-факта апынулася ў ёй на другіх ролях (першыя адыгрывалі БНФ і ПКБ). Адначасова яна спрабавала наладзіць стасункі з дэпутацкай групай “Рэспубліка”: так, намесьнік старшыні АГП Я. Раманчук браў чынны ўдзел у падрыхтоўцы альтэрнатыўнага закону аб бюджэце на 2004 г., прэзэнтаванага “Рэспублікай”. На выбарах 2003 году ў мясцовыя саветы з вылучаных дзьвюх соцень чалавек (сяброў і прыхільнікаў АГП) і зарэгістраваных 120 трапілі толькі 5 прадстаўнікоў АГП. Паразай для АГП скончылася і кампанія 2004 г., хаця партыяй былі вылучаны больш за 50 кандыдатаў у дэпутаты. Што праўда, толькі 29 зь іх здолелі паўдзельнічаць у выбарах: астатнія не былі зарэгістраваны акруговымі камісіямі.

У апошнія гады партыя рабіла акцэнт на прыцягненьне ўвагі да праблемы зьніклых людзей і на пратэстных кампаніях (напрыклад, супраць перайменаваньня менскіх вуліцаў і праспэктаў у траўні 2005 г.). Адметны інтэлектуальны патэнцыял і стаўка на прафэсіяналаў, пра якія неаднойчы заяўляла кіраўніцтва АГП, не дапамаглі А. Лябедзьку стаць “адзіным кандыдатам” дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г., аднак, заняўшы другое месца пасьля А. Мілінкевіча, ён узначаліў Нацыянальны камітэт пры адзіным кандыдату – “ценявы ўрад”.

## Аграрная партыя (АП)

Заснаваная ў 1992 годзе пад назвай Аб’яднаная аграрна-дэмакратычная партыя як палітычны інструмэнт аграпрамысловага лёбі. Бальшыня сяброў партыі — кіраўнікі прадпрыемстваў сельскай гаспадаркі. АП выступала за захаваньне буйной сельскагаспадарчай вытворчасьці (калгасаў і саўгасаў) і ў гэтым сэнсе ўяўляла сабой процівагу «фэрмэрскай» Беларускай сялянскай партыі. Зь іншага боку, АП уважала за магчымае ўвядзеньне прыватнай уласнасьці на зямлю (зь істотнымі абмежаваньнямі) і іншых элемэнтаў рынкавай эканомікі — але з моцным дзяржаўным рэгуляваньнем фінансавай сфэры. Да канстытуцыйнага крызысу 1996 году АП была адной з найбольш масавых партыяў, колькасьць сяброў партыі дасягала 12 000. АП супрацоўнічала з Аграрнай партыя Расіі й зь Сялянскай партыяй Украіны.

На II зьездзе ў 1994 годзе была прынятая новая назва — Аграрная партыя. На прэзыдэнцкіх выбарах у 1994 годзе і пазьней на парлямэнцкіх выбарах АП актыўна выкарыстоўвае «інтэграцыйную» і ў пэўнай меры антызаходнюю рыторыку, выказваецца за стварэньне канфэдэрацыі Расіі, Беларусі і Ўкраіны. Кандыдат у прэзыдэнты ад АП А.Дубко пад сацыялістычнымі лёзунгамі набраў больш галасоў, чым кандыдат ад ПКБ В.Новікаў (6,0% супраць 4,6%). У 1995 годзе ў часе выбараў у Вярхоўны Савет АП разам з ПКБ утварае аснову перадвыбарнага блёку левых; пасьля выбараў АП фармуе ў парлямэнце найбольшую партыйную фракцыю, у якую ўваходзяць 48 дэпутатаў (24%). Лідэр АП Сямён Шарэцкі быў абраны на пасаду Старшыні Вярхоўнага Савету.

У Вярхоўным Савеце 13 склікання АП разам з ПКБ і лібэральнымі дэпутатамі супраць-

staiць прэзыдэнту. Кіраўніцтва АП нават часткова адмаўляецца ад сваіх перадвыбарных лёзунгаў: на фоне актыўнасьці Лукашэнкі ў справе інтэграцыі Беларусі і Расіі лідэр партыі і фракцыі, сьпікер парлямэнту С. Шарэцкі на прэс-канфэрэнцыі ў пачатку 1996 году кажа аб нерэальнасьці аднаўленьня СССР і аб неабходнасьці будаўніцтва сувэрэннай беларускай дзяржавы.

У межах парлямэнцкай фракцыі АП зьяўляюцца пэўныя разыходжаньні паміж больш і менш лібэральнымі дэпутатамі. Калі на галасаваньні стаіць пытаньне аб дэнансацыі белавескіх пагадненьняў, частка аграрнікаў галасуе супраць, частка — за. Пасьля 1996 году АП развальваецца: каля паловы дэпутатаў з фракцыі аграрнікаў пераходзіць у прызначаную Лукашэнкам палату прадстаўнікоў, тады як С. Шарэцкі і некаторыя іншыя дэпутаты адмаўляюцца прызнаваць новы заканадаўчы орган. Улады пад пагрозай звальненьня забараняюць кіраўнікам аграпрамысловых прадпрыемстваў, на ахвяраваньні якіх дзейнічала партыя, падтрымліваць АП. Партыя фактычна перастае дзейнічаць.

Дзейнасьць партыі аднаўляецца толькі ў сакавіку 2000 году — але ўжо ў якасьці прапрэзыдэнцкай партыі. Ляяльныя рэжыму аграрнікі праводзяць першы пасьля 1996 году зьезд АП, які абірае на пасаду кіраўніка партыі Міхаіла Шыманскага, на той час – галоўнага рэдактара падкантрольнай уладам «Народнай газэты» (С. Шарэцкі быў выключаны з АП яшчэ ў 1998 годзе). Паводле зьвестак Міністэрства юстыцыі, у пачатку 2002 г. у партыі было 1242 сябры. У верасьні 2004 г. М. Шыманскі ад імя АП падпісаў зварот, у якім ухваліў ініцыятыву А. Лукашэнкі па правядзеньні рэфэрэндуму 17 кастрычніка.

## Беларуская партыя жанчын «Надзея»

Старшыня партыі — Валянціна Матусевіч, якая ў жніўні 2002 году зьмяніла на гэтай пасадзе Валянціну Палевікову. Партыя жанчын «Надзея» была створаная 28 красавіка 1994 году на базе прафсаюзу супрацоўнікаў асьветы, зарэгістраваная Міністэрствам юстыцыі 3 чэрвеня 1994 году. Мэта стварэньня партыі — палітычная актывізацыя жанчынаў. У праграме партыі сьцьвярджаюцца наступныя прыярытэты: абарона сям'і, мацярынства й дзяцінства, адкрытае грамадзтва, дэмакратычныя рэформы, сацыяльная справядлівасьць, эканамічная і палітычная свабода. Сябры партыі — прафсаюзныя лідэры, актывісткі жаночых рухаў, беспрацоўныя жанчыны.

У 1996 годзе партыя «Надзея» далучаецца да палітычнай апазыцыі аўтарытарнаму рэжыму, удзельнічае ў Кангрэсах дэмакратычных сілаў, уваходзіць у ёй, у ліпені 2000 г. далучаецца да КРДС, але ў чэрвені 2001 году прыпыняе сяброўства ў КРДС. Афіцыйна гэтая пастанова тлумачыцца пратэстам супраць таго, што частка дэмакратычных сілаў (у прыватнасьці АГП) парушае рашэньні КРДС і падтрымлівае кандыдатаў, якія не ўваходзяць у «пяцёрку».

Ідэалягічна партыя бліжэйшая да левацэнтрысцкіх апазыцыйных сілаў.

Сацыялягічныя апытаньні неаднаразова паказвалі найбольшы з усіх палітычных партыяў рэйтынг «Надзеі» — да 8,4%. Ува ўмовах інфармацыйнага голаду гэта, аднак, наўрад ці адлюстроўвае рэальны ўплыў партыі на палітычны працэс; можна прыпусьціць, што гэтыя лічбы тлумачацца прывабнасьцю азначэньня партыі для рэспандэнтаў-жанчын.

Партыя «Надзея» супрацоўнічае з шматлікімі замежнымі жаночымі арганізацыямі. У 2002 годзе ў яе ўваходзіў 1141 чалавек.

## Беларуская партыя працы (БПП)

Старшынём партыі працяглы час быў Аляксандар Бухвостаў, старшыня прафсаюзу работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва. БПП была зарэгістраваная 24 лютага 1994 году. Паводле самавызначэньня, гэта партыя «сацыял-дэмакратычнай, лейбарысцкай арыентацыі». Партыя была створаная з мэтаю палітычнай падтрымкі прафсаюзнага і рабочага руху праз абарону і прадстаўленьне ягоных інтарэсаў у органах улады, у прэсе, на выбарах. Ініцыятарамі стварэньня БПП сталі Беларуская незалежная асацыяцыя прафсаюзаў прамысловасьці (А. Бухвостаў — сустаршыня асацыяцыі), дэмакратычна настроеныя дзеячы прафсаюзнага і рабочага руху — прыхільнікі рэфармаваньня прафсаюзаў. Рэгіянальныя арганізацыі партыі існавалі ўва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі, у Барысаве, Асіповічах, Бабруйску, Салігорску, Жодзіне.

БПП знаходзілася ў апазыцыі да рэжыму Лукашэнкі. Найбольш шчыльна партыя супрацоўнічала з БСДП (НГ). У ліпені 2000 г. далучаецца да КРДС, але пасьля прыпыненьня сяброўства ў гэтай Радзе БСДП (НГ) на знак салідарнасьці перастае браць удзел у паседжаньнях Рады.

У ліпені 2001 году БПП разам з БСДП (НГ) абвяшчае аб разрыве з КРДС і стварэньні левацэнтрысцкай канфэдэрацыі. На пачатак 2002 году ў партыі было 1077 сяброў. У 2003 годзе кіраўнікі БПП далучыліся да кааліцыі «Пяцёрка-плюс». У жніўні 2004 году партыя была ліквідаваная рашэньнем Вярхоўнага суду за парушэньні заканадаўства: цяпер былыя чальцы БПП займаюцца палітычнай дзейнасьцю без афіцыйнай рэгістрацыі. Лідэр партыі А. Бухвостаў стаў арганізатарам Кангрэсу дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г., а пасьля правядзеньня Кангрэсу актывісты БПП далучыліся да каманды А. Мілінкевіча.

## Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Грамада» (БСДП (Г))

Утворана на базе Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада» (БСДП (НГ)), якую да сьнежня 2004 году ўзначальваў Мікалай Статкевіч.

**БСДП (НГ)** на рубяжы стагодзьдзяў была адной з найбольш значных апазыцыйных сілаў: колькасьць сяброў у канцы 1990-х гадоў сягала 2500, у пачатку 2002 г. – 4076. БСДП (НГ) лічыла сябе адной зь пераемніц партыі БСДГ, заснаванай 2 сакавіка 1991 году часткай сяброў БНФ «Адраджэньне», а БСДГ, у сваю чаргу, прэтэндавала на працяг гістарычнай дасавецкай традыцыі, абвясьціўшы сваю пераемнасьць зь Беларускай сацыялістычнай грамадой, якая дзейнічала ў Беларусі на пачатку ХХ стагодзьдзя. Першы старшыня БСДГ — прафэсар Міхась Ткачоў, намесьнік тагачаснага старшыні БНФ З.Пазьняка; пасьля сьмерці яго ў 1992 годзе на пасаду старшыні быў абраны Алег Трусаў, дэпутат парлямэнту, пазьней старшыня Таварыства беларускай мовы. Нягледзячы на істотныя разыходжаньні ў эканамічных паглядах, на пачатку сваёй дзейнасьці БСДГ была вельмі блізкая да БНФ «Адраджэньне», бо адным з прыярытэтаў партыі была абарона і адраджэньне нацыянальных вартасьцяў. У 1993 годзе адлегласьць паміж БНФ і БСДГ павялічваецца праз удзел апошняй у працы Аб’яднань-

ня дэмакратычных сілаў «Вясна-94», якое было створанае з ініцыятывы АДПБ і БСП і ў якое БНФ адмовіўся ўступіць, верагодна, не жадаючы зьніжаць свайго статусу раўнапраўным хаўрусам з нашмат меншымі і менш уплывовымі за яго партыямі. У 1994 годзе БСДГ разам са сваёй новай хаўрусьніцай АДПБ падтрымлівае на прэзыдэнцкіх выбарах не З. Пазьняка, а С. Шушкевіча, але ў 1995 годзе на выбарах у Вярхоўны Савет БНФ і БСДГ яшчэ ўзгадняюць свае дзеяньні па вылучэньні кандыдатаў.

Выбары 1995 году сталі правальнымі для партыяў, якія рабілі акцэнт на нацыянальных сымбалях. Вынікі выбараў выклікаюць інтэнсіўную палеміку ўнутры гэтых партыяў, і калі ў БНФ З.Пазьняку ўдаецца захаваць і сваё лідэрства, і ранейшыя прыярытэты, дык у БСДГ адбываецца важная зьмена: замест А.Трусава 1 ліпеня 1995 году кіраўніком партыі стаецца падпалкоўнік Мікалай Статкевіч (лідэр забароненага Беларускага згуртаваньня вайскоўцаў, за ўдзел у БЗВ у 1993 годзе звольнены ў запас). Ад гэтага часу нацыянальна-культурны складнік праграмы БСДГ — адпаведна з палітычнай кан'юнктурай у краіне — адыходзіць на другі плян. З абраньнем М.Статкевіча на пасаду старшыні партыя пачынае шукаць сабе хаўрусьнікаў не сярод правых, зь якім яе дагэтуль збліжала нацыянальная ідэя, а сярод левых. М.Статкевіч вылучае мэту стварэньня шырокай сацыял-дэмакратычнай кааліцыі. Улетку 1995 году БСДГ разам з маргінальнымі Партыяй народнай згоды (ПНЗ) і Партыяй усебеларускага адзінства і згоды (ПУАЗ) падпісвае пагадненьне аб стварэньні Сацыял-дэмакратычнага саюзу (СДС), які выступае адзіным блёкам на давыбарах у Вярхоўны Савет 13 скліканьня. Дэпутаты ад СДС утвараюць у парлямэнце фракцыю «Саюз працы» з 18 чалавек на чале зь лідэрам ПНЗ Леанідам Сечкам. У студзені 1996 году БСДГ і ПНЗ аб'ядноўваюцца ў адну партыю, якая атрымоўвае назву Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя «Народная грамада».

Наступныя падзеі паказалі, наколькі малазначным у спэцыфічных беларускіх варунках таго часу было падабенства абстрактнай ідэалёгіі партыяў. Сацыял-дэмакратычную кааліцыю разьбівае новы магутны палітычны фактар — асоба прэзыдэнта Лукашэнкі. Л.Сечка і іншыя сябры ПНЗ уладкоўваюцца на працу ў Адміністрацыю прэзыдэнта, М.Статкевіч і сябры былой БСДГ удзельнічаюць у акцыях пратэсту супраць усталяваньня аўтарытарнага рэжыму. Сяброў фракцыі «Саюз працы» ў парлямэнце аб'ядноўвае хіба што назва. Пасьля канстытуцыйнага крызысу ў лістападзе 1996 году частка былой ПНЗ абвяшчае аб сваёй ляяльнасьці прэзыдэнту, выходзіць са складу БСДП (НГ) і засноўвае прапрэзыдэнцкую Сацыял-дэмакратычную партыю народнай згоды (СДПНЗ). БСДП (НГ) на чале з М. Статкевічам застаецца ў апазыцыі.

Такім чынам, курс, які ўзяла БСДП (НГ) пад кіраўніцтвам М.Статкевіча, прывёў партыю на скрыжаваньне розных «лініяў падзелу». З аднаго боку, усё больш левая ідэалёгія партыі і спробы супрацоўніцтва з ПНЗ аддаляюць ад БСДП (НГ) тых лібэральных нацыянальна-дэмакратычных палітыкаў, якія стаялі ля яе пачаткаў (А.Трусаў, С.Шушкевіч і інш.), — і ўрэшце яны выходзяць з партыі, засноўваючы новую БСДГ. Зь іншага боку, партыя знаходзіцца ў жорсткай апазыцыі рэжыму Лукашэнкі і пасьлядоўна выступае супраць спробаў аб'яднаньня з Расіяй, што абцяжвае дасягненьне пастаўленай Статкевічам мэты — для стварэньня «шырокай сацыял-дэмакратычнай кааліцыі» пры захаваньні ў ліку прыярытэтаў нацыянальнай ідэі, хай і не на першым месцы, пакуль няма адпаведнай сацыяльнай базы.

У наступныя гады БСДП (НГ) узяла ўдзел у арганізацыі масавых вулічных акцыяў, у працы Кансультацыйнай рады апазыцыйных палітычных партыяў і КРДС. Адначасова пра-

цягвалася «паляваньне» партыі: БСДП (НГ) усталявала шчыльныя кантакты з прафсаюзамі, прафсаюзнаю БПП. У 1999 годзе БСДП (НГ) не падпарадкавалася пастанове КРДС аб байкоце выбараў, што дадаткова пагоршыла яе стасункі з правейшаю часткай КРДС і прывяло да канфлікту паміж партыйнай бальшынёй і партыйнай фракцыяй «За адзінства» на чале з Аляксеем Каралём (фракцыя байкатавала выбары). Лягічным вынікам напружаных адносінаў БСДП (НГ) і правымі сіламі ў КРДС стала тое, што ў 2001 годзе БСДП (НГ) разам з Партыяй працы парвалі з КРДС і пачалі новую спробу арганізацыі левага цэнтру. У ліпені 2001 году гэтыя партыі абвясьцілі аб заснаваньні левацэнтрысцкай канфэдэрацыі «За сацыяльныя перамены». Канфэдэрацыя падтрымала кандыдатуру У. Ганчарыка на прэзыдэнцкіх выбарах.

У канцы 2001 году БСДП (НГ) перажыла крызыс, зьвязаны з сыходам актывістаў фракцыі «За адзінства», аднак у сьнежні 2001 г. Мікола Статкевіч быў пераабраны старшынём партыі. На выбарах у мясцовыя саветы ў сакавіку 2003 году партыя атрымала 11 мандатаў. У 2003 годзе М. Статкевіч, разам з актывістамі «Хартыі'97», абвяшчае пра стварэньне «Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь»», альтэрнатыўнай «Пяцёрцы-плюс», навязвае кантакты з дэпутатамі палаты прадстаўнікоў з групы «Рэспубліка». У кастрычніку 2004 году лідэр партыі дырыгуе пратэставай кампаніяй супраць рэфэрэндуму аб падаўжэньні прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў, за якую ў чэрвені 2005 году быў асуджаны да абмежаваньня волі (разам з П. Севярынцам). У 2004 г. унутры БСДП (НГ) афармляецца апазыцыя, якую ўтвараюць бліжэйшыя паплечнікі М. Статкевіча У. Нісьцюк і А. Ляўковіч. У пачатку 2005 г., пасьля адхіленьня з пасады М. Статкевіча, яны па чарзе кіруюць партыяй. Паводле У.Нісьцюка (“Наша Ніва”, 14 студзеня 2005 г.), на той час у БСДП (НГ) налічвалася каля 1500 актывістаў. У красавіку 2005 г., на г.зв. аб'яднаўчым зьезьде БСДП (НГ) і БСДГ лідэрам партыі, якая атрымала новую назву – БСДП (Г) – абіраецца А. Казулін. Вынікі зьезду зацьвярджаюцца Міністэрствам юстыцыі.

Пераварот у партыі быў рэзка адмоўна ўспрыняты прыхільнікамі М. Статкевіча, які застаецца аўтарытэтным лідэрам для многіх сацыял-дэмакратаў. Незарэгістраваная група Статкевіча трымаецца назову “БСДП (НГ)” і мае інтэрнэт-старонку http://bsdpng.info. У перадвыбарчай кампаніі 2005-2006 гг. актывісты “БСДП (НГ)” падтрымліваюць кандыдатуру А. Мілінкевіча.

На дадзены момант (студзень 2006 г.) партыя БСДП (Г) пад кіраўніцтвам А. Казуліна не пасьпела паўдзельнічаць ні ў водных выбарах, таму казаць пра яе палітычную вагу ў параўнаньні з “БСДП (НГ)” зарана. Цягам 2005 году А. Казулін дэманстрацыйна ўхіляўся ад супрацоўніцтва з партыямі “Пяцёркі-плюс” і не падтрымаў ідэі вылучэньня “адзінага дэмакратычнага кандыдата” на Кангрэсе дэмакратычных сілаў. У сьнежні 2005 году ён зарэгістраваўся ў якасьці прэтэндэнта на прэзыдэнцкую пасаду ў 2006 годзе, аднак, відавочна, разлічвае хутчэй на намэнклятурныя, чым на партыйныя рэсурсы. Паколькі ў сьнежні 2005 г. пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі заявіў і іншы актывіст партыі, В. Фралоў, можна зрабіць выснову аб слабасьці ўнутрыпартыйнай дысцыпліны і зьніжэньні вагі БСДП (Г) на палітычным полі. Інтэрнэт-старонка партыі – http://bsdp.org.

## Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (БСДГ)

Кіраўніком **БСДГ** зьяўляецца Станіслаў Шушкевіч, старшыня Вярхоўнага Савету ў 1991–1994 гады. БСДГ — другая пераемніца той БСДГ, якая існавала ў 1992–1996 гадох. БСДГ Станіслава Шушкевіча была заснаваная ў лютым 1998 г. больш лібэральнай часткай сяброў БСДП (НГ), якіх не задавальнялі зьмены курсу БСДП (НГ) пасьля абраньня на пасаду старшыні партыі М. Статкевіча; такім чынам, сацыял-дэмакраты фармальна разьбіліся на «левую» (партыя М. Статкевіча) і «правую» (партыя С. Шушкевіча) часткі.

Прыярытэтнай задачай новай БСДГ было абвешчанае аднаўленьне Канстытуцыі 1994 году. У 1999 годзе БСДГ увайшла ў КРАПП, у ліпені 2000 году — у КРДС. Партыя С. Шушкевіча паводле ідэалёгіі бліжэйшая хутчэй да БНФ, чым да БСДП (НГ).

Партыя М.Статкевіча напачатку рэзка адмоўна ўспрыняла заснаваньне БСДГ. Стасункі паміж БСДП (НГ) і БСДГ пацяплелі, калі ў лютым 2001 году БСДГ выстаўляе патрабаваньне ўзнавіць сяброўства БСДП (НГ) у КРДС, прыпыненае Радаю з прычыны ўдзелу БСДП (НГ) у выбарах у нелегітымны парлямэнт.

У 2001 годзе пасьля выказваньняў пяцёркі апазыцыйных кандыдатаў за інтэграцыю з Расіяй, абумоўленых хутчэй палітычнай кан’юнктурай, выканкам БСДГ распаўсюджвае заяву аб прыпыненьні свайго сяброўства ў КРДС і выказвае гатоўнасьць падтрымаць кандыдата ад КХП БНФ З. Пазьняка. Пасьля гэтая заява была дэзавуяваная. Сацыялягічныя апытаньні пачатку 2000-х гадоў паказвалі досыць высокі ў параўнаньні зь іншымі партыямі рэйтынг БСДГ — да 6%; гэта можна патлумачыць вядомасьцю і аўтарытэтам С.Шушкевіча. Пазьней гэты рэйтынг паступова зьніжаўся.

На пачатак 2002 г. колькасьць сяброў БСДГ складала 1071. Пасьля выбараў 2001 году некаторыя актывісты БСДГ перайшла ў БСДП (НГ), абвінавацілўшы лідэра БСДГ у аўтарытарызьме. Аднак назіраўся і адваротны працэс: частка сяброў БСДП (НГ) на чале з А. Каралём, пасьля няўдалай спробы ўтварыць Аб’яднаную сацыял-дэмакратычную партыю ў 2002 г., увайшла ў БСДГ. Цягам 2003 году адбываецца інтэграцыя новых далучэнцаў, і ў студзені 2004 году зьезд БСДГ зацьвярджае А. Караля намесьнікам С. Шушкевіча. Другім намесьнікам стаецца М. Грыб. У 2005 годзе А. Кароль і М. Грыб пяройдуць у каманду А. Казуліна.

Удзел у мясцовых выбарах 2003 г. скончыўся для БСДГ няўдачай. У 2003 г. кіраўніцтва партыі далучылася да кааліцыі «Пяцёрка-плюс», аднак у 2004 г. ніводзін сябар БСДГ не трапіў у парлямэнт.

У 2005 г. С. Шушкевіч разглядаўся як патэнцыйны «адзіны кандыдат» ад дэмакратычных сілаў на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г., але ў час Кангрэсу дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г., прадчуваючы паразу, зьняў сваю кандыдатуру на карысьць А. Мілінкевіча.

## Беларуская партыя «Зялёныя»

Беларуская партыя «Зялёныя» (БПЗ) была ўтворана 17 красавіка 1994 году, зарэгістраваная 3 чэрвеня 1994 году і перарэгістраваная 13 верасьня 1999 году. Яна ставіць за мэту стварэньне здаровага жыцьцёвага асяродзьдзя для чалавека, сацыяльныя і прыродныя парамэтры якога забясьпечваюць максымум магчымасьцяў для яго разьвіцьця. Старшыня

партыі – Алег Грамыка, на пачатак 2002 г. у ёй быў 1141 сябар. Да ўступленьня ў 2004 годзе ў перадвыбарную кааліцыю «Пяцёрка-плюс» БПЗ знаходзілася ў стане пасіўнасьці. Нягледзячы на тое, што, паводле некаторых апытаньняў, у рэйтынгу папулярнасьці БПЗ апярэджвала БНФ, КХП-БНФ, БСДП (НГ) (дзякуючы свайму прывабнаму праэкалягічнаму брэнду), яна не высоўвала ўласных кандыдатаў на выбарах у палату прадстаўнікоў. У пачатку 2005 году цэнтральны савет БПЗ, які знаходзіцца ў г. Гомелі, падтрымаў вылучэньне кандыдатуры А. Мілінкевіча на прэзыдэнцкіх выбарах, а пасьля Кангрэсу дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г. нешматлікія актывісты БПЗ пачалі працаваць у камандзе А. Мілінкевіча.

## Беларуская экалягічная партыя зялёных «БЭЗ»

Партыя «БЭЗ» была створаная 28 кастрычніка 1998 году на базе дзьвюх партыяў: Партыі зялёных Беларусі (заснаваная ў 1993 годзе ў Гомелі, старшыня Мікалай Карташ) і Беларускай экалягічнай партыі (заснаваная ў 1994 годзе ў Менску, старшыня Міхаіл Фрыдлянд). М. Карташ і М. Фрыдлянд сталі сустаршынямі новай партыі. Колькасьць сяброў партыі ў канцы 1990-х гадоў — каля 1500 чалавек, у 2002 г. – 1107. Мэты дзеяньня партыі: стварэньне грамадзтва, у якім будзе забясьпечанае права грамадзян на экалягічны дабрабыт, распаўсюджваньне досьведу ашчаднага прыродакарыстаньня, аднаўленьне прыроднага асяродзьдзя. Палітычная праца партыі актывізуецца падчас выбарчых кампаніяў. Прадстаўнікі зялёных абіраліся ў парлямэнт 12, 13 скліканьня, у мясцовыя Саветы. На выбарах 1999 году ў мясцовыя Саветы ніводзін прадстаўнік ужо аб'яднанай партыі ня трапіў.

«БЭЗ» знаходзіцца ў апазыцыі рэжыму Лукашэнкі. У лістападзе 2001 году «БЭЗ» далучаецца да КРДС. Сваю апазыцыйнасьць «БЭЗ» матывуе нежаданьнем сёньняшніх уладаў разьвязваць экалягічныя праблемы.

Партыя мае жаночы і моладзевы рух. «БЭЗ» падтрымлівае кантакты з Швэдзкай партыяй зялёных. Інтэрнэт-старонка, на якой зьмешчаны гістарычныя зьвесткі пра "БЭЗ" – http://bez.usluga.info

## БНФ «Адраджэньне», Партыя БНФ

Беларускі Народны Фронт «Адраджэньне» (інтэрнэт-старонкі www.pbnf.org, http://pages.prodigy.net/dr_fission/bpf/) быў першай альтэрнатывай камуністычнай партыі ў Беларусі. БНФ узьнік на хвалі нацыянальнага ўздыму, беспасярэднім штуршком да якой стала адкрыцьцё двума археолягамі, Зянонам Пазьняком і Яўгенам Шмыгалёвым, масавых пахаваньняў ахвяраў сталінскага рэжыму ў Курапатах пад Менскам. 3 чэрвеня 1988 году ў газэце «Літаратура і мастацтва» друкуецца сэнсацыйны артыкул З. Пазьняка і Я. Шмыгалёва аб масавых расстрэлах у Курапатах. 19 чэрвеня праходзіць дэманстрацыя, у якой бяруць удзел каля 10 000 чалавек; улады вымушаныя стварыць камісію па расьследаваньні масавых пахаваньняў. 19.10.1988 адбываецца ўстаноўчы сход беларускага гістарычна-асьветнага таварыства памяці ахвяраў сталінізму «Мартыралёг Беларусі», заснавальнікамі якога выступілі Саюз пісьменьнікаў, Саюз кінематаграфістаў, Саюз мастакоў і рэдакцыя газэты «Літаратура і

мастацтва», і на гэтым сходзе з прапановы З. Пазьняка ствараецца аргкамітэт БНФ «Адраджэньне», канцэптаванага як грамадзка-палітычны рух за дэмакратычнае рэфармаваньне грамадзтва і адраджэньне беларускай нацыі, у якім могуць браць удзел як асобныя грамадзяне, так і грамадзкія аб’яднаньні. Аргкамітэт апублікаваў праграмную заяву, у якой акрэсьліў скіраванасьць руху (дэмакратычныя рэформы, рэальны сувэрэнітэт Беларусі, нацыянальнае адраджэньне, правы чалавека). Устаноўчы зьезд БНФ, на якім прысутнічала каля 400 дэлегатаў, адбыўся 24–25.6.1989 у Вільні, бо правесьці яго ў Менску не дазволіў Прэзыдыюм ВС БССР.

На пачатку БНФ уяўляў сабой аб’яднаньне нефармальных культурніцкіх суполак, арганізацый і грамадзянаў, якія выступалі найперш за адраджэньне беларускай мовы і культуры. Пытаньне выхаду Беларусі са складу СССР тады яшчэ ўголас не ўздымалася: зьезд ухваліў статут руху, у якім сьцьвярджалася, што дзейнасьць БНФ будзе адбывацца ў рамках Канстытуцыі БССР. На пасаду старшыні БНФ быў абраны Зянон Пазьняк.

БНФ як першая шырокая дэмакратычная арганізацыя адразу ж стаецца галоўным выказьнікам і арганізатарам дэмакратычных настрояў грамадзтва. Яшчэ аргкамітэтам БНФ 19.02.1989 быў арганізаваны першы апазыцыйны мітынг у Беларусі, дазволены ўладамі. Мітынг, які праходзіў пад гістарычнымі нацыянальнымі сьцягамі, сабраў каля 40 000 чалавек; прынятая на мітынгу рэзалюцыя патрабавала скасаваць замацаваную ў Канстытуцыі кіруючую ролю камуністычнай партыі. У тым жа годзе шэраг дэмакратычных кандыдатаў пры падтрымцы БНФ абіраюцца ў Вярхоўны Савет СССР. У 1990 годзе БНФ бярэ ўдзел у выбарах у прадстаўнічыя органы ўлады БССР. 25.02.1990 на арганізаваны БНФ мітынг пратэсту супраць недэмакратычнага правядзеньня выбараў прыйшло каля 100 000 чалавек. Пасьля выбараў у Вярхоўным Савеце ўтвараецца фракцыя БНФ — 37 чалавек з 345 дэпутатаў. Гэтыя суадносіны наўрад ці адлюстроўваюць рэальную папулярнасьць БНФ на той час з прычыны шматлікіх фальсыфікацыяў падчас выбараў.

Фракцыя БНФ у парлямэнце, дзе пераважная бальшыня дэпутатаў была камуністамі, утварыла ядро дэмакратычнай апазыцыі. Сябры фракцыі БНФ ініцыююць прыняцьцё Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Беларусі, наданьне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы, абвяшчэньне незалежнасьці Беларусі. Нягледзячы на колькасную перавагу камуністаў у парлямэнце, пасьля паразы жнівеньскага путчу ў Маскве дэпутатам ад БНФ нават удалося дабіцца часовага прыпыненьня дзейнасьці Камуністычнай партыі Беларусі. Адзначаючы посьпехі БНФ пачатку 1990-х, трэба сказаць, што яны сталі магчымымі ў першую чаргу дзякуючы разьвіцьцю падзеяў у іншых краінах былога СССР. Шлях Беларусі да незалежнасьці паўтараў шлях да незалежнасьці Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны — са спазьненьнем і зь меншай інтэнсіўнасьцю падзеяў.

На пачатку існаваньня БНФ былі розныя думкі што да таго, ці ёсьць БНФ палітычнай партыяй. Дэ-юрэ, БНФ партыяй ня быў. Аб гэтым казалі ягоныя кіраўнікі, нельга было назваць БНФ партыяй і паводле структуры, бо ягоны статут прадугледжваў калектыўнае сяброўства. Паводле статуту, БНФ зьяўляўся «грамадзка-палітычным рухам». Дэ-факта, БНФ ставіў палітычныя мэты і дзеля іх зьдзяйсьненьня браў удзел у выбарах — у мясцовыя Саветы народных дэпутатаў, у Вярхоўны Савет Беларусі 12 скліканьня, таму былі падставы ўважаць БНФ за палітычную партыю. Супярэчлівасьць афіцыйнага статусу і фактычнай дзейнасьці БНФ была зьнятая ў 1993 годзе праз заснаваньне Партыі БНФ, якая мусіла актыўна дзейнічаць падчас выбарчых кампаніяў. Такім чынам, ад 1993 году палітычныя функцыі

БНФ узяла на сябе Партыя БНФ, а культурніцкія функцыі засталіся за БНФ «Адраджэньне» як шырокім грамадзкім фронтам. Адылі рэальнага арганізацыйнага адмежаваньня партыі ад фронту ў 1993 годзе ўсё ж не адбылося.

У 1992 годзе БНФ зазнае першую паразу. БНФ ініцыяваў збор подпісаў за датэрміновыя выбары новага Вярхоўнага Савету, але нягледзячы на тое, што было сабрана больш за 400 000 подпісаў грамадзянаў, Вярхоўны Савет адмаўляецца прыняць адпаведную пастанову. Прыкладна ад гэтага часу ўплыў БНФ пачынае аслабляцца. Пасьля рэваншу намэнклятуры на чале з В.Кебічам — адстаўкі С.Шушкевіча з пасады старшыні парлямэнту — улады пачынаюць у падкантрольных ім сродках масавай інфармацыі маштабную кампанію па дыскрэдытацыі ня толькі БНФ і ягоных лідэраў, але і саміх мэтаў і гістарычных ідэалаў нацыянальна-дэмакратычнага руху. З абраньнем А.Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта гэтая кампанія ўзмацняецца яшчэ больш. У 1995 годзе ў Вярхоўны Савет Беларусі 13 скліканьня ня трапіў ніводзін кандыдат ад БНФ. Як і ў часе папярэдніх выбараў, і нават у большай ступені, кандыдаты ад БНФ сутыкаліся зь вялікімі перашкодамі з боку ўладаў; але гэтым разам няўдалыя для БНФ вынікі выбараў тлумачацца яшчэ і ўзмацненьнем настальгічных прасавецкіх настрояў у грамадзтве ў зьвязку з пагаршэньнем эканамічнага становішча. БНФ прапанаваў лібэральную эканамічную праграму, пэрспэктыўны балта-чарнаморскі вэктар вонкавай эканамічнай палітыкі — але ня здолеў прапанаваць нічога прывабнага для масавай сьвядомасьці постсавецкага беларускага грамадзтва, якому быў уласьцівы катастрафічна нізкі ўзровень гуманітарнай адукацыі і нацыянальнай самасьвядомасьці. (У цэлым па краіне БНФ атрымаў каля 10% галасоў выбарцаў, адылі стойкія прыхільнікі БНФ становяць у краіне так званую структурную меншыню, якая пры мажарытарнай выбарчай сыстэме ня мае шанцаў на рэпрэзэнтацыю сваіх інтарэсаў у прадстаўнічых органах улады.) Ад 1995 году БНФ перастае быць адзінаасобным лідэрам дэмакратычных сілаў Беларусі — у парлямэнце гэтыя сілы прадстаўленыя фракцыяй «Грамадзянскае дзеяньне», аснову якой складаюць чальцы Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

З прычыны нездавальняючых для БНФ вынікаў парлямэнцкіх выбараў 10 чэрвеня 1995 году на сойме БНФ падалі ў адстаўку В.Вячорка — старшыня палітычнай камісіі БНФ, У. Анцулевіч — старшыня выбарчай камісіі БНФ, і Л.Баршчэўскі — сябра палітычнай камісіі БНФ. На тым жа сойме Ю.Хадыка, намесьнік старшыні БНФ, прапанаваў разьдзяліць партыю і рух. На думку Хадыкі, партыя мусіла мець большую свабоду дзеяньняў, актыўна супрацоўнічаць зь іншымі дэмакратычнымі партыямі. Ён прыпускаў, што партыя і рух могуць мець кожны свайго лідэра і што партыя нават можа зьмяніць імя. В.Вячорка яго падтрымаў, выказаўшы меркаваньне аб тым, што БНФ мусіць заставацца носьбітам нацыянальнай ідэі як грамадзкі рух, а партыя павінна стаць выяўна палітычнай сілай з кансэрватыўнай ідэалёгіяй. Гэтыя прапановы не былі падтрыманыя лідэрам фронту З.Пазьняком і не былі прынятыя. Рознасьць паглядаў у кіраўніцтве БНФ, якая яскрава выявілася на тым сойме, урэшце прывяла да расколу фронту.

У 1996 годзе роля БНФ у палітычным жыцьці краіны зноў павялічваецца. Рэжым Лукашэнкі ўстанаўлівае жорсткі кантроль над электроннымі СМІ і дзяржаўнай прэсай, дэмакратычныя сілы вымушаны зьвяртацца да грамадзкасьці праз улёткі, праз масавыя вулічныя акцыі пратэсту. На той час БНФ быў адзінай палітычнай партыяй, якая мае досьвед арганізацыі такіх акцыяў, досьвед супраціву таталітарнаму рэжыму. У гэтым жа годзе рэзка ўзрастае значнасьць і вядомасьць моладзевай фракцыі БНФ — «Маладога фронту», чальцы якога

найбольш актыўна ўдзельнічаюць у вулічных акцыях.

У 1996 годзе старшыня БНФ Зянон Пазьняк быў вымушаны зьехаць зь Беларусі, бо, на ягоную думку, існавала рэальная пагроза ягонаму жыцьцю, якая зыходзіла з боку ўладаў. Пры гэтым намінальна ён заставаўся кіраўніком БНФ, а на пасаду выканаўцы абавязкаў старшыні ў Беларусі быў прызначаны Лявон Баршчэўскі. У наступныя некалькі гадоў розьнасьць паглядаў кіраўнікоў БНФ перарастае ў сапраўдны канфлікт паміж «палітыкамі сумленьня», якія ўважаюць дапасаваньне рыторыкі БНФ да рэальных умоваў за здраду сваіх перакананьняў, і «палітыкамі адказнасьці», якія гатовыя да пэўных кампрамісаў зь іншымі апазыцыйнымі сіламі і з самімі сабой дзеля дасягненьня першачарговай мэты: усталяваньня дэмакратычнага ладу ў краіне. Гэты канфлікт сягае свайго апагею падчас і пасьля альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў 16 траўня 1999 году. Кандыдатамі ў прэзыдэнты на гэтых выбарах былі З.Пазьняк і М.Чыгір, а разгалінаваная рэгіянальная структура БНФ выкарыстоўвалася для стварэньня выбарчых камісіяў на месцах. Арганізаваць паўнавартыя дэмакратычныя выбары ўва ўмовах дыктатуры было немагчыма. Фактычна, гэта была своеасаблівая мабілізацыйная акцыя, акцыя грамадзкага непадпарадкаваньня, якая мусіла паказаць, што вялікая колькасьць грамадзянаў не падтрымлівае і ня лічыць легітымнай уладу Лукашэнкі. Выбары канча губляюць сэнс пасьля таго, як З.Пазьняк здымае сваю кандыдатуру на падставе «шматлікіх парушэньняў» у цягу падрыхтоўкі выбараў. Большая частка лідэраў БНФ рэзка крытыкуе гэтае рашэньне, іншая частка падтрымлівае яго і заклікае сяброў выбарчых камісіяў зь ліку БНФ выходзіць зь іх складу і сабатаваць іх працу. Ня могучы пасьпець за палётам думак кіраўніцтва, шмат хто адмовіўся гэта зрабіць. БНФ апынаецца на мяжы расколу.

31.7.1999 – 1.8.1999 адбыўся VI зьезд БНФ «Адраджэньне», пасьля якога Сойм БНФ і Сойм партыі БНФ прынялі рэзалюцыю аб недапушчальнасьці расколу і прызначылі на 30–31 кастрычніка 2 сэсію зьезду. Адылі і ў кастрычніку дасягнуць згоды не ўдаецца. У выніку, на пасаду старшыні БНФ «Адраджэньне» быў абраны адзін з апанэнтаў З. Пазьняка Вінцук Вячорка, а радыкальнейшая частка БНФ на чале з З. Пазьняком, Ю. Беленькім і С. Папковым утварыла асобную партыю — Кансэрватыўна-хрысьціянскую партыю БНФ (КХП БНФ).

БНФ «Адраджэньне» пад кіраўніцтвам В. Вячоркі зьбліжаецца з АГП; гэтыя дзьве партыі найбольш актыўна працуюць у КРДС. У 2001 годзе структуры БНФ працуюць на вылучэньне кандыдатам у прэзыдэнты Сямёна Домаша, пасьля — адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў Уладзімера Ганчарыка. У пачатку 2002 г. у партыі БНФ было 1259 членаў. У 2003 г. 11 зь іх патрапілі ў мясцовыя саветы, а кіраўнік Берасьцейскай абласной суполкі Юрась Губарэвіч на некалькі месяцаў нават стаў намесьнікам старшыні гарадзкога савету Белаазерску (Бярозаўскі раён). У тым жа годзе ад партыі адкалоліся прыхільнікі Вячаслава Сіўчыка і Паўла Севярынца, што аслабіла яе пазыцыі на правым флянгу палітычнага спэктру. У 2004 г. ніводзін кандыдат ад БНФ ня здолеў трапіць у палату прадстаўнікоў. У 2005 г. сойм партыі прыняў рашэньне падтрымаць кандыдатуру беспартыйнага Аляксандра Мілінкевіча на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г.

Кіраўнікі БНФ традыцыйна называюць сваю партыю вядучай апазыцыйнай сілай. Дзеля ўзмацненьня ўплыву на грамадзтва ў канцы 2005 г. была створана ўнутрыпартыйная арганізацыя «Моладзь БНФ». Неафіцыйны сайт БНФ – http://bnf.ukrbiz.net.

## Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ (КХП БНФ)

КХП БНФ (інтэрнэт-старонкі http://www.bpfs.boom.ru, www.pbpf.org) была зарэгістраваная Міністэрствам юстыцыі Беларусі 28.02.2000, неўзабаве пасьля расколу БНФ «Адраджэньне». КХП БНФ абвясьціла сябе пераемніцай Партыі БНФ. Старшыня партыі — Зянон Пазьняк, ініцыятар стварэньня і ў 1989–1999 гадах лідэр БНФ «Адраджэньне», які ад траўня 1996 году знаходзіцца ў вымушанай палітычнай эміграцыі.

Бадай, галоўная розьніца паміж дзьвюма пераемніцамі БНФ «Адраджэньне» — партыямі Вячоркі і Пазьняка — сфармуляваная ў праграме КХП БНФ у палажэньні аб дачыненьнях з палітычнымі, грамадзкімі арганізацыямі і структурамі ўлады: «КХП БНФ ня ўдзельнічае ў надпартыйных (міжпартыйных) органах, створаных іншымі грамадзка-палітычнымі сіламі. Сябры партыі дзейнічаюць па палітычных пытаньнях толькі ад імя сваёй партыі». Наступны пункт, праўда, утрымлівае засьцярогу: «КХП БНФ непасрэдна каардынуе свае дзеяньні і ўлічвае дзеяньні іншых партыяў і арганізацыяў».

Першым палітычным захадам КХП БНФ было абвяшчэньне акцыі «Беларуская салідарнасьць», якая мусіла ўключаць у сябе зьбіраньне подпісаў пад непрызнаньнем дамоваў Б.Ельцына і А. Лукашэнкі аб саюзе Беларусі і Расіі, запіс у грамадзянства БНР, масавыя вулічныя акцыі пратэсту — усё гэта БНФ пачынаў рабіць да расколу.

У 2001 годзе лідэр КХП БНФ З.Пазьняк спрабуе ўзяць удзел у прэзыдэнцкіх выбарах, што нават сярод ягоных традыцыйных прыхільнікаў выклікае неадназначную рэакцыю. Шмат хто выказвае трывогу, што ягоная непрахадная кандыдатура (паводле сацапытаньняў, З. Пазьняк — адзіны палітык, чый адмоўны рэйтынг складае больш за 50%) згуляе на руку Лукашэнку, дапаможа яму разьбіць пратэстныя галасы і правесьці ў другі тур выбараў квазіапазыцыйнага «кішэннага» кандыдата. Выбары для Пазьняка скончыліся на этапе збору подпісаў: яго група падтрымкі ня здолела сабраць дастатковую для рэгістрацыі колькасьць.

Нягледзячы на крыўдны вынік прэзыдэнцкай кампаніі і традыцыйна высокі адмоўны рэйтынг лідэра ў беларускім грамадзтве, партыя КХП БНФ да сёньня (пачатак 2006 г.) грунтуе сваю ідэалёгію перадусім на закліках З.Пазьняка. Пасьля выбараў 2001 году З.Пазьняк неаднойчы абвінавачваў дзеячоў БНФ, АГП, дэпутатаў з групы «Рэспубліка» у здрадзе інтарэсаў Беларусі, што прывяло да фактычнай маргіналізацыі КХП БНФ. У сьнежні 2002 году партыя прыняла адозву дзеля байкоту мясцовых выбараў, у 2004 г. байкатавала выбары ў палату прадстаўнікоў.

Тым ня менш, КХП-БНФ застаецца важным гульцом на беларускім палітычным полі. У пачатку 2002 г. у ёй налічвалася больш за 1200 сяброў. Гэта адзіная апазыцыйная партыя (апрача ЛДП, чыя апазыцыйнасьць выклікае сумневы), якая наважылася выставіць свайго кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах як у 2001, так і ў 2006 гадох.

## Лібэральна-дэмакратычная партыя (ЛДП)

Лібэральна-дэмакратычная партыя Беларусі была заснаваная ў лютым 1994 году на ўзор і пры падтрымцы расійскай Лібэральна-дэмакратычнай партыі У. Жырыноўскага. Паводле праграмы, прынятай на ўстаноўчым зьезьдзе партыі, ЛДП мусіла «супрацьстаяць нацыянал-

дэмакратам, вінаватым у развале адзінай саюзнай дзяржавы».

ЛДП — гэта выразна пэрсаналісцкая партыя. Ейная палітыка цалкам вызначаецца ейным лідэрам (старшынём вышэйшай рады) Сяргеем Гайдукевічам. ЛДП ня мае пэўнай акрэсьленай ідэалёгіі, а падхоплівае любыя лёзунгі, якія, на думку Гайдукевіча, могуць паспрыяць падвышэньню папулярнасьці партыі і ейнага лідэра ў пэўны момант часу. Пры гэтым Гайдукевіча мала абыходзіць, што гэтыя лёзунгі часта ёсьць супрацьлеглымі. (Напрыклад: у кастрычніку 1998 году ЛДП высоўвала ініцыятыву правесьці рэфэрэндум па пытаньні стварэньня канфэдэрацыі з Расіяй. Абгрунтоўваючы неабходнасьць рэфэрэндуму, Гайдукевіч тады казаў пра блізіню беларускага і расійскага народаў, пра вялікую эканамічную і палітычную карысьць ад стварэньня канфэдэрацыі. Тады Мінюст адмовіўся зарэгістраваць ініцыятыўную групу па правядзеньні рэфэрэндуму, і вось праз год Гайдукевіч ужо тлумачыць: «...почему власти не дали провести этот плебисцит? Да потому что они прекрасно понимали: коллективное мнение народных масс было бы не в их пользу. Народу надоели сладкоголосые обещания неизвестно чего под эгидой Москвы. Ведь наша партия и хотела спровоцировать вполне закономерное отторжение идеи бессмысленного и никому, по большому счету, не нужного объединения».)

На пачатку ЛДП успрымалася як філія партыі Жырыноўскага, які ў 1994 годзе карыстаўся вялікай папулярнасьцю ў Расіі і сярод расійскага ці русіфікаванага насельніцтва іншых былых рэспублік СССР. Адылі зь цягам часу папулярнасьць Жырыноўскага зьмяншаецца, і С. Гайдукевіч пачынае дыстанцыявацца ад ЛДПР і Жырыноўскага.

У лістападзе 1996 году Гайдукевіч стрымана падтрымаў дзеяньні Лукашэнкі. У наступныя гады ЛДП мітусіцца паміж антызаходнімі, панславісцкімі лёзунгамі, падтрымкай Лукашэнкі і спробамі супрацоўніцтва з дэмакратычнай апазыцыяй.

У 2001 годзе Гайдукевіч абвяшчае аб сваім намеры змагацца за пасаду прэзыдэнта. Ён накіроўвае Лукашэнку адкрыты ліст, у якім абвінавачвае Лукашэнку ў «прымітыўным папулізьме», падкрэсьлівае ягоную нелегітымнасьць і заклікае яго добраахвотна пайсьці ў адстаўку. Досыць абразьлівы зьмест ліста, здаецца, ужо не пакідае Гайдукевічу шляху назад. Напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў Гайдукевіч даслаў яшчэ больш абразьлівы адкрыты ліст адзінаму кандыдату дэмсілаў Ганчарыку, у якім у брутальнай форме запатрабаваў зьняцьця яго кандыдатуры (апублікаваны ў газеце лукашэнкаўскай адміністрацыі «Советская Белоруссия»). Назіральнікамі гэта было праінтэрпрэтавана як сьведачаньне таго, што паміж Лукашэнкам і Гайдукевічам быў укладзены тайны перадвыбарны альянс. Адразу пасьля выбараў 9 верасьня 2001 году Гайдукевіч павіншаваў Лукашэнку з абраньнем.

У верасьні 2003 году адбыўся зьезд ЛДП, на якім частка дэлегатаў, падтрыманая бліжэйшымі паплечнікамі С. Гайдукевіча, выказала недавер лідэру. Аднак Міністэрства юстыцыі пастанавіла, што адхіленьне Гайдукевіча ад пасады было нелегітымнае. У 2004 годзе ён, адзіны з шматлікіх прэтэндэнтаў ад ЛДП, быў абраны ў палату прадстаўнікоў. У сьнежні 2005 году ініцыятыўная група за вылучэньне С. Гайдукевіча кандыдатам у прэзыдэнты была зарэгістраваная Цэнтравыбаркамам.

Паводле кіраўніцтва ЛДП, гэтая партыя мае найбольшую з усіх палітычных партый колькасьць сяброў — каля 20 000. У пачатку 2002 году называлася нават лічба 45855 сяброў. Інтэрнэт-старонка партыі – http://ldpb.net.

## Партыя камуністаў беларуская (ПКБ)

Старшыня партыі (першы сакратар) — Сяргей Калякін. Партыя камуністаў беларуская была заснаваная як пераемніца Камуністычнай партыі Беларусі, якая існавала ў БССР. Пасьля паразы жнівеньскага путчу 1991 году ў Маскве дзейнасьць Камуністычнай партыі Беларусі была часова прыпыненая пастановай Вярхоўнага Савету Беларусі. Адылі ўжо 26 кастрычніка 1991 году быў створаны ініцыятыўны камітэт па ўзнаўленьні дзейнасьці камуністычнай партыі, які неўзабаве быў ператвораны ў арганізацыйны камітэт па скліканьні ўстаноўчага зьезду новай камуністычнай партыі з новай назвай. 6 сьнежня 1991 году ў Менску пачаўся ўстаноўчы зьезд, на якім былі прынятыя статут, праграмная заява, былі абраныя органы кіраваньня. Міністэрства юстыцыі марудзіла з рэгістрацыяй партыі на падставе неадпаведнасьці заканадаўству ейнага статуту, але пасьля адпаведнага рашэньня Вярхоўнага суду ўсё ж зарэгістравала яе. Актывісты ПКБ увайшлі ў арганізацыйныя камітэты, якія вэрбавалі сяброў новай партыі шляхам перарэгістрацыі членаў былой КПСС. Праз год ПКБ ужо мела абласныя арганізацыі ўва ўсіх абласьцях Беларусі, а таксама менскую гарадзкую, 130 іншых гарадзкіх і раённых партыйных арганізацыяў.

3 лютага 1993 году Вярхоўны Савет 12 скліканьня скасаваў сваю пастанову аб часовым прыпыненьні дзейнасьці Камуністычнай партыі Беларусі. У сакавіку 1993 году ЦК Камуністычнай партыі Беларусі склікаў 32 пазачарговы зьезд партыі, які адбыўся пры падтрымцы ПКБ. 25 красавіка зьезд КПБ прыняў рашэньне аб уваходзе партыі ў склад ПКБ.

Падчас дыскусіяў аб дарэчнасьці пасады прэзыдэнта ў Беларусі ПКБ выступала супраць уводжаньня інстытута прэзыдэнцтва як «буржуазнай формы кіраваньня», адылі ў парлямэнце супраць прагаласаваў толькі лідэр фракцыі ПКБ. Жаданьне захаваць і ўзмацніць уладу нефармальнай партыі намэнклятуры, зь якой паходзіла вялікая частка дэпутатаў-камуністаў, было мацнейшым за камуністычную партыйную дысцыпліну: сябры фракцыі камуністаў прагаласавалі за інстытут прэзыдэнцтва, бо былі ўпэўненыя, што прэзыдэнтам будзе намэнклятурны лідэр В.Кебіч.

Калі інстытут прэзыдэнцтва ўсё-ткі быў уведзены, ПКБ вырашыла ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах (апраўдваючыся «гістарычным вопытам бальшавікоў», якія бралі ўдзел у выбарах у расійскую царскую Дзяржаўную думу, і словамі У.Леніна аб неабходнасьці выкарыстоўваць усе магчымасьці для прапаганды). У сакавіку 1994 году пленум ЦК вылучыў кандыдатам Васіля Новікава, сакратара ЦК. На выбарах Новікаў заняў апошняе месца, набраўшы толькі 4,6 % галасоў — рэкордна мала ў параўнаньні з камуністычнымі кандыдатамі ў іншых постсавецкіх краінах. Але тлумачыцца гэты рэкорд, парадаксальным чынам, якраз папулярнасьцю левых лёзунгаў у Беларусі: на галасы левага электарату прэтэндавалі адразу чатыры кандыдаты (Кебіч, Лукашэнка, Дубко, Новікаў).

Пасьля другога туру выбараў камуністы віталі перамогу Лукашэнкі, павіншавалі яго і абвясьцілі, што гатовыя яго падтрымліваць, бо ён ішоў на выбары пад сацыялістычнымі і інтэграцыйнымі лёзунгамі. Лукашэнка, аднак, патрэбы ў такой падтрымцы ня меў, і партыяй улады ПКБ ня стала.

На выбарах у Вярхоўны Савет 13 скліканьня ў траўні 1995 году кандыдаты ад ПКБ, абапіраючыся на настальгічныя настроі прасавецкай старэйшай часткі выбарцаў, атрымалі больш за 22% месцаў у парлямэнце. Напачатку камуністы ўсё ж падтрымліваюць Лукашэнку, асаб-

ліва ягоныя захады дзеля інтэграцыі з Расіяй. Адылі наступ на свабоду слова, усталяваньне асабістай дыктатуры прымушае ПКБ стаць у апазыцыю прэзыдэнту, бо ягоная палітыка пагражае існаваньню партыяў як такіх, і ніякіх прэфэрэнцыяў для ПКБ тут ня робіцца. У ліпені 1996 году пленум ЦК ПКБ заявіў, што лічыць немагчымым далей падтрымліваць унутрыпалітычны і сацыяльна-эканамічны курс прэзыдэнта. Зь пераходам левых — ПКБ і Аграрнай партыі — у адкрытую апазыцыю да Лукашэнкі паўстае рэальная пагроза імпічмэнту.

Найбольш бескампрамісная частка ПКБ, якая марыла пра аднаўленьне СССР і ўважала за недапушчальныя любыя пагадненьні з нацыянал-дэмакратамі, выступіла з рэзкай крытыкай такога рашэньня кіраўніцтва, у тым ліку ў партыйнай газэце «Товарищ», выдаванай ПКБ ад сьнежня 1994 году. У партыі пачынаецца канфлікт, які адміністрацыя Лукашэнкі выкарыстоўвае ў сваіх мэтах — дзеля дэзарыентацыі грамадзянаў, якія маюць звычку галасаваць за камуністаў (чытай: за СССР), ствараецца камуністычная квазіпартыя. Напярэдадні рэфэрэндуму 1996 году адбываецца першы, «аднаўляльны» зьезд Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ), на якім дэлегаты ганяць кіраўніцтва ПКБ за змову з «радыкальна-нацыяналістычнымі сіламі» і выказваюць падтрымку ініцыятывам прэзыдэнта. Са 1134 чалавек, якія выступаюць у ролі арганізатараў КПБ, каля 60% маюць больш за 60 гадоў.

Калі Лукашэнка разганяе Вярхоўны Савет 13 скліканьня і прызначае новы «парлямэнт» — Нацыянальны сход, з 45 сяброў фракцыі камуністаў 24 пераходзяць у гэты орган.

Усталяваньне аўтарытарнага праўленьня Лукашэнкі і канстытуцыйны пераварот 1996 году адбіліся на ПКБ, бадай, мацней за іншыя партыі. Стварэньне новай-старой Камуністычнай партыі Беларусі сталася цяжкім ударам для ПКБ. У 1997 годзе ПКБ згубіла больш за 4000 сяброў, да пачатку 1998 году спынілі сваю дзейнасьць 18 гарадзкіх і раённых арганізацыяў ПКБ. У 1994 годзе камуністы ўзначальвалі 25 гарадзкіх і раённых органаў кіраваньня — пасьля 1996 году ўсе яны альбо выйшлі з партыі, альбо былі зьнятыя з пасадаў. Аднак адначасова раскол камуністычнай партыі паспрыяў эвалюцыі ПКБ у палітычную партыю ўва ўласным сэнсе слова. У першыя гады сваёй дзейнасьці адроджаная камуністычная партыя арыентавалася на настальгічна настроены электарат, людзей старэйшага веку; у вялікай меры партыя захоўвала старую, савецкую рыторыку, якая зь цягам часу гучала ўсё больш архаічна і не магла прывабіць да партыі новых чальцоў і выбарцаў. Цяпер, ня маючы больш манаполіі на настальгію па СССР, ані дзяржаўнай падтрымкі, ПКБ мусіла прапагандаваць сябе і свае ідэі іншымі спосабамі, мадыфікаваць свае ідэалы, вучыцца супрацоўнічаць зь іншымі палітычнымі сіламі — чаго камуністам раней рабіць не даводзілася. Паказальная вытрымка з заключнага слова лідэра партыі С. Калякіна на 5 зьезьдзе ПКБ (6–8 сакавіка 1999 году): «Час ужо нам перастаць баяцца абвінавачваньняў накшталт: ня там стаў, ня з тымі сеў. Палітык, а такім ёсьць кожны камуніст, мусіць быць гатовы, што яго будуць паліваць брудам... Калі не пераадолеем сумневаў і страху — зноў апынемся ў хвасьце падзеяў». (Маюцца на ўвазе абвінавачваньні ў здрадзе камуністычным ідэалам праз супрацоўніцтва з правымі.) ПКБ удзельнічала ў перамовах палітычнай апазыцыі з уладамі і ўвайшла ў Кансультацыйную раду апазыцыйных палітычных партыяў, але не ўвайшла ў КРДС.

Досьвед барацьбы дыктатарам-папулістам зрабіў ПКБ больш дэмакратычнай, чым падобныя партыі ў суседніх Расіі і Ўкраіне. У 2001 годзе С. Калякін уваходзіць у пяцёрку патэнцыйных кандыдатаў у прэзыдэнты, якія дамовілася аб каардынацыі сваіх дзеяньняў дзеля ліквідацыі аўтарытарнага рэжыму, і ў ходзе перадвыбарнай кампаніі ўжо кажа аб тым, што ідэалам ягонай партыі ёсьць не БССР, а Эўразьвяз.

Найбольшую колькасьць сяброў ПКБ мела ў 1996 годзе, перад расколам — каля 18 000. На 1.1.1999 у ПКБ было 9237 сяброў партыі, 119 раённых, 19 гарадзкіх, 534 пярвічных арганізацыяў. У пачатку 2002 г., паводле Міністэрства юстыцыі, у ПКБ уваходзілі 7878 чалавек.

У 2003 г. партыйнае кіраўніцтва далучылася да апазыцыйнай кааліцыі «Пяцёрка-плюс». Вылучэнцы ПКБ актыўна ўдзельнічалі ў мясцовых выбарах 2003 г. і парлямэнцкіх выбарах 2004 г. На першых яны дабіліся пэўных посьпехаў: пры 173 кандыдатах ад ПКБ месцы ў мясцовых саветах атрымалі 78, што перавышае колькасьць дэпутатаў ад усіх іншых апазыцыйных партыяў, разам узятых. На другіх не атрымалі ніводнага мандату, дарма што мелі адносна добрае, у параўнаньні з іншымі апазыцыянэрамі, прадстаўніцтва ў акруговых камісіях: 19 чальцоў.

ПКБ узяла чынны ўдзел у падрыхтоўцы Кангрэсу дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 году і вылучыла свайго лідэра на ролю «адзінага кандыдата», аднак паводле вынікаў галасаваньня С. Калякін заняў трэцяе месца (пасьля А. Мілінкевіча і А. Лябедзькі). Нягледзячы на пэўны супраціў «правіцы», ён узначаліў перадвыбарны штаб А. Мілінкевіча. Кіраўніком справамі ў штабе таксама стаў адзін зь лідэраў ПКБ, В. Ухналёў, а рэдактар газэты ПКБ «Товарищ» С. Вазьняк узначаліў прэс-групу А. Мілінкевіча.

Можна прыпусьціць, што, незалежна ад вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 2006 г., ПКБ захаваецца як сур'ёзная палітычная сіла, якая ўмела эксплюатуе настальгію па страчаным у савецкія часы дабрабыце (на гэтую эксплюатацыю паказваюць захаваньне слова «камуністычная» у назове партыі і найменьне моладзевай арганізацыі ПКБ «Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі»).

## Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды (СДПНЗ, або Партыя народнай згоды)

Створана і зарэгістравана ў 1997 г., перарэгістравана ў 1999 г., лічыць сябе пераемніцай Партыі народнай згоды (1992-1996). Старшыня – Сяргей Ярмак. У якасьці мэтаў абвяшчае «правядзеньне дэмакратычных рэформаў, пабудову цывілізаванай прававой дзяржавы». Утвораная былымі чальцамі БСДП (НГ), нязгоднымі з апазыцыйным курсам, узятым кіраўніцтвам гэтай партыі ў сувязі з падзеямі восені 1996 г. (першы старшыня СДПНЗ – Леанід Сечка, былы лідэр ПНЗ і кіраўнік фракцыі БСДП у ВС 13 скліканьня, быў выключаны з БСДП у сьнежні 1996 г. за калябарацыю з рэжымам). Абвясьціла сябе цэнтрысцкай партыяй. Доўгі час не знаходзіла ідэалягічнай «нішы» (асноўная мэта фармулявалася расплывіста – «дасягненьне згоды ў грамадстве»). Аднак у палаце прадстаўнікоў у 2000-2004 гадох мела прадстаўніка – Івана Пашкевіча. У пачатку лютага 2002 г. дэкляравала наяўнасьць 2881 сябра. На выбарах 2004 г. у палату прадстаўнікоў таксама вылучаліся прадстаўнікі СДПНЗ, аднак ніводзін зь іх не дабіўся месца ў парлямэнце.

## Прапрэзыдэнцкія партыі

Беларуская патрыятычная партыя, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці, Славянскі Сабор «Белая Русь» (у дадзены момант не існуе), Камуністычная партыя Беларусі,

Аграрная партыя (пасьля 4 зьезду ў 2000 г.), Беларуская сацыяльна-спартовая партыя, а таксама Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці — «прыдворныя партыі», якія пасьлядоўна падтрымліваюць дзеяньні Лукашэнкі, абслугоўваюць ідэалягічныя патрэбы рэжыму. Так, кіраўнікі КПБ, Рэспубліканскай партыі, Аграрнай партыі, Беларускай патрыятычнай партыі, Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасьці, Беларускай сацыяльна-спартовай партыі ўжо 8 верасьня 2004 году ў спэцыяльнай адозьве ўхвалілі рэфэрэндум аб падаўжэньні паўнамоцтваў А. Лукашэнкі (абвешчаны 7 верасьня).

Да атрыманьня ўлады гэтыя партыі, як правіла, не імкнуцца. Выключэньне складаюць КПБ і, у меншай ступені, Сацыяльна-спартовая партыя (ейны лідэр, бізнэсовец Уладзімер Александровіч, засядаў у палаце прадстаўнікоў у 2000-2004 гадох). Носьбіты панславісцкай (як былы Славянскі Сабор «Белая Русь», Беларуская патрыятычная партыя) альбо скрайне левай ідэалёгіі (Камуністычная партыя Беларусі). Існаваньне гэтых партыяў служыць пераважна прыкрыцьцю дыктатуры.

## СЬПІС БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТЫКАЎ

**Абрамава Вольга**

Нарадзілася 19 верасьня 1953 году ў г. Менску. Атрымала гуманітарную адукацыю, выкладала ў ВНУ. Дэпутат ВС 13 скліканьня (сакратар сталай Камісіі па міжнародных справах). Выступала супраць беларусізацыі сыстэмы асьветы, рэзка выказвалася супраць Закону Беларускай ССР аб мовах у Беларускай ССР, прынятага 26 студзеня 1990 году на 14 сэсіі Вярхоўнага Савету БССР 11 скліканьня. Увосень 1996 г. выступала за імпічмэнт прэзыдэнта Лукашэнкі, аднак пасьля роспуску Вярхоўнага Савету жорстка крытыкавала і апазыцыю. У канцы 1990-х гадоў ачоліла рух расійскамоўных дэмакратаў «Яблык» у Беларусі. У 2000 годзе была абрана ў палату прадстаўнікоў нацыянальнага сходу, у 2004 г. ізноў стала дэпутаткай ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту, дзе традыцыйна дэманструе «памяркоўную апазыцыйнасьць» (выказвалася супраць асобных рэпрэсыўных актаў выканаўчай улады).

**Абрамовіч Аляксандар**

Нарадзіўся 10 красавіка 1944 году ў вёсцы Забалоцьце Нясьвіскага раёну. Скончыў Наваградзкі сельскагаспадарчы тэхнікум, працаваў аграномам, інструктарам Лідзкага райвыканкаму. Атрымаў юрыдычную адукацыю ў БДУ, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысэртацыі. Рыхтаваў славуты «Закон аб мовах у БССР», прыняты 26 студзеня 1990 году. У 1990-91 гг. працаваў у Камітэце канстытуцыйнага нагляду СССР. З 1992 г. чалец, а ў 1994-96 гг. кіраўнік Цэнтравыбаркаму Беларусі. Са студзеня 1996 г. па лістапад 2004 г. – намесьнік старшыні адміністрацыі прэзыдэнта. Адзін з ініцыятараў рэфэрэндуму і аўтараў праекту прэзыдэнцкага варыянту канстытуцыі ўзору 1996 г. 15 лістапада 2004 г. абраны намесьнікам старшыні рады рэспублікі (верхняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту).

**Андрэйчанка Ўладзімер**

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 году ў вёсцы Мар’янава Лёзьненскага раёну. Па спэцыяльнасьці аграном. Пасьля працы ў калгасе быў прызначаны першым сакратаром Верхнядзьві-

нскага райкаму партыі. Закончыў Менскую вышэйшую партыйную школу. У дадзены момант — старшыня Віцебскага аблвыканкаму.

**Антановіч Іван**

Нарадзіўся 3 красавіка 1937 году ў вёсцы Домашы Ляхавіцкага раёну. Па адукацыі перакладнік. У 1977–1987 гг. — функцыянэр камуністычнай партыі (з 1979 г. загадчык аддзелу культуры ЦК КПБ). Сакратар і чалец Палітбюро ЦК Кампартыі РСФСР (1990–1991). Пасьля абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі вярнуўся на бацькаўшчыну. У 1993–1995 гг. — дырэктар Беларускага інстытуту навукова-тэхнічнай інфармацыі й прагнозу, намесьнік міністра (1995–1997), міністар замежных справаў Беларусі (1997–1998). Пазьней выкладаў у менскім унівэрсытэце культуры. Цяпер жыве ў Расіі.

**Антончык Сяргей**

Нарадзіўся 1 красавіка 1956 году ў г.п. Плешчаніцы Лагойскага раёну. Працаваў на прыборабудаўнічым заводзе БелВАР. У 1990–1995 гг. — чалец фракцыі БНФ у ВС 12 скліканьня. Быў адным з арганізатараў веснавых страйкаў у Менску ў красавіку 1991 году. Аўтар скандальнага дакладу, у якім выкрываліся прэм'ер-міністар М. Чыгір і чыноўнікі з адміністрацыі Лукашэнкі (сьнежань 1994 г.). Падчас выбарчай кампаніі 2001 году заявіў аб сваім жаданьні заняць пасаду прэзыдэнта. Ня здолеўшы набраць патрэбнай колькасьці подпісаў, адмовіўся ад далейшага ўдзелу ў ёй і заклікаў сваіх выбарцаў аддаць свае галасы за Міхаіла Марыніча. У 2002-2004 гг. спрабаваў стварыць грамадзкую арганізацыю «Айчына» гуманітарнага і праваабарончага кірунку: паводле яго словаў, аргкамітэт меў прадстаўнікоў у 240 населеных пунктах Беларусі, а арганізацыя мелася аб'яднаць некалькі соцень тысяч чалавек. У 2004-2005 гг. улады неаднойчы перашкаджалі правядзеньню ўстаноўчага зьезду «Айчыны» у Менску, аштрафаваўшы С. Антончыка за «несанкцыянаваны сход» на прыватнай кватэры.

**Антусевіч Сяргей**

Нарадзіўся 16 жніўня 1973 году ў г. Берасьці. Старшыня суполкі незалежнага прафсаюзу на гарадзенскім прадпрыемстве «Гродна Азот», актывіст БНФ. У сакавіку 2003 г. у другім туры мясцовых выбараў быў абраны дэпутатам Гарадзенскага гарсавету. На выбарах у палату прадстаўнікоў, у час паўторнага галасаваньня ў сакавіку 2005 году, прайграў рэктару Гарадзенскага ўнівэрсытэту С. Маскевічу.

**Астапенка Анатоль**

Нарадзіўся 7 жніўня 1947 году. Па адукацыі фізык-тэарэтык. Кандыдат фізыка-матэматычных навук. У пачатку 1990-х гадоў быў сустаршынём Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, з 1994 г. – старшыня Нацыянальнай партыі, пазьней – намесьнік старшыні БСДГ (С. Шушкевіча). У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў у адной зь менскіх акругаў, па афіцыйных зьвестках здабыў 14% галасоў.

**Аўтуховіч Мікалай**

Нарадзіўся 7 верасьня 1963 году ў г. Ваўкавыску. Па прафэсіі трактарыст-машыніст. Удзельнік вайны ў Аўганістане, пасьля звальненьня з Узброеных сілаў у 1991 г. меў прыватны

бізнэс у Ваўкавыску. У пачатку 2000-х гадоў некалькі разоў вытрымліваў націск падатковай інспэкцыі. Разам з супрацоўнікамі ўласнай фірмы ладзіў пратэстовыя акцыі. У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў па Ваўкавыскай акрузе, паводле афіцыйных зьвестак, набраў 27,9% галасоў. У 2005 г. быў арыштаваны па абвінавачваньні ў эканамічных злачынствах. За кратамі абвясьціў працяглую галадоўку. Уцёк з–пад варты..

**Афанасьеў Марат**

Нарадзіўся 3 сакавіка 1946 году. Інжынэр, начальнік адзьдзелу Беларускага мэталюргічнага заводу. Быў дэпутатам ВС 13 скліканьня. Актывіст АГП. У сакавіку 2003 г. выбраны дэпутатам Жлобінскага раённага савету. У чэрвені 2003 году стаў адным з каардынатараў Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў. На парлямэнцкіх выбарах у 2004 годзе набраў, паводле афіцыйных крыніц, 11,9% галасоў.

**Багданкевіч Станіслаў**

Нарадзіўся 1 студзеня 1937 году ў вёсцы Шапавалы Валожынскага раёну. Атрымаў фінансава-эканамічную адукацыю. У 1981–1991 гг. — загадчык катэдры грашовага абарачэньня й крэдыту Беларускага інстытуту народнай гаспадаркі. У 1991–1995 гг. кіраўнік Нацыянальнага банку. Супрацьдзейнічаў ініцыяванаму ўрадам Кебіча аб’яднаньню грашовых сыстэм Беларусі і Расіі. Старшыня (1995-2000 гг.), ганаровы старшыня (з 2000 г.) Аб’яднанай грамадзянскай партыі Беларусі. У 2004 г. балятаваўся на выбарах у палату прадстаўнікоў па адной зь менскіх акругаў, аднак ня быў абраны.

**Багдановіч Марына**

Нарадзілася 13 ліпеня 1963 году ў Цьвярской вобласьці (Расія). Па адукацыі інжынэр-будаўнік і эканаміст-мэнэджэр. У 1990-я гг. працавала ў лідзкім будаўнічым трэсьце, была дэпутаткай гарсавету. З 2001 году – намесьніца старшыні, у дадзены момант – старшыня менскай абласной арганізацыі АГП. У чэрвені 2004 г. далучылася да галадоўкі дэпутатаў палаты прадстаўнікоў пад лёзунгам «Не трэцяму тэрміну!». Увосень 2004 г. спрабавала балятавацца ў палату прадстаўнікоў па Лідзкай акрузе (побач з С. Скрабцом), аднак была зьнятая з дыстанцыі акруговай камісіяй за «некарэктныя» выступленьні. Увесну 2005 г. намагалася арганізаваць пратэстовы рух прадпрымальнікаў супраць палітыкі ўраду. Атрымала вялізны штраф.

**Бандарэнка Зінаіда**

Нарадзілася 28 красавіка 1939 году ў г. Менску. Па адукацыі філёляг, настаўніца. Шмат гадоў была вядучай на Беларускім тэлебачаньні, народная артыстка Беларусі. Актывістка АГП. Удзельнічала ў парлямэнцкіх выбарах 2004 г., балятавалася па Смургонскай акрузе: паводле афіцыйных дадзеных, набрала толькі 5,6% галасоў.

**Баршчэўскі Лявон**

Нарадзіўся 4 сакавіка 1958 году ў г. Полацку. Па адукацыі перакладнік, працаваў школьным настаўнікам, выкладчыкам у інстытуце. У 1990–1995 гадох — чалец апазыцыі БНФ у ВС 12 скліканьня. З 1995 году намесьнік старшыні БНФ, пасьля эміграцыі Зянона Пазьняка некаторы час выконваў абавязкі старшыні БНФ. Быў актывістам передвыбарнай кампаніі

Сямёна Домаша ў 2001 г. У пачатку 2000-х гадоў адмовіўся ад актыўнага ўдзелу ў палітыцы, засяродзіўшыся на пэдагагічнай і грамадзкай дзейнасьці (у 2003-2005 гг. кіраваў беларускім ПЭН-цэнтрам, у 2004 г. далучыўся да грамадзянскай ініцыятывы «За справядлівыя выбары», узначаленай А. Вайтовічам). У дадзены момант — намесьнік дырэктара зачыненага ўладамі Беларускага ліцэю, ганаровы старшыня ПЭН-цэнтру.

**Батура Барыс**

Нарадзіўся 8 ліпеня 1947 году ў Ваўкавыску. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут (інжынэр-механік). Працаваў на кіроўных пасадах у сфэры жыльлёвай гаспадарцы. На момант абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі – міністар жыллёва-камунальнай гаспадарцы. Захоўваў гэтую пасаду да 1999 году. З чэрвеня 1999 г. да лістапада 2000 г. быў намесьнікам прэм’ер-міністра Беларусі. У лістападзе 2000 г. ачоліў Магілёўскі аблвыканкам і быў прызначаны А. Лукашэнкам у Савет рэспублікі.

**Бахун Сяргей**

Нарадзіўся ў 1976 годзе ў вёсцы Майсееўка Акцябрскага раёну. Па адукацыі настаўнік геаграфіі. Жыве ў Берасьці, дзе кіраваў мясцовай філіяй «Маладога фронту». З 2005 г. – сустаршыня «Маладога фронту» (разам з З. Дашкевічам). У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў ад партыі БНФ, аднак ня быў абраны (паводле афіцыйных зьвестак, набраў 8,9% галасоў).

**Бажэлка Алег**

Нарадзіўся 27 кастрычніка 1954 году. Пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах 1994 г. праявіў сябе яго гарачым прыхільнікам, за што атрымаў пасаду Генэральнага пракурора. 27 лістапада 2000 г. быў адпраўлены ў адстаўку ў сувязі з скандалам вакол «зьніклых» палітыкаў. Пераехаў у Расію, нібыта хаваючыся ад перасьледу, але ў 2001 годзе вярнуўся ў Беларусь. Зьяўляецца адным з галоўных патэнцыйных сьведкаў у палітычнай справе аб «выкраданьні людзей».

**Беленькі Юры**

Нарадзіўся 5 траўня 1960 году ў г. Менску. Па адукацыі фінансіст, працаваў у апараце міністэрства фінансаў, пасьля на прамысловых прадпрыемствах. Членец апазыцыі БНФ у ВС 12 скліканьня (працаваў у плянавай і бюджэтна-фінансавай камісіях). З 26.09.1999 г. намесьнік старшыні КХП БНФ. У адсутнасьць З.Пазьняка выконвае абавязкі старшыні партыі ў Беларусі.

**Булахаў Дзьмітры**

Нарадзіўся ў 1959 годзе. Па адукацыі юрыст, працаваў сьледчым, адвакатам. Быў дэпутатам ВС 12 скліканьня, кіраўніком камісіі па заканадаўстве, адным з распрацоўшчыкаў Канстытуцыі 1994 году. Спрычыніўся да зрыву рэфэрэндуму, ініцыяванага БНФ у 1992 г. У 1994 г. ачоліў ініцыятыўную групу за абраньне Лукашэнкі прэзыдэнтам. Пасьля перамогі Лукашэнкі быў прапанаваны апошнім на пасаду старшыні Канстытуцыйнага суда, але ВС адхіліў кандыдатуру Булахава. У 1995 г. сышоў з каманды Лукашэнкі. Пэўны час ачольваў эфэмэрную партыю Ўсебеларускага адзінства і згоды (ПУАЗ; ліквідаваная ў 1998 годзе). У 1996

годзе выказваўся супраць прэзыдэнцкага варыянта канстытуцыі, аднак урэшце парваў з апазыцыяй і ў сакавіку 2000 году ўказам прэзыдэнта быў прызначаны прадстаўніком Беларусі ў органах СНД. У чэрвені 2000 году стаў першым намесьнікам старшыні выканкаму СНД. На гэтай пасадзе працаваў да верасьня 2005 году.

**Бухвостаў Аляксандар**

Нарадзіўся 22 лістапада 1944 году ў г. Арле (Расія). Па адукацыі інжынэр. Доўгі час працаваў на заводзе сельскагаспадарчай тэхнікі «Гомсельмаш». Старшыня прафсаюзу работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудаваньня, сустаршыня Асацыяцыі незалежных прафсаюзаў прамысловасьці. З 1995 г. дэпутат ВС 13 склікаvarньня, члец сталай Камісіі па сацыяльнай палітыцы й працы. У 1993–1999 гг. — старшыня Беларускай партыі працы, з 1999 г. — лідэр БПП (зачыненай уладамі праз суд у жніўні 2004 г.). Падчас выбараў 2001 г. — давераная асоба У. Ганчарыка. Спрабаваў балятавацца ў палату прадстаўнікоў у 2004 г., быў адсеяны на этапе рэгістрацыі. У пачатку 2005 г. узначаліў арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы Кангрэсу дэмакратычных сілаў, а ў сьнежні 2005 г. стаў кіраўніком ініцыятыўнай групы за вылучэньне А. Мілінкевіча кандыдатам у прэзыдэнты.

**Бяляцкі Алесь**

Нарадзіўся 25 верасьня 1962 году ў сяле Вяртсіля Сартавальскага раёну (Расія). Па адукацыі беларускі філёляг. У 1991–1995 гг. — дэпутат Менскага гарадзкога Савету дэпутатаў. У 1996 г. стварыў і з 1998 году ўзначаліў праваабарончую арганізацыю «Вясна-96» (www.spring96.org), ліквідаваную ўладамі праз суд увосень 2003 г. У 1999-2001 гг. — намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне». Да 2004 году кіраваў рабочай групай незарэгістраванай Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацый Беларусі, з 2004 году – намесьнік кіраўніка рабочай групы. Увосень 2004 году прадстаўляў партыю БНФ у Цэнтравыбаркаме ў якасьці чальца з дарадчым голасам.

**Вайтовіч Аляксандар**

Нарадзіўся 5 студзеня 1938 году ў вёсцы Рачкевічы Капыльскага раёну. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт. З 1960 і да 1992 году — супрацоўнік інстытуту фізыкі. У 1997 годзе абраны прэзыдэнтам Нацыянальнай акадэміі навук. Увосень 2000 году прызначаны А. Лукашэнкам чальцом савету рэспублікі. 19 сьнежня 2000 г. абраны старшынём савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу II скліканьня (верхняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту). На гэтай пасадзе выяўляў пэўную самастойнасьць у выказваньнях (увосень 2001 г. публічна раскрытыкаваў практыку прызначэньня прэзыдэнта Акадэміі навук, асьцярожна падтрымаў Беларускі ліцэй, зачынены ў чэрвені 2003 г.). У ліпені 2003 г. быў адхілены ад пасады, пасьля чаго перайшоў у адкрытую апазыцыю да Лукашэнкі. Ачоліў грамадзянскую ініцыятыву «За справядлівыя выбары» і заявіў пра прававую нікчэмнасьць рэфэрэндуму 17 кастрычніка 2004 г. Пасьля ваганьняў у сьнежні 2005 г. абвясьціў пра збор подпісаў за сваё вылучэньне ў прэзыдэнты (ініцыятыўная група была зарэгістраваная ў Цэнтравыбаркаме), аднак ужо 9 студзеня 2006 г. зьняў сваю кандыдатуру. Пэрсанальная інтэрнэт-старонка – www.voitovich.com.

**Вайцянкоў Мікалай**

Нарадзіўся ў 1947 годзе ў г. Швэрыне (ГДР). Па адукацыі інжынэр-мэханік. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў старшынём Гомельскага аблвыканкаму. У 1995 годзе прызначаны паслом Беларусі ў Чэскай Рэспубліцы. З 18.01.1997 зноў стаецца старшынём Гомельскага аблвыканкаму. 17 красавіка 2001 г. пайшоў у адстаўку з гэтай пасады. У кастрычніку 2001 г. быў прызначаны паслом па асаблівых даручэньнях МЗС Беларусі (адказваў за рэгіянальнае супрацоўніцтва Гомельскай вобласьці з памежнымі раёнамі Расіі і Ўкраіны). Чалец савету рэспублікі; у чэрвені 2002 г. перайшоў з камісіі па рэгіянальных пытаньнях у камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы.

**Васілевіч Рыгор**

Нарадзіўся 13 лютага 1955 году ў г. Менску. У 1972–1977 гг. працаваў машыністам кампрэсарнай станцыі заводу імя Вавілава (зь перапынкам на службу ў войску), інжынэрам па падрыхтоўцы кадраў на заводзе імя Казлова. Закончыў БДУ (1980). Чалец Канстытуцыйнага Суду Беларусі ад пачатку яго заснаваньня. Пасьля канстытуцыйнага перавароту, учыненага Лукашэнкам у лістападзе 1996 году, быў прызначаны старшынём Канстытуцыйнага Суду. Сваё прызначэньне заслужыў асабістым удзелам у распрацоўцы прэзыдэнцкага варыянту Канстытуцыі, вынесенага на рэфэрэндум у лістападзе 1996 году. Канстытуцыйны суд пад кіраўніцтвам Р.Васілевіча ператварыўся ў малаўплывовы кансультацыйны орган, які паддае крытыцы дзяржаўныя органы за нізкую прававую культуру, але не наважваецца на зьмястоўныя пярэчаньні адміністрацыі прэзыдэнта.

**Вахрамееў Кірыла (мітрапаліт Філарэт)**

Нарадзіўся 21 сакавіка 1935 году ў Маскве. Кіраўнік Расійскай праваслаўнай царквы ў Беларусі. Скончыў духоўную сэмінарыю, Маскоўскую духоўную Акадэмію, якую пэўны час ачольваў. Мае ступень кандыдата багаслоўя. З 1978 г. – мітрапаліт Менскі і Беларускі, экзарх Заходняй Эўропы, у 1989 г. стаў экзархам усёй Беларусі. З дазволу сыноду РПЦ у 1990 г. балятаваўся ў Вярхоўны савет 12 скліканьня па адной акрузе з дэмакратычным кандыдатам (Я. Будзінасам) і адолеў яго. Пасьля перамогі А. Лукашэнкі неаднойчы выказваў поўную падтрымку яго інтэграцыйных намаганьняў. Пад кіраўніцтвам Філарэта Беларускі экзархат РПЦ дабіўся ўнясеньня зьменаў у закон аб свабодзе сумленьня (з 2002 г. у законе вызначана прыярытэтная роля праваслаўя), падпісаньня дамоваў аб шчыльным супрацоўніцтве зь міністэрствамі адукацыі, абароны, фінансаваньня дзяржавай некаторых сваіх праектаў (Дом міласэрнасьці ў Менску). У кастрычніку 2004 г. публічна падтрымаў падаўжэньне паўнамоцтваў А. Лукашэнкі. У 2005 г. быў узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

**Вячорка Вінцук (Валянцін)**

Нарадзіўся 7 ліпеня 1961 году ў Берасьці. Па адукацыі выкладчык беларускай мовы й літаратуры. Выкладаў у Менскім дзяржаўным пэдагагічным інстытуце, а з 1990 году — у Беларускім гуманітарным ліцэі. Адзін з стваральнікаў і кіраўнікоў «Майстроўні» (1979–1984), «Талакі» (1986–1989), Канфэдэрацыі беларускіх маладзёвых суполак (1988–1989). Адзін з заснавальнікаў БНФ (чалец аргкамітэту, 1988). У 1995 годзе стварыў і ўзначаліў грамадзкую арганізацыю — Цэнтар «Супольнасьць» (інтэрнэт-старонка http://cacedu.unibel.by/cscsc/spasylki.htm). З 1999 году старшыня рабочай групы Асамблеі няўрадавых арганізацый Бела-

русі. Старшыня руху БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ (інтэрнэт-старонка http://www.pbnf.org). Двойчы няўдала балятаваўся ў ВС 12 і 13 скліканьняў. У 2004 г. удзельнічаў у выбарах у палату прадстаўнікоў: паводле афіцыйных зьвестак, набраў толькі 13,3% галасоў. З пачатку 2005 г. актыўна агітуе за абраньне А.Мілінкевіча на прэзыдэнта Беларусі.

**Гайдукевіч Сяргей**

Нарадзіўся 8 верасьня 1954 году ў г. Менску. Атрымаў вайсковую адукацыю. Служыў у войсках супрацьпаветранай абароны. У 1976–1991 гг. на розных камандных пасадах у войску, у т. л. быў кіраўніком групы вайсковых спэцыялістаў СССР у Іраку (1982–1983). У 1991–1992 гг. — вядучы спэцыяліст Ўпраўленьня нацыянальнай бясьпекі Дзяржаўнага сакратарыяту Беларусі. У 1992–1994 гг. стаў старшынём камітэту па сацыяльнай абароне супрацоўнікаў органаў дзяржбясьпекі, унутраных справаў, міністэрства абароны, памежных войскаў і воінаў-інтэрнацыяналістаў пры Савеце міністраў Беларусі. У 1991–1994 гг. — старшыня праўрадавага Народнага руху Беларусі (НРБ), які спыніў сваё існаваньне празь некаторы час пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году. З 1995 году — лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі Беларусі (ЛДПБ). У 2000 годзе ўзначаліў арганізацыйны камітэт палітычнага блёку «Новая Беларусь — Адзінства». На прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году набраў 2,5% галасоў. У верасьні 2003 г. быў жорстка раскрытыкаваны сваімі бліжэйшымі паплечнікамі, паддадзены абструкцыі на зьезьдзе ЛДПБ, аднак, паводле міністэрства юстыцыі, захаваў статус лідэра партыі. У 2004 г. стаў дэпутатам палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу (адзіны з вылучаных ЛДПБ кандыдатаў). Атрымаў сумную вядомасьць пасьля судовага працэсу зь недзяржаўнай газэтай «Народная воля», паставіўшы апошнюю на грань банкруцтва (2005). У 2005 г. зноў абвясьціў пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі, яго ініцыятыўная група ў сьнежні 2005 г. была зарэгістравана Цэнтравыбаркамам.

**Ганчар Віктар**

Нарадзіўся 7 верасьня 1957 году ў пасёлку Радзічава Слуцкага раёну. Закончыў юрыдычны факультэт БДУ. Дэпутат Вярхоўнага Савету 12 і 13 скліканьня. У верасьні 1991 г. выступіў з заявай у парлямэнце аб незаконнасьці прыпыненьня дзейнасьці КПБ. У 1994 годзе членец выбарчага штабу Лукашэнкі. За свае заслугі ў справе выбраньня Лукашэнкі на пасаду прэзыдэнта атрымаў пасаду намесьніка прэм'ер-міністра, адказнага за сацыяльную сфэру (1994). Зь цягам часу пайшоў у апазыцыю Лукашэнку. Публічна заявіў пра грубыя парушэньні ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня рэфэрэндуму 1996 г. і ў лістападзе 1996 г. быў незаконна адхілены ад пасады старшыні Цэнтравыбаркаму, на якой працаваў каля двух месяцаў. Кіраўнік самаабвешчанага Цэнтравыбаркаму падчас альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбараў 1999 году. Зьнік 16 верасьня 1999 году.

**Ганчарык Уладзімер**

Нарадзіўся 24 красавіка 1940 году ў вёсцы Аўгустова Лагойскага раёну. Закончыў Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт народнай гаспадаркі і Акадэмію грамадзкіх навук пры ЦК КПСС. Член КПСС з 1964 г. Кандыдат эканамічных навук. З 1961 г. — эканаміст, намесьнік, выканаўца абавязкаў галоўнага бугальтара саўгасу «10 гадоў БССР» Любанскага раёну. У 1965–1970 гг. — першы сакратар Любанскага раёну ЛКСМ Беларусі. З 1970 г. — інструктар Менскага абкаму, другі сакратар Дзяржынскага райкаму КПБ. З 1976 г., пасьля сканчэньня

асьпірантуры Акадэміі грамадзкіх навук пры ЦК КПСС, — намесьнік загадчыка сельскагаспадарчага аддзелу Менскага абкаму, першы сакратар Чэрвенскага райкаму КПБ. З 1982 па 1984 г. — інспэктар, намесьнік загадчыка аддзелу арганізацыйна-партыйнай працы ЦК Кампартыі Беларусі. З 1984 г. — другі сакратар Магілёўскага абкаму Кампартыі Беларусі. Займаў пасаду старшыні Камісіі па абароне прыроды і рацыянальным выкарыстаньні прыродных рэсурсаў. Дэпутат ВС 13 скліканьня, старшыня Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі. З 1986 г. — старшыня Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Паводле афіцыйных зьвестак, на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году набраў 15,4 % галасоў. Безвынікова спрабаваў узначаліць акцыі пратэсту супраць фальсыфікацыяў і абскардзіць вынікі выбараў. У снежні 2001 г. мусіў сысьці з пасады старшыні ФПБ, перайшоўшы на працу ў беларуска-расійскую канфэдэрацыю прафсаюзаў. Увосень 2004 г. зрабіў няўдалую спробу балятавацца ў дэпутаты палаты прадстаўнікоў (ня быў зарэгістраваны акруговай камісіяй).

**Гаравы Леанід**

Нарадзіўся 22 лютага 1959 году. Жыве ў г. Гарадку. Настаўнік, працаваў дырэктарам сельскай школы ў Гарадоцкім раёне (звольнены ў 2005 годзе па палітычных матывах). Пэўны час кіраваў раённай суполкай БСДП (НГ), разам з прыхільнікамі А. Караля перайшоў у БСДГ. Ад гэтай партыі ў сакавіку 2003 году быў абраны ў Гарадоцкі раённы савет. У чэрвені 2003 году стаў адным з каардынатараў асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў. У 2004 годзе балятаваўся ад БСДГ у палату прадстаўнікоў; паводле афіцыйных звестак, набраў 9,3% галасоў. На студзень 2006 г. – член ЦК БСДП (Г).

**Гразнова Людміла**

Нарадзілася 8 чэрвеня 1953 году ў г. Дзяржынску. Па спэцыяльнасьці эканаміст. Займала пасаду дацэнта катэдры эканамічных навук БДУ. Дэпутат ВС 13 скліканьня, прыхільніца імпічмэнту прэзыдэнту Лукашэнку. Чалец аргкамітэту грамадзянскай ініцыятывы «Хартыя’97», актыўна ўдзельнічала ў выбарчай кампаніі 2001 году на баку дэмакратычных сілаў. З 2003 г. старшыня беларускага «Праваабарончага альянсу», зарэгістраванага ў Летуве, з 2004 году намесьніца старшыні Аб’яднанай грамадзянскай партыі. Кандыдавала ў палату прадстаўнікоў у 2004 г., аднак, паводле афіцыйных зьвестак, сабрала толькі 23,6% галасоў і не была абраная.

**Грушавы Генадзь**

Нарадзіўся 24 ліпеня 1950 году ў г. Менску. Па адукацыі філёзаф. Старшыня дабрачыннага фонду «Дзеці Чарнобылю». Доктар навук, прафэсар. Адзін з заснавальнікаў БНФ «Адраджэньне». Дэпутат ВС 12 скліканьня, чалец фракцыі БНФ. Быў пераабраны ў ВС 13 скліканьня. У 1996 г. ачоліў Беларускую хрысьціянска-дэмакратычную партыю, якая ў 1999 годзе не прайшла дзяржаўнай перарэгістрацыі. У 1996–1997 гадох хаваўся ў Нямеччыне ад арышту. У 2000 і 2004 гг. вылучаўся на выбарах у палату прадстаўнікоў, але ня быў абраны.

**Грыб Мечыслаў**

Нарадзіўся 28 верасьня 1938 году ў вёсцы Савічы Дзятлаўскага раёну. Закончыў Львоўскую пажарна-тэхнічную вучэльню (1959), БДУ (1967). З 1959 году працаваў у органах унутраных справаў. Дaслужыўся да годнасьці генэрала-лейтэнанта міліцыі (1993). Дэпутат

ВС 12 скліканьня. Сьпярша старшыня сталай Камісіі па пытаньнях нацыянальнай бясьпекі, абароны і барацьбы з злачыннасьцю, у студзені 1994 году абраны Старшынём ВС (займаў гэтую пасаду да студзеня 1996 г.). Паступова перайшоў у апазыцыю да Лукашэнкі. У 1996 годзе пераабраны ў ВС 13 скліканьня (чалец сталай Камісіі па міжнародных справах). Чалец Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада» (1996), першы намесьнік старшыні партыі (з 1999), пазьней увайшоў у БСДГ. Падчас выбарчай кампаніі 2001 году ўзначаліў структуры незалежнага назіраньня за выбарамі. У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў ад БСДГ, паводле афіцыйных зьвестак, набраў 15,1% галасоў. У сьнежні 2005 г. стаў кіраўніком ініцыятыўнай групы за вылучэньне А.Казуліна кандыдатам у прэзыдэнты.

**Губарэвіч Юрась**

Нарадзіўся 23 лютага 1978 году ў г. Белаазерску. Старшыня Берасьцейскай абласной рады партыі БНФ. Па адукацыі інжынэр-электрык, таксама атрымаў дыплём магістра дзяржаўнага кіраваньня ў Акадэміі дзяржаўнага кіраваньня пры прэзыдэнту Ўкраіны. У 1996-98 гадох чалец «Маладога фронту». Быў каардынатарам незарэгістраванага «Цэнтру рэгіянальнага супрацоўніцтва», абраны дэпутатам Белаазерскага гарсавету ў сакавіку 2003 г. Да сьнежня 2003 г. займаў пасаду намесьніка старшыні гарсавету. У 2004 г. кандыдаваў на парлямэнцкіх выбарах, аднак у палату прадстаўнікоў ня трапіў. У 2005 г. – каардынатар выбарчай кампаніі А. Мілінкевіча ў Берасьцейскай вобласьці.

**Дабравольскі Аляксандар**

Нарадзіўся 23 лістапада 1958 году ў вёсцы Сула Стаўпецкага раёну. Па адукацыі інжынэр-канструктар і юрыст. У 1989–1991 гг. дэпутат ВС СССР. Дэпутат ВС 13 скліканьня, старшыня падкамісіі Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусі па сродках масавай інфармацыі і сувязях з грамадзкімі аб’яднаньнямі. Намесьнік старшыні АГП з 1995 г. У 2004 г. спрабаваў трапіць у палату прадстаўнікоў, аднак быў зьняты з дыстанцыі акруговай камісіяй. У 2005 г. – адзін з арганізатараў Кангрэсу дэмакратычных сілаў і кіраўнікоў перадвыбарнага штабу А.Мілінкевіча.

**Дамашкевіч Мікалай**

Нарадзіўся ў 1949 годзе ў Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласьці. Па адукацыі інжынэр-мэханік. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці — першы сакратар Сеньненскага райкаму КПБ. У 1995 годзе прызначаны начальнікам службы кантролю Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі, праз некаторы час — старшынём Камітэту дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусі. 2 сьнежня 1998 г. прызначаны старшынём Менскага аблвыканкаму.

**Данейка Павал**

Нарадзіўся 3 красавіка 1961 году ў г. Менску. Па адукацыі эканаміст. Працаваў у дзяржаўных і недзяржаўных структурах. У дадзены момант займае пасаду дырэктара Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту. З 1991 году чалец Аб’яднанай дэмакратычнай партыі, пасьля яе рэарганізацыі — АГП. Старшыня яе Менскай гарадзкой арганізацыі, у 2000-2002 гг. — намесьнік старшыні Нацыянальнага камітэту АГП. Дэпутат ВС 13 скліканьня.

**Даўгалёў Васіль**

Нарадзіўся 25 траўня 1951 году ў г. Рагачове. Паводле першай адукацыі інжынэр-электрык, па другой — эканаміст-мэнэджэр. Пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах 1994 году — начальнік службы кантролю Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі. 10 кастрычніка 1995 году быў прызначаны намесьнікам прэм'ер-міністра. 13 сакавіка 2000 г. адхілены ад гэтай пасады і прызначаны старшынём Берасьцейскага аблвыканкаму (на гэтай пасадзе працаваў да 2004 году). 24 лістапада 2000 г. прызначаны Лукашэнкам чальцом савету рэспублікі (заставаўся ім да 13 красавіка 2004 году). У сакавіку 2004 г. ізноў заняў пасаду намесьніка прэм'ер-міністра, стаў паўнамоцным прадстаўніком у органах «Саюзу Расіі і Беларусі».

**Дашкевіч Зьміцер**

Нарадзіўся ў 1981 годзе ў вёсцы Кушняры Івацэвіцкага раёну. Сябар БНФ. Скончыў філялягічны факультэт Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту. Актывіст «Маладога фронту», а з 2004 году яго сустаршыня (разам з С. Бахуном). Арганізатар і ўдзельнік шматлікіх вулічных акцый пратэсту. Праславіўся тым, што адным зь першых публічна пратэставаў супраць абвяшчэньня рэфэрэндуму ў пачатку верасьня 2004 году. Увосень 2004 г. спрабаваў трапіць у палату прадстаўнікоў ад незарэгістраванай кааліцыі «Маладая Беларусь», быў зьняты з дыстанцыі акруговай камісіяй. У 2005 годзе актывіст перадвыбарчай кампаніі А. Мілінкевіча.

**Домаш Сямён**

Нарадзіўся 2 студзеня 1950 году ў вёсцы Тумашы Ляхавіцкага раёну. Закончыў Бабруйскі аўтатранспартны тэхнікум, Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі, (факультэт плянаваньня прамысловасьці). Працаваў мэханікам па рамонце аўтамабіляў, інжынэрам, а з 1974 г. па 1977 г. — дырэктарам аўтабазы. З 1977 г. да 1982 г. — дырэктар аўтакамбінату №1 у Горадні. З 1982 г. да 1987 г. працаваў загадчыкам прамыслова-транспартнага аддзелу Гарадзенскага гаркаму КПБ і другім сакратаром Кастрычніцкага райкаму КПБ г. Горадні. У 1987 г. быў абраны старшынём выканкаму і гарадзкога Савету дэпутатаў г. Ліды Гарадзенскай вобласьці. У 1990 г. абраны старшынём выканкаму г. Горадні. У 1991–1993 гг. — старшыня выканкаму і гарадзкога Савету дэпутатаў г. Горадні. У 1993 годзе абраны старшынём Гарадзенскага аблвыканкаму і абласнога Савету дэпутатаў. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьняў. У траўні 1996 г. абраны сябрам Прэзыдыюму ВС 13 скліканьня. У лістападзе 1996 г. разам з 70 дэпутатамі ВС падпісаў заяву аб імпічмэнце прэзыдэнту. З 1997 году старшыня Каардынацыйнага камітэту «Гарадзенская Ініцыятыва». Зь ягонай ініцыятывы і пры актыўным удзеле ў траўні 2000 г. была створана Каардынацыйная рада «Рэгіянальная Беларусь» — кааліцыя грамадзкіх, палітычных і прафсаюзных аб'яднаньняў усіх абласных цэнтраў і буйных гарадоў Беларусі. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г., зьняў сваю кандыдатуру на карысьць Уладзімера Ганчарыка. Пасьля выбараў 2001 г. пакінуў вялікую палітыку. У студзені 2006 году лукашэнкаўцы прызначылі яго дырэктарам дзяржаўнага прадпрыемства ў Горадні.

**Дубко Аляксандар**

Нарадзіўся 14 студзеня 1938 году ў вёсцы Ілава Шумілінскага раёну. Па адукацыі аграном. Прайшоў кар'ерны шлях ад агранома-насеньнявода да старшыні Гарадзенскага абласнога Савету дэпутатаў, старшыні Гарадзенскага аблвыканкаму. Чалец Аграрнай партыі Бела-

русі, з 1995 году ўвайшоў у склад яе цэнтральнай рады. У 1994 годзе ўдзельнічаў у прэзыдэнцкіх выбарах, заняў перадапошняе, пятае месца. Памёр 4 лютага 2001 г.

**Ерын Леанід**

Нарадзіўся 17 лістапада 1951 году ў г. Воршы. Па першай адукацыі інжынэр, па другой — афіцэр КДБ. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў у Цэнтральным апараце КДБ СССР у Маскве, пасьля ачольваў Упраўленьне ФСБ Расійскай Фэдэрацыі па Маскве і Маскоўскай вобласьці. 20 кастрычніка 1995 г. заняў пасаду намесьніка старшыні Камітэту дзяржаўнай бясьпекі Рэспублікі Беларусі. 25 верасьня 2000 г. прызначаны начальнікам службы бясьпекі прэзыдэнта. 27 лістапада 2000 г. пераведзены на пасаду старшыні КДБ Рэспублікі Беларусі. У лістападзе 2004 г. адпраўлены ў адстаўку пасьля таго, як у кастрычніку 2004 г. спрабаваў навязаць дыялёг зь лідэрамі пратэставага руху. У 2005 г. звольнены з органаў дзяржбясьпекі РБ. Пераехаў у Расію.

**Забалоцец Сяргей**

Нарадзіўся 14 красавіка 1955 году ў вёсцы Таль Любанскага раёну. Быў камсамольскім і партыйным дзеячом сярэдняга зьвяна, працаваў на Менскім аўтамабільным заводзе. У 2000 г. быў абраны ў палату прадстаўнікоў, дзе ўзначальваў камісію па прамысловасьці, паліўна-энэргетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве. У палаце прадстаўнікоў 2004 г. заняў пасаду намесьніка старшыні.

**Замяталін Уладзімер**

Нарадзіўся 14 траўня 1948 году ў г. Тула (Расія). Кадравы вайсковец. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў палітработнікам у Беларускай вайсковай акрузе. Падчас прэзыдэнцкай кампаніі 1994 г. быў прэс-сакратаром В. Кебіча. У 1995 г. прызначаны начальнікам Галоўнага ўпраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі. Працаваў намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі, старшынём Дзяржаўнага камітэту Рэспублікі Беларусі па друку, намесьнікам старшыні Савету міністраў. На момант прзыдэнцкай кампаніі — першы намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Адразу пасьля выбараў 2001 году быў адпраўлены ў адстаўку.

**Зарамбюк Алесь**

Нарадзіўся ў 1982 годзе ў г. Масты. Скончыў Гарадзенскі каледж мастацтваў, па спэцыяльнасьці – рэжысэр масавых сьвятаў. Актывіст «Маладога фронту». У сакавіку 2003 году абраны дэпутатам Мастоўскага раённага савету. Быў адным з заснавальнікаў перадвыбарнага блёку «Маладая Беларусь». У 2004 годзе кандыдаваў у палату прадстаўнікоў па Мастоўскай акрузе як беспартыйны кандыдат. Паводле афіцыйных зьвестак, набраў 9,8% галасоў. З 2005 г. – у камандзе А. Мілінкевіча.

**Захаранка Юры**

Нарадзіўся 4 студзеня 1952 году ў мястэчку Васілевічы Рэчыцкага раёну. Кадравы работнік праваахоўных органаў. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў намесьнікам начальніка Міжрэгіянальнага ўпраўленьня па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю МУС СССР. Пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах 1994 году прызначаны міністрам

унутраных справаў. 16 кастрычніка 1995 г. адхілены ад гэтай пасады. Стаў актыўным апазыцыянэрам. Быў абраны чальцом Палітсавету АГП. Зьнік 7 траўня 1999 г.

**Зімоўскі Аляксандар**

Нарадзіўся ў 1961 годзе. Закончыў тры курсы Львоўскай вышэйшай вайскова-палітычнай вучэльні. Працаваў у барысаўскай райаграпрамтэхніцы, у друкаваных СМІ. У другой палове 1990-х гадоў вёў на беларускім тэлебачаньні прапагандысцкую перадачу «Рэзананс», у якой паліў брудам не адзін дзясятак апазыцыйных дзеячоў. У 2000-2002 гг. – намесьнік старшыні Белтэлерадыёкампаніі, з 2002 г. генэральны дырэктар тэлекампаніі «Сталічнае тэлебачаньне». У сакавіку 2005 г. А. Лукашэнкам быў прызначаны чальцом савета рэспублікі, у канцы сьнежня 2005 г. – старшынём Белтэлерадыёкампаніі.

**Зянковіч Юрась**

Нарадзіўся 31 кастрычніка 1977 году ў г. Менску, жыве ў вёсцы Ждановічы Менскага раёну. Навучаўся ў БДУ і ў польскіх унівэрсытэтах. Юрыст. З 1999 г. – старшыня менскай раённай рады БНФ і сойму БНФ. У сьнежні 2000 году ачоліў выканаўчае бюро Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацый. У сакавіку 2003 г. абраны дэпутатам Менскага раённага савету і Ждановіцкага сельсавету. Балятаваўся ў палату прадстаўнікоў у 2004 годзе, аднак набраў толькі 9,3% галасоў.

**Івашкевіч Віктар**

Нарадзіўся 21 верасьня 1959 году ў г. Менску. У 1981–1991 гг. працаваў стропальшчыкам на Менскай чыгунцы. Адзін з заснавальнікаў БНФ «Адраджэньне» (30.10.1999 стаў намесьнікам старшыні гэтай арганізацыі). У 1999 годзе абраны віцэ-прэзыдэнтам Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў. У 1997-2002 гг. галоўны рэдактар газэты «Рабочы». У канцы 2002 г. быў асуджаны да абмежаваньня волі за публікацыі, якія нібыта ўтрымлівалі «паклёп на прэзыдэнта», адбываў тэрмін пакараньня ў Баранавічах. Выйшаў на волю ў сьнежні 2003 г. На дадзены момант – намесьнік старшыні партыі БНФ. Дацераная асоба А. Мілінкевіча на выбарах 2006 г.

**Казлоўскі Павал**

Нарадзіўся 9 сакавіка 1942 году ў вёсцы Ваўкаўня Пружанскага раёну. Атрымаў вайсковую адукацыю. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці — намесьнік камандуючага Беларускай вайсковай акругі. 22 красавіка 1992 году быў прызначаны міністрам абароны Беларусі. Нейкі час займаў пасаду старшыні менскай гарадзкой арганізацыі АГП. У 2001 г. выйшаў з АГП, пазьней вярнуўся ў партыю. Беспасьпяхова ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 году — ня быў зарэгістраваны кандыдатам праз адсутнасьць патрэбнай колькасьці подпісаў. Быў даверанай асобай Уладзімера Ганчарыка. Спрабаваў балятавацца ў палату прадстаўнікоў у 2004 годзе, ня быў зарэгістраваны. У пачатку 2005 г. на зьезьдзе АГП прэтэндаваў на вылучэньне ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты, але прайграў А. Лябедзьку.

**Казулін Аляксандар**

Нарадзіўся 25 лістапада 1955 году ў г. Менску. Па адукацыі матэматык. У 1970-80-х гг. быў камсамольскім і партыйным актывістам. У 1990-х гг. абараніў доктарскую дысэрта-

цыю, атрымаў годнасьць прафэсара. Працаваў намесьнікам міністра адукацыі, у 1996 г. быў прызначаны рэктарам БДУ, пазьней абіраўся старшынём савета рэктараў краіны. У 1998 г. набыў статус чальца ўраду, аднак у 2001 г. пазбавіўся яго (па некаторых зьвестках за тое, што ня здолеў арганізаваць масавае галасаваньне студэнтаў за Лукашэнку на прэзыдэнцкіх выбарах). У канцы 2002 г. рэкамэндаваны парлямэнтам на пасаду прадстаўніка Беларусі ў ААН, аднак прызначэньне не было зацьверджана Лукашэнкам. Увосень 2003 г. звольнены з пасады рэктара і заменены В. Стражавым. Публічна абвінавачаны прадстаўніком пракуратуры ў тым, што «хаваецца ад сьледзтва» па справе, зьвязанай зь бізнэс-праектам БДУ. У лютым 2005 г. заявіў аб стварэньні апазыцыйнага Лукашэнку грамадзка-палітычнага руху «Воля народу»; у красавіку 2005 г. абраны старшынём Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). У сьнежні 2005 г. заявіў аб намеры балятавацца ў прэзыдэнты Беларусі; яго ініцыятыўная група, ачоленая М. Грыбам, была зарэгістравана Цэнтравыбаркамам.

**Калугін Леанід**

Нарадзіўся 16 студзеня 1940 году. Па адукацыі інжынэр-мэханік. Працаваў майстрам, начальнікам цэху. З 1993 па 2001 гг. прэзыдэнт акцыянэрнага таварыства «Атлянт» — дырэктар Менскага заводу лядоўняў. Былы чалец верхняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту, працаваў у Камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 году, але з прычыны недабору подпісаў ня быў зарэгістраваны кандыдатам у прэзыдэнты. У канцы 2001 г. быў арыштаваны і зьмешчаны ў сьледчы ізалятар па абвінавачваньні ў зьдзяйсьненьні эканамічных злачынстваў. Выпушчаны ў чэрвені 2003 году. Пакінуў вялікую палітыку.

**Калякін Сяргей**

Нарадзіўся 16 чэрвеня 1952 году ў г. Менску. Па адукацыі інжынэр. З 1983 г. працаваў у структурах КПБ. У 1989 годзе абраны другім сакратаром райкаму партыі Савецкага раёну Менску. У 1994 годзе IV зьездам Партыі камуністаў Беларускай прызначаны першым сакратаром ЦК ПКБ. З 1995 году — дэпутат ВС 13 скліканьня, а пасьля й сябра Прэзыдыюму парлямэнту. Узначальваў дэпутацкую фракцыю ПКБ. Быў адным з аўтараў альтэрнатыўнага праекту Канстытуцыі, вынесенага на рэфэрэндум 1996 году. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г. Пасьля няўдалага збору подпісаў падтрымаў кандыдатуру Уладзімера Ганчарыка, быў яго даверанай асобай. Прэтэндаваў на статус адзінага дэмакратычнага кандыдата ў 2005 г., але на Кангрэсе дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г. у часе галасаваньня заняў трэцяе месца пасьля А.Мілінкевіча і А.Лябедзькі. Узначаліў перадвыбарны штаб А.Мілінкевіча.

**Канаплёў Уладзімер**

Нарадзіўся 3 студзеня 1954 году ў сяле Акулінцы Магілёўскага раёну. Па адукацыі настаўнік-географ, працаваў у міліцыі. Падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі 1994 г. быў даверанай асобай А.Лукашэнкі, якога ведаў з маленства, разам з жонкай Алай актыўна зьбіраў за яго подпісы. У 1994-96 гг. займаў пасаду галоўнага памочніка прэзыдэнта. Дэпутат ВС 13 скліканьня, чалец Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету, кіраўнік прапрэзыдэнцкай фракцыі «Згода». Спрычыніўся да зрыву імпічмэнту ў лістападзе 1996 г. У 1997-2004 г. – намесьнік сьпікера ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту, з 2004 г. – яе сьпікер.

**Карач Вольга**

Нарадзілася 5 студзеня 1979 году ў г. Віцебску. Скончыла Віцебскі дзяржаўны ўнівэрсытэт. Па адукацыі філёляг. Працавала ў школах, удзельнічала ў нефармальных грамадзкіх ініцыятывах («Сёмая грань», «Зубр»). Была чальцом БСДП (НГ). У сакавіку 2003 году ў першым туры мясцовых выбараў перамагла кандыдатаў ад улады і была абраная ў Віцебскі гарадзкі савет дэпутатаў. У 2004 году не была дапушчана да выбараў у палату прадстаўнікоў акруговай камісіяй.

**Карняенка Віктар**

Нарадзіўся 29 ліпеня 1957 году ў вёсцы Міхнічы Краснапольскага раёну. Па адукацыі інжынэр-эканаміст. Дэпутат ВС СССР (1989–1991), намесьнік старшыні гарадзкога Савету г. Гомеля (1991–1994). Доўгі час быў чальцом Палітсавету АГП, старшынём гомельскай абласной арганізацыі АГП. Каардынатар па Гомельскай вобласьці Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацый, былы старшыня аб’яднаньня «Грамадзянскія ініцыятывы» (да ліквідацыі аб’яднаньня ўладамі). У пачатку 2000-х гадоў пакінуў кіраўніцтва АГП, расчараваўшыся ў магчымасьцях палітычных партыяў пры Лукашэнку. Узначаліў грамадзкі «Фонд спрыяньня лякальнаму разьвіцьцю», у якім працаваў разам з А.Мілінкевічам, быў адказным за палітычную кампанію А. Мілінкевіча перад Кангрэсам дэмакратычных сілаў (кастрычнік 2005 г.). Пасьля Кангрэсу стаў адным з кіраўнікоў штабу «адзінага дэмакратычнага кандыдата».

**Кароль Аляксей**

Нарадзіўся 29 траўня 1945 году ў мястэчку Копысь Аршанскага раёну. Па адукацыі гісторык. З 1992 г. намесьнік старшыні Партыі народнай згоды. Заснавальнік і галоўны рэдактар газэты «Згода». Доўгі час быў намесьнікам старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада», у 2000 г. узначальваў фракцыю «За адзінства», якая не падтрымала рашэньне кіраўніцтва БСДП (НГ) аб удзеле ў парлямэнцкіх выбарах, а выступала за іх байкот. У канцы 2001 г. разам з групай паплечнікаў пакінуў БСДП (НГ), спрабаваў зарэгістраваць Аб’яднаную сацыял-дэмакратычную партыю і ўзбуйніць яе за кошт актывістаў партыі «Надзея» і БСДГ. Пасьля правалу гэтай спробы ўступіў у партыю БСДГ, дзе стаў намесьнікам С. Шушкевіча. У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў па Маладэчанскай гарадзкой акрузе ад БСДГ; паводле афіцыйных зьвестак, набраў 8,2% галасоў. У дадзены момант – намесьнік старшыні партыі БСДП (Г), актывіст перадвыбарнай кампаніі А. Казуліна.

**Карпенка Генадзь**

Нарадзіўся 17 верасьня 1949 году ў г. Менску. Закончыў Беларускі політэхнічны інстытут (1972). Доктар тэхнічных навук, абіраўся чальцом-карэспандэнтам Акадэміі навук. Працаваў дырэктарам заводу парашковай мэталюргіі ў Маладэчне (1983–1990 гг.), быў старшынём Маладэчанскага гарсавету (1991-1994 гг.). Дэпутат ВС 12 і 13 скліка637ньня. У ВС 13 скліканьня быў абраны намесьнікам старшыні. Старшыня Партыі народнай згоды (да 1995), пазьней – намесьнік старшыні АГП. Памёр 7 красавіка 1999 г. пры ня высьветленых да канца абставінах (удава Г.Карпенкі Людміла і многія з апазыцыйных дзеячоў не выключаюць акту забойства). Біяграфія на ангельскай мове зьмешчана на старонцы http://www.belarus.net/parliame/korpenko.htm., расейскамоўная – на http://g-karpenko.narod.ru

**Касьцян Сяргей**

Нарадзіўся 15 студзеня 1941 году ў вёсцы Ўсохі Клічаўскага раёну. Па адукацыі гісторык, загадваў катэдрай у Мазырскім пэдагагічным інстытуце. У савецкі час быў камсамольскім і партыйным функцыянэрам. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага савету 13 скліканьня ад ПКБ, спрычыніўся да расколу партыі ў 1996 г., увайшоў у кіраўніцтва пралукашэнкаўскай КПБ. Нязьменны дэпутат палаты прадстаўнікоў (з моманту яе стварэньня і да сёньня). Пасьлядоўна агучвае найбольш радыкальныя антызаходнія і антыдэмакратычныя погляды. У 2002 г. быў прызначаны кіраўніком рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва», аднак неўзабаве адмовіўся ад гэтай пасады. Інтэрнэт-старонка, на якой зьбіраюцца самыя кур'ёзныя выказваньні С.Касьцяна – http://kostyan.cjb.net.

**Катляроў Ігар**

Нарадзіўся 15 ліпеня 1948 году ў г.п. Відзы Браслаўскага раёну. Скончыў Віцебскі інстытут лёгкай прамысловасьці, вышэйшую партыйную школу. Працаваў інструктарам у партыйных органах Віцебшчыны, на момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці быў адным з ідэолягаў ЦК КПБ, пазьней заняў пасаду ў Інстытуце сацыялёгіі, абараніў доктарскую дысэртацыю, паралельна адраджаў камуністычную партыю. Да 2000 г. быў чальцом ПКБ, пазьней стаў другім сакратаром ЦК КПБ. У 1996 г. трапіў у Вярхоўны савет 13 скліканьня і перайшоў у палату прадстаўнікоў. У кастрычніку 2000 г. трапіў у палату ў другі раз. У 2000-2004 гг. працаваў старшынём камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе, у 2002 г. быў прызначаны А. Лукашэнкам у "камісію па рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў". Выбраны дэпутатам палаты прадстаўнікоў і ў кастрычніку 2004 г.

**Кебіч Вячаслаў**

Нарадзіўся 10 чэрвеня 1936 году ў вёсцы Канюшаўшчына Валожынскага раёну. Па адукацыі інжынэр-мэханік. З 1958 і да 1980 гг. працаваў на кіраўнічых пасадах у вытворчым сэктары эканомікі. З 1980 г. — функцыянэр КПБ (другі сакратар Менскага гаркаму КПБ, другі сакратар Менскага абкаму). У 1985–1990 гг. — намесьнік Старшыні Савету міністраў БССР, старшыня Дзяржаўнага плянавага камітэту БССР. У 1989–1991 гг. — чалец ЦК КПБ, дэпутат ВС БССР, народны дэпутат СССР. У 1990–1994 гг. — Старшыня Савету міністраў. Асноўны супернік Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году. Дэпутат ВС 13 скліканьня, пасьля лістападаўскага канстытуцыйнага перавароту дэпутат ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту. У дадзены момант на пэнсіі.

**Клімаў Андрэй**

Нарадзіўся 17 верасьня 1965 году ў г. Менску. Працаваў пажарнікам, па прафэсіі будаўнік, у сярэдзіне 1990-х гадоў кіраваў буйной будаўнічай фірмай, выдаваў уласную газэту. Дэпутат ВС 13 скліканьня. Не прызнаў вынікаў рэфэрэндуму 1996 году, у часе падрыхтоўкі дэпутатамі ВС імпічмэнту заклікаў іх да арышту Лукашэнкі. У 1997 г. разам з В.Ганчаром падрыхтаваў даклад аб злачынствах рэжыму, які рассылаў вышэйшым чыноўнікам. 11 лютага 1998 году быў арыштаваны па абвінавачаньні ў фінансавым махлярстве. Быў асуджаны, знаходзіўся ў зьняволеньні да 2002 году. У пачатку 2004 году прыпыніў членства ў АГП і раскрытыкаваў яе кіраўніцтва за пасыўнасьць. Займаўся грамадзкай і палітычнай дзейнасьцю, у 2004 годзе прэзэнтаваў «Рух Андрэя Клімава», называў сябе «прарасійскім паліты-

кам». Напісаў некалькі кніг пра сучасную беларускую палітыку (некаторыя ў суаўтарстве з актывістам АГП Я. Агурцовым). Абвясьціўшы пачатак рэвалюцыі на 25 сакавіка 2005 г., вывеў на Кастрычніцкую плошчу ў Менску сотні людзей. Зноў быў арыштаваны і асуджаны: у дадзены момант адбывае пакараньне (абмежаваньне волі) у Крупскім раёне. Выказаўся за байкот апазыцыяй прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г., паабяцаў «працяг рэвалюцыі» 25 сакавіка 2006 году. Біяграфія на ангельскай мове месьціцца на старонцы http://www.belarus.net/parliame/klimov.htm.

**Козік Леанід**

Нарадзіўся 13 ліпеня 1948 году ў г. Барысаве. Працаваў кіроўцам, токарам, інжынэрам-тэхнолягам. Пасьля заканчэньня БДУ займаў пасады памочніка пракурора г. Барысава, дырэктара Барысаўскай шытнай фабрыкі. Быў дэпутатам ВС 12 скліканьня, дзе ачольваў камісію па эканамічнай рэформе і ўваходзіў у праўрадавую фракцыю «Беларусь». З 5 лютага 1998 году па 12 верасьня 2001 году працаваў намесьнікам прэм'ер-міністра, з 31 жніўня 2000 году па 12 верасьня 2001 году прадстаўляў Беларусь у г.зв. Савеце міністраў Саюзнай дзяржавы. Зь верасьня 2001 г. па ліпень 2002 г. – намесьнік кіраўніка адміністрацыі Лукашэнкі. Старшыня Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі зь ліпеня 2002 г. (фактычна прызначаны на гэтую пасаду А.Лукашэнкам, рашэньне якога зацьвердзіў пленум ФПБ). Увосень 2004 г. пасьпяхова балятаваўся ў палату прадстаўнікоў у Барысаўскай сельскай акрузе – паводле афіцыйных зьвестак, набраў 54,1% галасоў. Адзін з найбольш пасьлядоўных прыхільнікаў А. Лукашэнкі.

**Колас Уладзімер**

Нарадзіўся 22 верасьня 1951 году ў г. Менску. Па адукацыі перакладнік. Працаваў кінарэжысэрам. У 1990 г. узначаліў першы ў сучаснай Беларусі гуманітарны ліцэй, які пазьней увайшоў у структуру міністэрства адукацыі. У 2003 г., пасьля закрыцьця ўстановы Саветам міністраў, распачаў кампанію незалежнага навучаньня ліцэістаў. Быў актывістам БНФ, у 2004 г. балятаваўся ад гэтай партыі ў палату прадстаўнікоў па адной зь менскіх акругаў. Паводле афіцыйных зьвестак, набраў 22,5% галасоў і ня быў абраны; паводле неафіцыйных, перамог у першым туры выбараў. Неўзабаве пасьля выбараў выйшаў з партыі БНФ. Старшыня Рады беларускай інтэлігенцыі (з 2003 г.). У 2004-2005 гг. заяўляў пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі, крытыкаваў «традыцыйную апазыцыю» і працэдуру вызначэньня «адзінага кандыдата». Ня браў удзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў, але ў канцы сьнежня 2005 г. далучыўся да ініцыятыўнай групы А. Мілінкевіча.

**Краўчанка Пётра**

Нарадзіўся 13 жніўня 1950 году ў г. Смалявічы. Па адукацыі гісторык. У 1985 г. быў прызначаны сакратаром Менскага гаркаму КПБ. У 1990–1994 гг. — міністар замежных справаў Рэспублікі Беларусі. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьня, пэўны час узначальваў камісію па міжнародных справах. У 1994 г. падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі агітаваў за Вячаслава Кебіча. У сярэдзіне 1995 г. абраны намесьнікам старшыні, пасьля аб'яднаўчага зьезду стаў чальцом Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада». З 1998 г. пасол Беларусі ў Японіі і Філіпінах. У канцы 2002 г. быў адкліканы з гэтай пасады Лукашэнкам. У 2003 г. вярнуўся ў апазыцыю, заяўляў пра намер балятавацца ў прэзыдэнты, але ў канцы 2005 г. адмовіўся выстаўляць сваю кандыдатуру на выбарах 2006 году.

**Крыжаноўскі Яўген**

Нарадзіўся ў 1955 годзе ў г. Мікалаеве (Украіна). Па адукацыі тэатральны актор. Кіраўнік менскага тэатру сатыры й гумару «Хрыстафор». Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г. Ня здолеў набраць патрэбнай колькасьці подпісаў. Пасьля выбараў скардзіўся на ўціск з боку ўладаў, эміграваў у Расію разам з тэатрам, аднак вярнуўся ў Беларусь. Заявіў пра сыход з палітыкі. Інтэрнэт-старонка http://www.kryzhanovski.tripod.com.

**Кудзінаў Уладзімер**

Нарадзіўся 11 чэрвеня 1959 году ў сяле Танежыцы Слуцкага раёну. Па адукацыі фінансіст. Працаваў у падатковай інспэкцыі. У сьнежні 1992 г. узначаліў гандлёва-прамысловую фірму «Івацэвічы». Дэпутат ВС 13 скліканьня. У кастрычніку 1997 году арыштаваны па абвінавачаньні ў даваньні хабару службовай асобе. Адбыў турэмнае зьняволеньне. Чалец АГП. У 2001 г. быў даверанай асобай кандыдата ў прэзыдэнты Ўладзімера Ганчарыка. Пасьля выбараў зьехаў займацца бізнэсам ва Ўкраіну.

**Кучынскі Віктар**

Нарадзіўся 2 ліпеня 1958 году ў вёсцы Забродзьдзе Жыткавіцкага раёну. Па адукацыі вайсковец-палітработнік (мае званьне падпалкоўніка), юрыст, эканаміст, выкладчык гісторыі і сацыяльна-палітычных дысцыплінаў. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьня. Падчас выбарчай кампаніі 1994 г. агітаваў за Лукашэнку, у пэрыяд канстытуцыйнага крызысу 1996 г. выявіў сябе гарачым прыхільнікам прэзыдэнта. Дырэктар Дэпартамэнту па гуманітарнай дапамозе і памочнік прэзыдэнта ў адстаўцы. Дэпутат палаты прадстаўнікоў ад моманту яе заснаваньня і да сёньня. Дазваляе сабе крытыку асобных дзеяньняў ураду.

**Лабановіч Яўген**

Нарадзіўся 24 ліпеня 1975 году ў г. Менску. Скончыў БДУ, юрыст-правазнавец. У 1999-2002 гг. – старшыня выканкаму АГП. У дадзены момант – старшыня менскай гарадзкой арганізацыі АГП. У 2001 годзе актыўна агітаваў за С. Домаша. Атрымаў вядомасьць, заявіўшы ў канцы 2003 году, што расійскі рэжым горшы за лукашэнкаўскі. У 2004 годзе балятаваўся ў палату прадстаўнікоў, паводле афіцыйных зьвестак, набраў 14,2% галасоў.

**Латыпаў Урал**

Нарадзіўся 28 лютага 1951 году ў вёсцы Катаева Бакалінскага раёну (Башкартастан, Расія). Закончыў Казанскі ўнівэрсытэт (1973), Вышэйшыя курсы КДБ СССР у Менску (1974). Пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады прызначаны на пасаду памочніка прэзыдэнта па вонкавай палітыцы. Зь сьнежня 1998 г. — міністар замежных справаў, зь лістапада 2000 г. «дзяржаўны сакратар Рады бясьпекі Рэспублікі Беларусі — памочнік Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі па нацыянальнай бясьпецы». Адыграў ключавую ролю ў плянаваньні і правядзеньні выбарчай кампаніі Лукашэнкі ў 2001 годзе. Адразу пасьля выбараў прызначаны кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта замест Міхаіла Мясьніковіча. Адзін з арганізатараў незаконнага рэфэрэндуму 17 кастрычніка 2004 г. У сьнежні 2004 г. адпраўлены ў адстаўку з пасады кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі (заменены В.Шэйманам).

**Леванеўскі Валер**

Нарадзіўся 15 жніўня 1963 году ў Горадні. Працаваў аўтасьлесарам, электраманцёрам,

інжынэрам, быў індывідуальным прадпрымальнікам. Быў чальцом АГП, уваходзіў у Паліт-савет гэтай партыі, кіраваў гарадзенскай рэгіянальнай арганізацыяй. У 2000 годзе быў выключаны з АГП. Лідэр незарэгістраванага Беларускага прафсаюзу прадпрымальнікаў. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 году. На этапе збору подпісаў быў зьняты з дыстанцыі. У часе падрыхтоўкі першамайскай дэманстрацыі 2004 г. раздаваў улёткі з сатырычным вершам, у якім праваахоўныя органы ўбачылі намёк на Лукашэнку. Увосень 2004 г. быў асуджаны разам з А.Васільевым за "абразу прэзыдэнта". У дадзены момант знаходзіцца ў зьняволеньні. Інтэрнэт-старонка http://www.levonevski.net. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. і пазьней працавала старонка групы падтрымкі Леванеўскага, прысьвечаная беларускай палітыцы http://newbelarus.by.ru.

**Лінг Сяргей**

Нарадзіўся 7 траўня 1937 году ў г. Менску. Па адукацыі аграном. Да абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў міністрам эканомікі. У 1991–1996 гг. віцэ-прэм'ер. 18 лістапада 1996 году, пасьля адстаўкі прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра, Лінг ачоліў урад. 18 лютага 2000 г. пайшоў у адстаўку з пасады прэм'ер-міністра (заменены У. Ярмошыным). 11 жніўня 2000 г. прызначаны сталым прадстаўніком Беларусі пры ААН. З 2002 г. – на пэнсіі.

**Лукашэнка Аляксандар**

Нарадзіўся 30 жніўня 1954 году ў мястэчку Копысь Аршанскага раёну ў няпоўнай сям'і. Прозьвішча «Лукашэнка» атрымаў ад дзеда — матчынага бацькі. Па першай адукацыі настаўнік гісторыі і грамадазнаўства, па другой — эканаміст аграпрамысловай вытворчасьці. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў дырэктарам саўгасу «Гарадзец» Шклоўскага раёну Магілёўскай вобласьці. Дэпутат ВС 12 скліканьня, старшыня часовай Камісіі па расьсьледаваньні дзейнасьці камэрцыйных структур, у народзе званай камісіяй па барацьбе з карупцыяй (1993 – 1994 гг.). Праславіўся дзякуючы антыкарупцыйным выступам, у якіх выкрываліся чыноўнікі сярэдняга ўзроўню і кіраўніцтва Вярхоўнага савету. Справакаваў адстаўку С.Шушкевіча з пасады старшыні ВС у студзені 1994 г. Пераможца першых (1994) другіх (2001) і трэціх (2006) прэзыдэнцкіх выбараў. Па афіцыйных зьвестках, на выбарах 2001 г. атрымаў падтрымку каля 75% беларускіх выбарцаў. Дабіваўся падтрымкі сваіх ініцыятыў на рэфэрэндумах 1995, 1996 і 2004 гадоў. Афіцыйны сайт http://www.president.gov.by (расійская і ангельская мовы). Шмат цікавай інфармацыі пра Лукашэнку можна знайсьці на старонках http://www.compromat.ru/main/lukashenko/hist1.htm, http://www.terra.es/personal2/monolith/belarus.htm, http://www.lukashenko.com/, http://alexluka.chat.ru/. Найбліжэйшаму атачэньню Лукашэнкі прысьвечана старонка http://www.batke.net/.

**Лябедзька Анатоль**

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1961 году ў вёсцы Трылес Стаўпецкага раёну. Працаваў трактарыстам у калгасе. У 1985 годзе атрымаў вышэйшую адукацыю па спэцыяльнасьці выкладчык гісторыі. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьня. Падчас выбарчай кампаніі 1994 г. падтрымаў Лукашэнку, але неўзабаве расчараваўся ў ім. Уступіў у АГП, быў абраны намесьнікам старшыні гэтай партыі. 15 красавіка 2000 г. абраны старшынём АГП. Падчас выбараў 2001 г. быў даверанай асобай У.Ганчарыка. У сярэдзіне 2002 г. публічна заяўляў пра сябе як пра

лідэра беларускай апазыцыі. На выбарах у палату прадстаўнікоў у кастрычніку 2004 г., набраўшы 26,4% (паводле афіцыйных зьвестак), прайграў чыноўніцы Менгарвыканкаму Ірыне Аляксанавай. Быў моцна зьбіты ў часе масавых пратэстаў супраць вынікаў рэфэрэндуму (19 кастрычніка 2004 г.). У лютым 2005 году зьезд АГП афіцыйна назваў яго прэтэндэнтам на прэзыдэнцкую пасаду. На Кангрэсе дэмакратычных сілаў у кастрычніку 2005 г., саступіўшы некалькі галасоў А.Мілінкевічу, ня быў абраны «адзіным кандыдатам у прэзыдэнты», аднак узначаліў Нацыянальны камітэт пры перадвыбарным штабе Мілінкевіча («ценявы ўрад»).

**Лявонаў Васіль**

Нарадзіўся 16 красавіка 1938 году ў вёсцы Дубеец Касьцюковіцкага раёну. Атрымаў вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю. У 1983–1990 гг. — першы сакратар Магілёўскага абкаму КПБ. Пасьля здабыцьця Беларусяй незалежнасьці прызначаны гандлёвым прадстаўніком Беларусі ў Нямеччыне. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Міністар сельскай гаспадаркі і харчаваньня ўва ўрадзе Лукашэнкі. 11 лістапада 1997 году арыштаваны па абвінавачаньні ў фінансавых махлярствах і злоўжываньні службовым становішчам. 14 студзеня 2000 году асуджаны на 4 гады турмы. 5 кастрычніка 2000 году вызвалены па амністыі. Кіраўнік аргкамітэту руху «За новую Беларусь», потым (з 2002 г.) – старшыня апякунскай рады беларускарасійскага Фонду «За новую Беларусь» (інтэрнэт-старонка www.newbelarus.info). У 2001 г. узначальваў выбарчы штаб Уладзімера Ганчарыка. У пачатку 2005 г. у лекцыі для актывістаў апазыцыі прапаноўваў праект зьменаў канстытуцыі Беларусі. У сьнежні 2005 г. публічна выказаўся за байкот апазыцыяй прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г.

**Ляўковіч Анатоль**

Нарадзіўся ў 1953 годзе. Па адукацыі філёзаф. Кандыдат навук, дацэнт, працаваў у Берасьцейскім дзяржаўным унівэрсытэце. Доўгі час кіраваў берасьцейскай абласной суполкай партыі БСДП (НГ). У 2001 г. кіраваў выбарчай кампаніяй У. Ганчарыка ў Берасьцейскай вобласьці. Пазьней быў адным зь лідэраў групоўкі, якая ў канцы 2004 г. адхіліла М.Статкевіча з пасады лідэра БСДП (НГ). У 2004 г. балятаваўся на выбарах у палату прадстаўнікоў у Берасьці, паводле афіцыйных зьвестак, набраў 10,4% і ня быў абраны дэпутатам. У студзені 2005 г. быў абраны старшынём БСДП (НГ) (замест М. Статкевіча). У дадзены момант – намесьнік старшыні партыі БСДП (Г).

**Малафееў Анатоль**

Нарадзіўся 14 траўня 1933 году ў г. Гомелі. Па адукацыі эканаміст. Апошні першы сакратар ЦК КПБ (1990–1991). Дэпутат ВС 13 скліканьня, намесьнік старшыні Камісіі па эканамічнай палітыцы і рэформах. Пасьля канстытуцыйнага перавароту 1996 году і да 2000 году — старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі першага скліканьня, пазьней – чалец савету рэспублікі.

**Малумаў Юры**

Нарадзіўся 26 студзеня 1957 году. Па першай адукацыі інжынэр-будаўнік, па другой — юрыст. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьня. Адзін з суаўтараў антыкарупцыйнага дакладу, агучанага А. Лукашэнкам у 1993 г., падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. працаваў у выбарчым

штабе Лукашэнкі. У лістападзе 1996 г., будучы чальцом прэзыдыюму Вярхоўнага савету, спрычыніўся да зрыву імпічмэнту. Пазьней быў абвінавачаны ў кватэрных махлярствах і вымушаны пакінуць вялікую палітыку.

**Мальцаў Леанід**

Нарадзіўся 29 жніўня 1949 году ў вёсцы Вецянееўка Слонімскага раёну. Кадравы вайсковец. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці вучыўся ў Ваеннай акадэміі Генэральнага штабу Ўзброеных Сілаў у Маскве. У 1995–1996 гг. міністар абароны. Адхілены з пасады за зьяўленьне ў публічным месцы ў нецьвярозым выглядзе. 28 сакавіка 2001 году зноў прызначаны міністрам абароны.

**Маркевіч Мікола**

Нарадзіўся 29 чэрвеня 1962 году ў вёсцы Чэрнічы Жыткавіцкага раёну. Скончыў Калінінградзкі дзяржаўны ўнівэрсытэт, працаваў у абласной газэце «Гродзенская праўда». Дэпутат ВС 12 скліканьня, чалец фракцыі БНФ. З 1992 году рэдагаваў газэту «Пагоня», зачыненую ўладамі праз суд пасьля выбараў 2001 г. У 2002 г. разам з журналістам «Пагоні» П. Мажэйкам быў асуджаны паводле крымінальнага артыкулу да абмежаваньня волі за «абразу прэзыдэнта». Вызвалены ў 2003 г. Узначаліў гарадзенскую суполку «Таварыства беларускай мовы», выдаваў газэту «День». Застаецца актывістам партыі БНФ, уваходзіць у каманду А. Мілінкевіча.

**Марыніч Міхаіл**

Нарадзіўся 13 студзеня 1940 году ў вёсцы Старыя Галоўчыцы Петрыкаўскага раёну. Па першай адукацыі інжынэр-будаўнік, а па другой — перакладнік з ангельскай мовы. Дэпутат ВС 12 скліканьня. У пачатку 1990-х гадоў працаваў старшынём Менскага гарвыканкаму. У 1994 годзе прызначаны паслом у Чэхіі, Вугоршчыне і Славаччыне. У тым жа годзе быў пераведзены на пасаду міністра замежных эканамічных сувязяў. З 1999 году пасол Беларусі ў Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 году, але не сабраў досыць подпісаў за сваё вылучэньне, пасьля чаго стаў даверанай асобай Уладзімера Ганчарыка. Пасьля выбараў займаўся грамадзкай дзейнасьцю ў асацыяцыі «Дзелавая ініцыятыва», значнай часткай апазыцыі разглядаўся як верагодны супернік Лукашэнкі на будучых прэзыдэнцкіх выбарах. 25 красавіка 2004 г. быў арыштаваны КДБ па абсурдных падставах, у канцы сьнежня 2004 г. асуджаны судом Менскага раёну і г. Заслаўя да 5 гадоў калёніі ўзмоцненага рэжыму за прысабечваньне маёмасьці пасольства ЗША – патрыманай аргтэхнікі (касацыйны суд зьнізіў тэрмін зьняволеньня да 3,5 гадоў). У дадзены момант адбывае пакараньне.

**Матусевіч Валянціна**

Нарадзілася 28 верасьня 1956 году. Скончыла БДУ, па адукацыі інжынэр. Працавала ў рэспубліканскім вылічальным цэнтры. З 1984 году – на прафсаюзнай рабоце. У 1993-2002 гадох працавала ў Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі, на дадзены момант супрацоўніца Міжнароднага інстытуту працоўных і сацыяльных адносінаў (вышэйшая навучальная ўстанова ФПБ). Далучылася да Беларускай партыі жанчын «Надзея» у 1998 годзе, у 2000-2001 гадох прадстаўляла партыю ў КРАПП і КРДС, а ў жніўні 2002 году была абрана старшынёй «Надзеі». На

час абраньня выконвала абавязкі прэс-сакратаркі Л. Козіка, дэ-факта прызначанага А.Лукашэнкам старшынём ФПБ.

**Мацкевіч Уладзімер Аляксандравіч**

Нарадзіўся 1 сакавіка 1947 году ў мястэчку Марына Горка Пухавіцкага раёну. Па адукацыі інжынэр-тэхноляг. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў у органах КДБ. З 20 сьнежня 1995 г. — старшыня КДБ. 27 лістапада 2000 году быў адпраўлены ў адстаўку з гэтай пасады за тое, што спрабаваў расьсьледаваць справу аб выкраданьні людзей і памясьціў у сьледчы ізалятар КДБ падазронага Дзьмітрыя Паўлічэнку (хутка вызваленага на загад А.Лукашэнкі). З 2001 году — пасол Беларусі ў Югаславіі. 4 ліпеня 2002 г. быў прызначаны паслом Беларусі ў Босьніі і Герцагавіне па сумяшчальніцтве.

**Мацкевіч Уладзімер Уладзімеравіч**

Нарадзіўся 14 траўня 1956 году ў Іркуцкай вобласьці ў сям'і, дэпартаванай з Заходняй Беларусі. У 1970-х гадах працаваў фрэзэроўшчыкам на Гарадзенскім заводзе карданных валоў. Атрымаў псыхалягічную і філязофскую адукацыю. Займаўся пэдагагічнай і кансультацыйнай дзейнасьцю, стварыў шэраг удумлівых кніг пра сучасную беларускую палітыку. У 1991-92 гадах быў чыноўнікам у справах нацыянальных меншасьцяў Латвійскай рэспублікі. Пераехаўшы ў Беларусь, уступіў у Аб'яднаную дэмакратычную партыю, балятаваўся ад яе на выбарах у Вярхоўны савет у траўні 1995 г. (няўдала). У 1995-1998 гг. уваходзіў у Палітсавет АГП, пэўны час працаваў прэс-сакратаром АГП, быў адным з заснавальнікаў грамадзка-палітычнага руху «Хартыя-97». Расчараваўшыся ў «традыцыйнай апазыцыі», у канцы 2005 г. абвясьціў пра намер стварыць уласную партыю, якая мусіць абапірацца на хрысьціянскія каштоўнасьці і прыцягнуць, перш за ўсё, вернікаў-пратэстантаў. Пэрсанальная старонка ў сеціве – http://www.worvik.com/worvik.htm.

**Мацьвяйчук Уладзімер**

Нарадзіўся ў 1950 годзе на Віцебшчыне. Аднакурсьнік А. Лукашэнкі па гістарычным факультэце Магілёўскага пэдінстытуту (1970-я гады). Былы намесьнік старшыні Хоцімскага райвыканкаму. Да 2004 году працаваў намесьнікам дырэктара ААТ «Шкловалакно» па кадрах, у верасьні 2003 году з падачы канцэрну «Белнафтахім» быў абраны ў назіральную раду прадпрыемства. У 2004 г. нечакана для многіх указам прэзыдэнта быў прызначаны старшынём Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі (замест пасаджанага ў турму Ягора Рыбакова). Ад канца сьнежня 2005 г. – міністар культуры.

**Машэрава Наталя**

Нарадзілася 18 красавіка 1945 году ў г. Вялейцы. Дачка былога першага сакратара КПБ Пятра Машэрава, які загінуў у аўтакатастрофе 4 кастрычніка 1980 г. Па адукацыі філёляг. Балятавалася ў ВС 13 скліканьня, прайграла лідэру камуністаў Васілю Новікаву. Увосень 2000 г. на выбарах у ніжнюю палату лукашэнкаўскага парлямэнту перамагла Міхаіла Чыгіра. Удзельнічала ў выбарчай кампаніі 2001 г., адмовілася ад барацьбы на этапе збору подпісаў. Паводле некаторых зьвестак, пастанова аб зьняцьці кандыдатуры Машэравай была прынятая на адным з паседжаньняў Рады бясьпекі. У час свайго дэпутацтва (2000-2004) дазваляла сабе крытычныя выказваньні на адрас выканаўчай улады, у лютым 2005 году далучылася да грамадзка-палітычнага руху А. Казуліна «Воля народу».

**Мілінкевіч Аляксандар**

Нарадзіўся 25 ліпеня 1947 году ў г. Горадні. Фізык, кандыдат фізыка-матэматычных навук, выкладчык, краязнавец. З 1990 і да пачатку 1996 году быў намесьнікам старшыні гарвыканкаму Горадні, пасьля адстаўкі актыўна займаўся грамадзкай дзейнасьцю (кіраваў Беларускай асацыяцыяй рэсурсавых цэнтраў, грамадзкім аб’яднаньнем «Ратуша», зьліквідаваным праз суд у 2003 г.). У 2004-2005 гг. – кіраўнік праграмаў грамадзкага аб’яднаньня «Фонд садзеяньня лякальнаму разьвіцьцю» (старшыня – В. Карняенка). У 2001 г. узначальваў передвыбарны штаб кандыдата ў прэзыдэнты Сямёна Домаша. У 2004 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў па Шчучынскай акрузе і паводле афіцыйных зьвестак набраў 18,1% галасоў, прайграўшы памочніку А. Лукашэнкі – інспэктару прэзыдэнта ў Гарадзенскай вобласьці Вінцэнт Казяку. У пачатку 2005 г. быў вылучаны ў якасьці верагоднага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г. Беларускай партыяй «Зялёныя», а неўзабаве кандыдатура Мілінкевіча была падтрыманая і Соймам партыі БНФ. На Кангрэсе дэмакратычных сілаў, праведзеным у Менску ў кастрычніку 2005 г., зь невялікай перавагай супроць А. Лябедзькі быў абраны «адзіным дэмакратычным кандыдатам» у прэзыдэнты. Старонка каманды Мілінкевіча ў сеціве: http://www.milinkevich.org.

**Міхалевіч Аляксей (Алесь)**

Нарадзіўся 15 траўня 1975 году ў г. Менску. Па адукацыі палітоляг-юрыст. Дырэктар фірмы «Аркадзія», актывіст БНФ. Узначальваў грамадзкія аб’яднаньні «Задзіночаньне беларускіх студэнтаў» і «Моладзевы інфармацыйны цэнтар», ліквідаваныя ўладамі праз суд. У сьнежні 2001 году ўвайшоў у сойм БНФ, а з сьнежня 2003 г. – намесьнік старшыні партыі. У сакавіку 2003 году быў абраны ў Пухавіцкі раённы савет дэпутатаў. Стаў адным з каардынатараў Асамблеі дэпутатаў мясцовых саветаў, утворанай у чэрвені 2003 г. (разам з В. Бычком, М. Афанасьевым і Л. Гаравым). У 2004 годзе кандыдаваў у палату прадстаўнікоў у Менску, аднак быў зьняты з дыстанцыі акруговай камісіяй напярэдадні галасаваньня. З 2005 году – у камандзе кандыдата ў прэзыдэнты А. Мілінкевіча. Заявіў пра жаданьне балятавацца на пасаду старшыні БНФ у 2007 годзе.

**Мясьніковіч Міхаіл**

Нарадзіўся 6 траўня 1950 году ў вёсцы Новы Сноў Нясьвіскага раёну. Па адукацыі інжынэр. Працаваў на партыйных пасадах і ў Менскім гарвыканкаме; на момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці займаў пасаду першага намесьніка Старшыні Савету міністраў. Пасьля прыходу Лукашэнкі да ўлады прызначаны намесьнікам прэм’ер-міністра. У 1990-х гадох здолеў абараніць дзьве дысэртацыі (кандыдацкую і доктарскую), у эканамічных навуках. З кастрычніка 1995 г. — кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 9 верасьня 2001 г. пайшоў у адстаўку, але хутка быў прызначаны памочнікам Лукашэнкі ў асаблівых даручэньнях, а ў кастрычніку 2001 г., ня маючы акадэмічнай годнасьці, – прэзыдэнтам Акадэміі навук (з 2003 г. – старшыня прэзыдыюму Нацыянальнай акадэміі навук). Быў і застаецца адным з найбольш уплывовых чыноўнікаў Беларусі, нягледзячы на пэрыядычныя абвінавачваньні на яго адрас з боку лукашэнкаўцаў-радыкалаў.

**Навасяд Уладзімер**

Нарадзіўся 12 красавіка 1968 году ў г. Кіеве (Украіна). Па адукацыі выкладчык гісторыі і юрыст. Дэпутат ВС 13 скліканьня, намесьнік старшыні Камісіі па дзяржаўным будаўніцтве і

самакіраваньні. Кіраваў грамадзкім аб’яднаньнем «Грамадзянскі форум», якое да 2000 году мела статус моладзевай арганізацыі АГП. Да 2000 г. чалец Палітсавету АГП, у 1995–1997 гг. старшыня АГП г. Магілёва. У лістападзе 1996 году адклікаў свой подпіс пад зваротам дэпутатаў у Канстытуцыйны Суд для пачатку працэдуры імпічмэнту Лукашэнку, аднак у палату прадстаўнікоў І скліканьня не перайшоў. У 2000 годзе, прыпыніўшы сяброўства ў АГП, абраны дэпутатам ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту. У сакавіку 2001 году дапамагаў М. Статкевічу на выбарах у палату прадстаўнікоў у час паўторнага галасаваньня. Быў адным з заснавальнікаў «Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь». У 2003-2005 гг. тройчы спрабаваў зарэгістраваць уласную партыю пад рознымі назовамі, аднак атрымліваў адмовы ад уладаў. У 2004 г. ня трапіў у палату прадстаўнікоў: быў адсеяны на этапе рэгістрацыі. У 2005 г. разам з актывістамі «Грамадзянскага форуму» далучыўся да каманды А. Мілінкевіча.

**Навіцкі Генадзь**

Нарадзіўся 2 студзеня 1949 году ў г. Магілёве. Па адукацыі інжынэр-будаўнік. У 1970-80-х гг. працаваў на кіраўнічых пасадах у Магілёўскім абкаме КПБ. На момант абвяшчэньня незалежнасьці – старшыня праўленьня Магілёўскага абласнога сельбуду. З 1994 – міністар архітэктуры і будаўніцтва. 11 траўня 1998 году быў прызначаны намесьнікам прэм’ер-міністра, а ў кастрычніку 2001 году стаў прэм’ер-міністрам. 10 ліпеня 2003 году вызвалены з гэтай пасады ўказам Лукашэнкі за невыкананьне даручэньняў прэзыдэнта і фальсыфікацыю зьвестак. 28 ліпеня 2003 г. быў прызначаны Лукашэнкам у Савет рэспублікі і адразу выбраны старшынём. Застаўся на гэтай пасадзе і пасьля выбараў 2004 г.

**Навумаў Уладзімер**

Нарадзіўся ў 1956 годзе ў г. Смаленску (Расія). Кадравы работнік МУС. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці — камандзір атраду спэцыяльнага прызначэньня МУС «Алмаз». 20 студзеня 1999 г. быў прызначаны начальнікам службы бясьпекі прэзыдэнта, з 25 верасьня 2000 г. міністар унутраных справаў.

**Нісьцюк Уладзімер**

Нарадзіўся ў 1950 годзе ў г. Багародзку (Расія). Закончыў Новасібірскую вышэйшую вайсковую палітычную агульнавайсковую вучэльню (1972). Нейкі час працаваў камісарам Берасьцейскай крэпасьці. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году працаваў у выбарчым штабе Лукашэнкі, быў яго прэс-сакратаром. Пасьля перамогі Лукашэнкі быў прызначаны начальнікам упраўленьня кантролю органаў выканаўчай улады. Дэпутат ВС 13 скліканьня. У 1996 годзе перайшоў у апазыцыю Лукашэнку. У канцы 1990-х гадоў актывіст Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная Грамада» (быў сакратаром ЦК), пазьней – намесьнік старшыні БСДП (НГ). На выбарах 2001 г. — давераная асоба У. Ганчарыка. У верасьні 2004 г. быў уключаны ад БСДП (НГ) у склад Цэнтравыбаркаму як чалец камісіі з дарадчым голасам. У канцы 2004 г. – адзін зь ініцыятараў зьмяшчэньня М. Статкевіча з пасады старшыні БСДП (НГ). Пасьля выключэньня М. Статкевіча з партыі пэўны час выконваў абавязкі старшыні БСДП (НГ). У дадзены момант адзін зь кіраўнікоў партыі БСДП (Г).

**Новікаў Васіль**

Нарадзіўся 21 лютага 1946 году ў вёсцы Ламачына Аршанскага раёну. Па адукацыі філё-

заф, доктар навук. У гады існаваньня СССР быў камуністычным функцыянэрам сярэдняга ўзроўню. У 1994 г. узяў удзел у прэзыдэнцкіх выбарах, заняў апошняе, 6-е месца. Дэпутат ВС 13 скліканьня (на выбарах 1995 г. перамог Н. Машэраву). У 1996 г. быў абраны першым намесьнікам старшыні ВС С. Шарэцкага. Пэўны час меў пасаду сакратара ЦК Партыі камуністаў беларускай. Пакінуў апазыцыю і ў 1998 годзе быў прызначаны дарадцам амбасады Рэспублікі Беларусі ў Рэспубліцы Малдове, з 2004 г. – дырэктар Інстытуту філязофіі Нацыянальнай акадэміі навук.

**Нявыглас Генадзь**

Нарадзіўся 11 лютага 1954 году ў вёсцы Парахонск Пінскага раёну. Скончыў Маскоўскую вышэйшую памежную камандную вучэльню КДБ і Вышэйшую школу КДБ СССР. У 1975-2000 гадох служыў у памежных вайсках, апошняя пасада – намесьнік старшыні Дзяржаўнага камітэту памежных войскаў Беларусі. 4 сьнежня 2000 году стаў начальнікам Службы бясьпекі прэзыдэнта (замест Л. Ерына). Адразу пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году прызначаны дзяржсакратаром Савета Бясьпекі (замест У. Латыпава). Адначасова заняў пасаду памочніка прэзыдэнта па нацыянальнай бясьпецы. У сакавіку 2003 году быў выбраны прэзыдэнтам асацыяцыі «Беларуская фэдэрацыя футболу».

**Орда Міхаіл**

Нарадзіўся 28 верасьня 1966 году ў г.п. Дзятлава Гарадзенскай вобласьці. Па адукацыі вэтэрынар. Працаваў другім сакратаром ЦК БПСМ, з 2002 году – першы сакратар ЦК БРСМ, праўладнай арганізацыі для моладзі, якая ў значнай ступені фінансуецца зь дзяржаўнага бюджэту. У 2000 годзе быў абраны дэпутатам палаты прадстаўнікоў, пазьней названы А. Лукашэнкам адным са сваіх нефармальных прадстаўнікоў у парлямэнце. У 2004 г. балятаваўся па Лідзкай сельскай акрузе і быў пераабраны ў палату прадстаўнікоў.

**Пазьняк Зянон**

Нарадзіўся 24 красавіка 1944 году ў мястэчку Суботнікі Івейскага раёну. Па адукацыі тэатразнаўца, кандыдат навук. Фатограф, паэт, змагар за захаваньне гістарычнай спадчыны ў Беларусі. З канца 80-х і да цяперашняга часу адзін зь лідэраў беларускага нацыянальна-вызвольнага руху. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Старшыня БНФ «Адраджэньне» (з 1989) і партыі БНФ (з 1993). Удзельнічаў у прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г., заняў 3-е месца. У красавіку 1996 г. выехаў зь Беларусі, баючыся за сваё жыцьцё. Нязьменны лідэр Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ (з 1999 г.). Спрабаваў уступіць у прэзыдэнцкую гонку 2001 г.; яго ініцыятыўная група была зарэгістравана Цэнтравыбаркамам пасьля адмысловай пастановы Канстытуцыйнага суду, аднак ня здолела сабраць дастатковай колькасьці подпісаў. Заявіў пра намер балятавацца на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г., прапанаваўшы праект «Народнае галасаваньне», паводле якога выбарцы мусяць забіраць бюлетэні для галасаваньня з участкаў і перадаваць іх «грамадзкай камсіі». У канцы сьнежня 2005 г. яго ініцыятыўная група была зарэгістраваная Цэнтравыбаркамам, аднак не сабрала досыць подпісаў. Шмат цікавых зьвестак пра З.Пазьняка можна знайсьці на сайтах www.bielarus.net, www.pazniak.com, www.zianonpazniak.de.

**Палевікова Валянціна**

Нарадзілася ў 1950 годзе ў вёсцы Касьцяшы Любанскага раёну. Па адукацыі матэматык,

па спэцыяльнасьці інжынэр. З 1992 г. функцыянэрка Фэдэрацыі прафсаюзаў беларускай. Старшынька Беларускай партыі жанчын «Надзея» да лета 2002 г. Падчас выбарчай кампаніі 2001 г. была актывісткай выбарчага штабу Ўладзімера Ганчарыка. У 2002 г. адхілена ад пасады кіраўніцы партыі «Надзея» (прайграла В. Матусевіч). Была адной з заснавальніц Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі, а пасьля адмовы ў яе рэгістрацыі ў чэрвені 2003 г. шукала сабе месца ў Беларускай дэмакратычнай партыі Ў. Навасяда (таксама незарэгістраванай). У 2004 г. далучылася да АГП і спрабавала балятавацца ад гэтай партыі ў палату прадстаўнікоў, аднак была зьнята акруговай камісіяй. У канцы 2005 году стала каардынаткай выбарчай кампаніі А. Мілінкевіча ў горадзе Менску. Шмат цікавых зьвестак пра яе на старонцы http://www.polevikov.com/family/Valentina/.

**Папкоў Сяргей**

Нарадзіўся 13 лютага 1940 году ў г. Новая-Ляля Сьвярдлоўскай вобласьці (Расія) у сям'і выхадцаў зь Беларусі. Інжынэр, скончыў Днепрапятроўскі дзяржаўны ўнівэрсытэт. Дэпутат Вярхоўнага савету 12 скліканьня ад фракцыі БНФ. З 1999 г. намесьнік старшыні партыі КХП-БНФ. У 2003 г. разам з групай іншых сяброў КХП-БНФ спрабаваў прыцягнуць да судовай адказнасьці грамадзяніна Лукашэнку за падпісаньне антыканстытуцыйных пагадненьняў з Расіяй. У сьнежні 2005 г. узначаліў ініцыятыўную групу за вылучэньне Зянона Пазьняка кандыдатам у прэзыдэнты.

**Папоў Вадзім**

Нарадзіўся 5 ліпеня 1940 году ў г. Дзямідава (Расія). У 1971 г. закончыў Беларускі інстытут мэханізацыі сельскай гаспадаркі, а ў 1984 г. — Менскую вышэйшую партыйную школу. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў першым сакратаром Магілёўскага абкаму КПБ. У 1999–2000 гг. першы намесьнік міністра, міністар сельскай гаспадаркі і харчаваньня. 21 лістапада 2000 г. абраны старшынём палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі II скліканьня (ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту) і заставаўся ім да 2004 г. Пасьля выбараў 2004 году заняў пасаду старшыні камісіі палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах.

**Парфяновіч Уладзімер**

Нарадзіўся 2 сьнежня 1958 г. у г. Менску. Па адукацыі выкладчык фізычнай культуры і спорту. Заслужаны майстар спорту, трохразовы алімпійскі чэмпіён у веславаньні. Працаваў трэнэрам, служыў у войсках КДБ і МУС. У канцы 1990-х гадоў актыўна займаўся бізнэсам. Увосень 2000 г. быў абраны ў палату прадстаўнікоў. У 2002-2003 гг. узначальваў дэпутацкую групу «Рэспубліка». У 2003 годзе, пасьля першага туру выбараў у мясцовыя саветы, разам з В. Фраловым і Ў. Навасядам дабіўся пераліку галасоў у адной зь менскіх акругаў. У чэрвені 2004 году галадаваў разам з С. Скрабцом і В. Фраловым дзеля недапушчэньня ўзурпацыі ўлады А. Лукашэнкам. Увосень 2004 г. ня змог балятавацца ў палату прадстаўнікоў (адсеяны акруговай камісіяй), а ў 2005 годзе адмовіўся браць удзел у прэзыдэнцкіх выбарах. У пачатку 2005 году заявіў пра стварэньне антыядзернага руху, які б супрацьстаяў будаўніцтву АЭС у Беларусі.

**Паўлаў Міхаіл**

Нарадзіўся ў 1952 годзе на Магілёўшчыне. Скончыў Магілёўскі машынабудаўнічы тэхні-

кум, акадэмію народнай гаспадаркі пры ўрадзе Расіі. Інжынэр-мэханік, кандыдат тэхнічных навук. Працаваў дырэктарам заводу сянажных вежаў у Баранавічах. У 1997-2000 гг. – старшыня Баранавіцкага гарвыканкаму. У сакавіку 2000 году зацьверджаны старшынём Менгарвыканкаму (замест У. Ярмошына). У сьнежні 2000 году праз указ А. Лукашэнкі прызначаны чальцом Савету рэспублікі. У траўні 2004 году абраны старшынём Беларускай тэніснай асацыяцыі (замест С. Кагана). У якасьці «мэра Менску» спрычыніўся да абмежаваньня права грамадзянаў на сходы і асацыяцыі.

**Пашкевіч Іван**

Нарадзіўся 11 траўня 1955 году ў вёсцы Беражное (Бор-Дубянец) Столінскага раёну. Па адукацыі журналіст. У 1997 г. прызначаны намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Дэпутат ВС 13 скліканьня. Да кастрычніка 1996 г. чалец Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, быў выключаны за калябарацыю з рэжымам, уступіў у СДПНЗ. У 2000 годзе абраны дэпутатам ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту. Падчас прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі 2001 г. працаваў у выбарчым штабе М.Марыніча. У 2002 г., адстойваючы інтарэсы сваіх выбарцаў-пратэстантаў, быў адным з арганізатараў беспасьпяховага супраціву прыняцьцю Закона «Аб свабодзе сумленьня», які надаў перавагу праваслаўю. У 2004 г. ня быў пераабраны ў палату прадстаўнікоў (паводле афіцыйных зьвестак, у Столінскай акрузе набраў 20% галасоў).

**Посахаў Сяргей**

Нарадзіўся 29 лістапада 1944 году ў г. Іркуцку (Расія). Кадравы вайсковец, у 1990-я гады – актывіст КПБ. Падчас выбарчай кампаніі 1994 г. далучыўся да выбарчага штабу Лукашэнкі. Пасьля яго перамогі прызначаны памочнікам прэзыдэнта Беларусі ў палітычных пытаньнях і па сумяшчальніцтве прадстаўніком Беларусі ў органах СНД. З апошняй пасады быў адпраўлены ў адстаўку ў 2000 г., а з пасады памочніка прэзыдэнта – у лістападзе 2001 г. Вярнуўся ў Расію. У 2005 г. раскрытыкаваў палітыку Лукашэнкі, зазначыўшы, што Беларусі патрэбны не пастух з пугай, а палітык кшталту Вацлава Гаўла.

**Пракаповіч Пётра**

Нарадзіўся 3 лістапада 1942 году. Па адукацыі інжынэр-будаўнік. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Працаваў намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта, першым намесьнікам прэм'ер-міністра. З 1998 г. старшыня праўленьня Нацыянальнага банку.

**Праляскоўскі Алег**

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1963 году ў Маскоўскай вобласьці. У 1985 годзе скончыў Менскую вышэйшую інжынэрную зэнітную ракетную вучэльню па спэцыяльнасьці інжынэр-радыётэхнік, у 1998 годзе – БДУ. З 1997 па 2002 гг. працаваў у службе бясьпекі А. Лукашэнкі. Са сьнежня 2002 г. па сакавік 2003 г. займаў пасаду генэральнага дырэктара Беларускага тэлеграфнага агенцтва. 25 сакавіка 2003 г. прызначаны намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта, адказным за ідэалагічныя пытаньні. Яго прызначэньне супала з абвяшчэньнем у Беларусі эры афіцыйнай ідэалогіі (сакавік 2003 г.). Лічыцца адным з найбольш дасьведчаных маніпулятараў грамадзкай думкай у Беларусі. У канцы сьнежня 2005 г. адпраўлены ў адстаўку, аднак ужо ў студзені 2006 г. прызначаны памочнікам прэзыдэнта і загадчыкам упраўленьня ідэалогіі ў адміністрацыі Лукашэнкі.

**Пяткевіч Натальля**

Нарадзілася ў 1972 годзе ў г. Менску. Па адукацыі юрыст, скончыла БДУ, кандыдат юрыдычных навук. З 1994 да 2001 г. працавала ў апараце адміністрацыі прэзыдэнта. У 2001-2004 гг. – прэс-сакратарка А. Лукашэнкі. У 2004 г. прызначана намесьніцай кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта, адказвае за падрыхтоўку заканадаўчых актаў. Спрычынілася да прыняцьця ў сьнежні 2005 г. закона аб увядзеньні крымінальнай адказнасьці за «дыскрэдытацыю дзяржавы».

**Раманчук Яраслаў**

Нарадзіўся 10 студзеня 1966 году ў мястэчку Сапоцкін на Гарадзеншчыне. Скончыў Менскі пэдінстытут замежных моваў і асьпірантуру Рэспубліканскага інстытуту вышэйшай школы БДУ. Эканаміст, працаваў у апараце ВС 13 склiканьня. Вядучы экспэрт Аналітычнага цэнтру «Стратэгія». Намесьнік старшыні АГП з красавіка 2000 году, адказвае за міжнародныя зносіны і выпрацоўку эканамічных праграмаў. Прапаноўваў альтэрнатыўны праект бюджэту, ухвалены групай «Рэспубліка» у 2003 годзе. Ня быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты палаты прадстаўнікоў на выбарах увосень 2004 г. і на паўторных выбарах у пачатку 2005 г.

**Рубінаў Анатоль**

Нарадзіўся ў 1939 годзе ў Магілёве. Скончыў БДУ. Доктар фізыка-матэматычных навук, прафэсар, акадэмік. У 2002 годзе з падачы А. Лукашэнкі ачоліў Вышэйшую атэстацыйную камісію, якая пад яго кіраўніцтвам цэнзуравала дысэртацыі па палітычных матывах. У пачатку студзеня 2006 году прызначаны першым намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта.

**Русакевіч Уладзімер**

Нарадзіўся 13 верасьня 1947 году ў вёсцы Выганошчы Івацэвіцкага раёну. Скончыў Гарадзенскі сельскагаспадарчы інстытут і Гарадзенскі педінстытут. Кандыдат філязофскіх навук. Быў камсамольскім і партыйным дзеячом, на момант абвяшчэньня незалежнасьці – намесьнік старшыні Берасьцейскага аблвыканкаму. Дэпутат ВС 12 склiканьня, у сакавіку 1994 году быў абраны намесьнікам старшыні ВС. Са сьнежня 1994 г. працаваў ва ўрадзе М. Чыгіра, адказваў за пытаньні культуры, адукацыі і рэлігіі. У 1997–2000 гг. працаваў першым намесьнікам кіраўніка адміністрацыі прэзыдэнта. У 2000-2003 гг. – паслом у Кітаі. У жніўні 2003 г. прызначаны міністрам інфармацыі замест М. Падгайнага. На гэтай пасадзе працягвае наступ на свабоду слова і друку, распачаты яго папярэднікамі.

**Саньнікаў Андрэй**

Нарадзіўся ў 1954 годзе ў г. Менску. Па адукацыі перакладнік. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў у апараце Міністэрства замежных справаў. Намесьнік міністра замежных справаў (1995–1996). У лістападзе 1996 году сышоў у адстаўку. У дадзены момант каардынатар грамадзкай ініцыятывы «Хартыя'97» (інтэрнэт-старонка www.charter97.org) па міжнародных сувязях. У 2003-2004 гг. разам з М. Статкевічам ачольваў "Эўрапейскую кааліцыю "Свабодная Беларусь" – перадвыбарнае ўтварэньне, альтэрнатыўнае "Пяцёрцы-плюс".

**Сасноў Аляксандар**

Нарадзіўся 14 жніўня 1947 году ў г. Гомелі. Па адукацыі эканаміст. Кандыдат эканамічных

навук. Дэпутат ВС 12 скліканьня, у 1991 годзе разам з А. Лукашэнкам ачольваў фракцыю «Камуністы за дэмакратыю». З 1994 году — міністар працы ўва ўрадзе М. Чыгіра (да лістападу 1996). Чалец АГП, супрацоўнічаў з Фондам Сораса. Працаваў экспэртам, намесьнікам дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (НІСЭПД) (інтэрнэт-старонка www.iiseps.org).

**Севярынец Павал**

Нарадзіўся 30 сьнежня 1976 году ў г. Воршы. Па адукацыі інжынэр-геоляг. Працаваў журналістам, мэнэджэрам па продажах. У 1996 годзе ўступіў у БНФ «Адраджэньне». З лютага 1997 г. старшыня маладзёвай фракцыі БНФ у Менску. У 1998 г. правёў два месяцы ў турэмным зьняволеньні пасьля буйной акцыі пратэсту, наладжанай беларускай апазыцыяй. Сустаршыня (1997), старшыня (1999-2004) «Маладога фронту» — маладзёвага крыла БНФ, якое пад яго кіраўніцтвам прэтэндавала на шырокую аўтаномію. У 1999-2003 гг. намесьнік старшыні БНФ. У 2003 г. пакінуў партыю БНФ на знак нязгоды з палітыкай яе кіраўніцтва. Адзін з заснавальнікаў кааліцыі «Маладая Беларусь» (2004). Спрабаваў балятавацца ў Палату прадстаўнікоў увосень 2004 г. у Віцебску, але быў зьняты з перадвыбарнай гонкі акруговай камісіяй з прычыны «паклёпу на ўладу». У пачатку 2005 г. разам з А.Шэіным і М.Арцюховым абвясьціў пра заснаваньне новай палітычнай сілы – Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі (сайт www.bchd.info). У чэрвені 2005 г. асуджаны да 2 гадоў абмежаваньня волі за арганізацыю акцыяў пратэсту супраць рэфэрэндуму 17 кастрычніка 2004 г. У дадзены момант адбывае пакараньне на лесапавале ў вёсцы Малое Сітна Полацкага раёну, на мяжы з Расіяй. Пэрсанальная старонка ў сеціве, створаная прыхільнікамі ў сьнежні 2005 г.: http://www.seviarynets.net.

**Сівакоў Юры**

Нарадзіўся 5 жніўня 1946 году на Сахаліне (Расія). Кадравы вайсковец. Пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах 1994 г. быў прызначаны начальнікам аддзелу апэратыўнага рэагаваньня Дзяржаўнага сакратарыяту Рады бясьпекі. 30 сьнежня 1996 году прызначаны намесьнікам міністра ўнутраных справаў — камандуючым унутранымі войскамі. 9 лютага 1999 году прызначаны міністрам унутраных справаў. Неўзабаве пайшоў у адстаўку. На момант выбарчай кампаніі працаваў намесьнікам кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. Адразу пасьля выбараў адпраўлены ў адстаўку, але неўзабаве прызначаны міністрам спорту і турызму. На гэтай пасадзе знаходзіўся да ліпеня 2005 г. На студзень 2006 г. – прарэктар недзяржаўнага Менскага інстытуту кіраваньня.

**Сідорскі Сяргей**

Нарадзіўся 13 сакавіка 1954 году ў г. Гомелі. Інжынэр пуцей зносінаў – электрык. Працаваў на гомельскіх заводах, скончыў Беларускі інстытут інжынэраў чыгуначнага транспарту. Доктар тэхнічных навук. У 1998 г. быў прызначаны намесьнікам, потым – першым намесьнікам старшыні Гомельскага аблвыканкаму. 24 верасьня 2001 г. прызначаны намесьнікам прэм’ер-міністра. У яго кампэтэнцыю ўваходзілі пытаньні, што датычылі разьвіцьця прамысловасьці, будаўніцтва, транспарту, энэргетыкі. 3 ліпеня 2002 г. стаў першым намесьнікам прэм’ер-міністра, а 10 ліпеня 2003 г. быў прызначаны Лукашэнкам выконваючым абавязкі прэм’ер-міністра (замест зволенага Генадзя Навіцкага). 19 сьнежня 2003 г. на прапанову Лукашэнкі зацьверджаны палатай прадстаўнікоў на пасадзе прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь.

**Сініцын Леанід**

Нарадзіўся 28 ліпеня 1954 году ў Полацку. Па адукацыі інжынэр-будаўнік. З 1987 году ў апараце Магілёўскага абкаму КПБ на пасадзе інструктара. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. — каардынатар выбарчага штабу Лукашэнкі. Пасьля яго перамогі зь ліпеня 1994 па кастрычнік 1995 году быў кіраўніком Адміністрацыі прэзыдэнта. З кастрычніка 1995 па 6 жніўня 1996 году працаваў намесьнікам прэм'ер-міністра. Пасьля сваёй адстаўкі – намесьнік генэральнага дырэктара Фэдэральнай фінансава-прамысловай групы (Расія) і па сумяшчальніцтве дарадца расійскіх банкаў («ІнтэрТЭКбанк», «Банк высокіх тэхналёгій»). Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г., не набраў дастатковай колькасьці подпісаў для рэгістрацыі ў якасьці кандыдата. Супрацоўнічаў з А. Фядутам, які быў каардынатарам яго выбарчага штабу ў 2001 годзе, у беларускім грамадзкім аб'яднаньні «Сацыяльныя тэхналёгіі». У 2004 годзе спрабаваў балятавацца ў палату прадстаўнікоў, аднак ня быў зарэгістраваны акруговай выбарчай камісіяй з прычыны «падробленых подпісаў» у падтрымку яго вылучэньня.

**Сіўчык Вячаслаў**

Нарадзіўся 18 сьнежня 1962 году ў г. Менску. Па адукацыі геоляг. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў геолягам у «Беларусьгеалёгіі». У 1995–1998 гг. адказны сакратар управы БНФ, пасьля сакратар управы БНФ, старшыня камісіі Сойму БНФ па сувязях з рабочым рухам. За ўдзел у Чарнобыльскім шляху ў 1996 г. быў на некалькі тыдняў пасаджаны за краты разам з Ю. Хадыкам. 30 кастрычніка 1999 г. быў абраны намесьнікам старшыні БНФ «Адраджэньне» і Партыі БНФ. Адзін з галоўных ініцыятараў стварэньня «Маладога фронту»: у 2001 г. пры падтрымцы «МФ» спрабаваў балятавацца на пасаду старшыні партыі БНФ, але прайграў В.Вячорку. У 2003 г. быў выключаны з партыі БНФ за «раскольніцкую дзейнасьць».

**Скрабец Сяргей**

Нарадзіўся 25 кастрычніка 1963 году ў Лідзе. Па адукацыі інжынэр. Прадпрымальнік, быў дырэктарам закрытага акцыянэрнага таварыства «Белбабаеўскае» (супольнае беларуска-расейскае прадпрыемства). У 2000-2004 гг. – дэпутат палаты прадстаўнікоў. У 2001 г. заяўляў пра намер балятавацца ў прэзыдэнты, але не сабраў дастатковай колькасьці галасоў для рэгістрацыі ў якасьці кандыдата. Уваходзіў у дэпутацкую групу «Рэспубліка», з траўня 2003 г. і па 2004 г. узначальваў яе. У чэрвені 2004 г. разам з дэпутатамі У.Парфяновічам і В.Фраловым удзельнічаў у галадоўцы пад лозунгам «Не – трэцяму тэрміну!». У 2004 г. ня быў пераабраны ў палату прадстаўнікоў. У 2003 г. супраць яго заводзілася крымінальная справа за вымантачваньне крэдытаў. Прасіў палітычнага прытулку ў Расіі, але не атрымаў яго. Нейкі час быў беспрацоўным. Ня быў зарэгістраваны кандыдатам на паўторных выбарах у палату прадстаўнікоў у пачатку 2005 г. У траўні 2005 г. зьмешчаны за краты па абвінавачваньнях у дачы хабару службовай асобе. На знак пратэсту абвяшчаў галадоўку, якую трымаў некалькі месяцаў. У дадзены момант яго справа слухаецца ў Вярхоўным судзе. У сьнежні 2005 г. была сфармаваная і зарэгістраваная Цэнтравыбаркамам ініцыятыўная група за вылучэньне С.Скрабца кандыдатам у прэзыдэнты, якая, аднак, ня здолела сабраць дастатковай колькасьці подпісаў.

**Статкевіч Мікалай**

Нарадзіўся 12 жніўня 1956 году ў вёсцы Лядно Слуцкага раёну. Па адукацыі вайсковы інжынэр у радыёэлектроніцы. Кандыдат тэхнічных навук. На момант здабыцьця Беларусяй незалежнасьці працаваў выкладчыкам у МВІЗРВ. У сакавіку 1991 г. уступіў у Беларускую Сацыял-Дэмакратычную Грамаду (БСДГ). У першай палове 1990-х гадоў кіраваў незалежніцкім «Згуртаваньнем беларускіх вайскоўцаў». У 1996 г. пасьля аб’яднаўчага зьезду БСДГ і Партыі народнай згоды абраны старшынём ЦК аб’яднанай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада). У 1998 г. абраны старшынём БСДП. У 2000 г. пераабраны старшынём БСДП (НГ), у сьнежні 2004 г. адхілены з пасады кіраўніка БСДП (НГ). Адзін з арганізатараў «Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь» у 2003 г. і масавых пратэстаў супроць рэфэрэндуму 17 кастрычніка 2004 г. Увосень 2004 г. няўдала кандыдаваў у палату прадстаўнікоў у Менску (паводле афіцыйных зьвестак, набраў 18% галасоў). У чэрвені 2005 г. быў асуджаны за разам з П. Севярынцам. У дадзены момант адбывае пакараньне ў форме абмежаваньня волі ў Баранавічах. Выступае за абраньне А. Мілінкевіча на пасаду прэзыдэнта.

**Стражаў Васіль**

Нарадзіўся ў 1944 годзе ў г. Каменску Палтаўскай вобласьці. Скончыў БДУ і асьпірантуру Інстытуту фізыкі Акадэміі навук БССР. Працаваў інжынэрам-канструктарам і ў міністэрстве адукацыі БССР, быў партыйным функцыянэрам. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці – намесьнік міністра адукацыі. На гэтай пасадзе знаходзіўся да 26 жніўня 1994 году, калі быў прызначаны міністрам. Доктар фізыка-матэматычных навук, прафэсар. Адзін зь міністраў, якія найдаўжэй знаходзіліся на пасадзе пры Лукашэнку – з 1994 па 2001 гг. У 2001-2002 гг. – рэктар Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ. З канца 2003 г. – рэктар БДУ (замест А. Казуліна). Як старшыня беларускага таварыства «Веды» у верасьні 2004 году падпісаў зварот кіраўнікоў грамадзкіх арганізацый у падтрымку рэфэрэндуму аб падаўжэньні паўнамоцтваў А. Лукашэнкі.

**Сумар Канстанцін**

Нарадзіўся 15 студзеня 1949 году ў вёсцы Вічын Лунінецкага раёну. Па адукацыі аграном. Быў старшынём калгасу, узначальваў Берасьцейскі раённы савет дэпутатаў. Пры Лукашэнку – намесьнік начальніка Службы кантролю прэзыдэнта, першы намесьнік старшыні Менскага аблвыканкаму. Старшыня Дзяржаўнага падатковага камітэту ў 2000-2001 гг., міністар па падатках і зборах у 2001-2004 гг. З сакавіка 2004 г. – старшыня Берасьцейскага аблвыканкаму. Праславіўся выказваньнем, згодна зь якім А. Лукашэнка “крыху вышэйшы за Бога”. Чалец савету рэспублікі – верхняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту, уваходзіць у камісію па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы. У 2005 г. у Лунінцы мясцовыя чыноўнікі спрабавалі паставіць прыжыцьцёвы помнік К. Сумару, аднак ён запярэчыў.

**Сянько Ўладзімер**

Нарадзіўся 5 жніўня 1946 году ў вёсцы Вішкавічы Віцебскай вобласьці. Прафэсійны дыплямат. З 1991 г. да 1992 г. — намесьнік міністра замежных справаў, з 1992 г. да 1994 г. пасол Беларусі ў Польшчы, пасьля пасол Беларусі ў Вялікабрытаніі. З 1994 г. да 1997 г. міністар замежных справаў. З 1997 г. пасол Беларусі ў Францыі, з 2004 г. – пасол у Бельгіі і прадстаўнік Беларусі ў органах ЭЗ.

**Таразевіч Георгі**

Нарадзіўся 17 ліпеня 1937 году ў вёсцы Слабада Мядзельскага раёну. Па адукацыі інжынэр. Займаў вялікія намэнлятурныя пасады — старшыня Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету БССР, намесьнік старшыні Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету СССР (1985–1989), чалец ЦК КПБ (1974–1991), кандыдат у чальцы ЦК КПСС. У 1983 г. першы сакратар Менскага гаркаму КПБ. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці ўзначальваў Камітэт па геадэзіі пры Савеце міністраў Рэспублікі Беларусі. З 1995 г. у апазыцыі. Быў адным з сустаршыняў ЦК Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада). Памёр 21 сакавіка 2003 г.

**Тозік Анатоль**

Нарадзіўся 13 сакавіка 1949 году ў Гомельскай вобласьці. Па адукацыі гісторык. З 1979 г. у органах КДБ. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў у Інстытуце нацыянальнай бясьпекі Рэспублікі Беларусі (былыя Вышэйшыя курсы КДБ СССР). Займаў пасаду першага намесьніка дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі. У ліпені 2000 г. прызначаны старшынём Камітэту дзяржаўнага кантролю.

**Трусаў Алег**

Нарадзіўся 7 жніўня 1954 году ў г. Амсьціславе. Па адукацыі гісторык, кандыдат навук. Археоляг, выкладчык Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту культуры і мастацтваў. Дэпутат ВС 12 скліканьня (намесьнік старшыні Камісіі па адукацыі, культуры і захаваньні гістарычнай спадчыны). Чалец Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады (з 1991), намесьнік (1991), старшыня Цэнтральнай Рады БСДГ (1992—1995). У 1994 годзе кіраваў ініцыятыўнай групай па абраньні Станіслава Шушкевіча на прэзыдэнта Беларусі, пазьней стаў яго намесьнікам у БСДГ. У 2004 г. спрабаваў балятавацца ад гэтай партыі ў палату прадстаўнікоў, аднак ня быў зарэгістраваны акруговай камісіяй. Старшыня ўплывовага грамадзкага аб'яднаньня «Таварыства беларускай мовы» (з 1999 г.; інтэрнэт-старонка http://tbm.org.by).

**Унучка Раман**

Нарадзіўся 13 траўня 1944 году ў вёсцы Буйвічы Шчучынскага раёну. Па адукацыі аграном, скончыў Гарадзенскі сельскагаспадарчы інстытут і Вышэйшую партыйную школу. Быў першым сакратаром навагрудзкага гаркаму КПБ. Дэпутат ВС 12 скліканьня, ачольваў плянавую і бюджэтна-фінансавую камісію. Кіраваў Белінвэстбанкам. 21 ліпеня 2000 году быў прызначаны памочнікам прэзыдэнта – галоўным інспэктарам па Віцебскай вобласьці. У 2003-2004 гадох – намесьнік прэм'ер-міністра. 25 траўня 2004 г. быў прызначаны чальцом савету Рэспублікі. У кастрычніку 2004 г. абраны ў палату прадстаўнікоў, дзе кіруе бюджэтна-фінансавай камісіяй.

**Фралоў Валер**

Нарадзіўся 14 жніўня 1947 году ў г. Менску. Мае вышэйшую вайсковую адукацыю. 17 кастрычніка 1994 г. указам Лукашэнкі быў прызначаны камандзірам 28-га армейскага корпусу. Увосень 2000 г. быў абраны дэпутатам палаты прадстаўнікоў па Гарадзенскай сельскай акрузе. Уваходзіў у дэпутацкую групу «Рэспубліка» (да восені 2002 г. узначальваў яе), удзельнічаў у шматлікіх пратэстовых акцыях супраць узурпацыі ўлады А. Лукашэнкам. У жніўні 2004 г. далучыўся да партыі БСДП (НГ), у студзені 2005 г. быў абраны чальцом яе ЦК,

пазьней стаў актывістам партыі БСДП (Г). Удзельнічаў у выбарах у палату прадстаўнікоў увосень 2004 г. і ўвесну 2005 г., падчас паўторнага галасаваньня ў Гарадзенскай акрузе, аднак ня быў абраны. У сьнежні 2005 г. заявіў пра намер удзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г., сфармаваў ініцыятыўную групу і падаў дакумэнты ў Цэнтравыбаркам. Не сабраў дастатковай колькасьці подпісаў.

**Фядута Аляксандар**

Нарадзіўся 3 лістапада 1964 году ў Горадні. Па адукацыі філёляг. Знаўца расійскай літаратуры, кандыдат філялягічных навук. Працаваў настаўнікам у Горадні, быў камсамольскім функцыянэрам, у 1991-94 гг. – кіраўнік ЦК Саюзу моладзі Беларусі. у 1994 г. далучыўся да перадвыбарнага штабу А.Лукашэнкі. Пасьля перамогі Лукашэнкі на выбарах да студзеня 1995 г. працаваў начальнікам упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі ў адміністрацыі прэзыдэнта, пазьней займаўся палітычнай журналістыкай і аналітыкай, каяўся за супрацоўніцтва з Лукашэнкам. У канцы 1990-х гадоў – актывіст руху В. Абрамавай «Яблык». У 2000 г. балятаваўся ў палату прадстаўнікоў па адной зь менскіх акругаў (прайграў Н. Машэравай). Улетку 2001 г. узначальваў перадвыбарны штаб Л. Сініцына. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. выступіў у СМІ з рэзкай крытыкай на адрас «псэўдаапазыцыянэраў» дзеля прысабечваньня імі сродкаў, што паступалі з-за мяжы, аднак не давёў свае выкрываньні да канца. Быў кіраўніком грамадзкага аб’яднаньня «Сацыяльныя тэхналёгіі» (у 2005 годзе самаліквідавалася). У той жа год выдаў у Маскве з дапамогай А.Казуліна кнігу «А.Лукашенко. Политический портрет» – адзін з найбольш чытэльных твораў пра сучасную беларускую палітыку.

**Фядыніч Генадзь**

Нарадзіўся 31 ліпеня 1957 году ў вёсцы Ракітніца Жабінкаўскага раёну. Па адукацыі інжынэр-мэханік, юрыст. Да ліквідацыі Беларускай партыі працы быў намесьнікам старшыні БПТ. Адзін з кіраўнікоў незалежнага прафсаюзу работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці. У кастрычніку 2004 году балятаваўся ў палату прадстаўнікоў па адной зь менскіх акругаў, але ня быў абраны (афіцыйна сабраў 12,4% галасоў).

**Хадыка Юры**

Нарадзіўся 23 чэрвеня 1938 году ў г. Менску. Па адукацыі фізык. З 1989 г. і да сёньняшняга часу намесьнік старшыні БНФ. У 1996 г. разам з В. Сіўчыкам некалькі тдняў правёў у турме за ўдзел у шэсьці «Чарнобыльскі шлях-96». Падчас выбараў 2001 г. — давераная асоба У. Ганчарыка. Няўдала балятаваўся на выбарах у палату прадстаўнікоў увосень 2004 г. (паводле афіцыйных зьвестак, набраў 10,6% галасоў).

**Хвастоў Міхаіл**

Нарадзіўся 27 чэрвеня 1949 году ў вёсцы Казлоўшчына Пастаўскага раёну. У 1975 г. закончыў Менскі дзяржаўны пэдагагічны інстытут замежных моваў, у 1989 г. — Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў першым сакратаром Сталага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусі пры ААН. У 1997–2000 гг. — пасол Беларусі ў Канадзе. 11 жніўня 2000 г. прызначаны памочнікам прэзыдэнта. 27 лістапада 2000 г. заняў пасаду намесьніка прэм’ер-міністра – міністра замежных справаў. Застаўся

міністрам замежных справаў і пасьля выбараў 2001 году, займаў гэтую пасаду да 21 сакавіка 2003 году, а тады быў прызначаны паслом Беларусі ў ЗША і Мексыцы.

**Ціхіня Валер**

Нарадзіўся 1 кастрычніка 1940 году ў мястэчку Капаткевічы Петрыкаўскага раёну. Па адукацыі юрыст. Доктар навук, працаваў міністрам юстыцыі БССР, на момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці — сакратар ЦК КПБ. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Адзіны дэпутат парлямэнту, які прагаласаваў супраць Віскулёўскіх пагадненьняў аб дэмантажы СССР (сьнежань 1991 г.). Намесьнік Старшыні (1994), Старшыня (1995–1996) Канстытуцыйнага Суду. У час канстытуцыйнага крызысу восені 1996 г. узяў удзел у перамовах С.Шарэцкага з А.Лукашэнкам, падпісаў пагадненьне аб кампрамісе паміж Вярхоўным саветам і прэзыдэнтам. Пасьля рэфэрэндуму быў фактычна адхілены з сваёй пасады і пакінуў вялікую палітыку. На дадзены момант – прафэсар недзяржаўнага інстытуту правазнаўства.

**Ціцянкоў Іван**

Нарадзіўся 5 лістапада 1953 году ў вёсцы Клеевічы Касьцюковіцкага раёну. Па адукацыі заатэхнік. Быў камуністычным функцыянэрам, дэпутатам ВС 12 скліканьня (сакратар Камісіі па праблемах Чарнобыльскай катастрофы). Чалец штабу Лукашэнкі на выбарах 1994 г. З жніўня 1994 г. кіраўнік справаў прэзыдэнта. Пасьля рэфэрэндуму 1995 г. атрымаў сумную славу, дэманстрацыйна разьдзершы бел-чырвона-белы сьцяг на даху Дома ўраду. У 1999 г. быў адпраўлены ў адстаўку, працаваў у Расіі ў структурах кампаніі «Ітэра». У 2001 г. быў аўтарам некалькіх інтэрвію, у якіх крытыкаваў беларускі рэжым і асабіста Лукашэнку.

**Цэпкала Валер**

Нарадзіўся 22 лютага 1965 году ў г. Горадні. Скончыў Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносінаў, па адукацыі юрыст. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў у пасольстве СССР у Фінляндыі. Пэўны час быў дарадцам старшыні Вярхоўнага савету Беларусі С. Шушкевіча. 8 жніўня 1994 году быў прызначаны першым намесьнікам міністра замежных справаў Беларусі. З траўня 1997 г. па люты 2002 г. – пасол Беларусі ў ЗША. 16 ліпеня 2002 г. стаў памочнікам прэзыдэнта, курыруе пытаньні інфарматызацыі. У лютым-кастрычніку 2005 году выконваў абавязкі прадстаўніка Лукашэнкі ў Нацыянальным сходзе. У дадзены момант – дырэктар адміністрацыі Парку высокіх тэхналёгій.

**Цярэшчанка Віктар**

Нарадзіўся 30 студзеня 1950 году ў вёсцы Дуброўка Краснапольскага раёну. Працаваў сьлесарам, фрэзэроўшчыкам, інжынэрам. Закончыў экстэрнам эканамічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. У 1992 г. прызначаны генэральным дырэктарам СП «Міжнародны інстытут мэнэджмэнту» (МІМ-Беларусь). Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 1994 г., ня быў зарэгістраваны кандыдатам. Пасьля перамогі Лукашэнкі атрымаў працу ў адміністрацыі прэзыдэнта, але хутка яе пазбавіўся. У лістападзе 1994 году ачоліў Беларускую народную партыю (не прайшла перарэгістрацыі ў 1999 г.). Дэпутат ВС 13 скліканьня (чалец сталай Камісіі па адукацыі, навуцы і культуры). Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г. Адмовіўся ад далейшай барацьбы на этапе збору подпісаў.

**Чаргінец Мікалай**

Нарадзіўся 17 кастрычніка 1937 году ў г. Менску. Футбаліст і футбольны трэнэр, у 1960-х гадах выбраў міліцэйскую кар'еру, у 1969 г. скончыў юрыдычны факультэт БДУ. Працаваў на кіраўнічых пасадах у МУС, у 1993-1995 гг. – старшыня камітэту па сацыяльнай абароне вайскоўцаў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. У 1996 г. – памочнік кіраўніка справамі Лукашэнкі. З 1997 г. і па сёньня – члец Савета рэспублікі, старшыня камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бясьпецы. Кіраўнік ініцыятыўнай групы за абраньне А.Лукашэнкі прэзыдэнтам у 2001 г. Літаратар, аўтар шматлікіх дэтэктыўных раманаў. У 2002 г. быў абраны старшынём «Беллітфонду» і ў гэтай якасьці падпісаў зварот кіраўнікоў грамадзкіх арганізацый ад 8 верасьня 2004 г. з ухваленьнем незаконнага рэфэрэндуму 17 кастрычніка. У лістападзе 2005 г. абраны старшынём праўладнай пісьменьніцкай суполкі "Саюз пісьменьнікаў Беларусі". У сьнежні 2005 г. выключаны зь Саюзу беларускіх пісьменьнікаў і адхілены ад кіраўніцтва "Беллітфондам". Пэрсанальная старонка – www.cherginets.by.

**Чыгір Міхаіл**

Нарадзіўся 24 траўня 1948 году ў вёсцы Вусава Капыльскага раёну. Па адукацыі фінансіст. Перад прызначэньнем у 1994 г. на пасаду прэм'ер-міністра працаваў старшынём праўленьня «Белаграпрамбанку». Напярэдадні рэфэрэндуму 1996 г. самахоць пайшоў у адстаўку. Працаваў у Маскве кіраўніком расійскага прадстаўніцтва канцэрну «GEA». Вярнуўся ў Менск для ўдзелу ў «альтэрнатыўных прэзыдэнцкіх выбарах» 16 траўня 1999 г. Быў арыштаваны, паўгоду правёў у турме. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г. Адмовіўся ад далейшай барацьбы на этапе збору подпісаў. Член АГП. Быў даверанай асобай Уладзімера Ганчарыка, пасьля ягонай паразы сышоў зь вялікай палітыкі. Шмат інфармацыі пра Чыгіра на ангельскай мове зьмешчана на старонцы http://www.ilhr.org/belarus/chigirversion.htm

**Шарэцкі Сямён**

Нарадзіўся 23 верасьня 1936 году ў вёсцы Лаўрушава Наваградзкага раёну. Мае аграрную адукацыю. На момант абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі — старшыня калгасу «Чырвоны Сьцяг» Валожынскага раёну. У 1993 г. прызначаны дарадцам прэм'ера Кебіча. У 1994 г. ачоліў Аграрную партыю Беларусі. Дэпутат ВС 13 скліканьня, Старшыня ВС 13 скліканьня з студзеня 1996 г. З ліпеня 1999 г. жыў у Вільні (Летува). У дадзены момант — на эміграцыі ў ЗША. Біяграфія на ангельскай мове месьціцца на старонцы http://www.belarus.net/parliame/sharetsk.htm.

**Шлындзікаў Васіль**

Нарадзіўся 1 верасьня 1947 году ў вёсцы Мадора Рагачоўскага раёну. Старшыня Грамадзянскай партыі Беларусі, пасьля яе аб'яднаньня з Аб'яднанай Дэмакратычнай партыяй Беларусі — намесьнік старшыні Нацыянальнага камітэту новаўзьніклай АГП. Дэпутат ВС 13 скліканьня (старшыня Камісіі па эканамічнай палітыцы і рэформах). Падчас выбараў 2001 г. — куратар выбарчае кампаніі У. Ганчарыка ў г. Менску. Намесьнікам старшыні АГП быў да 2004 году. На дадзены момант – член Палітрады АГП.

**Шушкевіч Станіслаў**

Нарадзіўся 15 сьнежня 1934 году ў г. Менску. Па адукацыі фізык. У 1960–1961 гг., працуючы старшым інжынэрам на Менскім радыёзаводзе, навучаў расійскай мове Лі Гарві Ос-

вальда. Доктар навук, прафэсар, быў прарэктарам БДУ. Дэпутат ВС 12 і 13 склiканьня, першы намесьнік Старшыні ВС, з восені 1991 г. старшыня ВС (да студзеня 1994 г.). У прэзыдэнцкіх выбарах 1994 г. заняў чацьвертае месца. З 1998 г. старшыня партыі Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада. У 2004 г. вылучаўся ад БСДГ у палату прадстаўнікоў, ня быў зарэгістраваны. У 2005 г. лічыўся адным зь верагодных кандыдатаў ад дэмакратычнай апазыцыі на прэзыдэнцкіх выбарах 2006 г., але зьняў сваю кандыдатуру ў часе Кангрэсу дэмакратычных сілаў (кастрычнік 2005 г.). Падтрымаў прэтэндэнта А. Мілінкевіча. Біяграфія на ангельскай мове месьціцца на старонцы http://www.belarus.net/parliame/shushkev/shushkev.htm.

**Шчукін Валер**

Нарадзіўся 22 сакавіка 1942 году ў г. Уладзівастоку (Расія). Па адукацыі карабельны інжынэр-мэханік. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці працаваў машыністам крана-трубаўкладніка. Дэпутат ВС 13 скліканьня, сакратар Камісіі па нацыянальнай бясьпецы, абароне і барацьбе з злачыннасьцю. Да 1998 г. чалец ПКБ. У 2001 г. правёў 3 месяцы ў зьняволеньні за антыпрэзыдэнцкую дзейнасьць. Працаваў у недзяржаўных СМІ, займаўся праваабарончай дзейнасьцю. Спрабаваў балятавацца на выбарах у палату прадстаўнікоў 2004 г., але ня быў зарэгістраваны. Біяграфія на ангельскай мове месьціцца на старонцы http://www.belarus.net/parliame/schukin/index.htm.

**Шэйман Віктар**

Нарадзіўся 26 траўня 1958 году ў Гарадзенскай вобласьці. Кадравы вайсковец. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці быў маёрам, начальнікам штаба Берасьцейскай дэсантна-штурмавой брыгады. Дэпутат ВС 12 скліканьня. Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 1994 г. падтрымаў Лукашэнку. Пасьля яго перамогі — памочнік Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі ў пытаньнях абароны і бясьпекі, дзяржаўны сакратар Рады бясьпекі. 27 лістапада 2000 г. адхілены ад пасады дзяржаўнага сакратара Рады бясьпекі і прызначаны Генэральным пракурорам, нягледзячы на адсутнасьць юрыдычнай адукацыі. Са сьнежня 2004 г. – кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі, займаў гэтую пасаду да пачатку студзеня 2006 г. Лічыцца адным з найбольш апантаных прыхільнікаў сучаснага рэжыму, у сьнежні 2005 г. узначаліў ініцыятыўную групу за вылучэньне Лукашэнкі кандыдатам у прэзыдэнты. Пасьля дакладу Х.Пургурыдэса (канец 2003 году), у якім В.Шэйман быў названы галоўным падазроным у арганізацыі выкраданьня людзей у Беларусі, абвешчаны пэрсонай нон-грата на тэрыторыі ЭЗ.

**Якабсон Аляксандар**

Нарадзіўся ў 1951 годзе ў г. Гомелі. Скончыў Беларускі інстытут інжынэраў чыгуначнага транспарту, менскі інстытут паліталёгіі ды сацыяльнага кіраваньня. Працаваў на розных пасадах у будаўніцтве, быў інструктарам Гомельскага абкаму КПБ. Некалькі гадоў кіраваў Сьветлагорскім гарвыканкамам. Дэпутат ВС 12 і 13 скліканьня, перайшоў у палату прадстаўнікоў у 1996 годзе. У 1997-2001 гадох працаваў намесьнікам старшыні Гомельскага аблвыканкаму, а з 2001 г. – старшыня аблвыканкаму. Чалец савету рэспублікі.

**Яненка Зьміцер**

Нарадзіўся 31 сакавіка 1975 году ў г. Салігорску. Па адукацыі юрыст. Кіраўнік грамадзкага аб’яднаньня «Ленінскі камуністычны саюз моладзі Беларусі» – моладзевай арганізацыі

ПКБ, якая налічвае некалькі соцень чальцоў. Намесьнік рэдактара газэты ПКБ «Товарищ». З 2005 году агітуе за абраньне А. Мілінкевіча на прэзыдэнта Беларусі.

**Янчэўскі Ўсевалад**

Нарадзіўся 22 красавіка 1976 году ў г. Барысаве. Па адукацыі юрыст. Некаторы час дапамагаў дэпутату ВС 12 скліканьня С. Шушкевічу, быў чальцом партыі Славянскі Сабор «Белая Русь». Да 2001 г. кіраўнік пралукашэнкаўскага Беларускага патрыятычнага саюзу моладзі (БПСМ). У 2000-2004 гг. – дэпутат ніжняй палаты лукашэнкаўскага парлямэнту. У выніку выбараў увосень 2004 г. ня быў абраны ў палату прадстаўнікоў. У 2005 г. стаў галоўным рэдактарам праўрадавага прапагандысцкага часопісу “Планета”.

**Ярашук Аляксандар**

Нарадзіўся 16 лістапада 1951 году ў вёсцы Ўнучкі Камянецкага раёну. Па першай адукацыі навуковец-аграном, па другой — палітоляг і сацыёляг. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці загадчык аддзелу аграрнай палітыкі ЦК КПБ. У 1999-2002 гг. узначальваў рэспубліканскі камітэт Беларускага прафсаюзу працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Удзельнічаў у выбарчай кампаніі 2001 г. Адмовіўся ад далейшай барацьбы на этапе збору подпісаў. Быў даверанай асобай Уладзімера Ганчарыка. У 2002 г. быў абраны прэзыдэнтам Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў, якім кіруе да сёньня. У пачатку 2005 г. абвясьціў пра заснаваньне «грамадзкага Вярхоўнага савету Беларусі» з мэтай негвалтоўнага аднаўленьня ў краіне канстытуцыйнай законнасьці. У канцы 2005 г. выступіў за байкот дэмакратычнымі сіламі прэзыдэнцкіх выбараў 2006 г.

**Ярмошын Уладзімер**

Нарадзіўся 26 кастрычніка 1942 году ў г. Пронску (Расія). Па адукацыі інжынэр-мэханік. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці — намесьнік старшыні Менскага гарвыканкаму, старшыня камітэту па жыльлёвай гаспадарцы і энэргетыцы. З 1995 г. старшыня Менскага гарвыканкаму. 18 лютага 2000 г. прызначаны прэм’ер-міністрам. На гэтай пасадзе працаваў да кастрычніка 2001 году (заменены Генадзем Навіцкім). У дадзены момант займаецца бізнэсам у Расіі.

**Ярмошына Лідзія**

Нарадзілася 29 студзеня 1953 году ў г. Слуцку. Па адукацыі юрыст. На момант абвяшчэньня Беларусяй незалежнасьці кіраўнік юрыдычнай службы Бабруйскага гарвыканкаму. Працуе ў Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў з 1992 г. У лістападзе 1996 г. незаконна ачоліла Цэнтравыбаркам (замест Віктара Ганчара). На пасадзе кіраўніцы Цэнтравыбаркаму традыцыйна выяўляе поўную ляяльнасьць рэжыму, за што атрымлівала ад прэзыдэнцкай адміністрацыі падзякі і ўзнагароды. У 2004 г. урады краінаў ЭЗ уключылі Л. Ярмошыну ў сьпіс асобаў нон-грата за датычнасьць да фальсыфікацый народнага волевыяўленьня.

# НЕКАТОРЫЯ СКАРОТЫ

ААТ — Адкрытае акцыянэрнае таварыства
АБСЭ — Арганізацыя для бясьпекі й супрацоўніцтва ў Эўропе
АБЭЗ — Аддзел барацьбы з эканамічнымі злачынствамі
АГП — Аб’яднаная грамадзянская партыя
АДПБ — Аб’яднаная дэмакратычная партыя Беларусі
АП — Адміністрацыя прэзыдэнта
АПК — Аграпрамысловы комплекс
АСДП — Аб’яднаная сацыял-дэмакратычная партыя
АТ — Акцыянэрнае таварыства
БАЖ — Беларуская асацыяцыя журналістаў
БГК — Беларускі Гельсынкскі камітэт
БДІПЧ — Бюро па дэмакратычных інстытутах і правох чалавека
БМЗ — Беларускі мэталюргічны завод
БНФ — Беларускі народны фронт
БРСМ — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі
БПП — Беларуская партыя працы
БСДГ — Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада
БСДП (НГ) — Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада)
БССР — Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка
ВА — Вытворчае аб’яднаньне
ВГС — Вышэйшы Гаспадарчы суд
ВНП — Валавы нацыянальны прадукт
ВПК — Вайскова-прамысловы комплекс
ВПС — Ваенна-паветраныя сілы
ВР — Вярхоўная Рада
ВУП — Валавы ўнутраны прадукт
ГА — Грамадзкая арганізацыя
ДКБ — Дамова аб калектыўнай бясьпецы
ДКНС — Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы
ДМК — Дзяржаўны мытны камітэт
ДРЭС — Дзяржаўная раённая электрастанцыя
ДФР КДК — Дэпартамэнт фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржаўнага кантролю
ЗАТ — Закрытае акцыянэрнае таварыства
ЗАХР — Зводны атрад хуткага рэагаваньня
ІПГ — Інвэстыцыйна-прамысловая група
КДБ — Камітэт дзяржаўнай бясьпекі
КДК — Камітэт дзяржаўнага кантролю
КК — Крымінальны Кодэкс
КПБ — Камуністычная партыя Беларусі
КПРФ — Камуністычная партыя Расійскай Фэдэрацыі
КРАПП — Кансультацыйная рада апазыцыйных палітычных партыяў
КРДС — Кардынацыйная рада дэмакратычных сілаў
КРЛАПП — Кансультацыйная рада лідэраў апазыцыйных палітычных партыяў
КСП — Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта
КХП-БНФ — Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя «Беларускі народны фронт»
ЛДП — Лібэральна-дэмакратычная партыя
МА — Міністэрства абароны
МАЗ — Менскі аўтамабільны завод
МВФ — Міжнародны Валютны фонд
МЗЛ — Менскі завод лядоўняў
МЗС — Міністэрства замежных справаў
МЗКЦ — Менскі завод колавых цягачоў
МКД — Міжнародны клюб дырэктараў
МСД — Маладыя сацыял-дэмакраты
МТЗ — Менскі трактарны завод
МУС — Міністэрства ўнутраных справаў
МФ — Малады фронт
НІСЭПД — Незалежны інстытут сацыяльна-палітычных дасьледаваньняў
НДТРК — Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія
НАН — Нацыянальная акадэмія навук
НВА — Навукова-вытворчае аб’яднаньне
НПЗ — Нафтаперапрацоўчы завод
НС — Нацыянальны Сход
ПАРЭ — Парлямэнцкая асамблея Рады Эўропы
ПКБ — Партыя камуністаў Беларуская
ПНЗ — Партыя народнай згоды
ПП НС — Палата Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу
РА — рэспубліканскае аб’яднаньне
РАНА — Раённы аддзел народнай адукацыі
РАТ — Расійскае акцыянэрнае таварыства
РБ — Рэспубліка Беларусь
РВАП — Рада па вонкавай і абароннай палітыцы
РІСІ — Расійскі інстытут стратэгічных дасьледаваньняў
РППС — Рэспубліканская партыя працы і справядлівасьці
РСФСР — Расійскай Савецкая Фэдэрацыйная Сацыялістычная Рэспубліка
РФ — Расейская Фэдэрацыя
СВР — Служба вонкавай разьведкі
СБР — Саюз Беларусі і Расеі
СГА — Сусьветная гандлёвая арганізацыя
СДПНЗ — Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды
СДС — Сацыял-дэмакратычны саюз
СКВ — Свабодна канвэртаваная валюта
СНД — Садружнасьць Незалежных Дзяржаваў
СП — Сумеснае прадпрыемства
СПА — Супрацьпаветраная абарона
СПС — Саюз правых сілаў (Расея)
СРА — Супрацьракетная абарона
СРЮ — Саюзная рэспубліка Югаславія
ТБМ — Таварыства беларускай мовы
УДТРК — Усерасейская дзяржаўная тэлерадыёкампанія
УКДБ — Управа камітэту дзяржаўнай бясьпекі
УС — Узброеныя сілы
УСП — Управа справамі прэзыдэнта
УУС — Управа ўнутраных справаў
ТРА — Тэлерадыёвяшчальная арганізацыя саюзнае дзяржавы
ФПБ — Фэдэрацыя прафсаюзаў Беларусі
ФПГ — Фінансава-прамысловая група
ФПС — Фэдэральная памежная служба
ФСБ — Фэдэральная служба бясьпекі (Расея)
ЦВК — Цэнтральная выбарчая камісія
ЦК — Цэнтральны камітэт
ЭЗ — Эўрапейскі Зьвяз
ЭС — Эўрапейская супольнасьць
ЭІСМІ — Эўрапейскі інстытут сродкаў масавай інфармацыі

# ПАКАЗЬНІК ІМЁНАЎ


Абрамава, Вольга 12, 208, 221, 259, 262, 274, 512, 696, 727
Абрамовіч, Аляксандар 138, 657, 665, 696
Абрамовіч, Раман 310
Авак'ян, С. 654, 661
Агалец, Валянцін 179, 181, 196
Агееў, Аляксандар 170
Агурцоў, Я. 711
Адамкус, Валдас 375
Адамушка, Уладзімер 170
Азаматаў, Мікалай 170
Азаронак, Юры 121, 228, 398
Акінчыц, Іван 481
Аксёнаў, Аляксандар 133
Алейнікаў, Генадзь 183
Александровіч, Уладзімер 508, 696
Алексій ІІ 248, 249, 293
Алесіна, Тацяна 395
Алін, Урбан 248
Альендэ, Сальвадор 555, 569
Альфер, Сяргей 406, 461, 481, 517
Алякпераў, Вагіт 310
Аляксанава, Ірына 714
Андрэеў, Ігар 208
Андрэйчанка, Уладзімер 50, 51, 696
Андрэйчык, Наталя 659
Андэрсан, Б. 453
Анікееў, Міхаіл 184
Антановіч, Іван 180, 651, 697
Анташкевіч, Іван 506
Антончык, Сяргей 78, 103, 117, 256, 270, 271, 294, 603, 697
Антусевіч, Сяргей 697
Антчак, Р. (Antczak, R.) 101, 559
Апанасевіч, Віталь 181, 201
Арлоў, Дзьмітрый 439
Артэга-і-Гасэт, Хасэ 92, 101
Арцюхоў, М. 723
Арэсаў, Уладзімер 434
Арэхаў, Юры 438
Асіпенка, Віктар 440
Астапенка, Анатоль 697
Астапенка, Уладзіслаў 352
Астрога, Станіслаў 350
Атрошчанка, Сяргей 361
Аўтарханаў, А. 637
Аўтуховіч, Мікалай 697
Афанасьеў, Марат 698, 717

Бабкіна, Надзея 322
Бабосаў, Яўген 449
Бабурын, Сяргей 611
Багданкевіч, Станіслаў 77, 127, 146, 202, 204, 266, 299, 325, 339, 355, 557, 561—564, 568, 679, 698
Багдановіч, Марына 513, 698
Багуцкі, Алег 262
Бадзей, Георгі 180
Бадзі, Бэртран (Badie, Bertrand) 642
Бажок, Людміла 339
Бажэлка, Алег 168, 193, 197, 243, 264, 699
Байдак, Валянцін 177
Балашова, Сьвятлана 361
Балянд'е, Жорж (Balandier, George) 637
Бамбіза, Іван 169
Бандарэнка, Зінаіда 698
Бандарэнка, Зьміцер 332
Баравой, Канстанцін 611
Барадач, Уладзімер 434
Барадзін, Павал 245, 247, 309, 631, 654, 658
Барадзіч, Юры 195
Барсукоў, Міхаіл
Баршчэўскі, Лявон 190, 202, 203, 690, 698
Барыеў, Энвер 170
Барысаў, Сяргей 185
Батура, Аляксандар 289

Батура, Барыс 164, 177, 699
Баўчар, Рычард 307
Бахун, Сяргей 699, 705
Белахвостаў, Уладзімер 170
Беленькі, Юры 207, 479, 690, 699
Берніковіч, Яраслаў 406, 511
Бжазінскі, Зьбігнеў 432
Бікінін, Барыс 659
Біндзюкоў, Мікалай 659
Блахін, Аляксандар 433, 467
Блэр, Тоні 375, 435
Блянкенагель, А. 152
Бондар, Таіса 191
Броўка, Юры 654
Брыль, Станіслаў 76
Брэжнеў, Леанід 173, 618
Будзінас, Я. 701
Бука, Юля 405
Булахаў, Зьміцер 10, 77, 123, 150, 699
Булацкі, Сяргей 363
Бурскі, Віктар 51
Бухвостаў, Аляксандар 269, 276, 358, 379, 399, 444, 683, 700
Буш, Джордж Ўокер 375, 435, 440
Буш, Джордж Гэрбэрт Ўокер 442
Быкаў, Васіль 251, 253, 433, 437
Бычок, В. 717
Бэйліян, Хрэер 306
Бэрш, Гербэрт 89
Бялецкі, Ян Кшыштаф 435
Бяляцкі, Алесь 249, 312, 331, 332, 460, 700

Ваганаў, Аляксей 222, 425, 508, 659
Вазьняк, С. 695
Вайтовіч, Аляксандар 12, 373, 439, 699, 700
Вайцянкоў, Мікалай 54, 701
Валкагонаў, Дзьмтіры 646
Валчанін, Аляксандар 404
Валэнса, Лех 435
Ваніна, Тацяна 174
Варановіч, Міхаіл 140
Варанцоў, Генадзь 143, 208
Вардамацкі, Андрэй 88, 109
Варонін, Уладзімер 651
Васілевіч, Рыгор 143, 148, 373, 701
Васілеўскі, (Wasilewski, J.) 652
Васілеўскі, Аляксандар 350
Васільева, Вольга 648
Васільеў, Аляксандар 465, 478, 713
Ваўчанін, Аляксандар 513
Вашкевіч, Аляксандар 142, 149, 154, 517
Верашчагін, Зьміцер 241
Вік, Ганс-Георг 200, 205, 207, 208, 228, 232, 234, 247—249, 304, 306, 312, 314, 523, 675
Віньнікава, Тамара 167, 185, 242, 252, 564, 565
Віньнікаў, Сяргей 252
Вітко, Францішак (Франц) 348
Вітрэнка, Наталя 306
Волебэк, Кнут 199, 200
Вольскі, Аляксандар 180, 611
Вольскі, Аркадзь 308
Воранаў, Генадзь 405, 505
Воўчак, Алег 221, 405, 434, 513
Вус, Дзьмітры 390, 425
Высоцкі, Сяргей 279
Вэршбоў, Аляксандар 443
Вялічкін, Уладзімер 412
Вячорка, Вінцук (Валянцін) 130, 203, 249, 254, 258, 269, 279, 325, 337, 338, 373, 379, 397, 401, 413, 480, 689—691, 701, 724

Гавал, Вацлаў 375, 721
Гаварухін, Станіслаў 322
Гаварушкін, Станіслаў 288
Гайдар, Ягор 600, 604, 605, 611, 618
Гайдукевіч, Сяргей 207, 208, 229, 238, 256, 259, 266, 270—273, 283, 294—296, 299, 302, 303, 325, 334, 373, 379, 396, 517, 550, 674, 692, 702
Галаванаў, Віктар 170
Галкін, Максім 364
Ганчар, Віктар 36, 77, 85, 90, 107, 110, 117, 123, 128, 132, 136, 140, 141, 163, 176, 178, 180, 191, 193—196, 198—200, 202—204, 211, 219, 240, 241, 244, 278, 290, 327, 433, 702, 710, 732
Ганчар, Зінаіда 434

Ганчар, Мікалай 611, 654
Ганчарык, Уладзімер 10, 16, 129, 189, 207, 229, 230, 238, 240—242, 244, 254, 256, 261, 266—271, 273—280, 283, 289, 294—296, 298, 299, 301—303, 308, 310, 312, 317, 318, 321, 323—327, 330, 331, 334, 335, 338, 344, 348, 685, 690, 692, 700, 702, 705, 707, 708, 712, 714, 718, 720, 728, 730, 731
Ганчарэнка, Уладзімер 170
Гапееў, Васіль 169
Гапоненка, Генадзь 349
Гаравы, Ленід 703, 717
Гарадзенка, Валер 181
Гарбачоў, Міхаіл 14, 15, 60, 61, 292, 637, 638, 640, 641, 644, 648
Гардзей, Міхаіл 350, 353
Гаркун, Уладзімер 104, 106, 110, 163, 176
Гарсія, Алан 555
Гаўруцікаў, Аляксей 407
Гаўрыленка, Мікалай 506
Гдлян 14
Гедройц, Валер 253
Гелнэр, Э. 453
Гельман, Джоэл, С. (Hellman, Joel S.) 556, 592
Герасімовіч, Уладзімер 208
Герашчанка, Віктар 245, 246
Германовіч, Ірына 361
Гітлер, Адольф 240
Глухоўскі, Леанід 252
Глушакоў, Уладзімер 359
Гразнова, Людміла 481, 703
Грамыка, Алег 687
Грачоў, Павал 628, 646
Грузьдзіловіч, А. 118
Грушавы, Генадзь 137, 220, 221, 274, 703
Грыб, Мечыслаў 74, 79, 145, 164, 191, 309, 312, 313, 316, 332, 480, 506, 686, 703, 708
Грыгараў, Аляксандар 170
Грыгор’еў, Уладзімер 15
Грыцкевіч, Анатоль 254, 279
Грэкавіц, Бэла (Grekovits, Bela) 555, 556
Губарэвіч, Юры 443, 461, 506, 690, 704
Гудзееў, Уладзімер 313, 332
Гуляеў, Анатоль 362
Гуляка, Леанід 170
Гурыновіч, Анатоль 395
Гурыновіч, Валянцін 310
Гусараў, Мікалай 173
Гуцэрыеў, Міхаіл 292
Гюнтэр, Барыс 331, 332

Дабравольскі, Аляксандар 67, 123, 268, 276, 399, 481, 513, 679, 704
Давыдаў, Аляксандар 170
Далжанкоў, Уладзімер 438
Дамашкевіч, Мікалай 54, 168, 704
Данейка, Павал 680, 704
Данілаў, Генадзь 175, 177
Данько, Уладзімер 106
Данькоў (Шыцік), Юры 222, 270, 271, 288, 389, 390
Данэлі, Крыс 436
Даргель, Вольга 164
Дароніна, Тацяна 145
Дарэнка, Сяргей 611
Даўгалёў, Васіль 54, 164, 168, 345, 705
Дашкевіч, Віктар 513
Дашкевіч, Зьміцер 494, 699, 705
Дзейка, Ганна 170
Дземянцей, Мікалай 65, 66, 648
Дзерыпаска, Алег 310, 311, 628, 632
Дзьмітры (біскуп Віцебскі і Аршанскі) 27
Дзюба, Уладзімер 80
Домаш, Сямён 51, 174, 229, 234, 238, 244, 253, 254, 266—271, 273—279, 287, 289, 294—296, 298, 299—303, 308, 320, 325—327, 330, 331, 334, 335, 337, 690, 699, 705, 712, 717
Драбышэўская, Інэса 164, 178
Дражын, Уладзімер 345
Дракахруст, Галіна 62, 67, 69, 94
Дракахруст, Юры 62, 67, 69, 94, 123, 541, 610, 613, 618, 619
Дубко, Аляксандар 51, 75, 115, 116, 291, 297, 693, 705
Дубовік, Леў 170
Дудзіноў, Юры 299

Дуніч, Мікалай 357
Дылевіч, Галіна 15
Дылеўскі, Генадзь 294, 295
Дэвіс, Глін 89
Дэвіс, Тэры 307

Ельцын, Барыс 69, 72, 133, 135, 201, 202, 246, 375, 600, 602, 603, 605—607, 609, 611, 613, 616—619, 621, 631, 637—639, 641, 643—649, 691
Ерын, Леанід 179, 182, 264, 349, 352, 355, 356, 441, 444, 706, 719

Ёванавіч, Жывадзін 199

Жабка, Пётар 170
Жадобін, Юры 182
Жандараў, Валер 359
Жарнасек, Андрэй 244
Жураўкова, Галіна 167, 441, 458
Жырыноўскі, Уладзімер 259, 309, 322, 616, 691, 692

Забалоцец, Сяргей 659, 706
Завадзкая, Сьвятлана 140
Завадзкі, Зьміцер 240, 242, 327, 357, 443, 618, 619
Завяруха, А. 133
Зайчанка, Мікалай 170
Заламай, Уладзімер 50, 51, 115
Замяталін, Уладзімер 35, 107, 119, 178, 195, 197, 210, 234, 264, 285, 287, 344, 348, 350, 678, 706
Запруднік, Янка 614
Зарамбюк, Алесь 706
Захаранка, Юры 116, 164, 177—179, 181, 191, 202, 240, 241, 278, 327, 706
Захарчанка, Валер 184, 291, 379
Зданюк, Васіль 361
Зелянкоўскі, Анатоль 15
Зімоўскі, Аляксандар 289, 293, 707
Зіноўскі, Уладзімер 170
Злотнікаў, Леанід 71, 72, 77, 95, 259, 581, 651
Знавец, Павал 395
Зюганаў, Генадзь 133, 309, 322, 605, 611, 632
Зянковіч, Вячаслаў 79
Зянковіч, Юрась 707
Зяньковіч, М.

Іваненка, Сяргей 308
Івашка, Зьміцер 252
Іванкоў, Аляксандар 170
Іваноў, Камэн 415
Іваноў, Сяргей 651
Іваноўскі, Аляксандар 143
Івашкевіч, Віктар 249, 359, 360, 480, 679, 707
Ігнатовіч, Валер 241
Ігнацюк, Аляксандар 362
Ігруноў, Мікалай 16

Кабец, Канстанцін 646
Кабякоў, Андрэй 169, 345, 354, 434
Каган, С. 721
Кадафі, Муамар 282
Казановіч, Андрэй 506
Казека, Андрэй 350, 353
Казека, Віктар 350, 353
Казлоўскі, Павал 76, 164, 167, 234, 238, 267—271, 273—277, 289, 294, 299, 301—303, 325, 326, 628, 707
Казлоўскі, Сяргей 418
Казулін, Аляксандар 685, 686, 704, 707, 709, 717, 725, 727
Казяк, Вінцэнт 717
Какошын, Андрэй 646
Калінін, Эдуард 291
Калугін, Леанід 270, 271, 288, 294, 347—350, 437, 708
Каляда, Сяргей 251
Калякін, Сяргей 68, 186, 188, 220, 221, 234, 238, 256, 266—271, 273, 274, 276, 277, 289, 294, 299, 301—303, 325, 334, 373, 379, 397, 481, 676, 693—695, 708
Камай, Аляксей 133
Кананові, Канстанцін 270, 271
Канаплёва, Ала 190

Канаплёў, Уладзімер 140, 141, 183, 184, 290, 294, 708
Канцавенка, Сяргей 180
Канцараў, Фарыд 179, 181
Капітула, Пётра 180
Капульцэвіч, Віктар 185
Каралёва, Сьвятлана 406
Каралёў, Уладзімер 180
Каратчэня, І. 299
Карач, Вольга 709
Карашкоў, Валер 170
Карбалевіч, Валер 66, 74, 76, 91, 92, 96, 97, 184, 330, 400, 408, 409, 427, 561
Карніенка, Алесь 443
Карняенка, Віктар 709, 717
Кароль, Аляксей 207, 260, 267, 336, 338, 395—397, 399, 480, 509, 685, 686, 703, 709
Карпенка, Генадзь 49, 68, 105, 123, 124, 127, 134, 145, 191, 241, 258, 268, 278, 327, 709
Карпенка, Людміла 140, 268, 709
Карташ, Мікалай 687
Карунас, Уладзімер 406
Карцаў, Аляксандар 409
Карчміт, Міхаіл 291
Карэнда, Іван 348
Касаеў, А. 651
Касалапаў, Мікалай 648
Касінец, Аляксандар 169
Кастра, Фідэль 375
Касьценка, Анатоль 167, 185
Касьцень, А. 114
Касьцян, Сяргей 184, 351, 356, 550, 710
Касьянаў, Міхаіл 245, 247, 292, 309, 434, 442
Катляроў, Ігар 184, 351, 550, 710
Кацярына II 614
Каштуніца, Ваіслаў 375
Кашэўскі, Валеры 404
Квасьнеўскі, Аляксандар 375
Квон, Лі Ён 646, 647
Кебіч, Вячаслаў 10, 66, 69—72, 74—76, 82, 93, 94, 103—107, 109, 138, 162, 163, 175, 177, 179, 180, 185, 272, 297, 299, 557, 559, 564, 568, 597—602, 612, 625, 648, 674, 689, 693, 698, 706, 710, 711, 729
Кез, Валер 177, 179, 180, 243
Кенэдзі, Джон Фіцджэралд 14
Кільюнэн, Кіма 306
Кірыкаў, Анатоль 350
Кірычэнка, Мікіта 645
Кісель, Рыгор 363
Клімава, Тацяна 140
Клімаў, Андрэй 140, 199, 208, 241, 351, 481, 710
Клінтан, Біл 375
Клыкаў, Вячаслаў 285
Кляцкоў, Леанід 15
Князеў, Станіслаў 264, 344, 350, 351
Кобаса, Міраслаў 284
Козак, Майкл 249, 253, 306
Козік, Леанід 168, 264, 311, 336, 344, 355, 358, 373, 396, 444, 657, 665, 711, 716
Козыр, Аляксандар 198, 654
Козыраў, Андрэй 611, 646
Кокараў 110
Колас, Уладзімер 517, 711
Колас, Якуб 452
Корбут, Мікалай 170, 183
Корбышаў, Уладзімер 360
Корзун, Яўген 350
Косьцікаў, Мікалай 76
Котаў, Фёдар 244
Кох, Альфрэд 611
Крамко, Віталь 291
Красоўская, Ірына 140
Красоўскі, Анатоль 240, 241, 244, 327
Красуцкі, Анатоль 141
Краўцоў, Яўген 350, 355
Краўчанка, Пётра 76, 191, 711
Краўчук, Леанід 69
Крук, Уладзімер 511
Крыжаноўскі, Яўген 270, 294, 303, 325, 712
Крэчка, Мікалай 177
Кудзінаў, Уладзімер 140, 199, 712
Кудрын, Аляксей 441
Кузё, Тарас 61, 62, 99
Кузьма, Анатоль 438
Кузьняцоў, Ігар 287
Кузьняцоў, Рыгор 170

Кулакоўскі, Юры 208
Кулічкоў, Анатоль 50
Купала, Янка 452
Купрыянаў, Мікалай 354
Куранкоў, Уладзімер 128, 177, 180
Курачкін, Генадзь 170
Кучма, Леанід 375, 651
Кучынскі, Віктар 104, 106, 164, 184, 712

Лабанава, Ніна 170
Лабановіч, Яўген 406, 512, 712
Лагвінец, Аляксандар 264, 652
Лагвіновіч, Вольга 513
Лазавік, Мікалай 288, 391, 404, 412, 413, 528
Лазараў, Міхаіл 182
Лапацік, Мікалай, 241
Лапіцкі, Аляксей 404
Лапцэвіч, Уладзімер 270
Латыпаў, Урал 133, 182, 199, 200, 202, 205, 206, 208, 264, 324, 325, 344, 373, 441, 712, 719
Лашкевіч, Анатоль 481
Лебедзь, Аляксандар 133, 180, 611
Леванеўскі, Валер 270, 294, 465, 478, 713
Лемяшонак, Леанід 207, 396
Ленгвольд, Робэрт (Lengvold, Robert) 652
Леўчык, Уладзімер 45
Лігачоў, Ягор 644
Лінг, Сяргей 105, 107, 131, 163, 176, 177, 713
Лінц, Хуан (Linz, Juan J.) 420
Ліціцын, Анатоль 311
Ліхачоў, Дзьмітры 611
Ломаць, Зянон 438
Лугін, Яўген 274, 394
Лужкоў, Юры 245, 309, 611, 621, 632
Лукашэнка, Аляксандар 8—12, 28, 36, 40, 42, 49—51, 56, 58, 68, 71, 74—97, 102, 104—111, 115—117, 119, 127, 129, 131—133, 135—144, 146, 148, 150, 152, 157—164, 167, 172, 175—188, 191—196, 198—208, 211, 219—221, 224—234, 236—251, 253—257, 259—262, 264—266, 268—275, 279, 280, 282—304, 306, 308—311, 314, 317, 318, 320—329, 339—359, 363, 364, 368—376, 378—380, 382, 394, 410, 419—422, 424, 427—429, 431—447, 450, 456—459, 466—470, 472, 474, 477, 487, 489, 495, 497—500, 508, 510, 512, 515—517, 519, 521, 522, 535—542, 544—550, 553, 554, 557, 558, 560—571, 573, 575, 578—585, 587—590, 592, 594—597, 600—619, 621—623, 625, 628—636, 642, 648, 650, 651, 654, 663, 674, 675, 677, 678, 680, 682—684, 687, 689—694, 696, 697, 699—730
Лупач, Зьміцер 405
Лучанок, Ігар 291
Лучыч, Зоран, 522
Любімаў, Аляксандар 234, 266
Лябедзька, Анатоль 10, 77, 130, 207, 234, 249, 269, 299, 306, 325, 335, 341, 342, 357, 373, 379, 396, 439, 679—681, 695, 707, 708, 713, 717
Лявонаў, Васіль 167, 177, 185, 229, 243, 269, 274, 276, 310, 347, 362, 394, 437, 714
Лявонаў, Міхаіл 348—350, 444
Ляўковіч, Анатоль 480, 685, 714
Ляшко, Аляксей 270

Мажэйка, Павал 355, 359, 715
Мазураў, Кірыла 173
Макараў, Ігар 245, 292, 310
Максэй, Даяна 101
Малафееў, Анатоль 133, 139, 143, 183, 714
Малашка, Віталь 406
Малумаў, Юры 49, 127, 714
Мальцаў, Леанід 167, 170, 264, 715
Мамацюк, Сяргей 433
Манаеў, Алег 249, 340, 539, 540
Манамах, Уладзімер 616
Марголін, Леў 407, 505
Маркевіч, Алег 406
Маркевіч, Мікола 355, 359, 715
Маркоўскі, Андрэй 350
Маркоўскі, Георгі 167
Марозаў, Юры 259, 285, 286, 508
Мартынаў, Сяргей 170, 194, 433
Марыеў, Павал 291
Марыніч, Міхаіл 164, 229, 256, 269—272,

276, 286—288, 294, 326, 458, 464, 477—479, 546, 697, 715, 721
Маскевіч, С. 697
Матвяйчук, Уладзімер 170
Матусевіч, Валянціна 336, 338, 339, 396, 399, 682, 715, 720
Матусевіч, Юры 440
Махоўскі, Андрэй 243, 244
Мацкевіч, Уладзімер 179, 197, 243, 264, 299, 676, 716
Мацьвяйчук, Уладзімер 716
Мацюшка, Уладзімер 196
Мацюшкоў, Уладзімер 170
Машэрава, Наталя 263, 270, 272, 284—288, 293, 294, 299, 302, 303, 339, 659, 716, 719, 727
Машэраў, Пётра 173, 284, 716
Мельнік, Вадзім 170
Мельнікаў, Алег 440
Мельнікаў, Аляксандар 413, 417
Меч'яр 518
Міgranян, Андранік
Мізуліна, Алена 659
Мізэс, Людвіг фон 95
Мікалуцкі, Яўген 167
Мілінкевіч, Аляксандар 269, 677, 681, 685—687, 690, 695, 700, 702, 704—709, 711, 714, 715, 717, 718, 720, 730, 731
Мілошавіч, Слабадан 195, 200—202, 245, 375, 518
Мільднэр, Кірк 581
Мількота, Аляксандар
Мінікес, Стэфан 443 \як правільна???\
Мінэкес, Стэфан 414
Мітчэл, Іен 415
Мітшаўэр, Ёзэф 202
Міхалевіч, Алесь 422, 481, 512, 513, 717
Міхалевіч, Зьміцер 350
Морава, Антаніна 170
Мурашка, Аляксандар 440
Мусаліні, Бэніта 140
Мухтараў, Андрэй 290
Мядзьведзеў, Уладзімер 350
Мякека, Мікалай 270
Мясьніковіч, Міхаіл 104, 105, 107, 133, 134, 163, 175— 180, 182—184, 202, 206, 229, 252, 264, 344, 373, 564, 565, 584, 657, 665, 712, 717
Мяцельскі, Віталь 244

Навадворская, Валерыя 611
Навасяд, Уладзімер 12, 221, 259, 262, 413, 417, 426, 459, 495, 680, 718, 720
Навіцкі, Генадзь 12, 265, 346, 352, 373, 438, 439, 718, 724, 731
Навумаў, Уладзімер 170, 182, 195, 196, 241, 244, 252, 264, 355, 718
Навумчык, С. 17
Нарэйка, Андрэй 508
Натчык, П. 15
Нібэрг, Рэнэ 202
Нікіфараў, Валер 291
Нікіцін, Валянцін 181
Нікіцін, Уладзімер 659
Нісьцюк, Уладзімер 77, 274, 460, 685, 718
Новельскі, Віктар 208
Новікаў, (лідэр камуніст.партыі — Анатоль? Васіль? Яўген?) 105
Новікаў, Анатоль 659
Новікаў, Васіль 11, 68, 75, 186, 297, 674, 681, 693, 716, 719
Новікаў, Яўген 314
Нойбэрт, Кляўс 202
Нордбэрг, Марк 61, 62, 99
Нявыглас, Генадзь 264, 349, 719
Нямцоў, Барыс 308, 341, 607, 609, 619, 681

О'Донэл, Г. (O'Donnel, G.) 146
Орда, Міхаіл 460, 466, 719
Освальд, Лі Гарві 730
Офэ, Кляўс (Offe, Claus) 638

Паганяйла, Гары 220, 221, 274, 434
Падаляк, Міхаіл 457, 468
Падгайны, Міхаіл 197, 345, 355, 361, 362, 440, 722
Падгол, Уладзімер 612
Пазьняк, Аляксандар 134

Пазьняк, Зянон 10, 20, 23, 63, 71, 75, 99, 105, 106, 109, 118, 125, 129, 191, 198, 200—205, 238, 258, 266, 267, 270, 271, 294, 297, 299, 301—303, 325, 373, 379, 397, 479, 535, 603, 684, 686—691, 698, 699, 719, 720
Палахала, В. 639
Палевікова, Валянціна 163, 276, 284, 299, 325, 334, 336, 338, 379, 395, 396, 513, 682, 720
Палякоў, Васіль 443
Панамарэнка, Панцеляймон 173
Панасаў, Сьцяпан 659
Папкоў, Аляксандар 249, 345, 438
Папкоў, Сяргей 690, 720
Паплаўскі, Міхаіл 356
Папоў, Вадзім 37, 212, 373, 720
Папоў, Гаўрыла 645
Парфяновіч, Уладзімер 12, 222, 413, 426, 477, 720, 724
Пастухоў, Барыс 654, 668
Пастухоў, Міхаіл 138, 142, 143, 148, 158, 191, 208
Патанін, Уладзімер 629
Патолічаў, Мікалай 173
Патупа, Аляксандар 287
Паўлаў, Валянцін 643, 644
Паўлаў, Міхаіл 721
Паўлічэнка, Зьміцер 243, 716
Паўлоўскі, Аляксандар 170
Паўэл, Колін 249, 306
Пафераў, Алег 440
Пахабаў, Мікалай 407
Пахлопка, Аляксандар 481
Пашкевіч, Іван 183, 695, 721
Пётар I 614, 616
Петрушкевіч, Зьміцер 242
Петрыкевіч, Сяргей 552, 596
Пётух, Пётра 51, 115
Піначэт, Аўгуста 569
Пласкавіцкі, Аляксандар 38, 212
Пліска, Міхась 193, 313, 410, 460, 521, 523, 528
Познэр, Уладзімер 234
Посахаў, Сяргей 115, 131, 180, 183, 348, 721
Пракапец, Іван 407
Пракаповіч, Пётра 167—169, 373, 563, 573, 625, 721
Праляскоўскі, Алег 461, 464, 721
Пратасеня, Анатоль 350
Процька, Тацяна 313, 317
Прыбыткоўскі, Ф. 654
Прымакоў, Яўген 133, 203, 272, 611, 616, 617, 639, 647, 649
Прыходзька, Сяргей 445
Пугачова, Ала 364
Пургурыдэс, Хрыстас 470, 730
Пуцін, Уладзімер 182, 203, 245—247, 283, 292, 308, 309, 339—342, 373—375, 428, 434, 438, 442, 445, 446, 589, 613, 619, 629, 631—634, 639, 642, 650, 651
Пыльчанка, Аляксандар 252
Пяткевіч, Натальля 722
Пятровіч, Тацяна 185
Пячэрскі, Арнольд 196

Рабатай, Аляксандар 208
Равяка, Тацяна 313, 412, 528
Рагозін, Дзьмітрый 446
Радзівонаў, І. 133
Радзькоў, Аляксандар 170
Радкевіч, Уладзімер 76
Ракаў, Мікалай 350
Раманавы 98
Раманчук, Яраслаў 481, 623, 681, 722
Рамсфэлд, Дональд 436
Рахманько, Віктар 347, 348, 350
Ротман, Давід 109
Роўда, Уладзімер 189, 416, 421
Рубінаў, Анатоль 722
Рудэнка, Віктар 170
Рузвэльт, Франклін 356
Румянцаў, А. 653
Русак, Леанід 170
Русакевіч, Уладзімер 170, 178, 440, 722
Русецкі, Анатоль 170
Русы, Міхаіл 349, 438
Рухлядзеў, Сяргей 112, 179
Руцкой, Аляксандар 648
Рыбакоў, Ягор 167, 363, 364, 441, 458, 716

Рыбкін, Іван 117, 611
Рыкер, Філіп 241, 307

Саакашвілі, Міхаіл 444
Сабчак, Анатоль 645
Савіцкая, Сьвятлана 659
Садоўнічы, Віктар 245
Садоўскі, Пётра 184
Сазонаў, Аляксандар 112, 184
Сазонаў, Міхаіл 164, 184, 205, 207, 208
Салаўёў, Юры 291
Салаш, Сяргей 505, 512
Салжаніцын, Аляксандар 611
Саломенцаў, Міхаіл 644
Саляна, Хаўер 308
Саньнікаў, Андрэй 201, 276, 439, 443, 494, 722
Саранчукоў, Вадзім 398
Сасноў, Аляксандар 723
Сасноўскі, Уладзімер 170
Сахараў, Андрэй 63
Сашэнка, Зьміцер 185
Севярын, Адрыян 194, 205, 207
Севярынец, Павал 397, 398, 433, 444, 477, 481, 513, 676, 690, 723
Селіванава, І. 654
Селін, Павал 438
Селязьнёў, Генадзь 84, 159, 245, 309, 607, 611, 632
Семянінаў, Рыгор 648
Семянюк, Уладзімер 357
Сечка, Леанід 124, 270, 280, 286, 684, 695
Сівакоў, Юры 181, 182, 196, 197, 243, 264, 344, 348, 723
Сідорскі, Сяргей 169, 345, 354, 436, 438, 723
Сіліцкі, Віталь 413, 522
Сімірскі, Валянцін 141
Сініцын, Леанід 50, 104, 106, 164, 178—180, 234, 269—272, 284, 286—289, 293, 294, 303, 325, 340, 724, 727
Сіўчык, Вячаслаў 80, 253, 337, 338, 690, 724, 728
Скарына, Францішак 451
Скобелеў, Эдуард 351
Скокаў, Юры 646, 647
Скочка, Яўген 244
Скрабец, Сяргей 12, 222, 270, 271, 286, 288, 477, 698, 720, 724, 725
Скрыган, Алена 107, 460, 481
Случак, Алег 242
Снарэ, Ч. 534
Сом, Лера 513
Сорас 186, 263, 723
Спрынг, Дзік 89
Сталін, Іосіф 240, 637
Станішкіс, Ядзьвіга (Staniszkis, Jadwiga) 640
Старавойтава, Галіна 611
Старавойтаў, Васіль 185, 194, 199, 347
Старыкевіч, Аляксандар 361
Статкевіч, Мікалай 220, 221, 260, 262, 267, 274, 276, 325, 332, 334, 336, 338, 339, 373, 379, 395, 396, 398, 412, 430, 443, 475, 480, 494, 683—686, 714, 718, 719, 723, 725
Стражаў, Васіль 164, 708, 725
Строеў, Ягор 159, 287, 309
Стужынская, Ніна 406
Ступін, Арнольд 285
Ступнікаў, Аляксандар 618
Стэфановіч, Валянцін 313
Стэфанскі, Леанід 185
Суйкоў, Анатоль 404
Сукала, Валянцін 143, 349, 373
Сумар, Канстанцін 725, 726
Сурвілла, Івонка 153
Сухарэнка, Сьцяпан 170
Сыракваша, Дзьмітрый 25
Сьлюнькоў, Мікалай 173
Сьмірноў, Канстанцін 648
Сьміт, Э. 453
Сьцерлігаў, Аляксандар 606
Сьцяпанаў, Уладзімер 168, 288
Сьцяпашын, Сяргей 203, 617, 639
Сюдак, Аляксей 513
Сямак, Валянцін 270
Сямашка, Пётар 170
Сямашка, Уладзімер 169
Сямдзянава, Галіна 406
Сямёнаў, Уладзімер 51, 174

Сянько, Уладзімер 726
Сяроў, Валер 84, 611
Сярэбраньнікаў, Аляксандар 350
Сярэдзіч, Язэп 119, 249, 274

Тайсан, Майк 549
Тамковіч, Аляксандар 361
Таразевіч, Георгі 16, 726
Таранаў, Іван 632
Тарасаў, Уладзімер 137
Ткачоў, Міхась 672, 683
Ткачоў, Сяргей 54
Ткачоў, Уладзімер 350
Тозік, Анатоль 169, 345, 348, 349, 352, 355, 357, 358, 433, 441, 726
Токараў, Уладзіслаў 513
Том, Франсуаза (Thom, Fransoise) 649
Трусаў, Алег 207, 254, 279, 339, 389, 683, 684, 726
Трызна, Алег 80
Тулееў, Аман 309
Туміловіч, Максім 552, 564, 572, 573
Тэлбат, Строўб 201

Угляніца, Генадзь 243, 244
Удавікоў, Міхаіл 181, 182, 201, 264
Улан, Рамуальд 362
Улаховіч, Зьміцер 291
Уліцёнак, Аляксандар 361
Унучка, Раман 438, 726
Урынсон, Якаў 611
Усюкевіч, Генадзь 274
Ухналёў, В. 695

Фадзееў, А. 614
Фадзееў, Валер 150
Феакцістаў, Юры 347
Фёдараў, Барыс 600
Фёдараў, Юры 646, 648
Філарэт (Вахрамееў, Кірыла) 96, 701
Фішар, Лені 88
Фралоў, Валеры 12, 222, 357, 373, 413, 426, 434, 477, 478, 480, 494, 506, 508, 685, 720, 724, 727
Фрыдлянд, Міхаіл 687
Фрыдрых II 456
Фрык, Гельмут 443
Фурман, Дзьмітры 62, 67, 69, 94, 610, 613, 618, 619, 652
Фэстынгер, Леон 236
Фядута, Аляксандар 49, 51, 77, 119, 149, 164, 178, 270, 284, 331, 332, 566, 724, 727
Фядыніч, Генадзь 358, 444, 506, 727

Хадаркоўскі, Міхаіл 440, 443
Хадыка, Юры 19, 80, 203, 396, 480, 506, 689, 724, 727
Халопік, Кірыла 425
Хаменка, Сяргей 418
Хамэд, Аднан 433
Харлап, Анатоль 180
Харужык, Лявонці 170
Харытон, Аляксандар 356
Хасбулатаў, Руслан 600
Хашчавацкі, Юры 254, 279
Хвастоў, Міхаіл 304, 306, 307, 433, 728
Хелмс, Джэсі 347
Хельман, Джоэль (Hellman, Joel S.) 556, 592
Хілько, Уладзімер 185
Хрол, Васіль 425
Хрушчоў, Канстанцін 355
Худая, Марыя 659
Хусэйн, Садам 375, 432, 550

Цалка, Уладзімер 170
Цапф, Ута 148, 435, 479
Цесавец, Міхаіл 144, 164
Цімаеў, Андрэй 409
Ціханаў, Генадзь 611
Ціханаў, Георгі 234, 659
Ціхіня, Валер, 84, 88, 141, 143, 148—150, 159, 728
Ціцянкоў, Іван, 78, 104, 106, 168, 178, 184, 231, 264, 290, 728
Цынкевіч, Аляксандар 513
Цыркун, Надзея 357, 508
Цэпкала, Валер 728
Цярэшчанка, Віктар, 77, 164, 266, 268, 270,

271, 288, 294, 729

Чавусаў, Ю. 493
Чалнакоў, Міхаіл 643
Чаргінец, Мікалай, 208, 290, 306, 659, 729
Чаркізаў, Андрэй 611
Чарнамырдзін, Віктар, 84, 104, 133, 159, 602, 606, 611, 622
Чарнышэвіч, Станіслаў 350
Чарняўскі, Міхась 395
Чубайс, Анатоль 308, 600, 605, 607, 609, 611, 618
Чудакоў, Міхаіл, 114
Чумакоў, Аляксандар, 167, 180, 199
Чуркін, Віталь 646
Чыгір, Аляксандар, 251, 252
Чыгір, Міхаіл, 77, 78, 128, 163, 177, 178, 180, 191, 195, 198, 200—202, 220, 230, 234, 238, 251, 252, 256, 266—271, 273—277, 284, 290, 294, 299, 301—303, 325, 330, 561, 562, 568, 690, 697, 713, 716, 722, 723, 729
Чыкін, Віктар, 68, 168, 186
Чыстоў, Валеры 407

Шайкоў, Васіль, 120
Шакум, Міхаіл 611
Шарамет, Павал 287, 618, 619
Шарапкін, Кірыла 409
Шарэцкі, Сямён, 69, 84, 90, 130, 138—140, 148, 158, 159, 191, 193, 195, 200, 202, 203, 681, 682, 728, 729
Шаўцова, Лілія 637
Шафарэвіч, Ігар, 285
Шахрай, Сяргей 611
Швыдкой, Міхаіл, 245
Шлындзікаў, Васіль, 123, 259, 274, 679, 730
Шмыгалёў, Яўген 687
Шохін, Аляксандар 602
Шпагіна, Марына 645
Шпілеўскі, Аляксандар, 170, 221
Шродтэр, Элізабэт 308
Шродэр, Герхард 375
Штудман, Герхард 305
Шульга, Людміла 185
Шурубовіч, А. 666, 669
Шустаў, Васіль 51
Шушкевіч, Станіслаў, 8, 9, 66, 67, 73—76, 105, 106, 123, 127, 162, 179, 259, 260, 262, 269, 276, 284, 297, 299, 302, 325, 334, 336, 338, 339, 379, 395, 396, 480, 597, 598, 601, 612, 636, 684, 686, 689, 697, 709, 713, 726, 728, 730, 731
Шчукін, Валер 274, 730
Шчыгельскі, Зьміцер, 239, 240
Шыманскі, Зьміцер 512
Шыманскі, Міхаіл 139, 682
Шынкарык, Ігар 400, 409
Шыпук, Павал 50, 659
Шырак, Жак 375
Шыркоўскі, Эдуард, 175, 176, 179
Шышкоў, Юры 651
Шышла, Іван, 185
Шэін, А. 723
Шэйман, Віктар, 10, 132, 164, 168, 177—179, 181—184, 196, 197, 199, 208, 243, 264, 325, 344, 347—352, 354, 355, 357, 358, 373, 431, 433, 434, 441, 503, 712, 730
Шэрман, Гарнэт (Sherman, Garnett) 652

Эйдзін, Эдуард, 132
Эсамбаеў, Махмуд, 167, 443

Юмашаў, Валянцін 611
Юнчык, Леанід, 139
Юркін, Іван, 179
Юрчык, Мікалай, 185
Юсуфаў, Ігар 444
Юшанкоў, Сяргей 611

Ягораў, А. 519
Ягораў, Уладзімер, 164, 175—179, 181
Якабсон, Аляксандар 731
Якаўлеў, Аляксандар 350
Якубовіч, Павал, 208, 449
Яненка, Зьміцер 731
Янукевіч, Аляксей 481, 512, 513
Янчэўскі, Усевалад 508, 731
Ярашук, Аляксандар 228, 263, 268—271,

276, 299, 303, 325, 326, 340, 680, 731
Ярмак, Сяргей, 276, 279, 695
Ярмошын, Уладзімер, 229, 265, 299, 310, 713, 721, 731
Ярмошына, Лідзія, 136, 257, 271, 314, 373, 389, 400, 404, 407, 412, 414, 460, 484, 528, 549, 732
Ясін, Яўген
Ястржэмбскі, Сяргей 611, 618
Яўлінскі, Рыгор 604, 611
Боярунец, А. 77
Бугрова, И. 517

Голобуцкий, А. 77

Криштапович, Л. 453
Кулик, В. 77

Матусевич, Е. 448
Мехов, С. 147
Мошес, Аркадий 650

Сергеев, Н. 614
Сысоев, Геннадий 244

Чернов, В. 423

Яровенко, Мария 228

..wiktochowski, Tadeusz 645
Bajarnas, Eitvygas 645
Bayou, Céline 645
Boenker, Frank 638

Dábrowski, M. 101
Dornbusch, Rudiger 554

Edwards, Sebastian 554
Elster, Jon 638

Fount, Serguei 649

Goetting, Ulrike 638

Haab, Mare 645
Huntington, Samuel 597

Ilmars, Viksne 645
Inglot, Tomasz 556

Jones, Geraint 592

Kaufmann, Daniel 592

Landago, A. 307
Lane, David 643

Olson, Mansur 593
Ost, David 556

Peterson, Scott 331
Preuss, Ulrich 638
Price, Joe 329
Przeworski, Adam 556

Roniger, L. 184
Rueb, Friedbert 638

Simonsen, Sven Gunnar 596

Urban, M. 15

Van Ham, Peter 645

Zwierzchowski, E. 149

*Падрыхтаваў Раман Маладзяшын*